Вячаслаў Швед

ГІСТОРЫЯ ГРОДНА

Энцыклапедыя

WYDAWNICTWA UNIWERSYTETU WARSZAWSKIEGO
WUW



ГІСТОРЫЯ ГРОДНА

Энцыклапедыя

Вячаслаў Швед

ГІСТОРЫЯ ГРОДНА

Энцыклапедыя

WYDAWNICTWA UNIWERSYTETU WARSZAWSKIEGO
WUW

Рэцэнзенты
Віктар Корбут
Святлана Сяльверстава

Вядучы рэдактар
Якуб Азімэк / Jakub Ozimek

Рэдагаванне і карэктура
Алег Барцэвіч

Падбор ілюстрацый
Віктар Корбут

Праект вокладкі
Анна Гагалевска / Anna Gogolewska

Фота на вокладцы
Максім Швед

Вёрстка
Дарыюш Гурскі / Dariusz Górski

Выдадзена дзякуючы фінансавай падтрымцы Варшаўскага ўніверсітэта

Выдадзена дзякуючы фінансавай падтрымцы Фонду Варшаўскага ўніверсітэта
Publikacja dofinansowana przez Fundację Uniwersytetu Warszawskiego



Апублікавана на ўмовах ліцэнзіі Creative Commons Attribution 4.0 PL
(CC BY 4.0 PL) (поўны тэкст шаблона даступны на: https://creativecommons.org/licenses/by/4.0/legalcode.pl).

Вячаслаў Швед, Uniwersytet Warszawski, ORCID 0000-0002-2878-6231

ISBN 978-83-235-7052-3
ISBN 978-83-235-7054-7 (pdf online) ISBN 978-83-235-7053-0 (e-pub)

Выдавец
Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego
02-678 Warszawa, ul. Smyczkowa 5/7
wuw@uw.edu.pl
www.wuw.pl

1-е выданне, Варшава 2025

Друк і пераплёт
POZKAL

Змест

Уступ 7

Энцыклапедыя 9

Бібліяграфія гісторыі Гродна 725

Ілюстрацыі 817

Уступ

"Понеже от прирожения звери, ходящие в пустыни, знають ямы своя;
птици, летающие по воздуху, ведаютъ гнезда своя;
рибы, плавающие по морю и в реках, чують виры своя;
пчелы и тым подобная боронять ульев своих,
– тако ж и люди, игде зродилися и ускормлены суть по бозе,
к тому месту великую ласку имають".

(Францішак Скарына. Юдзіф).

Шмат працуючы ў польскіх бібліятэках па зборы матэрыялаў, якія тычацца Гродна, я звяртаў увагу на дасведачныя і энцыклапедычныя выданні і бачыў, колькі энцыклапедый ёсць па гарадах Польшчы. І не толькі такіх, як Варшава, Кракаў, Вроцлаў, але і значна меншых. Брала зайздрасць. А потым прыйшло жаданне напісаць энцыклапедыю "Гісторыя Гродна". Мой горад заслугоўвае мець энцыклапедыю – яго гісторыя мае больш за 1000 гадоў. Ён быў пэўны час другой сталіцай (1240-я – 1398 г.) і галоўным цэнтрам Вялікага Княства Літоўскага (1795–1801), сталіцай Беларускай Народнай Рэспублікі (27.12.1918–14.03.1919), абласным (з 20.09.1944) і раённым цэнтрам Беларусі (з 15.01.1940). Гродну давялося быць у розных дзяржаўных утварэннях: ВКЛ, І і ІІ Рэчы Паспалітай, БССР і Рэспубліцы Беларусь.

Усё гэта адлюстравалася на эканамічным, палітычным, культурным, этнічным развіцці Гродна. Чытач знойдзе ў кнізе апісанні аб'ектаў прамысловасці і гандлю, іх гаспадароў; артыкулы пра войны, паўстанні, рэвалюцыйныя і нацыянальныя рухі, партыі і таварыствы (легальныя і падпольныя), асобаў, звязаных з гэтымі падзеямі; нарысы пра адукацыю (школы, гімназіі, выкладчыкі і вучні), асвету і друк (таварыствы, перыёдыка, друкарні, бібліятэкі); літаратуру (кнігі навуковыя і мастацкія); архітэктуру (будынкі і іх уладальнікі); мастацкую і музычную культуру (тэатр, балет, опера, аркестры і артысты).

Гродна – шматэтнічны і паліканфесійны горад, таму мы знаёмім чытачоў з беларусамі, палякамі, рускімі, яўрэямі, немцамі, яцвягамі, татарамі і іншымі этнасамі, з гараджанамі, якія спавядалі хрысціянства, іўдаізм, іслам або былі язычнікамі.

Кніга, якую паважаны чытач трымае ў руках – гэта плён 6 гадоў цікавай працы. Пісаць было і цяжка, і лёгка. Цяжка, бо калі пісаў пра асобаў ужо памерлых, якіх асабіста ведаў, дык успамінаў нашыя сустрэчы і размовы – перажываў; трэба было перачытаць, пераглядзець тысячы кніг і артыкулаў, альбомаў (глядзі "Спіс бібліяграфіі гісторыі Гродна"). Я карыстаўся архівамі

Беларусі (Гродна, Мінск), Польшчы (Беласток, Варшава), Літвы (Вільня), Расійскай Федэрацыі (Пецярбург). Апублікаваныя крыніцы і літаратуру знаходзіў у бібліятэках (асноўнага фонду і аддзелаў рэдкай кнігі, рукапісаў, картаграфічным) названых гарадоў, а таксама Масквы, Вроцлава. Трэба было здзейсніць паездкі на Сілезію ў замак "Гродна", у Гастынін у колішнім Плоцкім ваяводстве, па слядах Давыда Гарадзенскага і яго забойцы рыцара Госта.

Пісалася лёгка, бо за плячамі я меў свае даследаванні Гродна – апублікавана больш за дзясятак кніг па гісторыі горада. Меў выпісы з апублікаваных і архіўных крыніц, якія даўно ляжалі ў хатніх тэчках і чакалі свайго часу. Я вёў некалькі гадоў факультатыўны курс па гісторыі Гродна, пэўны час вадзіў экскурсіі па горадзе – гэты вопыт даваў мне "карцінку, выгляд" горада. Калі я пісаў, дык часам віртуальна хадзіў па Горадзену, Горадні, Гродна ці стаяў каля месца або будынка, якія апісваў. Дарэчы, горад меў на працягу свайго існавання розныя, як вы бачыце, назвы (дадамо яшчэ расійскую – Гродно). Мы спрабавалі ўжываць іх да той эпохі, пра якую пісалася ў артыкуле ці яна прыводзілася ў цытаваным намі дакуменце. Пачытайце артыкулы пра кожную назву і вы будзеце добра арыентавацца.

Яшчэ адна падказка – звяртайце ўвагу на словы, якія набраныя курсівам. Гэта значыць, што ў энцыклапедыі маецца артыкул з падобнай назвай і, прачытаўшы яго, вы пашырыце свае веды пра з'яву ці асобу, пра якую хочаце ведаць болей.

Дзякую ўсім гісторыкам і гродзенскім краязнаўцам за іх працу па напісанні артыкулаў, брашур і кніг па гісторыі Гродна. Без вас мне было бы цяжка напісаць "Энцыклапедыю гісторыі Гродна" толькі на сваіх працах. Асабліва ўдзячны за публікацыі Андрэю Вашкевічу, Юрыю Гардзееву, Алесю Госцеву, Аляксандру Радзюку, Вользе Сабалеўскай, Віктару Саяпіну, Яну Супрону, Андрэю Чарнякевічу. Іх працы далі мне не толькі канкрэтны матэрыял, але і ідэі для наступных артыкулаў энцыклапедыі.

Дзякуй майму сыну Максіму Шведу – за фотаздымак для вокладкі кнігі.

Былой загадчыцы аддзела бібліяграфіі Гродзенскай абласной бібліятэкі імя Я. Карскага Людміле Здрадоўскай дзякуй за дапамогу па бібліяграфіі гісторыі Гродна.

Маёй жонцы Тамары дзякуй за цярплівасць, разуменне, тэхнічную і лагістычную дапамогу.

А

Абабкава-Чэкель Марыя Аляксандраўна (1935, в. Сухмяні Гродзенскага р-на – ?) – прадзільшчыца, Герой Сацыялістычнай Працы (1960). У 1953–1961 – рабочая, у 1961–1976 – зменны майстар апаратна-прадзільнага цэха, у 1976–1977 – старшыня фабрычнага камітэта прафсаюзаў, у 1977–1992 – інжынер па стандартызацыі Гродзенскага вытворчага тонкасуконнага аб'яднання. Была дэпутатам Гродзенскага гарадскога Савета. Узнагароджаная ордэнам Леніна, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Літ.: Книга Героев Гродненской области / сост. Ю.М. Алексей, О.М. Якубович. – Гродно: ГОУПП "Гродн. тип.", 2004. – С. 93.

Абрамовіч Зыгмунт (1892–1938) – сябра і сакратар управы гродзенскага гуртка беларускай моладзі, унук Францішка Багушэвіча. Таленавіты акцёр, арганізатар сцэнічных спектакляў гуртка, кіраўнік спектакляў-вечарын. Пазней стаў адным з вядучых акцёраў Першай беларускай трупы Ігната Буйніцкага. Напісаў пра яе ўспаміны.

Літ.: З успамінаў Баляслава Грабінскага (1899–1991) (падрыхтоўка да друку А. Смаленчука) // Горад святога Губерта: зборнік краязнаўчых артыкулаў. Выпуск 6 (2012). – Горадня: б.в., 2012. – С. 113, 115, 124

Абрамовіч Эміль Абрамавіч (ліпень 1864, Гродна – 4.04.1922, Гродна) – адзін з першых прапагандыстаў марксізму на Беларусі. У 1822 скончыў Гродзенскую гімназію. Вучыўся на медыцынскіх факультэтах Парыжскага (1884) і Дэрпцкага універсітэтаў (1888), дзе і пазнаёміўся з творамі Маркса і Энгельса. У 1884 арганізаваў гурток друкарскіх рабочых у Мінску і распрацаваў трохгадовую праграму заняткаў, для якіх падрыхтаваў кароткія нататкі – своеасаблівы падручнік. У 1886–1887 вёў прапаганду ў Вільні, у 1889 стварыў адзін з першых сацыял-дэмакратычных гурткоў у Кіеве. Пасля арышту сядзеў у Кіеве (1889–1892). У 1892 высланы ў Сібір, дзе працаваў урачом. У 1896 вярнуўся ў Мінск, дзе жылі бацькі, але ненадоўга, бо прыняў запрашэнне на працу на Ленскія залатыя выкапні. У 1905–1907 жыў у Саратаве і слыў актыўным сацыял-дэмакратам. У 1912 сасланы ў Табольскую губернію. У 1914–1915 служыў урачом у арміі. Заслужыў Георгіеўскія крыжы. З 1917 г. жыў і працаваў у Саратаве. Дадому змог вярнуцца толькі ў 1922 і хутка памёр.

Літ.: Ермоленко В. А., Черепица В. Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 340.

Абрэмскі Людамір (Любамір) Паўлавіч (1823, м. Дзярэчын Слонімскага ўезда – 1894, Гродна) – паўстанец 1863 г. Маці Францішка з Багушэвічаў, скончыў Свіслацкую гімназію. Працу пачаў у кастрычніку 1840 у гродзенскай гарадавой паліцыі. З красавіка 1841 пераведзены ў Гродзенскую палату дзяржаўных маёмасцяў. Заслужыў знак "15 гадоў бездакорнай службы", тытулярны дарадца. Жанаты, меў 2 сыноў і 1 дачку. Быў касірам рэвалюцыйнай арганізацыі Гродзенскага ваяводства з чэрвеня па кастрычнік 1863 г. (пасля Багаткі). Прызнаўся ў гэтым перад следчай камісіяй: на кватэры ў Мілеўскага ў чэрвені 1863 знаходзіліся акрамя названых Э. Заблоцкі і В.-К. Каліноўскі, які менавіта і настойваў на прызначэнні А. касірам, як чалавека сумленнага. А. згадзіўся з умоваю, што будзе кантактаваць толькі з Заблоцкім і толькі весці разлікі. За ўвесь час праз яго рукі прайшло звыш 10 тыс. руб. Быў арыштаваны 12 лістапада 1863 падчас вобыску ў палаце дзяржаўных маёмасцяў, калі знайшлі рэчы і паперы "возмутительного содержания". Сядзеў у гродзенскай турме. Прыгавораны да катаржных прац у капальнях на 5 гадоў (спачатку да 8, было "мнение" расстраляць). Рашэннем гродзенскага губернскага праўлення ад 13.12.1864 маёмасць падлягала канфіскацыі. "По признанию неспособным к ношению оков 15 апреля 1866 г. заключён в Тобольскую тюрьму, откуда сослан в Восточную Сибирь". З 9.08.1876 жыў у Ядрыне Казанскай губ. на забеспячэнні казны. 18.01.1879 выехаў на жыхарства ў Гродна.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 12 адв.; ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10, 47 адв., 113, 117; с. 1, а. 49, 72–74, 547 адв., 553 адв., 566; с. 4, а. 21; Электронны рэсурс: narod.ru/864/Ssilka-kazan.html. Дата доступу: 20.01.2013; Паўлаў В. Удзельнікі паўстання 1863 г. у ссылцы ў Казанскай губерні // ARCHE. – 2010. – 12. – С. 248; Швед В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня) / Вячаслаў Швед. – Мінск: Альфа-кніга, 2017. – С. 13–14.

Аб'яднанне Рускае Народнае – суполка заснаваная ў 1926 г. Цэнтр знаходзіўся ў Варшаве, а ў Гродне была акруга на чале з упаўнаважанымі А. А. Байрашэўскім і Г. А. Дулевічам (пазней А. Навумюк). Мэты былі не толькі культурна-асветніцкія, але і палітычныя: "абарона правоў рускай меншасці ў Польшчы, адстойванне іх культуры і адукацыі перад урадам, удзел у выбарах дэпутатаў гарадскіх дум і дзяржаўнага сейма на аснове канстытуцыі рэспублікі". Большасць сябраў Аб'яднання было і сябрамі *Таварыства дабрачыннага рускага*. Выдаваліся газеты: "Рускі голас" (у Львове) і "Іскра" (з 1936 "Новая Іскра" у Вільні). Адной з задач было адкрыццё рускай школы, але зрабіць гэтага не ўдалося – згоду атрымалі толькі на курсы рускай мовы пры бібліятэцы. Адмоўна скончылася і барацьба за рускую мову ў выкладанні Закона Божага ў школах. Больш таго – з 1938 польскія ўлады патрабавалі ад праваслаўных святароў весці службу па-польску, а ў 1939 забаранілі рускія грамадскія аб'яднанні.

Літ.: Черепица В. Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней). Ч. 1. – Гродно: ГрГУ, 1999. – С. 179–181.

Авіяцыя вайсковая. Паветраны флот з'явіўся ў Гродне ў канцы 1911 г., калі на вул. Ерусалімскай была размешчаная 5-я Гродзенская паветраплавальная рота (пазней Гродзенская крапасная паветраплавальная). Камандзірам яе быў палкоўнік А. М. Нікіцюкаў, а старэйшым афіцэрам – штабс-капітан А. А. Ваньковіч. Рота мела на ўзбраенні аэрастаты і аэрапланы, якія базаваліся на аэрадроме ля в. Караліно (авіяатрад з'явіўся ў 1912). У авіяатрадзе было 6 двухмясцовых французскіх аэрапланаў тыпу "Фарман", у 1915 дадаўся самалёт "Лебедзь-VII". Адным з вядомых гродзенскіх авіятараў быў *Касценьчык А. М.*

Літ.: Саяпін В., История общественного транспорта Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 167–181.

Авіяцыя грамадзянская нарадзілася ў канцы 1920-х гадоў. 24.06.1928 у *Румлёва* адбылося ганаровае адкрыццё аэрадрома "Гродна", які выконваў прамежкавую ролю на лініі Варшава – Ліда. У верасні 1930 пачаў працу новы аэрадром ля в. Караліно. З 1938 ён дзейнічаў як адкрыты грамадзянскі аэрадром катэгорыі "С". Пасля *вайны Другой сусветнай* было сфармаванае падраздзяленне грамадзянскай авіяцыі. У жніўні 1945 начальнікам аэрапорта прызначылі П. Д. Трашкова, і хутка з'явілася першае звяно самалётаў По–2 пад кіраўніцтвам У. П. Дзянісава. Яно выконвала функцыі санітарнай авіяцыі і ажыццяўляла паштова-пасажырскія рэйсы. Апошнія пачаліся 6.09.1946 палётам самалёта Лі–2 па маршруце Мінск – Гродна – Мінск (пілот У. Д. Бугроў). У 1959 у гэтым напрамку сталі лятаць самалёты Ан–2. Яны рабілі пасадкі ў Навагрудку і Казлоўшчыне. 20.03.1962 пачаліся рэгулярныя рэйсы па маршруце Масква – Гродна – Масква самалётам Іл–14. У гэты час стаў працаваць і новы аэравакзал на былым вайсковым аэрадроме ля в. Караліно. У студзені 1963 на базе авіязвяна і аэрапорта было створанае Гродзенскае прадпрыемства грамадзянскай авіяцыі (70-я асобная авіяэскадрылля) пад кіраўніцтвам К. І. Лобача. 27.06.1967 Гродзенскі аэрапорт упершыню сустракаў Ан–24, турбавінтавы самалёт. З мая 1974 з Гродна самалёты Ан–24 ляталі ў Варонеж, Куйбышаў, Валгаград праз Гомель; з чэрвеня аднавіўся рух па маршруце Гродна – Кіеў – Сімферопаль. У 1979 у Абухава пачалося будаўніцтва новага аэрапорта з пасадачна-узлётнай паласой, разлічанай на самалёты тыпу Ту–134, Ту–124, Як–40. У ліпені 1984 адбыўся першы пасажырскі рэйс па маршруце Гродна – Масква – Гродна. У 1986 з'явіўся прамы пералёт Гродна – Кіеў, а ў наступным пачаў працу маршрут Сочы – Адэса – Гродна. Добра працавалі Ан–2 на мясцовых лініях: на Брэст, Пінск, Смаргонь. З 1992 самалёты пачалі лятаць у Харкаў, Растоў-на-Доне, Мінеральныя воды, Сімферопаль, Алма-Ату, Санкт-Пецярбург, Архангельск і інш. гарады. 13.05.1993 рашэннем СМ РБ аэрапорту быў нададзены міжнародны статус.

Літ.: Саяпін В., История общественного транспорта Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 182–209.

Агаф'я Уладзіміраўна (канец XI ст. ? – другая палова XII ст. ?) – дачка вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Усеваладавіча Манамаха і англійскай прынцэсы Гіты, унучка англійскага караля Гаральда, праўнучка Яраслава Мудрага і візантыйскага імператара Канстанціна Манамаха, прапраўнучка Уладзіміра Святога і Рагнеды Полацкай. А. Назаранка сцвярджае іншае: А. – дачка трэцяй жонкі Манамаха, палавецкай князёўны невядомага імя. Была жонкай гарадзенскага князя *Усевалада Давыдавіча* (1116 г.), мела з ім трох сыноў (*Барыса, Глеба і Мсціслава*) і двух дачок. Апошнія былі замужам адна за Уладзімірам Давыдавічам, князем дарагічынскім (ці чарнігаўскім?, яна збегла ў стэп і пабралася шлюбам з палавецкім ханам Башкордам); другая – за Юрыем Яраславічам, князем тураўскім, пінскім у 1140–1160 гг. (яго ўнукам быў наваградскі князь Ізяслаў).

Літ.: Госцеў А.П. Дата заснавання Гродна як гісторыка-краязнаўчая праблема. // Гродна – 875: Матэрыялы абласной канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў. – Гродна: ГрДУ, 2004. – С. 3–5; Госцеў А.П., Швед В.В. Шлюб князя-ізгоя, або як пачынаўся Горадзен // Гродзенская праўда. – 1991.- 1 лістапада. – С. 3; А. Кібінь. Ад Ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурныя трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – № 5. – С. 134, 174; Назаренко А.В. Городенское княжество и городенские князья в XII в. / А.В. Назаренко // Древнейшие государства Восточной Европы. 1998 г. / отв. ред. Т.М. Калинина. – М., 2000. – С. 181.

Агінскія – адзін з найбольш заможных магнацкіх родаў, які меў зямельныя валоданні ў *Горадні*. У 1664 г. участак на вул. Віленскай, ля шпіталя Св. Духа набыў ваўкавыскі маршалак Мікалай Францішак А. Пасля гэтай сядзібай валодаў ягоны сын віленскі канонік Людвік Караль А., а затым яго брат, радашковіцкі староста Антоні А. Наступным уласнікам быў троцкі ваявода Казімір Дамінік А., а ад яго ў 1728 пляц перайшоў да Міхала Юзафа Масальскага (гл. *Масальскія*), жонкай якога была Францішка з Агінскіх. Яе дзед мсціслаўскі ваявода Ян Яцак А. у 1670–80 гадах валодаў пляцам з камяніцай на *Рынку*, пасэсіяй на вул. Маставой, каля *Нёмана.* У 1 пал. XVIII ст. уладальнікам нерухомасці Яна Яцака А. стаў ягоны ўнук і сын Казіміра Дамініка А., троцкі ваявода Юзаф А. Яму належалі яшчэ 2 пляцы на Падольнай вул. Пасля яго смерці ў 1736 валоданні сталі належаць сыну, літоўскаму польнаму пісару, будучаму вялікаму літоўскаму гетману Міхалу Казіміру А. Палац на правым баку Дзям'янаўскай вул. у 1792 належаў Міхалу Клеафасу А. Забудаваны пляц на правым, з горада ідучы, баку вул. Рэзніцкай падараваў у 1764 стрыечнай сястры Ядвізе і яе мужу, прывальскаму старасце Тадэвушу Францішку А. кракаўскі біскуп Е. С. Залускі. Ягонаму сыну літоўскаму маршалку Андрэю Ігнацыю А. у 1754 прадаў сваю сядзібу на вуліцы "Другой з вуліцы Дзям'янаўскай" прымас А. Камароўскі. У другой палове XVIII ст. уладанні Міхала Казіміра А. складаліся з пляцаў на гарадзенскім *Занямонні*: на паўднёвым і ўсходнім баках *Рынку*, на вул. Лабенскай і Горніцкай (у 1790 адпаведна 25 і 14 пляцаў).

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2008. – С. 220–221; Obiasnienie interesu Miasta Sejmowego J.K.Mci Grodna. – Grodno, 1789. – S. 22–24, 27–28.

Агурскі Самуіл Хаімавіч (1884, Гродна – 1947, Паўладарская вобл.) – удзельнік рэвалюцыйнага руху, гісторык-марксіст. Пасля рэвалюцыйных падзей 1905 г. эміграваў спачатку ў Англію, потым у ЗША. Калі адбылася Лютаўская рэвалюцыя 1917 года, вярнуўся ў Расію і ўдзельнічаў у падзеях кастрычніка 1917-га і ў грамадзянскай вайне. З 1921 у Мінску, дзе паступова займаў кіроўныя пасады: у Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК кампартыі Беларусі (1924–1934), дырэктар Інстытута яўрэйскай пралетарскай культуры (з 1934), нам. дырэктара Інстытута нацыянальных меншасцяў у Беларускай акадэміі навук. У 1938 арыштаваны і асланы ў Паўладарскую вобл. Рэабілітаваны ў 1956. Аўтар шэрагу прац па гісторыі рэвалюцыйнага руху ў Беларусі і ўдзелу ў ім Бунда.

Літ.: Ермоленко В.А., Черепица В.Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 340.

Адамовічы – прадстаўнікі мяшчанскай эліты ўлады Гродна. Станіслаў і Міска – уладальнікі пляцаў на заходнім баку *Рынку*, што сведчыць пра іх заможнасць. Станіслаў быў бурмістрам (1690). Ян быў лаўнікам (1642), райцам (1660–65), бурмістрам (160, 1653–57, 1659–61). Валодаў разам з жонкай Агнешкай адным з названых вышэй пляцаў на Рынку, які ў 1663 прадалі злотніку Г. Варланду.

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 350–352; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у 1743–1767 гг.// Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – с. 65–66; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у XVIII с. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. // Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 107–110.

Адамовіч Ян Юзэфавіч/Восіпавіч (1804–1870) – уладальнік *аптэкі фарнай* у 1836–1870 гг. Вучыўся ў Віленскім універсітэце. У 1837 правёў даследаванне лекавых якасцяў друскеніцкіх мінеральных водаў. Аказваў дабрачынную дапамогу лекамі бедным гродзенцам і шпіталям. Быў актыўным сябрам рады евангеліцка-лютэранскай грамады, падтрымоўваў матэрыяльна яе дабрачынныя мерапрыемствы. Пасля смерці дзве аптэкі А. перайшлі ў маёмасць лютэранаў і быў створаны фонд для навучання 10 найбяднейшых дзяцей лютэранаў. А. узнагароджаны ордэнам св. Станіслава. У 1888 г. была зацверджаная стыпендыя імя Адамовіча для 3 вучняў гродзенскай гімназіі.

Літ.: Игнатович Ф.И. Провизор И.О. Адамович, его профессиональная и благотворительная деятельность в Гродно / Ф.И. Игнатович // Журнал Гродненского государственного медицинского университета. –2010. – № 1. – С. 108–110; Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017. – С. 163; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część I. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 78–79

Адамчык Яўген – гродзенскі футбаліст, “кароль бамбардзіраў” у 1930-я гады. У сезоне 1931/1932 быў нападаючым “Вайскова-спартовага клуба 76 пях. палка”, а з 1934 – “ВСК Гродна”. Восем разоў разам з камандай быў чэмпіёнам акругі. У чэрвені 1939 гуляў у складзе зборнай каманды Гродна ў таварыскім матчы супраць чэмпіёна Літвы каманды “ЛСГФ” і забіў 2 галы.

Літ.: Саяпин В. Гродненский спорт: история и достижения. 1919–1939 годы. Гродно: ЮрСаПринт, 2015. – С. 174.

Адляніцкі-Пачобут Фелікс Дыянісі Дамінікавіч – гродзенскі фотамайстар. Падаў прашэнне аб адкрыцці фотамайстэрні 8.06.1902. Яна знаходзілася на вул. Саборнай (Савецкай). Вядомая да 1911 г.

Адольская М. – балерына *балета Тызенгаўза*. У верасні і кастрычніку 1778 г. выступала ў пастаноўцы “Шлюб самнітаў”.

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. T. II. – Lwów, 1925. – S. 333.

“Адрес-календарь служащих в Гродненской губернии лиц гражданского, военного и духовного ведомств”, выдаваўся ў Гродне пры губернскім праўленні ў 1867–68, 1870–78 гг. Відаць, выходзіў замест “*Памятной книжки Гродненской губернии”,* якой у гэтыя гады не было.

“Адрес-календарь и статистическо-справочные сведения” друкаваўся ў Гродне паводле распараджэння губернскага праўлення ў губернскай *друкарні* ў 1879–1889, 1896, 1901–1915 гг. Там змяшчаліся матэрыялы пра органы кіравання ў губерні і асобаў, якія займалі ў іх пасады (указвалася прозвішча, адукацыя, чын, месца службы, з якога года на службе і ў дадзенай пасадзе, узнагароды), статыстычныя і даведкавыя дадзеныя па гарадской эканоміцы, культурнаму, рэлігійнаму і палітычнаму жыццю горада і губерні. У асобных нумарах змяшчаліся артыкулы. Так у зборніку за 1887 апублікаваны артыкул П. Дзікава “Матэрыялы для гісторыі Каложскай царквы ў г. Гродне”, у зборніку за 1896 знаходзім “Звесткі пра стан Гродзенскай губерні за 1894 г.”.

Адэльгаўзер (Adelhauser) Ганс/Ёган – нямецкі мастак. У другой палове XVI ст. быў у ВКЛ паводле запрашэння вялікага князя літоўскага Жыгімонта Аўгуста. У ліпені 1567 г. зрабіў з натуры малюнак “Сапраўднае адлюстраванне Горадні ў Літве” (у левай частцы ёсць аўтограф мастака каралю польскаму). На аснове малюнка М. Цюнт зрабіў гравюру (гл. *гравюра Адэльгаўзера-Цюнта*). Іншыя працы А. не вядомыя.

Літ.: Сліж Н. Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2. – С. 10; Швед В.В., Госцеў А.П., Дабрыян А.А. Горадзен. – Гродна, 1996. – С. 49–55.

Ажароўскі Адам Пятровіч (1776, Варшава – 1855, Варшава) – граф, генерал ад кавалерыі (1826). На чале партызанскага вайсковага атрада 19.12.1812

падышоў да Гродна і ўступіў у перамовы з аўстрыйскім генералам Фрэйліхам. Паходзіў са старажытнага польскага дваранскага роду (XV ст.). Бацька – вялікі каронны гетман, быў павешаны паўстанцамі ў 1794. Павел І падараваў удаве і дзецям тысячу душ сялян у Гродзенскай губ. і звярнуў асаблівую ўвагу на А. З 17.07.1796 ён карнэт лейб-гвардыі Коннага палка, паручнік (1800), штаб-ротмістр, ротмістр (1801), палкоўнік (1802). Удзельнік антыфранцузскіх кампаніяў 1805–1807 гг., узнагароджаны ордэнамі Св. Георгія 3-й і 4-й ступеняў. З 1807 – генерал-ад'ютант Яго Імператарскай Вялікасці. Удзельнік *вайны 1812 г.* і замежных паходаў 1813–1814, узнагароджаны залатой шпагай "За храбрость", ордэнамі Св. Ганны 1-й ступені і Аляксандра Неўскага. З лютага па снежань 1827 – камандзір Літоўскага асобнага корпуса. З канца 1827 па 1833 знаходзіўся ў адстаўцы. З 1833 – сябра Дзяржаўнай рады Каралеўства Польскага, з 1841 – сенатар Варшаўскага дэпартамента Кіроўнага Сената.

Літ.: Обезьянинов-Огнин Т. Ожаровский А.П. // Русский биографический словарь. – СПб., 1905. – С. 175–176; Швед В., Данскіх С. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады / В. Швед, С. Данскіх. – Гр.: ГрДУ імя Я. Купалы, 2006. – С. 170–172.

Ажэшка (Арэшка) Калікст Мікалаевіч – гродзенскі губернскі прадвадзіцель дваранства (маршалак), які ўдзельнічаў у губернскім камітэце па распрацоўцы рэформы адмены прыгонніцтва ў 1861 г. Прысутнічаў як дэпутат камітэта на паседжаннях Галоўнага камітэта ў Пецярбургу (1860). Ягоная маці жыла з другім сынам у м. Туржыск Ковельскага ў. і ў 1861 прымала ўдзел у набажэнствах па забітых у Варшаве, збірала грошы для іх сем'яў. У красавіку прыязджала ў Гродна. У доме маршалка А. адбылася вячэра перад шлюбам яго сваяка з *Ажэшкай Э.*

Ажэшка Эліза Бенедыктаўна (1841, Мількаўшчына, Гродзенскі ў. – 1910, Гродна) – пісьменніца і грамадскі дзеяч, ганаровая грамадзянка Гродна (1906). Як напісала прафесар С. П. Мусіенка, яна была "тутэйшай і адной для ўсіх". Упершыню ў Гродне была ў 1849 г., потым летам 1857 жыла ў маёнтку маці *Румлёва* і бывала ў Гродне, напрыклад, у доме Камілі Гласка на вуліцы Брыгіцкай (цяпер К. Маркса). У гродзенскім *бернардзінскім касцёле* (ксёндз *Гінтаўт*) 21 студзеня 1858 адбыўся шлюб Элізы з ліцвінам (беларусам) Пятром Ажэшкам. Пражыўшы з ім у маёнтку Людвінава ў Кобрынскім у. Гродзенскай губ., вярнулася ў 1864 у Мількаўшчыну, а з 1869 пасялілася ў Гродне (які называла Ongrodem/Ангродам) і пражыла тут больш за 40 гадоў. Вядомыя наступныя адрасы (адпаведна храналогіі): дом Гладкіх па вул. Брыгіцкай/К. Маркса (з восені 1857); дом Палуты па вул. Брыгіцкай (1879); дом Разэнбаўма пры Сянным завулку (за гатэлем "Нёман", вул. Татарская/Свярдлова, да 1885, калі згарэў у *пажары)*; дом Шлегеля (пазней Волка і А. Якоўскай-Волкавай) на рагу вул. Палявой/Карбышава і Пясочнай (1885–1895); дом Хамрата на вул. Рыдза-Сміглага 18/Васілька; дом Нагорскага па вул. Садовай/Ажэшкі

С. 819

С. 820

(1895–1910, гл. *дом Ажэшкі*). Пасля забойства ў Варшаве 5 дэманстрантаў (27.02.1861) А. заклікала сябраў *сходу дэпутацкага* ісці ў касцёл на жалобную малітву. Падчас паўстання 1863–64 была звязаная з атрадам Р. Траўгута, які дзейнічаў на тэрыторыі Гродзенскай губ.: дастаўляла харчаванне, лекі, пошту, перадавала звесткі пра дзеянні царскіх войскаў, шыла канфедэраткі і кашулі. У ліпені 1863 спачатку хавала, а потым перавезла ў сваёй карэце Р. Траўгута ў Каралеўства Польскае. Гэтаму эпізоду прысвечаная навэла Ажэшкі "Ён". Праславіла паўстанцаў у сваім зборніку навэлаў "Gloria victis" (1863), у рамане "Над Нёманам". 1 лістапада 1894 у *касцёле Святога Францішка Ксаверыя* адбыўся шлюб Ажэшкі з адвакатам Станіславам Нагорскім. Пасля вяселля ў 1895–1910 гг. Ажэшка жыла ў яго доме па вул. Садовай/Мураўёўскай (цяпер вул. Ажэшкі). Квірына Гандке напісала: "Гродзенскі дом Э. Ажэшкі быў месцам яе прымусовага адасаблення, якое паводле загаду царскіх уладаў працягвалася доўгія гады. Вартыя здзіўлення былі ўмовы, у якіх яна ажыццяўляла гэтыя ўсялякія і рознабаковыя дзеянні юрыдычнага, эканамічнага, палітычнага, культурнага, грамадскага, асветнага, нарэшце адміністрацыйнага і публіцыстычнага характару – галоўным чынам шляхам карэспандэнцыі і пры сціплай дапамозе адной, двух, найбольш трох знаёмых паняў і паненак, якія часова гасцявалі ў доме Э. Ажэшкі". У гэтым доме Ажэшка праводзіла патаемныя курсы. У лісце да Т. Т. Ежа ў 1882 яна пісала: "(…) была бы вельмі шчаслівай, калі б магла ў сваім доме ў Гродне збіраць тры ці чатыры [разы] на тыдзень паненак і маладых жанчын, і па некалькі гадзін распавядаць ім тое, што ведаю і думаю. Вучылася, вучуся далей і, здаецца мне, што для маладога пакалення, асабліва жанчын, якія-небудзь лекцыі, з вобласці сацыяльных здольнасцяў і сацыяльных рэчаў, мной прачытаных, не былі бы, магчыма, пазбаўленыя значнай карысці". Курсы, якімі кіравала Ажэшка, праводзіліся і ў іншых месцах – на дахах, у падвалах і закамарах дамоў у групах з 4, 6, 10 чал. У сваім доме, на паддашку, трымала польскую патаемную бібліятэку, якая стала дзейнічаць у студзені 1901 г. З 1904 у *доме Ажэшкі Э.* праводзіліся літаратурныя і артыстычныя вечарыны, на якія збіралася мясцовая інтэлігенцыя. На некалькі галасоў чыталіся літаратурныя творы. Ажэшка падрыхтоўвала чытачоў-дэкламатараў, тлумачыла ў працэсе незразумелыя месцы, удзельнічала ў дыскусіі. Выступалі тут каля 1904 г. дэкламатар Юзаф Катарбінскі, у 1905 – артыстка Ванда Сямашка, выкладалі ў 1908 мастак Генрык Нусбаўм, Габрыэль Талвінскі. Гралі піяністы Зоф'я (з Кулікоўскіх) Дамброўская і Юзаф Слівінскі (1895).

У вольны ад літаратуры час А. любіла збіраць у гродзенскім навакольным прыродным асяроддзі розныя расліны, а пазней выразала з іх гербарыі ці кветкавыя альбомы. З апошніх нам вядомыя 5: адзін захоўваецца ў Нацыянальным Музеі ў Варшаве; другі – у бібліятэцы Асалінэўм у Вроцлаве; трэці быў падараваны прадпрымальніку і філантропу Г. Вавельбергу; чацвёрты быў прададзены ў Лодзі з мэтаю сабраць грошы для касы бедных у Гродне; пяты падараваны А. ксяндзу Ю. Катарбінскаму і цяпер знаходзіцца ў Музеі пры санктуарыі ў Ліхэні (Польшча). У Гродне альбом ёсць у *дзяржаўным*

гісторыка-археалагічным музеі, 8 асобных лістоў з раслiннымі кампазіцыямі знаходзяцца ў музеі-аптэцы, адзін "раслінны" абраз – у *музеі Ажэшкі Э.*

У 1905 г. Ажэшка была намінаваная на літаратурную прэмію Нобеля разам з Л. Талстым і Г. Сянкевічам (які яе і атрымаў). У сакавіку 1905 у доме Ажэшкі адбылося веча польскай інтэлігенцыі, на якім быў складзены тэкст петыцыі, у якім гаварылася пра стварэнне польскай школы (яна паўстала ў 1906). У 1906 г. А. атрымала львоўскую ўзнагароду імя А. Кохмана.

Пахаваная на гродзенскіх каталіцкіх могілках. На пахаванне прыйшло каля 15. тыс. чал. У езуіцкім касцёле казанне гаварыў ксёндз С. Мілкоўскі, сябар і спаведнік Ажэшкі. Рашэннем *рады гарадской* ад 7.05.1928 на помнік было асігнавана 15 тыс. злотых. Ён паўстаў у *парку гарадскім*, недалёка ад дома, дзе жыла пісьменніца (скульптары Р. Зэрых і В. Куявінскі). Адкрыццё адбылося 20.10.1929 г. У гады *вайны Вялікай Айчынай* яго хавалі на каталіцкіх могілках, а ў 1949 усталявалі ў гарадскім парку. На паседжанні гарадской рады 13.12.1928 радны С. Земак прапанаваў ад імя Кола працы гаспадарчай усталяваць літаратурную прэмію імя А. Рада ўхваліла прапанову: 1 раз на 2 гады ўзнагарода будзе выплочвацца ў памеры 8 тыс. злотых; упершыню гэта адбудзецца 18.05.1930, у 20-годдзе смерці А. Было вырашана да 1.05.1929 выпрацаваць Статут узнагароды з вызначэннем твора і яго характара.

Даследчык Гродна Ф. Акерман піша, што Ажэшка трапіла на "службу савецкай ідэалогіі" дзякуючы сваім дэмакратычным творам на рэгіянальную тэматыку і пра мясцовых людзей. Паводле рашэння КП(б)Б ужо ў 1944 трэба было аднавіць дом Ажэшкі, як яе музей. Выстава пра яе творчасць была зробленая толькі ў 1967. Але дом, які цяпер называюць домам Ажэшкі, быў пабудаваны з вялікіх сілікатных блокаў у 1970 г. і перанесены ўглыб вуліцы. Большую частку памяшканняў займае філіял абласной бібліятэкі імя Я. Карскага. Два пакоі і зал на першым паверсе прысвечаныя экспазіцыям жыцця і дзейнасці Ажэшкі. На доме Ажэшкі знаходзіцца мемарыяльная дошка.

Крын. і літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 399–404; Вашкевіч А. Гарадзенкі. Жаночы след у гісторыі Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 29–33; Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці, ф. 46. воп. 1, с. 4, а. 38, 221 адв.; НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 6, с. 621; ф. 2, воп. 38, с. 689, а. 6; Гродно. Энциклопедический справочник. – Мн.: БелСэ, 1989. – С. 297–298; Швед В. Гарадзенскія памятныя месцы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Элізы Ажэшкі // Acta Albaruthenica. – 2018. – № 18. – с. 333–343; Jankowski E. Eliza Orzeszkowa. – Warszawa 1988. – S. 68; Jońca M. "Pozór malowidła"/ Wokół albumu florystycznego Elizy Orzeszkowej // Albumy kwiatowe Elizy Orzeszkowej. – Wrocław: Ossolineum, 2018. – S. 16–19; Handke K., Eliza Orzeszkowa jako kresowa instytucja narodowa i kulturalna // Bohatyrowicze sto lat później. – Warszawa: SOW, 1998. – S. 71; Kałuski M. Sprawy kresowe – bez cenzury. T. 3. – Toruń, Melbourne, 2018. – s. 635; A. Nowicka. Tajne A.B.C. Orzeszkowej // Nasza okolica. – 1939. – № 6 (18.03). – S. 5–6; E. Orzeszkowa, Listy zebrane, t. II, Wrocław 1955, s. 64, 65; t. IV, Wrocław 1958, s. 35, 201, 221, 303; t. V, Wrocław 1961,

s. 12–13; t. VI, Wrocław 1967, s. 158; E. Orzeszkowa, Dnie, opr. I. Wiśniewska, Warszawa 2001, s. 206; St. Poczobut-Odlanicki, Szlakiem Elizy Orzeszkowej i jej bohaterów wiek później z historycznym opisaniem świątyń i osad po drodze objazdu, Białystok 2007, s. 29–30; A. Romanowska, Pozytywizm na Litwie. Polskie życie kulturalne na ziemiach litewsko-białorusko-inflanckich w latach 1864–1904, Kraków 2003, s. 329.

Азгур Заір Ісакавіч (15.01.1908, в. Маўчаны Сенненскага раёна Віцебскай вобл. – 18.02.1995) – беларускі скульптар. Народны мастак Беларусі (1994), народны мастак СССР (1973). Сябра Акадэміі Мастацтва СССР (1958), Герой Сацыялістычнай Працы (1978). Вучыўся ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме (1922–25), Ленінградскім (1925–28) і Кіеўскім (1928–29) мастацкіх інстытутах. Працаваў у галіне станковай і манументальнай скульптуры, прыхільнік строгай рэалістычнай формы. Яго працы ў Гродне: помнік Я. Купале ў будынку *універсітэта Гродзенскага* (1964) і помнік У. Леніну (4.11.1987), на адкрыцці якога ён прысутнічаў. Стварыў серыю партрэтаў дзеячаў гісторыі і культуры. Аўтар публіцыстычных твораў па праблемах выяўленчага мастацтва і мемуараў (“Незабыўнае”, 1962; “Тое, што помніцца…”, кн. 1–2, 1977–83). Атрымаў дзяржаўную прэмію СССР у 1946 г. Дасканала валодаў беларускай мовай.

Акадэмія медычная гл. школа медычная

Акруговая лячэбніца (бальніца баніфратраў) знаходзілася на сённяшняй вул. Ажэшкі, дзе цяпер размешчанае аддзяленне сувязі № 23. Двухпавярховы будынак падараваў баніфратрам у 1808 г. расійскі цар Аляксандр I.

Літ.: Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 37–38.

“Акты издаваемые Виленскою археографической комиссией”, “Акты издаваемые Виленскою комиссией для разбора древних актов”. У т. 1 (Вільня, друкарня А. К. Кіркора, 1815) змешчаныя 99 актаў Гродзенскага земскага суда (1540–1795): у 1 раздзеле знаходзяцца акты, якія паказваюць “элемент праваслаўя ў Заходнім краі” – прывілеі *Жыгімонта Аўгуста, Боны Сфорцы, Аляксандра і Жыгімонта, Жыгімонта III царкве Барыса і Глеба на Каложы,* ёй жа даравальныя граматы мяшчан і шляхты; у 2 раздзеле змешчаныя акты, якія праясняюць адміністрацыю Вялікага Княства Літоўскага – шмат прывілеяў дадзеных вялікімі князямі і каралямі польскімі гродзенскай яўрэйскай суполцы (*кагалу*) за розныя гады (гл. *яўрэі*), у 3 раздзеле публікуюцца этнаграфічныя і юрыдычныя акты – цікавыя 4 дакументы за перыяд 02.1697–08.1697, прысвечаныя нападу падскарбіхі Францкевічавай і пінскага стольніка Ронікера на гродзенскі двор мітрапаліта Кіеўскага і Усёй Русі Леана Заленскага; у раздзеле 4 змешчаны “акт, замечательный по оригинальности события”, у якім гаворыцца пра справу аб затрыманні памешчыкам В. Лышчынскім мітры, якая належыць віленскаму епіскапу Мікалаю Пацу.

У т. 5 (Вільня, друкарня губернскага праўлення, 1871) апублікаваныя 218 актаў Брэсцкага і Гродзенскага гродскіх судоў (1577–1769) з далучэннем прывілеяў

на землеўладанне ў Брэсцкай і Кобрынскай эканоміях. Цікавымі з'яўляюцца дакументы пра *яўрэяў* Гродзенскага пав. і пра польскія землеўладанні.

У т. 7 (Вільня) знаходзяцца 165 актаў Гродзенскага гродскага суда (1510–1784). У 1 раздзеле – акты, якія тычацца гісторыі царквы (фундушовыя запісы цэрквам і духавенству): да Гродна адносяцца прывілей гарадзенскаму архімандрыту Я. Пяшкоўскаму 1644 і ліст Я. Арахоўскага да ігуменні гарадзенскага манастыра базыльянаў 1702 г. У 2 раздзеле змешчаныя *прывілеі* і рэскрыпты *Горадну* і іншым местам і асобам; рэкамендацыйны ліст караля Аўгуста II старасце Гарадзенскаму 1713, распараджэнне Аўгуста II аб вызваленні Горадна ад падаткаў і вайсковай павіннасці 1713, універсал Аўгуста III адносна збору маставога на р. *Нёман* у Горадні 1744, пастанова *сеймікa* Гарадзенскага пав. у Горадні 1714, пратэст Казіміра Морскага супраць цэлага акта Гарадзенскага *сейма* 1752; інструкцыі шляхты Гарадзенскага пав. паслам, выбраным на сейм, і акт гарадзенскай канфедэрацыі 1764; вопіс 1765 г. *маетак* Гарадзенскага пав. У раздзеле 3 (юрыдычныя акты) знаходзім скаргі Калажанскіх базыльянаў на захопы іх зямлі (у 1750, 1762, 1772), вызваленне Скарбовым трыбуналам Гродна ад гіберны ў 1712, скаргу гарадзенскага протаіерэя Ф. Грыневіча на напад на яго дом і разбой.

У т. 17 Акты Гарадзенскага земскага суда (1539–1565) і ў т. 21 (Вільня, друкарня А. Г. Сыркіна, 1894) Акты Гарадзенскага земскага суда (1555–1558) знаходзяцца аднатыпныя дакументы – судовыя запісы, якія даюць уяўленне пра побыт тагачаснага грамадства (шляхты, баяр, сялян, татар, яўрэяў), яго звычаі ў Горадні і ваколіцах.

Акцэс (Акт) аб далучэнні – 28 красавіка 1794 г. жыхары Гродна ў сувязі з акупацыяй горада рускімі войскамі аб'явілі у Саколцы аб далучэнні да паўстання пад кіраўніцтвам *А. Т. Касцюшкі*. 14–15 мая адбыўся працяг падпісання акцэса (акта) у Гродне (378 чалавек). 27.07.1812 жыхары Гродзенскага пав. склалі Акт аб далучэнні да Генеральнай канфедэрацыі.

Аладаў Вальмен Мікалаевіч (12.02.1930, Мінск – 2.11.2021, Мінск) – заслужаны архітэктар БССР (1969), кандыдат архітэктуры (1972), прафесар (1993). Сярод яго праектаў былі жылыя дамы на скрыжаванні пр. Леніна і вул. Казлова (1958), Камароўскі крыты рынак (1980) у Мінску (аўтар. калектыў); спорткомплекс "Раўбічы" (1974, з С. Неўмывакіным), універсам "Цэнтральны", афармленне выставаў дасягнення народнай гаспадаркі БССР у Лейпцыгу (1967), Плоўдзіве (1969), Мінску (1970), Маскве (1977) – усё з Л. Мельнікам, У. Ласковым, мастаком І. Масланам. З 2006 – старшыня Беларускага грамадскага аб'яднання архітэктараў і дзеячаў будаўнічых навук. У Гродне выступіў архітэктарам помніка Леніну на плошчы яго імя перад будынкам гарадскога выканаўчага камітэта. Узнагароджаны ордэнам "Знак пашаны", ордэнам Францыска Скарыны.

Літ.: Аладов Вальмен Николаевич // Кто есть Кто в Республике Беларусь. Архитекторы Беларуси. / Редакционный совет: И. В. Чекалов (пред.) и др. Минск: Энциклопедикс, 2014.

Александровічы – шляхецкі род, які валодаў зямельнымі надзеламі ў Горадні не пазней як з 1664 г., калі гарадзенскі земскі суддзя і войт Канстанцін А. набыў 2 пляцы на Падоле. У другой пал. XVII ст. значныя зямельныя валоданні належалі гарадзенскаму падкаморыю і войту Стэфану Яўстафію А.: на вул. Падольнай і Замкавай; комплекс пляцаў паміж паўночным бокам Рынку, Віленскай і Калюцінскай вул.; 3,5 пляцы купіў у 1684 г. На пачатку XVIII ст. гэтая маёмасць перайшла ў валоданне лідскага земскага пісара Міхала А., які да таго ж меў юрыдыку паміж Златарскай і Скаліманаўскай вул. Наступным спадкаемцам стаў у 2 палове XVIII ст. літоўскі канюшы Дамінік А. У 1789 у валоданні А. знаходзілася 13 пляцаў. У 1780–90 гадах А. калярынкавую пасэсію падзялілі на ўчасткі і прадалі. Лідскаму маршалку Францішку А. належалі пляцы на вул. Златарскай і Маставой. У канцы XVIII ст. пляцамі на вул. Віленскай і Падольскай/Падольнай валодалі: гарадзенскі стольнік Бенедыкт А., гарадзенскі земскі суддзя Тадэвуш А., падстароста Гарадзенскага пав. Геранім А. У канцы XVIII ст. гарадзенскі земскі суддзя і камісар гарадзенскай павятовай цывільна-вайсковай камісіі Тадэвуш А. набыў дворык у завулку, які злучаў Азёрскую вул. з Дзям'янаўскай.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2008. – С. 223–224; Карев Д. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Минск: Нац. Биб-ка Беларуси, 2018, – С. 23; Obiasnienie interesu Miasta Sejmowego J.K.Mci Grodna. – Grodno, 1789. – S. 28–30.

Алексій, свецкае імя **Грамадскі Аляксандр** (1.11.1882, Дакудава – 7.05.1943, Смыга, Ровенская вобл.) – архіепіскап Гродзенскі (1922–1934). З сям'і праваслаўнага псаломшчыка. Скончыў Холмскае духоўнае вучылішча (1898) і семінарыю (1904), Кіеўскую духоўную акадэмію са ступенню кандыдата багаслоўя (06.1908). Затым працаваў настаўнікам рэлігіі ў Холмскай мужчынскай гімназіі (1908–1917), Крамянецкай духоўнай семінарыі (1918–1921) і быў яе рэктарам (1921–1923). Рукапаложаны ў сан іерэя 30.07.1908, стаў протаіерэем у 1918, 11.02.1922 пастрыжаны ў манахі. Стаў спачатку архімандрытам і прыёрам манастыра ў Дэрмані, затым епіскапам Луцкім, вікарыем Валынскай епархіі (3.09.1922). Адтуль 12.10.1922 прызначаны часовым кіраўніком Гродзенскай епархіі. Епіскап (21.04.1923), пазней архіепіскап Гродзенскі і Навагрудскі (3.07.1928). З 29.03.1934 – архіепіскап Валынскі і Крамянецкі. Арыштоўваўся савецкай уладай, але пакараны не быў. У 1940 прыняты ў юрысдыкцыю Маскоўскага патрыярхата і пакінуты на сваёй пасадзе. З ліпеня 1941 – мітрапаліт, Экзарх аўтаномнай Украінскай Праваслаўнай Царквы. Забіты ўкраінскімі партызанамі альбо нямецкімі спецслужбамі.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПринт, 2015, с. 23–24.

Алеша – беларускі дваранскі род са Століншчыны герба "Алеш" (алень з залатой каронай на шыі). Алеша – гэта алянёнак. З гэтага роду паходзіў

вядомы савецкі пісьменнік Алеша Юры (аўтар знакамітых кніг “Три Толстяка”, “Зависть”, Ни дня без строчки”, “Книга прощания”), яго бацька Карл Антонавіч і маці Вольга Уладзіславаўна. Ці быў Юры ў Гродне, даследчыкі на сённяшні дзень не ведаюць. А вось бацькі яго тут жылі з 1922, калі прыехалі з Адэсы. У 1939 у іх кватэры пры гатэлі гасцявалі В. Катаев, У. Лідзін. Карл Антонавіч атрымаў права на валоданне і распараджэнне домам і *гатэлем* “Еўрапейскі” (цяпер тут стаіць універмаг). Быў ён азартным карцёжнікам, любіў выпіць, траціў грошы і прагуляў усё багацце, пакінуўшы жонку без сродкаў існавання. Памёр у жніўні 1944 ад раны, атрыманай пасля разрыва бомбы. Маці пісьменніка жыла ў двухпавярховым цагляным будынку па вул. Міцкевіча, 13а. Яго пакінулі ёй сябры, якія выехалі ў Амерыку. Пасля *вайны Другой сусветнай* у дом падсялілі іншых, а “пані Алешы” выдзелілі невялікі пакой з агульнай кухняй. Ёй было тады больш за 70 год і яе даглядала суседка, урач Рыта Сапір. У 1954, калі ў Вольгі Уладзіславаўны здарыўся інсульт, у Гродна на пэўны час прыехала жонка сына Вольга Суок. У 1960 яна забрала свякроў у Маскву, дзе тая і памерла праз два гады. Пахаваная на Новадзевічых могілках, побач з сынам. У Гродне ёсць вуліца імя Юрыя Алешы.

Літ.: Лидин В.Г. Люди и встречи. – М.: Советский писатель, 1961. – С. 115–117; Никитина Т. К. Моё время. Моя страна. Мой город, Очерки, эссе, интервью, зарисовки. – Гродно: ЮрСаПринт, 2017. – С. 217–230; Чернякевич А. “Новый свет” и его окрестности / А. Чернякевич при участии И. Трусова. – Минск: “Лимариус”, 2009. – С. 51–52.

Альшанка – раён горада, былая вёска. Назва вёскі нададзеная ад назвы дрэва альхі, альховага лесу, кустоў. Згодна з прывілеямі польскага караля і вялікага князя літоўскага ад 16.07.1502 і 4.12.1506 належала да грунтоў горада *Гродна*. У 1859 А. была скарбовай каралеўскай вёскай. Частка зямлі была падараваная гродзенскім *цэрквам Уваскрасенскай, Св. Мікалая, Св. Сімеона, Прачысценскай, Чэснакрэсценскай*. Згадваецца ў прывілеі караля Уладзіслава IV, дадзеным гродзенскай царкве Уваскрашэння Хрыста ад 20.05.1633: 4 валокі пры сёлах Альшанка і Канюхі былі падараваныя царкве ягонымі папярэднікамі в.к.л. *Аляксандрам* і *Стэфанам Баторыем*. Падчас *вайны Паўночнай* у 1706 г. вёска А., магчыма, была спаленая шведамі, пасля чаго жыхары сталі будавацца на захад ад старога месца жыхарства, у дзвюх вёсках. Частка зямлі ў Альшанцы ў 1712 належала шляхціцам, 10 валок – гродзенскім дамініканам і францішканцам. У 1784 вёска належала гораду Гродна і адносілася да Гродзенскай парафіі. Разам з Малой Альшанкай мела 44 валокі. У 1789 было 14 дымаў. У 1840 вёскай валодаў горад. Падчас *вайны Першай сусветнай* частка земляў вёскі была адчужаная на патрэбы *крэпасці Гродзенскай*. У 2007 дамоў было 35, агульная колькасць жыхароў – 93, няпоўнагадовых да 15 год – 20, працаздольнага ўзросту – 49, пенсіянераў – 24. Паводле ўказу Прэзідэнта Беларусі ў верасні 2011 г. вёска адыйшла да тэрыторыі Гродна.

Крын. і літ.: Акты Виленскай Археографической комиссии, Т. 1. Акты Гродненского земского суда, Вильна, 1865. – С. 60–61; Жучкевич. Краткий топономический словарь Белоруссии. – Минск, 1974, с. 269; Черепица В.Н. Город-крепость в годы Первой

мировой войны: мероприятия гражданских и военных властей по обеспечению обороноспособности. – Гродно, 2006. – С. 311; Швед В., Трусаў І. Да пытання гістарычнай геаграфіі даўняга Гарадзенскага павета (населенныя пункты, уключаныя ў склад Гродна) // Гарадзенскі гадавік. – 2013. – № 2. – С. 123–138; Яшкін І.Я. Слоўнік беларускіх мясцовых геграфічных тэрмінаў: Тапагрфія. Гідралогія. – Мінск, 2005. – 57; Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w X – XVIII wieku. – Supraśl, 2005, s. 259 281, 288, 302, 304; Rękopiśmienne opisy parafii litewskich z 1784 roku. Dekanat grodzieński, opr. W. Wernerowa. – Warszawa, 1994, s. 42.

Альшанскі Ігнацы (28.01.1883, Альшаніца, Бельскі павет – 16.09.1963, дзесьці ў СССР) – ксёндз, грамадскі дзеяч хрысціянскай дэмакратыі, пасол на Заканадаўчы сейм 1922 г. і пасол польскага сейма. З 1925 у партыі Хрысціянаскай дэмакратыі ўваходзіў у камісію па справах народных меншасцяў і займаўся пераважна беларускай праблематыкай. Ад 1922 да 1931 быў рэктарам касцёла св. Барталамея ў Вільні. З 1925 стаў сакратаром па грамадскіх справах генеральнай віленскай дыяцэзіі. У 1931–37 працаваў у Гродне як пробашч парафіі св. Францішка Ксаверыя і дэкан. У 1931 прымаў удзел у працах архідыяцэзіяльнага сінода. Быў выбраны сінадальным экзаменатарам. У 1937 асеў пры касцёле Св. Крыжа ў Вільні. У 1938 – пробашч у Лынтупах. Падчас другой сусветнай вайны дзейнічаў у АК на Віленшчыне.

Літ.: Polski słownik biograficzny. T. 24. – Wrocław, 1979. – S. 2.

Альшына-Вільчынскі Юзаф Канстанцін (27.11.1890, Кракаў – 22.09.1939, в. Калеты, Гродзенскі пав.) – кіраўнік III Вайсковага корпуса ў Гродне (1938–1939). Вучыўся ў Кракаве і Львове. Служыў у аўстрыйскай арміі, а падчас *вайны Першай сусветнай* – у Польскіх легіёнах (1914–1917). З 1918 у польскім войску. Удзельнік польска-украінскай і *вайны польска-савецкай*. У 1927 быў у чыне генерала брыгады. У Гродне займаўся грамадска-палітычнай працай: 1935–1937 – дырэктар Урадавага ўпраўлення фізічнага выхавання і вайсковай падрыхтоўкі. Быў сябрам гродзенскага аддзела *Таварыства польскага гістарычнага* (1935), ініцыятарам разбору *царквы Аляксандра Неўскага* (1938), электар у складзе ваяводскіх калегіумаў, якія выбіралі сенатараў (1938). З лютага 1938 стаў кіраўніком Акругі Корпуса № III у Гродне. У 1939, паводле загаду маршала Рыдза-Сміглага, узначаліў Самастойную аператыўную групу "Гродна" (існавала да 14.09.1939). Жыў на вул. Бернардзінскай, дом № 2. Меў багатую бібліятэку кніг па вайсковай тэматыцы і, выязджаючы з горада, пакінуў яе *Ліпінскай Г*. 17.09.1939 каардынаваў стварэнне на Гродзеншчыне канспіратыўных структур, а 18.09 выехаў з Гродна ў кірунку літоўскай мяжы. У школе м. Тэалін (1 км ад Сапоцкіна) арганізаваў штаб камандавання з мэтаю апекі польскіх войск, якія адыходзілі праз так званы "сапоцкінскі калідор". 22.09, рухаючыся да мяжы з Літвой, каля вёскі Калеты натрапіў на савецкіх танкістаў і быў расстраляны. На могілках Тэаліна (зараз у межах Сапоцкіна) знаходзіцца яго пахаванне. Згадваецца ў творы *Л. Саванеўскага* "Сага пра Гродна".

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 25–26; Bielski M. Relacja generałowej Alfredy Olszyny-Wilczyńskiej z wydarzeń wojennych z września 1939 r. na terenie dowództwa okręgu korpusu № III Grodno // Dzieje najnowsze. R. 23. – Wrocław. – 1991, №1. – S. 87–99; Bielski M. "Skazany na zapomnienie". Generał brygady Józef Konstanty Olszyna-Wilczyński // Głos znad Niemna. – 1994. – 12–18.09. – S. 4; Jaskulski W. Generał brygady Józef Konstanty Olszyna-Wilczyński (1890–1939). – Włocławek, 2013; Nowa encyklopedia powszechna PWN. T. 4 – W-wa: PWN, 1996. – s. 640; Porzecki J. Jak został zamordowany generał Olszyna-Wilczyński // Magazyn Polski – 1993. – N 1/2 (5/6). – S. 69–75; Sawoniewski L. Saga o Grodnie. – Łódź, Białystok, 1999. – 203 + XXXII s.

Аляксандр I (25.11.1777, Санкт-Пецярбург – 1.12.1825, Таганрог) – імператар Усерасійскі, вял. кн. фінляндскі, цар польскі. Быў у Гродне 21.06.1802 (прысутнічаў на адкрыцці Гродзенскай губ.) і 17.05.1812 (інспектаваў у горадзе войскі). Вось як апісваецца яго прыезд у 1802: павятовы маршалак Л. К. Панцажынскі сустрэў цара за горадам, у канцы вул. Скідзельскай, дзе сабраліся прадстаўнікі яўрэйскіх гмін на чале з рабінам (яны далі яму верш), мяшчане ў парадку цэхаў на чале з магістратам, усе расцягнуліся аж да *касцёла паезуіцкага*, дзе чакала духавенства. Тут а 18.30 Аляксандра I сустрэў генерал-губернатар Бенігсэн Л. Далей яны паехалі па вул. Дамініканскай, дзе каля кляштара стаялі студэнты і кідалі кветкі пад ногі коней. У доме Дзяконскага (гл. *Палац адміністратара*) на Гарадніцы для цара падрыхтавалі кватэру. Тут сустрэў яго губернатар Д. Р. Кошалеў і губернскі маршалак Нямцэвіч С. Ф. Імператар падзякаваў ім за апеку мясцовага дваранства над 12 сіротамі. Затым пайшлі ў залу, дзе мясцовая эліта была Бенігсэнам прадстаўленая Аляксандру I. Потым імператар пайшоў адпачыць, а вечарам быў у тэатры, дзе паказалі камедыю "Генрых Шосты на паляванні". Затым была вячэра ў прысутнасці Кошалева, Нямцэвіча, Панцажынскага, двух братоў Дзяконскіх.

Літ.: Dyaryusz przyjazdu i bawienia się Nayiaśnieyszego Imperatora w Grodnie.

Аляксандр II (29.04.1818, Масква – 13.03.1881, Санкт-Пецярбург) – імператар Усерасійскі, вял. кн. фінляндскі, цар польскі. Быў у Гродне ў 1870 г.

Аляксандр I Ягелончык (5.08.1461/па інш. звестках 5.10.1460, Кракаў – 20.08.1506, Вільня/па інш. звестках Гродна) – чацвёрты сын Казіміра IV і Эльжбеты Ракушанкі, унук Ягайлы. Вялікі князь літоўскі (28.07.1492 – 1506) і кароль польскі (3.10.1501 – 1506). У 1492–1494 і 1500–1503 гг. ваяваў з Вялікім Княствам Маскоўскім, аддаў яму паводле дамовы 1494 г. Вязьму і некоторыя гарады былога Смаленскага княства. Быў жанаты на дачцэ вялікага князя маскоўскага Івана III Алене. У 1496 надаў *Горадні магдэбургскае права*. У 1501 падпісаў Мельніцкі акт – пагадненне ВКЛ і Каралеўства Польскага, паводле якога правы ВКЛ абмяжоўваліся (Брэсцкі сейм ВКЛ 1505 гэты акт адхіліў). У Горадні правёў 508 дзён: 17.06.1493 (пры смерці бацькі); снежань 1493 – канец лютага 1494; 28.09–1.10.1494; з 18.09.1495 па сакавік

1496 (з выездамі на паляванне); 1497–1498 і 1505 (святкаванне Божага нараджэння); 30.01–30.03.1500; 11.1501; 11–12.1505; 03.1506. Пахаваны ў віленскай базыліцы, у капліцы Св. Казіміра.

Літ.: Бутэвіч А. Паміж Княствам і Каронай. – Мінск: Выдавецкі дом "Звязда", 2013. – С. 293–296; Госцеў А.П., Швед В.В. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990 гг.). – Гродна: ГАА БФК, 1993. – С. 19–20, 32–38, 122; Семянчук А. Каралеўскі і вялікакняжацкі побыт у Гародні ў канцы XIV – XVI ст. // Grodnae et orbi: гарадскія супольнасці і гарадское асяроддзе XIV – XX стст. / пад рэд. А. Радзюка і І. Галубовіча. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2018. – С. 6–21.

Аляксюк Аўгіння, Аляксючанка (1899, Гродна? – ?) – сястра П. Аляксюка. Сакратар Гродзенскай павятовай рады і клуба "Беларуская хатка". Сябра Гродзенскага беларускага нацыянальнага камітэта (БНК), бежанскага камітэта. Працавала ў Міністэрстве беларускіх спраў. Была рэдактарам гродзенскай беларускай газеты "Зорка" (1919). У Варшаве была сакратаром мясцовага БНК і кур'ерам урада БНР. На беластоцкім "працэсе 45-ці" у 1923 А. называлі кіраўніком беларускага падполля.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 26

Аляксюк Павел Паўлавіч, мянушка Паўлюк з Гродна (28.11.1892, Гродна – пасля 1931) – беларускі нацыянальны дзеяч, "бацька" беларускіх паланафілаў. Паходзіў з сям'і вайскоўца, магчыма, з Горадні ці Воўпы (ён называў іх "сваімі"). Скончыў юрфак Пецярбургскага універсітэта (1915), дзе стаў адным з арганізатараў Беларускага літаратурна-навуковага гуртка, пра працу якога пісаў у "Нашу Ніву". У 1909 стаў віцэ-старшынём Гродзенскага *гуртка беларускай моладзі*, але ў сярэдзіне 1910 пераехаў у Коўна. У 1915 быў адным з заснавальнікаў Цэнтральнага камітэту дапамогі ахвярам вайны, а напрыканцы 1916 быў ужо ў Мінску. У 1917 адзін з актыўных членаў Беларускай Сацыялістычнай Грамады. Сябра Вялікай беларускай рады і Цэнтральнай беларускай вайсковай рады (ЦБВР), удзельнічаў у абвяшчэнні БНР (1918). ЦВБР даручыла яму атрымаць грошы ў Кіеве (11 тыс. руб.). Да рады яны не дайшлі і А. быў выключаны з яе складу. А грошы, магчыма, трапілі да Беларускага народнага прадстаўніцтва на чале з Р. Скірмунтам. Разам з ім А. быў у складзе дэлегацыі, якая ў лютым 1918 сустракала ў Мінску нямецкія войскі, а ў маі ўвайшоў у Народны сакратарыят на чале са Скірмунтам. Яшчэ да пераезду ўрада БНР у Горадню А. са сваёй сястрой Аляксюк А. быў першым арганізатарам тут беларускіх мітынгаў. Хутка стаў сябрам мясцовай гродзенскай рады (1919), здолеў правесці пастанову, якая надавала беларускай мове роўныя правы з рускай, польскай і яўрэйскай. З сакавіка 1919 стаў рэдактарам-выдаўцом газеты "Беларусь" (орган Цэнтральнай беларускай рады Гарадзеншчыны). У маі 1919 А. разам з Тарашкевічам Б. мелі кантакт з польскай контрвыведкай і атрымалі 10 тыс. царскіх рублёў на правядзенне

беларускага з'езду прадстаўнікоў Віленшчыны і Гарадзеншчыны. Мэтай яго было "прыняцце агульных пастаноў у сэнсе неабходнасці уніі з Польшчай". Калі 22.10.1919 Пілсудскі Ю. падпісаў дэкрэт аб стварэнні беларускага войска, А. стаў афіцыйным прадстаўніком Беларускай вайсковай камісіі (да 11.09.1920). Восенню 1920 быў створаны Беларускі палітычны камітэт (існаваў да 02.1921), які фактычна стаў беларускім ўрадам пры штабе Булак-Балаховіча, якога А. называў "Правадыр Беларусі". Гэтая палітычная авантура ледзь не каштавала А. жыцця, бо 26 афіцэраў батальёна Дзямідава М. хацелі яго забіць. У сярэдзіне лета 1921 А. быў арыштаваны палякамі і вывезены ў Варшаву, адкуль выехаў у Беларусь 23.06. У верасні 1921 А. выступіў на Беларускай нацыянальна-палітычнай канферэнцыі, дзе выпрацоўваўся антыпольскі напрамак дзейнасці беларускага руху. Ён заклікаў "да цярплівай, доўгай працы над сваім духоўным і палітычным рэнесансам", а не да рэвалюцыйнага змагання беларускага народу, пра што гаварылі яго правадыры, казаў пра патрэбу абапірацца на дапамогу Польшчы. У снежні 1921 Аляксюк разам з паплечнікамі правялі віленскі з'езд "Краёвай сувязі" і сялянскай партыі "Сялібнікі" і стварылі Беларускі цэнтральны выбарчы камітэт на чале з А. На выбарах у Віленскі сейм Сярэдняй Літвы ён не правёў ніводнага дэпутата. Пацярпеўшы палітычнае банкруцтва А. на пачатку 1922 пераехаў у Навагрудак, дзе задумаў пашыраць беларускую справу на перыферыі. У 1920-я гады – адвакат у Навагрудку (быў адным з адвакатаў на працэсе Б. Рагулі). Меў маёнтак Татаршчына каля Воўпы. Часта ездзіў у Варшаву, Вільню, Мінск. У лютым 1929 узначаліў Навагрудскае ТБШ. Стаў радным у мясцовым магістраце. У кастрычніку 1931 газета "Беларускі звон" змясціла паведамленне, што А. падпаліў сваю маёмасць, папярэдне застрахаваную на 100 тыс. злотых, за што быў арыштаваны. Далейшы лёс яго невядомы.

Літ.: Пашкевіч А., Чарнякевіч А. "Бацька" беларускіх паланафілаў // Гістарычны альманах. – Гародня, 2010. Т. 16. – С. 37–58; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 23–24; Чарнякевіч А., Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гродне 1909–1939. Слоўнік біяграфічны. – Мінск, 2003. – С. 10–15; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 1. – Мінск: Бел Эн., 1991. – С. 112–113.

Анатаміраванне Стэфана Баторыя адбылося з дазволу *сейма* Рэчы Паспалітай ў будынку Замкавы двор (які і трэба называць "*Батароўка*") 15.12.1586 г. з мэтаю даведацца аб прычынах смерці Яго каралеўскай Вялікасці. Гэта было першае ва Усходняй Еўропе анатамічнае ўскрыццё. У прысутнасці двух каралеўскіх лекараў (*С. Сімані* і *М. Бучэла*), польнага гетмана, канцлера і іншых магнатаў каралеўскі цырульнік ускрыў цела, а пазней забальзамаваў яго. Лекары знайшлі ў вантробе камень. Прычыны смерці тады так і не ўсталявалі, але вядома, што С. Б. меў спадчынную паталогію (эпілепсію) і злоўжываў піццём моцнага венгерскага віна (у падвалах Старога замка знайшлі пасля яго смерці каля паўсотні бочак). Цела вялікага князя літоўскага і караля польскага

забальзаміравалі і паклалі ў крыпту Фары Вітаўта, дзе яно знаходзілася амаль паўтара года да перавозу ў Кракаў (працэсія выехала з Гродна 29.04.1588).

Літ.: Гродно. Энцикл. справ. / Белорус. Сов. Энцикл.; Редкол. И.П. Шамякин (гл. ред.) и др. – Мн.: БелСЭ, 1989. – С. 262; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 17; Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ТАА "ЮрСаПрынт, 2018. – С. 59–60; Jodkowski J. Pamiątki po Jagiellonach i Batorym w Grodnie // Echo Grodzieńskie. – 1920. – № 62. – S. 3; № 64. – S. 3; № 65. – S. 3; № 66. – S. 3; № 67. – S. 3; Pawłowska-Kubik A., Śmierć Stefana Jegomości króla polskiego w Grodnie 12 Decembra Anno Domini 1586 (Prawdziwa sprawa o chorobie i śmierci nieboszczyka Stefana Batorego króla polskiego) – źródło do losów Stefana Batorego i historii medycyny // Studia Źródłoznawcze=Commentationes. T. 56 (2018). – Warszawa: IH PAN. – S. 148.

Анацэвіч Ігнат Жэгота Базыль (1780 ці 1781 – 1845) – гісторык, прафесар Віленскага ўніверсітэта. Вучыўся ў школах Ваўкавыска (1784–93) і Гродна (1796–97), у Беластоцкай гімназіі (1801–1802). А. збіраўся пайсці ў вайсковую службу, але, дзякуючы добрым водгукам міністра Шрэцера, прускі кароль уладкаваў яго за казённы кошт у Каралявецкі (сёння Калінінградскі) універсітэт (1802–1804, факультэт філасофіі), дзе затым А. працаваў выкладчыкам польскай і рускай моваў. Пасля заняцця Прусіі французскімі войскамі А. прымаў актыўны ўдзел у жыццёвых праблемах расійскага насельніцтва, якое апынулася пад акупацыяй. У той час А. пазнаёміўся з графам Румянцавым, які запрасіў яго ў свой маёнтак пад Гомелем, дзе была добрая бібліятэка, і малады вучоны меў магчымасць год працаваць над кнігамі і зборам рукапісаў графа па праблемах рускай мовы і славянскай (рускай і ліцвінскай) гісторыі, аналізаваў помнікі і граматы. З 1809 да пачатку *вайны 1812 г.* працаваў у Віленскім універсітэце, дзе атрымаў ступень магістра і выкладаў агульную гісторыю для асобаў, якія знаходзіліся на дзяржаўнай службе. З пачаткам вайны 1812 выехаў з Вільні, ў 1813 вярнуўся і працаваў у Беластоцкай гімназіі, дзе ў 1817 стаў памочнікам дырэктара. У 1818 Віленскі ўніверсітэт запрасіў А. на пасаду ад'юнкта гісторыі і статыстыкі, з 1821 па 1828 А. працаваў на кафедры рускай статыстыкі і дыпламатыі. Каля 1820 падаў Радзе ўніверсітэта праект выдання крыніц па гісторыі ВКЛ (на жаль нерэалізаваны). У 1824, пасля следства над філаматамі, яго павінны былі звольніць, але князёўна Зубава ўгаварыла Навасільцава пакінуць А. У 1827 стаў прафесарам, а ў наступным годзе быў звольнены нібыта за выказванні супраць урада. Пад арыштам дастаўлены ў Гродна, дзе адбыўся суд. А. змог абараніцца (Сенат зацвердзіў рашэнне суда аж у 1834). Напісаў у Гродне ноту, у якой паказаў віленскае лайдацтва Навасільцава і яго прыяцеляў (І. Лялевель знайшоў гэты дакумент падчас паўстання 1830–1831 у вял. кн. Канстанціна). У 1834 А. працаваў у Археаграфічнай камісіі ў Пецярбургу, у 1838 – у Румянцаўскім музеі, дзе камплектаваў крыніцы па гісторыі Літвы.

Творы: Rzut oka na pierwotne dzieje Litwy // Noworocznik Literacki, 1846; Uwagi nad historią powszechną// Magazyn powszechny, 1840, nn. 11–12.

Літ.: Прафесар Ігнат Анацэвіч. Жыццё і спадчына: гістарычны нарыс / С.А. Габрусевіч, С.В. Марозава. – Гродна: ГрДУ, 2005; Русссский биографический словарь. Т. 12. – СПб., 1902. – С. 262–263; Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 353; Mickiewicz. Encyklopedia. /J. M. Rymkiewicz, D. Siwicka, A. Witkowska, M. Zielińska. – Łódź, 2010, s. 377–378; Szybiak I. Onacewicz Ignacy // Polski Słownik Biograficzny. – Wrocław, 1979, T. XXIV, s. 377–378.

Андрайковіч Гэлена з Керсноўскіх – сябра гродзенскага павятовага жаночага камітэта (або камітэта апекі) падчас паўстання 1863–64 гг.. Захавала для нашчадкаў верш Ц. Цеханоўскага “Падзяка Полькам”. Памерла ў Друскеніках у красавіку 1922 г.

Літ.: Jodkowski J. Rok 1863… (notatki i uzupełnienie) // Echo Grodzieńskie. – 1923. – № 17. – S. 3.

Андрайковіч Міхал гл. Бутаўт-Андрайковіч Міхал.

Андрыеўскі Станіслаў Міхайлавіч (25.10.1936, в. Мацеевічы Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл. – 9.10.2020, Гродна) – старшыня гарадскога выканаўчага камітэта. Скончыў у 1955 Малабераставіцкую сярэднюю школу. У 1955–1958 служыў у войску. У 1963 скончыў Гродзенскі педагагічны інстытут, гісторыка-філалагічны факультэт (беларуская філалогія). Быў другім (1962–1964) і першым (1964–1967) сакратаром Гродзенскага гаркама камсамола. Затым старшынёй гарадскога *выканаўчага камітэта* (1982–1989). Пры ім пабудаваныя гарадская бальніца № 4, кінатэатр “Кастрычнік”, *мост* Румлёўскі, 20 дзіцячых садкоў, 11 школ, развіваліся мікрараёны Прынёманскі, *Румлёва, Дзевятоўка*. З 1990 А. – нам. старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта. *Ганаровы грамадзянін* Гродна.

Анікін Віктар Іванавіч – заслужаны архітэктар БССР, канд. архітэктуры, дацэнт. Скончыў у 1940 г. Ленінградскі інжынерна-будаўнічы інстытут, з 1958 па 1964 працаваў у “Беларускім дзяржаўным праекце” (з 1962 – галоўны архітэктар). У 1963 – адзін з аўтараў другога *генеральнага плана Гродна*. Іншыя творчыя працы: планіроўкі, забудовы і добраўпарадкаванне пл. Леніна, мікрараёна па вул. Чкалава, рэканструкцыі Батанічнага саду ў Мінску, генпланаў Светлагорска, Брэста, Магілёва. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны 5 медалямі, Ганаровай граматай ВС Літоўскай ССР.

Літ.: Беларусский государственный проект, с. 116.

Ансамбль песні і танца “Нёман”, створаны ў 1957 г. пры гарадскім Доме культуры. Першыя кіраўнікі – заслужаныя дзеячы культуры БССР *Радаліцкі Панцеляймон* і *Ляшэнка Ларыса.* З 1960 кіраваць стаў заслужаны дзеяч культуры БССР А. Чопчыц, з 1983 – М. Бянько. З 1986 балетмайстрам быў У. Шчарбін. Жанравы кірунак ансамбля – інструментальны, вакальны і харэаграфічны. У 1961 г. А. атрымаў званне народнага. А. выступаў на базе

Чарнаморскага флота, у Севастопалі, Ялце ды інш. гарадах. Прымаў удзел у фестывалях у Кішынёве, Прыбалтыцы, Іспаніі, Грэцыі ды інш. На сённяшні дзень удзельнікамі А. з’яўляюцца вучні, настаўнікі, пенсіянеры. Кіраўнік – Кіслы Яўген, мастацкі кіраўнік – Сафронава Ганна. У рэпертуары больш за 60 вакальных твораў, 10 танцавальных кампазіцыяў, 3 народныя абрады – “Веснавы”, “Зімовы”, “Каханы”.

Крыніца: Літ.: Гродно. Энциклопедический справочник, Минск, 1989, с. 290; https://ckg.by/kollektivy/narodnyj-ansambl-belorusskoj-pesni–3/. Доступ 03.03.2021

Ансамбль танца “Раніца”, створаны ў 1959 у Палацы культуры тэкстыльшчыкаў Гродзенскага вытворчага тонкасуконнага аб’яднання. У 1969 А. атрымаў званне народнага. Кіраўнікамі былі заслужаны працаўнік культуры Я. Штоп (1964–77, 1979–87). А. Панасюк (1987–?). У рэпертуары было шмат беларускіх народных танцаў і харэаграфічных кампазіцый на базе беларускага фальклору, расейскія хараводы і танцы. У 1982 калектыў А. стаў лаўрэатам прэміі Ленінскага камсамола Беларусі. Удзельнічалі ў міжнародным тэлевізійным фестывалі народнай творчасці “Радуга” (1975), у 1-ым Усесаюзным фестывалі самадзейнай мастацкай творчасці працоўных (1975–77), у міжнародных фальклорных фестывалях Францыі і Іспаніі (1979); у Днях культуры СССР у Японіі (1980), Грэцыі і Францыі (1983), Нідэрландаў (1985), ФРГ (1987); ва Усесаюзным фестывалі народнай творчасці у гонар 70-годдзя вялікага Кастрычніка (1986–87).

Літ.: Гродно. Энциклопедический справочник, Минск, 1989, с. 342.

Антонаў Аляксей Інакенцьевіч (15.09.1896, Гродна – 18.06.1962, Масква) – генерал Савецкай арміі (1943). Нарадзіўся ў сям’і афіцэра рускай арміі. У 12 год памёр бацька, і хлопчыку прыйшлося ісці на працу. У сувязі з *вайной Першай сусветнай* сям’я эвакуявалася ў Петраград, дзе жылі сваякі. Працаваў на заводзе і вучыўся на вячэрніх курсах гімназіі. У 1915 памерла маці, паступіў ва ўніверсітэт. Хутка прызвалі ў войска і накіравалі на паскораны курс у Паўлаўскае вайсковае вучылішча (1916). Удзельнічаў у вайне ў чыне прапаршчыка, атрымаў ордэн. Дэмабілізаваўся ў маі 1918, працаваў служачым у Петраградзе. 11.04.1919 падаў рапарт аб прыняцці ў Чырвоную армію. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне (Луганск, Сіваш, Перакоп). Пазней прайшоў шлях ад начальніка штаба брыгады да начальніка штаба Маскоўскай акругі (1937). Скончыў акадэмію імя Фрунзэ (1931), аператыўны факультэт гэтай акадэміі (1933), акадэмію Генштаба (1937). Затым быў на выкладчыцкай працы. З чэрвеня 1940 стаў генерал-маёрам. Са жніўня 1941 паступова займаў пасады начальніка штаба Паўднёвага, Паўночна-Каўказскага і Закаўказскага франтоў і Чарнаморскай групы войск. З 11.12.1942 – начальнік аператыўнага кіравання і намеснік начальніка Генштаба, з 17.02.1945 – начальнік Генштаба (да 6.11.1946), уваходзіў у склад Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандуючага. Удзельнік Ялцінскай і Патсдамскай канферэнцый. У 1948–54 гг. –

1 нам. і камандуючы войскамі Закаўказскай вайсковай акругі. З 04.1954 – 1 нам. начальніка Генштаба, з 05.1955 – начальнік штаба аб'яднаных узброеных сіл краін Варшаўскай дамовы. Узнагароджаны ордэнам "Перамога", 3-ма ордэнамі Леніна, 4-ма ордэнамі Чырвонага Сцяга, 2-ма ордэнамі Суворава 1-й ст. і Айчыннай вайны 1-й ст., 14 замежнымі ордэнамі, шматлікімі медалямі. Пахаваны на Чырвонай плошчы. У Гродне ягонае прозвішча носіць вуліца, у музеі ёсць экспазіцыя А. Дом, у якім ён жыў у Гродне, не захаваўся.

Літ.: Смирнов А. Генерал, который осмеливался возражать Сталину // Гродзенская праўда. – 1996 – 12.09. – С. 4.

Антонаў Іван – камандзір *Палка першага беларускага пяхотнага ў* красавіку – чэрвені 1919. Звестак пра яго няшмат: з 1912 – настаўнік у Горадні, у званні палкоўніка служыў у беларускім палку, а потым стаў яго камандзірам пасля *Езавітава К.* Быў арыштаваны палякамі, сядзеў у Кракаве і Беластоку. Пасля вызвалення пэўны час знаходзіўся ў Коўне.

Літ.: Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich = Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– S. 202; Surgailis G. Lietuvos Kariuoenes. Gudu Kariniai Daliniai 1918–1923 m. – Vilnius, 2020. – S. 246.

Апановіч Міхал – кравец, прадстаўнік гарадзенскай уладнай эліты. Згадваецца ў крыніцах 1691, райца (1712, 1715, 1722), бурмістр (1717–18).

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 361.

Аптэка езуіцкая/фарная/Адамовіча, заснаваная ў 1687 г. езуітам Я. Цішкевічам, які стаў і першым аптэкарам. Першапачаткова яна абслугоўвала вучняў і выкладчыкаў *калегіума езуіцкага*. Мураваны будынак знаходзіцца побач з *кляштарам і касцёлам Св. Францішка Ксаверыя*. Пабудаваны ў 1709 на зямлі, купленай у *магістрата*. Магчыма, аўтарам першапачатковага праекта будынка быў Якуб Руф (Ruoff ці Rouff). У 1763 дабудаваны другі паверх на ўласныя грошы езуіта Эдара Ю. Функцыянальна будынак быў падзелены на дзве часткі: на першым паверсе 4 пакоі, кухня і калідор, на другім – 7 пакояў, сені, малая кухня, пакой для захоўвання "заморскіх лекаў". Падлога галоўнай залы на 1 паверсе была мармуровая, а ў іншых пакоях выкладзеная паркетам або дошкамі. Было некалькі кафляных печаў, стаяла цікавая мэбля (напрыклад, шафа, распісаная паводле кітайскіх матываў). З боку двара будынак злучаўся з комплексам калегіума драўлянай галерэяй на ўзроўні другога паверха. Каля ўвахода ў аптэку былі тры прыступкі з цясанага каменя. Пасля *пажару 1885* г. гродзенскі дэкан Элерт перабудаваў будынак: з левага боку быў пабудаваны новы аб'ём з уваходам і лесвічным маршам на другі паверх, ліквідаваны франтон і зроблены складаны атынкаваны дах, накрыты бляхай. Пасля

С. 821

ліквідацыі ордэна езуітаў (1773) аптэка фактычна перайшла да гродзенскай *школы медычнай*. У гэты час у А. працаваў са сваімі вучнямі прафесар *Жылібер Жан Эмануэль*. Аптэкарамі ў А. былі: Ян Цішкевіч (2 гады), Пётр Алізаровіч (1697–99), Сымон Вайцяховіч (1701–08), Андрэй Юцэвіч (1708–25), Якуб Руф (1721–24), Ежы Зыман (1724–25), Тамаш Грымскі (1726–47), Міхал Петэр (1741–47), Ян Блус (1745–46), Стэфан Крацэр (1751–1752), Андрэй Кочыг (1763–64), Марцін Каінскі (1757–58), Андрэй Сакалоўскі (1747–49, 1753–73), Юзаф Бапсыка (1749–53), Юзаф Эдар (1766–74), С. Шміт (1775), Ф. Шэда (1817–1835), Ян Адамовіч (1836–70), *Шміт А.* (1863), доктар медыцыны А. Адамовіч (1870–1881). Уладальнікамі аптэкі былі: евангеліцка-лютэранская суполка – арандатар С. Развадоўскі (з 1881), К. Стэфаноўскі (1885–1905), *Стэмпнеўскі Э.* (1905–1939). З 1944 г. у будынку фарнай аптэкі знаходзілася аптэка № 3, з 1950 – аптэчны склад, з 1978 – салон мэблі. З 23.07.1996 тут размешчаны *музей аптэкі* імя І. А. Адамовіча і дзейная аптэка.

Крын. і літ.: AGAD, Arch. Tyzenhauza, sygn. D–5, k. 6–7; Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С.314–316; Игнатович Ф. Аптека Адамовича // Гродзенская праўда. – 1994.01.12. – С. 3; Игнатович Ф. "Пробощ" из фарной аптеки // Гродзенская праўда. – 1994.01.12 . С. 3; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 117; Ткачова В. А. Дзейнасць гродзенскіх аптэкараў-езуітаў // // Краязнаўчыя запіскі. – 2010. – № 7. – С. 166–171; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 37.

Аптэка Юзафа Прайса. Ейны гаспадар жыў у 1790 г. па вул. Падгорная над р. Гараднічанкай, а на пач. XIX ст. – у будынку *магістрата*. У апошнім, магчыма, і знаходзілася аптэка.

Літ.: Рэвізская сказка Гродна пачатку XIX ст.// Гарадзенскі гадавік – 2024. – № 8. – С. 45.

Арганізацыя Гродзенская сацыял-дэмакратычная ваенна-рэвалюцыйная, існавала ў 1902–08 і займалася прапагандай, арганізацыяй розных выступленняў салдат гродзенскага гарнізона. На сходзе, скліканым арганізацыяй прадстаўнікоў вайсковых частак 27.11.1905, была прынятая рэзалюцыя супраць расправы над салдатамі, выказаная салідарнасць з матросамі Адэсы, Кранштата, Севастопаля. З красавіка 1906 выдавала нелегальную газету "Солдатская воля". У гэтым годзе пад уплывам арганізацыі было каля 10 тыс. чал. У чэрвені 1906 яе прадстаўнікі удзельнічалі ў працы Віленскай акруговай арганізацыі РСДРП, кіравалі выступленнем салдат Асавецкай крэпасці. Мела сувязі з гродзенскай групай РСДРП. Спыніла працу пасля масавых арыштаў у перыяд паслярэвалюцыйнай рэакцыі (1907–10).

Літ.: Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3, Мн., 1996, с. 124.

Арлоўскі Яўстафі Філарэтавіч (14.04.1862, в. Славенск Ашмянскага павета былой Віленскай губерні, цяпер Валожынскі раён – 2/14.12.1913, Гродна) – гісторык, педагог, краязнавец. Быў чацвертым дзіцём і з дзяцінства, са слоў

сястры, вылучаўся дабрынёй, чуласцю і высакароднасцю. Быўшы сынам святара (законавучыцеля народнага вучылішча), А. вучыўся спачатку ў Віленскім духоўным вучылішчы, а потым скончыў чатыры агульнаадукацыйныя класы Віленскай (Літоўскай) духоўнай семінарыі. У 1881 г. Арлоўскі, як стыпендыят Віленскай вучэбнай акругі, паступіў на гістарычнае аддзяленне імператарскага гісторыка-філалагічнага інстытута ў Санкт-Пецярбургу, якое і скончыў у 1885 са званнем "вучыцель гімназіі". 11.07.1885 МНА быў прызначаны настаўнікам Гродзенскай класічнай *гімназіі мужчынскай* на кафедры грэчаскай мовы і гісторыі. З 1885/86 навучальнага года ен вёў грэчаскую і лацінскую мовы, логіку. У 1891 надалей выкладаў старажытныя мовы, а ў 1894 займаўся ўжо выключна гісторыяй і геаграфіяй. У класічнай гімназіі Арлоўскі працаваў амаль 28,5 гадоў. Быў таксама настаўнікам геаграфіі ў *гімназіі жаночай* (1846–1904), выкладчыкам рускай і агульнай гісторыі ў прыватнай 7-гадовай *гімназіі яўрэйскай* Л. С. Вальдман (1909–1912). За гэты час паступова прайшоў усе службовыя ступені: калежскі асэсар (12.03.1890), надворны дарадца (10.12.1890) калежскі дарадца (5.07.1894), стацкі дарадца (27.02.1898). Атрымаў званне заслужанага выкладчыка. Арлоўскі, са слоў калег і вучняў, быў добрым настаўнікам, адданым сваей справе, па-бацькоўску ставіўся да выхаванцаў, захапляўся сам і захапляў іх гісторыяй. Вельмі старанна рыхтаваўся да ўрокаў: чытаў класічныя творы, манаграфіі, выкарыстоўваў краязнаўчы матэрыял. Гімназіст У. Кузьміцкі ў сваей прамове над магілай Арлоўскага ўспомніў аб Дыягене, які ішоў днём па вуліцы з ліхтаром і на пытанне "Каго ты шукаеш?", адказваў: "Чалавека". "Мы сёння хаваем, – падкрэсліў гімназіст – "Настаўніка-чалавека". Вельмі шмат часу Арлоўскі аддаваў грамадскім абавязкам: член праўлення гарадской бібліятэкі (1891–1913), агент таварыства драматычных пісьменнікаў, член Гродзенскага царкоўна-археалагічнага камітэта (1913). 11.09.1906 А. узяў шлюб з Вікторыяй з Смірновых, удавой Малевіча ў *царкве Св. Уладзіміра* (звесткі знойдзеныя даследчыцай Ю. Чарнушчык). У 1907 г. Арлоўскі стаў галосным, а ў 1911 – кандыдатам у галосныя *думы гарадской*. У бібліятэцы гімназіі кіраваў аддзелам "вучэбных дапаможнікаў па гісторыі і геаграфіі". У 1912 – апякун Віленскай вучэбнай акругі прызначыў Арлоўскага членам камісіі "для разбору губернскага архіва з мэтай вылучэння спраў, у якіх ёсць звесткі аб мінулай ваеннай старажытнасці". Арлоўскі быў таксама членам Гродзенскага павятовага аддзялення Літоўскага епархіяльнага вучылішчнага Савета (1892–1898), сапраўдным членам губернскага статыстычнага камітэта (1893–1913). "За усердную службу и особые труды" Арлоўскі быў узнагароджаны 5 ордэнамі: св. Станіслава 3 ст. (1.01.1894) 2 ст. (1.01.1903); св. Ганны 3 ст. (1.01.1899) і 2 ст. (1.01.1907); св. Уладзіміра 4 ст. (1.01.1910) і 2 медалямі: срэбным на стужцы ордэна св. Аляксандра Неўскага і бронзавым – у памяць стагоддзя *вайны 1812* г. за працу "Гродзенская губерня ў 1812 г.". Для гродзенцаў Арлоўскі пакінуў пасля сябе больш 20 прац (спіс гл. у бібліяграфіі). Ён даказаў ідэнтычнасць летапіснага *Горадна, Горадзена* і нёманскага *Гродна.* "Імя яго не будзе забытае і тады, калі ўжо нікога з нас не будзе тут, – казаў на пахаванні настаўнік Д. Н. Кропатаў, – нябожчык

працаваў нездарма: ён упісаў сваё імя на старонках гісторыі і кожны будучы гісторык мясцовага краю павінен будзе перш за ўсё звяртацца да прац Яўстафія Філарэтавіча. Ён будзе жыць у сваіх працах". Першага жніўня 1910 г. Арлоўскі атрымаў пенсію, але застаўся на службе і працаваў ст. настаўнікам амаль да смерці. Толькі за паўтара месяца да яе ён перастаў наведваць гімназію. Памёр ад рака страўніка. Яго апошнімі словамі былі: "Памерці лёгка, ды паміраць цяжка". У Гродне Арлоўскі жыў па розных адрасах. Паводле "*Памятных книжек*" удалося знайсці наступныя месцы яго жыхарства: Акцызная плошча, дом Круповіча (?–1890), вул. Палявая, дом Вейсбрэма (1891), вул. Саборная, дом Фіна (1892–1897), вул. Раздзельная, дом Шчэрбы (1898–1901/1902), вул. Гараднічанская, дом М. Орман (1902), вул. Іванаўская, дом Гордана (1903–1913). Цяпер гэта адпаведна частка пл. Тызенгаўза і Леніна, вуліцы Савецкая, Энгельса і Гараднічанскай (Тэльмана).

Літ.: Госцеў А.П. Яўстафі Арлоўскі – "чалавек навукі" і "настаўнік-чалавек", чалавек культуры // Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў. – Гродна: Гродз. друкарня, 2011. – С. 171–180; Ермоленко В. А., Черепица В. Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 184–189; Швед В.В. Стварэнне калекцыі прац Юзэфа Ядкоўскага / В. В. Швед // Краязнаўчыя запіскі. – Гродна: Выд-ва Гродз. абл. аддзела БФК, 1997. – Вып. 4. – С. 47–51; Швед В. Дзейнасць Ю. Ядкоўскага па захаванню гістарычнай спадчыны Гродна і ваколіц (па матэрыялах Дзяржаўнага архіва ў Беластоку) / В. Швед // Горад Святога Губерта: Альманах лакальнай гісторыі / рэдкал.: І. Соркіна [і інш.]. – Гродна, 2016. – Вып. 10. – С. 5 – 11.

Армія Краёва (да 14.02.1942 называлася Związek Walki Zbrojnej (ZWZ) – Саюз узброенай барацьбы) – частка канспіратыўнай сеткі, якая стала ствараць паводле загаду камандуючага III акругі Войска Польскага *Альшыны-Вільчынскага Ю.* у той час, калі яшчэ ішлі баі ў Гродне ў 1939 г. Узначаліў працэс падпалкоўнік Францішак Сленчка ("Крак/Воран"), падтрымалі афіцэры памежнай аховы, гарцэры і стральцы. Арганізатарамі падполля ў Гродне сталі капітан 41 палка пяхоты Станіслаў Сядлецкі ("Ганча") і падпаручнік рэзерва 76 палка пяхоты Аляксандр Палянка ("Олек"). Структура ZWZ складалася з каменданта раёна, яго намесніка, разведчыка, камендантаў пляцовак, вуліц і фальваркаў. У Гродне было 6 камендантаў раёнаў (да 300 чал.), ніжэй былі пляцоўкі, дружыны, секцыі, тройкі. У выніку арыштаў (у ZWZ да 21.04.1941 было каля 234 чал.) і *дэпартацыі* польскага насельніцтва савецкай уладай філія ZWZ у Гродне была злікідаваная да чэрвеня 1941. Адначасова складалася сетка Польскай вайсковай арганізацыі (ПВА=POW), дзякуючы дзейнасці капітана таго ж 41 палка пяхоты Пятра Дамброўскага. Ён наладзіў кантакты з доктарам Е. Высоцкім у Вільні і пачаў ствараць падполле ў Гродне (камендант – маёр рэзерву Ян Ражаньскі), Лідзе і Беластоку. Адным з арганізатараў ПВА ў Гродне і павятовым камендантам, мажліва, быў *Іваноўскі Вацлаў* ("Ліпскі", "Брэйк"). ПВА была зліквідаваная ў 1940. Яшчэ адной канспіратыўнай часткай быў у Гродне філіял "Саюза актыўнай барацьбы за

незалежнаць Польшчы" (кіраўнік Ян Ліпка). У Гродне, верагодна, знаходзіўся цэнтр лідскага падполля, якім кіраваў М. Падгайны. Падчас распрацоўкі ZWZ службоўцы НКУС выкрылі падпольную арганізацыю Казіміра Зімнаха. Яна паўстала ў студзені 1940 і складалася з груп у Гродне (на фабрыцы тытуню), Скідзелі, Саколцы, Беластоку.

Армія Краёва з паловы 1942 у Гродзенскім пав. стала складацца з дзвюх зон. Да "Гродна – Правы Нёман" належаў горад і гміны на правым беразе ракі: паўночная частка Гродна, гміны Бершты, Друскенікі, Дубна, Гожа, Азёры, Марцінканец, Масты, Парэчча, Скідзель, Верцялішкі, Жыдомля (на 1.01.1944 каля 2 тыс. жаўнераў). Да зоны "Гродна – Левы Нёман" належалі прадмесце Гродна і гміны Бераставіца, Эйсманты, Гудзевічы, Горніца, Галынка, Індура, Крынкі, Лаша, Лунна (на 1.01.1944 каля 2 тыс. жаўнераў). У самім Гродне знаходзілася пяць пляцовак АК (каля 150 чалавек). З пачатку 1943 узнікла вайсковая структура. "Гродна – Правы Нёман" скадалася з 5 пяхотных палкоў, "танкавага" узвода (мелі 2 танкі), узвода сапёраў, узвода палявой жандармерыі, аддзел WSOP/ SOP (Wojskowa Służba Ochrony Powstania / Вайсковая служба аховы паўстання), каля 70 чал. WSK (Wojskowa Służba Kobiet / Вайсковая служба жанчын). "Гродна – Левы Нёман" меў 4 пях. палкі, узвод сапёраў, звод палявой жандармерыі, аддзел SOP, каля 100 чал. WSK.

АК планавала аперацыю "Бура" з мэтаю вызвалення падкантрольнай тэрыторыі ад немцаў да прыходу Чырвонай арміі. Вайскоўцы "Гродна – Правы Нёман" павінны былі наступаць з лясоў Друскенік на Гродна. Вайскоўцы "Гродна – Левы Нёман" – з лясоў 4 форта і лесу Зарубічы на прадмесце Гродна і на 2 масты на Нёмане. Танкісты павінны былі падтрымаць падчас захопу мастоў. АК падрыхтавалася да аперацыі, але вайсковая сітуацыя змянілася: немцы на беразе Нёмана стварылі лінію абароны супраць Савецкай арміі. АК выдавала сваю газету "Wytrwamy" ("Вытрымаем").

Літ.: Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 391–392; Silwanowicz S. Polskie podziemie w Grodnie w latach 1939–1941. Rocznik Grodzieński. – 2007. – nr. 1. – S. 52–59; Papiery dotyczące Okręgu Białostockiego AK zebrane przez płk. Władysława Liniarskiego [w:] Ossolineum, Wrocław, z.16689/II, d. 35846, k. 1–245 (jest spis członków).

Арзэльн Вернэр фон (?–1330) – гросмайстар Тэўтонскага ордэна, які ў 1328 г. захапіў атрадам з 60 рыцараў і 3 тыс. ратнікаў *крэпасць Гродзенскую* пасля трохтыднёвай зацятай аблогі. Узяў у Гродне вялікую кантрыбуцыю, спустошыў ваколіцы ў радыусе 6 міль. Забіты нейкім рыцарам у 1330 г.

Літ.: Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния / М. Бобровский. – СПб., 1863. Ч. 2. – С. 763.

Архівы Гродна. У верасні 1916 г. немцы падчас акупацыі горада склалі інвентар архіваў і бібліятэк Гродна. Цяпер ён знаходзіцца ў Дрэздэне (10 старонак машынапіснага тэксту). Названыя наступныя архівы: 1. Губернскі

(на 2 паверсе будынка на Замкавай пл.), 2. Расійскага гродзенскага павятовага суда (на рагу вул. Кафедральнай і Мураўёва), 3. Земскай маёмасці і лясной адміністрацыі (на рагу Рынку ў доўгім жоўтым будынку), 4. Праваслаўнай дыяцэзіі (у доме праваслаўнага біскупа да 1916, а пазней – у палацы губернатара), 5. Збор гарадскіх актаў, якія тычыліся службы здароўя (у 1916 знаходзіліся ў доме нямецкага лазарэта для лёгкапараненых жаўнераў (вул. Грандзіцкая). У Губернскім архіве знаходзіліся акты губернскай адміністрацыі (за 1816–1877), распараджэнні губернатара (за 1855, 1875–1897), персанальныя справы чыноўнікаў губерні (1803–1905), цыркуляры міністраў (1853–1905), планы курорта ў Друскеніках, акты і рапарты лекараў і ветэрынараў (1867–1912), матэрыялы аб вязнях гродзенскай турмы (1839–1901) і ваўкавыскай (1819–1820), метрыкі касцельныя (1880–1915), матэрыялы беластоцкага генерал-губернатара (1906–1908), дакументы бюджэту Гродна (1848–1879), падаткавыя акты (1813–1827), дакументы аб замежніках, якія прыехалі на жыхарства ў Расійскую імперыю і г. д. У Расійскім гродзенскім павятовым судзе знаходзіліся матэрыялы працэсаў цывільнага і крымінальнага суда з паветаў Гродзенскай губерні (1801–1883), а таксама гродзенскага павятовага суда (1875–1913), распараджэнні Сената (1803–1871), дакументы выбараў у Дзяржаўную думу (1906–1912), судовыя кнігі (1857–1876), акты адвакатуры (1872–1882) і інш.

Літ.: Perłakowki A. Niemiecki inwentarz archiwów Grodna z 1916 r. Struktura, opis, stan zachowania // Grodnae et orbi: гарадскія супольнасці і гарадское асяроддзе XIV – XX стст. / пад рэд. А. Радзюка і І. Галубовіча. – Мінск: А. М. Янушкевіч, 2018. – С. 308–320.

Архітэктары губернскія. Першым з іх, магчыма, быў Тот Адам; у 1867–1887 – І. І. Калянкевіч, нараджэнец Гродзенскай губ., надворны дарадца, кіраваў працамі па будаўніцтве пральняў і бані ў Гродзенскай акруговай бальніцы; у 1887–1903 – П. І. Залатароў, калежскі сакратар, надворны дарадца, прайшоў шлях ад малодшага інжынера да губ. архітэктара; у 1893–1900 – *Раманаў М. У.*; у 1900–1907 – І. К. Плотнікаў, калежскі сакратар, надворны дарадца, з 1891 быў малодшым архітэктарам, кіраваў працамі па рамонце дому для псіхічна хворых; у 1910–1914 – У. Ю. Храсціцкі, стацкі дарадца, у 1893–1899 быў малодшым інжынерам, узнагароджаны срэбным медалём Аляксандра III (1896).

Архітэктурная школа XII ст. У яе стылі пабудаваны *церам княскі* на паўночна-заходнім ускрайку *гары Замкавай*, *царквы* Ніжняя (у цэнтры *дзядзінца*), *Прачысценская* (на неўмацаваным пасадзе на ўсход ад дзядзінца), *Барысаглебская на Каложы*, Ваўкавыская (недабудаваная на замчышчы), сцены замкавыя з *плінфы*. Вялікая верагоднасць існавання ў *Гродне* яшчэ двух цэркваў на вакольных пасадах: *Васкрасенскай* і г. зв. "Малой царквы", вядомых па крыніцах XV–XVI стст. і паказаных на *гравюры Адэльгаўзэра-Цюнта* 1568 г. Характэрныя рысы: будаўнічая тэхніка (асаблівая сістэма муроўкі з плінфы, скошаныя вуглы слупоў і сценаў, размяшчэнне купала над заходняй часткай храма, увядзенне ў муроўку збаноў-галаснікоў); дэкаратыўнае

ўбранне паверхні сценаў (пояс са шліфаваных камянёў, крыжовыя кампазіцыі з рознакаляровых маёлікавых плітак), каляровая маёлікавая падлога, ружова-белыя ўнутраныя сцены. Вядучым майстрам А. ш. быў *Пётр-Міланег*. Узводзіла будынкі гарадзенская будаўнічая арцель, у яе складзе былі полацкія рамеснікі, якія выраблялі плінфу.

Літ.: Иушина О. В. Гродненская архитектурная школа XII века // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада). – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 138–143; Краўцэвіч А. Гродзенская архітэктурная школа XII ст. // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 35–43.

Архіў Дзяржаўны Гродзенскай вобласці (ДАГВ) быў заснаваны ў Гродне 11.02.1944. Знаходзіўся на вул. Акадэмічнай, 7а, у будынку былой *лютэранскай кірхі*. У ДАГВ захоўваюцца матэрыялы ўстаноў Рэчы Паспалітай за перыяд 1919–1939 з тэрыторый Аўгустоўскага (часткова), Ваўкавыскага і Гродзенскага паветаў Беластоцкага ваяводства, Навагрудскага ваяводства (акрамя Баранавіцкага і Валожынскага пав.): аб развіцці эканомікі, сацыяльным становішчы працоўных, іх барацьбе за свае правы, пра нацыянальны рух, дзейнасць грамадскіх, рэлігійных і палітычных арганізацый. Таксама ў ДАГВ знаходзяцца матэрыялы часоў усталявання савецкай улады (1939–40) і нямецка-фашысцкай акупацыі (1941–44): пра палітыку каланізацыі, працэс уз'яднання Зах. Беларусі з БССР, дзейнасць нямецкіх акупантаў, барацьбу партызан, падпольшчыкаў і антыфашыстаў. У фондах органаў савецкай улады, прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў, асветы, навукі, культуры, прыватных архіваў і калекцый зберагаюцца матэрыялы пра эканамічнае, адукацыйнае, культурнае развіццё Гродна і Гродзенскай вобласці.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 85–86; Плешавеня А. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3., Мн., 1996, с. 245.

Архіў, Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне. Ягоны пачатак паклалі справы фондаў архіва губернскага праўлення, які знаходзіўся ў будынку "паштовай канторы" на Дварцовай пл., 4 (зараз пл. Тызенгаўза, 2). Старажытныя актавыя кнігі да 1799 г. з архіва ў Гродне былі паводле рашэння цара Мікалая I ад 2.04.1852 перададзеныя ў Віленскі цэнтральны архіў. Значна пацярпеў архіў у часы *войнаў 1812* і *Першай сусветнай*. Матэрыялы яго вывозіліся то ў Расію, то ў Польшчу. Савецкі Саюз у 1930 г. у межах рэвіндыкацыі перадаў Польшчы 290 скрыняў архіўных матэрыялаў – амаль 30 тыс. спраў. У канцы 1930-х гадоў гродзенскі архіў, створаны ў 1921 (Archiwum Państwowe w Grodnie) стаў трэцім у міжваеннай Польшчы. Напярэдадні 1926 у ім знаходзілася каля 150 тыс. спраў: матэрыялы адміністрацыйных органаў расійскай улады, гродзенскіх *сеймаў, паўстанняў* 1794, 1830–31 і 1863–64 гадоў ды інш. У навуковы і культурны цэнтр ператварыла архіў *Студніцкая-Казлоўская Я.* На базе гэтага архіва ў 1940 быў створаны

гістарычны архіў, як філіял Цэнтральнага гістарычнага архіва БССР. У 1940 у архіў паступілі дакументальныя матэрыялы за 1802–1914, і ў канцы года архіў меў 935 тыс. адзінак захоўвання за перыяд 1802–1939. Пасля вайны, з 1946 г. архіў атрымаў дзясяткі тысяч дакументальных матэрыялаў за XVI–XX стст. з гістарычных архіваў Масквы, Вільні, Магілёва, Мінска, абласных дзяржаўных архіваў РСФСР. Са Слонімскага і Ваўкавыскага музеяў, кляштара Брыгіцкага касцёла былі дастаўленыя матэрыялы за XVI–XX стст., архіў захоўвае метрычныя кнігі рэлігійных устаноў Гродзеншчыны і Брэстчыны. Матэрыялы па губернях Ломжынскай, Люблінскай, Калішскай, Седлецкай перададзеныя з А. у Польшчу, а Сувалкаўскай і Аўгустоўскай – у Літву. Дакументы гродскіх, земскіх, падкаморскіх, камісарскіх і эксдывізарскіх судоў, магістратаў, ратушаў ды іншыя дакументы XVI–XVIII стст. перададзеныя ў НГАБ У Мінску. У 1960 А. быў ператвораны ў ЦДГА ў Гродне. Затым новыя змены: у маі 1993 – у Беларускі дзяржаўны архіў, у лютым 1995 – у Нацыянальны гістарычны архіў у Гродне, у верасні 1996 – у НГА Беларусі ў Гродне. Нарэшце ў 2001 архіў атрымаў назву "Дзяржаўная ўстанова "НГАБ у Гродне", а ў 2014 пераехаў у новы будынак па вул. Гаспадарчая. Тут захоўваюцца ў асноўным дакументальныя матэрыялы з губернскага перыяду да 1917 г., але сустракаюцца экзэмпляры з папярэдніх часоў ад XVI ст.

Літ.: Карев Д. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 141–143; Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 12. – Гродна: ГАІУН, 2010. – С. 39—41; Chwalewik E. Zbiory Polskie. Archiwa, biblioteki, gabinety, galerie, muzea i inne zbiory pamiątek przeszłości w Ojczyźnie i na Obczyźnie / E. Chwalewik. T. 1. – Warszawa, Kraków: wyd-wo J. Morkowicza, 1926. – S.113.

Аршун Аляксандр (1892 – не раней за 1944, Гродна) – настаўнік, беларускі грамадска-палітычны дзеяч. Сябра БПС-Р (пачатак 1920-х). Кіраваў гродзенскім беларускім прытулкам (1925–1928), рэдагаваў газету "Беларуская думка" (1930–1932). Быў віцэ-старшынём Цэнтральнага камітэта арганізацыі беларускіх беспартыйных актывістаў і сябрам гродзенскага беларускага дабрачыннага таварыства (1924), арганізацыі Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, праўлення таварыства "Еднасць" (1927), Беларускага акруговага выбаркама (1928), гродзенскага Беларускага нацыянальнага выбарчага камітэта (1930). У 1940 працаваў у Гродзенскім раённым аддзеле народнай адукацыі, у 1941 – у беларускай школе, у 1944 – школе № 6. Органамі НКУС быў высланы, а потым вярнуўся ў Гродна, дзе і памёр.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 32–33.

Асаргін Міхаіл Міхайлавіч (16.04.1861 – пасля 1920) – гродзенскі губернатар з 15.02.1903 да 16.05.1905 г. З патомных дваран Калужскай губ. У 9 гадоў быў залічаны ў пажы імператарскага двара, а 1.10.1878 накіраваны ў Пажскі

корпус. 30.09.1879 пераведзены ў камер-пажы, 8.08.1880 – у карнэты Кавалергардскага палка, са спіса якога выключаны і 10.11.1888 выйшаў у адстаўку. Стаў служыць па Міністэрстве народнай адукацыі і быў накіраваны да апекуна Маскоўскай навучальнай акругі ў чыне тытулярнага дарадцы (15.03.1887). 10.03.1888 прызначаны памочнікам калужскага павятовага прадвадзіцеля дваранства, 5.03.1889 – пазаштатным старэйшым чыноўнікам асаблівых даручэнняў пры калужскім губернатары, 16.01.1890 – земскім начальнікам 3-га ўчастка Калужскага ў. 15.03.1890 атрымаў чын калежскага дарадцы. У 1890–1898 – калужскі ўездны прадвадзіцель дваранства, 15.03.1894 – надворны дарадца. 14.12.1895 выбраны ў губернскую вучылішчную раду. 2.05.1898 прызначаны харкаўскім віцэ-губернатарам. Епіскап Калужскі Макарый 2.11.1898 зацвердзіў А. ганаровым сябрам Калужскага адзела Епархіяльнага савета. 2.05.1902 г. А. за выслугу гадоў атрымаў чын стацкага дарадцы.

Паводле ўказа Мікалая II ад 15.02.1903 прызначаны выканаўцам абавязкаў гродзенскага губернатара. У гэты час уваходзіў у склад Віленскага адмысловага камітэта па зборы сродкаў для будаўніцтва помніка Кацярыне II, быў ганаровым сябрам шэрагу арганізацый: Брэст-Літоўскага адзялення Расійскага таварыства апекі жывёл, Друскеніцкага праваслаўнага брацтва, Гродзенскага ўпраўлення Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа і Гродзенскага епархіяльнага вучылішнага савета, Беластоцкага пажарнага таварыства. У 1903–1904 садзейнічаў правядзенню падпіскі і збору грошай для стыпендыі імя *Сталыпіна* ў адной адукацыйнай установе Гродна. 16.09.1903 атрымаў чын сапраўднага стацкага дарадцы, 6.12.1903 – прыдворнае званне камергера. 16.05.1905 пераведзены на пасаду тульскага губернатара (да 1906). У 1908 быў рэкамендаваны на пасаду таварыша/намесніка обер-пракурора Сінода.

Творы: "Что я слышал, что я видел и что я делал в течение моей жизни (1861 – 1917, февраль)". Рукопись, 243 с.

Узнагароды: ордэны – Св. Уладзіміра 4 ст. (1900), Св. Станіслава 2 ст. (1895), Св. Ганны 3 ст. (1891), 2 ст. (1898); медалі – срэбныя ў памяць каранацыі Мікалая II (1895) і царавання Аляксандра III (1897), цёмна-бронзавыя ў памяць царавання Аляксандра III (1896) і за працу па Першым усеагульным перапісе насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. (1897).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф.2, воп.25, с.731, а.3, 75; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 119–121; Черепица В.Н. Гродненский исторический калейдоскоп: очерки истории, историографии и источниковедения. – Гродно: ГрГУ, 2014.

Асвятленне вуліц. Пачыналася з усталявання ліхтароў. З ведамасці ад студзеня 1832 вядома, што ў горадзе было ўсяго 8 ліхтароў (4 пры магістраце, 1 пры Доме таварыства апекі, 3 пры дамах *Максімовіча* і Сядлецкага) і трэба было паставіць 62 – на вул. Замкавай (6 штук), Маставой (17), Скідзельскай (19), Дамініканскай (10), пры доме *губернатара* (2), на *мастах* губернатарскім (2) і Мікалаеўскім (3), у ваколіцах *Рынку* (6), на плошчы Замкавай (3). З гадамі колькасць

ліхтароў расла: у 1873 – 275 шт., у 1887 – 317 шт. Калі ліхтарныя слупы былі па двух баках вуліцы, дык размяркоўвалі іх у шахматным парадку. Для паліва ў ліхтарах выкарыстоўвалі спецыяльнае кінкетнае масла, керасін, спірта-скіпідарную вадкасць, масла канаплянае, ільняное і рапсавае, газ, нафту. Запальваліся ліхтары з 2 гадзін ночы да 7–9 гадзін раніцы, на працягу 7–9 месяцаў на год абслугоўванне ліхтароў здавалася ў арэнду падрадчыкам. З канца 1912 галоўныя вуліцы сталі асвятляцца праз *электрастанцыю гарадскую*.

Літ.: Иващенко Н.А., Повседневная жизнь губернского города Гродно (XIX – начало XX века). – Гродно: ЮрСаПринт, 2019. – С. 98–109; Helena z Janczynowskich Roth, Czasy. Miejsca. Ludzie. Wspomnienia z kresów wschodnich, Kraków, 2009, s. 64.

Аскольд – вараг з дружыны шведскага конунга Олафа, кіеўскі князь. Паводле версіі даследчыкаў Юзафа Пузыні (яго праца не захавалася) і барона Міхаіла Таўбе (якому распавядаў Пузыня), А. – мажлівы будаўнік *Горадзена/Горадні* (IX ст.) – апорнага пункта на Нёманскім шляху з вараг у грэкі.

Літ.:А. Кібінь. Ад Ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурныя трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – № 5. – С. 258.

С. 822

“Асновы Дзяржаўнасці Беларусі” – мемарандум напісаны М. Доўнар-Запольскім у 1918 па просьбе ўрада БНР і выдадзены ў 1919 ў Гродне і Вільні аддзелам друку Міністэрства беларускіх спраў урада Літвы. Выйшла брашура на беларускай (пераклад А. Луцкевіча), рускай, нямецкай, французскай мовах. Два апошніх варыянты друкаваліся ў берлінскім выдавецтве В. Гартмана, але мелі ў сыходных дадзеных Гродна (каб падкрэсліць беларускасць). Пазней мемарандум быў перакладзены на англійскую мову П. Кларкам. У “А. Д. Б.” апісваліся гістарычныя падставы стварэння незалежнай беларускай дзяржавы. Беларуская дэлегацыя распаўсюджвала яе сярод удзельнікаў Версальскай канферэнцыі. Гэта выклікала вострую крытыку з боку ўрада Літвы. Карысталіся мемарандумам у якасці раздатачнага матэрыялу падчас правядзення піяр-акцый, прысвечаных БНР, а таксама на мірнай канферэнцыі ў Парыжы.

Літ.: Ляхоўскі У., Чарнякевіч А., Інфармацыйна-выдавецкая дзейнасць Рады і ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918–1925 гадах // Przegląd Środkowo-Wschodni. – 2019. – № 4. – S. 49. https://be.wikipedia.org/wiki/. Доступ 14.01.2021; Ігар Барынаў. Група “Запіскі беларусаведа” у ФБ. Доступ 27.04.2120.

Астапковіч Ігар (4.01.1963, Наваполацк, Віцебск. вобл.) – гродзенскі алімпіец (лёгкая атлетыка, молат). Атрымаў срэбны медаль на чэмпіянаце свету ў 1991 і на Алімпіядзе ў Барселоне (1992) з вынікам 81,94 м. Заняў 7 месца на Алімпіядзе ў Атланце (1996) з вынікам 78,20. Быў трэцім на Алімпіядзе ў Сіднэі (2000) – бронза за вынік 79,17. Чэмпіён Еўропы (1990), пераможца гульняў Добрай Волі (1990) і Сусветнай Універсіяды (1987), срэбны прызёр Спартакіяды народаў СССР (1991), шматразовы чэмпіён СССР і Беларусі.

Літ.: Попко И. Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 37, 43, 47; 113–116.

Астроўскі Юры Міхайлавіч (29.06.1925 – 31.12.1991, Гродна) – дырэктар Інстытута Біяхіміі АН Беларусі (1970), доктар медычных навук, заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1978), акадэмік (1986). На пачатку *вайны Айчыннай* сям'я пераехала жыць у Слонім. А. працаваў на мясцовым радыёвузле, падтрымоўваў сувязі з партызанамі: перадаваў лекі, тапаграфічныя мапы, радыёдэталі. Пасля вяртання Савецкай улады быў прызваны ў Савецкую армію і ў 1945 быў залічаны курсантам Ленінградскай ваенна-медычнай акадэміі, але хутка выключаны пасля арышту бацькі, як "ворага народа". А. здолеў паступіць у Мінскі медычны інстытут і ўтрымацца да заканчэння, нягледзячы на выяўленую прыналежнасць яго да Саюза беларускай моладзі. А вось паступіць у аспірантуру ў Маскве не ўдалося. З 1950 А. кіраваў у Полацку аддзелам і лабараторыяй санэпідстанцыі і працаваў урачом-лабарантам біяхімічнай лабараторыі гарадской бальніцы. З 1956 працаваў у Віцебскім медычным інстытуце, стварыў пры абласной бальніцы біяхімічную лабараторыю. У 1958 абараніў кандыдацкую дысертацыю па абмене вітаміну В1 (тыяміну) пры сухотах, у 1965 – доктарскую. З 3.01.1959 стаў працаваць у Гродзенскім медычным інстытуце, дзе арганізаваў кафедру біяхіміі. Гродзенская біяхімічная школа, якую стварыў А., налічвае звыш 70 дактароў і кандыдатаў навук. Паводле яго ініцыятывы ў горадзе ў 1970 створаны аддзел рэгуляцыі абмену рэчываў АН БССР (з 1985 – Інстытут Біяхіміі АН БССР), якую А. ўзначаліў. У 1977 абраны членам-карэспандэнтам АН БССР. Напісаў амаль 500 навуковых прац, сярод якіх 10 манаграфій, 15 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтва. Адным з галоўных напрамкаў яго дзейнасці была барацьба з алкагалізмам і наркаманіяй. Заснаваў у 1990 гродзенскі філіял Усесаюзнага наркалагічнага цэнтра. Пасля Чарнобыльскай аварыі А. са сваімі супрацоўнікамі першы выкрываў яе вынікі, далажыў гродзенскаму партыйнаму кіраўніцтву аб выяўленых радыеактыўных прадуктах харчавання. Выступіў супраць будаўніцтва ў Скідзелі біяхімічнага прадпрыемства. А. быў патрыётам Беларусі, марыў, каб яна была вольнай і не выкарыстоўвалася суседзямі ў сваіх інтарэсах (нататнікі ўтрымоўваюць яго думкі пра беларускую гісторыю, запісы рэальных сітуацый з народнага жыцця, крытычныя ацэнкі савецкай рэчаіснасці, выпіскі з твораў беларускіх класікаў). У 1989 А. выступіў на ўстаноўчай канферэнцыі па стварэнні гарадской арганізацыі Таварыства беларускай мовы (ТБМ), падтрымаўшы адраджэнне Беларусі, яе мовы, культуры, нацыянальнай свядомасці насельніцтва. Быў абраны ў гарадскую Раду ТБМ. КДБ не даваў А. спакойна жыць і працаваць. На аснове даносу былога вучня прафесара пачалося ганебнае шальмаванне сусветнавядомага вучонага. Як кандыдат А. прымаў удзел у выбарчай кампаніі ў Вярхоўны Савет рэспублікі ў 1989–90 гг. Гэта таксама падарвала здароўе, бо мясцовая наменклатура цкавала яго. У красавіку 1991 у А. раптоўна выявілася смяротнае захворванне – лейкоз. Праз паўгода ён памёр. Сярод сяброў А. былі *З. Верас, В. Быкаў, А. Карпюк, М. Ткачоў* і інш. У Інстытуце Біяхіміі склаўся актыў грамадска-палітычнага аб'яднання *"Паходня"*. З 1943 А. пісаў вершы (па словах А. Пяткевіча: "гаворка асаблівай, паэтычнай мовай з самім сабой").

Аўтар твораў: “Душу раскрыўшы насцеж”, “Беларусы: генетыка, рэлігія, нацыянальнасць”. А. – “Заслужаны дзеяч навукі” (1979), узнагароджаны таксама ордэнам “Знак Почета” і медалямі.

Літ.: Кісель Д. Ён усё жыццё хварэў любоўю да Беларусі // Пагоня. – 1997. – 4–9.01. – С. 7; Майсяёнак А. Пра Настаўніка // Краязнаўчая газета. – 2000. – №6 . – С. 4–5; Майсяёнак А. Первый академик Гродненщины // Гродзенская праўда. – 1995. – 29.06. – С. 3; Пяткевіч А. Беларускі інтэлігент // Гродзенская праўда. – 1995. – 29.06. – С. 3.

Аўгуст II Моцны (12.05.1670, Дрэздэн – 31.01/1.02.1733, Варшава) – курфюрст саксонскі пад імем Фрыдрых Аўгуст I (з 1694). Кароль польскі і вял. князь літоўскі (1697–1704, 1709–1733) з дынастыі Ветынаў. У 1668 стаяў з войскам (каля 15 тыс.) пад Гроднам і зрабіў публічную цырымонію ламання дрэўкаў штандараў зліквідаваных ім літоўскіх палкоў. Саюзнік Пятра I у *вайне Паўночнай*, з якой звязанае яго знаходжанне ў Гродне. У 1704 г. прыхільнікамі шведаў быў пазбаўлены прастола. Вярнуўся да ўлады пасля Палтаўскай бітвы (8.07.1709).

Літ.: Семянчук А. Каралеўскі і велікакняжацкі побыт у Гародні ў канцы XIV – XVI ст. // Grodnae et orbi: гарадскія супольнасці і гарадское асяроддзе XIV – XX стст. / пад рэд. А. Радзюка і І. Галубовіча. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2018. – С. 6–21; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005). – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020; P. Jasienica. Polska anarchia. – Warszawa: Prószyński i S-ka SA, 2008. – s. 15, 171

Аўгуст III (1696–1763) – вялікі князь літоўскі і кароль польскі (5.10.1733), ён жа саксонскі курфюрст Аўгуст II. Паводле яго загаду з 1726 будавалі *замак Новы* на поўдзень ад *замка Старога*. Бываў у Гродне дзеля дзяржаўных спраў і любімай забавы – палявання. Недалёка ад горада ён меў драўляную вілу на *Нёмане* і паляўнічы двор у Стрыеўцы.

Літ.: Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005). – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020; Historia Polski. Kalendarium dziejów 1655 – 1887/ red/ A. Nowak. – Kraków, 2010. – С. 126.

С. 823

Аўгустова/Аўгустовак – вёска, дзе ўзнік у 1770-я гады, дзякуючы архітэктару *Дж. Сака*, дом-палац у стылі барока і парк з сажалкамі для *Станіслава Аўгуста Панятоўскага*. У НГАБ у Гродне захаваўся план маёнтка А. з 1797 г., складзены павятовым землямерам Адамам Тотам. Пасля адрачэння Панятоўскага ад прастола Кацярына II падаравала Аўгустовак фельдмаршалу, *губернатару гродзенскаму*, графу Маўрыцыю-Петэру дэ Лясы. Маёнтак складаўся з фальваркаў Горны, Кругляны, Горніца, Саламянка і Дзямідкава – усяго 12 тыс. гектараў зямлі. Палац быў аднапавярховы з мансардай па цэнтры. Элементы дэкору былі ў стылі Людовіка XVI. Пафарбаваныя ў белы колер, яны выразна вылучаліся на жоўтым фоне атынкаванага фасада. Першапачаткова было каля 10 памяшканняў, якія размяркоўваліся анфіладна. У цэнтры першага і другога паверха знаходзіліся авальны салон і тэатральная зала. У салоне быў узорысты паркет, фрэскі на сценах, партрэты Кацярыны II і Паўла I, камін, прыгожы плафон. З правага боку салона быў прамавугольны салон з плафонам да

12-свечнай срэбнай люстры. У кабінеце быў камін. На другі паверх, да тэатральнай залы вяла дубовая лесвіца. Адміністрацыя і служба месціліся ў левым ад палаца флігелі, а кухня і кладоўка – у правым. У 1802 г. з'явілася *капліца*. Яе архітэктура нагадвала базіліку св. Пятра і Паўла ў Рыме. У алтары віселі абразы Маці Божай, а па баках – апосталаў Пятра і Паўла. У склепе капліцы знаходзілася крыпта з пахаваннямі роду *О'Брыен дэ Лясы*. Парк займаў амаль 20 гектараў. Перад палацам ён быў рэгулярным, а за палацам – пейзажным. Тут раслі елка, сасна, граб, асіна, клён, бяроза і іншыя дрэвы. Ад дзвярэй авальнага салона да ўскраіны парку ішла ліпавая алея. На адной з палян расла велізарная лістоўніца, пасаджаная, паводле мясцовага падання, Станіславам Аўгустам Панятоўскім. У канцы парк плаўна пераходзіў у лес, а на правым баку – у агароды і сад. Падчас *Першай сусветнай вайны* парк амаль цалкам загінуў – сядзіба была спаленая падчас адступлення расійскімі войскамі. З боку ўезда знаходзіўся круглы газон, падзелены дарожкай на два паўколы. Яго агінала шырокая дарога. Два невялікія прамавугольныя газоны з кветкамі знаходзіліся каля дома. На галоўнай восі была ўязная брама з двума мураванымі пілонамі, на версе якіх стаялі вазоны з гірляндамі. Меліся тры сажалкі, якія былі злучаныя паміж сабой каналамі. Уся сядзіба была акружаная паўкруглай агароджай са штыкетніка паміж мураваных слупоў. З 1819 маёнтак паводле купчай перайшоў пляменніку Маўрыцыя-Петэра дэ Лясы, англійскаму капітану Патрыку. Пры ім быў пабудаваны палац-двор. Патрык перадаў сядзібу сыну Аляксандру, пасля смерці якога гаспадарыў ягоны сын, былы лейтэнант расійскага флоту Цярэнці О'Брыен дэ Лясы. Ад Першай сусветнай вайны да рэвалюцыі 1917 г. і ў 1920–1926 кіравала маёнткам маці. У 1919 ён меў каля 12 тыс. гектараў (фальваркі, лес, луг). Да 1932 у сядзібе жыў Цярэнці, тут і памёр, пахаваны ў сямейнай капліцы. З 1921 карчма была перабудаваная ў панскі дом, які з капліцай належаў брату Маўрыцыю. Той у летні час запрашаў да сябе на адпачынак ахвочых (да 20 асобаў). Тады ў двары былі пошта, тэлеграф, тэлефон, радыё, электрычнасць у доме. Запрошаным прапаноўвалі гульню ў тэніс, катанне на лодцы па Нёмане, пляж на Нёмане і Ласасянцы, фартэпіяна, збіранне грыбоў і ягад. У міжваенны час у А. пабывалі Вітальд Гулевіч, Ірэна Тувім з мужам Юльянам Ставінскім, дырэктар віленскай бібліятэкі Лысакоўскі, Ян Парандоўскі. У чэрвені 1939 тут цэлы месяц жыў Станіслаў Ігнацы Віткевіч, вядомы філосаф, літаратар, мастак. У 1930 Н. Друцкая ладзіла пансіянат для дзяўчынак з варшаўскай гімназіі Тымінскай. Цяпер жыхароў вуліцы Рэпіна будзяць званы на адбудаванай капліцы.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 334–338; Шлавенец Т., Синевич А. Имение короля // Вечерний Гродно. – 2006. – 31 мая (22). – С. 5; Федорук Старинные усадьбы Гродненщины. – Мн.: Беларусь, 2014. – С. 272–281; Швед В.В. Аўгустоўская капліца-маўзалей як месца пахавання прадстаўнікоў родаў дэ Лясы і О'Брыен дэ Лясы / В.В. Швед // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 111–115; Drucka N. Trzy czwarte… Wspomnienia. – Łomianki: LTW, 2011. – S. 120, 124–125; Sypuła-Gliwa Joanna. Podróż na Wschód. – Łomianki: Wydawnictwo LTW, 2011. – S. 172–173.

Аўтамабіль у Гродне з'явіўся не пазней пачатку XX ст., бо ўжо 28.04.1903 гродзенская гарадская дума ўсталявала падатак на карысць горада 2 руб. 50 кап. "с каждой силы автоматического движения". Паводле дадзеных на люты 1913 у горадзе прыватна валодалі аўтамабілем: *Тальгейм А.* (меў № 1, ім кіраваў шафёр П. А. Бароўскі), губернскі інжынер С. Л. Пінаеў (№ 2, сам кіраваў аўто, таму яго можна лічыць першым гродзенскім аўтамабілістам), тэхнік А. Ч. Гардзееў (№ 3, шафёр К. К. Марціновіч), інжынер шляхоў зносін І. Р. Тымінскі (№ 4, сам за рулём), уласнік механічнай майстэрні П. А. Бароўскі. Акрамя таго аўтамабілі былі ў арганізацыях, установах і войску: 10 аўтамабіляў (4 легкавых і 6 грузавых) належалі Упраўленню будаўніцтва Гродзенскай крэпасці; 1 грузавік – 10-й шашэйнай дыстанцыі ведамства міністэрства шляхоў зносін; 1 легкавы аўтамабіль – 5-й паветраплавацельнай роце. На мяжы 1913/1914 гг. браты Пётр і Канстанцін Бароўскія, уладальнікі механічнай майстэрні па Мураўёўскай вуліцы, мелі чатырохцыліндравы, 14 к. с. аўтамабіль "La Buire". Улетку 1913 "шафёр-механік" Б. Б. Гародка атрымаў першы ў горадзе патэнт на "права пастаноўкі таксаматора" (гл. *таксі*). 23.05.1924 атрымалі права руху па публічных дарогах Д. Шапіра (асабісты аўтамабіль "Delage", № рэгістрацыі 4089), браты Бараш (грузавы "Renault", № 4088), ваяводскае кіраванне акруговай дырэкцыі прац (грузавы "Packard", № 4086); Лапін, Прылукін, Ламперт (асабісты аўтамабіль "Marwesman Mulag", № 4090). Г. Рот згадвае аўтамабіль чырвонага колеру князя Уладзіслава Друцкага-Любецкага, які ездзіў з асабістым шафёрам (палешуком па мянушцы Поль), бо меў дрэнны зрок. Аднойчы яму давялося ехаць з ім на возера і ўбачыць, як конь з брычкай спалохаўся аўтамабіля і збег з дарогі ў поле, перавярнуўшы папа з жонкай, якія ў ёй сядзелі.

Крын. і літ.: ДАГВ, ф. 26, воп. 1, с. 8, а. 524; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гродна-Вроцлаў: Гродзенская бібліятэка, 2014. – С. 269; Саяпін В. Забытые фабрики и заводы Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 82; Саяпін В., История общественного транспорта Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 4–10; Черепица В. Н. Не потерять связующую нить: История Гродненщины XIX – XX столетий в событиях и лицах (исследования, документы, комментарии): Монография. – Гродно: ГрГУ, 2003. – С. 183–185, 387–390; Helena z Janczynowskich Roth, Czasy. Miejsca. Ludzie. Wspomnienia z kresów wschodnich, Kraków, 2009, s. 111.



С. 824

Аўтобус з'явіўся ў Гродне ў 1925 г. 24 мая Леан Банькоўскі, галава фірмы "Аўтарух" адкрыў аўтобусныя зносіны паміж *Гроднам* і *Пышкамі*, *Ласоснам* – курсавалі з 7.30 да 21.00 два аўтобусы на 14 месцаў. Яны адпраўляліся ад будынка *магістрата* і па дарозе спыняліся на скрыжаванні вул. Ліпавай (сёння Гарнавых) і Ласасянскай (сёння Савецкіх памежнікаў). Білет да Пышак каштаваў 75 гр., да Ласосны 50 грошаў. У чэрвені планаваўся новы маршрут: Гродна-Сапоцкін.

Пытанне аб адкрыцці аўтобусных зносін разглядалася на паседжаннях *магістрата* ў 1929 г. Былі пададзеныя заявы беластоцкіх прадпрымальнікаў А. Шатмука, Я. Браўдэ, Я. Паўлоўскага, Яновіча і В. Мікалаевай на арганізацыю мясцовай камунікацыі. На паседжанні 7.12.1929 было вырашана аднаму

з заяўнікаў выдаць дазвол на канцэсію. Былі адкрытыя 2 аўтобусныя лініі: № 1, Грандзіцкая шаша – вул. Грандзіцкая – вул. Пушкінская – Піянерская – Тэатральная плошча – Паштовая – Банкавая – Брыгіцкая – Скідзельская і зварот па названых вуліцах; № 2, Чыгуначны вакзал – вул. Ажэшкі – Дамініканская – Маставая – Леванабярэжная – Ліпавая – Беластоцкая – Ласасянская і зварот па названых вуліцах. 1.04.1930 г. магістрат падпісаў дамову з Таварыствам “Autoruch” , які пачаў рух аўтобусаў 10.06 па названых 2 лініях. 29.06 на месцах прыпынкаў былі ўсталяваныя паказальнікі. У 1930-я гады пачалі існаваць міжгароднія (адзін з першых Вільня – Эйшышкі – Радунь – Азёры – Гродна) і прыгарадныя аўтобусныя зносіны (Гродна – Ліда, Гродна – Скідзель). Па горадзе хадзілі аўтобусы замежныя “FIAT”, “Chevrolet”, “Saurer” і польскай зборкі “PZInż ZAWRAT”, “FIAT 621 L”. Пасля далучэння Гродна да БССР аўтобусная база згаданага Таварыства была нацыяналізаваная і перанеслася спачатку на вул. Цэткін, 1, а затым на Транспартную, 2. На маршрутах сталі працаваць аўтобусы маркі “ЗІС–16”, “ЗІС–8”, “ГАЗ-03–30”. Пасля *вайны Другой сусветнай* аўтобусныя зносіны ўзнавіліся ў 1947 г. У наступным годзе зацвердзілі “Правілы рэгулявання аўтобусным рухам па горадзе” і кошты праезда аднаго пасажыра ў аўтобусе “Вакзал Гродна – ст. Ласосна”. 3.03.1950 *гарвыканкам* зацвердзіў графік працы і маршруты аўтобусаў, іх прыпынкі і тарыфы на праезд. Далей працягвалі дзейнічаць старыя маршруты, з’яўляліся новыя, удасканальваўся тэхнічны парк, колькасць аўтобусаў на маршрутах павялічвалася, упарадкоўваліся месцы прыпынкаў. У 1960 налічвалася 96 аўтобусаў, іх парк быў перайменаваны ў аўтакалону 2408 і размешчаны на вул. Перамогі, 16. У канцы 1962 была здадзеная ў эксплуатацыю першая чарга аўтавакзала на пл. Скідзельскай. У 1968 стары будынак аўтавакзала на Калгаснай пл. быў зліквідаваны. У 1972 быў забаронены рух аўтатранспарта па вул. Савецкай і Ажэшкі. У лютым 1973 на 21 маршруце працавала 105 аўтобусаў мадэлі “ЗІЛ 158”, “ЛАЗ”, “ЛіАЗ”, “Ікарус”. З 1.03.1974 гродзенцы перайшлі на талонную сістэму аплаты праезда ў аўтобусе (кошт 4 кап., праязнога – 2 руб. 40 кап.).

Крын. і літ.: ДАГВ, ф. 46, воп. 1, с. 16, а. 5 адв.; Саяпин В., История общественного транспорта Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 20–48; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 95, 139–142. 156, 166–167.

“Афганцы” – вайскоўцы Савецкай арміі з Гродна, якія ўдзельнічалі ў вайне ў Афганістане ў 1979–1989 гг. і пахаваныя ў Гродне. У спісе загінулых 12 чал.:
Бабко Валеры Уладзіміравіч (18.05.1956, Гродна – 10.07.1984) – капітан, забіты ў Афганістане, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.
Бажук Васіль Уладзіміравіч (2.02.1966, г. Чусавы Пермскай вобл. – 30.01.1985) – узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.
Бараноўскі Валеры Эдуардавіч (7.09.1968, Гродна – 27.04.1988) – сяржант, забіты ў Афганістане, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.
Бардан Генадзій Мікалаевіч (24.12.1960, Гродна – 16.03.1984) – лейтэнант СА, забіты ў Афганістане, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Блізнец Дзмітры Віктаравіч (4.04.1966, Шахцінск Карагандзінскай вобл. – 18.11.1984) – радавы СА, памёр ад ран, атрыманых у Афганістане, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.
Блахін Аляксандр Васільевіч (14.06.1951, Гродна – 22.08.1981) – прапаршчык, забіты ў Афганістане, узнагароджаны медалём "За адвагу".
Гладышаў Канстанстанцін Іванавіч (15.11.1963, с. Тапчыха Алтайскага краю – 21.12.1987) – лейтэнант СА, памёр ад ран, атрыманых у Афганістане, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.
Карней Сяргей Сяргеевіч (16.04.1956, с. Кучыры Дубасаўскага р-на Малдаўскай ССР – 12.11.1986) – капітан СА, забіты ў Афганістане, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.
Лісанаў Сяргей Мікалаевіч (25.05.1967 – 23.05.1987) – радавы СА, забіты ў Афганістане, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.
Рыбакоў Мікалай Мікалаевіч (18.03.1946, г. п. Іўе Гродзенскай вобл. – 18.02.1986) – прапаршчык СА, памёр ад цяжкай хваробы, атрыманай у Афганістане падчас выканання баявога задання.
Цяцюхін Вячаслаў Васільевіч (22.08.1951, г. п. Грыбанаўка Варонежскай вобл. – 10.02.1985) – маёр СА, памёр ад ран, атрыманых у Афганістане, узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.
Юртаў Віктар Васільевіч (2.06.1946, Бабруйск – 20.10.1980) – капітан міліцыі, забіты ў Афганістане, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. На доме па вул. Леніна, дзе ён жыў, усталяваная мемарыяльная дошка.

Літ.: Спіс забітых у Афганістане змешчаны ў: "Гродзенская праўда". – 1989. – 20.04

Ахрыменка Генадзь Віктаравіч (24.10.1932, Краснадар – 14.12.1974, Гродна) – старшыня Гродзенскага *камітэта гарадскога выканаўчага* (1965–1973). Скончыў механічны факультэт Краснадарскага інстытута харчовай прамысловасці па спецыяльнасці інжынер-механік (1951–1956). Працаваў галоўным механікам Гродзенскай цыгарэтна-ферментацыйнай фабрыкі (1956–1960), дырэктарам Гродзенскага шклозавода (1960–1963). Затым перайшоў на партыйную і савецкую працу. Быў нам. старшыні камітэта партыйнага і дзяржаўнага кантролю пры Гродзенскім прамысловым абкаме КПБ і аблвыканкаме (1963–1964), другім сакратаром Гродзенскага гарадскога камітэта КПБ і гарадскога выканаўчага камітэта (1964).

Б

Баброўскі В. – гродзенскі скульптар, творы якога прадстаўленыя на фарных могілках. Даследчыца Л. Зорына знайшла 7 падпісаных і 3 верагодных надмагілляў, выкананых Баброўскім (яго дакладнае імя невядомае) у 1840–1860 гадах.

Літ.: Зорына Л. Гродзенскія скульптары XIX – пачатку XX ст. // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 74–75.

Баброўскі Павел Восіповіч (2.04.1832, маёнтак Ваке каля Вільні – 16.02.1905, Пецярбург) – вайсковы тэарэтык, гістарыёграф, рэфарматар расійскай арміі і арганізатар вайсковых вучылішч. Паходзіць з дваран Гродзенскай губ. Быўшы падпалкоўнікам Генштаба, рабіў статыстычнае апісанне Гродзенскай губ., апублікаванае ў 1863 у 2-х тамах і ў 2-х тамах дадаткаў. За гэтую працу Б. узнагароджаны ордэнам Св. Уладзіміра 4 ст. і залатым медалём Імператарскага геаграфічнага таварыства. Даслужыўся да генерала ад інфантэрыі (1870), займаўся ўладкаваннем юнкерскіх вучылішч ва ўсіх вайсковых акругах (1864–1876). Начальнік вайскова-юрыдычнага вучылішча і Акадэміі (1875–1897). У гэтыя гады займаўся даследаваннем "Артикула Воинского". Затым служыў ва ўрадавым Сенаце. За добрую працу ўзнагароджаны ордэнам Белага арла. Атрымаў таксама вялікі залаты медаль Акадэміі навук імя графа Л. Талстога. За заслугі ў даследаванні Гродзеншчыны Б. быў абраны ганаровым сябрам *камітэта гродзенскага губернскага статыстычнага.*

Асноўныя працы: "Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами генерального штаба, Гродненская губерния", ч. 1 и ч. 2; Приложения, ч. 1, 2. – СПБ, 1863; "Историко-статистический очерк города Гродно" и "Законы движения народонаселения Гродненской губернии в 15-летний период: рождаемость, браки, смертность" (Памятная книжка Гродненской губернии на 1860 г. – Гродно, 1860); "Исторические сведения о городах Гродненской губернии" (Памятная книжка Гродненской губернии на 1861 г. – Гродно, 1861); "Г. Слоним и примечательные места Слонимского уезда" (Вестник Западной России – 1866, т. 4, N 12, июнь, отд. 2, с. 161–179); "Историческая монография г. Гродно" (Вестник Западной России – 1866, т. 3, N 7, январь, отд. 2, с. 28–43); "Русская греко-униатская церковь в царствование императора Александра I" – СПБ, 1890; "Подготовка реформ в русской греко-униатской церкви (1803–1827)" (Христианские чтения – 1889, N 5–6, с. 720–764); "Упразднение Супрасльской греко-униатской епархии и восстановление Виленской митрополичей

епархии" – Вильна, 1890; "Михаил Кириллович Бобровский (1785–1848), ученый славист-ориенталист" – СПБ, 1889; "К биографии М. К. Бобровского (славянского филолога-ориенталиста)" – СПБ, 1871–1874.

Літ..: Историки Гродненщины / Сост. Нечухрин А. Н. – Гродно, 1989. – С. 17–19; Мелешко Е. И., Нечухрин А. Н. Павел Осипович Бобровский: ученый, реформатор, педагог // Диалог со временем. 2011. Вып. 36. С. 344–376.

Бабяцінскі Міхаіл Трафімавіч (?1773–1832) – гродзенскі губернатар з 30 кастрычніка 1824 па 14 жніўня 1831 г.З дваран Віцебскай губ., гаспадар фальварка Пекалішкі ў Віленскім у. З 30.03.1789 служыў падканцылярыстам у Суражскім пав. Полацкага намесніцтва, з 27.09.1792 – у Полацкай крымінальнай палаце, з 28.07.1795 – рэгістратарам у грамадзянскім аддзяленні Вярхоўнага літоўскага праўлення ў Гродне. 21.10.1795 атрымаў чын калежскага рэгістратара. З 1.07.1797 па 17.07.1800 служыў у Літоўскай казённай палаце, затым да 31.12.1804 – у Віленскім губернскім праўленні. Заслужыў чыны калежскага асэсара і надворнага дарадцы. З 28.02.1805 па 8.04.1813 з'яўляўся кіраўніком канцылярыі пры літоўскіх вайсковых губернатарах. У 1808 атрымаў чын калежскага дарадцы. 8.04.1813 прызначаны на пасаду віленскага віцэ-губернатара. 4.08.1816 пераведзены ў герольдыю Сената Міністэрства фінансаў для асаблівых даручэнняў. Кіраваў казённымі лясамі Віленскай (1818–1822) і Гродзенскай (1822–1823) губ. З 24.11.1823 па 30.10.1824 зноў на пасадзе віленскага віцэ-губернатара, даслужыўся да чына стацкага дарадцы (14.11.1826). Яму прыйшлося перажыць выступленне *дзекабрыстаў* у Браньску пад Беластокам у 1826, крошынскае выступленне сялян у 1828 і *паўстанне 1830–1831 гг.* Бунт у войску быў падаўлены, і 26.05.1827 Бабяцінскі даносіў імператару пра тое, што сёстры М. Рукевіча – арганізатара дзекабрысцкага Таварыства вайсковых сяброў – пасаджаныя ў *Брыгіцкі кляштар* г. Гродна. 28 мая 1828 Бабяцінскі сам дапрасіў у Крошыне ўсіх падазроных, у тым ліку паэта П. Багрыма, які чытаў сялянам верш "Размова сялян" ("Rozmowa chłopów"). У 1830 Б. садзейнічаў размеркаванню дзейных расійскіх войск на тэрыторыі губерні перад пераходам імі мяжы Каралеўства Польскага, прымаў захады для спынення адносін паміж памежным насельніцтвам губерні з замежнымі жыхарамі. 9.05.1831 г. за "благоразумные действия по поддержанию порядка в губернии" падчас *паўстання 1830–1831* атрымаў чын тайнага дарадцы. Камандуючы дзейнай арміяй Дзібіч 7.01.1831 пісаў Мікалаю I: "Губернатор производит впечатление умного, но также и очень хитрого человека. Я высказал ему откровенно своё неудовольствие по поводу возвышения цен, сказав, что это вынудит меня прибегнуть к реквизиции, которая, понятно, ляжет главным образом на крупных собственников (а он сам принадлежит к числу их). Я также объявил ему в ответ на один глупый вопрос с его стороны, что я не могу делать никаких различий для тех подданных Вашего величества, которые, живя частью в царстве, частью в империи, не принимали присяги в этой последней, а если они будут в рядах восставших, и что измена Вашему величеству, как императору, или как королю, составляет одно

и тоже государственное преступление. Мне передавали, что зять губернатора принадлежит к людям этой категории". У 1828 Б. стварыў Камітэт па ўпарадкаванні Гродна. У 1830, па яго прадстаўленні куратару Віленскай навучальнай акругі, прафесар Віленскага ўніверсітэта І. Фонберг зрабіў аналіз хімічнага складу вады друскеніцкіх мінеральных крыніц. У гэтым жа годзе па ініцыятыве Б. была створаная губернская камісія з мэтаю арганізацыі ў Гродне *публічнай бібліятэкі*. Двойчы Б. дасылаў запыты ў МУС, але бібліятэка была адчыненая пазней. Указам Мікалая І ад 14.08.1831 Б. пераведзены ў 2-е адзяленне 6 дэпартамента Сената. 14.07.1832 адкамандзіраваны ў Маскву для ўдзелу ў працы Камітэта па уладкаванні мясцовых гарадскіх прыбыткаў і выдаткаў. Узнагароды: ордэны Св. Уладзіміра 4 ст. (1811), Св. Ганны 2 ст. (1824) і 1 ст. (1829).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 2, с. 1098, а. 3–5; Война с польскими мятежниками в 1831 г. Переписка императора Николая 1 с гр. Дибичем-Забалканским. // Русская старина. Кн. 1, СПБ, 1884, с.104–105; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801–1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007, с. 41–45.

Багатка Францішак Тамашавіч – паўстанец 1863 г., на час паўстання меў 46 гадоў. Скончыў нейкі ўніверсітэт, былы асэсар гродзенскай крымінальнай палаты, затым губернскі страпчы і калежскі сакратар Гродзенскага прыказа грамадскай апекі. Меў пад Гроднам маёнтак Котра (арандаваў яго Ціт Чачот). Быў сакратаром і касірам у гродзенскай дабрачыннай арганізацыі, дазволенай губернатарам. Жыў у доме Мірыновіча. У гродзенскай рэв. арганізацыі займаў пасады рэферэнта апекі і касіра Гродзенскага паўстанцкага ваяводства да Л. *Абрэмскага* (чэрвень 1863). Быў зняты, бо знайшлі недакладнасці ў вядзенні разлікаў збіраемых грошай. Высланы следчай камісіяй у Тамбоўскую губ. у жніўні 1863 г., 24.02.1864 памёр ад сухотаў. Яго маёмасць была секвестраваная. Рашэннем гродзенскага губернскага праўлення ад 13.12.1864 маёмасць падлягала канфіскацыі.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11, 114 адв., 165 адв., 206, 213–21 адв.; с. 4, а. 1–2, 21, 29; воп. 1, с. 40, а. 182 адв., 206 адв.; Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017. – С. 17.

Багатырэвіч Браніслаў (24.02.1870, Гродна – 6.04.1940, Катынь) – вайсковец, кіраўнік гродзенскай самаабароны (9–11.1918). Сын Казіміра і Марыі Каваліцкай. Скончыў гродзенскую гімназію (1887) і афіцэрскую школу ў Вільні (1893). У складзе расійскай арміі ўдзельнічаў у *вайне Другой сусветнай*. Паранены трапіў у нямецкі палон (1914). З лістапада 1918 да сакавіка 1919 быў адным з арганізатараў і кіраўніком Польскай самаабароны. Пазней камандаваў Гродзенскім стралковым палком Літоўска-Беларускай дывізіі (12.1919 – 3.1920), быў камандуючым 1-й і 2-й Літоўска-Беларускай дывізіямі, афіцэрам штаба Галоўнага камандавання Сярэдняй Літвы (1921–1922). У 1926 выконваў

абавязкі камандуючага Акругі корпуса № 1, генерал брыгады (1927), намеснік старшыні часовага камітэта былой Гродзенскай самаабароны (1931). У 1939 быў арыштаваны НКУС і забіты ў Катыні ў красавіку 1940.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 37; Kałuski M. Sprawy kresowe – bez cenzury. T. 1. – Toruń, Melbourne, 2018, s. 645.

Багдановіч Адам (Адольф) Ягоравіч, псеўд.: А. Б., А. Б-ович, А. Б-вич, А. Борисовский, Гродненский обыватель (1.04., па іншых сведчаннях 6.04.1862, м. Халапенічы Барысаўскага ў. Мінскай губ. – 16.04.1940, Яраслаўль) – беларускі этнограф, фальклярыст і мовазнавец. Бацька беларускага паэта *Максіма Багдановіча*. Скончыў Нясвіжскую гімназію (1882). З 1885 быў загадчыкам гарадскога вучылішча ў Мінску. Адзін з кіраўнікоў мінскіх народавольцаў. У сувязі са станам здароў'я пакінуў выкладчыцкую працу і з 1892 па 1896 працаваў памочнікам бухгалтара сялянскага пазямельнага банка ў Гродне. Быў чальцом праўлення *Гродзенскай публічнай бібліятэкі* (абіраўся яе дырэктарам), супрацоўнікам неафіцыйнай часткі *"Гродненских губернских ведомостей"*, старшынём таварыства драматычных пісьменнікаў і оперных кампазітараў. Сярод знаёмых Б. у Гродне – *Я. Ф.* А*рлоўскі*, С. Ф. Галюн, старэйшы кантралёр гродзенскай *кантрольнай палаты* П. І. Волкаў. Жылі Багдановічы ў Гродне на г. зв. *Новым Свеце* (сёння ў адным з падобных дамоў па вул. Багдановіча знаходзіцца літаратурны *музей Максіма Багдановіча*). "*Памятная книжка Гродненской губернии на 1896*" дае яшчэ адзін адрас, па якім жыў Б.: вул. Палявая, дом Шміта (цяпер Карбышава, дзе знаходзіцца станцыя хуткай дапамогі). За гады жыцця ў Гродне Б. выдаў некалькі сваіх прац, запісаў шмат твораў беларускага фальклору, частка якога была надрукаваная ў працы П. В. Штэйна. Пасля смерці жонкі ў 1896 пераехаў у Ніжні Ноўгарад. Ажаніўся другі раз на А. П. Валожынай (1899), сваячцы М. Горкага, з якім у гэты час пасябраваў. У 1907 пераведзены ў Яраслаўль (паводле абвінавачвання ў прыналежнасці да крайне левых: сімпатыі да сялянства, жаданні сацыяльнай рэвалюцыі). У савецкі час – загадчык навуковай бібліятэкі яраслаўскага гістарычнага музея, адначасова чытаў лекцыі па гісторыі культуры ў мастацка-педагагічным, тэатральным і музычным тэхнікумах. Быў відным прафсаюзным працаўніком.

Публікацыі: Очерк положения женщин в крестьянской семье Белорусского края Минский листок – 1886. – № 39; Педагогические воззрения белорусского народа, Тамсама. – 1886. – № 61; Про панщину, Гродно, губ. тип.,1894 (оттиск из Гродненских губернских ведомостей. – 1894. – № 10, 11, 16); Пережитки древнего миросозерцания у белоруссов, Гродно, губ. тип., 1895 (оттиск из ГГВ. – 1895. – № 11–45); Революционное движение в гор. Минске и губернии в 80-х и нач. 90-х гг.; К истории партии "Народной воли" в Минске и Белоруссии, 1880–1892; Страницы из жизни Максима Горького, Материалы к биографии Максима Богдановича", Воспоминания., Мн., 1965; Язык земли. Население Верхнего Понемонья, Оки и Камы – Мн., 1966; О необходимости возобновления народных чтений в нашем городе" (Гродненские губернские

ведомости, № 14, 1894); Об улучшении быта народных учителей" (тамсама, № 31, 1894); Школьная страда (тамсама, № 44, 45, 47, 1894); Отцы и дети в белорусской деревне (тамсама, № 20, 22, 30, 1894).

Рукапісы: Язык земли, образование водоречных имен и производных от них. Т. 1–2; Этнический состав белорусского народа; Этнический состав народов славянских и русских (усе 1930-я гг.).

Літ.: Махнач А.И. А.Е. Богданович – этнограф-эвалюционист // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С. 185–190; Пширков Ю.С. А.Е. Богданович. – Минск, 1966; Шлях паэта. – Мн.: Маст. літ., 1975; А. Госцеў. Гарадзенскае маленства Максіма Багдановіча ў асяроддзі дарослых // Я хацеў бы спаткацца з вамі... – Гродна: Дом-музей М. Багдановіча ў Гародні, 1991. – С.52–57.

Багдановіч Максім Адамавіч (9.12.1891, Мінск – 25.05.1917, Ялта) – беларускі паэт, перакладчык, крытык і гісторык літаратуры. З 1892 па 1896 (каля 1580 дзён) жыў з бацькамі ў Гродне. Пасля смерці маці Марыі Афанасьеўны Багдановіч (1896) бацька перавёз сям'ю ў Ніжні Ноўгарад. Дзіцячыя гады, праведзеныя Б. у Гродне, мелі вызначальны ўплыў на фармаванне светаўспрыняцця будучага паэта. У Гродне ў 1986 адчынены *музей літаратурны Б.* на вул. яго імя.

Літ.: Госцеў А. Гарадзенскае маленства Максіма Багдановіча ў асяроддзі дарослых // Я хацеў бы спаткацца з вамі…: да 100-годдзя з дня нараджэння М. Багдановіча. – Гродна: Музей М. Багдановіча. – С. 52–57; Дарогамі Максіма Багдановіча / [аўт. А.А. Балбатун і інш.]. – Гродна: ГАУД, 1991; Петрушкевіч А. Старонкі Гарадзеншчыны літаратурнай. Дапаможнік. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 107–117.

Багдановіч Марыя Афанасьеўна (1869, Ігумен – 16.10.1896, Гродна) – маці паэта *Максіма Багдановіча*, жонка *Адама Ягоравіча Багдановіча*. Нарадзілася ў сям'і дробнага чыноўніка. Па бацьку – Мякота, па маці – Малевіч. З-за цяжкай хваробы бацькі выхоўвалася ў Мінскім дзіцячым прытулку (да 14 гадоў). Скончыла Мінскае жаночае Аляксандраўскае вучылішча, затым Пецярбургскую настаўніцкую школу. Замуж выйшла ў 19 год. Мела чатырох дзяцей (Максім быў другім). Яе лісты, паводле успамінаў А. Я. Багдановіча, "поражали и мягкостью наблюдения, и живостью, и картинностью языка". Увесь вольны час Б. прысвячала дзецям, прыдумвала розныя гульні і забавы. Адзінае вядомае апавяданне Б. "Накануне Рождества" было апублікаванае ў "Гродненских губернских ведомастях" (№ 102 за 1883 г.). Памерла Б. ад туберкулёза. Пахаваная ў Гродне на *могілках праваслаўных*. На яе магіле ў кастрычніку 1992 пастаўлены помнік (скульптар В. Панцялееў, арх. А. Капцюг). У экспазіцыі літаратурнага *музея Максіма Багдановіча* адлюстраванае жыццё Б., выстаўленая фотакопія апавядання "Накануне Рождества".

Багавіцінавіч Богуш Міхал (? – 1531, Гродна) – каралеўскі сакратар, троцкі гараднічы, маршалак і падскарбі земскі, вялікі пісар ВКЛ. Паходзіў са

старажытнага беларускага роду герба Корчак. У 1500 г. ездзіў на чале з пасольствам у Маскву, за што атрымаў ад караля слонімскія і камянецкія староствы. Частка земляў была з колішніх уладанняў збеглага ў Масковію Міхала Глінскага. У 1512 Жыгімонт I даў яму прывілей на ўсе манастырскія землі. Б. зрабіў рамонт *царквы Барысаглебскай ў Гродне* (1500–1513): аднавіў разбураныя сцены, прарубіў невялікае вакно ў паўночнай сцяне, накрыў дах; унутры ў нішах, відаць, зрабілі фрэскі. У выніку цяжкіх перамоў з Масковіяй у 1522 дамогся 5-гадовага міру, працягнутага затым яшчэ на 6 гадоў. Таму, відаць, Б. карыстаўся падтрымкаю Ягелонаў і зрабіў добрую кар'еру. Ягонай жонкай была княгіня Фядора Сангушка, пляменніца К. Астрожскага. Меў трох дачок. Пахаваны ў 1531 у Барысаглебскай царкве, каля першага ад алтара слупа (па правую руку), які абрынуўся падчас абвалу.

Літ.: Дорош. Коложский храм. История и современность, с. 6; Коршинова, Милинкевич. Коложская церковь)+ (Будучая кніга / Трусава – рукапіс). Kossakowski, Monografia…

Багуслаўскі Войцех Рамуальд (9.04.1757, в. Глінна каля Познані – 23.07.1829, Варшава) – польскі акцёр і оперны спявак (бас), рэжысёр, драматург, лібрэтыст, педагог, тэатральны дзеяч. Стваральнік польскага прафесійнага драматычнага і музычнага тэатра ("бацька польскага тэатра"). Удзельнік паўстання 1794 г. Выступаў у Гродне ў студзені, а потым восенню да канца лістапада 1784. Даваў тры разы на тыдзень спектаклі для паслоў, якія прыехалі на *сейм гродзенскі Рэчы Паспалітай.* У 1785–90 меў свой тэатр (дакладней таварыства артыстаў, сярод якіх былі *Шыманскі, Руткоўскі, Дэшнер*, Руткоўская і інш.) у Вільні і штогод летам прыязджаў у Гродна. Быў тут у лютым 1785, у маі – верасні 1789 падчас паседжанняў літоўскага трыбуналу. З 1790 Багуслаўскі працаваў у Варшаўскім тэатры з названымі вышэй артыстамі, далучыўшы да іх артыстаў антрэпрызы Трускалаўскай. Атрымалася трупа, у складзе якой былі *Трускалаўскія* (маці і дачка Ледухоўская), Шыманскі, Руткоўскі і інш. У 1820–1823 у Варшаве выйшаў збор твораў Б. у 9 тамах "Dzieła dramatyczne Wojciecha Bogusławskiego". Пахаваны на могілках Павонзкі ў Варшаве.

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. T. I. – Lwów, 1925. – S. 395, 401, 418; Dykcyonarz Uczonych Polaków… ułożony przez ks. Ignacego Chodynieckiego zakonu karmelitów. T. 1. – Lwów, 1833. – S. 41–46; Raczewski Z., Bogusławski, Warszawa 1972, t. 1, s. 184–185; Renikowa W., Tradycje teatralne Grodna // Wilno i kresy Północno-Wschodnie. T. II. Kultura i trwanie., Białystok 1906, s. 133–135; Mazur Grzegorz, Bogusławski Wojciech // Słownik biograficzny historii Polski. T. 1 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C. 105; Szenic S. Cmentarz Powązkowski. 1790–1850. Zmarli i ich rodziny. – Warszawa: PIW, 1797. – S. 216–221.

Багуцкі Вацлаў Антонавіч, партыйныя мянушкі "Вацэк", "Аляксандр", "Шпак" (1884, м. Буракаў каля Варшавы – 1937) – савецкі партыйны дзеяч, кіраўнік Гродзенскага падпольнага камітэта РКП(б) у 1918–19. Скончыў гарадское вучылішча ў Беластоку, працаваў слесарам, пазней машыністам

на фабрыцы. У 1904 стаў чальцом Сацыял-дэмакратычнай партыі Польшчы і Літвы (з 1906 яна стала часткай Расійскай сацыял-дэмакратычнай партыі). У 1905 – першы арышт і 1,5 гады турмы. Вярнуўся ў 1906 у Беласток, працаваў машыністам на тэкстыльнай фабрыцы, быў дэлегатам 5-га з'езда Сацыял-дэмакратыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ). Арганізаваў уцёк рэвалюцыянераў з Беластоцкай турмы. У 1907–1909 гг. пражыў арышт і зняволенне ў турме. Два гады быў у ЗША (з 1909), дзе арганізаваў сярод эмігрантаў з Польшчы і Літвы секцыю (СДКПіЛ). Пасля вяртання на радзіму быў арыштаваны і сядзеў 2 гады ў Варшаўскай крэпасці. Калі выйшаў, быў мабілізаваны, служыў у Тыфлісе, дзе яго застала Лютаўская рэвалюцыя 1917 г. Арганізаваў у Тыфлісе Савет салдацкіх дэпутатаў, дзе быў абраны сябрам выканкама. Вясной 1918 вярнуўся ў Беласток і стаў з сакавіка сябрам мясцовага Савета рабочых дэпутатаў. За ўдзел у страйку быў арыштаваны нямецкай жандармерыяй. Збег і па заданні партыі паехаў у Гродна, дзе узначаліў камуністычную арганізацыю, а пазней – першую *Раду рабочых дэпутатаў* (26.01–27.04.1919). Пасля перадачы Гродна палякам (27.04.1919) і пераходу камуністаў у падполле Б. пераязджае ў Мінск, працуе ў наркамаце ўнутраных спраў Літоўска-Беларускай рэспублікі, у ЦК кампартыі Літвы і Беларусі. Затым быў пасланы на нелегальную працу ў Вільню. Вярнуўся ў Мінск (1921) на працу ў ЦК КПБ(б), а пазней – нам. старшыні Савета народных камісараў БССР. З 1924 удзельнічаў у працы выканкама Камінтэрна. У 1929–1933 – старшыня ЦК прафсаюза працаўнікоў сувязі, затым – нам. старшыні Усесаюзнага таварыства хімікаў. Узначальваў Скандынаўскую секцыю выканкама бюро Прафсаюзнага інтэрнацыянала. На пачатку 1937 камандзіраваны ў Хабараўск, дзе працаваў сябрам спецкалегіі акруговага суда. Дэлегат X–XII, XIV–XVI з'ездаў ВКП(б). Восенню 1937 быў арыштаваны і 19.12.1937 расстраляны.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 210–211; Егорычев В.Е. Председатель первого гродненского совета // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 460–464.

Багуцкі Пётр (13.08.1887, Востраў Беластоцкі – 5.01.1941) – настаўнік, арганізатар абароны Гродна ў 1939. Удзельнік *войнаў Першай сусветнай,* польска-украінскай *і польска-савецкай,* паўстання ў Верхняй Сілезіі. З 1925 быў настаўнікам у падрыхтоўчай школе пры жаночай настаўніцкай семінарыі імя *Э. Ажэшкі,* з 1926 выконваў абавязкі кіраўніка сямікласнай агульнай школы № 2 (з 1930 – дырэктар па выніках конкурсу). Скончыў вакацыйныя настаўніцкія курсы ў Варшаве. 20–22.09.1939 арганізаваў атрад гімназістаў, які бараніў Гродна ад Чырвонай арміі. 22.10.1939 арыштаваны НКУС і 15.10.1940 прыгавораны да расстрэлу.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 38; Bogucka M., Ludzie z kresów, 2010.

Бадакоў Аляксандр Васільевіч (23.02.1926, в. Бахараўка Рослаўскага р-на Смаленскай вобл. – 2014, Мінск) – кандытат філасофскіх навук (1958), прафесар. Першы рэктар Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы (1978–1994). Пры ім ун-т пераўтвараўся ў навуковы і культурны цэнтр Беларусі. Галоўная тэматыка публікацый: праблемы свядомасці, пазнання, сацыяльных вынікаў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі, камуністычнага выхавання. Аўтар 10 манаграфій і падручнікаў, больш за 100 навуковых прац. З 1998 г. жыў у Мінску і працаваў ва Універсітэце культуры.

Літ.: Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы: бібліягр. давед. / рэд. В.М. Чарапіца. – Гродна: ГрДУ, 1999. – С. 50–51; Постаці ў гісторыі Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы: гіст. Нарыс / аўт.-склад. В.П. Таранцей. – Гродна: ГрДУ, 2005. – С. 50.

Бадаракі Юзаф (на мяжы XVII–XVIII стст. – 8.11.1774) – першы *прэзідэнт* Гродна (1756, 1760, 1763–1765, 1768, 1772, 1774), сакратар Яго Каралеўскай Высокасці (1753–1754, 1756–1757, 1760, 1768). У 1720–1730 яму належаў будынак на *Рынку* (цяпер дом на рагу Маставой і завулка, там сёння аптэка), меў таксама пляцы на Падоле, вул. Рэзніцкай і Азёрскай. У 1736 Б. быў лаўнікам, затым неаднаразова райцам (1736–37, 1741–42, 1749) і бурмістрам (1743–1747, 1750–1752). Тройчы быў жанаты, меў дочак Ружу і Тэрэзу. Ружа выйшла замуж першы раз за віцэ-рэгента *камісіі скарбовай ВКЛ* В. Жылінскага, другі раз – за гарадзенскага *войта* (1786–1792) *Ю. Зялінскага.* Паводле спадчыны 1774 г. яны атрымалі ад Б. палову рагавой камяніцы на Рынку па Маставой вул. Тэрэза была жонкаю вядомага сакратара пошты ў Гродне *Сабалеўскага Ваўжынца* (таго, што звязаны з *Тызенгаўзам А.* і *"Газетай Гродзенскай"*). Унучка Брыгіда Жылінская атрымала паводле тастаменту пляц над *Нёманам,* пляцы на вул. Рэзніцкай і былы пляц Шмуклера. Удаўцу сваёй ўнучкі Ганны Жылінскай, Пятру Пастольскаму Б. падараваў камяніцу на Замкавай вул. Была і іншая маёмасць, што сведчыць пра заможнасць першага прэзідэнта горада. Даследчык Ю. Гардзееў выказаў думку аб аўтарстве Б. літаратурнай працы аб двух пажарах у Гродне 1753 г.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 256–258; Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 355–356, 362; Гардзееў Ю. Тастамент Юзафа Бадаракі як крыніца па гісторыі горада XVIII ст. // Гарадзенскі гадавік. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2020. – С. 7 – 29; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у XVIII ст. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. // Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 96–97; Hardziejeu J. Źródła do dziejów Grodna w zbiorach krakowskich. Wstęp do badań // Pogranicze polsko-litewsko-białoruskie. Źródła historyczne – stan badań. – Białystok: wyd-wo "Prymat", 2003. – S. 29; Grodno w, 1997. – S XVIII wieku. Miasto i ludność (na tle trendów rozwojowych od średniowiecza do 1936 roku) / Red. A. Woltanowskiego i J. Urwanowicza. – Białystok 1982.

Бажанаў (імя не знойдзенае) – гродзенскі *губернатар* з 14 жніўня па 24 жніўня 1831 года. У 1829 быў уключаны ў спіс кандыдатаў на пасаду грамадзянскіх губернатараў. Кароткачасова з'яўляўся гродзенскім губернатарам, а ўказам Мікалая I ад 24.08.1831 стацкі дарадца Бажанаў быў прызначаны магілёўскім губернатарам.

Крын. і літ.: ф.1, оп.3, д.997, л. 317–317 об.; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 46.

Бажко Васіль Васільевіч (23.01.1935, в. Пяняны Люблінскага ваяводства, Тамашоўскі павет – ?) – архітэктар, скончыў Львоўскі палітэхнічны інстытут, будаўнічы факультэт, архітэктурнае аддзяленне (1954–1960). З 15.08.1960 у Гродне. Спачатку ў Аблпраекце (цяпер Гроднаграмадзянпраект), затым у 1963–1977 – галоўны архітэктар горада. У 1977–1985 працаваў у Грамадзянпраекце (галоўны архітэктар). У 1985–1989 – начальнік майстэрні Белжылпраекта, з 1989 – дырэктар інстытута Белжылпраект. Чалец праўлення Саюза архітэктараў БССР, Саюза архітэктараў СССР (з 1963). Старшыня праўлення Гродзенскай абласной арганізацыі Саюза архітэктараў БССР (1980–1984), дэпутат Гродзенскага гарадскога Савета (1965–1979). Асноўныя праекты: комплексная забудова вуліцы Горкага (пач. 1960-х, з І. Мазнічкам); забудова мікрараёнаў "Фарты–1" (1965, з У. Давыдзенкам і В Ягошыным) і "Пярэселка–3" (з У. Давыдзенкам, В. Клепікавым, В. Прэабражэнскім); мікрараён "Дзевятоўка–1", стадыён "Чырвоны Сцяг", "Гроднасельбудпраект". Мае артыкулы па архітэктуры ў БСЭ, энцыклапедычным даведніку "Гродно".

Базары – гандаль на адкрытай прасторы, торг, рынак, сход, з'езд у базарныя дні тыдня для продажу і куплі, асабліва харчовых прыпасаў. У Гродне з XIV ст. гасціны двор размяшчаўся на галоўнай плошчы горада, якая так і называлася *Рынак* (як у Варшаве, Кракаве і інш. еўрапейскіх гарадах). Тут адбываліся кірмашы, былі мясныя і хлебныя рады, крамы, а таксама праходзілі базары. Па нядзелях, серадах і пятніцах былі яны на рынку Сянным (прыкладна на тым месцы, дзе цяпер знаходзіцца аўтастаянка па вул. Траецкай), а праз недахоп памяшканняў яшчэ і на плошчы каля Скідзельскай заставы (сёння каля аўтавакзала і ваенторгаўскага універмага) і, нават, на бліжэйшых вуліцах. На левым беразе *Нёмана* таксама быў адзін рынак. На базары сяляне прывозілі зерневы хлеб, крупу, мёд, воск, хмель, солад, сена, скуры і іншае. У сярэдзіне XIX ст. гэта складала ад 300 да 1 тыс. падводаў на суму да 3500 руб. На базарах гандлявалі рамеснікі і прамыславікі, якія задавальнялі патрэбы сялян і мяшчан у сваіх вырабах. У 1698 г. вялікі князь літоўскі і польскі кароль Аўгуст II дазволіў рыбакам Гродна заснаваць свой *цэх* і ўсталяваць у горадзе свой рынак для рыбнага гандлю (ён знаходзіўся недзе каля Сяннога). Так што мясцовае насельніцтва і прыезджыя маглі забяспечваць сябе свежаю рыбай.

Літ.: Швед В.В. Торговля в Беларуси в период кризиса феодализма (1830–1850-е годы) / В.В. Швед. – Гродно: ПКФ "Орбикс", 1995.

Баер (Baehr, Бер) **Отан Отанавіч** (1836–1907) – старшыня праўлення Гродзенскай сельскагаспадарчай суполкі (з 1898), уладальнік маёнтка Макаўляны, размешчанага на поўнач ад Саколкі (у другой пал. XIX ст. 857 дзесяцін зямлі і лясоў). Трымаў у арэндзе дзяржаўныя маёнткі Паломін і Гродзіск у Гродзенскай губ. Продкі паходзілі з Прусіі (Wittigwalde каля Астругы), у 1825 г. барон Баер уласнага герба набыў Макаўляны ад Раймунда Рэмбелінскага. Сям'я хутка спаланізавалася. Отан Баер у сяр. XIX ст. быў маршалкам шляхты Сакольскага ў. і займаўся распрыгоньваннем сялян. Некаторыя даследчыкі пішуць, што О. Баер – былы сібірскі ссыльны. У 1898–1901 ён быў адным з найактыўнейшых сябраў сельскагаспадарчай суполкі, якая мела месцам паседжанняў Гродна. Меў грунтоўныя веды ў агранамічных і сацыяльных навуках, бо быў выпускніком універсітэта ў Дэрпце, Сарбоны і Калеж дэ Франс, прайшоў грунтоўную агранамічную практыку ў Германіі. У Макаўлянах вырошчваў сады, плёны якіх вывозіў на продаж у Маскву, Пецярбург, Варшаву. Гадаваў пародзістых коней, разводзіў слімакоў.

Крын. і літ.: Памятная книжка Гродненской губернии на 1899 год. – Гродна: губ. типография, 1898. – С. 67; Aftanazy R., Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. T. 3. – Wrocław, Warszawa, Kraków, 1992, S. 80; Orzeszkowa E. Listy zebrane/ red. E. Jankowski. T. IX. – Wrocław, 1981, S. 486; Urkowski R., U źródeł Grodzieńskiego Towarzystwa Rolniczego: Grodzieński Syndykat Rolniczy i jego prezes Otton Baehr w latach 1899–1907 [w:] Znakomici Grodnianie przełomu XIX i XX wieku. Zasięg i skutki powstania styczniowego na Grodzieńszczyźnie – Ludzie powstania, Grodno 2018, s. 158–159.

Бакст Леан, сапраўднае Леў Самуілавіч Розэнберг, мянушка паходзіць ад прозвішча бабулі Бахтэр (9.05.1866, Гродна – 27.12.1924, Парыж) – выдатны дзеяч мастацтва і культуры, жывапісец, графік, тэатральны мастак, заканадаўца мод. Нарадзіўся ў дробнабуржуазнай сям'і: дзед быў багатым краўцом, бацька займаўся гандлем. Хутка пасля яго нараджэння бацькі пераехалі ў Пецярбург, дзе Б. скончыў гімназію. Вучыўся ў Пецярбургскай акадэміі мастацтва (1883–1887). Ужо студэнтам зарабляў на ілюстрацыях кніг. Першае публічнае выступленне Б. як жывапісца адбылося ў 1889 на "Першай выставе расійскіх і фінскіх мастакоў": жанравая карціна "Сужэнцы", якая ў 1989 экспанавалася ў Магілёве і Гродне. Правёў персанальныя выставы ў Парыжы (1911), Лондане (1912, 1913, 1914, 1917), Берліне (1913), Стакгольме (1913), Нью-Ёрку (1913, 1914, 1914, 1916, 1920, 1922), Бостане (1914), Філадэльфіі (1914, 1923), Лос-Анджэлесе (1924) і Балтымары (1924). Удзельнічаў у групавых выставах рускіх мастакоў у Парыжы (галерэі La Boëtiei і Devambez, 1921), Нью-Ёрку (Бруклінскі музей, 1923; Grand Central Palace, 1924).

Б. уваходзіў у аб'яднанне "Свет мастацтва" (1898), а затым – у "Саюз рускіх мастакоў" (1903). Кніжная графіка (Б. супрацоўнічаў з часопісамі "Свет мастацтва", "Залатое руно", "Апалон") і станковы жывапіс Б. вытрыманы ў стылі "мадэрн". На першых этапах творчасці Б. асабліва спадабаліся старажытная Грэцыя эпохі архаікі і Усход, што мела ўплыў на яго дзейнасць у якасці

вядучага дэкаратара "Рускіх сезонаў" С. П. Дзягілева (Б. жыў у Парыжы з 1903, афармляў балеты "Клеапатра", "Жар-птушка", "Нарцыс", "Дафніс і Хлоя"). Стылізуючы матывы антычнага мастацтва і экзатычную ўсходнюю вопратку, Б. стварaў дэкараванныя, часам фантастычныя касцюмы, якія з'яўляюцца вельмі важным элементам тэатральнага відовішча. Такім чынам Б. "перенес живопись в театр, а театр перевел в живопись" (Т. Харашылава). Цікавілі Б. і тэмы філасофска-этычнага характару (ён пачаў карціну "Іуда, які размаўляе з Хрыстом"). Вядомы Б. і як партрэтыст (намаляваў Васіля Разанава, Дзягілева, Бенуа, Андрэя Белага, Сомава, Зінаіду Гіпіус і інш.). З 1908 г. працаваў мастаком сцэнаграфіі ў групе "Расійскі Балет". Напрыклад, у "Карнавале" (1910), "Нарцысе" (1911). У 1910–1920 Б. працаваў таксама ў тэатрах Лондана, Нью-Ёрка, Брусэля, Рыма. Б. – аўтар лібрэта да балетаў "Шахеразада" Рымскага-Корсакава (1910), "Жар-птушка" Стравінскага (1910), "Дафніс і Хлоя" Равеля (1912), "Тамара". Выступаў у еўрапейскіх гарадах з лекцыйнымі праграмамі па пытаннях сучаснага мастацтва і касцюма. Узнагароджаны ордэнам Ганаровага легіёна. Памёр у шпіталі Руэй-Мальмезона ад наступстваў нервовага прыпадку, які здарыўся падчас працы над балетам "Істар" В. д'Эндзі для трупы Іды Рубінштэйн. Пахаваны на могілках Баціньёль у Парыжы. Яго імем тут названая вуліца.

Літ..: Пружан И.Н. Бакст. – М.,1975; Борисовская Н. Лев Бакст. – М.: Искусство, 1979.

Балет Тызенгаўза Антонія – балетная трупа, якая была складовай часткай *тэатра Тызенгаўза*. Восенню 1773 г. кіраўнік капэлы *Леан Сітанскі* знаёміцца ў Фларэнцыі з балетмайстрам *Каэтанам/Гаэтанам Пецінэці,* які дае згоду пераехаць у Гродна (1774). Разам з ім прыехаў Людвік Пецінэці (яго лічаць братам Каэтана). У 1779, калі К. Пецінэці пераехаў у Нясвіж, балетмайстрам стаў італьянскі танцор *Казімір Аўгусцін Марэлі*. Але ён пратрымаўся нядоўга і яго замяніў у 1781 француз *Франсуа Габрыэль Ле Ду* – вучань вядомага танцора Гаэтана Вестрыса. Сярод імён гродзенскага балета вядомыя: Магдалена Вясельская, браты Пецінэці, Андрэй Кухальскі, Марыянна Адольская, Разалія Лаўцэвіч, Дарота Пякарская – (гл. *Сітанская*), М. Рымінскі, А. Дарэўская, А. Бжэзінскі, Я. Валінскі, М. Малінская. Вядомыя лібрэта трох аднаактных балетаў Пецінэці, якія паставілі ў 1778: "Сялянскі балет", "Квартэт дудараў", "Другі балет пекараў". Магчыма ў Гродне паставілі балет "Дон Жуан", бо ў жніўні 1778 Тызенгаўз закупіў да яго касцюмы ў Варшаве. З падзеннем *Тызенгаўза А.* трупа пераехала ў 1781 г. у Паставы, а ў 1785 яго спадкаемцы прадалі каралю 15 балерын ва ўзросце ад 10 да 21 года і 18 танцоўшчыкаў ва ўзросце ад 10 да 20 гадоў. Кароль 24.06.1785 даў ім вольную і выслаў у Парыж для навучання танцам. У Варшаве было заснаванае Таварыства танцораў Яго Каралеўскай Высокасці, якое працавала да 1794 г.

Крын. і літ.: AGAD, Arch. Tyzenhauza, zesp. 351, sygn. D–4, k. 4; Гостев А.П. Кронон. Летопись города над Неманом (1116–1990) / А.П. Гостев, В.В. Швед. – Гродно: НВК "Пергамент", 1993. – С. 180; Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны.

Вып. 12. – Гродна: ГАІУН, 2010. – С. 23–25; Jędrychowski Zbigniew, Teatra grodzieńskie 1784–1864, Warszawa 2012, s. 21; Mamontowicz-Łojek B. Tancerze króla Stanisława Augusta. 1774–1798. Początki polskiego baletu. – Warszawa: Rytm, 2005. – S. 38–42; Polska stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 2. – Warszawa, 1963 – S. 622, 847; Renikowa W., Tradycje teatralne Grodna // Wilno i kresy Północno-Wschodnie. T. II. Kultura i trwanie., Białystok 1906, s. 130.

Баліцкі Іосіф (каля 1897, в. Лаша – ?) – настаўнік, старшыня Гродзенскага павятовага камітэта БСРГ і акруговай управы ТБШ (1926). Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю. Вярнуўся з бежанства (1923) і актыўна ўключыўся ў беларускі рух. Сябра БПС-Р. У 1927 ад спіса аб'яднанага блока рабочых выбраны ў *раду Гродзенскую гарадскую*. Быў асуджаны па "справе 56" (1928) і арыштоўваўся за ўдзел у выданні аднадзёнкі "Пералом" (1929).

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 41.

Банапарт Жэром/Геранім (15.11.1784, Аяча, Корсіка – 24.06.1860, Шато дэ Вільжэні) – малодшы брат Напалеона Банапарта. Выхоўваўся ў вайсковай калегіі, пасля заканчэння якой стаў лейтэнантам флота. У 1801–1802 знаходзіўся на Гаіці, адкуль быў пасланы з дэпешамі ў Францыю, але, з-за пераследу англічанамі, схаваўся ў Амерыцы. Ажаніўся з дачкою балтымарскага купца Элізабэт Патэрсан (1803). У 1805 кінуў яе па патрабаванні Напалеона Банапарта і вярнуўся ў Францыю. Стаў французскім прынцам. Падчас вайны ў Сілезіі (1806), камандуючы корпусам, узяў некалькі крэпасцяў. Кароль Вестфаліі (1807–1813). Другі раз ажаніўся з прынцэсай Кацярынай, дачкой Фрыдрыха Вюртэмбергскага, і пасяліўся ў Касэлі. У перыяд *вайны 1812 г.* камандаваў адным з карпусоў французскай арміі. Б. уступіў у Гродна 30.06 са шматлікай світаю ў 80 коннікаў. Перад горадам яго сустрэў новы мэр, а шляхта і чыноўнікі-палякі віталі караля Вестфальскага на кватэры, у каменным доме *віцэ-губернатара Максімовіча* (цяпер стары будынак Гродзенскага аблвыканкама па вул. Э. Ажэшкі, 3). Жэром Банапарт разлічваў атрымаць ад Напалеона польскую карону, таму ўсяляк дагаджаў гродзенскай шляхце: наладжваў балі, прыёмы. Не забываўся і пра армію – папаўняў запасы харчавання і фуражу. 4 ліпеня на загад Напалеона пакінуў Гродна і накіраваўся на Навагрудак, каб дагнаць 2-ю армію П. Багратыёна. У гэты ж дзень загадаў генералу польскіх войск, гродзенскаму *губернатару А. Ражнецкаму* склікаць Гродзенскую канфедэрацыю (яна далучылася да Генеральнай канфедэрацыі Польшчы). Хутка Напалеон адаслаў брата ў Касэль. Падчас "Ста дзён" (перыяд вяртання Напалеона да ўлады ў Францыі) Б. адважна ваяваў пры Ліньі і Ватерлоа. У далейшым – князь Манфорцкі. Жыў у Аўстрыі, Італіі, Бельгіі. У 1847 атрымаў дазвол вярнуцца ў Францыю. Пасля абрання Людвіка-Напалеона прэзідэнтам – губернатар Дома інвалідаў. Затым маршал Францыі (1850). Дэкрэтам ад 24.12.1852 аб'яўлены спадчыннікам французскага трона

з тытулам “французскі прынц крыві і імператарскай вялікасці”. У трэці раз ажаніўся ў 1853 з маркізай Джусцінай Балдэлі.

Літ.: Niemcewicz J. U., Podróże historyczne po ziemiach polskich od 1811 do 1828 roku. Wyd. 2. – Petersburg, 1859. – S. 266; Швед В. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. / В. Швед, С. Данскіх. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2006.

Бандарына Зінаіда Аляксандраўна (11.10.1909, Гродна – 16.04.1959) – беларуская паэтэса. Нарадзілася ў сям’і настаўніка. У Гродне жыла да 1914 г. і ў 1946–1948. Скончыла Мінскі педагагічны тэхнікум. Пасля вайны ўзначаліла ў Гродне Дом народнай творчасці, друкавалася ў *“Гродзенскай праўдзе”*. Затым працавала ў музеі Я. Купалы ў Вязынцы, літаратурным супрацоўнікам у газетах “Зорка” і “Літаратура і мастацтва”. Аўтар зборнікаў вершаў і паэм: “Вершы” (1926), “Веснацвет” (1931); прозы: “Дипломная работа” (аповесць, 1953), “Галина Ильина” (аповесць, 1959), аповедаў для дзяцей “Лясныя госці” (1960), “Ой, рана на Івана” (1956).

Літ.: Пяткевіч А.М. Слова і кніга Прынёмання. Зборнік навуковых артыкулаў. –Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 97; Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. – Гродна: ГрДУ, 2000. – С. 48–49.

Бандарчук Мікалай Трафімавіч (25.10.1952, в. Сярэднія Печы Лельчыцкага раёна) – беларускі мастак, старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення саюза мастакоў Беларусі. Скончыў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва ў Р. Р. Вашчанкі). Працуе ў гэтай галіне і ў станковым жывапісе. Яго працы знаходзяцца ў дзяржаўных установах і прыватных калекцыях у Беларусі, Польшчы, Расіі, Італіі, ЗША. Узнагароджаны медалём Саюза мастакоў Беларусі “За заслугі ў выяўленчым мастацтве”.

Літ.: Карев Д. В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 68.

Бандарэнка Андрэй Васільевіч (17.07.1955, Вільнюс) – кампазітар, сябра Саюза кампазітараў Беларусі (1985), протаіерэй (2009). Скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю, Мінскую духоўную семінарыю (2002, бакалаўр багаслоўя). У 1985–1992 працаваў выкладчыкам кампазіцыі ў Гродзенскім музычным вучылішчы. Стварыў у Гродне камерны аркестр, а затым Гродзенскую капэлу (яе мастацкі кіраўнік у 1992–1996). У 1995 быў рукапакладзены ў сан дыякана. З 2000 зацверджаны духоўнікам Свята-Барысаглебскага брацтва, а з 2009 – духоўнік Гродзенскай епархіі. Ініцыятар правядзення і старшыня журы фестываля праваслаўных спеваў епархіі “Коложский Благовест”.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 68.

Банкі. Першым правобразам банка ў Гродне была купецкая кантора “Бекю і К.”, якая займалася перасылкай вэксаляў і грошай замежным гандлёвым фірмам,

С. 825

вяла карэспандэнцыю з замежнымі купцамі і прадпрымальнікамі, з'яўлялася ашчаднай касай для майстроў і замежных рабочых. Але больш паспяхова банкі дзейнічалі пасля адмены прыгоннага права. З 16.08.1884 г., дзякуючы намаганням У. П. Сербіна (першага кіраўніка), у Гродне пачало дзейнічаць мясцовае аддзяленне Расійскага дзяржаўнага банка (да 14.12.1917). Яно займалася камерцыйнымі аперацыямі, улікам вэксаляў, выдаваннем пазык, крэдытаў, прыёмам укладаў на захаванне ад устаноў і прыватных асоб. У склад аддзялення ўваходзілі кіраўнік, сакратар, кантралёры, касіры, бухгалтары. З 10.02.1885 пачало дзейнічаць Гродзенскае аддзяленне Сялянскага пазямельнага банка (да 8.12.1917), які ў 1913 г. пераехаў у новы *будынак* (арх. Б. Астраумаў), які захаваўся да нашых дзён (вул. Леніна, 22, гарнізонны штаб). Аперацыйная зала знаходзілася на 2 паверсе. Займаліся прыёмам і разглядам заяў аб выдачы пазык таварыствам і асобным сялянам на куплю зямлі. У склад аддзялення ўваходзілі кіраўнік і 3 сябры. На цокальным паверсе былі архіў і службовыя памяшканні. У 1892 г. у Гродне таксама дзейнічалі: аддзяленне Пецярбургскага камісійнага Рускага гандлёва-прамысловага камерцыйнага банка, Таварыства ўзаемнага крэдыту, банкаўскія канторы "Ашкеназі", "Вайсбрэм", "Ландаў", "А. Тарлоўскага". У канцы XIX ст. на сённяшняй вул. Сацыялістычнай, 19. працаваў Народны банк, а пазней Польскі банк. 27.08.1913 на паседжанні гарадской думы гаварылі пра адкрыццё з 1.10. гарадскога банка ў будынку Таварыства ўзаемнага крэдыту на вул. Паштовай (сёння Сацыялістычнай). Яго дырэктарам стаў спачатку палкоўнік Сулеўскі, а затым неўзабаве У. Янкоўскі. У 1930-я гады ў будынку на вул. Напалеонаўскай (сёння Карбышава, 17), пабудаваным інжынерам–архітэктарам Янам Клімашэўскім у 1933, працавала павятовае адзяленне Польскага банка (цяпер тут знаходзіцца *Бібліятэка абласная навуковая імя Карскага*). У тыя ж гады па адрасе Замкавая, 12, знаходзіўся Народны банк.

Крын. і літ.: Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С.172–173; Вашкевіч А. Біяграфіягарадзенскіх вуліц: ад Фартоў Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В. Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 12, 13 да Каложы / аўт.: А. Вашкевіч [і інш.]. – Гародня–Wrocław: Гарадз. б-ка, 2012; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 12, 13; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997.

Барадыцкі Мардэхай – доктар, прадстаўнік ад яўрэйскага камітэта ў *камітэце Часовым гарадскім* (1918), сябра Гродзенскай гарадской рады ад яўрэйскага дэмакратычнага блока (1919). Сябра праўлення Яўрэйскай рэлігійнай абшчыны (на 1921) і кіраўнік яўрэйскага культурнага таварыства "Yiddishe Kunst".

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 42.

Баран Поль, Поль Бэран, Пейсах Баран (26.04.1926, Гродна – 27.03.2011, Пала-Альта, Каліфорнія) – амерыканскі інжынер у галіне інфарматыкі. Яго бацькі паходзілі з м. Сідра Сакольскага пав. Гродзенскай губ. Праз 2 гады пасля нараджэння разам з бацькамі Б. выехаў у Бостан (ЗША), затым у Філадэльфію. Скончыў Тэхналагічны інстытут Дрэкселя (бакалаўр у 1949), Каліфарнійскі ўніверсітэт у Лос-Анджэлесе (магістр, 1959). Працаваў над праектам лічбавай сеткі перадачы дадзеных, якая была бы здольная перажыць трэцюю сусветную вайну. У 1962 г. выйшла 12-томная праца, якая ўтрымлівала праект лічбавай сеткі ARPANET. Па замове Дэпартамента абароны ЗША падзяліў яе на вайсковую MILINET і цывільную INTERNET. У 2008 прэзідэнт ЗША ўзнагародзіў Б. за ўклад у развіццё тэхналогій.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 69.

Баран (Баранаў) Сяргей (27.09.1892, в. Віцькі Гродзенскага пав. – 1937) – старшыня Гродзенскага БНК, сябра Гродзенскага *камітэта вайскова-рэвалюцыйнага* (1920). Скончыў гродзенскую сярэднюю школу, вучыўся на "вышэйшых навучальных курсах" у Кіеве (ці ў Гродне). Падчас *вайны Першай сусветнай* служыў пры вайсковай канцылярыі Паўднёвага фронту (1914–1918). Сябра партыі беларускіх эсэраў, рады БНР, старшыня *Грамады беларускай моладзі*. У 1920 арыштоўваўся бальшавікамі, але збег ад іх. У канцы 1920 стаў заснавальнікам і настаўнікам *гімназіі беларускай*. Сябра Гродзенскага прадстаўніцтва Беларускага таварыства Чырвонага крыжа (1921) і Беларускага выбарчага камітэта ў Гродне (1922). Абраны паслом у польскі сейм з Гродзенскай акругі ад блока нацыянальных меншасцяў і ўваходзіў у склад дзвюх камісій (па грамадскай апецы ды інваліднасці, па петыцыях). Ужо праз месяц пасля абрання Б. выступіў у Сейме с заявай супраць арыштаў гарадзенскіх беларусаў, затым супраць затрымання гродзенскага праваслаўнага епіскапа Уладзіміра. Выступаў таксама за ўрэгуляванне рэквізіцый зямельных надзелаў для патрэб *крэпасці Гродзенскай*. Пэўны час з'яўляўся віцэ-старшынём Беларускага пасольскага клуба. У 1923 быў асуджаны на 6 год турмы за антыдзяржаўную дзейнасць. Вызвалены ў 1926 загадам прэзідэнта Польшчы. У 1928 нелегальна перайшоў у Савецкую Беларусь. Працаваў на тытунёвым складзе, у фабрычнай краме. У 1930 паступіў у вышэйшы педагагічны інстытут у Мінску, але ў 1933 быў арыштаваны і пазней расстраляны.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 42; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 76–78; O niepodległą i granice. T. 7. Raporty Straży Kresowej 1919–1920 Ziem Północno-Wschodnich opisane /Wstęp, wybór i opracowanie J. Gierowska-Kałłaur. – Warszawa, Pułtusk, 2001, s. 267.

Бараноўскі Пётр (1911–1990) – архітэктар. Скончыў будаўнічы аддзел Дзяржаўнай тэхнічнай школы ў Вільні, значна пазней – Варшаўскую палітэхніку

(1957). У 1931–1939, 1941–1945 працаваў у Гродне: пабудова *Дома стральца*, рэканструкцыя *Старога замка*, аўтар праекта рэканструкцыі *касцёла і кляштара бернардзінскага*. На пачатку *вайны Другой сусветнай* служыў у 76-м пяхотным палку, паранены трапіў у нямецкі канцлагер у Млаве. Пасля вайны жыў і працаваў у Польшчы (Вроцлаў, Кракаў). У 1958–1980 працаваў у Міністэрстве будаўніцтва.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 43.

Барзенка Віктар Міхайлавіч (1864–?) – гродзенскі *губернатар* з 10.12.1907 па 20.12.1912. З патомных дваран, праваслаўны. Пасля заканчэння Імператарскага вучылішча правазнаўства ў чыне тытулярнага дарадцы 18.05.1883 прызначаны на службу кандыдатам на судовыя пасады да пракурора Варшаўскай судовай палаты. Вайсковую службу праходзіў у 1-й гвардзейскай Яго Імператарскай Вялікасці вялікага князя Мікалая Міхайлавіча батарэі 3-й гвардзейскай і грэнадзёрскай артылерыйскай брыгадзе. 28.01.1884 адкамандзіраваны для самостойнага вядзення следчых спраў да судовага следчага 1-га ўчастка г. Варшавы. 2.05.1884 пераведзены на службу ў МУС старэйшым чыноўнікам асаблівых даручэнняў пры мінскім губернатары. 1.05.1886 атрымаў чын калежскага асэсара. 18.07.1886 прызначаны чальцом Мінскага павятовага суда па сялянскіх справах. 2.05.1890 стаў надворным дарадцам, а 18.05.1893 – калежскім дарадцам. З 10.02.1893 па 23.11.1904 быў звязаны з Курскай губ., дзе знаходзіўся на розных пасадах у губернскім праўленні і канцылярыі губернатара. Атрымаў чарговыя чыны: стацкага дарадцы (29.08.1899) і сапраўднага стацкага дарадцы (1.01.1903). На паўгода пераехаў у Варшаву працаваць чыноўнікам асаблівых даручэнняў пры генерал-губернатары (23.11.1904 – 16.05.1905), пасля вярнуўся ў Курск: спачатку на пасаду намесніка, а пазней губернатара (10.12.1905).

З апошняй пасады і быў прызначаны гродзенскім губернатарам. У 1909 г., падчас падрыхтоўкі Другога агульнага перапісу Расійскай імперыі (1915), падрыхтаваў запіску "Положение о Первой всеобщей переписи населения Российской империи". На сходзе праваслаўных брацтваў 2.04.1909 у Гродне падтрымаў рашэнне аб павышэнні квоты прадстаўніцтва ў Думе ад рускага (праваслаўнага) насельніцтва 9-ці заходніх губерняў. У 1911 узначаліў Камітэт памяці *Сталыпіна П. А.* і садзейнічаў збору ахвяраванняў на пабудову ў Гродне яго помніка-бюста. 25.03.1912 Б. стаў тайным дарадцам. 30.09.1912 атрымаў "монаршую благодарность" за арганізацыю парадку падчас праезду імператара праз Гродзенскую губ. і побыту Мікалая II у асабістым маёнтку Белавежа (цяпер у Польшчы). Царскім указам ад 20.12.1912 Б. прызначаны на пасаду Ніжагародскага губернатара.

Узнагароды (значная частка ў гродзенскі перыяд службы): ордэны – Св. Станіслава 3 ст. (1886), 2 ст. (1895), 1 ст. (1909); Св. Ганны 3 ст. (1892), 2 ст. (1898); Св. Уладзіміра 4 ст. (1901), 3 ст. (1905); персідскі Льва і Сонца 2 ст. (1902);

медалі – Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа ў памяць удзелу ў дзейнасці таварыства ў час *вайны руска-японскай* (1908), срэбны ў памяць царавання Аляксандра III, цёмна-бронзавы за працы па Першым агульным перапісе насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. (1897), светла-бронзавы – у памяць стагоддзя *вайны 1812 г.* (1912) і 300-годдзя дома Раманавых, 25-годдзя адраджэння царкоўна-прыходскіх школ (1909); знак Чырвонага Крыжа (1908); партрэт імператара з асабістым надпісам у каштоўнай раме (1912).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 25, с. 1462, а. 4; воп.37, с. 51, а. 21 адв.; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 11–14.

Баркоўскі Фелікс (магчыма, Карлавіч), на *могілках каталіцкіх* пахаваны як "былы філарэт, генерал расійскі". Гаворка, верагодна, ідзе пра старшыню патаемнага філарэцкага тыпу таварыства "Заран" у Беластоку. У 1825 ён адмовіўся выканаць загад Ф. Ляховіча аб выключэнні з таварыства Я. Высоцкага, які паехаў у Свіслач, каб аднавіць мясцовых "Заран" і далучыць іх да Таварыства вайсковых сяброў. Б. стаў чальцом 3 ступені гэтага таварыства. Быў прыгавораны да 4 месяцаў арышту ў Бабруйскай крэпасці. Відаць, пасля ён трапіў у расійскае войска.

Літра: Швед В.В. Военные друзья // Гродно. Энцикл. справочник. – Минск, 1989; Швед В.В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў. – Мінск, 1998; Швед В.В. "Заране" // Бел. Энцикл. Т. 6. – Мінск, 1998; Швед В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гродна: ГрДУ, 2001. – с. 223.

Барматаў Уладзімір Мікалаевіч (25.10.1959, г. Сарапул у РСФСР) – мастацкі кіраўнік Гродзенскай капэлы, дырыжор яе камернага аркестра. Скончыў музычную школу (1976), Іжэўскае музычнае вучылішча (1980), Беларускую дзяржаўную кансерваторыю (1987) і асістэнтуру-стажыроўку (1989–91). Працу пачаў у гродзенскім ансамблі танца "Белыя росы". З 1991 – галоўны дырыжор і мастацкі кіраўнік Гродзенскага камернага аркестра. З 2001 кіруе Гродзенскай капэлай. Пад яго кіраўніцтвам капэла правяла больш за 500 канцэртаў у Беларусі і за яе мяжой. Дацэнт (2003) кафедры спецыяльнага музычнага інструмента ГрДУ імя Я. Купалы, загадчык кафедры (1995–2006). Узнагароджаны прэміяй А. І. Дубко (2004, 2015), медалём Ф. Скарыны (2013). Яго імя запісанае ў Кнізе славы г. Гродна (2011).

Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 68

Барыс Усеваладавіч (пасля 1117, Горадзен – пасля 1151, не пазней 1166) – гарадзенскі князь, старэйшы сын Усевалада Гарадзенскага і Агаф'і Уладзіміраўны. Упершыню згадваецца ў Іпацьеўскім летапісе пад 1144 г. разам з братам Глебам, калі яны ўдзельнічалі ў паходзе кіеўскага князя на Уладзіміра Галіцкага. А. В. Салаўёў лічыў, што было супольнае кіраванне *княствам Гарадзенскім* (дуумвірат). Барыс, магчыма, займаўся вонкавай палітыкай

і абаронай межаў Кіеўскай Русі: удзельнічаў у паходах Манамахавічаў, дапамагаў ім у барацьбе за кіеўскі стол. Але А. Кібінь з гэтым не згодны і піша, што, верагодна, Барыс княжыў у Горадзене, а Глеб – у Ваўкавыску. Пасля 1151 г. звесткі пра князя Барыса зніклі са старонак летапісу. Відаць, ён загінуў у адным са шматлікіх паходаў.

Літ.: Госцеў А.П., Швед В.В. Шлюб князя-ізгоя, або як пачынаўся Горадзен // Гродзенская праўда. – 1991. – 1 лістапада. – С. 3; Госцеў А. Азбука гарадзенца // Rocznik Grodzieński. – Grodno: Zjednoczenie społeczne Polska macierz szkolna, 2011. – С. 184–185; А. Кібінь. Ад Ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурныя трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – № 5. – С. 133.

Барысік Мацвей Адамавіч (7.06.1915, в. Міхейкі Слуцкага р-на Мінскай вобл. – пасля 1993) – партыйны і савецкі дзеяч БССР. У 1930 па камсамольскай пуцёўцы паехаў у Магнітагорск, дзе ў 1933 скончыў горна-прамысловае вучылішча. Машыніст электравоза ў Магнітагорску (з 1934). Добраахвотнікам удзельнічаў у *вайне Вялікай Айчыннай*. Ваяваў на Калінінскім фронце, быў двойчы паранены (інвалід вайны), атрымаў званне падпалкоўніка. З 1944 па 1952 знаходзіўся на савецкай і партыйнай працы ў Магнітагорску. Завочна скончыў педінстытут (гістфак), Мінскі інстытут народнай гаспадаркі і партшколу. У Гродне – з 1953: загадчык аддзела абкама, сакратар Гродзенскага *камітэта гарадскога КПБ*; старшыня Гродзенскага *камітэта гарадскога выканаўчага* (9.03.1955 – 16.09.1960); кіраўнік абласнога кіраўніцтва камунальнай гаспадаркі (з 1960). На пенсіі з 1973. Узнагароджаны трыма ордэнамі, а таксама медалямі.

Крыніца: рукапіс аўтабіяграфіі ў архіве аўтара кнігі.

Бас Ноах (1874, Васілішкі, Лідскі ў. – 24.06.1941, каля Баранавічаў) – яўрэйскі грамадска-палітычны дзеяч, сіяніст. Скончыў гродзенскую ешыву (1887). Стаў заснавальнікам першага рэфармаванага хедара ў Гродне з выкладаннем на іўрыце. Падчас *вайны Першай сусветнай* заснаваў Яўрэйскае культурнае таварыства, падтрыманае нямецкімі ўладамі. Быў адным з лідараў сіянісцкай партыі ў Гродне. Удзельнічаў у часовым гарадскім камітэце (1918) і ў гарадской радзе (1919). У 1922–1937 кіраваў створаным ім жа аддзяленнем таварыства "Тарбут". Быў сябрам рады дырэктараў яўрэйскага Народнага банка, сакратаром праўлення Саюза яўрэйскай студэнцкай моладзі (1932). Займаўся распаўсюджваннем яўрэйскіх і польскіх газет, сам часта друкаваўся ў мясцовай прэсе. Актыўна працаваў у Яўрэйскім дабрачынным фондзе "Keren Kayemet", збіраючы грошы на развіццё яўрэйскіх пасяленняў ў Палесціне, за што ўнесены ў Залатую кнігу фонду. 20.06.1941 быў арыштаваны разам з сям'ёй органамі НКУС. Па дарозе эшалон быў збамбардаваны нямецкімі самалётамі, і Б. з жонкай загінулі. Мордха-Мотла, адзін з двух сыноў, верагодна быў у гродзенскім *юдэнраце*. Дзеці Б. эмігравалі ў Ізраіль і ЗША.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 44.

Басінскі Ігар (11.04.1963, Гродна) – гродзенскі алімпіец па кулявой стральбе. Чэмпіён свету (1986) і чэмпіён Еўропы сярод юнакоў па стральбе з малакалібернага пісталета. Двухразовы чэмпіён СССР. На алімпійскіх гульнях: бронза ў Сеуле (1988), срэбра ў Атланце (1992), срэбра і бронза ў Сіднеі (2000). Вайсковец. Скончыў вайскова-палітычнае вучылішча (1988).

Літ.: Попко И.Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 47, 108–112.

Баснякі – славяне з Балканскага п-ва. У Гродне былі на службе ва ўнутранай міліцыі *Тызенгаўза А.*: наглядалі за прыгоннымі працаўнікамі на мануфактурах. На 1.07.1771 гарнізон налічваў 81 чал.: з іх – 3 афіцэры (капітан Фрыдэрык Вернецке, паручнік *Ю. Сака*, харунжы Ян Дэйбел), 10 унтэр-афіцэраў, 3 кадэты і 65 інш. Баснякі жылі ў домiках на сённяшняй вул. *Ажэшкі Э.* (па 10 з кожнага боку), якія былі пабудаваныя ў стылі барока Саксоніі і Баварыі (гл. *дом майстроў*).

Літ.: Szymański S., Bośniacy w Grodnie końca XVIII wieku. // Rocznik Białostocki. – 1981. – T. XV. – S. 151–167.

Батароўка. 1) Будынак, які знаходзіцца каля гандлёвага дома, насупраць касцёла Францішка Ксаверыя (вул. К. Маркса, 1). Паводле сведчанняў польскіх даследчыкаў Е. Лілейкі і прафесара Фішэнгера ў часы *Стэфана Баторыя* на яго месцы стаяла прыватная камяніца, а таму ён не меў да яе ніякага дачынення. Гл. *Замкавы двор*.

2) У міжваенны час так называлася агульнаадукацыйная школа № 2 імя вял. кн. літ. і кар. польск. Стэфана Баторыя, сёння – Гродзенскі педагагічны каледж па вул. Леніна. 25.11.1933 на будынку была адкрытая памятная дошка, зробленая за сродкі грамадскасці ў Чанстахове, у майстэрні брата настаўніка гімназіі Яна Шымчака. Падчас *пажару 1885* будынак згарэў, пасля адбудавання ў ім размясціліся крамы і крамкі, а на верхніх паверхах меркавалася адкрыццё *гатэля* "Цэнтральны".

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 303–304; Зусім іншы горад / Уклад. А.Ф. Вашкевіч, Т.У. Касатая. – Гродна: ТАА ""ЮрСаПрынт, 2017; Кулевіч Р.Ч. Горад адзін, успаміны розныя: Гродна 1930–1940-х вачыма жыхароў. – Гродна: ТАА ""ЮрСаПрынт, 2018; Orzeszkowa E. Dom Batorego w Grodnie //Tygodnik ilustrowany. – 1886. – 183–208. T. VIII. – s. 373–375.

Баўфал-Дарашкевіч Францішак Казіміравіч, герба Касцеша (1730 – 1805) – сеймавы дзеяч, паўстанец 1794 г. 19.04.1764 саступіў пасаду маршалка гродзенскага павета *Тызенгаўзу Антонію*, падтрымліваючы і надалей групоўку Чартарыйскіх. У Радамскай і Барскай канфедэрацыях, сейме падзелу Рэчы

Паспалітай 1773–1775 удзелу не прымаў. У 1766 стаў стражнікам і пісарам гродзенскім, у 1770 – падстоліем, а ў 1773 – стольнікам. У 1173–74 быў чальцом *Трыбунала Літоўскага*, у 1776 і 1778 – паслом *сейма Рэчы Паспалітай*. Падтрымліваў палітыку Тызенгаўза да яго падзення. З 3.02.1794 прыняў пасаду маршалка Сакольскага пав., а, калі пачалося *паўстанне 1794 г.*, 9.05 быў выбраны старшынём гродзенскай *камісіі Парадкавай цывільна-вайсковай*. Заклікаў да ўдзелу ў паўстанні, ахвяраванні маёнткаў ды вызвалення прыгонных, якія пойдуць бараніць сваю Айчыну. Сам ахвяраваў 450 злотых. Пасля задушэння паўстання эміграваў у Чэхію, адкуль вярнуўся падчас уступлення на расійскі трон Паўла I. Памёр у *Ласосне*.

Літ.: Polski Słownik biograficzny. T. II. – Kraków, 1936. – S. 378.

“Бацькаўшчына” – беларуская газета, якая выдавалася ў Гродне з 16 па 28 сакавіка 1919.

Бацюшкаў Дзмітры Мікалаевіч (1828–1909) – гродзенскі *губернатар* ад 19.04.1890 да 6.03.1899. З дваран Цвярской губ. Скончыў Маскоўскі ўніверсітэт са ступенню 1-га кандыдата фізіка-матэматычнага факультэта. З 12.11.1849 – калежскі сакратар, чыноўнік канцылярыі маскоўскага генерал-губернатара. Служыў сакратаром і дырэктарам Маскоўскага дзяржаўнага банка (17.10.1862 – 31.10.1865), а потым быў пераведзены ў Дзяржаўны кантроль. Затым былі пасады кіраўніка Казанскай кантрольнай палаты (3.01.1866), атрыманне чыноў да сапраўднага стацкага дарадцы (26.03.1876), кіраўніка Санкт-Пецярбургскай кантрольнай палаты. З 8.07.1882 па 19.07.1884 з’яўляўся падольскім губернатарам, затым да 19.04.1890 – кацярынаслаўскім губернатарам. 24.04.1888 стаў тайным дарадцам.

Указам Аляксандра III ад 19.04.1890 быў прызначаны, а з 12 мая заступіў на пасаду гродзенскага губернатара. З’яўляўся чальцом праўлення Гродзенскага адзялення Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа. 26.08.1895 г., падчас усеагульнага страйку рабочых у Беластоку з прычыны ўвядзення разліковых кніжак, і падчас страйку 1897 тлумачыў страйкоўцам фабрычныя законы, запэўніваў у немэтазгоднасці метадаў барацьбы рабочых шляхам забастовак. Але выступленні былі спыненыя сіламі казакоў. Вядомы развітальны ліст супрацоўнікаў губернатару, у якім гаварылася: “9 лет прошло с тех пор, как глубокоуважаемый Дмитрий Николаевич принял в свое управление Гродненскую губернию. Жителям г. Гродно и губернии хорошо известно, с какой любовью губернатор относился к делу, сколько гуманности, уважения к человеческой личности он обнаруживал всегда в исполнении обязанностей. Добрый, он был одинаково доступен и для сильного, и для слабого, и для дряхлых стариков, и для малых детей”.

Блізкія супрацоўнікі і знаёмыя губернатара арганізавалі развітанне з Б.: адбыўся малебен у зале Гродзенскага дабрачыннага сходу; губернатару падаравалі срэбны складны абраз з выявай Св. Дзмітрыя, Св. Кацярыны і Св. Мікалая-цудатворца; правялі падпіску на ўсталяванне стыпендыі імя Бацюшкава

ў мужчынскай і жаночай гімназіях, гарадскім вучылішчы. У 1899 было дазволена ўсталяваць стыпендыю Б. у Гродзенскай жаночай гімназіі. У Беластоку сабралі 1 тыс. 700 руб. для арганізацыі стыпендыі Б. у мясцовай Мікалаеўска-Аляксандраўскай гімназіі. *Ажэшка Э.* і яе муж, адвакат С. Нагорскі, былі ў добрых адносінах з Бацюшкавымі, запрашалі іх на абеды, далучалі да ўдзелу ў дабрачынных мерапрыемствах. Ажэшка пісала, што губернатар "человек терпимый и хорошо воспитан, с которым сжились". Царскім указам ад 6.03.1899 Б. прызначаны ганаровым апекуном Апякунскай рады Установ імператрыцы Марыі. Быў узнагароджаны 6 ордэнамі і 4 медалямі. Жонка Озерава К. Ф., падчас губернатарства мужа з'яўлялася старшынёй Гродзенскага аддзялення Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа. Пазней пры Гродзенскім дабрачынным таварыстве існавала жаночае аддзяленне Дома працы імя К. Ф. Бацюшкавай.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф.2, оп.24, д.1472, а.1; Orzeszkowa E. Dnie. – Warszawa: IBL, 2001. – S.77, 102; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 97–100.

Баяроўскі Адам – калежскі сакратар Гродзенскага паліцэйскага ўпраўлення. *Э. Заблоцкі* паказаў, што ён быў агентам рэв. начальніка Гродзенскага пав. Я. Каменскага. Б. не прызнаўся ў гэтым, але сказаў следчым, што меў кантакты з *Заблоцкім*, які даручыў яму сачыць за дзяўчынай, якая скупляла харчаванне для палітычных арыштантаў, а таксама паведамляць пра дзеянні мясцовых грамадзянскіх і вайсковых уладаў супраць паўстанцаў. Гэтыя функцыі ён выконваў з чэрвеня па верасень 1863 г. (да арышту Заблоцкага) з-за цяжкага фінансавага становішча. На следстве выказаў згоду прыняць праваслаўе (гэта змякчала пакаранне).

Літ.: Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017. – Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017. – С. 18–19.

Баярскі Пётр Міхайлавіч (1871–?) – гродзенскі губернатар з 31.12.1912 па 14.10.1913, патомны дваранін Палтаўскай губ., праваслаўны. Скончыў юрыдычны факультэт Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта і 16.06.1893 прызначаны на службу ў канцылярыю 1-га дэпартамента Сената ў чыне губернскага сакратара. Праз год – на службе ў канцылярыі крымінальнага касацыйнага дэпартамента Сената, з 2.04.1896 – малодшы памочнік обер-сакратара. 16.06.1896 атрымаў чын калежскага сакратара. 27.06.1898 прызначаны таварышам (намеснікам) Чарнігаўскага акруговага суда. За выслугу гадоў 16.06.1899 атрымаў чын тытулярнага дарадцы. 2.12.1900 пераведзены на службу ў ведамства МУС земскім начальнікам 2-га ўчастка Лубенскага пав. Палтаўскай губ. 20.06.1902 атрымаў чын калежскага асэсара. 10.07.1903 імператрыцай Марыяй прызначаны апекуном Ябланоўскага дзіцячага прытулку, якім з'яўляўся да 3.05.1907, а таксама ганаровым чальцом Лубенскага павятовага апякунства

дзіцячых прытулкаў (з 10.04.1903), з захаваннем займанай пасады. У 1904–1906 служыў у Палтаўскім губернскім органе па зямельных і перасяленчых справах. Указам Мікалая II ад 14.10.1906 прызначаны выканаўцам на пасаду саратаўскага віцэ-губернатара з чынам надворнага дарадцы. 25.11.1906 зацверджаны на гэтай пасадзе. У 1910 атрымаў чын калежскага дарадцы, а ў 1912 – стацкага дарадцы.

Указам Мікалая II 31.12.1912 прызначаны гродзенскім губернатарам. Падтрымоўваў антыпольскія тэндэнцыі: забараняў правядзенне мерапрыемстваў на польскай мове; не зацвердзіў паляка Паплаўскага на пасадзе дырэктара гарадскога банка; у школах забараняў вывучэнне каталіцкай рэлігіі на польскай мове. Быў ганаровым чальцом Камітэта па будаўніцтве Петрапаўлаўскага Суворaўскага храма ў Кобрыне.

14.10.1913 прызначаны выканаўцам абавязкаў казанскага губернатара. У 1914 атрымаў прыдворнае званне камергера, у 1915 – чын сапраўднага стацкага дарадцы. У 1916 зацверджаны на пасадзе казанскага губернатара. Атрымаў 3 ордэны і 6 медалёў, а таксама іншыя ўзнагароды: за асаблівыя заслугі па землеўпарадкаванні (1913), Таварыства Чырвонага Крыжа (1908), юбілейны знак у памяць 300-годдзя дома Раманавых (1913), пазалочаны знак для асоб, якія служылі ў дзіцячых прытулках Устаноў імператрыцы Марыі; за заслугі ў справе развіцця ваеннага паветраплавання, срэбны знак Камітэта па ўзмацненні флота Расіі (1913).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 25, с. 2906, а. 1, 23; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 135–137.

Бекеш (венг. Bekes) **Каспар** (1520 – 7.11.1579, Горадня) – венгерскі вяльможа, палітычны і вайсковы дзеяч Рэчы Паспалітай, куды прыехаў у 1577. Пачынаў кар'еру з ваяводы Сяміградзкага (Трансільваніі). Быў звязаны з яе князем Янам Запольскім, які хацеў зрабіць яго сваім пераемнікам. Але князем Трансільваніі стаў *Стэфан Баторы*. Адносіны паміж Бекешам і Баторыем былі напружаныя. Апошні захапіў ягоную крэпасць. Бекеш з падтрымкай Габсбургаў Венгрыі спрабаваў супрацьстаяць, але быў разбіты. Пасля каранацыі ў Кракаве Баторы запрасіў Бекеша да сябе і даручыў яму кіраванне венгерскай пяхотай. У войнах Рэчы Паспалітай праявіў сябе выдатным вайсковым кіраўніком, асабліва падчас абароны Эльблёнга ў 1577 і пры ўзяцці Полацка ў жніўні-верасні 1579. З 1576 па 1579 Бекеш служыў ваяводам у Гродне. Б. быў адным з першых у ВКЛ арыянінам, таму каталікі і кальвіністы (якія лічылі Б. ерэтыком) забаранілі пахаваць яго на могілках. Пахаваны ў Вільні 18.11.1579 на Лісінай Горцы, названай пазней гарой Бекеша (правы бераг р. Віліі, на ўсход ад замка Гедыміна). Смерць Б. Стэфан Баторы хацеў выкарыстаць як спробу сіл супраць Літвы: вывез цела з *Горадні*, дзе мог без праблем яго пахаваць, арганізаваў пахаванне з вайсковым гонарам і пазней пабудаваў "сябру баёў" маўзалей; эпітафію склаў і распаўсюджваў Андрэй Волан.

Літ.: Шершеневич А. …И служил воеводой в Гродно // Гродзенская праўда. – 1992. – 3.09. – С. 3; Venclova T., Wilno/ Przewodnik biograficzny. – Warszawa: PIW, 2013. – С. 33.

Беклямішаў Уладзімір Мікалаевіч (1890, Гродна – 1962, Масква) – заснавальнік навуковай школы паразітолагаў і медыцынскіх энтамолагаў. Скончыў гродзенскую гімназію з залатым медалём (1908) і Пецярбургскі ўніверсітэт (1913). Застаўся на кафедры заалогіі і параўнальнай анатоміі для падрыхтоўкі да прафесарскай ступені. У 1914 удзельнічаў у Каспійскай экспедыцыі і ў 1915 апублікаваў свае першыя працы па турбелярыях Мурмана і Каспія. Стаўшы магістрам заалогіі, быў выбраны прыват-дацэнтам Пермскага ўніверсітэта (1918). Зарганізаваў экспедыцыю на Аральскае мора (1920). У 1923–1929 працаваў дырэктарам Камчацкай біястанцыі пры Біялагічным інстытуце. Даследаваў біялогію малярыйнага камара і ажыццявіў шэраг комплексных экспедыцый ў Перадуралле і Заўралле (1924–1932), працаваў на заастанцыі ў Неапалі і малярыйнай станцыі ў Рыме (1927). З 1932 пачаў працаваць у Цэнтральным трапічным інстытуце ў Маскве, дзе даследаваў марфалогію, фізіялогію, экалогію папуляцыйнай біялогіі камароў, метады барацьбы з камарамі, эпідэміялогіі малярыі і комплексныя метады аздараўлення малярыйных тэрыторый. У 1957 пад рэдакцыяй Б. апублікаваны зборнік "Сезонныя з'явы ў жыцці малярыйных камароў". У 1934 Б. стаў прафесарам, а ў 1937, без абароны дысертацыі, атрымаў ступень доктара біялагічных навук. У 1941–1942 дапамагаў Ірану весці барацьбу з малярыяй. Асноўныя працы выйшлі ў 1940-х гадах: "Экалогія малярыйнага камара", у 2-х тамах "Падручнік медыцынскай энтамалогіі", у 2-х тамах "Пачаткі параўнальнай анатоміі беспазванковых". Пасля смерці была выдадзеная яго праца "Біяцэналагічныя пачаткі параўнальнай паразіталогіі" (1970). Лаўрэат Сталінскіх прэмій (1944, 1952), заслужны дзеяч навукі РСФСР (1947).

Літ.: Гостев А. П., Известные личности Гродно. – Гродно, 2016. – С. 76–81; Ермоленко В. А., Черепица В. Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 344–346.

Бекю Аўгуст Людвік (3.05.1771, Гродна – 8.09.1824, Вільня) – сын *Бекю Яна Людвіка*, вучыўся ў факультэцкай школе ў Гродне і Галоўнай літоўскай школе ў Вільні, у якой 28.07.1787 атрымаў залаты медаль. 29.06.1789 – доктар філасофіі, 6.01.1793 – доктар медыцыны. 1.10.1797 атрымаў пасаду віцэ-прафесара паталогіі, тэрапіі і мед. матэрыі. У 1799 – звычайны прафесар, з 1806 – прафесар звычайны паталогіі і гігіены Віленскага ўніверсітэта, у 1798–1814 – доктар у шпіталі св. міласэрнасці. Першым увёў у Літве ды Беларусі прышчэпкі ад воспы, напісаў пра гэта кнігу "O wakcynie" (Вільня, 1804). Сябра цэнзурнага камітэта. З 1810 – доктар Галоўнай віленскай семінарыі. Адзін з ініцыятараў, а з 1811 г. – старшыня таварыства ўрачоў. У 1812–13 без задавальнення аказваў дапамогу параненым французскім салдатам, а пасля вызвалення займаўся саленнем трупаў, каб выратаваць Вільню ад эпідэміі. Сібарыцтва

зблізіла яго з М. М. Навасільцавым і яго клікай. У працэсе філарэтаў праявіў дваістасць, аб чым А. Міцкевіч не пашкадаваў напісаць у цёмных фарбах у сцэнах VIII і IX трэцяй часткі "Дзядоў" (падобнага меркавання прытрымліваліся таксама Лялевель, Невяртовіч). Памёр Б. ад маланкі ў сваёй кватэры, у чым бачылі "кару нябёсаў". Другая яго жонка Саламея была ўдавой прафесара славеснасці Я. Славацкага. Яе сын Юльюш Славацкі быў незадаволены Міцкевічавай ацэнкай Б. і стаў яго ворагам. Прафесар С. Б. Юндзіл у сваіх запісках ды іншыя сучаснікі (А. Ходзька, А. Э. Адынец) абвяргаюць непраўдзівыя чуткі пра Бекю, называючы яго шляхетным чалавекам.

Літ.: Жывапісная Расія. – Мн. 1993 – С. 116; PSB, T. 1 – s. 391 – 392; Mickiewicz. Encyklopedia. /J. M. Rymkiewicz, D. Siwicka, A. Witkowska, M. Zielińska. – Łódź, 2010, s. 39–41; Venclova T., Wilno/ Przewodnik biograficzny. – Warszawa: PIW, 2013. – С. 118–119.

Бекю Якуб Якубавіч – супрацоўнік-паплечнік *Тызенгаўза Антонія* ў арганізацыі *мануфактур каралеўскіх гродзенскіх*. Ягоны дзед эміграваў з Францыі падчас пераследу гугенотаў у Прускае Памор'е. Бацька займаўся гандлем лесу, будаваў караблі, заклаў мануфактуры. Я. Бекю пачаў працу бухгалтарам у Варшаўскай кампаніі баваўняных мануфактур (1766). У 1771 г., калі яна збанкрутавала, Тызенгаўз паклікаў яго ў *Гродна,* дзе прызначыў "генеральным інспектарам гродзенскіх фабрык" і "дырэктарам мануфактурнага кантара", які кіраваў мануфактурамі каралеўскай *эканоміі.* У 1772–75 быў за мяжой, дзе па заданні Тызенгаўза наведаў прускія, чэшскія, італьянскія, шведскія, французскія, саксонскія і іншыя фабрыкі. Закантрактаваў тут рамеснікаў і выслаў іх у Гродна, знайшоў кантакты і наладзіў гандлёвыя сувязі. Вярнуўшыся з-за мяжы, да сыходу Тызенгаўза загадваў мануфактурамі як інспектар, у 1780–1787 – трымаў нагляд, апекаваўся імі, як маёр (да 06.1787), калі Станіслаў Панятоўскі падпісаў з ім дамову на арэнду гродзенскіх мануфактур. Далейшы яго лёс невядомы. Жонка Цэцылія, сын Генрык Якуб ахрышчаны ў каталіцкім *фарным касцёле* Гродна 17.05.1779. У 1779 г. напісаў і прэзентаваў каралю матэрыял аб стане гродзенскіх фабрык "Über Lie Fenler welene bei anlage der Fabaiquen zu Grodno gemacht wozden, und in administration derselben noch gemacht warden".

Літ.: Hardziejeu J. Źródła do dziejów Grodna w zbiorach krakowskich. Wstęp do badań // Pogranicze polsko-litewsko-białoruskie. Źródła historyczne – stan badań. – Białystok: wyd-wo "Prymat", 2003. – S. 29; PSB, T. 1, s. 392; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 340, 880.

Бекю Ян Людвік Якубавіч (каля 1741 – ?) – старэйшы брат *Бекю Якуба*, які і ўцягнуў яго ў службу да *Тызенгаўза*. У 1771 г. стаў тут бухгалтарам мануфактурнай канторы з платаю 1200 зл., замяшчаў брата ў 1772–1775, пакуль той быў за мяжой, у кіраванні мануфактурамі. З 1776 стаў гандлёвым прадстаўніком канторы (да 1780), падчас гэтага выязджаў за мяжу для наладжавання гандлёвых кантактаў. Быў у Брэмене, Гамбургу, Лондане, Рызе, Караляўцы. Там

ён вербаваў людзей на прадпрыемствы. З 18.05.1778 быў яшчэ і кантралёрам Літоўскай скарбавай камісіі. Пакінуў Тызенгаўза патаемна, што выклікала з боку апошняга вострую крытыку за неэтычны ўчынак. Абодва браты Бекю на працэсах Тызенгаўза далі супраць яго паказанні. У 1794 г. быў экспедытарам Найвышэйшага скарбавага дэпартамента Літоўскага ўрада. У 1796 – дырэктар памежнай мытнай службы ў Гродне. У 1797 – дарадца ў Літоўскай скарбавай палаце. Далейшы лёс невядомы. Першая жонка Караліна памерла ў Гродне ў 1782. Мелі сына Аўгуста (айчыма Юліюша Славацкага). 29.09.1794 у фарным касцёле Гродна ўзяў шлюб з Яаннай Амеліяй Бернатовіч.

Літ.: Игнатович Ф.И. Ж.Э. Жилибер и Гродненская медицинская академия / Ф.И. Игнатович // Журнал Гродненского государственного медицинского университета. – 2011. – № 2. – С. 85–90.; Шарейко П., Мойсеёнок А.Г. Август Бекю из Гродно – доктор медицины, профессор Виленского университета // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII –XIX стагоддзяў. матэр. навук.-практычн. канферэнцыі 11–12 траўня 1992 г. – Гродна-Белавічы: Б.в., 1992 – С.44–47; PSB, T. 1, c. 393

“Беларускае слова” – гродзенская газета, якая выдавалася з кастрычніка 1920 да 07.01.1921 г. Тут публікаваліся палітычныя, эканамічныя і культурніцкія матэрыялы з пазіцый барацьбы за нацыянальнае вызваленне, ацэньваліся міжнародныя і мясцовыя падзеі.

“Беларуская справа” – газета-орган Цэнтральнага беларускага нацыянальнага камітэту, выдавалася з 2 кастрычніка 1920 да 7 студзеня 1921 г.

“Беларуская хатка” – клуб, першая ў Гродне беларуская арганізацыя, заснаваная ў сярэдзіне лютага 1919 Т. Вернікоўскім, які прыехаў з Мінска. Большасць гурткоўцаў складалі выхадцы з Сакольшчыны. Сярод сябраў Б. х. вядомыя Янка Ляўковіч, Адольф Зянюк (апошні старшыня гуртка), Баляслаў Грабінскі, Станіслаў Грынкевіч, Зыгмунт Абрамовіч, Адам Бычкоўскі, Канстанцін Пушкарэвіч (а ўсяго было каля 30 сябраў). Гурток меў бібліятэку. Гісторык Чарнякевіч А. сцвярджае, што ў канцы сакавіка 1919 у Б. х. адбыўся ўрачысты вечар у гонар урада БНР (ёсць і адпаведны здымак). Пад спецыяльнымі запрашэннямі для гасцей стаялі подпісы *Алексюка П.* і Фохта А. Выступілі Луцкевіч А., прадстаўнікі Польскай партыі сацыялістычнай і яўрэйскай гміны: адбылася дыскусія між тымі, хто лічыў, што Беларусь мела раней сваю незалежнасць і тымі, хто гэта адмаўляў. Будынак клуба знаходзіўся на сучаснай вул. Карбышава, 10. Пабудаваны быў у 1888. У 1919 тут жылі Тамаш Грыб і *Паўліна Мядзёлка*.

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктурн. энцыкл. даведн. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 52; Павач. Андрэй. Шпацыр па Гародні. Шляхаводнік. – Вільня: ЕГУ, 2018. – С. 6–7; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў / А. Чарнякевіч. – Мінск: Янушкевіч, 2015, с. 37–39, 66, 149.

Беларуская ўправа Гарадзенскага краю была створаная ў сяр. кастрычніка 1918, спачатку пад назвай Руская ўправа Гродзенскай губ., па ініцыятыве праваслаўнага епіскапа Уладзіміра і Я. Курлова. На чале стаялі расейцы і беларусы прарасейскай арыентацыі, якія меркавалі замяніць сваёй дзейнасцю былое *праўленне губернскае*. Пачаткова былі ў складзе ўправы і не русафілы: *Грыкоўскі А*., адвакат В. фон Дзітман, У. Зянковіч.

Літ.: Міхалік Д. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920: Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці. – Смаленск: Інбелькульт, 2015, с. 320.

“Беларускі інстытут гаспадаркі і культуры” быў створаны ў 1926 г. дзеячамі Беларускага сялянскага саюза (дэпутаты Ф. Ярэміч і В. Рагуля) і партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя (А. Станкевіч, В. Гадлеўскі, Л. Хвецька). Існаваў да студзеня 1937. Чальцы інстытута арганізоўвалі бібліятэкі, падтрымоўвалі развіццё рамёстваў, засноўвалі кааператывы, машынныя станцыі на вёсках, прапагандавалі меліярацыю з мэтаю пашырэння пасяўных плошчаў сялян. Аддзел інстытута дзейнічаў і ў Горадні.

Літ.: Верас З. Я помню ўсё: успаміны, лісты. – Гародня-Wrocław: Гарадз. б-ка, 2013.

“Беларусь” – газета, рэдакцыя якой знаходзілася ў доме Ромэра (цяпер вул. Савецкая, 23).

Бенецкі Мікалай Іванавіч – паўстанец 1863 г., дваранін, нарадзіўся ў Магілёве, на час паўстання меў 26 гадоў, выхоўваўся ў Слонімскім дваранскім вучылішчы. За ім і бацькамі нерухомай маёмасці не было. Служыў у гродзенскай паштовай канторы, затым памочнікам слонімскага паштмайстра (снежань 1863), губернскі сакратар. Паводле паказанняў Э. Заблоцкага Б. перадаваў праз казённую пошту рэвалюцыйную карэспандэнцыю. У сваёй віне не прызнаўся, гаворачы, што па службовых абавязках прымаў законна афармленую карэспандэнцыю ад усіх, не выключаючы, што сярод яе магла быць і тайная ад паўстанцаў. Пад следствам сядзеў у мурах *кармеліцкага касцёла* ў Гродне. Паводле прыгавору вызвалены ад суда і арышту. Высланы на месца жыхарства пад суворы паліцэйскі нагляд, секвестр зняты.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а., а. 8; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 69 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 12 адв., 272–274; с. 1., а. 561 адв.; Jodkowski. Sylwety z roku 1863 // Echo Grodzieńskie. – 1926. – № 8. – S. 3.

Бенкен Густаў (1890 – 24.02.1935, Варшава) – намеснік каменданта пажарнай аховы. Служыў у польскіх легіёнах і пазней быў адным з арганізатараў у Гродне Саюза легіянераў. Камендант павятовага Саюза стральцоў. Узнагароджаны Крыжам Незалежнасці.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 46.

Беразоўскі Давід (20.01.1896 – пасля 1941) – рэдактар газеты "Grodner Moment". Скончыў гімназію. Як журналіст неаднаразова прыцягваўся да судовай адказнасці. Сябра сіндыкату журналістаў Беластоцкай акругі. Жыў па вул. Дамініканскай, 7. Загінуў у канцлагеры Трэблінка.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 46; Sawoniewski L., Saga o Grodnie. – Białystok, 1994, s. 85.

Берастнеў Мікалай Міхайлавіч (20.05.1867, Гродна – 1910, Масква) – урач-бактэрыёлаг. Выпускнік Гродзенскай гімназіі. Скончыў курс у Маскоўскім універсітэце. У 1897 абараніў доктарскую дысертацыю "Актынамікоз і яго ўзбуджальнікі" (апублікаваная ў Маскве, 1897) і працаваў прыват-дацэнтам Маскоўскага універсітэта. Памочнік дырэктара Маскоўскага бактэрыялагічнага інстытута (1895–1904). Удзельнік навуковых экспедыцый па даследаванні чумы ў Індыі (Бамбей) і на Каўказе (Батумі), малярыі – ў Італіі і Расіі. Загадчык супрацьчумнай лабараторыі на форце "Аляксандр I" у Кранштаце (1904–1908). Дырэктар Маскоўскага бактэрыялагічнага інстытута (1908–1910). Быў адным з распрацоўшчыкаў супрацьдыфтэрыйнай сывараткі.

Аўтар навуковых прац па бактэрыялогіі дыфтэрыі, халеры, чумы і малярыі: О приготовлении противодифтерийной сыворотки в Московском бактериологическом институте// Рус. арх. і патол. клин. мед. и бактериол., т. 1, вып. I. – 1896. – с. 81; Окраска плазмодий малярии и других простейших по способу Романовского и его видоизменения// Тамсама. – Т. 10. – 1900. – с. 399; О бактерилогическом исследовании подозрительных по чуме больных и трупов // Вестн. обществ. гиг. – 1902. – май. – с. 643.

Літ.: Ермоленко В. А., Черепица В. Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 346; Соловьев С. В. Научная деятельность Н. М. Берестнева (К 50-летию со дня смерти), Журн. микр., эпид. и иммун. – 1963. – № 1, с. 153.

Бергман (дзяв. прозв. Кучкоўская) **Аляксандра** (1.05.1906, Гродна – 20.06.2005, Варшава) – сябра Гродзенскага акруговага камітэта Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі (1924), гісторык. Вучылася ў прыватнай гімназіі Вальдмана, дзе далучылася да камуністычнага руху. Працавала ў кравецкай майстэрні (1923), арганізавала першамайскі мітынг на пл. Баторыя. За неліквідацыю плыні "сэцэсіі"у мясцовай камсамольскай арганізацыі была знятая з пасады сакратара. У 1925 працавала інструктарам камсамола Заходняй Беларусі, у 1927 вучылася ў партыйнай школе КПЗБ у Мінску. Пазней была сакратаром партыйнай арганізацыі на Гомельшчыне. У 1935 была рэпрэсаваная органамі НКУС, у 1945 выехала ў Польшчу. Тут працавала на паліграфічным камбінаце, у рэдакцыі часопіса "Życie partii". Як гісторык даследавала рэвалюцыйна-вызваленчы рух у Заходняй Беларусі, пісала пра дзеячаў КПЗБ. Рэабілітаваная ў 1956.

Літ.: Рэгіёны Беларусі. Т. 4, кн. 1. – Мінск: БелЭн, 2014, с. 45. Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 47.

Бернулі Ёган, Ёган III Бернулі (4.11.1744, Базэль – 13.07.1807, Берлін) – швейцарскі/нямецкі астраном (1764) і вандроўнік. Ужо ў 19 год стаў сябрам Прускай Акадэміі навук у Берліне ў класе матэматыкі. Праз год узначаліў берлінскую астранамічную абсерваторыю. У 1778 быў у Гродне, дзе азнаёміўся з гродзенскімі мануфактурамі, медычнай школай, тэатрам, пазнаёміўся з прэзідэнтам горада *Сталінскім*, прафесарам *Жыліберам Ж. Э.*, генеральным інспектарам прадпрыемстваў *Бекю*, архітэктарам *Сака Дж.* Свой дзённік, дэтальныя нататкі якога рабіў падчас вандроўкі, дапоўніў у Берліне звесткамі з літаратуры, артыкулаў з розных газет і часопісаў. У дзённіку Б. пакінуў звесткі пра тое, што ўбачыў у Гродне.

Нямецкі арыгінал дзённіка: Bernoully J., Reisen durh Brangerburg, Pommerh, Preussen, Gurland, Rusland und Polen in den Jahren 1777 und 1778, b. 6. – Leipzig, 1780. Польскае выданне: Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 329–475. Фрагмент беларускага пераклада па Гродна змешчаны ў кнізе: А. П. Грыцкевіч, А. І. Мальдзіс, Шляхі вялі праз Беларусь. – Мн., 1980. – С. 210–212.

Літ.: Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 20–21.

Берсан Станіслаў Ігнацьевіч (1895, Варшава – 21.04.1919) – нам. старшыні Мінскай вайсковай рады, палітычны камісар ВРК Заходняга фронту (15.11.1918 – 6.01.1919). Старшыня Гродзенскага губернскага рэвалюцыйнага камітэта (з 4.02.1919). Арганізатар Віленскай вайсковай рады. Чалец Часовага рабоча-сялянскага ўрада Літоўска-Беларускай ССР (наркам Дзяржканторолю).

Бжэзінскі Адам – артыст *балета Тызенгаўза*. У верасні і кастрычніку 1778 г. выступаў у пастаноўцы "Шлюб самнітаў", далей быў у Варшаве, дзе выступаў у 1786 у балеце "Мірза і Ліндэр", у лістападзе 1788 – у балеце "Ванда, польская каралева", у 1790–1793 – у балеце "Клеапатра",

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. T. II. – Lwów, 1925. – S. 331, 333, 334, 338.

Бібліятэка гарадская публічная – адна з першых у Беларусі. Каля яе вытокаў стаяў беларускі педагог бібліяфіл, выпускнік Варшаўскага ўніверсітэта Ігнат Кулакоўскі. Ён быў апекуном Б. у 1830–1837. Рашэнне аб яе адкрыцці было прынятае гродзенскім *губернатарам М. Т. Бабяцінскім* у верасні 1830. Дазвол міністра народнай адукацыі на адкрыццё у Гродне бібліятэкі быў дадзены 6.08.1834. Першым бібліятэкарам стаў прэфект *гімназіі гродзенскай М. Зялёнка*. Пасля яго высылкі ў Сібір пасаду займаў Тадэвуш/Фама Красоўскі (з 17.09.1830), затым з 1831 Фадзей Левановіч. Спачатку чытачоў было няшмат і яны паходзілі са шляхецкіх саслоўяў. З 1859 паводле прапановы

губернатара дзяржаўным службоўцам Гродна прапанавалі адлічваць 1% ад месячнай зарплаты на карысць бібліятэкі для набыцця кніг, перыёдыкі. У 1865 быў зацверджаны Статут Б. і склад яе Праўлення: дырэктар *гімназіі мужчынскай гродзенскай*, рэктар мясцовай духоўнай семінарыі, вядомыя гісторыкі-краязнаўцы Гродзеншчыны (*Я. Ф. Арлоўскі, А. Е. Багдановіч, Ю. Ядкоўскі* і І. Г. Астравумаў). У 1876 выпрацаваны праект яе новага статута. З 1877 Б. пачала атрымліваць дзяржаўную дапамогу ў памеры 800 руб. З 1886 адчыніўся кабінет для чытання. У 1891 сябраў бібліятэкі было 42 асобы, тых, хто меў месячныя абанементы – 687, пабочных асоб – 2 665; да 1 студзеня 1892 г. кніг і перыёдыкі – 6 719 тамоў. Зводны каталог фондаў Б. зрабіў А. Багдановіч і выдаў яго ў 1895. Карысталіся Б., на думку даследчыка А. Пяткевіча, браты Эдуард і Зыгмунт *Урублеўскія, С. Касцялкоўскі, В. Касцялкоўская, Э. Ажэшка,* А. Багдановіч, Я. Арлоўскі і гісторыкі навучальных устаноў Гродна. У 1919–1939 Б. дзейнічала як цэнтральная бібліятэка Гродна і павета. Да 1926 мела каля 30 тыс. тамоў, у тым ліку звыш 20 тыс. расейскіх (кнігі розных адукацыйных і асветніцкіх расейскіх устаноў) і звыш 2 тыс. польскіх, астатнія – на розных іншых мовах. Да 1939 у фондах бібліятэкі было звыш 100 тыс. тамоў, а на пачатку 1940 са старых фондаў засталося 35 тыс. і было каля 14 тыс. новых савецкіх.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і савецізацыя сяродневўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 142; Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 131; Орловский Е. Очерк истории города Гродны. – Гродна, 1889. – С. 54; Пяткевіч А.М. Слова і кніга Прынёмання. Зборнік навуковых артыкулаў. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 144–151; Chwalewik E. Zbiory Polskie. Archiwa, biblioteki, gabinety, galerje, muzea i inne zbiory pamiątek przeszłości w Ojczyźnie i na Obczyźnie / E. Chwalewik. T. 1. – Warszawa, Kraków: wyd-wo J. Morkowicza, 1926. – S.113.

Бібліятэка гістарычная г. Гродна (польск. Biblioteka Historyczna miasta Grodna) – выдавецтва *магістрата,* якое з 1930 г. пачынае выдаваць серыю кніг пра Гродна. Старшынём рэдакцыйнага камітэта стаў прэзідэнт горада Антоні Ранчашак, чальцамі – прафесар Віленскага універсітэта *Касцялкоўскі Ст.*, кусташ дзяржаўнага музея *Ядкоўскі Ю.*, кіраўнік аддзела культуры і адукацыі, лаўнік Гутман К., рэдактар зборніка “Kronika Grodna” (“Хроніка Гродна”) Савіцкі Р. У 1930 г. выйшла кніга Т. Янкоўскага “Śmierć Stefana Batorego w Grodnie” (“Смерць Стэфана Баторыя ў Гродне”). У 1933 была апублікаваная кніга Т. Карноўскага “Ludwik Narbutt. Życiorys wodza w Powstaniu Styczniowym na Litwe” (“Людвік Нарбут. Біяграфія кіраўніка ў Студзеньскім паўстанні”). Апошняй з’явілася кніга К. Сідаровіч-Чарнеўскай “Sprawa emisariusza Michała Wołłowicza z r. 1833” (“Справа эмісара Міхала Валовіча з 1833 г.”).

Бібіятэка грамадская, існавала ў Гродне ў часы нямецкай акупацыі ў 1941–1944. Кнігі былі ў асноўным прапагандысцкага ды ідэалагічнага характару,

біяграфіі немцаў з гісторыі і сучаснасці, ваеннай тэматыкі. 35 выданняў з гэтай Б. г. захавалася ў спецыяльным сховішчы ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы.

Крыніца: даследчык Ігар Барынаў // ФБ, група "Запіскі беларусаведа". Доступ 27.04.2021

Бібліятэка гродзенская абласная навуковая імя Я. Ф. Карскага – створаная на базе *бібліятэкі гарадской публічнай*. У 1939 у фонды Б. трапілі зборы з усіх ліквідаваных устаноў горада і вобласці (да 35 тыс. экзэмпляраў). 1.05.1940 адбылося ўрачыстае адкрыццё Б. Цяпер ёю маглі карыстацца бясплатна працоўныя масы (да 4 тыс. чытачоў). У часы *вайны Вялікай Айчыннай* удалося захаваць толькі невялікую частку фонду, таму Б. пасля вайны папаўнялася з розных бібліятэк СССР. Абслугоўваць чытачоў стала з 26.07.1944. Знаходзілася ў будынку купцоў *Мураўёвых* на пл. Савецкай, 2. У маі 1949 адчыніўся дзіцячы аддзел, складаўся сістэматычны каталог, арганізаваны міжбібліятэчны абмен і метадычная праца з бібліятэкамі Гродзенскай вобл. 15.02.1957 Б. было нададзенае імя *Я. Ф. Карскага*. У 1950-х гадах Б. прымала актыўны ўдзел у сацыяльна-эканамічным і палітычным жыцці горада. Праводзіліся чытацкія канферэнцыі, літаратурна-мастацкія вечарыны, сустрэчы са знакамітымі людзьмі, цыклы лекцый. Паслугамі Б. карысталіся каля 10 тыс. чытачоў. Актывізавалася выдавецкая дзейнасць, ствараліся каталогі, назапашваліся розныя бібліяграфічныя матэрыялы. У 1960-я гады супрацоўнікі Б. накіравалі сваю дзейнасць на станаўленне Б. як цэнтра нацыянальнай культуры вобласці і метадычнага цэнтра для бібліятэк усіх сістэм і ведамстваў. У красавіку 1965 адкрыты дзіцяча-юнацкі аддзел, у 1966 – аддзел замежнай літаратуры. У 1970-я гады ў Б. прайшла рэарганізацыя структуры: у *доме Ажэшкі Э*. створаны юнацкі філіял і аддзел замежнай літаратуры, пачаў працу сектар (пазней аддзел) перыядычных выданняў; сектар інфармацыі па праблемах культуры і мастацтва (сёння гэта інфармацыйна-бібліяграфічны аддзел); сектар беларускай і краязнаўчай літаратуры (сёння краязнаўчы аддзел); аддзел мастацтва. У 1980 Б. была ўзнагароджаная Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. У канцы 1980-х – пачатку 1990-х бібліятэка пераязджае ў *замак Новы* (чытальны зал часова знаходзіўся ў будынку па вул. Замкавая, 21). Ствараецца аддзел аўтаматызацыі бібліятэчных працэсаў і сектар каталогаў. 20.09.1995 зацверджаны новы Статут Б. як абласной навуковай. На пач. XXI ст. бібліятэка мае болей за 45 тыс. чытачоў, якія маюць доступ да больш за 600 тыс. экз. дакументаў, базы дадзеных "Краязнаўства", "Мастацтва" і інш., электроннага каталога на 170 тыс. бібліяграфічных дадзеных, МБА і Internet, платных паслуг па ксеракапіяванні і сканаванні матэрыялаў, запісу музычных твораў. Пры Б. ёсць публічны цэнтр прававой інфармацыі. Ладзяцца навуковыя канферэнццыі, прэзентацыі кніг, дні інфармацыі. На 1.01.2018 фонд Б. налічваў 1 604 501 адзінку захоўвання. На сённяшні дзень Б. знаходзіцца ў былым будынку банка па вул. Карбышава.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 131–132; Мілоста Н.Н. Главная

библиотекаа Гродненщины в русле культурного развития области // 60-летие образования Гродненской области. – Гродно: ГрГУ, 2004. – С. 228–230.

Бібліятэка калегіума езуітаў. У 1773 г. мела 2373 кнігі на лацінскай, нямецкай, італьянскай, польскай, грэчаскай, рускай і іншых мовах, выдадзеных у айчынных і замежных друкарнях. Тут захоўваліся палітычныя, філасофскія і тэалагічныя рукапісы, у тым ліку частка *трактатаў філасофскіх*. Бібліятэка валодала "Літоўскімі казаннямі" М. Даўкшы (Вільня, 1599), тагачасная назва "Пасціла Даўкшы" – пераклад езуіта з лацінскай на польскую мову казанняў Я. Вуека, чальца ордэна і дзеяча Контррэфармацыі ў Рэчы Паспалітай, са сваёй прадмовай. У бібліятэцы былі кнігі дзеячаў Рэфармацыі і Контррэфармацыі, Арыстоцеля, Фамы Аквінскага, П. Скаргі, М. Смігліцкага, братоў Каяловічаў (Войцеха, Казіміра, Пятра), Я. Пашакоўскага, С. Кміты, Р. Дуніна і інш. У бібліятэцы знаходзіліся кнігі антычных аўтараў, якія вывучалі студэнты калегіума: Цыцэрона, Авідзія, Сенекі, Тацыта, Гарацыя, Вергілія і інш. Былі падручнікі і даследаванні па рыторыцы і паэтычным мастацтве, педагогіцы, царкоўнай і свецкай гісторыі, геаграфіі, кананічнаму і грамадзянскаму праву, граматыкі і слоўнікі па замежных мовах, кнігі па медыцыне. Захоўваліся ў бібліятэцы і кнігі забароненыя, напісаныя на лацінскай, польскай і нямецкай мовах. Яны знаходзіліся ў апошняй 11 шафе.

У каталогах езуіцкіх бібліятэк абавязкова быў раздзел "Езуістыка" або "Кнігі Таварыства": зборы папскіх бул, канонаў, дэкрэтаў езуіцкіх кангрэгацый, Статут таварыства ды іншая літаратура для службовага карыстання. З 1570 пры кожнай езуіцкай бібіліятэцы павінны былі захоўвацца адмысловыя кнігі, ў якія запісваліся сцэнічныя і аратарскія выступы, школьныя лекцыі, штогадовыя агляды па філасофіі і тэалогіі, панегірыкі.

Як правіла, бібліятэкі езуітаў размяшчаліся ў добрых і светлых памяшканнях. Кнігі стаялі ў шафах, пачынаючы ад розных выданняў Святога пісання, затым ішлі яго талкаванні, творы святых айцоў і г. д. Сваё існаванне бібліятэка скончыла пасля закрыцця ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі.

Літ.: Блинова Т.Б. Иезуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения, 2002. – Гродно ГрГУ, с. 230–239; Гродно: Энциклопедический справочник, Минск, 1989, с. 238.

Бінькоўіч Хаім-Эльяш Ёселевіч – гродзенскі фотамайстар, купец 2-й гільдыі. Да 1893 жыў у Брэсце, займаўся ў фатографа Стамлера. Фотамайстэрню ў Гродне адкрыў у 1893 (дазвол на адкрыццё атрымаў 17.02.1893 паводле ст. ст.). Яна знаходзілася ў Хлебным завулку (зараз вул. *Найдуса*). З красавіка па жнівень 1894 працаваў з П. І. Язерскім-Квятам. 12.10.1896 перадаў сваю фотамайстэрню ў поўную маёмасць *М. К. Гельгару*. На пачатку XX ст.некалькі гадоў яна працавала на вул. Саборнай (Савецкай) у доме Чартка.

Біспінг Аляксандр Камілевіч (? – 24.04.1867, Пецярбург) – уладальнік маёнткаў у Гродзенскай і Аўгустоўскай губ. (7,5 тыс. дзесяцін зямлі атрымаў

ад сваіх бабуль А. Свечынай і Ю. Вайчынскай). Скончыў нямецкую губернскую гімназію ў Міта́ве (суч. Елгава), Бонскі ўніверсітэт. У Масалянскім маёнтку (Ваўкавыскі пав.) меў вялікую бібліятэку з кніг XVIII – пачатку XX стст. У паўстанні 1863–1864 не прымаў удзелу, прытрымліваючыся кансерватыўных поглядаў, але паводле паказанняў В. Іваноўскага і А. Эйсманта быў абгавораны ў дастаўцы паўстанцам зброі і за гэта сасланы ў верасні 1863 ва Уфімскую губ. Тут Б. перайшоў у праваслаўе (10.12.1865), кантактаваў з расійскай элітай. У гэты час пазнаёміўся з дачкой уфімскага губернатара Г. С. Аксакава Вольгай, унучкай пісьменніка Сяргея Аксакава. Яны закахаліся, рыхтавалася вяселле, перад якім Б. паехаў на радзіму, каб вырашыць сямейныя справы. У лютым 1867 ён быў у Масалянах і Гродне апошні раз. Сваякі (гл. *Біспінгі*) сустрэлі яго халодна, магчыма адбыліся непрыязныя размовы, што паўплывала на Б. псіхалагічна і ён 24 красавіка брытвай перарэзаў сабе горла ў *гатэлі* "Пецярбург". Магчыма, пахаваны ў в. Струбніца каля Свята-Траецкага касцёла, побач з магіламі бацькоў, братоў і пляменніц.

Літ.: Шатырёнок И. Его личный крест //Созвучие. by/proekty/rodinovedenie-radzimaznastva/ego-lichnyj-krest.html?fbclid

Біспінгі (Біспінкі, Бышпінкі), паходзяць з нямецкай Вестфаліі, пры канцы XVIII ст. пасяліліся ў Ваўкавыскім пав., а пазней у Гродзенскім, былі уладальнікамі зямельных пляцаў у *Горадні*. У 1761 старадубаўскі харунжы Баляслаў Бышпінк набыў пляц ад жмудскага цівуна Церабешава. Ён знаходзіўся на левым баку вул. Падольскай/Падольнай, ідучы з горада з левага боку. Біспінг Ян Юзэфавіч (30.01.1880 – 04.1940), дваюрадны брат У. Друцкага-Любецкага, быў сябрам Рады і выконваў абавязкі скарбніка Гродзенскага *таварыства сельскай гаспадаркі* (1909). Спадкаемец трэцяга масалянскага ардэната і апошні ўладальнік маёнтка Масаляны. Жанаты ў першым шлюбе з Еваю з Рудамінаў, у другім – з Марыяй Юзэфай з Замойскіх. Паводле ўспамінаў гарадзенцаў-сучаснікаў, ён забіў свайго кузіна (21.04.1913).

Літ.: Записка Совета Гродненского общества сельского хозяйства // Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. Т. XI. Гродненская губерния. – СПб., 1903. – С. 230; Aftanazy R., Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. T. 3. – S. 87–88; Obiasnienie interesu Miasta Sejmowego J.K.Mci Grodna. – Grodno, 1789. – S. 26; Orzeszkowa E. Listy zebrane/ red. E. Jankowski. T. V. – Wrocław, 1961. – S. 351; Helena z Janczynowskich Roth, Czasy. Miejsca. Ludzie. Wspomnienia z kresów wschodnich, Kraków, 2009, s. 83.

С. 826

Бічэль (Бічэль-Загнетава) Данута Янаўна (1.01.1938, в. Біскупцы Лідскага раёна) – гродзенская паэтэса (друкуецца з 1958 г.), стваральніца і захавальніца Дома-музея Максіма Багдановіча (1982–1998). Шмат гадоў узначальвала гродзенскае аддзяленне Саюза беларускіх пісьменнікаў. Вучылася на настаўніцу ў Лідскім і Навагрудскім педагагічных вучылішчах, беларускім аддзяленні філалагічнага факультэта *Гродзенскага педагагічнага інстытута* імя Я. Купалы. Двадцаць гадоў працавала настаўніцай, выкладала беларускую

мову і літаратуру. У створаным ёю музеі Багдановіча ў Гродне (“агмені беларушчыны”) збіраліся абаронцы беларускай мовы і гісторыі, адраджэнцы новай Беларусі. Разам з паэтам і перакладчыкам А. Чобатам напісала паэтычную кнігу, прысвечаную Багдановічу “Ты не самотны…”. Выдала зборнікі паэзіі: “Дзявочае сэрца” (1961), “Нёман ідзе” (1964), “Запалянкі” (1967), “Доля” (1972), “Ты – гэта ты”“ (1976), “Дзе ходзяць басанож” (1983), “Загасцінец” (1985), “А на Палессі” (1990), “Божа мой, Божа” (1993), “Крэсавякі” (1993, у суаўт.), “Ты не самотны…” (1997, у суаўт.). Апублікаваныя кніжкі вершаў для дзяцей: “Перапёлка” (1968), “Грыб-парасон” (1969), “Дзічка” (1971), “Дагані на кані” (1973), “Лузанцы” (1982), “Габрынька і Габрусь” (1985), “Гарадніца” (1993), “На белых аблоках сноў” (2002), “Стакроткі ў вяночак Боржай Маці” (2004), “Ойча наш…” (2008), “Іду сцяжынаю да Бога” (2012). Выбраныя творы выходзілі ў кнігах: “Браткі” (1979), “Даўняе сонца” (1987), “Снапок” (1998). Незвычайнай з’явай у сучаснай беларускай літаратуры стала духоўная паэзія Дануты Бічэль (вершы-плачы, вершы-малітвы, вершы-медытацыі). Супрацоўнічае паэтка з часопісамі “Наша вера”, “Ave Maria”. Шмат вершаў прысвечана гісторыі *Гродна* і *Нёману*: “Гародня”, “Наш горад”, “Анёлы Гародні”, “Каложа”, “Вандроўка па Гародні”, “Санет да Нёмана” і інш. Паэтка і літаратуразнаўца А. Нікіпорчык слушна заўважыла: “Гісторыя ў Д. Бічэль не нешта мёртвае, застылае, а хутчэй – паяднанне з днём сённяшнім”. Б. піша і прозу ў галінах літаратуразнаўства і краязнаўства. М. Новік адзначыла, што “проза Дануты Бічэль – гэта гутарка, даверлівая і няспешная, з мноствам дэталяў пра розных людзей, родных, сваякоў, вяскоўцаў, пра іх заняткі, звычкі, звычаі, пра нараджэнне, каханне, пра жыццё і выжыванне роду і люду беларускага на працягу некалькіх стагоддзяў”. Перакладае з польскай, рускай і ўкраінскай моваў. Аўтарка мемуараў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы (1984), узнагароджаная юбілейным медалём імя Ларысы Геніюш (2010).

Літ.: Бічэль Д. Хадзі на мой голас. – Гродна-Вроцлаў, 2009; Новік М. Паэтычны ружанец Дануты Бічэль // Бічэль Д.І. Выбраныя творы. – Мінск: Беларуская навука, 2016. – С. 5–22; Петрушкевіч А. Старонкі Гарадзеншчыны літаратурнай. Дапаможнік. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 287–293. Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік.– Гродна: ГрДУ, 2000. – С. 32–33; Сабуць А.Э. Данута Бічэль – слаўная падвіжніца Гародні // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С.470–472

Блажаеўскі Леапольд Віктар (?, Гродна – 1863, Лёш дэпарт. Эндр-э-Люар, Францыя) – удзельнік вайны 1812, паўстанец 1830–31 гг. У 1812 служыў у 8 палку ўланаў Дамініка Радзівіла. Трапіў у палон, з якога вярнуўся ў 1814 г. У 1816 уключаны ў 4 полк уланаў, вучыўся ў школе падхаружых конніцы, 8.07.1829 атрымаў чын падпаручніка. У Лістападаўскім паўстанні служыў ад’ютантам палка, паручнікам (03.05.1831). Быў узнагароджаны залатым крыжам (10.08.1831). Пасля паразы паўстання 05.10.1831 перайшоў у Прусію. У 02.1832 прыбыў у Францыю і быў паселены ў Безансон. Удзельнічаў у франкфурцкай

экспедыцыі і 07.04.1833 перайшоў у Швейцарыю. Затым атрымаў дазвол на вяртанне ў Францыю, у 1834 г. асеў у Лёш, дзе і памёр.

Літ.: Гарбачова В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: Біяграфічны слоўнік. – Мінск, 2004, с. 59; Bielecki R. Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego. T. 1. – Warszawa, 1995, s. 211.

Блазны горада – дзівакі, якія ў розныя часы сваім абліччам і паводзінамі пужалі ці забаўлялі гараджан. У царскія часы хадзіў па гарадзенскіх вуліцах "Саша-кабан"; на прыступках перад Пакроўскім саборам сядзела "генеральша Самсонава". За польскім часам, у 1930-я гады, на вул. Грандзіцкай можна было сустрэць "Інспектаршу" – псіхічна хворую жанчыну, апранутую ў цёмную вопратку, якой не падабаліся сустрэчныя жанчыны, якіх яна голасна рэўнавала да мужа – інспектара нейкай канторы. Вартаўнік гродзенскай семінарыі Сяльверст аддаў на рамонт кляштара бернардзінак 300 злотых, хаця яны былі патрэбныя яму самому не меней. Хадзіў прыкладна ў гэты ж час па гарадскіх вуліцах Янка, апрануты ў лахманы, басанож, брудны. Калі прыйшлі бальшавікі, дачка савецкага афіцэра, ўбачыўшы яго, сказала "Татка, татка, глядзі, а тут таксама ёсць калгаснікі!". Гавораць, што падчас дэпартацый палякаў з Гродна Янка сказаў: "Вязуць іх усіх у рай зямны". У савецкі час здзіўляў гараднян Коля Вагнер, які збіраў у сваім доме (стаіць амаль насупраць *лялечнага тэатра*) на пачатку 1970-х фанаў рок-музыкі і *хіпі*. Шакаваў ён сваім выглядам: хадзіў у доўгім чорным плашчы, вакол шыі некалькі віткоў белага шаліка, на галаве чорны шырокаполы капялюш, на руках белыя пальчаткі. Меў тростку (чуткі былі пра ўмантаваны туды магнітафон) і крумкача на плячы. Вядомым быў для многіх гараджан Лютэк (сапраўднае прозвішча Ермаловіч Аляксандр), які хадзіў у лахманах і збіраў бутэлькі. Казалі, што ён сабраў значны капітал і ахвяраваў яго ў фонд міру; іншыя сцвярджалі, што ён хацеў аддаць грошы на пабудову садка пры ўмове, што яму прысвояць імя Лютэка.

З пачатку 1990-х гадоў забаўляў гараднян Станіслаў, які памёр у 2021. Ён у дзяцінстве навучыўся ў вёсцы граць на лістах і пялёстках раслін і даваў свае "канцэрты" у розных месцах горада (часцей на вакзале чыгуначным, плошчы Савецкай, у пераходзе).

Літ.: Вашкевіч А. Гарадзенкі. Жаночы след у гісторыі Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 59–62; Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018, с.125–126, 136–137; Павач А. Гродно. За (зеркалье) или новейшая история города, подслушанная на forum.grodno.net / Павач А. – Гродно: ЮрСаПрынт, 2019, с. 48–59.

Бліноў – сакратар Часовага кіравання Гродна ў 1939 г. Інфармацыі пра яго знайсці не ўдалося ні ў літаратуры, ні ў архівах.

Блок Іван Львовіч (1857, Пскоў – 21.07.1906) – гродзенскі *губернатар* з 4.06.1905 па 3.02.1906. Сын тайнага дарадцы, дзядзька паэта А. Блока, евангеліцка-лютэранскага веравызнання. Пасля заканчэння курса навук у імператарскім вучылішчы правазнаўства, у чыне губернскага сакратара 16.05.1880

прыняты на службу кандыдатам на судовыя пасады ў Санкт-Пецярбургскі акруговы суд. Праз пяць месяцаў – на службе ў 2-м, затым у 1-м следчым участку Гдоўскага ў. Санкт-Пецярбургскай губ. (да 28.11.1881), затым – судовы следчы пры Аланецкай палаце крымінальнага і грамадзянскага суда, дзе вёў частку спраў па Петразаводскім, Павянецкім, Выцегорскім участках (1881–1883). 12.05.1883 быў абраны міравым суддзёй 1–га ўчастка Гдоўскай акругі, у сувязі з чым вызвалены ад займанай пасады. 16.05.1883 атрымаў чын калежскага сакратара. 11.10.1887 і 12.10.1890 зноў быў абраны міравым суддзёй. З 1887 неаднаразова выбіраўся сябрам ад земства ў Гдоўскі павятовы вучылішчны савет. 25.06.1891 зацверджаны земскім начальнікам 4–га ўчастка Гдоўскага ў. 2.07.1891 прызначаны старшынёй адміністратыўнага судовага органа Гдоўскага павятовага з'езда. Указам Сената атрымаў чарговыя чыны: калежскага асэсара (1889), надворнага дарадцы (1893). У 1895 прызначаны старшынёй Екацерынбургскага павятовага з'езда Пермскай губ. З 1896 з'яўляўся старшынёй павятовага Камітэта апекі народнай цвярозасці (па 1897), старшынёй павятовай Перапісной камісіі па Першым усеагульным перапісе насельніцтва Расійскай імперыі. У 1898–1902 прызначаны старшынёй Пермскага губернскага земскага сходу. 16.05.1897 атрымаў чын калежскага, 16.05.1901 – стацкага дарадцы. Царскім указам ад 13.07.1902 прызначаны ўфімскім віцэ-губернатарам, 4.07.1903 пераведзены на пасаду бесарабскага віцэ-губернатара. 9.12.1904 за выдатную службу атрымаў чын сапраўднага стацкага дарадцы. Указам Мікалая II ад 4.06.1905 прызначаны гродзенскім губернатарам. Яму прыйшлося вытрымаць напружанне *рэвалюцыі 1905 – пачатку 1906.* Мітынгі, дэманстрацыі, забастоўкі задушваліся паліцыяй, казакамі, арміяй. Б. з'яўляўся старшынёй Гродзенскага таварыства апекі. 3.02.1906 Б. быў прызначаны самарскім губернатарам. Забіты сябрам лятучага эсэраўскага атрада.

Узнагароды: ордэны – Св. Уладзіміра 4 ст. (1901), Св. Станіслава 2 ст. (1897), медалі – срэбны ў памяць царавання Аляксандра III (1896), цёмна-бронзавы за працы па Першым ўсеагульным перапісе насельніцтва Расійскай імперыі 1897. Жонка – Арлова Л. І., дачка калежскага дарадцы. З'яўлялася сябрам Таварыства апекі.

Крын. і літ.: НГАРБ у Гродне, ф.2, оп.37, д.2365, л.13 об.–14. Черепица В.Н. Жертвы красного террора: о трагичной судьбе гродненскго губернатора Ивана Блока – дяди поэта Александра Блока// Гродненщина в историческом, экономическм и культурном развитии 1801–1921 (к 200-летию образования Гродненской губернии). – Гродно: ГрГУ, 2012. – С. 121–126); Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 122–124.

Бобрынскі Уладзімір Аляксеевіч (2.10.1824 – 22.05.1898) – гродзенскі *губернатар* з 17.04.1863 па 21.07.1863. З графскага роду, вядомага з канца XVIII ст., праваслаўнай веры. У 1846 скончыў С.-Пецярбургскі ўніверсітэт кандыдатам. 23.05.1846 паступіў на службу ў С.-Пецярбургскае губернскае праўленне ў чыне калежскага сакратара; 14.02.1847 зацверджаны на пасаду

сакратара 1-га аддзялення губернскага праўлення. 03.08.1848 – тытулярны дарадца. 09.06.1849 прызначаны чыноўнікам па асаблівых даручэннях пры пецярбургскім губернатары. З 23.08.1850 – камер-юнкер двара яго імператарскай Вялікасці. 30.01.1851 пераведзены ў штат канцылярыі кіеўскага грамадзянскага губернатара. 16.05.1853 выбраны кандыдатам на пасаду прадвадзіцеля дваранства Чаркаскага ў. Кіеўскай губ. 22.09 зацверджаны на пасаду са звальненнем са штата канцылярыі кіеўскага грамадзянскага губернатара, 25.03.1854 звольнены з пасады прадвадзіцеля дваранства Чаркаскага ў. З 24.04.1854 – унтэр-афіцэр Гусарскага генерал-фельдмаршала князя Варшаўскага графа Паскевіча-Эрыванскага палка, з 25 мая – нязменны ардынарац пры галоўнакамандуючым дзейнай арміі генеральфельдмаршале І. Ф. Паскевічы. Удзельнічаў у асадзе Сілістрыі, ездзіў з князем у Малдавію. З 30.05.1854 – карнет, 28.06.1854 – ардынарац камандуючага, генерала ад інфантэрыі князя М. Д. Гарчакова. Удзельнічаў у Крымскай вайне. 24.04.1855 стаў флігель-ад'ютантам імператара з пераводам у лейб-гусарскі імператарскі полк. З 12.08.1855 – паручнік, з 12.11.1855 па 10.04.1856 знаходзіўся ў Кіеўскай губ. для назірання за наборам рэкрутаў, з 14.08 па 24.09.1856 – у Маскве, у складзе імператарскай світы на каранацыі Аляксандра II. З 6.12.1856 – штабс-ротмістр. 21.04–21.06.1857 расследаваў беспарадкі паміж студэнтамі ўніверсітэта і афіцэрамі. З 3.01 па 10.01.1858 знаходзіўся ў Пскоўскай і Віцебскай губернях з мэтай вяртання збеглых сялян з будаўніцтва С.-Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі. 13.11.1858 адкамандзіраваны ва Уладзімірскую губ. для расследавання справы аб прыгнёце сялян прадвадзіцелем дваранства Задаева-Кашанскім. З 12.04.1859 – ротмістр. 3.03–3.07.1861 г. займаўся сялянскімі справамі ў Тульскай губ. З 30.08.1861 – палкоўнік. У 1863 адкамандзіраваны ў Вільню для кіраўніцтва ўпраўленнем чыгункай ад Вільні да мяжы Каралеўства Польскага і для яе абароны ад паўстанцаў. Указам Аляксандра II ад 17.04.1863 прызначаны выканаўцам абавязкаў ваеннага губернатара г. Гродна і гродзенскага грамадзянскага губернатара. 4.05.1863 стаў генерал-маёрам і быў прызначаны ў світу імператара. Указам Аляксандра II ад 21.07.1863 г. паводле асабістага прашэння звольнены, з захаваннем прыдворнага звання. 4.06.1868 прызначаны таварышам (намеснікам) міністра шляхоў зносін і сябрам савета Міністэрства шляхоў зносін. З 20.04.1869 выконваў абавязкі міністра з правам прысутнасці ў Дзяржаўным савеце. Пры ім чыгункі пачалі ўзмоцнена будавацца канцэсійным спосабам, казённыя дарогі былі перададзеныя ў прыватныя рукі. Гэта прывяло ў 1871 г. да запазычанасці прыватных кампаній дзяржаўнай казне на суму ў 174 млн. руб. 2 верасня 1869 быў звольнены па прычыне хваробы, без захавання сяброўства ў Дзяржаўным савеце.

Узнагароды: ордэны – Св. Ганны 4 ст. "За адвагу" (1855) і 1 ст. (1886), Св. Уладзіміра 3 ст. (1868); срэбны медаль у памяць аб каранацыі Аляксандра II (1856).

Крын. і літ.: НГАРБ у Гродне, ф. 1, воп. 13, с. 1369, а. 4–4 адв.; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 75–77.

Богуш Аляксандр Уладзіміравіч (15.09.1930, в. Мядзведка Карэлічскага р-на Гродз. вобл. – 17.12.2018, Гродна) – рэдактар *газеты "Гродненская правда"* (1980–1991), старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі Саюза журналістаў БССР (1970). Скончыў факультэт журналістыкі БДУ імя У. Леніна (1958), аспірантуру пры БДУ (1968). Кандыдат гістарычных навук (1970). На журналісцкай працы з 1950 (карэспандэнт газеты Мірскай машынна-трактарнай станцыі "За высокі ўраджай"). Рэдактар казлоўшчынскай раённай газеты "Сцяг перамогі" (1956–1963?), лідскай аб'яднанай газеты "Наперад" (1964–1969). З 1969 – у "Гродзенскай праўдзе" (з 1979 – намеснік рэдактара, з 1980 – рэдактар). З 1991 па 1998 – супрацоўнік Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры. З 1998 Б. быў намеснікам рэдактара часопіса "Навуковыя запіскі", а з 1999 – рэдактарам часопіса "Веснік Гарадзенскага ўніверсітэта". Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Сяброўства Народаў, медалямі. Заслужаны працаўнік культуры БССР (1987). Выдаў зборнік краязнаўчых апавяданняў "Жухавіцкае вымярэнне" (Ліда, 1997).

Літ.: Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: давед. / А.М. Пяткевіч. – Гродна: ГрДУ, 2000. – С. 33–34.

Богуш-Багавіцінавіч/Богувіцінавіч Міхаіл гл. Багавіцінавіч Міхаіл.

Боеў Усевалад Н. (1885, Гродна – 1954, Чыкага) – грамадскі і палітычны дзеяч, юрыст і журналіст, старшыня *Беларускай управы Гарадзенскага краю* (1918–1919). З дзейнасці на гэтай пасадзе вядомыя яго тэлеграмы на мірную канферэнцыю ў Парыжы і маршалу Фошу, у якіх была просьба беларускай Управы пакінуць нямецкія войскі на Гарадзеншчыне для падтрымання парадку, пакуль не будуць сфармаваныя літоўскія і беларускія вайсковыя аддзелы. Летам 1919 Б. быў арыштаваны палякамі і сядзеў у Кракаве, пасля вызвалення жыў і працаваў адвакатам у Коўне (1921–1944). Быў сябрам Камітэта абароны Літвы, працаваў у Міністэрстве беларускіх спраў і МЗС Літвы. За гэта быў арыштаваны ў 1940 савецкім НКУС. У 1944 эвакуяваўся ў Нямеччыну, а пасля заканчэння *вайны Другой сусветнай* – у ЗША, дзе стаў сакратаром Расійскага манархічнага клуба ў Чыкага.

Літ.: Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich=Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– S. 203.

Бона Сфорца д'Арагона (2.02.1494, Віджэвана, Італія – 19.11.1557, Бары, Італія) – другая жонка (18.04.1518) вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта I Старога. Паходзіць з міланскага княжацкага роду. Уплывала на дзяржаўную палітыку. Займалася інтрыгамі, вяла барацьбу з літоўскімі магнатамі, асабліва з Гаштольдамі, *Сапегамі* і *Радзівіламі*. Яе намаганнямі двухгадовы Жыгімонт II *Аўгуст* ужо ў 1522 быў аб'яўлены вялікім князем літоўскім, у 1529 выбраны на трон ВКЛ, а затым, пры жывым бацьку, абраны польскім каралём. Шляхам каралеўскіх падарункаў, выкупаў, спекулятыўных

махінацый прысвоіла вялікія зямельныя валоданні ў Літве, Вялікай Польшчы, Каралеўскай Прусіі, Чырвонай Русі. У сваіх маёнтках (на землях паўднёвай і заходняй Беларусі) у 1552–1555 правяла аграрную рэформу: загадала перамераць сялянскія землі ў валоках, перасяліць сялян са старых вёсак на выдзеленую зямлю. За яе прыкладам пайшоў Жыгімонт Аўгуст падчас ажыццяўлення "валочнай памеры".

У 1539 г. у *Горадні* быў створаны земскі павятовы суд. У 1541 г. каралева пацвердзіла *магдэбургскае права* Горадні і наказала войту мець пячатку з *гербам горада*, аддала загад магістрату ўзяць на службу майстра па абслугоўванні *гадзінніка гарадскога*. У 1541 г. у горадзе быў пабудаваны *вадаправод*, былі таксама выбрукаваныя галоўныя вуліцы і плошчы. Б. С. мела дачыненне да перабудовы ў 1551 *Фары Вітаўта*, будаўніцтва *касцёла Св. Духа* і пры ім *шпіталя* (прытулку для бедных, 1550), стварэння гарадской капэлы, фундавала ў Гродне касцёл аўгусцінцаў Св. Тройцы (1553). Да заслуг Б. С. трэба аднесці распаўсюджванне ідэй Адраджэння і гуманізма, талерантнасці і верацярпімасці. Арганізавала земскі суд, які да 1831 разбіраў цывільныя справы мяшчан. Адначасова стаў дзейнічаць гродскі суд (да 1797). Б. С. прынесла на землі ВКЛ экзатычную ўсходнюю садавіну (апельсіны, лімоны, гранаты і інш.), прыправы, салат і гародніну, выкарыстоўванне відэльца. Бона Сфорца была супраць шлюбу паміж сынам Жыгімонтам Аўгустам і Барбарай Радзівіл. Яна баялася ўзмацнення гэтага роду ў ВКЛ. Калі сейм каранаваў Барбару, Бона Сфорца ў знак пратэсту пакінула Кракаў. А маладая каралева ў 1550 г. нечакана памерла. Сям'я Сфорцаў лічылася знаўцамі ядаў, і Бону называюць атручальніцай Барбары (ядам запаволенага дзеяння сантарэлай). Пасля дазволу Жыгімонта Аўгуста пакінуць Рэч Паспалітую Бона Сфорца ў лютым 1556 з грашыма і каштоўнасцямі (29 вазоў) з'ехала ў княства Бары. Тут яна памерла, верагодна, атручаная сваім доктарам паводле загаду Габсбургаў, праціўніцай якіх была ўсё жыццё. У шлюбе ў Жыгімонта Старога і Боны Сфорцы нарадзіліся 2 сыны (Жыгімонт Аўгуст і Альбрэхт) і 4 дачкі (Ізабэла, Сафія, Кацярына Ягелонка, Ганна Ягелонка).

Літ.: Баравік П. Гарадзенскія парафіі // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 69–70; Бутэвіч А. Паміж Княствам і Каронай. – Мінск: Выдавецкі дом "Звязда", 2013. – С. 320–322; Скютте Д.Н. Бона Сфорца: королева, реформатор, политик // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада). – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 412 – 416; Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym. Wyd. Drugie. T. IV. – Warszawa, 1886. – S. 302–303; Baczkowski K., Bona Sforca d'Aragona // Słownik biograficzny historii Polski. T. 1 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C.130–131; Grodno w polskim okresie jego dziejów // Głos znad Niemna. 1917: jednodniówka grodzieńska – Grodno, 1918. – S. 18–19.

Бонча-Тамашэўскі Міхал Антоні (?–1813) – польскі драматург, перакладчык. Каля 1800 г. стаў саўладальнікам друкарні ў Гродне. У 1802 зарганізаваў

у Вільні дзіцячы балет, які ў наступным годзе пераехаў ў Гродна. Пазней збег ад аплаты падаткаў на тэрыторыю Прусіі. У 1807 вярнуўся ў Літву. У Гродне выдаў каля 1800 г. "Ахвяра Мінервы, альбо выкананыя прыгаворы. Трагедыя міфалагічна-гістарычная у 5 актах".

Літ.: Nowy Korybut. T. 6. – Warszawa, Kraków, Wrocław, 1972, s. 343 – 344.

Борыс Анжаліка (14.10.1973, в. Грабяні каля Гродна) – грамадская дзяячка польскай меншасці ў Беларусі, старшыня непрызнанага беларускімі ўладамі *Саюза палякаў на Беларусі* (СПБ) ў 2005–2010 і з 10.12.2016. Скончыла сярэднюю школу ў в. Падліпкі, педагагічны тэхнікум у Замасці (Польшча) і факультэт педагогікі і псіхалогіі ва ўніверсітэце ў Беластоку. Пасля вяртання ў Беларусь выкладала польскую мову ў гродзенскай *польскай школе* і ў в. Адэльск. На 6 з'ездзе СПБ (03.2005) была абраная кіраўніком арганізацыі, але 12 мая Міністэрства юстыцыі Беларусі скасавала рашэнне з'езда. 15.03.2009 Б. зноў была абраная старшынёй СПБ, але 14.06.2010 адмовілася ад пасады па асабістых прычынах. З сакавіка 2005 Б. праследвалася беларускімі органамі міліцыі і бяспекі (сотні допытаў і 30 судоў), падаткавымі органамі, атрымлівала вялікія штрафы. Вярнулася на пасаду старшыні СПБ у 2016. Б. мае наступныя ўзнагароды і званні: тытул "Жанчына года" польскага часопіса "Twój styl" (2006); узнагарода Сусветнага форума паланійных СМІ "Fidelis Poloniae" за ахову свабоды слова (2006); ганаровы сябра Таварыства актыўных людзей "Гарызонты" (2009); дыплом польскага Міністэрства замежных спраў за высокія заслугі ў прамаванні Польшчы ў свеце (2011); узнагарода "Polonicus" у катэгорыі "Арганізацыя паланійнага жыцця ва Усходняй Еўропе", уручаная Еўрапейскай палоніяй у супрацоўніцтве з Еўрапейскай уніяй Паланійных суполак (2014).

Літ.: Новік І. Гарадзенкі. Жаночыя гісторыі сучаснага Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 9–13; Вікіпедыя на польскай мове.

Боўфалы/Баўфалы – шляхецкі род, які валодаў зямельнай уласнасцю ў Горадні, верагодна, з канца XV ст. На вул. Маставой і Віленскай у XVIII ст. знаходзіліся валоданні гарадзенскага гродскага пісара і літоўскага межавога мерніка Юзафа Феліцыяна Б., на вул. Віленскай – гарадзенскага гродскага пісара і літоўскага лоўчага Францішка Дарашэвіча Б. (1773–1790). У 1770 ён быў падстольнікам, пазней стольнікам, падтрымліваў палітыку і дзейнасць *Тызенгаўза А*. Падчас паўстання 1794 г. быў маршалкам Сакольскага павета, таму ў Саколцы (Сакулцы) 9.05.1794 гарадзенцы і мясцовыя жыхары абвясцілі Акт далучэння да паўстання. Боўфал стаў камісарам Гарадзенскай парадкавай камісіі. Вызваліў сваіх сялян ад залежнасці за ўдзел у паўстанні. У *касцёле фарным* знаходзіцца прысвечаная яму барокавая эпітафія.

Літ.: Анішчанка Я. Ураднікі беларускіх земляў ВКЛ пры Станіславе Панятоўскім. – Мінск: Выдавец В. Хурсік, 2008. – С. 57; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 225; Швед В.В. У часы касцюшкаўскага паўстання //

Швед В.В., Госцеў А.П. Горадня. Аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.). – Гродна: Пергамент, 1997. – С. 101.

Бравер Давід (1893 ці 1898, Станіславова – 13.02.1943) – настаўнік, кіраўнік юдэнрата гета № 1. Вучыўся ва ўніверсіэтах у Чарнаўцах, Вене, Венскай (або Львоўскай) камерцыйнай акадэміі. Валодаў іўрытам. Быў настаўнікам у розных навучальных установах Польшчы, а з 1927 па 1940 у гродзенскіх установах таварыства "Тарбут" выкладаў лацінскую мову: у гімназіі, семінарыі, пачатковай школе. За тое, што зарганізаваў сярод сваіх вучняў збор сродкаў на карысць яўрэйскіх перасяленцаў у Палесціне ўнесены ў залатую кнігу "Keren Kayemet" (1938). Быў сябрам гродзенскай гарадской рады і рады яўрэйскай рэлігійнай абшчыны (1938). Пры савецкай уладзе працаваў настаўнікам нямецкай мовы і гісторыі ў школе № 7 (16.01–15.08.1940), выкладчыкам геаграфіі ў польскай сярэдняй школе № 2 і школе № 15 (1940). У 1941 трапіў у гета № 1 і быў прызначаны кіраўніком юдэнрата. Дзякуючы яму ў гета паўстаў шэраг майстэрняў і невялікіх заводзікаў. Насельніцтва забяспечылася заробкамі, жыллём і медыцынскай дапамогай. Пасля ліквідацыі гета № 2 у лістападзе 1942 Б. страціў свой статус, немцы сталі над ім здзекавацца (прымушалі прыбіраць з вуліцы снег чайнай лыжкай, несці бочку з экскрэментамі). Пасля канчатковай ліквідацыі гета Б. застрэлілі на яго вуліцы. Жонка і дзеці загінулі ў Асвенціме і Трэблінцы.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 50.

Брамы горада, будаваліся ў месцы пераходу гасцінца ў гарадскую вуліцу, пры ўездзе ў горад. Ю. Гардзееў лічыць, што тры Б. існавалі ў Горадні ўжо ў XV – 1 палове XVI ст. На паўночнай мяжы горада ў XVI ст. на збегу вуліц Віленскай і Калюцінскай знаходзілася Віленская брама (так лічыў, напрыклад, прафесар *Ткачоў М. А.*). Адсюль вул. Віленская пераходзіла ў Віленскі гасцінец, побач з якім знаходзілася *царква Св. Мікалая*. Б. згадваецца ў крыніцах 1640, 1665. У першай палове XVII ст. гарадская мяжа перайшла за гэтую браму. Паўднёвай брамай у гэты час была, магчыма, вежа на мосце праз Нёман, якая намаляваная на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта* 1567–1568. Тут знаходзіўся пункт мытнага кантролю і вартоўня моста. На вул. ад Рынку (сённяшняя К. Маркса) знаходзілася Азёрская брама, каля якой у 1567 была Крывая карчма. Па апісанні месцазнаходжання брамы лагічна падумаць, што гэта можа быць вежа-званіца *касцёла брыгітак*.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 56–57, 62–63; Гардзееў Ю. Гарадская прастора ў XVI – XVIII стст. // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 98, 103.

С. 827

Браўн Георг (1541–1622) – канонік кёльнскай катэдры, разам з гравёрам фламандскага паходжання Франсам Хогенбергем выдаў у 1575 г. у Кёльне

атлас мап, планаў і выяваў гарадоў *"Civitates Orbis Terrarum"***.** У другім томе на планшэце 48 змешчаная выява Горадні.

Брацкія магілы, знаходзяцца: 1) У парку імя Жылібера, у якой пахаваныя 46 вайскоўцаў і 4 партызаны, забітыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Сярод пахаваных два Героі СССР – *Іўлееў Ю. Д., Санфірава О. А.* і сакратар Гродзенскага падпольнага гаркама камсамола *Соламава В. І.* На магіле стаіць *помнік*; 2) На вайсковых могілках па вул. Антонава – дзве б. м.: савецкіх ваеннапалонных, расстраляных гітлераўскімі немцамі ў 1944 (120 чал.) і савецкіх вайскоўцаў, партызан і ахвяр фашызму (570 чал.). На першай стаіць помнік у выглядзе вайскоўца з аўтаматам і дзяўчыны з лаўравым вянком, на другой – скульптура жанчыны ў жалобе; 3) На вайсковых могілках па вул. Перамогі: б. м. чырвонаармейцаў, забітых у 1939 падчас вызвалення Зах. Беларусі ў перыяд *вайны Другой сусветнай*, а таксама б. м. савецкіх вайскоўцаў, забітых у 1944 падчас вызвалення Гродна ад нямецка-фашысцкіх акупантаў; 4) На вайсковых могілках па вул. Белуша тры б. м.: чырвонаармейцаў, забітых у верасні 1939, савецкіх вайскоўцаў, забітых у 1944 і савецкіх ваеннапалонных, замучаных гітлераўцамі.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк / Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 228–229.

Брацтвы – парафіяльныя рэлігійныя суполкі. Дзейнічалі пры касцёлах і цэрквах. У задачу ўваходзіла: падтрыманне і захаванне старажытных помнікаў царкоўнага будаўніцтва, распаўсюджванне кніг Святога Пісання, матэрыяльная і маральная дапамога бедным, хворым у шпіталях і вязням у турмах, развіццё царкоўных школ і да т. п. У *Фары Вітаўта* былі два брацтвы: Св. Тройцы і Св. Анёлаў-ахоўнікаў. Першае было адоранае прывілеем папы Пія IV у 1560 г., разам з *магістратам* апекавалася аднайменным алтаром. Другое заснаванае каралём Жыгімонтам Вазам і каралевай Канстанцыяй, разам з магістратам апекавалася алтаром Св. Анёлаў. Кніга гэтага брацтва са спісамі сябраў за 1628–1821 знаходзіцца ў *Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне*. Тут захоўваецца і кніга брацтва Св. Антонія Падуанскага, якое дзейнічала пры Занёманскай парафіі. Пры кафедральнай *царкве Прачысценскай* дзейнічала Брацтва Нараджэння Найяснейшай Панны. Пры *кляштары бернардзінцаў* існавалі тры брацтвы: Св. Ганны, Бязгрэшнага зачацця Найсвяцейшай Дзевы Марыі і тэрцыяры (свецкая супольнасць, збудаваная на прынцыпах адпаведных манаскай). У езуітаў дзейнічала аб'яднанне студэнтаў Найсвяцейшай Дзевы Марыі, у дамініканцаў – брацтва Пояса Св. Фамы Аквінскага, у кармелітаў – брацтва Св. Ісідора (пал. 18 ст.). Было яшчэ праваслаўнае Сафійскае брацтва (1881–1915).

Літ.: Гардзееў Ю. Гродзенскі рынак у XVI-XVIII ст. (праблемы сацыятапаграфічнага развіцця) / Ю. Гардзееў // Краязнаўчыя запіскі. – 2000. – № 5. – С. 103; Баравік П. Гарадзенскія парафіі // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам.

– Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 73–74, 77; Чарапіца В.М. Са скарбніц кніжных паліц: нарысы пра аўтографы даследчыкаў гісторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў / В.М. Чарапіца. – Мінск: БелНДЦДААС, 1994. – С. 103–104; Черепица В.. Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней). Ч. 1. – Гродно: ГрГУ, 1999. – С. 16–30



С. 828

Бровары – прадпрыемствы па вытворчасці піва, згадваюцца ў 1550–1560 гадах. Аднымі з першых былі бровары, якія ў 1559–1563 узялі ў арэнду берасцеец Я. Яўлевіч і гараднянін М. Хаімавіч. Шмат броварaў знаходзілася ў ваколіцах *замка Старога – Рынку*. Так у 1672 тут было 4 піваварні. Б. належалі не толькі *яўрэям*, прыбытковай вытворчасцю займаліся і магнаты, і *кляштары* (дамініканцы, езуіты, францішканцы). Паводле інвентару 1780/1782 (?) гг. на *Гарадніцы* дзейнічалі тры бровары. Два драўляных і крытых дранкай будынкі знаходзіліся за мастом (магчыма на тэрыторыі, дзе сёння знаходзіцца вайсковы шпіталь, бліжэй да *рэчкі Юрыдыкі*). Трэці быў таксама драўляны, крыты гонтай і знаходзіўся каля грэблі гарадніцкага возера (у дакуменце названы "вялікі стары"). Інвентар 1795 зафіксаваў мураваны двухпавярховы бровар, які замяніў драўляныя. На 1 паверсе будынка жылі майстар і працаўнікі бровара, там быў таксама склад для соладу, на другім знаходзіўся склад для ячменю. Выраблялі сталовае і карчомнае піва, у 1795 прыбытак ад продажу склаў 1736 злотых і 19 грошаў.

На *плане Гродна* 1798 пазначаны бровар падкаморыя Францішка Юндзіла, які на пачатку XIX ст. арандаваў Каспер Жыпецкі. На беразе *Гараднічанкі/Гарадніцы* ў 1798 працавалі 2 бровары насупраць *сінагогі вялікай* і *могілак яўрэйскіх*. З 1877 г. пачаў працаваць Б. у былым *палацы Сапегаў/Агінскіх*. Уладальнікам быў аўстрыйскі падданы купец Ю. М. *Кунц,* які скончыў курсы піваварaў у Празе. На прадпрыемстве працавала 18 чал., мелася паравая машына магутнасцю 8 (пазней 20) конскіх сіл. У 1870-х прадукцыйнасць складала 56, а ў 1909 г. – 120 тыс. вёдраў піва. З кастрычніка 1897 кіравалі вытворчасцю сыны Кунца: Ігнацы і Франц. З 1912 г. бровар перайшоў у валоданне зяця Ігната Б. Крэткоўскага, які давёў вытворчасць да 315 тыс. вёдраў у 1914 г. (6 млн бутэлек). У 1918 г. бровар выкупіў Юдаль Марголіс, зрабіў грунтоўную рэканструкцыю на пачатку 1920-х і пачаў выпуск піва. У 1869 г. дзейнічалі наступныя бровары: Міхаіла Роберта Турка (з 1860), Саламона Лапіна (Ляпіна) з 1863, Лейбы *Шарашэўскага* з 1871 (Рахілі Андрэс з 1892), Янкеля Лапідуса з 1849, Вільнера з 1864, Ракавіцкага з 1864, Абрама Яфэ з 1861. Пазней адкрыліся іншыя: Льва Велера ў 1877 г., Лейбы Слуцкага ў 1882 (ад яго вядзе сваю гісторыю гродзенскі лікёра-водачны завод "Неманофф"), Шалома Шарашэўскага (1891–1909), Лейбы Андрэса ("Рай") і іншыя, меншыя. У міжваенны час існавалі тры бровары: Марголіса на Садовай вул. (зараз Завадская), Эўфраіма Яфэ на вул. Збажовай (да 1928), Лейбы Слуцкага на Віленскай вул. У 1933 бровар Марголіса быў выкуплены Варшаўскім гандлёва-прамысловым таварыствам "Гарацы Гелер" і ў 1939 выпускаў каля 385 тыс. дэкалітраў піва і іншых напояў. У гэты час бровар быў манапалістам у піваварнай справе

ў Гродне. У 1950-х бровар перажыў рэканструкцыю і далей працаваў да 2007, калі быў закрыты. Меліся планы па перабудове яго ў музей броварства, але неўзабаве будынак быў спалены.

Крын. і літ.: Рэвізская сказка Гродна пачатку XIX ст.// Гарадзенскі гадавік – 2024. – № 8. – С. 45; Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 62–67; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 45–47; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 273–277; Sliż N. Horodnica grodzieńska w źródłach wizualnych i dokumentalnych (druga połowa XVIII w.) [рукапіс].

Брыгіта (1303, к. Упсалы, Швецыя – 23.7.1373) – каталіцкая святая. Заснавальніца манаскага ордэна (зацверджаны папам Урбанам V у 1370), які пасля яе смерці атрымаў ейнае імя. Кананізаваная 7.10.1391. "Шчыраванні" Б. выдадзеныя на шведскай (1857–84) і лацінскай мовах.

Брэйха Ян (каля 1885 – 1940 ?) – інжынер, капітан сапёрнай службы. У 1924 рабіў абмер Замкавай гары паводле загаду камандуючага вайсковым корпусам III. У 1939 быў кандыдатам на выбарах у гарадскую раду ад Польскага гаспадарчага аб'яднання. З прыходам Чырвонай арміі быў арыштаваны і сядзеў у Гродзенскай і Брэсцкай турмах. Далейшы лёс невядомы.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 52.

Бугроў Мацвей Іванавіч (9.11.1897, в. Грынёўка Асіповіцкага р-на – 1983, Гродна) – нам. старшыні часовага кіравання Гродна (1939). Пасля вайны (з 1944) зноў у Гродне – адказны рэдактар абласной газеты. Цягам 15 гадоў выбіраўся сакратаром выканкама Гродзенскага абласнога Савета. Узнагароджаны трыма ордэнамі, медалямі. Чалец КПСС з 1925. Узнагароджаны знакам "50 лет пребывания в КПСС".

Будзаноўскі Тэафіл (10.12.1894, Рыпін – 5.03.1959, Пётркаў Трыбунальскі) – старшыня "Камітэта барацьбы з камунізмам" у Гродне ў 1939 г., пасол у сейм па Гродзенскай акрузе (1938–1939). Настаўнік (з 1913), сябра Польскай вайсковай арганізацыі. Удзельнічаў у барацьбе за адкрыццё польскіх школ (1905). З 1928 выкладаў у гродзенскай гімназіі імя А. Міцкевіча. У 1934 – школьны інспектар у Ломжы і Беластоку, старшыня ваяводскага кіраўніцтва Федэрацыі польскіх саюзаў абароны Айчыны ў Беластоку, сябра Упраўлення акруговага стралецкага саюза, старшыня акруговай камісіі Колаў Моладзі і старшыня грамадскага Ваяводскага камітэта радыёфікацыі краіны. Па вяртанні ў Гродна служыў пры камандуючым III акругі (09.1939), быў сябрам гарадской рады (1934–39, 1939). Старшыня гродзенскай федэрацыі польскага Саюза абаронцаў Айчыны і Саюза польскіх настаўнікаў. Сябра розных партый, арганізацый і саюзаў: PPS (Польская сацыялістычная партыя), PSL (Польская

сялянская партыя) "Вызваленне", прэзідыума павятовай рады Беспартыйнага блока супрацоўніцтва з урадам (1933), акруговага праўлення Саюза рэзервістаў, Гродзенскай школьнай павятовай рады. Падчас *вайны Другой сусветнай* у Арміі Краёвай (салдат АК, камандзір 5-га Згрупавання акругі АК Варшава), намеснік камандзіра згрупавання "Kryska" у Варшаўскім паўстанні, рэдактар часопіса "Добжынская зямля". Пасля вайны пасяліўся ў Пётркаве Трыбунальскім, працаваў дырэктарам ліцэя. Узнагароджаны срэбным крыжам Ордэна Virtuti Militari.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 52–53; Zach. Biał. Wydarzenia, 1930. T. 1. C. 386.

Будынак абласнога савета прафсаюзаў, пабудаваны ў стылі "сталінскага ампіра" у 1950-я гады на месцы, дзе пры канцы XIX ст. знаходзіліся мураваныя дамы Л. Брэгмана і Я. Грынберг з крамамі Мухіна, Жоўтка, Раўтэнштэйна і дом Т. Грынберга. На пачатку XX ст. тут жыў галоўны рабін гродзенскай яўрэйскай абшчыны Гельборт Абрам. У міжваенны час у двух дамах былі ювелірныя майстэрні М. Кузніцкага і Хешэса, у трэцім доме (№ 2) – крама аўтапакрышак "Goodyear" М. Кучкоўскага і сыноў, а таксама "Dom bankowy Bracia Zakhem".

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 285;

Буйло Станіслава Антонаўна (? – 28.02.1922, Гродна) – сястра беларускай паэткі Канстанцыі Буйло, загадчыца *прытулку Беларускага дзіцячага* ў Гродне на пачатку 1920-х гадоў.

Літ.: Верас З. Я помню ўсё: успаміны, лісты. – Гародня-Wrocław: Гарадз. б-ка, 2013, с. 253, 257; Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада, Гародня-Wrocław, 2012, с. 235, 237; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў, Мінск, 2015, с. 96.

Булагін Аляксандр (?, Гродна – 1872, Нім, Францыя) – паўстанец 1830–31 гг. Навучаўся ў Віленскім універсітэце. У 1823 г. паступіў добраахвотнікам у 4 полк лінейнай пяхоты. У паўстанні служыў у чыне падафіцэра, затым падпаручнікам (13.06.1831). Пасля паразы паўстання перайшоў у Прусію (05.10.1831). На пачатку 1832 г. прыбыў у Францыю і быў паселены ў Безансоне. Прыняў удзел у франкфурцкай экспедыцыі і 07.04.1833 перайшоў у Швейцарыю. Атрымаўшы дазвол вярнуцца ў Францыю, у 1834 быў паселены ў Шалён-сюр-Марн. 13.11.1838 перасяліўся ў Нім. У сакавіку 1846 далучыўся да акту Кракаўскага паўстання. Падчас Вясны народаў у 04.1848 рушыў у Страсбург з намерам перабрацца ў Польшчу. Аднак у хуткім часе вярнуўся ў Нім.

Літ.: Bartkowski J. Spis Polaków zmarłych w emigracji od roku 1831. – ?, 1985, s. 85; Гарбачова В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: Біяграфічны слоўнік.

– Мінск, 2004, с. 65; Bielecki R. Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego. T. 1. – Warszawa, 1995, s. 269.

Бунд (Algemeiner Judiszer Arbeiter Bund in Polen) – яўрэйская партыя, згодна з рэзалюцыяй V з'езда з'яўлялася "федэратыўнай часткай РСДРП" (1898–1903, 1906–1912) і была "сацыял-дэмакратычная, не абмежаваная ў сваёй дзейнасці ніякімі раённымі рамкамі, арганізацыя яўрэйскага пралетарыята і ўваходзіла ў партыю (РСДРП – В. Ш.) ў якасці яго адзінага прадстаўніка". У Гродне дзейнічаў сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда пад кіраўніцтвам Лейбы Пінчука, складзены з нізавых ячэек (цэхавых стачачных кас рабочых), звязаных між сабой выбарнымі прадстаўнікамі з міжкасавай гарадской сходкай. Мэтай камітэта было: аб'яднанне яўрэйскіх рабочых, дасягненне яўрэйскай нацыянальнай аўтаноміі ў Польшчы, затым – перамога сацыялізму праз дыктатуру пралетарыяту, а ў перспектыве – пабудова камунізму. "Палесцінскае пытанне" разглядалася як утопія і адрыналася. Сябры гродзенскага камітэта Бунда з 1902 удзельнічалі ў палітычнай барацьбе рабочых Гродна: стачцы летам 1902 на фабрыцы бандажных і пальчаткавых вырабаў, стачцы 1903, у забастоўцы рабочых тытунёвай фабрыкі 1903–1904, у *рэвалюцыі 1905–1907 гг*. Падчас паслярэвалюцыйнай рэакцыі гродзенскі камітэт Б. адмовіўся ад палітычнай барацьбы, а галоўным кірункам яго дзейнасці стала барацьба за паляпшэнне эканамічнага становішча яўрэйскіх рабочых і дасягнення культурна-нацыянальнай аўтаноміі. У 1913 камітэт арганізаваў стачку пратэсту супраць справы яўрэя Бейліса, абвінавачанага ў забойстве хрысціянскага дзіцяці. У *вайну першую сусветную* Б. прытрымліваўся германафільскіх пазіцый. Правыя бундаўцы ў 1918–1920 змагаліся супраць савецкай улады, левыя праяўлялі хістанні. У 1921–1939 апошнія стварылі самастойную арганізацыю – Камуністычны Бунд, які ў 1923 увайшоў у Камуністычную партыю Польшчы. У 1928 камітэт меў каля 3 тыс. чальцоў і прыхільнікаў, выступаў за самастойнасць яўрэйскіх рабочых (з мэтай адцягнуць іх ад барацьбы беларусаў, палякаў і інш.). З 1927 г. выдавалася газета "Grodner Shtimme" ("Голас Гродна", рэдактар М. Рубінштэйн). У 1928 г. створаны спартовы клуб "Morgenstern" ("Ранішняя зорка"), у якім дзейнічалі некалькі гімнастычных груп, футбольная каманда, секцыя настольнага тэніса. У 1936 прадстаўнікі камітэта Бунда ўдзельнічалі ў эканамічных і палітычных *выступленнях рабочых* пад лозунгам адзінага рабочага фронту. Пасля ўз'яднання Зах. Беларусі з БССР гродзенскі камітэт Бунда спыніў сваю дзейнасць.

Літ.: Біч М., Палуян У. Гродзенскі сацыял-дэмакратычны камітэт Бунда // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3, Мн,, 1996, с. 140; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 361, 369; Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 182–184.

Буралкін Генадзь Васільевіч (12.02.1942, Ленінагорск, Казахстан – 3.01.2024, Мінск) – скульптар, графік, старшыня Гродзенскага аддзялення Саюза мастакоў БССР (1985–1989). Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1976).

З 1989 жыў і працаваў у Мінску. Старшыня Саюза мастакоў Беларусі (1990–1992). У Гродне ёсць яго працы: мемарыяльны знак у гонар 850-годдзя г. Гродна, прасторавыя кампазіцыі са шкла і металу ў Гродзенскім *тэатры абласным драматычным.*

Літ.: Беларуская энцыклапедыя: У 18 т. – Мн., 1996. – Т. 3, с. 344; Беларускі саюз мастакоў: Энцыклапедычны даведнік. –Мн., 1998, с. 69.

Бурмістр – галава рады магістрата. Згодна з прывілеем на *магдэбургскае права* ў Гродне выбіралі двух бурмістраў: праваслаўнага і каталіка. Сустракаюцца дакументы, у якіх ёсць подпісы адразу 4 бурмістраў – гэта значыць, што 2 з іх былі з ліку старой рады. Дастаткова было абрацца на пасаду адзін раз, каб потым выкарыстоўваць гэты тытул да канца свайго жыцця. Але гадавымі, сучаснымі, кіроўнымі бурмістрамі былі толькі два апошнія абраныя бурмістры. Як правіла, на пасаду бурмістра выбіралі 21 верасня (на свята нараджэння Панны Марыі) асоб з заможных вярхоў гарадскога насельніцтва. Бурмістр (пазней прэзідэнт) загадваў гарадскім скарбам, старшынстваваў на паседжаннях бурмістраўска-радзецкага суда. У канцы свайго тэрміна кіравання гродзенскія бурмістры павінныя былі рабіць фінансавую справаздачу перад войтам. У выпадку запазычанасці перад горадам яны былі абавязаныя выплаціць кампенсацыю.

Вядомыя наступныя бурмістры Гродна (пададзеныя храналагічна): гарадзенскі васкаўнічы Багдановіч Федка (1496, 1507), Мікуліч Фёдар (1502), Драбышэвіч Мацей (1528), Кудаевіч/Кудаеўскі Раман (1536, 1540, 1541), Хадкевіч Рыгор/Грышко (1536), Пешкі/Пескі Матыс (1538–1541, Пацуціч Ян (1539–1540), Міскевіч Адам (1540–1541), Павел Залатар (1540, 1548), Лянковіч Тарас (1540), Квач Ян (1540); Бернатовіч Ян, Дуевіч Раман (1541); Ляшка/ Ян Бернатовіч (1548), Гранда Шыман/Грандзіч Сымон (1561, 1575), Паўловіч Альберт (1570), Рамановіч Іван (1570), Гатнеж Ян (1571), Яцковіч Марцін (1575), Тарасовіч Іван (1600), Неапаліта Станіслаў (1616), Дзіва Ян (1616), Паплаўскі Адам (1620), Межаеўскі Станіслаў (1620), Фандэберг/Фандэберк Ганус/Ганс (1620), Крашнеўскі Міхал (1633), Яцковіч Тэадор (1634), Вараб'евіч Рыгор (1639), Жыбуль Стэфан (1639), *Цвікліч/Цвікла Станіслаў* (1641, 1642, 1646, 1653, 1654), Высоцкі Яраш (1641, 1646), Шульц Фолтын (1650, 1652, 1654?), Андрэй Каспровіч (1652), *Адамовіч* Ян (1650, 1653–57, 1659–61), Явароўскі Ян (1653), Кудаеўскі М. (1655), Лагоўскі Т. (1655), Васілевіч Мікалай (1657, 1658, 1659, 1661), Шаматула Якуб (1654?, 1659, 1661), Яблановскі П. (1655), Эйварт Міхал (1656), *Цвікліч* Адам (1659, 1662, 1664, 1655, 1670, 1672), Вільд Эрхард (1663), Зеляпуга/Залепуха Ян (1657, 1660, 1663, 1667), Багдановіч Мікалай (1659?, 1660), Барысевіч/Барысовіч Міхал (1659?, 1660), Паўльсен Ганус (1660, 1662, 1663, 1666–1669, 1674), Ляўковіч Пётр (1655, 1656, 1661), Вільд Эрхард (1663, 1666, 1667, 1671), Масніцкі Мацей (1666), Дзіва Канстанцін (1664, 1665, 1666, 1669), *Цвікліч* Казімір (1665), Пятроўскі/Пятровіч Войцех (1655, 1665, 1671, 1679), Шараўскі Якуб (1668, 1670), Концкі Пётр (1673), Багдановіч Хведар (1678), Пятроўскі Ян (1689), Разумовіч Габрыэль (1689, 1691), Шульц Ян/

Фольтына (1652, 1690), *Адамовіч* Станіслаў (1690), Храноўскі Людвік (1691), Катовіч Францішак (1696), Разумовіч Ян Казімір (1698, 1712–1714, 1716, 1717, 1719, 1723, 1724, 1727), Мейстэр Ян (1714,1715, 1718, 1720, 1723, 1725, 1726, 1729, 1730, 1735, 1737, 1739, 1741, 1744, 1747, 1748), Грыўна Маркевіч Ян (1712), Апановіч Міхал (1716, 1717), Шульц Зыгмунт (1721–1723), Судан (Судане) Юзаф (1727, 1737), Цяхлевіч Войцех (1730), Ёрдан Ян Каспар (1741, 1743, 1746, 1747, 1749), Календа Міхал (1715, 1718, 1720–1722, 1725, 1726, 1728, 1729, 1735, 1738, 1741, 1742), Маркевіч Тамаш Яўстах (1719, 1724, 1728), *Бадаракі Юзаф* (1738, 1739, 1740, 1743, 1744, 1745, 1746, 1747, 1749, 1750–1755, 1758, 1763, 1768), Сталінскі Андрэй Францішак (1745, 1748, 1749, 1750–1756, 1768. 1774, 1779), Жылінскі Вінцэнт Тадэвуш (1753–1757), Клява Тадэвуш (1763, 1768, 1779), Абрамовіч Казімір (1768, 1774), Крэйбіх Францішак (1779), Лянкевіч Данііэль (1784), Гартман/Гертман Пётр (1786, 1790), Рафановіч Якаў/Якуб (1791), Зялінскі Юзаф-Антоні (1794), Касальскі Ян (1832), Элерт (1836), Гейслер Саламон (1836).

Крын. і літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў: Wrocławska Drukarnia Naukowa PAN, 2008. – С. 354, 356, 358–362, 364–368 372–373, 376–381; Сліж Н. Магдэбургскае права ў Гародні ў канцы XV – першай палове XVI ст.: увядзенне і развіццё // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – с. 16, 25, 27–29; Н. Сліж Праца гродзенскага магістрата ў другой палове XVII ст.// Przegląd Środkowo-Wschodni. – 2021. – N 6. – s. 31–53; Стрэнкоўскі, С.П. Гарадское самакіраванне на тэрыторыі Беларусі (канец XIV – XVIII ст.). Ч. II. / С.П. Стрэнкоўскі. – Мн.: МГІРА, 2013. – С. 238–241, 299; Шаланда А. Геральдыка гарадзенскіх мяшчанаў у XVI – XVII ст.ст.: спроба класіфікацыі // Гарадзенскі соцыум. 2013. Гісторыя і памяць. XV – XX стст. / Пад рэд. А.К. Краўцэвіча, А. Ф. Смаленчука Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 56–60; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у 1743–1767 гг.// Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – с. 65–66; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у XVIII с. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. // Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 107–110; Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV – XVIII wieku. – Supraśl: Collegium Suprasliense, 2005. – S. 93, 115, 127, 135, 153–157, 222, 243, 244, 266, 275, 282; Borowik P. Funkcjonowanie samorządu miejskiego w Grodnie podczas "potopu moskiewskiego" (1655–1661) oraz kilka uwag o zniszczeniu miasta przez Moskali // Гарадзенскі палімпсест. XII-XX стст. Матэрыялы міжн. канф. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Горадня-Беласток: ІГДБ (ЕГУ). – 2008. – С. 31–32; Jodkowski J. Spis wójtów, burmistrzów i prezydentów m. Grodna // Przegląd statystyczny za lata 1922 i 1923. – Grodno, 1925. – S. 11–12; Katalog testamentów mieszkańców Brześcia i Grodna od XVI do początku XVIII wieku / Opr. N. Sliż. – Warszawa: Semper, 2017. – S. 67–75

Бурса музычная езуіцкага калегіума існавала ў 1630–1773 гг. Фундатарам бурсы лічыцца дыяцэзыяльны ксёндз Бенедыкт Нівінскі: 3 тыс. злотых, запісаныя на маёнтак Гольны. У інвентары 1773 г. запісана, што "гэтая бурса або капэла мае фундуш на Міласеўшчыне (Мілашэўшчыне), што ў мілі за Ольнамі

і ў 11 мілях ад Гродна" (фундуш Маравіцкага і жонкі). Бурсісты падзяляліся на тры катэгорыі: "inscripti bursae" – хлопчыкі-вучні, "respectivi bursae" – кандыдаты ў пастаянныя музыканты бурсы, "musici salariati" – кантрактныя спецыялісты-музыканты, якія гралі ў капэле і выкладалі ў бурсе. У 1773 г. першых было 5 чал., другіх – 4 чал., трэціх – 3 чал. (прэм'ер Л. Каршулеўскі, трубач, валтарніст і басіст Развадоўскі, скрыпач, тэнарыст і арганіст Нарушкевіч). Прэфектамі бурсы былі прафесар фізікі, матэматыкі і метафізікі а. Ян Садоўскі (1713–15), духоўнік а. Францішак Квітоўскі (1753), выкладчык філасофіі а. Фелікс Орда (1766–68), будучы прафесар схаластычнай і пазітыўнай тэалогіі, кананічнага права а. Якаў Элерт (1769), духоўнік, прэфект касцёла а. Стэфан Вярбіцкі (1769–70). У рэпертуары капэлы бурсістаў была ў асноўным рэлігійная музыка, якая выконвалася падчас службы, у пастаноўках школьнага тэатра, на ўрачыстасцях, на лекцыях, у дзейнасці рэлігійных кангрэгацый і брацтваў.

Літ.: Ляўшук У. Qui Cantu Templum Exornabant, або аповесць пра музычную бурсу ў Гародні // Гарадзенскі гадавік, Кракаў. – 2014. – № III. – С. 6–34; Lawszuk W. Bursa muzyczna kolegium godzieńskiego // Rocznik Grodzieński, Grodno 2011, c. 33–53.

Бутаўт-Андрайковіч Міхал Тадэвушавіч (у 1823 г. меў 47 гадоў) – гродзенскі губернатар. 4 гады быў віцэ-губернатарам, шмат разоў выконваў абавязкі *губернатара* і толькі 17.02.1819 г. быў прызначаны на пасаду гродзенскага губернатара (затое на 5 гадоў і 9 месяцаў). Бутаўт-Андрайковіч паходзіў са шляхты Гродзенскай губ. герба Грыф. Быў сынам пісара і падстаросты гродзенскага Тадэвуша Б.-А. У 1812 г. у якасці гродзенскага павятовага маршалка сустракаў у Гродне польскія і французскія войскі, відаць, выконваў нейкую ролю пры французскім гродзенскім губернатары В. М. А. ле Бруне (за што пазней атрымаў нараканне ад *Д. Давыдава*, які вызваліў горад ад аўстрыйскіх частак). Але гэта не перашкодзіла яму мець давер расійскай улады (можа таму, што літоўскі генерал-губернатар Л. Л. Бенігсэн з 1803 г. быў жанаты на сястры Бутаўта-Андрайковіча). Менавіта яму просіць дапамагчы літоўскі губернатар А. М. Рымскі-Корсакаў у лісце да Ланскога ад 28.12.1812 (ст. стыль). Праз адсутнасць *губернскага праўлення* Бутаўту-Андрайковічу было даручана харчаванне войскаў, нагляд за хворымі, збор звестак аб стратах населеных пунктаў Гродзенскай губ., спагнанне недаплатаў і падаткаў з тых жыхароў, якія не пацярпелі банкруцтва. Для расійскай казны ён зрабіў добрую справу: у 1809–1810 гг. выменьваў асігнацыі казённых палат губерні на залатыя і срэбныя манеты. Ім жа было падрыхтаванае ў маі 1813 адкрыццё губернскага праўлення (22.06.1813). На пасадзе губернатара займаўся адбудовай Ваўкавыска і Кобрына, пацярпелых у вайне 1812 г., прапагандаваў распаўсюджванне Расійскага *Біблейскага таварыства*, напісаў у 1819 кніжку аб школах узаемнага навучання (ланкастарскіх), аднавіў працу *гродзенскай друкарні*. У 1819 атрымаў ад цэсарэвіча Канстанціна Паўлавіча манаршую ласку за "отличное усердие" у справе пастаўкі харчавання Літоўскаму

асобаму корпусу. Бутаўт-Андрайковіч быў *масонам* гродзенскай ложы "Сябры чалавецтва" і з 1821 выконваў абавязкі майстра (магістра). Відаць таму не вельмі стараўся ліквідаваць масонскія паперы, знакі, патэнты пасля забароны масонства. Выконваў загады М. Навасільцава, калі ў 1823 ішло следства па справе філаматаў і філарэтаў: займаўся пошукам месцажыхарства сябраў патаемных таварыстваў Свіслацкай гімназіі, канфіскацыяй іх папераў і адсылкай у Вільню, усталяваннем за імі паліцэйскага нагляду. Браў падпіскі аб нявыездзе з месцажыхарства. Адпраўляў у Вільню асоб, патрэбных следчай камісіі. Пад яго кіраўніцтвам прайшлі сакрэтныя дазнанні ў Свіслачы: былі дапрошаныя адміністрацыя гімназіі, гаспадары кватэр, дзе жылі падазраваныя гімназісты. Пра ўсё Б.-А. спраўна даносіў Навасільцаву. У 1823 знаходзіўся ў спісах выбаршчыкаў шляхецкага сходу Гродзенскага пав. (меў у той час спадчынныя маёнткі Стары Двор – 55 дымоў і 159 душ і Новы Двор – 27 дымоў і 69 душ). У 1823 паводле даносу тытулярнага дарадцы Руткоўскага была праведзеная праверка гродзенскага казначэйства, якая выявіла нястачу грошай. Губернатар таксама быў замяшаны ў гэта і павінен быў вярнуць 114 руб. срэбрам і 3 290 руб. асігнацыямі. У 1827 г., быўшы жытомірскім губернатарам, Бутаўт-Андрайковіч быў абвінавачаны ў няправільным выдаткоўванні земскіх сум, прадстаўленых гродзенскім губернскім маршалкам К. Грабоўскім, і звольнены ў адстаўку.

Крын. і літ.: ЛДГА, ф. 567, воп. 2, спр. 1169; спр. 1326].. НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 37, спр. 1810, а.1 аб–3; с. 1817, а. 25 адв.–27; Акты и документы архива Виленского, Ковенского и Гродненского генерал-губернаторского управления, относящися к истории 1812–1813 гг. // Виленский временник. – Вильна, 1912.– Кн. 5, ч. 2. Переписка по части гражданского управления. – С. 158; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 36–40; Радзюк А. Гродзенскія губернатары-злачынцы // Гарадзенскі гадавік. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2020. – С. 48; Токць С. Спісы выбаршчыкаў шляхецкіх сходаў Гродзенскага, Ваўкавыскага і Слонімскага паветаў Гродзенскай губерні за 1820–1823 гг.// Rocznik Centrum Studiów Białoruskich=-Гадавік Цэнтра Беларускіх Студыяў, 2020, № 5, с. 203; Швед В.В. Гарадзенскія масонскія ложы (канец XVIII – пач. XIX стст.) // Гарадзенскія запісы: старонкі гісторыі і культуры. – Гародня: ГрДУ, 1997. – Вып. 3. – С. 64–77; Iwaszkiewicz J. Litwa w roku 1812 / Wyd. Sz. Askenazy. – Kraków, W-wa, 1912. – C. 7.

Бучэла Мікалай (?–1599) – італьянскі лекар пры двары *Стэфана Баторыя*, адзін з удзельнікаў *анатаміравання* вялікага князя літоўскага і караля польскага ў Гродне. Працаваў у Падуі, Белуна, Вене, на Маравіі. У 1570-х апынуўся пры Сяміградскім двары і выехаў у ВКЛ. Пасля смерці Стэфана Баторыя быў лекарам Жыгімонта III Вазы.

Літ.: Pawłowska-Kubik A., Śmierć Stefana Jegomości króla polskiego w Grodnie 12 Decembra Anno Domini 1586 (Prawdziwa sprawa o chorobie i śmierci nieboszczyka Stefana Batorego króla polskiego) – źródło do losów Stefana Batorego i historii medycyny // Studia Źródłoznawcze=Commentationes. T. 56 (2018). – Warszawa: IH PAN. – S. 144–145;

Буш Актавіян (канец 1897 – 4.02.1939, Вільня) – сябра гродзенскай Польскай вайсковай арганізацыі (ПВА), кіраваў падпольным аддзелам жандармерыі (1918–1919). Ініцыяваў пабудову помніка маладым сябрам ПВА.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 57.



С. 829

Быкаў Васіль Уладзіміравіч (19.06.1924, в. Чарапоўшчына Ушацкага р-на Віцебскай вобл. – 22.06.2003, в. Бараўляны, Мінскі р-н) – беларускі пісьменнік і грамадскі дзеяч. Вучыўся на скульптурным аддзяленні Віцебскага мастацкага вучылішча. Удзельнік *вайны Вялікай Айчыннай*. Пасля дэмабілізацыі ў 1947 стаў працаваць мастаком у Гродзенскіх мастацкіх майстэрнях і стыль-рэдактарам у *газеце "Гродненская правда"*. У 1949–1955 служыў у Савецкай арміі, у 1956–1972 быў літаратурным супрацоўнікам, затым – літаратурным кансультантам газеты "Гродненская правда". У 1972–1978 Б. – сакратар Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў БССР. Гродзенскія адрасы Б.: вул. Ласасянская і Пажарскага (прыватныя кватэры), "каморка" на вул. Ажэшкі насупраць дома афіцэраў, Падгорная (у сям'і сябра знаёмага мастака), Вялікая Траецкая, 28–20, Свярдлова, 18–30, Парыжскай камуны, 9–11.

Першы аповед "У першым баі" Б. апублікаваў у "Гродненской правде" (1949), там жа публікаваліся ў фрагментах першыя аповесці. У Гродне Б. напісаў аповесці "Жураўліны крык" (1960), "Здрада" (1961), "Трэцяя ракета" (1962), "Пастка" (1962), "Альпійская балада" (1964), "Мёртвым не баліць" (1965), "Праклятая вышыня" (1968), "Круглянскі мост" (1969), "Сотнікаў" (1970), "Абеліск" (1971), "Дажыць да світання" (1973), "Воўчая зграя" (1974), "Яго батальён" (1975), "Пайсці і не вярнуцца" (1978). Гарадзенскі драмтэатр паставіў на сваёй сцэне драму "Апошні шанец" (1974). У гродзенскі перыяд напісаныя сцэнары да кінафільма "Трэцяя ракета" (1963), "Альпійская балада" (1966), "Дажыць да світання" (1975), "Воўчая зграя" (1976), "Доўгія вёрсты вайны" (1976), "Абеліск" (1977).

Быкаў быў у апазіцыі да існага ў Беларусі рэжыму. У 1960–70-х гадах разам з пісьменнікам *Карпюком А.* і гісторыкам *Клейнам Б. С.* стварыў сваеасаблівы інтэлектуальны клуб (так званы "Гродзенскі трохкутнік"). Быкаў атрымоўваў самвыдат, Карпюк распаўсюджваў яго і падтрымоўваў сувязі з А. Салжаніцыным. Клейн у 1959 г. стварыў народны Універсітэт культуры з мэтаю вярнуць у горад свабоду слова (праграма была створаная разам з Карпюком). Пасля публікацыі аповесці "Мёртвым не баліць" у 1965 г. супраць Б. разгарнулася кампанія пераследу. З 1978 жыў у Мінску. У 1988 Б. стаў адным з заснавальнікаў Беларускага народнага фронту. У 1998 вымушана з'ехаў у эміграцыю (Чэхія, Фінляндыя, Нямеччына). У 2003, незадоўга да смерці, вярнуўся на Радзіму. Пахаваны на Усходніх могілках Мінска. Герой Сацыялістычнай працы (1987), лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэміяў. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі.

Літ.: Быкаў В. Пункціры жыцця: далітаратурная біяграфія// Дзеяслоў. – 2005. – № 6. – С. 176–177; Быкаў В. Доўгая дарога дадому. Кніга ўспамінаў. – Мн.: ГА БТ "Кніга", 2004; Быкаў В. Гарадзенскі архіў. Невядомыя творы (1957–1972). Незавершанае. Нататнікі. – Гародня-Wrocław, 2012; Клейн Б. Инакомыслящий горад // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Вып. 10 (2015) / рэдкал. І. Соркіна [і інш.] – Гродна, 2016. – С. 112–113; Никитина Т. К. Моё время. Моя страна. Мой город, Очерки, эссе, интервью, зарисовки. – Гродно: ЮрСаПринт, 2017. – С. 231–238; Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 146; Петрушкевіч А. Старонкі Гарадзеншчыны літаратурнай. Дапаможнік. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 204–212; Праўдзіна А. Рэпрэсіі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце, гісторыя і сучаснасць // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Вып. 10 (2015) / рэдкал. І. Соркіна [і інш.] – Гродна, 2016. – С. 130–131; Пяткевіч А.М. Слова і кніга Прынёмання. Зборнік навуковых артыкулаў. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 99–100.

Быхаўцы – шляхецкі род герба "Магіла". Самуэль Б., люцынскі стараста (1716) у 1693 меў у Гродне дом. Людвік Б., пісар скарбу ВКЛ (1734) валодаў надзелам і домам, якія перадаў у 1729 брату Уладзіславу. Сямейны архіў роду Б. захоўваецца ў НГАБ у Гродне (893 справы).

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 26.

Бычкоўскі Адам (1889, фальварак Талочкі, Сакольскі пав. – 18.11.1937) – адзін з арганізатараў і першы (1909–1911) старшыня *Гродзенскага гуртка беларускай моладзі.* Вучыўся ў Гродзенскай гімназіі, затым на юрыдычным факультэце Пецярбургскага універсітэта, дзе стварaў гурткі разам з іншымі студэнтамі з Беларусі. Скончыў універсітэт з пачаткам *вайны Першай сусветнай* і паехаў працаваць суддзёй у Саколцы. Пазней пераехаў у Варшаву, працаваў адвакатам, уключыўся ў беларускі рух – дапамог падрыхтаваць дакументы для рэгістрацыі статута Беларускага культурнага таварыства і потым абскардзіў адмову ў МУС.

Літ.: Верас З. Я помню ўсё. Успаміны, лісты. – Гародня, Вроцлаў, 2013, с. 23.

Бяганскі Юзаф (каля 1886 – ?) – дырэктар мужчынскай настаўніцкай семінарыі, сябра гродзенскай гарадской рады (1927). У 1923 быў старшынёй супрацьгазавай абароны, у 1927 – сябра павятовай камісіі па фізічным выхаванні, у 1928 – кіраўнік добраахвотнай пажарнай аховы, у 1930 – сябра камітэта гродзенскага музея прыроды. Пасля *вайны Другой сусветнай* выехаў у Гданьск.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 57.

Бяклемішаў Кузьма – вядучы баскетбаліст Гродна ў 1930-я гады.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 57.

Бялецкі Канстанцін Яўхімавіч (20.01.1874, м. Лунна Гродзенскага пав. – 8.12.1926, Гродна) – лекар, грамадска-палітычны дзеяч беларускага руху. Пасля заканчэння Гродзенскай *гімназіі* (1894), вучыўся ў Пецярбургскай вайсковай медыцынскай акадэміі (1894–1899), а пасля яе працаваў вайсковым лекарам 102 пяхотнага палка ў Гродне. З 1912 – сябра Гродзенскага таварыства апекуноў ваенна-санітарных ведаў. У *вайну Першую сусветную* – галоўны лекар палявога шпіталя на Заходнім фронце. Быў кантужаны, летам 1918 вярнуўся ў Гродна. Са студзеня 1919 – лекар *палка Першага беларускага пяхотнага*. З 4.04.1919 уваходзіў у склад Літоўскай Тарыбы. Летам 1919 быў арыштаваны палякамі, знаходзіўся ў Кракаве. У 1918–1926 – ардынатар венерычнага аддзела ў Гродзенскім гарадскім *шпіталі*. Адзін з кіраўнікоў і старшыня упраўлення Беларускага клуба "Наша хатка", сябра *камітэта беларускага нацыянальнага* ў Гродне. 28.03.1920 – віцэ-старшыня арганізацыйнага камітэта па скліканні беларускага з'езда Гродзеншчыны. У 1920-я даглядаў дзяцей Гродзенскага беларускага прытулку. У 1922 г. вылучаўся ад блока нацыянальных меншасцей на выбарах у Сенат па акрузе № 5 (Беласток). Фотааматар. Жыў ва ўласным доме па вул. Кірхавая/Акадэмічная, 13.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 58; Чарнякевіч А. Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гродне 1909–1939: біяграфічны даведнік. – Мінск, 2003. – С. 46–47; Энцыклапедыя Гісторыі Беларусі, Т. 6, Кн. 2. – Мінск: БелЭн., 2003, с. 349; Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich= Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– S. 208.

Бяліцкі Л. – кіраўнік упраўлення водных дарог. Будаваў набярэжную ў Гродне. Быў сябрам камітэтаў адбудовы Старога замка (1929) і пабудовы заапарка (1930).

Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 58

Бяляўскі Леан (24.04.1869, Вільня – 10.02.1926) – адвакат, выдавец *газеты* "Echo Grodzieńskie" (1923). Бацькі Станіслаў і Юзэфа з Міхалоўскіх. У дзяцінстве жыў у маёнтку Паставы, дзе бацька служыў кантралёрам у Тышкевіча. Вучыўся ў школе Марыямпаля (Сувальшчына), на юрыдычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта. З 1884 жыў і працаваў у Гродне: спачатку быў памочнікам адваката Ячыноўскага, а потым адкрыў прыватную канцылярыю прысяжнага адваката. Сябра *Э. Ажэшкі* і В. *Зындрам-Касцялкоўскай*. Падчас *вайны Другой сусветнай* быў у бежанстве. Працаваў у Ліквідацыйнай камісіі Каралеўства Польскага, у гродзенскім грамадзянскім камітэце, у камітэце па вайсковых стратах. З 1922 – ганаровы суддзя Гродзенскага акруговага суда. Сябра розных таварыстваў і саюзаў: апекі над дзецьмі, гаспадарчага саюза, Гродзенскага аддзялення Польскага Белага Крыжа, Сяброў навук, падтрымкі польскай сцэны, апекі над помнікамі культуры, спажывецкага таварыства

"Rolnik". Быў сябрам камітэта па будаўніцтве помніка Э. Ажэшцы ды ініцыятарам стварэння Таварыства імя Э. Ажэшкі. Удзельнічаў у *таварыстве "Муза"*.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 60.

Бянецкі Юльян Феліксавіч (2.02.1829, в. Малевічы каля м. Сямятычы, Польшча – 14.02.1903, Гродна) – урач-гуманіст. Скончыў гімназію ў Беластоку (1845), медычны факультэт Дэрпцкага (Тартускага) універсітэта (1859). Падчас вучобы быў сябрам студэнцкіх арганізацый "Палонія", "Огун". Медычнай практыкай заняўся ў м. Цехановец, цікавіўся навуковай працай (у 1866 прадставіў Варшаўскаму саюзу медыкаў інструмент для выдалення зубоў), збіраў рэдкія кнігі XVI–XIX стст. З 1875 па 1903 працаваў прыватным урачом у Гродне. Жыў на вул. Гарохавай (сёння Сацыялістычная) у сваім доме. Бедных лячыў бескаштоўна, даваў ім лекі і часам грошы, пасяляў хворых у сваім доме. Яўрэі знайшлі ў ім адзінага выратавальніка ад хвароб, таму частка гараджан называла Б. "жыдоўскім лекарам". Шмат дапамагаў гродзенцам пасля *пажару 1885*, разам з *Ажэшкай Э.* уваходзіў у Камітэт дапамогі ахвярам пажару. Пасябраваў з пісьменніцай, быў сведкам на яе шлюбе з С. Нагорскім. Не цураўся палітыкі (у жніўні 1894 на яго адрас прыйшла пасылка з Лондана, дзе былі публікацыі антыўрадавага зместу). Пасля смерці была праблема пахаваць яго, бо каталіцкі і праваслаўны святары адмовіліся правесці абрад. Толькі рабін правёў набажэнства за спакой душы Б. Пасля пахавання адбылася дэманстрацыя працоўных горада. Гродзенскія, варшаўскія і пецярбургскія газеты змясцілі некралогі альбо рэпартажы аб пахаванні. З 1931 з'явілася вуліца імя Бянецкага (суч. Моладзевая).

Літ.: F. Ignatowicz, Lekarz-humanista Julian Bieniecki // Magazyn Polski. – 2004. – N1 (30). – S. 46.

Бярбецкі Леан (28.07.1875, фальварак Каліноўшчына каля Любліна – 23.03.1962, Глівіцы) – генерал, кіраўнік вайсковай акругі III у Гродне (03.1924 – 07.1926). Скончыў народную школу ў Грыбавіцы Уладзімірскага ў., прагімназію ў Грубешаве, Харкаўскі тэхналагічны інстытут. Удзельнік наступных войнаў: руска-японскай, *Першай сусветнай* (у польскіх легіёнах), польска-украінскай, *савецка-польскай*. Даслужыўся ў іх да генерала дывізіі (1924). Падчас кіравання вайсковай акругай у Гродне перадаў частку Старога замка і выязной вежы гістарычнаму музею (26.08.1924). У гэты ж час паводле яго загаду былі зробленыя абмеры Замкавай гары і вымярэнні глыбіні *Нёмана.* Сябра камітэта па будаўніцтве помніка *Э. Ажэшцы* (1925). У 1926 быў пераведзены ў Торунь. У 1939 эміграваў у Румынію. Сядзеў у нямецкіх канцлагерах. Пасля вайны жыў у Глівіцах.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 61–62.

В

Вадаліў бронзавы – акваманіл XIII ст., зроблены з груба апрацаванай бронзы ў выглядзе конніка, які адной рукой прытрымлівае павады, а другой спрабуе выхапіць меч (які не захаваўся). Агульная вышыня – 24 см, даўжыня – 19 см. Вада залівалася праз вузкую адтуліну на галаве каня, а вылівалася яна з рота жывёліны. Такія сасуды выкарыстоўвалі для абмывання рук падчас літургіі. Знойдзены падчас абвалу зямлі над Нёманам пад *царквой Барыса і Глеба* на Каложы. Захоўваўся да 1979 у Гісторыка-этнаграфічным музеі Літоўскай ССР, а затым у м*узеі Гродзенскім гісторыка-археалагічным* намаганнямі яго дырэктара А. Карпюка. Знаходка гаворыць пра сувязі *Горадні* з захадам, паколькі падобныя прадметы часта сустракаюцца ў раманскіх цэрквах Нямеччыны. Выраблялiся ў ваколіцах Аўсбурга. Даследчык А. Павач звязвае вадаліў з паходам *Давыда Гарадзенскага* ў ваколіцы Франкфурта (1326). А вось Собаль і Рудава лічаць, што В. – "справа рук рускага майстра-ювеліра".

Літ.: Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродно: ТАА "ЮрСаПрынт", 2018. – С. 45; Павач. А. Под крылом Коложы. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 35–36; Собаль М.І., Рудава Н.А. Гродзенскі вадаліў // Помнікі мат. гісторыі Беларусі. – 1970. – № 4. – С. 37; Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – С. 134; Kultura Wielkiego Księstwa Litewskiego: analiza i obrazy. – Kraków: Universitas, 2006. – S. 345–346.

Вадаправод. Першы пачаў працу ў 1629 г. Яго за свой кошт зрабіў купец з Караляўца (Кёнігсберга/Калінінграда), бурмістр Гродна Ганус Фандэберг. На беразе *Гараднічанкі* (прыкладна ў раёне *сінагогі вялікай харальнай*) знаходзілася велізарная ацамбраваная драўляная бочка, ад якой драўляныя трубы ішлі да *Рынку* і на *Стары замак*. Высвідраваныя драўляныя трубы змыкаліся металічнымі буксамі, замацоўваліся скобамі, замотваліся лёнам, канаплянымі вяроўкамі і замазваліся смалой. Рэшткі гэтых труб знойдзеныя падчас земляных прац у 1931 г., а таксама археолагамі на пачатку 2000-х гадоў. За рэканструкцыю Рынку і пабудову вадаправода Фандэберг атрымаў ад Жыгімонта III права спаганяць ад тавараў, якія паступалі на рынак, падатак для сябе.

Наступны вадаправод з'явіўся ў XIX ст. 30.07.1874 г. калежскі сакратар А. А. Дзеравіцкі заключыў з гарадскімі ўладамі кантракт на правядзенне вадаправода. Водазабор планавалася зрабіць з крыніцы або з *Нёмана* і праз

чыгунныя трубы пусціць у горад. Прадпрымальнік забавязваўся за свой кошт пабудаваць фантан і некалькі калонак. Праз 50 гадоў горад мог выкупіць вадаправод. У гэтым жа 1874 г. Дзеравіцкі перадаў свой кантракт калежскаму дарадцы Аляксандру Гіпіусу. Ён, разам з князем Д. У. Друцкім-Сакалінскім і купцом А. А. Кнопам, заснаваў "Гродзенскае таварыства водазабеспячэння" (статут зацверджаны 11.03.1877). Праўленне знаходзілася ў С.-Пецярбургу. Таварыства мела капітал 500 тыс. руб. і выпусціла пад яго 5 тыс. акцый па сто руб. кожная. Дзейнічаць таварыства пачало 19.04.1877. На вул. Татарскай (Свярдлова) быў зроблены рэзервуар для назапашвання вады. Маршрут (7,5 км) пралягаў па вуліцах Татарскай, Купецкай (К. Маркса), Паліцэйскай, Мяшчанскай (Баторыя), Калажанскай (Калючынскай), Пясочнай (Васількa), Гараднічанскай, Гарохавай (Сацыялістычнай), Палявой (Карбышава), Маставой-Замкавай, Вялікай Траецкай, Садовай, праз *Гараднічанку* да дома *губернатара* і на Акцызную плошчу (Тызенгаўза), Палацкай, да чыгуначнага вакзала. 7.03.1878 названы вадаправод пачаў працаваць. У 1901 паміж горадам і таварыствам быў заключаны дадатковы кантракт, якім вызначаліся ўмовы карыстання вадамерамі, таварыства забавязвалася забяспечваць вадой па зніжаных коштах казармы і дамы дыслакацыі расійскай арміі. Водазаборныя калодзежы з вадапоямі і без іх былі ўладкаваныя на Сянной, Біржавай і Рыбнай плошчах, на рагу Палявой вул. і Дравянога завулка. У 1890 і ў 1916–1917 былі пабудаваныя *вежы воданапорныя*. У 1909 кіраўніком Таварыства водазабеспячэння быў інжынер-тэхнік Мікалай Іванавіч Баравічка, бухгалтарам – Сямён Ізекіліевіч Іонас, яго памочнікам – В. В. Яваройскі, касірам – Рыгор Ізекіліевіч Іонас. Вясной 1920 г. водаправод перайшоў у гарадскую ўласнасць. У 1932–1935 гг. быў рэалізаваны праект інжынера В. Статлера – мантаж жалезнай водаправоднай трубы па дне Нёмана, што дазволіла далучыць да сістэмы водазабеспячэння занёманскую частку горада.

Літ.: Беларусь в эпоху капитализма. Т. 2 – Мінск, 1983. – С. 145; Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 112–138; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 49–50; Павач А. Красная книга Гродно. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2013. – С. 39–40; Памятная книжка Гродненской губернии на 1910 год. – Гродна, 1909. – С. 147; Иващенко Н.А., Повседневная жизнь губернского города Гродно (XIX – начало XX века). – Гродно: ЮрСаПринт, 2019. – С. 75–97; Orzeszko E. Z Grodna // Gazeta Polska, 1873, nr. 66.

Вазгірд Казімір (1706–1773) – прафесар, рэктар гродзенскага калегіума ў 1758–63 гг. Вучыўся ў Віленскай акадэміі: 1726–29 – філасофія; 1731–35 – тэалогія. Абараніў ступень доктара філасофіі (1742) і доктара тэалогіі (1750). Выкладаў паэтыку, рыторыку, філасофію, тэалогію, кананічнае права ў Полацку, Крожах, Варшаве, Гродне і Віленскай акадэміі.

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 559.

Вазніца (фурман) гл. Фурманскі транспарт.

Вазнякоўскі Рафал – польскі школьны інспектар Гродзенскага пав. у 1919–1920, 1921–1923 (?) гг. Сябра таварыства гігіены і асветы імя праф. Э. Гадлеўскага (1921). Выступаў за развіццё агульных школ, у адрозненне ад шэфа Асветніцка-палітычнага аддзела Грамадзянскага кіраўніцтва Усходніх земляў у Вільні Л. Зарэцкага і старшыні гродзенскай *Мацежы школьнай* кс. *Курыловіча*, якія хацелі развіваць сярэднія школы. В. збіраліся звольніць, але інспектар Гродзенскай Крэсовай Аховы *С. Мыдляж* яго бараніў, бо лічыў, што В. польскую справу робіць добра. "Калі пан Вазнякоўскі не вернецца, – пісалі ў выканаўчы камітэт С. Левандоўскі і Цяўлоўскі – школьная адукацыя на Гродзеншчыне прыйдзе ў заняпад". Польскія настаўнікі пагражалі падаць у адстаўку, калі В. не вернуць на сваю пасаду. В. пераследаваў беларускіх настаўнікаў, беларускі дзіцячы дом, закрываў беларускія школы (з 7 засталіся 4), не дазволіў адкрыць каля 10 беларускіх школак.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 63; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 73, 91; J. Gierowska-Kałłaur, Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (19 lutego1919 – 9 września 1920), Warszawa 2003, s. 236, 311; O niepodległą i granice. T.7. Raporty Straży Kresowej 1919–1920 ziem północno-wschodnich opisanie. / Wstęp, wybór i opracowanie J. Gierowska-Kałłaur, Warszawa 2011, s. 280–283, 291, 292.

Вайна Вялікая Айчынная 1941–1944 гг. У Гродне пачалася ў першыя яе гадзіны. 22.06.1941 з паветра горад 6 разоў бамбардавалі з 4 да 8 раніцы нямецка-фашысцкія самалёты, якія разбурылі цэнтр горада і раёны каля *мастоў*. Савецкія лётчыкі 122-га знішчальнага палка баранілі гродзенскае паветра – знішчылі ў першы дзень вайны 35 самалётаў праціўніка. Пяць лётчыкаў, сярод якіх *А. Данілаў*, здзейснілі паветраныя тараны. На зямлі асноўны ўдар наносілі з паўночнага боку Гродна 8-я, 28-я і 161-я нямецкія пях. дывізіі 8-га армейскага корпуса, узмоцненыя 14 дывізіёнамі буйнакаліберная артылерыі і штурмавымі сапёрнымі батальёнамі. Раніцай 22.06 з партыйна-савецкага актыву быў створаны атрад самаабароны на чале з 1-ым сакратаром гаркама КП(б)Б Пазняковым І. Б. Ён патруляваў вуліцы, ахоўваў важныя аб'екты, эвакуяваў жыхароў і ўстановы, кантраляваў вываз каштоўнасцяў і дакументаў.

Першы ўдар прынялі памежнікі Аўгустоўскага атрада (гл. *Усаў В. М.*). На Аўгустоўскім канале, на поўнач ад Сапоцкіна, вялі баі часткі 3-й арміі ген.-лейтэнанта В. І. Кузняцова, у складзе 56-й і 85-й стралковых дывізій 4-га стр. корпуса і 29-й танкавай дыв. 11-га механізаванага корпуса. У ноч на 24.06 акружаным часткам удалося прарвацца, пераправіцца праз *Нёман* і адыйсці на ўсход. 57-ы і 59-ы танк. палкі 29-й танк. дывізіі 22.06 у 11.00 атакавалі нямецка-фашысцкія войскі на рубяжы Лойкі-Галынка ў напрамку Сапоцкіна і знішчылі 21 танк, 34 бронетранспарцёры, каля 2 батальёнаў пяхоты праціўніка. У другой палове дня нямецка-фашысцкія войскі падыйшлі да ракі *Ласосна*, дзе іх сустрэлі 103 і 141 стралк. палкі 85 стралк. дывізіі. Праціўніка,

які фарсіраваў Нёман, стрымлівалі 59 стралк. полк той жа дывізіі і курсанты акруговай школы малодшага кіраўнічага складу памежных войск. У ноч на 23.06 3-я армія пакінула Гродна і адыйшла на рубеж рэк Котра і Свіслач. Стрэламі з гармат быў разбураны *мост* праз Нёман. 24–25 чэрвеня 6-ы механізаваны корпус з паўднёвага захаду ажыццявіў контрнаступленне на Гродна і, нават, дайшоў да ваколіц горада, але вымушаны быў адыйсці пад значна мацнейшымі сіламі праціўніка.

У горадзе ўсталяваўся акупацыйны рэжым (24.06.1941 – 24.07.1944). 30 чэрвеня Гродна наведалі Гімлер і Гайндрых з інспекцыяй і раскрытыкавалі недастатковую актыўнасць айнзацгрупы В, якая павінная была забіваць яўрэяў. З першых дзён іх ліквідоўвалі на Рынкавай плошчы, у турме і крэпасці на ўскрайку горада. Гродна/*Гартэн* і яго павет да 18.09.1941 былі далучаныя да Остланд, а затым – да Беластоцкай акругі. У горадзе да верасня 1941 кіравала ваенная камендатура, якая стварыла цывільную ўладу з польскіх чыноўнікаў, якія былі да 1939 г., на чале з бурмістрам Завадзкім (яго змяніў З. Гарбачэўскі). Пазней гэтае кіраўніцтва было замененае на гарадскога камісара немца Штэйна, а чыноўнікі прыехалі з Прусіі.

У Гродне знаходзіліся розныя паліцэйскія і спецыяльныя службы: Orpo (паліцыя парадку), Schutzpolizei (дапаможная паліцыя), Sipo (паліцыя бяспекі), Sicherhaitsdienst (СД – служба бяспекі), *гестапа*, СС, жандармерыя. У пачатковы перыяд акупацыі ў горадзе кватэравала брыгада добраахвотнікаў Іспанскай дывізіі. У Гродна павінныя былі прыехаць 10 тыс. нямецкіх каланістаў, а, каб вызваліць для іх месца, у Германію планавалася накіраваць 20 тыс. мясцовых жыхароў (цэнтр адпраўкі знаходзіўся ў будынку сённяшняга педагагічнага каледжа па вул. Леніна). На прымусовую працу з Гродна (галоўным чынам ва Усходнюю Прусію – на сельска-гаспадарчыя працы, абаронныя прадпрыемствы Кёнігсберга) было выслана каля 1,5 тыс. чал. У 1942 з Гродна вывезлі агулам 779 остарбайтараў ва Усходнюю Прусію: 480 трапілі ў Кёнігсберг, 254 – у Лік, 20 – у Мэмель, 23 – у Тыльзіт, па 1 – у Растэнбург і Інстэрбург. У наступным годзе большасць гродзенцаў была вывезеная ва Усходнюю Прусію, а частка – у Штутгарт і Магдэбург. У першыя месяцы 1944-га гарадзенцы (4/5 палякі і 1/5 беларусы) апынуліся ў Кёнігсбергу.

Яўрэі і цыгане, асобы хворыя, камуністы і савецкія чыноўнікі, тыя, хто супраціўляўся немцам, былі ў спісах на ліквідацыю. Гродзенцы прымусова працавалі побач з яўрэямі ў дубільнях, кравецкіх майстэрнях, цагельнях, лесапільнях, на тытунёвай фабрыцы.

28.06 адбылося першае паседжанне *юдэнрата* (яўрэйскага савета). 1.11.1941 нямецкія ўлады абвясцілі аб стварэнні двух *гета* для яўрэяў (падчас іх ліквідацыі забіта каля 40 тыс. чал. з Гродна і ваколіц). Некаторых яўрэяў гродзенцы выратавалі (гл. *праведнікі Народаў Свету*). У раёне *Фолюша, Ласосны*, Калбасіна, Кульбакаў, у *Румлёва,* на сучаснай вул. Чырвонаармейскай і прывакзальнай плошчы знаходзіліся лагеры для ваеннапалонных. 20.10.1942 і 15.07.1943 адбыліся расстрэлы польскай інтэлігенцыі ў ваколіцах в. *Навумавічы*, каля форта № 2.

Немцы знішчалі культурную спадчыну Гродна: змянілі назвы вуліц горада, рабавалі музеі, спальвалі кнігазборы, разбуралі помнікі. Дзейнічалі *школы* беларуская, руская. для *фольксдойчаў* і *райхсдойчаў*. У чэрвені 1942 было заснаванае "Фізкультурнае і спартовае таварыства Горадні". Прадпрыемствы працавалі на ваенную нямецкую гаспадарку. Рабочых не хапала, таму быў уведзены працоўны абавязак нават для дзяцей 12 гадоў, арганізаваныя лагеры прымусовай працы для парушальнікаў акупацыйнага рэжыму. Дзейнічалі нямецкія камерцыйныя фірмы "Рупель", "Цымерман і Маркс", "Варэнсгросгандлюнг".

Горад супраціўляўся ворагу: дзейнічалі з лістапада 1943 падпольныя камсамольская (сакратар *В. Соламава*) і партыйная (сакратар П. П. Бастун) арганізацыі; падпольныя групы (*М. А. Волкава*, М. М. Багатырова, С. М. Лямава, С. П. Панасюка), антыфашысцкія групы (В. Д. Разанава і ў *гета* № 1) і польскія *Армія Краёва,* атрад Саюза польскага гарцэрства (кіраўнік *Б. Глябовіч*). Подзвіг здзейсніў святар францішканскага кляштара *М. Кольбэ*. У Гродне дзейнічаў да сакавіка 1942 Беларускі нацыянальны камітэт, які займаўся арганізацыяй беларускай школьнай адукацыі і дыскрэдытацыяй польскіх чыноўнікаў, якія ў 1939 г. праявілі свой антынямецкі і антыбеларускі характар. 19.10.1942 у горадзе адбыўся канцэрт вядомага беларускага тэнара М. Забэйды-Суміцкага. Існавалі Рускі камітэт і філіял Таварыства ўкраінцаў, якія праводзілі культурна-асветніцкую працу сярод сваіх народаў. 13.07.1944 войскі 50-й арміі (І. Болдзін) 2-га Беларускага фронту (камандуючы І. Захараў) ва ўзаемадзеянні з 31-й арміяй (В. Глаголеў) і 3 кавал. корпусам (М. Аслікоўскі) 3-га Беларускага фронту (камандуючы І. Чарняхоўскі) пачалі Беластоцкую аперацыю, у выніку якой была вызваленая 16.07 правабярэжная частка Гродна, а 24.07 – левабярэжная. Ганаровай назвай "Гродзенская" былі названыя 17 савецкіх баявых частак.

Горад быў на 43% разбураны: цалкам знішчаны квартал паміж вуліцамі Маставой і Мяшчанскай, а таксама вуліцы вакол *рынку Сяннога* – згарэлі *палац Радзівілаў і ратуша*, выгарэў *касцёл бернардзінскі*, разбураны *кляштар бернардзінак*, пашкоджаны дах касцёла гарнізоннага (былая *Фара Вітаўта*). Ва ўсім горадзе было зруйнавана 1150 дамоў, *электрастанцыя*, ваданапорная станцыя, некалькі *гатэляў,* два *масты*. Насельніцтва не дасягала ½ даваеннага ўзроўню, па коштах 1941 г. страты склалі 2,8 млрд. руб. З музейных фондаў вывезлі каштоўныя экспанаты, з *бібліятэкі* спалілі савецкі фонд літаратуры і перыёдыкі.

У жніўні 1944 у Гродне былі створаныя фільтрацыйныя лагеры № 308, 309, 311, у якіх чэкісты ўладкавалі пункты праверкі тых, хто вяртаўся на радзіму ў СССР і адбіралі рэчы, якія яны везлі з Захаду (у большасці іх знішчалі). Кожны лагер быў разлічаны на 3 тыс. людзей, але ў верасні 1945 тут знаходзілася 15 397 чал. У тры разы больш ужо прайшло праверку і яны або былі адпраўленыя на месца жыхарства, або рэпрэсаваныя. У Гродна да лістапада 1945 вярнуліся 454 чал. Горад стаў рэгіянальнай транзітнай станцыяй, якая была чыгункаю звязаная з Варшавай, Вільняй і Ленінградам. Чыгуначным шляхам ішло забеспячэнне Савецкай арміі, якая пяспяхова займала Усходнюю

Прусію, Гданьск, Памеранію, Шчэцін. Паралельна ў гэты час пачалося перасяленне палякаў з Гродна і Гродзеншчыны ў Польшчу, а беларусаў з Беласточчыны – у БССР. У Гродне быў размешчаны інтэрнат для дзяцей, народжаных у Польшчы. Жыў там і будучы міністр замежных спраў Польскай Рэспублікі Адам Ротфельд.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 177–204, 237–238, 270–271, 309–315; Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 190–191; Карнялюк В.Р., Гродна ў час Другой сусветнай вайны // Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада. – Гродна, Вроцлаў, 2012, с. 260–271; Люцік Д. Нёманскі фронт 15–25 ліпеня 1944 года: баі за Гродна: аналіз падзей, данясенні, успаміны, статыстыка / Д. Люцік – Гародня, Вроцлаў, 2012; Мілеўскі Я.Е., Паміж Чырвонай зоркай і свастыкай // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам, Гародня, Вроцлаў, 2014, с. 383–395; Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада. – Гародня, Вроцлаў, 2012, с. 260–271.

Вайна з Масковіяй 1654–1667 гг. 22.08.1655 г. войскі цара Аляксея Міхайлавіча на чале з ваяводам Я. К. Чаркаскім занялі Гродна, спустошанае *пажарам*. Ахвярамі стыхіі сталіся *касцёлы св. Мікалая, Найсвяцейшай Тройцы, св. Духа*. Разваліліся мураваныя зводы *Барысаглебскай царквы*, бо падчас штурму маскоўскія вайскоўцы паставілі на іх гарматы. У чэрвені 1656 г. у сувязі з пачаткам вайны Расіі са Швецыяй у Гродне будуецца паўкола ахоўных земляных валоў ад поймы ракі *Гараднічанкі* да *Нёмана* (у канцы XVIII ст. зліквідаванае). У сакавіку 1659 гетман П. Сапега прымушае рускія войскі, якія займалі горад 5 год, капітуляваць: Я. К. Чаркаскі здае Гродна шляхце Гродзенскага пав. Але ў канцы года рускія войскі ў выніку наступу зноў займаюць Гродна, Ліду, Брэст-Літоўскі і Навагрудак. 13.05.1661 рускія войскі пакідаюць Гродна. Акупацыя завершылася. У горадзе засталося толькі 30 хворых чал. Гродна страціла 46,4% жыхароў. Пастановай сейма 1661 г. горад быў вызвалены на 4 гады ад падаткаў. Маскоўскія войскі знішчылі шмат судовых архіваў *магістрата* і сямейных архіваў мяшчан. Гродна было ахопленае фінансавым крызісам і злачыннасцю.

Літ.: Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654–1667, Мн., 1995. – С.; Ткачоў М. Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай // ЭГБ. Т. 2, – Мн., с. 189–200. Сліж Н. Праца гарадзенскага магістрата ў другой палове XVII ст.// Przegląd Środkowo-Wschodni. – 2021 – № 6. – S. 30–53.

Вайна Паўночная 1700–1721 гг. прывяла шведаў на чале з Карлам XII вясной 1702 г. у Гродна, але пад націскам расійскага войска яны былі вымушаныя адыйсці да Балтыйскага мора. У 1705 армія цара Пятра I стала размяркоўвацца на зімоўку ў Гродне і ваколіцах. А. Меншыкаў лічыць Гродна “самым крепким транжаментом”, дзе “неприятеля мы удержим и изнурим”. З мэтай агляду месца ў канцы верасня прыязджае Пётр I. Стары замак умацоўваецца, сюды назапашана харчаванне, на левым беразе *Нёмана* ўзводзяцца часовыя ўмацаванні ад *касцёла францішканцаў* да занёманскага *палаца*

Радзівілаў. У лістападзе 1705 у Гродне знаходзіліся 35–40 тыс. расійскага войска: палкі Прэабражэнскі, Сямёнаўскі, Інгерманландскі, фельдмаршала Шарамеццева, фельдмаршала Агільві, генерала Рэпніна, Шанбека, Чамберса, Галоўкіна, Шарфа. З 21 лістапада ў Гродне праходзілі перамовы паміж Рэччу Паспалітай і Масквой, у выніку якіх была заключаная дамова паміж Аўгустам II і Пятром I аб сумесных дзеяннях супраць Швецыі. 23 студзеня 1706 шведская армія (ад 20 да 24 тыс. чал.) спынілася ў некалькіх км ад Гродна. На ваеннай нарадзе расійскага камандавання большасць выказалася за адыход з горада, але кароль Аўгуст II, які камандаваў арміяй быў супраць. Фельдмаршал Г. Агільві сцягнуў да Гродна 45 батальёнаў і спадзяваўся, што Карл XII не стане атакаваць, а абыйдзе горад справа ці злева. 25 студзеня шведы перапраўліся на другі бераг Нёмана і ўпэўніўшыся, што Гродна захапіць немагчыма, размеркаваўся ў в. *Дзевятоўка.* 26 і 27.01 шведская армія падыходзіла да Гродна, але бітвы не адбылося, 28.01 яна размеркавалася ў навакольных вёсках. Аўгуст II адразу пакінуў горад разам з саксонскай кавалерыяй і 4 расійскімі драгунскімі часткамі. 4.02 шведская армія адыйшла на большую адлегласць ад Гродна і так абедзве арміі прастаялі ўсю зіму. 24.03.1706 войска Пятра I пакінула Гродна ў кірунку Тыкоціна – Брэста, скінуўшы ў Нёман цяжкія гарматы. Ноччу пачалася адліга і разбурыла мост, так што шведы не маглі кінуцца ў пагоню аж да 3.04 (у 1966 падчас расчысткі рэчышча Нёмана з дна былі паднятыя 4 бронзавыя гарматы, адна з якіх экспануецца ў *музеі Гродзенскім гісторыка-археалагічным*). У 1708 горад зноў стаў арэнай барацьбы. 1.02 з Дзятлава прыбыў Пётр I з 9-тыс. войскам, якое шведы атакавалі і прымусілі адступіць за муры Гродна. Затым Пётр I адышоў да Вільні, пакінуўшы для абароны горада і *моста* 3-тысячны атрад кавалерыі на чале з брыгадзірам Мюлендорфам. Апошні адступіў ад Гродна і не ліквідаваў мост, а 8.02 знянацку напаў на шведаў, уварваўшыся ў горад, але пацярпеў паражэнне. Сёння ад былых умацаванняў таго часу засталіся толькі тапаграфічныя "напаміны" ў выглядзе перападаў рэльефу. У 1716 у Гродне адбыліся нарады антысаксонскіх канфедэрацыяў Тарнагродскай і Віленскай, у прысутнасці маршалка К. Сулістроўскага. Канфедэраты імкнуліся да агульнанацыянальных, вызваленчых мэтаў. У 1718 на гродзенскім сейме кароль і паслы дзейнічалі салідарна супраць Масквы і цара Пятра I.

Літ.: Данскіх С.У. Гародня ў гады Паўночнай вайны (1700–1721) / С.У. Данскіх // Гродзенскія запіскі: старонкі гісторыі і культуры. – Гродна: ГрГУ. – Вып. 2. – С. 28–36; Супрон М. Абарончыя ўмацаванні Гародні часоў Паўночнай вайны: гісторыя і сучасны стан / М. Супрон // Гарадзенскі гадавік (Кракаў). – 2016. – № 4. – С. 99–110; Beynar L. Ziemie północno-wschodnie Rzeczypospolitej za Sasów. – Wilno, 1939. – S. 9, 12–13.

Вайна Першая сусветная 1914–1918 гг. Ваеннае становішча ў Гродне было абвешчанае 5.07.1914, а ў жніўні гараджане маглі прачытаць у газеце *"Гродненские губернские ведомости"* адозву Мікалая II (гл. *імператары расійскія ў Гродне*) да польскага насельніцтва і яго словы падзякі яўрэям за малітвы.

1.11.1914 расійскі імператар прыязджаў у Гродна з інспекцыяй *гродзенскай крэпасці.* У будынку рэальнага вучылішча (цяпер корпус аграрнага ўніверсітэта на вул. Акадэмічнай) размеркаваўся штаб 10-й арміі на чале з генералам Ф. Сіверсам. У *замку Новым* размеркаваўся вайсковы шпіталь. Гродзенскі паліцмайстар аб'явіў аб эвакуацыі з горада усіх жанчын і дзяцей рознага ўзросту не пазней за 20.06.1915. Немаёмасным быў абяцаны бясплатны праезд спецыяльным цягніком да Варонежскай губ. Да вайны горад налічваў 57 949 чал., да прыходу немцаў засталося 24 451 чал. Назад бежанцы будуць вяртацца з 1917 па 1923, і большасць з іх ужо ў іншую дзяржаву, ІІ Рэч Паспалітую. 14.08.1915 над горадам лёталі 2 нямецкія аэрапланы, якія над маёнткам *Станіславова* скінулі некалькі бомб. Адзін чалавек быў забіты і 2 параненыя, быў разбураны *касцёл базыльянак* і *палац Тызенгаўза.* Актыўныя баі за Гродна былі жорсткімі і ўпартымі з 17.08.1915 да 21.08.1918. Расійскія войскі пакідаюць *Гродзенскую крэпасць* 1.09. Яна перастала існаваць як фарпост на заходняй мяжы Расійскай Імперыі. Кіраўніцтва гарадскім жыццём бярэ на сябе Гарадскі камітэт, складзены з 6 палякаў і 6 яўрэяў. Ён дзяліўся на 6 секцый: фінансавую (агульны аддзел), мясцовае кіраўніцтва, харчовую, санітарную, адукацыйную, дабрачынную.

3 верасня 1918 Гродна было захопленае кайзераўскімі войскамі (да 29 красавіка 1919). Страты горада і жыхароў за час акупацыі склалі 1 200 000 нямецкіх марак толькі ад "добраахвотных" пазыкаў і падаткаў. У Германію вывезлі нерухомасць, архіў былой Беластоцкай акругі, разрабавалі бібліятэку дамініканцаў, архіў упраўлення дзяржаўнай маёмасці і г. д. У Гродне і наваколлі размясцілася 12-я нямецкая армія пад камандаваннем генерала пяхоты Ф. Фабецкі. Былі створаныя нямецкія органы кіравання. Обер-бургамістрам Гродна прызначаны Вайзэнборн (Weisenborn), капітан артылерыі, былы памочнік бургамістра ў Вільні. Пры галоўнай адміністрацыі ў Гродне быў створаны Цэнтральны аддзел, пазней – Гаспадарчы і аддзел сыравіны і гандлю. Галоўнай адміністрацыі падпарадкавалі акруговы суд і пракуратуру, далучылі аддзел жандармерыі. 1 чэрвеня 1916 у гродзенскім Старым парку адбылася палявая імша, на якой прысутнічаў кайзер Вільгельм ІІ. Потым ён паехаў на аўтамабілі аглядаць *Стары замак* і выдатны адтуль краявід на *Занёманскі фарштат*. У жніўні, да гадавіны захопу Гродна нямецкія ўлады выдаюць брашуру "Grodno". Немцы рэквізуюць ураджай 1915 г.; заганяюць на прымусовыя працы жыхароў Гродна і крэпасці па месцы жыхарства і за яго межамі; забараняюць забіваць жывёлу і птушку ўсіх відаў на продаж; дасылаць і атрымоўваць паштовыя пераводы, лісты і прэсу. Неабходна было здаць уладам каляровыя металы, набываць карткі аплаты за пераход праз мост. Жыхароў горада часта падвяргалі рэгістрацыі. Афіцыйна быў уведзены грыгарыянскі каляндар: усе даты перасоўваліся на 13 дзён наперад – 21 жніўня 1915 г. лічылася 3 верасня. Хаця вайна скончылася 11.11.1918, нямецкая акупацыя Гродна доўжылася да 27.04.1919. Гэта было зроблена спецыяльна: Заходнюю Еўропу трэба было ізаляваць ад бальшавіцкай рэвалюцыі, а Польшчы – не даць магчымасці аднавіць Рэч Паспалітую ў межах 1772 г.

Літ.: Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С.25–28, 37**;** Гродназнаўства: дапам./А.П. Госцеў [і інш.]; пад агул. рэд. В.В. Шведа, В.Р. Карнялюка. – Гродна: ГрДУ, 2009. – С.127–132.

Вайна руска-японская 1904–1905 гг. Пачалася 26.01.1904, а ўжо 30.01 уладыка гродзенскі Ніканор правёў у кафедральным саборы першае "молебствие Господу Богу о ниспослании победы Российскому христолюбивому воинству". Спецыяльныя малебны адбыліся ў касцёлах і сінагозе 31.01 і 1.02. Найвышэйшы маніфест, які загадваў "вооружённой силой ответить на вызов Японии" быў зачытаны 2.02 у гарнізоннай царкве. У гэты ж дзень адбылося паседжанне гарадской думы, якая вырашыла ахвяраваць 1 тыс. руб. у адмысловы фонд на дапамогу гродзенцам, пацярпелым на вайне ды іх сем'ям, а таксама адправіць на Далёкі Усход пяхотны батальён у колькасці 877 чал. з войскаў 2 армейскага корпуса. Адпраўкі на фронт адбываліся 2.02, 13.06, 25.06, 4.07.1904 г. Кожны раз уладыка Ніканор у кафедральным саборы служыў літургію, малебен са словамі наказу; салдатам раздавалі падарункі. Вайскоўцы з Гродна ўдзельнічалі ў баях пад Ляаянам, Вафангоў, Мукдэнам і інш. У памяць пра гэта ў *Пакроўскім саборы* вісяць дзве мемарыяльныя дошкі. Дамскі камітэт Гродна і мясцовае кіраванне Чырвонага Крыжа арганізавалі Гродзенскі лятучы лазарэт (3 урачы, 8 медсясцёр, 7 санітараў), які 27.08.1904 г. адправілі ў Манчжурыю. Вельмі часта ў горадзе праводзіліся дабрачынныя канцэрты, звыш 18 тыс. руб. да пачатку 1905 г. назбіраў Прыказ грамадскай міласэрнасці.

Літ.: Стурэйка С. А. Гродна падчас руска-японскай вайны 1904–1905 гг. // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада). – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 275–279.

С. 830

Вайна савецка-польская 1919–1920 гг. Як пішуць даследчыкі, пачалася з сутычак дзвюх армій пад Мастамі на *Нёмане*, Маларытай і Макранамі ў студзені 1919 г. У Гродна Польскае войска ўвайшло 5.04.1919. Нямецкія войскі дазволілі яму выехаць з чыгуначнай станцыі на Вільню. 27 красавіка горад пакінулі апошнія нямецкія часткі. Ноччу 28 красавіка палякі напалі на Беларускі гусарскі эскадрон, а днём Польская армія ўвайшла ў Гродна. На наступны дзень на *Рынку,* перад *касцёлам Св. Францыска Ксаверыя*, адбыліся ўрачыстае вітанне польскага войска і палявая імша, а ў Старым замку – прывітальная вячэра з удзелам польскіх і беларускіх афіцэраў, прадстаўнікоў усіх гарадскіх таварыстваў, саюзаў і дэлегатаў беларускага і яўрэйскага насельніцтва, праваслаўнага біскупа і нямецкага афіцэра сувязі. Апошнія нямецкія аддзелы выехалі з Гродна. 3 мая адбыўся парад беларускіх аддзелаў і польскіх войскаў, а вечарам банкет, арганізаваны па ініцыятыве Гродзенскай гарадской думы ў гонар польскіх вайсковых улад. 27, 28, 30 мая ў горадзе праходзіў першы рэкруцкі набор у польскае войска. 1 чэрвеня група польскай моладзі з вайсковай арганізацыі раззброіла *полк Першы беларускі* за адмову перадыслакацыі ў Слонім і далучэння да рэзервовай групы генерала Макшыцкага. Ягоныя 5-я рота і кавалерыйскі эскадрон пакінулі горад раней і летам 1919 г.

удзельнічалі ў баях з польскімі войскамі ў Лейтун і на Паўночным фронце. 3 чэрвеня 1919 упершыню горад наведаў кіраўнік польскай дзяржавы *Ю. Пілсудскі*. Ён хацеў пазбавіцца ад беларускага палка і пры гэтым не страціць даверу з боку беларускіх дзеячаў. 10.03.1920 на нарадзе з камандным складам Заходняга фронту ў Смаленску савецкі галоўнакамандуючы С. Каменеў аб'явіў пра наступленне фронту па лініі Смаленск – Варшава ў канцы красавіка. 14.05.1920 М. Тухачэўскі пачаў наступленне на літоўска-беларускім адрэзку вайны. 17–19.07.1920 польскія салдаты здзейснілі ў Гродне *пагром яўрэйскі*, а 18–19 ліпеня польскае войска бараніла Гродна ад Чырвонай арміі (ЧА) і было вымушанае адыйсці ноччу 19–20.07 у кірунку Караліно-Кузніца. 3 корпус кавалерыі ЧА пераправіўся праз Нёман і спыніўся па лініі Кашэўнікі – Малахавічы – Калбасіна – Баранавічы. 19 ліпеня, пасля бою з гродзенскім гарнізонам і гарадскім апалчэннем, войскі 3-га коннага корпуса *Г. Д. Гая* ўваходзяць у Гродна. Такім чынам быў сарваны план палякаў атакаваць ЧА па лініі Нёман – Шчара – канал Агінскага. Падчас адыходу польскай арміі, у момант вялікага збору людзей, гармат і фурманак, быў узарваны гужавы *мост* праз Нёман. У горадзе ўсталёўваецца савецкая ўлада. *Л. Шайкоўскі* перадае ЧА сцяг, выратаваны падчас расстрэлу дэманстрацыі на Параднай плошчы ў студзені 1919 г. 20 ліпеня ствараецца гродзенскі павятовы *камітэт Ваенна-рэвалюцыйны*. Старшыня – Лігер, а з 4 жніўня – *А. С. Славінскі*. Размяшчаўся ў былым *палацы Максімовіча*. 25 ліпеня ў Гродна прыехаў на сустрэчу з 3-м корпусам Гая М. І. Калінін, фатаграфаваўся з вайскоўцамі, а 28 ліпеня са штабам 4-й арміі прыбыў *М. М. Тухачэўскі*. 30 ліпеня праездам з Вільні ў Беласток спыніўся Ф. Э. Дзяржынскі, які 1–2 жніўня правёў нараду з работнікамі рэўкама і міліцыі. З ім прыехалі Ю. Мархлеўскі, Ф. Кон, *В. Багуцкі* – стваральнікі савецкай улады ў Беластоку. У гарадскім тэатры адбыўся ўрачысты мітынг, прысвечаны вызваленню Гродна і ўсталяванню савецкай улады. 20–26 верасня Польскае войска ажыццявіла бітву над Нёманам і захапіла Гродна 26 верасня. 3-я Чырвоная Армія адыйшла за р. Котра, 2-я польская армія зрабіла спробу яе пераследу. 12.10.1920 паводле ўмоваў перамір'я паміж РСФСР і Польскай Рэспублікай Гродна і губерня засталіся ў складзе Польшчы. 18.10.1920 былі афіцыйна спыненыя ўсе дзеянні на савецка-польскім фронце.

Літ.: Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005). – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 213–225; Czerniakiewicz A, Przejmowanie władzy przez Polaków w Grodnie (koniec 1918 – kwiecień 1919) // Początki niepodległości: Lomża-Białystok-Grodno-Suwałki, 1918–1919, Białystok, 1998. – S.41–50; Nowe Życie. – 1919. – 11 maja. – n. 20–21; 29 czerwienia – n. 27, s. 211; 17 sierpnia. – n. 35, s. 256; 31 sierpnia, n. 36, s. 269; 21 września, n. 39, s 287, 292; Historia Polski. Kalendarium dziejów. 1887–1943, Kraków 2010, s. 156, 176, 180, 189, 201.

Вайна 1812 г. (французска-расійская). Напярэдадні вайны з Гродна вывозілася ўсё каштоўнае. Першы абоз, у якім знаходзіліся справы губернскага праўлення, быў прывезены ў Мінск, але праз некалькі тыдняў трапіў у рукі французаў. Частка архіваў была давезеная да Масквы, але загінула там падчас пажару. У Віленскую казённую палату адправілі казённыя грошы

(200 пудоў медзі). У Пскоў вывозілі лекі з вайсковай казённай аптэкі (на некалькі соцень тысяч рублёў), багатыя рызы і царкоўнае начынне з *Сафійскай царквы*. Апошнія абозы з казённай маёмасцю, амуніцыяй, зброяй і харчамі пакідалі Гродна 28 чэрвеня пад агнём ворага. 28 чэрвеня Гродна пакінулі *губернатар Ланскі*, віцэ-губернатар *М. Ф. Бутаўт-Андрайковіч*, казначэй, радцы *праўлення губернскага*, чыноўнікі і канцылярскія службоўцы — усяго каля 50 чалавек. Абараняў Гродна *Платаў М.* Яго корпус вёў бой з авангардам войск караля Вестфальскага, брата французскага імператара *Банапарта Жэрома*. Гродзенскі паліцмайстар Высочын атрымаў загад зліквідаваць *мост* у выпадку пераправы французаў. Батальёну ўнутранай аховы на чале з прапаршчыкам Іўшыным не ўдалося стрымаць колькасна большыя напалеонаўскія войскі. Праціўнік быў абстраляны з гармат. Іўшын загінуў. Казакі Платава адыходзілі з Гродна праз Бераставіцу – Ліду – Шчучын. У той жа дзень Гродна заняла лёгкая кавалерыя Юзафа Панятоўскага, пляменніка *Станіслава Аўгуста Панятоўскага*. Гэта было спецыяльна зроблена французскім камандаваннем для таго, каб падкрэсліць, што "польскі" горад вызваліла польскае войска. Сам Жэром Банапарт са шматлікай світаю ў 80 коннікаў 30 чэрвеня з'явіўся ў Гродне. Перад горадам яго сустрэў новы мэр, а шляхта і чыноўнікі-палякі віталі караля Вестфальскага на кватэры, у каменным *доме віцэ-губернатара Максімовіча*. Галоўны штаб размясціўся ў доме Валіцкага (*гл. палац адміністратара*), а Панятоўскі — у губернатарскім доме (былы *палац А. Тызенгаўза*). З 1 па 3 ліпеня ў Гродне знаходзілася французская кавалерыя. 4 ліпеня Жэром Банапарт пакінуў Гродна і накіраваўся на Навагрудак, каб дагнаць адступаючую 2-ю армію Баграціёна. У гэты ж дзень гродзенскі губернатар, генерал польскіх войск *А. Ражнецкі* склікаў па даручэнні Жэрома Банапарта Гродзенскую канфедэрацыю, якая далучылася да Генеральнай канфедэрацыі Княства Польскага. У горадзе была створаная канфедэрацыйная рада пад старшынствам губернскага маршалка Людвіка Панцажынскага. У склад яе ўвайшлі 12 чалавек, яны ўтварылі чатыры аддзелы: правіянцкі, паліцэйскі, фінансавы, палітычны. Рада Гродзенскай канфедэрацыі праіснавала ўсяго 15 дзён. 29 ліпеня ў Гродна прыехаў упаўнаважаны Камісіі часовага ўрада ВКЛ князь Антон Гедройц, і пад яго кіраўніцтвам была арганізаваная новая структура мясцовай улады. Стварылі органы кіравання дэпартамента: прэфектура, функцыі якой выконвала адміністрацыйная камісія Гродзенскага дыстрыкта; падпрэфектура з павятовай камісіяй горада; *рада муніцыпальная.* Адміністрацыйная камісія мела тры аддзяленні: юстыцыі, унутраных спраў, паліцыі; правіянцкае і ваенных спраў; фінансавых і духоўных спраў, асветы. У жніўні была ўведзеная пасада дырэктара казённых маёмасцяў і даходаў. Дзейнасць мясцовых адміністрацыйных органаў была накіраваная галоўным чынам на забеспячэнне напалеонаўскай арміі рэкрутамі, харчаваннем, фуражом, транспартам, медыцынскім абслугоўваннем і г. д. У Гродне ў жніўні быў арганізаваны магазін (склад) на 500 тысяч порцый (хлеб, ялавічына, гарэлка, гародніна). Французы рэквізавалі ў жыхароў горада хлеб, крупы, фураж, птушку, мяса, масла і іншае харчаванне. Штодзённа ў горадзе выпякалі

100 тысяч порцый сухароў, за месяц выкарыстоўвалі для гэтага 4 500 вазоў дроў. У шпіталі на 1 200 чалавек, які ўтрымліваўся за кошт грашовай павіннасці жыхароў горада і Гродзенскага дыстрыкта, лячыліся салдаты і афіцэры напалеонаўскай арміі. Усе гарадзенцы павінныя былі плаціць падаходны падатак у памеры 1/7 ад прыбыткаў. Акрамя гэтага было шмат іншых грашовых паборaў: "асабовае адзіначасовае ахвяраванне" ад 15 грошаў (7 і 1/2 кап.) да 500 злотых (75 руб.), часовы падатак з асоб духоўнага звання, даплаты пры наборы рэкрутаў, на ўтрыманне жандармаў і г. д. Сучаснікі адзначалі, што "нельга было разабрацца, дзе заканчваецца рэквізіцыя і дзе пачынаецца рабаўніцтва". У Гродне быў разрабаваны *касцёл езуіцкі*, *Фара Вітаўта/Сафійскі сабор* пераўтвораны ў склад для сена, аўса і збожжа. Адсюль забралі ўсё начынне, выламалі іканастас, абразы выкарыстоўвалі замест дроў. Кошт страчанай рухомай маёмасці жыхароў Гродна склаў 48 тысяч 382 руб. 14 3/4 кап. Гарадзенцы прынялі ўдзел у арганізацыі вайсковых фармаванняў. Народная гвардыя складалася з дзвюх рот агульнай колькасцю 290 чал. (па іншых дадзеных – 119 чал.) на чале з Шастакоўскім. Народная гвардыя прызначалася для аховы межаў ВКЛ, падтрымкі парадку ў гарадах, аховы грамадскай і прыватнай маёмасці, а таксама важных ваенных аб'ектаў. Паводле загада Напалеона ад 1.07.1812, была створаная жандармерыя для паліцэйскай службы, аказання ўзброенай дапамогі адміністрацыйнай і грамадзянскай уладам. У Гродзенскім дэпартаменце быў прызначаны начальнік жандармерыі ў чыне палкоўніка і адзін старэйшы афіцэр у чыне эскадронных шэфа. Паводле падлікаў польскага даследчыка Івашкевіча налічвалася 400 жандармаў на чале з князем Міхалам Радзівілам, а паводле разлікаў расійскага гісторыка І. Ю. Кудрашова – 856 чалавек.

20 снежня авангард партызанскага атрада *Давыдава Дзяніса* на чале з маёрам *Чачэнскім А. М.* сутыкнуўся каля Гродна з аванпастамі аўстрыйскага корпуса. Апошні налічваў каля 3–4 тысяч чалавек пяхоты і кавалерыі, 30 гармат, але праслаўленаму партызану ўдалося пераканаць генерала Фрэйліха адыйсці і не спальваць пры гэтым правіянцкія і камісарыяцкія запасы (коштам каля 1 млн. руб.). Давыдаў увайшоў у Гродна 21 снежня. З палону былі вызваленыя 467 радавых і 14 параненых рускіх афіцэраў. У палон трапіў 661 варожы салдат. На Параднай плошчы (цяпер Савецкая) Давыдаў зачытаў гарадзенцам свой зварот і аддаў шмат загадаў аб кіраванні горадам і забеспячэнні парадку. Падпалкоўнік Храпавіцкі быў прызначаны начальнікам горада, а яўрэйскі кагальны – начальнікам паліцыі. Усё насельніцтва ў кароткі тэрмін (дзве гадзіны) павінна было здаць усю агнястрэльную зброю і спаліць алегарычныя карціны, якія праслаўлялі французаў, а на іх месцы размясціць тыя, якія "праслаўляюць вызваліцеля Расіі ад нашэсця адукаваных варвараў". Для патрулявання па горадзе "дзённа і ночна" была выдзеленая сотня казакоў. Ксяндзу загадвалася напісаць і сказаць у касцёле прамову, у якой ён мусіў праклясці Напалеона, яго войска і саюзнікаў, "ухваліць расійскага імператара, народ і войска". Усе магазіны (склады) былі апячатаныя, а каля іх выстаўленыя каравулы. Кагальны павінен быў скласці спіс усіх чыноўнікаў і абываценяў,

якія запісаліся ў службу Княства (Герцагства) Варшаўскага. 24 снежня, у дзень нараджэння Аляксандра I, адбылося богаслужэнне з нагоды вызвалення горада ад напалеонаўскага нашэсця. Усе гарадскія чыноўнікі павінныя былі з'явіцца да Давыдава з віншаваннямі, горад быў асветлены, цэлыя суткі гучалі званы ўсіх цэркваў. Магчыма, гарадзенцы ўспаміналі ў гэты час, як 15 жніўня яны адзначалі дзень імянін Напалеона.

У Гродне Давыдаў жыў насупраць *ратушы,* у пакоях старажытнага *палаца Радзівілаў* (ён знаходзіўся каля сучаснай плошчы Савецкай). 25 снежня Дзяніс Давыдаў атрымаў загад ісці на Ганёндз (цяпер мястэчка ў Ломжынскім ваяводстве, Польшча). Яго атрад выступіў без затрымкі, аднак сам ён з прычыны хваробы вымушаны быў застацца ў Гродне яшчэ на пяць дзён. У Саколцы спецыяльны нарачны даставіў Давыдаву ад дзяжурнага генерала П. П. Канаўніцына пакет з узнагародамі – ордэнамі св. Георгія 4-га класа і св. Уладзіміра 3-й ступені. Апошні – за вызваленне Гродна. Пасля адыходу атрада Давыдава ў горад увайшла кавалерыя генерал-лейтэнанта Ф. К. Корфа і пяхота генерала М. А. Міларадавіча. На гродзенскіх праваслаўных могілках ёсць помнік генерал-лейтэнанту *Ланскому Сяргею Мікалаевічу*, удзельніку вайны 1812 г.

Літ.: Швед В. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. / В. Швед, С. Данскіх. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2006. – 252 с.

Вайна 1939 г. (пачатак Другой сусветнай вайны). 1 верасня гродзенцы былі абуджаныя разрывамі бомб, якія падалі на цэнтр і наваколле горада з самалётаў Люфтвафэ. Бамбардавалі чыгунку, вайсковыя базы і склады боепрыпасаў. Немцы наносілі ўдар польскай арміі і тым самым падрыхтоўвалі лепшыя ўмовы для "вызваленчага паходу" Чырвонай арміі на Беларусі. Апошні выклікаў паніку сярод палякаў, якія не чакалі нападу з усходу. Бежанцы з захаду напалохалі яўрэяў, якія даведаліся пра іх пераслед немцамі.

Гродна мела 1554 га тэрыторыі і каля 58 тыс. чал. насельніцтва. У структуры апошняга найбольшую групу складалі палякі, затым яўрэі, беларусы і іншыя. Тут да красавіка 1939 г. знаходзіўся моцны гарнізон (29 польская пяхотная дывізія ў складзе: 76 полк пяхоты, 81 полк гродзенскіх стральцоў, 29 полк лёгкай артылерыі без 1 дывізіёна, 7 танкавы батальён, дывізіён супрацьпаветранай артылерыі), сядзіба камандавання Акругі Корпуса III. У красавіку названыя польскія часткі былі перадыслакаваныя на мяжу з немцамі. Сфармаваная на іх месца аперацыйная група "Гродна" (каля 7 тыс. чал.) была 11.09 зліквідаваная і накіраваная на абарону Львова. Перад боем з Чырвонай арміяй у палякаў у Гродне было толькі два няпоўных батальёны пяхоты (адзін маршавы на чале з кап. П. Корзунам, другі ахоўны на чале з маёрам Б. Серафіна). Да іх далучыліся: аддзел каля 200 чал. пад камандаваннем падпаруч. рэзерву А. Іглеўскага, людзі з 5 лётнага палка з Ліды, групы вайсковай жандармерыі і паліцыі, пададдзелы пяхоты з Вільні, часткова 101 і 102 рэзервовы

полк уланаў, цывільныя добраахвотнікі (гарцэры, гімназісты, чыноўнікі). Усіх абаронцаў Гродна налічвалася ад 2000 да 2500 чал.

Згодна з загадам камандуючага 11 Чырвонай арміі ад 19.09.1939 г. на Гродна павінна была наступаць механізаваная група 16 стралковага корпуса ў складзе: самастойны разведвальны батальён 2 страл. дывізіі, 100 і 365 танкавыя батальёны. Але ў гэты ж дзень, на 7 гадзін раней, камандуючы конна-механізаванай групы Болдзін аддаў загад заняць Гродна да канца 19 верасня 15 танкаваму корпусу камдыва Пятрова, узмоцненаму 101 стралковым палком з 4 страл. дывізіі і 119 стралковым палком з 13 страл. дывізіі, якія мелі аўтатранспарт. З-за атсутнасці паліва і добрай сувязі паміж вайсковымі адзінкамі названыя часткі 19 верасня ў бок Гродна не вырушылі. Наступнага дня штаб Беларускага фронту выдаў загад захапіць горад да канца дня сіламі адной дывізіі кавалерыі, што рабіла немагчымым выкананне загада. Камкор Болдзін вырашыў захапіць Гродна выдзеленымі раней сіламі 15 танкавага корпуса, 101 і 190 страл. корпуса, 4 кав. дывізіяй камбрыга І. Музычэнкі з 6 кав. корпуса, які павінен быў прыйсці ў горад 21 верасня. Штаб фронту зацвердзіў гэтае рашэнне, а штаб 11 арміі не пагадзіўся, як і раней, на Гродна павінен быў ісці узмоцнены 16 страл. корпус. Апошні выйшаў у напрамку горада 20.09 і, пасля бою пад Скідзелем, спыніўся там на адпачынак. Да Гродна першымі прыйшлі часткі конна-механізаванай групы Беларускага фронту: каля паловы танкаў не мелі паліва, 20 механізаваная брыгада знаходзілася каля Слоніма.

Да 12.09 на чале абаронцаў Гродна стаяў камандуючы тэрыторыі крэпасці Гродна палкоўнік Б. Гулевіч, які падрыхтаваўся да яе абароны з боку немцаў. Менавіта ён назапасіў бутэлькі з бензінам і нафтай для барацьбы супраць танкаў і правёў курсы па іх выкарыстанні для вайскоўцаў і ахвотнікаў. Пасля Гулевіча камандуючымі тэрыторыяй крэпасці Гродна былі: адстаўны палкоўнік Б. Адамовіч, затым палк. Сядлецкі, а з 21.09 – камандуючы групоўкі "Ваўкавыск" генерал Пшэздзецкі. Пералічаныя вайскоўцы не верылі ў магчымасць абароны Гродна наяўнымі сіламі і сродкамі, не змаглі ці не паспелі сфармаваць з наяўных вайсковых аддзелаў баявыя фармаванні. Розумам і душой абароны Гродна сталі віцэ-прэзідэнт горада Р. Савіцкі і камандзір 31 батальёна маёр Б. Серафін. Яны арганізавалі капанне равоў, будаванне супрацьтанкавых умацаванняў, навучанне добраахвотнікаў і дапаможных служб, выбралі месцы супраціўлення ў горадзе: мураваныя будынкі (на *касцёле Фарным* і гарнізонным/*Фары Вітаўта* паставілі кулямёты), *могілкі*, рака *Нёман*. Дырэктар *гімназіі* ксёндз В. Патрэбскі заклікаў гімназістаў да абароны горада, і частка з іх была ўзброеная старымі французскімі ружжамі.

У выніку нямецкага бамбардавання частка турмы была разбураная, і вязням удалося збегчы. Сярод іх былі таксама кіраўнікі гродзенскага камуністычнага падполля, якія здолелі зарганізаваць паўстанне, і польскім абаронцам горада прыйшлося з 17 па 22 верасня весці з імі барацьбу. Добра вядомы інцыдэнт на плошчы Стэфана Баторыя, дзе 19 верасня адбыліся баі.

20 верасня ў 8 гадзін раніцы з захаду Гродна пачалі наступаць танкі з разведбатальёна 27 танкавай брыгады (12 танкаў і 1 самаходка) Чырвонай арміі

на чале з маёрам Багданавым. Гродзенскія абаронцы не чакалі іх з гэтага напрамку і спачатку думалі, што надыходзяць немцы. Палякі да гэтага часу тлумачаць хуткае прасоўванне савецкіх танкаў тым, што ў іх знаходзіліся гродзенскія яўрэі-камуністы і паказвалі дарогу. Відавочцы ўспамінаюць пра тое, што з першага танку, які прыехаў да моста праз Нёман, выйшаў яўрэй, які ўдзельнічаў у бойцы перад *пагромам яўрэйскім 1935*. Даказаць або абвергнуць гэта немагчыма, але вобраз "жыдакамуны" уплывае на наратыў пра верасень 1939 г.

Прайшоўшы праз масты ў горад, савецкія танкі без падтрымкі пяхоты на вузкіх вуліцах не мелі шанцаў на перамогу над палюючымі за імі групамі абаронцаў і амаль усе былі знішчаныя. У другой палове 20.09 падыйшлі да Гродна пяхота з 4 с. д. і артылерыя 119 і 101 с. п. – пачалася перастрэлка паміж берагамі ракі Нёман. Агонь савецкай артылерыі каардынавалі прабальшавіцкія сілы ўнутры горада. Да 20.00 дайшлі дывізія кавалерыі (6 казацкі корпус), 100 танкаў і бронемашын, якія занялі пазіцыі на паўднёва-усходніх межах. 2 батальён 119 стралковага палка 15 танкавай дывізіі на лодках пачаў пераправіцца на правы бераг. З яго дапамогай удалося завалодаць *могілкамі*, якія сталі плацдармам для ажыццяўлення разведвальных атак. Ноччу сюды пераправіўся яшчэ адзін батальён з названага палка. Уначы з 20 на 21.09 да польскіх частак падыйшлі тры палкі рэзервовай кавалерыйскай брыгады "Ваўкавыск" на чале з генералам В. Пшэздзецкім. Ён узначаліў абарону Гродна (штаб знаходзіўся на чыгуначным вакзале), пачалося будаўніцтва новых супрацьтанкавых пастак, барыкадаванне мастоў, забеспячэнне абаронцаў неабходнымі рэчамі. Да раніцы 21.09 Чырвоная армія акружыла Гродна. Каля 4.00 пачалася артылерыйская падрыхтоўка, і праз паўгадзіны савецкія войскі сталі наступаць на горад з захаду, поўдня і паўднёвага ўсходу. Упартая бойка ішла каля моста, дзе савецкія танкі стрымлівала польская гармата (камандуючы кавал. корпуса А. Яроменка перасаджваўся з танка ў танк). Каля 8.00 група польскіх вайскоўцаў на чале з палкоўнікам Адамовічам пачала эвакуацыю ў бок літоўскай мяжы. Гэта аслабіла сілы абаронцаў і дрэнна падзейнічала на іх маральны стан. У той час ЧА узмацнілася 16 стралковым корпусам з 11 арміі. 22.09 каля 14.00 Гродна ў значнай частцы было захопленае танкамі і пяхотаю ЧА, хаця да позняга вечара захоўваліся ачагі супраціўлення палякаў (казармы 81 пях. палка па вул. Маставой, *Стары замак,* будынкі прафсаюзных школ, *могілкі праваслаўныя*). Да раніцы 22.09 польскія аддзелы пакінулі Гродна – яны прарываліся на захад або на поўнач ў напрамку літоўскай мяжы. Страты 27 танкавай брыгады склалі: 19 забітых, 26 параненых чал., 2 танкі, 1 радыёстанцыя. Страты 20 механізіраванай брыгады: 3 забітых, 20 параненых чал., 1 самаходка.

Пасля прыходу савецкай арміі ў Гродна пачаліся расправы з абаронцамі горада. НКУС, чырвонаармейцы, пры актыўным удзеле мясцовых камуністаў, расстралялі не менш за 300 вайскоўцаў і мірных жыхароў. Расстрэлы адбываліся ў горадзе і ваколіцах: пад сценамі *кляштара францішканцаў*, на Чыгуначнай вул. за казармамі 76 пях. палка, у лясках "*Горкі Сабачай*" (каля 20 гімназістаў) і *"Сакрэта",* у ляску "*Панямунь*" (70 польскіх жаўнераў), у *Румлёва,*

у лясках маёнтка *Пярэселка* і *Пышках,* у Новай Калоніі (40 чал. былі эксгумаваныя ў 1992 г.). Адбыўся працэс над пажарнымі, акт абвінавачвання ім быў складзены пракуратурай Беластоцкай вобласці 22.04.1940 г. 13 асобаў былі абвінавачаныя ў пакаранні 25 яўрэяў, салідарных з савецкай уладай (верасень 1939). 4 чал. былі прыгавораныя да расстрэлу (сярод іх былыя сенатары К. Біспінг-Гален, К. Церлікоўскі), 3 чал. асуджаныя на 10 гадоў, 3 – на 8 гадоў, 1 – на 6 гадоў зняволення, а дваіх прызналі невінаватымі. На пл. Валовіча, на рагу вул. Скідзельскай, у 1940 публічна спалілі польскія кнігі.

Крын. і літ.: Малишевский Н. Бой за Гродно 19 сентября 1939 года глазами участников и очевидцев. – Мн.: издатель А.Н. Вараксин, 2012. – 140 с.; Філіповіч М., Савіцка Эдыта (Беласток). Савецкія рэпрэсіі супраць абаронцаў Горадні ў 1939 г. // Горад святога Губерта: зборнік краязнаўчых артыкулаў. Выпуск 6 (2012). – Горадня: б.в., 2012. – С. 87–96; Czarnowski R. J. Grodno. Zapomniana stolica. – Warszawa: oficyna wydawnicza RYTM, 2015. – C. 105–118; Grabczyński K. Obrona Grodna // Magazyn Polski. – 1994. – N. 42 (7/8). – S. 74–80; Grzelak Cz. Grodno 1939. – Warszawa: In-t Wydawniczy związków Zawodowych, 1990.– 72 s.; Grzelak Cz. Wilno-Grodno-Kodziowce 1939. – Warszawa: Dom wydawniczy Belona, 2002. – C.; J. Jadeszko. Obrona Grodna we wrześniu 1939 roku // Agresja sowiecka 17 września 1939 roku na kresach Wschodnich i Lubelszczyźnie. – Lublin: Tow-wo Przyjaciół Grodna i Wilna, 2011. – S. 57 – 76

Вайзэнборн/Вайзэборн Ганс – старэйшы бурмістр Гродна падчас нямецкай акупацыі (з 1915). У красавіку 1916 адбыліся змены ў сістэме кіравання горадам: *камітэт Грамадзянскі* быў ператвораны ў дарадчы орган, *бурмістр* В. узначаліў *раду гарадскую*. Галоўнай задачай апошняй было забеспячэнне харчаваннем нямецкага войска і насельніцтва Германіі.

Літ.: Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гродна-Вроцлаў: Гарадзен. б-ка, 2014, с. 288–289; Горадня 1916 г. на старонках Дзённіка ротмістра Курта Кламрота / падрыхтоўка да публ. А. Смаленчука) // Горад святога Губерта: зб. краязн. арт. – Горадня, 2012. – Вып. 6. – С. 41–85.

Вакзал аўтобусны, знаходзіцца на вул. Чырвонаармейскай, 7. Прайшоў тры перыяды існавання: з 1962 – аўтобусны вакзал г. Гродна; з 2002 – філіял "Аўтавакзал" г. Гродна прадпрыемства "Гроднааблаўтатранс"; з 2009 – філіял "Аўтавакзал" г. Гродна ААА "Гроднааблаўтатранс". В.а. знаходзіцца на вул. Чырвонаармейскай, 7. Цагляны будынак быў пабудаваны ў 1962 г. Сцены будынка былі абліцаваныя неглазаванай керамічнай пліткай светла-жоўтага колеру. На першым паверсе справа і злева ад вестыбюля былі касавыя залы, камера захоўвання, выхады ў горад і на пасадачныя пляцоўкі, буфет і дыспечарская з уваходам з боку пляцовак. Да 1.02.1963 уваходзіў у склад Гродзенскай аўтакалоны 2408-С; прыгарадны вакзал рэканструяваны на базе мяснога павільёна былога базара ў 1977. Аўтавакзал ў 2021 абслугоўваў 18 міжнародных, 70 міжгародніх і каля 114 прыгарадных маршрутаў штомесячна. Асноўнай дзейнасцю В. а. з'яўляецца: продаж білетаў; сувязь з іншымі аўтавакзаламі

рэспублікі для заказу білетаў; з 2008 працуе платная даведачная служба 114; уведзеная цэнтралізаваная сістэма продажу білетаў; ёсць магчымасць забраніраваць білет па тэлефоне; асабісты аўтапарк дазваляе аказваць паслугі па абслугоўванні вяселляў і ўрачыстых мерапрыемстваў.

Крыніца і літ.: сайт grodnotrans.by; Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 75.



С. 831

Вакзал чыгуначны. Станцыя пабудаваная ў стылі класіцызму ў 1862 г. на лініі *чыгункі* Варшава – Санкт-Пецярбург. Будынак меў строга сіметрычную аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю, прамавугольны ў плане. Цэнтральная частка была двухпавярховай, злучанай аднапавярховымі галерэямі з бакавымі аднапавярховымі крыламі. 21.09.1939 на станцыі месціўся польскі штаб абароны горада генерала Пшэздзецкага. Пасля разбурэння падчас *вайны Вялікай Айчыннай* быў адноўлены ў 1948 (з дабудаваннямі другога паверху). Будынак станцыі быў зруйнаваны ў 1986 падчас пабудовы новага вакзала. Супраць гэтага выступіла група (30 чал.) гродзенскай інтэлігенцыі (сярод іх: *Ткачоў М. А., Таранда М., Госцеў А.,* Жук І.). На сцяне ёсць мемарыяльная дошка, надпіс на ёй гаворыць аб падзеі 14 сакавіка 1863 г. (гл. *паўстанне 1863*), калі вучні *гімназіі гродзенскай* на чале з *Л. Кульчынскім* паспрабавалі захапіць паравоз з вагонамі, каб выехаць у Парэчча, дзе чакаў іх брат Л. Нарбута.

Літ.: Гродзенскі чыгуначны вакзал //Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. – Мінск., 1993. – С. 183; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 26; Трусов И. Первый железнодорожный вокзал на территории Беларуси/ИгорьТрусов // Архитектура Гродно. Невосполнимые утраты. XIX -XX вв. Гродно, 2011. – С. 60–68; Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017. – С. 160–171.

Вакольны горад – умацаваная гандлёва-рамесная частка Горадні, размеркаваная на ўзвышшы насупраць *замка Старога*, на месцы, дзе сёння *замак Новы*. Археалагічныя даследаванні А. К. Краўцэвіча дазваляюць сказаць, што на тэрыторыі В. г. знаходзілася *царква Васкрасенская*. Паводле гравюры Адэльгаўзера-Цюнта тут стаяў *дом каралеўскі*.

Літ.: Краўцэвіч А.К. Гродзенскі вакольны горад // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. – Мінск: БелЭн., 1993. – С. 189.

Валенрод Конрад (? – 25.07.1393). Са старажытнага франкскага роду, грасмайстар Тэўтонскага ордэна (з 12.03.1391 па 1393). Ваяваў з Літвой на баку *Вітаўта,* а пасля адыходу апошняга ад Ордэна, выступіў супраць ВКЛ і Кароны Польскай. Памёр ад шаленства. Легенды робяць яго ліцвінам, які ўступіў у Ордэн, каб адпомсціць яму за разбурэнне сваёй радзімы (гл. А. Міцкевіча "Конрад Валенрод"). Комтур Шлокаў (1382), вялікі маршал (1382–1387), майстар (1391–1393).

Літ.: Энцикл. Словарь. Т. V (9) – СПБ.: Брокгауз Ф.А., Ефрон И. А., 1891. – 468 + XI с.

Валеўскі Ян – галоўны рэдактар (з 30.06.1931) штодзённай газеты "Głos Ziemi Grodzieńskiej", якая раней выходзіла пад назвай "Gazeta Polska Ziemi Grodzieńskiej".

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 65.

Валікоўскі Фёдар (1876, в. Целяцін Тамашэўскага пав. Люблінскай губ. – 1950- я) – настаяцель Пакроўскага сабора (1938). Скончыў духоўную семінарыю і служыў настаяцелем сабора ў Лодзі. З 1935 у Гродне. Актывіст Таварыства праваслаўных палякаў ў Гродне, сябра праўлення Праваслаўнага навукова-выдавецкага інстытута. 19.12.1944 арыштаваны органамі НКУС, 22.03.1947 прыгавораны да пяці год зняволення. Пасля вызвалення знаходзіўся ў Жыровіцкім манастыры, пэўны час быў выкладчыкам у мясцовай семінарыі.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 65.

Валіцкі Міхал (каля 1747, Наваградчына – 1828, Вільня), сапраўднае прозвішча Міцкевіч. Паходзіць з сям'і дробнага шляхціца. Авантурыст і філантроп. Граф, уладальнік у Гродне *палаца адміністратара* і маёнтка ў Азёрах. Чалавек вельмі неардынарны. Свой капітал ён выйграў у карты ў Парыжы, прозвішча Валіцкі і права належаць да яго роду выкупіў у ваяводы Б. Валіцкага. У 1787 г. купіў у С. Солтана пасаду падстолія кароннага, тытул графа купіў у Італіі, а пацвердзіў яго вялікі князь літоўскі і кароль польскі *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі*. М. Валіцкі быў каханкам княгіні дэ Паліньяк, якая ўвяла яго ў двор караля Людовіка XVI, і стаў фаварытам французскай каралевы Марыі Антуанэты. Вярнуўся на радзіму (дзе не быў 20 гадоў) падчас Вялікай Французскай рэвалюцыі, знаходзіўся спачатку ў Варшаве, потым у *Гродне*. Тут жыў у трохпавярховым будынку, былым доме адміністратара. Набыў фальварак Азёры Гродзенскага павета, дзе стварыў узорную гаспадарку (працавалі таксама суконная і папяровая мануфактуры). Станіслаў Аўгуст Панятоўскі узнагародзіў Валіцкага ордэнам Св. Станіслава 1 ступені за ахвяраванне значнай сумы на карысць навучальных устаноў. Калекцыю каштоўных камянёў В. падарыў Віленскаму ўніверсітэту. Фундаваў у ім навучанне сваіх сваякоў Міцкевічаў і Валіцкіх. Падчас *вайны 1812 г.* вядомы партызанскі камандзір *Давыдаў Д.* вызваляў Гродна і сустракаўся з мясцоваю шляхтай. Вось, што ён напісаў у сваіх успамінах: "стары чалавек граф Валіцкі (яму было 65 год. – В. Ш.), які па старасці і баязлівасці не кідаўся ў вайсковыя прадпрыемствы, а ад скупасці не дапамагаў грашыма".

Літ.: Давыдов Д. Военные записки – М.: Воениздат, 1982; Заневский С.В. Шляхетский род Валицких в истории Гродно // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008.

– С. 420–425; Самусік А.Ф. Граф Міхал Валіцкі – айчынны калекцыянер і мецэнат другой паловы XVIII – першай чвэрці XIX ст. // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 416–420; Трусаў І. Валіцкі Міхал // ВКЛ, т. 1, с. 382; Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 12. – Гродна: ГАІУН, 2010. – С. 62–65; Шпунт А., Цудоўная фартуна шляхціча Валіцкага // Найяснейшая Рэч Паспалітая: Цывілізацыя-Культура-Рэлігія-Палітыка-Авантура-Героіка-Успамін / Уклад. А. Дзярновіч. – Мінск: І.П. Логвінаў, 2007. – С. 160–176; J. Puchalska, Kresowi Sarmaci. – Warszawa, 2015. – S. 13–29.

Валіцкі Ян – дырэктар тытунёвай фабрыкі, старшыня мясцовага прадстаўніцтва Лагера нацыянальнага аб'яднання. Электар у склад ваяводскіх камісій, якія абіралі сенатараў. У 1938 – сябра Камітэта па святкаванні 20-годдзя незалежнасці Польшчы. Па словах А. Чарнякевіча, В. быў удзельнікам абароны Гродна ў 1939 г.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 66.

Валовіч Іван – маршалак каралеўскі. Разам з Іванам Карпам і Іванам Трызна-Грыгор'евым 24.07.1567 г. у Гродне сустракаў паслоў. Выява яго ёсць на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта.*

Літ.: Сліж Н. Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця / Н. Сліж // Arche. – 2017. – № 2. – С. 99–105; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997.

Валовіч Міхал Казіміравіч (18.06.1806, маёнтак Парэчча Слонімскага ў. – 2.08.1833, Гродна) – сын Казіміра і Мар'яны-Людвікі Валовіч. Скончыў гімназію ў Жалібожы, затым – Віленскі ўніверсітэт (1822–1825). З пачаткам паўстання 1830 г. у Каралеўстве Польскім пакінуў 15.01.1831 маёнтак і накіраваўся разам з Леанам Працлаўскім ад Літоўскага паўстанцкага камітэта па дапамогу да кіраўніка польскага войска Ю. Хлапіцкага. Не атрымаўшы падмацавання, застаўся ў Варшаве і ўступіў у Літоўскі легіён. З разгортваннем паўстання на землях былога ВКЛ, быў высланы эмісарам у Палангу для сустрэчы партыі зброі, сабранай еўрапейцамі для польскіх паўстанцаў. Штурм Палангі паўстанцамі 13.05.1831 быў няўдалым. Вяртаючыся ў Варшаву, па дарозе далучыўся да корпуса А. Гелгуда, які ішоў на дапамогу беларуска-літоўскім губерням. В. стаў ад'ютантам генерала Ю. Шыманскага, прыняў удзел у некалькіх бітвах. Пасля паражэння паўстання ў ліпені апынуўся ў Прусіі. Завочна следчай камісіяй 19.10.1832 быў занесены ў 2 разрад дзяржаўных злачынцаў (да гэтага ж разраду далічылі і бацьку Казіміра Валовіча). Іх маёнтак быў канфіскаваны. У 1832 г. В. напісаў эсэ "Партызанская вайна", у якім сцвярджаў, што толькі яна можа прывесці да адраджэння Рэчы Паспалітай. Таму,

калі пачалася падрыхтоўка экспедыцыі Ю. Заліўскага, актыўна далучыўся да акцыі. Яму даручылі ўзначаліць Слонімска-Навагрудскую акругу. Прытрымліваўся дэмакратычных і рэспубліканскіх поглядаў, ішоў на родную зямлю з заклікамі свабоды і роўнасці правоў для ўсіх людзей, у тым ліку прыгонных сялян. У канцы лютага ці пачатку сакавіка В. быў на месцы прызначэння разам са сваім паплечнікам Ю. Яцкевічам. Да арышту яму ўдалося стварыць невялікі партызанскі атрад, які ў адрозненне ад іншых складаўся ў асноўным з сялян (10 чалавек), сямёра з якіх былі ўніятамі. Тры разы атрад Валовіча спрабаваў зрабіць напад на пошту з мэтай захопу грошай, але няўдала. Не ўдалося таксама наладзіць кантакты з суседнімі атрадамі. Напады на пошту і данос Яна Валовіча 13 мая 1833 г. прывялі да арганізацыі шматдзённых аблаў на Валовіча і іншыя партызанскія атрады. 26 мая В. падчас затрымання хацеў скончыць жыццё самагубствам. 11.07.1833 пачаўся судовы працэс. Над В. ён адбываўся ў Гродне, камісія вайсковага суда была складзеная пры мясцовым ардынансхаўзе. В. у сваіх паказаннях смела казаў пра сябе, але маўчаў пра паўстанцкія мэты прыезду з-за мяжы, пра свае кантакты, пра іншых асоб і эмісараў. Гаварыў, што вярнуўся з эміграцыі на радзіму, каб правесці жыццё ў тутэйшых лясах і не мае ніякіх палітычных ці сацыяльных намераў. Прыгавор В. быў аб'яўлены 9.06.1833. В. быў спачатку асуджаны да чвартавання, але віленскі генерал-губернатар кн. Далгарукаў пагадзіўся з гродзенскім камендантам, генералам Казловым і змяніў прысуд на павешанне. Яго прывялі ў выкананне 21 ліпеня 1833 г. ў Гродне, каля парахавога склада за Скідзельскай заставай, у глінянках, насупраць яўрэйскага дома апекі. Згодна з рапартам Далгарукава да ваеннага міністра, на экзекуцыі прысутнічала некалькі тысяч жыхароў Гродна. Сучаснікі гаварылі, што прывезлі яго на возе, падобным на клетку. "Чтобы не могло быть тайных молений над телом преступника, оно ночью сокрыто и ничем не может быть отыскано". Цела В. улады кінулі у вапну, каб хутчэй расклалася. У міжваенны час плошча ў раёне Скідзельскай заставы (цяпер раён праспекта Касманаўтаў каля *аўтобуснага вакзала*) насіла імя В.

Літ.: Мальдзіс А. Падарожжа ў XIX стагоддзе. – Мн., 1969; Матвейчык Д. Ч. Выгнаныя з роднага краю: Паслялістападаўская эмігрцыя з Беларусі і Літвы (1830–1870-я гады). – Мн., 2011. – С. 82–88; Талерчык С. Парэчча. – Гродна: Ратуша, 2002; Chodźko M. Dziesięć obrazów z wyprawy do Polski 1833 r. 1834–1835. Poema z muzyką do dwóch pieśni i czterema portretami. – Paryż, 1841; Nowe życie – 1929 – 14. 07. № 47, s. 2; Sidorowicz-Czerniewska K. Sprawa emisariusza Michała Wołłowicza w r. 1833. – Grodno, 1934.

Валовіч Яраш – стараста самагіцкі (жамойцкі), земскі падскарбі ў 1609 г. Сын Марыны Мялешкі (Мялешкі – фундатары Жыровіцкага манастыра; Марына пахаваная "пад вялікімі варотамі" гродзенскай *царквы Прачысценскай саборнай*). В. даў гэтай царкве 13.10.1626 некалькі сялянскіх двароў з 16 прыгоннымі, якія раней належалі (паводле запісу гродзенскага падкаморыя Юрыя

Мялешкі, дзядькі В.) Бернардзінскаму манастыру, бо манахі-бернардзінцы не мелі права валодаць маёмасцю.

“Валочная памера” гл. “Помера волок городенских”.

Валчэцкая (Цюнянкова) Алена Уладзіміраўна (нарадз. 4.12.1943, Гродна) – першая беларуская спартсменка, якая здабыла залаты алімпійскі медаль у спартыўнай гімнастыцы. Майстар спорту СССР (1958). Чэмпіёнка СССР у практыкаваннях на гімнастычным бервяне (1963–64), у апорным скачку (1961, 1962, 1965). Пераможца Такійскай алімпіяды (1964) ў камандным заліку. Пераможца і прызёр міжнародных і ўсесаюзных спаборніцтваў. Скончыла с. ш. № 8, *інстытут Гродзенскі педагагічны* (1965). Стала трэнерам па спартыўнай гімнастыцы, заўважыла *В. Корбут* і ўзяла яе ў сваю групу, а пазней перадала *Кнышу Р. І.* Працавала з 1968 выкладчыкам гімнастыкі ў гродзенскім тэхнікуме фізкультуры, а пасля стварэння на яго базе факультэта фізічнай культуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта – выкладчыкам, а затым з 1994 г. дацэнтам. У 1998 і 2000–2006 гг. працавала ў прыватнай школе гімнастыкі ў ЗША. Пасля вяртання ў Гродна працягвала працу дацэнтам кафедры тэорыі і методыкі фізкультуры ГрДУ. Заслужаны трэнер БССР. *Ганаровы грамадзянін* Гродна. Узнагароджаная медалём “За заслуги перед университетом” (2012).

Літ.: 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. – Мінск: УП “Экоперспектива”, 2008. – С. 381; Папко И. Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Минск: Харвест, 2003. – С. 66–69; Кныш Р. Алена Валчэцкая. З правінцыі – на алімпійскі п’едэстал// Сто асоб беларускага спорту: нарысы. – Мінск, 2009. – С. 114–117; Попко И. Елена Волчецкая // Попко И. Олимпийцы Гродненщины. – Минск, 2003. – С. 66–69; Республика Беларусь: Энциклопедия. Т. 2. – Минск, 2006. – С. 795.

Валь фон Віктар Карл Конрад Вільгельм Вільгельмавіч/Уладзіміравіч (1840 – 07.02.1915) – гродзенскі *губернатар* з 4.06.1878 да 27.02.1879. З прыбалтыйскіх дваран, лютэранін. Вучыўся ў Мікалаеўскім інжынерным вучылішчы ў С.-Пецярбургу (скончыў у 1859), быў слухачом з 16.01.1859 у званні інжынер-прапаршчыка ў Інжынернай акадэміі (праз год быў звольнены за ўдзел у пратэсце студэнтаў супраць аднаго з настаўнікаў). Служыў у 1-м сапёрным батальёне ў Гуры Кальварыі**,** затым – у Смаленскім уланскім палку на тэрыторыі Каралеўства Польскага. Падчас *паўстання 1863–64 гг.* быў ад’ютантам генерала Ф. Ф. Берга і за баявыя заслугі атрымаў чын ротмістра. З сакавіка 1865 быў чыноўнікам асаблівых даручэнняў пры генерал-паліцмайстры Каралеўства Польскага. З 9.03.1873 да 25.02.1876 у званні палкоўніка асаблівых даручэнняў служыў пры галоўнакамандуючым войскамі Варшаўскай вайсковай акругі. У 1874 стаў флігель-ад’ютантам.

З 1876 па 1878 выконваў абавязкі яраслаўскага віцэ-губернатара. Указам Аляксандра ІІ ад 4.06.1878 палкоўнік Валь быў прызначаны выканаўцам абавязкаў гродзенскага губернатара з захаваннем былых званняў. Затым

быў харкаўскім (1879–1880), віцебскім (1880–1884), падольскім (1884–1885), валынскім (1885–1889), курскім (1889–1892) губернатарам. З 1892 па 1895 служыў пецярбургскім граданачальнікам. У 1895 быў прызначаны ганаровым апекуном у Апякунскую раду Асабістай яго імператарскай вялікасці канцылярыі па установах імператрыцы Марыі. Быў у ім, відаць, да *вайны першай сусветнай.* У 1901–1902 з'яўляўся віленскім губернатарам. У 1902 паводле яго загаду была разагнаная палітычная дэманстрацыя працоўных, а пасаджаныя ў віленскую турму былі збітыя розгамі. За гэтыя дзеянні У. Ленін назваў Валя "раз'юшаным нягоднікам". На жыццё Валя быў замах – ён атрымаў раненне ў руку і нагу. Пасля Вільні В. стаў таварышам/намеснікам міністра ўнутраных спраў К. Плеве і камандзірам Асобнага корпуса жандараў. У студзені 1904 пакінуў адміністратыўную дзейнасць, але застаўся чальцом Дзяржаўнага савета.

Узнагароджаны 5 расійскімі і 7 замежнымі ордэнамі, медалём за падаўленне паўстання 1863–1864, знакам адрознення за пазямельнае уладкаванне дзяржаўных сялян.

Творы: Наместник в Царстве Польском // журнал "Русская старина". Т. 20, С. 703–706, СПб, 1879; Список руководящих деятелей восстания 1863–1864 гг. (См.: Русско-польские революционные связи 1860-х годов и восстание 1863 года. С.515–539, М., 1962.).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 7, с. 2481, а. 5–5об.; ф. 1, воп. 8, с. 144, а. 3–3об.; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 88–91.

Вальдман Майсей (?–1941?) – кіраўнік жаночай гімназіі ў Гродне (1907). Быў дырэктарам змешанай сярэдняй школы, прадстаўніком ад яўрэйскага камітэта ў часовым гарадскім камітэце (1918). Магчыма перад нямецкай акупацыяй горада здзейсніў самагубства.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 66.

Ванатоўскі Юзаф (17.01.1894, Дзежбін пад Калішам – 20.10.1942, Навумавічы пад Гроднам) – настаўнік малюнка і чарчэння ў с. ш. № 7, мастак. Арыштаваны НКУС 16.05.1940. Па дарозе трапіў пад бамбёжку нямецкіх самалётаў і збег. Але праз год быў расстраляны немцамі ў групе польскай інтэлігенцыі.

Літ.: Чарнякевіч А. Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гродна 1909–1939 гг.: біягр. давед. / А. Чарнякевіч. – Мінск: Грам. аб'яднанне "ВІТ", 2003.

Вараб'і, Варабяёўскія, Вараб'евічы – прадстаўнікі гарадзенскай уладнай эліты.

Конан Варабей быў лаўнікам у 1558 г. Паводле *валочнай памеры* 1560–61 ён валодаў на вул. Наваікоўскай (сёння Маладзёжная) пляцам (5,5 сядзібных і 14 агародных прэнтаў) з домам на ім; трыма вялікімі агародамі на вул. Плутніцкай (41 сядзібная прэнта) і адным на "вул. за Вараб'ём".

Грыгор Вараб'евіч, пісар магістрата, райца (1633, 1641), бурмістр (1639–40).

Павел Вараб'евіч, пісар войтаўска-лаўніцкі (1659).

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 353; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у 1743–1767 гг.// Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – с. 65–66; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у XVIII с. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. // Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 107–110.

Вараксін Уладзімір Мікалаевіч (5.07.1901, Омск – 2.01.1980, Брэст) – беларускі савецкі архітэктар і педагог, заслужаны будаўнік БССР (1967). Скончыў Ленінградскі інстытут камунальнай гаспадаркі (1934). Выкладчык (1952), дацэнт БПІ (1954–72). Загадчык кафедры Брэсцкага інжынерна-будаўнічага інстытута (1971–75). У Гродне ў 1952 перабудоўваў *замак Новы* пад будынак абласнога камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

Варашыльскія – вядомая гарадзенская яўрэйская сям'я. Якаў Варашыльскі быў рабочым на *тытунёвай фабрыцы Шарашэўскага*. Ягоны сын Рыгор (Гершан) пасля вучобы ў Кёнігсбергскім універсітэце стаў добрым урачом-гінеколагам, кабінет якога знаходзіўся па вул. Рыдза-Сміглага/Васілька (зусім нядаўна тут была бальніца скураных захворванняў). З 1939 г. ён працаваў галоўным урачом у сваёй былой, а цяпер нацыялізаванай бальніцы. У *вайну Другую сусветную* пражылі *гета*, адкуль іх выратавалі гарадзенцы-беларусы. Пасля вайны выехалі на жыхарства ў Польшчу. Сын Рыгора Віктар (8.07.1927, Гродна – 13.09.1996, Варшава) стаў вядомым польскім паэтам, празаікам, эсэістам і перакладчыкам (між іншых *В. Быкава*). Сын Віктара Фелікс – вядомы калекцыянер паштовак і фотаздымкаў пра Гродна, якія выкарыстоўваюць аўтары кніг па гісторыі горада.

Літ.: Гостев А.П., Известные личности Гродно. – Гродно, 2016. – С. 125–129; Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 147; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 171–175; ; Kałuski M., Sprawy kresowe – poza cenzurą. T. 2. – Toruń-Melbourne, 2017. – S. 167.

Варонін Мікалай Мікалаевіч (13.12.1904, Уладзімір – 4.04.1976, Масква) – савецкі архітэктар і археолаг. Доктар гістарычных навук (1945), лаўрэат Ленінскай прэміі (1965). Аўтар кніг і артыкулаў па гісторыі і архітэктуры старажытнарускіх і расійскіх гарадоў, у тым ліку манаграфіі "Древнее Гродно" (М., 1954), напісанай па матэрыялах археалагічных раскопак на *Замкавай гары* ў 1932–39 (гл. *Ядкоўскі Ю.*; *Дурчэўскі З.*) і асабістых двухмесячных раскопак

1949 г. Варонін намагаўся навукова даказаць, што Гродна было заснаванае як старажытнарускі горад. Ён наракаў, што шмат артэфактаў прапала ад непрафесійных раскопак Ядкоўскага. В. сцвярджаў, што да з'яўлення мураваных пабудоў на *замку Старым* існавала паселішча, якое было знішчанае пажарам. На яго месцы ў канцы XI – пачатку XII ст. была пабудаваная *крэпасць Гродзенская*. В. прааналізаваў архітэктуру старажытнага Гродна і прыйшоў да высновы *існавання гарадзенскай школы архітэктуры*. Бібліяграфію твораў В. гл. у зборніку "Средневековая Русь" (М.: Наука, 1976).

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 381, 388; Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада/ Пад рэд. В. Карнялюк, В. Швед. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2012, с. 31.

Варонка Язэп/Іосіф (17.04.1891, м. Дзятлава – 4.06.1952, Чыкага) – старшыня першага ўрада БНР (Народнага Сакратарыята). Вучыўся ў С.-Пецярбургскім універсітэце, вёў актыўнае літаратурнае і палітычнае жыццё. Галава выканаўчага камітэта Рады Усебеларускага з'езда (часовага беларускага ўрада з 21.02.1918). Міністр па справах нацыянальнасцяў ва ўрадзе *А. Луцкевіча*. Пад яго кіраўніцтвам урад БНР зацвердзіў у якасці пячаткі Рэспублікі пячатку *Міндоўга* (з "Пагоняй"), даручыў М. Доўнар-Запольскаму падбор кадраў для беларускага ўніверсітэта ў Мінску. З 27.11.1918 В. быў кіраўніком міністэрства беларускіх спраў у літоўскім урадзе. У Коўне заснаваў выдавецтва міністэрства і рэдагаваў штотыднёвік "Часопісь" і газету "Беларускі народ", дзе, па словах А. Луцкевіча, "(…) той бруд, які Варонка дагэтуль выліваў на іншых вусна, цяпер выліваецца ў друку, паганячы наогул усё беларускае". В. супрацьставіў міністэрства *камітэту Беларускаму нацыянальнаму*, а сваю асобу – А. Луцкевічу, чым унёс раскол у беларускім руху. Так напрыклад, калі Луцкевіч падаваў ад імя ўрада БНР пратэсты супраць далучэння беларускіх зямель да Польшчы, Варонка рабіў тое ж ад імя "беларусаў Паўднёвай Літвы". Ад імя літоўскай дзяржавы аддаваў афіцыйныя распараджэнні (напрыклад, аб мабілізацыі афіцэраў і чыноўнікаў). У 1923 пераехаў у ЗША, дзе заснаваў першую беларускую газету "Беларуская трыбуна".

С. 832

Літ.: Латышонак А. Жаўнеры БНР. – Менск, 2009, с. 76; Міхалік Д. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920: Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці. – Смаленск: Інбелькульт, 2015, с. 328–329, 469; Чарнякевіч А. Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гродна 1909–1939 гг.: біягр. давед. / А. Чарнякевіч. – Мінск: Грам. аб'яд-не "ВІТ", 2003; Чарнякевіч А. Паміж грызьнёй і барацьбой. Беларускі палітычны нацыяналізм у Горадні (канец 1918 – пачатак 1921 г.) / А. Чарнякевіч // Arche. – 2009. – № 3. – С. 329–410; Чарнякевіч А. Памяць пра Гродна: матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. / А. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПринт, 2015; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў / А. Чарнякевіч. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 132–134.

Васілевіч Мікалай – гаспадар цукерні і кавярні "Orient". У 1930 г. атрымаў залаты медаль на выстаўцы ў Ніццы. У яго кавярні прадаваўся папулярны сярод жыхароў безалкагольны напітак пад назвай "буза". Гараднянка Антаніна М. успамінае: "І гэтая буза – гэта быў як наш кактэйль малочны. Але ён быў смачнейшы! Быў такі шыпучы… Ён такі быў і салодкі, і такі трошкі з кіслінкай".

Літ.: Зусім іншы горад. Гродна і гродзенцы ў вусных успамінах. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2017. – С. 15–16; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 67.

Васілёк Міхась, сапр. Міхаіл Восіпавіч Касцевіч (14.11.1905, в. Баброўня Гродзенскага р-на – 3.09.1960, Гродна). Быў актыўным дзеячам Беларускай сялянска-рабочай *Грамады* ў 1920–30-х гадах, за што польскія ўлады неаднаразова арыштоўвалі яго і саджалі ў турму. У Гродне праходзіў вайсковую службу ў 1926–28. У Вялікую Айчынную вайну кіраваў Скідзельскім падпольным антыфашысцкім камітэтам, пад псеўданімам Язэп Гром друкаваўся ў партызанскім друку. З 1946 па 1950 працаваў літкансультантам у рэдакцыі "Гродзенскай праўды". Друкавацца пачаў яшчэ ў 1926 у віленскіх выданнях. Першы зборнік лірыкі "Шум баравы" быў у 1929 канфіскаваны паліцыяй, рукапіс другога зборніка канфіскавала і знішчыла дэфензіва ў 1934 г. У савецкі час выдадзеныя паэтычныя зборнікі "Выбраныя вершы" (1950) і "Выбраныя творы" (1950). Пахаваны ў Гродне. На будынку філіяла "Белжылпраект", пабудаваным на месцы дома, у якім ён жыў у 1958–60 (вул. Карбышава, 15), усталяваная мемарыяльная дошка (1986). Недалёка ёсць вуліца імя Васілька.

Літ.: Гродно. Энциклопедический справочник. – Минск: БелСэ., 1988. – С. 112; Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. – Гродна: ГрДУ, 2000. – С. 48–49; Пяткевіч А.М. Слова і кніга Прынёмання. Зборнік навуковых артыкулаў. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 89, 97.

Васькоў Фёдар Іванавіч (1791–?) – гродзенскі *губернатар* з 27.07.1844 па 17.03.1848. Са старажытнага дваранскага роду з Кастрамской губ., праваслаўны. У 1827 звольнены з вайсковай службы ў чыне капітана з правам нашэння мундзіра лейб-гвардыі Ізмайлаўскага палка. З гэтага ж года прызначаны на службу ў герольдыю Сената са званнем надворнага дарадцы. Кастрамскім дваранствам быў выбраны яго ўездным прадвадзіцелем. Да 1835 быў звязаны з Кастрамской губ., атрымаў чын калежскага дарадцы (1832). 5.05.1835 прызначаны першым чальцом Межавой канцылярыі, а ўжо 24.07.1836 стаў таварышам/намеснікам галоўнага дырэктара Межавога корпуса. Даслужыўся да сапраўднага стацкага дарадцы (25.03.1839), але 22.11.1840 звольніўся згодна з прашэннем. 20.06.1844 быў пераведзены ў МУС і ўказам *Мікалая I* ад 27.06.1844 прызначаны гродзненскім губернатарам. 17.03.1848 стаў наўгародскім грамадзянскім губернатарам. Узнагароджаны ордэнам Св. Уладзіміра 4 ст. з бантам.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 37, с. 1970, а. 5 адв.–6.; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С 59–60.

Вашчук Ян (2.04.1886, Кутаісі – 15.07.1943, в. Навумавічы, форт № 2) – лекар. У Гродне апынуўся каля 1924 г. Стаў першым гродзенскім ларынголагам. Служыў у турме (1925–1930), ардынатарам пры вайсковым шпіталі. У 1931 вучыўся на курсах пластычнай хірургіі ў Парыжы. Меў у горадзе прыватную практыку, аказваў бясплатную дапамогу для беднага насельніцтва. Быў радным гарадской рады (1934–1939) і сябрам Лагера нацыянальнага аб'яднання (1937). Узнагароджаны залатым за заслугі і бронзавым медалём "За шматгадовую службу". Перад *вайной Вялікай Айчыннай* працаваў у вайсковым шпіталі. Быў у АК, расстраляны разам з сям'ёй немцамі.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 68.

Ваяводская гродзенская рэвалюцыйная арганізацыя (1861–1864), створаная пад уплывам расійскага і польскага рэвалюцыйнага рухаў ва ўмовах узмацнення на Гродзеншчыне сялянскага руху пасля палавіністай і рабаўніцкай адмены прыгоннага права ў 1861 г. Пасля забойства 5 варшаўскіх дэманстрантаў у лютым 1861 у Саколцы, у доме *В. Урублеўскага*, сустрэліся *Э. Заблоцкі, К. Каліноўскі, С. Сангін*, ксёндз Я.-І. Казлоўскі. Заблоцкі на следстве сведчыў, што размова ішла пра варшаўскія падзеі, Каліноўскі і Урублеўскі сказалі яму, што хутка павінна быць створаная "арганізацыя народнага польскага ўрада па ўсёй Літве", і прапанавалі яму прыняць у ёй удзел. У "Конфирмации о лицах Гродненской революционной организации" гаворыцца наступнае: "Са справы відаць, што спробы фармавання рэвалюцыйнай арганізацыі па Гродзенскай губ. былі яшчэ на пачатку 1861 г., затым у другой палове 1862, калі рэвалюцыйная прэса распаўсюдзіла звесткі пра ўтварэнне арганізацыі ў Каралеўстве Польскім, ізноў былі адноўленыя спробы ўтварэння такой самай арганізацыі ў Гродзенскай губерні. Да гэтага часу трэба аднесці прызначэнне ў ёй для кіравання рэвалюцыйнымі справамі пад назвай камісара студэнта Канстанціна Каліноўскага, які заняў пазней пасаду ўпаўнаважанага камісара ўсёй Літвы і ўжо пакаранага".

Тэрытарыяльна-адміністрацыйная структура падпольнай арганізацыі ў Польшчы, Літве і Беларусі ўтваралася згодна са Статутам Агатона Гілера (ліпень 1862): ваяводства – ваявода, павет – павятовы, акруга – акруговы, сотня – сотнік, дзясятка – дзясяцкі. У Літве, Беларусі, як пісаў Оскар Авейдэ, "усе свае намаганні звярталі выключна на ўсталяванне галоўных ваяводскіх органаў", не стваралі дзясяткі, а для ўзмацнення прапаганды сярод сялян арганізоўвалі "начальнікаў прыходаў". Свае начальнікі былі ў мястэчках (не абавязкова), ваяводскіх гарадах (Гродне, Вільні, Мінску, Коўне) і ў паветах. Спачатку (верагодна, з канца лютага 1861 г.) падзялілі Гродзенскае ваяводства

на дзве часткі: першая – Гродзенскі, Ваўкавыскі і Слонімскі паветы, другая – Сакольскі, Беластоцкі, Брэсцкі, Кобрынскі і Пружанскі. Ваявода быў адзін, меў 2 памочнікаў. Рассылалі паперы з ваяводскага бюро *Геніюша* па ўсіх паветах. Пазней, прыкладна з сакавіка 1863 г., падзялілі Гродзенскае ваяводства на тры часткі: Гродзенскі, Ваўкавыскі і Слонімскі паветы ўзначаліў намеснік ваяводскага камісара *Э. Заблоцкі*; Сакольскі, Беластоцкі і Бельскі падпарадкавалі *В. Урублеўскаму*; Брэсцкі, Кобрынскі і Пружанскі падначалілі цывільнаму ваяводзе *Гафмайстру*. Верагодна, з адыходам Урублеўскага з паўстанцкім атрадам у лясы (жнівень 1863 г.) адбыліся чарговыя змены: Гродзенскі, Ваўкавыскі, Слонімскі, Сакольскі і Беластоцкі паветы склалі Паўночнае ваяводства (яго ўзначальваў Заблоцкі, а затым Сільвестровіч); Брэсцкі, Кобрынскі, Пружанскі і Бельскі паветы склалі Паўднёвае ваяводства (тут ваяводам быў Гафмайстар).

Цывільны ваявода спачатку быў адзіны на губерню, а потым да яго дадалі двух памочнікаў у сувязі з тым, што адбыўся падзел губерні на дзве часткі. Па сутнасці, яны ўсе дзейнічалі самастойна і падпарадкоўваліся толькі ўрадаваму камісару. Пры ваяводзе існавала ваяводскае бюро. Ваявода ажыццяўляў рэвізію паўстанцкіх атрадаў, распараджаўся іх дзеяннямі, назіраў за дзейнасцю чыноўнікаў падпольнай арганізацыі, рабіў распараджэнні па ваяводстве ў выкананні загадаў органаў кіравання паўстаннем і сваіх асабістых, прызначаў на пасады павятовых, начальнікаў прыходаў і патрабаваў ад іх справаздачы. Урадавы ваяводскі камісар павінен быў пастаянна сачыць за мясцовай рэвалюцыйнай адміністрацыяй, выкананнем яе рашэнняў, дакладаць аб яе дзеяннях у ЛПК і ЦНК.

Важную ролю надавалі чыноўнікі ВГРА канспірацыі. У Інструкцыях ЛПК для павятовых і акруговых начальнікаў (каля 28.10.1862) у пункце 2 гаварылася, што павятовыя ад акруговых, а акруговыя ад парафіяльных і гмінных начальнікаў, дзясятнікаў і сотнікаў павінны прыняць прысягу "на поўнае падпарадкаванне і захаванне таямніцы як на свабодзе, так і ў турме". Дзейнічала правіла: першы не ведае трэцяга. Многія чальцы арганізацыі, калі іх на допытах у следчых камісіях прасілі назваць іншых, адгаворваліся няведаннем менавіта з гэтай прычыны. Улады Гродзенскай ваяводскай рэвалюцыйнай арганізацыі падпарадкоўваліся з восені 1861 да кастрычніка 1862 Камітэту руху, які ў гэтым месяцы рэарганізаваўся ў Літоўскі правінцыйны камітэт (ЛПК) у Вільні, з 27.02.1863 – Часовы правінцыйны ўрад Літвы і Беларусі; з прыходам да ўлады "белых" 11.03.1863 – Літоўскае выканаўчае аддзяленне, якое кіруе правінцыямі Літвы; з 14.06.1863 г. па жнівень 1864 г. – Выканаўчы аддзел Літвы. На допыце 30.01.1864 Каліноўскі паказаў, што па невядомых яму прычынах Гродзенская губ. па кіраванні адыйшла ад Літвы да Варшаўскага камітэта. Віленскае кіраўніцтва ўзгадняла сваю дзейнасць з Цэнтральным нацыянальным камітэтам (ЦНК) у Варшаве, які кіраваў паўстаннем у Польшчы, Літве і Беларусі. Прадстаўнік ЦНК быў у складзе віленскага кіраўніцтва (Нестар Дзюлёран). Але ў час, калі пры ўладзе былі "чырвоныя" на чале з Каліноўскім, яны праяўлялі сепаратызм у адносінах да ЦНК: пра гэта

сведчыла назва органа (“літоўскі”), грошы, якія збіраліся на Літве і Беларусі, заставаліся на месцы і выкарыстоўваліся на свае патрэбы. ЦНК вымушаны быў прызнаць самастойнасць ЛПК.

ВГРА перастала існаваць зімой 1864 г. Паводле дадзеных даследчыка Е. Краскоўскага, яна налічвала каля 300 чал. Звернем увагу на сацыяльны склад ВГРА. Каліноўскі і яго паплечнікі папаўнялі свае шэрагі перш за ўсё за кошт разначыннай інтэлігенцыі (вясковыя настаўнікі, валасныя пісары, студэнты, чыноўнікі і г. д.). Каліноўскі гаварыў Э. Заблоцкаму, што хацеў бы, каб у арганізацыі “было болей людзей аднаго з ім стану, гэта значыць, якія б не належалі да класа памешчыкаў, інакш апошнія забяруць уладу ў свае рукі”. Адпаведна і погляды чальцоў былі рэвалюцыйна-дэмакратычныя (“чырвоныя”): падрыхтоўка мас да народнай рэвалюцыі з мэтай звяржэння самадзяржаўя, дасягнення нацыянальнай самастойнасці і ліквідацыі прыгонніцтва.

Крын. і літ.: Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці, ф. 104, с. 77, а. 4; Дзяржаўны архіў Літвы, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 143; ф. 1248, воп. 1, с. 1320, ч. 2, а. 397; НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2887, а. 4 адв.–5 адв.; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 28 адв., 47 адв.; с. 21, а. 304; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 28 адв., 47 адв., 48; с.21, а. 304; ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 103 с. 4, а. 10 адв.; Авейде О. Показания и записки о польском восстании 1863 года. – М., 1961. – С. 451–453, 487, 522, 542, 616; Бикулич В.Б. Революционная организация восстания 1863–1864 гг. в Литве и Белоруссии: автореферат диссертации. – Вильнюс, 1973. – С. 18 11, 14–15, 18, 23; Ковкель И.И. Гродненская революционно-демократическая организация // Гродно: энцикл. справочник: БелСЭ, 1989. – С. 158–159; Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг. – М., 1964. – С. 491; Каліноўскі К. За нашую вольнасць. Творы, дакументы / уклад., прадм., паслясл. і камент. Г. Кісялёва. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1999. 132.188; Jodkowski. Rok 1863 w powiecie Grodzieńskim (notatki i uzupełnienia) // Echo Grodzieńskie. – 1923. – № 17. – S. 3; Giejsztor J. Pamietniki z lat 1857–1865. – T. 2. – Wilno, 1913. – S. 327–328; Rożański F. Z województwa grodzieńskiego: W czterdziestą rocznicę Powstania styczniowego. 1863–1864. – Lwów, 1903. – S. 396

Вежа замкавая, “столп пред враты градныя”, вежа валынскага тыпу, пабудаваная, на наш погляд, альбо вял. кн. літоўскім Шварнам Данілавічам (1267–1270), альбо яго наступнікам Тройдзенем (1270–1282) не пазней 1277 г. Пад гэтым годам яна згадваецца ў Іпацьеўскім летапісе з нагоды асады *Горадзена* галіцка-валынскім князем *Львом Данілавічам* (братам Шварна) падчас паходу на Слонім: “Столпъ бо бе каменъ высокъ стоя передъ вороты города, бяхя въ немъ заперлися проуси, и не бысть имъ мимо онъ пойти къ городоу, побиваха бо из столпа того, и тако къ пристяжпивъше къ немоу, взяша…”. Месцазнаходжанне В. вучоныя-археолагі пазначаюць па рознаму. Варонін М. М., Рапапорт А. П., *Ткачоў М. А.*, *Трусаў А.*, Краўцэвіч А. лакалізуюць В. каля брамы *замка Старога*; польскі даследчык С. Аляксандровіч і беларускі археолаг Ю. Заяц – на суседнім пагорку, дзе цяпер знаходзіцца *замак Новы*. В. дазваляла прыкрываць падыходы да брамы і абараняць усходнія сцены замка. Бачная на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта*. Гісторык М. Макараў сцвярджае, што В. нельга называць данжонам, бо яна не выкарыстоўвалася як жыллё,

а гэта галоўная прыкмета данжона. Была цыліндрычнай формы, троху звужаная ўверсе і пакрытая шатровым дахам. Гісторык Ткачоў М. А. лічыў, што вежа мела 4 баявыя ярусы і пляцоўку на версе за зубцамі. Вышыня вежы была каля 20 м, дыяметр – да 12 м, таўшчыня сцен – 3 м. Разабраная ў XVI ст. падчас пабудовы замка *Стэфана Баторыя*.

Літ.: Макараў М. Да пытання пра выкарыстанне тэрміну "данжон" (donjon) у беларускай гістарычнай літаратуры // Гістарычны альманах. Т. 5 – С. 54–67; Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII – XVIII стст. – Мн, 1987, – С. 24; Ткачоў М.А. Замкі Беларусі (XIII – XII ст.). – Мінск: оЛ, 1977. – С. 23; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшая школа, 1969. – С. 39; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 27; Швед В. Летапіс Гродна (1005–1995). – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020 – С. 21; Kronika Halicko-Wołyńska (Kronika Romanowiczów). – Kraków, Warszawa, 2017. – S. 490–492.

Вежа вадаправодная ў Румлёва, знаходзіцца на краі яра заходняй мяжы румлёўскага лесапарку. Мураваная кладка, над уваходам ёсць тры таблічкі з тэкстам на польскай мове, рымскімі лічбамі выбіта "XIX". Вежа дапамагала дастаўляць ваду ў сядзібу гаспадароў *Румлёва* (*Румлёву, Ажэшцы Э.*, ваеннаму ведамству). У цяперашні час В. не мае гаспадара, таму стаіць без даху, дзвярэй, адкрытая ўсім вятрам, ападкам і чалавечым інстынктам.

Літ.: Экологические экскурсии пр лесопарку Румлёво / Андреева Д. М., Бахарев В. А., Голубков В. В., и др. изд. 2-е испр., доп. – Гродно: ГОУПП "Гродненская типография", 2006. – С. 8.



С. 833

Вежа пажарная, пабудаваная з цэглы пасля вялікага пажару 1885 г. (па вул. Замкавая, 19). Пабудова шасціярусная, чатырохгранная са зрэзанымі гранямі на рагу Г-падобнага будынка дэпо. Цікавыя аконныя праёмы – арачныя, лучковыя, круглыя, стрэльчатыя, прамавугольныя. На верхнім ярусе знаходзіцца аглядная пляцоўка з шатровым навесам на металічным каркасе і металічная агароджа.

Літ.: Гродно. Энциклопедический словарь, Минск, 1989, с. 89–90.

Вежы вадаправодныя па вул. Свярдлова, збудаваныя ў розны час. У 1890 г. складзены праект "заходняй" вежы, а ў 1895 яна была пабудаваная. Вежа мела чатыры паверхі/ярусы, унутры якіх былі размешчаныя трубы для паступлення вады, інжынернае абсталяванне, кантора, лабараторыя. На верхнім паверсе знаходзіўся каваны жалезны рэзервуар на 300 тон вады. У 1905 была пабудаваная "усходняя" вежа, у якой размясціліся другі падобны рэзервуар, невялікая майстэрня, склады і архіў. Рэзервуары былі забяспечаныя ад трапляння туды шкодных асоб з атрутаю. Вежы захаваліся да нашага часу, там знаходзяцца майстэрні мясцовых мастакоў і скульптараў. У народзе вежы называюць імёнамі дзяўчат, якія працавалі ў іх у міжваенны час – Бася і Кася. Глядзі таксама артыкул *Вадаправод*.

Літ.: Иващенко Н.А., Повседневная жизнь губернского города Гродно (XIX – начало XX века). – Гродно: ЮрСаПринт, 2019. – С. 92.

Велер Беньямін (каля 1885 – ?) – гаспадар прадпрыемства па вытворчасці сельтарскай вады і ліманада (разам з братам) у 1930-я гады. Сябра праўлення яўрэйскай рэлігійнай абшчыны (1932–1938), кандыдат на выбарах у гарадскую раду (1939).

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 69

Веракса Мікалай (9.09.1884, Мазыр – 11.11.1944, Ерусалім) – галоўны лекар вайсковага *шпіталя* ў Гродне (1921), удзельнік абароны *Гродна* (20–22.09.1939). Дыплом лекара атрымаў у 1910 у Вайскова-медыцынскай акадэміі, спецыяліст па скурна-венерычных захворваннях. Спачатку служыў у расійскім войску, затым – у польскім (1919–1934). Быў кіраўніком санітарнай службы Камандавання Акругі корпуса III (1930). Старшыня Таварыства хрысціянскіх уладальнікаў нерухомасці (1939), віцэ-старшыня праўлення Гродзенскага аддзялення Польскага Чырвонага Крыжа (1931–1935), сябра Лагера нацыянальнага аб'яднання (1937). Электар у склад ваяводскіх камісій, што выбіралі сенатараў. Апошнія гады жыцця служыў у польскім войску на Усходзе.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 68

Верас Зоська, сапр. Сівіцкая Людвіка Антонаўна, па мужы Войцік (30.09.1892, мяст. Мяджыбаж Лятычаўскага пав. Падольскай губ./цяпер Хмяльніцкая вобл., Украіна – 8.10.1991, Вільня) – дзеяч беларускай культуры. Бацька-вайсковец выхоўваў В. як хлопца (ягоны сын памёр 10-месячным) – маючы 12 гадоў ездзіла конна, лазіла па дрэвах. У фальварку дзеда з боку маці была ў курсе гаспадаркі. Часта бывала ў дзеда і бабкі з боку бацькі, якія жылі ў Гродне, за *касцёлам езуіцкім/Фарным* (дом Саборнага духавенства). З 1909 па жнівень 1915 (з перапынкам на курсы ў Варшаве з кастрычніка 1913 па ліпень 1914) жыла з мацерай у Гродне. У 1912 скончыла прыватную жаночую *гімназію* К. Баркоўскай (знаходзілася на рагу вул. К. Маркса і пл. Савецкай). В. была адной з заснавальніц *гродзенскага гуртка беларускай моладзі*. Каб неяк утрымоўваць сям'ю (бацька памёр у 1907, а пенсія была невялікай), маці В. атрымала дазвол у школьных уладаў на арганізацыю "вучнёўскай кватэры" па вул. Гараднічанская, 14 (1910–1913). Менавіта на гэтай кватэры адбываліся сходы *гродзенскага гуртка беларускай моладзі*, спектаклі, вечарыны, праходзілі рэпетыцыі хору і аркестра. В. арганізоўвала выезды з лекцыямі і спектаклямі-вечарынамі ў вёскі ў ваколіцах Новага Двара (Сакольскі ўезд), адкуль паходзілі яе дзяды і бацька. Скончыла школу агародніцтва і пчолаводства

ў Варшаве (1914). Затым жыла ў Мінску, дзе пазнаёмілася з *М. Багдановічам* (гл. пра гэта ў яе успамінах у зборніку "Шлях паэта", Мн., 1975). Удзельнічала ў працы Таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны (1916–1917), у Беларускім нацыянальным камітэце, у Цэнтральнай Радзе беларускіх арганізацый, у Вялікай беларускай радзе, у Беларускай сацыялістычнай грамадзе – усюды сакратаркай. Была старшынёй кааператыва Беларускага таварыства "Пчала" (1928–39). Друкавалася з 1907 г. у "Нашай Ніве", "Вольнай Беларусі", "Студэнцкай думцы". У Гродне бывала 1–2 разы на месяц з 1919 да пал. 1923, часта бачылася з *Рак-Міхайлоўскім*, які ў той час жыў там (В. атрымоўвала праз яго грошы на беларускі друк і здавала яму справаздачу аб фінансах). Выдала "Беларуска-польска-руска-лацінскі батанічны слоўнік" (1924). У газеце "Беларуская борць" друкавала артыкулы пра меданосныя расліны. У 1927 пачала рэдагаваць і выдаваць у Вільні часопіс для дзяцей "Заранка". З 1940-х жыла ў Вільні. У 1985 выйшаў яе зборнік "Каласкі". Трэба асабліва адзначыць, што В. была ўсё жыццё патрыёткай Гродна і Гродзеншчыны. У лістах называла сябе "старая гродзенская патрыётка" і "гродзенская душа на выгнанні". Была ў Гродне ў 1954 і 1970 гг.

Літ.: Вашкевіч А. Гарадзенкі. Жаночы след у гісторыі Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 74–76; Верас З. Гарадзенскі гурток беларускай моладзі // Маладосць. – 1972. – № 10; Верас З. Я помню ўсё. Успаміны, лісты/уклад. М. Скобла. – Гародня, Вроцлаў, 2013, с. 216, 258, 346, 383–385; Верас З. Старое Гродна // Краю мой – Нёман. – Мн., 1986. – С. 188–194; З успамінаў Баляслава Грабінскага (1899–1991) // Горад святога Губерта: зборнік краязнаўчых артыкулаў. Выпуск 6 (2012). – Горадня: б.в., 2012. – С. 116, 123; Петрушкевіч А. Старонкі Гарадзеншчыны літаратурнай. Дапаможнік. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 68–90.

Весялоўская Аляксандра Марыянна (? – 1645 ці 1650) – дачка люблінскага ваяводы Марка Сабескага. Ад першага мужа Яна Вадынскага мела дачку Грызельду (у шлюбе Сапега). Другім мужам быў *Кшыштаф Весялоўскі.* Заснавальніца гродзенскага жаночага *кляштара св. Брыгіты* (1634).

Весялоўскі Кшыштаф (каля 1590 – 19.04.1637) – сын маршалка вялікага літоўскага Пятра Весялоўскага (герба Агончык) і С. Любамірскай. Стольнік літоўскі (1604–18), крайчы літоўскі (1620). Маршалак вялікі літоўскі (1635). Ваяваў супраць рокашаў, камандаваў войскам супраць Турцыі, Швецыі, Масковіі. Староста тыкоцінскі, суражскі, крычаўскі, *гараднічы* гарадзенскі (з 1626), адміністратар *эканоміі гарадзенскай* (1636). Фундатар зямлі *кляштару Брыгіцкаму,* што замацавана прывілеем Аўгуста II у 1698. У Гродне меў сваю рэзідэнцыю.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 27–28; Marszałkowie sejmów I Rzeczypospolitej. – Warszawa, 1993. – S. 36.

Вейс Генрых (27.01.1882 – ?) – падпалкоўнік, камендант *крэпасці гродзенскай* у 1925 г.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 68

Вейсбрэм Уладзімір Давыдавіч – сын пецярбургскай купчыхі Ганны Вейсбрэм, пецярбургскі першай гільдыі купец. Сумесна з *М. Г. Лангбордам* валодаў пераплётнай і футлярных вырабаў фабрыкай "Нёманская", якая працавала ў Гродне з 24.04.1899 (гадавая вытворчасць за 1901 г. склала 62 439 руб. 73 кап). З агульнага заключэння камітэта гродзенскага аддзялення дзяржаўнага банка на заяву ўладальнікаў названай фабрыкі ад 13.11.1902: "Оба совладельца (...) пользуются хорошей репутацией и люди вполне благонадежные. Дело на фабрике поставлено умело и солидно. За 3 1/4 года фабрика приобрела покупателей со всех концов России. Принимая во внимание годовой объем, количество денег на векселя и имущественную обеспеченность постановили: (...) открыть кредит в сумме 7000 руб. 23 ноября 1902 г. (ст. ст.)". Фабрыка выпускала блакноты, альбомы, канторскія капіравальныя кнігі, партфелі і інш.

Вігдаровіч Рувін (1880, Астрына Лідскага ўезда – 1943, Асвенцім) – настаўнік. Скончыў гродзенскія педагагічныя курсы па падрыхтоўцы выкладчыкаў іўрыта і атрымаў за поспехі гармонік "concertina", з якім потым ніколі не развітваўся. Выкладаў іўрыт, музыку і спевы ў прыватных і публічных школах ды гімназіі Гродна. Быў адным з першых настаўнікаў рэфармаванага хедэра, дзе прадметы выкладаліся на іўрыце. Вялікім попытам карыстаўся школьны хор, якім кіраваў В. Ён напісаў шэраг музычных твораў, гімн "Тарбут". Сацыяліст-сіяніст, падчас *вайны Айчыннай* знаходзіўся ў *гета* № 1, загінуў у Асвенціме.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 70.

Відацкая Францішка з Каменскіх (1814 – 13.11.1878) – жонка Бенедыкта Паўлоўскага, маці літаратаркі *Ажэшкі Э.* За сродкі, атрыманыя ў пасаг ад другога мужа, Канстанціна Відацкага, купіла сабе ў былога правізара і аптэкара *Я. Б. Румеля* абодва яго маёнткі: *Румлёва* і Гнойніцу (цяпер абодва ў межах Гродна). У 1877 вайсковыя ўлады зацікавіліся гэтымі землямі і задумалі выселіць Відацкую з Румлёва. У гродзенскім гістарычным *архіве* захавалася справа пад назваю "Аб высылцы начальніку 26 пяхотнай дывізіі плана маёнтка Румлёўка Гродзенскага ў. памешчыцы Відацкай". Штаб дывізіі 5.06.1877 г. звярнуўся ў гродзенскую губернскую чарцёжную з пытаннем, ці ёсць у іх план маёнтка памешчыцы Відацкай, "які прылягае да лагера 26 дывізіі і на

частцы якога размешчаны ў цяперашні час лагер 104-га Усцюжскага палка". Калі такі план ёсць, штаб прасіў даслаць для вызначэння дакладных межаў маёнтка. Такога плана не аказалася ў Межавым архіве, а 12 планаў зямель, занятых вайсковымі лагерамі часова былі адпраўленыя чарцёжнай у гродзенскі губернскі распараджальны камітэт. А таму ў архіўнай справе ніякіх планаў не было. Скончылася гэтая справа тым, што вайсковыя ўлады выселілі Відацкую, даўшы ёй фінансавую кампенсацыю.

У Гродне В. мела дом па вул. Брыгіцкай/К. Маркса. Памерла пасля раптоўнай хваробы. Пахаваная на каталіцкіх *могілках* у сектары S 313. А ў сектары L 114 пахаваны яе сын Ян/Ясь Відацкі (1851–57 ?).

Літ.:, Jankowski E. Eliza Orzeszkowa. – Warszawa: PIW, 1966. – S. 24–26, 43–44, 167.

Вількашэўскі Багуміл – інжынер, дырэктар жаночай *гімназіі* імя Э. Плятар (з 1925). Л. Саванеўскі піша пра тое, што В. меў швейцарскі дыплом доктара. Сябра праўлення Польскага краязнаўчага таварыства ў Гродне (1927). Верагодна з 1928 г. працаваў ужо ў Варшаве.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 70;

Вільд Эрхард – сябра гродзенскага самакіравання: лаўнік (1659), райца (1670, 1672–73) і *бурмістр* (1668, 1670).

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 350–352; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у XVII ст. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 100.

Вірыён Караль Юзаф Янавіч (1752?, Нансі ў Францыі – 1815, Нясвіж). Скончыў медыцынскі факультэт Страсбургскага універсітэта са ступенню доктара медыцыны. Служыў прафесарам анатоміі, доктарам медыцыны ў Страсбургу. Быў прыдворным урачом караля *Станіслава Аўгуста Панятоўскага,* які за сумленную службу надаў В. патомнае дваранства (1783), узнагародзіў медалём і падараваў мураваны дом у Гродне. Тут В. дапамагаў *Жыліберу Ж.* ствараць *Батанічны сад.* Служыў пазней павятовым урачом (1793–1799). З 14.01.1802 па 1806 – інспектар Літоўска-Гродзенскай урачэбнай управы. Карыстаўся папулярнасцю сярод насельніцтва, бо лячыў не толькі багатых, але і бедных. У 1806 атрымаў чын надворнага дарадцы. У 1807 Віленскі універсітэт выбраў яго ганаровым сябрам. У 1810 выйшаў у адстаўку і пераехаў у Нясвіж, дзе займаўся медыцынскай практыкай.

Літ.: Игнатович Ф. И. Доктор медицины И. (К.) Вирион – первый врачебный инспектор Гродненской губернии // Дзеячы аховы здароўяі мед. навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII – XIX стагоддзяў. – Гродна – Белавічы, 1992. – с. 77–79; Паўлоўская Г. Зубры, бабры і лімфомы мозга, або Гарадзенскія даследаванні Жана

Эмануэля Жылібера // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: зборнік навуковых артыкулаў / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 39; Polska stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 2. – Warszawa, 1963 – S. 809.

дэ Вірыён Мечыслаў Антоні Ян (8.06.1835 – 8.12.1918) – віцэ-прэзідэнт Гродна, гаспадар маёнткаў каля горада: Лішкі, Крынкі, Жылічы, Засценнікі. Меў у горадзе камяніцу, дзе пасяліўся ў 1873 г.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 72.

Вітаўт Аляксандр Юры, Вітаўт Вялікі, у каталіцтве Віганд, у праваслаўі Аляксандр (1354 альбо 1355 – 27.10.1430, Трокі) – князь брэсцкі і гарадзенскі, вялікі князь літоўскі (з 1392 да смерці). Сын Кейстута і Біруты, дачкі баярына Відмунша. З 1365 г. атрымаў *Горадзен* разам з падляскімі землямі і Брэстам. Падтрымліваў бацьку *Кейстута* ў яго барацьбе з *Ягайлам*. Апошні абодвух у 1382 г. пасадзіў у Крэўскую замкавую турму. Кейстут быў там забіты, а В. удалося збегчы на тэрыторыю Тэўтонскага ордэна. Выконваючы яго ўмовы, В. прыняў каталіцтва (хрысціянскае імя Віганд; аднак працягваў называць сябе Аляксандрам). З дапамогаю прыхільнікаў бацькі і *крыжакоў* В. імкнуўся вярнуць сабе радавое Троцкае княства. У ліпені 1384 г. Ягайла вярнуў яму Горадзен, Брэст і даў Драгічын, Мельнік, Бельск, Сураж, Камянец, Ваўкавыск. У акце нададзеным у Вялічцы 13.03.1386 і на фундацыйных актах караля Ягайлы ад 22.02.1387 Вітаўт тытулуецца *гарадзенскім князем* (dux Litwaniae ac dominus Hrodnensis з 1386 г., dux Brestensiis et Haradiensis з 1387, dux Hrodensis, Brestensis з 1389). Пасля спробы ў 1389 заняць Вільню быў вымушаны зноў збегчы да крыжакоў. У пошуках саюзнікаў выдаў дачку Соф'ю за вял. князя маскоўскага Васіля I. Паводле Астроўскай дамовы (1392) з Ягайлам фактычна стаў вялікім князем літоўскім. Цэнтралізаваў дзяржаву, распаўсюджваў каталіцтва, пашыраў землеўладанні шляхты, каталіцкай царквы, умацоўваў феадальную залежнасць сялян, падаўляў іх антыфеадальную барацьбу. Паводле Салінскай дамовы (1398) В. саступіў Тэўтонскаму ордэну Жамойцію і палову Судуўскага краю (Занямонне). Далучыў да ВКЛ (1397–1398) частку зямель Паўночнага Прычарнамор'я, у 1404 – Смаленскае княства. У 1406, 1407 і 1408 ажыццявіў вайсковыя паходы на Вялікае Княства Маскоўскае (Угорская дамова). У 1410 В. узначаліў войска ВКЛ у пераможнай Грунвальдскай бітве. В. усталяваў добрасуседскія адносіны з Наўгародскай рэспублікай. У 1429 з'езд у Луцку прыняў рашэнне каранаваць В., але інтрыгі польскіх магнатаў і яго хуткая смерць перашкодзілі гэтаму.

Літ.: Грыцкевіч, А. Старонкі нашай мінуўшчыны. – Мінск: Кнігазбор, 2009. – С. 13–43; Кананоўіч У. Вітаўт супраць Ягайлы // Пагоня. 1993. – № 29. – С. 4–5; Краўцэвіч, А.К. Вітаўт як дзяржаўны геній // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. Вып. 2. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2013. – С. 4–8; Станкевіч А. Вітаўт

Вялікі і беларусы // Наша слова. – 1990. – № 10. – С. 5–7, 10; Шаланда, А.І. Палітычная праграма вялікага князя літоўскага Вітаўта паводле яго гербавых пячатак // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. Вып. 2. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2013. – С. 27–39; Швед В.В. Горадзен часоў Вітаўта (1374–1430) // Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў– Гродна, 2013. – Вып. 2. – С. 9–14; Nikodem J., Witold Wielki Książe Litewski (1354 lub 1355 – 27 października 1430). – Kraków: Avalon, 2013. – S. 71–105.

Віцень – вялікі князь літоўскі (каля 1295 – 1316), валадар *Горадзена*. Сын Пукувера-Бутвіда (пам. 1295), брат *Гедыміна*. Тытулаваўся каралём Літвы і Земгаліі (мясцовасць на поўдні сучаснай Рэспублікі Летувы, дзе ў XIII ст. жыло балцкае племя земгалаў). Заключыў саюз супраць Лівонскага ордэна з рыжанамі (1298–1330). Ажыццявіў 11 паходаў у захопленую Тэўтонскім ордэнам Прусію і тым абараняў Жамойць ад Ордэна. Пасяліў прусаў на Гарадзеншчыне. Вярнуў ВКЛ згубленыя пасля смерці *Міндоўга* (1263) землі Чорнай Русі і далучыў Тураўскае і Пінскае княства. Адбудаваў Горадзен, разбураны пасля першага нападу Тэўтонскага ордэна ў 1284. Даручыў абараняць яго *Давыду Даўмонтавічу/Гарадзенскаму* і ажаніў князя са сваёй дачкой.

Літ.: А.Грыцкевіч. Віцень // Вялікае княства Літоўскае. Энцыклапедыя. – Мн.: Бел. Эн., 2005. – С. 457–458; Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym. Wyd. Drugie. T. IV. – Warszawa, 1886. – S. 292; Grodno w polskim okresie jego dziejów // Głos znad Niemna. 1917: jednodniówka grodzieńska – Grodno, 1918. – S. 16.

Віцэ-губернатар – другая асоба ў кіраўніцтве губерні. Ягоным абавязкам было быць непасрэдным памочнікам і супрацоўнікам *губернатара* па ўсіх аспектах кіравання. Ён наглядаў за справаводствам, дабраўладкаваннем і парадкам у *праўленні губернскім* і канцылярыях прысутных месцаў. Падчас адсутнасці губернатара часова выконваў яго абавязкі. Да 1845 г. віцэ-губернатар узначальваў *казённую палату*.

Літ.: Швед В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гродна: ГрГУ, 2001, с. 122–124.

Вішнявец – раён горада, былая вёска (да 1964 Гнойніца). У аснове новай назвы – дрэва вішня, вішнёвы зараснік, садок. Маёнтак спачатку атрымаў паводле прывілею Аляксандра Ягелончыка ад 13.02.1505 гродзенскі ключнік Афанас Дудка. Пасля яго смерці ўдава выйшла замуж за Чэшэйка Грынковіча, якому і перайшлі землі. Дачка А. Дудкі выйшла замуж за Рабея Грынковіча, які таксама стаў уладальнікам часткі Гнойніцы. Часткай валодаў сын Рабея Сідар. Да ўсіх спадчыннікаў фальварка мяшчане Гродна мелі прэтэнзію за нявыплату падаткаў гораду. 18.01.1553 прыгавор суда прымусіў іх выплочваць Гродну складкі і падаткі. У 1558–1561 вёска належала да грунтоў горада (18 валок, 11 моргаў). У вайсковым попісе 1567 г. як уладальнікі зямель у Гнойніцы згадваюцца Фёдар Сасін, Адам Шэмбел, Іван Макарэвіч. На пач. XX ст.

валодала Гнойніцай *Э. Ажэшка*, гэта быў яе радавы маёнтак. Яна хацела падараваць яго Гродзенскаму *таварыству сельскай гаспадаркі,* з умоваю атрымання пажыццёвай штогадовай рэнты ў суме 600 руб. Законы абмяжоўвалі правы палякаў-землеўладальнікаў, таму гэта не ўдалося зрабіць. Прадаць жа маёнтак не дазволіў віленскі генерал-губернатар. У 1906 г. Ажэшка (тады ўжо Нагорская) перадала зямлю ў Г. (171 дзесяціна 643 кв. саж.) наступным людзям: сялянам А. М. Бернатовічу, П. П. Богдзе, П. А. Рапаю, А. Ф. Пыску, мяшчанам І. В. і А. Р. Папуцэвічам; С. Антановічу, С. А. і А. В. Марцінкевічам; А. В. Мількевічу, С. В. Сідаровічу, В. М. Ланеўскаму; С. Ф. і С. В. Дайновічам. Ад П. Богды 3 дзесяціны 220 кв. саж. купіў мешчанін В. А. Злоцкі ў 1908 г. Падчас *вайны Першай сусветнай* частка зямель вёскі была адчужаная на патрэбы Гродзенскай *крэпасці.* У 2007 – дамоў 44, агульная колькасць жыхароў – 135, няпоўнагадовых да 15 год – 16, працаздольнага ўзросту – 84, пенсіянераў – 35.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 24, воп. 3, спр. 3973, а. 1, 2 адв.; Жучкевич. Краткий топономический словарь Белоруссии. – Минск, 1974, с. 53; Рапановіч. Слоўнік назваў населеных пунктаў. Гродзенская вобласць. – Мінск, 1982, с. 71. Черепица В.Н. Город-крепость Гродно в годы Первой мировой войны: мероприятия гражданских и военных властей по обеспечению обороноспособности и жизнедеятельности – Гродно: ГрГУ, 2006. – с. 311; Швед В.В. Губернскі Гродна: аповяды з гісторыі горада (канец XVIII – пач. XX ст.) / В.В. Швед. – Баранавічы: Баранав. ўзбуйненая друкарня, 2003. – С. 145; Borowik P. J. Jurydyki miasta Grodna w XV – XVIII wieku. Stanowy podział nieruchomości, Supraśl, 2005. – s. 60, 62, 259.

Война Ваўжынец/Лаўрын (? – каля 1580) – земскі падскарбі, каралеўскі рэвізор, пінскі і кобрынскі староста. Падскарбі надворны ВКЛ (1569–1576). Меў пляцы ў *Горадні.* Уласнік Красніка, Квасоўкі, Ласосны, Путрышак, Свіслачы, Мератыч. Арандатар Індуры. У 1560 г. разам з С. Дыбоўскім склаў *валочнае вымярэнне эканоміі Гарадзенскай*. Паводле загаду караля Жыгімонта Аўгуста ў 1561–1566 гг. склаў "Писцовую книгу бывшего Пинского староства" (выдадзеная Віленскай археаграфічнай камісіяй у 1874 г.).

Літ.: Сліж Н.І. Падаткі і іх збор у Гародні XVI – XVII стст. // Białoruskie zeszyty historyczne. – 2022. – n. 35. – S. 33; Poczobut-Odlanicki St. Grodno znane i nieznane. Historyczne opisy miasta. Przewodnik dla polskiego turysty. T. 1. – Białystok, 2014. – S. 28.

Войт – кіраўнік гарадской адміністрацыі ў XIV–XVIII стст. У Гродне войт прызначаўся вялікім князем літоўскім з заможных феадалаў або мяшчан. Пасада прадугледжвалася *магдэбургскім правам*. Войт вызначаў чынш, судзіў магдэбургскім правам (кіраваў гарадскім судом), займаўся прыцягненнем перасяленцаў на пустыя гарадскія пляцы. Войт на свой пажытак атрымоўваў штрафы, даходы з *корчмаў* і важніц, кожны трэці грош з гарадскіх чыншаў, меў права пабудаваць млын на *Нёмане,* валодаць фальваркам. Вядомыя наступныя войты: Міска (1502), Грышка (Грычка) Пуцятыч (07.1507, 23.08.1518), Станіслаў Яновіч, драгіцкі мешчанін (2.12.1522, 7.05.1526), Леан Фёдаравіч Сасін, прыдворны гаспадарскі (18.01.1530), Павел Ляшнеўскі, гродз. мешчанін

(4.04.1530 пасля смерці Л. Сасіна, 25.02.1540), Грыньковіч Пётр (8.06.1531, 1538), Чашэйка Пётр (1538–1540), Станіслаў Дуброва (21.12.1540, 25.07.1541), Ян Нямелчын (11.05.1541), Матыс Пяхціцкі, пісар кіраўніка гарадз. староства (14.09.1546. 15.01.1553), Пётр Шаматула (9.09. і 30.09.1555), Богуш Міхновіч (22.11.1556, 16.12.1558), Павел Міткавіч, мешчанін (памёр 27.07.1564), Дахно Канстантынавіч, землеўласнік гаспад. (22.07.1564, паўторна 31.07.1576), Себасцьян Еліткоўскі, прыдворны ЯКВ (9.09.1569), Мікалай Мікушэўскі (памёр 19.05.1586), Павел Сколка, чыноўнік ЯКВ (19.05.1586, 20.04.1593), Ян Дзевалтоўскі, стольнік (2.05.1593 пасля Скулкі), Януш Скумін Тышкевіч, пісар ВКЛ, стараста браслаўскі (28.08.1615), Андрэй Станіслаў Сапега, прыдворны ЯКВ (1620 пасля Тышкевіча), Аляксандр Трызна, падкаморы лідскі (23.01.1630), Канстанцін Казімір Александровіч (1659, 18.11.1633, 20.04.1665, 17.10.1667), Стэфан Яўстах Александровіч (17.10.1667, 1673), Ян Александровіч, пісар лідскі (2.11.1700), Ян Антоні Масальскі, маршалак (4.11.1700 эспедыцыя, 5.05.1706 без тытула), Казімір Караль Вайдзевіч, пісар дэкрэтавы ВКЛ (3.06.1706 пасля смерці Масальскага), Катовіч Рыгор Язэп (1717), Масальскі Міхал Юзаф (15.10.1755), Зялінскі Юзаф Антоні (1786–1792).

Літ.: Гардзееў Ю. Асаблівасці гарадскога права // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 57–61; Сліж Н. У. Магдэбургскае права ў Гародні ў канцы XV – першай палове XVI ст.: увядзенне і развіццё // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX ст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – С. 18, 21, 28, 29; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у 1743–1767 гг.// Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – с.; Jodkowski J. Spis wójtów, burmistrzów i prezydentów m. Grodna // Przegląd statystyczny za lata 1922 i 1923. – Grodno, 1925. – S. 11–12; Hardziejeu J. Źródła do dziejów Grodna w zbiorach krakowskich. Wstęp do badań // Pogranicze polsko-litewsko-białoruskie. Źródła historyczne – stan badań. – Białystok: wyd-wo "Prymat", 2003. – S. 29; Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. II. Województwo Trockie XIV-XVIII wiek /Pod red A. Rachuby. – Warszawa: DiG, 2009. – S. 353–356.

Волкаў Мікалай Аляксеевіч (? – 1942, Гродна) – кіраўнік адной з першых груп гродзенскіх падпольшчыкаў. Сын вясковага каваля. Удзельнік савецка-фінскай вайны, за якую ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. З 1940 у званні лейтэнанта служыў у вайскова-будаўнічым падраздзяленні ў Гродне. У жніўні 1941 стварыў падпольную групу. У яе ўвайшлі мясцовыя жыхары (урачы, настаўнікі, служачыя) і вайскоўцы Чырвонай арміі, якія не паспелі выйсці з горада. У складзе падпольнай групы былі: жонка Волкава, урач В. В. Шапашнікава, якая здабывала медыкаменты; Е. Ф. Карпюк прымаў па радыё інфармацыю Савінфармбюро, якую І. М. Завіша і А. У. Бараноўскі распаўсюджвалі сярод насельніцтва; А. Р. Калініна/Бачыла працавала ў нямецкай вайсковай частцы, дзе спаліла 2 аўтамашыны з амуніцыяй і вопраткай. У студзені 1942

В., яго жонка, Н. А. Быкаў (бухгалтар райпатрэбсаюза), Г. Хораў (настаўнік), Г. В. Васілюк былі схопленыя і замучаныя *гестапа*.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 317.

Вольмеры. Земскі суддзя, пазней маршалак Гарадзенскага пав. Казімір Вольмер меў у другой палове XVIII ст. 23 пляцы ў розных кварталах Гродна. На вул. Азёрскай была ягоная юрыдыка з камяніцай, якую ён набыў паміж 1753 і 1775. У 1779–89 Вольмер валодаў палацам на вул. Садоўніцкай, 2, пасэсіямі на вул. Падольнай. На пачатку 1780-х набыў наступную сядзібу на *Рынку*. У гэты час згадваецца Тадэвуш Вольмер, лоўчы і камісар павятовай цывільна-вайсковай камісіі. Ён набыў пляц на Бернардзінскім узвышшы.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 225.

Вольфганг Ксаверы Янавіч (?, Вільня – 24.03.?, маёнтак Полукня пад Вільняй) – доктар, выдавец штогадовіка "Ondyna Druskienickich Źródeł" (1844–1846), прафесар фармацэўтыкі і фармакалогіі Віленскага ўніверсітэта. Атрымаў дыплом лекара 17.05.1832 г. у Віленскай медычна-хірургічнай акадэміі. Працаваў 28 гадоў лекарам у Друскеніках: апісанне, лекарскія тлумачэнні і рэцэпты для хворых (Вільня, 1841). Яго намаганнямі ў Друскеніках быў пабудаваны невялікі шпіталь для казённых сялян (1846). Разам з І. Крашэўскім выдаў "Друскенікі. Літаратурна-медычны агляд" (Вільня, 1849), у якой прапагандаваў загартоўванне цела праз халодныя купанні.

Літ.: P. Szarejka. Słownik Lek. Polskiego. T. 3, – W-wa, 1995, s. 398.

Воранаў Мікалай Міхайлавіч (21.01.1913, Орша – ?) – прафесійны палітработнік, скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС. Старшыня *Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта* (26.10.1960 – 19.11.1962). Разбураў *Фару Вітаўта*.

Літ.: Мілінкевіч А. Фара Вітаўта ў Гродне / А. Мілінкевіч, Е. Пашэнда // Наш радавод. – Гродна, 1990. – Кн. 2. – С. 182–184.

Вуліцы горада. Колькасць іх у розныя часы была рознай, і не толькі павялічвалася – бывала, што і змяншалася ў выніку ваенных знішчэнняў. Паводле *валочнай памеры* Гродна 1561 г. у горадзе было 2 плошчы, 35 вуліц (у тым ліку ў занёманскай частцы *Рынак* і 4 вуліцы) і драўляны замак з дваром у *в. Гарадніца*. Паводле спісу *парадкавай камісіі* ў 1794 г. было 23 вуліцы, жылі таксама на занёманскім прадмесці (без пазначэння вуліц) і ў в. *Гарадніца*. Паводле дадзеных у кнізе П. В. Баброўскага, выдадзенай у 1863 г., Гродна дзялілася на 2 часткі: у першай было 4 плошчы і 11 вуліц, Гарадніца; у другой частцы – 2 плошчы, 28 вуліц, у тым ліку *фарштат занёманскі*. У кнізе Ю. Ю. Ядкоўскага "Назвы гродзенскіх плошчаў і вуліц: старажытныя і сённяшнія" (1932) пералічаныя 274 вуліцы, плошчы, завулкі. Станам на 1.01.1988

С. 834

налічвалася 371 вуліца, праспект, бульвар, завулак, плошча. На 1.09.2005 у горадзе – 1 бульвар, 4 праспекты, 289 вуліц, 106 завулкаў, 5 плошчаў.

У старажытнасці назвы вуліц былі звязаныя з асаблівасцямі рэльефу, месцам знаходжання, напрамкам, знешнім воблікам: Падольная, Падгорная, Віленская, Скідзельская, Аўгустоўская, Кляновая, Сасновая, Ласаснянская. З будаўніцтвам храмаў прыйшла традыцыя называць вуліцу, на якой ён стаіць, імем храма: Дамініканская, Брыгіцкая, Бернардзінская, Францішканская. Пазней у назвы вуліц стала ўмешвацца ідэалогія кіроўнага класа. Мясцовыя ўлады сталі называць вуліцы імёнамі дзяржаўных і палітычных дзеячаў, увекавечваць тыя ці іншыя гістарычныя падзеі і факты гісторыі. У расійскі час узніклі гродзенскія вуліцы Мураўёўская, Банкавая, Паліцэйская, Мяшчанская, Купецкая, Саборная, Пакроўская. Згодна з рашэннем мясцовай *рады г. Гродна* ад 10 лютага 1931 г. адбылася значная змена ў назвах вуліц. Было нададзена 170 новых назваў. Спецыяльная камісія разглядала назвы вуліц, выбірала іх з гісторыі Гродна, ушанавала імя *Вітаўта, Стэфана Баторыя*, Я. Чачота, ксяндза *Фардона,* доктара *Бянецкага*, паўстанца 1863 г. *А. Гафмайстра*, паэта *Л. Найдуса* і іншых.

У гады Савецкай улады ў назвах вуліц былі ўвекавечаныя імёны класікаў марксізма-ленінізма: Маркса, Энгельса, Леніна, іх саратнікаў Крупскай, Кірава, Свярдлова, Цэткін, герояў грамадзянскай вайны Будзёнага, Чапаева, Шчорса, Лазо (ніхто з пералічаных не звязаны з гісторыяй Гродна і ніколі ў ім не быў). Узніклі вуліцы 17 верасня (у гонар вызвалення Заходняй Беларусі і далучэння яе да БССР, Гродна вызвалена 19–20.09), 1 мая (дзень салідарнасці працоўных), Перамогі. Ушанаваныя імёны расійскіх палкаводцаў А. Суворава (які патапіў у крыві *паўстанне 1794* г. на тэрыторыі Гродзеншчыны) і М. Кутузава; савецкіх военачальнікаў, Герояў СССР М. Гастэлы, К. Заслонава, З. Касмадзям'янскай, М. Ватуціна, Л. Даватара (якія не маюць дачынення да Гродна); А. Антонава, І. Болдзіна, М. Паўлоўскага, В. Сакалоўскага; "народных герояў" (не з беларускай гісторыі і фальклору) Е. Пугачова, У. Кармалюка, Б. Хмяльніцкага, С. Разіна; касманаўтаў Ю. Гагарына, Г. Цітова, У. Камарова, А. Мікалаева, В. Церашковай.

Знайшлі сваё ўшанаванне расійскія, савецкія, польскія і беларускія літаратары: В. Бялінскі, М. Гогаль, М. Лермантаў, А. Пушкін, М. Астроўскі, Я. Колас, Я. Купала, *М. Багдановіч*, *Ю. Нямцэвіч*, *Э. Ажэшка*, У. Рэймант і іншыя. Ёсць вуліцы вучоных: гісторыка І. Лялевеля, хіміка Д. Мендзялеева, біёлага І. Мічурына (помнік яму стаіць на вул. Ціміразева, які ў жыцці быў супраць яго навуковых ідэй), фізіёлагаў К. Ціміразева і І. Паўлава, заснавальніка беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнографа *Я. Карскага*. Не абыйшлі і дзеячаў мастацтва: беларускага паходжання расійскі кампазітар М. Глінка, расійскія мастакі І. Рэпін і І. Шышкоў, беларуска-польскі кампазітар С. Манюшка і іншыя. Сваё месца занялі ў назвах вуліц дзеячы нацыянальна-вызваленчага руху: Я. Дамброўскі, *В. Урублеўскі, В.-К. Каліноўскі, Т. Касцюшка*. Плошча Дзекабрыстаў, вуліцы П. Пестэля, К. Рылеева названыя ў гонар "першанцаў свабоды" дзекабрыстаў.

На пачатку 1990-х гадоў пры гродзенскім гарвыканкаме, на чале з намеснікам старшыні, была створаная гарадская тапанамічная камісія. У склад яе ўвайшлі 26 чалавек: гісторыкі, краязнаўцы, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый. Імі быў падрыхтаваны спіс вуліц з прапановай вяртання гістарычных назваў цэнтральным вуліцам горада, надання назваў новым вуліцам у мікрараёнах Баранавічы і Зарыца, у пасёлку Паўднёвым. У гістарычным цэнтры былі зменены назвы толькі 1 плошчы і 7 вуліц: Кашавога на Вялікая Траецкая, 8 сакавіка на Малая Траецкая, Пасіянарыі на Калючынскую, Энгельса на Гараднічанскую, Замкавы тупік на Цесную, Новазамкавую на Давыда Гарадзенскага, Цэткін на Дамініканскую, Крупскай на Стэфана Баторыя, старая частка пл. Леніна на пл. А. Тызенгаўза.

Літ.: Бобровский П.О. Историко-статистический очерк города Гродна / П.О. Бобровский // Памятная книжка Гродненской губернии на 1860 год. – Гродно, 1860. – С. 69–132; Grodno w XVIII wieku. Miasto i ludność (na tle trendów rozwojowych od średniowiecza do 1936 roku) / Red. A. Woltanowskiego i J. Urwanowicza. – Białystok, 1997; Jodkowski J. Nazwy placów i ulic grodzieńskich dawne i dzisiejsze. – Grodno, 1932.

Выдавецтва гістарычнай бібліятэкі г. Гродна, арганізаванае рашэннем *магістрата* на паседжанні 29.11.1929. На першым паседжанні рэдакцыйнага камітэта было вырашана выдаць першым томам бібліятэкі кнігу Т. Янкоўскага “Смерць Стэфана Баторыя ў Гродне” з каментарамі *Ю. Ядкоўскага*. Месцам друку была выбраная гродзенская *друкарня Мейлаховіча* (1 тыс. экзэмпляраў за 1200 злотых). У склад рэдакцыйнай камісіі ўваходзілі: прафесар Віленскага ўніверсітэта *С. Касцялкоўскі*, кусташ Гродзенскага музея Ю. Ядкоўскі, лаўнік *магістрата* К. Гутман.

Крыніца: ДАГВ, ф. 46, воп. 1, с. 16, а. 70 адв.

Выступленне беспрацоўных 1936 г. Адбылося ў маі-ліпені пад кіраўніцтвам стачачнага камітэта на чале з У. Ф. Станкевічам. Спачатку спынілі працу 700 беспрацоўных, якія часова выконвалі грамадскія працы. Яны дамагліся падвышэння падзённай аплаты (мужч. да 3,5 злотых, жанч. да 2 злотых). Праз тыдзень да іх далучыліся 400 работніц прыватных садоў і агародаў з патрабаваннем падвышэння зарплаты і скарачэння рабочага дня да 8 гадзін. Іншыя працоўныя (чыгуначнікі, друкары, металісты, будаўнікі, тытуннікі, пекары) збіралі сродкі на дапамогу выступоўцам. У канцы мая забаставалі брукары, каменячосы, будаўнікі вайсковых гаражоў. Разам колькасць выступоўцаў дасягнула 1,5 тыс. чал. 29.05.1936 адбылася аднадзённая ўсеагульная стачка салідарнасці са страйкоўцамі (каля 2 тыс. чал.). Улады пайшлі на задавальненне многіх патрабаванняў.

Літ.: ЭГБ. Т. 3, с. 121.

Выступленне навучэнцаў мужчынскай гімназіі 23.09.1904 г. супраць адкрыцця расійскай уладай у Вільні помніка Кацярыне II. Было зарганізаванае

чальцамі Гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі навучэнцаў. Зрываліся заняткі, распаўсюджваліся ўлёткі антыдзяржаўнага зместу. За выступленне 7 навучэнцаў былі выключаныя з гімназіі.

Літ.: ЭГБ. Т. 3, с. 121.

Выступленні працоўных 1936 г. Былі зарганізаваныя міжпартыйным камітэтам, створаным чальцамі *КПЗБ, ППС* і *Бунда* з мэтаю арганізацыі адзінага рабочага і антыфашысцкага народнага фронту. У 2 пал. лютага – пач. сакавіка прайшлі забастоўкі гарбароў, швейнікаў і харчавікоў, у сакавіку – рабочых фанернай фабрыкі, металістаў, рабочых шклянога, лесапільнага і кафельнага заводаў. Гродзенскія працаўнікі падтрымалі агульнапольскую забастоўку супраць антысемітызму і рэакцыі, а ў дзень пахавання ахвяр у Кракаве баставалі ўсе гродзенскія прадпрыемствы, адбыўся 2-тысячны мітынг пратэсту. Першамайскія дэманстрацыі гэтага году прайшлі пад лозунгамі антыфашысцкага народнага фронту, барацьбы супраць вайны і фашысцкага тэрору, за ліквідацыю канцлагера ў Бярозе-Картузскай, у абарону СССР.

Літ.: Коўкель І. Гродзенскія адзінафронтаўскія выступленні працоўных 1936 ў Заходняй Беларусі // ЭГБ. Т. 3, с. 142.

Вявюрскі Юзаф (1902 – 15.07.1943, в. Навумавічы, *форт* № 2) – дырэктар агульнай школы № 8, радны гродзенскай гарадской рады (1934–1939). Скончыў педагагічныя курсы ў Варшаве. У 1936 быў сябрам камісіі па ўдакладненні *герба* горада. У 1937 – сябра Лагера нацыянальнага аб'яднання. У 1941 арыштоўваўся савецкімі ўладамі і быў высланы разам з жонкай і пяцярымі дзецьмі, але перад нямецкай акупацыяй вярнуўся ў Гродна. Працаваў у гарадской управе і загадваў дабрачынным аддзелам, арганізатар грамадзянскага камітэта дапамогі ахвярам вайны. Немцы ўзялі В. у закладнікі, але замест яго быў расстраляны *Каханоўскі Ян*. Праз год быў зноў арыштаваны і расстраляны разам з жонкай і дзецьмі.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 74.

"Вядамосці Гродзеньске" ("Wiadomości Grodzieńskie", у пер. Гродзенскія навіны) – орган *Таргавіцкай канфедэрацыі*, якая з 11 кастрычніка 1792 г. пераехала з Брэста ў Гродна. 18 лістапада выходзіць першы нумар газеты на польскай мове. Друкавалася яна ў гродзенскай друкарні і выходзіла па серадах і нядзелях. Усяго за лістапад ды снежань выйшла 12 нумароў. Тут можна было знайсці афіцыйныя матэрыялы, паведамленні генеральнай канфедэрацыі абодвух народаў, а таксама гродзенскую рэгіянальную інфармацыю. Напрыклад, ў № 2 паведамлялася аб прыездзе ў Гродна дэлегацыі з Польшчы са скаргаю на расійскія войскі, якія занялі польскія паветы. У № 4 была змешчаная пастанова канфедэрацыі ВКЛ пра захаванне парадку і бяспекі на

тэрыторыі Гродна. № 6 даваў інфармацыю аб прыездзе ў Гродна 28 лістапада генерала М. І. Галянішчава-Кутузава. У № 9 быў надрукаваны артыкул пра святкаванне 5 і 12 снежня 1792 г. у Гродне імянінаў *Кацярыны II*.

Вянгерка Аляксандр (17.07.1893 – 1941) – заснавальнік сучаснага польскага тэатра. Творчую дзейнасць акцёр пачаў у 1912 г. З 1923 працаваў у Варшаве, а ў 1939–1940 – у Гродне, дзе дзейнічаў як кіраўнік трупы, рэжысёр і пастаноўшчык спектакляў *Дзяржаўнага Польскага тэатра БССР*. Першы спектакль “Каварства і каханне” паводле Ф. Шыллера адбыўся ў Гродне 13.03.1940. Імя В. носіць польскі нацыянальны тэатр у Беластоку.

Літ.: Батура Н.В. Тэатр і музыкальнае жыццё г. Гродна ў 1939–1940 гадах // Сайт Гродненский район, доступ 22.07.2020.

Вясельская Магдалена – балерына з балета Тызенгаўза, якая танцавала ў “Другім балеце пекараў” (Гродна, 1778).

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. – Lwów. T. II, 1925. – S. 325.

Вячорка Антон – гаспадар гродзенскай фірмы па адліўцы чыгунных надмагілляў і агароджаў, створанай у 1865 г. Ягоныя працы можна знайсці на *могілках* гродзенскіх.

Літ.: Зорина Л. Художественный металл в Гродно. Каталог. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 68–75.

“Вячэрні Гродна” – гарадская штотыднёвая газета на рускай, з асобнымі матэрыяламі на беларускай мовах, якая стала рэгулярна выходзіць з ліпеня 2000 г. тыражом у 10 тыс. асобнікаў. З 2000 па кастрычнік 2004 друкавалася фарматам А–2, 16 палос, а затым перайшла на фармат А–3, 32 паласы. За час існавання газеты наклад вырас з 10 тыс. да 25 тыс. асобнікаў. Матэрыялы газеты друкуюцца ў наступных рубрыках: палітыка, эканоміка, соцыум, права, культура, спорт і іншыя. Перыядычна рыхтуюцца тэматычныя старонкі: “Деловая среда”, “Гость “Вечёрки”, “Четыре колеса”, “Детская площадка”, “Территория читателя”, “Машина времени”, “Женский клуб”, “Молодежный бульвар”. Распаўсюджваецца ў Гродне і раёнах вобласці праз “Белсаюздрук”, гандлёвую сетку, грамадскіх распаўсюднікаў, існуе падпіска па ўсёй Беларусі.

Крыніца: https://be.wikipedia.org/wiki/доступ 16.11.2024.

Г

Габрусевіч Сяргей Аляксандравіч (9.09.1936, в. Верхаўляны Бераставіцкага р-на Гродзенскай вобл. – 21.10.2013, Гродна) – старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры (1987). Вучыўся ў Малабераставіцкай школе (1954), на гісторыка-філалагічным факультэце Гродзенскага педінстытута імя Я. Купалы (1965), аспірантуры БДУ (1969). Пісаў вершы і, у сувязі з публікацыяй іх у *"Гродзенскай праўдзе"*, пасябраваў з *В. Быкавым*. Пасля заканчэння інстытута працаваў асістэнтам кафедры філасофіі і палітычнай эканоміі. Абараніў кандыдацкую дысертацыю "Развіццё У. І. Леніным марксісцкага вучэння аб практыцы як крытэрыі ісціны ў пазнанні сацыяльных з'яў" і стаў кандыдатам філасофскіх навук (1970). З 1970 пачаў працаваць у Гродзенскім педінстытуце, дзе прайшоў шлях ад старэйшага выкладчыка кафедры філасофіі і палітэканоміі (1969–72) да прарэктара па навуковай (1976–86), а затым па вучэбнай працы (1986–92). Быў прафесарам кафедры беларускай культуры (1992–2002), яе загадчыкам (2002–07), прафесарам кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму (2007). Вучонае званне дацэнта атрымаў у 1972, прафесара – у 1990. Асноўныя напрамкі даследаванняў Г. – паліталогія, гісторыя грамадска-палітычнай думкі ў Беларусі, гісторыя беларускай і рэгіянальнай культуры. У апошні перыяд жыцця плённа працаваў у галіне нацыянальнай культуры. У 1994–95 заснаваў і рэдагаваў часопіс "Свіцязь", як старшыня гродзенскага аддзялення БФК садзейнічаў выданню кнігі *А. Госцева* і *В. Шведа "Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990)*. Меў каля 100 навуковых твораў, у тым ліку манаграфіі (у суаўтарстве).

Творы: Гродна. Гістарычна-эканамічны нарыс; Прафесар Ігнат Анацэвіч. Жыццё і спадчына: гістарычны нарыс / С.А. Габрусевіч, С.В. Марозава. – Гродна: ГрДУ, 2005; От деловой игры до профессионального творчества; Педагагічная практыка студэнтаў; Гісторыя беларускай культуры; "…Это край мой до боли знакомый". Сборник стихов. – Большая Берестовица, 2014. Гл. таксама "Бібліяграфію гісторыі Гродна" у дадзеным выданні.

Літ.: Постаці ў гісторыі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы: гіст. нарыс/ Аўт.- склад. В.П. Таранцей. – Гродна, 2005. – С. 122–123; Прафесары Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. 1940–2010: біябібліяграфічны слоўнік. – Баранавічы: – № 1 ААТ "Чырв. Зорка", 2010. – С. 23–24.

Гавін Тадэвуш Феліксавіч (3.07.1951, в. Ласосна Гродзенскага р-на) – польскі грамадска-культурны дзеяч, першы кіраўнік *Саюза палякаў на Беларусі* (СПБ,

1990–2000). Пасля заканчэння Арлоўскай вышэйшай ваеннакаманднай вучэльні сувязі (1972) і ваеннай Акадэміі сувязі ў Ленінградзе (1982) служыў да 1987 г. афіцэрам сувязі на камандных і штабных пасадах у памежным войску на Далёкім Усходзе. У 1987–1991 – начальнік сувязі Гродзенскага памежнага атрада. Звольніўся ў званні падпалкоўніка. У 1988–1990 быў старшынёй Польскага культурна-асветнага *таварыства* імя А. Міцкевіча ў Гродне. На пасадзе кіраўніка СПБ дамогся адкрыцця польскіх школ у Гродне (1996), Ваўкавыску (1999) і выкладання польскай мовы амаль у 300 школах Беларусі. Цэнтры польскай культуры былі пабудаваныя ў Гродне, Баранавічах, Лідзе, Магілёве, Шчучыне. Ініцыяваў публікацыю ў Беларусі штотыднёвай газеты "Głos znad Niemna" і навукова-папулярнага квартальніка "Magazyn Polski".

Г. быў дарадцам старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь 13-га склікання па міжнацыянальных зносінах. Адзін з першых падпісаў Хартыю–97. Дзякуючы яму, упершыню за доўгі час пасля *вайны Вялікай Айчыннай*, польскае пытанне было вынесенае ў публічную прастору. Напрыклад, у 1988 яго сям'я публічна памалілася над магілай *Ажэшкі* на дзень усіх святых.

Г. – кандыдат гуманітарных навук. Аўтар кніг на польскай мове: "Бацькаўшчына: (дзённікі 1987–1993: адраджэнне польскасці на Беларусі (Гродна – Люблін, 1993); "Перамогі і паражэнні. Адраджэнне польскасці на Беларусі ў 1987–2000 гадах" (Беласток, 2003); "Польская нацыянальная меншасць на Беларусі 1988–2009. Ацэнка мінулага дваццацігоддзя" (Беласток, 2009, сумесна з З. Ю. Вінніцкім); "Польская нацыянальная меншасць на Беларусі. Саюз палякаў на Беларусі ў дваццацігоддзе дзейнасці" (Беласток, 2010, сумесна з З. Ю. Вінніцкім); "Польскае адраджэнне на Беларусі 1988–2005" (Беласток, 2010).

Крыніцы: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 413–414; сайт Саюза Палякаў на Беларусі, Вікіпедыя, Энцыклапедыя электронная.

Гадзіннік гарадскі (ратушны), з'явіўся на гарадзенскай *ратушы* ў XVI ст. і ўтрымліваўся за сродкі *магістрата.* Яго згадвала ў сваім прывілеі ад 25.07.1541 каралева і вялікая княгіня *Бона Сфорца*. Даследчык *Мілінкевіч Аляксандр* лічыць, што зрабіў гадзіннік майстар, запрошаны з Гданьска або з Караляўца. Ён пакінуў сваё таўро, падобнае на перавернутую літару "G". Расшыфраваць яго пакуль не ўдалося. Падчас *вайны руска-польскай 1654–67 гг.* ратуша была разбураная, і гадзіннік змясцілі на вежу *калегіума езуіцкага*, а ў 1725 г. – на левую вежу *касцёла Св. Францішка Ксаверыя/езуіцкага*. Калі ў 1750–52 гг. вежу і гадзіннік адрамантавалі, дык размясцілі на адзін ярус вышэй. Гадзіннік мае анкерны спуск і несекундны маятнік, круглы цыферблат. Сёння вышыня рымскіх лічбаў гадзін – 33 см, даўжыня гадзіннай стрэлкі – 100 см, а хвіліннай – 115 см. Даўжыня маятніка – 2 м. Апорны каркас механізма мае памеры 180х112х300 кг. Гадзіннік заводзіцца пры дапамозе спецыяльнай ручкі, адзетай на вал. Вага гіры ходу гадзінніка – 70 кг,

гіры, якая адказвае за бой гадзіны – 120 кг, а гіры боя чвэрці – 150 кг (гіры цяпер жалезныя, а раней былі з каменю). Гадзіннікавы звон "Святы Казімір" зроблены ў 1938 у Венграве Якубам Крушэўскім з медзі (80%) і англійскага волава (20%), мае вагу 300 кг, вышыню 60 см, дыяметр 76 см. Падчас *вайны Першай сусветнай* немцы вывезлі ў Германію гадзіннікавы звон, у 1922 г. былі дэмантаваныя цыферблаты. Гадзіннік рамантавалі ў 1680-я гады, 1725, 1743, 1750–52, 1875, 1944, 1980, 1988 гадах. Журнальны запіс гродзенскага *праўлення губернскага* за 20.01.1864 паведамляе, што, згодна з рапартам гадзіннікавых спраў майстра Караля Шчэнсновіча, "гродзенскаму гарадавому магістрату прадпісаць пабудову дашчатай абшыўкі гарадскога гадзінніка на вежы паезуіцкага касцёла, бо яны не могуць добра ісці, бо ўсялякая змена ў паветры дзейнічае на ход гэтага гадзінніка, тым больш, што ён знаходзіцца высока". Запіс за 31.12.1874 знаёміць нас з французскім падданым П'ерам Касеем, які ўзяўся аглядзець і адрамантаваць гадзіннік за 150 руб., а таксама з дваранінам Мечыславам Праневічам, які за 5 руб. на месяц пагадзіўся кожны дзень заводзіць гадзіннік і змазваць яго на асабісты рахунак.

У 1980-х гадах над запускам гадзінніка працаваў Мілінкевіч А., які зарганізаваў яго навуковае даследаванне (*Ткачоў М*., У. Кіслы, Л. Клімка), кансультацыі з экспертамі Эрмітажа ў Санкт-Пецярбургу і працу майстроў, якія выраблялі ці падрыхтоўвалі дэталі гадзінніка. Цяпер механізм знаходзіцца ў невялікім драўляным пакоі на моцнай дубовай падлозе. Квадратныя цыферблаты ў 1989 г. змянілі на круглыя, а старыя знаходзяцца ў *музеі гродзенскім гісторыка-археалагічным*. Абслугоўвае гадзіннікавы механізм з 1989 г. І. М. Ясюкевіч, "наглядальнік гарадскога вежавага гадзінніка". А першым вядомым гарадзенскім гадзіншчыкам быў мясцовы мешчанін Людвік Францыя. Г. г. з'яўляецца самым старым дзейным маятнікавым гадзіннікам у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе.

Літ.: Гончарук В.В. История городских башенных часов: Часы Фарного костёла в Гродно // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада). – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 154–158; Милинкевич А., История и техническое устройство гродненских башенных часов // Памятники науки и техники. – Москва, 1989. – С. 25–32; Мілінкевіч А., Гарадзенскі ратушны гадзіннік // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 119–136; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 81–84.

Гадлеўская Марыя – дырэктар гродзенскай *гарадской бібліятэкі* (з 15.10.1919). Праз яе ў гродзенскі музей трапіў малюнак вучня Рубенса, Тэнерса Давіда.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 77.

Гажанскі Ісак (пасля 1888 – не раней за 12.1942) – адвакат, старшыня юдэнрата гета № 1. Быў сябрам праўлення яўрэйскай абшчыны Гродна, гродзенскага аддзялення яўрэйскага камітэта "ORT" (1920), праўлення гродзенскага

аддзялення ваяводскага таварыства апекі над яўрэйскімі сіротамі(1930). З *гета* быў пераведзены ў перасылачны лагер Каўбасін (12.1942).

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 77.

Гажахоўскі Ян (21.12.1874, Седлец – 21.06.1948, Бруквуд, Вялікабрытанія) – камандуючы 3 дывізіёнам жандармерыі ў Гродне (1922–1927). Брыгадны генерал, муж *З. Налкоўскай*. Сябра баявой арганізацыі ППС (1904). У Гродне з 1922, жыў па вул. Акадэмічная, 15. Пасля Гродна быў камендантам Брэста і Варшавы. Памёр у эміграцыі.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с.77–78.

Гажыч Марыя (20.03.1860, Вішэра Курскай губ. – 13.09.1935, Гродна) – мастачка, абразы якой знаходзяцца ў кляштары *касцёла брыгіцкага*. Бацька – Т. Храноўскі, чыноўнік у галіне будаўніцтва мастоў і чыгункі, маці – Альжбета Нобель, далёкая сваячка заснавальніка Нобелеўскай прэміі. Бацькі мелі маёнтак Сегянёўшчына на Ваўкавышчыне, дзе пазней мастачка будзе выконваць большасць сваіх прац. Мастацкую адукацыю атрымала ў варшаўскім класе малюнка Войцеха Герсана, потым – у Акадэміі Жуліян у Парыжы ў Т. Рабэр-Фляры, В. Адольфа Бужэро і Ж. Ю. Лефэбрэ, затым – у Мюнхене. З 1880 выстаўляла свае творы на выставах у Варшаве, Кракаве, Вільні, Парыжы і Мюнхене, Чыкага і Сан-Францыска. Пісала пейзажы, кветкі, пабытовыя сцэны, партрэты. У 1878 выйшла замуж за мастака Паўла Гажыча і пасля яго смерці ў 1901 уступіла ў Згуртаванне назарэтанак, з 1908 па 1919 была старэйшай сястрой ў гродзенскім *кляштары* назарэтанак (былым *брыгіцкім*). Сястра Паўла (імя ў гонар мужа) займалася сакральным жывапісам, ад якога ў гродзенскіх назарэтанак захавалася 6 абразоў (“Святы Клемент”, “Святы Юзаф-цясляр”), а таксама актыўнай грамадскай і педагагічнай дзейнасцю. Пазней Г. выехала ў Люблін, затым на 10 гадоў – у Альбана (Італія), дзе вяла педагагічную дзейнасць. У 1932 вярнулася ў Гродна, у 1935 памерла і была пахаваная на *каталіцкіх могілках* у Гродне.

Літ.: Вашкевіч А. Гарадзенкі. Жаночы след у гісторыі Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 37–41; Маліноўская-Франке Н., Забыты вернісаж. Творчасць мастакоў Гродзеншчыны 1860-х – 1930-х гг.- Мінск: “Канфіда”, 2012, с. 149–150.

“Газета Гродзенская” (“Gazeta Grodzieńska”) – адна з першых газет на Беларусі. Выдавалася згодна з “Бібліяграфія Польскай” К. Эстрэйхера са студзеня 1775 (захаваны нумар датуецца 28.01) па снежань 1783 г. Аднак на думку польскага даследчыка Е. Лоека “(…) гэта магчыма, але не даказана. У кожным разе ў захаваных дакументах друкарні за 1784/85 няма ўжо слядоў друкавання

газеты". Ініцыятарам выдання быў сакратар гродзенскай *пошты* Ваўжынец Сабалеўскі. Яму надакучыла перапісваць у некалькіх экзэмплярах для распаўсюджвання "Газету Варшаўскую". Назва "Газета Гродзенская партыкулярная замест звычайнай пісанай" якраз падкрэслівала гэты факт ("partykularna" у дадзеным кантэксце перакладаецца з польск. як "мясцовая"). Сабалеўскі не толькі перадрукоўваў матэрыялы "Газеты Варшаўскай", але і дадаваў свае артыкулы палітычнага і гаспадарчага зместу, каментары палітычных падзей. На выданне газеты звярнуў увагу *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* і папрасіў *Тызенгаўза А.* кантраляваць працэс (цэнзараваць) перад друкам. Выходзіла штотыднёва па чацвяргах (у год 52–53 нумары). Фармат газеты 20х15 см. Тэкст друкаваўся на 1 лісце з абодвух бакоў (зрэдку было 4 старонкі). Выкарыстоўваліся два шрыфты і курсіў. Тыраж даходзіў да 200–300 экзэмпляраў, якія распаўсюджваліся на тэрыторыі ВКЛ, Кароны Польскай і беларускіх землях, захопленых Расійскай імперыяй пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай. Друкаваліся навіны з краіны і замежжа, цікавыя падзеі і здарэнні (у тым ліку ў Гродне: ушанаванне караля 17.01.1779; выбары ў Галоўны *Літоўскі трыбунал* 11 і 18.02.1779; святкаванне імянін Тызенгаўза А. 13.06.1779; баль на дзень выбару караля 14.09.1779; экзамены ў ваяводскай школе), аб'явы аб крадзяжах, згубах, збеглых сялянах і служках у рубрыцы "Данясенні з Гродна", рэклама прадукцыі гродзенскай каралеўскай друкарні. На сённяшні дзень экземпляры газеты захоўваюцца: у нацыянальным Музеі Кракава (зборы Чапскіх, 3 асобныя нумары за 1778 і 2 за 1780 г.) і Бібліятэцы Варшаўскага ўніверсітэта (53 нумары за 1779 і без 5 нумароў падшыўка за 1780 г.).

Літ.: Швед В.В. "Газета Гродзеньска" – адна з першых газет Беларусі // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 10–18; Łojek J. "Gazeta Grodzieńska" 1776 – 1783. // Rocznik Historii Czasopiśmiennictwa Polskiego. – 1966. – T. 5, z. 2. – S. 16–37.



Газеты, перыядычны друк

С. 835

З 1901 да верасня 1915 друкавалася газета *"Гродненские епархиальные ведомости"*.

Паводле рашэння *праўлення гродзенскага губернскага* ад 19.01.1838 выходзілі да 11.08.1915 г. *"Гродненские Губернские ведомости"*.



С. 836

1 снежня 1915 г. у рукі чытачоў трапіў першы нумар газеты "Grodnoer Zeitung" ("Гродно цайтунг"). Рэдактар – капітан Хайнікэ. Друкавалася па-нямецку, па-польску і на ідыш.

У нямецкую акупацыю часоў *вайны Першай сусветнай* стала выходзіць першая гродзенская беларуская газета "Беларускі народ".

18 снежня 1918 г. з № 34 выходзіць у Гродне "Nowe Życie" – штотыднёвік Хрысціянскага дэмакратычнага саюза і Камітэта аб'яднання Усходніх Крэсаў з тэрыторыяй Рэчы Паспалітай. Рэдактар і выдавец – ксёндз *Людвік Саванеўскі*.

У 1918–1929 гг. выходзіла газета "Dziennik Grodzieński" замест забароненай уладамі газеты "Echo". З'яўлялася самым вялікім перыядычным выданнем у Беластоцкай вобласці і асвятляла палітычнае, грамадскае і культурнае жыццё горада. У газеце былі такія рубрыкі, як: "Хроніка Беластока", гандлёва-прамысловы "Інфарматар", "Абавязкі" (карэспандэнцыя з Гродна). Газета пачала сваё жыццё ў Беластоку (рэдактар А. Лубкевіч), а ў 1922 перанеслася ў Гродна пад назвай "Dziennik kresowy".

У 1919 г. беларускі рух у Гродне падтрымлівалі газеты "Наше утро", "Беларусь" (11 нумароў з 30.03 па 18.05), "Родны край" (орган бел. эсэраў). Вясной гэтага года выйшла некалькі нумароў "Зоркі" (рэд. А. Аляксюк), але адсутнасць фінансавання спыніла далейшыя выпускі.

З кастрычніка 1920 па 1924 г. можна было пачытаць "Echo Grodzieńskie". Выдаўцом газеты было таварыства "Стражы Крэсаў". З афіцыйных пазіцый друкаваліся палітычныя навіны, тэлеграмы. Выдаваў і рэдагаваў газету доктар Ю. Руп. Рэдакцыя газеты знаходзілася ў будынку стылю мадэрн на сучаснай вул. Ажэшкі, 15 (шахматна-шашачны клуб).

2.10.1920 пачалося выданне газеты "Беларускае слова" (да 07.01.1921). Рэдактарам быў В. Адамовіч-малодшы (пс. "атаман Дзяргач"). Была органам Гродзенскага беларускага нацыянальнага камітэта, пасля – Цэнтральнага беларускага нацыянальнага камітэта. У ёй публікаваліся палітычныя, эканамічныя і культурныя матэрыялы, з пазіцый барацьбы за нацыянальнае вызваленне ацэньваліся міжнародныя і мясцовыя падзеі. З гарадзенскіх выданняў мела найбольшую колькасць нумароў – каля сотні.

2 кастрычніка1920 г. у Гродне выйшаў першы нумар газеты "Беларуская справа" – органу Цэнтральнага беларускага нацыянальнага камітэта (выдавалася да 7 студзеня 1921).

Газета камуністаў "Вясковы пралетар" выдавалася з 29 кастрычніка па 10 снежня 1922 г. У ёй асуджаліся лідары заходнебеларускага руху (Луцкевіч А., Тарашкевіч Б., Станкевіч С. ды інш.) як нацыяналісты, іранізаваліся вынікі выбараў у сейм 1922 г.

"Беларускі шлях" – гродзенская газета, якая выходзіла з 22 красавіка па 2 жніўня 1922 г. Выдавала яе група "беспартыйных беларускіх актывістаў" пад кіраўніцтвам Я. Міткевіча. Яны стваралі сабе імідж "людзей з народу" ды апанентаў "савецкага раю" і спадзяваліся на падтрымку сваёй камерцыйнай дзейнасці з боку ўлад. З лета да канца 1923 г. гэтая ж група выдавала газету "Сялянская гутарка", у якой працягвала палітыку згодніцтва з уладамі, нападала на камуністычную ідэалогію і беларускі нацыянальны рух.

З мая 1923 г. можна было чытаць штотыднёвую газету рускіх эмігрантаў "На рубеже" (орган "працоўнай інтэлігенцыі"). Для яе было характэрнае рэзкае непрыманне савецкай Расіі і асцярожнае стаўленне да беларускага нацыянальнага руху.

З 17.12.1922 па 1939 г. выдавалася газета "Dziennik Kresowy" у Лодзі, а ў Горадні з 13.10.1923 – "Nowy Dziennik Kresowy" (да 1939). Прытрымлівалася прынцыпу беспартыйнасці. Мела рубрыкі: "Спорт", "Чыста жаночая рубрыка", "Літаратурны дадатак". Рэдактарам быў Т. Карульскі.

У 1924 г. пачалі выходзіць польскамоўныя афіцыйныя газеты "Nadniemeński Kurier Polski", "Straż nad Niemnem", з 1925 – "Trybuna Grodzieńska", з 1926 па 1929 г. – "Głos Prawdy Ziemi Grodzieńskiej". Яны перадавалі палітычныя навіны, адлюстроўвалі ўнутранае становішча ў Польшчы, мясцовую хроніку, культурныя падзеі, шмат было рэкламы.

У 1920-я гады сфармавалася яўрэйская прэса на мове ідыш. З 1924 – "Гродзенскі момант", 1926 – двухтыднёвік "Рэдута", з 1928 – "Наш гродзенскі экспрэс". Гэтыя газеты асвятлялі розныя бакі жыцця яўрэйскага насельніцтва: гаспадарчае, рэлігійнае, побыт, культурніцкія справы.

З 1925 г. выходзіла штотыднёвая газета "Wiadomości teatralne", у якой пісалася пра ўсё, што датычыць тэатра – пра драматургаў, драматургію розных краін, тэатральныя традыцыі.

З 1929 г. выдаваўся "незалежна-дэмакратычны штотыднёвік, прысвечаны палітычна-грамадскім справам" "Postęp". Радыкальная газета спрабавала аб'яднаць найбольш здаровыя сілы дзеля ўмацавання ідэі дэмакратыі, дамагалася стварэння блока левых сілаў дзеля супрацьстаяння дыктатуры, гаспадарчаму крызісу, спробам перагляду межаў II Рэчы Паспалітай.

У 1930-я гады польскіх перыёдыкаў было даволі шмат: "Gazeta Polska Ziemi Grodzieńskiej" (1929–31), "Przegląd Kresowy" (1930), "Ostatnie Wiadomości Grodzieńskie" (1931–39), "Gazeta Grodzieńska" (1931–32), "Dziennik Kresowy" (1932–39), "Wieczorny Kurjer Grodzieński" (1932–35), "Codzienny Kurjer Grodzieński" (1934–35), "Grodzieński Express Poranny" (1934–36), "Kurjer Nadniemeński" (1934–36), "Mały Dziennik Grodzieński" (1935–36), "Kurjer Grodzieński" (1935–1939), "Nowy Grodzieński Kurjer Codzienny 5 groszy" (1935–1939), "Nasza Okolica" (1.11.1937), "Głos Polski" (7.03.1937), "Głos Grodzieński" (1938–1939), "Głos Nadniemeński" (1938–1939), "Dziennik Popularny" (1939). Пералічаныя газеты былі амаль аднатыпныя: шырока каментавалася замежная прэса, рабіліся агляды палітычнага жыцця ў краіне, мясцовай інфармацыі было няшмат.

Канцом ліпеня 1944 г. датуецца пачатак выдання газеты "За Советскую Родину" (з 1957 – "Советская Родина", з 1963 – "Сельская новь") – органа Гродзенскага райкама КПБ і раённага савета дэпутатаў працоўных. 26 кастрычніка 1944 г. выходзіць першы нумар газеты *"Гродненская правда"* – органа Гродзенскага абкама КП(б)Б і аблвыканкама. Побач з № 1 у дужках стаяла лічба "508", якая азначала працяг адліку нумароў абласных газет "Освобожденный Белосток", "Вольная праца" і "Белостокская правда". Апошняя выходзіла ў 1943 г. у Ліпічанскай пушчы як орган падпольнага Беластоцкага абкама КП(б)Б і аблсавета дэпутатаў працоўных (рэдакцыя – Я. Колас, С. Майхровіч –

адказны рэдактар, Ф. Пестрак, С. Прытыцкі, Я. Савіцкі). З 1 студзеня 1948 г. "Гродзенская праўда" пачынае выходзіць на рускай і беларускай мовах (да 31 снежня 1962). Агульны тыраж газеты ў гэты час складаў 55 тыс. экземпляраў, з іх каля 53 тыс. прыходзілася на рускамоўнае выданне.

У канцы савецкай эпохі з'яўляецца перыядычны друк на польскай мове. У 1989 г. выходзіць першы нумар газеты "Głos znad Niemna" ("Голас з-над Нёмана"), культурна-гістарычны штомесячнік "Magazyn Polski". З 1997 г. выдаецца "Газета Жыцця" – орган Гродзенскай каталіцкай дыяцэзіі.

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 15; Ляхоўскі У., Чарнякевіч А. Інфармацыйна-выдавецкая дзейнасць Рады і ўрада Беларускай Народнай Рэспублікі ў 1918–1925 гадах // Przegląd Środkowo-Wschodni. – 2019. – n. 4. – S. 49–51, 57; Пяткевіч А. Тэндэнцыі развіцця перыядычнага друку ў Гародні ў 1920-я – 1930-я гг. // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: зборнік навуковых артыкулаў / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 175–183; Пяткевіч А.М. Слова і кніга Прынёмання. Зборнік навуковых артыкулаў. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 39–70; Сороко П.В. Польские переодические издания в г. Гродно (1919 – 1939 гг.): к вопросу об актуальности проблемы // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 113–118; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 104; Kałuski M., Sprawy kresowe – poza cenzurą. T. 2. – Toruń-Melbourne, 2017. – S. 125; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. I. – Białystok: Prymat, 2014. – S. 129–133.

Гаетана (Gaietano, Caietano) – музыкант, кампазітар, капельмайстар, затым дырэктар прыдворнага аркестра Яго Каралеўскай Вялікасці (1790). Быў звязаны з *тэатрам Тызенгаўза* (напрыклад, "Не кожны спіць, хто храпіць", 1779), а пасля падзення апошняга – з варшаўскім тэатрам у 1787 (опера "Д'ябальская мітусня, або падвойнае ператварэнне"), у 1788 (опера "Каляда на Новы год"), 1793 гг. ("Не кожны спіць, хто храпіць"), у 1790, 1797 (аперэта "Жаўнер-алхімік", інш. назва "Жаўнер-чорнакніжнік", таксама 1787) і інш.

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. T. I, s. 193, 297, 303, 306, 335; T. II. – Lwów, 1925. T. II. – s. 14, 139, 234, 302, 350.

Галадушка К. – сябра Часовага кіравання г. Гродна ў 1939 г.

Галаснік – керамічная пасудзіна ў выглядзе збана, якую ўмуроўвалі гарызантальна або вертыкальна ў сцены ці столь храмаў горлам унутр памяшкання для паляпшэння яго акустычнага ладу (адкуль і сама назва вырабу), аблягчэння мураванай сцяны і скляпенняў (як лёгкі будаўнічы матэрыял), а таксама, магчыма, для стварэння круглымі венчыкамі рытмічнага дэкору ў інтэр'еры. Распаўсюджваўся ў XII–XIV стст. на тэрыторыі старажытнай Русі. Выкарыстаны ў цэрквах *гродзенскай школы дойлідства* XII ст.: *Ніжняй* (Сімяонаўскай?), *Барыса і Глеба на Каложы*, *Прачысценскай*. Галаснікі Барысаглебскай

царквы зробленыя з чырвонай гліны, добра абпаленыя, маюць высокі тон гуку, сваёй формай набліжаюцца да антычных равенскіх амфар (Італія), калі пазбавіць апошніх ручак і завостраны ніз змяніць на плоскае дно. Змешчаныя гарызантальна ва ўнутранай сцяне царквы, маюць наступныя памеры: вышыня ад 41,9 да 49,5 см (па іншых дадзеных – ад 38,2 да 50,4); дыяметр ля шыйкі – ад 9,0 да 9,2 см; тулава – ад 23,1 да 27,2 см; дыяметр дна – ад 11,3 да 13,8 см. Г. Барысаглебскай царквы больш цёмныя па колеры ("задымленыя"), чым Г. Ніжняй царквы.

Літ.: Архітэктура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. / Рэдкал.: А.А. Воінаў і інш.. – Мн.: БелЭн., 1993. – С. 166–170, 515; Воронин Н.Н. Древнее Гродно (по материалам археологических раскопок 1932–1949 гг.) // Материалы и исследования по археологии древнерусских городов. Т. III. – М.: Изд-во АН СССР, 1954. – С. 78–104; Диков П. Материалы для Коложской церкви в г. Гродно // Памятная книжка Гродненской губернии на 1887 год. – Гродно: губ. типография, 1886. – С. XIII – XV; [Диков П.] Материалы для истории древних Православных церквей в Гродно // Памятная книжка Гродненской губернии на 1866 год. – Гродно: губ. типография, 1865. – С. 30–33; Трусов И.Г. Православные храмы Гродно. Краткий очерк истории / И.Г. Трусов. – Мн.: Мэджик Бук, 2008. – С. 10, 47–48; Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – С. 130–134.

Галер фон Іван Уладзіміравіч – гродзенскі *губернатар* з 6.03.1862 да 17.04.1863. У 1849 у чыне штабс-ротмістра з'яўляўся чальцом следчай камісіі над віленскай тайнай арганізацыяй "Братні саюз". Напярэдадні прызначэння ў Гродзенскую губ. служыў дзяжурным штаб-афіцэрам віленскага вайсковага губернатара, кіраваў яго канцылярыяй. Быў у армейскай кавалерыі ў чыне палкоўніка. Па словах гродзенскага губернатара *А. М. Дранякіна*, інтрыгаваў супраць яго. Указам Аляксандра II ад 6.03.1862 прызначаны выканаўцам абавязкаў вайсковага губернатара Гродна і гродзенскага грамадзянскага губернатара, з наданнем чына генерал-маёра, а ўказам ад 5.03.1863 – вайсковым губернатарам Гродна і гродзенскім грамадзянскім губернатарам. У перыяд падаўлення *паўстання 1863–1864* прапанаваў звярнуць увагу на становішча сялян, з мэтаю іх адхілення ад нацыянальнага руху. Указам ад 17.04.1863 прызначаны віленскім грамадзянскім губернатарам. "За наглость, мошенничество, воровство и притеснение, которыми отличался Галлер, некоторые особы накануне его отъезда в Гродно принесли ему свои "поздравления" – так званую "каціную музыку".

Крын. і літ.: Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў, ф. 1101, воп. 1, с. 704, а. 76 адв.; НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 13, с. 1281, а. 2–2 адв., 54–54 адв.; Орловский Е.Ф. Граф М.Н. Муравьев, как деятель над укреплением прав русской народности Гродненской губернии. 1831–1835 и 1863–1865 гг. – Гродна, 1898. – с. 16; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 72–74.

Галіцын Васіль Васільевіч (1572 – 25.01.1619, Гродна) – рускі князь, удзельнік бітвы 1590 пад Нарвай, дзе быў ваяводам левай рукі. У 1596 і 1599

знаходзіўся з расійскімі палкамі ў Смаленску. Пасля смерці цара Барыса Гадунова (13.04.1605) перайшоў на бок самазванца Ілжэдзімітрыя I, але потым быў адным з першых, хто яго скідваў. Граў значную ролю пры звяржэнні Шуйскага (1552–1612) і быў у пасольстве да польскага караля Жыгімонта, які трымаў у асадзе Смаленск (1609). Разам з іншымі пасланнікамі быў затрыманы і 9 год знаходзіўся ў палоне ў Марыенбургу. Памёр у Гродне, калі вяртаўся з палону ў Маскву. Пахаваны ў Гродне каля *царквы Барыса і Глеба на Каложы*.

Галіцына Ганна Аляксандраўна, народжаная Галавіна (? – 1784, Гродна) – жонка князя Міхаіла Васільевіча Галіцына. У царкве Барыса і Глеба на Каложы ў 1878 г. ляжала яе надмагільная пліта, бо яна ў 1784 памерла ў Гродне. Пахавалі Г. у крыпце, дзе было месца пахавання *Богуша-Багавіцінавіча*. Падчас археалагічных раскопак 1935 г. *Ядкоўскі Ю.* знайшоў пліту памерам 76,5х56,5 см з рускім надпісам ля фундамента іканастаса.

Літ.: Грязнов В. Коложская Борисоглебская церковь в г. Гродне // Труды Виленского предворительного комитета по устройству IX археологического съезда. – Вильно, 1993; Jodkowski J., Świątynia warowna na Kołoży w Grodnie w świetle badań archiwalnych i archeologicznych dokonanych w 1935 r. // Prace i Sprawozdania Muzeum w Grodnie. – nr 1. – Grodno, 1936.

Галубовіч Уладзімір (20.06.1908, Екацярынадар/Краснадар – 7.04.1962, Стакгольм) – археолаг і этнограф. Вучыўся у Віленскім універсітэце *Стэфана Баторыя*, затым працаваў тут ва ўніверсітэцкім музеі археалогіі да 1939 г. У 1937–1941 праводзіў археалагічныя раскопкі і этнаграфічныя даследаванні на тэрыторыі Віленшчыны. У 1945–46 разам з жонкай Геленай Цэгак-Галубовіч зрабілі пашпартызацыю 11 тыс. знаходак і навуковую апрацоўку матэрыялаў раскопак, зробленых у Гродне ў 1932–39 гг. Вынікі прац Галубовічы падсумавалі ў рукапісе "Новыя матэрыялы па гісторыі Гродна", які быў падрыхтаваны да друку, але не быў выдадзены. Галубовічы вылічылі некалькі перыядаў у развіцці Гродна: 1) 2 палова XI – пачатак XII, калі паселішча з'яўлялася памежнай крэпасцю; 2) пачатак XII – сярэдзіна XIII, паселішча ператвараецца ў горад-цэнтр княства, будуецца *церам княскі* і *царква Ніжняя*. Пасля гэтага жыццё на *дзядзінцы* спыняецца ў сувязі з нейкай катастрофай. Пасля вайны Г. пасяліўся ў Польшчы (у Таруньскім дзяржаўным архіве захаваліся дакументы на рэпатрыянтаў Галубовічаў: Уладзіміра і ягонай жонкі Гелены). Г. працаваў ва ўніверсітэтах Торуні, Вроцлава (1951–1962, прафесар), дзе заснаваў кафедру археалогіі. Даследаваў ранняе сярэднявечча на тэрыторыі Сілезіі, друкаваў працы па методыцы і метадалогіі археалагічных даследаванняў, абараніў доктарскую дысертацыю "Даследаванне метадаў вывучэння культурных слаёў у польскай перадгісторыі". У 1948 г. у часопісе Пазнанскага ўніверсітэта "Slavia antiqua" (T. 1, c. 573–582) апублікаваны артыкул Г. "Радавыя і іншыя знакі на прадметах з раскопак у Гродне". У 1950 выйшла кніга "Garncarstwo wiejskie zachodnich terenów Białorusi" ("Вясковае ганчарства заходніх рэгіёнаў Беларусі").

Літ.: Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада/ Пад рэд. В. Карнялюк, В. Швед. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2012, с. 30–31; Pracownicy nauki i dydaktyki Uniwersytetu Mikołaja Kopernika 1945–1984. Materiały do biografii / pod red. S. Kalembki. – Toruń, 1987, s. 540.

Гальская Антаніна (1896, Гродна – ?) – настаўніца, паланістка. Сакратар арганізацыйнага камітэта *Хрысціянскага дэмакратычнага саюза* (11.1918), сябра праўлення "Гуртка полек" (1921), камітэта супрацьгазавай абароны (1923), праўлення польскай *Мацежы Школьнай* (1925). Падчас абароны Гродна (20–22.1939) арганізавала санітарныя патрулі. Арыштоўвалася органамі НКУС, але была вызваленая з прыходам немцаў (1941). Удзельнічала ў працы грамадзянскага камітэта дапамогі ахвярам вайны. Стварала патаемныя польскія школы. Была камендантам вайсковай жаночай службы АК (псеўданім Шаротка). Прымала ўдзел у вызваленні двух жаўнераў АК з брэсцкай турмы. 5.01.1945 зноў арыштаваная органамі НКУС. Каля 1956 вызваленая з лагера, выехала ў Польшчу.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с.78.

Гальскі Ян/Іван Антонавіч – гродзенскі каваль. Прыехаў у Гродна з Варшавы разам з братам Уладзімірам. Жылі ў доме купца *Лапіна* па вул. Саборнай/Савецкай, мелі слясарную майстэрню, якая згарэла падчас *пажару* 1885 г. У 1896 браты валодалі механічным заводам на вул. Шасэйнай, мелі ўласны дом. На гродзенскіх *могілках каталіцкіх* ёсць агароджы з фірменным знакам "В. И. Гальский. Гродно". Пахаваны на каталіцкіх могілках, у сектары С 030.

Літ.: Зорына Л. Художественный металл в Гродно. Каталог. – Гродна: ЮрСаПринт, 2012. – С. 43–46.

Галюн Сяргей Фёдаравіч (11.10.1866, Пецярбург – пасля 1917). Скончыў Ваенна-медыцынскую акадэмію ў Пецярбургу (1891). У Гродне са снежня 1891 – урач 104 Усцюжскага пяхотнага палка, са жніўня 1893 – гродзенскага ваеннага шпіталя, з 1895 – 102 пяхотнага Вяцкага палка. Бясплатны дырэктар дзіцячага прытулку. Кіраваў нядзельнай школай для дзяўчынак. З 1892 – чалец, а з 1893 – кіраўнік гродзенскага рэвалюцыйнага гуртка. З 1893 чытаў у горадзе лекцыі пра заразныя хваробы (адна з іх апублікаваная ў *Гродзенскіх губернскіх ведамасцях* – 1893, № 20). Быў кандыдатам у чальцы праўлення *Гродзенскай публічнай бібліятэкі*. Магчыма, меў кантакты з *А. Е. Багдановічам* праз бібліятэку і газету. Уноч з 6 на 7 жніўня 1894 Г. быў арыштаваны. Найвышэйшым загадам ад 18.10.1895 (30.10.1895 пав н. ст.) Г. выключылі з вайсковага ведамства. 8.12.1895 быў звольнены з пасады, а 19.12.1895 – пасаджаны ў *Гродзенскую турму*. Пазней сасланы пад нагляд паліцыі ў Астраханскую

губ. на 3 гады. Пасля ссылкі, да 1900 жыў за мяжой. З 1901 працаваў земскім урачом у Варонежскай і Цвярской губернях.

Літ.: Бич М. О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии. Мн., 1973; Галюн Сергей Фёдорович // Биографический справочник. — Мн.: "Белорусская советская энциклопедия" имени Петруся Бровки, 1982. – Т. 5. – С. 136.

Галямін Валерыян Емяльянавіч (1794, Гродна – 1855, Санкт-Пецярбург) – удзельнік дзекабрысцкага руху. Вучыўся да 1816 г. у інстытуце корпуса інжынераў, атрымаў чын паручыка і пачаў службу ў свіце Яго Вялікасці па кватэрмайстарскай частцы. У 1822 стаў намеснікам дырэктара корпуса тапографаў. Членам дзекабрысцкіх таварыстваў Г. не з'яўляўся, але падчас следства было высветлена, што дзекабрысты Д. А. Іскрыцкі і П. П. Канаўніцын 1-ы ўгаворвалі яго не прысягаць Мікалаю I, і ён абяцаў не парушаць прысягі, дадзенай цэсарэвічу Канстанціну Паўлавічу. Пасля следства Галямін быў пераведзены ў Петрапаўлаўскі пяхотны полк, ваяваў з туркамі, стаў у 1830 палкоўнікам Генеральнага штаба. Падчас падаўлення паўстання 1830–1831 гг., калі штаб знаходзіўся ў Гродне (10.01–11.02.1831), Галямін жыў у горадзе ў двухпавярховым будынку насупраць дома губернатара. Саслужывец Няелаў пісаў, што Галямін быў "душою таварыства, якое там жыло". У 1832 г. ён быў звольнены з вайсковай службы і прызначаны дырэктарам фарфоравага завода. У 1848 г. Галямін пакінуў гэтую пасаду ў чыне сапраўднага стацкага саветніка.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Минск, 2018, С. 49; Швед В.В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў. – Мн., 1998, с. 58.

Ганаровыя грамадзяне – гарадское насельніцтва з дробнай шляхты заходніх губерняў Расійскай імперыі, якое займалася так званымі інтэлігентнымі прафесіямі: настаўнікі, урачы, гравёры, архітэктары, скульптары, мастакі, адвакаты, літографы і інш., названыя ва ўказах 19.10.1831 і 1.01.1832 г. Умовамі залічэння да Г. г. было валоданне атэстатам расійскага ўніверсітэта альбо наяўнасць звання "сапраўднага студэнта" ці ступені кандыдата, для мастакоў – атэстата Акадэміі Мастацтва. Ганаровае грамадзянства было спадчынным (за запіс плаціліся 200 руб.), і тады перадавалася нашчадкам, альбо асабістае (аплата 100 руб.). Маглі запісацца таксама купцы, замежныя вучоныя, капіталісты і тыя, хто вызначыўся ў навуках і мастацтве. Яны мелі больш правоў, чым аднадворцы і грамадзяне, маглі адкупляцца ад рэкруцтва за 1000 руб., з 1834 г. былі вызваленыя ад падушнага падатку і цялесных пакаранняў, атрымалі права ўдзелу ў гарадскіх выбарах, але не мелі права паступлення на дзяржаўную службу. З 1847 Г. г. запісваліся ў 5 частку гарадавой абывацельскай кнігі. Прыкладам можа быць скульптар *Баляслаў Шышкевіч*, які з 1886 па 1893 г. у сваёй майстэрні паблізу могілак выраблял сапраўдныя цуды мастацтва і заслужыў тытул ганаровага грамадзяніна Гродна.

Літ.: Полное собрание законов Российской империи, 2-е собрание. Т. 6, отд. 2. – С. 134–138; Т. 7. – С. 193–196; Zasztowt L. Europa Środkowo-Wschodnia a Rosja XIX-XX wieku w kręgu edukacji i polityki. – Warszawa: Retro-Art., 2007. – s. 83–94.

Ганаровыя грамадзяне Гродна – асобы заслужаныя перад горадам Гродна. У Расійскай імперыі гэтае званне атрымалі друкар і ліцейшчык Зымель Нахімовіч (1841), пісьменніца *Ажэшка Э.* (1907), *губернатары гродзенскія І. М. Скварцоў, Д. М. Крапоткін*, фотамайстар *З. Я. Карасік*, сябра Гродзенскага павятовага прысутнічання Я. Ф. Кнотэ (мужна бараніў горад падчас *пажару 1885 г.*) і інш. У часы II Рэчы Паспалітай такі тытул мелі: камандуючы Акругі № 3 на Гродзеншчыне А. Літвіновіч (1936); прэзідэнт РП (1926–39) І. Масціцкі (дарэчы, паводле яго прапановы сталі святкаваць дзень *св. Губерта*); Стэфан Карпінскі (9.09.1928); маршалак, Начальнік Рэчы Паспалітай *Пілсудскі Ю.*, маршалак РП Э. Рыдз-Сміглы (1936). У савецкі час, 1.07.1964 *выканаўчы камітэт* гродзенскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных усталяваў званне "ганаровага грамадзяніна горада Гродна" і завёў адмысловую Кнігу, куды запісваліся прозвішча, імя ды імя па бацьку, інфармацыя аб заслугах дадзенай асобы (захоўваецца ў выканаме гарадскога савета). Рашэннем гродзенскага *гарадскога Савета дэпутатаў* № 35 ад 10.12.2003 званне ганаровага прысвойваецца жыхарам горада за выдатную грамадскую і вытворчую дзейнасць на карысць Гродна, высокія дасягненні ў развіцці навукі, мастацтва, архітэктуры і спорту. Ганароваму грамадзяніну ўручаецца пасведчанне, нагрудны знак і блакітная стужка з выявай *герба горада* і надпісам. Першымі Г. г. былі ўдзельнікі *вайны Вялікай Айчыннай*: *Данілаў А. С.*, *Соламава В. І.*, *Карбышаў Д. М.*, Разанаў В. Д. А ўсяго ў студзені 2017 – 36 асоб. У перыяд Рэспублікі Беларусь (з 1991) да ветэранаў вайны сталі дадавацца спартсмены, дзеячы культуры, кіраўнікі гаспадаркі. Успомнім некаторых: алімпіец *Курловіч А. М.* (1992); кіраўнік народнага ансамбля песні і танца "Нёман" *Чопчыц А. С.* (1997); рэктар ДГМУ Маслакоў Д. А.; Герой СССР Лебедзеў І. Д.

Крын. і літ.: ДАГВ, ф. 14, воп. 1, с. 15, а. 79; Почётные граждане города Гродно. библиографический справочник. – Гродно: Гродненская типография, 2007, с. 4–6.

"Гандлёвы дом Нёман", знаходзіцца на вул. Савецкая, 18. Стары ўнівермаг быў пабудаваны на месцы будынка гатэля "Еўропа" ("Большой Европейский") у стылі "сталінскага" ампіру 1950-х гадоў. Прыняты ў эксплуатацыю 19.03.1959. Гандаль ажыццяўляўся на першым і другім паверхах, а трэці быў адміністрацыйным. Праз 10 гадоў *гарадскі выканаўчы камітэт* прыняў рашэнне аб наданні ўнівермагу зямельнага ўчастка для пашырэння вытворчых плошчаў. Пры гэтым для пашырэння вытворчых плошчаў быў знесены шэраг дамоў, дзе знаходзіліся кінатэатр "Спартак", фотамайстэрні М. Ш. Папірнага, Карасіка, Х.-А. Ф. Язерскага, рэстаран "Варшаўскі", падсобны будынак медыцынскага ўніверсітэта. Новы будынак універмага ўзнік у 1970-х. Пазней адбылася яго рэканструкцыя.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 296–297; Саяпин В. Пешком по Ожешко и Советской/ Виктор Саяпин. – Гродно: ООО "ЮрСаПринт" 2011. – С. 70–72.

Ганібал Абрам/Ібрагім Пятровіч (каля 1697, Лагон, Паўночная Эфіопія – 26.05.1781, Суіда, цяпер Ленінгр. вобл.) – прадзед па маці расійскага літаратара А. С. Пушкіна. Нарадзіўся ў сям'і афрыканскага князя, трапіў у няволю, з якой яго выкупілі ў Канстанцінопалі для цара Пятра I. Да 1717 быў яго камердынерам, затым высланы вучыцца ў Парыж, займаўся ў артылерыйскай школе, ваяваў у Іспаніі. Пасля вяртання ў Расію атрымаў чын генерала і пасаду каменданта Рэвеля/Таліна. Дачка трэцяга сына Г. Восіпа была маці Пушкіна. У якасці сакратара Пятра I суправаджаў яго ў паездках падчас *вайны Паўночнай* (1700–1721). Падчас знаходжання ў Вільні ахрысціўся ў Пятніцкай/Параскевай царкве (27.07.1705, меў хрысціянскае імя Пётр). Верагодна, разам з Пятром I накіраваўся пасля Вільні ў Гродна (пачатак верасня 1705).

Літ.: Venclova T., Wilno/ Przewodnik biograficzny. – Warszawa: PIW, 2013. – С. 101–102.

Ганчарук Дзмітры (нар. 17.07.1970, Гродна) – гродзенскі алімпіец (лёгкая атлетыка, ядро), удзельнік чэмпіянатаў свету 1995, 1997, 2001. У Атланце ў 1996 кінуў ядро на 19,38 м і заняў 8 месца.

Літ.: Попко И.Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 43.

"Гарадзенская беларуская губернская ўправа" – былая гарадзенская расійская ўправа, створаная былымі царскімі чыноўнікамі, вайскоўцамі і праваслаўным духавенствам (кіраўнік Яўграф Курлоў). Адбылося палітычнае вяртанне дактрыны "заходнерусізму": сябры ўправы не бачылі аніякай розніцы паміж беларусамі і рускімі. У снежні 1918 яны правялі Першы гарадзенскі беларускі губернскі з'езд, пасля якога і адбылася змена назвы. Мелі кантакты з урадам Літвы і Міністэрствам беларусіх спраў пры гэтым урадзе і выказваліся за далучэнне Гарадзеншчыны да Літвы на правах аўтаноміі.

Літ.: Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гродна-Вроцлаў: Гродзенская бібліятэка, 2014. – С. 295

Гарадзенская школа архітэктуры – самабытная школа мураванага дойлідства, для якой характэрныя: будаўнічая тэхніка храмаў – роўнаслаёвая муроўка з уключэннем на знешніх фасадах зашліфованых з аднаго боку валуноў, палі-

С. 837

хромных маёлікавых плітак, з якіх выкладаліся ромбы, крыжы, разеткі. Ва ўнутраным баку сцен умуроўвалася вялікая колькасць галаснікоў, якія адкрываліся ўнутр храма, выконваючы трайную функцыю: аблягчэнне будаўнічых канструкцый, паляпшэнне акустыкі, дадатковае дэкаратыўнае аздабленне інтэр'ера. Да пабудоў названай школы адносяцца: у Гродне – *церам княскі, царква Ніжняя, Барысаглебская царква на Каложы, Прачысценская царква,*

царква на тэрыторыі *замка Новага,* якую знайшоў *Ткачоў М. А.*, у Ваўкавыску – недабудаваная царква.

Літ.: Краўцэвіч А. Гродзенская архітэктурная школа XII ст. // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 35–40; Ткачоў М.А. Археалагічныя помнікі г. Гродна / М.А. Ткачоў // Археалагічныя помнікі Гродзеншчыны. – Гродна, 1992. – С. 5–30; Ткачоў М.А. Старажытны горад Гродна / М.А. Ткачоў // Памяць: гіст.-дакум. хроніка горада Гродна. – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 32–33; Чарняўскі І. Гродзенская Прачысцінская царква / І.М. Чарняўскі // Архітэктура Беларусі: энцыкл. – Мінск, 1993. – С. 170; Чарняўскі І.М., Жаровіна Г.П. Нечаканае адкрыццё / І.М. Чарняўскі, Г.П. Жаровіна Г.П. // Помнікі культуры і гісторыі Беларусі. – 1982. – № 4. – С. 34–36.

Гарадзенскі павет – створаны пасля Гарадзельскай ўніі 1413 г. на тэрыторыі *княства Гарадзенскага*, існаваў да першай пал. XX ст. Гродна было ягоным цэнтрам, дзе знаходзілася ўлада – староства на чале са *старостай*. Падчас адміністратыўна-тэрыт. рэформы 1565–1566 межы павета былі ўдакладненыя. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай зах. частка Г. п. апынулася ў Прусіі, а ўсходняя (у тым ліку Гродна) – у Расійскай імперыі: спачатку ў складзе Слонімскай губ., з 23.07.1797 – у Літоўскай, з 21.09.1801 – у Літоўска-Гродзенскай губ. (пасля 1840 Гродзенскай). У 1886–1912 у складзе Г. п. налічвалася 21 воласць: Азёрская/Язерская, Багародзіцкая, Берштаўская, Верцялішкаўская, Воўпаўская, Вялікабераставіцкая, Галынкаўская, Гожская, Горніцкая, Гудзевіцкая, Дубнаўская, Жыдамлянская, Індурская, Каменская, Крынская, Лашанская, Луненская, Малабераставіцкая, Мастоўская, Сабалянская, Скідзельская; горад Гродна; 11 мястэчак: Азёры, Воля, Воўпа, Вял. Бераставіца, Друскенікі, Індура, Каменка, Крынкі, Лунна, Масты, Скідзель; 955 вёсак, фальваркаў, пасёлкаў і інш.

Літ.: Волости и важнейшие селения Европейской России. Вып. 5, СпБ., 1886; Административно-территориальное устройство БССР: Справ. Т. 1, Мн, 1985; Jakubowski J. Powiat Grodzieński w w. XVI // Prace komisji Atlasu historycznego Polski. Zesz. 3, Kraków, 1935.

Гарадніца – рака (цяпер больш ручай), якая цячэ ў Гродне і ўпадае ў *Нёман* недалёка ад гродзенскіх *замкаў*. Згадваецца ў інвентары маёнтка Чашчаўляны, які належаў *царкве Барыса і Глеба на Каложы*. Гісторык Ю. Гардзееў згодны з аўтарамі артыкула пра Гарадніцу ў "Гродно. Энциклопедическим словаре", якія назву рэчкі выводзяць з наймення горада. Аўтар дадзенай кнігі падзяляе погляд гісторыка архітэктуры Гродна І. Трусава: рака дала назву гораду – Горадзен, Гарадня. Пацвярджаюць гэта і разважанні даследчыка планіроўкі Гродна Ю. Н. Кішыка, які лічыць, што першы дзядзінец гарадзенцаў быў на рацэ Горадні/Гарадніцы (каля сённяшняга будынка банка Мінск-Масква на рагу вул. Траецкай), а на пачатку XII ст. быў заснаваны другі, дзе знаходзіцца *замак Стары*.

Літ.: АВАК, Т. XIV. – Вильно, 1879; Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 46–47; Гродно.

Энциклопедический словарь. Минск, 1989. – С. 137; Кишик Ю.Н. Градостроительная культура Гродно / Ю.Н. Кишик. – Мінск: Беларус. навука, 2007.

“Гарадніца” – краязнаўчы клуб, які існаваў у 1980-я гады. Сябрамі клуба былі дацэнты ГрДУ філолаг Анісімава А. і гісторык *В. В. Швед*, краязнаўцы сужэнцы *Госцеў А. П.* і Госцева Л., кіраўнік гродзенскага аддзела БФК Грышуціна Л., сужэнцы Г. і Ю. Юневічы і інш. Знайшлі месца пахавання дырэктара *тэлеграфа*, які застрэліўся.

Гарадніца, Сухая даліна, Сухое сяло, існавала з XV ст. як каралеўская вёска і княскі двор. Спачатку была ўмацаваная драўляная рэзідэнцыя, а з сярэдзіны XVI ст. – замак польскай каралевы *Боны Сфорцы*, якой належалі вакольныя землі (двор займаў каля 1,178075 га). Драўляны замак у форме квадрата з залай пасярэдзіне быў пабудаваны *Дыбоўскім Себасцьянам* і меў дах пакрыты гонтам. Па словах І. Трусава, мог знаходзіцца недалёка ад старога фантана ў *парку імя Жылібера*, паводле іншай версіі – на месцы, дзе цяпер *палац* у *Станіславове*. У 1655–1661 гг. фальваркавыя пабудовы двара Гарадніца былі знішчаныя падчас маскоўскай акупацыі горада. У 1678 г. Гарадніца была ў занядбаным стане і патрабавала рамонту. На яе тэрыторыі ў той час знаходзіліся: двор, тры дамы (чацвёрты згніў), бровар, пякарня, *лазня*, стайня, ганачак, агарод, гумно. Замак быў спалены падчас *вайны Паўночнай*, на пачатку XVIII ст. На беразе Гараднічанкі гродзенскі краязнавец М. Я. Супрон знайшоў фрагмент рэйнскай керамікі XVI–XVII ст., якая, мяркуе ён, паходзіць з палаца *Боны*. Цяпер Гарадніцай называюць тэрыторыю, абмежаваную вуліцамі Ажэшка, Дзяржынскага, 1-га Мая, Цімеразева. *Тызенгаўз А. у* 1765–1780 гг. тут ажыццяўляў свае эканамічныя і культурныя рэформы. Праектам планавання і забудовай гарадніцкага ансамбля займаліся дрэздэнскі архітэктар *Мёзер Ёган Георг* і італьянец *Сака Юзаф (Джузэпэ)*. Галоўная вуліца Раскоша (*Ажэшкі Э.*) была забудаваная 20 тыповымі *дамамі баснякаў* (сумяшчэнне мураванай і драўлянай архітэктуры) для замежных рабочых і майстроў, запрошаных працаваць на мануфактурах і навучаць мясцовых прыгонных розным рамёствам. На пачатку вуліцы стаяла *карчма “Раскоша”*, а ў канцы – *карчма “Галеча”*. Г. была ў той час падзеленая на адміністрацыйна-культурна-адукацыйную і гаспадарча-прамысловую часткі/зоны. У першай знаходзіліся *палацы Тызенгаўза А., адміністратара і віцэ-адміністратара, медычная акадэмія/школа, школы, адчыненыя Тызенгаўзам, тэатр, сад батанічны,* склады, *крывая афіцына (музычная)*, былі запланаваныя *абсерваторыя астранамічная* з галерэямі і сад прагулачны. У другой частцы былі дамы басняцкія, *мануфактуры каралеўскія, бровары, карчмы, кафенгаўз,* фабрычны склад, *млыны*, афіцына для тытунёвых афіцыялістаў, склад для дроў, кузня з будынкам пры ёй. Агулам на Гарадніцы ў 1789 г. было 102 будынкі.

С. 838

Комплекснасць Г. была зламаная пасля адхілення Тызенгаўза ад кіравання ў 1780. Разбураць яе працягнулі ў першай траціне XIX ст., калі перабудоўвалі Г. пад вайсковыя патрэбы, а ў 1873 г. ператварылі будынак-блізнюк насупраць

дома віцэ-адміністратара (былы будынак *Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродне*) у губернскую *казённую палату*, а пазней збудавалі на плошчы Тызенгаўза *царкву Аляксандра-Неўскую*. У 1915 г. нямецкай бомбай быў разбураны палац Тызенгаўза. Пасля рэканструкцыі плошчы Леніна быў зліквідаваны флігель дома віцэ-адміністратара. У канцы 1950-х гадоў з 85 пабудоў засталося толькі 20, а сёння іх – 8.

Даследчыца Сліж Н. апублікавала інвентар 1780/1782 гг. і апісанне плана Гарадніцы 1780 г. Сам план гісторык *В. Швед* апублікаваў у ніжэй названай кнізе.

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 97; Квитницкая Е.Д. Планировка Гродно в XVI-XVIII вв. // Архитектурное наследство. – М., 1964. – № 17. – С. 11–38; Кишик. Ю. Градостроительная культура Гродно. – Мн., 2007; Павач А. А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 121–128; Писцовая книга Гродненской экономии. Часть 1, 2. – Вильна, 1881–1882; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С. 41–42; Супрон М. Я. Невядомыя старонкі гісторыі Горадні (паводле блога supron-licvin.livejournal.com) // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Вып. 10 (2015) / рэдкал. І. Соркіна [і інш.] – Гродна, 2016. – С. 73; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшая школа, 1969. – С. 97; Чернякевич А.Н. Знакомьтесь, Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Навукова-метадычны дапаможнік для настаўнікаў гісторыі і геаграфіі. Вып. 12. – Гродна: ДУА Гродзенскі АІРА, 2010. – С. 3–9; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997; Skice z dziejów kolonizacji Podlasia i Grodzieńszczyzny od XIV do XVI wieku. – Olsztyn: Wyd-wo Warmińsko-Mazurskie, 2002. – S. 112; Sliż N. Horodnica grodzieńska w źródłach wizualnych i dokumentalnych (druga połowa XVIII w.) [рукапіс 2021 г.].

“Гарадніца” – праграма Гродзенскай студыі тэлебачання, у якой з 1989 да 1994 (?) асвятляліся пытанні культуры, гісторыі, літаратуры, музычнага жыцця Гродна і Гродзеншчыны. Аўтарамі і вядоўцамі былі Голуб Ю., Кумко Л., Шаўчонак М.; рэжысёрам – Тараканава Н. У праграме былі такія рубрыкі, як: “Гісторыя і сучаснасць”, “Вернісаж”, “Хвіліны паэзіі”, “Рэпартаж”, “Тэатральная вясна”, “Польскія беларусы”, “Па старых вулках Горадні” (з 1992 г. вёў яе *Мілінкевіч А.*). Двойчы (у 1992 і 1993) прадстаўлялі ў праграме кнігу *Госцева А.* і *Шведа В.*: *Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990).*

Літ.: Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990). – Гродна: ГАА БФК. – С. 281–282.



С. 839

Гараднічанка (Horodniczanka) – назва рэчкі *Гарадніцы* ў польскамоўных крыніцах (1661, 1674, 1751, 1793 гг.). Даследчык Ю. Кішык сцвярджае, што на берагах Г. быў першы *дзядзінец* Горадні. Падчас *сейма 1793* на беразе ракі стаялі для запалохвання паслоў гарматы, накіраваныя на *замак Новы*, дзе адбываўся сейм, які зацвердзіў другі падзел Рэчы Паспалітай. Пра Г. напісала карэспандэнцыю ў “Газету Польскую” (1867, № 186) *Ажэшка Эліза*.

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2012; Кишик Ю.Н. Градостроительная культура Гродно / Ю.Н. Кишик. – Мінск: Беларус. навука, 2007; Павач. А. Под крылом Коложы. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 150–151; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 83–84.

Гараднічы (бургграбя) замка гарадзенскага, займаўся яго будаўніцтвам, функцыяваннем і забяспячэннем. Вядомыя наступныя гараднічыя: Грынашка (Грынька) Хадкевіч (9.02. і 14.12.1486, 31.10.1495, з 25.05.1499 ужо намеснік у Прывалцы), Федка Гаўрылавіч Мялешкавіч, чэснік гаспадарскі (9.07.1496, 1499, 1501, 1504, 5.12.1522), Марцін Іванавіч Мялешкавіч, дворнік гаспадарскі (5.12.1522 у сувязі з хваробай брата Федка, 1524 пасля смерці апошняга), князь Сямён Багданавіч Адзінцовіч, любашаньскі арандатар (20.06.1530, 17.11.1533, 20.04.1534, 20.11.1541), Шчэнсны Мікалаевіч Талочка (20.08.1549), Астафі Багданавіч Валовіч (26.06.1551, 24.11.1552), Рыгор Багданавіч Валовіч, прыдворны гаспадарскі, арандатар мсцібаўскі, эйшышскі, каняўскі, дубіцкі і зэльвенскі (29.02.1553, 1567), Андрэй Няпрэцкі (1555), Ян Рыгоравіч Валовіч, чашнік ЯКВ (13.06.1567, 1569, канец 1571), Ян Васілевіч Клукоўскі (5.01.1573, 28.06.1582), Марцін Стэфанавіч Скарульскі (2.04.1588, 10.10.1596, 1.08.1597), Габрыэль Гейштар (Гейштарт) (1.08.1597), Ян Дзевалтоўскі, войскі і войт (17.03.1598 пасля смерці Гейштара), Павел Валовіч, падкаморы (13.07.1601 пасля смерці Дзевалтоўскага, 21.03.1626), Кшыштаф Весялоўскі, надворны маршалак ВКЛ (21.03.1626), Гедэон Міхал Трызна, прыдворны ЯКВ, стольнік ВКЛ (2.05.1637 пасля смерці Весялоўскага), Самуіл Казімір Азянблоўскі (1667, 18.09.1677), Аляксандр Ян Мальхеравіч Зарэмба Чэмпкоўскі (18.12.1674), Ян Леваш, брамнік і ключнік (1676), Аляксандр Дыянізы Войшка Скарабагаты, падчашы дорпцкі (3.02.1676), Зыгмунт Караль Гумоўскі (8.09.1688, 20.08.1702, 1708), Якуб Францішак Палітальскі (Палітаньскі), лоўчы (1700), Геранім Казімір Кабылінскі (памёр 13.08.1706), Казімір Кавалеўскі (9.07.1708), Войцех Палкоўскі (20.10–12.11.1709), Себасцьян Станіслаў Ваўкавыскі (6.02 і 26.04.1710, 7.02.1720), Антоні Пшэздзецкі (24.04.1722, 24.04.1727), Аляксандр Ядкоўскі, падлоўчы ВКЛ (25.08.1723, 16.06.1734), Ахацы Данька (Данк, Данек) (13.10.1735), Канстанты Гердзяеўскі, станоўчы войска ВКЛ (26.11.1735, 23.06.1750), Антоні Ваўкавыскі (21.03.1737, 19.05.1786), Караль Ян Данька (Данек) (26.10.1740 пасля смерці бацькі Ахацыя, 3.10.1756), Лукаш з Ялова Барановіч, абозны (7.06.1752 пасля смерці Гердзяеўскага да 26.05.1755), Францішак з Ялова Барановіч (26.05.1755 пасля Лукаша, 1758), Феліцыян Пшэздзецкі (18.08.1764), Гіпаліт Дзякевіч (30.09.1765), Андрэй Станіслаў Эйсымонт (Эйсмант), скарбнік (12.03.1784 пасля смерці Ф. Барановіча да 7.03.1786), Антоні Студзінскі, скарбнік (пасля Эйсманта 7.03.1786, 5.02.1794), Багдан Наткінскі (14.03.1792), Марцін Кандыба (12.11.1792), Антоні Барановіч (26.07.1793)

Крын. і літ.: Літоўскія метрыкі; Rps. BUW nr. inw. 260, dok. 51, k. 2; Галубовіч В. Пастулаты Гродзенскага сойміка на Сойм 1646 г. // Гарадзенскі палімпсест. XII-XX стст. Матэрыялы міжн. канф. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Горадня-Беласток:

ІГДБ (ЕГУ). – 2008. – С. 61; Сліж Н. Статус Гародні ў XVI – першай палове XVII стст. / Rocznik Grodzieński. – 2012. – 4. – С. 38; Литовская метрика (1533–1535). 8-я книга судных дел. Т. 227(8). – Вильнюс: Вильнюский ун-т, 199. – С. 78, 123; Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. II. Województwo Trockie XIV-XVIII wiek / Pod red A. Rachuby. – Warszawa: DiG, 2009. – S. 15, 251–256.

Гараднічы (часоў Расійскай імперыі) – пасада, якая ўсталёўвалася згодна з імянным ўказам Кацярыны II на імя Ліфляндскага, Эстляндскага і Літоўскага генерал-губернатара *М. В. Рапніна* ад 10.11.1794 г. Старшыня створанага на незанятай яшчэ частцы ВКЛ *Вярхоўнага літоўскага праўлення* (той жа Рапнін) павінен быў у павятовыя гарады прызначыць гараднічых і меў права прысвоіць ім чын 8 класа, калі асоба не мела больш высокага. У абавязкі Г. уваходзілі: захоўваць у горадзе грамадскую бяспеку, "благочиние, добронравие и порядок", вызначаць кватэры для войска, праводзіць супрацьпажарныя мерапрыемствы, весці барацьбу са злачынствамі і эпідэміямі, збіраць падаткі і зборы, а таксама інш. казённыя і вайсковыя справы. Г. падпарадкоўваліся прыватныя прыставы і квартальныя наглядальнікі. Пасада зліквідаваная 25.12.1862 адпаведна з "Часовым правілам аб усталяванні паліцыі ў гарадах і ўездах губерняў, па агульнай арганізацыі кіраваных". Абавязкі Г. былі ўскладзеныя на павятовых спраўнікаў.

Літ.: Гродненская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917). – Гродна: ЮрСаПринт, 2018. – С. 39–40; Рубинштейн С.Ф. Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии. Вильно, 1894. – С. 163; Швед. В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гродна: ГрДУ, 2001. – С. 126; Żytkowicz L. Rządy Repnina na Litwie w latach 1794–1797. – Wilno, 1938. – S. 100–101.

Гарадняне, градняне – найменні жыхароў Горадзена/Гародні. Напрыклад, Мілаш Гараднянін (1488 г.), людзей нашых "Городнянъ" (1504), "у Городнянина" (1505), "гродняне" (17 ст.). У Валынскім летапісе сустракаем "городняне", у Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай – "гроднян".

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 30–31; Летапісы і хронікі Беларусі. Сярэднявечча і раньнемадэрны час, Мінск, 2010, с. 482.

Гарады-пабрацімы Гродна – населеныя пункты, якія знаходзяцца ў розных краінах і маюць з Гроднам пастаянныя кантакты ў галіне гісторыі і культуры: Ашкелон (Ізраіль); Беласток, Слупск, Сувалкі (Польшча), Белград (Сербія), Друскінінкай і Алітус (Літва), Кралева (Сербія), Ліможа (Францыя); Лунань (Кітай); Масква, Калінінград, Волагда, Тамбоў, Чэбаксары, Туапсэ, Хімкі, Шчолкава (усе РФ); Міндэн (Германія); Ранча-Кардова (ЗША). Гродна мае кантакты з Саюзам балтыйскіх гарадоў і з'яўляецца сябрам Міжнароднай Асамблеі сталіц і буйных гарадоў. У Гродне знаходзяцца Генеральныя консульствы Літвы і Польшчы.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 21; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 78–79.

Гарбачэўскі Зыгмунт (16.01.1889, Лікаўка Гродзенскага ў. – ?) – бургамістр Гродна падчас нямецкай акупацыі (з 1.08.1941). Скончыў Гродзенскую *гімназію* (1907), юрыдычны факультэт Дэрпцкага ўніверсітэта (1914). Добраахвотнік, падпаручнік падчас *вайны савецка-польскай*. Далей працаваў па спецыяльнасці: сакратар акруговага суда, міравы суддзя 1-й акругі Гродзенскага пав., з пач. 1920-х – адвакат. Сябра ППС, удзельнічаў у народнай радзе Гродзенскага пав. (1919). Быў радным Гродзенскай *гарадской рады* (1919–1927, 1939). Кіраваў гуртком гаспадарчай працы, узначальваў Саюз стральцоў, сябра Польскага дабрачыннага таварыства ў Гродне (1921) і павятовага камітэта фізічнага выхавання (1927). З прыходам у горад Савецкай улады быў вывезены на Усход, але транспарт быў збамбардаваны немцамі (22.06.1941), і гэта ўратавала яго. Стаўшы бургамістрам Гродна, супрацьдзейнічаў мясцоваму Беларускаму нацыянальнаму камітэту ў перайманні кіраўніцтва адміністрацыяй горада. Далейшы лёс Г. невядомы.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 79–80.

Гарбульская Малка (1897–?) – загадчыца аб'яднаных яўрэйскіх школ у Гродне (1928–1939). Пасля гімназіі скончыла 4 курсы гуманітарнага факультэта ўніверсітэта, педагагічныя курсы, курсы рускай мовы. У Гродне з 1928 г. Пры Савецкай уладзе ў 1939–1940 працавала ў няпоўных сярэдніх школах № 12 (дырэктар), № 6 і яўрэйскай № 12.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 80.

Гардзінас (Gardinas) – летувіская назва *Гродна*. У перакладзе з мовы летувісаў gartas, gardas азначае абгароджанае месца, загон, стойла. Філолаг Казімерас Буга тлумачыць назву ад імя паганскага бога Гардуніціса (Гарнітаса, Гардунціса) – апекуна жывёлы, якога паважалі яцвягі гістарычнай Літвы. Гісторык, які схаваўся пад мянушкай Jadźwing, пагаджецца з абгароджаным месцам для жывёлы, але піша, што ёю не маглі быць авечкі, бо ў вільготнай прасторы яны хварэюць.

Літ.: Госцеў А. П. Гродна: назвы горада на працягу 880-гадовай гісторыі // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 65–66; Jadźwing, Monografja Grodna [w.:] Przegląd Wileński. – Wilno. – 1923. – № 18. – S. 2–4; Z. Winnicki, Szkice kresowe. – Wrocław, 1995. – S. 103.

Гарнавых Рыгор Аляксандравіч (снежань 1904, г. Верхні Уфалей Чалябінскай вобл. – 20.09.1939, Гродна) – удзельнік баёў у Гродне ў 1939. З рабочых.

У Чырвонай арміі з 1928. Скончыў вайскова-палітычную школу (1935) і быў накіраваны ў Беларускую вайсковую акругу. Забіты падчас захопу *моста* імя *Пілсудскага* праз р. *Нёман* у Гродне. На месцы яго смерці знаходзіцца мемарыяльны знак. Адна з вуліц Гродна названая яго прозвішчам (былая вул. Ліпавая).

Гартэн, Гартэна (Garten, Garthe, Gartha) – нямецкамоўная назва *Горадзена/ Горадні* ў крыніцах Тэўтонскага ордэна ў XIII–XIV стст. і Гродна падчас нямецкай акупацыі ў *войнах Першай і Другой сусветнай*. У апошняй такая назва рэгулярна была толькі на бланках лістоў бурмістра і на пячатцы павятовага камісара. У перакладзе з нямецкай мовы "гартэн" азначае "сад". Ёсць паданне, у якім гаворыцца пра прускага князя Відэвута, старэйшага сына якога звалі Літва. Апошні заснаваў горад на Нёмане і назваў яго ў гонар свайго сына Гарта (Gartho, Garto) – Grottna, Grodna, а па-нямецку Garz, Gartz, Gartho.

Літ.: Астравец С. Garten // Дзеяслоў. – 2005. – № 6. – С. 105–107; Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 29–30; Госцеў А. П. Гродна: назвы горада на працягу 880-гадовай гісторыі // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 64; Ліцкевіч А., Гародня і гарадзенскі рэгіён у другой палове XIII – XIV ст.: назва і межы // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 12; Санько С. Эпанімічная версія паходжання назвы "Літва" і беларускія рэфлексы блізнечнай міфалогіі // Новае слова ў гісторыі і культуралогіі / пад рэд. А.А. Сушы. – Мінск, 2012, с. 44; BJ Rkp 6320. IV. Słownik geograficzno-historyczny Wielkiego Księstwa Litewskiego sporządzony przez Jana Prekiera, c. 51.

Гарф Вільгельм Яўгенавіч (1884, Гродна – 1938, Масква) – вайсковы дзеяч спачатку расійскай арміі, а потым Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі (РСЧА). Вучыўся ў нямецкай школе пры гродзенскай лютэранскай *кірсе*, у Пажскім корпусе ў Пецярбургу (1904). Служыў у лейб-гвардыі Егерскім палку, а ў 1908 у чыне паручніка паступіў у імператарскую Мікалаеўскую вайсковую акадэмію. Паспяхова скончыў яе ў 1910 па 1-м разрадзе і цэнзавае камандаванне прайшоў у Егерскім палку. Пасля двух гадоў прызначаны ад'ютантам штаба 3-га армейскага корпуса обер-афіцэра пры штабе Віленскай вайсковай акругі. Сем месяцаў у 1914 праслужыў старэйшым ад'ютантам штаба 26-й пях. дывізіі, якая размяркоўвалася ў Гродне. Пачатак *вайны Першай сусветнай* сустрэў у Вільні, дзе служыў штаб-афіцэрам для даручэнняў пры штабе 26-га армейскага корпуса. Ваяваў на пасадзе начальніка штаба 69-й пях. дывізіі і на пачатку 1917 атрымаў чын палкоўніка. Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 перайшоў на службу ў Чырвоную армію. Са студзеня 1918 па ліпень 1919 служыў памочнікам кіраўніка справамі Галоўнага ўпраўлення Генеральнага штаба, начальнікам аддзялення яго аператыўным кіраваннем, начальнікам аператыўна-выведвальнага кіравання штаба Усходняга фронту. З ліпеня 1919 па студзень 1920 Г. быў начальнікам штаба Усходняга фронту і ўключаны ў спіс Генштаба РСЧА. У 1921 узнагароджаны ордэнам Чырвонага

Сцяга. Пасля заканчэння грамадзянскай вайны Г. служыў ва ўпраўленні забеспячэння і ўзбраення РСЧА. На пачатку 1930-х працаваў ваенным кіраўніком у Маскоўскім інстытуце сувязі, з 1934 – начальнікам Акадэміі сувязі РСЧА ў чыне камандуючага дывізіі. 10.05.1938 арыштаваны і 22.08 расстраляны.

Літ.: Ермоленко В. А., Черепица В.Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 331–333.

Гарцэры. Гарадская Гарцэрская дружына імя караля *Стэфана Баторыя* (Miejska drużyna harcerska im. Króla Stefana Batorego) была зарганізаваная 4.01.1917 у школе польскай імя Стэфана Баторыя. 4.03.1917 гарцэры склалі прысягу на вернасць Богу і Айчыне. Першым кіраўніком быў Гасперскі А. З 29.10.1019 Г. сталі адносіцца да Віленскай акругі. Ажыццяўлялі паходы ў ваколіцы Гродна, дзе шукалі праціўніка, спявалі польскі гімн, песні "Za Niemen hej precz" ("Вон за Нёман"), "Marsz Sokołów" ("Марш Сокалаў"). Г. увайшлі ў *Самаабарону Зямлі Гродзенскай;* 14 хлопцаў уступілі ў аддзел польскай кавалерыі *Чучаловіча*; старэйшыя паводле ўзросту пайшлі ў войска і ўдзельнічалі ў раззбраенні нямецкага гарнізона ў Гродне. Пасля заканчэння вайны польска-савецкай дружына Г. аднавіла сваю дзейнасць.

Літ.: O niepodległą i granice. T. 7. Raporty Straży Kresowej 1919–1920 Ziem Północno-Wschodnich opisane /Wstęp, wybór i opracowanie J. Gierowska-Kałłaur. – Warszawa, Pułtusk, 2001.

Гасперскі Міхал (1877 – ?) – ініцыятар першай ў Гродне Гарцэрскай арганізацыі (1917). Быў выкладчыкам геаграфіі, прафесарам. Выступаў з лекцыямі па гісторыі горада ў Агульным універсітэце, які арганізавала Польская *Мацеж школьная*. Цікавіўся паранармальнымі з'явамі. Падчас нямецкай акупацыі працаваў у гарадской управе (загадчык архіва).

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 80; Sawonewski L. Saga o Grodnie, Łódź-Białystok, 1999, s. 68–69.

Гасціны двор – комплекс збудаванняў і плошча ў горадзе ці мястэчку, дзе гандлявалі і часова пражывалі купцы і захоўваліся тавары. У Гродне вядомы з XIV ст., размяшчаўся на чатырохвугольнай плошчы, забудаванай з усіх бакоў мяснымі і хлебнымі радамі і крамамі. У XVI–XVII стст. у горадзе ўжо былі тры Г. д.: два на правабярэжжы і адзін на фарштаце, *занёманскім прадмесці.* Асноўны Г. д. пэўна знаходзіўся на *Рынку.* У 1869 г. быў падрыхтаваны праект яго капітальнага рамонту: Г. д. перабудоўваўся ў аднопавярховы з мезанінам, уладкоўваліся памяшканні для 7 крамаў і 77 лавак, у мезаніне размяшчалася *гарадская дума*, сіроцкі суд і кватэрная камісія, на двары былі зробленыя 28 драўляных лавак для дробнага гандлю, меркавалася пабудова часовага балагана на 30 лавак. У 1876 новы Г. д. ужо дзейнічаў. Паглядзець яго можна на плане Гродна 1879. Г. д. быў моцна пашкоджаны падчас пажару

1885 г. У 1890 частка даху над мезанінам была пакрытая бляхай. У 1890–1910-я гады ў будынку *ратушы* знаходзіліся мяшчанская ўправа, рамесная ўправа, пажарнае таварыства, пакоі занятыя войскам і інш.

Літ.: Супрон М. Гарадзенская ратуша (гасцінны двор) у XIX – пачатку XX ст.: функцыі і знешні выгляд // Гарадзенскі гадавік, Кракаў. – 2014. – №. III. – С. 98–103; Швед В.В. Гасціны двор // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Мн.: Бел. Эн, 1994. – с. 497–498.



С. 840

Гатэлі. У XX ст. адыгралі не толькі сацыяльна-эканамічную, але і грамадска-палітычную ролю. Сённяшні стан крыніц і літаратуры дазваляе прывесці наступную інфармацыю. "Гандлёвы", "Камерцыйны" знаходзіліся ў будынку пабудаваным у 1900 г., у 1912 дабудаваны трэці паверх (зараз вул. Савецкая, 20). Уласнік Ш. Л. Фэдэр адкрыў гатэль, які з 1901 г. стаў "Камерцыйным". У 1920 г. апошні ператвораны ў "Гандлёвы". У кастрычніку 1920 працавала бюро Беларускай вайсковай камісіі па запісе ў беларускі клас Варшаўскай школы падхарунжых, у складзе камісіі былі А. Борык, А. Плескачэўскі, Я. Шурпа, Ю. Лявыкін, А. Якубецкі, Э. Якабіні і Ф. Умястоўскі. У 1926 г. тут спыняўся сеймавы пасол В. Рагуля, працавала фотамайстэрня *Рубінштэйна*. З пачатку 1930-х дзейнічаў "Паморскі базар", на якім прадаваліся тканіны, сукно, карункі, цыраты. У савецкі час у доме знаходзіліся абласны савет "Осоавиахим", рэстаран "Беласток", узорная сталоўка, гатэль "Гродна".

"Гродна" спачатку знаходзіўся ў будынку па вул. Савецкая, 20. Тут у часы Расійскай імперыі размяркоўваліся гатэлі "Камерцыйны", "Гандлёвы". У 1950–1960-я меў назву "Беларусь" (да 12.1969), а затым "Белоруссия". "Еўропа" стаяла на месцы старога будынку *ўнівермага* да другой паловы 1950-х гадоў. Да *вайны Першай сусветнай* будынак належаў Л. Валянскаму, і ў ім знаходзіўся гатэль "Вялікі Еўрапейскі". Магчыма, будынак быў пабудаваны архітэктарам Небальсіным у канцы XIX ст., які збудаваў у 1890-х гадах дом гродзенскага акруговага суда насупраць гатэля (вул. Савецкая, 31). Падчас Першай сусветнай вайны немцы выкарыстоўвалі будынак пад гатэль, які назвалі "Нямецкі кайзер" і адкрылі ў ім рэстаран нямецкай кухні Аўгуста Тона. З канца 1918 гаспадаром гатэля стаў І. Пытко, які вярнуў назву "Еўрапейскі". 28 ліпеня 1920 у Гродне пабываў камандуючы Заходнім фронтам *М. Тухачэўскі*. Ён быў у штабе *Гая*, які знаходзіўся ў гатэлі "Еўропа". У 1920–1930-х гадах гатэль і пры ім рэстаран "Еўропа" працягвалі сваю працу: у гатэлі было 31 месца, у двары размяшчаўся гараж для машын гасцей, у рэстаране падчас абеду і вячэры граў аркестр. Кіраўніком у гэты час служыў бацька вядомага пазней рускага пісьменніка Карл *Алеша*. Правая частка будынка пацярпела падчас вызвалення горада ў 1944. У захаванай частцы размеркавалася аўта-кінарамонтная майстэрня. Са снежня 1944 была перададзеная рамесламу вучылішчу № 14 для аднаўлення, першы паверх занялі розныя крамы. Але адрамантаваць будынак не змаглі ні вучылішча, ні ўпраўленне гандлем, ні арцель інвалідаў "Прагрэс", таму ў 1953 прымаецца рашэнне разабраць аварыйны будынак сіламі будаўнічага ўчастка № 64.

"Метраполь" дзейнічаў на пач. XX ст. на сённяшняй вул. Сацыялістычнай, 19. У часы БНР тут адбывалася рэгістрацыя добраахвотнікаў у беларускі полк пры літоўскім войску. "Нёман" адчынілі побач з крамай "Вопратка" на вул. *Стэфана Баторыя* (тады Н. Крупскай) у снежні 1961 г. На той час гэта быў найлепшы гатэль у горадзе: тут сялілі ў пакой па 1–2 чал., у пакоі быў умывальнік, хаця санвузел меўся не ва ўсіх нумарах. У гатэлі ахвотна спыняліся артысты падчас гастроляў. Некалькі разоў спыняўся тут У. Высоцкі. "Пецярбургскі" знаходзіўся ў доме Ромера па вул. Саборнай. У 1865 г. яго набылі сужэнцы Ясяноўскія і арганізавалі гатэль. Разам з тым яны адкрылі краму рэйнскіх вінаў і каланіяльных тавараў. На пач. XX ст. будынак належаў Рыманам, якія таксама трымалі гатэль, пашырыўшы яго да 33 нумароў і, магчыма, назваўшы "Маскоўскі" (1907–1915). А з 1926 г. тут дзейнічаў "Гатэль Польскі".

Гатэль "Расія" быў у будынку па вул. Савецкая, 23. У сакавіку 1919 тут праходзілі паседжанні ўрада БНР. Працавалі *камітэт Беларускі нацыянальны*, *Грамада беларускай моладзі*, *рада Цэнтральная беларуская Гарадзеншчыны*, рэдакцыя газеты "Беларусь", беларускі клуб "Наша хата". "Раяль" быў на вул. Гараднічанскай, 20, у доме Паплаўскага. Тут 15–19.02.1919 г. жыла амерыканская місія пад кіраўніцтвам палкоўніка Грова, маёра Роса і маёра Дуайта Эйзенхаўэра (будучага прэзідэнта ЗША). У рэстаране гатэля праходзілі беларуска-польскія вечарыны. "Швейцарыя" – гатэль па адрасе Ажэшкі, 4. Будынак уяўляе сабой рэдкі прыклад стылю канструктывізма. У часы БНР тут знаходзілася рэдакцыя газеты "Беларускі шлях". У адным з пакояў у сярэдзіне 1928 г. была сядзіба гарадзенскага акруговага камітэта *Таварыства беларускай школы*. Апошняя мела штатнага інструктара, бібліятэку і драматычны гурток.

А яшчэ былі ў 1907–1915 іншыя гатэлі: на вул. Саборнай/Савецкай – "Славянскі", "Маскоўскі", "Бельвю", "Нямецкі", "Англійскі"; на Мураўёва – "Вікторыя", "Нью-Ёрскі"; на Купецкай – "Ковенскі", "Французскі", "Варшаўскі", "Цэнтральны", "Венскі", "Паўночны", "Брыстоль"; на Мяшчанскай – "Гамбургскі"; на Маставой – "Дзінабургскі", "Палячыка", "Купецкі"; на Ласаснянскай – "Надежда"; на Аляксандраўскай – "Сувалкаўскі" і "Варшаўскі" (пераехаў з Купецкай?).

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 297–299; Иващенко Н.А., Повседневная жизнь губернского города Гродно (XIX – начало XX века). – Гродно: ЮрСаПринт, 2019. – С. 226–229; Павач. А. Шпацыр па Гародні. Шляхаводнік. – Вільня: ЕГУ, 2018. – С. 25, 31; Саяпин В. История Гродненских площадей. – Гродна: ЮрСаПринт, 2011. – С. 22; Саяпин В. Пешком по Ожешко и Советской/ Виктор Саяпин. – Гродно: ООО "ЮрСаПринт" 2011. – С. 73–82; Чарнякевіч А. Гародня: другая сталіца БНР // Шляхамі БНР. Да 100-годдзя абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 29–41.

Гафмайстар (Гофмэйстэр) Апалон Паўлавіч (1825, Брэст, па інш. звестках Шастакова – 1.07.1890, Кракаў) – памешчык Брэсцкага ўезда маёнтка Шастакова. Пасля атрымання хатняй адукацыі вучыўся ў Варшаўскай гімназіі

і Берлінскім універсітэце. Адстаўны афіцэр, удзельнік так званай "справы Рэра" у 1846 г., калі замежныя эмісары спрабавалі арганізаваць новае паўстанне на тэрыторыі Беларусі. Сасланы на 7 гадоў у арыштанцкія роты Орскай крэпасці ў Арэнбургскай губ. Вярнуўся дадому ў 1857, пасяліўся ў маёнтку Шастакова, яшчэ да 1861 вызваліў сваіх сялян ад прыгоннага права. У лютым 1863 з сямействам выехаў у Брэст-Літоўск. Ізноў уключыўся ў рэвалюцыйную дзейнасць. У красавіку 1863 сустрэўся ў Брэсце з камісарам Народнага ўрада Чарноцкім (*В.-К. Каліноўскім*), пасля чаго стаў гродзенскім ваяводам, адказным за Брэсцкі, Кобрынскі і Пружанскі пав. Праз некалькі дзён сустракаўся ў Беластоку з Каліноўскім, *Урублеўскім,* Духінскім. Затым паехаў у Гродна да *Э. Заблоцкага*, якому адвёз пячатку з надпісам "Начальнік Гродзенскага ваяводства". Недзе ад жніўня 1863 (у гэты час вярнуўся на жыхарства ў маёнтак) – ваявода 4 паветаў паўднёвай часткі Гродзенскага ваяводства (да названых трох дадаўся Бельскі павет). Дваровыя людзі на допытах сведчылі, што часта выязджаў у Брэст, а да яго ў Шастакова прыязджаў Швыкоўскі. Да следства прыцягвалі і жонку Гелену (Алаізу). У лютым 1864 г. узяў пашпарт на выезд у Маскву для вырашэння сямейных спраў адносна раздзелу маёмасці пасля памерлай швагеркі. Праездам быў у Пецярбургу, што засведчыў на следстве У.-І. Л. Пасяніцкі. У красавіку 1864 г. быў арыштаваны ў Старой Русе Наўгародскай губ., спачатку даваў паказанні ў 1-й Гродзенскай следчай камісіі, а ў ліпені – у Віленскай камісіі. У лістападзе 1864 г. перададзены ваенна-палявому суду, які прыгаварыў яго да расстрэлу. Маёнтак быў канфіскаваны (514 дзесяцін ворнай зямлі, млын, карчма). Смяротнае пакаранне замянілі ссылкай на катаргу ва Усоль. У 1868 г. паводле царскага маніфесту накіраваны на пасяленне ў Іркуцк. Займаўся тут навучаннем музыкі. Дзякуючы намаганням нейкага замежніка атрымаў эміграцыйны пашпарт без права вяртання ў Расію. Прыкладна ў 1873 г. пасяліўся ў Галіцыі – спачатку ў Бродах, затым у Кракаве, дзе і памёр.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10 адв.–11, 49 адв.; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 19, 25–26; с. 40 а, а. 48–76, 80, 96 адв.; с. 21, а. 29; ф. 23, воп. 1, с. 372; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 1320, ч. 2, а. 44, 52, 54, 55, 155–156, 306 адв.; Госцеў А.П., Швед В.В. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990 гг.). – Гродна: ГАА БФК, 1993. – С. 151.

Гай Гая Дзмітрыевіч, сапр. Бжышкянц Гайк (18.02.1887, Тэбрыз, Іран – 11.12.1937) – савецкі вайсковец. Нарадзіўся ў сям'і настаўніка. Пасля пераезду ў Тыфліс уступіў у армянскую сацыялістычную партыю (1903). Актыўны карэспандэнт сацыял-дэмакратычнага друку (1905–1907). У гады *вайны Першай сусветнай* быў на турэцкім фронце, дзе тройчы ўзнагароджаны Георгіеўскім крыжам, атрымаў чын афіцэра. Лютаўскую рэвалюцыю сустрэў у Маскве і актыўна ўключыўся ў рэвалюцыйную барацьбу. У 1918 г. уступіў у камуністычную партыю. Ваяваў супраць белачэхаў, праславіўся рэйдам (150 вёрст) па тылах праціўніка так званай "Сімбірскай жалезнай дывізіі". Восенню 1918 дывізія Гая вызваліла Сімбірск. Са снежня 1918 Гай – камандуючы 1-й арміяй Усходняга фронту (вызваленне Бугуруслана, Бузулука, Арэнбурга, Уфы, Орска).

Затым служыў на Паўднёвым фронце, камандаваў 42-й стралковай і 1-й каўказскай кавалерыйскай дывізіямі супраць дзянікінскіх войск. Вясной 1920 – на Заходнім фронце. Па заданні камандуючага фронтам М. М. Тухачэўскага за некалькі дзён пад Полацкам сфармаваў з частак 10-й і 15-й кавалерыйскіх дывізій 3 конны корпус. Менавіта з ім ён увайшоў у Гродна 19 ліпеня 1920 г. пасля баёў з гродзенскім гарнізонам і гарадскім апалчэннем. Калі 25 верасня Гродна заняло польскае войска, корпус Гая быў інтэрнаваны. Пасля грамадзянскай вайны Г. быў народным камісарам па вайсковых і марскіх справах Арменіі. Скончыў вайсковую акадэмію імя М. В. Фрунзэ (1927), ад'юнктуру. Стаўшы прафесарам (1933), кіраваў кафедрай гісторыі войнаў і вайсковага мастацтва ў ваенна-паветранай акадэміі імя М. Жукоўскага. Сябра ЦВК БССР (1924–25). Аўтар навуковых прац і нарысаў па гісторыі грамадзянскай вайны. Узнагароджаны чатырма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ганаровай залатой зброяй, імянным залатым гадзіннікам, ганаровым знакам ЦВК Армянскай ССР. У 1937 г. расстраляны. Імем Г. названая вуліца ў Гродне.

Літ.: Гродно. Энциклопедический справочник. – Минск: Бел. Сов. Эн., 1989. – С. 130.

Гедройц Казімір (22.05.1877, Гродна – ?) – прысяжны адвакат акруговага суда ў Гродне (1906–1917). Вучыўся ў гродзенскай гімназіі (скончыў у 1896), на юрыдычным факультэце Маскоўскага ўніверсітэта (1901). З 1906 стаў працаваць у Гродне. Сябраваў з *Э. Ажэшкай*. Радны гродзенскай *гарадской рады*. Віцэ-старшыня праўлення Польскага дабрачыннага таварыства ў Гродне. Старшыня выканкама Камітэта па будаўніцтве помніка Э. Ажэшцы. Сябра розных таварыстваў, арганізацый, камісій і камітэтаў: Польскай рады асветы, рэвізійнай камісіі "Музы", таварыстваў сяброў навук, прыхільнікаў горада Гродна, народных дамоў, арганізацыйнага камітэта па святкаванні стагоддзя паўстання 1830 г., праўлення Таварыства Гродзенскага аддзялення польскага гістарычнага. Магчыма пераехаў у Лодзь пасля *вайны Другой сусветнай*.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 81.

Гельгор/Гельгар Лейба/Лейзер Мееравіч (1878 – ?) – адзін з самых вядомых гродзенскіх фотамайстраў пач. XX ст. Сапраўдны чалец рускага фатаграфічнага таварыства ў Маскве. Сын М. К. Гельгара, былога землямера, які набыў фотамайстэрню ад Х. М. Бінкавіча 12.10.1896 на вул. Саборнай (цяпер Савецкая) і паспяхова працаваў да 1901 г. З гэтага года там стаў працаваць Г. Выявы Гродна, сфатаграфаваныя ім, можна пабачыць на паштоўках першай траціны XX ст. і ў публікацыях *Ядкоўскага Ю.* У Г. фатаграфаваліся *Верас З.* (адна і з сынам), *Гарадзенскі гурток беларускай моладзі*. Спецыялізаваўся Г. на "павелічэнні здымкаў да натуральных памераў, брошках, бірулька з выяваю жаданай асобы". Меў розныя ўзнагароды: Вялікі залаты медаль на выставе ў Брусэлі (1905), срэбныя медалі на Станіславаўскай стужцы (1908,

1911), ліст падзякі на Дзвінскай выставе (1903), падарункі ад цара Мікалая II і вялікага князя Дзмітрыя Паўлавіча (персцень і запінкі, 1912), падзяка ад прэзідэнта II Рэчы Паспалітай Ігнацыя Масціцкага (фатаграфаваў яго ў Гродне, 1923). У 1915 артыстычную фатаграфію меў яшчэ ў Скідзелі, па вул. Кутузаўскай, 10. З 1932 быў сябрам праўлення Гродзенскай яўрэйскай абшчыны. У 1934 выехаў у Палесціну і ў г. Рамат-Ган адчыніў фотаатэлье "Гельгор". Фатаграфаваў эмігрантаў з Еўропы ў Палесціну, алімпіяду 1936 г. у Берліне. У Тэль-Авіве жыве ўнук Г. (яму 92 гады) і дачка Ніна.

Літ.: Варашыльскі Ф., Гельгор Лейба (Лейзер) // Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 81–82; Верас З. Я помню ўсё. Успаміны, лісты/ уклад. М. Скобла. – Гародня, Вроцлаў, 2013, с. 386; Госцеў А., Швед В., Кронан. Летапіс горада на Нёмане. – Гродна, 1993. – С. 146; Соболевская О., Гончаров В., Евреи Гродненщины. Жизнь до Катастрофы. – Донецк: НОРД-ПРЕСС. – С. 123; Тэкст Ф. Варашыльскага ў ФБ за 14.04.2021.

Генеральныя планы горадабудавання. У 1944 г. была складзеная схема 1-га генеральнага плана Гродна (аўтар *Р. А. Румянцаў*), а 5 красавіка 1949 зацверджаны першы генеральны план развіцця горада. 21 лютага 1951 былі зацверджаныя праўкі ў першы генеральны план Гродна. Грамадска-палітычным цэнтрам горада становіцца Савецкая плошча. 15 мая 1957 зацверджаныя чарговыя папраўкі ў генеральны план Гродна 1949 г. У 1962 распрацоўваецца новы генплан г. Гродна, а 3.05.1963 ён быў зацвержаны. Адкарэктаваны ў 1966 г. 9 сакавіка 1973 г. СМ БССР зацвердзіў трэці генеральны план Гродна. У 1986 была падрыхтаваная "Карэктура генеральнага плана горада Гродна" (фактычна чацвёрты генплан).

Геніюш Ігнат Ігнатавіч – паўстанец 1863 г., меў 43 гады**,** чыноўнік Гродзенскай *казённай палаты*, калежскі асэсар. Жыў на кватэры ў доме Арона Пундзіка. Са студзеня 1863 г. быў перапісчыкам рэвалюцыйных папер і загадваў карэспандэнцыяй пры ваяводскіх Э. Заблоцкім і С. Сільвестровічы (начальнік ваяводскага бюро). На гэтую пасаду яго прызначылі Сангін і *В.-К. Каліноўскі* ў заезным доме каля кляштара на вул. Маставой у Гродне. Напісаў дзве ўлёткі да падпарадкаваных ваяводству валасцей аб неабходнасці выкарыстаць усе сродкі, каб выканаць распараджэнні віленскага Камітэта. Арыштаваны 29 сакавіка і ў красавіку 1864 г. высланы да віленскага каменданта. Прыгавораны ваенным судом да высылкі ў Сібір на катаржныя працы на заводах на 6 год, з пазбаўленнем дваранскіх прывілеяў і правоў.

Крын.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10 адв.–11, 48 адв., 56, 122; с. 1, а. 48 адв., 52, 100–104, 361 адв.; с. 4, а. 22–23; Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017.

С. 841

Герб Гродна. У 1540 г. польская каралева і вялікая княгіня літоўская *Бона Сфорца* надала *Горадні прывілей*, згодна з якім гарадзенскаму *войту* з лаўнікамі

надавалася права мець асобную *пячатку,* "як гэта прынята ў горадзе Любліне". У той час на пячатцы гэтага польскага горада была выява казла, які абгрызаў вінаград, а на ваяводскай пячатцы – выява белага аленя з каралеўскай каронай на шыі. У 1541 Бона новым прывілеем нагадала кіраўніцтву Горадні аб неабходнасці завесці новую пячатку. Падкрэслім, што каралева пісала ў прывілеі пра новую пячатку – значыць горад ужо меў нейкі герб? Які ж? Польскі гісторык *Яджоўскі Ю.* лічыў, што першым гербам Горадні магла быць пячатка вялікага князя літоўскага *Вітаўта* з выявай "Пагоні". Першыя з вядомых гарадзенскіх пячатак (яны датаваныя 1540 і 1565 гадамі) былі, відаць, зробленыя ў Любліне. На іх была выява залатога аленя з залатым крыжам паміж рагамі. Алень пераскокваў праз агароджу. На пячатцы быў надпіс "Sigillum consulum civitates Grodnensis" (пячатка савета гарадскога Гарадзенскага).

Як бачым, у Гарадзенскім гарадскім гербе, як і ў Люблінскім (ваяводскім), намаляваны алень, аднак гэта няпроста перанос выявы з чужога герба на свой асабісты. З'яўленне ў гербе Горадні аленя, які пераскоквае праз агароджу, было звязанае з адным з асноўных заняткаў гараджан – паляваннем. Сярод паляўнічых трафеяў асноўнае месца займалі алені. Сярод беларускіх гарадоў гэта характэрна толькі для Горадні. Косці высакароднага аленя складаюць 25% знойдзеных падчас археалагічных раскопак касцей дзікіх жывёлаў. Агароджа на гербе з'явілася таксама нездарма. Паляўнічыя будавалі падобныя збудаванні для таго, каб перагарадзіць зверу дарогу. Побач капалі лоўчыя ямы і рабілі засады. Алень, які пераскокваў праз агароджу, станавіўся недасягальным для паляўнічых, вольным. Відаць, узяўшы яго выяву ў свой герб, гарадзенцы хацелі тым самым падкрэсліць свой вольналюбівы характар. Бо алень – гэта і сімвал ваяра, перад якім бяжыць вораг. Алень – любімы персанаж і вобраз баек, паданняў, легенд, калядных і вясельных песень. Яго называлі цудоўным і дзівосным зверам, турам-аленем. У язычніцкай, а затым і ў хрысціянскай веры алень лічыўся сімвалам Сонца, выратавальніка, апосталаў або святых. У 41 псалме алень сімвалізуе душу. Сімвал аленя з крыжам паміж рагамі атрымаў шырокае распаўсюджанне ў жыціях святых. Алень у гербе Горадні звязаны з імем святога *Губерта* і мае паміж рагамі залаты крыж – сімвал ісціны, веры, чысціні думак, мудрасці і ўрадлівасці. Залаты колер сімвалізуе багацце, справядлівасць, вялікадушнасць. Блакітны шчыт – сімвал прыгажосці, велічы, мяккасці. Спалучэнне залатога і блакітнага колераў павінна было яшчэ больш падкрэсліць, што горад будзе квітнець "на славу і каб дагадзіць богу".

Даследчык С. Расадзін крытыкуе абумоўленасць аленя на гербе Горадні гаспадарчымі матывамі і тлумачыць, што кампазіцыя герба адлюстроўвае наступны факт: "зверху – сімвал перамогі хрысціянства (крыж), унізе – былы татэмны звер (алень)". Апошні "не пераскоквае, а ляціць" і не над агароджай, а над "гораднёю", якая сімвалізуе і літаральна называе імя горада "*Горадзен*".

Гарадскія *пячаткі* зафіксавалі розныя выявы герба. На пячатках з датамі "1540" і "1565" (знойдзеных адпаведна паводле дакументаў за 1633 і 1575 гады)

адлюстраваны алень з крыжам паміж рагамі, які пераскоквае праз агароджу. На пячатцы "1640" (па дакуменце за 1652 г.) агароджы няма. Можа гэта было звязана з выкарыстаннем на паляванні агнястрэльнай зброі? Паводле дакументаў за 1718 і 1784 гады на гербе паміж рагоў няма крыжа, а замест агароджы – контуры трох узгоркаў. Магчыма, яны ўказвалі на месцазнаходжанне *Горадні* на трох узвышшах (там, дзе знаходзяцца *царква Барыса і Глеба на Каложы*, *Стары замак*, *касцёл Бернардзінскі*). На пячатцы з датай "1540", якая выяўленая на дакументах за 1772–1791 гг., выкананы алень з крыжам, які пераскоквае праз агароджу на фоне трох кустоў. Герб Горадні з выявай аленя праіснаваў больш за 250 гадоў. У 1801 г. ён спалучаўся з двухгаловым арлом, на грудзях якога быў шчыт з "Пагоняй", а па баках скіпетр і дзяржава. З утварэннем Гродзенскай губ. горад страціў свой герб, хаця паводле "Даравальнай граматы гарадам" Кацярыны II мог яго мець.

У 1930 польскае Міністэрства па справах рэлігіі і публічнай асветы пачало змены ў пячатках мясцовай улады: яны павінныя былі ўтварацца з элементаў дзяржавы, ваяводскага герба і надпісу назвы ўстановы. Некаторым гарадам пакінулі свой гістарычны герб. *Магістрат* Гродна таксама дамогся такога права і на сваіх паседжаннях абмяркоўваў выгляд і форму герба адпаведна да прапановаў Міністэрства. У камісію магістрата пад кіраўніцтвам Эдмунда Кунды ўвайшлі: Адольф Панчакевіч, Вікторыя Чапавувна, Абрам Любіч, Лазар *Мейлаховіч*, Эдвард *Стэмпнеўскі*, Канстанцін Тэрлікоўскі. Былі заслуханыя погляды такіх асоб, як: архівіст *Студніцкая Я.,* гісторык і археолаг *Ядкоўскі Ю.*, архітэктар П. Казінскі, дырэктар бібліятэкі публічнай Т. Янкоўскі, прафесар Палітэхнікі Варшаўскай Я. Вайцехоўскі. 24.05.1938 МУС Рэчы Паспалітай зацвердзіла герб Гродна, распрацаваны спецыяльнай камісіяй *гарадской Рады*: у чырвоным полі шчыта выява аленя з крыжам паміж рагамі, які пераскоквае у правы бок агароджы, каля якой вырастаюць з муравы тры кусты. Алень, крыж, агароджа – залатыя, мурава і кусты – зялёныя. Над шчытом – залатая каралеўская карона. У 1939 г. герб зноў знік амаль на паўстагоддзя.

У 1987 г. выканкам Гродзенскага гарсавета народных дэпутатаў аб'явіў конкурс на распрацоўку герба горада. 15 чэрвеня 1988 ён быў зацверджаны рашэннем *гарадскога выканкама*: "Герб г. Гродна мае форму выразнога раннегеральдычнага шчыта; фон шчыта выкананы ў выглядзе сцяга Беларускай ССР (...) на фоне намаляваны залаты алень, які пераскоквае праз агароджу; шчыт абведзены залатой паласой". Такім чынам герб XVI ст. быў падноўлены: не стала залатога крыжа, а заззяла чырвоная зорка, колер шчыта з блакітнага пераўтварыўся ў чырвона-зялёны. І толькі трэцяя сесія Гродзенскага гарсавета рашэннем № 41 ад 1.10.1990 аднавіла першапачатковы выгляд герба XVI ст. Ён унесены ў Гербавы матрыкул РБ 15.07.1994 пад № 3.

Крын. і літ.: ДАГВ, ф. 46, воп. 1, с. 285, а. 100, 104; Пазьнякоў В. Вось сымбаль твой // Наша ніва.- 1998. – 6.06. = С. С. 8; Расадзін С. Пра сімволіку герба г. Гродна// Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 3. – 2002. – С. 142–146; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 219; Цітоў А.К. Пячаткі старажытнай Беларусі: нарысы сфрагістыкі / А.К. Цітоў.

– Мінск: Полымя, 1993; Цітоў А.К. Сфрагістыка і геральдыка Беларусі / А.К. Цітоў. – Мінск: РІВШ БДУ, 1999.

Гертман Пётр – купец, прадстаўнік уладнай гарадзенскай эліты. Лаўнік (1782, 1783), сябра рады (1787, 1789, 1791), бурмістр (1786, 1789, 1790). Гандляваў у 1790-х гадах віном, гарэлкай, мёдам, рыбай, кавай, воцатам, цукрам.

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 360.

Герута Вітольд, мянушка "Мефіста" (1.10.1912, Харбін – 1973, Канстанцінаў каля Варшавы) – гродзенскі алімпіец 1948 па шматбор'і, заснавальнік гродзенскага баскетбола. У Гродна прыехаў з бацькамі ў 1918 г. У 1931 скончыў гімназію імя Міцкевіча, у 1934 – школу малодшых афіцэраў 76 пях. палка, у 1938 – юрфак Варшаўскага ўніверсітэта (магістр права і эканаміст). У 1930–34 быў у гродзенскім спартовым клубе "КС Крэсовія", у 1935 – у клубе "АЗС Вільна", у 1936 – у клубе "Варшавянка". Удзельнічаў у розных міжнародных спаборніцтвах у 1936–1939. У складзе зборнай Польшчы стаў срэбным медалістам чэмпіянату Еўропы (1938). Г. з'яўляецца 17-разовым чэмпіёнам Польшчы: у скачках у вышыню (1936, 1939, 1945), штурханні ядра (1936–38, 1945, 1946), кіданні дыска (1936, 1937, 1945, 1946), кіданні кап'я (1938, 1946–48), дзесяцібор'і (1937). У 1938 Г. быў названы лепшым лёгкаатлетам Польшчы. Удзельнічаў у Варшаўскім паўстанні падчас нямецкай акупацыі. Удзельнік Алімпійскіх гульняў 1948 г. У 1949 Г. скончыў сваю спартовую кар'еру і пачаў актыўную дзейнасць у польскіх і міжнародных лёгкаатлетычных арганізацыях: віцэ-прэзідэнт Польскага лёгкаатлетычнага саюза, сябра тэхнічнай камісіі і еўрапейскага Камітэта IAFF, сябра Савета EAA.

Літ.: Саяпин В. Гродненский спорт: история и достижения. 1919–1939 годы. Гродна: ЮрСаПринт, 2015. – С. 8–10, 177–178.; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей ЮрСаПрынт, 2015. – С. 83.

Гестапа, з верасня 1941 знаходзілася ў Гродне на вул. Гувера, 10 (сёння Тэльмана, 10). Пад кіраўніцтвам Гайнца Эрэліса тут працавалі начальнікі гродзенскіх *гета* К. Візэ і Ота Стрэблаў.

Літ.: Баціс М., Буцько У., Крапівіна Н. і інш. Гародня: сляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні // ARCHE. – 2010. – № 6. – С. 410–412.

Гета. 1 лістапада 1941 г. акупацыйныя ўлады абвясцілі пра стварэнне ў Гродне двух гета. 2 лістапада ўсе *яўрэі* былі забавязаныя з 12.00 да 18.00 перасяліцца ў гета. Над гэтым назірала 3-я рота 13 рэзервовага паліцэйскага батальёна. У гета № 1 пасялілася каля 15 тыс. чал. (так званых "спецыялістаў": рабочых лёгкай прамысловасці, рамеснікаў); у № 2 – каля 10 тыс. чал. ("неспецыялістаў": адвакаты, настаўнікі і іх сем'і). Тэрыторыя гета № 1 уключала падворак *сінагогі вялікай*, вуліцу Віленскую з аднаго боку і паўночную частку вуліцы Замкавай (пераназванай у вуліцу Бурга) з другога боку (цяпер раён

вуліц Замкавая, Траецкая, Віленская, Савецкая). Начальнікам гета быў Курт Візэ. Тэрыторыя гета № 2 была створаная ў прыгарадзе Слабодка, за чыгуначнымі шляхамі, справа ад дарогі, што вяла на вул. Скідзельскую, насупраць рынкавай плошчы і раёна баракаў (цяпер раён, абмежаваны вуліцамі Лідская, Белуша, Антонава і праспектам Касманаўтаў). Начальнікам быў Ота Стрэблаў. У гета № 1 дзейнічаў *юдэнрат*, а ў гета № 2 – яго філіял. Гэтая яўрэйская рада павінная была выконваць загады нямецкай цывільнай адміністрацыі.

Жыхары гета мусілі працаваць у мясцовых дубільнях на апрацоўцы скур, рабілі валёнкі, шылі вопратку і ўніформу, выраблялі цыгарэты на былой фабрыцы Шарашэўскага, апрацоўвалі драўніну. Службоўцы нямецкай адміністрацыі хадзілі ў гета лячыць зубы, рамантаваць вопратку ці абутак, хатнія рэчы, набывалі каштоўнасці, якія яўрэі змаглі пранесці ў гета. 2 лістапада 1942 г. улада ў гета была перададзеная начальніку СД (службы бяспекі СС). Гродзенскія гета былі поўнасцю ізаляваныя, і працоўныя калоны не маглі ўжо іх пакідаць.

Жыхары гета спрабавалі наладзіць супраціў. У студзені 1942 у гета №1 была створаная падпольная антыфашысцкая група (да лютага 1943), у склад якой уваходзілі камуністы Л. Ліпскі, І. Рэйзнер, І. Хмельнік, камсамольцы К. Любіч, А. Руд, Е. Чапнік і інш. Яны слухалі зводкі Савінфармбюро, пісалі лістоўкі і распаўсюджвалі іх. Таксама рыхтавалі фальшывыя дакументы для выйсця з гета, збіралі зброю, боепрыпасы, мапы. У гетах дзейнічалі моладзевыя палітычныя арганізацыі "Дрор", "Ха-Шомэр ха-Цаір", "Ха-Халуц ха-Цаір". Першая з названых налічвала каля 70 сябраў, мела маленькі кібуц. Другая складалася з 4 груп па 20–35 дзяцей ва ўзросце да 12 год. Іх хацелі адцягнуць ад вуліцы, навучалі яўрэйскім святам, апавядалі пра "Эрэц Ісраэль". У сярэдзіне 1942 г. моладзевыя арганізацыя аб'ядналіся для сумеснай барацьбы. Зрабілі спробу далучыцца да партызанаў, але 3 з 4 груп загінулі, а адна вярнулася назад. Пазней, не маючы зброі, моладзь адмовілася ад планаванага паўстання ў гета, урэшце паасобку альбо з сем'ямі спрабавалі збегчы з гета ў лясы ці ў напрамку Беластока.

На пачатку лістапада 1941 г. на балконе сядзібы юдэнрата за самавольны выхад з гета былі павешаныя дачка краўца Лена Прэнская, бежанец з Варшавы Друкер і гаспадар дома, дзе жыла Прэнская, Моўша Шпіндлер, які не данёс на сваю жыхарку. Увесь час расстрэльвалі альбо адпраўлялі ў канцлагер за спробу пранесці кантрабандна ў гета прадукты харчавання. Раніцай у гета № 2 каля брамы былі затрыманыя рабочыя, па іх пачалі страляць каменданты гета Курт Візэ і Ота Стрэблаў. У выніку 12 яўрэяў былі забітыя, а 40 параненыя. 9 лістапада з гета № 2 перасялілі ў гета № 1 каля 4 тыс. кваліфікаваных работнікаў (па іншых дадзеных каля 1 тыс.) з сем'ямі. З 14 па 22.11.1942 адбыліся дэпартацыі яўрэяў з гета № 2 (каля 1 тыс. чал.). У грузавых і пасажырскіх вагонах іх дастаўлялі ў Асвенцім/Аўшвіц. Перш чым адправіць у газавыя камеры, іх прымусілі напісаць на паштоўках для сваіх сваякоў наступны тэкст: "Абыходзяцца з намі добра, мы працуем, і ўсё выдатна". 21 лістапада вывезлі ў Асвенцім і Трэблінку астатніх яўрэяў з гета № 2 (сярод іх былі яўрэйскія

паліцыянты і чальцы юдэнрата на чале са старшынёй) – звыш 2 тыс. чал. Яны прыехалі ў Асвенцім 25 лістапада.

У канцы лістапада ў Каўбасінскі перасыльны лагер/шталаг двума эшалонамі былі адпраўленыя з гета № 1 каля 4 тыс. чал. Адсюль іх пазней пераправілі ў Аўшвіц і Трэблінку. З 9 лістапада па 20 снежня 1942 з Калбасіна ў лагер знішчэння Трэблінка выехалі чатыры цягнікі. Туды яны прыбывалі 9 і 14 лістапада, 2 і 8 снежня 1942 г. 20–24 студзеня 1943 г. кожны дзень адпраўляўся эшалон з тых яўрэяў, хто заставаўся ў гета № 1. Дэпартавалі адразу ў Аўшвіц і Трэблінку – агулам 11 650 чал. (з іх адабраныя на працы 1799 чал., а астатнія забітыя). 13–15 лютага 1943 г. фашысты правялі акцыю адпраўкі ў Трэблінку жыхароў гета № 1 – каля 4 тыс. чал. (з іх каля 150 адабраныя на прымусовыя працы) двума эшалонамі. 11 сакавіка з гета № 1 вывезлі апошніх яўрэяў (1148 чал.) у беластоцкае гета. 13 сакавіка 1943 г. на гродзенскіх вуліцах былі вывешаныя аб'явы пра тое, што Гродна – горад, вольны ад яўрэяў. За час ліквідацыі гродзенскіх гета загінула болей 40 тыс. яўрэяў з Гродна і яго ваколіц (Азёраў, Астрыны, Галынкі, Друскенікаў, Індуры, Каменкі, Лунны, Парэчча, Сабачынцаў, Саколкі, Скідзеля).

У 1966–1967 у Беластоку адбыўся судовы працэс над кіраўнікамі гета Візэ і Стрэблаў, камендантам шталага Калбасіна Рынцлерам, кіраўнікамі гестапа Г. Эрэлісам і Э. Шота, чыноўнікамі нямецкай адміністрацыі ў Гродне. Менавіта названыя асобы ўспрымаліся яўрэйскімі сведкамі як асабліва небяспечныя.

На месцы гета ксёндз Тытус Стшэлевіч знайшоў дзённік з прымацаваным да яго чорным алоўкам. Запісы вяліся па-польску з 12.02 па 8.04.1943 мужчынам каля 40 гадоў. Ён меў жонку Фелю, дачку Тосю (яе забілі), сына Генека. У 2011 дзённік выдаў ксёндз Юзаф Макарчык на мове арыгінала, а таксама на беларускай, рускай і англійскай. Арыгінал дзённіка захоўваецца ў Ватыкане.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 217–232, 239, 247–248; Гародня X-XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2014, с. 395–408; Колоцей М.Я. Антифашистское подполье в Гродненском гетто // 60-летие образования Гродненской области. – Гродно: ГрГУ, 2004. – С. 151–155; Колоцей М.Я. Борьба узников гродненского гетто // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 504–507; Нямецкая акупацыя і лёс яўрэяў Гродна // Arche. – 2010. – № 1–2. – С. 385–457; https://prozhito.org/person/5955. Выхад 06.01.2022.

Гіблер Ян Дамінік (?–1825) – спявак, якога *Тызенгаўз Антоні* каля 1772 г. запрасіў да сябе з беластоцкага тэатра І. Браніцкай. Жыў у доме падараваным каралём і апошнія гады быў бургграбам гарадзенскага замка.

Літ.: Dąbrowski S., Dwieście lat teatru w Białymstoku…, Białystok 1979, s. 129.

Гібулічы – сяло, якое ў сярэднявеччы належала *Горадні*. Паводле *валочнай памеры 1558–61 гг.*, рэвізіяў 1650 і 1680, інвентарызацыі 1708 мела 24 валокі.

Літ.: Сліж Н.І. Падаткі і іх збор у Гародні XVI- XVII стст. // Białoruskie zeszyty historyczne. – 2022. – n. 35. – S. 12–14.



С. 842

Гімназіі Гродна, існавалі ў расійскі і польскі перыяд гісторыі Гродна.

Беларуская існавала з лета 1920 па красавік 1921 г. Мела 2 асноўныя і 2 падрыхтоўчыя класы, пяць настаўнікаў і больш за сто вучняў. Узначальвала гімназію Мараўская, настаўнікамі працавалі *С. Баран*, Алеся Смоліч (беларуская мова і літаратура), С. Рак-Міхайлоўскі (матэматыка). Для прыезджых быў інтэрнат ("бурса"). Ён знаходзіўся на вул. Ерусалімскай, 20, кв. 2. Ахвочыя там пасяліцца павінныя былі мець з сабой: жытняй мукі – 40 фунтаў, ячменнай – 10, круп – 10, сала – 2, бульбы – 80, кіслай капусты – 40, буракоў – 20, солі – 1; пілаваных дроў – 1 воз. Таксама трэба было мець свой ложак, посцілкі, навалачкі, коўдру, 2 змены бялізны, міску, лыжку і кубак. На адкрыццё Г. прыязджалі Іваноўскі В., *Тарашкевіч Б.*

Дамініканская 4-класная гімназія знаходзілася па вул. Дамініканскай/Савецкай, 6. Утвораная на базе дамініканскай школы ў 1825 г. Пры ёй была 3-класная павятовая школа. Узмоцнена вучылі лацінскую і грэчаскую мовы, але вывучалі і рускую. Для гэтага быў настаўнік рускай мовы і праваслаўны святар. За ўдзел у паўстанні 1830–31 гг. гімназія і школа былі зачыненыя, але ў 1831 яны зноў пачалі працу. У 1832 пры 14 настаўніках вучылася ў гімназіі 79 вучняў, у школе – 155. Пры гімназіі былі багатая бібліятэка (у яе складзе былі старадрукі з зачыненых касцёлаў гродзенскіх дамінікан і шчучынскіх піяраў, архіў Упраўлення Новай Усходняй Прусіі ў Беластоку за 1795–1807), калекцыя мінералаў і хімічная лабараторыя. Прэфектам школы быў *Зялёнка К.* За актыўны ўдзел вучняў у антыдзяржаўных выступленнях літоўскі генерал-губернатар Далгарукі загадаў зліквідаваць *кляштар дамініканцаў* і існыя пры ім навучальныя ўстановы.

Дзяржаўная мужчынская гімназія імя А. Міцкевіча, створаная як школа, працавала паводле праграмы гімназіі. Афіцыйна адкрытая 18.01.1916. Ініцыятарамі стварэння школы былі кс. прэфект *Ф. Грынкевіч* (першы дырэктар), Я. Манкелевіч, *А. Гальская*, Г. Кулікоўская, Г. Аўгусевіч, В. Лабан. Да чэрвеня 1917 давялося працаваць паводле польскай праграмы гімназіі канспірацыйна, бо нямецкая ўлада патрабавала дзейнічаць паводле сваёй праграмы "Mittelschule". На першы навучальны год паступіла 120 хлопцаў, якіх размеркавалі адпаведна да праграмы гімназіі ва ўступны, 1 і 2 класы. Настаўнікамі сталі: Грынкевіч, Л. Бартноўская, М. Сасулевіч, М. Гасперскі, В. Крэўскі. З 1918/1919 навучальнага года апякуецца гімназіяй *Польская Мацеж Школьная*. У гэтым годзе вучыцца ўжо 200 вучняў. Паступова прыбываюць настаўнікі з карэннай Польшчы. У 1919 прыязджае ў Гродна дэлегат урада *Ю. Вазнякоўскі,* які займаецца школьнай справай. З кастрычніка 1920 гімназія робіцца дзяржаўнай. Яе месцам дзейнасці робіцца будынак былога рэальнага вучылішча цэсарэвіча Аляксея па вул. 3 Мая, 3 (цяпер корпус аграрнага ўніверсітэта па вул. 1 Мая, 3). Гарцэры гімназіі адыгралі значную ролю ў абароне Гродна падчас

вайны савецка-польскай у 1920 г. У іх гонар 11.11.1928 была адкрытая мемарыяльная дошка (на польскай мове), з наступным зместам: "1918–11.XI–1928. У 10-годдзе незалежнасці памяці вучняў: Пятра Тарасевіча + 1.09.1920, Віталіса Руткоўскага + 1.09.1920, Вітольда Гарбачэўскага +4.09.1920, забітым падчас абароны Айчыны, дошку гэтую прысвячаем. Дзяржаўная гарадская гімназія імя А. Міцкевіча ў Гродне. Dulce et decorum Est pro Patria mori".

Жаночая гімназія імя Э. Плятар знаходзілася ў будынку былой мужчынскай гімназіі па вул. Савецкай. Была адкрытая ў верасні 1919 г.

Жаночая Марыінская гімназія была адкрытая 7.01.1860, знаходзілася пад апекай расійскай імператрыцы Марыі Аляксандраўны (жонкі Аляксандра II). Была сямікласнай, дзе рыхтавалі выкладчыкаў і хатніх настаўнікаў. Мелася бібліятэка з 2 аддзелаў: фундаментальнага для настаўнікаў і вучнёўскага. Выдаваўся школьны часопіс "Подснежник". Вучылі дзяўчат расійскай мове, славеснасці, чыстапісанню, гісторыі і геаграфіі, арыфметыцы і геаметрыі, асновам педагогікі. За дадатковую аплату выкладалі нямецкую і французскую мовы, малюнак, музыку, спевы, танцы. На пач. XX ст. дадалі латынь, дамаводства, гігіену і гімнастыку. У 1870 начальнікам гімназіі быў сапраўдны стацкі дарадца, доктар філасофіі Мікалай Васільевіч Чашнікаў, а з 1871 – стацкі дарадца, кандыдат права Антон Карлавіч Гейслер. Месцазнаходжанне гімназіі было нясталым. Першыя дзесяць гадоў дзейнічала Г. у *доме масонаў* на завул. Тэлеграфным, 15. У 1870–75 знаходзілася ў доме архіварыуса *палаты казённай* Мірановіча на вул. Тэлеграфнай. Наступныя 10 гадоў праца Г. адбывалася ў флігелі *кляштара дамініканскага* па вул. Саборнай/Савецкай, 8. З 1895 Г. пераехала ў новы будынак на вул. Мураўёўскай/Ажэшкі, 22, пабудаваны паводле праекта інжынера Небальсіна (цяпер стары корпус *універсітэта Гродзенскага дзяржаўнага*). Тут вучылася дачка *П. Сталыпіна,* калі ён быў гродзенскім *губернатарам*. У 1914 Г. часова працавала ў Слоніме, а ў 1915 у сувязі з *вайной першай сусветнай* пераехала ў Калугу.

Жаночая прыватная гімназія К. М. Баркоўскай, адкрытая ў 1906 як сямікласная, з падрыхтоўчым класам і дзіцячым садком. Налічвала 311 гімназістак.

Жаночая прыватная яўрэйская гімназія Т. В. Астрагорскай і Л. С. Вальдман была створаная на базе прыватнага вучылішча (1852) як 4-кл. прагімназія, з 25.01.1907 – 7-класная гімназія. У 1914 гімназію скончылі 30 вучняў, а ў 1915 тут ужо навучаліся 330 вучняў.

Мужчынская гімназія, губернская мужчынская гімназія была адкрытая 6.04.1834 у будынку *кляштара дамініканскага* на базе былой *дамініканскай гімназіі,* з мэтай навучання мясцовай моладзі ў духу адданасці расійскай уладзе. Утрымлівалася за кошт дзяржаўнага бюджэта. Сістэма навучання стала расійскай: выкладчыкі былі расейцамі (акрамя выкладчыкаў польскай мовы як прадмета ў 1834–40 і 1857–1865), мовай выкладання была расейская, вучылі расійскую геаграфію і гісторыю, былі уведзеныя ўрокі праваслаўя. У 1835 гімназія атрымала назву губернскай і 5.03 пры ёй быў адкрыты мужчынскі шляхетны

пансіён. Пры гімназіі была бібліятэка, якая налічвала 8278 тамоў і 5038 назваў. Гімназісты прынялі актыўны ўдзел у *паўстанні 1863–64 гг.* У 1865 г. гімназія была перароблена ў класічную. Тут выкладалі: гісторыю – *Арлоўскі Я.,* маляванне, чарчэнне і чыстапісанне – мастак Зянковіч Я. Вучыліся вядомыя асобы: брат Каліноўскага К. *Каліноўскі Віктар*, гісторык Латышаў У., філосаф *Макавельскі А*., браты У*рублеўскія* (*Зыгмунт, Эдвард, Станіслаў, Вітаўт*), журналіст, філосаф і пісьменнік Саланевіч Іван, беларускі нацыянальны дзеяч *Аляксюк Павел,* польскі гісторык *Касцялкоўскі С. Ю.* і іншыя. Былы гімназіст Панкевіч М. успамінаў, што ў гімназіі на пач. XX ст. існавалі гурткі, у якіх вывучалі граматыку, літаратуру і польскую гісторыю; раз на месяц кіраўнікі сустракаліся пад кіраўніцтвам прэзідэнта (ён называе С. Грынявіцкага) і абмяркоўвалі праблемы гурткоў. У 1906–1907 гурткамі кіравала Рада з 3 чалавек (К. Міхлер, А. Садоўскі, В. Казлоўскі). Сябры гурткоў у выходныя дні выходзілі ў вакольныя лясы, дзе спявалі патрыятычныя і народныя песні; ладзілі вечарыны і танцы. У доме Матушэўскіх знаходзілася патаемная бібліятэка. У лістападзе 1905 гімназісты вырашылі паводле прыкладу віленскіх аб'явіць аднадзённую забастоўку, што і зрабілі, сабраўшыся ў актавай зале. Наступнага дня заняткі не адбыліся, але ніхто за гэта не быў пакараны. Пазней гімназісты падалі школьным уладам прашэнне аб правядзенні заняткаў па польскай мове і ўдзеле аднаго гімназіста ў паседжаннях педагагічнай рады гімназіі. Цікава, што *Ажэшка Э.* прасіла бацькоў паўплываць на дзяцей, каб рэпрэсіі не зламалі ім жыццё. Пасля свята Божага нараджэння сітуацыя супакоілася і заняткі аднавіліся. У 1912 Г. было прысвоена імя генерала А. П. Тармасава. Г. існавала да *вайны Першай сусветнай,* калі яе эвакуявалі ў г. Ліпецк Тамбоўскай губ. У міжваенны час тут знаходзіліся *жаночая гімназія імя Э. Плятар* і настаўніцкая семінарыя. У 1950-х гадах у будынку размяркоўваўся каўбасны цэх гродзенскага мясакамбіната. Пазней будынак прыстасавалі пад жылы дом.

Мужчынская гімназія *Польскай Мацежы Школьнай* імя Генрыха Сянкевіча, пачала дзейнічаць у 1925 г. па ініцыятыве Таварыства настаўнікаў сярэдніх і вышэйшых школ ды кіраўніцтва групы "Polskiej Macierzy Szkolnej". Першым дырэктарам быў настаўнік лацінскай мовы Рамуальд Пульян, пасол гродзенскай зямлі. Затым дырэктарамі былі Пётр Галфтэр, настаўнік матэматыкі Вацлаў Мысліцкі (1930–1939). У 1923–1926 гімназія месцілася ў будынку кляштара бернардзінцаў, а з 1926/27 навучальнага года – на пл. Тэатральнай, 6/*Тызенгаўза*. У 1937/1938 навучальным годдзе пры гімназіі быў адкрыты першы жаночы клас, заняткі адбываліся ў *доме Ажэшкі Э.*

Мужчынская прыватная гімназія М. С. Хныкіна была адкрытая ў 1906 як 6-класная, а з 1907 дадаўся яшчэ адзін, 7 клас. У гэтым годзе было 250 навучэнцаў. Школа была платная.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 39, воп. 1, с. 584; Памятные книги Гродненской губернии на 1870–1883 годы; Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 286–287, 289; Верас З. Я помню ўсё: успаміны, лісты. – Гародня-Wrocław: Гарадз. б-ка, 2013,

с. 258; Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада / Пад рэд. В. Швед, В. Карнялюк. – Гародня, Вроцлаў, 2012. – С. 189–191; Павач А. Sursum corda: Красная кніга / Павач Андрей Андреевіч. – Гродно: ЮрСаПрынт, 2013. – С. 95–98; Гимназия Мариинская. – Твой город Гродно. – 2020.03. – С. 22–23; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 58; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў, Мінск, 2015, с. 95; Швед В.В. Губернскі Гродна. Аповяды з гісторыі горада (канец XVIII ст. – пачатак XX ст.). – Гродна: РУПП "Баранавіцкая ўзбуйнёная друкарня", 2003. – С. 81–88; Chwalewik E. Zbiory Polskie. Archiwa, biblioteki, gabinety, galerje, muzea i inne zbiory pamiątek przeszłości w Ojczyźnie i na Obczyźnie / E. Chwalewik. T. 1. – Warszawa, Kraków: wyd-wo J. Morkowicza, 1926. – S.113; Historia Polskiej Macierzy Szkolniej w Grodnie // Słowo Ojczyste. – 2011. – Nr 4 (128). – S. 10; Pankiewicz M. Biebrza-Amazonka-Wisła. Wspomnienia lat 1877–1945. T. 1 // rękopis [w:] Ossolineum, 15612/II n10109–10112, s. 9–14, 29–31; Państwowe gimnazjum męskie im. Adama Mickiewicza w Grodnie. Drugie sprawozdanie szkolne. Za rok szkolny 1928/29. Nakład własny, 1929.

Гінтаўт-Дзевалтоўскі Аляксандр Казімір (26.02.1821, маёнтак Вайшканы Ковенскай губ. – 14.08.1889, Дудэргоф) – мітрапаліт Магілёўскі, арцыбіскуп. Вучыўся спачатку ў хаце, затым – у гімназіі г. Кейданы і духоўнай семінарыі ў Вільні (1839). Пасля 1845 служыў вікарыем у Вількаміры, выкладаў у мясцовай гімназіі, затым прыняў прыход у Янішках. У Гродне з 1855, ксёндз пабернардзінскага *касцёла*. На працягу 10 гадоў выконваў абавязкі Гродзенскага дэкана. Настаўнічаў у *гімназіі гродзенскай*, выкладаў катэхізіс для сірот і дзяцей зняволеных. Г. сабраў на сваёй кватэры ў Бернардзінскім касцёле значную калекцыю старажытнасцяў і галерэю карцін (вывезеная сваякамі, знікла недзе ў Ноўгарадзе). Падчас следства над паўстанцамі 1863–64 гг. узяў на парукі арыштаванага ксяндза *Т. Гадлеўскага*. Пасля таго, як Г. выступіў супраць ажыццяўлення над гродзенскім дэканатам рускага рытуала (трэбніка), яго перавялі з Гродна на 2 гады ў Сувалкі, дзе ён займаўся навуковай працай. Дзякуючы моцным сувязям, быў вернуты ў Гродна.

6.08.1872 прыняў з рук мітрапаліта Фіялкоўскага біскупскую мітру і выехаў у Полацк, дзе ў 1874 быў выбраны адміністратрам епархіі. Пабудаваў новы будынак гімназіі. Пасля арганізацыі ў Заходнім краі некалькі новых каталіцкіх епархій папа Леў XIII аб'явіў Г. арцыбіскупам і мітрапалітам Магілёўскім, адначасова ён стаў апостальскім адміністратарам Мінскай епархіі. Г. не падтрымаў уводзін багаслужэнняў на рускай мове і пісаў пра гэта міністру ўнутраных спраў Д. Талстому, міністру замежных спраў Гіршу. Ад мясцовых уладаў атрымоўваў нараканні, але гэта не перашкаджала яму апякаць маладое духавенства: для духоўнай акадэміі зацвердзіў новы склад, значна дапоўніў яе бібліятэку і прызначыў рэктарам энергічнага ксяндза Францыска Альбіна Сымона. Некаторыя крыніцы сцвярджаюць пра пахаванне Г. у пецярбургскім касцёле Наведвання Найсвяцейшай Дзевай Марыяй Лізаветы.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 231, а. 147; Воспоминания Ф. Рожанского "Z województwa Grodzieńskiego" // W czterdziestą rocznicę Powstania styczniowego.

1863–1903. – Lwów, 1903. – S. 396–400; П. Бобровский. Материалы для географии и статистики России. Гродненская губерния, ч. I, СПБ, 1863, с. 791: Бобровский П. Историко-статистический очерк города Гродна // Гродненщина. Часть первая. Том 1. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 62; Госцеў, А. Гінтаўт-Дзевалтоўскі Аляксандр Казімір / Алесь Госцеў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. – Мн.: БелЭн, 1996. – С. 6.

Гінцбург Ілля Якаўлевіч (27.05.1859, Гродна – 3.01.1939, Ленінград) – скульптар, партрэтыст, аўтар надмагілляў. У 1871 М. М. Антакольскі прывёз яго ў Пецярбург, дзе Г. стаў ягоным вучнем. У 1878–1886 вучыўся у Акадэміі Мастацтва, якую скончыў з залатым медалём за скульптуру "Плач Ераміі". Затым год удасканальваўся ў Парыжы і Рыме за кошт Г. О. Гінцбурга. Адзін з заснавальнікаў еўрапейскага таварыства заахвочвання мастацтваў у Петраградзе (1915–1919). Працаваў у стылі акадэмічнага натуралізма. Асноўныя працы: "Хлопчык, які збіраецца купацца" (1886), "У куце" (1901), скульптурныя партрэты Л. М. Талстога, А. Г. Рубінштэйна, Чайкоўскага, Рэпіна, Мендзялеева, барона Г. О. Гінцбурга, Л. О. Пастэрнака і інш., надмагіллі М. М. Антакольскага, В. В. Стасава (1910), помнік Д. І. Мендзялееву ў Ленінградзе (1929–32). Аўтар мемуараў аб жыцці яўрэяў у Расіі "З майго жыцця" (1908). Скульптурныя працы знаходзяцца ў Дзяржаўным Расійскім музеі, Дзяржаўным гістарычным музеі, Музеі Л. Талстога ў Маскве. *Госцеў А.* піша, што ў Г. у адносінах да Гродна "нет никакого пиетета. Более того, своим родным городом он считает Вильно. Может, это одна из основных причин того, что в городе Гродно память о выдающемся скульпторе никак не увековечена".

Літ.: Гостев А.П., Известные личности Гродно. – Гродно, 2016. – С. 140–147; Российская Еврейская Энциклопедия. Т. 1. – С. 316.

Гіргас Уладзімір Фёдаравіч (13.12.1835, Гродна – 1887, Кіеў) – усходазнавец. Скончыў 4-ю Пецярбургскую гімназію (1854) і факультэт усходніх моў Пецярбургскага ўніверсітэта (1858, са ступенню кандыдата). У Парыжы займаўся арабскай і турэцкай мовамі. Праходзіў моўную і навуковую падрыхтоўку ў Сірыі і Егіпце (1861–64). За працу "Правы хрысціян на Усходзе па мусульманскіх законах" (1865) атрымаў ступень магістра арабскай славеснасці і быў зацверджаны дацэнтам універсітэта на кафедры арабскай славеснасці. Доктар (тэма дысертацыі: "Нарыс граматычнай сістэмы арабаў") і экстраардынарны прафесар (1873). З 1878 стаў ардынарным прафесарам Пецярбургскага ўніверсітэта. Напісаў шэраг прац па арабістыцы: "Нарыс арабскай літаратуры" (1875), 2 тамы "Арабская хрэстаматыя" (1875–1878), "Слоўнік да Арабскай хрэстаматыі і Карана" (1881), паказчыкі да пяці тамоў анталогіі "Кніга песень" (1900). У 1886 паводле асабістага прашэння выйшаў у адстаўку і пераехаў у Кіеў.

Літ.: Гостев А.П., Известные личности Гродно. – Гродно, 2016. – С. 38–40; Историки Гродненщины / Сост. А. Нечухрин. – Гродно, 1989. – С. 14–15; Черепица В.Н. Звенья цепи единой: большие и малые события в истории Гродненщины XIX – XX столетий / В.Н. Черепица. – Гродно, 2009.

Главацкі Мікалай Міхайлавіч (1894, Гродна – 1941) – савецкі вайсковы кіраўнік. Удзельнік *вайны Першай сусветнай*. У 1918 уступіў у Чырвоную армію, у 1920 – у партыю бальшавікоў. Прайшоў вышэйшыя камандныя курсы "Выстрал", вучыўся ў Вайсковай акадэміі імя Фрунзэ. Служыў на розных камандных пасадах у Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі (РСЧА), дапамагаў Манголіі ствараць сваю армію. Адзначаны ўрадавымі ўзнагародамі СССР і МНР. У 1938, з'яўляючыся камандзірам 26-й стралковай дывізіі ў чыне генерал-маёра, Г. быў арыштаваны. Пасля двух гадоў зняволення выйшаў на волю. Фармаваў 118-ю стралковую дывізію, з якой сустрэў *вайну Вялікую Айчынную*, абараняючы Пскоў. За адыход арміі быў 3.08.1941 расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

Літ.: Ермоленко В. А., Черепица В.Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 333–334.

Глеб Усеваладавіч (пасля 1117, Горадзен – люты 1170?) – гарадзенскі князь. Сын *Усевалада Гарадзенскага* і *Агаф'і Уладзіміраўны*. Паводле меркавання А. В. Салаўёва, спачатку правіў у княстве з братам *Барысам Усеваладавічам* і адказваў за ўнутраную палітыку. Паводле версіі А. Кібіня, кіраваў Ваўкавыскім княствам. Быў жанаты і меў сына Юрыя. Удзельнічаў у паходзе Манамахавічаў у 1144 г. на Уладзіміра Валадар'евіча Галіцкага. Пасля смерці Барыса кіраваў разам з братам *Мсціславам Усеваладавічам*. Дапамагаў валынскаму князю Мсціславу Ізяславічу ў барацьбе за кіеўскі стол (1167, 1170).

Літ.: Госцеў А.П., Швед В.В. Шлюб князя-ізгоя, або як пачынаўся Горадзен // Гродзенская праўда. – 1991. – 1 лістапада. – С. 3; Госцеў А. Азбука гарадзенца // Rocznik Grodzieński. – Grodno: Zjednoczenie społeczne Polska macierz szkolna, 2011. – С. 181–184; А. Кібінь. Ад Ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурныя трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – № 5. – С. 133, 137.

Глінскі Давід Львовіч (1857 – ?, Пецярбург) – урач у лейб-гвардыі *Гродзенскім гусарскім палку* (1889–1892). Скончыў гродзенскую мужчынскую *гімназію* і Пецярбургскую медыцынскую акадэмію. З 1882 служыў мал. урачом у вайсковых шпіталях Елізаветграда і Херсона. У 1892 пайшоў у адстаўку, каб ажыццявіць вандроўку ў Індыю. У 1893 абараніў доктарскую дысертацыю і стаў служыць галоўным урачом Петразаводскага палка, які размяркоўваўся ў Гродне. Прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці горада: быў сябрам таварыства ўрачоў Гродзенскай губ.; чытаў лекцыі аб Індыі і санітарным стане Гродна, меў кантакты з гісторыкамі *Арлоўскім Я.*, Кропатавым Д. М. і інш., маладым этнографам і літаратарам *Богдановічам А. Е.* У 1896 у складзе адмысловага санітарнага атрада быў у Эфіопіі, дзе народ ваяваў за незалежнасць з італьянскімі каланізатарамі. Аповедамі пра гэтыя падзеі Г. падзяліўся ў кнігах "Харарэ і яго жыхары" (1897) і "Жыццё рускага санітарнага атрада ў Харарэ" (1899), выдадзеных у Гродне.

Літ.: Гусары Российской империи / сост. Минск: Букмастер, 2012. – С. 150–154.

Глінскі Міхаіл Львовіч (1470, Тураў – 24.09.1534, Масква) – князь, спадчыннік ханаў Залатой Арды, якія перасяліліся ў ВКЛ пры *Вітаўце*. 12 год пражыў за мяжой (Саксонія, Італія, Іспанія). Па вяртанні ў ВКЛ быў набліжаны да вялікага князя літоўскага Аляксандра: стаў маршалкам двара (1499); у якасці пасла ад Літвы суправаджаў яго на каранацыю ў Кракаў; атрымаў у валоданне Тураў. Літоўская эліта баялася, што пасля смерці вялікага князя Аляксандра Г. захопіць уладу ў ВКЛ у свае рукі. Перамогі яго над татарамі (у Лідзе і пад Навагрудкам у 1506) толькі узмацнілі зайдрасць і нянавісць да яго.

Пасля смерці Аляксандра маршалак вялікі літоўскі Ян Забжэзінскі/Забярэзінскі дамогся ад Жыгімонта адхілення Г. ад вялікакняскага двара, абвінаваціўшы яго ў жаданні аддзяліць праваслаўныя вобласці ВКЛ. Г. патрабаваў суда з праціўнікамі, але дарэмна. Тады ён са сваімі братамі Іванам і Васілём у Тураве сабралі родных і паплечнікаў і прызначылі Жыгімонту тэрмін для суда. Па дарозе ў Гродна Г. са сваімі сябрамі сустрэлі каханку Забжэзінскага і пад пагрозай катаваннямі прымусілі яе расказаць усё, што яна пра яго ведае. Затым змоўшчыкі, выбіўшы дзверы, уварваліся ў гарадзенскі дом Забжэзінскага (ён быў старастам Гарадзенскім). Немец Шлейніс забіў яго ў ложку, а другі саўдзельнік Турчынаў/Турчын адрэзаў Забжэзінскаму галаву. Яе потым насілі на дрэўцы па горадзе і кінулі за некалькі міль ад Гродна ў возера, якое знаходзілася па дарозе на Вільню (ці не ў Азёрах?).

2.02.1508 Г. падняў паўстанне, заключыў дамовы з пасламі маскоўскімі, малдаўскімі і крымскімі. Маскоўскія ваяводы разам з Г. асадзілі Мінск, падыйшлі да Вільні, Смаленска і Бабруйска, выслалі палкі да Воршы. Жыгімонт з літоўскімі і польскімі войскамі прымусіў зняць асаду і адступіць. Г. паехаў у Маскву шукаць падтрымкі ў вялікага князя Васіля, але той хутка заключыў мір з Жыгімонтам (8.10.1508). У выніку Г. апынуўся ў стане выгнанніка, пазбавіўся сваіх уладанняў у ВКЛ і вымушаны быў застацца на маскоўскіх землях (яму далі Малаяраславец і Бароўск). Калі ў 1514 падчас вайны княства Маскоўскага з ВКЛ Г. захапіў Смаленск і не атрымаў яго ў сваё валоданне ад Васіля, ён задумаў вярнуцца ў ВКЛ. Жыгімонт яму дараваў, але падчас спробы ўцёкаў Г. быў захоплены маскоўцамі і прыгавораны да пажыццёвага зняволення. У 1526 расійскі цар задумаў ажаніцца на пляменніцы Г. Алене Васільеўне і таму зноў прыблізіў Г. да сябе. У 1530 быў ваяводам у конніцы пад Казанню. Пасля смерці Васіля (1533) увайшоў у склад Вярхоўнай Думы Вялікага Княства Маскоўскага, але хутка быў абвінавачаны ў задуме авалодаць дзяржавай, пасаджаны ў цямніцу, дзе і памёр.

Крын. і літ.: Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и издаваемые археографической комиссией. Т.II /N36,37,40,49/; Летапісы і хронікі Беларусі. Сярэднявечча і раньнемадэрны час, Мінск, 2010, с. 315, 353, 535; В. Чаропка. Міхал Глінскі: узлёты і падзенні // Крыніца. – N12, 1988. – с. 17–19; Niemcewicz J. U., Podróże historyczne po ziemiach polskich od 1811 do 1828 roku. Wyd. 2. – Petersburg, 1859. – S. 261.

Глябовіч Брунон Францішкавіч (22.10.1908 – 09.12.2001) – абаронца Гродна ад Чырвонай арміі (20–22.09.1939). У Гродна прыехаў з бацькамі ў 1921 г.

Скончыў школу № 7, настаўніцкую семінарыю. Выкладаў прыродазнаўства ў сярэдняй школе імя С. Жэромскага. З 1935 быў камендантам гарцэрскага атрада, з 1938 – кіраўніком гуртка старэйшых гарцэраў і кіраўніком Гродзенскай акруговай арганізацыі Саюза польскай моладзі, з 1939 – рэдактарам газеты "Раніца Польшчы". Ініцыятар *яўрэйскіх пагромаў* у Гродне. Пасля *вайны Другой сусветнай* быў зняволены на 12 год у турмах ПНР. Вызвалены ў 1956. Фундатар мемарыяльнай дошкі ў гонар гарцэраў Гродна – абаронцаў горада ў 1939.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. / А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 84–85; Siemiński J. Grodno walczące. Wspomnienia harcerza. – Białystok, 1992. – s. 105 (foto), 225; Sawoniewski L. Saga o Grodnie – Białystok, 1994. – S. 86, 91.

Гой Мечыслаў Браніслававіч (нар. 1963, в. Шлавенцы, Воранаўскі раён, Гродзенская вобл.) – старшыня Гродзенскага *гарадскога выканаўчага ка*мітэта з 11.08.2014. У 1989 г. скончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі і працаваў галоўным інжынерам калгаса імя Леніна. Затым працаваў старшынёй сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва "Агра-правожа". У 2004 скончыў Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і стаў старшынёй Смаргонскага райвыканкама. Да прызначэння старшынёй Гродзенскага гарвыканкама быў дэпутатам Воранаўскага раённага і Забалацкага сельскага саветаў дэпутатаў.

Крыніца: https://be.wikipedia.org/wiki/. Доступ 08.01.2022.

"Голос Гродны" – штотыднёвік, які выдаваўся ў Гродне з 22 сакавіка да 28 красавіка 1919 г. (выйшла 6 нумароў).

Голуб Юры Уладзіміравіч (20.10.1947, в. Горна Зэльвенскага р-на Гродзенскай вобл. – 12.10.2020) – празаік, паэт, перакладчык, тэлевядучы. Пасля заканчэння філфака Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1970) працаваў рэдактарам на Гродзенскай абласной студыі *тэлебачання* (1970–77, 1979–96), у рэдакцыі газеты *"Гродзенская праўда"* (у 1978 і з 1996). Публікавацца пачаў у раённым друку з 1963, у рэспубліканскім – з 1965 г. Выдаў 5 зборнікаў паэзіі, кнігу для дзяцей "У бары грыбы бяры". Займаўся перакладамі, пісаў апавяданні-замалёўкі, эсэ. Творы яго перакладзеныя на рускую, літоўскую, украінскую і польскую мовы.

Літ.: Беларускія пісьменнікі (1917–1990): даведнік / склад. А. Гардзіцкі. – Мн., 1994.

Городенъ, Городен, Horoden (па-беларуску Горадзен) – адзіная летапісная назва Гродна ў XII–XIII стст. і ў рускай (старабеларускай) мове ў XIV – пачатку XVII. Упершыню згадваецца ў летапісах (Лаўрэнцьеўскім, Іпацьеўскім, Радзівілаўскім) 11 ці 14 жніўня 1127 г., хаця *князь гарадзенскі* (городенский) узнікае ў іх у 1116 г. У Іпацьеўскім летапісе запісана: "6636... Того же лета посла князь Мстиславъ с братьею своею многы кривичи четырьми путьми… Всеволодка

С. 843

из Городна… Тем повеле ити къ Изяславлю… рек им день всим пустити на воропъ мца августа 11 дня". У Радзівілаўскім летапісе чытаем: "6635... в тоже время посла князь Мстиславъ братию свою на кривичи четырми пути; Вячеслав ис Турова, Андреа из Володимеря, а Всеволодка из Городна, и Всеславъ Ярославича ис Клецка. Тем повеле ити и ко Изяславлю… рек им: Во один день всим пустити на воропъ, августа 14 дня". Амаль тое ж самае напісана ў Лаўрэнцьеўскім летапісе пад 6635 годам. Пры вылічэнні даты на сённяшні каляндар паводле Радзівілаўскага і Лаўрэнцьеўскага летапісаў трэба ад 6635 года адняць прынятую гісторыкамі лічбу 5508. Атрымаем 1127 год – год першай згадкі Горадзена. Гэтая дата павінная лічыцца годам нараджэння горада. А калі ўзяць 6636 год паводле Іпацьеўскага летапіса, дык трэба ўлічыць існаванне ў той час ультрасакавіцкага каляндарнага стылю, які выкарыстаў летапісец. У гэтым выпадку гісторыкі пры перакладзе на сённяшні каляндар павінны адымаць 5509 гадоў. Атрымоўваецца ў выніку той жа 1127 год (6636 – 5509). Тоеснасць летапіснага Горадзена, *Горадні* нёманскаму гораду Гродна даказаў на IX археалагічным з'ездзе ў Вільні ў 1893 г. гродзенскі гісторык *Арлоўскі Я. Ф.* З'яўленне назвы можа мець сувязь з назоўнікам *горадня* ды дзеясловам "градити" (гарадзіць, будаваць, агароджваць). Назву Горадзен знаходзім у летапісах: Нікіфароўскім (пад 1415 г.), Супраскім (1415), Красінскага, Румянцаўскім. У Хроніцы Быхаўца напісана лацініцай Horoden (1240-я гады).

Крын. і літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 15, 19; Госцеў А. П. Гродна: назвы горада на працягу 880-гадовай гісторыі // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 63–64, 68–71; Госцеў А. Гродназнаўства: Гісторыя еўрапейскага горада / А. Госцеў, А. Дабрыян, В. Карнялюк (рэдактар), С. Марозава, А. Чарнякевіч, Швед Вячаслаў (рэдактар). – Гародня-Вроцлаў, 2012. – С. 12–16; Летапісы і хронікі Беларусі. Сярэднявечча і раньнемадэрны час, Мінск, 2010, с. 66, 102, 180, 234. 682; Ліцкевіч А., Гародня і гарадзенскі рэгіён у другой палове XIII – XIУ ст.: назва і межы // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 11.

Горадня (гародня, гарадня) – прамавугольны зруб з бярвён ці брусоў, запоўнены ўнутры зямлёй і каменнем (свайго роду драўляны блакгаўз); тып абарончага збудавання. Шэраг горадняў, шчыльна пастаўленых адна да адной тарцамі, утваралі абарончую сцяну. У верхняй частцы горадняў рабілі перакрытыя двухсхільнымі дахамі баявыя галерэі з абломамі і байніцамі. Незасыпаныя (пустыя) горадні падчас аблогі выкарыстоўваліся жыхарамі горада як прытулак, сховішча для хатняга скарбу, як склад правіянту. На Беларусі былі распаўсюджаныя ў XV–XVI стст. у замках і гарадскіх крэпасцях. Ад іх, відаць, паходзіла і летапісная назва сённяшняга Гродна – Горадня.

Літ..: Архітэктура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. / Рэдкал.: А.А. Воінаў і інш.. – Мн.: БелЭн., 1993. – С. 516–517; Гродназнаўства: Гісторыя еўрапейскага горада / Пад рэд. В.В. Шведа, В.Р. Карнялюка. – Гародня, Вроцлаў, 2012. – С. 12–13; Ткачоў М.А. Гародня // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл./ Беларус. Энцыкл.:

Рэдкал: В.В. Гетаў і інш. – Мн.: БелЭн, 1993. – С. 165; Gloger Z. Budownictwo drzewne i wyroby z drzewa w dawnej Polsce. T. II. – Warszawa, 1907. – S. 59.

Горадня, а таксама **Гародня.** Дамініканскі манах з Толкеміта Сімон Грунаў у 1520-х гадах завершыў Прускую хроніку, дзе напісаў згодна з легендай, што сын Відэвута Літво (Lyttpho) атрымаў ад жраца Крыве-Кірвейта ў кіраванне землі ад Буга да Нёмана і пабудаваў горад Горадню (Grottna), названы ў гонар свайго сына Гарты (Gartho). Назва горада Горадня ці Гародня, паводле словаў даследчыка-мовазнаўцы В. Корбута, прагучала на старонках газеты "Наша Ніва" (1915, 1919, 1924–25, 1927, 1928). Напрыклад, у артыкуле Ластоўскага В. (1915, № 19–20). У 1919 гэтую назву выкарыстаў у кнізе "Геаграфія Беларусі" А. Смоліч. У сэнсавым аспекце назва адсылае да старабеларускага слова "*горадня*". М. В. Доўнар-Запольскі ў кнізе "Очерк истории кривичской и дреговичской земель" пісаў: "Так, вядомыя тыя абставіны, што старажытнарускія князі будавалі памежныя умацаванні, якія насілі назвы: гарадок, гарадзец, гарадзішча, горадня, рубеж, зарубежжа і т. п. Пры ўмацаваннях сяліліся памежныя жыхары, утвараліся пасяленні, гарады з тымі ж назвамі". Польскі даследчык З. Вінніцкі таксама адзначае, што па-скандынаўску gardo значыць месца, якое ахоўвае край ад набегаў нападнікаў. Горад, заўважае ён, паўстаў на межах Літвы, Русі, Прусіі, яцвягаў і Падляшша. Расійскія гісторыкі М. Карамзін, У. Салаўёў, украінскі гісторык М. Грушэўскі лічылі, што летапісная Горадня/Горадзен знаходзілася на месцы мястэчка з такой назвай у Пінскім павеце. Расійскія аўтары кніг пра Гродна *Баброўскі П. В.* і *Арлоўскі Я. Ф.*, польскія даследчыкі Ярашэвіч і М. Балінскі прызнавалі месцам знаходжання Горадні наднёманскі Гродна. Польскі гісторык Ян Якубоўскі, аналізуючы згаданыя вышэй дзве версіі знаходжання Горадні, называе яшчэ Давыд-Гарадок, як магчымае месца летапіснага горада (бо бацька Усевалада – Давыд, а Горадна магло трансфармавацца ў Гарадок: Horodno-Horodek).

Літ.: Доўнар-Запольскі М.Ф. Очерк истории кривичской и дреговичской земель. Кіев, 1891; А. Кібінь. Ад Ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурныя трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – № 5. – С. 234; Ліцкевіч А., Гародня і гарадзенскі рэгіён у другой палове XIII – XIV ст.: назва і межы // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 11; Jakubowski J. Gdzie leżało "Horodno" hipackiego latopisu? // Ateneum Wileńskie. – 1930. – T. 7. – S. 419–424; Winnicki Z. Szkice kresowe. – Wrocław: Stowarzyszenie "Wspólnota Polska", oddział Dolnośląski, 1995. – S. 103.

Городно, Городна – назва горада Гродна ў пісьмовых помніках XIII ст., кнігах Метрыкі ВКЛ, складзеных у перыяд ад другой паловы XV ст. да 60-х гг. XVI ст. У летапісах Супраскім, Акадэмічным, Слуцкім, Віленскім, Красінскага, Румянцаўскім, Археалагічнага таварыства, Рачынскага, Еўраінаўскім, Валынскім сустракаем назву Г. у розных склонах: Городно, з/из Городна, к/ко Городну, на Городно, у/в Городне, до Городна, з Городном. На думку А. Жураўскага

С. 844

“старабеларускую форму Городно ў сучасным беларускім напісанні слушна падаваць у выглядзе Горадна […]”. Назву Городно выкарыстоўвалі ў сваіх працах гісторыкі У. А. Чантурыя, М. М. Ціхаміраў, П. А. Рапапорт і інш.

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 15–17. 20, 24–25; Жураўскі А. Старадаўнія назвы гарадоў Беларусі // Навіны беларускай акадэміі. – 1992. – 14 жніўня. – С. 3; Летапісы і хронікі Беларусі. Сярэднявечча і раньнемадэрны час, Мінск, 2010, с. 113, 114, 117, 134, 13, 138–140, 171, 172, 175, 180, 181, 186, 187, 191, 234, 236, 247, 248, 264, 274, 283, 285, 296, 297, 313, 315, 326, 339, 340, 353, 372, 444, 483.

Гост Андрэй – забойца гарадзенскага кашталяна *Давыда Гарадзенскага*. Пётр з Дусбурга называе яго qurdam Polonus (польскі рыцар), Я. Длугаш – Andreas de Masovia (Андрэй Мазавецкі), “Хроніка Валенрода” – Andrzej Gost (Андрэй Гост), шляхціц мазавецкі, *Даніловіч І.* – “адзін з рыцарства польскага, прозвішчам Андрэй з Мазоўша”. Уваходзіў у дружыну Давыда Гарадзенскага (паводле Пятра з Дусбурга – “выдаваў сябе сябрам няверных”) і па-здрадніцку ў 1326 забіў яго (версіі забойства розныя: ззаду дзідаю, або кінжалам, у намёце ці каля ракі падчас паення каня) у той час, калі літоўскае войска вярталася ў *Горадню* з паходу на Брандэнбург. Цікава, што Г. удалося збегчы на добрым кані ад літоўскай аховы. Магчыма, забойства было помстай за разрабаванне і знішчэнне агнём горада Плоцка (поўнач Мазовіі) – рэзідэнцыі біскупа плоцкага Фларыяна, а таксама Пултуска, дзе былі землі біскупства. Знішчаны быў і Гастынін – сталіца Гастынінскай зямлі і павета. Можа Гост паходзіў з гэтай мясцовасці? Князь мазавецкі Вацлаў 2.01.1326 падпісаў з крыжацкім магістрам Вернерам фон Орзэльнам дамову аб узаемнай вайсковай дапамозе пры нападзе на адзін з бакоў. Забойства *Давыда Гарадзенскага* адпавядала мэтам гэтай дамовы. Можа быў у Г. і асабісты матыў, бо ў адной з хронік гаворыцца, што Давыд Гарадзенскі згвалтаваў ягоную жонку. У адным з дакументаў канцылярыі князя мазавецкага Баляслава III ад 14.07.1351 згадваецца Андрэй, падкаморы гастынінскі. Можа гэта наш забойца?

Літ.: Dymek B. Historia i kultura Mazowsza do 1526. – Żyrardów, 2005. – S. 42, 83–84; Dzieje Mazowsza. T. 1 / pog red. H. Samsonowicza. – Pułtusk: AH im. A. Gieysztora, 2006. – S. 241–242; Dzieje Mazowsza do 1526 roku / Pod red. A. Gieysztora i H. Samsonowicza. – Warszawa: PWN, 1994. – S. 196, 201, 290, 293; Pacuski K. Ziemia Gostyńska od XII w. do 1462 r. na tle dziejów Mazowsza Plockiego i Rawskiego // Dzieje Gostynina i ziemi gostyńskiej / pod red. M. Chudzyńskiego. – Warszawa: wyd-wo Akcydensowe, 1990. – S. 98; Pazyka St. Najstarszy opis Mazowsza Jędrzeja Swięcickiego. – Warszawa: Ludowa Spółdzielnia Wydawnicza, 1974. – S. 236; Tęgowski J. Rola Grodna w składzie Wielkiego Księstwa Litewskiego w XIV i początkach XV wieku // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 63, 69; Wolff A. Mazoweckie zapiski herbowe z XV i XVI wieku. – Kraków: PAU, 1937. – S. 281, 365.

Госцеў Аляксандр Пятровіч (2.05.1948, Калінінград, РСФР) – метадыст і настаўнік астраноміі гродзенскага ліцэя №1, краязнавец. У Гродне з 1948 г.

Скончыў СШ № 7 і фізічны факультэт Гродзенскага педагагічнага інстытута (1970). Пасля службы ў Савецкай арміі працаваў інжынерам-праграмістам на Гродзенскім *вытворчым аб'яднанні "Азот"* імя С. В. Прытыцкага (1972–82) і ў Гродзенскім філіяле Дзяржаўнага навукова-даследчага і праектнага інстытута азотнай прамысловасці ды арганічнага сінтэзу (1982–92). З 1976 Г. актыўна заняўся краязнаўствам, таму не выпадкова яго запрасілі на пасаду сакратара Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры (1988–89). З 1992 працаваў ў сістэме народнай адукацыі, апошнія амаль 30 гадоў звязаны са шматпрофільным ліцэем № 1, удзельнікам заснавання якога быў і ён сам. Распрацаваў аўтарскую сістэму школьнага краязнаўства. Стварыў пры ліцэі разам з вучнямі і калегамі музей "Гісторыя педагогікі Гродзеншчыны XII–XXI стст." (2005). Чалец Беларускага саюза філатэлістаў (з 1977), Беларускага нумізматычнага таварыства (з 1989), Саюза журналістаў Беларусі (1994). Г. – першы лаўрэат грамадскай *прэміі імя Ю. Яджоўскага (2012)*. Дзейны чалец грамадскай Міжнароднай акадэміі ноасферы ўстойлівага развіцця (2016). Старшыня адкрытага інтэлектуальнага клуба "Паходня ісціны" (з 2017).

Узнагароджаны знакам "Пераможца ў сацыялістычным спаборніцтве" (1977); знакам "Актывіст УАФ" (1984); залатым медалём за ўдзел у Нацыянальнай філатэлістычнай выставе "Белфіла-II" (2000); граматамі гарадскога і абласнога ўпраўлення адукацыі і Міністэрства адукацыі РБ (2014).

Аўтар і суаўтар звыш 100 публікацый (на 1.01.2021). Вехавым і значным для гродзенскай гістарыяграфіі быў артыкул "Монеты чеканились в Гродно" у газеце "Гродненский химик" (3.06., № 11, – С. 4). У ім фізік Госцеў растлумачыў, чаму ў горадзе "можна знайсці літоўскія манеты з польскімі надпісамі з партрэтам саксонскага князя" – тым самым раней за прафесійных гісторыкаў Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта і мінскай Акадэміі навук Г. пачаў вынаходзіць беларускую гісторыю горада і вызначаць яго храналагічныя межы. У 1993 ён разам з гісторыкам і краязнаўцам Шведам В. В. выдаў кнігу *"Кронан"*, якая стане вельмі актуальнай падчас новай хвалі Адраджэння.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 405–406; http://www.grodno.by/grodno/authors/gostev_a_p.html. Доступ 22.01.2021; Кто есть кто в Республике Беларусь. 2021. – Минск, 2021.

Гоўвальты – гаспадары маёнтка Грандзічы, тэрыторыя якога цяпер знаходзіцца ў складзе Гродна. Аўтар інфармацыі пра Грандзічы Ян Супрон піша, што ў 1818 г. гаспадарыла тут Тэкля Гоўвальт.

Крыніца: Грандзічы. Рэшткі маёнтка Класкоўскіх// supron_licvin. Дата доступу 24.01.2021.

Гравюра Г. Адэльгаўзера – М. Цюнта 1567–1568 гг., "Vera designatio urbis In Littavia Grodnae" ("Праўдзівае адлюстраванне Горадні ў Літве"). Узнікла ў сувязі з гістарычнай міжнароднай падзеяй – прыездам чатырох пасольстваў у *Горадню* падчас знаходжання ВКЛ у цяжкім стане на паўночных і ўсходніх

межах. На першым плане гравюры бачная Занёманская частка горада, запруджаная людзьмі ў войскавых строях і з ваенным рыштункам на конях. Гэта сустрэча 24.07.1567 г. пасольства Маскоўскага княства да вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта Аўгуста. На блізкім плане каралеўскі маршалак Іван Валовіч і галава маскоўскага пасольства Фёдар Іванавіч Колычаў (Разумны) падаюць адзін аднаму рукі. Гравюра прысвечаная "Яго каралеўскай вялікасці *Жыгімонту Аўгусту*, каралю польскаму, вялікаму князю літоўскаму, рускаму, прускаму, мазавецкаму, жамойцкаму і г. д., пану і спадкаемцу, свайму найласкаўшаму пану". Гродзенская даследчыца гравюры Н. Сліж лічыць, што *Адэльгаўзер* рабіў замалёўкі не адзін дзень і з трох пунктаў: з сучаснай вул. Міра, прыкладна каля дамоў № 3–5; з боку *касцёла Францішканскага*; са Старога моста. Менавіта з першага пункта добра маляваць Каложскі манастыр і раён вакол яго, але "знікае" рака *Нёман* і мы бачым на гравюры разгалінаванне ракі, упадзенне *Гараднічанкі* ў Нёман. Сустрэча маскоўскага пасольства, *мост* праз Нёман, *замак* і *каралеўскі двор* былі намаляваныя з другога пункта. Сустрэчы турэцкага і маскоўскага пасольстваў, Уваскрасенская *царква, Рынак, Падол,* каралеўскія стайні, шыбеніца – з трэцяга пункта каля Старога моста. Пры спалучэнні намаляваных паасобку сюжэтаў у агульную панараму горада адбыліся некаторыя скажэнні. На пазнейшых копіях гравюры апошнія бачныя яшчэ больш відавочна. Гравюра мае пяць сюжэтаў, якія адбыліся ў розныя часы: чатыры сустрэчы пасольстваў (турэцкага, валашскага, маскоўскага, татарскага) і выезд маскоўскага пасольства на сустрэчу з Жыгімонтам Аўгустам. Спецыялісты адносяць гравюру да катэгорыі "гістарычная карціна" і лічаць, што яна выкананая на вельмі высокім мастацкім узроўні, дакладна адлюстроўвае тапаграфію і архітэктуру горада і адзначаецца вялікай інфарматыўнасцю. Маюцца копіі гравюры 1575, 1608, 1637, 1720 гг.

Літ.: Салей С. Гравюра Адэльгаўзера/Цюнта "Vera designatio urbis in Littavia Grodnae" як крыніца па гісторыі Гародні: сучасны стан і перспектывы вывучэння // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі. Зб. навуковых артыкулаў. – Гродна: Грду, 2009. – С. 227–234; Сліж, Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2007. – № 2. – С. 9–105; Швед В.В. Горадзен: аповяды з гісторыі горада (10 ст. – сярэдзіна 16 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў, А.А. Дабрыян. – Гродна: Гродз. ўзбуйненая друкарня, 1996. – 60 с.; Niewodniczański T., Grodno-bemerkungen zur panorama-vedute von Adelhauser/Ztindt 1568 // Liineburger beitrdge zur uedutenforschung, Liineburg, 1983. – S. 103–107.

Гразноў Васіль Васільевіч – мастак і даследчык гістарычнага мінулага. Вучыўся на пачатку 1860-х гадоў у маскоўскім Страганаўскім мастацкім вучылішчы, на арнаментным аддзяленні. У Акадэмію мастацтва не паступаў, бо трэба было ўтрымліваць сябе і старую маці, працаваў у "срэбнай фабрыцы Сазікава". У 1864 пераехаў па запрашэнні І. П. Карнілава ў Вільню і заняўся пошукам гістарычных помнікаў. Працаваў у Першай мужчынскай і з 1886 у жаночай гімназіях, дзе выкладаў чыстапісанне, малюнак і чарчэнне. Даваў

хатнія заняткі. Калі разбурылася *царква Барыса і Глеба на Каложы*, Г. у 1853 і 1856 г. зрабіў яе замалёўкі, планы і фасады (цяпер гэта першакрыніца па архітэктуры царквы). Графіка Г. выстаўлялася на выставах у Пецярбургу. Яго малюнкі выкарыстаў П. М. Бацюшкаў у сваёй кнізе "Помнікі рускай старажытнасці ў заходніх губернях". Фотаздымкі абразоў друкаваліся ў "Віленскім календары на 1887 год". У Тураве Г. знайшоў Евангелле XI ст.

Літ.: Алексеев Л.В.. археология и краеведение Беларуси XVI в. – 30-е годы XX в./ под рд Б.А. Рыбакова. – Мн.: Бел. наука, 1996, с. 121–122; Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада/ Пад рэд. В. Карнялюк, В. Швед. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2012, с. 24.

Грамада Беларуская сялянска-работніцкая (БСРГ) – масавая легальная рэвалюцыйна-дэмакратычная і нацыянальна-вызвольная беларуская арганізацыя, створаная ў Зах. Беларусі ў 1925–26. Структурна выглядала як мясцовыя гурткі, аб'яднаныя ў павятовыя арганізацыі. Гродзенская была створаная намаганнямі Якімовіча М. у *Горадні* на паседжанні 13.06.1926. Галоўныя мэты: "дамагацца Сялянска-работніцкага ўрада; ачышчэнне ўсёй адміністрацыі ад рэакцыйных элементаў; скасаванне кары смерці, скасаванне дазнавальных судоў і поўнай амністыі для ўсіх палітычных вязняў; безадкладнае выданне закону аб перадачы сялянству ўсяе зямлі без выкупу; скасаванне асадніцтва; безадкладнае ўвядзенне работніцкага кантролю над прамысловасцю; пералажэнне ўсяго цяжару падаткаў на багатыя класы; 8-гаддзінны дзень працы і ўсе сацыяльныя здабыткі; самавызначэнне народаў для Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны і сапраўдная раўнапраўнасць для ўсіх нацыянальнасцяў". На павятовым з'ездзе БСРГ 19.09.1926 у Горадні было амаль 300 дэпутатаў. У новае павятовае кіраўніцтва ўвайшлі: *Баліцкі І.* (старшыня), Паддубік У. (сакратар), Кізевіч П. (скарбнік). На пачатку лістапада 1926 склад зноў змяніўся: В. Шушкевіч стаў старшынёй, У. Паддубік захаваў сваю пасаду, а А. Будневічанка заняла пасаду скарбніка. Існаваў таксама гарадзенскі гурток БСРГ. У студзені 1927 у Горадні і павеце налічвалася 220 гурткоў, якія аб'ядноўвалі звыш 10 тыс. чальцоў. Гарадзенскія сябры БСРГ удзельнічалі ў шматлікіх дэманстрацыях, мітынгах у студзені-жніўні 1926. У студзені 1927 польская буржуазная ўлада пачала пагром БСРГ, шмат актывістаў было арыштавана, прыгаворана да турэмнага зняволення. У лютым 1927 у Гродне і навакольных вёсках адбылася дэманстрацыя ў абарону Грамады, збіраліся подпісы пад петыцыю ў яе абарону. Пратэст падтрымалі гродзенскія прафсаюзы.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник, Минск, 1988, с. 92–93; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 80–82, 84.

Грамада беларускай моладзі (1919–1923), створаная ў маі 1919 г. ініцыятыўнай групай на чале з У. Курбскім. Мэта – знаёміць беларускую моладзь з роднай мовай, літаратурай, гісторыяй, геаграфіяй, песнямі і д. п. На сходзе каля 50 чал. прынялі статут "Драматычнага гуртка Грамады беларускай

моладзі ў Гродне". У склад прэзідыума Грамады ўвайшлі Курбскі, К. Салошык, М. Амельянчык. Пры Грамадзе працавалі тры секцыі: драматычная, самаадукацыйная і харавая (па словах Курбскага – драматычная, вакальная і лекцыйна-рэфератная). У Крынках, Верцялішках былі адкрытыя філіі Грамады. У чэрвені быў створаны "Драматычны гурток грамады беларускай моладзі ў Гродне". Кіраўнік – настаўніца, у будучым заслужаны дзеяч культуры БССР П. В. Мядзёлка. Ставілі аматарскія спектаклі на беларускай мове ў Гродне і навакольных вёсках: "Паўлінка" Я. Купалы, "На дне" М. Горкага, "Мядзведзь" А. Чэхава, "Пашыліся ў дурні" Крапіўніцкага і інш. – усяго каля 20 прэм'ер. У якасці акцёраў выступалі Вера Краўцэвічанка, Аўгіння Палуйчык, Мікалай Амельянчык, Кастусь Драздоўскі, Міхал Карповіч, Мікалай Галавач, Кастусь Салошык, Авар'янаў, Юрачка ды інш. Хорам кіраваў Аляксандр Шах.

Літ.: Мядзёлка П. Сцежкамі жыцця. – Мінск, 1974. – С. 130–132; Чарнякевіч А. З гісторыі Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту. Канец 1918 – пачатак 1921 г. // Гарадзенскі палімпсест. XII-XX стст. Матэрыялы міжн. канф. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Горадня-Беласток: ІГДБ (ЕГУ). – 2008. – С. 163; Чарнякевіч А. Дваццаць год з гісторыі беларускага тэатра ў Гродне (1910–1930) // Гарадзенскі гадавік, Кракаў. – 2014. – № III. – С. 88–91; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С.62–64, 69.

Грандзічы – сяло, якое ў сярэднявеччы належала да Горадні і плаціла падаткі гораду. Паводле валочнай памеры 1558–61 гг. і рэвізіі 1650 мела 40 валок. Паводле рэвізіі 1680 і інвентарызацыі 1708 мела разам з Манчынам 89 валок.

Літ.: Сліж Н. І. Падаткі і іх збор у Гародні XVI- XVII стст. // Białoruskie zeszyty historyczne. – 2022. – n. 35. – S. 12–14.

Грандзічы (Гранды) – адзін з найстарэйшых мяшчанскіх родаў, які належаў да ўладнай эліты Гродна.

Аляксей Грандзіч (Олекши Кграндич, Aleksiej Grandzicz) згадваецца ў 1557 г.

Сымон Гранда, *бурмістр* у 1560–61. Валодаў сядзібай на *Рынку*.

Юргі, Мацей, Сабнік (Sobniko) Грандзічы згадваюцца ў валочнай памеры Гродна 1560–61. Валодалі пляцам на вул. Віленскай.

Павел Грандзіч меў на вул. Дзям'янаўскай дом.

Грышка Грандзіч быў уладальнікам сядзібы на рагу Рынку з вул. Замкавай.

Крыштаф Гранда ў 1589 быў гарадскім пісарам.

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 352–353.

Гродзенская епархія – рэлігійная адміністратыўная адзінка, якая існавала з 4 лютага 1900 г. Мела сваю газету *"Гродненскіе епархиальные ведомости"*.

С. 845

Гродзенская вобласць – створаная 20 верасня 1944 г. у складзе 15 раёнаў з цэнтрам у Гродне. Мяжуе на захадзе з Рэспублікай Польшча, на поўначы

з Летувой, на паўночным усходзе з Віцебскай вобл., на ўсходзе з Мінскай вобл., на поўдні – з Брэсцкай вобл. Колькасць раёнаў пастаянна змянялася: з 1954 па 1956 гг. іх было аж 23, з 1959 па 1962 – 20–21, у 1962 вобласць паменшылася двойчы да 11 раёнаў, затым павялічылася да 17–18 у 1965–1966 і ў 1988 г. спынілася на 17 раёнах: Астравецкі, Ашмянскі, Бераставіцкі, Ваўкавыкі, Воранаўскі, Гродзенскі, Дзятлаўскі, Зэльвенскі, Іўеўскі. Карэліцкі, Лідскі, Мастоўскі, Навагрудскі, Свіслацкі, Слонімскі, Смаргонскі, Шчучынскі. У 1987 плошча складала 25 тыс. кв. км., насельніцтва – 1156,6 тыс чал. У 1993 вобласць насяляла 1211 тыс. чал.

Літ.: Административный подел. Белорусская ССР. Гродненская область. – Мінск, 1968; Граблевский И.С. Гродненская область. – Минск, 1988.

Гродзенская (Літоўска-Гродзенская) губерня – адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка, створаная паводле ўказа Аляксандра I ад 21.09.1801 г., калі Літоўская губерня была падзеленая на Віленскую і Літоўска-Гродзенскую (так яна называлася да 1840) губерні. Горад Гродна стаў губернскім цэнтрам па эканамічных меркаваннях, а таксама таму, што ён "издревле город довольно знатный", тут жылі вялікія князі літоўскія і польскія каралі, замежныя паслы, знаходзіўся *Галоўны літоўскі трыбунал*, горад быў забудаваны добрымі і прыдатнымі дамамі і будынкамі, дзе можна было размеркаваць губернскія ўлады. Гродзенскую губ. склалі Брэсцкі, Гродзенскі, Ваўкавыскі, Кобрынскі, Лідскі, Навагрудскі, Пружанскі і Слонімскі паветы. Паводле ўказа ад 30.12.1842 г. у склад губерні з 1843 г. уключаліся Беластоцкі, Бельскі (злучаны з Драгічынскім) і Сакольскі паветы са скасаванай Беластоцкай вобласці, а Лідскі перададзены ў Віленскую губ., Навагрудскі – у Мінскую губ. Гродна па пытанні на званне губернскага горада перамагло Беласток па прычынах гістарычнага старшынства, па статыстычных перавагах (большае насельніцтва, выгоднае становішча на адной з галоўных рэк краю, развіццё прамысловасці і гандлю), па наяўнасці таго, што яшчэ трэба было ўладкаваць у Беластоку (адміністрацыйныя будынкі, сродкі камунікацыі). Такое адміністрацыйна-тэрытарыяльнае ўладкаванне губерні захоўвалася да 1921 г. Фактычна Літоўска-Гродзенская губерня пачала існаваць з 13 студзеня 1802 г., калі а 12 гадзіне апоўначы адбылося першае паседжанне губернскага праўлення. У *царкве Барыса і Глеба на Каложы* ці ў *царкве Раства Багародзіцы* базыльянскага манастыра адбылася літургія, затым – імша за здароўе Гасудара Імператара і ўсёй царскай сям'і. Пасля гэтага прызначаныя літоўскім генерал-губернатарам *Л. Л. Бенігсэнам* чыноўнікі сабраліся ў былым *палацы А. Тызенгаўза*, дзе размеркаваліся губернскія ўстановы (цяпер на гэтым месцы знаходзіцца помнік савецкім ваярам і гарыць вечны агонь). Памяшканні былі акропленыя святою вадой, і тады чыноўнікі прынеслі прысягу. Былі прачытаныя "приличные статьи" з найвышэйшага "Учреждения о губерниях", пасля чаго віцэ-губернатар стацкі дарадца Пётр Іванавіч Берг, дарадца праўлення Пётр Панкратавіч Прэжэнц і калежскі сакратар Нікіфар Загаранскі занялі свае месцы і загадалі "запісаць адкрыццё Літоўска-Гродзенскай губерні ў журнал

С. 846

і данесці пра гэта ў Кіроўны Сенат". Што і было зроблена, пратакол першага паседжання захоўваецца цяпер у Нацыянальным гістарычным архіве Рэспублікі Беларусь у Гродне. У гэты ж дзень адбылося першае паседжанне Гродзенскай *казённай палаты*. 31 мая 1802 г. указам, дадзеным Кіроўнаму Сенату, быў пастаноўлены парадак дваранскіх выбараў у "губернях, ад Польшчы далучаных" на агульных асновах, вызначаных паводле "Учреждения о губерниях". 15 сакавіка 1805 г. выйшаў указ "Аб парадку выбараў у губернях, ад Польшчы далучаных". Адпаведна з ім было абмежаванае кола выбарчых толькі тымі дваранамі, якія мелі 18 ці болей гадоў і валодалі ў губерні нерухомым маёнткам, які прыносіў не меней за 150 рублёў прыбытку. Быць выбранымі на пасаду маглі толькі дваране не маладзейшыя за 23 гады і з правам голасу ў *дваранскім сходзе*. Павятовыя і губернскі *маршалкі* выбіраліся таксама, як і прадвадзіцелі дваранства рускіх губерняў на падставе Даравальнай граматы дваранству ад 1785 г. 23 ліпеня 1802 г. найвышэйшым указам Сената быў зацверджаны герб Літоўска-Гродзенскай губерні: у верхняй частцы шчыта быў "ездок в латах, скачущий на белом коне в правую сторону, у которого в правой руке поднятая вверх сабля, а на левой надет серебряной щит с красным осьмиконечным крестом" (Пагоня) ў чырвоным полі, у ніжняй – выява зубра ў срэбным полі; пасля 1845 г. на шчыце герба застаўся толькі зубр у чырвоным полі. У 1878 г. была зменена выява зубра ("золотой зубр с черными глазами и языком"), гербу былі нададзеныя расійская імператарская карона, стужкі і лісце дуба. Гэтым жа указам 1802 г. быў зацверджаны мундзір Гродзенскай губ. У Поўным зборы законаў Расійскай імперыі ён апісваецца наступным чынам: "Кафтан тёмно-зелёного цвета, воротник и обшлага бархатные, красного цвета, подкладка белая, камзол и исподнее платье белые, пуговицы белые с изображением герба" (Т. 27 – с. 190). 9.09.1802 былі зацверджаныя штаты прысутных месцаў Гродзенскай губерні, якія размяркоўваліся ў Гродне: *губернскае праўленне*, *казённая палата*, палаты крымінальных і грамадзянскіх спраў, сумленны суд, прыказ грамадскай апекі ("общественного призрения"), урачэбная ўправа, землеўпарадкавальная і будаўнічая частка. У Гродне размяркоўвалася і сядзіба *Дваранскага дэпутацкага сходу*. Плошча Літоўска-Гродзенскай губ. у 1817 г. мела 353 262 кв. вярсты, у 1891 – 33 979 кв. вёрст. На гэтай тэрыторыі жыло ў 1811 г. 300 тыс. чалавек, у 1834 г. – 751,7 тыс. чал., ў 1897 г. – 1671,8 тыс. чал. (з іх 11,4% гараджан). У 1848 г. у губерні было 9 павятовых і 16 заштатных гарадоў, 84 мястэчкі, 351 сяло, 4741 вёска. У 1893 г. была такая ж колькасць павятовых і заштатных гарадоў, а мястэчак 62.

Крын. і літ.: II ПСЗРИ, Т. 15. Ч. 1. – Стб. 13678; Т. 17. Ч. 2. – Стб. 16347; Т. 26. – Стб. 20004, 20096;. Т. 27. – Стб. 20394; Швед В.В. Становление Гродненской губернии // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII –XIX стагоддзяў. матэр. навук.-практыч. канферэнцыі 11–12 траўня1992 г.- Гродна-Белавічы: Б.в., 1992 – С. 98–103; Швед В.В. Губернскі Гродна: аповяды з гісторыі горада (канец XVIII – пач. XX ст.) / В.В. Швед. – Баранавічы: Баранав. ўзбуйненая друкарня, 2003.

“Гродзенская праўда” гл. Газеты.

Гродзенская эканомія (з 1589 г.) – сталовыя (каралеўскія) маёнткі ці староства вялікага князя літоўскага і караля польскага. Складалася з 200 паселішчаў, якія мелі 3773 валокі зямлі (79 233 га), 5 пушчаў: Сакольска-Навадворская, Пшэломска-Перстунская, Стрыеўска-Берштанская, Белавежская, Жувітынска-Аліцкая. Эканомія падзялялася на 11 двароў, якія былі падзеленыя на гміны і вайтоўствы. Найвялікшыя маёнткі: Гарадніца, Новы Двор, Лаўна, Крынкі, Адэльск, Краснік, Квасоўка, Кузніца, Котра, Скідзель, Верцялішкі, Азёры, Салацце, Мількаўшчына, Масты. У 1780 Г. э. складалася з “губерняў” Янаўскай, Дамброўскай, Сакольскай, Крынкаўскай, Квасоўскай і Азёрскай. Было 49 ключоў, 24 фальваркі, 13 гарадоў і мястэчак, 362 вёскі, 5 пушчаў. Насельніцтва было звыш 40 тыс. чал., а зямлі – 155 тыс. га.

Крыніца: Писцовая книга Гродненской экономии. Часть 1, 2. – Вильна, 1881–1882.

Гродзенскі губернскі ваенна-рэвалюцыйны камітэт, створаны 4 лютага 1919 г. пастановаю Прэзідыума Беларускага часовага рабоча-сялянскага ўраду ў Слоніме (старшыня С. І. Берсан). 25 лютага зліквідаваны.

Гродзенскі гусарскі полк

1) Назва Клясціцкага гусарскага палка ў 1806–1824. Полк быў сфармаваны 13 чэрвеня 1806 з Ізюмскага, Александрыйскага, Сумкага і Альвіяпольскага эскадронаў. Прыняў удзел у бітвах антынапалеонаўскай кааліцыі ў 1806–1807 пад Гутштадам, Кёнігсбергам, Лікендорфам і Фрыдландам. Тады палком камандаваў Я. П. Кульнеў. У вайне са Швецыяй (1808–1809) гродзенскія гусары ваявалі на тэрыторыі Фінляндыі. Ім удалося захапіць г. Грысельгам у 100 км ад сталіцы Стакгольма. Адным з эскадронаў палка камандаваў *Давыдаў Дзяніс*. Менцікі значнай колькасці афіцэраў упрыгожылі баявыя ордэны, усе салдаты і ўнцер-афіцэры былі ўзнагароджаныя медалём з надпісам “За переход на шведский берег 1809”. Наступныя баі палка адбыліся падчас *вайны 1812* г. (пад Клясціцамі, вызваленне Гродна ад аўстрыйцаў – гл. *Чачэнскі А.*) і замежных паходаў 1813 (пад Баўценам, Фершампунеазам, Рэймсам, Берлінам). Усяго гродзенскія гусары за гады вайны з Напалеонам удзельнічалі ў 30 генеральных і поўсотні авангардных баях. У палон да іх трапілі 5 генералаў, 117 афіцэраў і болей за 13 тысяч ніжніх чыноў арміі праціўніка. Полк атрымаў 7 срэбных труб з надпісамі памятных баёў, ганаровы знак на галаўны ўбор. З 1824 г. полк сталі называць у гонар бітвы пад Клясціцамі. Салдаты палка атрымалі 437 георгіўскіх крыжоў, а афіцэры – ордэны і ганаровую зброю.

2) Паводле ўказа Аляксандра I ад 19.02.1824 у г. Седлец з ураджэнцаў Літвы, Беларусі і памежных з ёю тэрыторый Польшчы сфармавалі лейб-гвардыі Гродзенскі гусарскі полк для аховы цэсарэвіча, намесніка Каралеўства Польскага Канстанціна Паўлавіча. З кастр. 1824 полк дыслацыраваўся ў Варшаве, у 1825–29 уваходзіў у зводную гвардзейскую кав. дывізію Літоўскага асобнага

корпуса. У гэты час на штандары палка і на галаўным уборы гусараў змяшчалася выява двухгаловага арла, на грудзях якога быў адлюстраваны шчыт з відарысам "Пагоні". З 1832 полк размяркоўваўся на ваен. пасяленні ў Наўгародскай губ., а з 1878 – зноў у Варшаве. Полк выкарыстоўваўся царызмам для задушэння *паўстання 1830–1831* і *паўстання 1863–1864* у Польшчы, на Беларусі і Літве. Удзельнічаў у наступных войнах: Крымскай 1853–1856 (берагавая аванпаставая служба ў Фінляндыі), руска-турэцкай 1877–78 (пераход праз Балканы, баі пад Плеўнай, Горным, Дубняком, Філіпопалем/Плоўдзівам, Адрыянопалем і інш. 23.12.1877 гродзенскія гусары першымі ўвайшлі ў вызваленую Сафію. Полк быў узнагароджаны ганаровым штандарам з надпісам "За отличие в Турецкой войне". У *вайне Першай сусветнай* гродзенскія гусары ваявалі ў Галіцыйскай бітве, Люблінскай, Варшаўска-Івангарадской, Чэнстахоўска-Кракаўскай і Уладзіміра-Валынскай аперацыях. Сярод камандзіраў палка былі генералы: К. Г. Штрантман (1824–31), А. А. Эсен (1831–37), Дз. Р. Баграціён-Імерэцінскі (1837–45), А. І. Брэверн (1845–48), Р. Б. Берг (1848–51), Р. В. Адэркас (1851–56), М. А. Краснакуцкі (1856–63), Д. А. Тацішчаў (1863–65), А. В. Алсуф'еў (1865–72) і інш. У спісах палка ў розны час значыліся імператары Аляксандр II, Мікалай II, Аляксандр III, вял. князі Аляксандр Аляксандравіч, Мікалай Аляксандравіч, Канстанцін Мікалаевіч, Дзмітры Канстанцінавіч. У палку служылі: атлет Чэхаўскі Якуба, дзекабрыст М. С. Лунін, паэт *М. Ю. Лермантаў* (10.1837–03.1838), лінгвіст і жывапісец М. А. Краснакуцкі, скульптар і карыкатурыст М. М. Цэйдлер і інш. Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 г. полк быў пакінуты ў Гжацку, дзе пачалася яго ўкраінізацыя і спроба пераўтварыць яго ў "Гетмана Сагайдачнага полк". Падчас пераезду цягніком з Гжацка ў Кіеў чырвонаармейцы раззброілі полк на ўчастку Орша-Магілёў і распусцілі гусараў па хатах. Афіцыйна полк быў расфармаваны 4.03.1918 загадам № 236 Маскоўскага абласнога камісарыята па вайсковых справах.

Літ.: Бехтинеев Ш.И. Формирования российсой армии с белорускими наименованиями. – Минск: "Арти-Фекс", 1999. – С. 29–31; Гусары Российской империи / сост. Н.Н. Малишевский. – Минск: Букмастер, 2012. – С. 96–160; Елец Ю.Л. История лейб-гвардии Гродненского гусарского полка. Т. 1–2. – СПб., 1890–97; Швед Вячаслаў. Гродзенскі гусарскі полк // ЭГБ. Т. 3. – Мінск: БелЭн., 1996. – С. 134; Швед В.В., Данскіх С.У. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. – Гродна: ГрДУ, 2006.

Гродна, Гродня – назва горада ў рускім справаводстве 17–18 стст. У назоўным склоне – Гродня, Гродна; у родным – от Гродны, Гродни; с Гродна, из Гродни; у давальным – к Гродне; у вінавальным – про Гродню, в Гродну; у творным – под Гродною; у месным – в Гродне, в Гродно.

Англійскі вандроўнік Ёган Георг Форстэр быў у Гродне ў 1784 і такім убачыў яго: "З'язджаем глыбокім ярам на бераг *Нёмана*, праз які пакладзены *мост,* дзе як у Варшаве аплочваецца 2 злотыя. На другім баку дарога была таксама крутая, пазней, едучы праз балоцістыя вуліцы паміж дамамі, часткова

драўлянымі, часткова мураванымі, якія часам прэзентаваліся прыгожа, а часамі былі ўбогія, даехалі да *Старога замка*, дзе жыў граф Храптовіч". Нямецкі вандроўнік Фрыдрых Шульц, які бачыў Гродна ў 1793, дае сваё апісанне: "Гродна, ляжыць цудоўна ў даліне Нёмана. Від з узвышша ёсць вельмі прыгожы. Шмат касцёлаў з вежамі, значная кольскасць збудаваных у новым будаўнічым гусце, але шмат раскіданых *палацаў* і *дамоў* стаяць на фоне чорных драўляных халуп, якія на самой справе ствараюць горад".

А вось як выглядае Гродна/Гродня ў апісанні М. Дэ Пуле (кніга 2 выданнем выйшла ў 1871): "У ім усяго адна добрая вуліца ды плошча, з непазбежным цялятнікам (гэта значыць бульварам), фарай (рым.-кат. Сабор), прысутнымі месцамі і д.п.; астатнія вуліцы ўтвораныя амаль цалкам з драўляных крытых гонтай альбо чарапіцай домікаў, самай простай архітэктуры. Час зліквідаваў у Гродне амаль усе помнікі былога стагоддзя; на месцах памерлага польскага жыцця прывольна раскінулася яўрэйства. *Палацы* (аўтар піша па-руску "палаццы". – В. Ш.) Агінскіх, Сангушкі і Юндзіла, ці дакладней – месцы, на якіх яны знаходзіліся, цяпер належаць *яўрэям*; у доме *Сапегі,* які належыць князю Любецкаму, цяпер размеркаваны "шляхецкі" сход".

Даследчык-мовазнаўца В. Корбут піша пра наяўнасць у газетах "Наша Доля" і "Наша Ніва" (1906–1928) назвы "Гродня", "Гродна", "Hrodna", "Hrodnia"

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 19; Де Пуле. М. Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794–1797 годах. Изд. 2-е. – СпБ., 1871. – С. 15, 19; Polska stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 2. – Warszawa, 1963 – S. 77, 396.

"Гродна" – аперацыйная група польскіх войск, створаная ў жніўні 1939 г. на базе Групоўкі камандуючага Акругі Корпуса III з мэтаю забеспячэння абароны на лініі Сувалкі – Аўгустаў, дапамога пададдзелам Сувальскай кавалерыйскай брыгады. Камандуючым групы быў генерал брыгады *Ю. Альшына-Вільчынскі*. На пачатку верасня група арганізацыйна была падпарадкаваная камандуючаму Самастойнай аперацыйнай групы "Нараў". Загадам маршалка Рыдза-Сміглага ад 11.09.1939 група была накіраваная на абарону Львова.

Літ.: SGO "Narew" I GO "Grodno" w wojnie obronnej 1939 r. – Białystok, Przasnysz: wyd-wo "Forteca", 2004. – S. 23–24.

Гродна Новы (Nougarden) – драўляны замак, пабудаваны крыжакамі ў 1391–1392 гг. насупраць замка *Старога* паводле дазволу князя літоўскага *Вітаўта*.

Літ.: Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005). – Гродна: ЮрСапрынт, 2020; Maroszek J. Dzieje województwa podlaskiego do 1795 roku. – Białystok: Wyd-wo Uniwersytetu w Białymstoku, 2013. – S. 30.

Гродна, падземны горад. Самыя першыя звесткі пра яго, напэўна, апублікавала *Ажэшка Э.* у сваім артыкуле "Дом Баторыя ў Гродне" (1886). Яна напісала пра падземны калідор, які пачынаецца пад *касцёлам Фарным*, праходзіць пад домам Баторыя, яго падваламі (дзе знаходзіцца скарбніца *Стэфана*

Баторыя), і дасягае занёманскага *касцёла францішканцаў*. Ва ўнутранай сцяне падчас рамонту пасля *пажару 1885* у доме Баторыя быў знойдзены вузкі калідорчык, які меў выхад на знешнім баку сцяны, праз які туды, магчыма, трапляла паветра з вуліцы.

Верагодна, пра гэты ж падземны ход успамінае гараднянка А. П. Хоцім. 21.03.1935 на пл. Стэфана Баторыя/Савецкай, перад касцёлам Фарным, правалілася мураваная пліта і з’явіўся ўваход у падземны калідор, які вёў у бок плошчы. 19-гадовая дзяўчына трапіла ў падземны калідор вышынёй у рост чалавека, шырынёй каля 2 м, звод зроблены з бетона, па абодвух баках калідора знаходзіліся невялікія памяшканні. Унутры некаторых былі печы з белым попелам, у іншых – труны з неструганых дошак. Моладзь, якая знайшла гэты падземны ход, лічыла, што ад *Фары Вітаўта* ён ідзе пад Нёманам (яны чулі шум вады) да *касцёла францішканцаў*.

Аўтару гэтай кнігі сын гродзенскага паслявaеннага пракурора Гродна і сведка У. С. Малахаў апавядалі пра тое, што ў падзямеллі сядзелі савецкія ваеннапалонныя. Маці аўтара (1933 г. н.), якая хадзіла ў названы касцёл, апавядала, што таксама чула пра падземны ход ад святароў. Б. У. Смаленскі працаваў у спартыўна-тэхнічным клубе, які знаходзіўся на тэрыторыі Музея рэлігіі і атэізму. Падчас рамонту аднаго з памяшканняў ён падняў дошкі падлогі і ўбачыў спуск у дол – там знаходзілася брукаваная дарога, па якой мог бы праехаць воз (шырыня да 5 м). Ход ішоў пад аўтамабільнай дарогай на вул. *Давыда Гарадзенскага*, у бок *Замка Новага*. Пра падземны ход с *замка Старога* пісалі гродзенскія гісторыкі *Арлоўскі Я. Ф.* і *Ядкоўскі Ю. Ю.* Апошні пісаў, што падчас выканання праекта аднаўлення Старога замка і *Гары Замкавай* “У сувязі з паніжэннем узроўню замкавага дзядзінца будзе доступ да акенца ў мурах над ярам, пра які ходзяць легенды, што гэта ёсць уваход у падзямелле, якое ідзе пад Нёманам”. Ядкоўскі таксама пісаў пра падземны ход ад ратушы ў бок вул. Маставой і пацвярджаў, што “частка падземнага Гродна ўсё ж захавалася”.

Літ.: Синевич А. Есть ли в Гродно подземные ходы? // Вечерний Гродно. – 24.08.2005. – С. 4; Jodkowski J. Śródmieście Grodzieńskie dawne a jutrzejsze. – Grodno, 1930, s. 2; Jodkowski J. Projekt urządzenia Zamku Starego i góry zamkowej w Grodnie // Przegląd statystyczny za lata 1922 i 1923. – Grodno, 1925, S. 150; Orzeszkowa E. Dom Batorego w Grodnie //Tygodnik ilustrowany. – 1886. – 183–208. T. VIII. – s. 374–375.

“Гродназнаўства”

1) Курс па гісторыі і культуры Гродна, які спачатку праводзіўся ў музеі гісторыка-археалагічным з маленькімі дзяцьмі ў выглядзе гульні, а потым распаўсюдзіўся ў сярэдніх школах як факультатыўны ўрок;

2) Кніга-падручнік, напісаная для вышэйназванага курса групай аўтараў, у складзе якой былі прафесар, доктар гістарычных навук *Вячаслаў Швед* (рэдактар); кандыдат гістарычных навук, дацэнт Віталь Карнялюк (рэдактар); канд. гіст. навук, дацэнт Святлана Марозава; канд. гіст. навук Андрэй Чарнякевіч; археолаг Аляксандр Дабрыян. У 2009 і затым на загад рэктара

У. Роўбы ў 2010 Г. было выдадзенае ў Гродзенскім дзяржаўным *універсітэце* як дапаможнік па краязнаўстве для студэнтаў. У 2012 кніга, дапоўненая ілюстрацыямі, была выдадзеная ў кніжнай серыі “Гродзенская бібліятэка” (каардынатар Мажэйка Павел). Структура не змянілася ад папярэдніх выданняў, і засталіся наступныя раздзелы: школьнае краязнаўства як навука, Гродна ў канцы X – сярэдзіне XIII ст.; Гродна на пачатку эпохі ВКЛ (да 1496 г.); Магдэбургскі Гродна (1496–1795); Гродна ў складзе Расійскай імперыі (1795–1917); Гродна ў войнах пачатку XX ст.; Гродна ў складзе другой Рэчы Паспалітай (1921–1939); Гродна ў складзе БССР (1939–1991); спіс рэкамендаванай літаратуры; слоўнік; дадаткі (спісы *бурмістраў, войтаў, прэзідэнтаў* Гродна і старшынь Гродзенскага *гарсавета* і *гарвыканкама*).

Нямецкі палітолаг і гісторык Ф. Акерман адзначыў, што ў “Гродназнаўстве” мясцовыя калегі ажыццявілі скразны наратыў для дзесяці стагоддзяў гарадской гісторыі, “у якім разглядаюцца ўзаемаадносіны ўладаў, жыхароў, будынкаў і вобразаў цягам доўгага часу”. Ён прызнаў, што кніга стала мясцовым бестселерам, што “яшчэ ніколі ў гісторыі Гародні не было такой яркай, поўнай гарадской гісторыі, у якой было б разгледжана столькі розных аспектаў”.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сяродзнеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 441–442; Гродназнаўства: дапаможнік па курсе “Краязнаўства” для студэнтаў гуманіт. спецыяльнасцяў / пад агульн. рэд. В.В. Шведа, В.Р. Карнялюка. – Гродна: ГрДУ, 2009. – 219 с.; 2-е выд. – Гродна: ГрДУ, 2010. – 219 с.; Госцеў А. Гродназнаўства: Гісторыя еўрапейскага горада / А. Госцеў, А. Дабрыян, В. Карнялюк (рэдактар), С. Марозава, А. Чарнякевіч, Швед Вячаслаў (рэдактар). – Гародня-Вроцлаў, 2012. – 339 с.; Рабкоў А. Праграма факультатыву “Гродназнаўства” // Румлёўскія старонкі: Помнікі гісторыі, прыроды і культуры паміж турыстычнай прывабнасцю і навуковай цікавасцю. – Гродна: ГрДУ, 2011. – С. 274–280; Трухановіч Н.А., Цімошына В.Б. Ідэя, рэалізацыя і перспектыва музейнай праграмы “Гродназнаўства” // Румлёўскія старонкі: Матэрыялы I абласнога навукова-практычнага форума па праблемах рэгіянальнай гісторыі і краязнаўства. – Гродна, 2007. – С. 5–7; Швед В.В. Выкладанне курса “Гродназнаўства” ва ўстановах адукацыі Гродна // Румлёўскія старонкі: Матэрыялы I абласнога навукова- практычнага форума па праблемах рэгіянальнай гісторыі і краязнаўства. – Гродна, 2007. – С. 8–13.

“Гродненская копейка” – штодзённая вячэрняя непартыйная газета. Выдавец –рэдактар С. Б. Барысаў. Пакуль вядомы толькі адзін нумар – № 1 за 28 снежня 1912 г.

Літ.: Российская национальная библиотека. Газеты дореволюционной России. 1703–1917. Каталог. – СПб., 2007. – С. 103.

“Гродненские губернские ведомости” – газета, якую сталі друкаваць у Гродне паводле рашэння *праўлення гродзенскага губернскага* ад 19.01.1838. Выходзіла да 11.08.1915. Паводле закону 1876 г. ГГВ не падвяргаліся агульнай цэнзуры, і губернатары мелі права даручаць цэнзараванне асобам паводле свайго выбару. Адказнымі за выданне былі згодна з цыркулярам МУС ад

29.10.1881 *губернатары*. Неафіцыйная частка ГГВ з’явілася ў 1876. 13.10.1890 віленскі генерал-губернатар дазволіў друкаваць неафіцыйную частку паводле праграмы, прапанаванай гродзенскім губернатарам. У ёй былі 2 аддзелы: агульны і мясцовы. У першым знаходзіліся найважнейшыя ўрадавыя распараджэнні і прыдворныя звесткі, тэлеграфныя паведамленні, унутраныя і знешнія навіны; у другім – артыкулы і зацемкі па розных пытаннях мясцовага грамадскага жыцця, хроніка Гродна і губерні, гісторыя края, карэспандэнцыя, вясковы і даведачны аддзелы, аб’явы.

Памешчыкаў заахвочвалі дастаўляць у губернскае праўленне праз *прадвадзіцеляў дваранства* “розныя звесткі, заўвагі і назіранні, якія тычацца гаспадаркі, рамёстваў, фабрык, заводаў, адкрытых у іх маёнтках розных рэдкасцяў і з’яваў усіх царстваў прыроды і розных памятных рэчаў, а таксама каб даводзілі да праўлення розныя цікавыя гістарычныя пра губерню і асаблівых месцах у ёй звесткі, таксама некралогі вядомым ім асобам, якія заслугоўваюць агульнай увагі”. З газеты чытачы маглі даведацца пра афіцыйныя ўказы, аб’явы продажу маёмасці, таксы, курсы золата і срэбра, аб кірмашах, рынках, судаводстве, вучэбных установах і г. д. Тут публікаваліся артыкулы, якія потым маглі быць надрукаваныя асобнай кніжкай. Напрыклад, артыкулы С. Н. Д. “Из летописи Гродненского Борисо-Глебского мужского монастыря” (1896), Л. Паеўскага “Государево внимание и Царская милость” (1897), І. Раманоўскага “Православие в нынешней Гродненской губернии в связи с униями” (1899). Асаблівай увагай насельніцтва газета ГГВ не карысталася і распаўсюджвалася ў асноўным сярод расійскіх губернскіх чыноўнікаў. Прачытаць газету можна было ў *бібліятэцы публічнай гродзенскай*. Знайсці ГГВ можна ў рэдкіх кнігазборах Гродзеншчыны. Напрыклад, у гісторыка Т. Нарбута былі № 1–52 за 1838 і № 24–50 “неафіцыйнай часткі” за 1845 г. Пры гэтым рукой Нарбута на інвентары за 1846 г. напісана: “толькі нумары, у якіх ёсць гістарычныя артыкулы”. Падшыўка газеты ёсць у Расійскай рэспубліканскай бібліятэцы (былой Салтыкова-Шчадрына) у Санкт-Пецярбургу; асобныя нумары – у НГАБ у Гродне.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 19, с. 980, а. 3–7; Афанасьева Т.Ю. “Гродненские губернские ведомости” в фондах Национального исторического архива Беларуси в Гродно // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: “Гродзенская друкарня”, 2011. – С. 28–30; Белоруссия в эпоху феодализма. Т. IV. – С. 350–353, 359; Василькевич В.А. Буржуазные реформы 60–70-х гг. XIX в. (по материалам “Гродненских губернских ведомостей”) // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С. 79–83; Гродненские губернские ведомости; Гродно: Энциклопедический справочник. – Минск, 1989. – С. 47; Швед В.В. Губернскі Гродна: аповяды з гісторыі горада (канец XVIII – пач. XX ст.) / В.В. Швед. – Баранавічы: Баранав. узбуйненая друкарня, 2003. – С. 67–80.

“Гродненские епархиальные ведомости” – афіцыйны орган Гродзенскай епархіі, царкоўная газета, заснаваная 2.12.1900. Рэдактары: гісторык, вучань М. О. Каяловіча протаіерэй *М. Р. Дзікоўскі* (1901–1907), сакратар гродзенскай

кансісторыі, кандыдат багаслоўя М. І. Шалуцінскі (1907–1915). Першы нумар выйшаў у 1901, а друкавалася газета да верасня 1915. Мела выгляд кнігі, з'яўлялася два разы на месяц на рускай мове. Кожны нумар утрымліваў болей за 30 старонак, парадкавая нумарацыя захоўвалася на працягу года. Складаліся з афіцыйнай і неафіцыйнай частак. У першай змяшчаліся звесткі пра жыццё царскай сям'і, урадавыя распараджэнні, пастановы царкоўных улад. У другой – рэлігійныя матэрыялы, артыкулы па гісторыі царквы ў Беларусі, па краязнаўстве, археалогіі і этнаграфіі. У 1907–1909 як дадатак да газеты выдаваліся брашуры і кнігі царкоўна-маралізатарскага зместу. У 1992 выданне ГЕВ было адноўленае па ініцыятыве архіепіскапа Валянціна (Мішчук). З 1998 ГЕВ выходзяць штомесячна тыражом 1 тыс. экз. Матэрыял падаецца ў наступных рубрыках: "Литературные страницы", "Молодёжный отдел", "Паломничество", "Церковь и общество", гістарычныя і краязнаўчыя матэрыялы, "Наши святыни". "Святоотческое наследие", "Наши архипастыри", "Из старых газет". Газету атрымоўваюць вясковыя святары, царкоўныя старасты, яна прадаецца ў гродзенскіх храмах.

Літ.: Гісторыя беларускай кнігі. У 2 т. Т. 2. Кніжнасць новай Беларусі (XIX – XXI ст.). / М.В. Нікалаеў і інш. – Мінск: БелЭн, 2011. – С. 110; Пяткевіч А.М. Слова і кніга Прынёмання. Зборнік навуковых артыкулаў. –Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 39; wikipedia.org/wiki/. Доступ 07.01.2022.

Гродніцкі Юзаф (19.03.1899, Конін – 31.03.1961, Ольштын) – акцёр, рэжысёр, дырэктар гродзенскага тэатра імя *Ажэшкі Э.* у 1934–38 гг. Яму ўдалося вывесці тэатр з матэрыяльнага крызісу. Трупа выступала з гастролямі па ўсёй Гродзеншчыне і Беласточчыне са спектаклямі "Каралеўскі адзіны сын", "Стэфан Баторы", "Калігула", "Мандарын Ву" і інш. Г. быў ініцыятарам выдання часопіса "Наша сцэна". Жыў па вул. Багуслаўскага, 9 (1938).

Літ.: Чарнякевіч А. Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада 1919–1939. – Гродна, 2015. – С. 87.

Гродно

1) Назва горада Grodno/Grodna, упершыню зафіксаваная ў польскай крыніцы – лісце мазавецкіх князёў 1325 г., а таксама ў перакладзе "Летапісца вялікіх князёў літоўскіх" на лаціну. У летапісах Альшэўскім і Панцырнага і Аверкі, Магілёўскай хроніцы Т. Сурты і Ю. Трубніцкага падаецца "Grodno, z Grodna, w Grodnie, do Grodna";

2) Старабеларуская форма назвы горада 17 ст. У "Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай" можна знайсці яе ў розных склонах: "доставал собе […] Гродна; дал ему посессию Гродно место, до Гродна, в Гродне, Кроль Стефан […] умер у Гродне, а в Кракове похован". Сустракаецца гэтая назва таксама ў актах земскага суда Гарадзенскага павета (1613 і 1633 гг.) і дакументах сярэдзіны 17 ст.

3) Расейская назва горада (хаця быў час, калі расейцы ўжывалі назву "Гродна").

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 25, 27–29; Госцеў А. П. Гродна: назвы горада на працягу 880-гадовай гісторыі // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: “Гродзенская друкарня”, 2011. – С. 62–71; Летапісы і хронікі Беларусі. Сярэднявечча і раньнемадэрны час, Мінск, 2010, с. 204, 205, 215, 444, 478, 481–483, 524, 35. 571, 580, 611, 624, 674, 675.

“Гродно цайтунг” – нямецкая газета, якая выходзіла на нямецкай мове падчас акупацыі горада. 1 снежня 1915 г. з’явіўся першы нумар газеты.

Грушэцкі Антонін (1734–1798) – мастак-базыльянін з Супрасля, які прыехаў у Гродна паводле запрашэння *Тызенгаўза А*. Упрыгожваў яго *палац:* выканаў 8 супрапортаў з вазамі і кветкамі, 6 – з чалавечымі фігурамі, 3 – з ландшафтамі, таксама зрабіў дэкаратыўны роспіс на столі і інш. З Гродна Г. напісаў ліст *Тызенгаўзу* ў Варшаву, у якім прасіў у таго хадайніцтва перад каралём, каб паслалі яго на вучобу ў Дрэздэн. Вядомыя яго 11 карцін на алегарычныя, міфалагічныя, свецкія і біблейскія тэмы, якія ён падарыў *Станіславу Аўгусту Панятоўскаму*: Св. Іеранім, Алегорыя адданасці, Марскі выгляд, Рознакаляровыя львы, Мужнасць Св. Варфаламея і інш. Г. спадзяваўся зрабіць кар’еру пры каралі, але атрымаў ад яго толькі пенсію ў 10 дукатаў на год. У 1788 разам са сваім вучнем афармляў *касцёл бернардзінскі*. Апошнюю сваю карціну напісаў у 1793.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 65; Dąbrowski S., Artyści na dworze Antoniego Tyzenhauza (przyczynki archiwalne)// Biuletyn historii i kultury. – 1933. – №. 3. – S. 137.

Грыбаедаў Мікалай Іванавіч (25.12.1898, в. Масюкі Аршанскага р-на Віцебскай вобл. – 10.09.1972, Гродна) – старшыня Гродзенскага *камітэта гарадскога выканаўчага* (1951–1955). У 1918 быў добраахвотнікам у Чырвонай арміі. Старшыня Шыбекскага сельсавета Каханоўскага р-на Віцебскай вобл. (1924–1930). У 1930–1939 – на савецкай працы. У 1940 стаў 1-м нам. старшыні Беластоцкага абласнога выканаўчага камітэта. У гады *вайны Вялікай Айчыннай* – начальнік палітычнага аддзела брыгады, камісар брыгады. З 1946 па 1951 – загадчык камунальнай гаспадаркі. Чалец Камуністычнай партыі Беларусі з 1927, узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам “Знак гонару”, медалямі. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, абласнога, гарадскога і раённых Саветаў дэпутатаў працоўных.

Крыніцы: дакументы, прадстаўленыя аўтару сям’ёй Грыбаедава.

Грыкоўскі Аляксандр (1893, в. Корніна Бельскага пав. – 13.2.1919, Гродна) – беларускі грамадскі дзеяч, настаўнік у першай *школе беларускай* у Гродне. Пасля заканчэння настаўніцкай семінарыі ў Панявежы і настаўніцкіх курсаў у Свіслачы працаваў настаўнікам. У Гродне з 1916 г. Быў першым старшынёй *камітэта Гродзенскага Беларускага нацыянальнага*, затым – сябрам Віленскага

Беларускага нацыянальнага камітэта. З'яўляўся сябрам Камітэта нацыянальнага адраджэння Беларусі, *управы Гарадзенскай беларускай губернскай*, камітэта Гродзенскага часовага. Памёр ад сухотаў і пахаваны на *могілках гродзенскіх*. У. Крынскі пра Г. пісаў: "Гэты малады ідэаліст працаваў не пакладаючы рук; ён быў усюды, дзе таго вымагала дабро беларускай нацыянальнай справы; ён вынес на сваіх плячох увесь цяжар піянерска-арганізацыйнага пачыну…". Газета "Бацькаўшчына" пасля смерці Г. змясціла праніклівы некралог.

Літ.: Крынскі Ул. Адраджэнскі рух у Горадзеншчыне // Новая дарога. – № 24. – 1942. – 06.09. – С. 4; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015. – С. 87; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў / А. Чарнякевіч. – Мінск: Янушкевіч, 2015, с. 33–34.

Грынкевіч Францішак (25.10.1884, Новы двор Сакольскага ў. – 26.7.1933, Гродна) – ксёндз, стваральнік і першы кіраўнік *Гуртка беларускай моладзі* (1909). Скончыў *гімназію гродзенскую*, затым духоўныя Віленскую семінарыю (1905) і Пецярбургскую каталіцкую акадэмію (1907), вучыўся ў Інсбруку (1907–1908) і Мюнхене (1908–1909). Меў навуковую ступень у галіне філасофіі. Свядомым беларусам стаў у студэнцкія гады ў Пецярбургу. У Інсбруку і Мюнхене належаў да невялічкага беларускага гуртка. З 1909 г. выкладаў Закон Божы ў *гімназіях* Гродна. У 1912 г. ён пакінуў гурток і больш актыўна заняўся рэлігійнай дзейнасцю. Матэрыяльна дапамагаў выдавецтву беларускага каталіцкага часопіса "Biełaruś" ў Вільні (1913–15) і пісаў туды артыкулы. З 1920 г. быў прэфектам гімназіі імя А. Міцкевіча, з 1930 г. – пробашчам парафіі ў Гожы. З усталяваннем на Гарадзеншчыне II Рэчы Паспалітай, пад ціскам улад і па прычыне пагаршэння здароўя, паступова адышоў ад беларускай грамадскай і асветніцкай дзейнасці. У міжваенны час быў катэхетам у гродзенскіх гімназіях і рэктарам касцёла Дабравешчання НМП сс. Назарэтанак. У 1930-х гг. у Гродне была вуліца імя Грынкевіча (цяпер вул. Розы Люксембург).

Літ.: З успамінаў Баляслава Грабінскага (1899–1991) // Горад святога Губерта: зборнік краязнаўчых артыкулаў. Выпуск 6 (2012). – Горадня: б.в., 2012. – С. 115, 123; Міхайлік Л. Каталіцкі касцёл у палітычным і грамадскім жыцці Гродна ў 1921–1939 гг. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 459; Станкевіч А. З Богам да Беларусі: збор твораў / уклад., рэд., каментары А. Пашкевіч, А. Вашкевіч. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008, с. 473, 477; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 13–15.

Губернатар гродзенскі – вышэйшая службовая асоба, начальнік губерні, надзелены адміністратыўнай, судовай, ваеннай і палітычнай уладай. Прызначаўся царом па прадстаўленні міністра ўнутраных спраў з ліку асоб, якія належалі да вышэйшых колаў дваранства. Абавязкі губернатара абумоўліваліся

настаўленнямі 1728 і 1764 гг. (галава і гаспадар губерні), наказам губернатарам 1837 г. (прадстаўнік вярхоўнай улады на месцы), указам 1856 г. (права выдаваць пастановы і інструкцыі, якія раскрываюць агульныя артыкулы законаў). Губернатар, як прадстаўнік вышэйшай урадавай улады, павінен быў сачыць "за непарушнасцю вярхоўных праў самадзяржаўя, карысцямі дзяржавы і дакладным выкананнем законаў, статутаў, найвышэйшых загадаў, указаў Сената і загадаў начальства". Губернатар з'яўляўся старшынёю губернскага праўлення, статыстычнага камітэта, губернскіх органаў (па сялянскіх справах, па земскіх і гарадскіх справах, па піцейных і па фабрычных справах, па вайсковай павіннасці і інш.). Быў таксама старшынёю або членам яшчэ прыкладна 20 камісій і камітэтаў, якія дзейнічалі ў губерні. Губернатар ажыццяўляў ведамасны і надведамасны нагляд за дзейнасцю падпарадкаваных яму ўстаноў і асоб: губернскага праўлення, камітэтаў і камісій, казённай палаты і яе ўстаноў, судовых палат і іх органаў, обер-паліцмайстра, гараднічага, землямераў, прыказа грамадскай апекі, сумленнасцю суда. Фінансавая дзейнасць губернатара тычылася збору розных падаткаў, нядоімак, складання штогадовых каштарысаў земскіх збораў, клопату аб належным становішчы ўсіх казённых будынкаў. Ваенныя функцыі вымушалі губернатара праводзіць рэкруцкія наборы, садзейнічаць ваеннаму начальству, турбавацца аб кватэрным і харчовым забеспячэнні воінскіх і рэкруцкіх каманд, якія знаходзяцца на тэрыторыі губерні. Выконваючы паліцэйскія абавязкі (а ў паліцэйскай дзяржаве яны носяць усемагутны і ўсёабдымны характар), губернатар падтрымліваў грамадскі парадак і спакой, забяспечваў дзяржаўную і асабістую бяспеку, сачыў, каб не было тайных таварыстваў, займаўся пошукам дзяржаўных злачынцаў і збеглых, назіраў за дзейнасцю пажарных служб, санітарнай і медыцынскай паліцыі, за асобамі, якія знаходзіліся пад наглядам паліцыі і інш. Судовая дзейнасць патрабавала ад губернатара займацца справамі грамадзянскага і крымінальнага судаводства: зацвярджэнне выбарных суддзяў, рашэнняў палаты грамадзянскага суда, сумленных судоў, нагляд за следствам (мог нават адмяніць прыгавор) і прызначэннямі ваеннага суда. Глядзі асобныя артыкулы па прозвішчах губернатараў.

Губернскае праўленне – орган, створаны ў Гродне ў 1802 г. паводле "Учреждения для управления губерний" для агульнага кіравання губерняй ад "імя Яе Вялікасці",. У яго склад уваходзілі *губернатар*, некалькі дарадцаў і віцэ-губернатар. У функцыі губернскага праўлення ўваходзіла абвяшчаць законы, распараджэнні ўрада і губернатара, сачыць за іх выкананнем, назіраць за добрапрыстойнасцю. Справаводства вялося канцылярыяй праўлення, якая мела чатыры аддзяленні. Даволі значная колькасць спраў вырашалася ў камітэтах і камісіях, а таксама ў апякунскім аб турмах таварыстве, апецы дзіцячых прытулкаў, органе для "освидетельствования умалишённых". Пры праўленні быў губернскі пракурор, які паводле "Учреждения о губерниях" з'яўляўся "прадстаўніком элемента законнасці і ахоўнікам закона".

Крын. і літ.: НГАБ, ф. 2002, воп. 1, с. 8, а. 226; Сборник циркуляров и распоряжений МВД, относящихся до гг. губернаторов, вице-губернаторов, советников губернских правлений, канцелярий гг. губернаторов, губернских типографий, строительных и учебных отделений с 1858 по 1894 год / Сост. КН. В.П. Урусов. – М., 1894. – С. 43; Шаўкапляс В. А. Асаблівасці арганізацыі мясцовых органаў кіравання і суда ў Беларусі ў канцы XIII – пачатку XIX ст. // Весці АН БССР. Сер. Грамад. Навук. – 1972. – № 2. – С. 48–55

Губерт Святы (каля 655, Аквітанія – 728?, Льеж) – магчымы патрон Горадні. Існуе легенда, што будучы святы паводзіў сябе ў маладосці зусім не як святы: праводзіў час весела і разгульна, любіў паляванне. І вось аднойчы яму сустрэўся алень з крыжам паміж рагамі, і пачуў ён голас з нябёс, які гаварыў яму кінуць такое жыццё і служыць Богу. Губерт паслухаўся і стаў вучнем маастрыхцкага біскупа Ламберта, а з цягам часу і яго пераемнікам (каля 704 г.). Біскуп Губерт прысвяціў сваё жыццё распаўсюджванню хрысціянства. Пасля смерці быў кананізаваны. Святы Губерт лічыцца апекуном паляўнічых. Па атрыманні *магдэбургскага права* алень Г. існуе ў якасці аднаго з асноўных элементаў гарадскога *герба.* Дзень Св. Г. (3 лістапада) доўгі час адзначаўся як Дзень горада. Існуе ўзнагарода – ордэн Святога Губерта: залаты крыж з каронай і надпісам "In Trau Vast" ("Стойкі ў вернасці"). У цэнтры знака намаляваная сцэна – Св. Губерт стаіць на калене, справа – яго конь, злева – алень з крыжам паміж рагамі. Ордэнская стужка была ў двух колерах: чырвоным (ахвярная любоў Хрыста) і зялёным (сімвал уваскрашэння і аднаўлення). Сярод узнагароджаных такім ордэнам былі і значныя асобы ВКЛ: Радзівілы – Міхал (1763), Дамінік (1773), Антоні (1782), Мацей (1787), Дамінік (1800), Сапегі – Аляксандр (1773), Францішак Ксаверы (1773) і інш.

Названую вышэй легенду аб з'яўленні аленя з крыжам паміж рагамі даследчык В. П. Пазнякоў звязвае з другім святым – візанційцам Яўстафіем Плакідам, які быў вядомы на тэрыторыі старажытнай Русі з XI ст. С. Расадзін у сваім артыкуле піша, што "алені з крыжам паміж рагоў і ў гродзенскім гербе сярэдзіны XVI, і ў гербе Цырына канца XVIII стагоддзяў могуць быць звязаныя як са св. Губертам, так і са св. Яўстафіем" .

Паводле версіі беластоцкага гісторыка Алега Латышонка патронам Горадні быў Святы Амерык Венгерскі – венгерскі святы з роду Арпадаў, сын першахрысціцеля Венгрыі Стэфана (Іштвана), каралевіч. Легенда была запісаная ў 1370-х гадах у Roczniku mansjonarzy krakowskich, што верагодна звязана з прыходам да ўлады ў Каралеўстве Польскім Лаёша I Вялікага (Людвіка Венгерскага). Пашыраная версія легенды знаходзіцца ў "Аналах" Яна Длугаша. У легендзе гаворыцца пра паляванне Амерыка на аленяў на Лысай Гары пад Кельцамі, заснаванні тут бенедыктынскага абацтва. Святакрыжскі кляштар наведвалі многія польскія каралі і вялікія князі літоўскія. Асабліва гарачую любоў да крыжа адчуваў Ягайла-Уладзіслаў, жанаты на Ядвізе Венгерскай – дачцэ Людвіка Венгерскага, які шанаваў сваіх святых – Стэфана, Амерыка і Уладзіслава. Ушаноўваў іх і Казімір Ягайлавіч, культ якога як святога фармаваўся

паводле ўзору культа Амерыка. На сувязь паміж імі ўказвае і паліхромія ў барокавай пазнанскай фары, якая прадстаўляе Маці Божую са Св. Казімірам і Св. Амерыкам. Гэтыя святыя мелі падобныя выявы – трымалі ў руцэ лілію (сімвал цнатлівасці). Аляксандр, надаючы Горадні магдэбургскае права, мог надаць і герб з выявай аленя Св. Амерыка (без крыжа паміж рагамі, які ўзнік пазней). Атаясамліванне гарадзенскага аленя з аленем Св. Губерта пачалося разам з распаўсюджваннем легенды пра яго на пачатку XVIII ст.

Літ.: Пазьнякоў В. Вось сымбаль твой // Наша ніва. – 1998. – 6.06. = С. С. 8; Расадзін С. Пра сімволіку герба г. Гродна// Беларускі археаграфічны штогоднік. Вып. 3. – 2002. – С. 142–146; Латышонак А., Святы Амерык Венгерскі – сапраўдны патрон Горадні? // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 72–79; Павач А. Гродзенскія гісторыі. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2019. – С. 126–128.

Гудэрлей Ян (?, Гродна – 06.01.1872, Сен Север, Францыя) – паўстанец 1830–31 гг. Вучыўся ў ліцэі. У *паўстанні Лістападаўскім* служыў падпаручнікам 6 палка конных стралкоў. Пасля паражэння паўстання 15.07.1831 перайшоў у Прусію. 02.1832 прыбыў у Францыю і пасяліўся ў Безансоне. 06.03.1833 адасланы ў Бержэрак, 05.1833 прыбыў у Сен-Север дэп. Ланды. 05.1835 спрабаваў атрымаць дазвол на навучанне медыцыне ў Манпелье дэп. Эроль, але яму было дазволена пераехаць толькі ў Бардо. У 11.1835 ужо вярнуўся ў Сен Север, каб распачаць працу на фабрыцы свечак. Затым жыў у Мон-дэ-Марсан дэп. Ланды. У 1838 г. вярнуўся ў Сен Север. У 03.1846 далучыўся да акту кракаўскага паўстання. Нежанаты.

Літ.: Гарбачова В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: Біяграфічны слоўнік. – Мінск, 2004, с. 118; Bartkowski J. Spis Polaków zmarłych w emigracji od roku 1831. – ?, 1985, s. 161; Bielecki R. Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego. T. 2. – Warszawa, 1995, s. 131; "Dziennik Narodowy", 1842, № 72. S. 288; Tyrowicz M. Towarzystwo Demokratyczne Polskie. 1832–1863. Przewodnik biobibliograficzny, Warszawa, 1964, s. 210.

Гурская Ізабэла – танцоўшчыца *тэатра Тызенгаўза*. Калі *Ле Ду* заснаваў новую *школу балетную* ў 1801 г., яна яму актыўна дапамагала.

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. T. I. – Lwów, 1925. – S. 405.

Гурткі народнікаў (1870–1880-х гадоў). Першы ўзнік у Гродне летам 1875 г., падчас "хаджэння ў народ". Створаны студэнтам медыка-хірургічнай акадэміі ў Пецярбургу С. І. Бельскім. У Г. н. уваходзілі вучні мясцовай гімназіі К. І. Бельскі (брат стваральніка), А. І. Слуцкі, Д. і І. Роўтэнштэйны, былы пецярбургскі працаўнік друкарні, наборшчык гродзенскай *друкарні* М. Янчэўскі, С. Р. Андрэс, служачыя Т. І. Нагорскі, Г. Р. Аўгустоўскі, выхадзец з сялян В. М. Раманоўскі. З восені 1875 гуртком кіравалі Слуцкі і Янчэўскі. Чальцы гуртка чыталі нелегальныя выданні П. Л. Лаўрова, М. А. Бакуніна,

Л. А. Ціхамірава Жандармы выявілі Г. н. у сакавіку-красавіку 1876 і большасць гурткоўцаў арыштавалі. У 1879 народніцкая арганізацыя "Зямля і воля" раскалолася на 2 арганізацыі: "Чорны перадзел" і "Народная воля", у склад якіх і ўвайшла большая частка былых гурткоўцаў. Гурток "Чорнага перадзелу" дзейнічаў з лета 1880 да канца 1881. У яго ўваходзілі наборшчыкі губернскай друкарні П. Кавальскі, Я. Грынкевіч; гімназісты У. Руткевіч, С.Андрэйкавіч, Л. Гарадзішча; служачыя С. Р. Андрэс, М. Любіч, А. Баткоўскі, І. Тарноўскі; акушэркі М. Пумпянская, С. Гурэвіч; вучні *гімназіі* А. Вальбушэвіч, Д. Драўніцкі. Асаблівасцю гэтага Г. быў актыўны ўдзел яго чальцоў у прапагандысцкай дзейнасці сярод рабочых і гімназістаў, сялян вакольных вёсак, удзел у стварэнні друкарні ў Мінску. Гурток "Народнай волі" узнік на пач. 1880 і дзейнічаў да 1884. Кіраўніком быў Л. Э. Гарадзішча, а найбольш актыўнымі чальцамі – Б. Б. Базілінскі, М. Ваўкавыскі, Грынкевіч, А. А. Густановіч, Любіч, А. І. Марголін, В. А. Руткевіч, К. Ульянінскі, Янчэўскі. Гурток распаўсюджваў нелегальныя выданні, прапагандаваў нарадавольскія ідэі сярод навучэнцаў і інтэлігенцыі. Супрацоўнічалі з іншымі рэвалюцыйнымі гурткамі Беластока, Варшавы, Вільні, Віцебска, Мінска, Харкава. З-за гэтых сувязяў гурток і быў выкрыты, а яго чальцы арыштаваныя.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 47–48; Самбук С.М. Революционные народники Белоруссии (70-е – начало 80-х годов XIX в.), Мн., 1972; Лосинский Н.Б. Революционно-народническое движение в Белоруссии, 1870–1884 гг., Мн., 1983; Czerepica W. Związki rewolucjonistów Białorusi i Polski w latach 70–80 XIX wieku, Warszawa, 1985.

Гурток гарадзенскі беларускай моладзі – па некаторых звестках называўся "Хатка", існаваў у Гродне з верасня (кастрычніка) 1909 па вясну 1914 г. Заснаваны ў Бернардзінскіх мурах у кватэры кс. *Грынкевіча Ф.,* які і стаў кіраўніком гуртка. Ініцыятарамі былі гімназісты апошніх класаў *Адам Бычкоўскі,* Ф. Эйсмант, *П. Аляксюк*, сёстры Салянка Ганна і Марыя, выпускніца гімназіі Гелена Шэгідэвіч, вучаніца 6 кл. Сівіцкая Людвіка (*Верас Зоська*). У выбраны ўрад увайшлі: вучань 7 класа А. Бычкоўскі (старшыня), П. Аляксюк (нам. старшыні), З. Абрамовіч (сакратар). Бібліятэкарам прызначылі В. Зоську. Са студзеня 1912 г. кіраўніком гуртка быў Казюк Калышка, а з восені 1913 – Адольф Зянюк. Мэтаю гуртка было аб'яднанне беларускай моладзі, самаадукацыя і ўмацаванне сувязі з вёскай для развіцця нацыянальнай свядомасці, распаўсюджванне ведаў пра Беларусь, яе гісторыю, культуру і мову. Паседжанні адбываліся спачатку ў памяшканні Грынкевіча, які быў школьным капеланам, а пазней – у маці Сівіцкай на Гараднічанскай вул. Тут праходзілі лекцыі па гісторыі, геаграфіі, літаратуры і спектаклі-вечарыны. Гурткоўцы выязджалі на вёскі (асабліва ў Сакольскі ў.), дзе давалі спектаклі ("Па рэвізіі" М. Крапіўніцкага, "Модны шляхцюк" К. Каганца, "Міхалка" Далецкіх, "Варажба цыганкі"). Сябры гуртка праводзілі вечарыны, выступалі на паседжаннях з рэфератамі, раздавалі беларускія літаратуру і перыёдыку, збіралі па вёсках этнаграфічныя матэрыялы. Гурток зарганізаваў свой хор і аркестр,

бібліятэку бел. выданняў. Ладзіліся экскурсіі на бераг *Нёмана*. На пачатку школьнага 1910–11 г. колькасць сябраў значна павялічылася, таму гурток падзялілі на 3 секцыі: старэйшую, сярэднюю і малодшую. Трэба адзначыць, што да гуртка належала шмат дзяцей засцянковай шляхты. Падтрымоўвалі сувязі з рэдакцыяй "Нашай Нівы", суполкай "Загляне сонца і ў наша аконца", беларускай кнігарняй у Вільні, Беларускім навукова-літаратурным гуртком студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта, гродзенскім Польскім гуртком самаадукацыі ("Zjednoczenie Postępowo-Niepodległościowe"). Выдалі вясной 1913 г. аднадзёнку "Колас беларускай нівы" (50 экз.). Перапісваліся з Луцкевічам І., Ластоўскім В., Уласавым А. У 1912, пасля Новага году, ксёндз Грынкевіч пад ціскам каталіцка-нацыяналістычных колаў адышоў ад гуртка, увосень 1913 Сівіцкая Л. з'ехала ў Варшаву на курсы медсясцёр. Новы старшыня А. Зянюк нядоўга спрабаваў падтрымаць дзейнасць гуртка, і ён скончыў сваё існаванне.

Літ.: З успамінаў Баляслава Грабінскага (1899–1991) // Горад святога Губерта: зборнік краязнаўчых артыкулаў. Выпуск 6 (2012). – Горадня: б.в., 2012. – С. 113–121; Пяткевіч А.М. Гродзенскі гурток беларускай моладзі і Сакольшчына // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1998. – n. 9. – S. 136–141; Смалянчук А. Гродзенскі гурток беларускай моладзі // Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства. – Гродна: б.в., 1990. – С. 34–36; Сівіцкая Л. Горадзенскі гурток беларускай моладзі (1909–1914) // Горад святога Губерта. Вып. 1. / пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Сейны, 2002. – С. 87–95; Станкевіч А. З Богам да Беларусі: збор твораў /уклад., рэд., каментары А. Пашкевіч, А. Вашкевіч. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008, с. 474–477.

Гурток марксісцкі, узнік у Гродне ў 1887 г. для самаадукацыі і аб'яднаў каля 20 чал. Да восені 1893 узначальваў яго чыноўнік Гродзенскай палаты дзяржаўных маёмасцяў *Дзем'яновіч М. А.*, а пасля – урач вайсковага шпіталя *Галюн С. Ф.* У Г. уваходзілі: студэнт *П. І. Шумаў*, паручнік Мяцеліц У. Я., медсястра Варэнік Я. С., палітычны паднаглядны П. Ф. Баар і інш.. Вывучалі працы К. Маркса, Ф. Энгельса, М. А. Дабралюбава, Г. Гегеля, Л. Феербаха і інш., крытыкавалі ідэалогію і тактыку народавольцаў. Мелі сувязь з Пецярбургам, Кіевам, Казанню і інш. гарадамі. Спрабавалі весці агітацыю сярод вучняў і сялян. У ліпені 1894 Г. быў разгромлены. У 1895 узнік пад кіраўніцтвам Шумава новы гурток марксісцкага напрамку. У яго ўваходзілі: Лапін М., Лапіна К., Лапін Л., Г. Ковенская, У. Цяпліцкі і інш. У 1897 Г. пачаў прапаганду, а затым эканамічную і паліт. агітацыю, і ў выніку склалася арганізацыя каля 250 чал. пад кіраўніцтвам камітэта.

Літ.: Бич М.О. Развитие социал-демократического движения в Белоруссии. Мн., 1973; Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 180–181; Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 67–68.

Гурэвіч Фрыда Давыдаўна (1.01.1912, Рыга – 8.09.1988) – археолаг, доктар гіст. навук, спецыяліст у галіне вывучэння старажытнай і сярэднявечнай культуры паўднёва-ўсходняй Прыбалтыкі і беларускага Панямоння. У 1932 скончыла інстытут імя Герцэна ў Ленінградзе, у 1938 абараніла канд. дысерт.

па тэме "Саксонскае паўстанне 1073–1075 гг.". З 1937 працавала ў Ленінградскім аддзяленні Інстытута археалогіі АН СССР. У 1942–44 жыла і працавала ў Ташкенце, карэспандавала з даследчыкам старажытнай архітэктуры М. М. Вароніным, які ў 1949 будзе даследаваць Гродна. У 1949–51 Г. вяла раскопкі ў Калінінградскай вобласці, нядаўна далучанай да СССР. З 1956 г. пераключылася на даследаванне помнікаў Заходняй Беларусі. У выніку адкрыла шэраг гарадзішчаў, неўмацаваных паселішчаў, курганных і грунтавых магільнікаў 1 тыс. н. э. і XI–XIV ст. Выдала 2 манаграфіі: "Древности Белорусского Понеманья" (М; Л., 1962) і "Древние города Белорусского Понеманья" (Минск, 1982). Г. даказала, што ўжо ў канцы 1 тыс. н. э. у беларускім Панямонні (яна таксама выкарыстоўвала назву Чорная Русь) фармуецца славяна-літоўскае памежжа. Аўтар болей за 120 навуковых публікацый. Сярод іх артыкул "Из истории раннего Гродно" (Советская археология, 1951, № 15, с. 82–95), у якім пісала пра першы ўспамін князя У*севаладка Гарадзенскага* ў 1116 г., а горада ў 1127 г., звязвала яго ўзнікненне з паходамі Уладзіміра (980 г.) або Яраслава Мудрага (1038), стварэнне паселішча датавала мяжой X–XI ст. Матэрыялы пра Гродна ёсць і ў наступных публікацыях Г.: О формировании городов Черной Руси по данным археологии (Советская археология, 1983, №3, с. 61–71); Происхождение городов Черной Руси (Беларускія старажытнасці, Мінск, 1972. С. 191–192); Города Черной Руси: К истории городов белорусского Понеманья (Этногенез белорусов. Тезисы докладов на конф. по проблеме "Этногенез белорусов". Минск, 1973, с. 34–37).

Літ.: Ревуненкова Е. В., Ревуненкова Н. В. Фрида Давыдовна Гуревич (01.01.1912—02.09.1988) // Записки ИИМК РАН. СПб: 2012, № 7. С. 233—244; Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі ў 5-ці тамах, Т. 2, с. 236.

Гучы (Gucci, Guci, Guczy) **Санці** (Ксанці) **Фіярэнціна** (каля 1530, Фларэнцыя – 1599/1600) – італьянскі архітэктар і скульптар. У Польшчы з'явіўся не раней за 1550 і з 1558 быў архітэктарам каралеўскім Жыгімонта Аўгуста, Ганны Ягелонкі і *Стэфана Баторыя*. Запрошаны равінам Левушам у Гродна. Прыняў тут удзел у пабудове мураванай *Вялікай сінагогі*, будаваў так званую *"Баторыеўку"*, быў аўтарам праекта мураванага касцёла *Фары Вітаўта.* Доўгі час лічыўся архітэктарам *Старога замка*. Першым сказаў пра гэта Андрэй Фішынгер, затым падхапілі *А. Трусаў,* У. Бачкоў, В. Баравы. Іншага архітэктара (дакладней муляра дэ Кгрыпа) прапанавалі Г. Семянчук і А. Шаланда. О. Гайдук, якая ў сваёй кандыдацкай працы і ў выдадзенай манаграфіі адзначыла, што Г. не мог быць архітэктарам Старога замка, бо быў заняты ў гэты час будаваннем іншых аб'ектаў у Сандаміры, Рызе, Варшаве, пад Кракавам. М. Каламыйская-Саед адмовілася ад Гучы на карысць Юзафа Ройтэна (Райсціна), які паходзіць не са Львова, а з мясцовасці Ройтэн каля Лінца ў Аўстрыі.

Літ.: Гродзенскі Стары замак // Мастацтва Беларусі. – 1989. – № 6, с. 48; Семянчук Г. Гарадзенскія замкі ў 1578 г. // Краязнаўчыя запіскі. 2013. – № 9, с. 55–62; Я. Супрон публікацыя ў фэйсбуку 24.04.2019; Трусов И.Г. Архитекторы, которые работали

в Гродно в XVI веке // Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў /Склад. Л. І. Турмасава; навук. рэд. С.В. Марозава. – Гродна, 2011, с. 125–136; Шаланда А.І. Антоні дэ Кгрып, муляр гарадзенскага замка, і яго род у канцы XVI – першай палове XVII ст. Краязнаўчыя запіскі. Вып. 8. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2012. – С. 17–26; Czyżewski K. Gucci Santi // Słownik biograficzny historii Polski. T. 1 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C. 503; A. Fischinger. Santi Gucci, architekt i rzeźbiarz królewski XVI wieku. – Kraków, 1969, s. 34–36; Hajduk O. M. Kilka uwag o batoriańskiej przebudowie Starego zamku w Grodnie oraz jej współczesnej rekonstrukcji // Biuletyn Historii sztuki. – T. 83. – 2021. – n. 4. – s. 843–858.

Д

Дабравольскі Мікалай Аляксандравіч (10.03.1854 – 19.10.1918) – гродзенскі *губернатар* з 2.04.1899 па 19.10.1900. Нарадзіўся ў сям'і патомных дваран Наўгародскай ці Смаленскай губ., праваслаўны. З юнацкіх гадоў быў у блізкіх адносінах з вялікім князем Міхаілам. У 1876 скончыў юрыдычны факультэт С.-Пецярбургскага ўніверсітэта са ступенню кандыдата права. Пасля 5 месяцаў службы ў Кавалергардскім палку 6.04.1877 быў адпраўлены ў адпачынак па прычыне хваробы ў званні ўнцер-афіцэра, 20.05.1877 прызначаны кандыдатам на судовыя пасады пры пракуроры С.-Пецярбургскага акруговага суда. У маі-ліпені 1878 зноў прыйшлося паслужыць у сваім палку, з якога звольніўся ў запас. Следчую працу працягнуў у Міністэрстве юстыцыі, быў таварышам валынскага, а потым жытомірскага губернскага пракурора, пракураў Кіеўскага (1882–86) і Пецярбургскага (1886–88) акруговых судоў. Затым працаваў пракурорам Мітаўскага (1891–95) і Рыжскага (1895–97) акруговых судоў. 27.02.1896 атрымаў чын стацкага дарадцы.

Гродзенскі перыяд жыцця і дзейнасці Д. пачаўся ў 1897 г., калі 8.02 яго прызначылі гродзенскім віцэ-губернатарам. Указам Мікалая II ад 2.04.1899 прызначаны выканаўцам абавязкаў гродзенскага губернатара, а ўказам ад 5.02.1900 г. – гродзенскім губернатарам. 18.04.1899 стаў сапраўдным стацкім дарадцам, а 29.08.1900 г. атрымаў званне камергера імператарскага двара. 19.10.1900 прызначаны обер-пракурорам 1-га дэпартамента Сената, з захаваннем прыдворнага звання. 31.10.1900 склаў губернатарскія паўнамоцтвы, але 29.01.1903 быў прызначаны ганаровым міравым суддзёй Гродзенскага акруговага суда на 1902–1905, 1905–1908, 1915. У 1909 стаў ганаровым сябрам *таварыства Гродзенскага сельскай гаспадаркі*.

18.10.1906 Д. атрымаў чын тайнага дарадцы і быў прызначаны сенатарам з выкананнем абавязкаў обер-пракурора 1-га дэпартамента Сената (да 30.09.1915). У 1910–1911 быў старшынёй Камітэта па напісанні гісторыі Сената, рэдактарам 5-томнага выдання. З 20.12.1916 па 27.02.1917 быў кіраўніком Міністэрства юстыцыі. Затым стаў намеснікам старшыні Савета міністраў. Напярэдадні Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. заняў пасіўнае становішча, потым падтрымаў увядзенне ў Петраградзе асаднага становішча. Быў арыштаваны Часовым урадам, сядзеў у Петрапаўласкай крэпасці, але 30.07 яго апраўдалі і вызвалілі. 22.08 атрымаў дазвол выехаць на лячэнне на Каўказ. У верасні 1918 Д. у якасці закладніка быў расстраляны (ці зарублены шашкай) у Пяцігорску.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2. Воп. 24, с. 2380, а. 50, 56; ф. 1, воп. 9, с. 970, а. 84; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007.



С. 847

Давыд (Давід) Даўмонтавіч, Давыд Гарадзенскі (каля 1287, па іншых звестках 1283 – ліпень ці пачатак жніўня 1326, па іншых звестках 1327) – сын нальшчанскага князя Даўмонта і дачкі наўгародскага князя (унучкі Аляксандра Неўскага) Марыі Дзмітрыеўны**.** Па лініі бацькі Д. Д. належаў да літоўскіх князёў, а па лініі маці – да Рурыкавічаў (даследчык М. Малішэўскі сцвярджае, што праз Д. Д. прыйшоў да Віценя і Гедыміна герб “Пагоня”). Польскі даследчык Ян Тэнгоўскі лічыць, што акрамя хрысціянскага імя ў Д. Д. было яшчэ і літоўскае. Староста гарадзенскі (1304/05 – 1326), намеснік вял. кн. літоўскага на *Чорнай Русі,* князь Пскоўскі (1322). Гісторык В. М. Чарапіца піша, што ён “был высок (2 метра), атлетически сложен” (крыніца не ўказаная аўтарам і малаверагодная). Жыў з бацькам, які стаў пскоўскім князем, і марыў пра вяртанне на Радзіму. Гэта адбылося пасля смерці *Даўмонта* (Цімафея), які, паміраючы, даў наказ сыну: ехаць у ВКЛ і служыць Радзіме. Літоўскія хронікі называюць Давыда вайсковым настаўнікам будучага гаспадара Літвы Альгерда. Потым Давыд Даўмонтавіч паступіў на службу да вялікага князя літоўскага *Віценя*. Пры *Гедыміне* служыў на пасадах гарадзенскага *старасты* і з 1312 г. кашталяна (каменданта) гарадзенскага *Старога замка* на працягу 25 гадоў. Гедымін аддаў сваю дачку Біруту замуж за Д. Д. Магчыма, тады ён атрымаў у пасагу каралеўскі двор Верцялішкі, недалёка ад Гродна. Паводле польскага даследчыка Ю. Слівінскага, Д. Д. быў *князем гарадзенскім*. Ахоўваў *Горадню* і княства ад крыжацкіх нападаў. У 1306 тыя зрабавалі і спалілі горад. У 1314 г. дапамагаў адбіць іх наступ на Наваградак. У 1319 (па іншых звестках у 1236) са сваімі ваярамі захапіў шмат палонных і ваеннай здабычы ў Вогенсдорфе (Wohensdorf ці Wunsdorf, Прусія). Калі ў 1320-х гадах да Рыгі дайшлі чуткі, што Давыд Гарадзенскі хоча пераехаць у Пскоў, дык рыжане прасілі Гедыміна угаварыць яго, каб застаўся. У 1322 і 1323 гадах па просьбе жыхароў Пскова абараняў іх родны горад спачатку ад лівонскіх рыцараў, а пазней ад дацкага войска. Магчыма, у Ізборску княжыў ягоны сын Яўстафій, таму, відаць, Давыд Гарадзенскі спяшаўся на дапамогу Пскову. У пасланні рады горада Рыгі Гедыміну [да 2.10.]1323 г. гаварылася: “Затым даведаліся мы, што спадар Давыд стаў цяпер князем пскоўскім. А паколькі вы з ім асабліва блізкія сябры, дык мы настойліва просім вашу міласць зрабіць ласку так, каб пры вашым уплывовым пасярэдніцтве ён стаў бы сябрам нашага горада і апекуном нашых грамадзян, таму што яны шмат разоў праязджаюць праз яго землі, мы [у сваю чаргу] гатовыя аказваць паслугі”. У лістападзе 1324 г. Д. Д. здзейсніў набег на Мазовію, саюзніцу братоў-рыцараў, знішчыў г. Пултуск (рэзідэнцыю біскупа плоцкага), спаліў 120 (па іншых звестках 130) мястэчак і вёсак, якія належалі біскупу і мазавецкаму князю, зруйнаваў 30 касцёлаў і захапіў у палон 4 тыс. чалавек (Лызлоў піша, што жорсткасць Д. Д. перабольшаная). Так ён адпомсціў *крыжакам* за напад на яго маёнтак Верцялішкі

ў 1324. Тады 134 браты-крыжакі і 60 ваяроў з Натангіі забілі 38 чал., забралі 100 коней, вялікую колькасць жывёлы. Некаторыя крыніцы гавораць пра забойства жонкі Д. Д. Біруты/Наталлі, але хутчэй за ўсё яна ў гэты час ужо не жыла – яе пахавалі ў Пскове побач з маці Д. Д. Пасля паходу на Мазовію польскі кароль прызнаў Падляшша за ВКЛ. У 1324 г. Давыд Гарадзенскі зноў прыйшоў на дапамогу Пскову, дзе разам з сынам прагнаў нямецкіх рыцараў. У 1326 (па іншых звестках летам 1327) Давыд Гарадзенскі, на чале 1200 коннікаў і з атрадам польскага войска, на загад Гедыміна, саюзніка польскага караля Уладзіслава Лакеткі, здзейсніў спусташальны рэйд на Брандэнбург. Падчас вяртання з паходу князь зрабіў у Мазовіі прывал – тут і сустрэла яго смерць. Падкуплены крыжакамі мазавецкі рыцар *Гост Андрэй* знянацку ззаду напаў на князя ў намёце і забіў яго дзідай (Лызлоў піша пра забойства Давыда кінжалам, калі ён паіў каня ў рацэ). Легенда гаворыць пра тое, што вайскоўцы прынеслі Д. Д. пад сцены *царквы Барыса і Глеба на Каложы* і тут яго пахавалі. У 2003 г. недалёка ад царквы (з удзелам аўтара дадзенай кнігі) быў пастаўлены вялікі камень з надпісам "Давыду Гарадзенскаму (1287–1326) – славутаму абаронцу Гродна ад крыжацкай навалы. Ад удзячных нашчадкаў". У чэрвені 2018 г. на вуліцы Давыда Гарадзенскага яму быў пастаўлены помнік з белага граніту (скульптар С. Аганаў).

Літ.: Ермоленко В. А., Черепица В.Н., 400 имён: жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 11; Лызлов В. История земли варяжской Руси и борьбы русского народа с латинской пропагандою в пределах ея. – Вильна, 1886. – С. 15–16; Швед В.В. Давыд Даўмонтавіч – абаронца зямлі Гарадзенскай // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 106–109; BJ Rkp 6320. IV. Słownik geograficzno-historyczny Wielkiego Księstwa Litewskiego sporządzony przez Jana Prekiera, k. 10; Dymek B. Historia i kultura Mazowsza do 1526 r. – Żyrardów, 2005. – S. 74, 83–84; Piotr z Dusburga. Kronika ziemi Pruskiej. – Toruń, 2004. – S. 226, 228, 231, 233, 234; Scriptores verum Prussicavum. T. I – V, Lejzig, 1861–1874, s. 706–708; Śliwiński J., Wyodrębnianie się puszczy przynależnej do Grodna // Puszcze wielkoksiążęce na północnym Podlasiu i zachodniej Grodzieńszczyźnie w XV-XVI wieku (podziały, administracja, służby leśne i wodne). – Olsztyn: wyd-wo uniwer. Warmińsko-Mazurskiego, 2007. – S. 102–105; Tęgowski J. Rola Grodna w składzie Wielkiego Księstwa Litewskiego w XIV i początkach XV wieku // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 61–63.

Давыдаў Дзяніс Васільевіч (28.07.1784, Масква – 4.05.1839, в. Верхняя Маза, цяпер Радзішэўскага р-на, Ульянаўскай вобл.) – расійскі байкапісец і вайсковец, камандзір вайсковай партызанскай часткі, якая вызваліла Гродна ад напалеонаўскіх войскаў падчас вайны 1812 г. Службу пачаў эстандарт-юнкерам у кавалергардскім палку. За байкі і сатыры на палітычную тэму быў з яго пераведзены ў правінцыйны гусарскі полк, размеркаваны ў Кіеўскай губ. З 1806 ротмістр лейб-гвардыі гусарскага палка ў Паўлаўску каля Пецярбурга, з 1807 – ад'ютант П. І. Баграціёна, ўдзельнік бітвы пад Прэйсіш-Эйлау.

Затым прымаў удзел у войнах са Швецыяй (1808–1809), у Малдавіі і Турцыі (1808–1810). У красавіку 1812 атрымаў чын падпалкоўніка і стаў камандзірам першага батальёна Ахтырскага гусарскага палка. У 1812 біўся з напалеонаўскай арміяй пад Мірам, Раманавым, Дашкоўкай і ва ўсіх бітвах з авангардам праціўніка ад Дарагабужа да Гжацка, у бітве пад Шэвардзіно. З 25.08 вёў партызанскую вайну. У 1813–1814 удзельнічаў у замежным паходзе расійскай арміі ў Германіі, Францыі. У 1826 прымае ўдзел у вайне супраць персаў на Каўказе. Генерал-лейтэнантам ліквідоўвае *паўстанне 1831* у Беларусі. Пахаваны ў Маскве ў Новадзевічым манастыры побач з радавымі магіламі продкаў.

Літ.: Гусары Российской империи / сост. Минск: Букмастер, 2012. – С. 68–95; Давыдов Д.В. Военные записки / Предисл. О. Михайлова. – М.: Воениздат, 1982. – С. 239–245; Швед В. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. / В. Швед, С. Данскіх. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2006.

Давыдзёнак Васіль Фёдаравіч (13.04.1931, в. Слабада Маладзечанскага р-на – 30.05.1990, Гродна) – архітэктар, чалец Саюза архітэктараў. Скончыў адзяленне архітэктуры будаўнічага факультэта БПІ (1955–1961). З 1966 працаваў у інстытуце "Гроднаграмадзянпраект". Аўтар праектаў адміністратыўных і жылых будынкаў у мікрараёнах "*Фарты*–1", "*Пярэселка*–3", "*Дзевятоўка*–1", "Дзевятоўка–2", у тым ліку цэнтра "Вясёлка" па вул. *Урублеўскага* (з *Асадавым С.*), шэрагу 10-павярховікаў па вул. Горкага (з Клепікавым І. С.), будынка гарадскога камітэта Камуністычнай партыі Беларусі на пл. *Леніна* (1976).

Далмат-Ісакоўскі Францішак (? – 1654), у 1626 г. увайшоў у віленскі капітул, пробашч трабскі і гродзенскі. З 1650 – смаленскі біскуп. У 1654 заклаў у Гродне *касцёл св. Францішка Ксаверыя* і *калегіум езуіцкі*.

Далматаў (сапр. Лучыч) **Васіль Панцеляймонавіч** (1852, Далмацыя – 1912) – вядомы акцёр імператарскага тэатра. У летні сезон 1898 г. узначальваў таварыства артыстаў, якое выступала ў Гродне. Ён быў добрым партнёрам вялікіх "аляксандраўцаў" Савінай, Давыдава, Варламава. Таварыства артыстаў Далматава паказала гродзенскім гледачам "Рэвізора", "Гора ад розуму", "Гамлета", "Смерць Івана Жахлівага". Д. умеў глыбока пранікаць у сцэнічную задуму драматурга, востра выяўляць у сваіх сцэнічных героях іх сацыяльную сутнасць.

Літ.: Пашкин Ю. А. Русский драматический театр в Белоруссии XIX века / Ю. А. Пашкин, В. И. Нефед. – Минск: Наука и техника, 1980, 87–88, 154–155, 157.

Дамброўскі Фрыдрых – філолаг, дырэктар мужчынскай *гімназіі імя А. Міцкевіча* ў 1922–1928 гг. Аўтар ідэі стварэння ў Гродне агульнага ўніверсітэта (1923).

Літ.: Чарнякевіч А. Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада 1919–1939. – Гродна, 2015. – С. 93; Міхайлік Л. Адукацыя ў міжваенным Гродне ў 1921 – 1939 гг.// Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. – Мінск, 2013. – С. 329, 333.

Дамы майстроў – былыя басняцкія дамы, якія былі пабудаваныя да 1778 г. на вул. Раскоша (*Э. Ажэшкі*). У іх жыла гвардыя Тызенгаўза Антонія – наёмнікі з Босніі, Албаніі, Харваты. Сачылі за парадкам у эканоміі гродзенскай. Далей іх дамы сталі дамамі рамеснікаў. Пабудаваныя архітэктарам І. Г. Мёзерам (паводле звестак І. Трусава – Д. Сака) у часы рэформ А. Тызенгаўза для замежных майстроў, запрошаных ім для працы на мануфактурах у Гродне. Дамы ў стылі барока са спалучэннем класічных форм пабудаваныя ў 1768–1773 гг. гродзенскімі мулярамі і цеслярамі з выкарыстаннем новых для таго часу канструкцый і эканомным спалучэннем розных будаўнічых матэрыялаў. Упершыню для будаўніцтва было выкарыстана некалькі тыпавых праектаў. Бакавыя і задняя сцены аднапавярховага з мансардай дома выкананыя з брусоў таўшчынёй 25 см, а галоўная фасадная сцяна выкладзеная з цэглы і атынкаваная. Даўжыня дома па вулічным фасадзе складае каля 8 м, па бакавых сценах – 9 м, вышыня столі – 2,5 м. Дом мае фігурны франтон, які ўпрыгожвае яго і надае сваеасаблівасць. 2-схільны дах накрыты дахоўкай. На першым паверсе два жылых пакоі, кухня і сені, з якіх лесвіца вядзе на мансарду. Па абодвух баках вуліцы Раскоша было па 10 такіх дамоў. Адзіны захаваны дом быў рэстаўраваны ў 1990 г. паводле праекта У. Барсукова – В. Калніна. Капітальны рамонт адбыўся ў 2011–2012 гг. З 1994 г. у захаваным доме майстра знаходзіцца музей.

Літ.: Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы / Вашкевіч А., Госцеў А., Саяпін В. і інш. – Гародня, Вроцлаў, 2012. – С. 30–31; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / Рэд. Кал.: С.В. Марцэлеў (гал. Рэд.) і інш. – Мн.: БелСэ, 1986. – С. 56; Квитницкая Е.Д. Строительство Тизенгауза в Гродно // Строительство и архитектура Белоруссии. – 1988. – № 17. – С. 22–42; Раманава З.П. Гродзенскі "Домік майстра" // Архітэктура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. / Рэдкал.: А.А. Воінаў і інш.. – Мн.: БелЭн., 1993. – С. 172–173; Чантурия В.А. Архитектура Белоруссии конца XVIII – XIX века. – Мн.: Изд-во Министерства высшего, среднего специального и профессионального образования БССР, 1962. – С. 89–91; Швед В.В. "Квітнеючая Галандыя" на Нёмане // Швед В.В., Госцеў А.П. Горадня. Аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 сст.). – Гродна: Пергамент, 1997. – С. 72–73; Szymański S., Bośniacy w Grodnie końca XVIII wieku. // Rocznik Białostocki. – 1981. – T. XV. – S. 151–167.

Даніла Раманавіч (1201–1264) – князь галіцкі і валынскі, далучыў у 1253 г. Горадзен разам з усёй Чорнай Руссю да Галіцка-Валынскай зямлі: "Даниил (...) посла с братом и сыном Романом люди своя, и взяста Городен (...) того же лета присла Миндог к Данилу, прося мира", што замацавалася дамовай 1254 г. Відаць, ненадоўга, бо ў 1259 зноў захоплівае Горадзен і на наступны год губляе яго. Далей ўжо яго пераемнікі нападалі на горад (1275 і 1277).

Літ.: Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990 гг.) – Гродна, 1993. – С. 13–14, 153; Кібінь А. Ад ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурны трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – 5. – С. 185–192.

Данілаў Андрэй Сцяпанавіч (17.11.1910, в. Вежля, Актарскага р-на Саратаўскай вобл. – ?) – лётчык, у Чырвонай арміі з 1938 г. 22.06.1941 біўся з нямецкімі самалётамі ў небе над Гроднам, збіў 2 самалёты. Адным з першых у гады *вайны Вялікай Айчыннай* тараніў вінтом сваёй "чайкі" гітлераўскі самалёт у раёне Лунны, дзе збіў таксама 2 самалёты. Падчас бою быў паранены ў левую руку і нагу, галаву. Параненаму Д. дапамаглі жыхары в. Чарлёна Мастоўскага р-на. Указам Прэзідыума ВС СССР Д. "пасмяротна" быў узнагароджаны ордэнам Леніна. Але ён быў жывы і пасля шпіталя працягваў ваяваць: быў камандзірам авіяпалка, удзельнічаў у вызваленні Беларусі, Польшчы, разгроме Квантунскай арміі. З'яўляецца ганаровым грамадзянінам Гродна.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 214–215.

Дапельмаер Рыгор Гаўрылавіч (1789–?) – гродзенскі *губернатар* з 16.05.1836 па 19.11.1842. З дваран Разанскай губ. Служыў у 1801–08, 1814–15 у Маскоўскім архіве Калегіі замежных спраў, у 1808–1809 – у канцылярыі вайсковага губернатара С.-Пецярбурга Лабанава-Растоўскага. У 1809 знаходзіўся пры галоўнакамандуючым арміі князі Галіцыне ў Галіцыі і ўдзельнічаў у падпісанні прэлімінарнай канвенцыі аб перадачы Расійскай імперыі Цярнопальскай вобласці. 25.10.1817 звольніўся са службы і вярнуўся на яе ў 1826 г. дарадцам у Курляндскае губернскае праўленне ў чыне калежскага асэсара. З 12.12.1827 быў прызначаны на пасаду курляндскага губернскага пракурора, а з 23.01.1831 – на пасаду віленскага губернскага пракурора. З'яўляўся чальцом Камісіі для вызначэння ступені віны паўстанцаў 1830–1831 і канфіскацыі іх маёнткаў. З 12.02.1832 – віленскі віцэ-губернатар, з 3 мая – выканаўца пасады, а з 16.03.1835 – віленскі губернатар.

Царскім указам ад 16.05.1836 прызначаны гродзенскім губернатарам. У 1837 перадаў у Пецярбургскую археаграфічную камісію старажытныя дакументы, канфіскаваныя ў Сапегаў у м. Дзярэчын. Па даручэнні Д. гродзенскі аптэкар Адамовіч зрабіў хімічны аналіз вады з мінеральных крыніц у Друскеніках. Далей Д. падрыхтаваў праект адкрыцця там курорта, які быў зацверджаны царом. Крыніца №1 была названая Допельмаерскай. У 1837 садзейнічаў даследаванню і захаванню костак *маманта*, знойдзеных на беразе р. *Ласасянкі*. Пры губернатары Д. з 1838 пачалі выходзіць "*Гродненские губернские ведомости*". Ён праводзіў у жыццё царскія ўказы аб "именовании Литовско-Гродненской губернии – просто Гродненской" (18.05.1840), распаўсюджванні на Заходнія губерні дзеяння расійскіх законаў (25.06.1840) і расейскай мовы. Указам Мікалая 1 ад 19.11.1842 быў прызначаны мінскім губернатарам. Скончыў жыццё самагубствам.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 3, с. 2012, а. 1.–1 адв.; НИАБ в г. Гродно, ф. 1, оп. 34, д. 231, л. 86. Ф.1, оп. 13, д. 1161, л. 3–3об. Исторический очерк Белостокского института благородных девиц. 1841–1891 / Составил Н.П. Авенариус. – Белосток, 1891. – С. 55; Орловский Е.Ф. Гродненская старина. – Ч. 1. – Гродна, 1910. – с. 287;

Полное собрание законов Российской империи. – Т. 15. – СПб., 1830. – с. 444–445; Jodkowski J. Rok 1863 w powiecie Grodzieńskim // Echo Grodzieńskie. – Ф.1, оп.13, д.1161, л.3–3об. Grodno, 1921. – № 28.

Дарэўская Апалонія (1767–?) – танцоўшчыца ў *балеце Тызенгаўза А*. Выхоўвалася ў *школе балетнай* ў Гродне і Паставах. Пасля падзення Тызенгаўза апынулася ў Варшаве, дзе стала салісткай трупы "Таварыства танцораў Яго Каралеўскай вялікасці", гратэскавай танцоркай на прыдворнай сцэне і ў Нацыянальным тэатры Польшчы. Выконвала партыі ў балетах : "Мірза і Ліндар" (1786–88), "Рыбакі", "Лукас і Калінета", "Па-дэ-дэ" Ф. Шлянцоўскага. У 1788 на сцэне Варшаўскага тэатра адбыўся бенефіс Д. У 1794–1797 выступала ў прыватных антрэпрызах у Варшаве і Гданьску, у 1797 – на сцэне Імператарскага Марыінскага тэатра ў якасці прымы-балерыны.

Літ.: Черепица В. Н. 400 имён: жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гроднен. тип., 2014. – С. 425; Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. T. I. – Lwów, 1925. – S. 317–319; T. II. – S. 334.

Даўмонт (пам. 10.05.1299) – бацька *Давыда Даўмонтавіча (Давыда Гарадзенскага*), князь Нальшанскі, затым Пскоўскі. Сваяк ці сын Міндоўга. Удзельнічаў супраць яго ў змове разам з князем Транятам (1263). Прычынай яе было тое, што Міндоўг пасля смерці сваёй жонкі забраў жонку Даўмонта (яна была блізнючкай памерлай сястры). Варыяцыяй гэтай версіі з'яўляюцца не асабістыя матывы, а палітычныя – нянавісць да *крыжакоў* і абарона суверэнітэта ВКЛ, бо Міндоўг пакінуў тастамент, паводле якога ВКЛ пераходзіла б ў валоданне Нямецкага ордэна, калі б не было спадчынніка пасля яго смерці. Паводле другой версіі Д. не забіваў Міндоўга (зрабіў гэта князь Гердзень з Нальшан), а ўдзельнічаў у змове супраць князя Тройдзеня (1265), з якім паспрачаўся з-за жонкі. А таму падгварыў 6 сялян, якія яго забілі. Д. збег з Літвы ў Пскоў у 1266, прыняў хрысціянства (хрысціянскае імя Цімафей, Тэафіл). Уступіў у шлюб з Марыяй – дачкой князя Дзмітрыя, сына Аляксандра Неўскага. Арганізаваў абарону Пскова ад немцаў і ліцвінаў (1266, 1267, 1268, 1298). У 1267/68 Д. адпомсціў Гердзеню – напаў на яго валоданне і забіў. Кананізаваны праваслаўнай царквой. Пахаваны ў Траецкай царкве Пскова.

Літ.: Малишевский Н. Давыд Городенский. Герой и легенда. – Гродно: ЮрСаПринт, 2019; Kronika Halicko-Wołyńska (Kronika Romanowiczów). – Kraków, Warszawa, 2017. – S. 442–448.

Дахоўка, чарапіца (з XIX ст.) – дахавы матэрыял, зроблены з тлустай і пластычнай гліны, які характэрызуецца трываласцю, даўгавечнасцю, вогнеўстойлівасцю, вялікай вагой і крохкасцю. Выраблялі мясцовыя ганчары разам з кафляй і посудам. Трапіла на Беларусь з Паўночнай Германіі адначасова з ганзейскімі рамеснікамі. Плоская Д. была на даху гродзенскай *Верхняй царквы*: чырвоная, добра абпаленая, з аднаго боку закругленая, мела шырыню

15 см, таўшчыню 2 см, акруглены мацавальны выступ. Разнавіднасцю плоскай Д. з'яўляецца чарапіца, якая называецца "бабровы хвост" (на адным канцы па вуглах была выемка ў чвэрць кола). Такой Д. была пакрытая *Прачысценская царква, Стары замак* у Гродне. Лускаватая Д., пакрытая палівай, была знойдзеная ў гродзенскай царкве *Барыса і Глеба на Каложы*. Чорная глянцаваная каньковая Д. пачатку XVII ст. была адшуканая падчас рэстаўрацыі *касцёла Брыгіцкага*. Непаліваная вільчыкавая Д. выяўленая ў манастыры базыльянак.

Літ.: Воронин Н.Н. Древнее Гродно (по материалам археологических раскопок 1932–1949 гг.) // Материалы и исследования по археологии древнерусских городов. Т. III. – М.: Изд-во АН СССР, 1954. – С. 186; Краўцэвіч А.К. Майстар – наш продак. Кніга для вучняў. – Мн.: Народная асвета, 1990. – С. 69; Краўцэвіч А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV – XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – С. 124.

Дваранскі дэпутацкі сход – карпаратыўны орган дваранскага самакіравання, які пачаў сваё існаванне ў 1802, з моманту распаўсюджання на Гродзенскую губ. "Граматы на правы, вольнасці і перавагі шляхетнага расійскага дваранства" ад 21.04.1785. Сходы былі павятовыя і губернскія. У першым маглі ўдзельнічаць усе паўналетнія радавыя дваране, не асуджаныя і не выключаныя з дваранскага сходу. Паседжанні адбываліся за тры месяцы да губернскага дваранскага сходу. Вырашаліся пытанні павятовага ўзроўню: складанне спіса дваран, выбары кандыдатаў на пасады ў павятовыя ўстановы, выбары дэпутата для рэвізіі справаздачы аб выкарыстанні і стане дваранскай казны. У дваранскім дэпутацкім сходзе (ДДС) маглі прысутнічаць усе паўналетнія дваране, запісаныя ў радаводную кнігу губерні, не зняслаўленыя паводле суда і не выключаныя з дваранскага грамадства. ДДС складаўся з дэпутатаў ад кожнага ўезда, якіх выбіралі на тры гады, і ўзначальваўся губернскім прадвадзіцелем дваранства (да 1831 называўся маршалкам). У кампетэнцыю ДДС уваходзілі выбары на пасаду ў саслоўныя дваранскія органы: маршалкаў – павятовага і губернскага (да 1862, калі іх сталі прызначаць), сакратара дваранскага сходу, засядацеляў ў дваранскую апеку, судоў верхняга і ніжняга земскіх, чальцоў судоў сумленнага і павятовага і інш.; вырашэнне пытанняў, прапанаваных урадам; права хадайніцтва праз спецыяльна выбраную дэпутацыю перад генерал-губернатарам, Сенатам і царом (па пытаннях ліквідацыі мясцовых злоўжыванняў і нязручнасцей у мясцовым кіраванні); вядзенне дваранскіх кніг і выключэнне з дваранства (нават тых, хто не быў асуджаны судом, але яго ганебны ўчынак быў вядомы ўсім); складанне капіталаў для саслоўных патрэб (абавязак усіх дваран губерні); распараджэнне маёмасцю дваранскага грамадства. Забаранялася абмяркоўваць пытанні аб асновах дзяржаўнага ладу.

ДДС знаходзіўся пад кантролем *губернатара* і падпарадкоўваўся Дэпартаменту герольдыі Сената. Сходы мелі звычайныя паседжанні і надзвычайныя. Першыя збіраліся адзін раз на тры гады ў снежні-студзені на 15 дзён, другія – на загад або дазвол *губернатара.* Апошні адкрываў паседжанне, потым

прысутныя прыводзіліся да прысягі, а старшынёю паседжання станавіўся губернскі прадвадзіцель дваранства. ДДС меў права мець у губернскім горадзе будынак для паседжанняў, архіў і пячатку. Калі адмовілі ў выкарыстанні для гэтай мэты *дома віцэ-губернатара Максімовіча*, дык у 1848 быў пабудаваны будынак у стылі эклектыкі па вул. Саборнай /Савецкай, 19.

Літ.: Ерошкин Н.П. История государственных учреждений в дореволюционной России. 3 изд. М., 1983; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 77; Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 93–94; Российское законодательство X – XX веков. Т. 5. М., 1987; Романович-Славятинский А. Дворянство в России от начала XVIII в. до отмены крепостного права. 2 изд. Киев, 1912; Швед В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гродна: ГрГУ, 2001, с. 126–129; Яблочков М. История дворянского сословия в России. СПб., 1876.

Дзевятоўка (Дзевятоўцы, Дзевятлоўцы) – калісьці вёска пад Гроднам, а цяпер гарадскі раён. Назва вёскі ўтвораная ад асновы "дзевяць", прычына ўзнікнення назвы магла быць розная: нараджэнне дзявятага сына ці дачкі, дзявяты ўчастак або зямельны падзел. Д. вядомая з гісторыі *вайны Паўночнай*. 28.12.1705 шведскі кароль Карл XII аддаў загад арміі – паход з Варшавы на Гродна, дзе знаходзіліся расійскія войскі Пятра I. Пераправа шведскага войска праз *Нёман* ажыццявілася ў "Дзевятоўцах, у 3-х вярстах ад Гродны – у напрамку Вільны". 15.01.1706 г. Карл XII правёў тут рэкагнасціроўку і вырашыў адвесці сваю армію за 10 вёрст ад Гродна. Паводле інвентару з 1-й паловы XIX ст. на карысць *кляштара дамініканцаў* з фальварка Дзевятлоўцы паступалі падаткі. Падчас *вайны Першай сусветнай* частка зямель вёскі была адчужаная на патрэбы Гродзенскай *крэпасці*. У 2007 годзе ў Д. было дамоў 56, агульная колькасць жыхароў – 164, няпоўнагадовых да 15 год – 34, працаздольнага ўзросту – 97, пенсіянераў – 33. Галоўныя вуліцы гарадскога раёна – Дзяржынскага, Брыкеля, Ліможа, Курчатава. У раёне знаходзіцца *касцёл* і парафія Найсвяцейшага Адкупіцеля і *школа польская*.

Літ.: Бобровский П. Историко-статистический очерк города Гродна // Гродненщина. Часть первая. Том 1. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 87–88; Жучкевич. Краткий топономический словарь Белоруссии. – Минск, 1974, с. 95; Орловский Е.Ф. Гродненская старина. / Е.Ф. Орловский. – Гродна, 1910. – Ч. 1: Гродна. – С. 129; Черепица В.Н. Город-крепость Гродно в годы Первой мировой войны: мероприятия гражданских и военных властей по обеспечению обороноспособности и жизнедеятельности: моногр. / В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 2006. – С. 311; Borowik P. J. Jurydyki miasta Grodna w XV – XVIII wieku. Stanowy podział nieruchomości. – Supraśl, 2005. – с. 160; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – С. 190–198.

Дзекабрысты. Некаторыя сябры расійскіх тайных дзекабрысцкіх таварыстваў былі сваім лёсам звязаныя з Гроднам. У Алфавіце дзекабрыстаў, складзеным

сакратаром Следчай камісіі А. Бараўковым, ёсць прозвішча Валерыяна Емяльянавіча Галяміна, бацька якога служыў правіянцкім чыноўнікам у Гродне. Членам дзекабрысцкіх таварыстваў В. Галямін не з'яўляўся, але сябрам-дзекабрыстам паабяцаў не прысягаць Мікалаю I і абяцанне выканаў – не парушыў прысягі, дадзенай цэсарэвічу Канстанціну Паўлавічу. У 1830 г. ён быў палкоўнікам Генеральнага штаба і падчас падаўлення *паўстання 1830–1831 гг.* знаходзіўся ў Гродне (10.01–11.02.1831) і жыў у двухпавярховым будынку насупраць дома *губернатара*. У 1832 г. Г. быў звольнены з вайсковай службы і прызначаны дырэктарам фарфоравага завода. З Гродзеншчынай звязана каля дзевяці год жыцця Іллі Іванавіча Іванова. Ён паходзіў з "паштальёнскіх дзяцей", працаваў у Гродзенскай (з 26.02.1813) і Беластоцкай пагранічнай (з 30.05.1815) паштовых канторах. Іваноў ("Катон") быў сябрам Таварыства злучаных славян і выконваў абавязкі сакратара і казначэя. Па сваіх службовых абавязках меў магчымасць падтрымліваць пастаянную сувязь паміж сябрамі таварыства, таму яго кватэра ў Жытоміры была цэнтрам, куды паступала ўся самая важная інфармацыя. М. П. Бястужаў-Румін уключыў Іванова ў спіс царазабойцаў. Паводле канфірмацыі прыгавора Вярхоўнага крымінальнага суда ён атрымаў 12 год катаржных прац, але ўказам 22.08.1826 тэрмін быў скарочаны да 8 год. Пакаранне адбываў у Чыце і Пятроўскім заводзе, з 1833 г. – на пасяленні ў в. Верхне-Астожскае Ідзінскай воласці Іркуцкай губ. Яшчэ адзін дзекабрыст звязаны з Гроднам – Андрэй Львовіч Кажэўнікаў. У сябры Паўночнага таварыства быў прыняты на пачатку лістапада 1825 г. 14 снежня ўгаворваў салдат 2-га батальёна не прысягаць Мікалаю I, а трымацца старой прысягі Канстанціну Паўлавічу. Быў арыштаваны і зняволены ў Петрапаўлаўскай крэпасці. З 1856 г. працаваў кіраўніком Гродзенскай палаты дзяржаўных маёмасцей, стаў сапраўдным стацкім саветнікам (1858). Летам 1825 г. у Літоўскім асобным корпусе, размеркаваным на тэрыторыі Гродзенскай губ., афармілася патаемная палітычная арганізацыя дзекабрысцкага напрамку Таварыства ваенных сяброў. Ініцыятарам яе быў былы філамат *Рукевіч Міхаіл Іванавіч*. За сувязь з таварыствам праходзіў па следстве адвакат гродзенскага галоўнага суда Ян Серпутоўскі. Быў ён масонам 3-й ступені гродзенскай ложы "Сябры чалавецтва" (гл. *масонства*) і сябрам польскага Патрыятычнага таварыства. Былі ў нас і свае дзекабрысткі – *Рукевічы* Ксаверыя і Карнэлія, якіх за ўдзел у таварыстве і за знішчэнне яго дакументаў прыгаварылі да арышту ў гродзенскім *кляштары брыгітак*: Ксаверыю – на адзін год (сядзела з 22.05.1827 па 3.06.1828), а Карнэлію – на шэсць месяцаў (з 22 мая па пачатак снежня 1827). У турме гродзенскай сядзеў з 19 па 22 студзеня 1826 г. Сямён Балашоў, злоўлены ў Слоніме слуга дзекабрыста В. К. Кухельбекера, які пасля паўстання ў Пецярбургу збег са сталіцы і дабраўся праз Гродзеншчыну да Варшавы, дзе і быў арыштаваны.

Літ.: Швед В. "Трымаць пад арыштам у кляштары…" / В. Швед // Гарадзенскія запісы: старонкі гісторыі і культуры. – Гародня: ГрДУ, 1993. – Вып. 1. – С. 75–79. Швед В.В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў. – Мн.: Бел.НДІДАС, 1998. – 132 с.

Дзекуць-Малей Лукаш (1888, Слонім – 1955, Гданьск) – баптысцкі прапаведнік, сябра Беларускай партыі сацыял-рэвалюцыянераў. Да *вайны Першай сусветнай* скончыў рэлігійныя курсы ў Пецярбургу, затым жыў у *Горадні*. У 1918–19 быў камісарам літоўскага ўрада ў пав. Крынкі-Лунна. У 1919 скончыў беларускія настаўніцкія курсы ў Вільні. У 1918–1921 гг. быў старшынёй *рады Гродзенскай беларускай школьнай*, арганізатарам беларускай адукацыі і асветы ў Гарадзенскім пав., кіраўніком *прытулку беларускага дзіцячага*, адным з кіраўнікоў *камітэта Беларускага нацыянальнага* ў Горадні. Па словах польскага інспектара *Вазьнякоўскага,* быў "bardzo niebezpieczny" (вельмі небяспечны). У 1921 выехаў у Брэст. Падчас *вайны Другой сусветнай* быў прэсвітарам беларускіх баптыстаў на акупаванай немцамі тэрыторыі. У 1945 выехаў у Германію, а ў наступным годзе пераехаў у Польшчу. Памёр у Гданьску.

Літ.: Чарнякевіч А., Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гродне 1909–1939: біяграфічны даведнік. – Мінск, 2003. – С. 84–86; O niepodległą i granice. T. 7. Raporty Straży Kresowej 1919–1920. – Warszawa, 2011, s. 267; Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich = Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– S. 213–214.

Дзем'яновіч М. А. (1867, Чухлама Кастрамской губ. – 12.04.1895, Варшава) – сын калежскага асэсара, дваранін, намеснік столаначальніка Гродзенскай *казённай палаты*. Арыштаваны 26.06.1894 (у кішэні была знойдзеная шыфраваная запіска). У 1888 г. выключаны з 7 класа Гродзенскай *гімназіі*, бо вёў кампраметуючую перапіску са студэнтам Кіеўскага універсітэта Абрамам Фрыдманам, і за кнігі, якія ён меў (не забароненыя, але "изъятых из обращения в публичных и общественных библиотеках"). Быў пад наглядам паліцыі. Атрымоўваў з Сібіры праз удаву паліцмайстара В. Парукаву і яе маці М. Бяляеву забароненыя брашуры і заклікі.

Дзярэўская Дарота – балерына, якая выступала ў Гродне ў "Сялянскім балеце" *Пеціпаці* (жнівень 1778).

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. – Lwów. T. II, 1925. – S. 325.

Дзікоўскі Мікалай Раманавіч (1866, м. Браслаў Новааляксандраўскага ў. Ковенскай губ. – не раней за 1907) – святар, настаўнік *гімназіі гродзенскай*. Скончыў Віленскае духоўнае вучылішча, Літоўскую дух. семінарыю, Санкт-Пецярбургскую дух. акадэмію. У Гродна прыехаў у 1894 і стаў працаваць настаўнікам божага закона ў класічнай гімазіі, а з 1899 – яшчэ і ў жаночай гімназіі. З 1901 прызначаны настаяцелем Гродзенскай *царквы Пакроўскай*. Прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці: быў сябрам Гродзенскага аддзялення Літоўскай епархіяльнай рады, Гродзенскага Сафійскага *брацтва праваслаўнага* (у 1904–06 – старшыня), адзін з ініцыятараў стварэння ў 1901 Гродзенскага *камітэта царкоўна-гістарычнага*, рэдактар газеты *"Гродненские*

епархиальные ведомости" (1901 – лета 1907). У лістападзе 1907 пакінуў Гродна, пераехаўшы на новае месца працы ва Уладзікаўказскай епархіі.

Публікацыі гродзенскага перыяду: Опыт библиографического указателя статей и заметок, касающихся истории церквей и монастырей Гродненской губернии (Гродно, 1894); Несколько слов об искушении униатов Западной России в латинство (Гродно, 1896); Борьба Жировицкого монастыря с еврейством (1897); Из летописи Гродненского Борисоглебского мужского монастыря 1846–1856 гг.: по документам архива гродненского архирейского дома и (…) монастыря (Гродно, 1906.); Коронование Чудотворной иконы Богоматери (1730) (Гродно, 1902); Базилианский орден и его значение в западо-русской униатской церкви XVII – начала XVIII в. – до Замойского униятского православного собора 1720 г. (1904–1906, рукапіс незавершаны).

Літ.: Ленкевич Д.В. У истоков историко-церковной библиографии на Гродненщине // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С. 194–198; Чарапіца В.М. Са скарбніц кніжных паліц: нарысы пра аўтографы даследчыкаў гісторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў / В.М. Чарапіца. – Мінск: БелНДЦДААС, 1994. – С. 98–101; Черепица В.Н. Очерки истории православной церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней): в 2 ч. / В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 1999. – Ч. 1. – С. 68–70.

Дзмітрыеў Міхаіл Аляксеевіч (1832, Пецярбург – 26.05.1873, Гродна) – рускі і беларускі фальклярыст і этнограф. Скончыў Галоўны педагагічны інстытут у Пецярбургу. З 1853 – настаўнік Навагрудскага дваранскага вучылішча. Пазней – дырэктар Навагрудскай гімназіі. У 1867–1873 – дырэктар Гродзенскай дырэкцыі народных вучылішч. Збіраў беларускі фальклор, даследаваў матэрыяльную культуру беларусаў. Аўтар наступных публікацый: "Собрание песен, сказок, обрядов и обычаев крестьян Северо-Западного края" (Вільня, 1869), дзе змешчаныя 277 спеваў і баек, апісанне абрадаў, народных гульняў, забаў, танцаў; "Несколько слов краткого исторического обозрения русско-литовского Новогрудка" (Вестник императорского русского географического общества, 1858, ч. 24). У Гродне апублікаваная яго праца "Обряды и обычаи западно-русских крестьян" (Памятная книжка Гродненской губернии на 1869 г. – Гродно: губернская типография, 1869). Узнагароджаны медалямі за Крымскую вайну 1853–1856 і ў памяць "усмирения польского мятежа 1863–1864 гг., серебряной медалью Императорского географического общества за труды по этнографии". Пахаваны ў Гродне на праваслаўных могілках.

Літ.: Историки Гродненщины" /Сост. А. Нечухрин. – Гродно, 1989; В.Н. Черепица, Гродненский православный некрополь, Гродно: ГрГУ, 2001. Ч. 2.



С. 848

Дзядзінец горада – умацаванае месца на Замкавай гары, на якім спачатку было пасяленне X ст., а пазней узнік горад. Па краях замкавага ўзгорка быў насыпаны земляны абарончы вал з пяску, культурнага пласта і суглінку. Насыпалі яго на спецыяльныя драўляныя канструкцыі – *гарадні*. Паверх вала цягнулася сцяна, складзеная з тоўстых бярвёнаў. Гарнізон замка падчас

нападу мог хавацца ў пяці драўляных вежах, а таксама на галерэі, якая ішла па версе сцяны. На дзядзінцы жыў князь са сваімі дружыннікамі, гарнізон крэпасці, рамеснікі і абслуга. Дзядзінец быў забудаваны драўлянымі дамамі са слюдзянымі вокнамі, гаспадарчымі пабудовамі. Вуліцы і правулкі былі замошчаныя дошкамі, часткова каменем. На паўднёвым краі пляцоўкі знаходзіўся *церам княскі*, у цэнтры – *царква Ніжняя*, а пасля разбурэння – *царква Верхняя*. Ю. Кітурка, даследчык і дырэктар *музея Гродзенскага гісторыка-археалагічнага*, прыйшоў да высновы, што Д. у другой палове XIII ст. "не займаў усю плошчу Старога замка. Цалкам дапушчальна, што сучасная планіроўка пачала фармавацца пасля разбурэння горада ў 1284 г. *крыжакамі*, калі былі пабудаваныя *Верхні і Ніжні замкі*".

Літ.: Бочков В.В. Средневековый детинец на Замковой горе в Гродно в XII веке // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 8. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2012. – С. 12–16; Кітурка Ю.В. Рэльеф Замкавай гары ў Гродне // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 10. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2016. – С. 3–12.

Дзямідаў Мікалай (1888, Гарадок на Падляшшы – 1967, Чыкага) – беларускі вайсковы, грамадскі і палітычны дзеяч, камендант *Горадні* ў 1919. Працаваў на чыгунцы, настаўнічаў у Беластоку да *вайны Першай сусветнай*. У 1917 скончыў Паўлаўскае вайсковае вучылішча ў Пецярбургу, удзельнічаў у ваенных дзеяннях, падчас якіх трапіў у нямецкі палон. Знаходзіўся у Вільні са снежня 1919, займаўся арганізацыяй *Палка першага беларускага пяхотнага*. Быў тут ад'ютантам, затым начальнікам штаба. З 31.01.1919 выконваў абавязкі каменданта Горадні і падчас эвакуацыі беларускага міністэрства з Горадні ў Коўна выехаў разам з ім. З восені 1919 ваяваў у арміі С. Булак-Балаховіча. У 1921–22 настаўнічаў у Гарадку, затым уцёк у Латвію, дзе працаваў настаўнікам у Дзвінску (цяпер Даўгаўпілс), затым у Рызе. У 1940 арыштаваны Савецкай уладай, у 1941 вызвалены. Падчас вайны працаваў у беларускіх школах Латвіі і Беларусі. З 1944 – у Нямеччыне, з 1950 – у ЗША.

Літ.: Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich= Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7. – S. 201; Surgailis G. Lietuvos Kariuoenes. Gudu Kariniai Daliniai 1918–1923 m. – Vilnius, 2020. – S. 246–248.

Дзяржынскі Фелікс Эдмундавіч (11.09.1877, хутар Дзяржынава Стаўбцоўскага р-на – 20.07.1926) – савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч. У 1895 уступіў у Літоўскую сацыял-дэмакратычную партыю, выдаваў з 1897 у Коўне падпольную газету "Ковенскі працаўнік". Неаднойчы арыштоўваўся і ссылаўся ў Сібір, але яму кожны раз удавалася ўцячы. Падтрымоўваў погляды У. Ульянава/Леніна. Удзельнічаў у бальшавіцкім перавароце ў кастрычніку 1917. Са снежня таго ж года кіраваў Агульнарасійскай надзвычайнай камісіяй па барацьбе з кантррэвалюцыяй (ЧК). Быў у Гродне 30 ліпеня падчас *вайны савецка-польскай 1920*. Правёў тут нараду. У выпадку перамогі бальшавікоў Д. павінен быў стаць на чале польскай сацыялістычнай дзяржавы. У горадзе

ёсць вул. яго імя і памятная дошка на старым будынку абласнога выканаўчага камітэта па вул. Ажэшкі, 37 (гл. *дом Максімовіча*).

Літ.: "Наша гісторыя". – 2019. – № 5 – С. 4–15; Venclova T., Wilno/ Przewodnik biograficzny. – Warszawa: PIW, 2013. – С. 210.

Дом Абрэмскіх – дом Людаміра і яго жонкі Марыі з Завістоўскіх, іх сына Максіміліяна. Стаяў каля *дома Ажэшкі*. Марыя з Сямашкаў Абрэмская (жонка Максіміліяна) была найвярнейшай сяброўкай пісьменніцы, а таксама яе сакратаркай, паверанай і лектаркай у патаемнай школцы. Дзённікавыя запісы Ажэшкі "Dnie" вельмі часта згадваюць Абрэмскіх: Марыю (Марыню) і Максіміліяна (з 1874 і не пазней за 1907 служыў у Кантрольнай палаце). *Ажэшка* бывала ў іх доме на "асвячэнні дома", "вячэры вігілійнай", "на свянцоным", "іменінах Марыні", "абедзе", падчас хваробы Марыні.

Дом знаходзіцца па вул. Ажэшкі, 19. Быў пабудаваны з чырвонай цэглы ў канцы XIX ст. Людамірам Абрэмскім, бацькам Максіміліяна. У 1910 г. у доме працавала мужчынская *гімназія* М. Хныкіна. Пасля *вайны Першай сусветнай* гаспадаром дома быў З. Лямпіцкі, які здаваў яго Навагрудскаму акруговаму земскаму ўпраўленню. У 1930-я гады тут знаходзілася школа імя Б. Яселевіча. У савецкі час у доме ў розны час дзейнічалі: курсы падрыхтоўкі настаўнікаў пачатковых школ, фельчарска-акушэрская школа, Гарадскі аўтамабільны клуб, школа № 5, базісная крама наглядных вучэбных сродкаў, станцыя юных тэхнікаў, абласны інстытут павышэння кваліфікацыі настаўнікаў. На тарцовай сцяне дома з 1975 г. змешчанае пано "Навука" з выявамі асветнікаў і навукоўцаў аўтарства ленінградскіх скульптараў.

Літ.: Саяпин В. Пешком по Ожешко и Советской/ Виктор Саяпин. – Гродно: ООО "ЮрСаПринт" 2011. – С. 24; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 49; Orzeszkowa E., Dnie, opr. I. Wiśniewska, Warszawa 2001, s. 27–29, 116, 148, 183, 193, 219, 275, 300, 306, 310.

С. 849

Дом Ажэшкі Э., "шэры домік", цяпер копія дому, у якім жыла пісьменніца з 1894 па 1910 гг. Знаходзіцца на вул. яе імя. Тут пісьменніца вяла тайныя курсы па польскай літаратуры, гісторыі цывілізацыі, праходзілі пасяджэнні гуртка літаратурна-драматычнага *"Муза"*, збіралася інтэлігенцыя ў 1905 г. для абмеркавання выбараў у Дзяржаўную думу. У 1911 г. дом быў падараваны Гродзенскаму таварыству апекі над дзецьмі. У 1920-х гадах у доме размяркоўвалася гандлёвая школа, з 1940 г. працавала музычная школа, дзе ў той год знаходзіліся выбарчыя акругі № 582 і № 600 па выбарах у Вярхоўны Савет СССР. Пасля вайны ў доме былі кіраўніцтва Абласнога праекта, станцыя пералівання крыві, інвентарызацыйна-тэхнічнае бюро. Паводле рашэння гарвыканкама ад 6.01.1948 дом перадалі *музею дзяржаўнаму гісторыка-археалагічнаму* і тут адчынілі прыродазнаўчы музей. У 1949–54 у Д. знаходзіўся Дом піянераў. З 1959 з'явіўся новы гаспадар – чытальная зала імя Ажэшкі Э., а ў 1964 – бібліятэка: з 1965 як юнацкі філіял, з 1966 – аддзел выданняў на замежных мовах, у 1982–2001 – аддзел мастацтва. З 1965 па 2000 у Д. знаходзілася

С. 850

Гродзенскае аддзяленне *Саюза пісьменнікаў Беларусі*. У 1976 г. будаўнікі разабралі арыгінальны будынак і пабудавалі копію з сілікатных блокаў у глыбіні ад чырвонай лініі вуліцы. Цяпер у доме дзейнічае філіял *бібліятэкі абласной імя Карскага.* Два пакоі і зал на першым паверсе прысвечаныя экспазіцыям з жыцця і дзейнасці Ажэшкі. 15.06.2001 адбылося ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнага пакоя Ажэшкі (гл. *Музей Ажэшкі*). З ліпеня 1958 на доме вісіць мемарыяльная дошка з надпісам: "Тут з 1870 па май 1910 г. жыла выдатная польская дэмакратычная пісьменніца Эліза Ажэшка".

Літ.: Ігнатовіч Ф. Эліза Ажэшка ў памяці нашчадкаў: работа Дзяржаўнай установы культуры "Гродзенскабласная навуковая біліятэка імя Я. Ф. Карскага"па ўшанаванню памяці пісьменніцы // Eliza Orzeszkowa. Pamięć kultury / J. Ławski, S. Musijenko. – Białystok, s. 576–582; Саяпин В. Пешком по Ожешко и Советской/ Виктор Саяпин. – Гродно: ООО "ЮрСаПринт" 2011. – С. 33–38; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 72

Дом баснякаў гл. Дамы майстроў.

Дом выхаваўчы Прыказа грамадскай апекі, утвораны не раней за 1802 г. для выхавання сірот, галоўным чынам "падкідышаў". Частка дзяцей выхоўвалася тут, а большая перадавалася прыёмным бацькам у горадзе ці ў вакольных вёсках. На ўтрыманне дзяцей выдавалася ў 1820 г. 2 руб. срэбрам, на пач. XX ст. – 3 руб. на месяц. Падапечныя дзеці павінныя былі навучыцца чытаць і пісаць, асновам арыфметыкі і рамёслам. Тых, хто меў здольнасці, пасылалі вучыцца ў спецыяльнае вучылішча ў Санкт-Пецярбургу (атрымаць спецыяльнасць "предназначению их свойственную"), у вучылішча аптэкараў або, нават, у Медыка-хірургічную Акадэмію. Няздольныя сіроты маглі займацца абслугоўваннем у дамах багатых гараджан. У 1820 у Д. в. знаходзіліся на ўтрыманні 19 чал., з іх 10 дзяцей да 5 год, 5 – ад 5 да 16, астатнія – да 2 год; акрамя таго 48 былі на ўтрыманні прыёмных бацькоў, з іх 42 – да 2 гадоў.

Літ.: Кашко С. Благотворительность // Гродзенская праўда. – 1993. – 22.06. – С. 3.

Дом губернатара гл. Палац *Тызенгаўза А.*

Дом Дашкевічаў Вандаліна і Маўрыкія – гарадскі дом шлюбу, "кавярня турка". Пабудаваны ў 1888 г. на перакрыжаванні вуліц Савецкай, Ажэшкі і Віленскай. У кавярні, гаспадаром якой быў ці то азербайджанец, ці то серб, частаваліся малочным напіткам "буза" (падобны да квасу), халвой, смачнай кавай і ватрушкамі з суседняй пякарні. Сёння тут з нядаўняга часу працуе кавярня, дзе можна выпіць рознага гатунку каву, сокі, з'есці пірожнае.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 105–108.

Дом дваранскага дэпутацкага сходу. У 1827 г. для гэтай установы планавалася выкупіць дом Максімовіча, які ў той час быў секвестраваны казной, але

губернскі прадвадзіцель дваранства князь Чацвярцінскі атрымаў ад губернатара адмову. Вядомы другі дом, дзе праводзіліся дэпутацкія сходы – будынак на вул. Савецкая, 19, пабудаваны ў 1848 г. Балкон на фасадзе прыбудаваны пазней. У 1875 узнік мураваны хлеў, перабудаваны затым у флігель. У будынку ў расійскі час знаходзіліся: кнігарня "Народная польза", прадстаўніцтва страхавога таварыства "Саламандр" (1894), акушэрка Прэнская (1895), зубны ўрач Фін, аптэчная крама (1903), друкарня *Мейлаховіча Л.* (1910), кватэра гісторыка *Арлоўскага Я.* У міжваенны час тут размяркоўваліся: фотамайстэрня Хомуля, пякарня Шаркоўскага, крамы Левінаса, Ю. Міко, запчастак для матацыклаў ды аўтамабіляў "Aras-Auto". З лютага 1952 г. у будынку месціліся салон-крама і студыя "Саюза савецкіх мастакоў БССР".

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 297; Сенаторова С.В. Инвентарь дома бывшего гродненского вице-губернатора К. Максимовича / С.В. Сенаторова // Краязнаўчыя запіскі. – Гродна: Выд-ва Гродз. абл. аддзела БФК, 1997. – Вып. 4. – С. 141–146;

Дом дзіцячага яўрэйскага прытулку – пачаў сваю гісторыю ў 1870, калі быў зацверджаны яго статут. На пачатку існавання прытулак знаходзіўся на вул. Пераца, 6 (сёння Вялікая Траецкая), з 1900 – на вул. Дамініканскай, 17, у будынку былога *шпіталя яўрэйскага*. У 1914 пераехаў у прыгожы будынак на вул. Касманаўтаў, 6, які захаваўся да нашага часу. Прытулак утрымліваўся за кошт спецыяльнага яўрэйскага скрыначнага падатку, сродкаў кагалу, ахвяраванняў багатых яўрэяў-прадпрымальнікаў (напрыклад, *Шарашэўскі І.*), гарадскіх арганізацый і прадпрыемстваў (напрыклад, *кінатэатр* "Эдэм"). Выхаванцы прытулку (у 1914 – 80 дзяўчат і хлопцаў ва ўзросце ад 1 да 18 гадоў) атрымлівалі бясплатна вопратку, ежу, медыцынскую дапамогу і пачатковую адукацыю. З 1928 кіраўніком прытулку быў Э. Яноўскі.

Літ.: Баціс М., Буцько У., Крапівіна Н. і інш. Гародня: сляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні // ARCHE. – 2010. – № 6. – С. 375–376.

Дом каралеўскі (Domus Regia) – пабудаваны пасля абрання ў 1445 г. на польскі трон вялікага князя літоўскага *Казіміра Ягелончыка*. Тут адбываліся паседжанні паноў-рады ВКЛ, прыёмы паслоў, *сеймы*. Тэрыторыя каралеўскага двара была абнесеная драўляным і мураваным парканам. Тут памёр у 1484 г. каралевіч *Казімір* (*Святы Казімір*), а ў 1492 – яго бацька. Д. к. бачны на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг.* Рэшткі яго былі знесеныя падчас будаўніцтва на гэтым месцы *Новага замка*.

Літ.: Краўцэвіч А.К. Рыцары і дойліды Гародні. – Кракаў, 2009. – С. 27; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С. 45; : Kałuski M. Sprawy kresowe – bez cenzury. T. 3. – Toruń, Melbourne, 2018. – s. 634;

Дом Крэйцара, дом з ліліямі, стаіць на вул. Гарохавай/Сацыялістычнай. Купец 2-й гільдыі, дваранін У. М. Крэйцар пабудаваў дом на пачатку XX ст.

Яго дачка Элеанора звязалася з 1922 г. з нейкім У. Фёдаравым, які прывучыў яе да какаіна, і яе прыйшлося лячыць. Пасля смерці гаспадара дома ім валодала ягоная жонка Ірма. У часы *вайны Другой сусветнай* тытунёвая крама, якая знаходзілася ў доме, была нацыялізаваная, але Ірма засталася яе кіраўніцай. Летам 1944 у доме размеркаваўся "Спіртатрэст", адчынілася піўная. Трохі пазней на 2 паверсе з'явілася спартыўнае таварыства "Калгаснік". У памяшканні будынка пабывалі і іншыя арганізацыі: крамы "Машпрыборы" і абутковая, "Зберагальная каса 1-га разраду", "Бюро рэклам камбіната ўпарадкавання", аптэка і сталярная майстэрня. Нарэшце ў будынку размясціўся Беларускі народны банк, які і заняўся рэканструкцыяй і рамонтам дома. Яны былі паспяхова завершаныя, і гродзенцы могуць любавацца помнікам гісторыі і культуры.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 163–169.

Дом Левандоўскага, знаходзіцца на вул. Савецкая, 15. Пабудаваны ў 1875–1885 гг. і перабудаваны ў 1895 г. Трохпавярховы, Г-падобны ў плане каменны будынак з невысокім двухсхільным дахам у стылі эклектыкі, з элементамі класікі. Напярэдадні *пажару* 1885 г. будынкам валодаў дваранін І. М. Левандоўскі. У 1910 дом у дакументах праходзіць як "новы трохпавярховы, крыты бляхай". Тут месціліся кватэры, крама кніжнага рускага гандлю Міхайлоўскага і Крамкоўскага, фотамайстэрні *Ф.-Д. Д. Адляніцкага-Пачобута* (1902–1911), Г. А. Шульнер-Дамбравіцкага (да пачатку *вайны Першай сусветнай*), *Рубінштэйна* (1915), аптэчныя склады Ю. Маліноўскага (1926), тытунёвая крама Л. Здраевіча (1926), крама вопраткі "Bon-Ton".

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 295

Дом лясной адміністрацыі, знаходзіцца на плошчы імя *Тызенгаўза А.*, быў пабудаваны ў 1776 г. паводле праекта І. Мёзера і ўваходзіў у комплекс *Гарадніцы*. З'яўляецца ўзорам архітэктуры позняга барока. Адміністрацыя займалася лясной гаспадаркай у часы рэформ *Тызенгаўза А.*: будаваліся тартакі, смалакурні, рудныя млыны. Пэўны час у будынку размяркоўвалася школа акушэрская, а яшчэ пазней – адзін з карпусоў акруговага *шпіталя*.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 154–155.

Дом Ляхніцкіх, знаходзіцца на вул. Замкавай, згодна з даследаваннем мінскага даследчыка Я. Курта пабудаваны паводле чарцяжоў "дома для багатых" італьянскага архітэктара Трэзіні, а перабудову рабіў М. Кнакфус. З такім поглядам не згодны гродзенскі даследчык І. Трусаў, які прааналізаваў дрэздэнскі план першага паверха гэтага дома 1752 г. Цяпер у будынку знаходзіцца *музей гісторыі рэлігіі*.

Літ.: Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 43.



С. 851

Дом Максімовіча, паводле звестак гісторыка архітэктуры А. А. Кулагіна пабудаваны каля 1800 г. Гэта даволі рэдкі для Заходняй Беларусі ўзор архітэктуры класіцызму ў расійскім варыянце. Уяўляе сабой двухпавярховы Г-падобны ў плане мураваны будынак, накрыты двухсхільным дахам. Прыгажосць дому надае чатырохкалонны порцік дарычнага ордэна. Сёння мы можам убачыць пры галоўным уваходзе вялікі вестыбюль з параднай лесвіцай. А вось фрэскавыя размалёўкі ў інтэр'еры, а таксама сад за домам з каменнай альтанкай-ратондай у стылі класіцызму, на жаль, не захаваліся. У доме быў добры кнігазбор з літаратуры на розных мовах: расейскай – 48 у 104 тамах; французскай – 75 у 142 тт.; італьянскай – 16 у 40 тт.; лацінскай – 3 у 3 тт.; нямецкай – 7 у 17 тт.; польскай – 252 у 472 тт.). У чэрвені 1812 г., калі ішла *вайна руска-французская 1812 г.*, у доме Максімовіча жыў малодшы брат Напалеона і вестфальскі кароль *Жэром Банапарт*. Ён прабыў тут каля пяці дзён. А паколькі любіў "раскошу, жанчын, вайсковыя парады ды святы" (словы Напалеона, запісаныя Арманам дэ Каленкурам), дык не губляў часу ў Гродне. Прысутнічаў на балах, купаўся ў ванне, запоўненай шампанскім, кахаўся з жанчынамі, сцвярджаючы, што "гродзенскія полькі зусім не такія, як варшаўскія". Сам Максімовіч у гэты час быў запрошаны на працу ў скарбовым аддзяленні *камісіі адміністрацыйнай Гродзенскага дэпартамента*. У лютым-сакавіку 1827 г. губернскі прадвадзіцель дваранства князь Чацвярцінскі спрабаваў за 120 тысяч руб. набыць дом Максімовіча (секвестраваны казною) для *дома дваранскага дэпутацкага сходу*. Сенатар М. Навасільцаў адмовіў у просьбе, бо не быў упэўнены, што атрыманая плата перакрые запазычанасць Максімовіча. У расійскі час у доме працавала *казённая палата*, пэўны час тут быў дом Камінскіх на Акцызнай плошчы. У 1920 г. падчас *вайны савецка-польскай* у доме размяркоўваўся Гродзенскі вайскова-рэвалюцыйны камітэт (ліпень-верасень), тут спыняўся 1–2 жніўня *Ф. Э. Дзяржынскі*, у той час сябра Часовага Польрэўкама ў Беластоку. Ён правёў нараду з сябрамі рэўкама. У памяць пра гэтыя гістарычныя падзеі у 1970 г. былі ўсталяваныя мемарыяльныя дошкі, якія ў 1985 рэканструявалі. У 1920-я гады, калі Гродна знаходзілася ў складзе другой Рэчы Паспалітай, у доме працавалі гродзенскае *староства,* міністэрства грамадскіх прац, міністэрства фінансаў. З 1922 па пачатак 1930-х гадоў у былым доме віцэ-губернатара месціўся гарадскі музей, створаны намаганнямі *Ю. Ядкоўскага*. У 1930 г. тут знаходзілася рэдакцыя "Польскай Газеты Гродзенскай Зямлі".

Літ.: Саяпин В. Пешком по Ожешко и Советской/ Виктор Саяпин. – Гродно: ООО "ЮрСаПринт" 2011. – С. 50–51; Сенаторова С.В. Инвентарь дома бывшего гродненского вице-губернатора К. Максимовича / С.В. Сенаторова // Краязнаўчыя запіскі. – Гродна: Выд-ва Гродз. абл. аддзела БФК, 1997. – Вып. 4. – С. 141–146; Kowkiel Lilia. Prywatne księgozbiory na Grodzieńszczyźnie w pierwszej połowie XIX wieku. Kraków: WN Akademii Pedagogicznej, 2005. – S. 82.

Дом "масонаў" (дом масонскай ложы) – дом № 4 на Тэлеграфным завулку ў паўночна-усходняй частцы гістарычнага цэнтра Гродна. Былая рэзідэнцыя

каралеўскага архітэктара *Дж. Сака* служыла ў канцы XVIII – першай чвэрці XIX ст. месцам паседжанняў гродзенскай *масонскай ложы* "Счастливое освобождение". У перабудаваным выглядзе захаваўся да нашага часу. Верагодна, да яго адносіцца брама з вул. Тэлеграфнай.

Літ.: Кулагин А.Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии. Вторая половина XVIII – начало XIX в. Минск "Наука и техника" 1981; Трусаў І.Г. Завулак Тэлеграфны// Біржа інфармацыі – 1998. – № 43. – С. 3; Jodkowski Józef. Grodno. Wilno 1923, s. 23.

Дом Мураўёвых, пабудаваны не пазней за сярэдзіну 1890-х на пляцы, які належаў купцу Івану Мураўёву. Архітэктар, мажліва, быў той самы, які пасля *пажару* 1885 г. аднаўляў *сінагогу вялікую харальную*. З 1910 уласнікамі былі купцы Васіль Іванавіч і калежскі асэсар Міхаіл Іванавіч Мураўёвы. Будынак у стылі мадэрн захаваўся на рагу плошчы Савецкай, 2. Д. М. быў неатынкаваны, трохпавярховы, Г-падобны ў плане. На другім паверсе знаходзіўся балкон з літымі чыгуннымі рашоткамі, на трэцім – два невялікія балконы. На 2 паверсе размяркоўвалася зала (дэкаратыўна размаляваная, з лепкай і 2 печамі з ляпнымі картушамі) і пакой для гульняў, на трэцім – жылыя пакоі і сталовая. У канцы 1918 у зале афіцэрскага казіно адбыўся першы ў горадзе беларускі мітынг, на якім выступіў між іншых Смоліч Аркадзь, пазней напісаўшы, што "лозугі БНР карысталіся тады ў Гародні поспехам". На мітынгу была створаная Беларуская павятовая сялянская рада. З ліпеня 1918 па студзень 1919 у Д. М. знаходзіўся падпольны камітэт Расійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў), у 1919 на працягу 3 месяцаў адбываліся пасяджэнні Гродзенскага *Савета рабочых дэпутатаў* (першае 26.01). Пазней у будынку месціліся Гродзенскае аддзяленне Беластоцкага камерцыйнага банка, крама змешаных мануфактурных тавараў фірмы "Франк Ш. А., удава і сын" (пач. XX ст.); У 1928 г. у доме працавала пякарня Залускага М. У савецкі час да 1995 г. тут змяшчалася *бібліятэка абласная*. У 1995–1996 гг. адбыўся рамонт будынка, выкананы фірмай "Пульс" і прадпрыемствам "Канцэпт–93". Потым будынак апынуўся без аховы, і яму былі нанесеныя пашкоджанні (паводле стану на канец 1997): знічшаныя міжпавярховыя перакрыцці на драўляных бэльках першага і другога паверхаў, канструкцыі падлогаў усіх паверхаў, скрадзеная чыгунная агароджа на параднай лесвіцы, сапсаваныя кахляныя печы, знішчаныя дэкаратыўныя элементы па ўсёй вышыні будынка і парадныя дзверы, пашкоджаныя ці часткова знішчаныя мастацкая драўляная разьба інтэр'ераў памяшканняў, каляровыя ліхтары і вітражы, насценны жывапіс, ляпніна. З 2006 г. Д. М. займеў новага ўласніка – Народны пенсійны фонд, які вырашыў спачатку зруйнаваць суседні дом па вул. Калючынскай, 23, пабудаваць два новыя будынкі, атрымаць прыбытак з іх ужытку і толькі тады пачаць аднаўленне Д. М. На мяжы 2010/2011 гг. рамонтныя працы часткова былі адноўленыя. На будынку былі дзве мемарыяльныя дошкі, якія паведамлялі аб знаходжанні тут у 1918–1919 падпольнага камітэта РКП (б) і паседжаннях Гродзенскага Савета рабочых дэпутатаў у 1919 г.

Літ.: Вашкевіч А. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы /А. Вашкевіч, А. Госцеў, В. Саяпін, І. Трусаў, А. Чарнякевіч, Я. Лялевіч, І. Лапеха. – Гародня, Wrocław: Гарадзенская бібліятэка, 2012. – С. 304–307; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 31–35.

Дом народны (Дом культуры), пабудаваны і асвечаны ў юбілей 100-годдзя Гродзенскай губ. у 1912. Будынак быў пабудаваны інжынерам Л. Лаганда і архітэктарам *Раманавым М. Б.* на сродкі Апекі аб народнай цвярозасці. Быў прызначаны для асветы беднага насельніцтва і прапаганды барацьбы з п'янствам. Тут працавала таварыства цвярозасці, якое праводзіла лекцыі, канцэрты, музычныя вечарыны, выступы дэкламатараў вершаў, часта пасля гэтых мерапрыемстваў адбывалася сумеснае піццё чаю. Падчас рэвалюцыі ў Расіі, 5 снежня 1905 г. гродзенскія гімназісты, вучні гарадскога вучылішча і некаторыя настаўнікі ў Народным доме правялі забастоўку. Для перамоў прыйшоў сам *губернатар Асаргін,* бо яго сыны таксама былі яе ўдзельнікамі. Пэўны час Д. н. быў дывізійным шпіталем. У 1920–1930-я гады тут знаходзіўся "Dom żołnierza" (Дом жаўнера), у якім месціўся вайсковы тэатр, бібліятэка гарнізона, чытальня для салдат і падафіцэраў, арганізацыі "Белага" і "Чырвонага" крыжа. У савецкі час будынак стаў гарадскім Домам культуры.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 225–227; Швед В.В. Губернскі Гродна: Аповяды з гісторыі горада (канец XVIII – пачатак XX ст.) – Баранавічы: Баран. узб. друкарня, 2003. – С. 127–128, 136–137; Вашкевіч А. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы /А. Вашкевіч і інш. – Гародня, Wrocław: Гарадзенская бібліятэка, 2012. – С. 113.

Дом настаўніка знаходзіўся ў будынку, у якім была аптэка езуіцкая на сённяшняй плошчы Савецкай, 4. Дом пабудаваны ў 1709 г.

Дом Ратнера, размешчаны на вул. Савецкая, 25. Пабудаваны ў 1870 г., двухпавярховы, прамавугольны ў плане будынак з аднасхільным дахам. З 1902 г. тут працавала абутковая крама Ш. Гардона, з 1903 г. – кнігарня Тракеніцкага. Падчас *вайны савецка-польскай 1919–20 гг.* тут знаходзіўся штаб 10-й кав. дывізіі Чырвонай арміі. У міжваенны час працавалі розныя ўстановы: рэдакцыя газеты "Głos prawdy Ziemi Grodzieńskiej" (1927), цырульня Турчынскага, склад мясных вырабаў Шэміса (1928), аптэчная крама А. Майзеля (1939). У савецкі час у будынку размяркоўваліся: мастацкае фота № 2 "Ваенгандлю" (1945), кантора нарыхтоўкі ільну (1950), фірменная крама па продажы папярос ды тытуня (1952), крама "Спартовыя тавары" (1964), крама "Бярозка" па продажы тавараў за валюту, крама "Букініст" (1982).

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 299–300

Дом Ромера, размешчаны на вул. Савецкая, 23, пабудаваны ў 1856 г. сужэнцамі Ромерамі, Севярынам і Тэдорай. Падчас *паўстання 1863–64 гг.* тут

часта збіраліся чальцы гродзенскай *рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі* 1861–64 гг. Дом наведваў паўстанец, мастак Орда Н., які пакінуў ягоны малюнак. Пасля высылкі Ромера дом быў прададзены, яго набылі Ясяноўскія, якія адчынілі тут *гатэль* "Пецярбургскі", краму рэйнскіх віна і каланіяльных тавараў. З пачатку XX ст. уласнікамі дома сталі Рыманы, якія працягнулі гатэльную гаспадарку, павялічыўшы колькасць нумароў да 33 (магчыма, назва гатэлю была "Маскоўскі"). У 1919–1920 гг. у доме працавалі розныя беларускія арганізацыі: *Беларускі нацыянальны камітэт*, Беларуская павятовая рада, Цэнтральная беларуская рада Гродзеншчыны, клуб "Беларуская хатка", "*Грамада беларускай моладзі*", рэдакцыя газеты "Беларусь". У сярэдзіне 1920-х гг. у доме былі "Polska drukarnia kresowa", рэдакцыя газеты "Nowy Dziennik Kresowy", гатэль "Polski". З лютага 1942 г. дом выкарыстоўваўся як жыллё і рэзідэнцыя нямецкага Галоўнага мытнага ўпраўлення. У другой палове 1940-х гг. у будынку месціўся інтэрнат Гродзенскага педагагічнага ўніверсітэта (гл. *універсітэт імя Я. Купалы*). У гэты час давялося жыць тут будучаму пісьменніку Карпюку А. З ліпеня 1947 г. у будынак перабраўся апарат гарадскога выканаўчага камітэта. З 1961 г. на цокальным паверсе пачала працу "Пяльменная". У 1970 г. тут знаходзіліся "Облмежколхозпроект" і "Облмежколхозстрой", у 1982 г. – Таварыства аматараў кнігі.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 298–299

Дом рыбака – гарадскі будынак XVIII ст., які знаходзіўся на вул. Замкавай да пачатку 1970-х гадоў. Аднапавярховы з мансардай дом быў зроблены з цэглы-пальчаткі. Падобныя будынкі функцыянавалі як жылыя і мелі службовыя памяшканні: крамы, варштаты, канторы. У сярэднявеччы ў Гродне існаваў *цэх рыбакоў*. Нядаўна дом быў адбудаваны нанова амаль з захаваным стылем.

Маліноўская Т. Р. Тэндэнцыі развіцця архітэктуры Гродна напрыканцы XVIII ст. // Ігнат Анацэвіч: Жыццёвы шлях, педагагічная і навуковая спадчына. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 116–117

Дом Сангушкаў – будынак, які знаходзіцца на рагу сучасных вуліцы Савецкай і Савецкай плошчы. Пляц адышоў да магнацкага роду Сангушкаў недзе паміж 1726 і 1745 гг. Дом перабудаваны з дома XVII ст. у камяніцу. Уласнікамі камяніцы з *карчмой* ды драўляным домам былі маршалак вялікі літоўскі Павел Караль Сангушка і яго сыны: маршалак надворны літоўскі Януш Аляксандр і маршалак вялікі літоўскі Юзаф Паўлін. Паводле І. Трусава аўтарам праекта быў Павел Антоні Фантана, паводле Ю. Гардзеева – Дамінік Фантана.

Літ.: Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 45; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў 2008. – С. 291.

Дом стральца (дом афіцэраў), паўстаў у другой палове 1933 г. Яго будаўніцтва разглядалася як патрыятычная справа – выхаванне будучых абаронцаў

айчыны ў час, калі міжнародныя абставіны абвастраюцца. Кантраляваў будаўніцтва камітэт партыятычных грамадзян на чале з генералам Шмаравінскім. Кошт будынка дасягаў больш за 400 тыс. злотых. Пры Д. с. дзейнічалі спартыўныя секцыі: стральба, лёгкая атлетыка, валейбол, лыжы. З 1939 г. і пасля *вайны Другой сусветнай* да сярэдзіны 1990-х у будынку знаходзіўся гарнізонны дом афіцэраў. Затым апошні стаў здаваць свае памяшканні пад арэнду розным фірмам і арганізацыям. Па нядзелях тут працаваў Клуб калекцыянераў. Не зусім добрую рэпутацыю меў клуб "Эпалет". У 1960-х гадах да будынка дабудавалі новы будынак, дзе размясцілася канцэртна-тэатральная зала.

Літ-тра: Чарнякевіч А. "Гвалтоўная эстэтызацыя": архітэкурна-планіровачныя змены ў міжваенным Гродна. 1919–1939 гг. // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Выпуск 9 (2014) / рэд. І. Соркіна [і інш.]. – Гродна, 2014. – С. 13–14; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 84

Дом Тарлоўскага, размешчаны на вул. Савецкая, 3. Будаваўся паступова ў 1880, 1890, 1914 гг., перабудоўваўся ў 1924 і 1933 гг. Купец Тарлоўскі размясціў у доме банкірскую кантору (1894). Акрамя таго тут былі: 12 кватэр, камера судовага следчага па важных справах, Паўночнае страхавое таварыства (1895), крамы, пякарня. У савецкі час у доме размяркоўваліся: кантора "Ваенторга", з 1964 – фотаатэлье № 4, гарнізонны ўнівермаг (1964–1966), крама абласнога кнігагандлю "Ученика и учителя", потым – "Белювелирторга".

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 284–285

Дом Франкаў – будынак размешчаны на вул. Савецкая, 12. Раней на гэтым месцы стаяў дом друкароў Мейлаховічаў (гл. *Мейлаховіч М.*). *Пажар* 1885 г. зруйнаваў будынак, таму яны прадалі маёмасць купцам Франкам. Тыя збудавалі ў 1900 г. новы будынак, які існуе і зараз. Тут месціліся *бібліятэка гарадская публічная,* Паўночнае страхавое таварыства (1903), галоўны агент Расійскага страхавога таварыства (1910), крама А. Жураўскага, Іпатэчны гаспадарчы банк (1937), кнігарня "Kultura", кватэра доктара С. Біргера. У савецкі час тут знаходзіліся крамы: піўная, кааператыўнага гандлю "Журавінка", крама № 7.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 293

Дом Фукса Л. – будынак па вул. Савецкая, 7. Фактычна складаецца з двух будынкаў: адзін, дзе цяпер крама "Оптыка", другі, дзе бар (раней тут быў брамны праезд). Апошні дом належаў у 1831–61 гг. купцу Лейбу Фуксу, пацярпеў ад *пажару* 1885 г., і быў ягонай жонкай-удавой Фейзэ перабудаваны з пабудовай флігеляў да 1899 г. Другую частку дома Фуксы набылі ў 1858 г. Ён меў прыбудову – 1,5 павярховы драўляны дом, які стаяў уздоўж вул. Савецкай і заварочваў у завулак, працягваючыся каменным гаспадарчым памяшканнем. Названы драўляны дом пасля пажару 1885 г. быў разабраны і пабудаваны

новы дом, а каменнае гаспадарчае памяшканне стала двухпавярховым. Тут размеркаваліся аптэка і друкарня. Падчас *паўстання 1863–64* гг. у доме (дзе "Оптыка") жыў сакратар гродзенскага паўстанцкага начальніка Мілевіч І., на кватэры якога адбываліся сустрэчы кіраўнікоў паўстання, спыняўся *Каліноўскі К.-В.* Пасля пажару 1885 г. у двух частках дома знаходзіліся крамы *Лапіна,* Зільбермана, Красіўца, С. Ган; Таварыства страхавання жыцця "Нью-Йорк" (1894), "скоропечатная" Лапіна М. (1910), натарыяльныя ўстановы Шахновіча і Рашэтнева (1911). Варта ўзгадаць пра аптэку *Румеля Я.* (з 1915), дзе прадавалі не толькі лекі, а і парфюмерныя і кандытарскія тавары; пазней аптэка перайшла да Дзічкоўскага Л., а на пач. XX ст. – да Нестаровіча, з 1903 – да Атовіча. У 1937 у доме жыў Беразоўскі Д. – рэдактар мясцовай яўрэйскай газеты "Grodner Moment". З верасня 1940 г. у доме і флігелі размеркавалася "Кіраўніцтва будаўніча-аднаўленчых работ Беластоцкай чыгункі". У 1940–50-я гг. на першым паверсе дома працавала сталоўка, з 1960-х – крама "Оптыка".

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 288–289

Дом Чартка, пабудаваны каля 1866 г., дабудоўваўся ў 1875 (з'явілася двухпавярховая крама) і 1890 (пасля пажару застаўся аднапавярховы дом). Зараз па вул. Савецкай, 21, стаіць непазнавальна перароблены будынак крамы. У розныя часы тут знаходзіліся: тыпалітаграфія *Д. Мейлаховіча* (1894), фотамайстэрня Х.-Э. Э. Бінковіча (1896–1903), фотаатэлье Заблуды і *М. Рубінштэйна*, кнігарня і пры ёй бібліятэка Шантыра (1910), аптэкарская крама Маліноўскага, гатэль "Англійскі" (1915), магчыма, пякарня Танкусовай (1928) і рэдакцыя газеты "Dziennik Kresowy" ды "Polska Drukarnia Kresowa". У 1950 г. у доме была абласная бібліятэка, з 1970 – ювелірная крама.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 298

Дом Шарашэўскага (дом Багуміла) – С-падобны будынак, пабудаваны на вул. Замкавай у стылі эклектыкі паміж 1795 і 1812, перабудаваны ў 1848 г. У 1886 зробленыя прыбудоўкі (свіран і хлеў), якія ў 1910 былі перароблены ў флігелі. У доме размяшчаліся 14 кватэр, майстэрні, крамы, з 1881 – фотамайстэрня М. Г. Кушнера. У 1926 тут жыў галоўны ўрач шпіталя яўрэйскага і ардынатар шпіталя гарадскога А. Ліпнік. Працавала тытунёвая крама Д. Файвушовіча.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 285

Домаш Сямён Мікалаевіч (2.01.1950, в. Тумашы Ляхавіцкага р-на Брэсцкай вобл. – 9.02.2019, Гродна) – старшыня Гродзенскага *гарадскога выканаўчага камітэта* (з 15.05.1990 па сакавік 1991), старшыня Гродзенскага гарадскога савета (з сакавіка 1991). Скончыў Бабруйскі аўтатранспартны тэхнікум (1969),

Вышэйшую партыйную школу (1981) і Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі (1989). У 1993 быў выбраны старшынёй Гродзенскага абласнога выканкама і абласнога Савета дэпутатаў. У 1990–1996 быў дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, дзе курыраваў дзейнасць пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве і мясцовым самакіраванні. 23.03.1996 быў выбраны віцэ-прэзідэнтам Беларускай праваабарончай канвенцыі, якая на той момант аб'ядноўвала 113 грамадскіх арганізацый, партый і рухаў. Разам з 70 дэпутатамі Вярхоўнага Савета падпісаў заяву аб імпічменце прэзідэнту Лукашэнцы. Калі ён не ўдаўся, вярнуўся ў Гродна і заставаўся ў апазіцыі да ўлады. З 1997 быў старшынёй Каардынацыйнага Камітэта "Гродзенская Ініцыятыва", які аб'ядноўваў 34 грамадскія, палітычныя, прафсаюзныя арганізацыі Гродзенскай вобласці. Падпісаў Хартыю'97 у ліку першых ста чал. Паводле ініцыятывы Д. у маі 2000 была створаная Каардынацыйная Рада "Рэгіянальная Беларусь". На выбарах прэзідэнта ў 2001 сабраў 161 476 подпісаў, але за некалькі дзён да галасавання зняў сваю кандыдатуру на карысць У. Ганчарыка. Працаваў дырэктарам Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Гродзенскае вытворчае скураное аб'яднанне" (да 2014). У 2017 Д. увайшоў у кіраўніцтва завода АВС у Гродне.

Крыніца: https://ru.wikipedia.org/wiki. Доступ 07.01.2022.

Дранякін Аляксандр Максімавіч (1813–1879) – гродзенскі *губернатар* з 19.09.1861 да 6.03.1862. Да прызначэння гродзенскім губернатарам у званні генерал-маёра служыў у асобным грэнадзёрскім корпусе світы імператара. Вясной 1861 прыняў жорсткія меры па падаўленні паўстання сялян у Пензенскай губ. У "Гутарцы двух суседаў" № 2, якая распаўсюджвалася ў перыяд паўстання на тэрыторыі Беларусі, гаварылася аб расстрэле Д. на загад цара 10 тыс. сялян у Казанскай губ.

Указам Аляксандра II ад 19.09.1861 быў прызначаны вайсковым губернатарам Гродна і гродзенскім грамадзянскім губернатарам. Па словах расійскага гродзенскага гісторыка *Я. Ф. Арлоўскага*, "в управлении губернией он выказал много энергии и административного таланта. Это был человек твердый и решительный, всякие польские демонстрации подавлял с твёрдой последовательностью". Польскі гродзенскі гісторык *Ю. Ю. Ядкоўскі* назваў Д. "палякаедам". Казначэй гродзенскай *казённай палаты* Малевіч пісаў: "губернатар гаварыў, што не любіць есці аб'едкі чужой ежы, бываць на вечарынах і гуляць у карты". 2.11.1861 Д. падаў "памятную записку", дзе пералічыў меры, якімі можна "утрымаць дадзеную яму губерню ў сапраўдным, а не прывідным парадку і паслухмянасці". Для падаўлення выступлення сялян маёнтка Сліўны графіні Е. Красінскай накіраваў у студзені 1861 дзве роты ў Харошчу і Турасць-Дольную. У лісце да міністра ўнутраных спраў ад 26.01.1862 скардзіўся на рэўматызм і прасіў аб хадайніцтве перад імператарам аб адстаўцы. Указам Аляксандра II ад 6.03.1862 звольнены са службы з пераводам у МУС. 18.03.1863 быў прызначаны начальнікам 1-й акругі Корпуса жандармаў. У 1863 з'яўляўся чальцом следчай камісіі над студэнтамі таварыства

“Зямля і воля”. У 1864 па просьбе М. Мураўёва пераехаў у Вільню для выканання “асаблівых даручэнняў”.

Творы: у 1885 быў надрукаваны артыкул у часопісе “Русская старина” пра сустрэчы ў 1861–1862 з гродзенскім губернскім прадвадзіцелем дваранства В. Стажынскім (Стажэнскім); рукапісны дзённік “Моим внукам”, які захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве.

Крын. і літ.: НАРБ у Гродне, ф.1, воп. 13, с. 1161, а. 3–3 адв.; ф. 1, воп., 34, с. 231, а.86; Орловский Е.Ф. Гродненская старина. – Ч. 1. – Гродна, 1910. – с. 287; Jodkowski J. Rok 1863 w powiecie Grodzieńskim // Echo Grodzieńskie. – Grodno, 1921. – № 28.

Друкарня губернская – друкарня губернскага праўлення, створаная на базе былой каралеўскай. Існавала пры губернскім праўленні з 1819 ці 1820 па 1915 г. У 1864 г. было тут 6 станкоў, да 1895 г. былі набытыя 3 хуткадрукарскія машыны тыпу “амерыканка”. На іх друкаваліся перш за ўсё афіцыйныя матэрыялы, але выконваліся і прыватныя замовы, што давала гадавы даход каля 4,5 тыс. руб. серабром. Да 1865 г. друкаваная прадукцыя выходзіла не толькі на рускай мове, але і на польскай, у 1896 была апублікаваная на беларускай мове паэма “Тарас на Парнасе”. З 1838 па 1915 у Д. г. друкавалася газета *“Гродненские губернские ведомости”*, з 1858 па 1915 – “Адрес-календарь и справочная книжка Гродненской губернии” (“Памятная кніжка Гродзенскай губерні”, 58 выданняў), з 1879 па 1913 – “Обзор Гродненской губернии за ... год” (32 кнігі), з 1892 па 1896 – “Памятные книжки Гродненской дирекции народных училищ”. У друкарні было выдадзена каля 150 найменняў кніг. Тут друкаваліся *Я. Ф. Арлоўскі*, І. І. Астраўмаў, *А. Я. Багдановіч*, *М. Дзікоўскі*, М. А. Дзмітрыеў, У. Р. Краснянскі, У. С. Манасеін, *Д. Мілюцін*, Л. Паеўскі, І. А. Раманоўскі, *Л. Саланевіч*, А. Э. Штрэтар.

Крын. і літ.: НГАБ, ф. 1, воп. 1, с. 1407, воп. 38, с. 615, л.3; ф. 2, воп. 3, с. 889, л.43; воп. 12, с. 1157. Гродзенская губернская друкарня // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. – Мн.: БелЭн, с. 125; Гродно. Энциклопедический справочник, Мінск: БелСЭ, 1989, с. 146–147; Пяткевіч А.М. Слова і кніга Прынёмання. Зборнік навуковых артыкулаў. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 31–32

Друкарня езуітаў. Адныя даследчыкі пішуць, што яна была, а другія, што не было. Мажліва, што супярэчнасці і блытаніну ўнесла наступная сітуацыя. *Тызенгаўз А.*, калі стварaў гарадзенскую друкарню – *каралеўскую, надворную Яго каралеўскай Вялікасці* (інакш: скарбовую) – атрымаў віленскую паезуіцкую друкарню і размясціў яе ў вольнай на той час бурсе *калегіума езуітаў.* А ў тастаменце, складзеным Тызенгаўзам А. (які лічыў друкарню сваёй маёмасцю) 23.08.1782, друкарня была падараваная ксяндзу Мучынскаму, рэктару гродзенскай паезуіцкай калегіі.

Літ.: Пяткевіч А, *Маршруты кніжнага слова: з гісторыі кнігі, друку на Гродзеншчыне,* Варшава 2002, С. 35; *Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku.* Zeszyt 5. Wielkie Księstwo Litewskie. / Oprac. A. Kawecka-Gryczowa, K. Korotajowa, W. Krajewski. – Wrocław, Kraków, 1959. S. 6, 101; Łojek J., “Gazeta Grodzieńska” 1776 – 1783. //

Rocznik Historii Czasopiśmiennictwa Polskiego. – 1966. – T. 5, z. 2. – S. 38; *Nowy Korbut. Bibliografia literatury polskiej.* T. 4. Oświecenie, Kraków 1996, S. 121.

Друкарня Жымеля (Зымеля, Шымеля) Нахімовіча – закладзеная з дазволу ўладаў Літоўска-Гродзенскай губ. у 1803 г. Да якога часу існавала, невядома.

Літ.: Kościałkowski St. Antoni Tyzenhauz. T. 1. – Londyn 1970, s. 493; Jaroszewicz J. Obraz Litwy.., s. 132.

Друкарня каралеўская, надворная Яго каралеўскай Міласці. У спісе "Старажытныя кірылічныя выданні XVI–XVIII стст." гісторык Р. Я. Галенчанка прыводзіць розныя назвы друкарні, напісаныя на самім выданні: "izdana v tipografii e/go/ k/orolevskogo/ v/eliczestva/ // Grodenskoj 1781 godu"; "izdana byst v grade e/go/ k/orolevskogo/ v/eliczestva/ polskogo velikogo kn/ia/zia li/ tovskogo Grodne v leto ot sozdanija mira 7294//"; "napeczatana v tipografii Grodenskoj v leto 7297". Заснаванне гарадзенскай друкарні пачалося з канфліктаў гродзенскага старасты *А. Тызенгаўза* з ксяндзом-астраномам *М. Пачобутам-Адляніцкім* і яўрэямі. Польскі кароль і вялікі князь літоўскі *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* дапамог яму: стрымаў прывілей на друкарню яўрэям і даў астраному-друкару пажыццёвае ўтрыманне за саступку віленскай езуіцкай друкарні. Пачобут напісаў, што саступае друкарню на карысць скарбу Яго каралеўскай Вялікасці – 24.12.1775 падпісаў квіт за атрыманне грошай (2 тыс. чырвоных злотых) за яе. Адсюль назва гарадзенскай друкарні – каралеўская, надворная Яго каралеўскай Вялікасці, скарбовая. Тызенгаўз быў не гаспадар яе, а арандатар, хаця сам лічыў яе сваёй прыватнай уласнасцю і нават у тастаменце, складзеным 23.08.1782, ён дараваў друкарню ксяндзу Мучынскаму, рэктару гродзенскай паезуіцкай калегіі. З віленскай друкарні, відаць, прывезлі першы прэс, шрыфты, іншае патрэбнае абсталяванне, працаўнікоў. У 1774 Станіслаў Аўгуст Панятоўскі даў сваім прывілеем Д. эксклюзіўны прывілей на выданне польскіх і лацінскіх букваро ў, кніг для набажэнстваў. Размеркаваная гродзенская друкарня была ў бурсе паезуіцкага калегіума. У 1775 г. Тызенгаўз запрасіў у Гродна *Зымеля Нахіма*, які арганізаваў словалітню (вытворчасць друкарскіх літар). Паперу для друкарні закуплялі лыскоўскую, кайранскую, за мяжой прускую і ў мясцовых яўрэяў (асабліва паштовую). Каб зменшыць выдаткі, спадзяваліся на вытворчасць паперы тызенгаўзаўскай мануфактуры, якая працавала ў Паставах. Першым дырэктарам Д. быў з 1774 г., верагодна, па канец 1784 (у 1780 яшчэ быў) ксёндз экс-езуіт Маліноўскі Караль. Менавіта ён складаў "Календары гаспадарскія гродзенскія". З 1788 па 1792 друкарняй кіраваў (а можа і арандаваў) яўрэйскі друкар *Ром Барух бар Рабі Юзаф.* У 1792–1794 імаверным кіраўніком мог быць ксёндз Юрэвіч. Даследчык С. Казуля падае яго на 1790–1796 гг. У 1794–1797 кіраўніком Д. быў *Ясенскі/Ясінскі Ян* (гл. таксама *друкарня Яна Ясенскага*). У часы Тызенгаўза патрэбна было друкаваць універсалы, загады, квіты, рахункавыя кнігі, аб'явы, рэкламныя праспекты, афішы. Друкаваліся

тут ноты, праекты, “справы”, “абароны”, “рэплікі” і прамовы дэпутатаў гродзенскіх *сеймаў* (асабліва 1793 г.), іншыя афіцыйныя дакументы. Публікаваліся тры газеты: *“Gazeta grodzieńska”;* “Wiadomości Grodzieńskie” – орган Таргавіцкай канфедэрацыі; *“Кур’ер Літоўскі”*. Папулярным быў “Kalendarz gospodarski Grodzieński”. К. Эстрайхер падае гаспадарскія календары на 1776–81, 1784, 1786–1788, а таксама “Kalendarz polityczny Grodzieński”, які друкаваўся на 1782 і 1783 гады. Выдавалася арыгінальная і перакладзеная літаратура на польскай мове, навуковая і мастацкая літаратура, падручнікі, стараславянскія, польскія і лацінскія малітоўнікі – усяго каля 100 кніг. Успомнім кнігі па гісторыі: Ф. Ёдка, “Вайсковая гісторыя, якая каротка распавядае пра першую Прускую вайну і даўнюю Баварскую” (1799); Г. Бажэнцкі, “Кароткі зборнік егіпецкай і карфагенскай гісторыі” (1776). У 1781 выйшаў 1–2 том “Флоры Літвы” *Ж. Э. Жылібера*. Сярод мастацкіх твораў былі: Ф. А. Вальтэр, “Усходняя гісторыя пра Задзіга” (1776); Я. Х. Мальер “Сганарэль, доктар паводле прымусу, камедыя” (1779, па-нямецку і па-польску); І. Красіцкі “Апісанне вандроўкі з Варшавы ў Білгарай” (1783); Ф. Карпінскі “Вяртанне з Варшавы ў вёску” (1784); І. Быкоўскі “Жанчына, або выпадкі Ірысы – маральная аповесць” (1787); А. Т. Лаўрыновіч “Паў капы баек” (1789). З 1781 па 1792 у Д. выдавалася стараверская літаратура (у НББ захоўваецца 13 выданняў=18 экзэмпляраў), хаця не выключана, што месца выдання пададзенае, каб заблытаць расійскую ўладу. Магчыма, у друкарні выдалі дзве праклямацыі Якуба Ясінскага супраць расійскага тырана і акупанта – “Do exulantów polskich, o stałości” (1793). У канцы 1790-х біскуп Я. Касакоўскі дамогся перанясення друкарні ў Вільню, дзе размеркаваў яе ў семінарыі Св. Юрыя. Адсюль забралі яе місіянеры і ўладкавалі як дыяцэзіяльную, якая дзейнічала да паловы XIX ст.

Крын. і літ.: AGAD, Arch. Tyzehhauza, sig. D–5, k. 20–24; Казуля С. у энцыклапедыі Кніга Беларусі. Зводны каталог. / Склад. Г.Я. Галенчанка і інш.. – Мінск: Бел. СЭ, 1986, с. 19, 156–183; Киреева Г.В. Гродненские издания XVIII века: К созданию национальной ретроспективной библиографии Беларуси // Здабыткі. Вып. 5. – Мн., 2002. – С. 32–40; Пяткевіч А.М. Слова і кніга Прынёмання. Зборнік навуковых артыкулаў. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 24–28; Швед В.В. Гродзенская каралеўская друкарня і яе выданні (1775–1795 гг.) / В.В. Швед // Rocznik centrum studiów białoruskich. – 2016. – № 2. – S. 21–29; Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku. T. 5. Wielkie Księstwo Litewskie / Oprac. A. Kawecka-Gryczowa, K. Korotajowa, W. Krajewski. – Wrocław, Kraków: PAN, 1959, s. 101–104.

Друкарня КПЗБ, дзейнічала ў Гродне падпольна ў верасні 1926–38 гг. Яе арганізатарам быў М. Ш. Жукоўскі-Зільбер, упаўнаважаны ЦК *Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі*. Знаходзілася на вул. Ласасянскай, 48 (цяпер Савецкіх памежнікаў) у падвале дома *І. І. Пата* (дом не захаваўся) Тэксты да друку пастаўлялі з Вільні і Беластока, а паперу і фарбу знаходзілі ў Гродне. Надрукаваныя матэрыялы распаўсюджваліся па ўсёй Зах. Беларусі. У 1930 чалец КПЗБ У. Станкевіч заснаваў у кватэры *Лапіна*, уладальніка

літаграфіі і фабрыкі карт для гульні, друкарню Гродзенскага *акруговага камітэта КПЗБ.*

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 389.

Друкарня Рома Баруха, спачатку была створаная ў мястэчку Азёры пад Гроднам. Лічыцца, што першай кнігай, надрукаванай у ёй (1791) была "Цваат га-хасід га-мефурсам" ("Тастамент вядомага праведніка") гродзенскага равіна Аляксандра (Зіскінда) бен Мойшэ. З 1788 па 1792 Ром кіраваў ці арандаваў *друкарню каралеўскую* ў Гродне. Тут у яго працавалі зэцэры Ісак, сын Ісахара Бер Сегела з Карэца (Кожэца); Арон, сын Самсона Селігі з Карэцу; Яхескель, сын Менахена Нохіма з Сокала; Арэ Леб, сын Яхескеля з Сокала. З 1788 выданні выходзілі з пазнакай каралеўскай друкарні, а з 1792 з'явілася прозвішча Рома. З 1799 "яўрэйская" частка гродзенскай друкарні пераехала ў Вільню, дзе паклала пачатак друкарні, якая існавала да 1925. Пасля смерці *Баруха Рома* абедзве друкарні перайшлі ў спадчыну да сына *Рома Менахема Мана Манеса.*

Літ.: Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku. T. 5. Wielkie Księstwo Litewskie / Oprac. A. Kawecka-Gryczowa, K. Korotajowa, W. Krajewski. – Wrocław, Kraków: PAN, 1959, s. 222–223.

Друкарня Ясенскага Яна – гэтая "друкарня прывілеяваная Яго Каралеўскай Вялікасцю" была заснаваная каля 1794 г. былым шэфам зэцэраў і кіраўніком (прэфектам) *друкарні каралеўскай*. У 1793 *Ясенскі/Ясінскі* атрымаў ад *Станіслава Аўгуста Панятоўскага* прывілей на друкаванне кніг рэлігійнага зместу і для адукацыі моладзі. У Д. выдаваўся па панядзелках і чацвяргах часопіс "Кур'ер Літоўскі" (з 3.10.1794), афіцыйныя матэрыялы. Эстрайхер падае 2 гродзенскія публікацыі друкарні Я. – пераклады з усходніх моў на польскую твораў А. Галанда: "Падарожжа, пачатае дзеля каханых дзяўчат", "Птах, што гаворыць, ды дрэва, што спявае". Каля 1797 г. друкарня пераехала ў Вільню, дзе Ясенскі працягваў друкаваць "Кур'ер Літоўскі" (з 1.04.1797), друкаваў матэрыялы Літоўскага Трыбунала. Напрыклад, "Eksperyment roczny pod zaszczytem Prześw. Sądu Głównego WXLit. za łaski JWIPana Jana Siestrzeńcewicza dany przez JJPP akademików edukujacych się w szkołach powiatowych grodzieńskich zgromadzienia XX Dominikanów dnia 28/9 lipca 1799 r.". У 1802 друкарня спыніла сваё існаванне, абсталяванне было прададзенае Віленскаму ўніверсітэту за 1037 руб. Ёсць меркаванне, што з 1804 г. гродзенскую друкарню ўтрымоўваў прэзідэнт Гродна Урублеўскі Ігнацы.

Літ.: Мальдзіс А. Таямніцы старажытных сховішчаў, с. 92; Kościałkowski St. Antoni Tyzenhauz. T. 1. – Londyn 1970, s. 459, 493; Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku. T. 5. Wielkie Księstwo Litewskie / Oprac. A. Kawecka-Gryczowa, K. Korotajowa, W. Krajewski. – Wrocław, Kraków: PAN, 1959, s. 100–101.

Друцкая Надзея, па мужы О'Брыен дэ Лясы (17.01.1898, Варшава – 1986, Варшава) – дачка князя Сяргея Друцкага, генерала і прафесара Вайсковай

акадэміі права і Марыі Сафановіч. Грамадскі дзеяч, пісьменніца. Скончыла ў Пецярбургу Смольны інстытут у 1914. Падчас *вайны Першай сусветнай* была санітарам і сястрой Чырвонага Крыжа ў санітарным цягніку. Камендантам яго быў *Маўрыцы О'Брыен дэ Лясы,* будучы муж Д. (11.1917). У жніўні 1918 прыехалі ў сямейны маёнтак апошняга – *Аўгустовак*. Тут займалася грамадскай працай у Коле землеўласнікаў, Чырвоным Крыжы, таварыстве Дабрачыннасці, стварыла Таварыства сяброў літаратуры і мастацтва. Як старшыня Бацькоўскага кола, арганізавала на частцы зямлі, што належала О'Брыен дэ Лясы (у сасновым лесе над *Ласасянкай*), летні лагер для бедных вучаніц. У 1925 надрукавала аповесць "Перамога", а ўсяго да 1939 г. выйшла 5 кніжак. У 1930 *Налкоўская З.* увяла Д. у ПЭН-клуб. У 1939 праз Вільню і Коўна дабралася да Варшавы. Тут прымала ўдзел у Чырвоным Крыжы АК, а таксама ў варшаўскім паўстанні. Пасля *вайны Другой сусветнай* працавала ў Бюро аднаўлення сталіцы, перакладала з рускай і супрацоўнічала з радыё. Затым была выкладчыкам рускай мовы і вярнулася да пісьменніцкай працы. Пісала для моладзі біяграфічныя кнігі аб Моцарце, Глінцы, Верне, Манюшцы, Зарускім. З'яўляецца аўтарам успамінаў "Тры чвэрці… Успаміны" .

Літ.: Nałkowska Z. Dzienniki. T. III. 1918–1929. – Warszawa, 1980. – S. 115; Drucka N. Trzy czwarte…Wspomnienia. – Łomianki: LTW, 2011. – S. 90.

Друцкі-Любецкі Францішак Ксаверы Тадэвуш Адам Эўзэбіўш Францішкавіч (1779, в. Пагост Пінскага пав. – 1846) – гродзенскі губернатар з 22.01 па 20.07.1816. Са старажытнага беларускага княскага роду, унесены ў радаслоўныя кнігі Мінскай губ. 18.06.1784 пасля заканчэння Пецярбургскага сухапутнага кадэцкага корпуса (20.11.1797) пачаў службу прапаршчыкам у Нізоўскім мушкецёрскім палку. Удзельнічаў у італьянскім і швейцарскім паходах А. В. Суворава. За храбрасць у бітве пры Марэнга ўзнагароджаны ордэнам Св. Ганны і чынам падпаручніка. Да 1800 у сувязі з кантузіяй выйшаў у адстаўку і пасяліўся ў маёнтку бацькі Чарлёна Гродзенскага пав., некалькі гадоў вёў гаспадарку сястры ў суседнім Шчучыне, дзе ажаніўся з Марыяй Сцыпіён дэль Кампа і тут пасяліўся. У 1806 з'яўляўся чальцом Гродзенскага камітэта па уладкаванні побыту *яўрэяў.* У студзені 1809 г. быў абраны *маршалкам* шляхты Гродзенскага пав. Як яе дэлегат паехаў у снежні 1810 у Пецярбург і дабіўся змяншэння падаткавага цяжару ў беларускіх губернях (указ Аляксандра I ад 24.12.1811/5.01.1812). Перад вайной 1812 прыняў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы праекта адраджэння ВКЛ у межах Расійскай імперыі. У вольны час наведваў прадпрыемствы сталіцы, знаёміўся з тэхнічнымі навінамі і частку набыў сабе ў Шчучын. У кастрычніку 1811 атрымаў чын сапраўднага саветніка, а ў студзені 1812 г. яго завочна выбралі гродзенскім губернскім *маршалкам*. Напярэдадні вайны 1812 г. займаўся забеспячэннем правіянта рускай арміі і ад пачатку чэрвеня знаходзіўся пры імператары ў галоўным штабе. З 25.01.1813 на працягу 1,5 месяца выконваў абавязкі гродзенскага *губернатара*: пачаў аднаўляць жыццё і гаспадарку пасля вайны, забяспечваў рускія войскі харчаваннем. Як адзін з нямногіх палякаў, адданых цару Аляксандру I, у сакавіку

1813 г. быў прызначаны сябрам Часовага Вярхоўнага савета Княства Варшаўскага і старшынёй Цэнтральнага камітэта пры ім. На гэтых пасадах імкнуўся не дапусціць марадзёрства і рабункаў адміністрацыі і расійскіх войск, праявіў актыўную цікавасць перш за ўсё да будучага лёсу свайго краю. З мая па снежань 1815 г. уваходзіў у склад Часовага Урада Каралеўства Польскага. 20.05.1815 як "царскі намеснік" падпісаў Канстытуцыйную хартыю. У сфармаваны ўрад Каралеўства Польскага не ўвайшоў, а быў прызначаны царскім указам ад 22.01.1816 на пасаду Гродзенскага *губернатара.* На гэты раз на паўгода, а царскім указам ад 20.07.1816 стаў віленскім губернатарам (7 гадоў лічыўся ім, але так і не ўступіў на пасаду).

19.07.1821 Д.-Л. быў прызначаны міністрам фінансаў Каралеўства Польскага і чальцом Дзяржаўнай рады. Да поспехаў яго дзейнасці на гэтых пасадах можна аднесці будаўніцтва Жырардаўскай ільнопрадзільнай фабрыкі, стварэнне Галоўнай дырэкцыі кіравання горназаводскай прамысловасцю, арганізацыя польскага банка і земскага крэдытнага таварыства, дасягненне мытных ільгот для вывазу польскага сукна ў Расійскую імперыю, падпісанне гандлёвай канвенцыі паміж Расіяй і Прусіяй, якая забяспечыла эканамічныя інтарэсы Польшчы. Падчас следства па справе дзекабрыстаў (1825–26) дабіўся перадачы чальцоў польскіх тайных гурткоў і таварыстваў польскаму сеймаваму суду, і яны панеслі мяккія пакаранні. У перыяд паўстання 1830–1831 гуляў ролю пасярэдніка паміж дыктатарам Хлапіцкім і рускім урадам. 14.02.1832 Д.-Л. быў прызначаны сябрам расійскага Дзяржаўнага Савета, дзе ў 1833 падтрымаў ідэю М. М. Сперанскага аб складанні і выданні "Свода законов Российской империи". Выказаў ідэю аб замене асігнацый, якія страцілі кошт, на крэдытныя білеты. У 1840 склаў запіску аб стане і мерах па ўдасканальванні фінансаў Расіі. Пахаваны ў Шчучыне Гродзенскай вобл. Меў узнагароды: ордэны – Св. Ганны 4 ст. (1799), 1 ст. (1812). Сям'я: жонка – графіня М. Сцыпіён дэль Кампа (14.02.1807); 9 дзяцей. На гродзенскіх каталіцкіх могілках знаходзяцца пахаванні Міхала (?–1916) і Вікторыі (?–1861) Сцыпіён дэль Кампа.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф.1193, воп.1, а.1; ф. 1, воп. 1, с. 551, а. 31–32; Olechnowicz. Archiwa rodowe i osobiste w Litewskim państwowym archiwum historycznym // Miscelanea historico-archivistica. T. IX. – Warszawa, 1998. – s. 155; Polski Słownik Biograficzny. T. 17. – Wrocław, W-wa, Kraków: PAN, – s. 582; J. Zdzitowiecki. Xiąże-minister Franciszek Xawery Drucki-Lubecki. 1778–1846. – Warszawa: Wyd-wo S. Arcta, 1998. – S. 13–16.

Друцкі-Любецкі Уладзіслаў Аляксандравіч (1864 – 21.04.1913) – князь, уладальнік маёнткаў Шчучын, *Станіславова, Панямунь* (пасля смерці Ядвігі Быхавец з Друцкіх-Любецкіх) каля Гродна і Тэрэсіна ў Сухачэўскім у. У 1907 быў выбраны на пасаду *прэзідэнта* Гродна, але не быў зацверджаны расійскай уладай. *Ажэшка Э.* пра яго казала: "трохі занадта халодны – з публічных прычын. Гэта надзвычайны нечалавек". Яго жонкай была графіня Марыя Здзіславаўна Замойская (1868–1939), з якой меў 4 дзяцей. У маёнтку Тэрэсін у канцы красавіка 1913 ён быў забіты, па-словах сучаснікаў, Я. Ю. Біспінгам, ардынатарам маёнтка Масаляны з-пад Гродна. Следства ішло амаль год, але

скончылася мяккім прысудам: пазбаўленне правоў і прывілеяў, канфіскацыяй маёмасці і 4 гадамі арыштанцкіх рот. Ад усяго Біспінгу ўдалося адкупіцца закладам у 100 тыс. руб., а хутка пачалася *вайна Першая сусветная,* за ёю – рэвалюцыя, *вайна савецка-польская*, і ўладам было не да яго.

Літ.: Павач А. Гродзенскія гісторыі ад Андрэя Павача. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2019, 86–88; Aftanazy R., Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. T. 3. – S. 126; Orzeszkowa E. Listy zebrane/ red. E. Jankowski. T. V. – Wrocław: Wydawnictwo PAN, 1961. – S. 351; T. IX. – Wrocław: Wydawnictwo PAN, 1981. – S. 478.

Друцкі-Любецкі Ян Марыя (8.07.1898, Экс-ле-Бэн, Францыя – 12.08.1990, Непакалянаў, Польшча) – сын *Уладзіслава,* князь, уладальнік маёнтка *Станіславова* і камяніцы на вул. Ажэшкі, 24. Сябра *Таварыства аматараў г. Гродна* (1924). У 1927 ахвяраваў айцу *Кольбэ М.* тэрыторыю пад манастыр францішканцаў у Тэрэсіне. З 1939 жыў у эміграцыі і толькі напрыканцы жыцця вярнуўся ў Польшчу.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015. – С. 97.

Дубко Аляксандр Іосіфовіч (14.01.1938, в. Ілава Віцебскай вобл. – 4.02.2001) – старшыня ордэна Леніна аграпрамысловага калгаса-камбіната "Прагрэс" Гродзенскага р-на (з 1972). Скончыў Гродзенскі *інстытут сельскагаспадарчы* па спецыяльнасці "аграном". Працаваў аграномам-семянаводам вучгаса "Станіславова" Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута (1960). З 1961 па 1972 быў на розных кіроўных пасадах у Гродне і вобласці. Старшыня Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў (26.04.1990 – 1991). Герой Сацыялістычнай Працы. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, "Знакам гонару", двума медалямі і дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Старшыня Савета калгасаў Рэспублікі Беларусь, старшыня Саюза аграрнікаў Беларусі.

Дуброўшчык Уладзімір Уладзіміравіч (7.01.1972, Гродна) – гродзенскі алімпіец, лёгкаатлет (кіданне дыска). Срэбны прызёр XXVI Алімпійскіх гульняў (1996), заняў сёмае месца на XXVII гульнях. Срэбны прызёр чэмпіянату свету (1995), пераможца Кубка свету (1994), чэмпіён Еўропы (1994), шматразовы чэмпіён Беларусі.

Літ.: Попко И.Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 117–120.

Дума гарадская

1) Заснаваная ў 1836 згодна з указам Мікалая I "Аб усталяванні прысутных месцаў у вернутых ад Польшчы губернях". Была выбарным распарадчым органам самакіравання. Выбіралася на 3 гады паводле саслоўнага прынцыпу. Знаходзілася ў сістэме МУС, падпарадкоўвалася *губернатару*. У 1870 адбыліся

змены: згодна з указам Сената "Аб распаўсюджванні Гарадавога палажэння ад 16.06.1870 г. на гарады Заходніх губерняў". Д. г. выбіралася на аснове маёмаснага цэнзу на 4 гады з прадстаўнікоў розных саслоўяў. Са свайго складу яна выбірала старшыню (гарадскога галаву), які кіраваў думай і ў*правай гарадской,* а таксама – сябраў управы. Думы займаліся гарадскім дабраўпарадкаваннем, зборамі і падаткамі, зацвярджалі гарадскі бюджэт. Зліквідаваныя ў 1917, а іх функцыі перададзеныя гарадскім *Саветам дэпутатаў*.

2) У міжваенны час 1919–1939, калі горад быў у складзе другой Рэчы Паспалітай, мясцовая гарадская ўлада таксама належала думе. Друкаваліся яе справаздачы ў "Przegląd statystyczny m. Grodna" за 1922–26 гг.

Літ.: Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 87–88; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 12.

Дурчэўскі Здзіслаў (3.07.1908, Длонь Равецкага пав. Пазнанскага в-ва – 5.08.1944, Варшава) – польскі археолаг. Вучыўся ў школе Длоні, гімназіі Равіч, Пазнанскім універсітэце. У апошнім абараніў ступень магістра філасофіі ў галіне гісторыі і ў 1936 – доктарскую па прадгісторыі. Працаваў у Дзяржаўным археалагічным музеі ў Варшаве, які і накіраваў яго ў Гродна. Тут Д. у 1937–1938 гг. правёў раскопкі на *замку Старым*. На захад ад *царквы Ніжняй* выявіў рэшткі 23 драўляных пабудоў. На аснове знойдзенага археалагічнага матэрыялу прыйшоў да высновы аб існаванні 2 перыядаў у развіцці *Горадзена*: горад канца XII – 1 паловы XIII ст. і часоў літоўскіх князёў XIII–XIV ст. У Гродне яго застала *вайна Другая сусветная*, жыў за кошт продажу газет. У кастрычніку 1939 выехаў у Вільню, а пазней вярнуўся ў Варшаву. Расстраляны нямецкімі акупантамі падчас Варшаўскага паўстання ў 1944. Пахаваны на Служэўскіх могілках у Варшаве. Апублікаваныя працы, прысвечаныя яго раскопкам у Гродне:

1. Łopata prehistoryka na Starym zamku w Grodnie // Kuryer Litewski – Naukowy, XIV, N 36, dodatek do Ilustrowanego Kuryera Codziennego, Kraków, n. 239 z 30.VIII.1937.
2. Gród litewski z XIII i XIV w. na Starym zamku w Grodnie [w.:] Kuryer Litewski – Naukowy, XIV, n. 47, dodatek do Ilustrowanego Kuryera Codziennego, Kraków, n. 316 z 15.XI.1937.
3. Dziwy na Starym zamku w Grodnie [w:] Światowid, Kraków XV, n. 2 z 8.01.1938.
4. Z warsztatu pracy wykopaliskowej w Starym zamku [w.:] Dziennik kresowy, n. 180 z 3.07.1938.
5. Doniosłe wyniki prac wykopaliskowych na Starym zamku w Grodnie w latach 1937–1938 [w.:] Kuryer Litewski – Naukowy, XV, n. 48, dodatek do Ilustrowanego Kuryera Codziennego, Kraków, n. 329 z 28.XI.1938.
6. Sprawozdanie z badań archeologicznych na Starym zamku w Grodnie w 1937 r. [w.:] Sprawozdanie z działalności wojewódzkiego komitetu Uczczenia Króla Stefana Batorego w Grodnie. – Grodno, 1938.

7. Stary Zamek w Grodnie w świetle wykopalisk, dokonanych w latach 1937–1938, Grodno 1939 (тое ж у часопісе "Niemen" (1939, №1).

Літ.: Археалогія Беларусі: энцыклапедыя. У 2 т. Т.У. Бялова (гал. рэд.) і інш — Мінск: Бел. Эн., 2009. Т. 1; Kostrzewski J. Wspomnienia pośmiertne [w.:] Przegląd Archeologiczny. T. VII. Zesz. 1. ,1946, s. 127–128; Polski słownik biograficzny. T. 6, s. 10.

Дыбоўскі Себасцьян (? – каля 1565) – прыдворны каралевы *Боны Сфорцы*, а затым Жыгімонта Аўгуста, каралеўскі рэвізор, "спраўнік двароў староства гарадзенскага" (пасада ўведзеная Бонай для канцэнтрацыі фінансаў у адных руках). Пабудаваў *каралеўскі двор ў Гарадніцы/Сухім Сяле*. Разам з Войнам Л. у 1560 г. зрабіў *валочнае вымярэнне* староства гарадзенскага, у тым ліку апісанне Горадні ("Regestr pomiary wlok"). У 1881–1882 гг. вынікі прац Дыбоўскага і Войны былі выдадзеныя ў Вільні ў двух частках "Писцовая книга Гродненской экономии".

Літ.: Сліж Н. Статус Гародні ў XVI – першай палове XVII стст. / Rocznik Grodzieński. – 2012. – 4. – С. 40.

Дываны гродзенскія. Былі падвойныя, тканыя толькі з воўны, мелі двухслаёвую (падвойную) тканіну і абсалютна ідэнтычны, толькі розны па колеры малюнак з абодвух бакоў. Аздабляліся махрамі з той жа пражы. Назву "гродзенскія" атрымалі дзякуючы *Ядкоўскаму Ю.*, які ў першыню выявіў іх у вёсках Янава, Дамброва і Сухая Воля і апісаў. Распаўсюджаныя на тэрыторыі Беларусі ў сярэдзіне XIX ст. З 1930 г. ткала такія дываны Ядзвіга Райская (1913–2003) у Адэльску, вырабы якой захоўваюцца ў *Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі.* Дыван канца XIX ст., які належаў маці паэткі Л. Геніюш, з'яўляецца экспанатам Гудзевіцкага дзяржаўнага літаратурна-этнаграфічнага музея. Тут падвойныя дываны (каля 15 штук) ткала Вера Белакоз, а яе вучаніца Людміла Станеўская кіруе гуртком па ткацтве. Другая вучаніца – дачка В. І. Белакоз, Марына Камінская, узначальвае ўзорную студыю "Суквецце талентаў" пры Гродзенскім дзяржаўным абласным Палацы творчасці дзяцей і моладзі, дзе навучаюць усім тэхнічным асаблівасцям падвойнага ткацтва. Фелікс Шунейка ў 1950-х гадах стварыў пры Гродзенскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці лабараторыю па ткацтве. А яго дзеці Алена і Яўген у 1980 адрадзілі майстэрню. Тэхналогіі падвойнага ткацтва метадыст цэнтра Алена Шунейка вучылася ў Я. Райскай. За 30 гадоў яна стварыла больш за 40 тэкстыльных твораў розных памераў і ў розных тэхніках ткацтва. Тэматыкай яе працаў з'яўляецца любоў да Радзімы і яе гісторыі: "Каложа", "Фарны касцёл", "Фара Вітаўта", "Горад майго дзяцінства", "Гродзенскія замкі" і інш.

Літ.: Волах В.Я. Гродзенскія дываны // Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства. – Гродна: б.в., 1990. – С. 18–20; Пасюта Н.І. Ткацтва падвойнае // Этнакультурныя і прыродныя турыстычныя рэсурсы Гродзеншчыны і Сувальшчыны: энцыкл. давед. / рэд. В.Р. Карнялюк, І.І. Трацяк. – Гродна-Мінск: Беларускі дом друку, 2014. – С. 258; Пасюта Н.І. Шунейка А.Ф. // Этнакультурныя і прыродныя турыстычныя рэсурсы Гродзеншчыны і Сувальшчыны: энцыкл. давед. / рэд. В.Р. Карнялюк,

І.І. Трацяк. – Гродна-Мінск: Беларускі дом друку, 2014. – С. 282; Sztuka tkacka na wsi. Dywany grodzieńskie i perebory poleskie. Katalog wystawy/ VII-X. 1938. – Warszawa, 1937.

Дэпартацыі 1940–1941 гг. Тычыліся каталікоў, праваслаўных і юдэяў – асоб, якія ў вачах саветаў маглі быць носьбітамі нацыянальнай свядомасці і маглі зарганізаваць супраціў. Галоўным прынцыпам быў сацыяльны статус, а прычынай – даносы суседзяў. Першая Д. адбылася 10 лютага 1940 г. і была скіраваная на высяленне асаднікаў, працаўнікоў лясной гаспадаркі і членаў іх сямей. 13 красавіка пачалося высяленне сямей тых, родныя якіх сядзелі ў лагерах, турмах для ваеннапалонных: былых афіцэраў, паліцэйскіх, уладальнікаў прадпрыемстваў, працаўнікоў польскага дзяржаўнага апарата, удзельнікаў антысавецкіх арганізацый, паўстанцаў. 29 чэрвеня – трэці этап дэпартацыі, пад які трапілі бежанцы-яўрэі (1755 чал. на 13.01.1940). 19–20 чэрвеня – апошні, чацвёрты этап дэпартацыі, які закрануў ўдзельнікаў польскіх арганізацый "Стральцы", "Крокусы", "Ахвотнікі" і сем'і ўжо арыштаваных асоб. Апошні транспарт з дэпартаванымі трапіў пад бамбардзіроўку нямецкіх самалётаў пад Ваўкавыскам і ў раёне Баранавіч. А таму значнай частцы вывезеных людзей удалося вярнуцца ў Гродна.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 144; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 381; Omiljanowicz-Szoka C. Moje grodzieńskie lata 1939–1945. – Łódź, 1993. – s. 142–147.

Дэшнер (сапр. Teschner, Тэшнер) **Саламея** (1759, Беласток – 20.03.1809, Гродна) – акцёрка, рэжысёр, антрэпрэнёр, стваральніца першага пастаяннага тэатра ў Гродне. Раней працавала ў тэатрах Варшавы (1777–1785, 1790–1794) і Львова, Дубна, Вільні (1785–1790). У Гродне жыла з 1800 г. Ставіла антрэпрызы. Дазвол на тэатральную дзейнасць на 10 гадоў атрымала 9.06.1802 ад расійскага імператара *Аляксандра I*, калі той быў у Гродне. 12.06.1803 звярнулася да яго зноў з прашэннем аб дазволе паказваць спектаклі на кірмашах у м. Зэльва. Атрымала манапольнае права на гастролі на 6 гадоў не толькі у Зэльве, але і ў іншых месцах Гродзенскай губ. На той час яна была ўжо вядомай актрысай, якая выступала на сцэнах Варшавы, Львова і Вільні. Пачынала ў Беластоку ў тэатры Браніцкіх, дзякуючы каралю *Станіславу Аўгусту Панятоўскаму* трапіла ў каралеўскі двор у Варшаву, затым выступала ў трупе *Багуслаўскага В.* Грала ролі гераіняў і субрэтак – служанак, каханак і авантурыстак. У гарадзенскай трупе С. Д. выступалі сярод іншых Здановіч Юзаф, Аныч Зыгмунт, Шымкоўская Марыянна, Швейбянка Ганна (дзве апошнія памерлі ў Гродне). У 1783 спявала ў оперы, перакладзенай з італьянскай "Італьянка ў Лондане", у 1795 на рускай мове спявала ў камедыі "Згублены коцік". Захаваныя за 1804 і 1806 тэатральныя афішы знаёмяць з рэпертуарам тэатра Дэшнер. Пераважалі меладрамы, камедыі, французскія і нямецкія вадэвілі: "Жыхары выспы Гвадэлупы,

або “Узнагароджаная цнота” Л. С. Меркера, “Шахматная машына, альбо Гумар часоў зайздрасці” А. Кацэбу.

Літ.: Вашкевіч А. Жаночы след у гісторыі Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 17–20; ДГА Літвы, ф. 378, а/а 1803 г. стр. 266, л. 12; Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. T. I. – Lwów, 1925. – S. 254, 399, 403; Renikowa W., Tradycje teatralne Grodna // Wilno i kresy Północno-Wschodnie. T. II. Kultura i trwanie., Białystok 1906, s. 138–140; Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. T. II. – Lwów, 1925. – S. 14f, 239; Skibiński K., Pamiętnik aktora (1786–1858) / Oprac. i wydał M. Rulikowski. – Warszawa, 1912.

Е



С. 852

Езавітаў Кастусь (1893, Дзвінск – 1946, Мінск) – беларускі вайсковы, грамадскі і палітычны дзеяч, камандзір (03–09.1919) *Палка першага беларускага пяхотнага*. Вучыўся ў Віцебскім настаўніцкім інстытуце і Паўлаўскім вайсковым вучылішчы ў Пецярбургу. У 1917 быў намеснікам старшыні Цэнтральнай беларускай вайсковай рады, удзельнікам Першага ўсебеларускага з'езда. У 1918 быў камендантам Мінска, сябра Рады БНР, дзе выконваў пасаду народнага сакратара вайсковых спраў. У канцы 1918 выехаў у Вільню, заняўся фармаваннем Беларускага палка. З верасня 1919 працаваў у Міністэрстве беларускіх спраў, у 1919–1920 кіраваў Вайскова-дыпламатычнай місіяй БНР у Латвіі і Эстоніі. Да *вайны Другой сусветнай* працаваў настаўнікам у Латвіі і быў кіраўніком беларускай меншасці. У 1944 выбраны ў склад Беларускай цэнтральнай рады, а ў красавіку 1945 быў арыштаваны савецкім органам СМЕРШ і расстраляны (ці памёр сам).

Літ.: Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich= Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– S. 201–202; Surgailis G. Lietuvos Kariuoenes. Gudu Kariniai Daliniai 1918–1923 m. – Vilnius, 2020. – S. 244–245.

Еліна Ц. – адна са стваральнікаў камсамольскай арганізацыі ў Гродне (1921).

Ельскі Канстанцін, выбраны камендантам узброеных сіл *Гродзенскага пав.* 1794 г., атрымаў ад Касцюшкі чын генерала-маёра паспалітага Гродзенскага пав. У 07.1794 прывёў у Ломжу да генерала Карвоўскага атрад добраахвотнікаў з шляхты (1200 чал.). Выдаў у гродзенскіх *друкарнях* шэраг адозваў да мабілізацыі рэкрутаў і да паспалітага рушэння ў войска: 12.V, 16.V, 31.V, 1.VI. Запрашаў у Гродна рамеснікаў, асабліва кавалёў, слесараў, мечнікаў, майстроў па вырабе сёдлаў. Належаў да групы "правінцыйных якабінцаў", збіраў у паспалітае рушэнне дробную шляхту, а таксама заклікаў пасылаць "паспалітнікаў" з маёнткаў заможнай шляхты. Выправа Ельскага над Нараў мела характар шляхецкага паспалітага рушэння, галоўным чынам з дробнай шляхты, беззямельнікаў.

Літ.: Grodno w XVIII wieku. Miasto i ludność (na tle trendów rozwojowych od średniowiecza do 1936 roku) / Red. A. Woltanowskiego i J. Urwanowicza. – Białystok, 1997. – s. 36–37, 79.

Еўдакімаў Уладзімір Мікітавіч (6.05.1939, г. Об, Навасібірская вобл. – 2018). Заслужаны архітэктар БССР (1988). Скончыў архітэктурны факультэт

Навасібірскага інстытута імя Куйбышава (1971). І з гэтага года стаў працаваць у інстытуце “Гроднаграмадзянпраект” (пачаў з пасады тэхніка-архітэктара і дашоў да намесніка дырэктара па архітэктуры і галоўнага спецыяліста па архітэктуры). У 2004 выйшаў на пенсію. Загадам міністра па архітэктуры і будаўніцтве Рэспублікі Беларусь прызначаны старшынёй Дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта па спецыяльнасці Г11 15 00 – архітэктура. Аўтар рэалізаваных у Гродне праектаў: дом піянераў, 9-павярховы інтэрнат на 414 месц, будынак аблвыканкама па вул. Савецкай (у суаўтарстве), будынак упраўлення “Гроднасельбуд” па вул. Горкага (у суаўтарстве), кардыялагічны цэнтр па вул. Болдзіна (у суаўтарстве), гатэль на 500 месц “Гродна” па вул. Паповіча (у суаўтарстве), 3-зальны кінатэатр “Кастрычнік” на 1023 месц (у суаўтарстве), аэравакзал (у суаўтарстве; 1 месца ў конкурсе), мемарыяльны комплекс “Форт-Навумавічы” (у суаўтарстве, 1 месца ў конкурсе), жылы дом па вул. Горкага (у суаўтарстве). Пазней паводле замалёвак і праектаў Е. былі ўзведзеныя будынкі райвыканкама па вул. Сав. памежнікаў і гарвыканкама на пл. Леніна.

Паспяховай была і грамадская дзейнасць Е. Быў старшынёй праўлення Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза архітэктараў (далей СА) БССР (1984–1988). З 1986 – чалец Прэзідыума праўлення СА БССР і Праўлення СА СССР. З 1992 пастановай Вярхоўнага Савета РБ і Савета міністраў РБ уключаны ў склад Камітэта па дзяржаўных прэміях РБ у галіне культуры, мастацтва і архітэктуры. У 1996 выбраны сапраўдным чальцом Акадэміі архітэктуры РБ. Атрымаў дзяржаўныя ўзнагароды: Грамату Вярхоўнага Савета БССР (1984), медаль “Ветэран працы” (1990), Прэмія Савета міністраў за праектаванне і пабудову кінатэатра “Кастрычнік” (1991), Дзяржаўная прэмія за праектаванне і пабудову гарадка Рось (1998), прэмія Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва за праектаванне і пабудову дабраўпарадкавання Навагрудка (1999).

Крыніца: https://bsa.by/news/BUA/istoricheskaya-spravka. Доступ 25.01.2021.

Europa Regina – антрапаморфная мапа Еўропы ў выглядзе жанчыны з каронай на галаве – царэўны Еўропы, якая дала назву частцы свету. Выдадзеная Куадам і Бассемахерам у Кёльне ў 1587. На мапе паказаныя дзяржавы, іх гербы, буйныя рэкі і значныя гарады. У Польшчы – Кракаў, у Англіі – Лондан, у Францыі – Парыж, а ў ВКЛ – *Горадня*. Аўтар электроннага паведамлення піша, што, магчыма, на гэта паўплываў *Стэфан Баторы*, які зрабіў Горадню сваёю рэзідэнцыяй і фактычна ператварыў у сталіцу ВКЛ.

Літ.: https:// asnoru.livejornal.com/27078.ht

Ж

Жабакліцкі Антоні (17.05.1882, м. Пясэчна пад Варшавай – пасля 1939) – чалец *Рады польскай галоўнай Гродзенскай зямлі*. Капітан запасу, адвакат, юрыдычны дарадца Камандавання вайсковым корпусам III, актыўны грамадскі дзеяч у міжваенным Гродне: старшыня саюза адвакатаў; сябра таварыстваў (Польскага краязнаўчага, *"Музы"*, апекі над зняволенымі "Патранат", аматараў горада Гродна, народных дамоў) і камітэтаў (будаўніцтва помніка *Ажэшцы Э.*). Магчыма быў рэпрэсаваны ў 1939.

Літ.: Міхайлік Л. Праблема сацыяльнага забеспячэння ў Гродне 1921–1939 гг. // Гарадзенскі палімпсест. 201. Асоба, грамадства, дзяржава. XVI-XX стст. – Мінск, 2012. – С. 363; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015. – С. 102.

Жаброўскі Леан (7.04.1876, Поцішкі, Свянцянскі пав. – 6.09.1953, Мейшаголы) – ксёндз, чалец *Рады польскай галоўнай Гродзенскай зямлі*. У 1916–1927 гг. быў старшынёй дзявочага прытулку пры фарным *касцёле св. Фр. Ксаверыя*, у лістападзе 1918 – патрон арганізацыйнага камітэта Хрысціянска-дэмакратычнага саюза. У Гродна прыехаў падчас *вайны першай сусветнай*, з 1917 стаў гродзенскім дэканам, у 1920–1921 – капеланам гродзенскага *шпіталя* і гарнізона. Актыўны грамадскі дзеяч: сябра Польскага дэмакратычнага камітэта (1918–1920), Таварыства сяброў навук (1923), віцэ-старшыня рады па будаўніцтве помніка *Ажэшцы Э.* (1925), сябра польскай *Мацежы Школьнай*, Камітэта адбудовы *Фары Вітаўта* (1922), Камітэта па ўпарадкаванні гродзенскіх *могілак каталіцкіх* (1924).

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015. – С. 102–103

Жалкоўскі Уладзіслаў Людвікавіч (каля 1837 – ?) – паўстанец 1863 г., шляхціц, скончыў гродзенскую гімназію, з 1856 па 1860 быў вольным слухачом Кіеўскага ўніверсітэта. У сувязі с хваробай вярнуўся ў Гродна і паступіў на працу чыноўнікам (губернскі сакратар) канцылярыі гродзенскага ваеннага губернатара. Спачатку ў арганізацыі быў памочнікам *Цеханоўскага*, а потым рэвалюцыйным начальнікам Гродна пасля *Ю. Руткоўскага*. Рабіў закупкі вопраткі і абутку для паўстанцаў. Магчыма, Ж. атрымаў перад арыштам Руткоўскага пячатку начальніка горада і знішчыў яе, выкінуўшы ў прыбіральню каля

кватэры апошняга. Арыштаваны 31.03.1864 г. У сваёй дзейнасці на апошняй пасадзе не прызнаўся. Жыў у Гродне па вул. Купецкай, у доме брыгітак. Прыгавораны да крапасных прац на 8 гадоў у Сібіры і канфіскацыі маёмасці.

Крыніца: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11, 189, 191, 193; с. 1, а. 554 адв.; с. 4, а. 30–31, 34; воп. 1, с. 40, а. 157.

Жангаловіч Іван Данілавіч (1892, Гродна – 1981, Ленінград/Санкт-Пецярбург) – заснавальнік касмічнай геадэзіі, расійскі гравіметрыст і астраном. Скончыў Петраградскі ўніверсітэт (1916) і з 1920 працаваў у Інстытуце тэарэтычнай астраноміі АН СССР. З 1930 – прафесар Ленінградскага ўніверсітэта, намеснік дырэктара (1943–1966). Удзельнічаў у палярных экспедыцыях (1920–1930, 1937–1938). У 1946 стаў доктарам фізіка-матэматычных навук, у 1952 – заслужаным дзеячам навукі Расіі. Навуковыя працы прысвечаныя тэарэтычнай, практычнай і эфемерыднай астраноміі, геафізыцы, касмічнай геадэзіі, фігуры Зямлі.

Літ.: Ермоленко В. А., Черепица В. Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 365.

Жандармерыя – орган палітычнага вышуку, створаны ў Расійскай імперыі адпаведна Палажэнню аб жандарах унутранай стражы ад 1.02.1817. У губернскім Гродне мусілі стварыць стварыць часткі ўнутранай аховы. 28.04.1827 з'явілася Палажэнне аб Корпусе жандараў, згодна з якім усе яны былі аб'яднаныя ў Асобны корпус спецыяльнага прызначэння ў складзе расійскай арміі. Ён быў падпарадкаваны III аддзяленню Асабістай яго Імператарскай Вялікасці канцылярыі. Гродзенскае губернскае жандарскае ўпраўленне было створанае згодна з Палажэннем аб Корпусе жандараў ад 9.09.1867. Ж. займалася пошукам і следствам па палітычных справах: наглядам за дзейнасцю палітычных партый і іх сябраў; выкрываннем утрымання і распаўсюджвання нелегальнай літаратуры; правядзеннем вобшукаў; барацьбой з забастоўкамі працоўных і дзейнасцю нелегальнага друку; назіраннем за асобамі пад наглядам паліцыі; следствам і ссылкай ў Сібір. Адзін з памочнікаў Гродзенскага губ. жандарскага ўпраўлення займаўся непасрэдна гэтай працай па Гродне. Яму дапамагалі ў гэтым вахмістры, унцер-афіцэры, ротмістры. У 1880 Корпус жандараў быў зліквідаваны, а яго функцыі перайшлі да Дэпартамента паліцыі МУС. Губернскія жандарскія ўпраўленні былі падпарадкаваныя Дэпартаменту паліцыі, а ў вайсковых адносінах – ваеннаму міністру. Канцылярыя ўпраўлення падзялялася на сакрэтнае, вышуку, назіральнае, гаспадарчае аддзяленні. У 1915 была эвакуяваная ў Калугу. Рашэннем Часовага ўрада ад 4.03.1917 Ж. была зліквідаваная, а яе супрацоўнікі размяркоўваліся па вайсковых частках.

Літ.: Гродненская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917). – Гродно, 2018. – С. 51–54.

Жыгімонт Кейстутавіч (? – 20.03.1440, Трокі) – вялікі князь літоўскі, самы малодшы сын Кейстута, брат *Вітаўта*, якога заўсёды падтрымліваў. Калі апошні парваў з *крыжакамі,* Ж. К. затрымалі ў Мальбарку да 1398, а *Ягайла* пазбавіў яго вотчыны, Троцкага княства. Ваяваў разам з Вітаўтам супраць татараў на Ворскле (1399) і супраць крыжакоў пад Грунвальдам (1410). Пасля смерці брата Ж. К. быў праціўнікам Свідрыгайлы і зрабіў на яго замах пад Ашмянамі ў 1432. У гэтым жа годзе 15 кастрычніка Жыгімонт атрымаў уладу ў ВКЛ, падпісаўшы з Ягайлам *унію гродзенскую*. Вёў далей барацьбу са Свідрыгайлам і яго паплечнікамі, што стала прычынай яго смерці.

Літ.: Kiryk F., Zygmunt Kejstutowicz // Słownik biograficzny historii Polski. T. 2 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C. 1746–47.



С. 853

Жылібер Жан Эмануэль (21.06.1741, Ліён – 2.09.1814, Ліён) – французскі прыродазнавец, прафесар анатоміі, хірургіі і натуральнай гісторыі. 17.10.1775 прыехаў у *Гродна* з жонкай і дзіцём з Ліёна, дзе выкладаў у медычным каледжы і быў чальцом мясцовай Акадэміі навук. Запрасіў яго ў горад ад імя *Тызенгаўза А.* Даўнаровіч Т. (а па словах самога Жылібера – кароль польскі *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі*). Ж. замяніў памерлага каралеўскага доктара Хэйнзельмана і правёў у Гродне каля шасці-сямі гадоў. Узначальваў каралеўскую *школу медычную (акадэмію)* з анатамічным тэатрам. Заснаваў у Гродне школу акушэрскую, каралеўскі клінічны *шпіталь*, *батанічны і* заалагічны *сады*. Праектаваў стварэнне школ ветэрынарнай і сельскай гаспадаркі. Прадметамі даследавання Ж. былі "літоўскі зубр", "безгаловы плод чалавека", лімфома мозга быка, лось, еўрапейскі вожык, "літоўская чарапаха", мясцовая язва, зараза хатняй жывёлы, заразны сверб хатняй жывёлы, ціс, воўк, гібрыд воўка і сабакі. З 1781 Ж. па запрашэнні *Пачобута М.* заняў кафедру натуральнай гісторыі ў Віленскай галоўнай школе ВКЛ. Сюды ён перавёз свае расліны, гербарыі, калекцыі мінералаў. У 1783 Ж. раптоўна вярнуўся ў Францыю (кажуць, што яго хацеў атруціць каханак жонкі, француз Берлюц). На радзіме Ж. працаваў у шпіталях, выкладаў у навучальных установах, прымаў удзел у рэвалюцыі 1789–1794 (у 1793 быў мэрам Ліёна). Аўтар 16 навуковых твораў, напісаных па матэрыялах Беларусі, Літвы, Польшчы. Адзін з галоўных твораў – Flora Lithuanica inchoata, seu Ennumeratio planetarium quasi circa Grodnam Collegia et determinavit (Флора Літвы…), выдадзены ў Гродне (1781, тамы 1–3) і Вільні (1782, тамы 4–5). Аб падрыхтоўцы Ж. да выдання кнігі напісаў у сваім дзённіку швейцарскі вучоны Ё. Бернулі, які ў 1778 бачыў у Гродне сабраныя для яе матэрыялы: гербарыі і апісанні назбіраных "літоўскіх" раслін. Ж. гаварыў яму, што адшукаў і тыя расліны, якія не спадзяваўся ўбачыць у Літве. Ж. зрабіў фітагеаграфічную мапу раслін ваколіц Гродна. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі высока ацаніў працу Ж. у Гродне – узнагародзіў яго медалём "merentibus", надаў чын надворнага медыка і загадаў выбіць у яго гонар медаль і зрабіць бюст. Імя Ж. носіць *парк гарадскі* ў Гродне (з 15.11.1989). У Ж. у Гродне нарадзіўся сын, які атрымаў каралеўскае імя Станіслаў Аўгуст

(кароль быў хросным бацькам). Яму не было і 1 года, калі бацькі выехалі з Гродна ў Вільню.

Крын. і літ.: AGAD, Arch. Tyzenhauza, sygn. D–5, k. 8; sygn. D–3, k. 43–44; Гостев А.П., Известные личности Гродно. – Гродно, 2016. – С. 88–92; Паўлоўская Г. Зубры, бабры і лімфомы мозга, або Гарадзенскія даследаванні Жана Эмануэля Жылібера // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: зборнік навуковых артыкулаў / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 35–45; Игнатович Ф.И., Семенюк С.И. Ж.Э. Жилибер и его “Флора Литвы” // Советское здравоохр. – 1981. – № 11. – С. 67–69; Игнатович Ф.И. Ж.Э. Жилибер и Гродненская медицинская академия // Журнал Гродненского государственного медицинского университета. – 2011. – № 2. – С. 85–90; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 334–337, 878–879.

Жылінскі Вінцэнт Тадэвуш – гарадзенскі ўраднік, лаўнік у 1750 г., радца ў 1751–1752, 1755, 1758, 1760–1761, прэзідэнт ў 1753, 1757, 1759, 1761–1763, бурмістр у 1753–1754, 1756–1757 гадах. У 1759 – віцэ-рэгент Скарбавай камісіі ВКЛ. Жонка – Ружа Бадаракі, дзеці – меў 5 дачок. Меў ва ўсходнім баку вул. Бернардзінскай сядзібу, а таксама фальварак Навасёлкі ў Ваўкавыскім пав.

Жыткоў І. К. – старшыня Часовага кіравання ў Гродне (1939).

Жыўна Станіслаў Паўлавіч (1892, Гродна – 18.12.1940, Гродна) – заснавальнік *музея прыроды* ў Гродне. Бацька, фельчар 26 арт. брыгады, пахаваны на гродзенскіх могілках фарных. Ж. 16 гадоў жыў у Паўночнай Амерыцы, дзе сабраў разнастайную калекцыю (2933 назвы) сысуноў, птушак, матылёў, мінералаў. У 1924 г. вярнуўся ў Гродна і перадаў яе ў дар гораду з мэтай заснавання музея прыроды. У канцы 1926 г. *магістрат* знайшоў месца для музея, зрабіў шафы і выдзеліў у бюджэце грошы на дзейнасць музея. 21.11.1926 адбылося ўрачыстае асвячэнне музея і адкрыццё для публікі. Жыўна працаваў тут навуковым супрацоўнікам: збіраў матэрыялы, сітэматызаваў, апісваў іх, праводзіў экскурсіі, ездзіў у экспедыцыі. За 3 гады Ж. і камітэт музея зрабілі многа, каб мець узоры насельнікаў рэгіянальнай прыроды Гродзеншчыны. Наладзілі абмен узорамі з Заалагічным музеем Варшавы. Усё сабранае Ж. захоўваецца ў фондах і экспазіцыях аддзела прыроды *музея Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага*. Жыў Ж. на вул. Цаглянай, 23. Памёр ад запалення лёгкіх, пахаваны на *могілках фарных*. Аўтар у Гродне сустракаўся з яго сынам Мечыславам, які жыў у Вроцлаве.

Крын. і літ.: ДАГВ, ф. 46, воп. 1, с. 15, а. 2; Гараднянскі Р., Свет калекцый Ст. Жыўны // Бел. Пушча. – 1996. – № 1 (4) – С. 14; Ігнатовіч Ф.І., Швед В.В., Госцеў А.П. С.П. Жыўна і яго ўклад у стварэнне Гродзенскага музея прыроды // Краязнаўчыя запіскі. Зборнік артыкулаў да 75-годдзя заснавання ГДГАМ. Вып. 3. – Гродна, 1995. – С. 92–96.

Жэвускі (Равускі) Францішак Міхалавіч (?–1802) – пісар польны каронны, потым маршалак надворны каронны. Стаў пераемнікам *А. Тызенгаўза* (з 1880 па

1881). Паводле яго загаду падкаморы В. Сабалеўскі ўварваўся на *Гарадніцу*, узяў А. Тызенгаўза пад стражу, забраў паперы, заняў і зачыніў фабрыкі, а працоўных (некалькі тысяч) разагнаў па хатах; наклаў секвестр на яго прыватную маёмасць. У *эканоміі гродзенскай* праводзіў драпежную палітыку, імкнучыся як мага больш пакласці ў сваю кішэню (пакінуўшы краіну, Ж. змясціў у адным з венскіх банкаў 500 тыс. дукатаў). Апошнія гады жыцця правёў у Пізе, дзе і памёр. Пахаваны на могілках Campo Santo ў Фларэнцыі.

З

Заапарк, створаны ў 1927 г. на базе жывога кутка, арганізаванага *Каханоўскім Янам*. Легенда сцвярджае, што ў 1933, калі горад наведаў прэзідэнт Рэчы Паспалітай Ігнацы Масціцкі, Каханоўскі з ім сустрэўся, паказаў яму заапарк і гаварыў, што не хапае месца для звяроў. Масціцкі дамовіўся з уладамі Гродна, і яны выкупілі ў гаспадара *Станіславова* Я. Друцкага-Любецкага кавалак зямлі для заапарка. У міжваенны час гэта быў трэці пасля Варшаўскага і Пазнанскага заалагічны парк у Польшчы. У той час тут жылі два львы, бенгальскі тыгр, рысь, зубрыца з Белавежскай пушчы, некалькі аленяў, мядзведзі, воўкі, кабаны, калекцыя малпаў, шмат птушак ды іншыя жывёлы. У 1936 г. налічвалася болей за 400 экзэмпляраў. Існавала сістэма спонсарства жывёл – імі апекаваліся школьная моладзь, жаўнеры. Згодна з запісам у "Летапісе Сафійскага сабору" пабудовы 1938 г. зробленыя з жоўтай цэглы разабранай *царквы Аляксандра-Неўскага*. З 1939 З. атрымаў статус дзяржаўнага, і да пачатку *вайны Вялікай Айчыннай* яго тэрыторыю павялічылі, а калекцыю жывёл даўкамплектавалі (у асноўным мясцовымі прадстаўнікамі жывёльнага свету). Падчас вайны каштоўныя жывёлы былі вывезеныя ў заапаркі Кёнігсберга, Берліна, а астатнія знішчаныя. Ужо ў 1944 пачалося аднаўленне З. У 1946 рамантавалі агароджу, масткі, пасадзілі 15 ялінак, ачышчалі дно *Гараднічанкі* і ўмацоўвалі берагі. 28.09.1946 З. быў адчынены для наведвальнікаў. Да лета 1947 г. калекцыя жывёл налічвала 95 асобінаў, тады ж пачалася рэканструкцыя З. Былі зробленыя басейны для выдраў і баброў. У 1950-я гады калекцыя жывёл папаўнялася прадстаўнікамі экзатычнай фаўны Афрыкі, Аўстраліі, Азіі: 2 алігатары з Кітая, сланіха Машка з В'етнама (там яна ваявала – абслугоўвала дзейную армію, перавозячы зброю, боепрыпасы, абмундзіраванне і харчаванне), малпы, страусы, папугаі, львы Макар і Марта. Да пачатку 1960-х гадоў налічвалася каля 100 відаў жывёл, а агульная колькасць асобінаў – больш за 800. Сярод іх быў новы індзійскі слон па мянушцы Сурак (з Германскай дэмакратычнай рэспублікі), чалавекападобная малпа шымпанзэ (з Таліна). У 1975 г. колькасць відаў жывёлаў дасягнула 259, а колькасць экземпляраў – 1959, а ў 1987 г. – каля 300 відаў (з іх 30 занесеныя ў Чырвоную кнігу Міжнароднага саюза аховы прыроды і ў Чырвоныя кнігі СССР і БССР) і 2,5 тыс. жывёл. У 2002 г. адбылася значная рэканструкцыя. Да 2011 З. быў карэнным чынам перабудаваны, а яго тэрыторыя значна павялічылася, склаўшы 3,4 га. У заапарку былі акварыум і тэрарыум. У першым да 1987 г. налічвалася 1100 рыб 79 відаў, у другім жылі жабы (напрыклад, паўднёваамерыканская

жаба ага), яшчаркі, змеі (тыгровы пітон, сярэднеазіяцкая кобра, пясчаная эфа), чарапахі, кракадзілы (кітайскі алігатар) з розных куткоў зямнога шара.

Літ.: Гродзенскі заапарк=гродненский зоопарк / Автор-составитель Н.С. Герасимчук. – Минск: Беларусь, 1987. – С. 5–6, 11, 19; Игнатович Ф.И. История гродненского зоопарка / Ф.И. Игнатович, Д.П. Тарасюк. – Гродно: ЮрСаПринт, 2018; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 88; Саяпин В. О парке Жилибера и зоопарке Кохановского. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 48–78; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В. Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 135; Liss A., Maćkowski K. Grodno. Miasto nad Niemnem. – Kraków: Bezdroża, 2005. – S. 45.

Забароўскі Юзаф – беззямельны шляхціч, гродзенскі скульптар і разьбяр. У 1851 г. працаваў разьбяром у Лідзе і быў жанаты з Юліяй Кандратовіч. Творы яго прадстаўленыя на *могілках* фарных і праваслаўных па вул. Антонава, на могілках у Ваўкавыску. Даследчыца Л. Зорына знайшла ў Гродне 11 падпісаных і 16 верагодных надмагілляў, выкананых Забароўскім у 1850–1860-х гадах. Яна ж выказала думку аб магчымым супрацоўніцтве Забароўскага з Баброўскім В., бо іх працы характарызаваліся аднолькавымі формамі надмагілляў, прыёмамі апрацоўкі каменя, афармлення крыжа на абелісках.

Літ.: Зорына Л. Гродзенскія скульптары XIX – пачатку XX ст. // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 76–79; Rozmus, J. Cmentarz farny w Grodnie 1792–1939 / J. Rozmus, J. Gordziejew. – Kraków: Wyd-wo naukowe WSP, 1999. – S. 30.

Забастоўкі гродзенскіх рабочых, адбываліся ў расійскі і польскі міжваенны перыяд гісторыі Гродна (гл. таксама *Рэвалюцыя 1905–07 гг.*).

17.10 – 8.12.1900 забаставалі пад кіраўніцтвам камітэта Гродзенскага рэвалюцыйнага 120 працаўніц упаковачнага аддзялення тытунёвай фабрыкі Шарашэўскага. Яны патрабавалі звольніць майстра, які іх прыгнятаў, павышэння зарплаты і змяншэння нормы выпрацоўкі, паўгадзіннага перапынку на сняданак. 52 дні барацьбы скончыліся беспаспяхова, бо іншыя працаўнікі фабрыкі іх не падтрымалі, а ўлада пачала рэпрэсіі.

15.12.1903 баставалі каля 1 тыс. рабочых тытунёвай фабрыкі *Шарашэўскага* пад кіраўніцтвам гродзенскага сацыял-дэмакратычнага камітэта *Бунда*. 20.01. 1904 усе 1 331 рабочых былі звольненыя. Дапамогу ім аказалі рабочыя Баку, Жэневы, Ліёна, Познані, Лейпцыга і інш., але гэта не выратавала іх ад голаду. На пач. лютага 1904 яны вымушаныя былі пагадзіцца з умовамі гаспадара: 36 сартавальніц і 7 работніц інш. цэхаў (ініцыятары забастоўкі) былі звольненыя.

9.12.1907 адбылася палітычная забастоўка 1 700 рабочых 53 прадпрыемстваў у знак пратэсту супраць суда над чальцамі сацыял-дэмакратычнай фракцыі 2-й Дзярж. думы. Удзельнічалі рабочыя тытунёвай фабрыкі Шарашэўскага (1250 чал.), Нёманскай пераплётнай фабрыкі (звыш 200), друкары, работнікі гарбарных, белашвейных і кравецкіх майстэрняў і інш.

У кастрычніку 1921 на працягу 3,5 тыдняў баставалі 250 машыністаў гільзанабівачных машын тытунёвай фабрыкі, бо яны не хацелі абслугоўваць адначасова 2 машыны замест адной. Рабочыя перамаглі. У лістападзе гэтага ж года баставалі 720 рабочых фабрыкі. Дабіліся павышэння зарплаты на 80%, але 8-гадзіннага дня і аплачваемых водпускаў не, бо на працу выйшлі штрэйкбрэхеры. Тытунёвікі баставалі таксама ў 1923–24, 1930 гадах.

З 28.06.1927 пачалася 5-месячная забастоўка каля 150 рабочых запалкавай фабрыкі "Марыес". Яны патрабавалі павышэння зарплаты на 20%, васьмігадзіннага працоўнага дня, скарочанай суботы, аплаты водпускаў. Страйкоўцаў падтрымалі польскія рабочыя, якія адмовіліся быць штрэйкбрэхерамі. Запалачнікі Пінска і інш. гарадоў прыслалі гродзенцам грошы, сяляне вакольных паветаў – сельска-гаспадарчыя прадукты, рабочыя хім. прамысловасці СССР – 1000 руб. Рабочыя перамаглі.

Летам 1929 баставалі некалькі сотняў рабочых фанернай фабрыкі – другога па велічыні прадпрыемства ў Гродне. Яны патрабавалі выплаты запазычанасці па зарплаце. Збілі гаспадара, прагналі паліцэйскіх. Відаць, свайго не дабіліся, бо ў лютым і ліпені 1930 зноў падняліся на забастоўку 700 рабочых, патрабуючы павышэння зарплаты на 50%, прыёма і звальнення рабочых са згоды прафсаюза, ветлівага абыходжання, абедзенага перапынку. Рабочых фабрыкі падтрымалі рабочыя іншых прадпрэмстваў, і ў выніку яны перамаглі.

16.03.1932 паводле закліку КПП і КПЗБ, якія падтрымалі абвяшчэнне забастоўкі Цэнтр. камісіі прафсаюзаў і кіраўніцтва *Польскай сацыялістычнай партыі*, рабочыя Гродна спынілі працу больш чым на 1/3 прамысловых прадпрыемстваў (гарбарных заводах, *фабрыках тытунёвай, Лапіна*, камунальнай гаспадаркі, электрастанцыі). Прычынай забастовак была спроба ўрада правесці праз сейм законапраект аб павелічэнні прац. дня, адмене скарочанай суботы, павышэнні ўзносаў на сац. страхаванне, паніжэнні пенсій і дзярж. дапамогі ў выпадку хваробы і інш. Антырабочыя законы ўдалося спыніць.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 216–220; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3, Мн., 1996, с. 128–129, 143–144.

Забела Станіслаў (?, Гродна – 19.07.1833, Буржэ, Францыя) – паўстанец 1830–31 гг. Служыў хірургам у расійскім войску і падчас паўстання перайшоў на бок паўстанцаў. 17.07.1831 быў прызначаны старшым хірургам коннага Літоўскага Легіёна. Пасля паражэння паўстання ў 10.1832 прыбыў у Францыю праз Эльзас. Быў паселены ў Буржэ, дзе і памёр.

Літ.: Гарбачова В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: Біяграфічны слоўнік. – Мінск, 2004, с. 143; Bielecki R. Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego. T. 1. – Warszawa, 1995, s. 134.

Заблоцкі Баляслаў-Юлі Каралевіч (14.07.1834, м. Крожы Ковенскай губ. – 27.01.1904, Гродна) – паўстанец 1863 г., родны брат Эразма Заблоцкага. Закончыў Лідскае пяцікласнае вучылішча, гродзенскую *гімназію* і Маскоўскі ўніверсітэт (са ступенню павятовага лекара, 1860). Пісаў патрыятычныя вершы.

У 1861 г. падчас свята Божага Цела раскідваў у *Брыгіцкім* і *Бернардзінскім касцёлах* "листки возмутительного содержания". Ягоная кватэра стала падпольнай яўкай, куды прыходзілі пад выглядам пацыентаў. 25 верасня 1863 г. ваенным начальнікам уездаў загадвалася арыштаваць доктара Заблоцкага. Ужо 26.09 гэта было зроблена. З. не прызнаўся, што займаў пасаду камісара Гродзенскага ваяводства пасля арышту брата і сказаў, што не ведае, хто ім быў. Падчас вобыску ў яго знайшлі толькі забароненую кнігу "Заўвагі да сачынення "Аб жыццёвых ісцінах польскага народа". Станіслаў Ажэшка прызнаўся ў Віленскай следчай камісіі, што прывёз ад *Каліноўскага* доктару Заблоцкаму ліст, адрасаваны камісару ваяводства ад Выканаўчага аддзела на Літве. Прыгаворам віленскага ваеннага суда высланы на жыхарства ва ўнутраныя расійскія губерні. Пасля царскай амністыі, у 1868 г., пераехаў на жыхарства ў Польскае Каралеўства. Па дарозе яму дазволілі спыніцца на адзін месяц у Гродне для сустрэчы з мацерай. Дазвол вярнуцца ў Гродна атрымаў, відаць, у 1889, калі пачаў прыватную лекарскую практыку. Згадваецца ў "Расійскіх медыцынскіх спісах" і "*Памятных кніжках Гродзенскай губерні*" да 1905 г. Памёр 27.01.1904, пахаваны на каталіцкіх могілках Гродна.

Крын. і літ.: Игнатович Ф.И. Гродненский врач Б.К. Заблоцкий – участник восстания1863–1864 года // Медицина на рубеже веков: К 100-летию Первой мировой войны. Сб. материалов. – Гродно: ГрГМУ, 2014. – с. 171–175; НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 6, а. 20, 21, 24, 46; с. 1, а. 45–46, 145–146 адв., 148, 362 адв.

Заблоцкі Эразм Каралевіч (1830 ці 1831?, Вільня – не раней за 1884) – паўстанец 1863 г., меў псеўданім Медыёр. Скончыў Лідскае павятовае вучылішча, Гродзенскую *гімназію* (пасведчанне аб заканчэнні і дазволе на чын XIV класа ад 7.08.1848). Пісар першага разраду, а затым бухгалтар будаўнічай і дарожнай камісіі гродзенскага губернскага праўлення. У 1860 г. на водах у Друскеніках (хварэў падучкай) пазнаёміўся з *В. Урублеўскім.* У 1861 быў запрошаны ім у Саколку, дзе адбылося паседжанне па стварэнні *гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі*. З лета 1862 – памочнік *Гафмайстра*, ваявода паўночнай часткі Гродзенскага ваяводства (Гродзенскі, Ваўкавыскі, Слонімскі паветы). У сакавіку 1863 прымаў удзел у жалобных набажэнствах, а з ліпеня да верасня 1863 быў камісарам ваяводства. У маі 1863 разам з *В.-К. Каліноўскім* рабіў агляд органаў паўстанцкай улады ў Слонімскім і Ваўкавыскім паветах з мэтай навядзення парадку ў патаемнай арганізацыі. 2.06.1863 быў з Каліноўскім у лагеры пад Мілавідамі, дзе правялі агляд войска. Арыштаваны на пачатку верасня (па іншых звестках 24 кастрычніка) 1863 і прыгавораны ў 1864 г. ваенным судом да расстрэлу. Пазней прыгавор быў змякчаны – на 15 гадоў катаргі. Паводле сведчанняў сваякоў у 1884 г. яшчэ жыў. Меў жонку Гелену Вальта-Скшыдлеўскую, сына Рафала, тры дачкі (Аўгуста, Казіміра, Гелена).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10; с. 1, а. 35, 49, 384; с. 4, а. 16 адв.; Игнатович Ф.И. Гродненский врач Б.К. Заблоцкий – участник восстания1863–1864 года; Революционный подъём в Литве и Белоруссии… – С. 151; Komar ... – S. 119; Kozłowski E. Zapomniane wspomnienia. – Warszawa, 1981. – S. 491.

Завершчызна – раён горада, які знаходзіцца на тэрыторыі за "Рамбыт-тэхнікай", побач з глыбокім ярам і Палацам творчасці дзяцей і моладзі. Імя атрымаў ад дваран Заверскіх, якія мелі тут маёнтак. На старых мапах яго можна ўбачыць: агароды, рэгулярны парк, сквер, ад якога захаваліся некалькі ліп і клёнаў. З цэнтра горада трапіць на З. можна з канца вул. Дамніканскай, спусціўшыся да р. *Гараднічанкі*, прайсці праз драўляны мост і падняцца на вул. Завершчызна па гранітнай лесвіцы.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 247–251

Залатая Горка – раён сучасных вуліц Астроўскага, Міцкевіча, Славінскага, Рэймanта ў частцы горада, якая называлася *Новы Свет*. Захаваныя будынкі адносяцца да XX ст. і стылю "цаглянай эклектыкі" ды канструктывізму. Захаваліся дамы, у якіх жылі рускі пісьменнік *Ю. Алеша* (Міцкевіча, 13а), арганізатар музея прыроды *Жыўна С.* (Бялінскага, 9), дырэктар беларускай школы *Федарук У.* (17 верасня, 13), камуністычны дзеяч *Прытыцкі С. В.* (17 верасня, 10а), інжынеры Зялінскі, Казлоўскі, Высоцкі ("дом Кляцкова"). Стаіць былы дом інжынера Астроўскага, частка дзіцячай бальніцы па вул. Астроўскага. У 2006 г. цэлы квартал З. Г. быў разбураны (напрыклад, будынак з крамай "Гарачы хлеб", былы дом Пашковічаў).

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 35; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 229–230, 241–244; Цыпельт З. Грандзіцкая вуліца і Дроўны рынак // Горад святога Губерта. Краязнаўчы альманах. Вып. IV. / Пад рэд. А. Смаленчука і А. Вашкевіча. – Горадня, Вільня, 2008. – С. 24–33; Чернякевич А. "Новый Свет" и его окрестности / Андрей Чернякевич при участии Игоря Трусова. – Минск: Лимариус, 2009. – С. 49–58.

Замак "Гродна" – замак у Загужы Сілезскім (гміна Валім, Валбжыскі павет, Ніжнесілезскае ваяводства). Пабудаваны на вышыні 450 м над узроўнем мора на вяршыні гары Хойна, на паўднёва-ўсходнім канцы Валбжыскіх гор. Складаецца з Ніжняга і Верхняга замкаў. Легенда гаворыць пра будаўніцтва замка ў IX ст. англійскім рыцарам, а дакументальныя звесткі ёсць ад 1198 г., калі князем свідніцкім быў Баляслаў I Высокі. Назва замка да 1959 г. была Кёнігсберг, а пасля Польскае турыстычна-краязнаўчае таварыства надала яму імя "Гродна".

Літ.: Dudziak M. Zamek Grodno. Dzieje, tajemnice, legendy. – Zakrzewo, 2017; Sakwerda J. Zamek Grodno, 1989.

Замак Ніжні, размешчаны на ўсход ад замка Старога. У XI ст. тут узнікла паселішча, а ў XII – *вакольны горад* старажытнага *Городно/Горадзена*. На *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта* тут бачны *дом Каралеўскі*. У сяр. XVIII ст. тут будзе пабудаваны *замак Новы*.



С. 854

Замак Новы, стаіць на месцы, дзе ў часы *Вітаўта*, ў XIV–XV ст., высіўся *Замак Ніжні*. Пры Казіміры Ягелончыку ён страціў фартыфікацыйнае значэнне і ператварыўся ў жылую частку *замка Старога/Верхняга*. Каля XV ст. тут быў збудаваны *"Дом караля"* ("Domus Regia") з капліцай і каменнай вежай-турмой, якая стаяла перад *мастом*. Увесь комплекс быў абнесены ахоўным мурам. "Дом караля" добра відаць на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта* 1568 г. У канцы XVII ст. названых збудаванняў ужо не было і захаваліся толькі фундаменты. Верагодна іх выкарыстаў кусташ каралеўскіх скарбаў Асалінскі, які пабудаваў сабе аднапавярховы палац з дзесяццю пакоямі. Побач стаялі драўляная афіцына, сушня і дрывяная павець. Намер архітэктурнай кампазіцыі Новага замка нарадзіўся не адразу і прайшоў як мінімум дзве фазы развіцця. Першую думку наконт пабудовы новага палаца маглі выказаць непасрэдна пасля разбурэння шведамі *Старога замка* ў 1708 г. Пазней пытанне аб будаўніцтве Новага замка паставіў на сейме Рэчы Паспалітай у 1726 вялікі князь літоўскі і польскі кароль *Аўгуст II*. Сейм 1736 г., які праходзіў ужо пры Аўгусце III, прыняў рашэнне аб прыспяшэнні будаўніцтва. Яно працягвалася да 1742 г. У 1768 сейм выдзеліў спецыяльныя сродкі на пастаяннае ўтрыманне палаца. Першы план палаца (да 1736) склаў невядомы аўтар, потым над ім працавалі *Даніэль Ян Іахім Яўх* і дрэздэнскі архітэктар *Карл Фрыдрых Пёпельман*. Праект пабудовы З. Н. быў зацверджаны 30.10.1738. Каля 1750 г. дабудоўваў палац Іяган Фрэдэрык Кнобель (аўтар капліцы). Да пасяджэнняў сейма Рэчы Паспалітай прыстасоўваў залы ў 1752 г. Яўх. Рэканструкцыяй замка ў 1789 займаўся італьянец, галоўны архітэктар Вялікага Княства Літоўскага *Джузэпэ (Юзаф) Сака*. Пад яго кіраўніцтвам выконваліся сталярныя і мулярскія працы, вымуроўка стайняў, быў выкапаны калодзеж з помпаю.



С. 855

Палац складаўся з парадных і службовых будынкаў. Асноўны парадны аб'ём уяўляў сабой двухпавярховы будынак у стылі позняга барока, які разгортваўся літарай "П" і ўтвараў вялікі замкнёны падворак – курданер. Першапачаткова палац быў пакрыты *дахоўкай* чырвонага колеру, сцены пафарбаваныя ў зялёны колер, а ляпны і архітэктурны дэкор – у белы. Фасады будынка чляніліся пілястрамі і былі аздобленыя картушамі з маскамі, лепкай розных форм. Праз цэнтральны ўваход траплялі ў вялікі вестыбюль з трыма выйсцямі: да параднай лесвіцы, у буфет і авальную Круглую залу (сталовую на 60 чалавек). З апошняй можна было трапіць у парк, замкавую капліцу са званіцай, пярэдні пакой, звязаны з буфетам, сталовай і салонам-пярэдняй для сенатараў. У правым крыле палаца знаходзіліся каралеўскія апартаменты (кабінет, сталоўка, малы гардэробны пакой, спальня) і пакоі каралевы (кабінет, аўдыенц-зала і іншыя). У левым крыле палаца былі Канферэнцыйная, Сенатарская і Пасольская залы, памяшканні для кухні, гаспадарчых патрэбаў, прыдворных. Залы асвятляліся з двух бакоў і мелі жывапісныя роспісы, лепку, скульптуру ў стылі ракако. У 1780-я гады інтэр'ер палаца быў размаляваны сюжэтнымі сцэнамі дэкаратарам Шыманам Манькоўскім. У пакоях былі багата аформленыя каміны, мазаічныя паркетныя падлогі.

З левага боку замка знаходзіўся службовы падворак, які складаўся з будынкаў канцылярыі, стайні, вазоўні, карэтнай і іншых службаў. Парадны падворак замыкалі аднапавярховыя будынкі кардэгардыі – памяшканні для каравула. Звяртае ўвагу агароджа замка, а таксама ўязная брама з пілонамі, на версе якіх знаходзяцца сфінксы ў выглядзе жанчын-людажэрак. Пра іх апавядаюць розныя легенды: маюць твары *Станіслава Аўгуста Панятоўскага* і яго жонкі, твар *Боны Сфорцы*, пра жудасную маці, якая забівала сваіх дзяцей, пра тое, як Панятоўскі ўбачыў такіх жа сфінксаў у палацы Браніцкага ў Беластоку і заказаў падобныя сабе. Слупы агароджы завершаныя шлёмамі з вайсковай атрыбутыкай.

Першым гаспадаром замка-палаца быў Аўгуст III. Тут павінныя былі адбыцца *сеймы Рэчы Паспалітай* у 1744 і 1752 гг., але яны былі сарваныя пасламі згодна з правам "ліберум вета". Прайшлі сеймы 1784 і 1793 гадоў. На пасяджэннях апошняга быў здзейснены другі падзел Рэчы Паспалітай. Мемарыяльная дошка на сцяне замка напамінае аб падзеях *паўстання 1794* г. З 1.01.1795 па 15.02.1797 у Новым замку жыў апошні польскі кароль і вялікі князь літоўскі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Прыстаўлены да яго князь І. А. Безбародка вёў штодзённыя запісы, з якіх мы даведваемся, як кароль-вязень бавіў свой час у Гродне. Тады ж з франтону *замка Новага* скінулі герб Рэчы Паспалітай, які складаўся з літоўскага герба "Пагоня", польскага герба "Белы Арол", а ў цэнтры знаходзіўся герб курфюрства Саксонскага польскага караля Аўгуста III. У кнізе "Гродна" *Ю. Ядкоўскі* пісаў, што з сярэдзіны XIX ст. герб знаходзіўся ў маёнтку С. Солтана Бераставіца Мураваная Гродзенскага ў. Ядкоўскі знайшоў яго ў парку і прывёз у гродзенскі *замак Стары*, дзе размяркоўваўся *гістарычны музей*. Паводле адной з версіяў у Новым замку Станіслаў Аўгуст Панятоўскі падпісаў адрачэнне ад прастолу.

Вялікія змены адбыліся ў знешнім і ўнутраным выглядзе замка падчас рамонтных прац у сярэдзіне XIX ст. У гады *войнаў Першай і Другой сусветных* у Новым замку размяркоўваўся ваенны шпіталь. Замак быў значна пашкоджаны ў 1944 г. У 1952 яго адбудоўвалі і прыстасоўвалі пад адміністрацыйную ўстанову пад кіраўніцтвам беларускага архітэктара У. М. Вараксіна. Палац набыў той стыль, які мы бачым цяпер – класічны псеўдарускі. У палацавых памяшканнях да 1991 г. знаходзіўся Гродзенскі абкам КПСС. Цяпер тут месцяцца залы *Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея* (галоўны корпус і левае крыло). Разам са Старым замкам Новы замак складае адзіны гісторыка-археалагічны комплекс, які з'яўляецца сімвалам агульнай гісторыі беларускага і польскага народаў.

Літ.: Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 68; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 40–41; Трусаў А.А. Стары замак у Гродне XI – XIII стст.: гіст.-археал. нарыс / А.А. Трусаў, В.Е. Собаль, Н.І. Здановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993; Ткачоў М.А. Замкі Беларусі (XIII-XVII ст.) / М.А. Ткачоў. – Мінск: Полымя, 1977.

Замак "Новы Горадзен" (Нойгартэн, Newgarten, Neu gartena) – замак, які *Вітаўт* у снежні 1391 г. за дапамогу ў барацьбе з *Ягайлам* дазволіў пабудаваць

крыжакам на левым беразе *Нёмана.* Гісторык Ю. Гардзееў выказаў меркаванне, што ён знаходзіўся на тым месцы, дзе Вітаўт у 1390 спрабаваў паставіць драўляны замак – на левым беразе Нёмана, насупраць *Ніжняга/Старога замка.* Як пісаў *Ядкоўскі Ю.*, "недалёка ад драўлянай бажніцы XVII ст. у бок *кляштара аа. францішканцаў*". Сучасныя даследчыкі-гродзенцы лічаць, што замкі стаялі на востравах Нёмана пад касцёлам францішканцаў. У чэрвені 1392 Вітаўт адышоў ад Ордэна, выгнаў яго з Горадзена і знішчыў яго гарадзенскі замак, спаліўшы *занёманскае прадмесце,* дзе ён знаходзіўся.

Літ.: Гардзееў Ю. Да пытання аб планіроўцы Гародні ў другой палове 13 – пачатку 15 ст. // Гістарычны альманах. – Гародня. – 1998. – №.1 – С. 23; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 8; Jodkowski J. Grodno i okolice. Jeziora Augustowskie. Suwalszczyzna. Przewodnik turystyczny. – Grodno, 1934; Liss A., Maćkowski K. Grodno. Miasto nad Niemnem. – Kraków: Bezdroża, 2005. – S. 54; Śliwinski J. Grodzieńszczyzna i Podlasie w XV – XVI wieku w Wielkim Księstwe Litewskim (wielkoksiążęce puszcze i włości, eksploatacja, pożary). – Olsztyn: Uniwersytet Warmińsko-Mazurski w Olsztynie, 2010. – S. 46–47, 232.

С. 856

Замак Стары/Верхні – рэзідэнцыя вялікага князя літоўскага і кароля польскага, комплекс абарончых збудаванняў, культавых і свецкіх пабудоў XI–XIX стст. Ён узнік як умацаваны *дзядзінец* на высокім берагавым мысе ля зліцця рэк *Гараднічанкі* і *Нёмана* на месцы пасялення XI ст. На пачатку XIII ст. тут пабудавалі двухпавярховы княскі *церам*. Пасля *пажару* 1398 г. вялікі князь літоўскі *Вітаўт* пабудаваў пяцівежавы Верхні замак, а паміж круглай і вуглавой паўночна-усходняй вежамі – гатычны двухпавярховы мураваны палац (45х15 м), сцяна якога адначасова з'яўлялася і крапасной. З другога паверха можна было прайсці ў круглую вежу і, верагодна, ва ўваходную вежу. Палац часоў Вітаўта мы можам пабачыць на сусветнавядомай *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта* 1568 г. Карэнная перабудова замак і палац чакала пры *Стэфане Баторыі* ў 1579 г. Для замка захавалі толькі сцены і асобныя вежы, а двухпавярховы палац быў пабудаваны нанова італьянскім архітэктарам *Санці Гучы*. Такога погляду прытрымліваюцца польскія даследчыкі А. Фішынгер, Я. Лялейка, Е. Пашэнда, мінскі архітэктар У. Бычкоў і гродзенскі гісторык архітэктуры І. Трусаў. Але апошнім часам з'явіўся новы погляд. У лаўнічых кнігах Львова знайшлі запіс пра "Яго каралеўскай вялікасці будаўнічага і архітэктара замка гродзенскага" Юзафа/Ёзэфа Ройтэна/Райсціна. Акты літоўскай метрыкі за 1592 г. гавораць пра яго ўдзел у будаўніцтве парафіяльнага касцёла, які Стэфан Баторы планаваў перадаць езуітам. Польская даследчыца М. Каламайская-Саед лічыць, што Ройтан, выхадзец з Аўстрыі, быў будаўніком Старога замка ў стылі архітэктуры нямецкага маньерызму. Другім архітэктарам Ст. замка быў *дэ Кгрып* з італьянскай архітэктурнай школы. Тоўстыя сцены (гэта бачна, калі праходзіць праз залы сучаснага музея), адсутнасць параднага вестыбюля і лесвіцы пацвярджаюць абарончы характар збудавання. Архітэктурны стыль палаца – рэнесанс. Ён бачны на *гравюры Т. Макоўскага*

С. 857

С. 858

С. 589

1600 г. На першым паверсе палаца Баторыя размяркоўваліся канцылярыя і архіў, скарбніца, кладоўка, пакой для аховы – усяго 10 памяшканняў, на другім – 14 парадных і жылых каралеўскіх пакояў: сталовая зала, спальня, пакой для целаахоўнікаў і іншыя. Унутранае афармленне ніжняга паверха было простым: падлога выкладзеная цэглаю, дзверы дубовыя або жалезныя, у некаторых пакоях былі печы ці каміны. Каралеўскія пакоі былі атынкаваныя паліраваным гіпсам, столі разьбяныя ці ляпныя, падлога была выкладзеная керамічнымі пліткамі і мармурам. Дзверы разьбяныя і паліхромныя, часта з мармуровымі парталамі. У пакоях стаялі разьбяныя каміны і кафляныя печы. Трэба падкрэсліць, што ў часы Баторыя замак перастаў быць толькі вайсковай крэпасцю, а стаў параднай рэзідэнцыяй вялікага князя літоўскага і караля польскага. Змянілася ў ім роля палаца, які набыў характар багатага палацца (ад італ. palazzo) ды заняў у замку дамінантнае становішча. Пасля *вайны Расіі з Рэччу Паспалітай* (1654–1667 гг.) замак і палац рамантавалі пад кіраўніцтвам літоўскага канцлера і дзяржаўцы гродзенскай эканоміі *К. Паца*: быў спрошчаны фасад палаца, пераробленыя вокны, зліквідаваныя эркеры. У XVIII ст. рэканструкцыяй займаўся архітэктар *К. Ф. Пёпельман:* да палаца дабудавалі лёгкі двух'ярусны арачны порцік, па баках якога, верагодна, знаходзіліся тэрасы, агароджаныя балюстрадай; дах палаца пакрылі жалезам. У XIX ст. над часткай палаца надбудавалі трэці паверх.

Замак і палац вытрымалі каля 20 нападаў, набегаў, сутычак з *крыжакамі* ў XIII – пачатку XV ст. Тут адбыліся перамовы князя Вітаўта з польскім каралём *Ягайлам*. У 1445 г. да вялікага князя *Казіміра Ягелончыка* прыбыло польскае пасольства, каб паднесці яму польскую карону. *Стэфан Баторы* прымаў тут пасольствы, з палаца адпраўляўся ў ваенныя паходы на Смаленск і Пскоў, выязджаў на паляванні. У палацы прайшлі пасяджэнні трох *сеймаў Рэчы Паспалітай* (1678–1679, 1681, 1688 гадоў). Для гэтага яго спецыяльна адрамантавалі і перабудавалі ў 1673–1678 гг. Польскі даследчык Е. Лялейка лічыць, што архітэктара і аўтараў інтэр'ераў трэба шукаць сярод архітэктараў і мастакоў літоўскага канцлера, вядомага мецэната Кшыштафа Паца. На сцяне вісела мемарыяльная дошка з наступным тэкстам на польскай мове:

"W sierpniowym zgromadzeniu najświetniejszych osób polskiego i litewskiego sejmu i senatu, wstępuję na święty kapitol. Co wojna nieprzyjaciółka pokoju, przez straszliwe spustoszenia w gruzy obróciła i szpetnym uczyniła to na pamiątkę pokoju i równości ludu, tudzież dla uświęcenia sejmowych uchwał za najjaśniejszych królów Michała Korybuta i Jana III, Krzysztof Pac, Marszałek Brzeski i dwudziesty raz na sejm poseł, z przywiązania ku Ojczyźnie podźwignął.

Tak więc dla Boga, Króla, Ojczyzny i Prawa, czcigodną tarczą królewską zabezpieczony, herbem Paców Lilii trwać będę. Wy zas którzy jesteście ozdobą purpury Polskiej, waszą zdrową radą majestat królewski i prawo wspieracie.

Roku Pańskiego 1678 w miesiącu grudniu, około zaczęcia obrad sejmu 14 dnia".

Падчас *вайны Паўночнай* у 1705 і 1708 гг. у палацы спыняліся расійскі цар Пётр I і шведскі кароль *Карл XII*. Згодна з інвентаром 1769 у З. С. знаходзіўся архіў *Скарбовай камісіі ВКЛ* (Трыбунал скарбовы), скарб і скарбніца, пакой

для скарбовага намесніка. У замкавай турме сядзелі паўстанцы 1830–1831 гг. Пазней у палацы былі казармы расійскага войска і афіцэрскі клуб. З усталяваннем у Гродне польскай улады для адраджэння замка быў створаны Камітэт аднаўлення замка. Калі гэта было зроблена коштам некалькіх тысяч марак, дык 22.04 у замку быў асвечаны і размеркаваны Польскі нацыянальны дом. 1920–30-х гадах у палацы размяркоўваўся гарадскі музей пад кіраўніцтвам *Ю. Ядкоўскага*. Цяпер тут знаходзіцца *музей Гродзенскі гісторыка-археалагічны*, які мае багацейшыя фонды, значная частка якіх прысвечаная і палацу.

У 1984 у інстытуце "Белспецпраектрэстаўрацыя" упраўленнем культуры Гродзенскага аблвыканкама быў заказаны праект рэстаўрацыі Старога замка. У 1981, 1985–88 праводзіліся археалагічныя раскопкі пад кіраўніцтвам А. Трусава і *М. Ткачова*. У 1994 архітэктар Бачкоў У. (навуковы кіраўнік праекта рэстаўрацыі Старога замка) падрыхтаваў эскізны праект. Паводле яго рэстаўрацыі падлягалі помнікі XII ст. (старажытнарускага перыяду: *церам княскі, цэрквы Ніжняя і Верхняя*) і 1580-х гадоў (часы праўлення Стэфана Баторыя: рэнесансны палац, крапасныя сцены, 2 вежы, 3 камяніцы, дом адміністратара). У 2008 Інстытут "Гроднаграмадзянпраект" пачаў працу над канчатковай версіяй будаўнічага праекта першай чаргі рэканструкцыі.

Падчас рэстаўрацыі 2018–19 гг. археолагі пад кіраўніцтвам супрацоўніцы музея Н. Кізюкевіч знайшлі каля 3 тыс. знаходак: наканечнікі да арбалетных стрэл, запясцевы шчыток для стральбы з лука, абарончы персцень, скураны дзіцячы бот, кухонныя начынні і бытавыя рэчы, некалькі шахматных фігур, залатыя ўпрыгожванні, гаршковая кафля, цэгла з выявамі Калюмнаў 14 ст. і інш. Відаць, самай цікавай знаходкай (археолаг І. Спірын) стала вісячая пячатка часоў Уладзіміра Манамаха, калі пад 1127 г. і з'явіўся гарадзенскі князь *Усевалад Давыдавіч*/Гарадзенскі). А таксама знойдзеныя больш за 20 драўляных пабудоў пад камяніцай замка.

Літ.: Віцько Д. Да пытання пра выгляд Верхняга замка ў Гародні часоў Вітаўта // ARCHE. – 2014. – № 11. – с. 213–234; Кітурка Ю. В. Музеефікацыя Гродзенскіх каралеўскіх палацаў // Краязнаўчыя запіскі. – 2010. – № 7. – С. 55–56; Краўцэвіч А. Новае даследаванне Старога замка ў Гродне / А. К. Краўцэвіч // З глыбі вякоў. Наш край: гістарычна-культурал. зб. / уклад. В. У. Шаблюк; рэд. А. Краўцэвіч. – Мінск, 1997. – Вып. 2; Краўцэвіч А. К. Гродзенскі замак: нарыс / А. К. Краўцэвіч. – Мінск: Юнацтва, 1993; Краўцэвіч А., Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно, 2012. – С. 21–22, 35; Шаланда А. І. Антоні дэ Кгрып, муляр гарадзенскага замка, і яго род у канцы XVI – першай палове XVII ст. // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 8. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2012. – С. 17; Nowe Życie. – 1919. – n. 18, s. 144; Czarnowski R. J. Grodno. Zapomniana stolica. – Warszawa: RYTM, 2015. – С. 175–176; Lilejko J. Przebudowa Starego Zamku w Grodnie na cele sejmowe w latach 1673–1678 // Kultura artystyczna Wielkiego Księstwa Litewskiego w epoce baroku. – Warszawa, 1995. – С. 130, 140.

Заменгоф Лазар/Лукаш Людвік (сапр. Элезер Леві Заменгоф, псеўд. "Доктар Эсперанта", 15.12.1859, Беласток – 14.04.1917, Варшава) – урач-акуліст, паліглот, стваральнік мовы эсперанта. Бацька – Марк, настаўнік замежных

моў, маці – Разалія з дому Софер (памерла, калі яму было 2 гады), артадаксальныя *яўрэі*. У доме размаўлялі на ідыш, ведалі рускую, польскую і нямецкую мовы. Калі З. было толькі 10 гадоў і ён вучыўся ў Беластоцкай гімназіі, пачаў пісаць драму "Вежа Бабель, альбо беластоцкая трагедыя ў пяці актах". Ужо тады ён лічыў, што Вавілонская вежа – галоўная прычына непаразуменняў паміж людзьмі і вырашыў разбурыць яе, стварыўшы адзіную сучасную мову. Вучыўся з 1879 у Маскоўскім універсітэце на медыцынскім ф-це, але пасля тэрарыстычнага нападу на цара ў 1881 г. пракацілася антысеміцкая хваля, і ён вымушаны быў пераехаць у Варшаўскі універсітэт, дзе спецыялізаваўся ў афтальмалогіі да 1885. Спецыялізацыю акуліста здаў у Вене. У 1885 г. атрымаў дыплом урача-акуліста і пачаў вольную практыку спачатку ў мястэчку Вейсуны, пазней у Варшаве. Першы варыянт мовы эсперанта быў напісаны яшчэ перад атрыманнем дыплома ў гімназіі, а канчатковы варыянт быў надрукаваны ў 1887 г. на рускай мове пад назваю "Міжнародная мова. Прадмова і поўны падручнік". Аўтар схаваўся пад псеўданімам Доктар Эсперанта. Ад слова "эсперанта" і назвалі створаную З. мову. У 1887 падручнік выйшаў на нямецкай, французскай і польскай мовах, а ў 1888 – на англійскай. З 1893 па 1897 гг. З. жыў у Гродне і працаваў афтальмолагам. Рэгістрацыйная карта падае нам больш дакладныя даты: выдадзеная 22.10.1893, выехаў 16.10.1897. Паводле перапісу 1897 г. бачна, што ён здымаў кватэру ў доме Рахманіна па вул. Паліцэйскай (цяпер Кірава, 5), меў жонку Клару Аляксандраўну з дома Сільбернік (гэта яна ўгаварыла свайго тату спансіраваць выданне падручніка па эсперанта), сына Адама 8 гадоў і дачку Соф'ю 7 гадоў. У Гродне, акрамя працы, З. займаўся грамадскай дзейнасцю: быў сябрам Таварыства лекараў Гродзенскай губ., выконваў абавязкі прысяжнага суддзі ў акруговым судзе. У 1896 праводзіў агульныя даследаванні зроку ў вучняў гродзенскіх школ. У Гродне працягваў працу над удасканальваннем эсперанта і выдаў у друку слоўнік ды збор практыкаванняў, зрабіў пераклад і выдаў у 1894 "Гамлета" У. Шэкспіра. Пакінуў Гродна і з'ехаў у Варшаву, бо, як пісаў: "Гродна было такім бедным, што акуліст ні ў якім выпадку не здолеў бы там павялічыць свае прыбыткі". У 1905 З. кіраваў першым міжнародным кангрэсам эсперанта ў Францыі, атрымаў ў Парыжы ордэн Ганаровага Легіёну. З. выдаў на мове эсперанта "Fundamenta krestomatio", "Марта" *Э. Ажэшкі*, Стары Запавет, кніжку "Hilelizm jako rozwiązanie kwestii żydowskiej". Апошняй ён хацеў зблізіць іўдаізм да вернікаў іншых рэлігій, што для яўрэйскіх артадоксаў было непрымальна. У 1913 г. З. намінавалі на Нобелеўскую прэмію, але яе не атрымаў (яго намінавалі у сферы міру 8 разоў). Першая сусветная вайна паказала З. дарэмнасць усёй яго працы па ратаванні сусвету. Пахаваны на яўрэйскіх могілках па вул. Акопавай у Варшаве. Яго дачкі былі забітыя падчас *вайны Другой сусветнай*: Ліда ў 1942 у Трэблінцы, яе лёс падзяліла Соф'я. Сын Адам быў акулістам, у 1940 г. яго расстралялі ў Пальмірах. Дзве планеты "Заменгоф" і "Эсперанта", якія верцяцца паміж Марсам і Юпіцерам, напамінаюць нам пра чалавека, які "не губляе надзею" (такі сэнс лац. слова "эсперанта"). У 1991 г. у Гродне на доме, дзе жыў і працаваў З. была ўсталяваная

памятная шыльда. З 1983 у горадзе пачаў працу клуб аматараў эсперанта “Espero-Надзея”.

Літ.: Ignatowicz F.I. Medyczna i społeczna działalność Ludwika Zamenhofa w Grodnie w latach 1893–1897. Przyczynek do życiorysu // Medycyna nowożytna. Studia nad Historią Medycyny. T. 5, z. 2, 1968, s. 127–132; Kosierodzki H. Twórca esperanta // Kontrasty/ – 1973. – n. 8; Krasko R. Ludwik Zamehof – twórca esperanto // Studia i materiały do dziejów miasta Białegostoku. T. III. – Białystok, 1972. – S. 121–147; Marmon G. Zamenhof Łukasz Ludwik // Słownik biograficzny historii Polski. T. 2 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C. 1703; Podlejski Z. Bez aureoli. III. Postacie niezwykłe, godne podziwu i naśladowania. – Kraków: wyd-wo Księży Sercanów, 2011. – S. 232–238.



С. 860

Замкавая гара – тэрыторыя, на якой ужо ў XI ст. існавала славянскае паселішча, на пачатку XII ст. стала рэзідэнцыяй гарадзенскага князя, *дзядзінцам* горада. На ёй стаялі *замак Стары і замак Новы*. У 1926 была створаная камісія для ратавання схілаў гары – ад Новага замка да *Нёмана* ўтварыўся роў глыбінёй 6 м і шырынёй 10 м. Прычынамі гэтага сталі: няправільна пабудаваная *каналізацыя* на тэрыторыі Новага замка, пашырэнне сваёй тэрыторыі жыхарамі вул. Падзамча за кошт падножжа гары, змяненне рэчышча Нёмана з-за збудаванай насупраць дамбы. У склад камісіі ўвайшлі: віцэ-прэзідэнт горада Цыдзік, лаўнік магістрата Савіцкі, радны Цытажынскі, гарадскі інжынер *Раманаў* і павятовы архітэктар Дубовік. Камісія вырашыла адсяліць жыхароў названай вуліцы, высадзіць на схіле дрэвы, пабудаваць падпорныя сцены. Яшчэ праектам 1924 прадугледжана было будаўніцтва гранітнага бульвара, які падпіраў бы схілы гары і пасадка на іх кустоў.

Літ.: Пачобут Н.А. Музеефікацыя археалагічных помнікаў на Замкавай гары ў Гродне (1932–1951) // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 8. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2012. – С. 36–43; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 97–100, 114–115.

Замкавы двор – трохпавярховы будынак у стылі позняга рэнесансу, пабудаваны каля 1540 г. як рэзідэнцыя вялікага князя літоўскага і польскага караля. Знаходзіўся на рагу вул. Замкавай і *Рынку* (г. зн. на месцы сённяшняга палаца тэкстыльшчыкаў). Калі *Стэфан Баторы* памёр, ягонае цела са Старога замка прынеслі сюды, і тут 15.12.1586 адбылося першае ў гісторыі Усходняй Еўропы навуковае *анатамічнае ўскрыццё*. Зрабіў яго каралеўскі цырульнік Я. Зігуліц у прысутнасці каралеўскіх лекараў (М. Бучэлы і С. Сімоні), епіскапаў, канцлера, польнага гетмана і іншых магнатаў. Яшчэ ў 1870-х гадах будынак меў мансардны паверх, пакрыты дахоўкай дах. На мяжы 19/20 ст. дах будынка апусцілі і пакрылі бляхай. У 1941 г. З. д. згарэў. Гродзенскі даследчык І. Трусаў лічыць, што менавіта гэты дом трэба называць “Батароўкай”. Выява Замкавага двара ёсць на акварэлі Орды Н. 1865 г.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: “Гарадзенская бібліятэка”, 2012. – С. 303–304; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 19–20.

Замыслоўскі Ягор Ягоравіч (18.06.1841, Гродна – 1896, Варшава) – расійскі гісторык, сябра-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1888). Скончыў 2-ю Пецярбургскую гімназію (1857), гісторыка-філалагічны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта (1862). У студэнцкія гады пачаў займацца выкладчыцкай працай з дзецьмі забяспечаных бацькоў, летам выязджаў з імі на агляд помнікаў гісторыі, культуры і прыроды ўнутры краіны і за яе межамі. З 1864 – на выкладчыцкай працы: у Паўлаўскім жаночым інстытуце, Аляксандраўскім ліцэі, Пецярбургскім гісторыка-філалагічным інстытуце (1869). У 1871 абараніў магістарскую дысертацыю і з 1884 па 1890 працаваў прафесарам кафедры. У 1880–1889 З. выкладаў расійскую і ўсеагульную гісторыю будучаму імператару Мікалаю II. У 1884 абараніў доктарскую дысертацыю і стаў працаваць у Пецярбургскім універсітэце. Чытаў курсы лекцый па гісторыі Расіі XVII ст., помніках старажытнарускага права, гістарыяграфіі і гістарычнай геаграфіі. Па гэтых праблемах друкаваў свае працы: "Аб значэнні XVIII стагоддзя ў рускай гісторыі" (1871), "Заняцце рускімі Сібіры" (1882), "Чарцяжы сібірскіх зямель XVI–XVII стст." (1891), "Герберштэйн і яго гісторыка-геаграфічныя звесткі аб Расіі" (1884), "Зносіны Расіі з Польшчай у часе царавання Фёдара Аляксеевіча" (1887) і інш. У 1890 г. выйшаў у адстаўку па хваробе.

Літ.: Ермоленко В.А., Черепица В.Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 368–370; Историки Гродненщины (материал в помощь лектору) / Сост. А.Н. Нечухрин. – Гродно, с. 8.

Зан Тамаш Каралевіч (21.12.1796, м. Мясота, Навагрудскага ў.; па іншых звестках м. Вязынь, Вілейскі ў. Мінскай губ. – 7.07.1855, Кахачын Сенненскага ў. Магілёўскай губ.) – стваральнік маладзечанскага таварыства "Войска Апалона і Марса" (1813–14), адзін з арганізатараў таварыства філаматаў (1.10.1817), яго сакратар; чалец Саюза сяброў (1819); сябра Таварыства шасці (1819); стваральнік таварыства прамяністых (1820); старшыня (прэзідэнт) філарэтаў (чалец блакітнага саюза). Вясной 1820 З. арганізаваў для прамяністых маёўкі. У 1821 уступіў у рэфармаваную масонскую ложу. З мая 1821 уваходзіў у віленскае аддзяленне Патрыятычнага таварыства, а з 1822 быў сябрам Таварыства шубраўцаў. Пасля следства над філаматамі і філарэтамі быў сасланы ў Арэнбург, дзе год сядзеў у крэпасці Кізыл, а потым на пасяленні. Там ён вывучаў геалогію, раслінны свет Урала, башкірскі і казахскі фальклор, у 1827–37 гг. ажыццяўляў вандроўкі па Арэнбургскай губ. Вызвалены быў у 1837, але толькі ў 1841 г. яму дазволілі вярнуцца на радзіму, дзе яго сустракалі як нацыянальнага героя. У 1841 жыў у Гродне, дзе праводзіў геалагічныя пошукі ў даліне Нёмана.

Творы: Апісанні Віленскага і Лідскага паветаў; рукапіс "O stanie oświaty w XIX w.". Знаходзяцца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве.

Крын. і літ.: ЛДГА, ф. 721, воп. 1, спр. 268, а. 124; спр. 822, а. 14, 18, 20 адв.; ф. 567, воп. 2, спр. 1336, а. 261; спр. 1546, 77 аб.; ВУ а.р., ф. 24, спр. 13, а. 2; спр. 28, а. 12 адв.; 43. Філаматы і філарэты: Зборнік/уклад. К. Цвірка. – Мн.: Беларускі кнігазбор. 1998.,

c. 197; Archiwum filomatów. Cz. 1 Korespondencja filomatów, t. III, Kraków 1910, s. 254; J. Borowczyk, Rekonstrukcja procesu filomatów i filaretów. 1823–1824, Poznań 2003, s. 775–778; Mickiewicz. Encyklopedia. /J. M. Rymkiewicz, D. Siwicka, A. Witkowska, M. Zielińska. – Łódź, 2010, s. 616–618; Olechnowicz. Archiwa rodowe i osobiste w Litewskim państwowym archiwum historycznym// Miscelanea historico-archivistica. T. IX. – Warszawa, 1998. – s. 158; Słownik podróżników, s. 345–346.

Запольскі-Доўнар Ігнацы Гілярыевіч (1829, в. Таўкачы Мінск. Губ. – 1865, Сувалкі) – гітарыст, адзін з першых гродзенскіх фотамайстроў, шляхціч. Школу скончыў у Мінску. Быў актыўным чальцом патаемнага "Братняга саюза літоўскай моладзі" (мінскага філіяла, 1849). Заклікаў да барацьбы супраць польскіх і літоўскіх арыстакратаў, прыгнятальнікаў народа, а таксама з царызмам за нацыянальную незалежнасць. У 1851 быў адданы ў вайсковую службу, праслужыў радавым у 2 Арэнбургскім лінейным батальёне да лістапада 1856. Даследчыкі пішуць, што З. адначасова вучыўся граць на гітары. Вярнуўшыся на радзіму, даваў канцэрты ў Маскве, Віцебску, Вільні, Горадні, Коўне, Сувалках, Беластоку, Любліне, Плоцку, Буску, Сольцы, Варшаве. Другім захапленнем З. была фатаграфія. Пасведчане гродзенскага губернскага праўлення аб дазволе утрымоўваць фотамайстэрню атрымаў 10.03.1863 (ст. ст.), але пераехаў у Сувалкі (можа з-за канкурэнцыі). Вядомыя яго паштоўкі з выявамі Сувалак і Даўспуды (рэзідэнцыі Пацаў пад Сувалкамі).

Літ.: Кісялёў Г. Музыкант, канспіратар, піянер фатаграфіі // Яго ж. Смак беларушчыны. – Мінск, 2013, с. 179–185.

Захараў Уладзімір Іванавіч (18.10.1961, Гродна) – беларускі гітарыст, стваральнік гродзенскай гітарнай школы, магістр мастацтваў, сябра грамадскага аб'яднання "Беларускі саюз музычных дзеячаў". У 1991 скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя А. В. Луначарскага, у 1998 – асістэнтуру-стажыроўку пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Выкладчык па класе гітары ў Гродзенскім дзяржаўным музычным каледжы, дацэнт кафедры музычнага мастацтва ГрДУ імя Я. Купалы. З выкладчыцкай працай сумяшчае канцэртную дзейнасць саліста-інструменталіста ў Гродзенскай дзяржаўнай абласной філармоніі. Прымаў удзел у шматлікіх фестывалях і канцэртах у Беларусі, Расіі, Украіне, Літве, Польшчы і Іспаніі. Дыпламант VII Міжнароднага конкурсу гітарыстаў у Кракаве (1992), лаўрэат міжнародных конкурсаў "Estrada gitarowych talentów im. Kazimierza Sosińskiego" (Гданьск, 1993) і "Віртуозы гітары" (Санкт-Пецярбург, 2016) у намінацыі "Конкурс кампазітараў". Аўтар твораў для гітары, фартэпіяна, харавых і вакальна-інструментальных кампазіцый (Апрацоўкі для гітары: рэпертуар. зб. / Уладзімір Захараў. – Гродна: ГрДУ, 2020. – 19 с.).

У 1999 г. узнагароджаны ганаровым знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь "За значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры". Лаўрэат прэміі імя А. І. Дубко Гродзенскага аблвыканкама "За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва" ў 2002 г.

Звяруга Яраслаў Генрыхавіч (4 верасня 1928, Мядзел – 4 жніўня 2011, Мінск) – беларускі археолаг, даследчык старажытных гарадоў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. У 1949–1953 гадах вучыўся на гістарычным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У 1971 абараніў дысертацыю і атрымаў навуковую ступень кандыдата гістарычных навук. У 1971–1973 даследаваў Каложскае плато каля царквы Барыса і Глеба на Каложы. Знайшоў шмат зямляначных і паўзямляначных паселішчаў, сельскагаспадарчыя прылады XIII ст.

Літ.: Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада/ Пад рэд. В. Карнялюк, В. Швед. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2012, с. 31–32; Вікепедыя.

Звярынец – месца, дзе гадавалі жывёлу для палявання вял. кн. літоўскага і польскага караля. Знаходзіўся на адным з востраваў на рацэ Нёман, прыкладна насупраць каралеўскага дома (Новага замка) і касцёла францішканцаў. Згадваецца ў дакументах 1676, 1717, 1754 гадоў. У XVII ст. частка плошчаў звярынца належала кляштару брыгіцкаму, а ў XVIII ст. – кармелітам.

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 96; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 14.

Здзяхоўскі Мар'ян – першы лаўрэат літаратурнай узнагароды імя *Ажэшкі Э.* Гродзенскай рады (18.06.1936). З 1899 г. – прафесар Ягелонскага ўніверсітета, з 1919 – Віленскага, у 1925–1927 – рэктар. Гісторык славянскай літаратуры, літаратурны крытык, філосаф, публіцыст. Быў знаёмы з Ажэшкай, неаднаразова прыязджаў да яе ў Гродна. Да яго яна звярталася з просьбай (у 1904 г.) падпісаць мемарыял польскіх вучоных аб прадстаўленні яе кандыдатуры на Нобелеўскую літаратурную прэмію.

Літ.: Skoczyński J., Wroński A. Marian Zdziechowski. 1861–1938. W 70 rocznicę śmierci. – Warszawa, 2009.

Зейн Франц Альберт Аляксандравіч (27.07.1862 – ?) – гродзенскі *губернатар* з 24.06.1906 да 16.11.1907. З дваран Віцебскай губ., лютэранін. Вучыўся ў Полацкай вайсковай гімназіі, з 1879 па 1822 – у Міхайлаўскім артылерыйскім вучылішчы, з 1885 па 1889 – у Мікалаеўскай акадэміі Генеральнага штаба. Пасля яе заканчэння атрымаў чын штабс-капітана. Служыў у Кіеўскай (1889–1890), Фінляндскай ваенных акругах (1890–1906). У апошняй атрымаў чын палкоўніка, быў з 1899 чальцом асаблівай нарады па справах друку, з 27.08.1900 – чальцом Цэнтральнага камітэта апекі сірот і пазашлюбных дзяцей у Фінляндыі. Займаўся рэарганізацыяй Фінляндскага кадэцкага корпуса (1901). З 4.05.1903 знаходзіўся ў камісіі для распрацоўкі пытанняў жандармскага нагляду ў Фінляндыі. Напярэдадні прызначэння ў Гродзенскую губ. З. меў званне генерал-маёра і пасаду дырэктара канцылярыі фінляндскага генерал-губернатара. Указам Мікалая II ад 24.06.1906 прызначаны гродзенскім губернатарам, і 29 чэрвеня прыехаў у Гродна. Указам цара ад 16.11.1907 стаў памочнікам фінляндскага

генерал-губернатара. У 1912 – генерал-губернатар Вялікага Княства Фінляндскага, генерал-лейтэнант, сенатар імператарскага фінляндскага Сената.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 25, с. 1464, 5–6; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007.

Зяньковіч Якаў Аўксенцьевіч (1825 – 1888, Вільня) – мастак. Скончыў курс імператарскай Мастацкай акадэміі (1843–1847) і жыў у Рыме. У Гродзенскай губ. з 27.03.1854. Выкладчык малюнка, чарчэння і чыстапісання ў гродзенскай класічнай *гімназіі* (1860–1880) і жаночай Марыінскай гімназіі (з 1877). Калежскі асэсар. Аўтар адзіных прыжыццёвых партрэтаў дзеячаў літоўскай культуры Даўкантаса (1793–1864) і Валанчуса (1801–1875), напісаных у 1850 у С.-Пецярбургу. Меў сына Мікалая, які скончыў курс Гродзенскай гімназіі і пазней быў прапаршчыкам 101-га Пермскага пяхотнага палка ў Гродне да 1873, затым – палкавым ад'ютантам, паручнікам. Мікалай намаляваны бацькам на партрэце "Італ'янскі хлопчык з мандалінай" (Вільня, 1861). Узнагароджаны медалямі "В память войны 1853–1856" і "За усмирение польского мятежа 1863–64".

Літ.: Крючкова Л. "Писал художник Академии Зенькович..." // Гродн. правда, 1984. – 16 апреля.

Зізмар Якаў (1856, Гродна – 1922, Вільня) – публіцыст, нар. спявак. Атрымаў традыцыйнае яўрэйскае выхаванне, рана пачаў пісаць вершы, сам сачыняў да іх музыку. Быў папулярны як бадхен. Пасля *вайны 1-й сусветнай* спрабаваў выступіць з канцэртамі ў Гродне і Вільні, але поспеху не меў. Першы зб. вершаў выйшаў у Вільні ў 1883, другі – там жа ў 1918. Вялікую каштоўнасць уяўляюць успаміны З. "Ранейшыя вяселлі" і "Мае ўспаміны аб бадхенах", апублікаваныя ў 1922 у зб. "Пінкас з гісторыі Вільні"

Знак памятны "Пагоня на Грунвальд", усталяваны ў Гродне ў 2010 г. да 600-годдзя перамогі беларуска-літоўска-польскага войска над *крыжакамі* пад Грунвальдам. Знаходзіцца каля *царквы Барыса і Глеба на Каложы*, месцы, дзе, як лічыцца, збіраліся гарадзенская і іншыя харугвы ВКЛ – удзельніцы бітвы 15.07.1410. Памятны знак уяўляе сабой вялікіх памераў валун з памятнай шыльдай, на якой адлюстраваны герб ВКЛ "Пагоня".

Крыніцы: http://krokapp.com/view/268/. Доступ 08.01.2022; https://vetliva.by/belarus/what-to-see/pamyatnyy-znak-pogonya-na-gryunvald/. Доступ 08.01.2022.

Зымель Нахім, Менахем Нахум бен Ехезкель (?–1808) – беглы старазаконны гісер з м. Сокала (Галіцыя). Некаторыя даследчыкі пішуць, што ён па запрашэнні А. Тызенгаўза разам з сям'ёй прыехаў у Гродна 25.10.1785 г. Але агульнавядома, што з 1780 гарадзенскі *староста* ўжо не меў ніякіх паўнамоцтваў, а 31.03.1785 памёр у Варшаве. Магчыма, маецца на ўвазе 1775 г. З. на створанай ліцейні выраблялі шрыфты лацінскія, польскія, расійскія, грэцкія і яўрэйскія. Па словах І. Лялевеля, яны былі роўныя найлепшым еўрапейскім,

а "з часам навучаныя адліўшчыкі разбегліся", гэта значыць разышліся па новых месцах працы. Пры дапамозе сына Сімхі Зымеля і Ехезкеля бен Ар'ега Лейбы рыхтаваліся да друку ў гэтай жа друкарні яўрэйскія кнігі. Першай, верагодна, была Lechem seriom, выдадзеная ў 1788 г.

Літ.: Бобровский П. Историко-статистический очерк города Гродна // Гродненщина. Часть первая. Том 1. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 61; Lelewel J., Bibliograficznych ksiąg dwoje. T. 1. Wilno 1927. S. 223, 226; Łojek J. , "Gazeta Grodzieńska" 1776 – 1783 // Rocznik Historii Czasopiśmiennictwa Polskiego. – 1966. – T. 5, z. 2. S. 38.

Зымель Нахімовіч/Нахумовіч (? – каля 1841) – гісер і друкар, удасканаліў ліцейню шрыфтаў ("словолитню"), атрыманую ў спадчыну ад бацькі *Зымеля Нахіма,* і выраблялў расейскія, лацінскія і яўрэйскія шрыфты. Імі карысталіся друкарні айцоў піяраў і Юзафа Завадскага ў Вільні, урадавая друкарня Княства Варшаўскага ў Варшаве, друкарня кармелітаў у Бярдзічаве і іншыя. У 1808 г. Зымель разам з Ануфрыем Ланткевічам адкрыў друкарню, якая да 1820 не мела ў Гродзенскай губ. канкурэнтаў. Тут друкаваліся судовыя і афіцыйныя дакументы, панегірыкі ў адрас мясцовых магнатаў, чыноўнікаў, мастацкая літаратура, "Каляндар Віленскага ўніверсітэта". Каля 1810 Зымель апублікаваў сваю працу "Узоры розных шрыфтоў, наяўных у друкарні, уласнай працы Зымеля Нахімовіча, друкара і шрыфтгісера гродзенскага". У 1823 прасіў князя Адама Чартарыйскага, як апекуна Віленскага ўніверсітэта, пасадзейнічаць яму ў атрыманні патэнта на выданне ўніверсітэцкага "Календара гаспадарскага". Пасля смерці Зымеля друкарняй кіраваў да 1864 г. ягоны сын М. Зымеловіч. Зымель Нахімовіч меў годнасць *ганаровага грамадзяніна* Гродна.

Літ.: Куль-Сяльверстава С. Гарадзенскі друкар Зымель Нахімовіч // Форум. – 1996. – С. 38–40; Tomaszewski A., Giserzy czcionek w Polsce, Warszawa, 2009. S. 84; Abramowicz L., Cztery wieki drukarstwa w Wilnie. 1525–1925. – Wilno, 1925. – S. 106–107; Kościałkowski St. Antoni Tyzenhauz. T. 1. – Londyn 1970, s. 493.

Зындрам-Касцялкоўская Віла (Вільгельміна) (1844, Гродна – 1926, Гродна) – пісьменніца. Скончыла шляхецкі інстытут для паненак у Вільні, як любімая вучаніца Здановіча, прафесара літаратуры і гісторыі. Першай спробай пяра стала аповесць "Złota hrabianka" ("Залатая графіня", 1877), напісаная сумесна з *Ажэшкай Э*. Яны былі знаёмыя з дзяцінства, але потым шляхі разышліся, а сышліся ўжо ў сталым узросце, калі Ажэшка пасялілася ў Гродне. З.-К. узбагаціла польскую літаратуру шэрагам прац: "Ігнацы Ходзька", "Аб Сыракомлі", "Слова аб Ажэшцы" (на аснове асабістых успамінаў), параўнальнае даследаванне Славацкага і Шэлі, Марыі Канапніцкай, Свентахоўскага. Добра ведала агульнаеўрапейскую літаратуру, мовы, пісала аб Лаці, аб іспанскай літ-ры, аб Брэтхардзе, Дыкенсе для "Gazety Łódzkiej", "Лісты з Гродна ў Лодзь". Як навэлістка выдала невялікі зборнік "З розных сфер", "Архаічныя байкі". Рабіла пераклады: Лаці "Ісландскі Рыбак", Д'Анунцыа "Агонь", Брэтхарда "Збор навэл", Грацыі Дэледы "Некалькі аповесцяў", Фарыны "Мой сын", Фогацары "Святы" (забаронены духоўнымі ўладамі і ненадрукаваны ў той

час). Апошнія гады нічога не пісала. Бацька – адзін з аўтараў надпісу на школьнай дошцы ў гонар Канстытуцыі 3 мая, якая дала нагоду М. М. Навасільцаву пачаць працэс супраць філаматаў (1823). Разам з Ажэшкай вучыліся чэшскай мове. Мела 2 сястры: Барбару і Юзэфу.

Літ.: Gozdawa. Willa Zyndram-Kościałkowska // Głosy znad Niemna 1917. Jednodniówka Grodzieńska, Grodno, 1918 – s. 63 – 64; Listy Elizy Orzeszkowej. Tom III. Listy zebrane. – Wrocław, 1956, s. 367, 396, 460.

Зураў Аляксандр Елпідыфаравіч (4.11.1837 – ?) – гродзенскі *губернатар* з 15.07.1870 да 9.05.1878. З дваран Наўгародскай губ. Паводле традыцыі продкаў стаў вайскоўцам. Выхоўваўся ў Пажскім корпусе. Адтуль 16.06.1856 накіраваны на службу ў былы Кавалергардскі Яго вялікасці полк. Даслужыўся да ротмістра (17.04.1863). У 1863 быў адкамандзіраваны для выканання абавязкаў ад'ютанта пры чальцы Дзяржаўнага савета генерале ад кавалерыі бароне Офенбергу. 27.03.1866 стаў палкоўнікам, з 28.04.1867 прызначаны афіцэрам асаблівых даручэнняў пры начальніку Галоўнага штаба.

Указам Аляксандра II ад 15.07.1870 атрымаў чын генерал-маёра са старшынствам і быў прызначаны гродзенскім губернатарам з залічэннем у армейскую кавалерыю. У 1874, вырашаючы справу аб 64 ураджэнцах Ваўкавыскага ў., якія пакінулі працу на будаўніцтве Прывісленскай чыгункі, не аддаў іх суду адпаведна з "Уложением об наказаниях" 1874. У красавіку 1876 атрымаў "изъявление высочайшего благоволения" за збор падаткаў і розных акладных збораў, 25.11.1876 – за паспяховае выкананне першага прызыву запасных ніжніх чыноў у сувязі з падрыхтоўкай да руска-турэцкай вайны. 1.10.1876 па ініцыятыве З. у Гродне была адкрытая спавівальная школа, пры якой існаваў радзільны прытулак. У 1877 дазволіў лютэранска-евангеліцкай абшчыне Гродна зарганізаваць канцэрт і зладзіць латарэю для збору грошай на новы арган для кірхі. 6.05.1877 З. была аб'яўленая "высочайшая благодарность" за актыўную дзейнасць па прызыве запасных ніжніх чыноў і дастаўцы насельніцтвам коней для войск, што спрыяла паспяховай мабілізацыі арміі. У 1878 зноў атрымаў "монаршее благоволение" за дзейнасць па збіранні акладных збораў.

Царскім указам ад 9.05.1878 прызначаны С.-Пецярбургскім граданачальнікам, з захаваннем прыдворнага звання і звання ў армейскай кавалерыі. 16.02.1879 атрымаў дазвол на атрыманне звання *ганаровага грамадзяніна* гарадоў Гродна, Саколкі і Беластока (1878), 6 ліпеня прыйшоў дазвол аб размяшчэнні партрэта Зурава ў класным пакоі гродзенскай спавівальнай школы, а 21 верасня царскім указам была усталяваная стыпендыя імя Зурава ў Гродзенскай *гімназіі* і Беластоцкім рэальным вучылішчы. Капітал для яе памерам 3 тыс. руб. быў сабраны на ахвяраванні служачых і жыхароў Гродзенскай губ. Адным з першых аказаў дапамогу гродзенскім жыхарам пасля *пажару* ў 1885 г. (ахвяраваў 500 руб.). У 1893 быў ганаровым чальцом Гродзенскага таварыства дабрачыннага. У 1895 была усталяваная стыпендыя яго імя ў Гродзенскай жаночай гімназіі, а ў 1903 прынятае рашэнне аб размяшчэнні партрэта ганаровага апекуна З. у зале гімназіі. У 1901–1902 – віленскі

губернатар, у 1902–1904 – таварыш міністра ўнутраных спраў і камандуючы Асобным корпусам жандармаў.

Крын. і літ.: НГАБ, ф. 1 Ф.1, оп.7, д.2480, л.9. , воп. 7, с. 2480, воп. 22, с. 1836, а. 13; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007.

Зялёнка Кандыд (свецкае імя: Міхаіл Тадэвуш, 1797 – 11.11.1860) – ксёндз, настаўнік у *школе дамініканскай* і *гімназіі,* паўстанец. Першы бібліятэкар *бібліятэкі гарадской публічнай* (верасень 1830–1831). З небагатай віленскай шляхты. Скончыў павятовае вучылішча, духоўную семінарыю і тэалагічны факультэт Віленскага ўніверсітэта. Быў прыёрам *кляштара дамініканцаў* у Гродне і прэфектам у мясцовай гімназіі. Вясной 1833 падчас хваляванняў у гімназіі быў арыштаваны, але вызвалены губернатарам *М. М. Мураўёвым*. Хутка зноў арыштаваны, асуджаны і 16.10.1833 г. сасланы ў Арэнбург "за участие в злонамеренных замыслах преступников, возвратившихся из-за границы" (фактычна за тое, што бараніў сваіх вучняў, якія знаходзіліся пад следствам). У асяроддзі ссыльных палякаў карыстаўся аўтарытэтам (яны называлі яго "Ojciec-prefekt" (айцец-прэфект). Заснаваў першы каталіцкі касцёл. Жонка Арэнбургскага губернатара М. П. Обручава была каталічкай, і З. стаў першым яе памочнікам ва ўсіх дабрачынных мерапрыемствах, увайшоў у давер да генерал-губернатара, тым самым атрымаў магчымасць аказваць уплыў на дзеянні адміністрацыі. З. займаўся даследаваннем Арэнбургскага краю. У 1835, калі ксяндзам дазволілі перасяліцца бліжэй да родных (у Вільні ў З. жыла маці, у Брэст-Літоўску – брат), ён адмовіўся і далей падзяляў лёс з іншымі вязнямі. У 1837, пасля таго як з'ехаў з Арэнбурга *Т. Зан*, Зялёнка прыняў на сябе кіраўніцтва музеем і турбаваўся папаўненнем яго збораў. Толькі ў 1839 З. атрымаў царскі дазвол на зацвярджэнне капеланам Няплюеўскага корпуса, што трохі палепшыла яго матэрыяльнае становішча. У 1847 З. пазнаёміўся з сасланым у Арэнбургскую губ. украінскім паэтам і мастаком Т. Р. Шаўчэнкам, які потым прысылаў яму лісты з Новапятроўскай крэпасці. У 1857 З. яшчэ знаходзіўся пад наглядам арэнбургскай губернскай паліцыі.

Літ.: Н.Н.Модестов "Бывший префект Гродненской гимназии, иеромонах доминиканского ордена Кандид Зеленко в Оренбурге" // Труды Оренбургской ученой архивной комиссии. Вып.28. – Оренбург, 1913; Л. Большаков. Літа невольнічі. – Киев: Худ. л-ра, 1971); Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 592.

Зялінскі Юзаф Антоні – латвойт па выніках выбараў судовага войта Марціна Кліманскага (24.7.1783), войт судовы Гродна (каралеўская намінацыя ад 20.02.1784). Затым *войт* (1786–1792), *бурмістр* (1794–?). Жыў на вул. Замкавай, 15. Меў камяніцу і 2 дамы. Валодаў складам він. Быў сябрам скарбавай дэпутацыі ў *Камісіі парадкавай Гродзенскага пав.*

Крын. і літ.: НГА РБ, ф. 1761, оп. 1, д.13 л. 209 – 213; Jodkowski J. Grodno. – Wilno, 1923, s. 68.

І

Іванішэўскі Генрык (1922, Гродна – 1981) – астраном, звязаны з універсітэтам Мікалая Каперніка ў Торуні. Аўтар прац па зорнай астралогіі, радыёастраноміі, механікі неба і фотаметрыі.

Літ.: Kałuski M., Sprawy kresowe – poza cenzurą. T. 1. – Toruń-Melbourne, 2017. – S. 87.

Іваноўскі Вацлаў Леанардавіч (7.06.1880, фальварак Лябёдка Лідскага пав. – 7.12.1943, Мінск) – беларускі грамадскі дзеяч. Скончыў 5-класную Варшаўскую гімназію (1899), хімічны факультэт Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута (1904), стажыраваўся ў Мюнхенскім палітэхнічным інстытуце. У 1909 атрымаў ступень доктара тэхналагічных навук. Займаўся пытаннямі перапрацоўкі садавіны, гародніны і малака, хлебапячэння, ачысткі і выкарыстання пасляцэлюлёзных сцёкаў. 17.07.1920, падчас эвакуацыі польскага войска з Мінска, І. затрымаўся ў Гродне і прабыў тут да 19.07, пасля чаго з'ехаў у Варшаву. У Гродне ён выдаў з Цэнтральнай касы БНР грашовыя крэдыты К. Цярэшчанцы, С. Рак-Міхайлоўскаму, *Л. Дзекуць-Малею*. Каля 8.10.1920 І. ехаў з *Б. Тарашкевічам* у Вільню і спыніўся ў Гродне ў сувязі з пытаннем адкрыцця тут беларускай вышэйшай школы.

Іваноўскі Станіслаў Леанардавіч (4.12.1887, Лябёдка – 5.10.1970, Быдгашч) – адзін з чатырох братоў Іваноўскіх, польскі грамадскі дзеяч. Скончыў у 1911 г. юрыдычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. Працаваў стажорам адваката ў Вільні, служыў у расійскім войску. Удзельнічаў у *вайне Першай сусветнай*. У 1916 пераведзены на службу ў акруговы суд вайсковага флоту ў Кранштат. У 1918 вярнуўся ў бацькоўскі маёнтак. Быў абраны віцэ-старшынёй Галоўнай рады і прызначаны камісарам польскага ўраду ў Гродзенскім пав. (1919–1920). На пачатку 1919 пасяліўся ў Гродне і паставіў сабе мэтай ліквідацыю беларускага войска. Здолеў перацягнуць на бок палякаў адзін батальён *палка Першага беларускага пяхотнага* (500 чал.). Арганізаваў Польскую самаабарону ў Лідскім пав., Польскую вайсковую арганізацыю ў Гродне, браў удзел у польскім з'ездзе павятовых рад у Гродне. Пры адыходзе немцаў з Гродна (4.1919) яму ўдалося выкупіць чыгуначны *мост* праз Нёман. Удзельнічаў у *вайне польска-савецкай* (1919–1920), *вайне Другой сусветнай* (чалец *Арміі Краёвай*). Пасля арышту органамі НКУС быў імі вызвалены і рэпатрыяваны ў Польшчу. Займаўся тут адвакацкай практыкай.

Літ.: Латышонак А. Жаўнеры БНР. – Менск, 2009, с. 79; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 113–114; J. Gierowska-Kałłaur, Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (19 lutego1919 – 9 września 1920), Warszawa 2003, s. 47, 70; Iwanowski K., Stanisław Iwanowski organizator Grodzieńskiej obrony obywatelskiej 1918–1919, Gdynia, Gdańsk, 2002.

Ігар Яраслававіч (1036–1060) – князь Валынскі і Смаленскі. Малодшы сын Яраслава Мудрага і шведскай прынцэсы Інгегерды (?–1051). У спадчыну атрымаў Уладзімір-Валынскі (1054). Пасля смерці свайго брата, смаленскага князя Вячаслава (1034–1056), стаў вялікім князем паводле закону старэйшынства. Быў жанаты на германскай прынцэсе Кунігундзе і меў дваіх сыноў – Усевалада і *Давіда Ігаравіча*, які стаў бацькам У*севалада Гарадзенскага*.

Ігнатовіч Фёдар Іванавіч (12.09.1938, в. Сяльцо, Салігорскага р-на Мін. вобл. – 2016, Гродна) – санітарны ўрач, гісторык медыцыны, краязнавец. Прысвяціў медыцыне 50 гадоў свайго жыцця. Скончыў Слонімскае медыцынскае вучылішча і Ленінградскі медыцынскі ўніверсітэт. Працаваў ўрачом-вірусолагам, загадчыкам вірусалагічнай лабараторыі Гродзенскага абласнога цэнтра гігіены і эпідэміялогіі. Актыўна ўдзельнічаў у правядзенні мерапрыемстваў па эпідэміялагічным наглядзе, лабараторнай дыягностыцы і прафілактыцы інфекцыйных хвароб на Гродзеншчыне. Па актуальных праблемах вірусалогіі і эпідэміялогіі апублікаваў звыш 47 навуковых артыкулаў і ўкараніў 14 рацыяналізатарскіх прапаноў у практыку. З 1996 па 2003 – ст. навуковы супрацоўнік навукова-вытворчага кааператыва "Біятэст", стваральнік *аптэкі-музея*. З 2003 па 2008 – асістэнт кафедры агульнай гігіены і экалогіі ГМУ, загадчык музея гісторыі ўн-та (2004–2006). З 2008 г. – выкладчык Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага каледжа і ГрДУ ім. Я. Купалы. Другі напрамак навуковай дзейнасці І. – даследаванне грамадска-палітычнай дзейнасці медыцынскіх і фармацэўтычных працаўнікоў. Аўтар 300 друкаваных навуковых прац, у тым ліку кніг "Уладзіслаў Борзабагаты" (1993), "Экологическая экскурсия по Румлевскому парку", "Гродненская медицинская академия: библиографический указатель" (2007, у суаўтарстве). Мае медаль "Ветэран працы". Лаўрэат прэміі *Ядкоўскага Ю.* (Гродна, 2014).

Літ.: Тищенко Е. И врач, и историк // Медицинский вестник. – 1998. – № 40. – 1.10. – С. 12; Игнатович Фёдор Иванович [о нем] // Кто есть кто в Республике Беларусь. – Минск: Энциклопедикс, 2001. – Т. 2. – С. 194.

Ікона Маці Божай Кангрэгацкай (Студэнцкай са жніўня 1664 г.), знаходзіцца ў *касцёле езуіцкім*. Яе прывёз з Рыма князь Альбрэхт Радзівіл, а пазней ёю валодалі дамініканін а. Куклінскі і Войцех Жэляроўскі. Апошні перадаў абраз езуітам, якія змясцілі яго ў 1664 г. у алтары студэнцкай арганізацыі (кангрэгацыі) старэйшых класаў гродзенскага *калегіума*. Вядомая як цудоўная ікона (памагае хворым вылечыцца), аб чым сведчыць пратакол спецыяльнай камісіі 1667 г.

Літ.: Lawszuk W. Jezuici w Grodnie. 1622–1700. Ludzie i dzieje kolegium. – Kraków: wyd-wo WAM, 2013. – S. 307.

Ікона цудатворная Прасвятой Багародзіцы Каложскай (канец XVII – пач. XVIII ст.). Па словах *Арлоўскага Е.*, напісаная на меднай дошцы, у срэбнай пазалочанай рызе, упрыгожаная каштоўнымі камянямі (агатамі, гранатамі, сердалікамі). У 1915 г., у часе *вайны Першай сусветнай*, была вывезеная ў Маскву падчас эвакуацыі Барысаглебскага манастыра. У 2004 дэпутаты гродзенскага *гарсавета* звярнуліся да прэфекта Паўночна-Заходняй акругі Масквы В. Казлова з просьбай аб пошуку іконы і вяртанні яе на радзіму. "Але вынікаў пакуль няма" – напісаў у 2009 г. А. Мальдзіс.

Літ.: Мальдис А. Белорусские сокровища за рубежом. – Минск: Літаратура і Мастацтва, 2009. – С. 28.

Іпатава Вольга (1.01.1945, м. Мір Карэліцкага р-на) – беларуская пісьменніца (паэтка, празаік, драматург, літаратурны крытык, публіцыст). Гадавалася ў гродзенскім дзіцячым доме (1956–1961). Тут скончыла школу № 7. Скончыла філфак Белдзяржуніверсітэта (1967). Вярнулася ў Гродна і ў 1965–68 была інструктарам, загадчыкам сектара ў абкаме камсамола, затым – рэдактарам на абласным тэлебачанні (1968–72). Цікавілася беларускай гісторыяй. Ужо ў першым зборніку вершаў "Раніца" (1969) знойдзем гродзенскія мясціны: Каложу, вул. Замкавую, Ласасянку. Аўтар кнігі "Паміж Масквой і Варшавай" (1996), тэлеп'есы "Давыд Гарадзенскі" (1988), лібрэта оперы "Князь Навагрудскі" (1992), тэлерэпартажаў пра жыццё беларускай эміграцыі ў ЗША. Літаратурнай падзеяй стаў ейны раман-трылогія "Альгердава дзіда" (2002).

Літ.: Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: Даведнік. – Гродна: ГрДУ, 2000. – С. 118–119; Пяткевіч А.М. Слова і кніга Прынёмання. Зборнік навуковых артыкулаў. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 109.

Іўліеў Юры Дзмітрыевіч (14.04.1923, Ташкент – 11.02.1945, Гродна) – капітан Савецкай арміі (служыў з 1940). Скончыў Чкалаўскую авіяцыйную школу ў Арэнбургу (1942). Затым быў на Заходнім і Другім Беларускім франтах. Камандзір штурмавой авіяэскадрыллі. Ажыццявіў звыш 120 баявых вылетаў. Адзначыўся пры вызваленні Магілёва, Мінска, Гродна. Герой Савецкага Саюза (26.10.1944). У студзені 1945 самалёт І. быў падбіты ў баі ў раёне Кёнігсберга. Лётчык накіраваў самалёт на групоўку немцаў, а сам катапультаваўся. Быў дастаўлены ў Гродна, дзе памёр ад ран. Пахаваны на *могілках брацкіх* у Старым *парку*. Яго прозвішчам названыя вуліцы ў Гродне і Ташкенце.

К

“Кавярня турка” (“Бузярня”, “Бузна”), знаходзілася ў доме, збудаваным у 1888 г. Вандалінам і Маўрыкіем Дашкевічамі на перакрыжаванні сучасных вуліц Віленскай, Ажэшкі, Савецкай (сёння дом ЗАГС). Гаспадар кавярні не быў туркам, а, мажліва, сербам або азербайджанцам. Тут варылі добрую турэцкую каву, прадавалі бузу – малочны напітак, які быў падобны на квас, толькі больш густы. Гэта была экзотыка, і гродзенская моладзь любіла сюды заходзіць пасля кінафільма ці пры розных жыццёвых нагодах. Гарадзенцы-старажылы ўспамінаюць К. т. да гэтага часу.

Літ.: Зусім іншы горад: Гродна і гродзенцы ў вусных успамінах / Уклад. А.Ф. Вашкевіч, Т.У. Касатая. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2017, с. 15–16; Павач А.А. Sursum Corda: Красная кніга Гродно/ Павач Андрэй Андрэевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2013. – С. 105–108.

Кагал – яўрэйская суполка, першы ўспамін пра якую ёсць у прывілеі вялікага князя літоўскага *Вітаўта яўрэям* Гродна ў 1389 г. Кагалам называюць таксама орган яўрэйскага самакіравання. Суполка выбірала некалькіх старшынь (рошым) і ганаровых асоб (товім). Судовыя справы разбіраліся ў рэлігійным судзе рабінам і суддзямі (даянамі). Праз спецыяльных хадайнікаў, штадланаў, кагал ажыццяўляў кантакты са знешнім светам. Напрыклад, у 1612–1622 гг. вёў барацьбу з кагалам Тыкоціна за гегемонію над прыкагаламі ў Заблудаве, Харашчы і Гарадку (на р. Супрасль). У кагале быў шэраг пасадаў, без якіх немагчыма ўявіць жыццё суполкі. Мяснік выконваў рытуальны забой жывёлы, і ў яго набывалі кашэрнае мяса для ежы. Абразальнік (маэль) праводзіў цырымонію абразання, што рытуальна далучала хлопчыкаў да суполкі. Сойфер займаўся перапісваннем сувоя Торы. Рабін апекаваўся рэлігійным жыццём і адукацыяй. Кантар у сінагозе спяваў падчас набажэнстваў рэлігійныя гімны, школьнік сачыў за станам сінагогі і парадкам у ёй. Скарбнік вёў фінансавыя справы, пісар – летапіс суполкі (пінкас), займаўся справаводствам. Місіяй кагалу, як адзначыла гісторык В. Сабалеўская, было забеспячэнне сваім чальцам “мажлівасці жыць максімальна камфортна і абаронена ва ўмовах іншаэтнічнага акружэння, захоўваць сваю тоеснасць – рэлігію, маральнасць і самасвядомасць”. У 1790 г. рабін кагалу Эльзар бен Шлома Вельбловер быў абвінавачаны ў рытуальным забойстве хрысціянскай дзяўчынкі. Нягледзячы на тое, што кароль не зацвердзіў прысуд, яго чвартавалі. У часы Расійскай імперыі кагал заставаўся легітымным органам яўрэйскага самакіравання. Ён ажыццяўляў ахову правапарадку, збіраў падаткі, каардынаваў

абавязковую для яўрэяў дабрачынную дзейнасць, рэгуляваў эканамічнае жыццё (прадухіляў магчымую канкурэнцыю сярод яўрэяў), займаўся адукацыяй (утрымоўваў школы пачатковыя/хэдэры і ешывы для старэйшых хлопчыкаў). У XIX ст. кагал пераўтварыўся ў алігархічную ўстанову, якая забяспечвала панаванне заможных яўрэяў ці "лепшых сем'яў" (Аскеназы, Броўды, Собалі, Фрумкіны, Шарашэўскія). Кагальнае кіраўніцтва мела цесныя кантакты з рабінамі. У 1844 г. кагалы былі скасаваныя, а яўрэйскае грамадства было падпарадкаванае магістрату і дзяржаўнаму суду. У міжваенны час у Гродне існавала ўправа кагалу, якая кіравала рэлігійнымі, эканамічнымі, сацыяльнымі, асветнымі, медычнымі, спартыўнымі справамі. Вялікая ўвага прысвячалася "палесцінскай праблеме": адпраўляліся грошы для падтрымкі тым, хто пераехаў у Палесціну.

Літ.: Анішчанка Я., Беньямін Шпеер і праект арганізацыі беларускіх кагалаў // Беларусіка=Albaruthenica/ Т. 4. Мінск, 1995. – С. 55–59; Баціс М., Буцько У., Крапівіна Н. і інш. Гародня: сляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні // ARCHE. – 2010. – № 6. – С. 370, 372; Сабалеўская В., Сацыяльныя змены ў асяроддзі беларускіх яўрэяў (канец XVIII – першая палова XIX стагодзя) // Евреи беларуси: История и культура: Сб. науч. Тр. Вып. 5. – Мн.: Изд-во "Три четверти", 2000. – С. 38–51; Сабалеўская В. З'яўленне габрэйскай суполкі // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 51; Сабалеўская В. Гарадзенскі кагал у XVI – XVIII стст. // Тамсама. – С. 149; Сабалеўская В. Габрэйскі квартал губернскага горада // Тамсама. – С. 306–308; Maroszek J. Dzieje województwa podlaskiego do 1795 roku. – Białystok: Wyd-wo Uniwersytetu w Białymstoku, 2013. – S. 391.

Кажынскі Мацей – спявак *тэатра Тызенгаўза* і варшаўскага тэатра. Спяваў у Варшаве ў оперы "Прыдуманае вар'яцтва ад кахання" (1791). У 1794 (гл. *паўстанне 1794*) выехаў у Львоў. У 1797 працягваў кіраваць мінскім тэатрам.

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. T. I, s. 345, 392, 397, 400; T. II. – Lwów, 1925. – S. 423.

Кажанеўскі (Кажанёўскі) Алаізы, герба Налэнч (1766–1833) – дамініканін (1782), вучыўся ў Віленскай акадэміі, атрымаў тут званне доктара вызвольных навук і філасофіі, выкладаў у Мерычы. У 1790–1806 быў настаўнікам фізікі і арганізатарам фізічнага кабінета ў Гродне. У гэты час зрабіў пераклад "Фізікі" Р. Ж. Гаюі і выдаў яе ў Полацку (1802) ды Вільні (1806). З 1809 дзейнічаў у Віленскім таварыстве дабрачыннасці. Да 1817 г. атрымаў у Віленскай акадэміі ступень доктара тэалогіі. Апублікаваў у Варшаве 4 тамы "Нядзельных казанняў" (1824–1825) і ў Вільні 2 брашуры супраць масонства.

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 232–233.

Кажэўнікаў Андрэй Львовіч (6.09.1802 – 2.05.1867, Пецярбург) – *дзекабрыст*, кіраўнік Гродзенскай палаты дзяржаўных маёмасцяў (1856). Сын

астраханскага *губернатара*. Выхоўваўся ў Маскоўскім універсітэцкім пансіёне, у маскоўскай вучэбнай установе калонаважатых (з 22.06.1819). Служыў у Барадзінскім пяхотным палку (даслужыўся да чына падпаручнік), паручнікам у лейб-гвардыі Грэнадзёрскім палку. Сябра Паўночнага таварыства *дзекабрыстаў* (1825). Удзельнічаў у паўстанні на Сенацкай плошчы ў Пецярбургу (14(26).12.1825). Пасля арышту быў дастаўлены ў Зімні палац, а затым пасаджаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Амаль праз год быў вызвалены і адпраўлены ў сібірскія гарнізонныя палкі. 7 ліпеня дастаўлены ў Іркуцкі гарнізонны полк у чыне падпаручніка. Удзельнічаў у турэцкай вайне (1829) і быў узнагароджаны срэбным медалём. У 1843 пераведзены ў Пскоў (маёр корпуса ляснічых). Атрымаў дазвол на ўезд у сталіцы. Стацкі дарадца (16.05.1852). Кавалер ордэна Св. Ганны з мячамі і імператарскай каронаю упрыгожанай. Атрымаў знак "беспорочной службы за XXV лет" (1855). З 1863 быў мінскім губернатарам і ўдзельнічаў у падаўленні паўстання. Напрыклад, ёсць яго данясенне аб арышце Камілы Марцінкевіч (дачкі В. Дуніна-Марцінкевіча).

Літ.: Швед В.В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў. – Мн.: Бел. НДІДАС, 1998.

Казённая палата – адзін з органаў кіравання, які быў створаны ў 1802 на аснове палажэння аб "Установах для кіравання губерняй…" 1775 г. Уваходзіла ў сістэму Міністэрства фінансаў і падпарадкоўвалася *губернатару*. К. п. мела наступныя аддзяленні: гаспадарчае – займалася дзяржаўнымі сялянамі і дзяржаўнымі маёмасцямі (да 1838); лясное – казённымі лясамі, іх эксплуатацыяй і мясцовай лясной вартай (да 1838); піцейных збораў – ажыццяўляла нагляд за піцейнымі адкупамі, за выдачай пасведчанняў на вінакурэнне і за дзейнасцю казённых піцейных устаноў; казначэйскае – загадвала павятовымі казначэйствамі; рэвізскае – ажыццяўляла ўнутраны фінансавы нагляд (рэвізію кніг і гадавых справаздач казначэйстваў). У функцыі казённых палат уваходзіла правядзенне таргоў на падрады, размеркаванне па губерні дзяржаўных падаткаў, назіранне за гандлем і прамысловасцю, правядзенне перапісу (рэвізій) абкладзенага падаткамі насельніцтва, пакаранне парушальнікаў устаноў казначэйства. Патрабаванні палаты прыводзіліся ў выкананне паліцыяй. У 1863 г. адбылася рэформа, пасля якой функцыі казённай палаты былі зведзеныя да вузка фінансавых пытанняў.

Літ.: Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 144–145; Швед. В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гродна: ГрГУ, 2001. – С. 129.

Казімір Святы, (3.10.1458, Кракаў – 4.03.1484, Гродна) – каралевіч, святы. Сын вялікага князя літоўскага і караля польскага *Казіміра IV Ягелончыка*. Быў вучнем польскага гісторыка Яна Длугаша, Яна Канта, Філіпа Калімаха. Вылучаўся фанатычнай рэлігійнасцю, чысцінёй традыцый, жыццём святошы. Вясной 1483 быў прызваны бацькам у Літву на пасаду падканцлера, і з канца гэтага

года знаходзіўся ў Гродне. Дзякуючы гісторыку *Ю. Ядкоўскаму* ў горадзе захавалася паданне, што Казімір мог правесці ў малітвах ноч перад уваходам у *Фару Вітаўта*. Ужо перад выездам у ВКЛ у К. былі хворыя лёгкія, а тут стан яго пагоршыўся. Месцам смерці каралевіча называлі Вільню, замак у Медніках, але аб'ектыўныя крыніцы (Пскоўскі II летапіс, праца З. Ферэры і Уроцлаўскі бенедыктынскі кодэкс) сцвярджаюць, што памёр Казімір у Гродне ад туберкулёза (сухотаў). А вось пахаваны ён у віленскім кафедральным саборы (капліца Св. Казіміра). Падчас ускрыцця труны цела яго аказалася нятленным (так званы цуд Св. Казіміра). Кананізаваны Папам Львом/Леанам X у 1521 г., але була не дайшла да Рэчы Паспалітай. Таму Папа Клімент VIII 7.11.1602 паўтарыў кананізацыю. У гродзенскім *касцёле Фарным* ёсць алтар Св. Казіміра з абразом "Св. Казімір моліцца на прыступках Фары Вітаўта". Прадстаўленая таксама сцэна з'яўлення св. Казіміра перад ліцвінскім войскам пад Полацкам у 1518 (ён дапамог ім выйсці з акружэння на другі бераг Дзвіны). Казімір з'яўляецца апекуном Літвы, Вільні, ліцвінскай моладзі. На выявах ён намаляваны ў мітры і княскай вопратцы, трымаючы у руках надпіс на латыні "кожны дзень з Марыяй". У 1930-х гадах у Гродне была вуліца яго імя. Св. Казімір – апякун рамеснікаў, таму ў горадзе праводзіцца кірмаш рамёстваў (гл. *Казюкі гродзенскія).*

Літ.: Бутэвіч А. Паміж Княствам і Каронай. – Мінск: Выдавецкі дом "Звязда", 2013. – С. 290–292; Гостев А.П. Кронон. Летопись города над Неманом (1116–1990) / А.П. Гостев, В.В. Швед. – Гродно: НВК "Пергамент", 1993. – С. 166; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 98–99; Palka D., Kazimierz // Słownik biograficzny historii Polski. T. 1 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C. 670; Orłowska B. Zwyczaje, obrzędy i tradycje w Polsce. Mały słownik. Wyd. II. – Warszawa: Verbinum, 2001. – S. 79.

Казімір IV Ягелончык, Андрэй (30.11.1427, Кракаў – 7.06.1492, Гродна) – вялікі князь літоўскі (1440–92), кароль польскі (1447–92). Малодшы сын *Уладзіслава II Ягайлы* і Соф'і Гальшанскай, унук Аляксандры Друцкай (маці Соф'і). 15.10.1445 у Гродна прыехалі польскія паслы прасіць К. заняць каралеўскі пасад. К. адмовіўся і толькі 17.06.1446 прыняў прапанову прыехаць у Карону Польскую, пры ўмове ануляваць усялякія запісы аб уніі Літвы і Кароны. Унія мела быць толькі персанальнай, як гэтага патрабавала літоўская эліта. 2.05.1447 К. сваім прывілеем пацвердзіў, што ВКЛ застаецца ў сваіх межах суверэнным гаспадарствам. Прымусіў Тэўтонскі ордэн стаць васалам Польшчы, але страціў уплыў на Ноўгарад і Пскоў. Спыніў буйныя татарскія набегі на ВКЛ. Абапіраючыся на сярэднепамесную шляхту, цэнтралізаваў краіну. Заваяваў права прызначаць біскупаў. Яго праўленне стала перыядам развіцця мастацтва і навукі. Зацвердзіў Судзебнік (1468).

Любіў *Горадню*, дзе часта жыў і гасціяваў па дарозе ў Вільню ці Кракаў. Быў тут 23.09.1440, 15.10.1445 (яшчэ як вялікі князь літоўскі); верасень 1448, лістапад 1452 (на паляванні); 21.03, 8.09, 9.11.1449; з 22.05.1451 на працягу некалькіх тыдняў;

19.05.1453 (10 тыдняў лячыўся пасля ранення падчас замаху на яго); 18.10.1453, 10–23.02.1455, 21.11–7.12.1456; 13.04.1458 ці 1473; 17.04.1459; 25–30.12.1463; 9.12.1464 – 8.01.1465; 14–16.04.1465 (Вялікдзень); канец 1465 – пачатак 1466; 31.10.1467; 8–14.09.1469; 25.12.1469, 1479, 9.12.1487 – 9.01.1488 (свята Божага нараджэння); 1470, 1471; пачатак 1473 (15 дзён быў у горадзе); красавік 1473; студзень 1475; сакавік 1484; на пачатку 1486; люты-сакавік 1490 (справы пра шлюб дачкі Ганны з паморскім князем Багуславам); 14.10.1491; 17.05–7.06.1492 (смерць Казіміра). Памёр у гродзенскім *Старым замку* ад вадзянкі/сухотаў.

Літ.: Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа. X-XXI стст. – Варшава: Demart, 2015. – С. 37–39, 40–41; Бутэвіч А. Паміж Княствам і Каронай. – Мінск: Выдавецкі дом "Звязда", 2013. – С. 285–289; Госцеў А.П., Швед В.В. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990 гг.). – Гродна: ГАА БФК, 1993. – С. 18–20, 166; Канановіч У. Вялікі князь Казімір // Пагоня. – 1990. – 5.06. – С. 7; Летапісы і хронікі Беларусі. Сярэднявечча і раньнемадэрны час, Мінск, 2010, с. 313, 524, 732; Семянчук А. Каралеўскі і велікакняжацкі побыт у Гародні ў канцы XIV – XVI ст. // Grodnae et orbi: гарадскія супольнасці і гарадское асяроддзе XIV – XX стст. / пад рэд. А. Радзюка і І. Галубовіча. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2018. – С. 6–21.

Казінскі Пётр – інжынер, архітэктар. У 1936 г. быў экспертам пры камісіі па ўдакладненні *герба горада*. У 1938 кіраваў пабудовай Дома дзіцяці па вул. І. Лялевеля.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 118.

Казлоўскі Ігнат Ігнатавіч (1846, г. Гродна – 9.11.1889) – беларускі і рускі мовазнавец-славіст. Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта. Вывучаў праблемы параўнальна-гістарычнага славянскага і ўсходнеславянскага мовазнаўства. Напісаў кнігу "Лёс народнай мовы ў Літве і на Жмудзі" (Вільня, 1870).

Літ.: Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: давед. / А.М. Пяткевіч. – Гродна: ГрДУ, 2000. – С. 122.

Казлоўскі Люцыян Вікенці-Дамінік Марцін (1854–?) – гродзенскі фотамайстар. З дваран Лідскага ў. З 1871 навучаўся фатаграфічнай справе ў *І. І. Садоўскага*. У 1885 атрымаў дазвол *губернскага праўлення* (№ 310) на адкрыццё асабістай фотамайстэрні ў Беластоку, але не здзейсніў гэтага, бо тады ж уступіў у таварыства з І. І. Садоўскім. І толькі ў 1891 вырашыў адкрыць асабістае фатаграфічнае прадпрыемства (пасведчанне № 5643 ад 22 мая 1891 г. ст. ст.).

Казлоўскі Ян Бабтыст Фелікс (10.07.1809, Гродна – 02.08.1859, Мулен, дэпартамент Алье, Францыя) – паўстанец 1830–31 гг., падпаручнік. Паводле іншай версіі нарадзіўся ў Седане дэп. Ардэнаў. За ўдзел у паўстанні рашэннем

гродзенскага губернскага следчага камітэта ад 20.08.1832 быў аднесены да 2 разраду злачынцаў. Пасля паражэння паўстання ў 1831 г. прыбыў у Францыю. Жыў у Парыжы, дзе з 1831 вывучаў медыцыну. 26.08.1832 атрымаў ступень бакалаўра літаратуры, а 31.08.1836 – дыплом доктара медыцыны. 25.08.1849 атрымаў французскае грамадзянства. Лекарскую практыку меў у дэп. Сэн-э-Уаз.

Крын. і літ.: : НГАБ, ф. 561, воп. 1, спр. 3, арк. 38; Гарбачова В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: Біяграфічны слоўнік. – Мінск, 2004, с. 163; Bielecki R. Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego. T. 2. – Warszawa, 1995, s. 350; Konarska B. Polskie drogi emigracji: Emigranci Polscy na studiach we Francji w latach 1832–1848. – Warszawa, 1986, s. 312.

Казюкі гродзенскія – кірмаш рамеснікаў, які адбываецца на плошчы і вуліцы Савецкай 4 сакавіка, у дзень смерці *Казаміра Святога*. Прадаюцца вырабы рамёстваў і рукадзелля, цацкі, лакальныя харчовыя прадукты. Падчас кірмашу адбываюцца выступленні фальклорных ансамбляў, гульні.

Калабук Генадзь Георгіевіч (17.09.1930 – ?) – брыгадзір мяса-тлушчавага цэха Гродзенскага мясакамбіната (1973–91). Герой Сацыялістычнай Працы (1974). Выбіраўся ў дэпутаты Гродзенскага гарадскога Савета. Узнагарджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Літ.: Книга Героев Гродненской области / сост. Ю.М. Алексей, О.М. Якубович. – Гродно: ГОУПП "Гродн. тип.", 2004. – С. 114.

Калацэй Мікалай Яфрэмавіч (8.01.1935, в. Антонаўка Мазырскага р-на Гомельскай вобл. – 2007). У 1953 г. скончыў школу № 67 г. Валгаграда. З лістапада 1953 па кастрычнік 1954 працаваў загадчыкам ізбы-чытальні ў в. Антонаўка. З 10.1954 па ліпень 1958 служыў у ваенна-марскім флоце. З 1958 па кастрычнік 1959 вучыўся ў Гродзенскім *педагагічным інстытуце*, затым перавёўся на завочнае ў Калінінградскі педінстытут і стаў працаваць сакратаром камітэта камсамола ў Гродзенскім медыцынскім інстытуце (1959–1960). З 1960 па 1964 – 1-ы сакратар Гродзенскага гарадскога камітэта камсамола, потым, да 1967 – загадчык арганізацыйным аддзелам Гродзенскага гарадскога камітэта камуністычнай партыі. З красавіка 1967 – намеснік, а з мая 1973 – старшыня *камітэта Гродзенскага выканаўчага гарадскога* (да 1982). З ліпеня 1982 – першы намеснік старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта. Узнагароджаны медалём "За доблесную працу" (1970), ордэнамі "Знак гонару" (1971), Працоўнага Чырвонага Сцяга (1974), Сяброўства народаў (1986), чатырьма Ганаровымі граматамі ВС БССР. Выбіраўся дэпутатам ВС БССР (1980), гарадскога і абласнога Саветаў.

Крыніца: асабістая размова аўтара з сям'ёй К.

Калегіум езуітаў, заснаваны па ініцыятыве вялікага князя літоўскага і караля польскага *Стэфана Баторыя*, які пачаваў выказваць ідэю яго стварэння ў 1584 г., а ў наступным завяшчаў для калегіума і касцёла 10 тыс. флорынаў.

Эпідэмія ў Трансільваніі (памерла 26 езуітаў Польскай правінцыі) і смерць Стэфана Баторыя ў 1586 стрымалі працэс арганізацыі калегіума. Езуіцкая місія з'явілася ў Гродне толькі ў 1623, дзякуючы гродзенскаму старосце Станіславу Касабуцкаму, які запісаў у тастаменце езуітам сваю вёску Сухая Баля. Першымі ў Горадні езуітамі былі Адам Калазембскі і Захары Скарульскі. Год яны жылі ў здымным памяшканні, пакуль каля *фары Вітаўта* ім не купіў дом капелан каралевіча Уладзіслава Ян Лясеўскі. Для службы айцы мелі капліцу і трох канфесіяналаў, а з 1625 – маёнтак Свіслач. У 1635 місія была павышаная да рэзідэнцыі, а ў 1647 сеймавая пастанова зацвердзіла "пляцы ў месце Гродзенскім, на якіх касцёл і калегіум іх павінен быць размешчаны". Калі ў 1656 г. Гродна занялі маскоўскія войскі, езуіты схаваліся ў вакольныя лясы, а іх будынкі былі спаленыя. Пасля вызвалення горада езуіты вярнуліся і ў 1662 аднавілі працу сваёй школы. 3.08.1664 рэзідэнцыя была ператвораная ў калегіум. Яго мураваныя будынкі ўзводзіліся ў 1677–1684, 1691 і 1722–1744 гг. Школа ніжэйшага ўзроўню, у якой выкладалі граматыку, была адкрытая ў 1625, школа паэтыкі – у 1633, рыторыкі – у 1645. Выкладчыкі былі з еўрапейскімі ўніверсітэцкімі дыпломамі. У 1770–1773 гг. тут вывучалі матэматыку, дыялектыку, лацінскую, грэчаскую, нямецкую і французскую мовы; былі танцы, плаванне, музыка, верхавая язда. У 17 ст. калегія магла ўтрымоўваць ад 7 да 20 чал., а ў 18 ст. – ад 26 да 38 чал. Пры калегіуме існавалі школьны *тэатр*, прыкладна з 1630 – музычная бурса, бібліятэка (у 1773 г. налічвала 2311 тамоў), з 1687 – *аптэка фарная*. Даследчык тэатральнай культуры Беларусі Г. І. Барышаў апублікаваў спіс пастановак школьнага тэатра ў 1712–1754 (20 назваў). У большасці гэта былі драмы, трагедыі і панегірыкі, выкананыя на латыні ці латыні ды польскай мове. Як правіла, яны выконваліся ў канцы навучальнага года.

Падчас сеймаў калегія здавала паслам і сенатарам памяшканні. У часы *вайны Паўночнай* тут бывалі Аўгуст II, Станіслаў Ляшчынскі, Пётр I, Карл XII. Пасля скасавання езуіцкага ордэна ў 1773 г. будынкі калегіума перайшлі да Камісіі нацыянальнай адукацыі, і тут былі размешчаныя ваяводскія школы. У часы Расійскай імперыі большасць будынкаў была занятая пад казённыя ўстановы (гл. *турма*). Беларускі даследчык У. Ляўшук выявіў асабісты склад гродзенскіх рэзідэнцыі і калегіума ў 1622–1700 гг. і прывёў біяграфічныя даведкі гродзенскіх езуітаў. Сярод іх былі народжаныя ў ваколіцах Гродна Пётр Алізаровіч і Ян Шыльпа, а таксама ў Гродзенскім пав. – Войцех Багушэвіч і браты Андрэй і Якуб Гладавіцкія.

Крын. і літ.: Барышев Г.И., Театральная культура Белоруссии XVIII в. – Мн., 1992, с. 265–266; Блинова Т.Б. Иезуиты в Беларуси. Роль иезуитов в организации образования и просвещения. – Гродно: ГрДУ, 2002; Лявшук В. Е. Организационные аспекты образовательной модели иезуитского коллегиума. – Гродно: ГрГУ им. Я. Купалы, 2010. – С. 136–164; Лявшук В. Иезуитский коллегиум в Гродно XVII-XVIII стст.: очерк эволюции забытого образовательного учреждения // Гарадзенскі палімпсест. – Горадня-Беласток, 2008. – С. 102–103; Ярашэвіч А.А., Бажэнава В.Д. Гродзенскі кафедральны касцёл Святога Францыска Ксаверыя. – Мн.: "Беларусь", 2005. – С. 1–5;

Jezuici w Grodnie 1622–1700: ludzie i dzieje kolegium = Езуиты в Гродно 1622–1700: люди и история коллегиума / W. Lawszuk. – Kraków, 2013. – S. 84–120, 129–266.

Календа Міхал – гарадзенскі ўраднік, радца ў 1712, 1716–1717, 1719, 1723–1724, 1727, 1730–1737, 1739, 1740, 1743–1744, бурмістр у 1715, 1718, 1720–1722, 1725–1726, 1728–1729, 1735, 1738, 1741, 1745 гг. Меў 2 дачкі, адна з іх была ў другім шлюбе за Т. Клявам. Валодаў у першай палове XIX ст. вялізнай сядзібай на *Рынку*, дзе ў 1729 г. знаходзіліся камяніца, аптэка, пякарня, шынок і іншыя гаспадарчыя пабудовы.

"Kalendarz gospodarski Grodzieński" ("Каляндар гаспадарчы гродзенскі"). Ён выходзіў у *друкарні каралеўскай/Тызенгаўза А.* з 1776 да 1800 г. К. Эстрайхер падае гаспадарскія календары на 1776–81, 1784, 1786–1788, а таксама "Kalendarz polityczny Grodzieński", які друкаваўся на 1782 і 1783 гады. Карысталіся папулярнасцю ў мясцовай шляхты і знаходзіліся ў многіх кнігазборах Гродзеншчыны. Прыводзіліся астранамічныя звесткі, друкаваліся сельска-гаспадарчыя парады, абвесткі пра тэхнічныя і агранамічныя навінкі.

Літ.: Estreicher K. Bibliografia Polska. T. XIX. – Kraków, 1903. – S. 21–22; Kowkiel Lilia. Prywatne księgozbiory na Grodzieńszczyźnie w pierwszej połowie XIX wieku. Kraków: WN Akademii Pedagogicznej, 2005. – S. 122–123.

С. 861

Каліноўскі Вікенці Канстанцін Сямёнавіч (мянушкі Макарэвіч, Хайноўскі, Хамут, Хамовіч, Хамуціус 1-ы, Чарноўскі, Чарноцкі, Ігнацы Вітажэнец; 2.02.1838, в. Мастаўляны Гродзенскай губ. – 22.03.1864, Вільня) – кіраўнік паўстання 1863–1864 гг. на Беларусі. Скончыў Свіслацкую прагімназію ў 1855 г. Паехаў у Маскоўскі ўніверсітэт з пасведчаннем аб беднасці. У канцы ліпеня 1856 разам з братам Віктарам пераехаў у Пецярбург. Падчас вучобы на юрыдычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта (тут працаваў Каліноўскі Бальтазар, мажліва, сваяк К.), быў звязаны праз Віктара і Б. Каліноўскага з гуртком З. Серакоўскага – Я. Дамброўскага (з 1858), разам з братам вывучаў гісторыю і права Беларусі і Літвы (працавалі з дакументамі і літаратурай у Публічнай бібліятэцы; мелі сваю бібліятэку на гэтую тэматыку), выконваў грамадскія абавязкі бібліятэкара ў студэнцкім таварыскім коле ("Агуле"), які аб'ядноўваў студэнтаў – выхадцаў з Польшчы, Літвы, Беларусі, Украіны. Пасля заканчэння універсітэта са ступенню кандыдата навук права (1860) вярнуўся ў Якушоўку Ваўкавыскага ўезда, дзе бацька на палову з жонкай (дзявочае прозвішча Лазарэвіч) меў маёнтак у 220 дзесяцін. Дапамагаў па гаспадарцы, але, паспрачаўшыся з мачахай, паехаў, па словах С. С. Каліноўскага, у Гродна шукаць службу. На пачатку 1861 падаў прашэнне аб прыёме на працу ў Вільні, але не быў прыняты. Стаў прафесійным рэвалюцыянерам: вясной 1861 пачаў ствараць Гродзенскую ваяводскую арганізацыю, праз год стала выходзіць "Мужыцкая праўда". Восенню 1861 увайшоў у склад Камітэта руху ў Вільні, а з кастрычніка 1862 па сакавік 1863 быў старшынёю Літоўскага правінцыяльнага камітэта (у гэты час перайшоў на нелегальнае становішча). Пасля

пераваротy "белых" падаў ад імя сваіх прыхільнікаў пратэст, у якім гаварылася, што яны пратэстуюць супраць "перадачы кіраўніцтва ў рукі контррэвалюцыянераў" і "скідваюць з сябе ўсю адказнасць перад будучыняй за ўсе памылкі і за ўсе страты і няшчасці, якія прынясе насупраць духу і тэндэнцыі паўстання кіраўніцтва Літоўскай справай". "Белыя" прыцягнулі Каліноўскага да суду, але потым спынілі следства, прымірыліся з ім. Каліноўскі часова быў памочнікам начальніка Вільні А. Аскеркі, а ў канцы сакавіка 1863 г. атрымаў мандат на пасаду ўрадавага камісара Гродзенскага ваяводства (пад прозвішчам Чарнецкі). Падтрымліваў сувязь з аднадумцамі ў Вільні (Малахоўскім, Віслаўхам), часам прыязджаў да іх. Каля 21.06.1863 стаў кіраўніком аддзялення ўнутраных спраў Аддзела, які кіраваў правінцыямі Літвы. На пачатку верасня атрымаў паўнамоцтвы ўрадавага камісара ў Літве і Беларусі. Выступаў за падрыхтоўку народнай (сялянскай) рэвалюцыі, за раздачу ўсёй зямлі сялянам, за самастойнасць Беларусі. Як кіраўнік "чырвоных" на Літве і Беларусі, праяўляў сепаратызм у адносінах да варшаўскага Цэнтральнага камітэта, бараніў незалежнасць гістарычнай Літвы ад Варшавы. Падтрымліваў сумесную барацьбу палякаў, літоўцаў і беларусаў супраць расійскага самаўладдзя. Царскія ўлады пачалі пошук К. пасля раскідання "Мужыцкай праўды" у в. Шайнякі ў кастрычніку 1862 г. Быў затрыманы з-за здрады В. Парфіяновіча 9 лютага 1864 у казённым гімназічным будынку ў Вільні, дзе жыў пад прозвішчам Вітажэнец. Зняволены ў будынку былога Дамініканскага кляштара. Супрацоўнік Мураўёва А. Масолаў пісаў, што К. першы дзень "толькі кусаў губы і без ахвоты адказваў на пытанні", пазней ён напісаў на добрай рускай мове "цікавыя разважанні аб адносінах рускай улады да польскага насельніцтва заходняга краю, у якіх між іншым выказаў думку аб хісткасці сучасных урадавых дзеянняў і поўную агіду да рускіх чыноўнікаў, якія прыбылі ў край". У паказаннях следчым гаварыў толькі пра сябе, а калі называў прозвішчы іншых паўстанцаў, дык толькі тыя, пра якіх ведаў, што забітыя ці выехалі ў эміграцыю. Выдавец газет на польскай мове "Голас з Літвы", "Харугва свабоды" (орган Літоўскага правінцыйнага камітэта), аўтар "Пісьмаў з-пад шыбеніцы", верша "Марысенька, чарнаброва галубка мая". Яму прыпісваюць аўтарства звароту "Да мужыкоў зямлі Польскай". 14 сакавіка 1864 г. прыгавораны да расстрэлу, а 16.03 рашэннем Палявога аўдытарыята – да павешання. Наступнага дня Мураўёў зацвердзіў прыгавор. 22 сакавіка К. быў павешаны на гандлёвай плошчы Лукішкі ў Вільні. Спачатку быў пахаваны на месцы смяротнага пакарання, а пазней цела перанеслі ў крэпасць на гары Гедыміна.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 336–337; с. 3, а. 46с. 6, а. 18–19, 26, 27, 29; Кісялёў Г. Героі і музы: Гісторыка-літаратурныя нарысы. – Мн.: Маст. літаратура, 1982. – С. 102–104, 110, 123, 128; Кісялёў Г. З думаю… – С. 146–147, 180–181; Лушчыцкі І.Н. Нарысы па гісторыі грамадска-палітычнай і філасофскай думкі ў Беларусі ў другой палове XIX веку. – Мн., 1958. – С. 171–249; Мосолов А.Н. Виленские очерки. 1863–1865 (Муравьёвское время). – СПб., 1898. – С. 125–126); Нікалаеў М. Браты Каліноўскія і Публічная бібліятэка // ЛіМ. – 1985. – 1.03. – С. 14; Ратч. Сведения… – С. 104, 182; Пантелеев Л.Ф. Воспоминания. – М., 1958. – С. 190, 209,

210, 817; Смирнов А.Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. – М.: Изд-во АН СССР, 1963. – С. 171–172, 375; Шалькевич В. Библиотека братьев Калиновских // Нёман. – 1997. – № 7. – С. 214; Шалкевіч В. Вікенці Канстанцін Каліноўскі // Славутыя імёны Бацькаўшчыны: Зборнік. Вып. 2. – Мн.: БФК, 2003. – С. 209–211; Groniowski K. Kalinowski Baltazar // Polski Słownik biograficzny. T. XI. – Wrocław, Warszawa, Kraków.– S. 454; J. Ochmanski. Historia Litwy. – Wrocław, Warszawa, Kraków, 1967. – С. 175–180; Rostworowski E. Kalinowski Wincenty Konstanty // Polski Słownik biograficzny. T. XI. – Wrocław, Warszawa, Kraków.– S. 460–462.

Каліноўскі Віктар Отан Сямёнавіч (21.04.1833, в. Мастаўляны – 6.11.1862, фальварак Якушоўка Ваўкавыскага ў.) – брат Вікенція Канстанціна Каліноўскага. Скончыў гродзенскую гімназію ў 1852 г., вучыўся ў Маскоўскім, а з 1856 – у Пецярбургскім універсітэтах. Праз Віктара *В. К. Каліноўскі* быў звязаны з гуртком З. Серакоўскага – Я. Дамброўскага (з 1858), разам з братам вывучаў гісторыю і права Беларусі і Літвы. Браты Каліноўскія працавалі з дакументамі і літаратурай у Публічнай бібліятэцы Санкт-Пецярбурга; мелі сваю бібліятэку і збор рукапісаў на гэтую тэматыку. Віктар Каліноўскі выконваў у Публічнай бібліятэцы даручэнні Віленскай Археаграфічнай камісіі: выяўляў і капіяваў розныя рукапісы, якія тычыліся гісторыі Беларусі і Літвы, вёў самастойныя даследаванні па гісторыі ВКЛ, сялянскіх рухах у Беларусі і Украіне, напісаў кнігу "Уманская разня" пра паўстанне украінскіх сялян у 1768. Віктару Каліноўскаму не ўдалося паўдзельнічаць у паўстанні 1863–1864 гг. – перашкодзіла смерць ад сухотаў 6.11.1862. Пахаваны быў 8.11.1862 настаяцелем свіслацкага касцёла на "публічных прыходскіх могілках".

Літ.: Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг. : (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017, 2017. – С. 54–57.

Каліноўскі Сямён Стэфан (Сямён Стэфанавіч) (1795, Рэпля, Ваўкавыскі ў. – 1871) – бацька В. О. і В. К. *Каліноўскіх*. На допыце ў следчай камісіі 24.04.1864 (ст. стыль) паказаў, што католік, мае выхаванне хатняе, у дзяржаўнай службе не быў, жанаты 2 разы (ад першай жонкі Рыбінскай мае 12 дзяцей, якія ўсе памерлі, ад другой Лазарэвіч – 5 дзяцей). К. меў палатняную фабрыку ў сваім фальварку Якушоўка ў Ваўкавыскім у. (цяпер Свіслацкі р-н), куды ў 1861 прыехаў пасля вучобы сын Вікенці Канстанцін. У красавіку 1864 г. быў арыштаваны, знаходзіўся пад следствам у Гродне, у снежні вызвалены пад строгі нагляд паліцыі.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне,ф. 1, воп. 20, с. 679, а. 120–121; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 347–348; с. 36, а. 22; Дакументы расказваюць: Жыццё і дзейнасць В.-К. Каліноўскага на Гродзеншчыне/ падрыхтаваны да друку В.В. Шведам і М.М. Сачок // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 10. – Гродна, 2004, с. 47–48, 76–80.

Калодзежы – пасля *Нёмана* і *Гараднічанкі* важная крыніца забеспячэння вадой насельніцтва Гродна ў Новым часе. Знаходзіліся на мяшчанскіх і кляштарных падворках (1591, Калажанскім), на пляцах юрыдык, у яўрэйскіх кварталах, былі і агульнагарадскія. Галоўны **гарадскі** знаходзіўся на *Рынку*.

Першая згадка пра яго паходзіць з 1541 г., калі каралева Бона загадала гарадзенцам, каб студня "абавязкова ачышчанай была і каб вада (…) з яе ў Рынку праведзеная была". У канцы XVIII ст. майстрам Ёганам Прэйсігам быў выкапаны новы К., які знаходзіўся паміж *ратушай і Фарай Вітаўта*. Гэта бачна на *планах горада* 1793 і 1795.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 49–50; Гардзееў Ю. Гаспадарчае жыццё і камунальная гаспадарка // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 119; Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 303.

Каложа

1) Другая назва *царквы Барыса і Глеба*. Гродзенскі гісторык архітэктуры І. Трусаў сцвярджае, што мясцовасць, на якой стаіць царква, насіла назву "Коложанъ" ад тэрміна "коложанъ, коложенъ, колозенъ" – месца, дзе б'юць шматлікія крыніцы. Апошнія шанаваліся як паганцамі, так і хрысціянамі, і ў такіх месцах будаваліся храмы. Мы знайшлі ў "Виленском Вестнике" за 1874 г. вызначэнне "Каложа", як "шырокая паласа зямлі паміж рэкамі Нёман і Заходні Буг". Легенда пра пасяленне на беразе *Нёмана* калажан, жыхароў з прыгарада Пскова, вялікім князем літоўскім *Вітаўтам* у 1405 г. не пацвярджаецца дакументамі. П. Дзікаў сцвярджае, што ў Пскоўскай губ. існуе возера Каложа і рэчка Каложыца, на беразе якой знаходзіцца стары горад Каложэ, зруйнаваны Вітаўтам.

2) Па словах архімандрыта Іасафата/Іосіфа Кастравіцкага, Каложай называлі манастыр пры *царкве Барыса і Глеба*.

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 92; Диков П. Материалы для истории Коложской церкви в г. Гродно; Коложа// Виленский Вестник. – 1874. – № 17, 18, 19; Трусов И.Г. Православные храмы Гродно. – Минск: Мэджик Бук, 2008; Трусов И. Борисо-Глебская Коложская Церковь. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011.

Калонія настаўніцкая, узнікла ў міжваенны час у раёне сённяшніх вуліц В. Чкалава і П. Асіпенкі (тады польскіх лётчыкаў С. Вігуры і Ф. Жвіркі). У той час гэта быў раён, дзе знаходзіліся гліняныя кар'еры, цагляны завод (адсюль вул. Цагляная), гарадская школа № 8 (у савецкі час спец. школа № 4 па вул. Лермантава). У раёне пабудавалі серыю драўляных дамоў у архітэктурным стылі канструктывізму. Кожны дом займала адна настаўніцкая сям'я. Сярод іх вядомыя наступныя: *П. Багуцкі*, Вішнеўскія, Вілантовічы, настаўніца польскай мовы Краеўская, матэматык Бранеўскі, настаўнік музыкі Будрэвіч, дырэктар школы Вавюрскі.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 257–260.

Кальбэ/Кольбэ Максіміліян Марыя, сапраўд. Кольбэ Раймунд (1894, Здуньска Воля – 1941, Асвенцім, Польшча), нарадзіўся ў сям'і патомкаў чэшскіх ткачоў, якія перасяліліся ў Польшчу: Юліюша Кольбэ і Марыянны Дамброўскай. Хлопчыку з'явілася Марыя і прапанавала выбраць карону – белую альбо чырвоную. Раймунд выбраў дзве – карону чыстай манаскай любові і карону мучаніка. Вучыўся ў Львоўскай духоўнай семінарыі, далей быў студэнтам і дактарантам філасофіі і сацыялогіі ў Рыме. Быў ініцыятарам стварэння місійнага цэнтра, выдавецтва і друкарні ў Непакалянаве каля Варшавы, а таксама Міліцыі Непакалянай, задачай якой было распаўсюджванне культа Найсвяцейшай Марыі Панны Непакаляна (Нявінна) Зачаўшай. У кастрычніку 1922–1937 гг. быў капланам у гродзенскім *францішканскім кляштары*, выдаўцом часопіса "*Rycerz Niepokalanej*" (органа Міліцыі Непакалянай). Як святар, Кольбэ выконваў абавязкі ў касцёле і прылеглых вёсках: выступаў з казаннямі, спавядаў, наведваў хворых. Сам хварэў на сухоты. Пасля Гродна быў капланам у Непакалянаве, дзе працягваў працаваць над часопісам. Быў місіянерам у Японіі (Нагасакі) да 1936 г. У 1939 арыштаваны *гестапа*, быў вязнем у Ламбіновіцах, Астшэшаве, варшаўскага Павяка і канцлагера ў Асвенціме, дзе добраахвотна аддаў сваё жыццё, каб выратаваць іншага (бацьку сям'і Ф. Гаёўнічка). Кананізаваны рымскім папам Янам Паўлам II 10.10.1982. З'яўляецца святым апекуном нарказалежных, журналістаў, палітычных вязняў, рухаў у падтрымку жыцця. У *касцёле францішканскім* ёсць памятная дошка святога.

Літ.: Maxence P., Maksymilian Kolbe. Kapłan, dziennikarz, męczennik, tłum. J.M. Kłoczowski. – Warszawa, 2013; Sotowski P., Opowieść o św. Maksymilianie. – Niepokalanów, 2011; Terlikowski P., Maksymilian M. Kolbe. Biografia świętego męczennika. – Kraków: Esprit sp. Z. O.O., 2017. – S. 243–282; Orłowska B. Zwyczaje, obrzędy i tradycje w Polsce. Mały słownik. Wyd. II. – Warszawa: Verbinum, 2001. – S. 109–110.

Калянкевіч Уладзіслаў Іванавіч (25.03.1864 – 2.02.1938) – доктар медыцыны, 9.02.1919 быў выбраны прадстаўніком Гродна на ўстаноўчы сейм у Варшаве. З'яўляўся старшынёй арганізацыйнага камітэта ХДС Гродна і Гродзенскай зямлі (11.1918). Паходзіў з сям'і землеўладальніка Ваўкавыскага пав. Скончыў гродзенскую *гімназію* (1883), Дэрпцкі ўніверсітэт (1892). Сябра моладзевых польскіх нелегальных арганізацый, карпарацыі "Палонія". Працаваў у Вене, у Самары падчас эпідэміі халеры, старшым лекарам на Байкальскай чыгунцы (1889–1905). З 1905 займаўся ў Гродне прыватнай практыкай па хірургіі, уралогіі, скураных хваробах. Жанаты, жыў на вул. Гараднічанскай, 18. Удзельнічаў у *вайне Першай сусветнай,* з якой вярнуўся ў Гродна (1918). У 1919 стаў радным Гродзенскай *гарадской рады*. У 1921 – старшыня Гродзенскага народна-нацыянальнага саюза. Пахаваны на могілках каталіцкіх, сектар А 27 а.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 119; Nowe życie. – 18.12.1918. – № 1, 1919. – № 8.

Калясінскі Бальтазар (1818–?) – удзельнік рэвалюцыйнага руху. Са шляхты Віленскай губ. Скончыў дваранскі пансіён. Працаваў пісарам камісіі для рэвізіі спраў гродзенскага *дваранскага дэпутацкага сходу*, затым – памочнікам кантралёра і кантралёрам (1841, калежскі рэгістратар) у *казённай палаце*. Пераведзены ў Лідскую дваранскую апеку (чын губернскі сакратар). У лютым 1848 па справе Рэра (гл. *Гофмайстар*) быў пазбаўлены чыноў і дваранскага стану, асланы ў Арэнбургскую губ., куды дабраўся ў снежні 1848. Служыў у в 5-м лінейным батальёне і быў удзельнікам штурма Ак-Мячэці. Быў паранены, за мужнасць адноўлены ў чыне калежскага рэгістратара. Хутка стаў чыноўнікам канцылярыі Арэнбургскай губ. Знаходзіўся пад паліцэйскім наглядам. Дазвол вярнуцца на радзіму атрымаў у лютым 1857. Быў блізка знаёмым з Т. Р. Шаўчэнкам.

"Камісарскі вопіс г. Гродна" 1680 г., згодна з якім у Гродне налічваліся 574 дамы (469 – халупы, 201 з якіх належаць агароднікам і 373 – іншым немаёмасным мяшчанам). З данясення каралеўскіх эмісараў: "мещане, за исключением лишь весьма немногих из магистрата, пренебрегли благосостоянием города и живут не в черте его, а по своим фольваркам, не занимаются торговлей и купечеством... а исключительно хлебопашеством... вследствие чего город постепенно клонится к упадку".

Камісія адміністрацыйная Гродзенскага дэпартамента, адкрытая для горада і павета (дыстрыкта) 25 ліпеня 1812 г. прадстаўніком Камісіі часовага ўрада Вялікага Княства Літоўскага, князем Антоніем Гедройцам. У яе складзе былі: Міхал Вітаноўскі (сакратар), Марцэлі Пілецкі (секцыя спраў падпрэфектаральных), Фелікс Імбр (секцыя спраў дэпартаментальных), Шастоўскі (справы муніцыпальныя).

Літ.: Швед В., Данскіх С. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. – Мін: ГрДУ імя Я. Купалы, 2006. – С. 91–105; Гардзееў Ю. Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі ў Вялікім Княстве Літоўскім у часы Чатырохгадовага сойма (1789–1792) / Ю. Гардзееў. – Смаленск, 2014.

Камісія добрага парадку, створаная паводле рашэння сейма Рэчы Паспалітай 1768 г. у буйных гарадах і мястэчках, у тым ліку і ў Гродне з 19.04.1776. Камісія займалася ўпарадкаваннем горада, паляпшэннем яго фінансавага і эканамічнага становішча. У функцыі К. уваходзілі пытанні захоўвання і сістэматызацыі архіва, складанне інвентароў і планаў, супрацьпажарная бяспека, будаўніцтва, мерапрыемствы па санітарыі і гігіене, рэвізія шпіталяў. Адным з вынікаў працы К. стала адраджэнне ў 1784 г. гарадской ратушы.

Літ.: Gordzejew J. Próby reform miejskich w Grodnie w okresie Oświecenia // Rocznik Biblioteki Naukowej PAU i PAN w Krakowie. – Kraków, 2001.

Камісія парадкавая цывільна-вайсковая – орган гродзенскай выканаўчай улады ў 1789–1792 гг., створаны рашэннем Чатырохгадовага сейма.

З 1790 – пастаянны, з 1791 – падпарадкаваны Камісіі паліцыі абодвух народаў. Частка камісараў камісіі выбіралася з неасуджанай і аселай шляхты на сеймiках на 2 гады. Без выбараў у камісію ўваходзілі сенатары, павятовыя маршалкі, цівуны, гродавыя *старасты*, харужыя. Камісія мела вознага (судовага выканаўцу) і адваката. Паводле дадзеных ад 28.01.1790 у камісію ўваходзілі наступныя прадстаўнікі мясцовай шляхты – зямельных уладальнікаў: літоўскі лоўчы Ф. Боўфал (старшыня), гродзенскі харужы Я. Ігнатовіч, гродзенскі земскі суддзя Т. Александровіч, гродзенскі падчашы Я. Мароз, гродзенскі лоўчы Т. Вольмер, гродзенскі стражнік Г. Ваўкавыцкі, падпалкоўнік М. Пянтэльскі, Ю. Сезянеўскі, гродзенскі падкаморы Ф. Юндзіл, гродзенскія ротмістры Я. Абуховіч, З. Дабжылеўскі, М. Бжазоўскі. Дакумент ад 23.03.1790 называе іншыя прозвішчы: М. Ю. Данкевіч (старшыня), гродзенскі земскі рэгент А. Эйсмант, Ю. Дзяконскі, К. Крывіцкі. У лютым 1791 старшынёй К. быў Т. Александровіч. Пасяджэнні адбываліся штодня, акрамя святаў. Займаліся гаспадаркай (земляробства, рамёствы, гандаль, шляхі зносін, падаткі), адукацыяй (парафіяльныя школы), вайсковымі справамі (забеспячэнне рэкрутамі, харчаваннем), судаводствам у якасці суда 1-й інстанцыі (маёмасныя справы і адміністр. парушэнні). Скасаваныя 22.09.1792 Таргавіцкай канфедэрацыяй. Адноўленыя гродзенскім *сеймам Рэчы Паспалітай* 1793, але не дзейнічалі. Адрадзіліся падчас *паўстання 1794 г.*

Літ.: Гардзееў Ю. Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі ў Вялікім Княстве Літоўскім у часы Чатырохгадовага сойма (1789–1792). – Смаленск: Інбелкульт, 2014.

Камісія скарбовая ВКЛ – эканамічная рада літоўскага скарбу, створаная рашэннем канвакацыйнага сейма Рэчы Паспалітай 1764 г. з мэтаю "як найлепей назаўсёды зарганізаваць парадак Літоўскага скарбу і памножыць яго прыбыткі праз увядзенне лепшага кіравання і гаспадарання на карысць Рэчы Паспалітай". У склад К. с. увайшлі падскарбі (старшыня камісіі), 2 асобы з сената і 7 – са шляхты, выбранай на сейме. Яны павінны былі займацца кантролем за фінансамі, падаткамі, наглядам за гандлем, назіраць за эканамічным станам у краіне, ажыццяўляць судовыя функцыі па фінансавых справах, прызначаць і звальняць скарбовых афіцыялістаў. К. с. мела паседжанні ў палацы каралеўскім *замка Старога* ў Гродне (з 1.01.1765). Першым пададзеным у К. с. праектам быў праект каморніка Віленскага ваяводства Л. Кройца аб аграрных пераўтварэннях у Берасцейскай і Кобрынскай каралеўскіх эканоміях: адмена прыгонніцкіх павіннасцяў і пераход на чынш. Праект не быў прыняты, а генеральны адміністратар усіх каралеўскіх эканоміяў у ВКЛ *Тызенгаўз А.* ажыццявіў сваю рэформу, стрыжнем якой стала паўсюднае ўвядзенне фальваркаў. У 1792–93 спец. дэлегацыя рэвізораў Таргавіцкай канфедэрацыі зрабіла праверку дзейнасці К. с. ВКЛ за 1786–92 і аціаніла яе станоўча, хаця былі і заўвагі: парушэнні ў выкарыстанні дарожных фондаў, грошай з квітавых і візавых збораў, фонда ад *пажараў*, крытыкаваўся продаж належнай камісіі нерухомай маёмасці і інш. Падчас рэвізіі сябрамі К. с. былі: вялікі падскарбі ВКЛ

Л. Тышкевіч, літоўскі надворны падскарбі А. Дзяконскі, камісары А. Валовіч, С. Ельскі, Корсак, Л. Сабалеўскі, Гараін.

Літ.: Кітурка І. Асветніцтва і аграрныя рэформы ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XVIII ст. // Arche. – 2011. – n. 6. – С. 213–216; Шмігельскіце-Стукене Р. Праверка дзейнасці Скарбовай камісіі ВКЛ у 1792–1793 гг. // Arche. – 2011. – n. 6. – С. 231–242; Kościałkowski S. Z dziejów Komisji Skarbowej Litewskiej w początkach panowania Stanisława Augusta (1765–1780) // Ateneum Wileńskie. – 1924. – T. 7–8/ – S. 371–408.

Камітэт Беларускі нацыянальны

1) Гродзенскі Беларускі нацыянальны камітэт (БНК), прадстаўнічы орган Віленскай беларускай рады, мясцовы орган прадстаўніцтва беларусаў у Гродне, створаны ў канцы 1918 г. У кіраўніцтва ўваходзілі настаўнік *школы беларускай* Аляксандр *Грыкоўскі,* настаўнік Андрэй Якубецкі, былы сябра *гуртка Гарадзенскага беларускай моладзі* Янка Натусевіч (старшыня да чэрвеня 1920 г.), і, магчыма, Зміцер Качан. Прынялі актыўны ўдзел у першым Гарадзенскім губернскім беларускім з'ездзе, дзе выступілі за беларускую мову ў школах, за стварэнне незалежнай беларускай дзяржавы, за еднасць беларусаў каталікаў і праваслаўных. 15–16.12.1918 г. камітэт правёў у зале афіцэрскага казіно ўласны з'езд (сход), на якім прысутнічалі "дзяржаўныя мужы БНР" – *В. Ластоўскі*, П. Крэчэўскі, А. Смоліч, Л. Заяц, К. Цярэшчанка, гродзенскія дзеячы *А. і П. Аляксюкі*. Дэлегаты прыехалі не толькі з Гарадзенскага пав., але і з Беластоцкага, Сакольскага, Ваўкавыскага. У прынятай рэзалюцыі гаварылася, што "беларускі народ павінен быць цэлым і ні ад кога не залежным. Сваіх правоў ён будзе дабівацца разам з суседнімі дэмакратычнымі народамі, а перад усім з народам літоўскім". Замест Губернскай рады была зарганізаваная Павятовая Сялянская Рада і абраны арганізацыйны камітэт па скліканні Краявога Беларускага з'езду Гарадзеншчыны. З чэрвеня 1920 г. старшынёй стаў *Сяргей Баран.* У гэты час пры БНК існавалі адміністратыўны, арганізацыйны, дабрачынны аддзелы і юрыдычнае бюро. На Гарадзеншчыне дзейнічалі дзевяць культурна-асветніцкіх гурткоў і інструктары Камітэту – Мялешка Ю., Якубецкі П., Сурба і Пасэвіч Я. 1.11.1920 Гарадзенскі БНК заявіў афіцыйны пратэст супраць Рыжскай дамовы. За беларускімі дзеячамі сачылі, у камітэт пранікалі шпіёны. У выніку ў студзені 1921 загадам *старасты Рагалевіча К.* дзейнасць БНК была спыненая, і ён перайшоў на нелегальнае становішча.

Літ.: Чарнякевіч А. З гісторыі Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту. Канец 1918 – пачатак 1921 г. // Гарадзенскі палімпсест. XII-XX стст. Матэрыялы міжн. канф. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Горадня-Беласток: ІГДБ (ЕГУ). – 2008. – С. 151–172; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў / А. Чарнякевіч. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 23–24, 31, 65, 68–73, 132, 145, 146.

2) БНК створаны ў ліпені 1941 для прадстаўніцтва 45% беларусаў Гродна і 90% вясковага насельніцтва. Колькасць і дзейнасць нацыянальных беларускіх актывістаў была нязначнай. Яны патрабавалі ўдзелу ў сферы народнай

(этнічнай) культуры: арганізацыя беларускіх школаў, сірацінцаў, спажывецкіх таварыстваў. Патрабаванняў стварыць структуры беларускай дзяржаўнасці не было. Немцы спачатку думалі выкарыстаць чальцоў К. у сваіх мэтах, але пазней зразумелі, што гэта прывядзе толькі да канфліктаў беларусаў з палякамі. Праз пару месяцаў пасля заснавання Камітэт быў распушчаны.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 253–254.

Камітэт выканаўчы гарадскі – орган выканаўчай улады Гродна. Размяшчаецца ў будынку, пабудаваным у 1971 для гарадскога камітэта КПБ (архітэктар *Давыдзёнак У.*). Структурныя падраздзяленні: 7 упраўленняў (архітэктуры і горадабудаўніцтва, гандлю і паслуг, эканомікі; упраўленне справамі; па працы, занятасці і сацыяльнай абароне; фінансавае; землеўладкавальнае) і 8 аддзелаў (арганізацыйна-кадравай работы; жыллёва-камунальнай гаспадаркі; ідэалагічнай працы і па справах моладзі; культуры; адукацыі; спорту і турызму; будаўніцтва; юрыдычны; ЗАГС.

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 59; https://be.wikipedia.org/wiki. Доступ 08.01.2022.

Камітэт гарадскі 1915 г., створаны ў Гродне пасля таго, як горад пакінулі расейскія ўлады. У склад увайшлі 6 палякаў і 6 яўрэяў: землеўладальнік Е. фон Класоўскі, ксёндз *Курыловіч А.*, уладальнік млына ў Ласосне яўрэй Касоўскі, яўрэі Талочка і Ёфе. Кіраўніком выбралі князя Сапегу, які падзяліў камітэт на 6 аддзелаў/секцый: "Секцыя 1 займалася агульным кіраваннем і фінансамі, секцыя 2 – гарадской гаспадаркай, секцыя 3 – забеспячэннем прадуктамі харчавання, секцыя 4 – санітарнай справай, секцыя 5 – дабрачыннасцю, секцыя 6 – школьнай адукацыяй". Як паведамляў К. Кламрот, кожная з іх належала "адначасова да поля дзейнасці альбо обер-бургамістра, альбо аднаго з нямецкіх адміністратараў".

Літ.: Горадня 1916 г. на старонках Дзённіка ротмістра Курта Кламрота // Горад святога Губерта: зборнік краязнаўчых артыкулаў. Выпуск 6 (2012). – Горадня: б.в., 2012. – С. 51, 59–60.

Камітэт гродзенскі акруговы КПЗБ (Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі), створаны на пачатку 1924 г. Узначаліў рэвалюцыйную барацьбу ў Гродзенскім, Саколкаўскім, Шчучынскім і Сувалкаўскім пав. Кіраўнікамі К. былі Е. Гальдштэйн (Карлоўскі), Ф. Канцэвіч, А. Радзевіч. Сярод спраў К.: дзейнасць падпольнай друкарні (1926–38) на кватэры *Пата Іллі* (вул. Ласаснянская, 48/Сав. пагранічнікаў); стварэнне адзіных прафсаюзаў (1926–27); падтрымка выступленняў рабочых супраць прадпрымальнікаў, фашызацыі грамадскага жыцця; удзел у выбарах органаў мясцовага самакіравання і байкот выбараў у сейм і сенат у 1935; дзеянні па стварэнні адзінага пралетарскага

і антыфашысцкага фронту; кіраванне рухам народных мас у абарону *Прыцыцкага С.* Частай акцыяй было развешванне ў Горадні чырвоных "камуністычных сцягоў". Напрыклад, летам 1927 на тэатральнай плошчы і Пагулянцы; напярэдадні 1 мая 1929 на вул. Гараднічанскай. У 1938 КПЗБ была распушчаная Камуністычным Інтэрнацыяналам.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк / Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 94, 96, 98, 103–106; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў / А. Чарнякевіч. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 122–123.

Камітэт гродзенскі губернскі рэвалюцыйны, створаны ў Слоніме 4 лютага 1919 г. пастановаю Прэзідыума Беларускага часовага рабоча-сялянскага ўраду (старшыня С. І. Берсан). 25 лютага скасаваны, бо Чырвоная армія пакінула Гродзенскую губ.

Камітэт гродзенскі губернскі статыстычны, створаны 8.08.1835 адным з першых у Расійскай імперыі, згодна з "Палажэннем пра стварэнне губернскіх і абласных статыстычных камітэтаў" ад 20.12.1834. У склад камітэта ўваходзілі "непременные" (абавязковыя) сябры: *губернатар* (старшыня), віцэ-губернатар, гарадскі галава; кіраўнікі *казённай палаты,* упраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцяў, Віленскай акругі шляхоў зносін; губернскі пракурор, губернскі прадвадзіцель дваранства, ганаровы апякун *гімназіі*, дырэктары гімназіі і народных вучылішч, губернскі вучэбны інспектар, інспектар лекарскай ўправы, кіраўнік удзельнай канторы і сябра духоўнай кансісторыі. У склад камітэта ўваходзілі таксама дзеячы асветы, адукацыі, культуры: *Дзікаў П. М., Арлоўскі Я. Ф.*, Стаўровіч Ф. У., Авенарыус М. П., Аношка Р. І., Паеўскі Л. С., Ярушэвіч А., Дзікоўскі М. Р.; у ролі ганаровых сяброў ГГСК былі П. В. *Баброўскі*, М. В. Каяловіч.

З уездаў матэрыялы статыстычна-эканамічнага характару павінныя былі дастаўляць сябры-карэспандэнты з ліку памешчыкаў і дзяржаўных чыноўнікаў. Усе супрацоўнікі камітэта працавалі без аплаты. Цэнтральным органам для камітэта было статыстычнае аддзяленне Міністэрства ўнутраных спраў, ператворанае ў 1850-я гады ў Цэнтральны статыстычны камітэт. У 1860 выйшла новае "Палажэнне", згодна з якім склад камітэта быў зменены – у яго ўвайшлі абавязковыя (асобы па пасадзе, у тым ліку гарадскі галава=*прэзідэнт горада*), сапраўдныя (з мясцовых жыхароў), ганаровыя сябры і сакратар. Камітэтам усталявалі стабільнае фінансаванне, сакратар стаў атрымоўваць рэгулярную гадавую аплату. Галоўнай задачай камітэта было збіранне эканамічна-статыстычных матэрыялаў па эканоміцы, адукацыі і ахове здароўя для справаздачнасці *губернатара*, распаўсюджванне анкет цэнтральных устаноў па гісторыі, этнаграфіі, археалогіі, па зборы звестак пра помнікі старажытнасці свайго рэгіёну, выданне "*Обзоров Гродненской губернии*". Да "неабавязковых" заняткаў камітэта адносіліся апісанні горада і губерні, выданне "*Памятных книжек Гродненской губернии*" і Адрас-календароў, збор матэрыялаў для

неафіцыйнай часткі *"Гродненских губернских ведомостей"*. Старшынёй ГГСК быў заўсёды губернатар, а сакратаром – спецыяльна прызначаная асоба. З апошніх вядомыя: Любавіцкі А. В. (1857–59, 1961), Вярцінскі К. В. (1860), Харламповіч (1862), Лапушынскі Я. А. (1864–69), Арлоў П. А. (1870–72), Дымчэвіч Ц. П. (1873–74), Ушакоў В. С. (1875–77), Дзікаў П. М. (1877–88), Штрытар А. Э. (1888–93), Горбаў А. М. (1893–94), Лачынаў У. Е. (1895–98), Шэнберг В. К. (1898–1901), Шыпін М. П. (1902), Мамокаў М. В. (1903), вакансія (1903), фон Бадэр В. А. (1905–06), в. а. сакратара Белаблоцкі І. Л., Кон А. А., Вінаградаў А. А. (1907), Івашынцаў Д. В. (в. а. у 1908–15).

Літ.: Грядовкина И.В., Структура и содержательный аспект Памятных книжек Гродненской губернии // Docplayer.ru/45079196-Struktura-i-soderzatelny-aspekt-Pamiatnych-knizek-Grodnenskoj-gubernii html.; Бердинский В. Уездные историки: Руская провинциальная историография. – М.: Новое литературное обозрение, 2003. – С. 46–54; Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 178–180.

Камітэт Гродзенскі павятовы рэвалюцыйны, створаны 20 ліпеня 1920 г. Старшынёй спачатку стаў Лігер, а з 4 жніўня – *А. С. Славінскі*, кіраўнік палітычнага аддзела 57-й стралковай дывізіі Чырвонай арміі, намеснік – беларус М. Кунда, сакратар – Янкоўскі. Размяшчаўся ў сённяшнім старым будынку абласнога выканкама *(дом віцэ-губернатара Максімовіча)*. На паседжанні 24 ліпеня былі створаныя наступныя аддзелы ВРК: упраўлення (загадчык Янкоўскі) і часова ён жа зямельны, харчавання (Валаў), працы (Абрамовіч), фінансавы (часова ён жа), народнай адукацыі (Орман), культурно-асветніцкай працы (В. Курбскі); 27.07. былі прызначаныя кіраўнікі аддзелаў: сацыяльнага забеспячэння – Мекэс, і юрыдычнага (С. Баран). Для працы ў агранамічным пададдзеле гродзенскага зямельнага аддзела ВРК у Гродна пераязджае *А. Смоліч. А. Дзекуць-Малей* стаў галавой пададдзела прытулкаў для інвалідаў і ясляў аддзелу сацыяльнага забеспячэння. Значны працэнт служачых рэўкама складалі *яўрэі*. Самі працаўнікі прызнавалі, што рэўкам дзейнічаў вяла і не быў папулярным у пралетарскіх масах. Камендантам Гродна стаў Жукаў, ваенным камісарам – А. Бараздзін. На паседжанні 25.07.1920 было прынятае рашэнне аб стварэнні пададдзелаў і іх задачах. Арганізацыйны, напрыклад, павінен быў стварыць міліцыю, рэв. камітэты і камітэты селскагаспадарчых працаўнікоў; зямельны – пачаць улік жывога і мёртвага інвентара, па магчымасці стварыць саюзы і камуны; харчовы – узяць на ўлік харчовыя запасы ў горадзе ды ваколіцах і арганізаваць адзіны рабочы кааператыў.

Крын. і літ.: ДАГВ, ф. 689, воп. 1, с.10, а. 2, 4.

Камітэт царкоўна-гістарычны (пазней перайменаваны ў гісторыка-царкоўна-археалагічны камітэт) – таварыства для даследавання гісторыі гродзенскага краю. Створаны на сходзе 30 прыхільнікаў царкоўнай і цывільнай гісторыі ў доме архірэйскім (гл. *палац адміністратара*) 9.12.1904 г. У камітэт увайшлі: епіскап Гродзенскі і Брэсцкі Ніканор, кафедральны протаіерэй

і рэдактар *"Гродзенскіх епархіяльных ведамасцей"* М. Дзікоўскі, камандзір 2-га армейскага корпуса ген. Павалоцкі, начальнік артылерыі корпуса Гальмдорф, начальнік Гродзенскай тапаграфічнай здымкі ген. Савіцкі, выкладчыкі гімназіі *Арлоўскі Я. Ф.*, К. Кемарскі, І. Астраўмаў, гродзенскія чыноўнікі, служачыя епархіі, святары – усяго 28 чал. У ліпені 1905 Свяшчэнны сінод зацвердзіў правілы дзеянняў Камітэта. Першым старшынёй камітэта быў *М. Дзікоўскі*, а затым – яго намеснік протаіерэй І. Карчынскі. Кожны сябра Камітэта павінен быў займацца даследчай працай, выконваць канкрэтныя даручэнні старшыні і плаціць узносы. Пры камітэце быў царкоўна-археалагічны музей, дзе захоўвалі архіўныя дакументы дзейнасці камітэта, помнікі царкоўнай гісторыі, фотаздымкі цэркваў, апісанні епархіі, царкоўныя летапісы. Спачатку музей знаходзіўся ў памяшканні архірэйскага дома, а з 1907 г. – у будынку Барысаглебскага манастыра, меў 88 "нумераў", якія складаліся з дзясяткаў прадметаў старажытнасці (рэлігійныя прадметы, манеты, медалі, ордэны, кнігі, рукапісы, фотаздымкі, абразы і г. д.). Камітэт быў закрыты ў 1915 у сувязі з *вайной Першай сусветнай.*

Літ.: Черепица В.. Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней). Ч. 1. – Гродно: ГрГУ, 1999. – С. 53–59.

Камітэт Часовы гарадскі – адміністратыўна-гаспадарчая ўлада ў горадзе з 13 снежня 1918 г. да 27–28 лютага 1919, створаная па ініцыятыве Экендорфа, кіраўніка нямецкіх цывільных уладаў Обер-Осту ў Горадні. У студзені 1919 у яго ўваходзілі 36 чал. (іх спіс ёсць у "Kronika m. Grodna"). Сярод іх былі прадстаўнікі Польскага дэмактратычнага камітэта (9 чал.), Часовага яўрэйскага камітэта (12 чал.), Міжнароднай сацыялістычнай рабочай фракцыі (7 чал.), Расійскай *управы гродзенскай губернскай* (4 чал.), *камітэта беларускага нацыянальнага* (2 чал. – Аляксюк П. і Матусевіч Я.), нямецкай нацыянальнасці (2 чал.). Старшынёй К. Ч. Г. быў *Лістоўскі Э.* Камітэт павінен быў прыняць ад нямецкіх уладаў маёмасць, гаспадарку, харчаванне, установы і распараджацца імі. Галава гарадской нямецкай адміністрацыі барон фон Закендорф на першым пасяджэнні Камітэта давёў умовы перадачы гаспадаркі горада. Немцы абяцалі спагнаць з жыхароў нядоімкі гарадскога падатку (104 544 маркі) і перадаць іх у гарадскую касу. Харчаванне прадавалася гораду па сабекошце, а 12 тыс. цэнтнераў жыта – па 15 марак за цэнтнер. Маёмасць, установы і прадпрыемствы перадаваліся бескаштоўна. Электрычная станцыя заставалася ў немцаў, пакуль яны будуць у Гродне. Камітэт быў вымушаны пагадзіцца на нямецкія ўмовы, але грошай (299 798 марак) для выплаты немцам у яго не было. Сябры К. вырашылі сабраць невыплачаныя падаткі (асабліва ад асоб, якія ўзбагаціліся за кошт вайны) і купіць для насельніцтва харчаванне, стварыць гарадское самакіраванне. Немцы аддалі харчаванне ў крэдыт пад распіску і 20.12 Камітэт гэта прыняў. Камісіі фінансаў і гарадской гаспадаркі прынялі свае аб'екты і маёмасць. К. вёў справаводства на 4 мовах: польскай, яўрэйскай, рускай і беларускай. Сярод рашэнняў К. былі: наладзіць працу электрастанцыі, уладкаваць штат гарадской бальніцы, арганізаваць міліцыю

і наладзіць дзяжурства начных вартаўнікоў на вуліцах горада, наладзіць працу гарадской бібліятэкі і д. п. Часовы гарадскі камітэт спыніў сваё існаванне пасля выбараў у *Раду Гарадскую*.

Літ.: Міхалік Д. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920: Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці. – Смаленск: Інбелькульт, 2015, с. 319; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 38–41, 45, 49–52; Kronika m. Grodna, Grodno 1928, zesz. 1, s. 19.

Камітэт часовы для аказання дапамогі пацярпелым ад пажару ў Гродне 29.05.1885 г. Быў створаны паводле распараджэння губернатара 30.05.1885. У чэрвені імператарская сям'я ахвяравала пацярпелым ад *пажару* вялікую суму грошай, і быў створаны яшчэ адзін камітэт для іх размеркавання. 8.07.1885 два каміэты злучыліся ў адзін агульны на чале з віцэ-губернатарам. Часовы камітэт праіснаваў да студзеня 1887. Ён склаў спісы пацярпелых, збіраў грошы, рэчы, харчаванне, размяркоўваў людзей, якія страцілі жытло па дамах, разбіраў просьбы жыхароў на атрыманне пазык і матэрыяльнай дапамогі.

Літ.: Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 257–258; Швед В.В. Гродзенскія пагарэльцы 1885 года і Эліза Ажэшка / В.В. Швед // Пісьменніца. Грамадскі дзеяч. Жанчына: да 170-годдзя з дня нараджэння Э. Ажэшкі. – Гродна, 2013. – С. 120–126.

Камуністычная партыя Беларусі (КП(б)Б, КПБ), як гродзенская гарадская арганізацыя аформілася ў кастрычніку 1918 г. Налічвала тады 135 чал. З 1919 дзейнічала падпольна ва ўмовах знаходжання на тэрыторыі II Рэчы Паспалітай. У Гродне знаходзіўся краёвы партыйны цэнтр.

Літ.: Очерки истории Гродненской областной партийной организации/ ред. И.П. Крень. – Мн.: Беларусь, 1990; Павач. А. Под крылом Коложы. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 213–218; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005). – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020.

Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ). Гродзенская гарадская арганізацыя дзейнічала ва ўмовах падполля ў кастрычніку1923 – жніўні 1938 пад кіраўніцтвам Беластоцкага акруговага камітэта (да пачатку 1924), а потым – Гродзенскага гаркама КПЗБ, Гродзенскага акруговага камітэта і ЦК КПЗБ. Гродзенская гарадская арганізацыя КПЗБ кіравала працай партыйных аддзелаў і Гродзенскай гарадской арганізацыі Камуністычнага саюза моладзі Зах. Беларусі, арганізоўвала барацьбу працоўных за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, супраць фашысцкай пагрозы, за далучэнне да БССР і д. п. Яе чальцы стваралі гурткі *Таварыства беларускай школы* і *Грамады Беларускай сялянска-рабочай,* прафсаюзныя арганізацыі на прадпрыемствах скураных, тытунёвых, хімікаў, дрэваапрацоўкі, шаўцоў. Арганізоўваліся першамайскія, кастрычніцкія, антываенныя дэманстрацыі, забастоўкі, стачкі працоўных. З 1934 пачалі ствараць адзіны рабочы фронт (кантакты з *ППС, Бундам*), з 1935 зарганізаваны міжпартыйны камітэт стаў аб'ядноўваць

незарганізаваных працоўных у класавыя прафсаюзы і каардынаваць выступленні рабочых супраць надыходу рэакцыі і пагрозы вайны (гл. *выступленні працоўных 1936).*

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник, Минск, 1988, с. 145.

Камуністычны саюз моладзі Заходняй Беларусі. Гарадская арганізацыя дзейнічала ў 1924 – жніўні 1938 пад кіраўніцтвам Гродзенскага гаркама КСМЗБ, Гродзенскага акруговага камітэта КСМЗБ і ЦК КСМЗБ. Накіроўвала працу камсамола *гродзенская гарадская арганізацыя КПЗБ*. У 1922 у горадзе было 25 камсамольцаў, у 1935 – 80 чальцоў. Гурткі камсамольцаў былі ў прафсаюзных арганізацыях тытуннікаў, друкароў, скурнікаў, шаўцоў, а таксама ў рускай гімназіі. У 1924–25 практычна дапамагала гродзенскай арганізацыі КСМЗБ Харужая В. Камсамольцы былі баявымі сябрамі чальцоў КПЗБ: удзельнічалі ў мітынгах, дэманстрацыях, забастоўках, арганізоўвалі свае выступленні за бясплатную школу на роднай мове, адзначалі ў верасні Міжнародны Дзень Юнацтва, праводзілі антываенную агітацыю сярод навабранцаў у польскую армію, заклікалі дзяўчат уступаць у шэрагі рэвалюцыйных барацьбітоў, стваралі фронт маладога пакалення – складовую частку антыфашысцкага народнага фронту. Гродзенская арганізацыя КСМЗБ кіравала гарадской піянерскай арганізацыяй. Зліквідаваная з роспускам КПЗБ і КСМЗБ, але камсамольцы працягвалі сваю барацьбу да аб'яднання Зах. Беларусі з БССР.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник, Минск, 1988, с. 145–146.

Камянецкі Людвік (1758–1816) – генерал дывізіі, камандзір 18 пяхотнай дывізіі, майстар польскай масонскай ложы "Адшуканая Вольнасць", варшаўскі губернатар. Кароткі час быў гродзенскім *губернатарам* – адразу пасля *Ражнецкага А.* і да даты не пазней Мірскага бою (9–10.07.1812). "Другі губернатар", як яго называюць крыніцы, быў сынам Юзафа, падчашага (cześnika) ашмянскага. Камянецкі ваяваў у руска-польскай вайне 1792 г., атрымаў крыж Віртуці Мілітары, быў давераным Ю. Панятоўскага, належаў да яго таварыства і вёў інтарэсы князя ў 1798–1806 гг. З 1807 быў начальнікам штаба Панятоўскага. Можа таму ён і прызначыў Камянецкага гродзенскім губернатарам, галоўнай справай якога былі ўмацаванне новай улады і мабілізацыя рэсурсаў губерні на вайну з Расіяй.

Літ.: Polski Słownik Biograficzny. T. 11.- Wrocław; W-wa; Kraków: PAN, 1964–1965. – s. 515.

Каналізацыя сучаснага тыпу з'явілася ў Гродне ў першай трэці XX ст. Гарадская дума 10.12.1913 вырашыла на сваім паседжанні выдаць 5 тыс. руб. на распрацоўку праекта каналізацыі і ў наступным годзе камандзіравала ў Вільню сябра ўправы Цыбульскага, каб азнаёміўся з арганізацыяй мясцовай каналізацыі. Але вайсковыя падзеі не далі магчымасці рэалізаваць праект. Толькі 24.05.1933 адбылася закладка вуглавога каменя гарадской каналізацыі.

Спецыяльна падрыхтаваны акт, напісаны на пергаменце, быў пакладзены ў цынкавы слоік, які аблілі стэарынам і глыбока замуравалі ў канале. Будаўніцтва разлічылі на 10 гадоў. Кіравалі ім інжынеры Казінскі і Бартноўскі. У 1934 калектар прайшоў па ўчастку вул. Рыдза Сміглага/частка вул. Васількa і вул. Пілсудскага/Леніна.

Да гэтага часу дзейнічала старая сістэма ачысткі памыйных ям і прыбіральняў: адкіды вывозіліся асенізацыйным абозам у бочках (малых і вялікіх) за горад, на навакольныя палі памешчыкаў, ва ўрочышча *Пышкі*; таксама выліваліся ў траншэі (рынштокі) і сцёкавыя равы, якія "вымяталі, высыпвалі нягашанай вапнай, аблівалі карболкай альбо проста бялілі вапнай. Толькі фекаліі з уборных злітыя вадой сплывалі да долу. У вызначаны час ноччу прыязджалі спецыяльныя помпы, якія выкачвалі сабранае ў бочкі, што вывозіліся на палі, якія апрацоўваліся пад горадам (капуста), што давала цудоўныя вынікі ва ўраджаях, а таксама ў смуродзе на вуліцах і палях". Яшчэ адзін спосаб пазбавіцца мачы і фекаліяў – збіраць іх у начны гаршчок, а потым выкінуць праз вакно на вуліцу. У некаторых дамах рабілі спецыяльную "трубу", якая ішла з-пад даху да зямлі, дзе знаходзіліся памыйныя ямы. Апошняя мусіла быць утрамбаваная глінай і мець прасмоленую драўляную скрыню. Гной апрацоўвалі вапнаю, а супраць паху пасыпалі тарфяным мохам. З грамадскіх прыбіральняў вываз кантраляваўся санітарнай камісіяй. Часта нечыстоты траплялі ў гарадскія рэчкі – *Юрыдыку і Гарадніцу/Гараднічанку*, у *Нёман*. Пасля зімы адкіды адтайвалі і атручвалі паветра горада.

Да 1954 працягласць К. складала 18,5 км і ахоплівала пераважна цэнтральную частку горада, дзе жыло 15–20% насельніцтва. У 1963 была пабудаваная каналізацыйная насосная станцыя "Рыбацкая", што дазволіла пашырыць каналізацыйную сетку. На пачатак 1988 яна дасягнула 270 км, працавала 7 каналізацыйных насосных станцый, у 1987 пабудаваная трэцяя чарга агульнагарадскіх збудаванняў К. на поўную біялагічную ачыстку магутнасцю 65 тыс. м^3 на суткі.

Літ.: Амбрулевичюте А. Ямы городов "литовских губерний" // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: Зборнік наук. артыкулаў. – Мінск, 2016. – С. 116–127; Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 230–231; Иващенко Н.А. Повседневная жизнь губернского города Гродно (XIX – начало XX века). – Гродно: ЮрСаПринт, 2019. – С. 57–74; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 15, 189, 204; Helena z Janczynowskich Roth, Czasy. Miejsca. Ludzie. Wspomnienia z kresów wschodnich, Kraków, 2009, s. 60; Kanalizacja miasta Grodna // Kronika miasta Grodna. Rok 1928. Zeszyt 2, S. 23–25.

Кандратовіч Кіпрыян/Цыпрыян Антонавіч (28.04.1859, в. Зіневічы каля Вавёркі Лідскага р-на – 31.10.1932, Гародна на Лідчыне) – генерал ад інфантэрыі расійскага войска, арганізатар беларускага войска. Вучыўся ў Лідскай павятовай школе, з 1875 пачаў вайсковую службу. У 1884 скончыў Мікалаеўскую акадэмію генеральнага штаба. Удзельнічаў у вайне расійска-турэцкай (1877–78),

у падаўленні "паўстання баксёраў" у Паўночным Кітаі (1900) *вайне расійска-японскай (1904–05)* і *вайне Першай сусветнай.* Атрымаў ордэн Св. Георгія 4-й ст. У 1893 стаў палкоўнікам, у 1900 – генерал-маёрам, у 1905 – генерал-лейтэнантам. У 1910–1913 быў начальнікам 1-га Каўказскага армейскага корпуса і намеснікам генерал-губернатара ў Тыфлісе. Са жніўня 1913 – у Варшаўскай вайсковай акрузе, дзе і сустрэў *вайну Першую сусветную*. З 1914 да 1917 дакладная інфармацыя пра К. адсутнічае, але вядома, што быў у адстаўцы. У 1917 вярнуўся на службу і камандаваў 75-й пях. дывізіяй, пазней быў абраны вайскоўцамі-беларусамі Заходняга фронту ў Цэнтральную Беларускую Вайсковую Раду. Атрымаў ад Стаўкі расійскага войска дазвол на стварэнне беларускага палка ў Мінску, але справа запаволілася, бо хутка Часовы ўрад перастаў існаваць, а кіраваць сталі бальшавікі (салдаты бел. палка былі далучаныя да 289 запаснага палка пяхоты). К. у маі 1918 стаў міністрам вайсковых спраў у Радзе міністраў на чале з Р. Скірмунтам. 11.11 Кандратовічу і *К. Езавітаву* даручылі стварыць штаб 1-га Беларускага палка. Паводле праекта К. меркавалася арганізацыя 200-тысячнага войска. У Горадні К. сфармаваў штаб (Беларускую камендатуру) і *полк беларускі пяхотны*. У лістападзе 1918 К. пераехаў у Вільню, куды пазней у снежні эвакуяваліся прадстаўнікі БНР. К. была даручаная дадатковая абарона Вільні ад бальшавікоў. Але ён не бачыў для гэтага дастатковых сілаў (палякі пагаджаліся дапамагчы, але не хацелі прызнаць Жамойцкую дзяржаву са сталіцай Вільняй). Адступаць у Коўна К. не хацеў, а гаварыў, што трэба перайсці ў Горадню і там на сваёй тэрыторыі арганізаваць большыя сілы для змагання з бальшавікамі. Таму 22.12.1918 ён з беларускімі аддзеламі выехаў у Гродна, 24.12.1918 загадам урада Жамойцкага быў зняты з пасады кіраўніка абароны Вільні. У лютым 1919 выехаў з Гродна на Парыжскую мірную канферэнцыю. К. уваходзіў у кіраўнічыя органы Беларускай партыі народных сацыялістаў. Пасля адстаўкі К. жыў у сваім маёнтку Гародна ў Лідскім пав. Хварэў і апошнія гады правёў у інвалідным крэсле, бо страціў каардынацыю руху. Пахаваны на Лідскіх праваслаўных могілках. У жніўні 1998 унук К. перапахаваў труну генерала на новых могілках у г. п. Воранава, а ў маі 2000 па ініцыятыве настаяцеля Воранаўскай царквы Св. А. Неўскага парэшткі К. перанеслі на месца каля царквы.

Літ.: Лаўрыш Л. Міністр Беларускай Народнай Рэспублікі генерал ад інфантэрыі Кіпрыян Кандратовіч. Біяграфічны нарыс. – Ліда, 2007; Приговор революции: крушение антисоветского движения в Белоруссии, 1917–1925 / Н. С. Сташкевич. – Минск, 1985, с. 55, 154, 155, 164, 187; Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich= Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7. – S. 196.

Кандрусевіч Тадэвуш (3.01.1946, в. Адэльск каля Гродна) – біскуп Беларусі (1989) з рэзідэнцыяй ў Гродне, зацверджаны папам Янам Паўлам II. З сялянскай каталіцкай сям'і. Скончыў на выдатна Ленінградскі палітэхнічны інстытут (1970) па спецыяльнасці інжынер-механік. У 1970–1976 працаваў інжынерам на Вільнюскім заводзе шліфавальных станкоў. У складзе групы інжынераў

зрабіў спецыяльны высокахуткасны шліфавальны станок для Волжскага аўтазавода. З дзяцінства хадзіў у касцёл. Самастойна вывучыў латынь і літоўскую мову. Скончыў на выдатна Каўнаскую духоўную семінарыю (1981). Стаў пробашчам *касцёлаў Божай маці* і *Фарнага* ў Гродне (1988). Доктар тэалогіі (1988). Адміністратар апостольскі для католікаў Еўропы (1989–2002), арцыбіскуп маскоўскі (2002–2007), арцыбіскуп мітрапаліт мінска-магілёўскі (з 2007). Пасля выбараў прэзідэнта Беларусі ў жніўні 2020 К. заклікаў уладу і пратэстоўцаў сесці за стол перамоў і спыніць гвалт. 31.08.2020 яму забаранілі ўезд у Беларусь з Польшчы без тлумачэння прычын. Пазней старшыня дзяржаўнага памежнага камітэта Беларусі А. Лапа растлумачыў, што пашпарт К. быў несапраўдны і была праверка грамадзянства К. 24.12.2020 К. вярнуўся ў Беларусь.

Літ.: Kałuski M., Sprawy kresowe – poza cenzurą. T. 2. – Toruń-Melbourne, 2017. – S.191; https://ru.wikipedia.org/wiki/Кондрусевич,_Тадеуш_Игнатьевич. Доступ 26.01.2021.

Канстытуцыя Гродзенская, тэкст яе абмяркоўваўся з 18.11 на паседжаннях сейма 1793 г. у Гродне. Яна складалася з 16 артыкулаў:

1. Рэч Паспалітая – адзінае, непадзельнае цела, вольнае і незалежнае. Найвышэйшым заканадаўчым органам з'яўляецца сейм, які складаецца з дзвюх палат. Толькі ён можа прымаць законы, аб'яўляць вайну, заключаць мір, трактаты, пасылаць паслоў, кіраваць манетным дваром. Выканаўчая ўлада належыць Пастаяннай радзе, у якую ўваходзяць 13 прадстаўнікоў з Кароны Польскай і 11 – з Літвы.
2. Феод Рэчы Паспалітай застаецца пры ёй вечна.
3. Галоўная рэлігія – каталіцкая.
4. Пераход у іншую веру караецца выгнаннем з РП. Правы, дадзеныя дысідэнтам ў 1775 г. захоўваюцца.
5. Каралём можа быць выбраны толькі католік.
6. Законы Вялікага Княства Літоўскага застаюцца непарушнымі.
7. Тое самае тычыцца Курляндыі і Семігаліі.
8. Ніякая дзяржаўная ўлада не можа адрываць і аддаваць правінцыі.
9. Гарантуецца вольная элекцыя (выбар) караля.
10. Кароль, згодна з пастановамі сейма, павінен захоўваць заключаныя дамовы.
11. Усе грамадзяне Рэчы Паспалітай (у тым ліку і аселыя іншаземцы) падлягаюць адзінаму суду, маюць аднолькавыя правы: апекі, недатыкальнасці асобы і ўласнасці. Шляхта захоўвае права годнасці, гонару, духоўных і свецкіх пасадаў, роўнасці адпаведна са станам.
12. Шляхціц, мешчанін, аселы іншаземец, той, хто мае пасэсію** павінны трымацца прынцыпу "нічога не браць у палон, калі не перамог паводле закону".
13. Уласнасць шляхты, уладальнікаў земскай маёмасці і іх падданых ніколі не можа быць забраная. Права "жыцця і смерці" ліквідуецца. За забойства падданага селяніна суд можа прызначыць вінаватаму ўладальніку смяротную кару.
14. Гарантуецца права вольнага голасу на сеймiках і сеймах. Забараняюцца лісты і друк, якія выступаюць супраць рэлігіі і кардынальных законаў.

15. Пасады, чыны, духоўныя і свецкія тытулы, нададзеныя каралеўскімі прывілеямі і ласкамі, могуць быць адабраныя толькі праз судовы вырак.
16. Кардынальныя законы непарушныя: ні сейм, ні ўлада не могуць іх адмяніць. Парушальнік можа быць аддадзены пад сеймавы і крымінальны суд. Каралю даецца права забароны.

Такім чынам, Гродзенская канстытуцыя, адхіляючы праграму Таргавіцкай канфедэрацыі, была камбінацыяй расійскіх жаданняў з артыкуламі канстытуцыі 1775 г. і рэформамі 1788 г. 23.11.1793 канстытуцыя была прынятая. Праіснавала да 3 падзелу Рэчы Паспалітай і, у сувязі з падзеямі 1794 г., фактычна не набыла моц па ўсіх вышэйназваных пунктах.

Крын. і літ.: Бардах Ю., Леснодорский Б., Пиетрчак М. История государства и права Польши. – М., 1980; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997. – 140 с.

Канфедэрацыя генеральная, атрымалася ад спалучэння канфедэрацыі кароннай (кіраўнікі Ф. Патоцкі, К. Браніцкі, С. Равускі) з канфедэрацыяй літоўскай, створанай у Вільні на чале з генералам рускай службы і гетманам польным ВКЛ Шыманам Касакоўскім і біскупам Лівонскім Юзафам Касакоўскім. З 1792 г. месцам знаходжання К. г. з'яўлялася Гродна.

Літ.: Орловский Е. Очерк истории города Гродны. – Гродна, 1889. – С. 54.

Капернік Мікалай (19.02.1473, Торунь – 1.06.1543, Фромбарк) – польскі астраном, лекар, матэматык, канонік, стваральнік геліяцэнтрычнай сістэмы. Адну ноч у сакавіку 1506 правёў у *Старым замку*, калі прыехаў, каб аглядзець здароўе вялікага князя *Жыгімонта* (які тады не быў яшчэ ні вялікім князем літоўскім, ні каралём польскім). Як вядома, медыцынай Капернік займаўся тры гады ў Падуанскім універсітэце (1503–1506). Ёсць партрэт К. з канваліяй (яна – сімвал лекарскай справы) у руцэ. К. ведаў прыдворнага лекара Жыгімонта I і кансультаваўся з ім у цяжкіх выпадках. К. быў сакратаром і лекарам свайго дзядзькі, біскупа вармінскага Лукі/Лукаша Ватцэльродэ (ці Ватцэнроде, прозвішча маці) у біскупскай рэзідэнцыі Лідзбарку. Карыстаўся папулярнасцю як лекар у бедных жыхароў Фраенбурга і ваколіц. У сакавіку 1506 вялікі князь літоўскі і кароль польскі *Аляксандр* запрасіў біскупа на нараду ў Вільню, разам з ім быў К. Дарога ішла праз Гродна.

Літ.: Павач А. Гродзенскія гісторыі. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2019. – С. 15–16; Dykcyonarz Uczonych Polaków… ułożony przez ks. Ignacego Chodynieckiego zakonu karmelitów. T. 1. – Lwów, 1833. – S. 335–342; Krukowski J. Kopernik Mikołaj // Słownik biograficzny historii Polski. T. 1 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C. 731–732; Małłek J. Mikołaj Kopernik. Szkice do portretu. – Toruń, 2015. – S. 129–130; Górski K. Mikołaj Kopernik. Środowisko społeczne i samotność. – Toruń, 2012. – S. 161.

Каплан Копель Абрамовіч (1902–1974) – адзін са стваральнікаў у 1921 г. камуністычнай арганізацыі ў Гродне. З лістапада 1921 па 1925 – сябра гарад-

скога камітэта *Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі*. Інвалід 1 групы па зроку. З 1937 па 1972 быў старшынёй Цэнтральнага праўлення Таварыства сляпых (ТА "БелТІЗ"). За дасягненні ў вытворчай і грамадскай дзейнасці ўзнагароджаны ордэнамі "Знак Гонару" і "Працоўнага Чырвонага Сцяга".

Літ.: https://beltiz.by/struct/hist-menu/rainmenu. Доступ 16.10.2021.

Капланскі С. Я. – сакратар падпольнай Гродзенскай арганізацыі бальшавікоў у 1918 г. Налічвала 102 чальцы, выпускала штотыднёвую газету "Набат", рэдактарам якой быў К. 3.01.1919 выступіў з дакладам на паседжанні Цэнтральнага камітэта Кампартыі Літвы і Зах. Беларусі ў Вільні. Меў цесныя сувязі з партыйнымі арганізацыямі ў Індуры, Парэччы, Малой Бераставіцы, Свіслачы, Ваўкавыску. Быў забіты ў перыяд акупацыі ў 1920-х гадах у Коўне.

Капліца ў Аўгустоўку. Граф Медэм у перыяд знаходжання Аўгустоўка ў яго руках (1817–1820 гг.; па іншых звестках у 1821) заснаваў тут капліцу імя апосталаў Пятра і Паўла. Паводле ягонай задумы, яна павінная была нагадваць рымскую базіліку Св. Пятра. Знешне капліца выглядала квадратнай, а ўнутры мела выгляд ратонды. Накрытая яна была велічным купалам, завершаным паходняй (лятарняй) і крыжам на шчыце. Перад уваходам у капліцу знаходзіўся паглыблены порцік з дзвюма калонамі. Капліца была абнесеная высокай мураванай агароджай (20х17 м), крытай гонтай. У галоўным алтары вісеў абраз Маці Божай, а па баках знаходзіліся абразы Пятра і Паўла ў натуральную велічыню. Пад падлогай была крыпта з пахаваннямі *дэ Лясы і О'Брыен дэ Лясы.* Пасля *вайны першай сусветнай* у капліцу перанеслі срэбны жырандоль, які раней аздабляў палацавы салон. У 1922 г. была адрэстаўраваная паводле праекта С. Шайко. У гады Другой сусветнай вайны была зноў разбураная. Дзякуючы ксяндзу Аляксандру Шэмету, капелану Саюза палякаў на Беларусі, у 1996 у капліцы (дакладней каля яе ўвахода) адбылася першая імша, якую цэлебраваў гродзенскі біскуп Аляксандр Кашкевіч. У наступным годзе капліцу адрэстаўравалі, а 18.07.2007 прэзідэнт Беларусі А. Лукашэнка асабіста даў згоду на будаўніцтва каля капліцы касцёла – прайшло 10 гадоў пасля падачы першай заявы на будаўніцтва.

Літ.: Sypuła-Gliwa Joanna. Podróż na Wschód. – Łomianki: Wydawnictwo LTW, 2011. – S. 174, 192, 193, 198–201, 204; Aftanazy R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. Wyd. 2. T. 3. – Warszawa, Kraków: Zakład Narodowy imienia Ossolinskich, 1992. – S. 16–17 (матэрыял падрыхтаваны па словах Маўрыцыя О'Брыена дэ Лясы); Федорук. Старинные усадьбы Гродненщины. – Мн.: Беларусь, 2014. – С. 279–280.

Капэла гродзенская дзяржаўная, створаная ў красавіку 1992 г. на аснове камернага аркестра кампазітарам *Бандарэнка А. В.*, які да жніўня 1996 быў яе мастацкім кіраўніком. У склад камернага аркестра ўваходзілі музыканты-выкладчыкі музычных школ і вучылішча. Першым дырыжорам быў з кастрычніка 1990 па кастрычнік 1991 А. Гендэльман. У лютым 1991 адбыўся першы канцэрт у *Музеі гісторыі рэлігіі*. З лістапада 1991 К. узначаліў дырыжор

Борматаў У. М. У красавіку 1992 быў створаны камерны хор (дыр. Л. М. Іконнікава), які далучылі да капэлы. У маі гэтага года адбыўся канцэрт-прэзентацыя К. у тэатры лялек. У верасні 1992 былі зарганізаваныя ансамбль салістаў і ансамбль старажытнай музыкі. К. актыўна гастралюе і ўдзельнічае ў музычных фестывалях па Беларусі і за мяжой (Польшча, Германія, Нарвегія, Францыя).

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 138–139.

Капэла дзяржаўная акадэмічная харавая БССР, заснаваная 1.11.1939 у Беластоку на базе хору беларускіх студэнтаў у Вільні (1929) *Р. Р. Шырмам* па даручэнні ўрада БССР. Мела тры групы: харавую (у 1947 – 50 чал.), танцавальную (24 чал.), музычную. Перад *вайной Вялікай Айчыннай* гастралявала ў Маскве, а падчас вайны – на Урале, у Сібіры, Сярэдняй Азіі. У 1943 К. вярнулася ў Беларусь і са снежня 1944 па 1952 працавала ў Гродне. Рэпертуар К. налічваў каля 150 назваў апрацаваных песень народаў СССР: з іх 54 беларускіх, 36 рускіх, 11 украінскіх і інш. З музыкі выконваліся савецкія кампазітары, у тым ліку беларускія – М. Аладаў, А. Багатыроў, У. Залатароў, І. Любан, М. Сакалоўскі і інш.; а таксама творы рас. і замежнай музычнай класікі. Сярод танцаў выконваліся беларускія народныя, рускія камічныя, украінскія, літоўскія, польскія, малдаўскія. Гастралявалі па заходніх абласцях Беларусі, Прыбалтыцы, Закаўказзі. У 1950 К. была рэарганізаваная ў Дзяржаўны хор БССР, у 1952 пераехала ў Мінск, у 1955 перайменаваная ў Дзяржаўную харавую капэлу БССР.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. – Минск, 1989, с. 142.

Капэла Тызенгаўза А. Аркестр пачынае стварацца прыкладна з 1765 г., калі былі заказаныя музычныя інструменты. Першы ўспамін пра капэлу адносіцца да 1769 г. У 1778 яна мела звыш 30 чал. і 2 італьянскія сапрана. У 1776 было 22 выканаўцы і 8 "хлопцаў" (вучняў), у 1779 – 30 музыкантаў і 7 "хлопцаў". Віртуозам-скрыпачом быў кіраўнік капэлы, капельмайстар *Сітанскі Леан*, на клавіцымбалах, кларнеце і скрыпцы гралі Д. Пташынскі (кантракт ад 2.11.1780), Рэцька, Ярмаковіч С. (5.01.1780), Віткоўскі Г. (1.11.1780), Швед С., прыгонныя музыканты П. Станкоўскі, Ф. Янкоўскі, А. Тумін, Кушалеўскі. У К. гралі італьянскі кампазітар і капельмайстар Абатэ К., чэхі Эндэрле і Геранім. У кантрактах было пазначана, што музыканты штодзённа павінны быць у калегіуме і адну гадзіну вучыць сваіх вучняў, вечарам аглядаць свае інструменты і берагчы іх ад палому, капіяваць ноты. Выконваліся творы ад опер да касцельнай музыкі. У сховішчы капэлы захоўваўся значны збор нотаў, якія былі купленыя ў Англіі, Аўстрыі, Германіі, Італіі. Прысылаліся ноты для перапіскі з Варшавы. Выступала К. у *тэатры Тызенгаўза А.*, падчас касцельных служб, на прыватных вечарынах, святах і балах. Капэла ўдзельнічала ў выкананні оперы А. Грэтры "Цудоўны", камедыі П. Бамаршэ "Севільскі

цырульнік", "Вясковага балета" і "Балета пекараў" *Г. Пеціпэці*. К. выконвала сімфонію Ё. Гайдна.

Крын. і літ.: AGAD, Arch. Tyzenhauza, zesp. 351, sygn. D–2, k. 273–282, 323–324; Гродно: энцикл. справ / редкол.: И.П. Шамякин [и др.]. – Минск: БелСэ, 1989. – С. 231; Канюк Н.Г. Хранитель Жилибертии. – Гродно: ЮрСаПринт, 2017. – С. 59; Музыкальный театр Беларусии. Дооктябрьский период. – Мн., 1990, с. 189; Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 12. – Гродна: ГАІУН, 2010. – С. 22: Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 341; Żorawska-Witkowska A. Kapela Tyzenhauza w Grodnie // Muzyka. – 1977. – nr. 2. – S. 3–35.

Каралеўскі двор, знаходзіўся на месцы, дзе сёння стаіць *замак Новы*. Узнік у сяр. XV ст., у часы панавання *Казіміра Ягелончыка*. Галоўным будынкам быў Каралеўскі дом, дзе вял. князь літоўскі Казімір часта спыняўся падчас паляванняў і вандровак. Тут ён і памёр 6.06.1492. Паводле інвентару 1633 на К. д. знаходзіліся мураваная царква, дзе праводзіліся *сеймікі* шляхты Гродзенскага павета і паседжанні суда каралеўскай адміністрацыі, дом начальніка варты, кухня, пякарня, памяшканні для вартавых і чэлядзі. Калі на сейме 1726 прымалі рашэнне аб будаўніцтве Новага замка, дык на месцы К. д. пабудоў амаль не засталося.

Літ.: Кітурка Ю. В. Музеефікацыя Гродзенскіх каралеўскіх палацаў Краязнаўчыя запіскі. – 2010. – № 7. – С. 48–49.

Каралькоў Анатоль Пятровіч (нар. 20.10.1934, с. Ціхоўскае Мітулінскага р-на Растоўскай вобл.) – архітэктар. Скончыў Львоўскі палітэхнічны інстытут (1958). Галоўны архітэктар Гродна (красавік 1977 – чэрвень 1986). З 1986 – галоўны архітэктар праектаў Гродзенскога філіяла ГІАП. Пераведзены ў гродзенскі філіял "Белгіпрабуд" (20.09.1990). Чалец Саюза архітэктараў СССР. Дэлегат 4 і 5 з'ездаў архітэктараў СССР. Дэпутат гарадскога савета, сябра камісіі па будаўніцтве (1977–1985). Узнагароджаны медалямі "За доблесную працу" (1970) і "Ветэран працы" (1984), дыпломам Саюза архітэктараў СССР.

Карасік Зельман Янкелевіч – купец 2-й гільдыі, гродзенскі фотамайстар. Да 7.07.1887 утрымоўваў фатаграфію ў Саколцы. У Гродне з 1886 (дазвол аб адкрыцці ад 30.09.1886 паводле ст. ст.). Майстэрню спачатку меў на вул. Саборнай/Савецкай у доме Вільнера, пазней – на вул. Калажанскай/ Калючынскай (1901–1902), на вул. Іваноўскай/Тэльмана. Губернскае праўленне дало К. спецыяльны дазвол на распаўсюджванне фатаграфічных паштовак Гродна. К. зрабіў фатакопію з рэпрадукцыі *гравюры Г. Браўна і Гогенберга,* прывезенную ў Гродна *Д. М. Бацюшкавым.* 21.07.1892 г. атрымаў дазвол трымаць фатаграфію ў Саколцы. У Нацыянальнай бібліятэцы ў Варшаве захоўваецца фатаграфія генерала Юліюша Румеля з бацькамі (1905 г.).

Літ.: Верас З. Я помню ўсё. Успаміны, лісты / уклад. М. Скобла. – Гародня, Вроцлаў, 2013, с. 386; Иващенко Н.А. Повседневная жизнь губернского города Гродно (XIX – начало XX века). – Гродно: ЮрСаПринт, 2019. – С. 182, 224–226.

Карасік малодшы – гродзенскі фотамайстар (з 1901). Сын *З. Я. Карасіка*. Дазвол аб адкрыцці фотамайстэрні ў Хлебным завулку/ вул. Найдуса атрымаў 20.07.1901 г. паводле ст. ст.

Карбышаў Дзмітры Міхайлавіч (26.10.1880, Омск – 18.02.1945, Маўтхаўзен, Германія) – генерал-лейтэнант інжынерных войск (1940), прафесар (1938), доктар вайсковых навук, Герой Савецкага Саюза (1946), ганаровы жыхар г. Гродна. Быў у горадзе ў чэрвені 1941 у сувязі з інспектаваннем будаўніцтва ўмацаванняў у Беластоцкай вобл. і ў наваколлі Гродна. Удзельнічаў у абарончых баях у раёне Аўгустоўскага канала (1941). Кантужаны і паранены пад Магілёвам трапіў у палон. Прайшоў праз дзясятак канцлагераў і ў Маўтхаўзене 18.02.1945 быў забіты. Яго імем названая вуліца ў Гродне (на доме № 25 ёсць мемарыяльная дошка) і школа № 15 (на яе двары ўсталяваны ў 1975 помнік, скульптар А. Салятыцкі, арх. К. Асадаў). К. – аўтар больш за 100 навуковых прац па вайскова-інжынерным мастацтве і ваеннай гісторыі.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник, Минск, 1988, с. 238; Карбышев Д.М. Избранные научные труды. М.: Воениздат, 1962; Пивоварчик С.А. Белорусские земли в системе фортификационного строительства Российской империи и СССР (1772–1941). – Гродно: ГрГУ, 2006, с. 236–237; Саяпин В. Гродненские памятники и скульптуры. – Гродно: ЮрСаПрынт, 2014, с. 42–43;

Карл XII (17.06.1682, Стакгольм – 30.11.1718, Фрэдэрыксхаль) – шведскі кароль з 1697. Камандуючы шведскай арміяй у *вайне Паўночнай* (1700–1721). Бываў у Гродне: у маі 1702 яго войска заняло горад; 26.01.1706 г. аглядаў гродзенскія ўмацаванні, у выніку вырашыў адмовіцца ад штурма і ўзяў горад у аблогу; 6.02.1708 ледзь не трапіў у палон да расійскага капітана Ніжагародскага палка каля *кляштара дамініканцаў* (жыхары горада дапамаглі выратавацца К.).

Літ.: Манасеин В.С., Пётр I и Карл XII под Гродно в походе 1706. – Гродна, 1901; Госцеў А.П., Швед В.В., Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116 – 1990 гг.). – Гродна: ГАА БФК, 1993. – С. 32, 35–37, 168; Данскіх С.У. Гародня ў гады Паўночнай вайны (1700–1721) / С.У. Данскіх // Гродзенскія запіскі: старонкі гісторыі і культуры. – Гродна: ГрГУ. – Вып. 2. – С. 28–36.

Кароль Гарадзенскі (Rex grodnensis) – тытул князя літоўскага *Вітаўта* пасля таго, як у 1376 г. *Гарадня* перайшла ў яго валоданне.

Карпюк Аляксей Нікіфаравіч (14.04.1920, в. Страшава Беластоцкага ваяводства – 14.07.1992, Гродна) – беларускі грамадскі і культурны дзеяч, пісьменнік, краязнавец. Заслужаны работнік культуры Беларусі (1980). Скончыў два класы Віленскай гімназіі (1939), вучыўся ў Навагрудскім педагагічным вучылішчы. Падчас *вайны Вялікай Айчыннай* удзельнічаў у антыфашысцкім падполлі, сядзеў у канцлагеры Штудгаф (з пачатку 1943). Пасля ўцёкаў адтуль (восень 1943) партызаніў, быў камандзірам атрада імя В.-К. Каліноўскага (з пачатку 1944). Атрад меў каля 60 чал., пад адхон пусцілі 3 цягнікі, стварылі

ў лесе лагер для цывільных уцекачоў ад немцаў. На фронце (1944–1945) прайшоў шлях артылерыста ад Варшавы да Берліна. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга і "Віртуці Мілітары", медалямі. Скончыў факультэт замежных моў гродзенскага педістытута імя. Я. Купалы (1949). Працаваў у Сапоцкіне, Біскупцах, Гродне педагогам, журналістам, загадчыкам агенства "Інтурыст", упаўнаважаным па Гродзенскай вобласці Усесаюзнага агенства па ахове аўтарскіх праў, дырэктарам Рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі (1977–1982). Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве і 19 гадоў (1965–1970, 1978–1992) узначальваў абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі. Друкавацца пачаў з 1953 г. Аўтар кніг: "Две сосны" (1958), "Данута", "Мая Гродзеншчына" (1960), "Пушчанская адысея" (1964), "В одном институте" (1965), "Чаго мы варты" (1970), "След на зямлі" (1972), "Вершалінскі рай" (1974), "Свежая рыба" (1978), "Партрэт" (1983), "Сучасны канфлікт" (1985), "Карані" (1988). У 1980 і 1992 гадах былі выдадзеныя "Выбраныя творы" (абодва выданні ў двух тамах). Творы К. перакладзеныя на рускую, украінскую, літоўскую, латышскую, польскую, чэшскую мовы. Міжнародны біяграфічны цэнтр у Кембрыджы (Англія) высунуў К. на званне чалавека года (1992). Яго біяграфія змешчаная ў зборніку "Who is who". У серыі "Гарадзенская бібліятэка" выйшла кніга ўспамінаў К. "Развітанне з ілюзіямі" (2008). Пераследаваўся КДБ (гл. *Быкаў В.*). У апошнія гады жыцця быў сябрам Беларускага Народнага Фронту. Дапамагаў палякам стварыць Таварыства Культурна-асветніцкае імя А. Міцкевіча (будучы *Саюз палякаў на Беларусі*).

Літ.: Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гродна-Вроцлаў: Гарадзен. б-ка, 2014. – С. 454–456; Гостев А.П. Кронон. Летопись города над Неманом (1116–1990) / А.П. Гостев, В.В. Швед. – Гродно: НВК "Пергамент", 1993. – С. 168; Карпюк А. Развітанне з ілюзіямі. – Гродна-Вроцлаў, 2010; Кіркевіч А. Заходнебеларуская адысея. Аляксей Карпюк // Наша гісторыя. – 2020. – № 3 (20). – С. 18–23; Петрушкевіч А. Старонкі Гарадзеншчыны літаратурнай. Дапаможнік. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 212–232.

Карскі Яўхім Фёдаравіч (1.01.1861, в. Лаша Гродзенскага ўезда – 29.04.1931, Ленінград) – філолаг-славіст, заснавальнік беларускай філалогіі, мовазнаўства і фальклярыстыкі. Скончыў інстытут у Нежыне. Абараніў у Маскве дысертацыю "Заходнерускія пераклады Псалтыра ў XV–XVII стст." (1896). З 1897 – прафесар, а ў 1905–1910 – першы абраны рэктар Варшаўскага ўніверсітэта. Акадэмік Пецярбургскай АН (1916), прафесар Пецярбургскага ўніверсітэта (1917), дзе працаваў да канца жыцця. Акадэмік АН БССР (1922) і Чэшскай АН (1929). Апублікаваў каля 300 навуковых прац. У гісторыю навукі і культуры ўвайшоў як аўтар капітальнай трохтомнай працы "Беларусы". Пахаваны на Смаленскіх праваслаўных могілках у Ленінградзе/Пецярбургу. Яго імем названая адна з вуліц Гродна і Гродзенская абласная бібліятэка. У гродзенскай гімназіі № 1 створаны музей.

Літ.: Булахов М.Г. Е.Ф. Карский. – Минск, 1981; Карнялюк В.Р. Да гісторыі музея Я.Ф. Карскага ў гімназіі № 1 імя акадэміка Я.Ф. Карскага. Гродна: лашанскі перыяд

(1956–1991) // Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў, Гродна 2–13. Вып. 2; Карскі А., Академик Карский // Неман. 2012. – № 3; 2013 – № 3; Цыхун А.П., Акадэмік з вескі Лаша Я.Ф. Карскі (краязнаўча-біяграфічны нарыс. Гродна, 1992;); Швед В. Варшаўскі перыяд жыцця Я.Ф. Карскага і лёс яго біліятэкі // Przegląd Środkowo-Wschodni. – 2020. – 5. – S. 347–361.

Карта ВКЛ радзівілаўская, выкананая рысавальшчыкам і географам *Т. Макоўскім* па ініцыятыве і за кошт Мікалая Крыштафа Радзівіла. Надрукаваная двума выданнямі: першае ў 1604 у Нясвіжы, другое ў 1610 у Амстэрдаме (экземпляр захоўваецца ва ўніверсітэцкай бібліятэцы Упсала). На мапе паказаны павятовы горад *Горадня* перад Люблінскім сеймам 1569 – надпіс па латыні гучыць: civitas judicialis vel districtualis ubi causee nobilium disceptantur. Ён стаіць на беразе ракі *Нёман/Кронан*, каля *моста* праз яе. Па словах даследчыка М. Маралоўскага, Т. Макоўскі намаляваў "даволі правільна мініятурныя профілі аб'ектаў архітэктуры". У профілях *Горадні,* на наш погляд, паказаны *замак Стары* (сцяг азначае рэзідэнцыю вялікага князя літоўскага), ратуша, касцёл каля яе (*Фара Вітаўта*), *царква Барыса і Глеба на Каложы.*

Літ.: Alexandrowicz S. Rozwój kartografii Wielkiego Księstwa Litewskiego od XV do połowy XVIII wieku, Poznań, s. 47–62; Alexandrowicz S. Mapa Wielkiego Księstwa Litowskiego Tomasza Makowskiego z 1613 r. tzw. "radziwiłłowska", jako źródło do dziejów Litwy i Białorusi, s. 50–57 // http.:rcin.org.pl. Дата доступу 20.09.2021.

Карчма – месца для продажу алкагольных напояў, гарачых і халодных закусак, часам з памяшканнямі, якія можна арандаваць для адпачынку на пэўны час (падобна гатэлям). У Гродне іх было некалькі. Пра значныя мы расказваем ніжэй у асобных артыкулах, а тут назавем іншыя. Адна з корчмаў была на вул. Калючынскай (правы бок з *Рынку* да *касцёла езуітаў*), мажліва гэта *гарадская карчма*. Былі яшчэ наступныя: на вул. Маставой (належала *кармеліцкаму касцёлу*); на вул., якая ідзе з Рынку да касцёла бернардзінцаў па левым баку стаяла карчма Сабіноўскага, а далей на юрыдыцы Красіцкага была наступная карчма.

Крын. і літ.: AGAD, zesp. 354, d. 18, syg. 333; Швед В.В. Беларуская карчма – заезны дом для падарожнікаў (XIV – пачатак XX ст.) w: Nowe wyzwania gospodarki turystycznej na poziome lokalnym, regionalnym i międzynarodowym, Białystok 2011, s. 69–81.

Карчма гарадская, знаходзілася на паўночна-заходнім рагу *Рынку*, на скрыжаванні з вуліцай Віленскай (сёння Савецкая плошча і Савецкая вул.). У валочнай памеры Горадні 1560–61 згадваецца як "карчма, дом мескі гасцінны". *Прывілеем Стэфана Баторыя* ў 1579 вызваленая ад аплаты капшчыны (падатку на алкагольныя напоі). Пазней карчма з камяніцай належалі аптэкару і лаўніку А. Ярашэвічу, які набыў пляц у 1659 для забудовы ў Тарасевічаў, якія пацярпелі ад маскоўскіх войск у 1655, а затым суседні пляц ад Самаша. На плане пляца канца 18 ст. паказаныя драўляны дом, камяніца, кухня і стайня. Пасля

Ярашэвіча ўласнікамі карчмы былі дамініканцы (1726), *Сангушкі* (1726–45), *Тызенгаўз А.* (1778–80), райца віленскага магістрата Лаўцэвіч (1789–95), Тызенгаўз І. (з 1795). У сярэдзіне 1880-х – 1 палове 1890-х гг. камяніцай (дзе раней была карчма) валодалі Кацэнэленбогены, на пачатку XIX ст. – Х. С. Левінсон, С. С. Тарлоўская. Яны здавалі нерухомасць у арэнду. Тут месціліся кватэры, крамы, майстэрні, аптэка, банкаўская кантора, на пачатку XX ст. – фотамайстэрня *Л. М. Гельгара.* У "польскі час" тут была крама канцтавараў Х. Міроўскага, цырульня "Міхал і Уладзіслаў", крама Г. Лініка па продажы кравецкіх машын, друкарак, роварaў, матацыклаў, радыёпрыёмнікаў, фота і электратавараў; турыстычнае бюро "Орбіс". У савецкі перыяд у доме размяркоўваліся то крама, то сталовая, то зноў крама (у дадзены момант "Ратушная").

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 281–284; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 43, 115–117; Габрусь Т.В. Гродзенскія корчмы/ Т.В. Габрусь // Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: А.А. Воінаў і інш. – Мінск, 1993. – С. 184; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Т. 1. – Мн, 1985. – С. 150–151.

Карчма на Занёманскім фарштаце – аднапавярховы (2 паловы XVIII ст.) будынак, дзе змяшчаўся гатэль, да тарцоў якога прымыкалі два аднолькавыя корпусы для карэт і стайняў. Утвораны ўнутраны двор, адгароджаны ад вуліцы плотам, выкарыстоўваўся для адкрытай стаянкі вазоў.

Літ.: Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшая школа, 1969. – С. 115–116.

Карчма "Галеча" ("Нэндза") – двухпавярховы будынак з высокім мансардным дахам (2 паловы XVIII ст.). Пабудаваны на вул. Раскоша *Гарадніцы* падчас рэформ *Тызенгаўза А.* (цяпер гэта месца занятае будынкам абласнога выканаўчага камітэта). З дваровага фасада мелася карэтная і стайня, якія паводле канструкцыі і афармленні былі падобныя да вялікіх вясковых хлявоў. На першым паверсе жылой часткі карчмы знаходзіліся агульная зала, кухня і дапаможныя памяшканні, а на другім – пакоі для адпачынку. У гарадніцкіх карчмах у 1782 прадавалі: венгерскае і французскае віны, гарэлку цукровую і гданьскую, піва карчомнае і бутэлькавае, пітны мёд. У расійскі час у будынку знаходзілася Кантрольная палата, а з 1908 яшчэ і фотамайстэрня Краўзеля. У савецкі час – крама "Дзіцячыя цацкі" і афіцэрская сталоўка.

Літ.: Вашкевіч А. Біяграфія гарадзенскіх вуліц: ад Фартоў да Каложы / аўт.: А. Вашкевіч [і інш.]. – Гародня-Wrocław: Гарадз. б-ка, 2012; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшая школа, 1969. – С. 115; Швед В.В. Беларуская карчма – заезны дом для падарожнікаў (XIV – пачатак XX ст.) w: Nowe wyzwania gospodarki turystycznej na poziome lokalnym, regionalnym i międzynarodowym, Białystok 2011, s. 69–81; Sliż N. Horodnica grodzieńska w źródłach wizualnych i dokumentalnych (druga połowa XVIII w.) [рукапіс].

Карчма "Раскоша" – будынак, які з'явіўся на вул. Раскоша *Гарадніцы* падчас рэформ *Тызенгаўза А.* (зараз Ажэшкі, у раёне стаматалагічнай паліклінікі № 1). Складаўся з трох аднолькавых частак: высокай цэнтральнай, дзе былі пакоі для адпачынку; дзвюх меншых па вышыні бакавых, прызначаных на стайні – яны выступалі наперад будынка. Такім чынам утвараўся невялікі парадны дворык, расчынены на вуліцу. У канцы XIX ст. у адным з будынкаў знаходзілася піўная, у другой, да пачатку *вайны Другой сусветнай,* працавала фабрыка мыла і мазей Гіршгорна. У пасляваенны час будынкі існавалі да канца 1960-х, іх займалі транспартная кантора гарадской камунальнай гаспадаркі, харчовая крама, трэст "Гаргаз".

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 19; Саяпин В. Пешком по Ожешко и Советской/ Виктор Саяпин. – Гродно: ООО "ЮрСаПринт" 2011. – С. 6–7; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшая школа, 1969. – С. 115; Швед В.В. Беларуская карчма – заезны дом для падарожнікаў (XIV – пачатак XX ст.) w: Nowe wyzwania gospodarki turystycznej na poziome lokalnym, regionalnym i międzynarodowym, Białystok 2011, s. 69–81; Sliż N. Horodnica grodzieńska w źródłach wizualnych i dokumentalnych (druga połowa XVIII w.) [рукапіс].

Карчынскі/Корчынскі Іван/Іаан Уладзіміравіч (1864, в. Тальная, Уманскага пав. Кіеўскай губ. – 1935, Аліта) – протаіерэй гродзенскага *сабора Сафійскага*. Асоба, якая злучыла беларускі рух з праваслаўнай царквой. Выпускнік Кіеўскай духоўнай семінарыі. У 1887 пасвечаны ў духоўны сан, каля дзевяці год быў вясковым святаром, затым 4 гады – наглядальнікам царкоўных школ. У маі 1900 пераведзены на такую ж пасаду ў Гродзенскую епархію. З 1904 стаў ключнікам і протаіерэям *манастыра Барысаглебскага*. У красавіку-маі 1909 удзельнічаў у Пецярбургу ў працах камісіі па падрыхтоўцы новага парадку выбараў у Дзяржаўную раду ад губерняў Паўночна-Заходняга краю. Быў старшынёй епархіяльнай вучылішчнай рады (1912), чальцом праўлення Гродзенскага *Сафійскага праваслаўнага брацтва*. У складзе дэпутацыі брацтва быў на прыёме ў Мікалая II (8.03.1912), а 1.11.1914 сустракаў яго на гродзенскім вакзале і падносіў ад брацтва падарунак. У кастрычніку 1912 К. адзначыў 25-годдзе царкоўна-адміністрацыйнай і навуковай дзейнасці. Большасць выступоўцаў характарызавала яго як "носьбіта і выразніка аб'яднанай славянскай і нацыянальна-рускай ідэі". З пачатку *вайны Першай сусветнай* быў у бежанстве і жыў у Маскве. У 1917–1918 быў сябрам Сабора Расійскай праваслаўнай царквы. 14.07.1918 пакінуў расійскую сталіцу і прыехаў у Гродна. Тут разам з аднадумцамі стварыў Гродзенскую губернскую рускую (перайменаваную хутка ў беларускую) *управу,* а 27.03.1919 – Гродзенскую беларускую хрысціянскую грамаду (стаў яе старшынёй), быў адным з заснавальнікаў таварыства "Бацькаўшчына". Служыў капеланам палка Першага беларускага пяхотнага. 4.04.1919 кааптаваны ў склад Літоўскай рады. Летам 1919 быў арыштаваны палякамі, сядзеў у Кракаве. У 1920 пераехаў у Коўна.

У 1923–29 быў старшынёй Рады Літоўскай Праваслаўнай епархіі. У 1926–35 – праваслаўны капелан Літоўскага войска. Стаў адным з арганізатараў беларускага антыпольскага партызанскага руху, сябрам штаба атамана Хмары (гл. *Разумоўскі Вячаслаў*).

Аўтар прац: Личность учителя начальной церковой школы/ свящ. И. Корчинский. – Гродно, 1901. – 12 с.; Торжество перенесения Рождество-Богородицкого монастыря из гор. Гродно в урочище Красносток Сокольского уезда / Корчинский. – Гродно, 1901. – 14 с.; Очерк истории церковного дела в Гродненской губернии в XIX ст. / И. Корчинский. – Гродно, 1903. – 131 с.; Русь и Польша: краткая история для русского народа / изложил по Купчанко И. Корчинский. – Гродно, 1903. – 67 с.; Братское приветствие православным русским и всем близким сердцу славянам, кои и не пребывают ныне в вере православной / изложил по Ширяеву свящ. И. Корчинский. – Гродно, 1903. – 34 с.; Граф Михаил Николаевич Муравьёв / Составил И. Корчинский. – Гродно, 1904. – 12 с.; Краткий исторический очерк православия в пределах нынешней Гродненской губернии и житие св. преподобного мученика Афанасия (Филиповича) / И. Корчинский. – Гродно, 1903. – 74 с.; Православный Софийский собор в гор. Гродно / И. Корчинский. – Гродно, 1907. – 20 с.; Древняя Коложская церковь во имя святых князей Бориса и Глеба в городе Гродно / И. Корчинский. – Гродно, 1908. – 24 с.; Что такое баптизм? Исторический очерк и характеристика этого религиозного движения. Штундо-баптизм в России / И. Корчинский. – Гродно, 1911. – 38 с.

Літ.: Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў / А. Чарнякевіч. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 111–112; Черепица В.Н. …Не потерять связующую нить: история Гродненщины XIX-XX столетий в событиях и лицах: исследования, документы, комментарии / В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 2003. – С. 240–241; Щавинская Л.Л., Лабынцев Ю.А. Гродненский протоиерей Иоаан Корчинский – составитель народных изданий // Здабыткі. Вып. 11. – Минск: НББ, 2009. – С. 140–152; Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich= Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– S. 208.

Касакоўскі Юзаф Корвін – дырэктар Гродзенскай *гімназіі* ў 1803–1807 гг., меў 7-класны чын., аглядаў школы і рабіў два разы на год справаздачу ў Віленскі ўніверсітэт. Брат віленскага біскупа, дырэктар школ Гродзенскай губ., потым Віленскай губ. (1808–1913), інспектар школ у 1815 г.

Кансценчык/Касценчык Авенір Маркавіч (2.08.1889, Гродна – 29.12.1935, Стаўбцы) – вайсковы лётчык, камандзір першага ў свеце цяжкага бамбардзіроўшчыка “Ілля Мурамец-Х”. Скончыў Віленскае вайсковае вучылішча і Вайсковую авіяцыйную школу ў Гатчыне. Служыў мал. афіцэрам Брэст-Літоўскага крапаснога авіяцыйнага атрада, у Эскадры паветраных суднаў (з 22.09.1914), камандзірам самалёта “Ілля Мурамец-Х” (з 13.12.1914). За ўдзел у *вайне Першай сусветнай* узнагароджаны 6 ордэнамі: Св. Станіслава 3-й ступені

і 2-й ст. з мячамі; Св. Ганны 3-й ст. і 2-й ст. з мячамі; Св. Уладзіміра 4-й ст. з мячамі і бантам; Св. Георгія 4-й ст.

Літ.: Саяпин В., История общественного транспорта Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – с. 173–175; Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Книга 2-я. – Минск, 1987, с. 232.

Касцёл Адшуканага Святога Крыжа і кляштар бернардзінцаў, асаблівасцю якога з'яўляецца наяўнасць трох стыляў: готыкі, рэнесансу, барока. К. спачатку быў драўляны (1494–95). Мураваны касцёл збудаваны да 1600 г., бо ён бачны на гравюры Т. Макоўскага, а даты 1602–1618 гг., якія адносяць да касцёла на самой справе – пачатак і канец будаўніцтва мураваных сцен кляштара. У 1602–1605 касцёл дабудоўваўся. Падчас вайны маскоўска-польскай і вайны польска-шведскай 1654–1667 вельмі пацярпеў. У сяр. XVII ст. люблінскія майстры пабудавалі ў касцёле хоры. У 1682 г. касцёл і кляштар перабудавалі. У XVIII ст. адбыліся новыя дабудовы: вежа-званіца, жылы корпус, мураваная агароджа вакол касцёла. У той час існавалі сад, гарод, двор з гаспадарскімі пабудовамі. У правай наве касцёла знаходзіцца абраз Маці Божай Месінскай (сяр. XVIII ст.), які пакрыты срэбнай тканінай. Ёсць памятная дошка, на якой напісана, што тут 2.11.1894 г. *Эліза Ажэшка* і Станіслаў Нагорны ўзялі шлюб. У кляштарных будынках цяпер знаходзіцца семінарыя Вышэйшая Духоўная.

С. 862

Літ.: Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – 26, 30.

Касцёл і кляштар баніфратраў, узнік пасля 1725 г., калі віленскі біскуп П. Панцажынскі даў ордэну 8 моргаў зямлі. Знаходзіўся на вул. Баніфратарскай/Татарскай. Пры ім быў шпіталь для бедных з 1729 па 1843. У 1808 расійскі імператар Аляксандр I падараваў К. *бровар* на вул. Верцялішкаўскай/Ажэшкі для шпіталя. Падчас *вайны 1812* ён быў заняты пад склад.

Літ.: Grodno w polskim okresie jego dziejów // Głos znad Niemna. 1917: jednodniówka grodzieńska – Grodno, 1918. – S. 23.

Касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай Дзевы Марыі і кляштар брыгітак – комплекс пабудоў па вул. К. Маркса, які ўзнік дзякуючы фундацыі маршалка ВКЛ *Кшыштафа Весялоўскага* і яго жонкі Аляксандры Сабескай (акт фундацыі 1642 г. напісаны на пергаменце лацінскай мовай, захоўваецца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве). У 1616 яны ўдачарылі Грызельду – дачку Яна Вадынскага і Зоф'і Сабескай, роднай сястры Аляксандры. У 1633 яна памерла, а за два дні да гэтага, 19 студзеня, напісала тастамент, адпаведна з якім Весялоўскія атрымоўвалі 80 тыс. польскіх злотых. Каб увекавечыць імя прыёмнай дачкі, Весялоўскія прызначаюць атрыманыя грошы, а таксама дадаюць свае на пабудову касцёла і кляштара брыгітак у Гродне. У 1634 быў атрыманы дазвол на пачатак прац ад віленскага епіскапа Абрахама Войны.

С. 863

На працягу 1636 былі пабудаваныя драўляныя кляштар і касцёл на мураваным фундаменце, усё абнеслі мураванай сцяной з дзвюма брамамі. У гэтым жа годзе ў Гродна з Любліна прыбылі 8 манашак на чале з Даротай Фірлей, а 10 снежня адбылася элекцыя першай ігуменні брыгіцкага кляштара ў Гродне Ганны Сабескай, роднай сястры А. Весялоўскай. Першыя манашкі пасялілiся ў драўляным *лямусе*. У студзені 1637 у касцёл быў перавезены з Вільні прах Грызельды, а ў красавіку тут пахавалі Кшыштафа Весялоўскага. Тады ж сталі будаваць мураваны касцёл паводле праекта Бенедэта Малі. Калі ў 1642 А. Весялоўская склала фундацыйны дакумент, касцёл быў пабудаваны, працягваліся ўнутраныя працы. Асноўныя абавязкі манашак (каля 30 асоб) згодна з фундацыяй – малітвы за душы Грызельды і памерлых фундатараў. Дапамагалі ім 6 ксяндзоў. А каб манашкі не турбаваліся бытавымі праблемамі, кляштар атрымаў маёнткі (Каханова, Вузловічы, Крамяніца, Князікоўшчына, Марцінавічы, Шылавічы, Задвор'е, Рагозніца) і чыншы з розных маёмасцяў. 19.10.1651 г. мураваны касцёл быў асвячоны віленскім біскупам Е. Тышкевічам. Касцёл размешчаны (як і ўвесь комплекс) на важнай гарадской магістралі, якая ішла на Вільню па сучасных вуліцах Маркса і Замкавай. Брыгіткі як бы сустракалі тых, хто прыязджаў у Гродна з віленскага напрамку. У адрозненне ад многіх польскіх і літоўскіх касцёлаў таго часу, брыгіцкі касцёл характарызуецца большай строгасцю і сціпласцю, у яго барочнай архітэктуры назіраецца адхіленне ад кананічных формаў. Гэта праяўляецца ў вольнай трактоўцы капітэляў, пілястр, у дэкаратыўным афармленні парталаў і асабліва брам манастырскай сцяны, якія толькі аддалена нагадваюць элементы заходнееўрапейскай архітэктуры. Дэкор фасаднага фрыза выкананы ў тэхніцы сграфіта – раслінны арнамент у спалучэнні з выявамі міфалагічных істот. Унутры храма варта паглядзець на 14 гарэльефных сюжэтна-скульптурных пано на тэму Крыжовага шляху Хрыста, размешчаных па бакавых нефах і пад хорамі. У глыбокай нішы бакавой сцяны знаходзіцца скульптурная кампазіцыя "Пакутны Хрыстос і Марыя".

Часткова захавалася мураваная агароджа, вышынёй каля 5 м., з вуглавымі квадратнымі ў плане вежамі і брамамі. Па-за межамі агароджы, па другім баку сучаснай вуліцы К. Маркса (тады Язерскай), знаходзілася вежа-званіца ў стылі класіцызму. Дату пабудовы вызначыць цяжка, бо на планах Гродна 1706 і 1753 яна ёсць, а на планах 1780–83 вежы няма, на плане 1795 з'яўляецца зноў. Вежа была трох'яруснай пабудовай, на першым і другім паверсе, магчыма, былі жылыя памяшканні. Архітэктура вежы-званіцы нагадвала крапасную гарадскую вежу. 3 мая 1966 яе знеслі. Сведкай быў гісторык *Клейн Барыс*, які прасіў вайскоўцаў стрымаць працы, пакуль ён пойдзе да ўладаў, каб вырашыць пытанне захавання помніка гісторыі і культуры. Разам з *Быкавым В.* і *Карпюком А.* пайшлі ў абкам партыі, але там ім нічым не дапамаглі і прапанавалі пакласці партыйныя білеты на стол за абарону "рэлігіі і цемрашальства".

У 1842 г. кляштар быў скасаваны, у яго будынках пасялілі манашак з закрытых кляштараў Нясвіжа, Луцка, Навагрудка. У 1842 расійскія ўлады

забаранілі прымаць новых манашак, і тым самым ён мог быць скасаваны пасля смерці апошняй з манашак (1908). У 1905 кляштар перадалі ордэну Святой сям'і з Назарэта. Тут з 1909 пробашчам быў Ф. Грынкевіч – беларускі рэлігійны і культурны дзеяч. Пад выглядам назарэтанак віленскі біскуп Э. Роп пасяліў тут некалькі сясцёр брыгітак. Апошнія выявілі сябе толькі з адраджэннем другой Рэчы Паспалітай. Дэкрэтам віленскага біскупа ад 7.09.1923 назарэтанкі прынялі спадчыну пасля брыгітак. Складзены ў 1925 інвентар маёмасці і нерухомасці захоўваецца ў Літоўскім дзяржаўным архіве.

Падчас *вайны Вялікай Айчыннай* ў кляштары размяшчаліся медыцынскія ўстановы. У 1945 г. большая частка назарэтанак пераехала ў Правінцыйны дом у Варшаве. Рашэннем гарадзенскіх уладаў ад 25.03.1950 манахіні былі выселеныя з кляштара, ён перайшоў у валоданне аддзелу аховы здароўя, і каля 40 гадоў тут знаходзіўся псіхіятрычны шпіталь. З былой бібліятэкі захавалася 130 аб'ектаў (рукапісаў, старадрукаў і кніг XIX ст.). У 1950-я гады была разабраная ўся агароджа з паўднёвага боку разам з дзвюма вонкавымі вежамі, брама, частка ўсходняй сцяны і званіца. У 1961 даследчыца архітэктуры *А. Д. Квітніцкая* знайшла ў падвалах касцёла кляштарны архіў (цяпер матэрыялы знаходзяцца ў мясцовым гісторыка-археалагічным музеі і Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне), а мастацтвазнаўца *А. В. Аладава* – партрэты Кшыштафа і Аляксандры Весялоўскіх, Грызельды Вадынскай. Яны былі адрэстаўраваныя ў Дзяржаўным Рускім музеі А. Брындаравым і дэманструюцца ў Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі ў Мінску. У 1990 г. касцёл перадалі рымска-каталіцкай царкве, і 2.06.1992 ён быў асвячоны арцыбіскупам *Т. Кандрусевічам*.

Крын. і літ.: Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння. – Мінск, 1996, с. 48–51; Саяпин Ю.В. Утраченные католические храмы Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 101–102; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 30–31; Kałamajska-Saeed M. Archiwum i biblioteka klasztoru brygidek w Grodnie. Inwentarz z 1925 r. i stan współczesny. – Wrocław: Tow-wo Miłośników Historii, 2015. – S. 7, 19.

Касцёл Маці Божай Анёльскай і кляштар францішканцаў, заснаваныя ў 1636 г. старастам упіцкім Яўстахіем Курчам і яго жонкай Сузаннай з Тышкевічаў. Пабудавалі храм з дрэва ў *Занёманскім прадмесці* Гродна, на левым высокім беразе *Нёмана* (сучасны адрас: вул. Агародная, 2). Курч падараваў манахам мураваны дом у горадзе. Падчас *вайны польска-расійскай* у 1659 касцёл быў разрабаваны шведскімі вайскоўцамі і згарэў. Да адраджэння касцёла спрычыніліся віленскі ваявода *Пац Міхал*, падстолі гарадзенскі Гедэон Хладавіцкі. Працы скончыліся ў 1680. Храм і званіцу збудавалі ў стылі барока, на фасадзе маюцца пілястры. Касцёл – трохнефавая базіліка, галоўная нефа пераходзіць у галоўны алтар. Яна пакрытая двухсхільным дахам, а бакавыя нефы – аднасхільным. Унутры касцёла столь галоўнага нефа і прэзбітэрыя аздобленыя фрэскамі біблейскага характару (евангелісты, пастухі, сцэны з жыцця Маці Божай). У тэхніцы паліхроміі выкананыя вітражы на

С. 864

С. 865

сюжэты жыцця Маці Божай і Хрыста. Галоўны алтар драўляны XVIII ст. у стылі позняга барока, двухузроўневы; астатнія – мураваныя і атынкаваныя; усе маюць скульптуры. Амбон зроблены ў стылі ракако, з постацямі евангелістаў. З 1697 касцёл стаў парафіяльным. У 1744 быў асвечаны ў імя Дзевы Марыі Анёльскай. У сярэдзіне XVIII ст. касцёл пражыў пажар. Вялікую дапамогу ў аднаўленні ўнутранай дэкарацыі і набыцці арганаў аказала Лаза Канстанцыя (гл. *Лаза Самуэль*), мсціслаўская кашталянка. У 1853 царская ўлада зачыніла касцёл, а з падаўлення *паўстання 1863–64* і да *вайны Першай сусветнай* ператварыла яго ў турму для духоўных асоб, падазраваных у антырасійскай дзейнасці. У міжваенны час ксяндзамі былі *Фардон Мельхіёр*, Дуда Яўстахі, *Кольбэ Максіміліян*, Пзынер Сільверст. Падчас *вайны Другой сусветнай* пастырскую службу аджыццяўлялі Клімчак Дыянісі (забіты немцамі ў 1943), Стшалевіч Тытус, Апалоніюш, Рудніцкі Цэцыліян, дзякан Валтас Аркадыюш (яму прысвечаная мемарыяльная дошка). У адной з келляў у 1909–13 жылі гродзенскія гімназісты з Сакольшчыны Янка Ляўковіч, Адольф Зянюк, Баляслаў Грабінскі, якія належалі да беларускага гуртка моладзі "Хатка".

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 11; Павач. А. Шпацыр па Гародні. Шляхаводнік. – Вільня: ЕГУ, 2018; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 32–33; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 224–231.

Касцёл Найсвяцейшага Адкупіцеля, знаходзіцца на Дзевятоўцы, збудаваны з клінкера, абчэсанага каменя і бетона каля драўлянай капліцы пачатку 1990-х гадоў. Будаўніцтва пачалося ў 1997 г. паводле праекта Генрыка Зубеля. 7.10.2000 у сцяну касцёла ўмураваны асвечаны Папам рымскім Янам Паўлам II камень з труны Св. Пятра. 15.10.2011 ксёндз біскуп *Аляксандр Кашкевіч* урачыста асвяціў касцёл пад імем Найсвяцейшага Адкупіцеля.

Літ.: Poczobut-Odlanicki St. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok, 2015. – S. 192–193.

С. 866

Касцёл Нараджэння Н. М. П. і кляштар бернардзінак, які знаходзіўся на вул. Маставой з 1621. Пабудаваны на сродкі фундацыі жмудскага старасты Гераніма Валовіча касцёл быў драўляным і называўся Панны Марыі з Арачэлы. Мураваны збудаваны ў 1650–51 у стылі барока па ініцыятыве падканцлера ВКЛ Казіміра Сапегі. Асвечаны віленскім біскупам Ежым Тышкевічам у 1651 г. У 1850 касцёл меў 40 локцяў у даўжыню і 15 у шырыню, было 7 алтароў. Вакол храма і манастырскіх могілак стаяў плот, уваход быў праз двухпавярховую каменную браму. У 1854 касцёл быў перададзены праваслаўным і, пасля разбурэння *царквы Св. Барыса і Глеба на Каложы*, сюды былі пераселеныя манахі-ўніяты. У 1890-я адбылася рэканструкцыя: дах панізілі, зробілі купал на васьмігранным барабане ў псеўдарускім стылі, на званіцу-браму паставілі купал-цыбуліну, зрабілі агароджу. У 1893 асвяцілі храм у імя прападобнага

Афанасія Берасцейскага. У кляштары размясцілі царкоўна-археалагічны *музей*. Кляштар бернардзінак меў зямельную маёмасць: фальваркі Залессе ад Гераніма Валовіча, Жэраслаўка (набыты з сумаў пасадаў манашак, галоўным чынам Тэафіліі Сапяжанкі ад Мікалая і Крыштафа Кунцэвічаў), Адамовічы і Плябанаўцы. Пасля 1797 г. гэта маёмасць была забраная. Кляштар карыстаўся правам доступу да пушчаў Берштанскай і Стрыёўскай ды млына ў *Ласосне*. Сейм 1678 г. вызваліў кляштар ад кватаравання войска і мясцовых падаткаў. На касцельнай вежы калісьці віселі два званы (з 1545 і 1672). У прэзбітэрыі захоўваліся два склепы з пахаваннямі – у адным ляжалі колішнія манашкі і фундатары, а ў другім невядома хто. Ядкоўскі Ю**.** пісаў у 1830 г. пра захаваную на той час трапезную, адноўленую дырэктарам семінарыі Ю. Беганскім; уязную вежу-браму. З мурамі касцёла і кляштара звязаная літаратурная праца *Зындрам-Касцялкоўскай В.*

У 1920-я гады ў кляштары знаходзіліся беларускія грамадскія і асветніцкія арганізацыі: сакратарыят Беларускага пасольскага клуба, канцылярыя беларускай настаўніцкай рады, Беларуская школьна-прытулкавая рада, Беларускі камітэт дапамогі пацярпелым ад вайны, рэдакцыя газеты "Сялянская гутарка", Гродзенскае аддзяленне Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, *гурток гарадзенскі беларускай моладзі, прытулак дзіцячы беларускі, школа беларуская,* беларуская кнігарня. У манастырскіх келлях жылі: Амяльянчык М., Буднік Е., *Буйло С.*, *Грыкоўскі А., Дзекуць-Малей Л.*, Кішко С., Кухарчук А., Лічыцкі Д., Лукашык Л., Шах А. і інш. У 1930-я гады ў будынку манастыра дзейнічала кравецкая гімназія.

У 1951 будынак займала будаўніча-мантажнае ўпраўленне, затым рашэннем камітэта гарадскога выканаўчага ён быў перададзены пад склад гродзенскаму гархарчпрамгандлю. У 1959 кляштарныя памяшканні выкарыстоўваліся як інтэрнат тонкасуконнага камбіната. У 1964 гарадскія ўлады задумалі разабраць ужо разбураны касцёл і кляштар, а тэрыторыю выдзеліць для будаўніцтва трохпавярховага будынка кафетэрыя. Апошні не быў пабудаваны, на яго месцы з'явіўся ў 1970-я гады *тэатр абласны драматычны*.

Літ.: Кулагін А.М. Касцёл і кляштар бернардзінак // Каталіцкія храмы Беларусі: энцыкл. даведнік. – Мн., 2008. – С. 410; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 63; Саяпин Ю.В. Утраченные католические храмы Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 39–50; Pawłowska H., Grodzieńskie kroniki klasztorne XVII i XVIII w. Formy gatunkowe i aspekty komunikacyjne. – Warszawa, 2013 (praca doktorska, "Artes Liberalis" UW). Гл. таксама яе публікацыі ў Бібліяграфічным спісе дадзенай кнігі.

Касцёл Прасвятой Дзевы Марыі Ружанцовай і кляштар дамініканскі. Кляштар размешчаны на вул. Савецкая, 6 (былая Віленская і Дамініканская). Існуе некалькі датаванняў будаўніцтва кляштара і касцёла. Паводле Т. Маліноўскай яны заснаваныя паводле прывілею Жыгімонта III ад 1632 г. і праз год былі пабудаваныя на грошы мсціслаўскага ваяводы Фрыдэрыка

Сапегі і яго жонкі Крысціны з Пацаў. Польскі даследчык П. Баравік таксама гаворыць пра 1632, калі Сапегі перадалі дамініканцам свой мураваны дом (стары К., відаць, адразу быў мураваным). *Яднкоўскі Ю.* пісаў пра будаўніцтва касцёла ў 1703, а інвентар 1830 г. дае дату 1708 (гэта новы 3-апсідны мураваны К. з 9 алтарамі). У 1727 касцёл асвечаны ў імя Прасвятой Дзевы Марыі Ружанцовай. Згодна з інвентаром 1830 будынак касцёла быў моцным і надзейным, меў 11 алтароў з жывапіснымі абразамі, на сцяне былі партрэты фундатараў касцёла – *Сапег*. У інвентары 1855 згадваецца бронзавы бюст *Станіслава Аўгуста Панятоўскага*, які знаходзіўся насупраць амбона, які быў злева ад ад увахода ў касцёл. З 1832 К. стаў гімназіяльным, а пасля паўстання 1863–64 быў перароблены ў праваслаўную гімназіяльную царкву, пазней – у вайсковую царкву 14 палка Ямбургскіх уланаў. У 1875 касцёл быў зліквідаваны, а на яго месцы зроблены сквер, які існуе да сённяшняга дня.

Кляштар згадваецца ў 1635, і невядома, ці быў ён драўляны, ці мураваны. Вядома, што існы цяпер цагляны двухпавярховы будынак у класічным стылі ўзведзены ў 1735 (так званы "стары") айцом Т. Ганусевічам і архітэктарам Л. Грынцэвічам. Дабудаваны ў 1760-я гг. (так званы "новы") уздоўж вуліцы Віленскай. Змены будынка кляштара апісаныя ў яго інвентарах 1820, 1830 гадоў і на *планах горада* 1753, 1795. У 1840 кляштар быў зачынены. У яго будынку ў розны час знаходзіліся навучальныя ўстановы: *школа дамініканская*, *гімназія дамініканская*, *гімназія мужчынская губернская,* мужчынская класічная гімназія імя генерала Тармасава, семінарыя настаўніцкая *Польскай мацежы школьнай*, *школа фольксдойчэ* двухкласная народная, аднакласная народная школа для райхсдойчэ (1943). У 1954 г. у будынку працаваў каўбасны цэх мясакамбіната. Цяпер на першым паверсе знаходзяцца крамы, а на другім – жылыя памяшканні.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 285, 288, 291; Маліноўская Т. Р. Гродзенскі кляштар дамініканцаў // Архітэктура Беларусі: энцыкл. даведнік. – Мн., 1993. – С. 178; Саяпин Ю.В. Утраченные католические храмы Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 85–92; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 35; Jodkowski J. Gimnazjum po-dominikańskie w Grodnie. – Grodno, 1924.

Касцёл Св. Духа і шпіталь, пабудаваны на сродкі каралевы *Боны* ад 9.10.1551 на Пушкарскім месцы (вул. Дамініканская і завулак Хлебны) – абарончай мяжы Гродна сяр. XVI ст. (цяпер вул. Савецкая, 14). Польскі даследчык Е. Лілейка лічыць, што аўтара праекта трэба шукаць сярод кола Яна Баптыста Квадра. Т-падобны ў плане будынак меў на галоўным фасадзе 4 круглыя калоны. Касцёл знаходзіўся ў цэнтры кампазіцыі кляштара і меў невялікія памеры да 1792 г., калі дабудавалі другі паверх. Перабудоўваўся ў 1802, 1817, 1843, 1890 гг. Немцы падчас *вайны Другой сусветнай* зруйнавалі апсіду касцёла.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 294–295; Квитницкая К.Д. Малоизвестные

зальные сооружения Белоруссии конца XV – XVI в. – Архитектурное наследство. – № 16, Москва 1967. – С. 5; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 19; Grodno w polskim okresie jego dziejów // Głos znad Niemna. 1917: jednodniówka grodzieńska – Grodno, 1918. – S. 23.

Касцёл Св. Тройцы (Траецкі) кляштара аўгусцінцаў, пабудаваны каля 1492–94 гг. вял. кн. *Аляксандрам Ягелончыкам* каля Нямецкага *рынку*, на перакрыжаванні сучасных вуліц В. Траецкай і Дамініканскай. У сяр. XVII ст. кляштарныя пабудовы былі спаленыя, і ў 1673 кляштар спыніў сваё існаванне.

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 32; Гардзееў Ю. Гарадская прастора ў XVI – XVIII стст. // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 96.

Касцёл Святога Францішка Ксаверыя, да 1798 г. езуіцкі, пасля фарны. Спачатку існаваў драўляны невялікі касцёл Св. Пятра і Паўла, прыкладам для якога стаў касцёл Хрыста ў Рыме. Будаўніцтва мураванага адбывалася з 1678 на сродкі фундацыі Самуэля і Канстанцыі Лозаў *(гл. Лаза)*. Вуглавы камень пад фундамент асвяціў 21.06 біскуп Мікалай Слупскі. Кіраўніком прац да 1684 быў Геранім Дзевалтоўскі, а ў 1684–1697 – ксёндз Пётр Алізаровіч. У 1700 у новым касцёле прайшло першае набажэнства. 6.12.1705 ён быў асвячоны ў імя св. Францішка Ксаверыя ў прысутнасці вялікага князя літоўскага і польскага караля *Аўгуста II* ды расійскага цара *Пятра I*. Адна з асаблівасцяў касцёла – вялікія памеры храма (план 30х60, вышыня – каля 50 м) – садзейнічала таму, што ён быў на працягу стагоддзя архітэктурнай дамінантай у забудове цэнтральнай часткі Гродна. Другая асаблівасць заключаецца ў прасторавай кампазіцыі касцёла: у ім сумясціліся сістэмы базілікальнага і цэнтрычнага крыжова-купальнага храмаў. Такі тып пабудовы даволі рэдкі ў каталіцкай архітэктуры. Прататыпам храма такога роду лічыцца Езуіцкі сабор у Рыме. Памеры, месцазнаходжанне і багатае ўпрыгожванне касцёла, яго зямельныя валоданні (падчас касацыі ордэна езуітаў касцёл меў 7 фальваркаў і 25 вёсак) былі прыкладам распаўсюджвання каталіцкай экспансіі на беларускіх землях, імкнення ордэна езуітаў да царкоўнай манаполіі. Калі мы глядзім на храм з Савецкай плошчы, дык бачым яго заходні барокавы фасад. Кідаюцца ў вочы шматлікія спараныя пілястры, якія ўпрыгожваюць усе ярусы і паказваюць дзяленне помніка на тры нефы. Сённяшнія формы вежаў (лёгкія і ажурныя) надбудаваў у 1750–1752 гг. "майстар мулярскага мастацтва" Хрысціян Бурман. У светлавым акне над уваходным парталам відаць глыбокую нішу-балкон, дзе змяшчаўся аркестр. У арачных нішах стаяць драўляныя скульптуры апосталаў Пятра і Паўла (яны нагадваюць пра былы на гэтым месцы драўляны касцёл), св. Ксаверыя, вытачаныя разьбяром Георгіем Гісам у 1768 г. У 1725 на вежы быў усталяваны *гадзіннік гарадскі* (помнік XVII ст.). Падымаемся ў касцёл па збудаванай на пачатку XX ст. двухмаршавай лесвіцы, праходзім побач з пастаўленай на парапеце

С. 867

С. 868

скульптурай Хрыста, які нясе крыж (1898), і ўваходзім у храм праз даволі малыя і цесныя каваныя жалезныя дзверы, зробленыя кавалём Я. Біршам ў 1744 г. (рэстаўрацыя ў 2000). Унутры, пры ўваходзе, знаходзяцца хоры, на якія ўвайсці можна па вінтавых сходах, схаваных у тоўшчы заходняй сцяны. Тут усталяваны арган, куплены ў 1744 у Караляўцы (сёння Калінінград). Ва ўсходняй частцы, у цэнтральнай апсідзе змяшчаецца галоўны алтар (вышыня 21 м) у стылі позняга барока. Усе калоны і фігуры вытачаныя з дрэва вышынёй у чалавечы рост разьбяром Янам Хрысціянам Шмітам з польскага г. Рэшаля ў 1736–1737 гг. (кантракт з ім падпісаны 14.12.1736 і захоўваецца ў Гістарычным архіве старажытных актаў у Маскве). Алтар мае трох'ярусную кампазіцыю. На першым мы бачым 13 скульптурных выяў – Св. Ксаверыя, 10 апосталаў, патронаў касцёла св. Самуэля і св. Канстанцыі. На другім – Хрыста, евангелістаў і 4 айцоў царквы. Усе святыя ў маляўнічых паставах: некаторыя зацікаўлена размаўляюць, іншыя нешта паглыблена абдумваюць, твары ва ўсіх вельмі натхнёныя. На трэцім – скульптурная алегарычная кампазіцыя, якая адлюстроўвае перамогу дабра над злом. Завершаны алтар 5-метровай глорыяй, якая абрамляе акно апсіды. Перад ёй схіляюць галовы 4 бакі свету, увасобленыя ў жаночых вобразах. Акрамя галоўнага ў касцёле ёсць яшчэ 12 бакавых алтароў: 2 у капліцах, 4 у трансепце і 6 кулісных. У левым нефе знаходзіцца капліца з алтаром св. Міхала Арханёла, якая імаверна засталася ад старога драўлянага касцёла. Тут ёсць скульптурныя выявы дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага. У правым – капліца Маці Божай Студэнцкай (Кангрэгацкай) з мураваным алтаром, выкананым у тэхніцы бежавага стука ў стылі класіцызму (1760-я гады). Абраз Маці Божай з'яўляецца копіяй абраза з базілікі Санта Марыя Маджорэ ў Рыме, падараваны віленскім ваяводам Казімірам Янам Сапегам. Пры першых пілонах ад увахода стаяць алтары Маці Божай Шкаплернай (магчыма, з зачыненага *касцёла кармелітаў*) і святога Юзафа (1715). Пры другім правым пілоне знаходзіцца алтар Язафата Пакутніка (1715). Маюцца таксама алтары апосталаў Тадэвуша (апекуна будаўнікоў і архітэктараў), Ісуса, Св. Ігнацыя Лаёлы і Св. Борджыя (цяпер Святой Тройцы і Маці Божай Ружанцовай), Св. Станіслава Косткі і *Св. Казіміра* (адпаведна апекуноў Кароны Польскай і ВКЛ). Уражвае дэкор амбона касцёла з высокім балдахінам, які падтрымліваецца ракавінай-кансоллю (стыль ракако). Звяртаюць увагу 4 драўляныя спавядальні, зробленыя, як і амбон, у стылі ракако (частка з іх выкананая ў 1768 майстрам І. Майфельтам). Прыцягвае зрок фрэскавы жывапіс на прасценках над аркамі цэнтральнага нефа, трансепта і прэзбітэрыя. Магчыма яго намаляваў чэшскі мастак Ігнацы Дарэці (на апошняй выяве ёсць манаграма "B.I.:D.P.1752"). 14 сюжэтных кампазіцый памерам 1,5х4 м (1752 г.), упісаных у прамавугольныя рамы, прысвечаныя эпізодам з жыцця святога Францішка Ксаверыя (найбліжэйшага паплечніка Ігнацыя Лаёлы). Насупраць галоўнага алтара, каля прэзбітэрыя, стаіць старажытная драўляная лава, на спінцы якой 16 розных гарэльефных выяў, якія адлюстроўваюць драматычныя падзеі 1696 г., калі было скрадзенае срэбнае ўбранне з абраза Маці Божай Студэнцкай, а К. Сапегу прыснілася Найсвяцейшая Панна

ў лахманах. Сапега падараваў касцёлу ўбранне з золата. На малюнках паказаныя злодзеі, якія здзіраюць убранне, ложак, на якім спіць магнат, працэс замаўлення новага ўбрання ў майстра. У касцёле вісяць некалькі мемарыяльных дошак. Адна з іх прысвечаная прафесару фізікі Ягелонскага ўніверсітэта У*рублеўскаму З. Ф.*, ураджэнцу Гродна (1845 г.), удзельніку паўстання 1863–64 гг. на Гродзеншчыне. Другая – *Андрэю-Тадэвушу Касцюшку,* кіраўніку *паўстання 1794* г. У касцёле знаходзіцца *помнік Тызенгаўзу Антонію*. Рамонты касцёла адбываліся ў 1818 г. пасля пашкоджанняў ад буры, а таксама ў 1876 г. Цікавым з'яўляецца звон касцёла, зроблены Гансам фон Охрумам з Караляўца, на якім ёсць надпіс: "Я загучаў адліты ў 1637 годзе".

Крын. і літ.: Мілінкевіч А. З гісторыі званоў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1988. – № 4. – С. 22–23; Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 63; Сліж Н.У. "Збор знакамітых цудаў і ласкаў Найсвяцейшай Панны Марыі Студэнцкай" як крыніца па гісторыі Гродна / Н.У. Сліж // Архіварыус: зб. навук.-папул. паведамл. і арт. Сер.: гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства. – 2009. – Вып. 7. – С. 132–181; Сліж Н. Лава ў капліцы Маці Божай Студэнцкай у Фарным касцёле Гародні / Н. Сліж // Arche. – 2010. – № 1–2. – С. 66–97; Сліж Н.У. "Збор знакамітых цудаў і ласкаў найсвяцейшай панны Марыі Студэнцкай" як унікальная крыніца па гісторыі Гародні. Манаграфія. – Мінск, 2019; Ярашэвіч А.А., Бажэнава В.Д. Гродзенскі кафедральны касцёл Святога Францыска Ксаверыя. – Мн.: "Беларусь", 2005. – С. 5–43; Bohatyrewicz W. Kościół Pw. Św. Franciszka Ksawerego w Grodnie. Bryła architektoniczna i wystrój wnętrza // Archiwa. Biblioteki b Muzea kościelne. T. 100. – Lublin: KUL, 2013. – S. 35–53.

Касцёл Узвышэння святога крыжа і кляштар кармелітаў босых, узнік на зямлі, падараванай Андрэем Катовічам і ягонай жонкай Барбарай насупраць *царквы Чэснага Крыжа*. У 1652 на капітуле правінцыі ў Любліне была разгледжаная просьба віленскага біскупа Ю. Тышкевіча прыняць фундацыю Катовічаў і заснаваць кляштар у Гродне. У магдэбургскіх кнігах за 1663 г. гаворыцца пра "новы касцёл кармелітаў" каля камяніцы гродзенскага *старасты* А. Катовіча. У *Хроніцы* кармелітаў адзначана, што ў ёй пэўны час жылі браты-заснавальнікі рэзідэнцыі. Апошняя ў Гродне была зацверджаная 15.06.1673. У наступным годзе ўніяцкі мітрапаліт К. Жахоўскі выдзеліў кармелітам царкоўны ўчастак і могілкі гарбарнага брацтва. У 1676 быў складзены акт фундацыі канвенту кармелітаў босых у Гродне, адпаведна з якім Катовічы перадалі ордэну купленыя ў 1671–76 пляцы. Спачатку касцёл быў драўляным, меў 5 залочаных алтароў. Выгляд зафіксаваны на планах Гродна 1655 і 1706 – прамавугольны ў плане будынак касцёла і кляштар, які далучаўся да яго з усходняга боку. З 1736 вялося будаўніцтва мураванага касцёла. Паводле І. Трусава архітэктарам быў Мейзер. На *плане Гродна* 1780 г. драўлянага ўжо не відаць. Магчыма, ён згарэў у *пажары* 1775, але быў пазней адноўлены. Падчас *вайны 1812* быў знішчаны, але зноў быў адбудаваны. У 1845 быў зачынены кляштар, паводле ўказу ад 11.09.1881 будынкі касцёла і кляштара перададзеныя гарадской уладзе, пачалі выкарыстоўвацца як казармы для войска. У 1904 для гэтага касцёл быў разабраны, а на яго фундаментах пабудавалі дадатковы

двухпавярховы казарменны блок. У 1934 польскае войска задумала купіць у горада пакармеліцкія будынкі і зрабіць казармы.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 104, воп. 1, с. 169, а. 4 адв.; Квитницкая Е.Д. Монастыри XVIII века с безбашенными храмами в Белоруссии. / Е.Д. Квитницкая // Архитектурное наследство. – М., 1985. – № 33. – С. 98–106; Саяпин Ю.В. Утраченные католические храмы Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 63–73; Pawłowska H., Grodzieńskie kroniki klasztorne XVII i XVIII w. Formy gatunkowe i aspekty komunikacyjne. – Warszawa, 2013 (praca doktorska, "Artes Liberalis" UW). Гл. таксама яе публікацыі ў Бібліяграфічным спісе дадзенай кнігі; Walczyna F. Grodno // Miasta wielu religii. Topografia sakralna ziem wschodnich dawnej Rzeczypospolitej / pod red. M. Jakubowskiego, M. Sasa, F. Walczyny. – Warszawa: Muzeum Historii Polski, 2016. – s. 226.

Касцёл фарны гл. *Касцёл святога Францішка Ксаверыя*.

Касцюшка Андрэй Тадэвуш Банавентура (4.02.1776, в. Мерачоўшчына Івацэвіцкага р-на – 15.10.1816, Залатурн, Швейцарыя) – палітычны і вайсковы дзеяч Рэчы Паспалітай. Кіраўнік (Начальнік) *паўстання 1794* у Польшчы, Літве і Беларусі. Падчас яго 30 верасня быў у Гродне, дзе правёў нараду, узнагародзіў частку паўстанцаў пярсцёнкамі з надпісам на польскай мове "Айчына свайму абаронцу". У горадзе яго імем названая вуліца. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне захаваўся арыгінал завяшчання К. аб вызваленні яго сялян вёскі Сяхновічы ад прыгоннай залежнасці.

Літ.: Емяльянчык У. Паланэз для касінераў. З падзей паўстання 1794 г. пад кіраўніцтвам Тадэвуша Касцюшкі на Беларусі. – Мінск, 1994; Клейн Б. Найдено в архиве // Неман. – 1965. – № 6. – С. 120–121; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна, 1997; Юхо Я. А. За вольнасць нашу і вашу: Тадэвуш Касцюшка. – Мінск, 1989.

Касцялкоўскі Станіслаў Юзафавіч (24.10.1881, Гродна – 2.09.1960, Пітсфард-Хол каля Нортгемптана, Англія) – гісторык, прафесар Віленскага ўніверсітэта. Сын паўстанца, а матчына сястра Алена была жонкай кіраўніка паўстання 1863–1864 гг. Я. Гейштара, што паўплывала на погляды К. Скончыў з залатым медалём *гімназію гродзенскую* (1900), а затым вучыўся ў Варшаўскім універсітэце і на гісторыка-філалагічным факультэце Кракаўскага ўніверсітэта. Пасля вучобы яго паслалі стыпендыятам (1905) у Рым. Член рымскай экспедыцыі Кракаўскай Акадэміі, працаваў у Ватыканскім архіве над паперамі апошняга Нунцыя пры двары Ваўжынца Літы. У 1905 абараніў у Кракаве доктарскую працу "Палітычная роля Антонія Тызенгаўза ў часы Станіслава Аўгуста". Вярнуўся ў 1906 у Вільню, працаваў спачатку настаўнікам польскай мовы ў гімназіі. Падчас нямецкай акупацыі (1915–1918) як галоўны кіраўнік школ Таварыства Польскіх Настаўнікаў у 1918 г. увайшоў у тайны арганізацыйны камітэт былога Віленскага ўніверсітэта. Браў удзел у працы патаемнага камітэта па арганізацыі Універсітэта імя Баторыя С. у Вільні. Пасля эвакуацыі расійскіх войск у 1915 займаўся арганізацыяй двух польскіх гімназій.

У 1919 стаў чальцом часовай універсітэцкай улады. З 1921 – загадчык кафедры польскай гісторыі ва ўніверсітэце Стэфана Баторыя (УСБ) у Вільні, з 1923 – прафесар надзвычайны, з 1935 – прафесар звычайны. Быў адным з заснавальнікаў Таварыства Сяброў навук у Вільні, сябрам яго прэзідыума, апошнім старшынёй (1938). У 1929 г. атрымаў Крыж Камандорскі ордэна Адраджэння Польшчы. У савецкі час (1939 – пачатак 1941) займаўся тайным навучаннем са студэнтамі, за што быў савецкай уладай у чэрвені 1941 сасланы на Урал. З 1942 ваяваў у войску Андэрса ў Іране, да 1945 займаўся тут культурніцкай і выдавецкай дзейнасцю. Пасля вайны, з 1945 па 1950 быў дырэктарам Польскага навуковага інстытута і Паланістычнага цэнтра ў Бейруце, з 1950 г. пасяліўся ў Англіі, працаваў выкладчыкам польскай мовы, літаратуры, гісторыі ў старэйшых класах гімназіі сясцёр назарэтанак у Пітсфард Хол. Адначасова праводзіў жвавую дзейнасць на навуковым полі: сеньёр Акадэмічнага Саюза УСБ, прафесар і выкладчык у Польскім універсітэце на чужыне ў Лондане і Таварыстве ўсходазнаўцаў "Рэдута". Быў адным з арганізатараў Польскага навуковага таварыства на чужыне. Падтрымоўваў сувязі з Таварыствам гісторыка-культурным у Парыжы. Навуковыя інтарэсы – гісторыя ВКЛ, друкаваўся ў віленскай перыёдыцы. Напісаў цікавую працу пра *Тызенгаўза Антонія* (Antoni Tyzenhauz podskarbi nadworny litewski, t. 1–2, Londyn, 1970–1971). Аўтар успамінаў "Гродна ў канцы XIX ст.", якія засталіся ў рукапісе (47 стар.), захаваным у Польскім грамадска-палітычным цэнтры ў Лондане. За сваю літаратурную працу ў часы Незалежнасці атрымаў срэбную літаратурную адзнаку Акадэміі літаратуры. На *каталіцкіх могілках* у Гродне, у сектары L 137, знаходзяцца пахаванні яго бацькі Юзафа (№ 1001, 1833 – 7.01.1895), удзельніка паўстання 1863, сасланага ў Сібір, сябра *Ажэшкі Э.*; яго маці Людвікі (№ 999, 25.12.1901); маці бацькі Тэафіліі з Цемпалонскіх.

Літ.: Dobroński A. Cz. Wspomnienia grodzieńsko-polskie // Rocznik Grodzieński. – 2012. – 4. – S. 157–167; Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S.238; Orzeszkowa E. Listy zebrane. T. 1. – Wrocław, 1954. – S. 193, 360; T. 3. – S. 416–417; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. I. – Białystok: Prymat, 2014. – C. 135.

Катовіч Андрэй Францішак, герба Корчак (?–1682). Суправаджаў каралевіча Яна Казіміра ў падарожжы па Еўропе. Пасля яго каранацыі атрымаў староства гродзенскае (перад 1652 г.). У 1657 стаў кухмістрам ВКЛ, у 1658 – пісарам вялікім літоўскім, у гэтым жа годзе вёў перамовы з Маскоўскім княствам. Неаднаразова быў паслом на сейм Рэчы Паспалітай (1658, 1666 і 1669). У 1671 займаўся рамонтам віленскага замка і рэгуляцыяй рэчышча Вілейкі. У 1676 быў фундатарам *касцёла кармелітаў босых* у Гродне.

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 239.

Катынцы-гродзенцы – асобы, звязаныя з Гроднам месцам нараджэння, цывільнай працай, вайсковай службай, якія былі арыштаваныя ў 1939–1940

і 1944 гадах і сталі вязнямі сталінскіх лагераў у Казельску (250 км ад Смаленска), Асташкаве (на поўнач ад Цвяры, непадалёк вытоку Волгі), Старабельску (на поўдзень ад Харкава, на р. Айдар), Гразаўцы (Валагодская вобл.). Выяўленыя па крыніцах на 1.09.2017 г. 224 чалавекі: у Казельску – 111 чал. (у асноўным вайскоўцы і рэзервісты), Асташкаве – 28 (функцыянеры паліцыі, жандармерыі, вайскоўцы з Корпуса памежнай аховы), Старабельску – 67 чал. (вайскоўцы і рэзервісты), Гразаўцы – 16 (вайскоўцы), не вызначана – 2. У армію Андэрса з Казельска трапіла 16 чал., з Гразаўца – 10 чал. З Асташкава 4 асобы былі дэпартаваныя ў Белую Падляскую. Астатніх катынцаў-гродзенцаў, верагодна, расстралялі. Спіс расстраляных глядзі ў ніжэй названым артыкуле аўтара кнігі.

Літ.: Szwed W., Grodzieńscy więźniowie stalinowskich obozów w Katyniu // Polacy na Białorusi. Od końca XIX do początku XXI wieku. Wybrane problemy stosunków polsko-białoruskich / Pod red. T. Gawina. – Warszawa: Studium Europy Wschodniej, UW, 2017. – S. 286–303.

Кафенхаўз, першыя былі збудаваныя на *Гарадніцы* і ў *Ласосне* падчас рэформ *Тызенгаўза А.*, аматара кавы. Паводле інвентару Гарадніцы і Ласосны 1780/1782 ён згадваецца на Гарадніцы як драўляны будынак, крыты *дахоўкай*, меў вокны ў алавянай раме. Пад К. знаходзілася мураваная крама, а каля К. быў драўляны будынак, крыты дахоўкай і з вокнамі ў алавяных рамах. Яшчэ адзін К. двухпавярховы, крыты дахоўкай, будаваўся з каменя ў Ласосне, у ляску пры гасцінцы Гродзенскім. Інвентар 1795 паказвае, што ў гарадніцкім будынку К. ужо знаходзіліся пакоі карчмы, мураваныя крамы, пакоі для начлегу, більярдная, кафляная печ. Усё патрабавала рамонту.

Літ.: Sliż N. Pierwszy Kaffenhauz w Grodnie / XVIII amżiaus studijos, t.1: Lietuvos Didžioji Kunigaikśtyste XVIII amžiuje: tarp tradiciju ir naujoviu: straipsniu rinkinys. Sudarytoja R. Śmigelskyte-Stukkiene, Lietuvos istorijos institutas. – Vilnius, 2014. – S. 215–224; Sliż N. Horodnica grodzieńska w źródłach wizualnych i dokumentalnych (druga połowa XVIII w.) [рукапіс 2021 г.].

Каханоўскі Ян (1894–1942) – прафесар, інжынер, настаўнік біялогіі, даследчык і абаронца флоры і фаўны Гродзеншчыны, калекцыянер, грамадскі дзеяч, папулярны сярод гродзенскай грамадскасці. Сябра Таварыства аматараў прыроды, заснавальнік *батанічнага саду* (20.09.1925) і *заапарка* ў Гродне. Жыў недалёка ад апошняга, на вул. 17 верасня, д. № 47 (не захаваўся). Вучыўся ў мужчынскай гімназіі Гродна. Быў сябрам таварыства *"Гродзенская гістарычная б-ка імя Ю. Пілсудскага"*. Адзін з рэдактараў часопіса *"Niemen"* (1935). У 1939 г. быў арыштаваны рэпрэсіўнымі органамі Савецкай улады, і да адыходу Чырвонай арміі (ліпень 1941) сядзеў у гродзенскай *турме* за ўдзел у выдуманай уладай педагагічнай радзе, нібыта складзенай з былых настаўнікаў гімназіі з мэтаю антысавецкай дзейнасці сярод вучняў. Быў паранены ў нагу ад нямецкай бомбы, якая трапіла ў турму. Падчас нямецкай акупацыі, абапіраючыся на патаемную Радыкальную сялянскую арганізацыю, стварыў патаемную сетку польскіх школ. У 1942 трапіў у лік нямецкіх закладнікаў, якіх мелі расстраляць

за забітага нямецкага жандара, але потым спіс іх скарацілі да 25 чал., і К. збіраліся адпусціць на волю. Папрасіў, каб яго пакінулі замест шматдзетнага бацькі Юзафа Вявюрскага. Быў забіты 20.10.1942 на тэрыторыі Навумавіцкага *форта* № 2. Жыхарка Гродна В. Кунаховіч перавезла яго парэшткі на гродзенскія *каталіцкія могілкі* (знах. у сектары К 164). У Гродне ёсць вуліца імя К. У *заапарку* змешчаная мемарыяльная дошка ў яго гонар – барэльеф з надпісам "Ян Каханоўскі (1894–1942). Заснавальнік Гродзенскага заапарка 1927 г. Настаўнік біялогіі Гродзенскай гімназіі імя А. Міцкевіча. 1920–1930-я гг. Расстраляны нямецка-фашысцкімі захопнікамі".

Творы: (Борці і бортніцтва) Barci i bortnictwo // Niemen – 1935 – Zeszyt 1 – s. 3–12; (Ахова прыроды ў школе) Ochrona przyrody w szkole // тамсама, s. 17–20; (Забыты твор тэхнікі) Zapomniane dzieło techniki // тамсама, s. 16; Nowe miejsca bobrów na Grodzieńszczyźnie (Новыя мясціны баброў на Гродзешчыне) // Niemen 1939. – S. 27–31; Sprawozdanie z pracy posła komitetu Obrony przyrody po powiecie Grodzieńskim za rok 1938 (Справаздача з дзейнасці дэлегата к-та Аховы прыроды па Гродзенскім павеце за 1938 г.) // Ibidem, s. 32–34.

Літ.: Карпюк А.Н. След на зямлі. – Мн., 1972 – С. 46–50; Карпюк А. Педагог-патрыёт // Беларусь. – 1967. – № 9; Саяпин В. О парке Жилибера и зоопарке Кохановского. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 50–51; P. Naumik. Kamienie rzucane na szaniec // Głos znad Niemna. 93 – 25 – 31 18 – 24 października. – s. 5; I. Woronko. Grodzieńska biblioteka historyczna im. J. Piłsudskiego – Głos znad Niemna. 1997 – 28.04.05. – s. 7.

Качаны – бацька Васіль Андрэевіч (скульптар) і сыны Восіп і Андрэй (кавалі), гродзенскія майстры, якія выраблялі надмагіллі, крыжы і агароджы на *могілкі*. На думку даследчыцы Л. Зорынай В. А. Качан мог быць вучнем Забароўскага Ю. Першы твор яго быў пастаўлены ў 1874 г. на магіле каталіка Я. Артца. Майстэрня Качаноў у 1899 змяшчалася на вул. Станіславаўскай. На ёй працавала 6 чал., якія за гэты год зрабілі 18 помнікаў. Пасля смерці В. А. Качана майстэрняй кіраваў да 1910 Восіп, а потым – Андрэй. Фірма вырабляла помнікі з граніту, белага мармуру і бетону, металічныя агароджы, крыжы, надмагіллі. Л. Зорына налічыла ў В. А. Качана 11 твораў на каталіцкіх і 14 на праваслаўных могілках на вул. Антонава; В. В. Качана – 4 на праваслаўных могілках; А. В. Качана – 2 на каталіцкіх, 5 – на праваслаўных і 1 – на вайсковых могілках на вул. Белуша. Творы Качаноў сустракаюцца і на могілках у Беластоку. Наогул спецыялісты лічаць каля 200 надмагілляў, крыжоў і агародж, зробленых Качанамі. Васіль Андрэевіч памёр 28.11.1907 на 55 годзе жыцця, Восіп Васільевіч – 17.06.1910 на 37 годзе жыцця.

Літ.: Зорына Л. Гродзенскія скульптары XIX – пачатку XX ст. // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 79–86; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 199–201; Sokół M., Krzyże i nagrobki żeliwne produkowane w Białymstoku w 2. połowie XIX i na początku XX w. Na wybranych przykładach wyrobów fabryki Antoniego Wieczorka // Zeszyty Naukowe SKNH Uniwersytetu w Białymstoku. – 2009. –

Качынскі Зыгмунт (1894–1953) – ксёндз, пасол на сейм 1922 з акругі Гродна-Сувалкі на час кадэнцыі 1922–1927 гг.

Літ.: Polski Słownik Biograficzny. T. 11. – Warszawa, Kraków, 1964–1965, s. 395–396.

Кашталян – камендант крэпасці або замка, начальнік гарнізона. Першым яго абавязкам было глядзець за цэласцю *замкаў*; як вайсковы начальнік, загадваў вайсковымі людзьмі, збіраў у паход шляхту і перадаваў яе ваяводзе. Меў таксама судовыя абавязкі – быў вышэйшым суддзёй, калі удзельнікі судовага працэсу былі незадаволеныя падкаморскім суддзёй. Самым вядомым каштaлянам у Гродне быў *Давыд Гарадзенскі*.

Літ.: Ластоўскі В. Кароткая энцыклапедыя старасвеччыны / Уклад. Я. Янушкевіч. – Мінск: Выдавец В. Хурсік, 2003. – С. 77–78.

Квітніцкая Алена Дзмітрыеўна (8.10.1919, Масква – 5.07.1981, Масква) – даследчык архітэктуры Беларусі, у тым ліку Гродна XVI – 1 паловы XIX ст. Скончыла школу (1937) і Маскоўскі архітэктурны інстытут (1941). Нейкі час жыла і працавала ў эвакуацыі, але ў 1942 вярнулася ў Маскву. У верасні 1947 абараніла кандыдацкую дысертацыю на тэму "Каменные арки и цилиндрические своды, как конструктивный элемент прошлого и современного строительства". З 1948 працавала ў Інстытуце гісторыі і тэорыі Архітэктуры СССР. З 1954 стала чальцом Саюза архітэктараў СССР. К. была сябрам рэдакцыйнай калегіі зборнікаў "Проблемы истории архитектуры народов СССР" і "Архитектурное наследство", у якім даволі часта публікаваліся яе працы. Яны заўсёды грунтаваліся на вялікай колькасці ўпершыню ўведзеных у навуковы зварот пісьмовых і графічных матэрыялаў, якія К. знаходзіла ў расійскіх архівах, музеях, бібліятэках. У сваіх артыкулах яна напісала пра планіроўку Гродна ў сярэднявеччы і пра такія гродзенскія помнікі, як: *храмы, кляштары, шпіталі, ратуша, калегія* і інш.

Літ.: Габрусь Т. В. Даследаванне архітэктуры барока ў Беларусі. – Мн.: Национальная АН Беларуси, 2009; Квітніцкая Алена Дзмітрыеўна // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва. — Мн.: БелЭн, 1986. – Т. 3. – С. 31.

Кваціньскі Андрэй Феліцыянавіч – стацкі дарадца, кіраўнік Гродзенскага аддзялення Дзяржаўнага *банка*. Прызначаны па пасадзе ў губернскі камітэт таварыства апекі турмаў, сябра праўлення Таварыства дапамогі вучням гродзенскіх мужчынскай і жаночай гімназій, хто жыве ў нястачы (на 1898 г.). Кавалер ордэнаў Св. Ганны і Св. Станіслава 2-й і 3-й ст. Скончыў Віленскі дваранскі інстытут, жанаты, на службе 19 гадоў, на пасадзе з 1884.

Літ.: Памятная книжка Гродненской губернии на 1898 год. – Гродна: губ. типография, 1897. – С. 37, 47, 65.

дэ Кгрып Антоні (Greppi/Grepy del Ronco; дэ Грота, Дэгрып, Грэта, Дзікрып, Дзікрэп) – італьянскі муляр, які магчыма прыехаў у канцы 1570-х у Рэч

Паспалітую з горада Ranca у Міланскім княстве. У 1580 *Стэфан Баторы* накіраваў яго ў *Горадню*, дзе ён ўдзельнічаў у перабудове для Баторыя *Старога замка* і ў будаўніцтве *касцёла* Фарнага. За добра выкананую працу К. атрымаў у 1586 два прывілеі ад Баторыя (нададзеныя пажыццёва валокі у в. Сухой=Гарадніцы) і адзін у 1588 ад Жыгімонта III Вазы (пацвердзіў усе наданні Баторыя і падкрэсліў, што К. вызвалены ад усіх павіннасцей і падаткаў). У 1593 К. жыў на дараваных манархамі грунтах, меў там уласную цагельню, трымаў у арэндзе сад Каложскага манастыра і належаў да мяшчанскага стану. У судовых дакументах называецца мулярам замкавым. Апошні ўспамін пра К. у Горадні датуецца 1598. Узоры працы К. можна паглядзець на гравюры Т. Макоўскага.

Літ.: Шаланда А.І. Антоні дэ Кгрып, муляр гарадзенскага замка, і яго род у канцы XVI – першай палове XVII ст. Краязнаўчыя запіскі. Вып. 8. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2012. – С. 17–26.

Кейстут (1297 – 15.08.1382, Крэва) – вялікі князь літоўскі (з канца 1381–1382). Сын Гедыміна (1275–1341), бацька *Вітаўта.* Валодаў Трокамі (дзе меў рэзідэнцыю), Жамойціяй, Падляшшам, Гарадзенскай зямлёй. Пасля смерці Гедыміна выступіў супраць новага вялікага князя літоўскага Яўнута і прызнаваў ім Альгерда, з якім і кіравалі ВКЛ. У 1381 г. выступіў супраць *Ягайлы*, які падпісаў патаемную змову з *крыжакамі.* К., заняўшы Вільню, абвясціў сябе вял. князем літоўскім, але Ягайла выйграў бітву каля Трокаў (жнівень 1382). Запрошаны на перамовы К. быў затрыманы і ў Крэўскім замку зняволены, а затым задушаны.

Літ.: Грыцкевіч А. Кейстут // Скрыжалі "Спадчыны". – Мінск, 1996. Вып. 2; Ермаловіч М. Старажытная Беларусь: Віленскі перыяд. – Мінск, 1994. – С. 76–81; Krzyżaniakowa J., Ochmański J. Władysław II Jagiełło. – Wrocław etc, 1990.

Кемарскі Канстанцін Сямёнавіч (1847, Гродна – 17.10.1922, Гродна) – дырэктар Цэнтральнай акушэрска-фельчарскай *школы* ў Гродне і загадчык створанага пры ёй радзільнага аддзялення (9.04.1877 – 1910). Скончыў Харкаўскі ўніверсітэт (1873) і 3 гады працаваў там ардынатарам пры акушэрскай клініцы. У 1882 атрымаў чын калежскага асэсара, а ў 1887-м стаў калежскім дарадцам, у 1914 быў стацкім дарадцам. Пры гродзенскай акушэрскай школе К. у 1908 зарганізаваў курс па падрыхтоўцы санітараў. У 1915 са школай выехаў у Калугу, у 1919 вярнуўся ў Гродна. Быў актыўным сябрам Таварыства ўрачоў Гродзенскай губ. і Гродзенскага Сафійскага праваслаўнага епархіяльнага *брацтва*. Паралельна з дырэктарствам у акушэрскай школе К. выкладаў фізіялогію чалавека ў *гімназіі Гродзенскай мужчынскай*, выконваў абавязкі ардынатара Гродзенскай акруговай лячэбніцы і Гродзенскага вайсковага шпіталя (у гады руска-турэцкай вайны). У жаночай *гімназіі* быў штатным лекарам і выкладаў гігіену (1914). Узнагароджаны ордэнамі Св. Станіслава 2-й ступені, Св. Уладзіміра 4-й ст., Св. Ганны 2-й ст. Пахаваны на гродзенскіх *могілках праваслаўных*. У Гродне жыў па вул. Пясочнай у асабістым доме.

Крын. і літ.: Адрес-календарь и справочная книжка Гродненской губернии на 1914 г. – Гродна, 1913 с. 31, 39, 55; В.Н. Черепица, Гродненский православный некрополь, Гродно: ГрГУ, 2001. – С. 82.

Кімберг Якаў Мікалаевіч (16.12.1909, Адэса – 27.01.1993, Гродна) – народны артыст БССР (1967). Скончыў драматычныя курсы пры кінастудыі "Масфільм". Удзельнік *вайны Вялікай Айчыннай*. У Гродне з 1947 – адзін з вядучых акцёраў абласнога драматычнага тэатра, выканаўца драматычных і характарных роляў.

С. 869

Кінатэатры. У доме Чартка на вул. Саборнай (зараз Савецкая) у 1908 г. пачаў дзейнічаць першы кінематограф пад назвай *"Электра-Біёграф"*. Яго ўладальнікам быў Якаў Крывашэін. На вул. Гараднічанскай, 4, знаходзіўся кінатэатр "Эдзісан" (пазней "Сатурн"). У 1912 яго ўладальніцай была Гольмстэн В. С., а ў 1913 далучыліся яшчэ дзве асобы – Манастырскі С. Д. і Плоцкі І. С. У 1911 Р. П. Завістоўскім у доме Баркоўскага па вул. Саборная, 26, заснаваны кінатэатр "Люкс". Ён знаходзіўся на месцы, дзе зараз стаіць новы будынак універмага. У міжваенны час называўся "Ліра", а затым "Апола", у 1939–41 – "ІІІ Інтэрнацыянал", а з 1944 – "Спартак". У будынку на сучаснай вул. Ажэшкі, 15, знаходзіўся кінатэатр "Палац", які пазней называўся "Уцеха". "Электрычны тэатр" "Эдэм" адстаўнога штабс-капітана Сяргея Мікалаевіча Манастырскага быў адкрыты ў жніўні 1915 г. Гэта быў першы ў Гродне стацыянарны кінатэатр (на вул. Паштовая, 11). На пачатку 1930-х называўся "Палонія", пазней – "Пан". У 1921 у гарнізонным Доме салдата на рагу вул. Сапёрнай і 3 Мая адкрыўся кінатэатр "Kino OW" (з 1922 "Bajka"). У гэтым жа будынку Польскі Чырвоны Крыж адкрыў кінатэатр, дзе дэманстраваліся адукацыйныя і прыродазнаўчыя фільмы. У школе імя Стэфана Баторыя па вул. Пілсудскага, 4 (Леніна, 4) арганізавалі "Kino naukowe", дзе паказвалі навукова-папулярныя фільмы. У 1931 пачаў працу адзін з лепшых і сучасных на той момант кінатэатраў "Światowid" на вул. Брыгіцкай, 2 (сёння К. Маркса). Ён належаў Ф. Плануцісу. Пазней называўся "Zosieńka", "Gloria", "Lux", "Helios". У 1930-х гадах кінатэатры для абароны сваіх правоў і для больш эфектыўнай дзейнасці аб'ядноўваліся ў таварыствы. Так, таварыства "Peteka" злучыла кінатэтры "Apollo", "Polonia", "Pałac". Пазней два апошніх увайшлі ў таварыства "Blok". У 1936 было створанае кінатэатральнае прадпрыемства "Apollo". У савецкі час былыя прыватныя кінатэатры сталі дзяржаўнай маёмасцю і змянілі сваю назву: "Uciecha" стала кінатэатрам імя Кірава (пазней "Спартак" на вул. Ажэшкі), "Apollo" – "ІІІ Інтэрнацыянал", "Пан" – "Чырвонай Зоркай", "Helios" – "КІМ". Паступова адкрываліся новыя кінатэатры: імя А. Пушкіна (1954, вул. Ласаснянская/Сав. Пагранічнікаў), "Летні" (1957 – пачатак 1990-х, у парку гарадскім), "Гродна" (1961–1999, вул. Савецкая), "Космас" (1964, вул. Горкага), "Усход" (1970, пр. Касманаўтаў), "Палёт" у салоне спісанага самалёта Ту–124 (1980–1992, парк гарадскі), "Кастрычнік" (1987, вул. Паповіча).

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 296–297; Касатая Т. Кінематограф як

частка гарадзенскай штодзённасці пачатку XX стагоддзя // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. // Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 437–443; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 15; Саяпін В., Касатая Т. Ад "Эдэна" да "Кастрычніка". З гісторыі кінатэатраў // Гарадзенскі гадавік, Кракаў. – 2014. – № III. – С. 43–63; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 19–21

Кірмашы гродзенскія (ярмонкі). Гродну дараваў права мець тры штогадовыя кірмашы вялікі князь літоўскі *Аляксандр I* у 1496 г., а потым гэта пацвердзіла ў 1540 каралева *Бона*. На пачатку 1760-х гадоў праходзіла некалькі не вельмі жвавых кірмашоў. У 1845 з дазволу Міністэрства ўнутраных спраў у Гродне быў заснаваны Іванаўскі кірмаш, які пачынаўся 25–26 чэрвеня і працягваўся адзін месяц. У першыя два гады на яго ніхто не прыехаў. У 1847–1851 на кірмаш штогадова прывозілі тавараў у сярэднім на 15,5 тыс. руб., прадавалі на 3,3 тыс. руб., у 1852–1856 адпаведна на 9,7 і 3,9 тыс. руб. У 1857 прывоз значна зменшыўся і склаў 3,7 тыс., а рэалізацыя – 3 тыс. руб., у 1858 адпаведна 3,8 і 1,8 тыс., у 1859 – 1,2 і 0,7 тыс. руб. У 1860 г. кірмаш не адбыўся, а ў наступным не было ніводнага прыезджага купца. Як пісаў даследчык Гродзенскай губерні П. Баброўскі: "На гродзенскі кірмаш, які існуе толькі паводле назвы, прыязджаюць два-тры гандляры-вандроўнікі, якім усё роўна, дзе прадаць тавар – у вёсцы, мястэчку ці горадзе, абы дасягнуць сваёй мэты". Мала-памалу гродзенскі кірмаш занепадаў. У 1890-х гадах ён ужо не згадваўся ў статыстычных матэрыялах. Чаму так здарылася? Адной з прычын гэтага быў непрыдатны тэрмін склікання кірмашу. Пасля віленскага кірмашу (ён пачынаўся 23.04) купцы ехалі ў Варшаву (12.06), адтуль у Зэльву (25.07), затым у Свіслач (25.08). А Гродна заставалася ў баку ад камерцыйных шляхоў. Баброўскі прапанаваў вельмі цікавы выхад: перавесці ў Гродна Зэльвенскі (Ганненскі) кірмаш і праводзіць яго ў жніўні-верасні, пасля заканчэння палявых прац. Для гандлю трэба было пабудаваць пастаянныя мураваныя памяшканні ці, паводле амерыканскага прыкладу, жалезныя, паблізу горада, у месцы бяспечным ад агню і даступным публіцы. Такое месца магло бы быць за фарштатам, на беразе Нёмана альбо каля вусця Ласосны (думаю, уважлівы чытач заўважыў, што сённяшні крыты рынак прыкладна знаходзіцца ў названым месцы). У 1857 г. *губернатар І. А. Шпейер* хадайнічаў аб пераносе кірмашу з Зэльвы ў Гродна, але Міністэрства ўнутраных спраў адмовіла.

Літ.: Бобровский П.О. Историко-статистический очерк города Гродна // Памятная книжка Гродненской губернии на 1860 год. – Гродно, 1860, с. 69–132; Бобровский П.О. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. – СПб., 1863. Ч. 1. – 866 с.; Ч. 2. – 1074 с.; Приложения. Ч. 1. – 247 с.; Ч. 2. – 6+391+72 с.; Швед В.В. Торговля в Беларуси в период кризиса феодализма (1830–1850-е годы). – Гродно: ПКФ "Орбикс", 1995; Jodkowski J. O dawnych jarmarkach w Zelwie i Grodnie // Głos prawdy ziemi grodzieńskiej. – 1926. – N 56. – S. 7; N 57. – S. 5.



С. 870

Кірха лютэранская імя Святога Яна, была пабудаваная ў 1780-я гады на месцы карчмы на *Гарадніцы*. У гэты час адбываліся рэформы *Тызенгаўза А.*, і ў Гродна для працы на мануфактурах прыехала шмат майстроў з Германіі і Галандыі. Пазней з'явіліся немцы-вайскоўцы расійскай арміі. Вось для названых лютэран і спатрэбілася кірха. Афіцыйнай датай яе заснавання лічыцца 1793 г., калі *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* перадаў будынак нямецкай суполцы (дакумент пра гэта можна знайсці ў інтэрнэце). Па ініцыятыве пастара Бронліха ў 1826 збіралі грошы на арган. У 1847–1849 адбылася перабудова кірхі паводле праекта губернскага архітэктара *І. Міхаэліса*. У 1873 была дабудаваная званіца з лесвіцай, якая вяла да гадзінніка, і шпіль. У 1912 храм значна перабудавалі, будынак кірхі быў атынкаваны і злучаны з домам пастара, набыўшы такім чынам сучасны выгляд. Побач з кірхай, праз дарогу (вул. Кірхавая), знаходзіліся *могілкі лютэранскія*. З 1944 па 1994 у кірсе знаходзіўся Дзяржаўны *архіў Гродзенскай вобласці*. У 1995 яна была вернутая евангеліцка-лютэранскай абшчыне (у 2012 – 50 чал.) і з'яўляецца адзінай дзейнай кірхай на тэрыторыі Беларусі. Урад Германіі выдзеліў 120 тыс. еўра на рэстаўрацыю К., якая адбылася ў 2013–2015 гг. Цяпер акрамя малітваў у царкве адбываюцца арганныя канцэрты і іншыя музычныя мерапрыемствы. Пастарамі ў кірсе былі: Міхаіл Пэц (1793), Хільзеніц Вільгельм Бройнліх (1826), Фрыдрых Юліўс Гофман (1843–1867), Аўгуст Філіп Вальдэмар Гун (1867–1890), Бонвеч (1890), Адольф Освальд Плямш.

Літ.: Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 47; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСа-Принт, 2013. – С. 215–221; Швед В.В., Ігнатовіч Ф.І. Гісторыя нямецкай супольнасці і евангелісцка-лютэранскай парафіі ў Гродне (1770–2002) // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С. 3–8.

Кісцер Уладзімір Канстанцінавіч – гродзенскі *губернатар* з 10.02.1906 да 24.06.1906. На службе з 16.01.1890. Указам Мікалая II ад 10.02.1906 прызначаны выканаўцам абавязкаў гродзенскага губернатара. Прыступіў да выканання пасады 30.03.1906. Не прыняў рашучых мер супраць рыхтаванага *пагрому ярэйскага* ў Беластоку 14–16.06.1906: прыняў у Гродне 12.06.1906 беластоцкую яўрэйскую дэлегацыю, але адхіліў яе просьбу аб адкліканні прыстава 1-га стану Шараметава (магчымага арганізатара чарнасоценскай акцыі), запэўніўшы, что "все средства на день 14 июня предприняты" і дадаў: "Во всяком случае не будет погрома, если 14 июня евреи не будут стрелять с окон и балконов в католическую и православную процессии". 14.06.1906 знаходзіўся ў Беластоку, дзе атрымаў завярэнне аб тым, што армія ўзяла горад пад кантроль, тым не менш, быўшы сам сведкам збіцця *яўрэяў*, не спыніў падпарадкаваных афіцэраў і салдат. *Э. Ажэшка* пісала, што за недастатковыя дзеянні падчас яўрэйскага пагрому ў Беластоку Кісцера знялі з пасады. Афіцыйна пайшоў у адстаўку па хваробе. Не дачакаўшыся прыезду наступнага губернатара *Ф. А. Зейна*, 26.06.1906 перадаў губерню начальніку Упраўлення земляробства

і дзяржаўных маёмасцяў А. Валковічу і з'ехаў з Гродна, не пакінуўшы апошняму ні інструкцый, ні распараджэнняў цэнтральных уладаў, ні перадаўшы звестак аб стане спраў у губерні, што ў перыяд рэвалюцыі было небяспечна. Чын сапраўднага стацкага дарадцы атрымаў 22.04.1907. У 1915 быў у чыне тайнага дарадцы, сенатарам, намеснікам/таварышам кіраўніка Устаноў імператрыцы Марыі.

Крын. і літ.: РГИА, ф. 1284, оп. 47, д. 102, л.12об.; ф. 2, воп. 25, с. 1465, а.16; ф. 2, воп. 25, с. 1465, а. 22; Korzec P. Pogrom Białostocki w 1906 i jego polityczne reperkusje // Rocznik Białostocki. – T.III. – Białystok, 1962. – S. 157, 160; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007.

Клава (Клавэ) Тадэвуш – доктар, гарадзенскі ўраднік: лаўнік у 1758 г., прэзідэнт у 1759, 1763–1766, бурмістр у 1768, 1779, радца ў 1760–1762, 1774, радзецкі пісар у 1760–1761, 1763, 1776. Прэзідэнт Гродна (1792–1794?), быў 125-м у спісе тых, хто падпісаў далучэнне да паўстання 1794 г. У гэты час жыў на вул. Алішкоўскай і заплаціў *Цыцыянаву П. Д.* кантрыбуцыю з маёнтка 40 злотых. Быў ён у сталым узросце, у гэты час хварэў і справамі не займаўся, а абавязкі яго выконвалі віцэ-прэзідэнт Я. Рафановіч і сакратар прэзідэнта К. Абрамовіч. Жыхары Гродна паслалі на іх скаргу ў найвышэйшую Раду ў Варшаву, каб хворага Клаву змянілі на грамадзяніна *Боўфала Ф.* Сын К. Ануфры ў 1804–1810 быў лаўнікам, а ў 1810–1812 – радцам гродзенскага *магістрата.* Род Клава/Клаве паходзіць з Маклембурга, сляды роду ёсць на шчэцінскім Памор'і, у ваколіцах Гожува Велькапольскага ў 17 ст.

Літ.: Grodno w XVIII w. Miasto i ludność (na tle trendów rozwojowych od średniowiecza do 1936 roku) / Red. A. Woltanowskiego i J. Urwanowicza. – Białystok, 1997, s. 37, 96; M. Klawe-Mazurowa. Z Meklemburgii do Warszawy dzieje potomków Jana Henryka Klawe. – Warszawa, 2017. – S. 54–59.

Клеберг Францішак Эмільянавіч (1.02.1888, Цярнопаль – 5.04.1941, пад Дрэздэнам) – кіраўнік Упраўлення акругі III корпуса ў Гродне (1936–38). У 1905 скончыў кадэцкую школу і да 1915 служыў у аўстрыйскім войску. Падчас *вайны Першай сусветнай* перайшоў у польскія легіёны. У 1918 уступіў у Войска Польскае, быў шэфам штабу кіраўніцтва "Усход" у барацьбе за Львоў. Пасля заканчэння курсаў у парыжскай вайсковай школе (1925) быў навуковым дырэктарам у Вышэйшай вайсковай школе, а з 1929 – камандуючым дывізіі пяхоты. Пасля кіраўніцтва акругай у Гродне ўзначаліў Упраўлення акругай IX у Брэсце. Калі пачалася *вайна Другая сусветная*, стварыў Аперацыйную групу "Палессе" і ваяваў з немцамі і Чырвонай арміяй. Трапіў у нямецкі палон і памёр у шпіталі. Пасмяротна атрымаў чын генерала дывізіі. Узнагароджаны ордэнамі Віртуці Мілітары, Адраджэння Польшчы, 4 Крыжамі за мужнасць і інш.

Літ.: Mazur G. Kleeberg Franciszek // Słownik biograficzny historii Polski. T. 1 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C. 694.

Клемпнер Дора – арганізатар у Гродне ў 1921 г., разам з Шайкоўскім і С. Елінай, камсамольскай арганізацыі, з 1922 г. – сакратарыята гарадскога камітэта камсамола. У 1924 арыштаваная і асуджаная на 4 гады. Пасля вызвалення працавала ў Цэнтральнай тэхніцы, затым на камсамольскай працы. У 1933 – сябра сакратарыята ЦК камсамола Заходняй Беларусі.

Літ.: Bergman A. Sprawy białoruskie w II Rzeczypospolitej. Warszawa, 1984.

Клейн Барыс Самуілавіч (1.11.1928, Віцебск – 4.10.2020, ЗША) – доктар гістарычных навук. Прафесар. З 1945 жыў ў Гродне. Пасля заканчэння юрыдычнага факультэта Ленінградскага дзяржаўнага ўніверсітэта (1951) працаваў старэйшым юрысконсультам Гродзенскага аддзялення Беларускай чыгункі (1952–1955), у Гродзенскім абласным аддзяленні таварыства "Веды" (1955–1964), у Гродзенскім медінстытуце (1964–1971). У сярэдзіне 1960-х гадоў зблізіўся з пісьменнікамі *Быкавым В. і Карпюком А.* – склалася група, якая крытычна ўспрымала савецкую рэчаіснасць, выступіла супраць пагрому чэхаславацкіх дэмакратаў у 1968. На загад старшыні КДБ Ю. Андропава былі прадпрынятыя мерапрыемствы па ліквідацыі гродзенскіх іншадумцаў. К. 5.05.1971 быў выключаны з шэрагаў КПСС, затым па хадайніцтву вучонай рады медінстытута пазбаўлены вучоных звання і ступені, з забаронай выступаць і друкавацца. Працаваў юрысконсультам у Гродзенскім гарадскім упраўленні харчгандлю (чэрвень-кастрычнік 1971), сацыёлагам на хімкамбінаце (1971–1975). У чэрвені 1976 рашэннем бюро ЦК КПБ быў адноўлены ў шэрагах КПСС, з аб'яўленнем вымовы за няправільныя паводзіны (у 02.1978 знятая). Быў сябрам Гродзенскай абласной калегіі адвакатаў (1975–1978). У маі 1978 вучоная рада медінстытута хадайнічала перад Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй, каб аднавіць вучонае званне і ступень, што і было зроблена ў 1979 г. З 1978 па 1992 К. працаваў у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце, займаючы пасады ад старэйшага выкладчыка да прафесара кафедры гісторыі СССР. Аўтар 72 публікацый (на 1988), у якіх ёсць багаты краязнаўчы матэрыял па гісторыі Гродзеншчыны, у тым ліку: "Найдено в архиве" (1968), "За дело правое: КПЗБ в борьбе с буржуазным террором" (1986), "Время выбора" (1987), "Взгляд из прошлого: историко-документальные очерки" (1989). З пачаткам так званай "перабудовы" выступаў у падтрымку рэфарматарскага курса і дэмакратычных перамен, за канверсію ваеннай прамысловасці і выкарыстанне яе для вытворчасці тавараў народнага спажывання. За апошняе быў у 1991 публічна названы "здраднікам радзімы" былым сакратаром Гродзенскага гаркама КПБ Мендаравым. Не знайшоўшы судовай абароны і "адчуўшы сваю непатрэбнасць, чужароднасць", вымушаны быў у снежні 1992 выехаць на месцажыхарства ў ЗША (там жыў яго сын). Прадпрымаў спробы наладзіць беларуска-амерыканскія сувязі ў галіне эканомікі і культуры (напрыклад, "Шлях Касцюшкі"). У 2008 г. выдаў кнігу "Недосказанное. Имена" (Мн.: Лимариус).

Крын. і літ.: Асабістая справа Б.С. Клейна ў архіве Гродзенскага ўніверсітэта; запіс размовы аўтара з Клейнам Б.С.; Бібікава А. Барыс Клейн: "Я адчуваю пачатак"// Пагоня.

– 1994. – 2–8.12. – С. 5; Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы: біябібліягр. давед. / рэд. В.М. Чарапіца. – Гродна: ГрДУ, 1999; Прафесары Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. 1940–2010.

Клімовіч Міхал (15.08.1809, Гродна – 05.12.1854, Пуацье, дэпартамент В'ена, Францыя) – паўстанец 1830–31 гг., сын Юзафа і Разаліі. Служыў у расійскім войску і падчас паўстання перайшоў на бок паўстанцаў, быў радавым 16 палка лінейнай пяхоты. Пасля паражэння паўстання перайшоў мяжу ў Прусію, дзе ў 1832–1833 знаходзіўся як зняволены. У канцы 1833 быў высланы ў Амерыку, але туды не трапіў. Апынуўся ў Гарвіч (Англія), адкуль 27.04.1834 прыбыў у Алжыр і быў на 3 гады завербаваны ў Іншаземны Легіён. Служыў стралком у Афрыцы (1834–1835), Іспаніі (1835–1837) і 14.05.1837 быў звольнены. Паехаў у Францыю і пасяліўся ў Бавэ дэпартамента Уаз (11.06.1837), затым выехаў у Лімож (31.07.1838), а ў 1839 – у Клермон-Феран дэпартамента Пюі-дэ-Дом. У 1840-х часта змяняў месца жыхарства. Падчас Вясны Народаў 05.04.1848 выехаў у Княства Пазнанскае, але дасягнуў толькі Страсбурга, і быў у 06.1848 высланы ў Шалон-сюр-Марн. У снежні 1848 прыбыў у Дыжон, затым знаходзіўся ў дэпартаменце Алье, адкуль 05.1849 вярнуўся ў Невер.

Крын. і літ.: НГАБ, ф. 1, воп. 4, спр. 255, арк. 20 адв.; ф. 4, воп. 1, спр. 191, арк. 91 адв.–92; ф. 4, воп. 1, спр. 196, арк. 6 адв. 7; Гарбачова В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: Біяграфічны слоўнік. – Мінск, 2004, с. 187; Bartkowski J. Spis Polaków zmarłych w emigracji od roku 1831. – ?, 1985, s. 190; Bielecki R. Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego. T. 1. – Warszawa, 1995, s. 269; "Dziennik Narodowy", 1842, № 72. S. 288; Tyrowicz M. Towarzystwo Demokratyczne Polskie. 1832–1863. Przewodnik biobibliograficzny, Warszawa, 1964, s. 295.

Клубы спартыўныя (1919–1939) – таварыствы спартсменаў па розных відах спартыўных спаборніцтваў, якія сталі ўзнікаць у горадзе пасля *вайны Першай сусветнай*. Звычайна мелі праўленне, у якое ўваходзілі выдатныя спартсмены, прадстаўнікі мясцовай ўлады, вайскоўцы, дзеячы грамадска-палітычнага жыцця. Праўленне збірала ўзносы, апекавалася спартсменамі, памяшканнямі для трэніровак і спартовымі базамі, набывала спартовы інвентар, арганізоўвала спаборніцтвы. Адным з першых узнік клуб гімнастычнага таварыства "Сокал" (1920). Затым з'явіўся вайскова-спартовы клуб (у польскай наменклатуры такія пазначаліся скаротам WKS, у перакладзе: "вайсковы клуб спартовы") "ВКС Крэсовія" (1921, з 1925 "КС Крэсовія"). З 1925 старшынёй клуба быў лекар-дэрматолаг Ян Хігер (1925). У сяр. 1930-х клуб узначальвалі інжынер Станіслаў Дамашэўскі і віцэ-старшыня, інжынер Станіслаў Бартноўскі. Клуб "Крэсовія" пабудаваў у 1925 на вул. Сапёрнай/Дзяржынскага тэніснyя корты, у 1932 – новы спартыўны комплекс па вул. Нарутовіча, 4 (Дзяржынскага, сёння тут "Гроднаграмадзянпраект"). У гэтым клубе славілася футбольная каманда. У першай палове 1920-х узніклі клубы пры вайсковых падраздзяленнях: "ВКС 76-га пяхотнага палка" (пазней "ВКС Гродна"), "ВКС 81-га пяхотнага палка", "ВКС 29-га палка артылерыі пяхоты". Стадыён

С. 871

С. 872

і спартыўныя пляцоўкі вайсковых клубаў знаходзіліся на месцы, дзе сёння стадыён Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта па вул. Захарава. У "ВКС Гродна" моцнай была ў сезонах 1934–35, 1937–39 баскетбольная каманда – уваходзіла ў лік 12 каманд, якія аспрэчвалі чэмпіёнскі тытул у Польшчы. Кіраўніком футбольнай секцыі клуба ў 1936 быў паручнік Браніслаў Даўгяла, моладзевай секцыі – сяржант Марчэўскі. Свае клубы мелі яўрэйскія жыхары горада: *"Макабі"* (1922), "Крафт" (1927), "Хасманея", "Нардзія", "Шамрыя", "Бар Хорба". У 1923 у *гімназіі* імя А. Міцкевіча быў зарганізаваны спартыўны клуб, які меў наступныя секцыі: гімнастыкі, лёгкай атлетыкі, фехтавання, а пазней грэблі (на летнім лагеры ў Азёрах). У 1921 створаны вайсковы вяслярны клуб "Нёман" (з 1927 "Гродна"). Арганізатарам і першым старшынёй яго быў палкоўнік Вацлаў Шрэдэрс, кіраўнік санітарнай службы Упраўлення акругі III корпуса ў Гродне. У 1925 клуб меў 18 лодак для прагулак і спорту, драўляны дом на Падзамчы, на беразе *Нёмана,* мураваны элінг для захоўвання лодак. Клуб арганізоўваў спаборніцтвы і прагулкі па Нёмане, Котры, Свіслачы, Аўгустоўскім канале і Вісле. З 1928 у горадзе дзейнічаў клуб "Лехія", у якім былі секцыі лёгкай атлетыкі, веласпорту, лыжная, веславання на байдарцы.

Літ.: Саяпин В. Гродненский спорт: история и достижения. 1919–1939 годы. Гродна: ЮрСаПринт, 2015. – С. 5–33, 95, 113–114; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. / А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 8, 43, 92, 93, 166, 274.

Кляцкоў Леанід Герасімавіч (12.05.1918, в. Шуміліна Ульскага р-на Віцебскай вобл. – 14.07.1997, Мінск). З 1972 па 1979 быў першым сакратаром Гродзенскага абласнога камітэта КПБ. У 1976 атрымаў званне Героя Сацыялістычнай Працы за поспехі ў выкананні планаў па павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі. Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, Айчыннай вайны 2 ст., двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, двума Знакамі Гонару, 7 медалямі, дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Пахаваны ў Мінску.

Літ.: Книга Героев Гродненской области / сост. Ю.М. Алексей, О.М. Якубович. – Гродно: ГОУПП "Гродн. тип.", 2004. – С. 117.

Кляштар баніфратраў. Фундаторам гэтага каталіцкага ордэна, які заклаў сваю сядзібу ў Гродне, быў у 1725 г. віленскі біскуп П. Панцажынскі, які запісаў манахам шэраг пляцаў на вул. Дзям'янаўскай/Свярдлова, на *Кургане*. Баніфратры мелі пабудаваць шпіталь і там займацца апекай над хворымі. Паводле звестак 1783 кляштарныя пабудовы былі драўляныя, жылі там 2 манахі: адзін збіраў у горадзе ахвяраванні, другі апекаваўся хворымі. Часова ў К. б. знаходзілася капліца, спачатку ў браме, а пазней – у кляштарнай трапезнай. У 1818 будынак капліцы знаходзіўся ў аварыйным стане, таму праз год яе разабралі, а ў 1830 удалося збудаваць новы 8-пакаёвы драўляны дом на мураваным фундаменце. На першым паверсе знаходзілася капліца Найсвяцейшай Маці Божай, на 2 паверсе – капліца Св. Яна Божага. Былі і іншыя пабудовы:

драўляны дом, кухня, гумно, адрына. У інвентары 1843 яшчэ называюцца званіца на 4 слупах, склад дрэва, стайні, 2 вазоўні, хлеў, альтанкі. Былі 2 агароды і сад. У 1847 кляштар быў зачынены.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 90–91; Walczyna F. Grodno // Miasta wielu religii. Topografia sakralna ziem wschodnich dawnej Rzeczypospolitej / pod red. M. Jakubowskiego, M. Sasa, F. Walczyny. – Warszawa: Muzeum Historii Polski, 2016.

Кляштар бенедыктынак, існаваў у 1645 г., калі *Аляксандра Весялоўская*, удава маршалка ВКЛ, даручыла кляштару завяршыць будаўніцтва шпіталя ў Тыкоціне.

Літ.: Maroszek J. Dzieje województwa podlaskiego do 1795 roku. – Białystok: Wyd-wo Uniwersytetu w Białymstoku, 2013. – S. 310.

Кляштар езуітаў, у комплекс уваходзілі *касцёл Св. Францішка Ксаверыя*, будынкі *калегіума езуіцкага*, бібліятэка, *аптэка фарная*, *друкарня езуітаў*, жылыя і гаспадарчыя пабудовы.

Кніга славы, усталяваная сумесным рашэннем № 149 Гродзенскага *гарадскога Савета дэпутатаў працоўных* і бюро Гродзенскага гарадскога камітэта КПБ ад 31.07.1968. З пачатку ў "Кнігу..." былі ўнесеныя 19 заслужаных асоб, жыццё і дзейнасць якіх звязаныя з Гроднам. За перыяд 1968–2016 такі гонар атрымалі 53 чал. Гэта асобы, якія "здзейснілі выдатны ратны, працоўны подзвіг у горадзе Гродне, або ўраджэнцы горада, заслугі якіх маюць вялікае агульнадзяржаўнае значэнне, незалежна ад месца ажыццяўлення подзвіга": дзеячы рэвалюцыйнага руху, Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, удзельнікі войнаў (грамадзянскай, Вялікай Айчыннай), будаўнікі сацыялізма.

Літ.: Книга славы города Гродно: библиографический справочник / составление, подбор материала: И.Н. Илюшина, Д.В. Крачко; под общ ред. Н.Г. Свиридо. – Гродно: ЮрСаПринт, 2017. – 204 с.

Кнобель Ян/Ёган Фрэдэрык/Фрыдрых (1724, Дрэздэн – 1792) – нямецкі архітэктар. Працаваў у Варшаве і Гродне (1753–1765). Дабудоўваў каралеўскі *замак Новы* і пабудаваў тут палацавы касцёл.

Кнотэ Якаў Фёдаравіч – *ганаровы грамадзянін* Гродна (каля 1885–86), купец 2-й гільдыі, чалец гарадской канцылярыі па кватэрным падатку і царкоўнага евангеліцка-лютэранскага савета (гл. *кірха евангеліцкая*).

Кныш Рэнальд Іванавіч (10.09.1931, г. Капыль Мінскай вобл. – 19.04.2019, Гродна) – беларускі трэнер па спартыўнай гімнастыцы, які выхаваў дзвюх алімпійскіх чэмпіёнак, *Валчэцкую А. і Корбут В.* (разам 5 алімпійскіх медалёў), а таксама чэмпіёнку СССР Аляксееву Т. У гады *вайны Айчыннай* жыў з маці ў Арэнбургскай вобл. Восенню 1944 прыехалі на жыхарства ў Гродна, дзе

бацьку прызначылі загадчыкам гарадскога адзела адукацыі. У 1947 К. пачаў займацца гімнастыкай у юнацкай секцыі спартшколы. Ужо ў 1949 стаў абсалютным чэмпіёнам БССР сярод юнакоў. У наступным годзе скончыў школу № 1 і паступіў у Гродзенскі педагагічны інстытут. Потым працягваў вучобу ў мінскіх палітэхнічным і фізкультурным інстытутах. У 1953 з-за вялікіх фізічных і нервовых нагрузак узяў акадэмічны адпачынак і вярнуўся ў Гродна, дзе пачаў трэнерскую працу. Завочна скончыў фізкультурны інстытут. У 1981 пад націскам гарадскіх і рэспубліканскіх улад, абвінавачваннях у злачынствах К. вымушаны быў пакінуць трэнерскую працу. Выехаў у Мінеральныя воды, затым у Талін і Калінінград. Вярнуўся ў Гродна ў 1989. Заслужаны трэнер БССР (1960), СССР (1964). *Ганаровы грамадзянін* Гродна (1972). Заслужаны дзеяч фізічнай культуры БССР (1974). Аўтар кніг: "Как делать олимпийских чемпионов" (2002), "Избранное" (2001), "Утро туманное" (2003), "В тени спорта" (2007).

Крын. і літ.: Горбатов Б. Ренальд Кныш: поэт и тренер. // Биржа информации. – 1998. – 11.06. – С. 5, 02.07. – С. 5; 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. – Мінск: УП "Экоперспектива", 2008. – С. 379–380; Корбут О. Жила-была девочка... – Минск, 1989; Корбут О. На цыпочках по лезвию бритвы. – Мин., 1991; рукапіс успамінаў Р. І. Кныша ў архіве аўтара.

Князі Гарадзенскія – кіраўнікі ўдзельнага *княства Гарадзенскага*. Спачатку кіравала дынастыя князёў Усеваладкавічаў. Першым згадваецца ў 1116 г. *Усевалад Давідавіч*, "Всеволодок Городенски" (каля 1099–1141) у сувязі са шлюбам з *Агаф'яй,* дачкой вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Манамаха. Ён быў № 82 паводле радаслоўнай Рурыкавічаў. Наступнымі князямі гарадзенскімі былі сыны Усевалада: дуумвірат Барыса і Глеба (1141?–1151?), Барыс (1151?–1173?) і *Мсціслаў* (1173? – пасля 1184). Яны прымалі ўдзел у паходах на Галіч (1144), супраць полаўцаў (1168, 1170, 1184). Пасля іх княжыў у *Горадзене* сын Глеба Юры (1184?–1241). З ягонай смерцю гэтая лінія гарадзенскіх князёў (Рурыкавічаў) скончылася. Польскі даследчык Ю. Слівінскі называе наступных князёў гарадзенскіх: *Давыд Гарадзенскі* (1314–1326); найстарэйшы сын князя Гедыміна Нарымонт (1326 – 2.02.1348); затым яго сын *Патрык* (1348–1365, па іншых звестках 1347–64). Пасля Патрыка княствам правіў непасрэдна *Кейстут*, які перадаў яго свайму сыну *Вітаўту* (з 1386 – гарадзенскі князь; у 1387–1389 – брэсцкі і гарадзенскі князь; у 1390–1393 – луцкі і гарадзенскі князь).

Літ.: Госцеў А.П., Швед В.В. Шлюб князя-ізгоя, або як пачынаўся Горадзен // Гродзенская праўда. – 1991. – 1 лістапада. – С. 3; Гостев А.П. О возникновении удельного Городенского княжества и князьях городенских // Наш радавод. Кн. 5, ч. 1. – Гродна, 1993. С. 107–109; Кібінь А. Ад Ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурныя трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – № 5. – С. 126–148; Нарбут А.Н. Генеалогия Белоруссии. Вып. 2 (XVI-XVIII вв.). М.: б. и., 1994. – С. 87; Śliwiński J., Wyodrębnianie się puszczy przynależnej do Grodna // Puszcze wielkoksiążęce na północnym Podlasiu i zachodniej Grodzieńszczyźnie w XV-XVI wieku (podziały, administracja, służby leśne i wodne). – Olsztyn: wyd-wo uniwer. Warmińsko-

Mazurskiego, 2007. – S. 106; J. Tęgowski. Pierwsze pokolenia Giedyminowiczów. – Poznań-Wrocław, 1999. – s. 21–25, 28–30, 198, 208.

Княства Гарадзенскае – удзельнае княства пач. XII – пач. XV ст. з цэнтрам у *Гарадзене*, вядомае па летапісах з 1116 г. з нагоды шлюбу *Усевалада Давыдавіча* з дачкой Уладзіміра Манамаха *Агаф'яй*. Мела выгаднае размяшчэнне ў басейне сярэдняга *Нёмана*, які выводзіў на Балтыйскае мора і быў адгалінаваннем шляху "з вараг у грэкі". Гэта спрыяла эканамічнаму і культурнаму развіццю княства. Аб яго межах ёсць розныя меркаванні. Георгі Штыхаў на мапе "Русь Кіеўская" заходнюю мяжу не паказаў, паўночная ідзе па літоўска-рускім памежжы (Аўкштайція), далей да Нёмана і яго правым бокам амаль да вытокаў, адсюль паварочвае на паўднёвы захад (збоку застаюцца Капыль і Клецк) да Ясельды ў ваколіцах Дзітава, далей па Ясельдзе і Нарве на паўночны захад. На тэрыторыі К. Г. знаходзіліся: Городно, Волковыеск, Турийск, Услоним, Здитов, Новогородок. У варшаўскім "Атласе гісторыі Беларусі" (т. 1, 2008) межы прыводзяцца падобна, як у Штыхава, толькі паўночна-усходняя мяжа перасунутая на поўдзень, абапіраючыся на Нёман у ваколіцах ракі Гаўя, ды паўночна-заходняя ідзе ўздоўж сённяшняй беларуска-польскай мяжы. У мінскім "Вялікім гістарычным атласе Беларусі" (2009) В. Насевіч на мапе "Падзел Русі на вотчыны розных галін Рурыкавічаў" тэрыторыю ўдзела *Усеваладка Гарадзенскага* паказаў як на мапе варшаўскага атласа. В. Цемушаў на мапе "Княствы на тэрыторыі Беларусі. XI–XII ст." правёў межы К. Г. па Нёмане (з прытокамі па поўначы ў ваколіцах Горадзена і Турыйска) і выключыў лясныя масівы на мяжы з зямлёй Тураўскай. У княства ўвайшлі гарады Ваўкавыск, Слонім і Навагрудак. Латышонак не пагадзіўся наконт прыналежнасці апошняга да К. Г. і лічыць, што яму належаў пэўны час Драгічын (паводле звестак сфрагістыкі). Палітычная залежнасць княства ад вялікага князя кіеўскага прымушала ўдзельнічаць у яго паходах супраць Полацка, Літвы, Галіча, полаўцаў. Пасля 1183 г. у Іпацьеўскім летапісе не знаходзім звестак пра Гродна і яго князёў, бо, верагодна, у Гарадзенскім княстве нічога выбітнага не адбывалася, а князі перасталі актыўна ўдзельнічаць у палітычным жыцці паўднёвай Русі. У гэты час роля Кіева як палітычнага цэнтра падала, і гарадзенскія князі, як і іншыя ўскрайныя, сталі праводзіць больш самастойную палітыку ўдзельнага княства. Такое існаванне працягвалася да мангола-татарскага нашэсця на Кіеўскую Русь. Успамін пра "трубы гучаць гарадзенскія" у "*Слове пра полк Ігаравы*" гаворыць пра тое, што Горадзен цяжка ўспрыняў паразу аднаго з полацкіх князёў-абаронцаў паўночна-заходніх межаў Русі. Цяпер гарадзенцы засталіся самі на памежжы двух вялікіх плямён: яцвягаў і аўкштайтаў (летувісаў). У апошняй чвэрці XII ст. склалася *гарадзенская школа архітэктуры*. З пачатку 1240-х гадоў, пасля нападу мангола-татараў, княства знаходзілася ў складзе ВКЛ. З 1253 па 1277 адбывалася барацьба за княства паміж літоўскім і галіцка-валынскімі князямі, пакуль *Тройдзень* не спыніў набегі апошніх на землі княства. У 1276 г. ён пасяліў у ваколіцах Горадзена прусаў. З 1284 па 1402 адбываліся на княства *крыжацкія*

напады, якія ў 1300–1326 паспяхова адбіваў кашталян гарадзенскага замка *Давыд Гарадзенскі*. З канца XIV ст. княства становіцца ўладаннем *Вітаўта*, а пасля заключэння гарадзельскай вуніі 1413 г. ператвараецца ў Гарадзенскі павет Троцкага ваяводства ВКЛ.

Літ.: Гостев А.П. О возникновении удельного Городенского княжества и князьях городенских / А.П. Гостев // Наш радавод. – Гродна, 1993. – Кн. 5, ч. 1. – С. 107–109; Зверуго Я.Г. Городенское княжество // Регионы Беларуси. Гродненская область. Т. 4, кн. 1, С. 171; А. Кібінь. Ад Ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурныя трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – № 5. – С. 110–126; Назаренко А.В. Городенское княжество и городенские князья в XII в. / А.В. Назаренко // Древнейшие государства Восточной Европы. 1998 г. / отв. ред. Т.М. Калинина. – М. – С. 169–188; Łatyszonek O. Wczesnośredniowieczne Księstwo grodzieńskie w historiografii ostatniego dwudziestolecia // Białoruskie zeszyty historyczne. – Białystok. – 2010. – N 37. – S. 7–22 (бел. варыянт – А. Латышонак. Нацыянальнасць – Беларусь, Б.м., 2012, с. 359–366).

“Kołas biełaruskaj nivy” – рукапісны часопіс, які выдаваў Гродзенскі гурток беларускай моладзі на беларускай мове “лацінкай” (лацінскім шрыфтам, 16 старонак, 50 экзэмпляраў). Артыкулы, апавяданні, вершы, песні расказвалі аб беспрасветнай долі беларускага народа і заклікалі да актыўнай культурніцка-асветніцкай працы сярод беларусаў.

Кольбэ Максіміліян Марыя – гл. *Кальбэ / Кольбэ Максіміліян Марыя*, с. 280.

Копцеў Нікіфар Харлампіевіч – вайсковы губернатар Гродна і Гродзенскі грамадзянскі *губернатар* з 24.01.1835 да 28.05.1836. Генерал-маёр, кавалер шматлікіх ордэнаў. Падчас яго губернатарства, 27.07.1835 быў адкрыты Гродзенскі *камітэт губернскі статыстычны*, паседжанні якога праходзілі пад старшынствам губернатара і пры поўным сладзе абавязковых чальцоў камітэта. Царскім указам ад 16.05.1836 звольнены з пасады з прызначэннем на службу ў Савет Міністэрства ўнутраных спраў.

Крын. і літ.: ф.1, воп. 19, с. 1008, а. 4–4 адв.; ф. 1, воп.19, с. 1008, а.4 – 4 адв.; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007.

Корбут Вольга Валянцінаўна (нар. 16.05.1950, Гродна) – майстар спорту па спартыўнай гімнастыцы. Скончыла гістарычны факультэт *Гродзенскага дзяржуніверсітэта* (1977). Трэніравалася ў Я. І. Караля, *Валчэцкай А. У.*, *Кныша Р. І.*, з якім дасягнула найвышэйшых сваіх вяршынь. Сябрам першай зборнай СССР стала ў 14 год пасля растоўскага чэмпіянату СССР 1969 г. Алімпійская чэмпіёнка 1972 (Мюнхен, золата на бервяне і ў камандным заліку, срэбны медаль за выступленне на брусах, 5 месца за апорны скачок, 7 месца ў шматбор’і) і 1976 (Манрэаль, золата ў камандным заліку, срэбны медаль за выступленне на бервяне, 5 месца ў шматбор’і і на брусах). Шматразовая чэмпіёнка БССР, СССР і свету. У 1973 прэзідэнт ЗША Р. Ніксан падараваў

ёй залатую брошку з гербам Белага дому. У 1974 ЮНЕСКА надала ёй званне "Пасол сусвету" (атрымала знак "Залаты камертон"). У гэтым жа годзе ёй уручылі кубак "Лепшай чэмпіёнцы Англіі". У ЗША ствараліся спартыўныя клубы імя К., у Нью-Ёрку яна кіравала гімнастычнай школай. Пакінуўшы спорт у 1978, працавала інструктарам аддзела Дзяржаўнага камітэта спорту Беларусі, дзяржаўным трэнерам па гімнастыцы Спарткамітэта СССР. У 1979 выйшла замуж за саліста ансамбля "Песняры" Л. Барткевіча. З 1991 жыла ў ЗША, дзе была кіраўніком гімнастычнай "школы Корбут" спачатку ў Фолсме (штат Нью-Джэрсі), затым у Нью-Ёрку. У ЗША стварыла Фонд дапамогі пацярпелым ад Чарнобыльскай аварыі. Аўтар кніг: "Жила-была девочка"(Мн., 1989); "На цыпочках по лезвию бритвы" (Мн., 1991). У музеі мадам Цюсо ёсць васковая фігура Корбут. Частка лістоў да К. захоўваецца ў *Дзяржаўным архіве Гродзенскай вобласці*.

Літ.: Вашкевіч А. Гарадзенкі. Жаночы след у гісторыі Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 99–103; Корбут О. На цыпочках по лезвию бритвы. – Мн. Полымя, 1991. – 142 с.; Попко И. "Чудо-девочка" вновь на гребне славы // Гродзенская праўда. – 1991. – 11.06. – С. 3; 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. – Мінск: УП "Экоперспектива", 2008. – С.376–377; Никитина Т. К. Моё время. Моя страна. Мой город, Очерки, эссе, интервью, зарисовки. – Гродно: ЮрСаПринт, 2017. – С. 239–244.

Корпус кадэцкі гл. школа кадэцкая.

Корсак Раймунд герба Ліс (1768–1817) – паэт, вучыўся ў піяраў у Варшаве і Кракаўскім універсітэце (магчыма тут атрымаў ступень доктара філасофіі). У 1791–1793 працаваў у *камісіі казённай* ВКЛ у Гродне, ведаў Я. Ясінскага, удзельнічаў у *паўстанні 1794 г.* Складаў патрыятычныя вершы. Сядзеў у *турмах* Гродна і Вільні, крэпасці на Падоле. Пісаў вершы, рабіў пераклады з французскай.

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 231.

Кох Аляксандр (1909, Гродна – 1972, Гродна) – мастак-жывапісец, з 1939 жыў і працаваў у Гродне (акрамя 1948–1955, калі сядзеў у канцлагеры). У 1930–34 вучыўся ў Варшаўскай акадэміі мастацтваў і з 1934 пачаў удзельнічаць у выставах з карцінамі архітэктуры, кветак, партрэтамі: "Варшава. Стары горад", "На Старым рынку", "Ружы", "Партрэт пані Р."

Літ.: Маліноўская-Франке Н., Забыты вернісаж. Творчасць мастакоў Гродзеншчыны 1860-х – 1930-х гг. – Мінск: "Канфіда", 2012, с. 152.

Кошалеў Дзмітры Радзівонавіч (пасля 1750 – 27.08.1815) – першы гродзенскі грамадзянскі *губернатар* з 1.04.1802 да 8.07.1803. Са старажытнага дваранскага роду Кошалевых, праваслаўны. Да гродзенскага губернатарства быў Літоўска-віленскім губернатарам (1801–1802). У Гродна прыехаў у чыне сапраўднага стацкага дарадцы, з'яўляючыся кавалерам шматлікіх расійскіх ордэнаў і ордэнскім камандорам. На пасадзе гродзенскага губернатара

ажыццяўляў кантроль за падрыхтоўкай справаздачы аб стане павятовых школ у губерні пасля спынення дзейнасці Літоўскай камісіі па адукацыі. Займаўся арганізацыяй паштовых станцый ва ўездах губерні. Даследаваў пададзеныя яму паэтам і асветнікам Ф. Карпінскім праекты аб удасканальванні землекарыстання і дзейнасці судоў. Указам Аляксандра I ад 9.06.1803 быў адкліканы "да іншых спраў" у С.-Пецярбург. Гродзенскі гісторык *Я. Ф. Арлоўскі* пісаў пра тое, што "ён быў звольнены за яўнае саўдзельніцтва ў кантрабандзе, а сотнік Аляксееў, адкрыўшы яго віну, быў атручаны асобамі зацікаўленымі". Сям'я: яго братам быў Кошалеў І. Р., падпалкоўнік, памешчык Разанскай губ. (бацька вядомага славянафіла і публіцыста Кошалева А. І.).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 1, а. 2, 373–375 адв.; Орловский Е.Ф. Гродненская старина. – Ч. 1. – Гродна, 1910. – С. 222; Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007; https://wiki.cologne. Доступ 08.01.2022.

Крапоткін Дзмітры Мікалаевіч (1836 – 9.02.1879) – гродзенскі *губернатар* з 13.01.1868 да 15.07.1870. Нашчадак князёў Смаленскіх Крапотка-Ялавіцкіх. З дваран Маскоўскай губ., праваслаўны. Выховаўся ў школе гвардзейскіх падпрапаршчыкаў і кавалерыйскіх юнкераў. У перыяд Крымскай вайны 1853–1856 гг. у чэрвені-лютым 1854 знаходзіўся ў складзе войск, якія ахоўвалі ваколіцы С.-Пецярбургскай губ. і Выбаргскі ўезд. У сакавіку 1859 прызначаны на пасаду палкавога ад'ютанта, даслужыўся да красавіка 1862 да ротмістра.

Быў дваюрадным братам Крапоткіна П. А., вядомага рэвалюцыянера-анархіста. 13.05.1865 К. адлічаны са світы імператара. 7.03.1864 К. прыкамандзіраваны да інспектарскага дэпартамента Вайсковага міністэрства і 4.04.1865 за выдатную службу атрымаў чын палкоўніка. Хадайнічаў за дваюраднага брата, сасланага ў Сібір за ліст, адпраўлены ў Лондан аднаму з ідэолагаў народніцтва П. Л. Лаўрову.

13.01.1868 атрымаў чын генерал-маёра з прызначэннем у світу імператара і залічэннем у армейскую кавалерыю. Адначасова гэтым жа ўказам Аляксандра II прызначаны вайсковым і грамадзянскім губернатарам Гродна. Ахвяраваў Слонімскаму Прэабражэнскаму брацтву, чальцом якога быў з 22.03.1856, 10 руб. У 1870 ахвяраваў г. Кобрыну 200 руб., на якія было вырашана набыць матэрыялы для пабудовы палкавога цэйхгаўза. Ганаровы грамадзянін г. Пружаны і г. Гродна (1870). 15.07.1870 пераведзены на пасаду харкаўскага губернатара. Забіты тэрарыстамі ў 1879.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф.1, воп. 6, с. 1171, а. 3адв.; Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007.

Красоўскі/Краскоўскі Тамаш/Фама – архіварыус канцылярыі Гродзенскага губернатара, біблятэкар Гродзенскай публічнай *бібліятэкі* (з кастрычніка 1831). Падчас *паўстання 1831* збег да паўстанцаў, "оставив имеющиеся на его руках книги, журналы и газеты, поступившие в библиотеку, в большом

беспорядке и даже не в целостности” (з данясення Гродзенскага *губернатара* міністру ўнутраных спраў). Знік без вестак.

Кронан, Chronon, Chrones (Кронэс), Chronus (Кронус) – колішнія назвы ракі *Нёман*. Назва К. упершыню з’явілася на мапе II ст. рымскага географа Пталамея. У 1490 яе перавыдаў у Рыме Пётр Турскі. Рака Chrones (Кронэс) выцякала з Венедскіх гор (сучасная Беларуская града, часткай якой з’яўляецца Мінскае ўзвышша). Другое выданне мапы ў 1511 зрабіў у Венецыі Якаў Пентус. Рака называлася Chronus (Кронус). С. Мюнсцер на сваёй мапе 1540 г. пазначыў раку дзвюма назвамі: Chronon (Кронан), Nemen (Нёман). Выцякала яна з Chrones Lacus (возера Кронэс). Магчыма апошні раз назва К. была выкарыстаная на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта*: на плыні ракі напісана Nieme і Cronon.

Літ.: Севенко А. Кто назвал Неман Крононом // Гродзенская праўда. – 2012. – 22 лютага. – С. 8

“Кронан. Летапіс горада над Нёманам (1116–1990 гг.)” – кніга гарадзенскіх краязнаўца *Госцева Алеся* і гісторыка *Шведа Вячаслава*, выдадзеная ў 1993 г. Гродзенскім абласным аддзяленнем Беларускага фонду культуры з дапамогай Гродзенскага абласнога і Гродзенскага *гарадскога выканкамаў* Саветаў народных дэпутатаў. Прысвечаная светлай памяці гісторыка *Міхася Ткачова*. Складаецца з дзвюх частак: “Храналогія”, дзе падаецца гісторыя Гродна і “Лёсам звязаныя з Гроднам”, у якой у алфавітным парадку прадстаўленыя біяграфіі асобаў, якія мелі кантакты з горадам. Гісторык Віталь Карнялюк адзначыў: “Сённяшняя навука пра горад Гродна выходзіць з “Кронана” Алеся Госцева і Вячаслава Шведа. Гэтае рускамоўнае выданне, сціплай паліграфіі, з вокладкай, аўтарам якой быў мастак *Аляксандр Ларыёнаў,* убачыла свет у 1994 г. у сценах лялечнага тэатра, і сваім зместам – канцэпцыяй, усёю сукупнасцю фактаў, імёнаў, ашаламіла аматараў і прымусіла задумацца прафесіяналаў. У гушчары розных культурна-творчых падзей пачатку 90-х гг. XX ст. даведачная кніга “Кронан” падсумоўвала і наследавала назапашаны краязнаўчы вопыт”.

Літ.: Карнялюк В. Гродна ў святле краязнаўчай думкі // Гарадзенскі гадавік, Кракаў. – 2014. – № III. – С. 117.

“Kronika miasta Grodno” – ілюстраваны квартальнік на польскай мове, прысвечаны дзейнасці мясцовага самакіравання, асобным галінам жыцця горада і яго гісторыі. Выдаўцом быў *магістрат* Гродна, у будынку якога і знаходзілася рэдакцыя квартальніка. У 1928 выйшлі два нумары (zeszyty). Першы (пад рэдакцыяй Станіслава Калецкага) быў падзелены на дзве часткі. У першай надрукаваныя невялікія артыкулы “Гродна”, “Гродна часоў Жыгімонта Аўгуста на гравюры з 1 паловы XVII ст.”, магчыма, аўтарства *Яднкоўскага Ю.* і яго артыкул “Гродна і ваколіцы ў перыяд гісторыі Літвы і Русі над Нёманам”. С. Калецкі напісаў артыкул “Дзейнасць гарадскога самакіравання ў Гродне за гады 1919, 1920, 1921”, невядомы аўтар прадставіў артыкул “Гарадскі

гродзенскі тэатр”. У другой частцы былі апублікаваныя розныя матэрыялы з жыцця Гродна: статыстычныя (аўтар Рубінгаўт), метэаралогія, дэмаграфія (аўтар Хейнрых Е.), каштарысы тавараў і прадуктаў, звесткі па беспрацоўі, банкаўскіх аперацыях, злачыннасці, зваротах гарадской касы, падатках, колькасці рамеснікаў. У квартальніку ёсць ілюстрацыя гравюры Браўна, *план Гродна* 1928, малюнак Ядкоўскага “Гродна XII–XV стст.”.

Наступны квартальнік № 2 быў выдадзены *Савіцкім Раманам*. Падзелаў нумара на часткі не было. З. Цыбульскі апублікаваў артыкул “Аб арганізацыі нагляду за гандлем спажывецкімі прадуктамі”; Е. Хейнрых – пра “Насельніцтва Гродна ў гады 1921–1927 у святле статыстычнага аналізу”; А. Дзершэн “Каса Стэфчыка”. Былі ў гэтым нумары статыстычныя матэрыялы пра гарадскія прадпрыемствы – электрастанцыю, вадаканал, ламбард, бойню жывёлы, прыватнае будаўніцтва, а таксама дадзеныя пра хворых і вязняў у 1927, адукацыю, бібліятэку, гарадскі тэатр, пажарную справу.

“Кронон” – перадача Гродзенскай студыі тэлебачання ў 1997–1998 гг., якую ініцыяваў гісторык і журналіст Уладзімір Хільмановіч і падтрымаў рэдактар Міхаіл Задаля. У. Хільмановіч стаў вядучым і расказваў у праграмах пра юбілейныя і значныя даты, пра асобаў у гісторыі Гродна. Падобныя тэлеперадачы пад іншымі назвамі пазней рабілі І. Валюсь, *В. Саяпін*.

Крыніца: вусныя ўспаміны У. Хільмановіча і аўтара.

Кропатаў Дзмітры Мікалаевіч – выкладчык гісторыі і рускай мовы Гродзенскага рэальнага вучылішча цэсарэвіча Аляксея. Скончыў Маскоўскі ун-т. Па яго ініцыятыве ў 1911–1914 гг. Гродзенскае педагагічнае таварыства выдавала часопіс “Педагогическое дело”. Быў адным з яго рэдактараў. Бацька яго, Мікалай Сяргеевіч, урач 26 пях. дывізіі, пахаваны на праваслаўных могілках Гродна, недалёка ад царквы.

Літ.: Чарапіца В.М. Са скарбніц кніжных паліц (Нарысы пра аўтографы даследчыкаў гісторыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў). – Мінск: БелНДЦДААС, 1994. – С. 112, 116 – 117.

Кругер (Крыгер) Освальд (каля 1598 – 1655) – езуіт, матэматык. У Віленскай акадэміі вывучаў філасофію (1623–1625), абараніў ступень доктара філасофіі і вызваленых навук (1639). Выкладаў матэматыку ў Полацку, Пултуску, Нясвіжы і Вільні. У 1655 стаў каралеўскім інжынерам і наглядаў за будаўніцтвам вайсковых машын у Гродне. Выдаў падручнік “Arithmetica practica in usum iuventutis” (Вільня, 1635).

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 251–252.

Круповіч Маўрыцы (1823, Гродна – 1891) – гісторык, архівіст, бібліятэкар. Вучыўся ў Дэрпцкім універсітэце (1842–1846), дзе атрымаў ступень кандыдата

філасофіі. У 1846–1851 працаваў у гродзенскім *архіве*, а ў 1852–1865 – у віленскім архіве. Быў навуковым сакратаром Археалагічнай камісіі ў Вільні, з 1879 працаваў у цэнзурным камітэце. Супрацоўнічаў з "Віленскім Кур'ерам", выдаў "Zbiór dyplomatów rządowych i aktów prywatnych posługujących się do rozjaśnienia dziejów Litwy…" (Wilno, 1858).

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 251–252.

Крусінскі Гіяцынт – дырэктар *гімназіі Гродзенскай*. Да гэтага меў больш за 20 гадоў вопыту публічнай службы. 15 гадоў актыўна супрацоўнічаў з Віленскім універсітэтам. У 1818 г. напісаў "Агульны стан ордэнскіх школ", дзе крытыкаваў дрэннае навучанне, якое з 1808 не змянілася. Бачыў поспехі развіцця адукацыі ў працягу палітыкі Адукацыйнай камісіі. Доктар Кракаўскага ўніверсітэта.

Літ.: Beauvois D. Szkolnictwo polskie na ziemiach litewsko-ruskich 1803–1832, t. 1: Uniwersytet Wileński, t. 2: Szkoły podstawowe i średnie, przeł. Ireneusz Kania, Rzym – Lublin: Fundacja Jana Pawła II – Redakcja Wydawnictw KUL 1991, s. 57, 61, 69, 82, 173, 239.

Крывец Сяргей Міхайлавіч (1909, в. Дубна Мастоўскага р-на – 28.04.1945, Гдыня) – паэт, удзельнік рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гады. Працаваў у Гродне ў 1930–1933. Творы яго распаўсюджваліся ў рукапісах сярод рабочых і сялян.

Крыж Напрастольны – каштоўны экспанат Гродзенскага *дзяржаўнага гістарыка-археалагічнага музея*. Зроблены на сродкі архімандрыта Зосімы Калковіча ў снежні 1782. У цэнтры меднага крыжа выкананы на эмалі сюжэт распяцця, на краях гарызантальнай перакладзіны знаходзяцца выявы Маці Божай ды Яна Багаслова. У падножжы крыжа выява калоны з пеўнем – напамін пра трохразавае адрачэнне апостала Пятра да таго, як тройчы праспявае певень. К. Н. па перыметры аздоблены рознакаляровымі камянямі. На адваротным баку фон крыжа пакрыты бутонамі кветак і ёсць 7 картушаў з тэкстам. На ніжнім пазначанае прозвішча фундатара і час стварэння крыжа.

Крыжакі, крыжаносцы – рыцары Прускага ці Тэўтонскага ордэна. У 1190 г. падчас трэцяга крыжовага паходу ў Палесціну быў афіцыйна створаны каталіцкі духоўна-рыцарскі ордэн братоў-рыцараў Тэўтонскага дому Дзевы Марыі ў Ерусаліме. Членамі яго маглі быць толькі прадстаўнікі нямецкае шляхты даўняга роду. А паколькі на Захадзе немцаў звалі тэўтонамі, дык і ордэн стаў звацца Тэўтонскім. Паводле пашытых на белых плашчах чорных крыжах на левым плячы нашыя продкі празвалі братоў-рыцараў крыжакамі. Крыж па плашчы падкрэсліваў галоўны абавязак рыцара – несці "слова божае" ў паганскія землі, паўставаць на абарону святой зямлі і ўсіх хрысціянскіх земляў супраць ворагаў веры, падтрымліваць і бараніць касцёл. Таму калі мазавецкі

князь Конрад запрасіў у 1225 г. крыжакоў для абароны межаў свайго княства ад ваяўнічых паганскіх плямёнаў прусаў, дык яны з задавальненнем адгукнуліся. Рымскі папа аб'явіў крыжовы паход супраць прусаў, яго ўдзельнікам адпускаліся грахі, падобна крыжакам, якія хадзілі ваяваць за святую зямлю ў Палесціну. Конрад Мазавецкі паводле прывілею 1230 г. аддаў Тэўтонскаму ордэну на вечныя часы Хэлмінскую зямлю і ўсё, што будзе імі здабыта ў Прусіі. Але крыжакі гэтым не задаволіліся і пачалі заваёўваць прусаў, будаваць на іх землях замкі. З гэтага года можна адлічваць фармаванне ў Прусіі ордэнскай дзяржавы. У 1237 з Тэўтонскім ордэнам аб'ядналіся рэшткі ордэна рыцараў Хрыста (мечаносцаў або Лівонскага ордэна). Сваю экспансію створаная дзяржава накіравала на суседзяў: Польшчу, Літву, Беларусь. Крыжацкі храніст Пётр Дусбург пад 1238 г. адзначыў: "Скончылася пруская вайна, пачалася вайна літоўская".

Горадзен быў ключом да земляў беларуска-літоўскага Панямоння з боку Мазовіі і Тэўтонскага ордэна. Вось чаму ён быў прывабным кавалкам, які спакушаў крыжакоў. Каля 20 нападаў здейснілі яны на Горадзен з 1284 па 1402 г. Хто толькі не пабываў пад сценамі непрыступнага *замка Старога*. "Паход на *Гартэн*" (так крыжакі называлі *Горадзен*) лічыўся вышэйшай адзнакаю і гонарам для маладога еўрапейскага дваранства Германіі, Францыі, Швецыі, Галандыі, Даніі, Італіі, Іспаніі, Чэхіі і Англіі. Напрыклад, сярод рыцараў былі англійскія графы Чэмберлены, Нортумбеленгі і Бэдфарды. Толькі тры разы ўдалося крыжакам захапіць Горадзен. Гэта адбылося таму, што горад меў добрыя абарончыя сцены і вежы з каменя-валуна ды *плінфы*. Каля ўвахода ў замак знаходзілася *вежа тыпу данжон* (падобная на шахматную фігуру "тура"). Уваход у брамную вежу зачыняўся сталёвымі кратамі. Мост да замка ў той час быў больш выгнутым, што дазваляла добра абстрэльваць ворага з муроў, вакон і вежаў. Частка моста паднімалася на моцных ланцугах. Значную ролю ў абароне Горадзена адыграў князь *Давыд Гарадзенскі/Даўмонтавіч* (каля 1287 – 1326).

23.04.1398 у Гродне была падпісаная прэлімінарная дамова аб міры паміж Ордэнам і ВКЛ. У ёй былі наступныя пункты:

1. Усталяванне мяжы Літвы з Інфлянтамі і Прусіяй такім чынам, што Жмудзь апынулася бы на тэрыторыі Ордэна.
2. *Вітаўт* павінен быў пабудаваць на тэрыторыі, якая адыдзе да Ордэна пасля выкупа мазавецкім князем зямлі вакол Візны, 2 ці 3 замкі – гэта будзе вечнай маёмасцю крыжакоў.
3. Вітаўт павінен дапамагчы Інфлянцкаму ордэну захапіць Пскоў, а той дапаможа ВКЛ атрымаць Вялікі Ноўгарад.
4. Вітаўт адпускае дамоў палонных крыжакоў, а сам атрымае брата Жыгімонта Кейстутавіча.
5. ВКЛ не прапускае праз сваю тэрыторыю войскі, якія ідуць на Ордэн. Сам Вітаўт не павінен быў ваяваць з крыжакамі і садзейнічаць перамір'ю з польскім каралём.
6. Вітаўту жадалі больш кантактаваць з каталіцкай царквой і Рымам.

Пра крыжакоў і іх праціўнікаў памятаюць у Гродне. Побач з *царквой Барыса і Глеба на Каложы* знаходзіцца памятны знак *"Пагоня на Грунвальд"*. Ён напамінае нам пра 1410 г. Тады каля храма вялікі князь літоўскі Вітаўт сабраў Гарадзенскую, Навагрудскую, Лідскую і Ваўкавыскую харугвы (палкі) і павёў на злучэнне з польскім войскам Ягайлы. Яны перамаглі крыжакоў, і тыя больш не нападалі на Горадзен і іншыя гарады Гарадзеншчыны. У 2003 г. недалёка ад храма узнік яшчэ адзін помнік – вялікі камень з надпісам "Давыду Гарадзенскаму (1287–1326) – славутаму абаронцу Гродна ад крыжацкай навалы. Ад удзячных нашчадкаў". А яшчэ ў Гродне ёсць раён Падкрыжакі – таксама напамін пра крыжацкія напады.

Літ.: Краўцэвіч А.К. Гродзенскі замак: нарыс. – Мінск, 1993; Сагановіч Г. Беларусь і Нямецкі ордэн (да крэўскай уніі 1385 г.) // З глыбі вякоў. Гістарычна-культуралагічны зборнік. Вып. 2. – Мінск, 1997. – С. 116–117; Сагановіч Г. Нямецкі ордэн у беларуска-літоўскіх летапісах // Беларускі археаграфічны штогоднік. – Мінск, 2003. – С. 94–103; Швед В.В. Давыд Даўмонтавіч – абаронца зямлі Гарадзенскай // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна, 2011, с. 106–109.

Крыніца "Каралеўская", знаходзіцца недалёка ад зліцця ручая *Юрыдыкі* з р. *Гараднічанкай*, ля падножжа ўзвышша, на якім калісьці стаяла *царква Св. Мікалая*, а ў часы рэформ *Тызенгаўза А. – палац адміністратара*, пазней – палац Валіцкага. Упершыню згадваецца ў дакументах 1498 г. У 1990-х была па-мастацку аформленая *Церабуном У.* з тэкстамі *Госцева А.* ("Цані ваду – мінеш бяду", "Глыток вады – няма бяды", "Калодзеж чысты – настрой празрысты"). Цяпер апошняе ўжо не існуе.

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 31; Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 64; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 13;

Крэйбіх Казімір Францішкавіч (1780–1823) – *прэзідэнт Гродна* (1810, 1819–1822). Ягоны бацька быў тутэйшым купцом, які гандляваў і меў асабістую пасэсію ў Тасна (ці Ласна), а ў 1794 г. быў сябрам *Парадкавай камісіі* Гродзенскага пав. У 1810 К. быў абраны *прэзідэнтам* Гродна, але хутка звольнены па прычыне хваробы. З ягонага фармуляра бачна, што ён добра адукаваны (ад'юнкт), "мае ўсе тыя таленты, якія патрэбныя для правільнага і добразычлівага кіравання". К. у 1812 стаў старшынёй аддзела паліцыі гродзенскай *рады муніцыпальнай* паводле загаду ад 17.07 Часовага ўраду ВКЛ. Быў кіраўніком паліцыі адразу пасля ўваходу ў Гродна польскіх войскаў пры *губернатары Ражнецкім* А. *Масон* ложы "Сябры чалавецтва на ўсходзе Гродна". Другі наглядальнік і справаздачны сябра. Ганаровы сябра Пецярбургскай ложы Белага Арла, якая працавала паводле рытуалу Вялікага Усходу Варшавы на польскай мове. Пасля таго, як ложы былі скасаваныя, даносіў *губернатару* Андрайковічу М., што масонскія дэкарацыі спаленыя (ці так было?). Яго

імя ёсць у спісе Гродзенскага аддзялення Расійскага *біблейскага таварыства* (1817). У 1819–1822 – прэзідэнт Гродзенскага гарадавога *магістрата*.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1168, воп. 1, с. 5, а. 2–3, 12, 41 адв.; ф. 1193, с. 7, л. 27 адв.; Grodno w XVIII wieku. Miasto i ludność (na tle trendów rozwojowych od średniowiecza do 1936 roku) / Red. A. Woltanowskiego i J. Urwanowicza. – Białystok, 1997, s. 30; Швед В.В. Гарадзенскія масонскія ложы (канец XVIII – пач. XIX стст.) // Гарадзенскія запісы: старонкі гісторыі і культуры. – Гародня, 1997. – Вып. 3, с. 64–77.

Крэйдавыя горы – каменяломні па здабычы белай крэйды, якія знаходзяцца на поўнач ад Гродна. Мясцовасць вядомая таксама пад назвай Мелаўцы, Мялы, Мёлы, Мелы (ад расейскага слова "мел"). У структуры гор вылучаюць: маладыя – дэлювій; мергелі – троесныя пяскі з дамешкам фасфарытаў на дне; мелавы крамяністы мергель; крэйда для пісання. Пра К. г. пісалі ў сваіх творах па геалогіі нямецкія вучоныя Г. Берэнт і Ц. Грэвінк (1870), расійскія даследчыкі геалогіі Гродзенскай губ. А. Гедройц (1895) і А. Місуна (1909), польскі вучоны Я. Мразевіч, які назваў мясцовыя фасфарыты тэрмінам "гродналіты" (1924). Польскі даследчык З. Глогер у 1872 г. знайшоў у крэйдавым кар'еры старажытныя крамянёвыя прылады працы.

Літ.: Глогер З. Далінамі рэк. Нёман (фрагменты) // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Вып. 10 (2015) / рэдкал. І. Соркіна [і інш.] – Гродна, 2016. – С. 52; Roxolanus., Przedhistoryczne dzieje Grodzieńszczyzny [w.:] Przegląd Wileński. – Wilno. – R. 6. 1923. – № 15. – S. 2–5; Rydzewski B., Dyzlokacja Grodzieńska=Die Dislokation von Grodno. – Wilno: drukarnia "Znicz", 1929. – S. 2, 5, 11.

Крэйтан Аляксандр Мікалаевіч (13.09.1866 – ?) – гродзенскі *губернатар* з 7.03.1916 да студзеня 1917. З дваран С.-Пецярбургскай губ. Выхаванец Пажскага корпуса. 11.08.1886 атрымаў чын падпаручніка лейб-гвардыі Прэабражэнскага палка, праз пяць год – паручніка, у чэрвені 1896 зацверджаны на пасаду справаводцы палкавога суда, неаднойчы камандаваў ротай Мікалая II і выконваў абавязкі палкавога казначэя. Загадам ад 27.11.1901 звольнены ў адстаўку ў чыне палкоўніка, з правам нашэння мундзіра і пенсіяй. У 1903 яму надалі званне камергера імператарскага двара і ў чэрвені накіравалі на працу ў МУС. У гады *вайны руска-японскай* 1904–1905 актыўна дзейнічаў у Расійскім таварыстве Чырвонага Крыжа. У 1908–1913 – херсонскі, у 1913–1916 – разанскі віцэ-губернатар. 23.02.1916 атрымаў званне ганаровага грамадзяніна г. Крэменец Валынскай губ. Да прызначэння ў Гродзенскую губ. дайшоў да чына сапраўднага стацкага дарадцы (1913).

Указам Мікалая II ад 7.03.1916 прызначаны выканаўцам абавязкаў гродзенскага губернатара, 24.05.1916 – гродзенскім грамадзянскім губернатарам. У чэрвені 1916 стаў старшынёй Гродзенскага аддзялення Камітэта Яе Імператарскай Высокасці вялікай князёўны Таццяны Мікалаеўны для аказання часовай дапамогі пацярпелым ад вайсковых бедаў. Падчас эвакуацыі пераехаў у Петраград, дзе працягваў выконваць функцыі гродзенскага губернатара да студзеня 1917.

Меў наступныя ўзнагароды: чатыры ордэны, Кавалерскі Крыж дацкага ордэна Данеброга; 7 медалёў (сярод іх цёмна-бронзавы за працы па Першым ўсеагульным *перапісе насельніцтва* Расійскай імперыі 1897), вензелевы ўзор імёнаў Аляксандра III і Мікалая II. Знакі адрознення – лейб-гвардыі Прэабражэнскага палка (1909), у гонар 50-годдзя Палажэння аб губернскіх і павятовых земскіх установах (1914).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф.18, воп.1, с. 2810, а. 31; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно, 2007.

Крэпасць гродзенская – абарончае збудаванне. Першая, па словах Вароніна М. М., пабудаваная на месцы былога паселішча на мяжы XI–XII стст. На захад ад палаца быў знойдзены невялікі ўчастак сцяны, які Варонін назваў рэшткамі кутняй вежы замка часоў Кіеўскай Русі. Знайшлі археолагі і сцяну на мысе гары. Яна складзеная з *плінфы* на цымяначнай рашчыне і пастаўленая на тонкай праслойцы будаўнічага смецця. Захавалася на даўжыню 12 м. Частка абарончай сцяны была драўлянай. *Замак Вітаўта* (XII–XIII стст.) меў 5 вежаў (адна з іх брама). Самая вядомая – "*столп бе камен*". Пасля пабудовы замка *Стэфана Баторыя* (XVI ст.) застаўся з боку *Гараднічанкі* вялікі блок абарончых сценаў з часткай квадратнай вежы, якую ўзмацнілі контрфорсам. У канцы 1990-х у вежы было адно акно, а другое было закладзенае цэглай.

У 1795, калі *Гродна* было ў складзе Расійскай імперыі і стала памежным горадам з Прусіяй, была задуманая пабудова сучаснай крэпасці. План не быў выкананы. У 1827 камісія пабудовы крэпасцей разглядала магчымасць пабудавання іх у Брэст-Літоўску ці Гродне. Праекты рыхтаваліся для двух гарадоў, але перамог Брэст – гэта ўратавала гістарычную частку Гродна. У 1873 на нарадзе ў імператара Аляксандра II разглядаліся планы інжынернай абароны заходніх і паўднёвых тэрыторый імперыі, у тым ліку па рацэ *Нёман*, бо верагодным праціўнікам Расіі сталі лічыць немцаў. У 1879 міністр абароны Д. Мілюцін падрыхтаваў рапарт аб пабудове крэпасцей у Коўне, Гродне, Асаўцы. У 2–3 км ад Гродна ў 1887 пачалі будаваць паўстацыянарныя ўмацаванні – пяць *фартоў* для 64 гармат і 10 батальёнаў пяхоты. Да 1891 збудавалі 7 фартоў.

У чэрвені 1911 г. была складзеная спецыяльная камісія на чале з генерал-лейтэнантам М. Н. Кайгародавым для падрыхтоўкі плана крэпасці ў Гродне. Праект крэпасці 4.08.1912 быў зацверджаны Мікалаем II (аўтары К. Вялічка і Н. Буніцкі). Ён прадугледжваў пабудову сучасных фартоў у адлегласці 3–6 км ад старых фартоў і ў 7–12 км ад горада працягласцю да 60 км. Знешні пас фартоў павінен быў складацца з 13 галоўных умацаванняў для 2–3 батальёнаў пяхоты (у дакументах пазначаныя нумарамі), 19 пасярэдніх пунктаў апоры для паловы батальёна пяхоты (пазначаныя літарамі), 23 малых пунктаў абароны для ўзвода пяхоты, а таксама з адкрытых батарэй артылерыі для гармат вялікага калібру. Бетаніраваныя фарты павінныя былі вытрымаць артылерыйскі снарад калібру 280 і ў некаторых месцах – 405 мм. Аўтарам большай колькасці ўмацаванняў быў К. Вялічка і некаторых Н. Буйніцкі. Будаўніком

фартоў быў генерал-маёр Д. Каласоўскі. Будаўнітва пачалося 2.10.1912. Працавалі вайскоўцы, прыватныя будаўнічыя прадпрыемствы, наёмныя працаўнікі і сяляне. 23.08.1913 Гродна было абвешчанае крэпасцю, але, калі 1.08.1914 немцы абвясцілі вайну Расіі, дык ніводзін з новабудаваных фартоў не быў скончаны нават на палову. Будаўнічыя працы былі перанакіраваныя на пабудову палявых фартыфікацый перад галоўнымі фартамі і падрыхтоўку фартоў да вайны. 14–15.11.1914 Мікалай II пабываў у крэпасці і пабачыў форт № 4. Падчас нямецкай акупацыі кантроль над крэпасцю ажыццяўляў этапны інспектар 12-й арміі. З верасня 1915 ім быў генерал ад інфантэрыі Рыхард фон Калеве. У К. Гродна быў сфармаваны асобны гарнізон, які складаўся з сямі батальёнаў ландштурма, мелася 8 батарэй пешай артылерыі (палявыя гаўбіцы калібра 10–15 см). Немцы рамантавалі расійскія ўмацаванні і будавалі між імі крапасную лінію. У Гродне рзмяркоўваўся 45-ы армейскі батальён, ля в. Караліно – нямецкі аэрадром на месцы былога расійскага. У часы *вайны Другой сусветнай*, 17–20.07.1944, на форце № 1 ішлі абарончыя баі некалькіх рот 455 стралковага палка 42 дывізіі.

Літ.: Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння. – Мінск, 1996, с. 23–30; Гроднаznаўства: дапам./А.П. Госцеў [і інш.]; пад агул. рэд. В.В. Шведа, В.Р. Карнялюка. – Гродна: ГрДУ, 2009. – С. 31, 127–129; Лютик Д., Пивоварчик С., Семенчук А., Неизвестная крепость Российской империи. Историческая реконструкция событий. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014; Піваварчык С. Гродзенская крэпасць у XIX – пачатку XX ст.: планы і рэаліі // Castrum, urbis et bellum: зборнік навуковых прац. – Баранавічы, 2002; Черепица В.Н., Город-крепость Гродно в годы Первой мировой войны: мероприятия гражданских и военных властей по обеспечению обороноспособности и жизнедеятельности: монография / В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 2006. – 535 с.; Parfieniuk W. Twierdza Grodzieńska. – Warszawa: Edipresse Polska S.A., 2016. – 63 s.

Кудравец Віктар Міхайлавіч (нар. 14.04.1947, в. Дашковічы Свіслацкага р-на) – старшыня Гродзенскага *гарадскога выканаўчага камітэта* (з 20.07.1989). Скончыў Маладзечненскі палітэхнікум (1969), Беларускі палітэхнічны інстытут і Мінскую вышэйшую партыйную школу (1981). Паводле спецыяльнасці інжынер-промцеплаэнергетык. Працаваў аператарам на Ваўкавыскім малочна-кансервавым камбінаце дзіцячых прадуктаў (1969), інструктарам, загадчыкам арганізацыйнага аддзела Ваўкавыскага гаркама партыі (з 1975), інструктарам, намеснікам загадчыка аддзела арганізацыйна-партыйнай працы Гродзенскага абкама КПБ (з 1981), другім сакратаром Гродзенскага гаркама КПБ (з кастрычніка 1985). Старшыня Гродзенскага *гарадскога Савета народных дэпутатаў* (15.05.1990 – сакавік 1991). Старшыня Кантрольнай палаты Беларусі па Гродзенскай вобласці (1993).

Кулакоўскі/Калакоўскі Ігнат (1800, Янаўшчына пад Сухапалем Пружанскага ў. Гродзенскай губ. – 1870) – польскі літаратар, магчымы аўтар кнігі "Рассказы на белорусском наречии". Скончыў Свіслацкую гімназію і Варшаўскі ўніверсітэт (1826). У Гродне працаваў засядацелем суда Гродзенскага

галоўнага (1827–30), з 1830 – палаты крымінальнай. Быў апекуном *бібліятэкі гродзенскай публічнай*. З'яўляўся чальцом-карэспандэнтам *камітэта Гродзенскага губернскага статыстычнага*. У 1827–28 у Гродне былі надрукаваныя яго "Забаўкі вершам". У 1833–37 К. склаў "Кароткае гістарычнае апісанне г. Гродна", а ў 1837 – "Статыстычнае апісанне гарадоў Гродзенскай губерні". Яго праўнучкай была *Верас Зоська/Людміла Сівіцкая*.

Літ.: Латышонак А. Нацыянальнасць – Беларус, Б.М., 2012, с. 471–475; Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны. Даведнік, Гродна, 2000, с. 168; Makowiecka Z. Kołakowski (Kułakowski) Ignacy // Polski Słownik Biograficzny. T. XIII. – Wrocław, Waszawa, Kraków, 1967–68, s. 330;

Кулеша Міхал (1800, Вільня – 3.11.1863, Беласток) – мастак, педагог. Першыя ўрокі малюнка атрымаў у Я. Дамеля. Затым вучыўся ў Я. Рустэма ў школе мастацтваў пры Віленскім універсітэце, удзельнічаў у выставах студэнцкіх прац 1820 і 1822 гг. У 1829 атрымаў патэнт настаўніка малявання і пачаў працаваць як прыватны настаўнік у Лунне ў князя Гераніма Друцкага-Любецкага. Маляваў краявіды Палесся, ажыццявіў мастацкія вандроўкі па Віленшчыне (1829), Крыме (1837), Літве, Падоллі, Валыні. Звяртаў увагу на архітэктуру як фон гістарычных падзей і аб'ект старажытнасці, як месцы, звязаныя з імёнамі выдатных дзеячаў Рэчы Паспалітай. З 1835 быў настаўнікам у Крожах, Гродне, Беластоку (з 1844 працаваў 20 год у гімназіі і інстытуце шляхцянак). У парыжскім літаграфічным выданні апублікаваў "Teka Kuleszy" (1850). Маляваў Гродна і ваколіцы: руіны прадпрыемстваў *А. Тызенгаўза* ў Ласосне, *царкву Барыса і Глеба на Каложы*, Стары і Новы *замкі*.

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 259; Rosińska-Derwojed A., Z twórczości malarza Białostockiego M. Kuleszy // Rocznik Białostocki . – 1960. – T. 1. – S. 255–271.

Кульчынскі Ігнат (1707, Уладзімір на Валыні ці Гродна – 1747, Гродна) – уніяцкі царкоўны дзеяч, першы даследчык беларускай старажытнасці. Вучыўся ў базыльянскіх школах Беларусі. У 19 год стаў сакратаром пры галаве базыльянскага ордэна К. Стаўпавецкім-Любянецкім. У 1727–1735 быў генеральным пракуратарам – прадстаўніком ордэна пры папе Рымскім. Закончыў рымскі калегіум і атрымаў ступень доктара багаслоўя. Выдаў на лаціне "Сапраўдныя паведамленні пра становішча ўніяцкай царквы на радзіме" (Рым, 1726), "Спроба гісторыі рускай царквы" (Рым, 1733); кнігу пра абраз Жыровіцкай Божай Маці. З 1736 па 1747 – архімандрыт Гродзенскага *манастыра Каложскага*. Даследаваў гісторыю манастыра паводле захаваных дакументаў яго архіва (публікацыя ў "Археографическом сборнике документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси", т. 9, Вильно, 1870). Цікавіўся гродзенскім замкам, Сафійскім саборам у Полацку (апісаў крыж, зроблены Лазарам Богшай у 1161). У 1738 склаў "Хронику игуменов, архимандритов, ктиторов и покровителей Гродненского на Коложе монастыря" (за перыяд 1492–1723), а таксама "Инвентарь монастыря Базилианско-униатского в Гродно на Коложе

в давнее время основанного" (паводле стану на 1738). Пахаваны ў мураванай труне ў *царкве Барыса і Глеба на Каложы,* паміж двума слупамі з паўднёвага боку. Магчыма над пахаваннем быў помнік.

Літ.: Казуля С.,. Дзеля заслугі перад Богам і для нашчадкаў // Пагоня – 1997. – № 2 – 8. 01. – с. 7: Ермоленко В. А., Черепица В.Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 277; Walicki M. Cerkiew Św. Borysa i Gleba na Kołoży pod Grodnem // Studia do dziejów sztuki w Polsce. T. 1 – Warszawa: W-wo Zakładu architektury polskiej Politechniki Warszawskiej, 1929, s. 2.

Кульчыцкі Леан Францішкавіч (каля 1823 – 1863) – адстаўны штабс-капітан расійскай арміі, наглядальнік (па іншых дадзеных начальнік) гродзенскай станцыі Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі. Па яго ініцыятыве ў гродзенскіх чыгуначных слясарных майстэрнях выраблялі халодную зброю. Удзельнічаў у арганізацыі выезда гродзенскіх гімназістаў у паўстанцкі атрад Л. Нарбута 26.03.1863. Пасля няўдачы дабраўся да лясоў паміж Парэччам і Друскенікамі, а затым на Ковеншчыну. Разбіў расіян у ваколіцы чыгуначнай станцыі Казлова Руда на адрэзку чыгункі Коўна-Вярбілава (на пачатку красавіка 1863). У баі 9 красавіка 1863 г. каля в. Павілайце быў цяжка паранены, трапіў у палон і затым памёр у вайсковым шпіталі ў Коўне. 4 сакавіка ў кватэры К. быў зроблены вобыск, падчас якога знайшлі куфар з паперамі.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 231, а. 19 аб.; ф. 3, воп. 1, с.2, а. 22; Jodkowski J. Łaniec St. Partyzanci kresów Północno-Wschodnich w Powstaniu styczniowym: ziemie białoruskie, Toruń, 1996, s. 28; Łaniec St. Partyzanci żelaznych dróg roku 1863. Kolejarze i drogi żelaznie w Powstaniu styczniowym. Warszawa, 1974, s. 206–207; Jodkowski J. Gimnazjum po-dominikańskie w Grodnie. – Grodno, 1924, s. 30.

Кунстава, Кунштат (ад нямецкага "Kunstatte" – горад мастацтваў, горад майстроў). На мапе Гродзенскай каралеўскай эканоміі 1782 г. на месцы сучаснай *Ласосны* нанесены як прамысловы комплекс. Тут меркавалі стварыць прамысловы цэнтр больш высокага тыпу, чым на *Гарадніцы* ў Гродне. Усе пабудовы павінныя былі быць з каменя, майстэрні – з бутавай кладкі, а жылыя дамы – з цэглы. Паводле ўзору "рэзідэнцый, якія будавалі на Захадзе і ў Польшчы каралі і магнаты" прадугледжваліся доўгія і шырокія магістралі, якія зоркападобна разыходзяцца ад агульных, рэгулярна зарганізаваных плошчаў. Цэнтр складала авальная плошча, акружаная дамамі галоўнага дырэктара/адміністратара і яго чыноўнікаў. Як сцвярджае гісторык архітэктуры Ігар Трусаў, першапачатковы план Кунстава мог быць распрацаваны Ёганам Георгам *Мозерам*, але аўтарам адзінага вядомага плана быў архітэктар Джузэпэ *Сака* (копія захоўваецца ў Варшаўскім палітэхнічным універсітэце). Будаўніцтва мануфактурнага цэнтра ў Ласосне (на каралеўскіх землях) пачалося каля 1774 г. і працягвалася да звальнення *А. Тызенгаўза* з пасады кіраўніка *Гродзенскай эканоміі* ў 1780. Па ініцыятыве Тызенгаўза меркавалася

адкрыць 14 *мануфактур каралеўскіх*, але, паводле звестак даследчыка І. Гібянскага, заснавалі 8 – у 1777 сюды перавялі з Гродна васковую фабрыку, фарбавальню палатна, скураны завод і капялюшную мануфактуру. Праз два гады былі падрыхтаваныя памяшканні для суконнай, залатой (вытворчасць залатых і срэбных галуноў), шаўковай і палатнянай фабрык. Тызенгаўз хацеў адкрыць у Ласосне некалькі новых фабрык: фарфоравую, папяровую, тытунёвую і люстэркаў. Нам вядома пра працу толькі трох мануфактур: палатнянай (працавала ў 1779–1845, кіраўніком быў швейцарац Даніэль Вілі; працавалі таксама яго землякі, майстар Недэрэр і дзяўчаты Ганна Местлін ды Барбара Хамен), воўнавай (1766–?), фарбавальна-тонкасуконнай (1779–1845). У канцы XVIII ст. па *Ласасянцы* прайшла мяжа паміж Расійскай імперыяй і Прусіяй, і большая частка Ласосны адышла немцам, якія ў 1807 г. склалі "План мануфактур на Ласосне" (пазначаныя 6 каменных пабудоў мануфактур і будынак адміністратара). Гарадзенскі гісторык Ігар Лапеха зрабіў спробу лакалізацыі пабудоў у К. пры дапамозе планаў XVIII – першай паловы XX ст. Мануфактуры і палац адміністратара знаходзіліся на ніжнім плато Ласасянкі, якое зараз займае былая вёска Дзімітраўка; жыллёвая зона размяркоўвалася на ніжнім правабярэжным плато Ласасянкі, дзе сёння вуліцы Запрудная і Ласосна, трасіроўка якіх супадае з трасіроўкай вуліц Кунстава. У в. Дзямідкава, у дварах дамоў №№ 5, 7, 14, 16 будынкі стаяць на фундаментах былых мануфактур. Былая сцяна адной з фабрык з'яўляецца сцяной сучаснага хлява жыхара ў Дзямідкава. У артыкуле "Строительство Тизенгауза в Гродно" расійская даследчыца *А. Д. Квітніцкая* пісала: "Паводле сведчанняў мясцовых жыхароў, у апошнюю вайну разбураныя рэшткі палатнянай фабрыкі і домікі рабочых у Ласосне".

Літ.: Вашкевич А. Ф., Трусов И. Кунштат Антония Тизенгауза: история и место в пространстве современного Гродно; Гродно во второй половине прошлого столетия // Гродненщина. Часть первая. Том 2. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 19; Квитницкая А.Д. Строительство Тизенгауза в Гродно // Архитектурное наследство. – М., 1959. – № 11. – С. 21–42; Лапеха І. Спроба лакалізацыі Гарадніцы і Кунстава канца XVIII – першай паловы XX ст. / І. Лапеха // Горад Святога Губерта: зб. краязн. арт. – Мінск, 2011, с. 101–102; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 329–333; Швед В.В. Гісторыя развіцця рамяства ў Гродне. – Ліда, 2015, с. 5–6.

Кунц Восіп Мацвеевіч – гродзенскі купец, заснавальнік бровара ў Гродне на беразе *Нёмана* (1877). У 1895 меў паравую машыну на 8 к. с. і вырабляў 60 тыс. вёдзер піва. Меў таксама соладавы завод, дзе працавала 20 рабочых, была паравая машына (12 к. с.). У 1861–1913 быў паравы рухавік магутнасцю 20 к. с., у 1908 на заводзе працавала 16 рабочых, якія выраблялі прадукцыі 150 тыс. вёдзер, коштам у 98 тыс. рублёў. К. таксама зрабіў першы гідралагічны пост на левым беразе Нёмана.

Літ.: "Вся Россия за 1895 г."; Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі /Аўтар-складальнік Болбас. – Мн.: Бел.СЭ, 1988, с. 206.

Купа Міхаіл Мікалаевіч (1931, в. Казлы Бераставіцкага р-на – 30.03.1997) – каменшчык, заслужаны будаўнік БССР (1974), Герой Сацыялістычнай працы (1975). Званне атрымаў за датэрміновы ўвод у эксплуатацыю першай чаргі нітачнай фабрыкі Гродзенскага прадзільна-нітачнага камбіната. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

Літ.: Книга Героев Гродненской области / сост. Ю.М. Алексей, О.М. Якубович. – Гродно: ГОУПП "Гродн. тип.", 2004. – С. 126.

Купала Янка (сапр. Іван Дамінікавіч Луцэвіч, 25.06.1882 – 28.06.1942) – народны паэт Беларусі. Яго імя носіць *Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт*. Каля галоўнага будынка на вул. *Ажэшкі Э.* і ўнутры яго маюцца бюсты К.

Купцэвіч Фелікс Філіпавіч (1900–1938) – камісар на гродзенскай чыгунцы (1919). Вучыўся ў Слонімскім вышэйшым пачатковым вучылішчы. У *вайну Першую сусветную* – бежанец. З 1918 працаваў у Гродне рабочым на чыгунцы, пасля 1919 быў тут камісарам, сябрам камісіі па барацьбе з працоўным дэзерцірствам. З 1924 – у статыстычным аддзеле ЦК КП(б)Б, у 1925 – сакратар Крычаўскага райкама КП(б)Б. У 1926 накіраваны ЦК КП(б)Б на працу ў Латвію. Пасля вяртання стаў намеснікам дырэктара газеты "Звязда", затым працаваў у радыёцэнтры. З 1929 вучыўся на літаратурным аддзяленні Інстытута Чырвонай прафесуры ў Маскве, у 1930 быў выключаны за "нацыяналістычны ўхіл". У жніўні 1930 арыштаваны па справе "Саюза вызвалення Беларусі", у лістападзе 1930 вызвалены. Працаваў у Маскве на заводзе, эканамістам у выдавецтве. У 1933 арыштаваны па справе "Беларуская народная грамада", асуджаны на 5 гадоў папраўчага працоўнага лагера. У 1937 г. арыштаваны ў Мінусінскім лагеры і ў 1938 асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1956.

Курбатаў Міхаіл Ціханавіч (15.01.1924, г. п. Магдагачы Амурскай вобл. – 18.07.1944, Гродна) – малодшы сяржант Савецкай арміі. Герой Савецкага Саюза. Забіты падчас вызвалення Гродна. На месцы яго смерці ёсць мемарыяльная дошка (1965). Перад заводам карданных валаў стаіць помнік К. (1977), на будынку завода знаходзіцца мемарыльная дошка. Яго імем названая вуліца.

Курган – адно з узвышшаў, на якіх паўстаў горад, адзін з найбольш высокіх пунктаў горада. Яго найменне можа мець сувязь з раннесярэднявечным курганным могільнікам X–XI стст. або месцам культу гарадзенскіх язычнікаў. Праведзеныя раскопкі паказалі, што таўшчыня культурнага слоя тут дасягае 2,9–3 м. Адлюстраваны на *гравюры Адэльгаўзера і Цюнта* 1567–68 гг. Курган згадваецца на старонках кніг магістрата XVII–XVIII стст. На тэрыторыі К. быў пляц *бурмістра* Гануса Паўльсена, знаходзіцца *касцёл Бернардзінцаў*.

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 110; Гардзееў Ю. Вывучаючы горад… / Ю. Гардзееў // Гарадзенскі гадавік. – 2016. – № 4. – С. 38–39; Краўцэвіч А. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV – XVIII стст. / (планіроўка, культурны слой). – Мінск, 1991. – С. 32, 71; Трусаў І. Матэрыялы да вывучэння гісторыі старажытных могілак у межах сучаснага Гродна // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 54.

Курган Славы – насыпаны на праспекце Касманаўтаў у 1958–1969 у гонар барацьбітоў за Савецкую ўладу ў 1917–1921, за далучэнне Заходняй Беларусі да БССР на працягу 1921–1939, а таксама вайскоўцаў, партызан і падпольшчыкаў часоў вайны Вялікай Айчыннай. Зямля была прывезеная з усіх раёнаў Гродзенскай вобл., з брацкіх магіл, магіл Герояў СССР. К. мае форму ўсечанага конуса вышынёй 18 м., верхавіны – 5 м. Зайсці на верх можна па 2 лесвіцах. Побач з К. у 1974 закладзеная Алея герояў. Дэманструецца вайсковая тэхніка.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 228.

“Кур’ер Літоўскі” (“Kurier Litewski”) – інфармацыйны часопіс, які выдаваўся ордэнам езуітаў у Гродне ў 1796–1797 гг. (горад быў рэзідэнцыяй літоўскага генерал-губернатара *Рапніна* і *Вярхоўнага літоўскага праўлення* пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай). Выходзіў 1 раз на тыдзень. Друкаваліся навіны краёвыя і з замежжа. Да і пасля Гродна часопіс выдаваўся ў Вільні.

Курлаў Яўген (1876, Варшава – 1919, маёнтак Навасёлкі) – грамадскі дзеяч, літаратар (публікаваўся з 1899), старшыня *ўправы Гарадзенскай губернскай беларускай* (са снежня 1918). Быў застрэлены ва ўласным маёнтку рабаўнікамі.

Літ.: Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich= Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– S. 208.

Курловіч Аляксандр Мікалаевіч (нар. 28.07.1961, Гродна – 09.04.2018, Гродна) – гродзенскі штангіст-цяжкавагавік (трэнер П. Савіцкі), заслужаны майстар спорту СССР (1988). Чэмпіён свету (1987, 1989, 1991, 1994) і СССР (1983, 1989, 1991). Чэмпіён Еўропы (1989, 1990). Чэмпіён Сеульскай Алімпіяды (1988; у суме двубор’я – 562,5 кг). Здабыў залаты медаль у суперцяжкай вагавай катэгорыі на XXV Алімпіядзе ў Барселоне (1992 г., у суме двубор’я – 450 кг). Уладальнік Кубка свету (1990, 1994). 13-разовы рэкардсмен свету ў суперцяжкай вагавай катэгорыі. Узнагароджаны ордэнам “Знак гонару”. *Ганаровы грамадзянін* г. Гродна (1993).

Літ.: 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. – Мінск: УП “Экоперспектива”, 2008. – С. 401–402; Ясны Э. Атлеты с большой буквы // Беларуская думка. – 1993. – № 4. – С. 89–92; Попко И. Золотая штанга Александра Курловича // Гродзенская пра-

ўда. – 1992. – 6.08. – С. 1, 3; Попко И.Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 61–65.

Курыловіч Антоні (1876–1954) – ксёндз канонік, пробашч пабернардзінскага касцёла, старшыня гродзенскага аддзялення агульнапольскага таварыства дапамогі дзецям і моладзі "Прыстань". Падчас *вайны Першай сусветнай* узначальваў дабрачынную секцыю Грамадзянскага камітэту. Пасля вайны ўвайшоў у *раду гарадскую*. У 1915 г. адкрыў прытулак, у якім дзеці набывалі прафесіі шаўца, краўца, вышывальшчыцы, вязальшчыцы. На яго падставе ў 1921 зарганізаваў школу для дзяўчынак розных веравызнанняў. З 1935 яна стала называцца "7-гадовая публічная Бернардзінская школа № 3". Дзякуючы К. у Гродне ўзнікла аддзяленне "*Польскай мацежы школьнай*", якой ён кіраваў з 24.12.1918 да 1939. У 1938 быў узнагароджаны Крыжам ордэна Адраджэння Польшчы "за заслугі на полі грамадскай працы". У *касцёле бернардзінскім* у 1988 была асвечаная дошка-бюст К.

Літ.: Historia Polskiej Macierzy Szkolnej w Grodnie // Słowo Ojczyste. – 2011. – Nr 4 (128). – S. 8, 9, 13.

Кушнер (Кнышоў) Павел Іванавіч (26.01.1889, Гродна – 14.03.1968, Масква) – этнограф, доктар гістарычных навук (1947), прафесар (1959). Незаконны сын (бо рускі не мог ажаніцца на яўрэйцы) расійскага чыноўніка, міравога суддзі І. Г. Кнышова і харысткі гродзенскага *тэатра* Л. Кушнер. Скончыў Гродзенскую *гімназію*. Як сацыял-дэмакрат (мянушка Кныш) прымаў удзел у рэвалюцыі 1905–1907 гг. у Гродне і Рызе (там жыла маці з меншымі дзецьмі, бо бацька памёр). Удзельнічаў у Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. і ў сакавіку стаў першым сакратаром Маскоўскага савета рабочых дэпутатаў, затым – сакратаром Маскоўскага Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта. Летам 1920 быў начальнікам Палітычнага ўпраўлення Туркестанскага фронту, пасябраваў з М. Фрунзэ. У гэты час К. пазнаёміўся з жыхарамі Сярэдняй Азіі і рабіў нататкі. У 1920-я гады кіраваў аддзелам у газеце "Чырвоная Татарыя". Затым – на партыйнай і выкладчыцкай працы. З восені 1922 выкладаў у Камуністычным універсітэце імя Свярдлова ў Маскве. Летам 1925 вандраваў па Сярэдняй Азіі з мэтай даследавання сацыяльнага ладу качавых народаў. Паводле матэрыялаў экспедыцыі выдаў манаграфію "Горная Кіргізія" (Масква, 1929). На пачатку 1930-х быў гандлёвым прадстаўніком СССР у Літве, затым год у Нарвегіі. У 1936 узначаліў Камітэт вучоных і вучэбных устаноў пры ЦВК СССР. Падчас сталінскіх пераследаў поўгода сядзеў у турме, але пазбег страшнага выніку і нават атрымаў пасаду нам. дырэктара музея народаў СССР. З 1944 працаваў у Інстытуце этнаграфіі АН СССР. Падтрымоўваў "этнічны" падыход да этнаграфічных характарыстык народаў, абгрунтаваў схему "племя – народнасць – нацыя" для розных этапаў развіцця грамадства. Упершыню ў сусветнай навуцы распрацаваў прынцыпы картаграфавання з'яў матэрыяльнай культуры ў іх гістарычным развіцці. Гродзеншчына была вызначаная этнічна

беларускай тэрыторыяй і таму аказалася ў складзе БССР. Узнагароджаны ордэнам Леніна і ордэнам Чырвонай Зоркі.

Творы: Очерк развития общественных форм (1924–29); Западная часть литовской этнографической территории (1947); Этнические территории и этнические границы (1951); Село Вирятино в прошлом и настоящем: Опыт этнографического изучения русской колхозной деревни (1958, у ЗША перавыдадзеная ў 1970).

Літ.: Гостев А.П., Известные личности Гродно. – Гродно, 2016. – С. 60–68: Мяцельскі А. Кушнер П. І. // HrodnaLife. 9.10.2019; Ермоленко В. А., Черепица В.Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 377–378.

Л

Лава гл. Магістрат.

Ладдзя – шахматная фігура сяр. XII ст., выразаная з каменя. Мініяцюра адпавядае сапраўднай ладдзі тыпу насад, якая мае два вострыя насы і можа рухацца ў любым напрамку (згадваецца ў летапісах у сувязі з барацьбой кіеўскага і ўладзіміра-суздальскага князёў). Па бартах ладдзі маюцца круглыя адтуліны для вёсел, а весляры схаваныя пад палубай-дахам. На версе бачныя былі 4 асобы, з якіх дзве не захаваліся (ад іх засталіся толькі шчыты), адзін вайсковец напаўляжыць і глядзіць наперад, другі трымае вясло. Падчас рэканструкцыі *замка Старога* ў 2019 знайшлі яшчэ адну Л. Помнік ладдзі стаіць на беразе Нёмана, каля лесвіцы, якае вядзе ад падножжа гары да замкаў.

Літ.: Павач. А. Под крылом Коложы. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 14–15.

Лаза Самуэль (?–1738) – фундатар галоўнага алтара *касцёла езуітаў Св. Францішка Ксаверыя*, сын гродзенскага гродскага суддзі. Лаза быў актыўным палітычным дзеячам: паслом на гродзенскіх *сеймiках* 1707, 1715, 1733, 1735. У 1730 удзельнічаў у надзвычайным гродзенскім сейме Рэчы Паспалітай, атрымаў пасаду кашталяна мсціслаўскага (раней быў войскім гродзенскім). Яго жонка Канстанцыя Міхаліна з Юндзілаў таксама стала фундатаркай названага алтара. Яе партрэт вісеў у касцёле, але на мяжы 19–20 ст. знік.

Літ.: Маліноўская Т. Р. Архітэктура горада Гродна (з X ст. да 1939). – Гродна: ГрДУ, 2005; Smoliński M., Kościoły w życiu politycznym Grodna w XVIII wieku: funkcje i treści w: Barok. Historia-Literatura-Sztuka. Półrocznik XVIII/1 (35). 2011. – S. 109–111.

Лазні. Самыя старажытныя, верагодна, былі ў сярэдзіне XVI ст. на каралеўскім двары ў *Гарадніцы*, а таксама прыватная ў ваколіцах горада. У *замку Старым* Л. знаходзілася злева ад брамы, на беразе *Нёмана*. Патрапіць на 2 паверх, дзе былі памяшканні Л., можна было з унутранага двара па лесвіцы і з каралеўскага палаца праз браму. Складалася з трох памяшканняў: сяней, топкі з печчу, у якую быў умураваны кацёл для вады, лазні. Апошняя мела лавы, стол і 4 вокны. Пакой для адпачынку "алебастравая зала" быў на 3 паверсе. У вайну 1654–67 Л. была закінутая, а ў 1 пал. XVIII ст. названыя паверхі былі перароблены пад жыллё. Існавалі лазні таксама пры каталіцкіх *кляштарах*: мураваная у *францішканцаў* на левым беразе Нёмана (канец XVIII ст.), *бернардзінцаў* на беразе аднайменнага

пагорка. Паводле інвентару *Гарадніцы* і Ласосны 1780 ці 1782 драўляная лазня, крытая дранкаю, знаходзілася ў *Ласосне*, дзе размярковаўся горад рамеснікаў *Куншmат/Кунстава*.

Сінагога вялікая мела *кагальную Л.* і басейн (мікву) з халоднай вадой для рытуальнага ачышчэння на беразе *Гараднічанкі,* насупраць школьнага двара. Магчыма, узнікла падчас будаўніцтва ў XVI ст., а на плане 1753, дзе відаць перабудаваную сінагогу, паказаная новая Л. Яна стала, па словах даследчыка Я. Супрона, першай грамадскай Л., дзе за аплату можна было памыцца кожнаму ахвочаму. Са спісу жыхароў Гродна пачатку XIX ст. вядомыя арандатар яўрэй Моўша Хаімавіч і працаўніца Хая Вельвеліёва. На малюнку з 1860-х Орды Н. бачна, што будынак Л. быў Г-падобны і меў некалькі аддзелаў. У 1852 *магістрат* аддаў Л. у арэнду на 10 год Д. Заянцу і З. Эпштэйну, з умовай яе рамонту. Гродзенскі краязнавец Супрон знайшоў у 2015 рэшткі міквы. Другая яўрэйская Л. XVIII ст. знаходзілася на *фарштаце занёманскім*, каля пераправы на беразе Нёмана. Яе таксама відаць на малюнку Орды. Была мураваная, але ў аварыйным стане. У 1885 яе выкупіў *Шарашэўскі Л.* і пачаў перабудову, але хутка памёр, таму скончыў яе апякун маёмасці С. Андрэс. Л. мела мужчынскую і жаночую часткі, у кожнай былі асобныя аддзяленні: распранальня, умывальня, парылка, міква, ванны. Ацяплялася паравым катлом, брудная вада сцякала ў калектар і праз пясчана-гравійны фільтр у Нёман. Існавала да *вайны Другой сусветнай*. Відаць, пра гэтую Л. гаворыць у 1928 доктар А. Перакладоўскі: “карыстаюцца толькі інтэлігентныя асобы; таму што тутэйшыя жыхары несвядомыя, зусім не мыюцца цэлымі месяцамі”. Лазня “у сэнсе гігіенічным патрабуе шмат чаго і недасканалая”, “утрымоўваецца кепска і брудна”. Л. утрымоўвалася выключна на сродкі кагалу і пасля *вайны Першай сусветнай* прыйшла ў заняпад: у 1923 кацельня была пажаранебяспечнай, столь працякала, фарба на лесвіцах аблупілася, сцены пацвілі, каналізацыя не спраўлялася са сцёкамі. Праз некалькі гадоў Л. парамантавалі, але ў 1937 здарыўся пажар. Дзякуючы таму, што страхавое таварыства аплаціла страты, удалося зноў зрабіць рамонт, і лазня працавала да 1970-х гадоў.

У XIX ст. у горадзе існавалі казённыя Л. Для вайскоўцаў на пач. XIX ст. Л. зробленая была *ў замку Новым*, дзе знаходзіўся шпіталь. Быў асобны пакой з ваннымі, 3 прылазнікі, сені, памяшканне для 2 вялікіх чыгунных катлоў. У 1832 тут пабудавалі дадатковую Л. На пач. XIX ст. пад Л. для арыштантаў прыстасавалі адзін з будынкаў калегіума езуіцкага. У ім былі тры асобныя аддзелы: дрывотня, парылка, пакой для адпачынку. Казённая была і Л. зарганізаваная ў былым доме графа Мураўскага па вул. Маставой, каля пераправы праз Нёман. Знаходзілася ў паўднёва-зах. крыле будынка ля ракі. Згодна з інвентаром 1833 мелася памяшканне з драўлянай падлогай, печкай, драўлянай паліцай з 5 прыступкамі. Казённая Л. была і за домам Юндзіла, былым *палацы кн. Масальскага* па вул. Замкавай. Пасля 1836 пачала дзейнічаць “памывачная” ў памяшканнях пансіёна пры *гімназіі губернскай*, у будынку на рагу вуліц В. Траецкай і Дамініканскай. Дзейнічала Л. пры шпіталі гарадскім. У 1937 гарадская ўлада задумала пабудаваць гарадскую Л. з крытым

плавальным басейнам над *Гараднічанкай* за *царквой Пакроўскай*, але *вайна Другая сусветная* перашкодзіла планам.

З 1860-х гг. існавалі **грамадскія Л.** Па вул. Падольнай, на беразе Нёмана меў лазню Траўгут Ромер. На беразе Гараднічанкі ў завулку Віленскім (дзе цяпер аўтастаянка за будынкам па вул. Віленскай) працавала Л. Сідорскага. Мела ў падземным паверсе мікву, на першым – мужч. адзяленне, на другім – жаночае. Аплата ў агульным адзяленні – 5–10 кап., у асобным пакоі – 75 кап. і дадаткова 30 кап., калі мыцца ў ванне. У 1890-х гаспадарыла ў гэтай лазні Міна Фрумкіна. У 1893 быў дабудаваны 3 паверх для "дваранскай лазні" з адзяленнямі для мужч. і жанч. У Л. меліся паравы кацёл, фільтры для сцёку бруднай вады. Была зліквідаваная ў 1970-х. Па вул. Маставой, каля пераправы, існавала Л. Тэафіла Камінскага. Пад яе прыстасавалі палац Пшэздзецкіх. У 1 пал. XIX ст. ёю валодаў Герман, і ў сяр. XIX ст. будынак быў у паўразбураным стане. Паміж 1861 і 1884 яго перабудавалі, дадаўшы 2 паверхі, дзе ўладкавалі Л. для мужчын, а для жанчын прыстасавалі 1 паверх з асобнымі распранальнямі, мыйнямі, парылкай, абсталявалі ванны. Працавала гэтая Л. да *вайны Першай сусветнай*. У савецкі час грамадскія лазні былі на вуліцах Віленскай (знішчаная), Цітова і Болдзіна. Апошнія дзве пасля рэканструкцыі і рамонту ператварыліся ў лазнева-аздараўленчыя комплексы. Падобныя да іх комплексы "Вішнявец", "Гродна Хімвалакно".

Былі ў горадзе і **прыватныя (сямейныя)** Л. па вул. Садовай/Ажэшкі, у двары чыноўніка А. Жаўтухіна ў драўляным доме былі 4 памяшканні: сені, пакой для печы, мыйня і адпачывальня. У канцы XIX ст. дом Жаўтухіна набыў *Нагорскі С.,* што дало Я. Супрону нагоду высунуць праўдападобную версію аб мыцці ў названай лазні знакамітай пісьменніцы *Ажэшкі Э*. У наш час ёсць шмат прыватных лазняў, лазняў-саўн у горадзе і яго ваколіцах.

Літ.: Баціс М., Буцько У.., Крапівіна Н. і інш. Гародня: сляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні // ARCHE. – 2010. – № 6. – С. 368–369; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 47; Супрон Я. З гісторыі гродзенскіх лазняў. Дзе і як парыліся гродзенцы ў мінулыя часы. // Livejournal. Supronlicvin. 8.07. 2018; Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 113; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 169; Sliż N. Horodnica grodzieńska w źródłach wizualnych i dokumentalnych (druga połowa XVIII w.) [рукапіс]; Dobroński A. Cz. Stan sanitarny Grodna w latach dwudziestych XX w. // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: зб. навук. арт. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 276–292; Sliż N. Horodnica grodzieńska w źródłach wizualnych i dokumentalnych (druga połowa XVIII w.) [рукапіс].

Ланскі Васіль Сяргеевіч (1754 – 22.06.1831) – гродзенскі *губернатар* (8.07.1803 – 6.04.1813). Паходзіць са старажытнага польскага дваранскага роду, вядомага з пачатку XVI ст. Сын памешчыка Холмскага ў. Наўгародскай губ., атрымаў хатнюю адукацыю, з пяці гадоў быў запісаны ў лейб-гвардыі Прыабражэнскі полк. У 19 год быў ужо падпалкоўнікам лейб-гвардыі

Грэнадзёрскага палка. Відаць, выхаванне і служба ў расійскім войску адбіліся на поглядах Ланскога, бо ўдзельнічаў у падаўленні *паўстання 1794*. У 1795 пакінуў вайсковую службу ў чыне генерал-маёра і атрымаў чын сапраўднага стацкага дарадцы. Да пасады гродзенскага губернатара пабываў саратаўскім і тамбоўскім губернатарам. У Гродзенскай губ. праявіў сябе як русіфікатар: увёў расійскія меры і вагі, Фарны касцёл (*Фара Вітаўта*), паводле найвышэйшага наказу ад 29.02.1804, загадаў перабудаваць у праваслаўны храм (*Сафійская царква*), арыштаваў А. Чарноцкага (Зарыяна Далэнгу-Хадакоўскага) у 1809 за жаданне служыць у войску Напалеона і абурэнне рэкруцкім наборам у расійскае войска. Напярэдадні *вайны 1812 г.* падрыхтоўваў эвакуацыю губерні, але дзейнічаў нерашуча: ніяк, напрыклад, не мог вырашыць пытанне аб вывазе казённай вайсковай аптэкі з запасам медыкаментаў на некалькі соцень тысяч рублёў і з дзесяццю тыс. наяўных грошай, а таксама багатай рызніцы Сафійскага сабора. Па пытанні аб эвакуацыі чыноўнікаў і архіваў прысутных месцаў так закідаў ваеннага губернатара А. М. Рымскага-Карсакава пытаннямі, што таму прыйшлося растлумачыць будучаму міністру ўнутраных спраў, як трэба выканаць "найвышэйшую волю". Але, відаць, і гэта не дапамагло, бо 28 чэрвеня казацкі атаман *М. І. Платаў,* пакідаючы Гродна пад націскам *Жэрома Банапарта* і польскіх частак *Юзафа Панятоўскага*, вывозіў архівы, казённую маёмасць і чыноўнікаў. Можа такія паводзіны (ціхі сабатаж) Ланскога дыктаваліся ягоным польскім паходжаннем? З заняццем расійскімі войскамі тэрыторыі Княства (Герцагства) Варшаўскага ў 1813 г. Л. стане тут прэзідэнтам Дзяржаўнай рады, а з 1815 – намеснікам Каралеўства (Царства) Польскага і сябрам Дзяржаўнай рады (да 1819). І. Яцкоўскі пісаў: "Пра губернатара Ланскога да гэтага часу засталася добрая памяць у жыхароў Гродзенскай губерні, бо ён, маючы сэрца і розум, не вярэдзіў раны (удзел жыхароў губерні ў вайне 1812 г. на баку Напалеона. – В. Ш.); калі ж пасля доўгага знаходжання на сваёй пасадзе ён быў прызначаны ў Пецярбург сенатарам, дык і там па-ранейшаму заставаўся прыхільны да ліцвінаў, як да сваіх кроўных суродзічаў".

З 25.03.1813 па 1815 – генерал-губернатар Варшаўскага княства, з 1814 да 12.05.1815 – прэзідэнт часовага Вярхоўнага савета Княства Варшаўскага. 15.06.1815 прызначаны намеснікам Каралеўства Польскага. 19.11.1815 прызначаны чальцом польскай Дзяржаўнай рады, 04.11.1819 – старшынёй Камісіі па прыняцці прашэнняў на імя цара. 22.02.1824 абраны старшынёй Камісіі па будаўніцтве Ісакіеўскага сабора. З 01.06.1826 з'яўляўся чальцом Вярхоўнага крымінальнага суда па справе дзекабрыстаў. Пры яго удзеле з канцылярыі, якая загадвала палітычнай паліцыяй, было створанае III Аддзяленне Асабістай яго імператарскай вялікасці канцылярыі. 19.04.1828 звольнены з МУС і з пасады старшыні Камісіі прашэнняў, з захаваннем сяброўства ў Дзяржаўным савеце, 24.02.1829 – са службы.

Узнагароды: атрымаў шмат вышэйшых расійскіх ордэнаў, уключна да ордэна Св. Уладзіміра 1 ст. (1815). Л. быў дзядзькам *С. М. Ланскога,* пахаванага ў Гродне.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 11, а. 612–613; Орловский Е. Ф. Гродненская губерния в 1812 году: Истор. очерк. – Гродно, 1912. – С. 52; Федорченко В. Императорский дом. Выдающиеся сановники: Энциклопедия биографий. В 2 т. – Красноярск: БОНУС; М.: ОЛМА-ПРЕСС, 2001. – Т. 1. – С. 621; J. Jackowski, Powieść z czasu mojego czyli Przygody litewskie", Warszawa 2010, s. 41, 46, 48.

Ланскі (Сухаўлянскі) Меер (04.07.1902, Гродна – 15.01.1983, Маямі) – адзін з самых уплывовых гангстараў ЗША XX ст., стваральнік "Нацыянальнага злачыннага сіндыката". Дзед Л., Беньямін Сухаўлянскі, быў рабінам у Гродне, у сталым узросце з'ехаў у Ізраіль і хутка памёр. Бацькі Меера ў 1890-х паехалі ў ЗША, але вярнуліся ў Гродна, а пасля нараджэння Меера зноў выехалі ў ЗША. У 1919–1933 Л. з крымінальнымі сябрамі актыўна парушалі "сухі закон", займаючыся бутлегерствам, і скалацілі вялікія капіталы. Л. уклаў іх у гульнявы бізнес, заснаваўшы гульнявыя дамы ў Чыкага, Кліўлендзе, Дэтройце. Разам з мафіёзі С. Лучана і Б. Сігелем стварылі гульнявы цэнтр у Лас-Вегасе (падобны да вядомага ў Монтэ-Карла). Дзясятую частку прыбытку ад казіно Л. перадаваў на карысць Ізраіля, тым самым дапамагаючы замацавацца новай дзяржаве. Для гэтага ён зарганізаваў новы марскі транспартны шлях з Нью-Ёрка ў Хайфу, па якім Ізраіль атрымоўваў зброю. У 1970 Л. схаваўся ў Ізраілі ад падаткавага пераследу, быў на прыёме ў Голды Меір. Апошнія гады жыў на ранча ў Маямі.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 85, 86; Кулевіч Р. Сваячка амерыканскага гангстэра наведала Гродна // Народная Воля. – 7.08.2018. – С. 5.

Ланскі Мікалай Сяргеевіч – генерал-маёр. Бацька *С. М. Ланскога.* Меў маёнткі Олтуш і Збураж у Брэсцкім у. Гродзенскай губ. 20.07.1812 памёр, быў пахаваны на гродзенскіх праваслаўных могілках. Магчыма, сын быў пахаваны каля ягонай магілы.

Ланскі Сяргей Мікалаевіч (1779 – 30.03.1814, Намор, Францыя). Службу пачаў з 14 год і ў 1800 г. быў ужо штабс-капітанам. У 1802–1805 служыў у Калегіі замежных спраў і быў з дыпламатычнай місіяй у Парыжы. Удзельнічаў у антыфранцузскіх кампаніях і ў 1810 атрымаў чын генерал-маёра. *Вайну 1812 г.* пачаў камандзірам Беларускага гусарскага палка, які стаяў недалёка ад Гродна. Ваяваў пад Полацкам, вызваляў Вільню, удзельнічаў у замежным паходзе 1813–1814 гг., пад Краонам у Шампані быў паранены. Сябры перавезлі яго ў Гродна, дзе 20.07.1812 быў пахаваны яго бацька (гл. *Ланскі М. С.*). На праваслаўных могілках ёсць магіла з помнікам, на мемарыяльнай дошцы якога напісана: "Здесь погребено тело генерал-лейтенанта Сергея Николаевича Ланского. С честью и славою служивший, на поле брани от полученной раны под селением Краоном февраля 23 дня к общему сожалению своих товарищей и подчиненных преставился в городе Наморе, от рождения на 35 году сего 1814 года марта 18 дня по полуночи в два часа". Л. узнагароджаны ордэнамі:

Св. Уладзіміра 2 ст., Св. Ганны 2 ст., Св. Георгія 3 і 4 ст.; залатой шпагай з надпісам “За храбрость”.

Літ.: Афанасьева Т. Из рода Ланских // Гродзенская праўда. – 1996. – 29.08. – С. 3; Швед В. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. / В. Швед, С. Данскіх. – Гродно, 2006.

Лапін Аляксандр Саламонавіч (у 1903 было 30 гадоў) – сын *Лапіна Саламона,* купца 2-й гільдыі і *Лапінай Соры Мархелеўны*, уладальніцы тыпалітаграфіі ў Калакольным завулку/Дамініканская ў доме Лапіна (дазвол ад 7.05.1892). Падчас рэвалюцыі 1905–1907 у друкарні Лапіных быў надрукаваны маніфест 17 кастрычніка 1905 г. (дапамагаў агент *Л. Саланевіч*). У 1914 разам з братам Абрамам Л. выкупіў будынак па вул. Аляксандраўскай, 46 (зараз Будзёнага, 56) і заклаў тут тыпалітаграфію. На пачатку 1922 браты атрымалі канцэсію на друкаванне ігральных карт у Гродне. Сямейства Лапіных загінула падчас нямецкай акупацыі ў гродзенскім *гета*. У 2018 сучасныя выдаўцы з дапамогай гісторыкаў і краязнаўцаў аднавілі выданне ігральных карт.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 9, с. 554, а. 263; Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 76, 79; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 73.

Лапін М., гаспадар скорапячатні.

Лапін Саламон (?–1891?) – купец 2-й гільдыі, уладальнік друкарні ў Гродне, дазвол на яе адкрыццё атрымаў ад губернскага праўлення 5.02.1881. Размяркоўвалася спачатку ў памяшканні тыпалітаграфіі Памяранскага на вул. Садовай, а затым – у асабістым доме на вул. Саборнай/Савецкай, 10 (1884). У 1885 працавала 15 чал., з’явілася паравая машына. Існавала друкарня і ў 1904 г. Будынак пабудаваны ў 1795, а ў 1873 прыбудаваны двухпавярховы флігель. Пасля перабудовы ў 1970-х у будынку размеркаваўся *камітэт выканаўчы гарадскога Савета*.

Крын. і літ.: НГАБ, ф. 2, воп. 13, с. 419; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 76.

Лапіцкі Уладзімір (15.02.1959, Гродна) – гродзенскі алімпіец, фехтавальшчык (рапіра). Срэбны прызёр XXII алімпійскіх гульняў у камандных спаборніцтвах у складзе зборнай СССР (1980), чэмпіён свету ў складзе зборнай СССР (1979), бронзавы прызёр чэмпіянату свету (1978) і чэмпіён свету сярод юніёраў (1978), пераможац VII Спартакіяды народаў СССР у складзе зборнай БССР (1979).

Літ.: Попко И.Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 99–102.

Ларыёнаў Аляксандр Мікалаевіч (3.9.1949, Баранавічы – 17.08.2013, Гродна) – беларускі самабытны мастак, паэт, гісторык культуры. Пасля

заканчэння *Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта* імя Я. Купалы ў 1972 працаваў настаўнікам у санаторным лагеры "Нёман". У 1993–2009 выкладаў на кафедры вытворчага мастацтва ГрДУ. Персанальныя выставы ў Гродне (1984), Друскінінкаі (1984, 1991, 1992), Шаўляі (1985), Маскве, Зеленаградзе, Пушчына, Дубне (1985–90), Беластоку (1989, 1991), Нью-Ёрку (1991–1992), Познані (1992). Творчасць Л. адзначаецца глыбокім лірыка-філасофскім асэнсаваннем прыроды і чалавека. Аўтар цыклаў: "Принеманье", "Цветов божественные лица", "Куршская сюита", "Календарь", "Черные доски"; скульптурных і графічных партрэтаў гістарычных і культурных дзеячаў, літаратурных герояў; ілюстрацый да "Слова аб палку Ігаравым", лірыкі Мацуа Басё і Арсенія Таркоўскага, "Погорельщины" М. Клюева, да зборніка М. Багдановіча "Вянок" (перададзены ў дар музею М. Багдановіча ў Гродне). Л. стаў стваральнікам творчага аб'яднання "Руно", фонда сучаснага вольнага мастацтва, галерэй "Тызенгаўз" і "UNIVERSUM" (апошняя ў ГрДУ).

Ларычава Ірына Мікалаеўна (22.07.1963, Навасібірск) – плыўчыха. Вучылася ў Гродзенскім і Гомельскім універсітэтах (скончыла ў 1992). На ўніверсіядзе 1983 (Эдмантан, Канада) заваявала пяць залатых медалёў: заплыў на 100 м (першы залаты медаль у камандзе СССР), 200 м (2 хв. 02.17 сек. – рэкорд універсіяды), 400 м (4 хвіліны 13.41 сек. – рэкорд універсіяды і СССР), 800 м і ў камандным заплыве – эстафеце 4х100 м. Жыве ў Гродне і працуе трэнерам. Спартыўную кар'еру завершыла ў 1984.

Ласосна – былое самастойнае пасяленне, а цяпер раён Гродна. Першы ўспамін адносіцца да 1496 г., калі вялікі князь літоўскі *Аляксандр* здаў мясцовасць у арэнду баярыну Рыгору. Назва паходзіць ад назвы ракі *Ласосна/Ласасянка*. З 1396 згадваюцца "ласасянскія" *татары*, а з 1539 – іх мячэць. Вёска Л. называецца ў попісе войска ВКЛ 1565 г. У 1568 адносілася да каралеўскага фальварка Ласосна-Каралін. Пазней частка вёскі належала шляхецкаму роду Дарашкевічаў, затым Янутам-Сапоцькам. У 60–70-х гг. XVIII ст. належала *старасце* гарадзенскаму *Тызенгаўзу А.*, які пабудаваў тут адзінаццаць *мануфактур каралеўскіх*. У гэты час ажыццяўляўся праект пабудовы ў Л. горада майстроў *Кунстава*. М. дэ Пуле піша, што *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі*, калі жыў у Гродне пад наглядам расіян у 1795–1797, любіў прыязджаць сюды падчас сваіх прагулак.

Літ.: Де Пуле. М. Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794–1797 годах. Изд. 2-е. – СпБ., 1871. – С. 97, 182; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 10 с.; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 340; Trusow I. Działalność Antoniego Tyzenhauza w Lososnej // Rocznik Grodzieński. – 2008. – № 2. – S. 77–82.

Ласосна/Ласасянка – левы прыток *Нёмана*, пачынаецца ў Польшчы. На канец 1980-х: працягласць 46 км, вадазбор 468 км/2 у межах Гарадзенскага ўзвышша. Л. мае 2 прытокі: справа Каменка, злева Татарка. Назва Л. верагодна паходзіць

ад рыбы ласось, якая водзіцца ў ёй дагэтуль. На берагах знаходзілася некалькі населенных пунктаў з назвай Ласосна: Алінская, Кульбакаўшчына, Тарусаўка, дзе жылі мясцовыя *татары*.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 255

Латышаў Васіль Васільевіч (1855, Цвярская губерня – 1921) – расійскі гісторык. Скончыў гродзенскую гімназію (1865–1872, срэбны медаль) і паступіў у Пецярбургскі гісторыка-філалагічны інстытут (аддзялянне старажытных моў, 1872–1876). Выкладчык старажытных моў у Віленскай гімназіі (12.06.1876 – 1880), затым – у Пецярбургскім гісторыка-філалагічным інстытуце (1883). Прыват-дацэнт інстытута (1884), член-карэспандэнт Пецярбургскай (1890) і Берлінскай (1891) АН. Ардынарны акадэмік АН і віцэ-дырэктар дэпартамента народнай асветы (1893). Дырэктар дэпартамента (1896). Член Савета Міністра народнай асветы (1898). Дырэктар Пецярбургскага гісторыка-філалагічнага інстытута (1903). З'яўляўся членам многіх вучоных таварыстваў. Як гісторык праславіўся вывучэннем Паўночнага Прычарнамор'я.

Літ.: Историки Гродненщины / Сост. А.Н. Нечухрин. – Гродно, 1989, с. 4–5.

Лаўрыновіч Антоні Тамаш Юзэфавіч (20.12.1750 – пасля 1796) – доктар філасофіі, байкапісец. Пасля ліквідацыі езуіцкага ордэна пераехаў з Вільні ў Мінск, дзе да 1776 г. выкладаў у Ваяводскай школе (тыпу гімназіі). У Гродне выдаў "Палова капы Казак" (1789); "Пахавальная прамова, выказаная ксяндзом … у Сейнах у 1793 пры пахаванні Розы з Плятараў Стрытынскай" (1793). У сваіх творах абапіраўся на прынцыпы класіцызму, традыцыі Эзопа і І. Красіцкага.

Літ.: Памяць. Мінск. – Мінск. Кн. 1, с. 474; Nowy Korbut, t. 5. – Warszawa, Kraków, Wrocław, 1967, s. 271.

Лаўрэнцьеў Мікалай (1865, Рагачоў – ?) – палкоўнік, камандзір *Палка Першага беларускага пяхотнага*. У 1882 скончыў Магілёўскае рэальнае вучылішча, у 1886 – Кіеўскае вайсковае вучылішча. У 1901 быў капітанам і прыняў удзел у расійска-японскай вайне 1904–1905 гг. У 1907 пераведзены ў рэзерв у чыне падпалкоўніка. Ваяваў у *вайне Першай сусветнай*, быў кантужаны і трапіў у нямецкі палон. У Вільні апынуўся ў 1918, стаў першым камандзірам беларускага палка, а з сакавіка 1919 – інструктарам Міністэрства аховы краю, старшынёй Камісіі па перайманні нямецкай вайсковай маёмасці. 3.04.1926 выйшаў у адстаўку.

Літ.: Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich= Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7. – S. 195; Surgailis G. Lietuvos Kariuoenes. Gudu Kariniai Daliniai 1918–1923 m. – Vilnius, 2020. – S. 241–242.

Лашкевіч Казімір (4.8.1888, Верцялішкі – 14.12.1978) – настаўнік, віцэ-прэзідэнт Гродна (1928, 1930–1932). Скончыў гродзенскую *гімназію,* духоўную

семінарыю, аддзяленне філасофіі і кананічнага права Пецярбургскай духоўнай акадэміі, вывучаў палітычныя навукі ў Парыжы. Служыў у расійскай арміі (1918–1919), а потым уступіў у польскую (1920). Дэмабілізаваўся і працаваў настаўнікам у гродзенскай гімназіі, быў з 1922 рэдактарам *газеты* "Echo Grodzieńskie" ("Гродзенскае рэха"). Пасол на сейм па спісе Польскай народнай партыі (Polskie Stronnictwo Ludowe, 1922–1927). Сябра Саюза сялян (з 1923), павятовага камітэта фізічнага выхавання і праўлення польскага краязнаўчага таварыства (1927). Сябра Партыі працы і гродзенскай гарадской рады (1927–1930, 1930–1934). Ініцыятар заснавання ў Гродне іпатэчнага кааператыўнага банка (1933). У Гродне жыў па вул. Паліцэйскай/Лістоўскага, 5 (1922). У 1933–1939 дарадчык фонда працы Беластоцкага ваяводскага кіраўніцтва. Падчас *вайны Другой сусветнай* быў акруговым дэлегатам прадстаўніцтва ўрада РП у Беластоку, а пасля вайны – кіраўніком аддзела ў Міністэрстве працы і публічнай апекі.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 149–150; L. Sawoniewski, Saga o Grodnie. – Łódź, Białystok, 1999, s. 18; Posłowie i senatorowie Reczypospolitej Polskiej 1919–1939. T. III. – Warszawa, 2005, s. 388.

Лебедзеў Іван Данілавіч (9.08.1916, с. Данілаўка Валгаградскай вобл. – ?) – герой Савецкага Саюза (20.12.1943). У Савецкай арміі ў 1937–39 і з чэрвеня 1941. Пасля заканчэння курсаў малодшых палітрукоў з верасня 1941 быў на фронце. Званне гвардыі капітан Л. атрымаў за фарсіраванне Дняпра ў раёне с. Перавалачна (цяпер с. Светлагорскае, Кабелякскі р-н Палтаўскай вобл.): 1.10.1943 захапіў плацдарм, а 14.10 камандаваў батарэяй і адбіў атакі нямецка-фашысцкай пяхоты і танкаў, ліквідаваў 3 танкі і да ўзвода аўтаматчыкаў. У 1950 скончыў Вайсковую акадэмію імя М. Фрунзэ, працаваў гродзенскім абласным ваенным камісарам. З 1966 палкоўнік Л. быў у запасе, да 1979 працаваў у *Гродзенскім дзяржуніверсітэце*. Узнагароджаны ордэнамі: Леніна, двума Айчыннай вайны 1 ст., Айчыннай вайны 2 ст., Чырвонай Зоркі, а таксама медалямі.

Літ.: Книга Героев Гродненской области / Сост. Ю.М. Алексеев, О.М. Якубович. – Гродно: ГОУПП "Гродн. Тип.", 2004. – С. 43.

Лебель Віктар Леў Севярын – удзельнік паўстанцкага руху. Паходзіў з дваран. У штат Гродзенскага губернскага праўлення ўключаны 22.11.1857 па заканчэнні Гродзенскай *гімназіі.* 10.08.1861 затрыманы ў *Фарным касцёле* за спяванне "возмутительного" польскага гімна. З рапарта гродзенскага губернатара Віленскаму генерал-губернатару: "Лебель неисправимый человек и своим дерзким и решительным характером может иметь вредное влияние на других. Я тотчас же сделал распоряжение об исключении его со службы и приказал арестовать". Вызвалены распараджэннем Віленскага генерал-губернатара Назімава 31.08.1861 г.

Літ.: Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017.

Лебрэн Ан Шарль (28.12.1775 – 21.01.1859) – французскі генерал, граф, гродзенскі *губернатар*. Сын архіскарбніка імперыі Шарля Францыа Лебрэна, з 1808 г. герцага дэ П'ячэнца. Сваё жыццё ён звязаў з вайсковай службай, калі 26.12.1799 стаў суб-лейтэнантам 5-га драгунскага палка. Удзельнічаў у Італьянскай кампаніі 1800 г. – быў у свіце Напалеона і адзначыўся ў бітве пры Марэнга. З мая 1801 знаходзіўся ў Генеральным штабе Консульскай гвардыі. У кампаніі 1804–1805 быў пры штабе маршала М. Нэя, а са снежня 1805 – у Стаўцы імператара (меў у гэты час чын палкоўніка). Ваяваў у бітвах пры Аўстэрліцы, Ене, Эйлаў, Фрыдландзе. 1 сакавіка 1807 атрымаў чын брыгаднага генерала. У лістападзе 1808 суправаджаў Напалеона ў Іспанію, а ў маі 1809 – у Германію. Біўся пры Ваграме. Са жніўня 1811 г. знаходзіўся ў Страсбургу, дзе меў заданне вышукваць дэзерціраў і рыхтаваць вайсковае папаўненне. Думаем, што гэты вопыт яму моцна спатрэбіўся на пасадзе гродзенскага губернатара. Падчас *вайны 1812 г.* Лебрэн быў пры Напалеоне. Загадам ад 21 (па іншых звестках 27) ліпеня быў прызначаны губернатарам у гродзенскі дэпартамент. Да якога часу ён заставаўся на пасадзе дакладна невядома, але паводле "Исторической записки о событиях в Гродненской губ. в 1812 г., составленной в 1836–1837 гг. Гродненским Гражданским Губернатаром" 3 лістапада Л. яшчэ быў у Гродне. Зразумела, што галоўным у яго дзейнасці было забеспячэнне напалеонаўскай арміі ўсім неабходным – харчам, фуражом, вопраткай.

Пасля выгнання напалеонаўскай арміі з Гродзенскага дэпартамента Лебрэн у 1813 г. быў прызначаны генерал-палкоўнікам гусар, пазней іншых вайсковых частак, а з 7.12.1813 – губернатарам Анвера. На гэты раз, відаць, дапамагаў гродзенскі вопыт губернатарства. Пасля адрачэння Напалеона прызнаў Бурбонаў і быў прызначаны імі надзвычайным камісарам караля ў 14-й вайсковай акрузе. Потым стаў генерал-інспектарам гусар, але, калі Напалеон у 1815 вярнуўся ў Францыю падчас знакамітых "ста дзён", Лебрэн стаў на баку імператара. Пагром Напалеона пакінуў яго без працы аж да 30.12.1818, калі яго залічылі ў склад Генеральнага штаба. Ва ўзросце 76 гадоў Лебрэна прызначылі сенатарам, а на наступны 1853 г. – Вялікім канцлерам Ганаровага Легіёну.

Крын. і літ.: ф.1, воп.19, спр.1141, а.123 адв.; Швед В. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. / В. Швед, С. Данскіх. – Гродно, 2006, с. 105.

Левандоўскі/Левандовіч Генрык – сын уладальніка кнігарні, якая знаходзілася каля паезуіцкага *(Фарнага) касцёла,* на рагу сённяшніх пл. Савецкай і вул. К. Маркса. Жыў у асабістым доме па вул. Саборнай/Савецкай, 15, пабудаваным паміж 1875–85 (побач быў гатэль Л.). З шостага класа *гімназіі гродзенскай* (з 1918) пачаў збіраць кнігі, даваў ахвочым чытаць іх. Ёсць экслібрыс ягонай бібліятэкі, які захоўваецца ў Нацыянальным Музеі (Варшава, MN, Gr. Pol. 7319). Як выглядала кнігарня, можна ўбачыць на некаторых гродзенскіх паштоўках. Пахаваны на *могілках каталіцкіх,* у сектары С 009.

Літ.: Верас З. Старое Гродна // Краю мой – Нёман. – Мінск, 1986. – С. 188–194; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 76–77.

Ле Ду (Le Doux) **Франсуа/Францішак Габрыэль** (каля 1755, Парыж – 2.02.1823, Варшава) – танцоўшчык, педагог і "балетмайстар Яго Каралеўскай Высокасці". Вучань знакамітага балетмайстра Гаэтана Апаліна Вестрыса. У ВКЛ перахаў з Парыжа ў канцы 1770-х і стварыў, паводле дамовы з *Тызенгаўзам, школу балетную* (у Гродне, а з 1781 па 1785 – у Паставах), выступаў з трупай у Гродне. Пасля адстаўкі А. Тызенгаўза, паводле распараджэння кароля *Станіслава Аўгуста Панятоўскага,* сфармаваў і ўзначаліў у Варшаве балетную трупу "Таварыства танцоўшчыкаў Яго Каралеўскай Вялікасці", у якой быў балетмайстрам (дэбют балетам Ле Ду "Хілас і Сільвія" 24.09.1785). Трупа працавала да 1794 (пастаноўкі Ле Ду ў 1785 – камедыя "Патрапіў франт на франта" і балет "Лунатык"; 1786 – аперэтка "Анэтка і Лубін", "Званок"; у 1786–88 – балет "Мірза і Ліндар"; у 1787 – "Падкопы кахання", "Ніна ці Шалёная з любові"; у 1788 – "Дзень вяскоўцаў", "Ванда, польская каралева") і інш. Аснову трупы склалі акцёры *балета Тызенгаўза* А., у тым ліку вучні Ле Ду: *М. Рымінскі, Г. Валінскі*, *Д. Сітанская*, *М. Малінская*. Балет, створаны Ле Ду ў Варшаве на аснове гродзенскага балета, стаў адным з найлепшых у Еўропе. У канцы 1802 Ле Ду стварыў у Варшаве новую балетную школу (каля 30 дзяцей). Пахаваны на могілках Павонзкі ў Варшаве.

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. – Lwów. T. I, c. 280–291, 392, 405–407, 425; T. II, 1925. – S. 324, 327, 334, 338, 339; Szenic S. Cmentarz Powązkowski. 1790–1850. Zmarli i ich rodziny. – Warszawa: PIW, 1979, s. 158–160.

Лекшыцкі Францішак (1600 – 1667 ці 1668, Гродна) – манах-бернардзінец, жывапісец. Майстар алтарных абразоў. Яго працы знаходзяцца ў касцёлах польскіх гарадоў. У Гродне вядомы напісаны ім партрэт у *кляштары Брыгіцкім.*

Ленін Уладзімір Ілліч (22.04.1870, Сімбірск – 21.01.1924, Масква) – рэвалюцыянер-марксіст, заснавальнік Расійскай Камуністычнай партыі. У працах Л. згадваецца Гродна і Гродзенская губ. У кнізе "Развіццё капіталізму ў Расіі" Л. адносіць Гродзенскую губ. да ліку тых, у якіх пануе капіталістычная сістэма вядзення памешчыцкай гаспадаркі. Гродна згадваецца ў запісцы Леніна нам. старшыні Рэвалюцыйнага вайсковага савета рэспублікі Э. М. Склянскаму ад 12 ці 13.07.1920 (ПСС, Т. 51, с. 238, дак. 423), у тэлефонаграме І. В. Сталіну ў гэты ж дзень (тамсама, прым. 270 на с. 439), у заданні Л. Б. Каменеву не пазней 5.08.1920 (тамсама, прым. 282 на с. 47), у прамове на нарадзе старшынь павятовых, валасных і вясковых выканаўчых камітэтаў Маскоўскай губ. 15.10.1920 (ПСС, Т. 41, с. 349) – ва ўсіх гэтых дакументах гаворыцца пра "лінію Керзана", па якой англійскі ўрад прапаноўваў правесці польска-савецкую мяжу: Гродна – Ялаўка – Нямірaў – Брэст-Літоўск. У дзяржаўным *архіве Гродзенскай вобласці* ў справе дэфензівы захоўваецца буклет з 8 старонак

“Кароткая біяграфія У. Леніна” (М., друкарня Сыціна, 1918; Выдавец – Усерасійскі цэнтральны выканаўчы камітэт Савета працоўных, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў; аўтар невядомы). Гэта адна з першых прыжыццёвых біяграфій Л. была знойдзеная ў кватэры настаўніка з в. Баркавіна В. С. Станкевіча. Складаецца з 9 глаў, у якіх раскрываюцца: паходжанне, вучоба, рэвалюцыйная дзейнасць, жыццё ў эміграцыі, погляды Леніна. У Гродне імем Л. названы адміністратыўны раён (7.04.1978), плошча (1939), вуліца (1939). На плошчы яго імя стаіць *помнік Л.* (1987, скульпт. *З. Азгур*).

Лермантаў Міхаіл Юр’евіч (15.10.1814, Масква – 27.07.1841, Пяцігорск) – расійскі паэт і празаік. За верш “На смерть поэта” (1837) сасланы на Каўказ. Прапаршчык Ніжагародскага драгунскага палка. Затым загадам ад 11.10.1837 (ст. ст.) пераведзены ў лейб-гвардыі *Гродзенскі гусарскі полк*, куды выехаў на пач. 1838 і прыехаў 26.02 (ст. ст.) у Наўгародскае пасяленне ў Селішчанскія казармы. Вядомы аўтапартрэт Л. у форме *Гродзенскага гусарскага палка*. Загадам ад 9.04.1838 (ст.ст.) пераведзены ў лейб-гвардыі Гусарскі полк. Падчас службы задумаў “Мцыри” (1837), стварыў асноўную рэдакцыю “Демона” (1838), працаваў над “Героем нашего времени”. Там жа маляваў (мажліва да 12 карцін, але пэўна вядомыя дзве: “Черкес” і “Воспоминание о Кавказе”). У Гродне ёсць вуліца яго імя.

Літ.: А. Бегунова. “Повседневная жизнь русского гусара в царствование Александра I”, М., 2000.

Лешэрн Карл Карлавіч – гродзенскі *губернатар* з 14.02.1813 па 22.01.1816. Да 1813 – віцебскі губернатар, сапраўдны стацкі дарадца. Указам *Аляксандра I* ад 14.02.1813 і сенацкім ад 10.03.1813 прызначаны гродзенскім губернатарам. Займаўся аднаўленнем губерні пасля *вайны 1812 г.*, забеспячэннем расійскай арміі харчаваннем. Прымаў удзел у канфіскацыі маёнткаў асоб, які ваявалі на баку Францыі. Ажыццяўляў кантроль над умовамі ўтрымання ваеннапалонных. Пералічаныя заняткі, відаць, дазвалялі губернатару залазіць ў кішэню дзяржавы і прыватных асоб, бо спецыяльная камісія выявіла, што ў 1809–1815 толькі з земскіх збораў было скрадзена Лешэрнам каля 112,5 тыс. руб. срэбрам. У 1828 Сенат вызначыў Л. вярнуць у бюджэт каля 11 тыс. руб. Царскім указам ад 22.01.1816 Лешэрн быў пераведзены ў герольдыю Сената.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф.1, воп. 1, с. 332, а. 1–1 адв.; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно, 2007. – 168 с.; Радзюк А. Гродзенскія губернатары-злачынцы // Гарадзенскі гадавік. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2020. – С. 47.

Леў Данілавіч (хрысціянскае імя Ануфры) – сын караля Галіцка-Валынскага Данілы Раманавіча, князь Перамышля/Пшэмысля (каля 1240 – каля 1301), князь белзскі (1245–69), князь холмскі і галіцкі (1264 – каля 1301), князь галіцка-валынскі (1293–1301). Удзельнічаў у сярэдзіне 1250-х у паходзе татар на Літву. Пасля падпісання міру ажаніўся з дачкою *Міндоўга* (1255). У красавіку

1267 забіў вял. кн. літ. Вайшэлка, і на прастол сеў яго малодшы брат Шварн Данілавіч (быў чацвёртым в. к. л. да 1269). Спрабаваў у 1277 захапіць *Горадзен* (князі Галіцка-Валынскага княства лічылі сябе спадчыннікамі зямель Кіеўскай Русі). У сувязі з нападам на Горадзен згадвалася *вежа замкавая*.

Літ.: Википедия, Лев Данилович. Доступ 29.12.2020; Войтович Л. Лев Данилович: Спроба відтворення справжнього портрету "безчесного князя"// Średniowiecze Polskie i Powszechne. – 2012. – № 4(8). – С 58–94.

Лінкоўцы Барбара і Адольф – акцёры трупы Хелхоўскага, якія прынялі падчас свайго выступлення ў Гродне прапанову кіраваць гродзенскай трупай. Ад снежня 1859 да сакавіка 1860 яны разам кіравалі *тэатрам*, а, пасля выезда Адольфа ў Варшаву, Барбара да студзеня 1861 спраўлялася сама. На тыдзень тэатр даваў у горадзе 2 спектаклі, а ў іншыя дні трупа выступала ў розных населеных пунктах – Друскеніках, Кобрыне, Брэсце, Сувалках.

Літ.: Renikowa W., Tradycje teatralne Grodna // Wilno i kresy Północno-Wschodnie. T. II. Kultura i trwanie, Białystok 1906, s. 142.

Ліпінская Гражына (12.04.1902 – 30.11.1995, Варшава) – адзін з арганізатараў цывільнай абароны Гродна ў верасні 1939 г. Адукацыю атрымала ў жаночай гімназіі Львова, дзе ўступіла ў польскую вайсковую арганізацыю і прымала ўдзел у абароне Львова ў якасці санітаркі. У 1920 удзельнічала ў абароне Варшавы, а затым служыла санітаркай у шпіталі пад Кракавам. Далей вучылася на хімічным факультэце Ягелонскага ўніверсіэта, удзельнічала ў Сілезкім паўстанні. Заканчвала сваю хімічную адукацыю ў Варшаўскім палітэхнічным універсітэце. З 1935 была дырэктарам прафесійнага вучылішча ў Гродне. З пачаткам *вайны Другой сусветнай* прызначаная камендантам Грамадскай абароны (Pogotowia Społecznego). Пасля ўсталявання савецкай улады ў горадзе была першы раз на кароткі тэрмін арыштаваная (11.1939). Хутка паводле даносу зноў арыштаваная, на гэты раз атрымала 10 гадоў у лагеры і 15 на пасяленні. Ад гэтага прыгавора яе выратоўвае пачатак *вайны Вялікай Айчыннай*. Падчас эвакуацыі турмы з Мінску ўглыб СССР Л. удалося збегчы і дабрацца да Варшавы, дзе яна ўступіла ў Саюз узброеннай барацьбы. Пазней Л. стала служыць у Арміі Краёвай (даслужылася да падпалкоўніка). Са студзеня 1942 знаходзілася на Гродзеншчыне і кіравала ўсходнім аддзелам выведкі *Арміі краёвай.* У 1944 была арыштаваная НКУС і абвінавачаная ў прыналежнасці да АК ды шпіёнстве на карысць Вялікабрытаніі. Пасля вызвалення з лагера ў Варкуце ў 1956 вярнулася ў Варшаву і працавала да пенсіі ў Галоўнай бібліятэцы Варшаўскага тэхналагічнага ўніверсітэта.

Аўтарка успамінаў "Jeśli zapomnę o nich…" (Wydawnictwo Editions Spotkania, 1990). У Archiwum Ośrodka KARTA. Lata 1944–1956 захаваўся запіс аповеду Л. пра дзейнасць у выведцы АК на Гродзеншчыне і Беларусі, арышт і знаходжанне ў віленскай і мінскай турмах, вываз у лагеры, рэпатрыяцыю. Л. мае наступныя ўзнагароды: Рыцарскі крыж ордэна Virtuti Militari; Камандорскі крыж з зоркай ордэна Адраджэння Польшчы; Рыцарскі крыж ордэна

Адраджэння Польшчы; Партызанскі крыж, Крыж Мужных, Крыж Арміі Краёвай, Медаль у гонар 10-годдзя атрымання незалежнасці.

Літ.: Szawłowski R. Wojna polsko-sowiecka 1939 r. T. 2. – Londyn, 1986, s. 450; https://ru.wikipedia.org/wiki/Липинская,_Гражина. Доступ 19.01.2021; https://www.biblionetka.pl/art.aspx?id=80179 Доступ 19.01.2021.

Ліпшыц Гедаля бэн Саламон (1517, ? Гродна – ?) – літаратуразнаўца. Вядомая яго праца "Ec Szathul", надрукаваная ў 1618 у Венецыі. Гэта былі каментары да працы Албы "Ikkarim" ("Дагматы веры"). Аб жыцці і творах Л. вядома мала. Доўгі час жыў у Любліне.

Літ.: Bersohn M. Słownik biograficzny uczonych żydów polskich XV, XVII, XVIII wieku. – Warszawa, 1906.

Лістоўскі Эдвард Эдвардавіч (1861, Масква – 11.05.1922, Гродна) – патомны дваранін. Скончыў рэальную школу ў Гродне, Мікалаеўскае інжынернае вучылішча ў Пецярбургу (1878), юнкер расійскай арміі. У 1892 – штабс-капітан, у 1895 – капітан. У 1897 быў камандзірам роты 4-га сапёрнага батальёна ў Гродне, жыў на Паліцэйскай/Кірава вуліцы, быў жанаты і меў трох сыноў. У 1899 збудаваў сабе дом на Якаўлеўскім праспекце (суч. вул. 1 мая). На першым пасяджэнні Гарадской Рады выбраны прэзідэнтам (23 за, 10 стрымаліся) з зарплатаю 2 тыс. марак. У 1903 г. быў першым палякам на гэтай пасадзе, стараўся шмат зрабіць для горада. У 1908 дэмабілізаваны ў чыне палкоўніка. У 1907–1915 быў галавой гарадской думы Гродна. Дзякуючы яму было папраўленае становішча камунальнай гаспадаркі, адбывалася добраўпарадкаванне тратуараў, дарог, зроблены прыгожы сквер, пабудаваны сучасны забойны цэх, пачалася электрыфікацыя Гродна. У 1909 быў сябрам праўлення таварыства карыстальнікаў хлебапякарань і булачнай пад назваю "Меркуры" у Гродне. З 1912 – ганаровы суддзя гродзенскай акругі, як гарадзенскі галава ездзіў на святкаванне юбілею *вайны 1812 г.* у Маскву і Барадзіно (пасведчанне № 14399 выдадзенае 8.08.1912). У 1913 ездзіў на святкаванне 300-годдзя Дома Раманавых і быў узнагароджаны юбілейным медалём. Быў сябрам P.O.W. (Польскай вайсковай арганізацыі ў 1918–19 гг.; гл. *Армія Краёва*) у Гродне. 24.08.1919 выбраны ў Народную Раду па хрысціянска-народным спісе. У перыяд з 05.03.1919 па 12.05.1922 – старшыня рады Гродна (прэзідэнт). Уладальнік нерухомай маёмасці (два ўчасткі з мураванай забудовай на вул. Паліцэйскай і праспекце Якава). Жыў у доме па вул. 1 Мая, 14 (нядаўна яго адрэстаўравалі). У лютым 1922 здароўе Л. пагоршылася, паралізавала правую нагу. 15 мая адбылося пахаванне. Пахаваны на гродзенскіх *Фарных могілках*, сектар Д, магіла № 10.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродна, ф. 1, воп. 18, с. 1860, а. 17; (ф. 366, воп. 1, спр. 130, л. 197); Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 67–68; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг.

/А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 155; Nowe życie – 1919 – 16. 03 – № 13 – s. 103; 17.08. – № 35, s. 269; A. Dobroński. Szkice do dziejów inteligencji grodzieńskiej // Wokół "Nad Niemnem". – Białystok: W-wo Uniw. w Białymstoku, 2001. – s. 188–189; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 55; J. Rozmus, J. Gordziejew. Cementarz Farny w Grodnie. 1792–1939, Kraków, 1999, s. 103; L. Sawoniewski, Saga o Grodnie. Łódź, Białystok, 1999, s. 11.

Літвіновіч Аляксандр (27.02.1879, Пецярбург – 14.01.1948, Шчэцін) – брыгадны генерал (1924), камандуючы Упраўлення акругі III корпуса ў Гродне (1927–1935). Удзельнічаў у працы гродзенскай арганізацыі Саюза стральцоў, быў старшынёй адмысловай камісіі па каардынацыі прац па добраўпарадкаванні *Замкавай гары* (1929). Пад патранатам сям'і Літвіновічаў адбываліся спаборніцтвы па конных скачках праз перашкоды. Л. быў старшынёй праўлення вяслярнага клуба "Гродна" і займаўся тэнісам – у 1934 стаў срэбным прызёрам чэмпіянату Гродна. Рада горада надала Л. званне *ганаровага грамадзяніна* Гродна і перайменавала вул. Агародную ў яго гонар. У 1938 ён прыязджаў у Гродна на адкрыццё выставы ў замку *Стэфана Баторыя*.

Літ.: Саяпин В. Гродненский спорт: история и достижения. 1919–1939 годы. Гродна: ЮрСаПринт, 2015. – С. 185; Чарнякевіч А. Памяць пра Гродна. Матэрыялы для біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. Гродна: ЮрСаПрынт, 2015. – С. 155–156.

Літоўскі ручай, цячэ праз гарадскі раён Пярэселка і ўпадае ў Нёман.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С.253–254.

Літоўскі трыбунал – вышэйшы апеляцыйны суд у ВКЛ. Створаны ў 1581 г., складаўся з дэпутатаў, якіх выбіралі на павятовых *сеймiках* (па 2 чал. ад павета). Разглядаў справы па апеляцыях на рашэнні земскіх і гродскіх судоў. Пастановы Л. Т. прымаліся на аснове *статута ВКЛ*. Пасяджэнні трыбунала адбываліся два разы на год у Вільні, Навагрудку, Мінску. Пасля *другога падзелу Рэчы Паспалітай* у 1793 было створанае Гродзенскае ваяводства і паседжанні Л. Т. былі пераведзеныя ў Гродна.

Ясинский М. Н. Главный Литовский трибунал, его происхождение, организация и компетенция. — Киев, 1901.

Ліўні Эйтан (? Гродна) – дэпутат Кнэсэту 8–10 скліканняў, у 1925 г. пераехаў разам з жонкай Сарай Розэнберг з Гродна ў Ізраіль. Там у іх нарадзілася дачка Цыпора/Цыпі Малка (5.07.1958), 19 міністр замежных спраў Ізраіля (18.01.2006 – 31.03.2009) , з 2008 – лідар партыі "Кадзіма".

Ліхтэн Хаген – камендант Брандэнбурга, комтур, узначальваў крыжакоў падчас нападу на Гродна ў 1305 г. Замак выстаяў, а ваколіцы былі разбураныя.

Лукашык Канстанцін Леанідавіч (18.09.1975, Гродна) – алімпійскі чэмпіён па стральбе з малакалібернага пісталета на 50 м (Барселона, 1992), майстар спорту СССР (1992). Скончыў СШ 18 і гродзенскае электратэхнічнае прафесійнае вучылішча. Чэмпіён свету сярод юніёраў (Нарвегія, Ставангер, 1991) і чэмпіён Еўропы (Італія, Балоння, 1991). У 1996 на чэмпіянаце Еўропы і ў 1998 на чэмпіянаце свету быў бронзавым прызёрам у стральбе з пнеўматычнага пісталета на дыстанцыі 10 м.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 88; Попко И.Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 36–37, 85–89; https://pl.wikipedia.org/wiki/Kanstancin_%C5%81ukaszyk. Доступ 26.01.2021.

Лышчынскі Казімір (4.03.1634, маёнтак Лышчыцы, цяпер Брэсцкага раёна – 30.03.1689) – беларускі філосаф, мысліцель-атэіст. Дзяцінства правёў у вёсцы Лышчыца 20 км ад Брэста, фамільны фальварак Лышчынскіх ў 12 км ад Беластока – в. Маркаўшчына – былы фальварак К. Лышчынскага. Працаваў памочнікам рэктара калегіума езуітаў у Брэсце, пасля разрыву с езуітамі – падсудак брэсцкі, дэпутат сейма Рэчы Паспалітай. Філасофскія погляды Лышчынскага адлюстраваныя ў трактаце "Аб неіснаванні Бога". У 1687 г. па даносе Я. Бжоскі Лышчынскі быў арыштаваны і перададзены Духоўнаму суду ВКЛ, які прыгаварыў яго да спалення. Літоўскі трыбунал адхіліў прыгавор, справа Лышчынскага слухалася ў 1688 на *сейме ў Гродне*, і ў 1689 у Варшаве ён быў прызнаны вінаватым у бязбожжы і прыгавораны да смяротнага пакарання, якое было здзейсненае на старым рынку ў Варшаве 30.05.1689. У Гродзенскім музеі гісторыі рэлігіі маюцца копіі даносу, дакументаў суда над Лышчынскім, скульптура Лышчынскага (аўтар *У. Церабун*).

Літ. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии: Избранные произведения XVI – нач. XIX в. Мн., 1962. С. 285–286. Памятники философской мысли Белоруссии XVII – первой половины XVIII в. Мн., 1991. С. 186–188.

Любамірскі Тэадор Юзаф Канстанты Станіслававіч (1683–1745) – маршалак сеймаў у Гродне. Абодва былі сарваныя: 27.08.1729 і 2–14.09.1730. Староста ўніцкі (1700), кракаўскі ваявода (1732), аўстрыйскі фельдмаршал (1736). Кавалер Ордэна Белага Арла. Фінансаваў Collegium Nobilium.

Літ.: Marszałkowie sejmów I RD, s. 94. W. Szczygielski, Lubomirski Teodor herbu Szreniawa (1683–1745) w: Polski Słownik Biograficzny, Wrocław – Warszawa – Kraków – Gdańsk, 1973, t. XVIII/1, zeszyt 76, s. 60–63.

Любіч Восіп (6.12.1896, Гродна – 27.11.1990, Парыж) – жывапісец, графік. Сын рамесніка. Скончыў *гіманізію* ў Гродне. У 1915–1919 вучыўся ў Адэскім мастацкім вучылішчы. У 1920 выехаў у Берлін. Распісваў дэкарацыі для кабарэ Яшы Южнага "Сіняя птушка", тэатра І. Дувана-Тарпцова і Берлінскай оперы. Падпрацоўваў статыстам, граў на скрыпцы ў кінатэатрах. У 1923 пасяліўся

ў Парыжы. Пісаў пейзажы, партрэты, жанравыя карціны і нацюрморты, займаўся афортам. З 1925 выстаўляўся ў салоне Цюільры, з 1926 – у Асеннім салоне. Удзельнічаў у групавых выставах у галерэях Druet (1929), L'Époque (1931), у салонах Абмену сучаснага мастацтва (1936), у выставе "Парыжскія мастакі" (1925–1935) у Брусэлі, выставах у Цюрыху (1935), Ліможы (1936), Лондане (1936). Выпусціў альбом аквацінты "Цырк" з тэкстам Ж. Руо (1934, выдавецтва "Quatre Chemins"). Падчас *вайны Другой сусветнай* заставаўся ў Парыжы. У канцы нямецкай акупацыі па даносе трапіў у лагер Дрансі, але падчас вызвалення Парыжа збег. У 1945 яго працы былі паказаныя на Выставе сучасных жывапісцаў і скульптараў, зарганізаванай камітэтам "Францыя – СССР" XIV акругі Парыжа. У пасляваенныя гады працягваў пісаць пейзажы, партрэты і нацюрмотры: працаваў алеем і гуашшу, займаўся гравюрай. У 1993 працы экспанаваліся на выставе, зарганізаванай мэрыяй IX акругі Парыжа і Асацыяцыяй рускіх жывапісцаў і скульптараў у Францыі. Прадстаўлены ў музеях Лондана, Цюрыха, Нью-Ёрка і Тэль-Авіва; гравюры знаходзяцца ў зборы Нацыянальнай бібліятэкі ў Парыжы.


Люблінскі Павел Ісакавіч (1882, Гродна – 20.12.1938, Ленінград/Пецярбург) – крымінолаг, доктар юрыдычных навук, прафесар. Вучыўся ў 5-й Пецярбургскай гімназіі, на юрыдычным факультэце Пецярбургскага ўніверсітэта (1900–1904). У 1907 абараніў магістарскую працу і быў зацверджаны на пасаду прыват-дацэнта на кафедры крымінальнага права і судаводства. З мая 1909 быў прафесарам Вышэйшых Бестужаўскіх курсаў у Пецярбургу. У 1905–1915 актыўна ўдзельнічаў у міжнародных кангрэсах Саюза крыміналістаў. Быў рэдактарам часопіса "Криминальное право и процесс", "Русский евгенический журнал". Пасля кастрычніцкіх падзей 1917 працягваў працаваць у Петраградскім універсітэце, затым – у Ленінградскім юрыдычным інстытуце. За выдатныя навуковыя заслугі атрымаў ступень доктара юрыдычных навук без абароны (1938). Сярод яго публікацый: "Злачынствы супраць выбарнага права" (1906), "Памяці трох рускіх крыміналістаў І. Я. Файніцкага, Д. А. Дрыля, М. Д. Сяргееўскага" (1914), "Паліцыя, суд і турмы Амерыкі" (1933) і інш.

Літ.: Ермоленко В. А., Черепица В.Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 379–380.

Людовік XVIII – кароль Францыі (1814–1824) Людвік Станіслаў Ксаверы дэ Бурбон (1755–1824), брат пакаранага падчас французскай рэвалюцыі караля Людовіка XVI. Вядома, што Скарбовая камісія ВКЛ выплаціла гарадзенскаму настаяцелю ксяндзу Кантрыму за абрад памінання французскага караля 2 тыс. злотых. Пад імем графа Праванскага (ці дэ Ліль) Людовік XVIII пэўны час жыў у Варшаве. У жніўні 1804 г. Талейран даведаўся, што дэ Ліль часова знаходзіцца ў Гродне і чакае на прыезд усяго свайго сямейства, каб скласці болей ўрачыстую, чым раней аб'яву аб адмове адрачэння Бурбонаў ад французскага прастола. Праванскага запрашалі ў Расію, але ён пераехаў з Варшавы

ў Мітаву. Дарога напэўна пралягла праз Гродна, бо ў "Аповесці з майго часу, альбо Літоўскія прыгоды" І. Яцкоўскі піша пра выпадак, які адбыўся з Праванскім на паштовай станцыі Навіны, адкуль дарогі ішлі на Слонім-Гродна і на Ліду-Вільню.

Літ.: Яцкоўскі І. Аповесць з майго часу, альбо Літоўскія прыгоды. – Варшава, 2010, с. 79–80; Швед В.В., Данскіх С.У. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. – Гродна, 2006. – С. 17–19; Шмігельскіце-Стукене Р. Праверка дзейнасці Скарбовай камісіі ВКЛ у 1792–1793 гг. // Arche. – 2011. – n. 6. – С. 243.



С. 873

Лютэране, евангеліцка-лютэранская супольнасць аўсбургскага вызнання. Першае найбольш значнае перасяленне лютэран у Гродна адбылося ў 1770-я гады, калі *Тызенгаўз А.* запрасіў з Германіі спецыялістаў на створаныя ім мануфактуры. У адказ на просьбу немцаў Гродна, якіх налічвалася каля 70 чал., кароль польскі і вялікі князь літоўскі *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* даў збору лютэранскай канфесіі 12.11.1793 прывілей, у якім падараваў навечна мураваны асабісты каралеўскі дом на *Гарадніцы,* з пабудовамі і прылеглымі землямі памерам 4 моргі. Усё гэта было ўзятае пад каралеўскую пратэкцыю. У гэтым жа годзе у будынку тракціра адчынілі лютэранскую *кірху*, а ў 1796 была створаная Гродзенская евангеліцка-лютэранская парафія. Акрамя духоўных пастараў, евангеліцка-лютэранская суполка выбірала сабе кіроўны орган – царкоўны савет на чале з прэзідэнтам. На працягу XIX ст. імі былі: стацкі саветнік, губернскі архітэктар *І. І. Міхаэліс* (1847–1849), тытулярны саветнік Дзітрых (1849–1850), барон Г. фон Ган (1850–1859), надворны саветнік Ф. Берг (1859–1868), секунд-лейтэнант, шэф гродзенскага *тэлеграфа* П. фон Зенгбуш (1868–1874), надворны саветнік І. фон Вестберг (1874–1879), кіраўнік гродзенскай воданасоснай станцыі А. Ціле (1880–1883), стацкі саветнік, дырыжор Г. фон Вестберг (1883–1886), член гродзенскага акруговага суда Р. фон Гёршэльман (1886–1890), настаўнік гімназіі, стацкі саветнік Ю. Марці (1890–?). Найбольш вядомымі членамі савета былі ўладальнік езуіцкай аптэкі, правізар *І. В. Адамовіч*, губернскі ўрачэбны інспектар, доктар медыцыны К. Л. Эрбштэйн, фармацэўт урачэбнага аддзялення губернскага праўлення і памочнік гарадскога галавы Г. Г. Фейшнер, ваенны ўрач, доктар медыцыны А. Шміт і іншыя. Разам з наладжваннем рэлігійнага жыцця нямецкая суполка значную ўвагу надавала развіццю асветы. З 1846 пачала дзейнічаць *школа евангеліцка-лютэранскай суполкі.* За сваю дабрачынную дзейнасць многія сябры нямецкай суполкі заслужылі ўдзячнасць. 5 студзеня 1849 г. савет пісьмова выказаў падзяку Юліі фон Шэдэ за фінансаванне (640 руб.) пабудовы каменнай агароджы з усходняга і паўднёвага боку царкоўнага двара і падарункі (карціна "Зняцце Хрыста з крыжа", 4 пазалочаныя насценныя падсвечнікі, часоўня на *могілках*). У 1887 яе ўрачыста пахавалі на старых могілках, ужо закрытых для пахаванняў. Аптэкар І. В. Адамовіч у 1870 завяшчаў суполцы дзве аптэкі (у Гродне і Друскеніках), з даходаў ад якой 400 руб. на год ішло на дапамогу 10 бедным сябрам суполкі. За актыўную дапамогу ў рэканструкцыі кірхі і ўзвядзенне каменнай прыбудоўкі (дома

пастара) у 1840-х гадах падзяку атрымаў І. Міхаэліс. У 1883 дырэктар гродзенскай гімназіі фон Гейслер ахвяраваў каля 1 тыс. руб. на пабудову вакол новых могілак (1707 м.) драўлянага плоту і жылога дома для магільшчыка. У 1884 інжынер і дырэктар воданасоснай станцыі ў Гродне К. Зеебэк падараваў кірсе вялікую люстру раманскага стылю, а барон фон Ган – маленькую люстру. Пані Пачобут ахвяравала вялікую карціну "Хрыстос, які грукае ў дзверы і просіць упусціць".

Паводле перапісу 1897 г. у Гродне пражывала 457 жыхароў лютэранскага веравызнання, з іх пісьменных было 364 чал., нямецкую мову лічылі роднай 375 чал. З 1905 царкоўны савет суполкі ўзначальваў Ф. К. Вульперт, пастарам быў А. О. Плямш. Актыўнымі членамі савета з'яўляліся О. А. Кайзер, Я. Ф. Кнотэ, Л. В. Кнотэ і інш. У 1911 пры кірсе працаваў жаночы гурток, які займаўся дабрачыннай дзейнасцю. Другім пастарам быў абраны І. Фаўергольд. Перад *вайной Першай сусветнай* большасць лютэран нямецкага паходжання была з Гродна дэпартаваная ўглыб Расіі. У гады нямецкай акупацыі, якая працягвалася з 1915 па 1919, нямецкая суполка адрадзілася і дзейнічала ў асноўным у рэлігійным напрамку. Паводле перапісу, праведзенага ў 1916 нямецкімі акупацыйнымі ўладамі, у Гродне пражывала 147 асоб нямецкай нацыянальнасці. У евангеліцка-лютэранскую суполку ўваходзілі 162 вернікі. У 1922 колькасць вернікаў павялічылася да 286. Напярэдадні *вайны Другой сусветнай* лютэране зноў зазналі пераслед, на гэты раз з боку Савецкай улады. 1939 г. стаў апошнім у дзейнасці парафіі. У гэтым годзе яна мела кірху, пастарскі дом, гаспадарчыя пабудовы, школу, дом для настаўнікаў, 6 могілак. Працягваў дзейнічаць жаночы гурток. У гады вайны Другой сусветнай акупацыйныя ўлады правялі рэгістрацыю мясцовых цывільных асоб нямецкага паходжання і ахвочым выдалі пасведчанне "фольксдойча". Захаваны ў дзяржаўным *архіве Гродзенскай вобласці* спіс налічвае 223 чал. Калі да іх дадаць членаў сямей, дык агульная колькасць "фольксдойчаў" павялічыцца больш чым у два разы. У чэрвені 1942 г. была адкрытая *школа для фольксдойч*. На загад нямецкага ваеннага каменданта ў Гродне была адноўленая дзейнасць евангеліцка-лютэранскай суполкі, якой перадалі адрамантаваную *кірху*. Архітэктар Леапольд Вагнер і Тэрэза Баўм былі прызначаныя пасярэднікамі ў зносінах суполкі з ваеннай адміністрацыяй. Падчас вызвалення Гродна ў 1944 *"фольксдойчы"* і большасць мясцовых немцаў падаліся на захад разам з нямецкай арміяй. Тыя, хто застаўся, не пазбеглі рэпрэсій: былі пасаджаныя ў *турму* або высланыя. Будынак кірхі быў перададзены *архіву дзяржаўнаму Гродзенскай вобласці*, а могілкі закрытыя.

У 1960–1980-я гады рэпрэсаваныя немцы пачалі вяртацца ў Гродна з Сібіры, Казахстана, Прыбалтыкі. Некаторыя немцы прыехалі сюды на працу па размеркаванні. Паводле перапісу 1989 г. у горадзе налічвалася 97 жыхароў нямецкай нацыянальнасці. Толькі 9 з іх лічылі роднай мовай нямецкую, а 85 – рускую, 3 – беларускую. Паволі пачалося адраджэнне грамадскага і рэлігійнага жыцця. У 1993 на хвалі дэмакратызацыі ў Гродне быў створаны Цэнтр нямецкай культуры на чале з абраным старшынёй А. В. Мілерам. У гэтым

жа годзе 16 сакавіка 12 лютэран-вернікаў стварылі евангеліцка-лютэранскую суполку і атрымалі ў арэнду будынак кірхі. У 1999 суполка была зарэгістраваная ў Міністэрстве юстыцыі Расійскай Федэрацыі, як структурная адзінка Евангеліцка-лютэранскай царквы. Першым старшынёй яе савета быў выбраны А. С. Бінерт. Далей старшынямі былі А. В. Мілер, А. Фромертас, В. Філіпава, З. А. Сарасек, а з 1999 – Л. М. Зорына. Паводле перапісу 1999 г. у Гродне пражывае 156 немцаў. Большасць з іх лічыць роднай мовай рускую. З 58 сябраў лютэранскай суполкі толькі 45 маюць нямецкія карані. Спонсарскую падтрымку гродзенскія немцы атрымоўваюць ад шэрагу лютэранскіх суполак Германіі.

Літ.: Гибянский И.Г. Граф Антоний Тизенгауз и гродненские королевские мануфактуры. – Петроград, 1916.; Грынь З.В. Церковная община города Гродно // Дер Боте (СПб.). – 1999. – №1. – С. 39; Даўгела Л. Лютеране // Гродненская неделя. – 1996. – № 4. – С. 2; Дэмбскі А. Лютэране ў Гродне // Аркуш. – 1999. – 13 мая. – С. 4; Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. Т. XI. Гродненская губерния. – Спб., 1903; Праздничное послание к столетнему юбилею Гродненской евангелическо-лютеранской церкви 17 октября 1893 года. Репринтное издание. Гродно, 2007. – 31 с.; Volumina Legum. T. 10, s. 328–329.

Лямус – гаспадарчая пабудова для захоўвання харчовых прадуктаў, збожжа, адзення, каштоўнай маёмасці, прылад працы, а таксама для жылля ўлетку. Адзін з гродзенскіх лямусаў знаходзіцца на сённяшняй вул. Маладзёжнай. Гэта двухпавярховы драўляны будынак, выкладзены з масіўных бярвенняў на ўрубках (без адзінага цвіка). Ён вылучаны на галоўным фасадзе 2-яруснай слуповай галерэяй. Дах высокі, чатырохскатны і пакрыты гонтам. На першым паверсе захоўвалі маёмасць, а на другім пэўны час жылі першыя 8 манашак-брыгітак з 1636 г. Гродзенскі гісторык архітэктуры І. Трусаў выказвае версію пра магчымасць страты лямуса XVII ст. (калі ён існаваў) і пабудове лямуса ў сяр. XVIII ст., пасля пажару Гродна 1753 г. Другі лямус застаўся з часоў *Тызенгаўза А.* на вул. Дзяржынскага, 1а. Гэта двухпавярховы, прускага фахверку прамавугольны ў плане будынак з вальмавым дахам і мансардамі. Цагляныя коміны шматпрыступкавыя, унутраныя перагародкі ў асноўным драўляныя, драўляная лесвіца двухмаршавая з высокімі прыступкамі.

С. 874

Літ..: Архітэктура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. / Рэдкал.: А.А. Воінаў і інш.. – Мн.: БелЭн.,1993. – С. 537; Маліноўская Т.Р. Тэндэнцыі развіцця архітэктуры Гродна напрыканцы XVIII ст. // Ігнат Анацэвіч: Жыццёвы шлях, педагагічная і навуковая спадчына. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 117; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 32; Чантурия В.А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшаяя школа, 1969. – С. 225.

Лянкевіч Аляксандр Алаізавіч (псеўд. Ландэр, Ляндэр; 1823, Гродзенская губ. – ?) – адзін з кіраўнікоў *паўстання 1863–64* у Гродзенскім у. У арміі з 1840 па 1861 (падпалкоўнік). 14.05.1863 падняў паўстанне ў Гродзенскім у.

Арганізаваў атрад каля 200 чал. Меў званне палкоўніка і камандваў аб'яднанымі атрадамі Млотка, Міладоўскага, Улодака, Юндзіла. 15.06.1863 гэтыя атрады ў р-не в. Мілавіды Слонімскай губ. правялі паспяховы бой з 3-ма ротамі Стараінгерманландскага палка, казакамі і артылерыяй. 13.08.1863 з лідскімі паўстанцамі перайшоў Нёман і пачаў дзейнічаць у Аўгустоўскай губ. З верасня 1863 жыў за мяжой. Завочна прыгавораны да смяротнай кары.

дэ Лясы Маўрыцы-Петэр (1740, Кілакален, Ірландыя – 1820) – сын Патрыка і Мары з Гербертаў, граф. У 16 гадоў пакінуў радзіму і спачатку служыў у аўстрыйскай арміі, а з 1762 г. – у рускай, дзе даслужыўся да фельдмаршала. Выконваў абавязкі губернатара Казані, галоўнага інспектара правінцыі Арэнбург і Смаленска, *губернатара* Гродна. Пасля трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай Кацярына II падаравала яму сядзібу ў *Аўгустоўку*, былую рэзідэнцыю польскага караля *Станіслава Аўгуста Панятоўскага*. Маёнтак складаўся з фальваркаў Горны, Кругляны, Горніца, Саламянка і Дзямідкава – усяго 12 тыс. гектараў зямлі, 1105 душ. У 1807 г. Напалеон прапаноўваў Маўрыцыю-Петэру ваяваць разам з ім супраць сумеснага ворага – расіян. Невядома, што адказаў той яму, бо архіў Аўгустоўка быў спалены падчас першай сусветнай вайны. Не быў жанаты, усынавіў Патрыка, сына сястры Мары, якая была замужам за Вільямам-Цярэнціем О'Брыенам з Лімерыка (Ірландыя). Ад цара Аляксандра I атрымаў дазвол на спалучэнне двух прозвішчаў, і таму з 1820 г. патомкі Патрыка маюць прозвішча *О'Брыен дэ Лясы*.

Літ.: Де Пуле. М. Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794–1797 годах. Изд. 2-е. – СПб., 1871. – С. 138.

Ляхніцкі Ігнацы Эмануэль Антонавіч (1793 – 20.01.1826, Варшава) – пляменнік Л. Ігнацыя Юзафавіча, публіцыст, натураліст, эканаміст. У 1812 атрымаў у Віленскім універсітэце ступень доктара філасофіі, стаў камер-юнкерам двара расійскага цара *Аляксандра I*. Прапагандаваў тэорыю Месмера аб жывёльным магнетызме, быў містыкам. У 1816–18 рэдагаваў і выдаваў часопіс "Dziennik Magnetyczny" ("Дзённік Магнетычны"), ініцыяваў выданне часопіса "Wiadomości Brukowe", быў сябрам рэдакцыі "Dziejów Dobroczynności krajowej i Zagranicznej" (1820–24). Масон віленскай капітулярнай ложы "Дасканалая Еднасць" і сябра Таварыства шубраўцаў у канцы яго існавання. У 1825 правёў геалагічныя пошукі (солі, мелу, жалеза, вугля, серы, гіпсу) ад Беластока ўздоўж *Нёмана* да межаў Прусіі і Курляндыі. У экспедыцыі захварэў і хутка памёр. Найвышэйшым указам ад 27.07.1826 Ляхніцкага ўзнагародзілі ордэнам Святога Уладзіміра 4-й ступені. А паколькі ён да гэтага часу памёр, дык прысланую ад Дэпартамента горных і саляных спраў гродзенскаму губернатару грамату аб выдачы ордэна ўручылі спадчыннікам. Апошнія павінныя былі заплаціць 30 руб. у капітул імператарскіх ордэнаў і грошы на іх перасылку ў Пецярбург. Аўтар кніг: "Statystyka guberni litewsko-grodzieńskiej" ("Статыстыка губерні Літоўска-Гродзенскай", Вільня, 1817); "Statystyka guberni Wileńskiej" ("Статыстыка губерні Віленскай", не выдадзеная); "Wiadomość

o sposobie leczenia wścieklizny, powzięta z jasnowidzenia magnetycznego" ("Паведамленне аб спосабе лячэння шаленства, узятае з магнетычнага яснабачання", Вільня, 1821).

Меў з жонкай Анэляй з Трэмбіцкіх сына Цыпрыяна, які нарадзіўся ў 1824 у Ляхнове на Гродзеншчыне. Быў шамбялянам, калекцыянерам, дырэктарам Музея мастацтва і дырэктарам класа малюнка ў Варшаве. Памёр 27.12.1906, пахаваны на варшаўскіх могілках Павонзкі.

Літ.: Nowy Korbut. Bibliografia literatury Polskiej. – Warszawa: PIW, 1997. – S. 237–238; Szenic S. Cmentarz Powązkowski. 1790–1850. Zmarli i ich rodziny. Warszawa: PIW, 1979. – S. 217.

Ляхніцкі Ігнацы Юзафавіч (1755 – каля 1830) – чалец Гродзенскай *камісіі адміністрацыйнай 1812 г.*, верагодна, старшыня (прэзідэнт) аддзела вайсковых спраў і харчавання. Вучыўся ў Віленскай акадэміі. У 1772 абараніў дысертацыю "Propositiones ex universa philosophia" і атрымаў тытулы магістра вольных мастацтваў і доктара філасофіі. Даслужыўся ў войску ВКЛ да чына палкоўніка (1788/89). Затым быў маршалкам Слонімскага двара ў гетмана М.-К. Агінскага, ягоным дарадцам у маёнткавых і палітычных справах. Паводле яго загаду пераклаў для Слонімскага тэатра аповесць Вальтэра "Альзіра". У верасні і снежні 1788 г. ездзіў ад Агінскага і віленскага ваяводы князя Радзівіла ў Берлін з палітычнай місіяй (антыкаралеўскай і антырасійскай). Пасля пасяліўся ў спадчынным маёнтку Лахнова (Ляхнова) з фальваркам Індура (530 дымаў і 1578 душ у 1823) і заняўся гаспадаркай. У 1793 на Гродзенскім сейме выбраны камісарам Літоўскай скарбавай камісіі. Жыў у Вільні, быў сябрам камітэта па яўрэйскіх справах, вількамірскім стольнікам (1793). Падчас *паўстання 1794 г.* – старшыня Гродзенскай *парадкавай камісіі*, віцэ-прэзідэнт г. Гродна, ахвяраваў 1 тыс. злотых на паўстанне. За правядзенне сялянскай рэформы ў сваіх гродзенскіх маёнтках атрымаў у 1810 ад *Аляксандра I* ордэн св. Уладзіміра 4-й ст., "за прывядзенне ў яснасць вучылішных фундушаў" быў узнагароджаны ордэнам св. Ганны 2-й ст. (1810). У 1811 – прэзідэнт межавага суда Гродзенскага ў., сябра каралеўскага Варшаўскага сельскагаспадарчага таварыства. На гродзенскім сеймiку 17.01.1812 падтрымаў план М.-К. Агінскага аб стварэнні ВКЛ пад апекай Расійскай імперыі. 27.07.1812 быў абраны дэлегатам на Генеральную канфедэрацыю Каралеўства Польскага. У 1813 дзейнічаў у камітэце вайсковых павіннасцяў, які даследаваў стан памешчыцкіх маёнткаў і ажыццяўляў пастаўкі харчавання для расійскай арміі. У 1815 быў у складзе дэлегацыі, якая сустракала Аляксандра I, які вяртаўся з Вены. У 1818 быў адным з заснавальнікаў Друкарскага таварыства. Ганаровы інспектар школаў Гродзенскай губ. Належаў да некалькіх масонскіх ложаў: майстар гродзенскай ложы "Сябры чалавецтва", ганаровы сябра "Святыні Ізіс" (1811–1812), сябра віленскай ложы "Руплівы Літвін", сябра віленскай капітулярнай ложы "Дасканалая Еднасць" (1820). Аўтар кнігі "Biografia włościanina nad brzegami Niemna powyżej Łososny mieszkającego" ("Біяграфія селяніна, які жыве на беразе Нёмана вышэй Ласосны", Варшава, 1815).

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. T. II. – Lwów, 1925. – S. 351. Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 266; Nowy Korbut. Bibliografia literatury Polskiej. – Warszawa: PIW, 1997. – S. 236–237; С. Токць. Спісы выбаршчыкаў шляхецкіх сходаў Гродзенскага, Ваўкавыскага і Слонімскага паветаў Гродзенскай губерні за 1820–1823 гг. // Rocznik Centrum Studiów Białoruskich=Гадавік Цэнтра Беларускіх Студыяў, 2020, № 5, с. 214.

Ляхніцкі Раман Антонавіч (1806 – у 1855 яшчэ жыў) – гродзенскі павятовы прадвадзіцель дваранства, ганаровы апякун *гімназіі гродзенскай* губернскай. У дваранстве прызнаны *дваранскім дэпутацкім сходам* 11.01.1825. Радавы маёнтак Квасоўка (79 душ) і непадзеленыя з пляменнікамі маёнткі Князевічы, Панямунь (454 душы). Вучыўся ў Полацкай акадэміі. З 1822 служыў унцер-афіцэрам у Падольскім кірасірскім палку, а з 1824 – карнетам у *Гродзенскім гусарскім палку*. З лютага 1826 у адстаўцы, са снежня гэтага года абраны суддзёй Гродзенскага межавога апеляцыйнага суда, быў на гэтай пасадзе да 1.02.1834. Зноў абраны на гэтую пасаду на тэрмін 1.06.1838 – 9.09.1840. Быў сябрам рэвізійнай камісіі Гродзенскага *дваранскага дэпутацкага сходу* (зацверджаны 20.01.1836, наступны раз – 01.02.1837). Доўгі час быў павятовым прадвадзіцелем дваранства (першы раз зацверджаны 22.02.1840, затым 22.05.1846, 17.06.1849, 13.03.1853). Выконваў абавязкі губернскага апекуна *турмаў* з 12.03.1843 і ганаровага апекуна Гродзенскай губернскай гімназіі з 1.08.1853. Кавалер ордэнаў Св. Уладзіміра 4 ст. (1841), Св. Ганны 2 ст. (1847), Св. Ганны 2 ст. з імператарскай каронай (1850), меў знак "Беспорочной службы XV лет" (1846).

Крыніца: НГАБ у Гродне, ф. 92, воп. 2, с. 1.

Ляшчынскі Антон Антонавіч (27.07.1962, Паўладарская вобл., Казахстан) – беларускі мастак, майстар мастацкай фатаграфіі. Скончыў школу ў Ракаве Валожынскага р-на Мінскай вобл. (1977), Наваполацкі фінансава-эканамічны тэхнікум (1981), Віцебскі педагагічны інстытут (1988). З 1988 працаваў ў *Гродзенскім дзяржуніверсітэце* імя Я. Купалы. З 1992 – загадчык кафедры вытворчага мастацтва, з 1994 – дацэнт. Стваральнік і кіраўнік кафедры дызайна факультэта мастацтваў і дызайна. Адзін з аўтараў партрэтнай галерэі прафесараў у ГрДУ. Удзельнік шматлікіх выставаў у Беларусі (Гродна, Мінск, Ліда і інш.) і замежжы (Польшчы, Літве і інш.). Узнагароджаны дыпломам пераможцы ў намінацыі "Фотаздымак" Рэспубліканскага конкурса моды і фотаздымка "Супермадэль Беларусі 2000". Мае граматы Гродзенскага аблвыканкама і ГрДУ за ўклад у развіццё мастацкага фотаздымка.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С.87.

Ляшэнка Ларыса (14.03.1914, Вільня – 2004) – гродзенская балетмайстарка народнага *ансамбля песні і танца "Нёман"* (1957–1996). Заслужаная дзяячка

самадзейнага мастацтва БССР, заслужаная дзяячка культуры Беларусі. Знаёмства з музыкай пачалося ад бацькі, які добра граў на многіх інструментах і меў знаёмствы з музыкамі. Л. грала на віяланчэлі, скрыпцы і фартэпіяна. У школе мастацтваў займалася балетам. З 1934 Л. працавала ў Варонежскім тэатры музычнай камедыі. У 1939 сям'я Ляшэнкаў перабралася ў Беларусь і ў Брэсце сустрэла *вайну Другую сусветную*. Адтуль удалося пераехаць у Беласток, дзе адбылася сустрэча з *Р. Шырмам* і яго ансамблем песні і танца. З апошнім Л. прыехала пасля вайны ў Гродна, дзе працавала метадыстам абласнога Дома народнай творчасці, балетмайстаркай і піяністкай у Доме афіцэраў, кіравала танцавальнымі калектывамі на прадпрыемствах горада. З 1950 выкладала народны танец у Культасветвучылішчы. Л. паставіла ў ансамблі "Нёман" каля 200 танцаў. Часткова яны былі выдадзеныя ў зборніках "Мяцеліца" (1982) і "Полькі-рассыпухі" (1985). Імя Л. упісанае ў *"Кнігу славы Гродна"*, а на Гарадскім доме культуры знаходзіцца памятная шыльда ў гонар А. Чопчыца і Л. Ляшэнкі.

Літ.: Вашкевіч А. Гарадзенкі. Жаночы след у гісторыі Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 85–89 (суаўтар І. Новік).

М

“Magazyn Polski” – часопіс-квартальнік, выдаваўся ў Гродне Саюзам палякаў у Беларусі з 1992. Яго рэдактарам быў *Э. Скрабоцкі.* З 2005 замест яго выдаецца штомесячнік “Magazyn Polski na uchodźstwie” (Магазын Польскі ў эміграцыі). Галоўным рэдактарам з’яўляецца Ірэна Валюсь. На часопіс нельга падпісацца, ён выдаецца за мяжой і распаўсюджваецца ў Беларусі праз аддзелы Саюза палякаў Беларусі. Часопіс даступны на партале Kresy24.pl. Сярод аўтараў часопіса не толькі палякі, але і беларусы, якія ёсць і ў складзе Калегіі рэдакцыі.

Крыніца: https://znadniemna.pl/3709/jubileuszowy-magazyn-polski-uchodzstwie/. Доступ 24.04.2021.

Магдэбургскае права – адна з найбольш вядомых сістэм гарадского права, якая склалася ў XIII ст. у нямецкім г. Магдэбургу. Замацавала за гараджанамі права на самакіраванне і дала пэўныя эканамічныя і палітычныя правы ды вольнасці. 11 ліпеня 1496 г., у дзень Св. Бенедыкта, паводле *прывілею* вялікага князя літоўскага *Аляксандра I Ягелончыка,* Горадня атрымала замест “літоўскага ці рускага права” “тэўтонскае магдэбургскае права”. Прывілей быў напісаны ў Берштах пісарам ВКЛ Эразмам Цёлкам, у прысутнасці віленскага біскупа Войцеха, канцлера і віленскага ваяводы Мікалая Радзівіла, бельскага старосты Мікалая, макграбія Мікалая Іллініча. Прывілей быў напісаны на пергаміне, з прымацаванай вялікакняскай пячаткай ў воску з шаўковым чорным шнурочкам. У першым сказе прывілею гаварылася: “Іж мы, маючы законнае прагненне і жаданне памнажэння агульнага дабра, каб стан горада нашага Гродна быў лепшы і каб людзі, якія ў ім жывуць парадкам добрым слушным у сваіх маёнтках сталіся заможнейшымі”. Пазней прывілей быў пацверджаны Жыгімонтам Старым (1506), *Стэфанам Баторыем* (1576), Жыгімонтам Вазам (1589), *Уладзіславам IV* (1633). Паводле прывілею мяшчанам давалася эканамічная свабода, уся адміністратыўная і судовая ўлада перадавалася абіранай гараджанамі *радзе.* Гораду дазвалялася пабудаваць на *р. Нёман* млын, камяніцу для размяшчэння важніцы і васкабойні, праводзіць тры *кірмашы* працягам у тыдзень: адзін – у дзень нараджэння Хрыста, другі – Св. Малгажаты, трэці – у дзень Св. Андрэя. Купцы маглі бязмытна везці тавар у Коўна па Нёмане, у Прусію па р. Неце. Гарантавалася валоданне зямельнай маёмасцю, “уваходы” ў каралеўскія лясныя ўгоддзі, дазвалялася карыстацца сенажацямі. Гарадзенцы маглі пабудаваць *ратушу* з правам мець пры ёй меры для

вадкіх і сыпучых цел. Магдэбургскае права было зліквідаванае ў 1795 г., калі Горадня прымусова стала часткай Расійскай імперыі пасля *трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай.*

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. Сацыяльная тапаграфія і маёмасныя адносіны ў XVI – XVIII стст. – Гародня-Wrocław, 2008; Сліж Н. У. Магдэбургскае права ў Гародні ў канцы XV – першай палове XVI ст.: увядзенне і развіццё // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX ст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – С. 15, 18–19, 35; Maciejowski W. A., Historya miast i mieszczan w krajach dawnego panstwa polskiego od czasów najdawniejszych aż do połowy XIX w. [w.:] Roczniki towarzystwa przyjaciół nauk Poznańskiego. T. XVII, z. 2. – Poznań, 1890. – S. 125–404.

Магістрат – структура гарадскога самакіравання, створаная ў Гродне паводле наданага ў 1496 г. *магдэбургскага права*. З'яўляўся распараджальным, выканаўчым і судовым органам, займаўся адміністратыўнымі, гаспадарчымі і фінансавымі, паліцэйскімі і судовымі справамі горада. Кіравалі М. *войт,* прызначаны вялікім князем літоўскім і 2 выбарных *бурмістры* (адзін праваслаўны, а другі каталік). М. складаўся з лавы і рады. У лаве пад кіраўніцтвам войта або лентвойта (яго намесніка) мелі паседжанні выбраныя лаўнікі – судзілі гараджан пры маёмасных спрэчках і нават займаліся крымінальнымі злачынствамі, разглядалі бягучыя справы. Збіраліся неабмежаваную колькасць разоў на год: напрыклад, у 1638 – тры разы, у 1639 – 12 разоў. Сябры рады (райцы/радцы) павінныя былі быць "не вельмі багатымі, не ўбогімі, а сярэдняга стану" і валодаць пэўным наборам станоўчых рыс характару. Магдэбургскае права прадугледжвала двухэтапныя выбары, але гісторык З. Капыскі сцвярджае, што ў Гродне яны былі аднаступенныя. Як правіла, у М. выбіралі найбольш уплывовых гараджан з купцоў, цэхмайстраў, багатых майстроў. Рада займалася гаспадарчымі справамі горада, і пры ёй быў бурмістраўска-радзецкі *суд*. Для вырашэння найважнейшых спраў лава і рада аб'ядноўваліся і праводзілі сумесныя паседжанні. Магістрат перастаў існаваць з ліквідацыяй магдэбургскага права ў снежні 1795.

Рэанімаваны ён быў ў міжваенны час. Размяшчаўся ў флігелі *кляштара дамініканскага* з 27.09.1920 па 1939 (зараз вул. Савецкая, 8). Магістрат складаўся прыкладна з 10% сябраў Рады, абіранай агульным галасаваннем гараджан. Выконваў абавязкі, даручаныя дзяржаўнай уладай, распараджаўся бюджэтам горада, кіраваў гарадской гаспадаркай і маёмасцю. У 1920 у складзе магістрата былі: *Лістоўскі Э.* (прэзідэнт горада), Нелюбовіч В. (ягоны намеснік), Яноўскі Ш., Рэйнхард Г., Ястшэмбскі Я. (сябры). М. меў наступныя аддзелы: прэзідэнцкі, фінансава-падаткавы (Дзмітрыеў), адміністрацыйна-статыстычны; асветы і культуры, сацыяльнага забеспячэння і аховы здароўя (Яноўскі); тэхнічны; гаспадарчы (Ястшэмбскі), прадпрыемстваў камунальнай гаспадаркі. У 1933 г. магістрат быў ператвораны ва ў*праўленне гарадское*, функцыі якога былі падобныя да магістрату. У фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі захаваліся актавыя кнігі гродзенскага М. за

паасобныя дзесяцігоддзі XVII ст. і амаль ўсяго XVIII ст. (Гарадзенскі магістрат: ф. 1761, воп. 1, с. 1–16, 21–25; Гродзенскі войтаўска-лаўніцкі суд: ф. 1800, воп. 1, с. 1).

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 290; Гардзееў Ю. З гісторыі канцылярыі гродзенскага магістрата / Ю. Гардзееў // Герольд. Litherland. – 2004. – № 3–4. – С. 103–109; Гардзееў Ю. Гісторыка-культурная спадчына Гародні магдэбургскага перыяду // Новае слова ў гісторыі і культуралогіі V Міжнароднага кангрэса беларусістаў "Новае слова ў беларусістыцы". – Мн, 2012. – С. 29; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 61–63, 332, 334; Казак Т., Дакументы магістрата Гродна 1919–1939 гг. у фондах ДАГВ // Гарадзенскі палімпсест 2009. – С. 353–355; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 55–57; Сліж Н. Праца гарадзенскага магістрата ў другой палове XVII ст.// Przegląd Środkowo-Wschodni. – 2021 – № 6. – S. 30–53; Яцкевіч З. Гарадзенскі магістрат у XVII ст. / З. Яцкевіч, В. Урублеўскі // Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV – XX ст. – Гародня, 2010. – С. 88.

Маеўскі Юльян – ксёндз дэкан *касцёла Св. Францішка Ксаверыя*. 25.08.1861 ён абвясціў з амбона аб працэсіі ў Ружаны Сток, якая адбудзецца заўтра ў 15 гадзін. Маеўскі накіраваў паліцмайстру ліст з просьбай не перашкаджаць працэсіі, якая будзе дэманстрацыяй узаемнага паміж людзьмі адзінства і братэрства, перадаў тэкст свайго выступу з амбона *губернатару*. Генерал-губернатар Назімаў тэлеграфаваў гродзенскаму губернатару Шпееру пра меры, якія трэба прыняць, каб не дапусціць працэсіі: зачыніць касцёл, паставіць варты каля ўвахода, на плошчу вывесці батальён пяхоты і казакаў, развесці *мост* і паставіць каля яго гарнізонны батальён, дзёрзкіх арыштоўваць. Усё было зроблена, акрамя таго, што касцёл не змаглі зачыніць, бо там было шмат народу. Паліцмайстар Змееў не вырашыўся арыштаваць Маеўскага. 26 жніўня з 16 да 17,5 гадзін адбывалася вячэрня. На заканчэнне яе Маеўскі паведаміў вернікам, што біскуп супраць любых працэсій, але сам ён не можа ні ўзбуджаць супраць уладаў, ні адгаворваць ад прынясення Богу належнага, "кожны павінен вырашыць для сябе сам, але памятаць, што нельга выкарыстоўваць сілу і прымус". Пасля службы выйшла працэсія на чале з дэканам і 4 святарамі і рушыла да Нёмана. Тут іх сустрэлі вайскоўцы на чале з генералам Галтгоерам, камандуючым 3-й дывізіяй пяхоты, і губернатар. Апошнія пераканалі ўдзельнікаў вярнуцца, бо падобныя працэсіі забароненыя. Паводле закліку Маеўскага ўсе вярнуліся на плошчу, дзе былі акружаныя войскам. Там губернатар ізноў упрошваў людзей разысціся, яны ўсталі на калені, праспявалі літанію, незабаронены гімн Багародзіцы. Дэкан сказаў, што працэсію ўлады не дазволілі, і ўсе пайшлі ў касцёл, дзе зноў праспявалі літанію і забаронены гімн, пасля чаго спакойна разышліся па дамах. Расійскі гісторык А. Ф. Смірноў пісаў, што апісаная маніфестацыя выклікала спрэчкі паміж царскімі саноўнікамі, адстаўку гродзенскага губернатара, узмацніла непаразуменні паміж генерал-губернатарам У. Назімавым і міністрам унутраных спраў П. А. Валуевым.

Апошні заступіўся за Маеўскага і тым выратаваў яго ад расстрэлу, на якім настойваў Назімаў. Яго выслалі ў сібірскі Курган.

Літ.: Смирнов А.Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. – М.: Изд-во АН СССР, 1963. – С. 359; Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – 94–95; Komar J. Grodzieńskie manifestacje przed powstaniem styczniowym // Przegląd Historyczny. – 1960. – № 51. – S. 107–110; Kałuski M. Sprawy kresowe – bez cenzury. T. 1. – Toruń, Melbourne, 2018, s. 646.

Маёліка – паліваная плітка рознага фармату (круглая, квадратная, трохвугольная, фігурная) і колеру, выраблена з гліны. Шырока выкарыстоўвалася ў гродзенскай школе дойлідства XII ст. У Барысаглебскай царкве першапачаткова падлога была выкладзеная з паліваных квадратных, трохвугольных і фігурных плітак, у XIII ст. – з паліваных рэльефных плітак. У вольных месцах сцен і ў прамежках паміж вакон таксама ёсць устаўкі з фігурных плітак рознага колеру і злучаных у выглядзе шматкутнікаў і крыжоў. У падлозе *Ніжняй царквы* выкарыстаная маёліка 17 відаў рознага фармату (17х17 см, 13х13, 11х11, 10,5х10,5) і трох колераў (жоўтага, зялёнага і карычневага). Пераважаў шахматны малюнак, месцамі ўводзіўся ўзор у выглядзе хваста ластаўкі з жоўтых і карычневых плітак. У цэнтральнай частцы наоса ўзор падлогі складаўся з квадратнай пліткі (на якой ўпісаныя колы з арнаментальнымі крыжамі) і шырокіх жоўта-зялёных стужак (палосак) паміж імі. Фасады былі аздобленыя керамічнымі паліванымі пліткамі рознай формы і колеру, паліванай чашападобнай кафляй. Падлога *Прачысценскай царквы* была выкладзеная маёлікавай пліткай жоўтага, зялёнага і карычневага колераў разнастайных форм (у асноўным квадратнай). Невялікія квадраты часам набіраліся з двух трохвугольных плітак. Фасады сцен упрыгожаныя пліткай квадратнай і трапецападобнай формы. Маёлікавай пліткай была выкладзеная падлога *княжацкага хорама* (палаца) на гродзенскім *дзядзінцы*.

С. 875

Літ..: Архітэктура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. / Рэдкал.: А.А. Воінаў і інш.. – Мн.: БелЭн.,1993. – С. 167, 169–170, 179; Малевская М.В. Реконструкция майоликового пола Нижней церкви в Гродно // Культура Древней Руси. – М.: Наука, 1966. – С. 146–151; Слюнчанка В.Р. Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне. Гісторыка-архітэктурны нарыс. – Мн., 1992. – с. 23–24; Трусов И.Г. Православные храмы Гродно. Краткий очерк истории / И.Г. Трусов. – Мн.: Мэджик Бук, 2008. – С. 10; 51–52; Трусов О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI – XVII вв.: Архитект.-археологический анализ. – Мн.: Наука и техника, 1988. – С. 27, 29–30, 117–118; Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – С. 129.

Мазнічка Іван Мікалаевіч (нар. 19.09.1930, с. Грабава Ражнятоўскага р-на Станіславаўскага ваяв. – ?) – заслужаны архітэктар БССР (1990). Скончыў Львоўскі палітэхнічны інстытут (1951–57). У Гродне з 20.08.1957. Працаваў архітэктарам інстытута Белдзяржпраекта, затым – галоўным архітэктарам (1975–1979). Намеснік дырэктара па архітэктуры (1979–85), галоўны спецыяліст

па архітэктуры (з 1985) інстытута Гроднаграмадзянпраект. Чалец горадабудаўнічай рады Гродна і вобласці. Старшыня праўлення Гродзенскага аддзялення Саюза архітэктараў БССР у 1960–1970. М. – аўтар праектаў новага будынка педагагічнага інстытута, планіровак мікрараёнаў №1 і №2 па вул. Савецкіх памежнікаў (разам з В. В. Бойкам), карэкціроўкі *плана генеральнага* Гродна, дэтальнай планіроўкі паўднёва-ўсходняга жылога р-на. Узнагароджаны медалём "За працоўную доблесць" (1966), "За доблесную працу" (1970), "Ветэран працы" (1984), бронзавым медалём Вышэйшых Дасягненняў Народнай Гаспадаркі за праект планіроўкі калгаса "Авангард" Гродзенскага р-на, Граматай Вярхоўнга Савета БССР (1974).

Мазуркевіч Ігнацы Каралевіч (33 гады ў 1863 г.) – гродзенскі мешчанін, шавец, меў у Гродне два невялікія драўляныя дамы. Захоўваў у сябе і даваў чытаць іншым нелегальную газету "Харугва вольнасці". Удзельнічаў у справе 14.03.1863 – спробе гімназістаў выехаць цягніком з Гродна ў Парэчча, а адтуль – у партызанскі атрад Л. Нарбута. Прайшоў праз следства і быў з-пад арышту вызвалены 8.04.1863 г.

Крыніца: ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 214, 228, 262.

Майсяёнак Андрэй Георгіевіч (нарадзіўся 1.06.1943, г. Глыбокае Віцебскай вобл.) – старшыня Гродзенскай абласной краязнаўчай асацыяцыі (з 1990), загадчык лабараторыі вітамінаў і каферментаў Інстытута біяхіміі НАН, член-карэспандэнт НАН Беларусі. Скончыў Гродзенскі *медыцынскі інстытут* з адзначэннем (1965). Навуковы супрацоўнік, асістэнт Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута (да 1970). Затым – у Аддзеле рэгуляцыі абмену рэчываў Акадэміі навук БССР (з 1985 – Інстытут біяхіміі): вучоны сакратар, навуковы супрацоўнік, загадчык лабараторыі, намеснік дырэктара па навуковай працы. Кандыдат медыцынскіх навук (1971), доктар біялагічных навук. На канец 2021 г. меў 826 навуковых прац, з іх 12 кніг ў галіне біяхіміі, вітаміналогіі, 53 артыкулы па гісторыі медыцыны і біялогіі, 24 патэнты і аўтарскія пасведчанні. Яго вучні абаранілі 24 кандыдацкія і 4 доктарскія дысертацыі. У 1990-я гады быў народным дэпутатам Гродзенскага абласнога Савета (з 1990), сябрам Праўлення рэспубліканскага Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і рэспубліканскага Фонда імя А. Міцкевіча, сябрам Прэзідыума Гродзенскага абласнога адзялення Беларускага фонда культуры. Удзельнічаў у стварэнні *аптэкі-музея* ў Гродне, садзейнічаў перадачы *Новага замка Гродзенскаму гісторыка-археалагічнаму музею*, усталяванню памятнага *знака Грунвальдскай бітве* каля *царквы Барысаглебскай* (гл. "*Пагоня на Грунвальд*"), дапамагаў арганізоўваць гісторыка-краязнаўчыя канферэнцыі на Гродзеншчыне. Узнагароджаны ганаровым знакам Усесаюзнага ленінскага камуністычнага саюза моладзі "За працоўную доблесць", медалём "За працоўнае адрозненне", медалём Гродзенскага медычнага ўніверсітэта "Alma mater".

Літ.: Журавлёв В. “Суха теория, мой друг, а древо жизни пышно зеленеет” // Биржа информации. – 2004. – № 46. – 18.11. – С. 8; Михайловская С. Гордиться богатым наследием своего края // Беларуская думка. – 2019. – № 2. – С. 4–10; Пракаповіч І. Даследчыкі роднага краю. – Мн., 2018. – С. 83–89.

Макавельскі Аляксандр Восіпавіч (22.07.1884 , Гродна – 16.12.1932, Баку) – філосаф. Пасля заканчэння гродзенскай гімназіі з срэбным медалём (1902) паступіў у Казанскі ўніверсітэт (гістарычнае аддзяленне). У 1904 Саветам ун-та ўзнагароджаны залатым медалём за твор “Ацэнка найноўшых поглядаў на драматычны канфлікт у трагедыі Сафокла “Антыгона”. Па заканчэнні ўн-та (1904) пакінуты на кафедры філасофіі. Восенню 1920 пераехаў у Бакінскі ўніверсітэт. Доктар філасофскіх навук (1921), заслужаны дзеяч навукі Азербайджанскай ССР (1930). Загадчык сектарам філасофіі (1944), дырэктар інстытута філасофіі Акадэміі Навук Азербайджанскай ССР (1945). Член-карэспандэнт Акадэміі Навук СССР (1946). Акадэмік Акадэміі Навук Азербайджанскай ССР (1949). За 60 год навуковай дзейнасці апублікаваў звыш 140 фундаментальных прац па даследаванні антычнай філасофіі, гісторыі філасофіі народаў Блізкага Усходу, дыялектычным матэрыялізме, логіцы і псіхалогіі. Чалец аўтарскага калектыва 6-томнай гісторыі філасофіі. Рукапісы і бібліятэка вучонага ў 1990 перададзеныя ўнучкай М. Вольгай Аляксееўнай Южанінай-Макавельскай у Гродна, дзе былі прынятыя на захоўванне *архівам дзяржаўным Гродзенскай вобласці*.

Творы: Досократовская философия. Ч. І. – Казань, 1918; Софисты. В. 1–2, – Баку, 1946; Авеста, – Баку, 1960; Категория причинности и законы природы и общества. – М., 1961.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 209.

Макаль Пятрусь (Пётр Міхайлавіч) (25.08.1932, в. Крушыняны, цяпер Беластоцкае ваяводства, Польшча – 31.08.1996) – беларускі савецкі паэт і драматург. Вучыўся ў Гродзенскім будаўнічым тэхнікуме (1947–49), у вячэрняй школе атрымаў атэстат сталасці. Затым паступіў у Гродзенскі педагагічны інстытут (1949–1954). У студэнцкія гады шмат друкаваўся: першы верш апублікавалі ў 1949 у “Гродзенскай праўдзе”. Працаваў літаратурным супрацоўнікам тамсама (1953–54). Аўтар зборнікаў паэзіі “Першы след”, “Вятрам насустрач”, “Вечны агонь”, “Круглы стол”, “Дотык да зямлі”, “Акно” і інш.

Літ.: Гарэлік Л.М. Макаль Пятрусь // Беларускія пісьменнікі. Бібліяграфічны слоўнік. Т. 4., Мінск, 1994, с. 175–176; Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: давед. / А.М. Пяткевіч. – Гродна: ГрДУ, 2000.

“Макабі” – гімнастычна-спартыўны яўрэйскі клуб, заснаваны ў 1919 г. Меў футбольную і баскетбольную каманды, лёгкаатлетаў, баксёраў і лыжнікаў (1925). У 1930 таварыства клуба вырашыла пабудаваць свой стадыён і ў ліпені звярнулася да *магістрата* горада аб выдзяленні пляца на вул. Ажэшкі. Атрымалі

зямлю пры ўпраўленні земскім, але яна не падыйшла, таму звярнуліся зноў да магістрата 18.05.1931. Той выдзеліў пляц на *Сабачай/Паляўнічай горцы*. Калі клуб зноў адмовіўся, яму прапанавалі 1,5 га на вул. Нарутовіча. На гэты раз не задаволіла форма і малая тэрыторыя пляца. І нарэшце, 10.08.1931 падыйшла зямля ў Станіславове, дзе была калонія служачых.

Крын. і літ.: ДАГВ, ф. 46, воп. 1, с. 199; Саяпин В. Гродненский спорт: история и достижения. 1919–1939 года / В.Ю. Саяпин. – Гродна, 2015.

Макоўскі Антоні (12.06.1797 ці 20.01.1798, Гродна – 13.04.1849, Страсбург) – паўстанец 1830–31 гг. Сын Яна і Альжбеты Бараноўскай, шляхціц. 20.03.1815 уступіў сяржантам у 2 полк лінейнай пяхоты польскага войска. 08.05.1822 атрымаў чын падпаручніка, 25.03.1819 – паручніка. У *паўстанні* служыў ад'ютантам батальённай артылерыі. Даслужыўся да чына капітана (03.05.1831) і быў узнагароджаны залатым крыжам (17.09.1831). Пасля паражэння паўстання перайшоў мяжу Прусіі. Рашэннем гродзенскай губернскай следчай камісіі прызнаны дзяржаўным злачынцам, і яго маёмасць у Гродне была канфіскаваная. У лютым 1832 прыехаў у Францыю і пасяліўся ў Безансон, дзе 06.1832 быў прыняты ў масонскую ложу "Стойкасць-Надзея". У красавіку 1833 французскімі ўладамі адасланы ў Нідэрброн. Магчыма, меў дачыненне да экспедыцыі *Заліўскага Ю.* У студзені 1834 прыбыў у Страсбург. У жніўні 1835 спрабаваў завербавацца ў Іншаземны Легіён, але беспаспяхова. Працаваў на паравых караблях на Рэйне. 29.11.1846 уступіў у Таварыства Трэцяга Мая. Падчас Вясны Народаў служыў у Легіёне А. Міцкевіча ў Італіі (Генуя). У студзені 1849 вярнуўся ў Страсбург. У сакавіку 1849 трапіў у вайсковы шпіталь і хутка памёр.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродна, ф. 31, воп. 2, спр. 309; Гарбачова В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі: Біяграфічны слоўнік. – Мінск, 2004, с. 223; Bartkowski J. Spis Polaków zmarłych w emigracji od roku 1831. – ?, 1985, s. 275; Bielecki R. Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego. T. 3. – Warszawa, 1995, s. 91; "Demokrata Polski", № 3, 26.01.1851. S. 12; Uruski S. Rodzina. Herbarz szlachty Polskiej – Warszawa, 1912 (reprint 1997).

Макоўскі Тамаш (каля 1575 – каля 1630, Кракаў) – княскі каморнік, графік і гравёр на дварэ нясвіжскім. У 1600 зрабіў гравюру Гродна, на якой паказаў раку *Нёман*, на правым беразе – *царкву Барыса і Глеба на Каложы*, *замак Стары* часоў *Стэфана Баторыя*, *Фару Вітаўта, ратушу, манастыр і касцёл Адшукання Св. Крыжа, царкву Чэснага Крыжа*; праз раку перакінуты *мост* з драўлянымі сценамі і дахам; на левым беразе намаляваныя жылыя і гаспадарчыя пабудовы. У параўнанні з гравюрай Адэльгаўзера-Цюнта, відаць, што дамоў стала болей (насельніцтва павялічылася). М. быў адным са стваральнікаў так званай *мапы Радзівілаўскай* ці "мапы Макоўскага" 1603 і 1613, на якой таксама паказаная Горадня.

Літ.: S. Alexandrowicz. Stanowisko T. Makowskiego na dworze nieświeskim // Biuletyn Historii Sztuki, XXIX, Warszawa, 1967, nr. 4, s. 522–529; M. Heydel. Makowski Tomasz // Słownik artystów polskich i obcych w Polsce działających (zmarłych przed 1966 r.), t. 5, Warszawa 1993, s. 271–273.

Макрэцкі Адам Вінцэнты Феліцыян (1856–1921) – генерал рас. арміі. Быў камандуючым брыгады ў 2-й дывізіі стральцоў І корпуса пяхоты на Усходзе, у 1918 – камандуючы 2-га палка самаабароны г. Вільня. Пазней быў камандуючым брыгады, камандуючым І дывізіі пяхоты літоўска-беларускага войска, камандуючым Генеральнай акругі "Гродна" (1919–20).

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 304.

Максімовіч Вячаслаў Аляксандравіч (14.04.1944, в. Пескі Шчучынскага р-на) – "хросны бацька" грэка-рымскай барацьбы ў Гродне, заслужаны трэнер БССР (1980) і СССР (1990), прафесар. Скончыў 7 класаў Навадворскай школы Шчучынскага раёна ў 1959 і паступіў у Растоўскае будаўнічае вучылішча. У Растове пазнаёміўся з класічнай барацьбой, выканаў нарматыў майстра спорту СССР. Праз 4 гады вярнуўся ў Беларусь і паступіў у Мінскі інстытут фізкультуры. Выйграў юнацкі чэмпіянат рэспублікі, быў прызёрам даслага (у вазе да 68 кг). Траўмы прымусілі скончыць са спаборніцтвамі. У красавіку 1966 прыехаў працаваць намеснікам дырэктара ў Гродзенскім заалагічна-ветэрынарным тэхнікуме і трэніраваў барцоў у кааператыўным тэхнікуме. Затым стаў працаваць у Гродзенскім пединстытуце выкладчыкам кафедры фізічнага выхавання, дзе таксама трэніраваў барцоў. Галоўны козыр у тактыцы М. – атака. Сярод яго выхаванцаў – В. Умінскі (бронза на міжнародным турніры памяці І. Паддубнага і на VII Спартакіядзе народаў СССР), А. Федарэнка (бронза на чэмпіянаце свету 1981 сярод юніёраў, бронза на чэмпіянаце свету 1986, тройчы чэмпіён Еўропы), А. Шастакоў (чэмпіён Еўропы ў Осла), А. Паўлаў (чэмпіён Еўропы і срэбны прызёр чэмпіянатаў свету). Па ініцыятыве М. стаў праходзіць турнір па грэка-рымскай барацьбе на прызы *"Гродзенскай праўды"*. М. узначаліў гарадскую федэрацыю грэка-рымскай барацьбы. *Ганаровы грамадзянін* Гродна.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 90; Попко И. Вячеслав Максимович и секреты гродненских "греко-римлян" // Гродзенская праўда. – 1994. – 19.04. – С. 3; Попко И.Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 53.

Максімовіч Канстанцін (Канстанты) Восіпавіч (1766 – 03.1851, Гродна) – гродзенскі віцэ-губернатар. Скончыў Віленскі ун-т, у 1784–1793 гг. служыў у войску РП, выйшаў маёрам у адстаўку і пачаў цывільную службу: са студзеня 1802 – саветнік гродзенскай *казённай палаты*. У 1803 адказваў за будаўніцтва *моста* праз *Нёман.* У 1807–1811, 1816–1817 гг. выконваў абавязкі гродзенскага віцэ-губернатара, а з 1819 быў прызначаны на пасаду. Падчас *вайны 1812 г.*

запрошаны ў скарбавае аддзяленне Адміністрацыйнай камісіі Гродзенскага дэпартамента ВКЛ. Ён заставаўся віцэ-губернатарам, хаця змяняліся *губернатары*: *В. С. Ланскі, К. К. Лешэрн, К. Ф. Друцкі-Любецкі, С. Ф. Урсын-Нямцэвіч, М. Ф. Бутаўт-Андрайковіч, М. Т. Бабяцінскі*. Пры такой "губернатарскай чахардзе" Максімовіч, відаць, фактычна кіраваў губерняй, і сітуацыя спрыяла злоўжыванню пасадай. Што ўрэшце прывяло віцэ-губернатара да пакарання, нягледзячы на дасягнутыя поспехі і ўзнагароду ордэнамі св. Уладзіміра і св. Ганны. У 1826 было выяўлена, што Максімовіч, як і шэраг іншых чыноўнікаў, "забіраў сумы з канцылярыі казённай палаты". У лютым 1827, паводле распараджэння Дваранскай апекі Гродзенскага ў., быў складзены вопіс рухомай і нерухомай маёмасці былога віцэ-губернатара. У яго патрапілі маёнтак Каменная Русота, вёска Пальніца (у 1823 – 20 дымаў і 76 душ) і мураваны *дом/палац Максімовіча* ў Гродне па вул. Віленскай (сучасная Ажэшкі, 3). Паводле рашэння гродзенскага губернскага праўлення ад 29.06.1837 Максімовіча пазбавілі чыноў і дваранства. У 1837–1846 жыў у маёнтку Русота. У 1846–51 знаходзіўся пад наглядам паліцыі, а маёмасць – у Дваранскай апецы.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродна, ф. 1, оп. 4, д. 985; ф 1, воп. 29, с. 8, а. 32 адв – 33; Гардзееў, Фарныя кат. могілкі. // Пагоня – с. 5; Радзюк А. Гарадзенцы пад наглядам паліцыі ў першай палове XIX ст. // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 98–99; Сенаторова С.В. Инвентарь дома бывшего гродненского вице-губернатора К. Максимовича / С.В. Сенаторова // Краязнаўчыя запіскі. – Гродна: Выд-ва Гродз. абл. аддзела БФК, 1997. – Вып. 4. – С. 141–146; С. Токць. Спісы выбаршчыкаў шляхецкіх сходаў Гродзенскага, Ваўкавыскага і Слонімскага паветаў Гродзенскай губерні за 1820–1823 гг.// Rocznik Centrum Studiów Białoruskich=Гадавік Цэнтра Беларускіх Студыяў, 2020, № 5, с. 216.

Малахоўскі Казімір (1802–?) – сябра патаемнага Свіслацкага Вучэбнага/навуковага таварыства. У 1820 г. выехаў са Свіслачы да бацькі ў маёнтак Дубляны Гродзенскай губ., а пазней у Гродна. Тут у 1823 працаваў у мытні.

Маліноўскі Караль (1841 – пасля 1796) – ксёндз экс-езуіт, настаўнік, рэдактар, выдавец. Вучыўся ў гродзенскім *калегіуме езуітаў*, вывучаў рыторыку ў Слуцку (1757–59). Выкладаў у Навагрудку і Гродне. У 1761–1764 вывучаў філасофію ў Віленскай акадэміі, а ў 1766–70 – тэалогію ў гродзенскім калегіуме. Да 1773 працаваў прафесарам красамоўя ў віленскім калегіуме, пісаў і друкаваў па розных нагодах вершы. Быў першым дырэктарам *друкарні гродзенскай каралеўскай* з 1776, верагодна, да канца 1784 (у 1780 яшчэ быў). Гісторыкі пісалі, што ў 1774 г. ён спрабаваў адкрыць у Гродне сваю друкарню, але не атрымаў ад караля *Станіслава Аўгуста Панятоўскага прывілей*. Але гэта не так, бо ў AGAD (Archiwum Tyzenhauzów, D–5/XXV, mikrofilm, s. 22, 22a) ён захаваўся і называецца "Privilegium pro nova typographia Grodna origenda venerabili Carolo Malinowski confertur". У 1792–1795 Маліноўскі будзе вядомым таленавітым журналістам і выдаўцом "Карэспандэнта Варшаўскага". У Гродне

менавіта ён складаў "Календары гродзенскія". Дакладна гэта: "Kalendarz gospodarski Grodzieński" ("Каляндар гаспадарскі Гродзенскі", 1776–81, 1784, 1786–1788) і "Kalendarz polityczny Grodzieński" ("Каляндар палітычны Гродзенскі", 1782 і 1783).

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 297; Łojek J. , "Gazeta Grodzieńska" 1776 – 1783 // Rocznik Historii Czasopiśmiennictwa Polskiego. – 1966. – T. 5, z. 2. S. 13–14.

Мамант – жывёла класа сысуноў, якая пражывала на тэрыторыі Гродзеншчыны ў эпоху ледавіка (2,59 млн. – 11,7 тыс. гадоў таму). На сённяшні дзень вядомыя дзевяць знаходак фрагментаў мамантаў у Гродне. Першая зафіксаваная ў сакавіку 1837 г. у сяле *Фалюш (Фолюш)* на беразе рэчкі *Ласасянка*: мясцовы млынар Людвік Міхальскі знайшоў рог даўжынёю каля трох аршынаў і ніжнюю сківіцу з двума зубамі. Гродзенскі мешчанін Адам Макарэвіч адшукаў на гэтым месцы галаву з двума зубамі, пярэднюю і заднюю лапатку даўжынёю і шырынёю каля аршына. Частку шкілета (чэрап, зуб з верхняй сківіцы з левага боку, правая лапатка, тазавая костка з левага боку) купіў кіраўнік Гродзенскай *мытні* Кулакоў і падараваў *гімназіі Гродзенскай* (у снежні 1855, паводле рашэння школьнага куратара, косткі былі перададзеныя Віленскаму музею старажытнасцяў). Другую частку набыў *О'Брыен дэ Ласы*. Ён паслаў сюды сваіх людзей, і яны адкапалі тры кавалкі рабрын маманта. Адзін зуб і некалькі костак купіў аматар старажытнасці з Каралеўства Польскага. Даследаванні месца знаходкі ў маі 1837 г. паказалі, што спачатку ў масе торфа захоўваўся цэлы шкілет маманта. Гэтую знаходку апісаў дырэктар *гімназіі Ястрабцоў І. М.* (лекар па спецыяльнасці) У 1872 косці маманта адшукаў у названай рацэ этнограф і археолаг З. Глогер. Наступная знаходка адбылася ў 1885 на *Новым Свеце*, каля дома Контрыма – здабычай каваля К. Романа стаў шкілет маманта даўжынёй каля 2 м і вагою каля 37 кг. Гродзенскі *губернатар* забраў знаходку, пазней яна была вывезеная ў Пецярбург. У 1889 каля в. Гожа знайшлі шкілет маманта вагою каля 100 кг і даўжынёю звыш 2 м. У 1913 фрагменты маманта былі знойдзеныя на глыбіні каля 2 м падчас будаўніцтва *крэпасці* Гродна. 15.05.1932 на беразе *Нёмана* каля в. Гожа знайшлі фрагмент косткі бядра. У 1935 гродзенскі часопіс "Нёман" паведаміў, што падчас пракладкі *каналізацыі* на глыбіні 5,5 м на вул. Басняцкай (цяпер Тэлеграфная) знайшлі костку левай голені маманта. Яна была змешчаная ў гродзенскі *Музей прыроды*. У той жа час на вул. Вітальдовай/Сацыялістычнай глыбока ў жвіры знайшлі частку шкілета маманта. У 1938 Жыўна С. П. сабраў на тэрыторыі Румлёўскага парку калекцыю костак маманта і іншых старажытных жывёл, якія былі выкапаныя падчас будаўніцтва шашы. Знойдзены тут бівень маманта быў размешчаны ў Музеі прыроды. Косткі мамантаў можна паглядзець цяпер у гродзенскім *музеі гісторыка-археалагічным*.

Літ.: Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада / Пад рэд. В.В. Шведа і В.Р. Карнялюка. – Горадня, Вроцлаў, 2012. – С. 23–24; Павач А. Гродзенскія гісторыі. – Гродна:

ЮрСаПрынт, 2019. – С. 147–150; Смирнов А. По гродненской земле ходили мамонты // Гродзенская праўда. – 1996. – 8.08. – С. 4; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 12, 21, 204, 221; Nieman. – 1939. – n. 1. – S. 48; Gloger Z. Dolinami rzek. Opisy podróży wzdłuż Niemna, Wisły, Bugu i Biebrzy, Warszawa 1903; Roxsolanus, Z przeszłości przedhistorycznej Grodzieńszczyzny [w.:] Przegląd Wileński. – Wilno. № 17. – S. 2–4; Zagacki D., Gdy w naszych okolicach pasły się mamuty // Magazyn Polski na uchodźstwie. – 2018. – n. 5 (148). – s. 30–31.

Манасеін Уладзімір Сяргеевіч (20.07.1878, Казань – 27.08.1938, Іркуцк) – гісторык, краязнавец, спецыяліст бібліятэчнай справы. Пасля заканчэння Ніжагародскага графа Аракчэева кадэцкага корпуса і Мікалаеўскага інжынернага вучылішча, 9.08.1897 атрымаў чын падпаручыка і быў прызначаны ў 4-ы Сапёрны батальён, які знаходзіўся на тэрыторыі Гродзенскай губ. Ужо падчас службы М. напісаў і выдаў у 1902 г. "Исторический очерк Гродненской губернии в военно-политическом отношении за первые сто лет её существования (1802–1902)" і "Крестьянский вопрос в Гродненской губернии в XIX столетии". Падчас рэвалюцыі 1905–1906 адмовіўся ад падаўлення паўстання рэвалюцыйных салдат, і быў адпраўлены ў адстаўку. Ваяваў падчас *вайны Першай сусветнай* і ў грамадзянскай (на баку белых і чырвоных). З 24.04.1920 па 1922 М. – прафесарскі стыпендыят. У 1922 здаў магістарскі экзамен і быў выбраны выкладчыкам Іркуцкага ўніверсітэта, а затым – загадчыкам кафедры права (да 1925). Пазней узначальваў розныя навуковыя бібліятэкі. У жніўні 1937 быў арыштаваны Упраўленнем НКУС па Усходне-Сібірскай вобласці. М. абвясцілі агентам японскай выведкі і чальцом белагвардзейскай контррэвалюцыйнай арганізацыі. Пастановай НКУС СССР і Пракурора СССР ад 28.08.1938 прыгавораны да расстрэлу. За дзень да гэтага М. памёр у шпіталі Іркуцкай турмы.

Літ.: http://history-kazan.ru/kazan-vchera-segodnya-zavtra/istoriya-v-litsakh/zhzl-kazanskaya-seriya/17264-vladimir-sergeevich-manassein-nagrada-za-rabotu-kotoraya-byla-dlya-menya-dorozhe-vsego-na-svete Доступ 24.04.2021.

Манастыр базыльянак, Барысаглебскі праваслаўны – знаходзіўся па вул. Маставая, 9 (там, дзе цяпер будынак драматычнага *тэатра*). З 1915 да канца 1920-х гадоў М. Б. быў прытулкам беларускасці ў горадзе. На браме манастыра па святах вывешваўся бел-чырвона–белы сцяг. У 1915 сюды перавялі з Краснастока дзіцячы прытулак (кіраўнік *Станіслава Буйло*). У красавіку 1916 тут размеркавалася першая ў Горадні беларуская *школа,* дзе працавалі *Станішэўская Тэкля* і *Грыкоўскі Аляксандр*, была Беларуская школьна-прытулкавая рада. У памяшканнях школы адбываліся канспіратыўныя сустрэчы прадстаўнікоў беларускага падпольнага партызанскага руху. Восенню 1918 у манастыры з'явілася першая легальная беларуская арганізацыя – Сувязь культурна-нацыянальнага адраджэння Беларусі (пазнейшая назва: *камітэт Беларускі нацыянальны*). 1.12.1918 у будынку манастыра адбыўся

з'езд праваслаўнага насельніцтва Гродзенскай губ. У манастыры знаходзіліся канцылярыя Беларускай вучыцельскай рады, сакратарыят Беларускага пасольскага клуба, Беларускі камітэт дапамогі пацярпелым ад вайны і рэдакцыя газеты "Сялянская гутарка", беларуская кнігарня і гродзенскае аддзяленне Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры. У келлях часам жылі мясцовыя альбо прыезджыя беларускія дзеячы.

Літ.: Павач. А. Шпацыр па Гародні. Шляхаводнік. – Вільня: ЕГУ, 2018. – С. 10–13; Шляхамі БНР. Да 100-годдзя абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 29–32.

Манастырскі Сяргей – былы штабс-капітан, кавалер ордэнаў Св. Уладзіміра, Станіслава і Ганны, стваральнік спецыяльнага кінатэатра ў Гродне ў 1914 г. Ён спачатку называўся "Манастырскі", затым "Эдэн", "Палац", "Палонія", а з 1940 па сённяшні дзень – "Чырвоная зорка". Унук М., доктар Сяргей, жыў у Гродне і памёр у Вільні ў 1940. У Гродзенскім гістарычным архіве захавалася справа "Аб дазволе капітану ў адстаўцы С. М. Манастырскаму будаўніцтва мураванага двухпавярховага будынка".

Літ.: Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 20–21.

Мангола-татарскія набегі на Гродна – праблема, якая на сённяшні дзень не мае адзінага погляду. Я лічу, што напад на горад у 1241 г. адбыўся. Ніжэй спасылаюся на дзве працы ваенных спецыялістаў вайсковай гісторыі. Паводле В. Заторскага ў другой палове лютага 1241, каб забяспечыць сабе тыл падчас нападу на Польшчу, у напрамку Літвы з Уладзіміра рушылі войскі манголаў на чале з Ордай (інакш Урля, Курдж) у сіле аднаго тумена. Ён ішоў праз Ваўкавыск, Лунну. Адбылася бітва паміж Астрыной і Васілішкамі (на месцы Шайбакполя), дзе літоўскае войска было разбітае і, як мы думаем, загінуў князь гарадзенскі *Юры Глебавіч*. Затым манголы патрапілі ў Гродна, разрабавалі яго і спалілі. Кайдан (Кайду) са сваім войскам не быў тут, бо ў гэты час захапіў Сандамір і Вроцлаў. Заторскі рабіў сваю рэканструкцыю, абапіраючыся на працы Длугаша, М. Стрыйкоўскага, Т. Нарбута. Другі польскі гісторык Ю. Пузыня, карыстаючыся акрамя вышэйназваных крыніц яшчэ і літоўскімі (беларускімі) хронікамі, лічыць, што паход мангола-татараў пачаўся не з Уладзіміра, а з Перамышля, і далей прайшоў праз Холм – Уладаву – Пінск – Навагрудак – Слонім – Ваўкавыск – Лунну – Васілішкі, а затым татары вярнуліся назад праз Ваўкавыск – Холм. Пра бітву ў Гродне, на погляд аўтара, гавораць знаходкі Ю. Ядкоўскага на тэрыторыі *замка Старога* ў Гродне. Апошні знайшоў вакол *царквы Ніжняй* каля 30 шкілетаў, раскіданых з боку берага *Нёмана* (а не па-хрысціянску пахаваных упарадкавана, да таго ж у адным з чарапоў знаходзіўся фрагмент стралы). Пузыня піша, што руіны царквы былі выкарыстаныя падчас бітвы для абароны ад татараў, і калі б зрабіць раскопкі з іншага боку царквы (з боку нападу), дык можна было б знайсці яшчэ больш шкілетаў. Камандаваў татарамі Кайдан, брат Батыя, які

разам з Ордай камандаваў адным з туменаў паўночнай арміі Байдара, і не трэба яго блытаць з палкаводцам Каданам, сынам Удыгея, які кіраваў адной з калон арміі татар у паходзе на Венгрыю.

Вясной 1506 г. наваколле Гродна рабавалі *татары* Крымскага ханства.

Літ.: Канановіч В.І. Крымскія напады на Беларусь // Гісторыка-археалагічны зборнік. – Мінск, 1993; Skirmunt. Nad Niemnem i nad Bałtykiem. T. 3. – Warszawa, 1897. – S. 13–17; Zatorski W. Pierwszy najazd mongołów na Polskę w roku 1240–1241 // Przegląd historyczno-wojskowy. T. IX. –Warszawa, 1936, z. 2. – S. 209–213; Puzynia J. W sprawie pierwszych walk Litwinów z tatarami o Ruś w latach 1238–1243// Przegląd historyczno-wojskowy. T. IX. –Warszawa, 1936, z 3. – S. 369–377, 394–395.

Маневіч Абрам Яфімавіч (?–1947) – радавы 102 Вяцкага палка Гродзенскага гарнізона (1905). Гродзенскі карэспандэнт Л. М. Талстога. Брат Льва Яфімавіча Маневіча (1898–1945), савецкага вайсковага разведчыка, Героя Савецкага Саюза.

Манетны двор – у Гродне існаваў у 1706–1707 гг., падчас *вайны Паўночнай*. Пра гэта дамовіліся ў Тыкоціне (21.10.1705), а затым у Гродне цар *Пётр I* і кароль польскі Аўгуст II Моцны. Планавалася друкаваць срэбныя манеты – тымфы, шастакі (1/3 тымфа) і шэлегі. Адкрыў М. д. вялікі падскарбі літоўскі Людвік Канстанцін Пацей. Чаканіліся з вельмі няякаснага срэбра трохі шасціграшовікі (траякі з 1706, а шастакі ў 1706–07) з партрэтам Аўгуста II, ужо выгнанага на той час караля польскага. Грошы прызначаліся для разліку з войскам, якое захавала вернасць выгнанцу. Сёння вядомыя толькі адзін траяк і два тыпы шастакоў 1706 і адзін шастак 1707 г. Траяк 1706 выглядаў наступным чынам: выява караля, вакол надпіс "Аўгуст Другі з Божай ласкі кароль Польшчы, вялікі князь літоўскі, электар саксонскі". На другім баку – "Пагоня", пад якой ініцыялы падскарбія – L. P. і ягоны герб – Шалі. Вакол надпіс: "Манета новая срэбная, Вялікага Княства Літоўскага. 1706". Насельніцтва расшыфроўвала "L. P." як "людскі плач ", бо за знаходжанне вышэйназванай манеты прыхільнікі караля Станіслава Лышчынскага забівалі на месцы. Толькі пасля вяртання Аўгуста II манеты гродзенскага М. д. сталі разыходзіцца вольна. Гродзенскі нумізмат Какарэка В. лічыць, што М. д. у Гродне не існаваў. Горад хутка пакінулі расійскія войскі, з'ехаў Аўгуст з польска-саксонскім войскам. Друкаваліся манеты ў Кёнігсбергу (перабіваліся з расійскіх капеек), а таксама ў Маскве, на адміралцейскім манетным двары ў 1706–1709. Распаўсюджваліся грошы на тэрыторыі Беларусі, занятай расійскім войскам. Падчас грашовай рэформы пры Станіславе Аўгусце Панятоўскім пачалася скупка і пераплаўка манет XVII ст. і М. д. у Гродне зноў адкрылі. Пад яго быў пабудаваны ў 1767 г. дом, закупленае абсталяванне, але да чаканкі новай манеты справа не дайшла.

Літ.: Вераціла М. "Даручаем вяльможнаму адміністратару Скарба Вялікага княства выбіць 1 мільён шэлегамі" // Народная воля, 2018, 2 мая, с. 7; Какареко В. Гродненский

монетный двор 1706–1707// Mennice między Bałtykiem a morzem Czarnym – Wspólnota dziejów. – Warszawa: Polskie TN. Zarząd Główny, 1998. – S. 187–196; Касмылёў В.С. Нумізматычны аспект у гісторыі Гродна // Краязнаўчыя запіскі. – Гродна, 1995. – С. 106–110; Сінчук І.І. Гродзенскі манетны двор // Археалогія і нумізматыка Беларусі // Энцыклапедыя: Бел.Эн., 1993. – С. 190; Historia Polski. Kalendarium dziejów. 1655–1887, Kraków, 2010, s. 95.

“Мануфактуры Яго Каралеўскай вялікасці” – прадпрыемствы, пабудаваныя ў *Гродне* і *Ласосне* падчас рэформы *Тызенгаўза А*. Паводле падлікаў розных даследчыкаў іх налічвалася больш за 20. На *Гарадніцы* дзейнічалі карункавая і залататкацкая мануфактуры (у 1760–1783), палатняная (1766–1845, з 1779 у Ласосне), суконная (1766–1860, з 1779 у Гродне), ваўняная (з 1766 створаная “Кампанія ваўняных мануфактур”, якая мела прадзільнае, ткацкае, валяльнае, стрыгальнае, вярсальнае і фарбавальнае аддзяленні), панчошная мануфактура (1768–1783), карэтна-экіпажная (1770–1783), гарбарная (1770–1860, да 1777 у *Гродне*), металаапрацоўчая (1770–1780), шаўкаткацкая (так званая “персіярня”, 1770–1789), тытунёвая (ёсць на плане 1780 г.). У Гродне працавалі мануфактуры па вытворчасці ігральных карт, шкляных пацерак і посуду. У *Ласосне*, ля ўпадзення ракі *Ласасянкі* ў *Нёман,* знаходзіліся тры прадпрыемствы: палатнянае (1779–1845), ваўнянае (1766–?), фарбавальнае і тонкасуконнае (1779–1860), свечаў васковых і паходняў (1777). Швейцарскі вучоны Ё. Бернулі у сваім вандроўным дзённіку ўспамінае яшчэ фабрыку капелюшоў. Невядома, дзе знаходзіліся згаданыя ў літаратуры паташныя, дзёгцевыя, лесапільныя заводы, бровары і дывановая (паркаленабіўная) мануфактуры. Ё. Бернулі і англійскі вучоны Вільям Кокс згадваюць яшчэ фабрыку зброі (1778). Агульны кошт абсталявання Гарадзенскіх каралеўскіх мануфактур складаў 116 767 злотых. На іх працавала да 3 тыс. прыгонных рабочых (разам з тымі, хто працаваў у вакольных вёсках), каля 400 прыгонных вучняў, да 70 майстроў і назіральнікаў. В. Кокс, які бачыў гродзенскія мануфактуры, пісаў: “Краіна дастаўляла воўну, лён, канаплю, воск, бабровую воўну ў дастатковай колькасці, патрэбнай для вырабу тавараў з іх, шоўк, бавоўну, жалеза, фарбавальнікі, золата і срэбра для аздобы і далікатныя брусельскія ніці на карункі трэба было прывезці з-за мяжы”. Прывознай сыравінай забяспечвала мануфактуры купецкая кантора “Бекю і К”. У 1787 працавала 16 прадпрыемстваў у Гродне і Ласосне.

На пералічаных мануфактурах выраблялiся самыя розныя рэчы. На панчошнай – шаўковыя, баваўняныя і ваўняныя панчохі. На суконнай (у 1778 мела 24 станкі) – розныя сукны і камлот (ваўняная тканіна з дамешкам шаўковай або баваўнянай ніткі), якія пастаўляліся каралеўскаму двару. На карункавай і залататкацкай мануфактуры плялі каштоўныя карункі, выраблялі залатую і срэбную ніткі, галуны, ордыны і рабілі некаторыя ювелірныя вырабы. На карэтна-экіпажнай мануфактуры працавалі каля 50 працаўнікоў (1778), сярод іх вядомыя: сталяр з Галандыі, адзін з лепшых парыжскіх майстроў экіпажаў, якога браты *Бекю* здолелі выцягнуць з Бастыліі, лакіроўшчык,

італьянец Сальвеці, маляр Бартэлман з Брабанта. Яны майстравалі “экіпажы накшталт парыжскіх”. На шоўкаткацкай мануфактуры (у 1778 мела 62 станкі) выраблялі шаўковыя матэрыі, гладкі і ўзорчаты аксаміт, камізэлькі, жупаны, стужкі, хусткі, шалі, атлас, габелены, а таксама “літыя” паясы, падобныя да слуцкіх. У іх вытворчасці прымалі ўдзел мастакі і майстры з Італіі, Францыі (напрыклад, дырэктар фабрыкі Дзюпіней; майстар Францішак Селіма з Ліёна). Яны ўнеслі ў вытворчасць “гарадніцкіх” паясоў заходнееўрапейскія метады тэхналогіі і ўсходнія матывы арнамента ў сярэдняй частцы і ва ўзорах на канцах паясоў. Металаапрацоўчая мануфактура выпускала вырабы з жалеза і медзі: цвікі, іголкі, дзвярныя завесы, замкі, шпількі, лапаты, напільнікі. На палатнянай мануфактуры выраблялі палатно для абрусаў і сурвэтак, муслін, батыст. Тут працаваў з 1780 г. ткач з Ноўгарада, майстры са Швейцарыі.

Ворсавыя дываны і шпалеры рабілі на дывановай мануфактуры. Дываны вызначаліся прыгажосцю кампазіцыі і высокай тэхнікай ткацтва. На пераважна блакітным або залацістым полі раскіданыя букеты, вазоны і кошыкі з кветкамі. На мануфактуры пацерак выраблялі, акрамя ўласна пацерак, шкляны посуд: бакалы, келіхі, пляшкі і штофы ў традыцыйных для Беларусі формах чатырохгранных квартаў. Посуд упрыгожваўся гравіроўкай у выглядзе пейзажаў, выяваў людзей і птушак, вензеляў. На працу ў бровары Тызенгаўз запрасіў піваварaў і саладоўнікаў з Чэхіі. Пабудавалі будынкі, набылі посуд і абсталяванне. На вывучку да замежных спецыялістаў Тызенгаўз даў сваіх сялян, а таксама добраахвотнікаў. Калі яны навучыліся варыць “здаровае, смачнае, пажыўнае” піва, дык раз’ехаліся па ўсім ВКЛ і сталі настаўнікамі для іншых.

Як бачым, асноўнымі таварамі тызенгаўзаўскіх мануфактур былі прадметы раскошы. Гэта было незнарок. Падскарбі разумеў, што пры натуральнай гаспадарцы ў сялянскіх дварах і маёнтках уласнікаў выраблялася ўсе неабходнае. Магнаты і шляхта куплялі толькі каштоўныя рэчы, прычым замежнага паходжання. Тызенгаўз прапаноўваў сваё, часам лепшага гатунку, чым імпартнае, праўда, даражэйшае з-за высокіх коштаў замежнай сыравіны і аплаты працы іншаземных майстроў.

У кракаўскай навуковай бібліятэцы ПАУ і ПАН захоўваюцца дакументы, якія гавораць пра дзейнасць мануфактур і пасля адстаўкі Тызенгаўза: кантракт ад 1787 г. Станіслава Панятоўскага з Я. Бекю на арэнду мануфактур; рахункі з касы мануфактур за 1787–1788; ёсць дакументы аб працы фабрыкі сукна, фарбавальні, млына, фолюшаў у Ласосне, аб каралеўскім прывілеі 1790 г. на загадванне мануфактурамі, атрыманым харунжым літоўскім А. Валовічам і падкаморым М. Бадэні.

Літ.: Гардзееў Ю. Падскарбі літоўскі надворны А. Тызенгаўз і яго рэформы ў Гродне (2-я палова XVIII ст.) // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 2. – Гродна: ИПК, 1996. – С. 18–32; Квитницкая Е.Д. Строительство Тизенгауза в Гродно // Строительство и архитектура Белоруссии. – 1988. – № 17. – С. 22–42; Швед В.В. “Квітнеючая Галандыя” на Нёмане // Швед В.В., Госцеў А.П. Горадня. Аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.). – Гродна: Пергамент, 1997. – С. 68–78; Hardziejeu J. Źródła do

dziejów Grodna w zbiorach krakowskich. Wstęp do badań // Pogranicze polsko-litewsko-białoruskie. Źródła historyczne – stan badań. – Białystok: wyd-wo "Prymat", 2003. – S. 29; Biblioteka Jagiellońska, Rkp.6315.III, k. 1–22, 57–59; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 338–340, 689, 880.

Мараўскі – адстаўны капітан, гродзенскі фотамайстар. Яго фатаграфія знаходзілася на вул. Мураўёва (цяпер Ажэшкі) з 1898 па 1907. Дазвол на адкрыццё фотамайстэрні атрымаў 19.03.1898 ст. ст.

Мараўскі Дамінік (каля 1760, Вялікапольна – 4.06.1801, Вільня) – акцёр, дырэктар тэатраў. Пачынаў кар'еру ў трупе *Багуслаўскага В.* у Вільні (каля 1785). Пасля шлюбу з Марыяннай з роду Карвалаў у 1787–1788 вялі тэатр у Мінску, выступалі ў Вільні, Любліне, Гродне, Львове. У сезоне 1792 М. граў у Вільні ў трупе Жакеўскага і Г. Кваснеўскага, паспрачаўся і збег разам з актрысай Тэкляй Міладаўскай у Гродна і тут з вясны 1793 г. да 12.10.1793 арганізаваў і вёў тэатр. Падчас *паўстання 1794* г. быў у Львове ў таварыстве акцёраў, створаным Багуслаўскім В. Адтуль пераехаў у Вільню і ездзіў выступаць у жніўні 1795 у Гродна разам з акцёрамі *Шыманскага Я.* (да вясны 1796). Умеў спалучыць тэатральныя амбіцыі з добрай арганізацыяй. Поспехі садзейнічалі пакупцы дома па вул. Маставой у 1783 (з 1678 зямельны пляц з домам належаў троцкаму ваяводзе *Агінскаму*). Ставіў галоўным чынам спектаклі на актуальныя падзеі, напрыклад, "Вяртанне пасла" Нямцэвіча, "Доказ удзячнасці народа", "Генрык VI на паляванні" Багуслаўскага В. Пасля Гродна, па адных дадзеных, М. пераехаў з тэатрам у Вільню (час паўстання), па іншых – адразу паехаў у Львоў у 1793 і вёў невялікую трупу акцёраў, якія прыехалі з Варшавы. Дапамог Багуслаўскаму (Нацыянальнаму тэатру), калі той у 12.1794 прыехаў у Львоў. Заставаўся са сваімі акцёрамі ў яго трупе да мая 1795 г. Вярнуўся ў Гродна, дзе пасля трэцяга *падзелу Рэчы Паспалітай* знаходзілася *Праўленне Вярхоўнае літоўскае.* Пачаў выступаць з мясцовай трупаю Яна Шыманскага. Вясной 1796 вырашыў зарганізаваць тэатр у Вільні, куды пераехала адміністрацыя ВКЛ. За 40 дукатаў выкупіў руіны радзівілаўскага палаца (вул. Віленская, 47) для польскага тэатра. Восенню ўжо пачаліся прадстаўленні (на ўзроўні не меншым, чым на варшаўскай сцэне) – 100 пастановак у сезон: драма, оперы.

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. – Lwów. T. I, c. 398, 400, 408; T. II, 1925. – S. 398, 400; Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 323; Nowy Korbut. T. 4, s. 183; Renikowa W., Tradycje teatralne Grodna // Wilno i kresy Północno-Wschodnie. T. II. Kultura i trwanie., Białystok 1906, s. 136; Літ.: Obiasnienie interesu Miasta Sejmowego J.K.Mci Grodna. – Grodno, 1789. – S. 25.

Мараш Якаў Навумавіч (7.01.1917, Гродна – 25.09.1990, Гродна) – карэнны жыхар Гродна, рэлігіязнавец, краязнавец Гродзеншчыны. Доктар гістарычных навук (1971). Прафесар кафедры гісторыі БССР *Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта* (1972). Скончыў *гімназію* гродзенскую (1936), гістарычныя

факультэты Вільні і Львова (1939). Працаваў настаўнікам гісторыі на Украіне і ў Расіі. У Гродна вярнуўся пасля *вайны Другой сусветнай* (1945). Працаваў настаўнікам, дырэктарам СШ № 2, загадчыкам педагагічным кабінетам гарадскога аддзела адукацыі, старэйшым выкладчыкам педінстытута (з 1946, але ў снежні забаранілі чытаць гісторыю). У 1954 абараніў у БДУ кандыдацкую дысертацыю "Агрэсія каталіцызма і Ватыкана ў Літве і Беларусі ў канцы XVI – пачатку XVII стст.". Праз 6 гадоў стаў дацэнтам. У 1968 вучоны савет БДУ абмеркаваў доктарскую дысертацыю "Ватыкан і Беларусь: Нарысы гісторыі экспансіі каталіцкай царквы ў Беларусі (1569–1795 гг.)", але абараніць яе М. змог толькі ў 1972 на вучоным савеце Інстытута гісторыі АН БССР (у ВАКу зацверджаная 27.12.1973). Каля 10 гадоў працаваў загадчыкам кафедры і дэканам гістарычнага факультэта педінстытута (з 1978 – *універсітэта*).

Аўтар звыш 20 манаграфій і вучэбных дапаможнікаў, 52 брашур і каля 500 артыкулаў. Навуковыя працы прысвечаныя гісторыі рэлігіі і атэізму, гістарычнаму краязнаўству, педагогіцы і методыцы выкладання ў вышэйшай і сярэдняй школе, даследчыцкай працы. Зразумела, што яны напісаныя на аснове марксісцка-ленінскай метадалогіі, ідэалагізаваныя і палітызаваныя. Але ў іх ёсць багаты і ўнікальны гістарычны матэрыял, яны таксама маюць пэўнае значэнне для разумення гісторыі касцёла ў Беларусі і распаўсюджвання ўніяцтва. М. заснаваў і да канца жыцця кіраваў гістарычна-краязнаўчым гуртком пры ўніверсітэце (з 1953). Узнагароджаны Ленінскім юбілейным медалём, значком "выдатнік народнай адукацыі БССР", ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі СССР і БССР. У *архіве дзяржаўным Гродзенскай вобласці* ёсць асабісты фонд М. (158 спраў).

Асноўныя працы: Из истории борьбы народных масс Белоруссии против экспансии католической церкви (Мн., 1969); Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569–1795) (Мн., 1971); Очерки экспансии католической церкви в Белоруссии XVIII в. (Мн., 1974); Политика Ватикана и католической церкви Западной Белоруссии (1918–1939); Студенческий научно-исследовательский кружок (Мн., 1976, 1989).

Літ.: Батвіннік М. Якаў Навумавіч Мараш (1917–1990). // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 1. – С. 185–190; Гостев А.П., Известные личности Гродно. – Гродно, 2016. – С. 116–124; Постаці ў гісторыі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы: гіст. нарыс / аўтар-складальнік праф. В.П. Таранцей. – Гродна: ГрДУ, 2005. – С. 36–40; Педагог, вучоны, інтэрнацыяналіст // Гродзенскі універсітэт. – 1990. – 16.10. – С. 3.

Марголіс Вольф – галоўны рабін у Гродне на працягу 27 гадоў (прыкладна з 1881 па 1908), затым служыў 4 гады ў Бостане, 10 гадоў у Нью-Ёрку.

Літ.: Супрон М. Гародня на старонках "The New York Times". 1853–1921. // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: зборнік навуковых артыкулаў / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 105.

Маркевіч з Мазуйскіх Юзаф (? – 3.02.1791) – каморнік Віленскага ваяводства, "землямер Яго Каралеўскай Высокасці", кіраўнік школы землямераў у Горадні. Верагодна вучыўся ў калегіуме Кафедры практычнай геаметрыі Кракаўскай акадэміі. З 1765 г. 24 гады служыў землямерам у *эканоміі Гарадзенскай*. Яго задачай было памераць усе грунты літоўскіх каралеўскіх маёнткаў, перапісаць сялян, перамераць палі ўсіх гаспадароў, вылічыць падаткі сялян. У інскрыпцыі (пахавальнай пліце), якая знаходзіцца ў касцёле бернардзінскім, напісана: "здзяйсняў пільна і дабрачынна свае абавязкі (…) якім быў у душы, так і да ўсіх ставіўся, праўду без злосці і страху казаў, тыя, хто з яго цнот паўсталі, гэта пасведчанне верна яму напісалі". Зрабіў мапу эканоміі гарадзенскай (каля 1781), на якой ёсць і ягоны партрэт з надпісам на латыні "Адзіны адпачынак ад хлусні", што, верагодна, звязана са складанымі адносінамі яго з *Тызенгаўзам А*. (той сістэматычна не плаціў зароблены ім грошы). Акрамя названай мапы М. зрабіў: план ключа вігерскіх камедулаў (1768; цяпер Вігры ў Польшчы); мапу *Гарадніцы* з пабудаванымі мануфактурамі (1769); Мапу Крынскай губерні (1780); мапу Сакольскай губ. (каля 1780); мапу Гродна (1780), на якой прадставіў вуліцы, гарадскую фартыфікацыю, маёмасць казённую, гарадскую, ваяводскую, жыдоўскага *кагалу*, касцельную (яны пазначаныя каля 700 нумарамі, і на мапе ёсць спіс гаспадароў пляцаў); мапу агульную Аліцкай эканоміі (1781).

Літ.: Дзянісава К., Інскрыпцыі ў гарадзенскім касцёле Адшукання Святога Крыжа // Arche. – 2014. – № 11 (132). – С. 207; Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 79; Moroz M. Józef Markiewicz – komornik województwa Wielezskiego (2 połowa XVIII wieku) // Europa Orientalis. Polska i jej wschodni sąsiedzi od średniowiecza po współczesność. – Toruń, 1996.– S. 209–230; Moroz M. Działalność Józefa Markiewicza w Ekonomii Grodzieńskiej za rządów Antoniego Tyzenhauza // Białostocczyzna. – 1998. – № 1. – S. 15–28.

Маркевіч Юзаф Янавіч – удзельнік *паўстання 1863 г.*, меў 29 гадоў, нарадзіўся ў Мінскай губ., вучыўся ў Віленскай гімназіі і Маскоўскім універсітэце, які скончыў са ступенню доктара медыцыны. З 1860 г. – штатны ўрач гродзенскай гарадской лячэбніцы. 6.11.1861 у *Фарным касцёле* спяваў забароненую "Serdeczna Matko". Абвінавачваўся паводле паказанняў *Э. Заблоцкага* ў тым, што збіраў грошы для паўстанцаў. Не прызнаўся ў гэтым, але сказаў, што аднойчы збіраў грошы для бедных асоб, якіх высылалі ва ўнутраныя расійскія губерні. На сабраныя 100 руб. купілі вопратку і абутак. Частка грошай была аддадзеная ссыльным з Каралеўства Польскага, якія праязджалі праз Гродна. Лічыў сваю дзейнасць дабрачыннай, а не палітычнай. Быў арыштаваны ў красавіку 1864 і сасланы ў Пермскую губ. Жыў на пасяленні ў Шадрынску разам з жонкай Валерыяй з Абламовічаў і дачкой Ганнай.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 69; с. 2, а. 438–441, воп. 1, с. 40, а. 11; Jodkowski. Rok 1863… // Echo Grodzieńskie. – 1921. – № 171. – S. 3.

Марцінкевіч Анатоль Іванавіч (1.07.1911, Гродна – 2.04.1973, Гродна) – выдатны гродзенскі спартсмен міжваеннага і пасляваеннага часу. Вучыўся ў *гімназіі* (1922–32), затым працаваў рахункаводам у гарадскім фінансавым аддзеле. Быў шматпрофільным спартсменам: штурханне ядра, кіданне дыска і кап'я, скачкі ў вышыню і даўжыню, фехтаванне на шаблях і шпагах, футбол. Удзельнічаў у гарадскіх і акруговых спаборніцтвах. Выступаў за спартыўны клуб ВКС "Гродна". Стаў арганізатарам адных з першых у горадзе спаборніцтваў па баскетболе. Пасля ўсталявання савецкай улады працаваў рабочым на чыгунцы, падчас нямецкай акупацыі – рахункаводам гарадскога фінаддзела, пасля *вайны Айчыннай* – бухгалтарам ва ўправе гродзенскай чыгункі, бухгалтарам і выкладчыкам баскетбола ў тэхнікуме фізічнай культуры (1945–57). Пасля заканчэння Беларускага інстытута фізічнай культуры (1955) працаваў (1957–59, 1964–73) у педагагічным інстытуце (гл. *Універсітэт гродзенскі*), культасветвучылішчы (1958–60), дзіцячай спартыўнай школе (1960–64). Падрыхтаваў чэмпіёна Алімпійскіх гульняў *Ядэшка І.,* прызёраў міжнародных і нацыянальных чэмпіянатаў па баскетболе. Заслужаны трэнер БССР (1961).

Літ.: Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Куалы: біяграфічны даведнік. – Гродна, 1999. – С. 328–329; Пяткевіч А. Людзі культуры з Гродзеншчыны. – Гродна, 2000. – С. 203–204; Саяпин В. Гродненский спорт: история и достижения. 1919–1939 годы. Гродна: ЮрСаПринт, 2015. – С. 186–187.

Марцінчык Мікалай (1901, в. Кубельнікі, зараз Бераставіцкага раёна – 1980, Гродна) – урач, беларускі грамадска-палітычны дзеяч у Заходняй Беларусі. Адзін з заснавальнікаў Беларускага студэнцкага саюза (1921), рэдактар часопіса "Студэнцкая думка". У 1925 удзельнічаў ва ўстаноўчай канферэнцыі па стварэнні БСРГ, стаў сакратаром, а з 1934 – намеснікам старшыні Галоўнай управы Таварыства беларускай школы. Пасля заканчэння Віленскага ўніверсітэта ў 1927 выкладаў хімію і анатомію ў Віленскай беларускай гімназіі і працаваў лекарам у педыятрычнай клініцы Віленскага ўніверсітэта. У перыяд выбарчай кампаніі 1927–28 дапамог стварыць беларускую дэпутацкую фракцыю "Змаганне". На выбарах 1928 і 1930 вылучаўся кандыдатам у паслы польскага сейма. У 1927 і 1930 арыштоўваўся польскімі ўладамі, а ў 1931 быў высланы пад нагляд паліцыі ў в. Нараўка Беластоцкага ваяводства, дзе сустрэўся са сваёй будучай жонкай Кацярынай. Пасля абвінавачванняў Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі ў 1930-х гадах, прэсай Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі ў супрацоўніцтве з польскімі ўладамі, у спробах звярнуць ТБШ са шляху нацыянальна-вызваленчай барацьбы адышоў ад грамадска-палітычнай дзейнасці. З 1944 г. працаваў галоўным урачом інфекцыйнай бальніцы ў Гродне. У 1948 быў арыштаваны і 12.03.1949 сасланы на 10 гадоў лагераў ў Варкуце. Працаваў там лекарам да амністыі ў 1956. Вярнуўся ў Гродна і працаваў у абласной бальніцы. У 1960-я гады жыў у будынку былой сядзібы Корпуса аховы памежжа на сённяшняй вул. Лермантава, 8. Падтрымоўваў стасункі з *Карпюком А.*, Геніюш Л., *Верас Зоськай*. У 1963 зарганізаваў у Гродне выступленне славутага беларускага спевака з Чэхаславакіі М. Забэйды-Суміцкага. Пакінуў успаміны.

Літ.: Астраўцова І. Вядомы тэнар лячыўся пісьмамі // Биржа инфармации. – 2001. – 11.01. – С. 5; Зусім іншы горад /Уклад. А.Ф. Вашкевіч, Т.У. Касатая. – Гродна: ТАА "ЮрСаПрынт", 2017. – С. 59–66; Ігнатовіч Ф. Мікалай Марцінчык (1901–1980) як лекар і дзеяч беларускага нацыянальнага руху ў Заходняй Беларусі //Гарадзенскі палімпсест. 2012. – Гродна, 2013; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 59; Успаміны пра старую Гародню і гарадзенцаў // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Выпуск 9 (2014) / рэд. І. Соркіна [і інш.]. – Гродна, 2014. – С. 38, 44.

Маршалак павятовы – выбіраўся на паседжанні павятовага *дваранскага сходу* з асоб добранадзейных, здольных і строгай маральнасці. Згодна з заканадаўствам асноўным абавязкам меў загадванне ўнутранымі справамі шляхецкай карпарацыі: кіраўніцтва правядзеннем сходаў, апека над сіротамі і хворымі, выдача пасведчанняў аб дваранскім паходжанні і інш. На практыцы М. п. былі актыўнымі дзеячамі мясцовай адміністрацыйнай улады: старшынствавалі на паседжаннях павятовых дарожна-будаўнічых, харчовых ды інш. камітэтаў і камісій, збіралі для начальнікаў губерняў статыстычны матэрыял аб ураджайнасці, цэнах на харчаванне і будаўнічыя матэрыялы, аплаце падаткаў і г. д., выконвалі даручэнні губернатараў.

Вядомыя наступныя маршалкі гродзенскага павета: Васіль Палубінскі і Ежы Міхалавіч Тышкевіч (былі ў 15 ст.), Станіслаў Гінвіл Пятроўскі (канец 15 – пачатак 16 ст.), Крыштаф Бухавецкі (канец 16 – пач. 17 ст.), Ян Александровіч (пач. 17 ст.), Фёдар Масальскі (1613), Рыгор Масальскі (1632), Кердзей (1660), Уладыслаў Кердзей Радзіваноўскі (1 палова 17 ст.).

Літ.: Токць С. Шляхецкае самакіраванне ў Гродзенскай губерні (пачатак XIX ст. – 60-я гады XIX ст.) // Białoruskie Zeszyty historyczne. – Białystok, 1997. – s. 15; Швед. В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гродна: ГрГУ, 2001. – С. 128; Compendium, s. 25, 50, 114, 141, 171, 194, 295.

Маршалак губернскі – выбіраўся на паседжанні губернскага *дваранскага сходу,* таксама як павятовы з асоб добранадзейных, здольных і строгай маральнасці. Павінен быў дакладаваць у МУС "шчыра і адкрыта аб усім, што можа спрыяць выкананню дабрачынных жаданняў Яго Імператарскай Вялікасці".

Крын. і літ.: Полное собрание законов Российской империи. – Спб., 1830. Т. 24. – С. 319; Швед. В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гродна: ГрГУ, 2001. – С. 128.

Марэлі Казіма/Казімір Аўгусціна, прыехаў у *Горадню* ў 1779 г. з Балоннi разам з жонкай Ганнай. Апошняя была ў той час ужо вядомай танцоўшчыцай, прафесійную кар'еру пачала ў свайго сваяка харэографа *Д. Саламоні* і ў вялікага Ж. Ж. Новера. Разам з апошнім і сваім мужам Казімам яна ў 1771–75 выступала ў Мілане, Празе, Дрэздэне, Варшаве. Пасля гэтага сужэнцы Марэлі

і прыехалі ў Горадню, прыняўшы запрашэнне *Тызенгаўза А.* Для іх *Сака Дж.* пабудаваў на *Гарадніцы* дом. Ганна стала выхавацелем балерын і балетмайстрам-рэпетытарам, Казіма ставіў балеты і італьянскія камедыі, сачыў за рэпертуарам *тэатра.* Адносіны М. з Тызенгаўзам не склаліся добра, і Ганна ў 1779 збегла ў Варшаву (прыняла ўдзел у балеце "Філосаф у краіне, або вораг жанчыны"), а Казіму не ўдалося – ён быў арыштаваны за парушэнне кантракта і пасаджаны ў гарадзенскую *турму.* Толькі дзякуючы *Станіславу Аўгусту Панятоўскаму* яго выпусцілі ў 1780, але прымусілі выконваць умовы кантракта. Хутка і сам Тызенгаўз патрапіў у нямілась вялікага князя і караля польскага. А М. выехаў у Варшаву, магчыма, з балетнай трупай і капэлай, якую Тызенгаўз на 2 гады перадаваў антрэпрэнеру "Нацыянальнага тэатра". У 1781 М. дае ў Варшаве 3 пастаноўкі гарадзенскага балета (між іншых "Берліх, або шчаслівы і няшчасны Банер") і пазней выязджае ў Венецыю для пошуку акцёраў для Варшавы. Але ў 1782 ён ужо ў Маскве, займаецца педагагічнай працай і разам з братам ставіць камічныя балеты на сцэне Пятроўскага тэатра. У 1791 М. вяртаецца ў Венецыю і працуе балетмайстрам.

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. – Lwów. T. II, 1925. – S. 325, 335; Барышев Г. И. Театральная культура Белоруссии XVIII века. – Мн., 1992, с. 204–205.

Масальскі Станіслаў (?–1670) – падкаморы гродзенскі, палкоўнік войск ВКЛ. Падчас вайны 1654–1667 перайшоў на расійскі бок разам з гродзенскім паспалітым рушэннем і захапіў *эканомію каралеўскую гродзенскую*. У 1658 вярнуўся да караля, які яго прабачыў, і трымаў у аблозе Гродна, занятае расійскім войскам. У 1659 стаў падкаморыем гарадзенскага павета, быў паслом на *сеймы* 1661 і 1662 гг. У 1667 быў дэпутатам *Галоўнага Трыбунала ВКЛ.* Удзельнічаў у бітве са шведамі пад Цяхоцінам.

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 304.

Масальскія – магнацкі род, які меў у Гродне і пав. свае зямельныя валоданні. Звесткі пра гэта ёсць з 1593 г., калі, верагодна, маршалак Гродзенскага пав. князь Фёдар Іванавіч М. меў нерухомыя валоданні на так званым Кургане, паміж Дзям'янаўскай ды Бернардзінскай вул., а таксама на вул. Віленскай (пазбавіўся ад яго ў другой пал. XVI ст.). Брэсцкія ваяводы Андрэй і Станіслаў Масальскія былі ўласнікамі пляцаў на *Рынку* (да 1655); адным участкам тут валодаў да 1738 мсціслаўскі ваявода Міхал М., а сядзібу ў 1730–40-х гадах меў літоўскі абозны Казімір М. На працягу XVIII ст. геаграфія гарадзенскіх уладанняў М. змянілася: яны пазбавіліся пляцаў на Рынку і набылі землі ў прызамкавым квартале. Гарадзенскі *староста* Міхал Юзаф М. набыў валоданні на вул. Замкавай і на рагу з вул. Цеснай Жыдоўскай пабудаваў свой двор. У 1744–1751 адкупіў у *яўрэяў* 4 пляцы, якія месціліся на паўночным баку Замкавай вул., і шэраг пляцаў у завулку, які злучаў вул. Замкавую і Маставую.

Віленскі біскуп Ігнацы М. у 1781–1795 валодаў пляцамі на Рынку і на вуліцах Віленскай, Калюцінскай, Златарскай – усяго ў канцы XVIII ст. 40–45 пляцаў. Апошняй уласніцай гарадзенскіх зямельных уладанняў была ў 1795 г. княгіня Апалонія Алена дэ Лінье з дому Масальскіх.

Крын. і літ.: Гардзееў Ю. Гродзенскі рынак у XVI-XVIII ст. (праблемы сацыятапаграфічнага развіцця) / Ю. Гардзееў // Краязнаўчыя запіскі. – 2000. – № 5. – С. 80–105; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2008. – С. 218–220, 326; Швед В.В. Беларуская карчма – заезны дом для падарожнікаў (XIV – пачатак XX ст.) w: Nowe wyzwania gospodarki turystycznej na poziome lokalnym, regionalnym i międzynarodowym, Białystok 2011, s. 69–81; Olechnowicz. Archiwa rodowe i osobiste w Litewskim państwowym archiwum historycznym// Miscelanea historico-archivistica. T.IX. – Warszawa, 1998. – s. 151; Obiasnienie interesu Miasta Sejmowego J.K.Mci Grodna. – Grodno, 1789. – S. 10–13.

Масонства – геаграфічна распаўсюджаныя і ўплывовыя тайныя аб'яднанні, арганізаваныя на аснове статутных дакументаў, выданых "Вялікай ложай Англіі" ці ложамі, створанымі ёю, і якія маюць у якасці асновы арганізацыйнай структуры ложы, сябры якой надзеленыя вызначанымі ступенямі пасвячэння ў яе справы ды праводзяць свае паседжанні ў адпаведнасці з рытуалам, які прадпісаны абраным імі абрадам масонства. Першай масонскай ложай у Гродне была ложа пад назваю "Шчаслівае вызваленне на Усходзе Гродна". Яна ўзнікла ў 1781 г., была правінцыяльнай і працавала на французскай мове (адсюль паводле дакументаў ложы яе назва "L'beureuse Delivrance"). Гэты скарочаны надпіс маецца і на авальнай пячатцы ложы (адбітак яе захаваўся на дакуменце за 17.02.1782 у бібліятэцы Польскай акадэміі мастацтва). У бібліятэцы АН Літвы ёсць пергамент з подпісамі 17 братоў ложы "Шчаслівае вызваленне на Усходзе Гродна", якія даверылі А. Годзіну прадстаўляць іх у ложы "Дасканалай Еднасці на Усходзе Вільні". Майстрам кафедры быў знакаміты *Ж.-Э. Жылібер*, намеснікам – *Бекю Якуб,* казначэем – *Бекю Ж.-Л.*, сакратаром – Ф. Шрайбер. Колькі існавала ложа, сказаць цяжка, бо нават такі вядомы польскі даследчык, як С. Малахоўскі-Лэмпіцкі, і той памыляецца: то піша, што яна перастала працаваць "яшчэ ў XVIII ст.", то дае спіс членаў ложы, дзе паказвае 1820–1821 гады знаходжання. Ёсць факт перадачы Вялікім Усходам імя гродзенскай ложы Нясвіжскай ложы "Шчаслівага вызвалення" 4.08.1810. У Гродне захаваўся дом масонаў, рэзідэнцыя архітэктара *Сака Джузэпэ*, які быў масонам першай гродзенскай ложы.

У 1817 г. узнікла наступная масонская ложа "Сябры Чалавецтва на Усходзе Гродна". Назва ложы паходзіць са Статута масонаў, дзе адзначаецца, што акрамя Айчыны ёсць чалавечнасць: "Увесь свет ёсць Айчына Вольнага Муляра, а ўсё, што тычыцца чалавека, не з'яўляецца для яго чужым". Статут запрашаў масонаў "электрычнай іскрай чалавечнасці агарнуць усіх людзей і ўсе краіны". Галоўным ініцыятарам, заснавальнікам і першым майстрам кафедры ложы "Сябры Чалавецтва" быў былы маршалак Гродзенскай губерні, масон VII ступені Калікст Межаеўскі. Ягонымі памочнікамі сталі: *Ігнацы Ляхніцкі* (з 1820

майстар ложы) і ягоны пляменнік камер-юнкер *Ігнацы Эмануэль Ляхніцкі*. Ложа "Сябры Чалавецтва" была сімвалічнай, бо вяла працы ў першых трох ступенях: вучня, чалядніка і майстра. Інакш такія ложы звaліся янаўскімі, у гонар свайго патрона св. Яна, якога Вялікі Будаўнік Свету Ягова паслаў для асветы людзей, якія знаходзяцца ў цемры і цені смерці. А яшчэ ложы першых двух ступеняў называліся блакітнымі, бо сцены ложы (памяшкання) і фартухі братоў (сябраў ложы) былі такога колеру. Навука масонаў сімвалічных ложаў складалася з выпрацавання 7 абавязкаў: даверу, шчырасці, міласэрнасці да бедных, паслухмянасці, лагоднасці, адвагі і маўчання.

Ложа "Сябры Чалавецтва" падпарадкоўвалася правінцыйнай ложы "Дасканалая Еднасць на Усходзе Вільні". Пра гэта сведчыць і пячатка апошняй: на адным са шчытоў сімвал гродзенскай ложы – P. L. ("Przyjaciele Ludzkosci"). Прадстаўнік (дэпутат) ложы ўваходзіў у Вялікі Усход Польшчы і Літвы. У 1819 ім быў старшыня ламжынскага грамадзянскага трыбунала Віктар Рэмбелінскі. У 1821 у ложы было 146 братоў: 93 дзейных і 53 ганаровых. Сярод першых найбольш было масонаў II (20 братоў), III (37) і IV (10) ступеняў, 9 масонаў мела I ступень, а 6 – V. Сярод ганаровых пераважвалі браты VII ступені (22), напалову менш было масонаў III ступені (11), масонаў IV ступені было 8, V – 9, VI – 3. Па сацыяльнай прыналежнасці расклад наступны: 98 чыноўнікаў, 24 вайскоўцы, 9 інтэлігентаў, 11 чалавек, статус якіх невядомы.

У 1820–1821 майстрам кафедры ложы "Сябры Чалавецтва" быў былы гродзенскі *губернатар Міхал Тадэвушавіч Бутаўт-Андрайковіч* (1778–1830), масон V ступені. Пасаду прамоўцы займалі ў 1821 масоны III і IV ступеняў, адпаведна адвакат гродзенскага галоўнага суда Бенедыкт Паўлоўскі і асэсар гэтага ж суда Дамінік Вітаноўскі. Падскарбіем быў скарбнік агульнай апекі Юзаф Нелюбовіч. Суддзёю да 1821 г. – А. Елец, а пасля – В. Вітаноўскі. Губернскі межавы суддзя, масон III ступені Рамуальд Данкевіч выконваў абавязкі ялмужніка. Пасады майстра, прамоўцы і ялмужніка былі выбарныя. На прызначаных пасадах у 1821 г. былі наступныя браты ложы: сакратаром – пісар гродзенскага магістрата, масон III ступені Антоні Жышкевіч; майстрам абрадаў – сакратар гродзенскай скарбавай палаты, масон III ступені Станіслаў Далінскі; першым (эканамічным) і другім (абрадавым) сцюартамі – абываталі Гродна, масоны III ступені Мікалай Рабі і Ян Міхаэліс; дзве пасады, пячатачніка і архівіста, сумяшчаў рэгент гродзенскага галоўнага суда, масон IV ступені Ян Нелюбовіч; будаўніком-рахункаводам быў былы палкоўнік Войска польскага, масон III ступені Ян Загорскі.

Сярод ганаровых братоў "Сяброў Чалавецтва" былі: масон VII ступені Ян Ходзька; Вялікі ялмужнік, дзяржаўны рэферэндар Аўгусцін Глінскі; масон VII ступені, прафесар Віленскага універсітэта Эрнэст Гродэк; сябра Дзяржаўнага савета, тайны саветнік, масон VII ступені князь Ф. Друцкі-Любецкі; саветнік Дзяржсавета, масон VII ступені С. С. Ланскі; жывапісец, сябра Санкт-Пецярбургскай Акадэміі Мастацтваў, масон III ступені Юзаф Аляшкевіч і іншыя. Гродзенская ложа "Сябры Чалавецтва" вылучалася дабрадзейнасцю, што "уплывала на ўвесь абшар Ордэна". Віленская правінцыйная ложа ставіла

яе іншым ложам, як прыклад узаемнай любові братоў, дапамогі іх адзін аднаму ў асветных працах, іх павагу да сваіх аднаверцаў, гатовасць ва ўсялякіх здарэннях прыйсці з парадаю і дапамогаю.

У 1818 г. доктар філасофіі і медыцыны, масон віленскай ложы "Стараннага літвіна" Я. Шымкевіч задумаў рэформу масонства з мэтаю наблізіць яго да шырокага грамадства. 16 сакавіка 1818 К. Контрым выступіў на паседжанні ложы з прамоваю, у якой крытыкаваў значную сімволіку і абраднасць, за якой хаваецца ідэйная пустэча, гаварыў, што сярэднявечная арганізацыйная форма не адпавядае рэчаіснасці XIX ст. і паралізуе дзейнасць. Контрым выказваўся за пераўтварэнне ложы ў "паўлегальнае навукова-дабрачыннае таварыства, падпарадкаванае адукацыйным уладам краю". Майстар гродзенскай ложы М. Бутаўт-Андрайковіч выступіў супраць праекта Шымкевіча і Контрыма. У сваім выступе ён ахарактэрызаваў яго "як нікуды нягодную і адарваную ад глебы тэорыю" і прасіў пакінуць у спакоі "старое масонства", а калі ёсць моцнае жаданне, дык стварыць якую-небудзь новую арганізацыю. Браты ложы "Сябры Чалавецтва" засталіся працаваць па "старых чарцяжах".

У жніўні 1821 г. выйшаў указ *Аляксандра I* аб закрыцці масонскіх лож і тайных таварыстваў. 25 верасня 1821 на апошняй сесіі Вялікага Усходу Польскага ўсе ложы былі закліканыя да паслухмянасці царскаму ўказу – яны павінны былі закрыць свае працы да 1 кастрычніка ў Варшаве і да 15 кастрычніка на правінцыі. Пасля гэтай даты яны будуць лічыцца незаконнымі. 1 жніўня 1822 царскі ўказ закрыў ложы па ўсёй Расійскай імперыі. Усе дзяржаўныя чыноўнікі, настаўнікі школ, прафесары, вайскоўцы павінныя былі даць падпіску аб непрыналежнасці да масонскіх і іншых тайных таварыстваў у краі ці за мяжой. У *архіве гродзенскім гістарычным* захавалася частка падпісак масонаў двух узораў: не належаў і належаў да такой та ложы, але цяпер і ў будучыні не буду належаць ні ў краі, ні за мяжой. Архіўныя матэрыялы гавораць пра тое, што ложа "Сяброў Чалавецтва на Усходзе Гродна" працягвала свае працы патаемна да пачатку 1840-х гадоў. *Ажэшка Э.* успамінала пра свайго бацьку Б. Паўлоўскага, вальтэрыянца. У 1838, паводле паказанняў вучня *гімназіі Гродзенскай* К. Бернарда, сакратар гродзенскага дэпутацкага сходу, калежскі асэсар Пятро Сіманоўскі запрашаў яго ўступіць у масонскую ложу, гаворачы, што мэта масонства – "імкненне да свабоды і дапамога бліжнім", даваў зборнік масонскіх песень, якія "усхвалялі годнасць і шляхетныя мэты ложы". У Гродне захаваўся дом масонаў, рэзідэнцыя архітэктара Сака Джузэпэ, які быў масонам першай гродзенскай ложы.

Літ.: Добрянский С.Ф. Очерки из истории масонства в Литве // Записки Северо-Западного отдела имп. Рус. географич. общества. Кн. 4., 1913 г. – Вильна, 1914. – С. 103–105, 119–122, 126, 130, 136, 166, 197; Швед В.В. Гродзенскія масонскія ложы (канец XIII-пач. XIX ст.) // Гарадзенскія запісы: Старонкі гісторыі і культуры. – Гародня: ГрДУ, 1997. – Вып. 3. – С. 64–77; Швед В.В., Ігнатовіч Ф.І. Урачы і аптэкары – члены гродзенскіх масонскіх лож (канец XVIII – пачатак XIX ст.) // История современные проблемы лекарственого обеспечения населения. – Гродно: б.и., 2000. – С. 37–41; Małachowski-Łempicki St. Wolnomularstwo na ziemiach dawnego WKL (1776–1822).

Dzieje i materiały. – Wilno, 1930. – S. 53; 54, 62–63, 68, 126; Małachowski-Łempicki St. Wykaz polskich lož wolnomularskich oraz ich członków w latach 1731–1821 // Archiwum komisji historycznej Polskiej Akademii Umiejętności. T. XIV. – Kraków, 1930. – Tablicy, 120–121, 126–134.



Масты праз Нёман. Даследчык М. Любаўскі піша пра драўляны мост, які злучаў горад з *Занёманскім прадмесцем* у 1486 г. М. складаўся з некалькі радоў бярвенняў, пакладзеных на 4 палі, умацаваных контрфорсамі. Шырыня моста дасягала 5–6 м, на канцы моста, перад уездам у горад стаяла вежа-брама. Казімір Ягелончык надаў у ліпені гэтага года прывілей Яцковічу на збор маставога мыта, а намесніку А. Юрэвічу наказаў наглядаць, каб ніхто не выкарыстоўваў іншыя сродкі пераправы. Невядома, ці гэта той самы мост, які згадваецца ў 1503 г. як сталы мост праз *Нёман* у часы вял. літ. кн. *Аляксандра Ягелончыка.* Быў ён драўляны на чатырох апорах, зробленых хутчэй за ўсё з дуба і запоўненых каменем, і стаяў прыблізна на тым самым месцы, дзе і так званы Стары мост. Невядома, колькі ён прастаяў, але пра гэты мост клапаціліся наступныя валадары: *Стэфан Баторы,* Жыгімонт III. Мост часоў апошняга відаць на *гравюры Аэльгаўзера-Цюнта 1568 г.* Даследчык дарог Беларусі А. Сардараў пісаў пра яго: "Пралётная пабудова моста была выкананая з некалькіх радоў бярвенняў. Яны абапіраліся на чатырохквадратныя апоры ў выглядзе драўляных зрубаў і чатыры пары нахіленых паляў". Магчыма, рэшткі гэтага моста (фрагменты слупоў і бэлькі) знайшоў падчас раскопак на Замкавым узвышшы *Дурчэўскі 3.* На *гравюры Т. Макоўскага 1613 г.* бачны наступны пастаянны *мост праз Нёман* 1600 г. (ці 1601). Ён стаяў трохі ніжэй, ля падножжа *замка Новага,* і меў 4 іншыя апоры, якія мелі драўляныя лёдарэзы (ільдзіны разбіваліся ад удару аб яго край). Акрамя таго мост атрымаў сцены і дах. У канцы моста была вежа, дзе знаходзілася мытня, якая збірала "маставое мыта" – плату за праезд па мосце.

С. 876

У дакументах 1632 згадваецца мост праз Нёман, які практычна разбураны. У 17 пастанове Варшаўскага сейма Рэчы Паспалітай успаміналася канстытуцыя сейма ад 1647 г., у якой гаварылася пра неабходнасць будаўніцтва мураванага моста праз Нёман за кошт прыбыткаў каралеўскага скарбу. Адзначалася таксама, што на гарадзенскім сеймiку гарадзенскія абывацелі пастанавілі сабраць пэўныя падаткі: 4 паборы і чопавае на адзін год. Збор грошай пачынаўся з 1.01.1648 і працягваўся 6 тыдняў. Паўтары тысячы злотых меліся даць мясцовыя *яўрэі. Пажары* 1650–60-х гадоў спынілі пабудову моста. Да яго вярнуліся зноў і 1.07.1690 вырашылі тры гады збіраць грошы (чопавыя і шэлежныя) з Гродна, яго *юрыдык*, Гродзенскага павета, духоўных і шляхецкіх маёнткаў, каралеўскай маёмасці на мост, які павінен "нармальна стаяць".

Падчас *вайны Паўночнай* рускія войскі, адыходзячы з Гродна ў 1706 г., спалілі мост (стары неадрамантаваны). Аўгуст II у 1710 выдаў універсал аб зборы грошай на пабудову "старога моста". У 1744 гродзенскі сеймік выказаў падзяку маршалку Гродзенскага пав. М. Александровічу за сабраныя 120 тыс. злотых (18 тыс. руб. срэбрам). Але пастаянны мост так і не пабудавалі. На

планах Гродна 1753, 1758, 1780–83, 1793, 1795, 1797 гадоў яго няма, паказаныя толькі пантонныя плашкоўтныя масты. У XIX ст. праз Нёман пабудавалі толькі мост металічны, чыгуначны.

У ваенную кампанію 1792 г. капітан інжынернага корпуса ВКЛ *Міхал Сакальніцкі* пабудаваў часовы пантонны мост на Нёмане. Ён меў форму дугі (наземнага лука), накіраванага ў супраціўны бок адносна кірунку плыні ракі. Складаўся з драўляных плытоў, баркі і судна пасярэдзіне дугі. Насціл і судны трымаліся канатамі з берагам. Насціл моста рабілі 120 чалавек на працягу 38 гадзін. У канцы чэрвеня па ім прайшла ўся армія ВКЛ з артылерыяй і абозам, а праз 9 дзён ад пабудовы мост быў разабраны (з дапамогай канатаў адцягнулі судна, а плыты такім жа чынам прыцягнулі да берагоў).

У *вайну 1812* г. *Платаў М.*, сыходзячы з Гродна, выстраламі з 12 гармат разбурыў і спаліў існы пантонны мост, а таму новая ўлада – *рада муніцыпальная* – прадугледжвала ў сваім бюджэце 40 тыс. злотых на яго адбудову. З яўрэем Ш. М. Рашбанам, які заключыў кантракт яшчэ з расійскай уладай, кантракт быў разарваны, і было пастаўленае пытанне аб аплаце ім патрэбных падаткаў.

Баброўскі П. у 1863 г. піша пра плывучы мост на 7 плашкоўтах з разводнай часткаю для пропуску суднаў. Даўжыня яго 53 ½ саж., шырыня – 5 саж. Вясной і восенню мост зніжаецца і зносіны падтрымліваюцца паромам на канаце, а зімой мост не наводзіцца. Відаць, пра гэты мост пісаў У. Сыракомля ў кніжцы "Niemen od źródeł do ujścia" (Wilno, 1861. – s. 41).

Новы мост, Аляксееўскі, Пятрова-Мікалаеўскі мост, мост імя Пілсудскага, Стары мост. Ён злучыў вул. Маставую і вул. Ліпавую/Гарнавых. Праект пастаяннага моста зрабіў у 1902–1905 гг. інжынер шляхоў зносін Падабыцаў (Подобыцов), а ў 1906–1907 яго збудавалі на месцы моста, які намаляваны на гравюры Цюнта (кіраўніком прац быў інжынер Э. Палазоўскі). На адной з апор (з боку Занёманскага прадмесця) ёсць дата "1907". Іспыты моста (праз яго праехалі тры цяжкія артылерыйскія батарэі) праходзілі пад наглядам прафесара-маставіка Белялюбскага. На будаўніцтва моста разам з падходамі-пад'ездамі было выдадзена 800 тыс. руб. (300 тыс. руб. земскіх, 500 тыс. – вайсковага ведамства, якое пагадзілася на будаўніцтва моста не ў Румлёва). Зямлю горад даў бескаштоўна. Стальныя канструкцыі для моста вырабіла фірма "Towarzystwo Fabryki Maszyn i Odlewów K. Rudzki i Spółka". Яе прадпрыемствы знаходзіліся ў Варшаве і Мінску Мазавецкім. Яна ж рабіла мантаж канструкцый. Мост меў даўжыню 164 м. 9.11.1910 імператар Мікалай II "за отличные результаты при постройке Петровско-Николаевского моста через реку Неман в городе Гродно объявил Высочайшую благодарность его Императорского Величества всем членам Гродненской Войсковой Строительной Комиссии, а также представителю Гродненского распорядительного комитета гражданскому инженеру, статскому советнику Н. В. *Романову* за отличное исполнение возложенных на них поручений". Канструкцыяй моста ў яго пралётах былі прадугледжаныя мінныя камеры. Сапёры рускай арміі выкарысталі іх

пры адыходзе падчас *вайны Першай сусветнай* і ўзарвалі Пятрова-Мікалаеўскі мост. Пераход у гэты час наладзілі па пантонным мосце.

У 1926 г. пастаянны мост быў адноўлены, але ён не вытрымліваў крыгалому, у 1934 рэканструяваны. Аўтарам праекта быў архітэктар і канструктар Браніслаў Пяроцкі. Брукаванае пакрыццё дарогі было замененае базальтавай чорнай брусчаткай. Асвятляўся мост электрычнымі ліхтарамі. У той час мост насіў імя *Пілсудскага Ю.,* і гэта была найвялікшая дарожная пераправа ў Беластоцкім ваяводстве. У 1944 нямецкія сапёры Стары мост узарвалі. У савецкі час рух на ім быў адкрыты 30.10.1950. На слупах агароджы быў зроблены надпіс "У дзясятую гадавіну аб'яднання беларусаў" (мост пачалі аднаўляць у 1949). У 2008 адбылася рэканструкцыя моста. Дарожнае палатно было пашыранае на адну паласу, ад старых канструкцый засталіся падтрымныя бэлькі і апоры, частка якіх стала карацейшай.

Новы мост, Мост будаўнікоў, які злучыў вул. Паповіча і вул. Вясеннюю быў пабудаваны ў 1971 г. Тэхналогія яго зборкі была наступнай: вялікія жалезабетонныя дэталі злучалі метадам склейвання спецыяльным клеем. Румлёўскі мост быў адчынены ў 1986, злучыўшы ўсходні прамысловы раён Гродна з мікрараёнамі *Румлёва* і Прынёманскі.

Чыгуначны мост праз Нёман пабудавалі ў 1857–1863 гг. (французскі інжынер Каліньён) у сувязі з пабудовай чыгункі Санкт-Пецярбург – Варшава. Трохпралётны мост меў 4 апоры (2 чыгунныя ў рэчышчы ракі, 2 каменныя на берагах). Пралёты былі зробленыя са сталёвых частак, замацаваных заклёпкамі. Вышыня моста – каля 15 сажаняў, а працягласць – каля 100 саж. У 1864 праведзеныя іспыты моста, а рэгулярны рух пачаўся ў 1867. Пра гэты мост пісаў К. Іваноўскі: яго бацька Станіслаў расказваў, як выкупіў мост ад знішчэння ў немцаў у 1919, калі яны хацелі ўзарваць яго перад наступам частак Чырвонай арміі. У 1926 мост быў адноўлены паводле праекта вайсковага інжынера Густава Нясецкага. Па канструкцыйных асаблівасцях і тэхналогіях ён нічым не адрозніваўся ад першапачатковага з 1867 г. У 1934 мост быў значна узмоцнены (перш за ўсё апоры) і стаў двухпутным. У 1944 нямецкія сапёры спрабавалі падарваць мост, але толькі пашкодзілі яго. Пасля невялікага рамонту ён у гэты ж год стаў забяспечваць рух цягнікоў. У савецкі перыяд мост двойчы рэканструяваўся без перапынку ў руху. Яшчэ адзін металічны чыгуначны мост быў пабудаваны ў 1880-х гадах праз р. *Ласасянку* пад Гроднам. У гэтым прымаў удзел выпускнік Інстытута інжынераў камунікацыі С. Белжэцкі, будучы прафесар Варшаўскай палітэхнікі.

Масты гарадскія – масты праз рачулкі *Гарадніцу*/*Гараднічанку* і *Юрыдыку*, ірвы. Адзін з мастоў гэтага прызначэння меў шмат назваў за час свайго існавання: "мост пры вінакурні Баніфратнай" (1828), "мост насупраць казённага саду па Язерскай вуліцы" (1840), "на рэчцы Гараднічанцы каля акруговай лякарні мост" (1855), "мост, які маецца каля Баніфратарскага бровара" (1855), Міхайлаўскі (з пачатку 1870-х). Узнік у 1770-я гады, верагодна, у часы рэформы *Тызенгаўза А.* Быў драўляным і ў XIX ст. некалькі разоў рамантаваўся, а ў 1892

спецыяльная камісія ў складзе: губернскі інжынер Небальсін, сябра губернскага распарадчага камітэта Архіпаў, губернскі архітэктар Залатароў і гродзенскі паліцмайстар Гардынскі пастанавілі, што лепш "пабудаваць каменны мост з адным пралётам над рэчышчам і з зямельнай дамбай па адхілах берагоў". Праект і каштарыс былі прадстаўленыя ў 1898, а да будаўніцтва прыступілі толькі ў 1913 г. Да вайны паспелі збудаваць. У 1939 у раёне моста апынуўся адзін з савецкіх танкаў, па якім адкрыла стральбу польская гармата з парку. У некаторых месцах была пашкоджаная металічная агароджа, што выявілася падчас рэканструкцыі моста ў 2008 г.

Архірэйскі мост праз ручай Юрыдыку быў пабудаваны падчас рэалізацыі рэформы Тызенгаўза А. у 1760–80 гг., ішоў да *дома віцэ-адміністратара*. У 1892 адбыўся рамонт на суму 1 106 руб. 4 кап., а ў 1895 – на 374 руб. 80 кап. Драўляная канструкцыя моста ляжала на каменных апорах, і толькі на пач. XX ст. была зменена на металічную. Бачны на малюнку *Н. Орды*. Губернатарскі мост праз Гараднічанку каля *парку імя Жылібера* першапачаткова пабудаваны ў часы Рэчы Паспалітай: "у трох зводах, з двума берагавымі і двума сярэднімі ўстоямі, з драўлянай падлогай на сярэдняй арцы". У расійскі час адчынены і асвечаны быў 15.08.1901. Кошт моста – 22 тыс. руб. Працамі кіраваў грамадзянскі інжынер *М. Б. Раманаў*.

Замкавы мост драўляны праз роў паміж *замкамі Старым* і *Новым*. Роў у той час быў прыблізна на 10 м глыбейшым, чым цяпер. Тэхнікай падземнай радыёлакацыі выяўлена, што апоры моста XII ст. былі па вышыні больш за 20 м. Адна з першых выяў знаходзіцца на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта*. Бачна, што патрапіць на мост можна было толькі прайшоўшы агароджаны *каралеўскі двор*, а каля брамы знаходзіліся вартаўнікі. Інвентар гродзенскага замка XVII ст. апісвае драўляны мост на каменных апорах. У сяр. XVIII ст. мост стаў цалкам каменным. У 1796 быў прадугледжаны рамонт моста, і выдзелена камісіяй Скарбовай 10 тыс. злотых. Для вартаўнікоў будавалася спецыяльнае памяшканне з левага боку ад уязной брамы. Апошняя зачынялася засовам на круках і завесах.

У 1863 г. існаваў Маскоўскі мост у канцы вул. Садовай (цяпер Ажэшкі), каля станцыі Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі. Быў таксама Марыінскі мост праз Гараднічанку каля старой бальніцы. Мост праз чыгунку, які злучае вул. Брыгіцкую са Скідзельскай шашой, прасіла гарадская рада пабудаваць Віленскую дырэкцыю чыгункі пастановай ад 15.03.1928 г.

Крын. і літ.: ДАГВ, ф. 46, фоп. 1, с. 14, а 26 адв.; с. 15, а. 12; НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 1, с. 112; ф. 8, воп. 1, с. 329, а. 8 адв.;ф. 1168, воп. 1, с. 3, а. 122; с. 5, а. 23 адв.; Бобровский П.О. Материалы для географии и статистики Российской империи, собранные офицерами Генеральнога штаба. Гродненская губерния. Ч. 1. – СПб., 1863. – С. 203–204, 209; Галубовіч В. Пастулаты Гродзенскага сойміка на Сойм 1646 г. // Гарадзенскі палімпсест. XII-XX стст. Матэрыялы міжн. канф. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Горадня-Беласток: ІГДБ (ЕГУ). – 2008. – С. 53; Гардзееў Ю. Гарадская прастора ў XVI – XVIII стст. // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 104; Гардзееў Ю., Цывільна-вайсковыя

парадкавыя камісіі ў Вялікім Княстве Літоўскім у часы Чатырохгадовага сойма (1789–1792). – Смаленск, 2014 – С. 386; Ивановский В. Мосты, соединившие столетия // Перспектива. – 2004. – 8 октября. – С. 19; Иващенко Н.А. Повседневная жизнь губернского города Гродно (XIX – начало XX века). – Гродно: ЮрСаПринт, 2019. – С. 52–55; Кітурка Ю.В. Крыніцы па гісторыі Гродзенскага каралеўскага палаца XVIII стагоддзя (Новага замка) // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 8. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2012. – С. 47–60; Любавский М. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого издания первого литовского статута. – М., 1892. – С. 174; Сардараў А.С., История и архитектура дорог Белоруссии. – Минск: Высшая школа, 1978. – С. 16; Саяпин В. О парке Жилибера и зоопарке Кохановского. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 10; Саяпин В. Маленькие мостики в Гродно. – Гродно: ЮрСаПрынт, 2012. – С. 25–33; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 57, 73–74; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С. 43; Трусов И., Пышинская Е. Гродненские мосты. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – 43 с.; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 28–29; Jankowski J., Mosty w Polsce i mostowcy Polscy (od czasów najdawniejszych do końca wojny Światowej). Wrocław, Warszawa: Wydawnictwo PAN, 1973. – S. 28, 30, 97, 174, 208–210, 254, 273; Jodkowski J. Jeszcze o dawnych mostach na Niemnie w Grodnie. – Grodno, 1930. S. 3–4; Jodkowski J. Nowy most na Niemnie w Grodnie. Z okazji ukończenia odbudowy stałego mostu kołowego. – Grodno, 1930; Liss A., Maćkowski K. Grodno. Miasto nad Niemnem. – Kraków: Bezdroża, 2005. – S. 54; Iwanowski K. Stanisław Iwanowski. Organizator Grodzieńskiej Obrony Obywatelskiej. 1918–1919. – Gdynia, Gdańsk: Oficyna wydawnicza I. Iwanowski, 2002. – S. 59; Teka Wileńska, II, s. 255, 310–315; Volumina legum. T. V, s. 400; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. I, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – С. 126–130.

Матацыкл “Нёман”, вырабляўся на “Крэсовай фабрыцы роварaў і матацыклаў “Нёман”, уладальнікамі якой былі Старавольскія Нохум (бацька) і Лазар (сын). Даследчык Ф. Акерман звяртае ўвагу на назву прадпрыемства: “Тым самым яны стваралі сувязь з самой ракой і міфам Крэсаў – рамантычна ўзнёслага вобразу ўсходніх ускраін, як польскай нацыянальнай святыні”. У 1930–1932 гг. прадпрымальнікі выкупілі будынак па вул. Брыгіцкай, 20 (зараз К. Маркса) і перабудавалі яго пад прамысловае прадпрыемства. У 1934, верагодна, пачаўся выпуск мотароваў з рухавіком 75 кв. см у мужчынскім і жаночым варыянтах. Яны камплектаваліся нямецкімі рухавікамі “Sachs”, электрычным абсталяваннем “Bosch”. Мотаровары былі разлічаныя на аднаго чалавека і развівалі хуткасць да 50 км/г. Першыя матацыклы з’явіліся ў 1936 і мелі аб’ём рухавіка каля 100 кубічных см (іх называлі “соткі”). Рухавікі былі англійскай маркі “Villiers”, а астатнія дэталі былі польскія. Максімальная хуткасць дасягала 70 км/г, расход паліва – 2,25 л на 100 км, дапушчальная нагрузка – 150 кг. У 1936 было выраблена 100 матацыклаў, а ў 1938 – 166. З 1939 пачалі выпускаць матацыклы з аб’ёмам рухавіка 125 і 150 кубічных см. Самы моцны матацыкл фабрыкі называўся 150DV і меў хуткасць 90 км/г, расход паліва – 2,8 л на 100 км, дапушчальная нагрузка – 250 кг. Матацыклы

прадаваліся не толькі ў Гродне, але і ў генеральным прадстаўніцтве прадпрыемства ў Варшаве на вул. Сенатарскай, 12, а таксама ў Кракаве і Познані. Таварным знакам фабрыкі “Нёман” была выява гродзенскага *Новага замка*. Матацыкламі карысталіся звычайныя грамадзяне, чыноўнікі, паштальёны, вайскоўцы. Узор матацыкла можна ўбачыць на выставе ў Музеі тэхнікі Палаца культуры і навукі ў Варшаве. Згодна са спісам аўтамабілістаў і матацыклістаў ад лютага 1913 г., магчыма, першымі уладальнікамі матацыклаў у Гродне былі мешчанін А. А. Бароўскі і капітан 101-га Пермскага пях. палка К. І. Буцкі.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места. – Смаленск, 2021. – с. 70; Вайцэховіч З. Транспарт. Ч. 1. Конка, трамваі, аўтобусы, ровары, матацыклы. – Мінск: УП “Камет”, 2008. – С. 83–86; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 344; Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 32–37; Черепица В. …Не потерять связующую нить: История Гродненщины XIX – XX столетий в событиях и лицах (исследования, документы, комментарии): Монография. – Гродно: ГрГУ, 2003. – С. 181, 185, 186, 390.

“Материалы для географии и статистики Российской империи, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния” – праца *Паўла Восіпавіча Баброўскага,* выдадзеная ў 1863 г. у Санкт-Пецярбургу ў двух тамах з двума тамамі дадаткаў, у якой Гродна і Гродзеншчына характэрызуецца як “Еўрапейская брама”, праз якую са старажытных часоў праходзілі розныя народы, дзе сустракаліся розныя элементы Заходняй Еўропы з элементам рускім Усходняй Еўропы”.

У першай частцы кнігі аўтар апісвае тэрыторыю Гродзенскай губ., яе фізічныя якасці, клімат, шляхі зносін, лясы, народанасельніцтва, народны быт. Асобныя старонкі прысвечаныя погляду на становішча і значэнне *яўрэяў* у губерні. У другой частцы разглядаецца эканамічнае развіццё Гродзеншчыны (фабрыкі, заводы, рамесная дзейнасць, гандаль), адукацыя, сацыяльныя ўстановы (апека, багадзельня, лячэбніца). Маюцца спецыяльныя нарысы пра гарады, у тым ліку “Губернскі горад Гродна. Гістарычная манаграфія”. Да абедзвюх частак кнігі ёсць дадаткі. У першым знаходзяцца дакументы і матэрыялы, якія ўтрымліваюць звесткі пра горад: па гідраграфіі, суднаводстве, *пошце* і *тэлеграфе*, гарадскім насельніцтве. У другім – дадзеныя пра дзейнасць прадпрыемстваў, піцейных устаноў, аб рамеснікаў, купцах, *кірмашах*, вязнях *турмы,* колькасці адукацыйных устаноў і вучняў, пра існаванне сацыяльных устаноў, насельніцтва гарадоў. Маюцца спецыяльныя дадаткі да нарыса пра Гродна: вуліцы, плошчы, дамы, статыстычныя дадзеныя.

“Мацеж Польская Школьная” (“Polska Macierz Szkolna”/ ПМШ) – гродзенскі філіял агульнапольскага таварыства, якое мае мэтай “умацаванне польскасці Крэсаў”, а задачамі – распаўсюджванне адукацыі і асветы. Пачало працу 24.12.1918, а афіцыйна зацверджанае 8.01.1919. Арганізатарам і старшынёй гродзенскай суполкі ПМШ у 1919–1939 гг. быў ксёндз канонік *Курыловіч А.*

Рэзідэнцыя кіраўніцтва знаходзілася ў *доме Ажэшкі Э*. У склад першага кіраўніцтва ў 1919 увайшлі суддзя Казімір Гейдройц, педагог Ядвіга Беняшувна, рэдактар Станіслава Носціц-Яцкоўская. Сябрамі рэвізійнай камісіі былі ксёндз дэкан Леан Жэброўскі, педагог Міхал Гасперскі. Пачыналі з адкрыцця розных вячэрніх курсаў (пачатковага навучання, гандлёвых, рамесных), патраната над мужчынскай *гімназіяй* імя А. Міцкевіча (да яе адзяржаўлення 7.03.1920). Намаганнямі ПМШ у лютым 1920 аднавіла працу прамысловая школа (пазнейшая 3-гадовая гімназія механічная ПМШ) з інтэрнатам і бібліятэкай для вучняў. Апекавалася ПМШ адкрытай у 1921/22 навучальным годзе жаночай прафесійнай школай, а таксама сваёй сярэдняй гандлёвай школай. У 1923 пачала працу мужчынская гімназія ПМШ (з 1927 імя Генрыка Сянкевіча), дзе атрымоўвалі сярэднюю адукацыю. З 1938/39 навучальнага года паўстала жаночая *гімназія*. Турбавалася ПМШ у Гродне і аб развіцці адукацыі на Гродзеншчыне – у 1925 школы былі ў 12 нас. пунктах, у 1926/27 – у 14, у 1930 – у 19, у 1934 – у 15. ПМШ арганізоўвала лекцыі для настаўнікаў, публічныя лекцыі, культурныя мерапрыемствы; апекавалася сацыяльнымі ініцыятывамі, у тым ліку будаўніцтвам дома-помніка Ажэшкі Э. У 1939 шэраг дзеячаў ПМШ былі ўзнагароджаныя Залатымі Крыжамі Заслугі і Крыжамі Ордэна Адраджэння Польшчы.

Новы этап развіцця ПМШ пачаўся пасля распаду СССР. Спачатку ў гродзенскіх школах № 3, 22, 17 і 25 былі адкрытыя класы з польскай мовай навучання, а пры *Саюзе Палякаў Беларусі* арганізаваны аддзел асветы. 28.03.1992 было створанае Таварыства Сяброў Польскай Школы, галоўнай задачай якога было распаўсюджванне ідэі адкрыцця польскіх школ на тэрыторыі Беларусі. Сярод актыўных дзеячаў Таварыства былі: Станіслаў Сянкевіч, Тэрэса Крышын, Барбара Фустачэнка, Міхал Дабрынін, Антоні Пацэнка, Тадэвуш Тарасевіч, Ганна Садоўская, Юзаф Дзюрбейка, Зоф’я Барадын. На справаздачным з’ездзе СПБ Таварыства трансфармавалася ў “Polska Macierz Szkolna”, быў зацверджаны Статут і выбранае кіраўніцтва. Старшынёй стаў Станіслаў Сянкевіч. 27.12.1995 ПМШ была зарэгістраваная як рэгіянальнае Таварыства “Асвета”, і толькі пасля з’езда заснавальнікаў ПМШ 29.06.1996 МУС Беларусі выдала 26.08.1996 рэгістрацыйнае пасведчанне рэспубліканскага Таварыства “Polska Macierz Szkolna” (назва менавіта па-польску). Статут таварыства меў у аснове статут 1933 г., новыя праўкі ў 1998 дазволілі ўключыць дабрачынную дзейнасць у працу арганізацыі. З 1999 таварыства было зарэгістраванае як грамадскае аб’яднанне “Мацеж Школьна” (назва ўжо зробленая кіріліцай). У склад уваходзілі клубы і таварыствы: Універсітэт Трэцяга веку, Клуб польскіх жанчын, польскі спартыўны клуб “Сокал”, Кола Жанчын (“Koło Kobiet”). Выдаваўся свой часопіс “Słowo Ojczyste”. Дапамогу ПМШ аказвалі польскія Сенат, Міністэрства нацыянальнай адукацыі, Таварыства “Wspólnota Polska”, няўрадавыя арганізацыі Польшчы і Захад. З 7.10.2022 ПМЖ было ліквідаванае, а галоўны будынак па вул. Гараднічанскай, 40, з 24.03.2025 стаў належаць генеральнаму консульству Расійскай федэрацыі. Адпаведна былі зробленыя змены ў інфраструктуры: зробленая агароджа і збудаваная ахоўная будка пра ўваходзе на тэрыторыю.

Літ.: Kwiecień O. Powstanie i działalność Polskiej Macierzy szkolnej na Białorusi // Проблемы национального сознания польского населения на Беларуси. Материалы междунар. науч. конфер. – Барановичи: Баранов. укрупн. тип., 2004. – С. 402–407; Renik W. Polska Macierz Szkolna w Grodnie w latach 1919–1939. – Rocznik Grodzieński. – 2007. – № 1. – S. 34–40; Historia Polskiej Macierzy Szkolniej w Grodnie // Słowo Ojczyste. – 2011. – Nr 4 (128). – S. 8–13.

Мейзер (Meyzer) – архітэктар Гродна XVIII ст. Пабудаваў *касцёл і кляштар кармелітаў*, дамы пачмайстра *Бадаракі.* Трусаў І. лічыць верагодным пражыванне архітэктара ў Гродне разам з жонкай у 1730–1763 гг.

Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 45–46.

Мейлаховіч Давід Майсеевіч (Моўшавіч) – брат *Мейлаховіча Ё.*, патомны *ганаровы грамадзянін* Гродна, уладальнік тыпалітаграфіі на Саборнай/Савецкай вуліцы ў доме Хомскага (дазвол ад 28.10.1877). У 1897 працавала 11, у 1903 – 23 працаўнікі. Уладальнік друкарні з 1905. Паходзіў з сям'і друкароў і гравёраў. Навучаўся прафесіі ў літаграфіі бацькі *Мейлаховіча М.* Меў асабісты дом па вул. Садовай (1897), які пазней быў прададзены купцам Франка.

Літ.: Болбас М.Ф. Промышленность Белоруссии, 1860–1900. – Мн., 1978, с. 234; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 76.

Мейлаховіч Зундэль Давідавіч – патомны *ганаровы грамадзянін* Гродна, уладальнік тыпалітаграфіі на Саборнай вуліцы ў доме Чартка (дазвол ад 11.02.1893). Яна перайшла яму ад бацькі (гл. *Мейлаховіч Давід*).

Мейлаховіч Ёсель Майсеевіч/Моўшавіч – гродзенскі патомны *ганаровы грамадзянін*, уладальнік літаграфічнага прадпрыемства па вул. Саборнай/Савецкай. Дазвол атрымаў у гродзенскім губернскім праўленні 7.08.1868 г. *Пажар 1885* знішчыў літаграфію, маёмасць не была застрахаваная, і Ёсель стаў жыць пад апекай сыноў Лейбы і Эйзера. Праз 10 гадоў апошнія падалі прашэнне аб аднаўленні бацькоўскай майстэрні, але ўлады адмовілі. У пашпарце вул. Дамініканскай за 1924 пазначана, што ў доме 21 знаходзіцца друкарня Е. Мейлаховіча, якая працуе з 1900.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 8, с. 1265, а. 36; с. 141, а. 1–2; воп. 9, с. 195, а. 1–2; ДАГВ, ф. 46, воп. 1, с. 52.

Мейлаховіч Майсей/Моўша – гродзенскі рэзчык. Навучаўся ў Пецярбургскай імператарскай акадэміі мастацтваў і заснаваў першую ў Гродне літаграфічную майстэрню. За скульптуру "Майсей прымае ад Бога скрыжалі з дзесяццю запаведзямі" у Расійскай акадэміі мастацтваў атрымаў у 1861 г. званне "вольнага мастака". Вырабіць фамільную ці фірменную пячатку прыязджалі да М. з Масквы і Санкт-Пецярбурга. Сваё майстэрства перадаў сынам

Давіду і Ёселю, якія трымалі тыпалітаграфію (з 1868) і далей пакінулі яе сваім нашчадкам, у руках якіх прадпрыемства дзейнічала да 1939 г.

Літ.: з маіх крыніц для Кронана; Бобровский П. Историко-статистический очерк города Гродна // Гродненщина. Часть первая. Том 1. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 58; Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 74–75.

Мейстр Ян (каля 1680 – паміж 20 і 25.05.1752) – шляхетны пан, гарадзенскі ўраднік: бурмістр у 1714–1715, 1720, 1723, 1725–1726, 1729, 1730, 1735, 1737, 1739, 1741, 1744, 1747–1748, радца ў 1712, 1717, 1719, 1721, 1724, 1727, 1728, 1738, 1740, 1743, 1745–1747, 1749–1752 гг. Меў некалькі пляцаў на вул. Віленскай. Паводле тастаменту перадаваў усё сынам сваіх братоў Бенедыкта і Расціслава.

Мемарыял вайскоўцам-памежнікам, пабудаваны ў гонар тых, хто прыняў бой з нямецка-фашысцкімі войскамі ў першыя дні *вайны Вялікай Айчыннай*. Будаваўся на ахвяраванні памежнікаў Беларусі, Расіі, Казахстана і Украіны. Знаходзіцца на вул. Савецкіх памежнікаў. Цэнтральная скульптурная кампазіцыя "Мяжа ў агні": вайскоўцы-памежнікі, якія стаяць плячо ў плячо (вышынёй 6 м), усталяваная на гранітны подыум метровай вышыні. На яго паліраванай нахіленай частцы вялікімі літарамі з бронзы напісана: "Погибшим, но не побеждённым воинам Белорусского пограничного округа". У кампазіцыю ўключаныя 15 памежных слупоў па колькасці рэспублік, якія ўваходзілі ў склад СССР. Ганаровае адкрыццё М. адбылося 22.06.2004.

Крыніцы: https://present5.com/memorialnye-pamyatniki-grodnenskoj-oblasti-pogran-zastava-lejtenanta-v/Доступ 04.01.2021; https://grodno.in/showplace/border-guards/ Доступ 04.01.2021

Мемель (Memela, Memil, Memel, Memele) – нямецкамоўная назва Нёмана. Упершыню, магчыма, з'явілася на Эбсторфскай мапе XIII ст., затым сталі выкарыстоўваць яе ў сваіх хроніках XIV ст. *крыжакі*.

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 35–36.

Менцэль Емілай – гродзенскі фотамайстар, майстэрня якога вядомая ў Гродне па вул. Замкавай з 1865 г.

Мера гандлёвая гродзенская, існавала ў першай чвэрці XVII ст. на *кірмашах* і падчас таргоў для ўзважвання сыпучых тавараў – ячменю, збожжа, жыта. Роўная была 4 капцам кракаўскім.

Літ.: Maroszek J. Dzieje województwa podlaskiego do 1795 roku. – Białystok: Wyd-wo Uniwersytetu w Białymstoku, 2013. – S. 367.

Мёзер Ёган Георг (Moeser Jogan Georg) – паходзіў з Дрэздэна, сын муляра, працаваў у Гродне інвентарызатарам пасля пажару ў 1753, пазней працаваў "архітэктарам Яго каралеўскай Высокасці". Захаваныя ў польскіх архівах квіты гавораць, што ў 1769–70 у Гродне М. быў адзіным архітэктарам. Распрацаваў *генеральны план Гарадніцы*. Пабудаваў *палац Тызенгаўза* (супольна з *Дж. Сака*), *карчму "Раскоша"* на вуліцы пад той жа назвай (цяпер вул. *Ажэшкі Э.*), *дамы баснякаў*. Выкладаў у Гродзенскай *школе будаўнічай*. Пакрыўджаны *Тызенгаўзам А*. невыплатай грошай, у 1775 г. пакінуў горад.

Літ.: Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 47; Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 12. – Гродна: ГАІУН, 2010. – С. 6, 43; Dąbrowski S., Artyści na dworze Antoniego Tyzenhauza (przyczynki archiwalne)// Biuletyn historii i kultury. – 1933. – №. 3. – S. 134–140; Szymański S., Bośniacy w Grodnie końca XVIII wieku. // Rocznik Białostocki. – 1981. – T. XV. – S. 163.

Мікалай II (6/18.05.1868, Царскае Сяло – 17.07.1918, Екацярынбург) – апошні імператар Усерасійскі, вял. кн. фінляндскі, цар польскі. 1.11.1914 сустракалі яго з жонкай Аляксандрай Фёдараўнай і дачкамі Таццянай і Вольгай на гродзенскім вакзале. Камендант крэпасці Гродзенскай М. Кайгародаў і губернатар *В. Шыбека* аддалі рапарты, гарадскі галава *Лістоўскі Э.* аб'явіў пастанову думы аб усталяванні ў мясцовых навучальных установах 16 стыпендый для дзяцей забітых і параненых вайскоўцаў мясцовага гарнізона. Імператар падараваў 5 тыс. руб для размеркавання паміж сем'ямі прызваных у войска. Пасля 11.00 царская сям'я патрапіла ў *Сафійскі сабор* на малебен. *Карчынскі І.* паднёс Мікалаю II свае кнігі "Софийский собор", "Коложская церковь", "Гродненский Богогласник". З сабора імператар пайшоў у вайсковы шпіталь і ўручыў параненым на вайне Георгіеўскія медалі. Затым аглядзеў 4 і 5 фарты крэпасці, абыйшоў батарэі. Вечарам цар вярнуўся ў цягнік і паехаў у Дзвінск.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 22, 24; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 125–128; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005). – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020.

Мілавідаў Аляксандр Іванавіч (1864 – пасля 1933) – гісторык, аўтар публікацый, якія ўтрымлівалі краязнаўчы матэрыял пра Гродна: Заслуги графа М. Н. Муравьева для православной церкви в Северо-Западном крае // Виленский календарь на 1901 г. – Вильно, 1900; Участие молодежи Северо-Западного края в мятеже 1863г. – Вильно, 1904; Перечень боевых столкновений русских войск с польскими повстанцами в кампанию 1863–1864 гг. в пределах Северо-Западного края. – Вильно, 1915; Архивные материалы Муравьевского музея. Ч. I. – Вильно, 1913; Ч. II. – Вильно, 1915.

Мілевіч Ільдэфонс Юр'евіч – паўстанец 1863 г., дваранін Віленскай губ., 29 гадоў у 1864. Нарадзіўся ў Віленскай губ. і ў., вучыўся ў Віленскай гімназіі, пасля заканчэння якой скончыў пры ёй поўны курс навук у землямерскіх

класах. Каля 2 гадоў служыў у таварыстве Адэса-Кіева-Курскай чыгункі. У 1860 быў прызначаны казённым землямерам для люстрацыйных спраў у Гродзенскай губ. У жніўні 1860 прыехаў у Гродна з Пецярбурга з рэкамендацыйным лістом ад М. Цеханоўскага (якога ведаў праз Віктара Каліноўскага). Звярнуўся да яго брата Цэлесціна (гл.), пазнаёміўся з братамі Заблоцкімі (гл.), сустрэўся ў канцы 1861 з В. К. Каліноўскім. Потым да снежня 1861 па справах службы землямера (чыноўнік люстратар) жыў па вёсках Гродзенскага ўезда. Да пачатку мая 1862 жыў у Гродне (па вул. Дамініканскай, у доме насупраць гімназіі, у 2-х пакоях на 2-м паверсе, дом Фукса), затым з мая па снежань 1862 працаваў і жыў у Брэсцкім уездзе. Апынуўшыся ў Гродне "был вовлечён общим противоправительственным настроением". У яго кватэры знаходзілася рэвалюцыйнае ваяводскае бюро. З ліпеня 1863 быў у адстаўцы і пасяліўся ў Вільні. З Вікенціем Канстанцінам Каліноўскім (відаць, ён яго менавіта так называе па-пецярбургску) М. сустракаўся ў Гродне ў канцы 1861, а на раство 1862 г. ездзіў да яго ў Вільню. З красавіка 1863 быў перапісчыкам рэвалюцыйных папер пры ваяводскім начальніку Э. Заблоцкім, а з верасня – пры камісары Літвы Каліноўскім (у гэты час М. жыў у сваіх бацькоў у Вільні). З 25.01.1864 знаходзіўся пад следствам Гродзенскай следчай камісіі. М. Мураўёў "чыста інтуітыўна адгадаў у арыштаваным Мілевічы аднаго з кіраўнікоў рэвалюцыйнай арганізацыі краю" (П. Чарэвін). Сасланы на катаржныя працы на 6 гадоў.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11 адв., 68–70, 83–84, 167, 192; с. 1, а. 1–4, 191–193 адв.; с. 3, а. 148; воп. 1, с. 40, а. 85 адв.; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 594, а. 20, 25; Ігнатоўскі. 1863. – С. 229; Чарэвін П. Паўночна-Заходні край (Успаміны) // Спадчына. – 1998. – № 3. – С. 42.

Мілінкевіч Аляксандр Уладзіміравіч (нар. 25.07.1947, Гродна) – кандыдат фізіка-матэматычных навук, 25 год выкладаў у Гродзенскім дзяржаўным універсітэце, з якога быў звольнены за ўдзел у палітычным жыцці. На пачатку 1980-х гадоў працаваў у Алжыры, дзе стварaў фізічную кафедру. Быў старшынёй гродзенскага аб'яднання "Ратуша". Прайшоў стажыроўку ў Францыі і ЗША па пытаннях дзяржаўнага будаўніцтва і мясцовага кіравання. З 1990 г. працаваў намеснікам старшыні гродзенскага *гарадскога выканаўчага камітэта*. Займаўся пытаннямі адукацыі, культуры, аховы здароўя, спорту, рэлігіі і міжнародных зносін. Спрыяў адкрыццю беларускіх школ, дапамог упарадкаваць могілкі польскіх жаўнераў 1939 г. і ўсталяваць помнік гродзенскім ахвярам Катыні, вярнуць жыццё старому гадзінніку на вежы Фарнага касцёла. Дзякуючы і яму былі праведзеныя раскопкі пахавання *Станіслава Аўгуста Панятоўскага* ў Воўчыне і знойдзеныя артэфакты. Аўтар артыкулаў у энцыклапедыях "Гісторыя Беларусі", "Архітэктура Беларусі". Вядучы цыкла перадач па гісторыі Беларусі і канкрэтна Гродзеншчыны на беларускім тэлебачанні. У 2005 разам з палякамі пратэставаў супраць недэмакратычнай змены ўлады ў *Саюзе Палякаў* у Беларусі. Пасля высялення абласнога камітэта КПБ з *замка Новага* Мілінкевіч прапанаваў выкарыстаць яго ў якасці культурнага

цэнтра з залай камернай музыкі, бібліятэкай і выставачнымі памяшканнямі. На выбарах прэзідэнта ў 2006 г. быў абраны адзіным прадстаўніком дэмакратычных сіл. Працуе над праектам адкрыцця дыстанцыйнага "Вольнага беларускага ўніверсітэта" на тэрыторыі ЕС.

Аўтар шэрагу публікацый па гісторыі Гродна (спіс гл. у 2 частцы дадзенай кнігі). Адзначыць трэба важны ў гістарыяграфіі Гродна артыкул "Судьба гродненских замков: трагедия и величие ", апублікаваны ў "Гродненской правде" (1990 – 18 жніўня. № 159, с. 3). М. выклаў кароткую гісторыю *Старога і Новага замкаў* ад першага паселішча *Горадзена* XII ст. праз гісторыю крэпасці на мяжы Кіеўскай Русі, ВКЛ, Каралеўства Польскага да распаду Рэчы Паспалітай (дзяржавы літоўска-польскай, у якой Гродна дэ-факта было 3 сталіцай). Доказам еўрапейскасці горада было, на погляд М., будаўніцтва з 1726 г. замка Новага на загад саксонскага курфюрста Фрыдрыха Аўгуста II (які быў адначасова і польскім каралём, і вялікім літоўскім князем Аўгустам III).

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 417–419, 434.

Мілкоўскі Эдвард (кс. Алаізы Слепаврон, мянушка Праметэй Віхор, 1878–1907) – ксёндз, паэт, грамадскі дзеяч. Скончыў віленскую духоўную семінарыю (1901), быў вікарыем ў Дамброве і Заблудаве Беластоцкага ўезда. Выдаваў часопісы "Za wiarę i ojczyznę" ("За веру і айчыну", Кракаў, 1904), "Protest" ("Пратэст", Варшава, 1906). Прагнуў стварыць незалежны славянскі касцёл і прапагандаваць этычны рух сярод рабочых. За патрыятызм быў асуджаны, сядзеў у гродзенскім кляштары францішканскім, быў пазбаўлены біскупам Е. Ропам 18.12.1905 святарскіх правоў і абавязкаў. Пакінуты сваімі сябрамі, скончыў жыццё самагубствам. У 1907 ягоныя вершы апублікавалі ў Варшаве ў зборніках "Ave Vita", "Dobra Nowina", "Gehenna".

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 316.

Мілюцін Дзмітры Міхайлавіч – настаўнік рускай гісторыі ў жаночай гімназіі (з 1904 г.). Вучыўся ў Пецярбургу. Працаваў з 1860 па 1867 у Тарапецкім павятовым дух. вучылішчы Пскоўскай губ., з 1872 па 1891 – у навучальных установах Каралеўства Польскага: на педаг. курсах у Седльцы, Холмскай настаўніцкай семінарыі, Варшаўскай 2-й жаночай гімназіі, Люблінскай жаночай гімназіі, Варшаўскім рэальным вучылішчы. Магчыма, у Гродне жыў на сённяшняй вул. Горкага, 21. Аўтар кніг: Гродно в 1794, 1795 и 1796 годах. – Гродно, 1905, Древнее население Гродненской губернии. – Гродно, 1907.

С. 877

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 35; Чарапіца В.М. Са скарбніц кніжных паліц: нарысы пра аўтографы даследчыкаў гісто-

рыі Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзяў / В.М. Чарапіца. – Мінск: БелНДЦДААС, 1994. – С. 54–61.

Міністэрства беларускіх спраў, знаходзілася ў 1919 г. у будынку гарадскога вучылішча па сённяшняй вул. Леніна, 4. Тут працавала ў гэты час і трохкласнае беларускае вучылішча, жылі беларускія дзеячы *Дзекуць-Малей* Л. і Салошык К.

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 57.

Мірончык Уладзімір Юсцінавіч (1915, в. Ячава Слуцкага р-на Мінскай вобл. – 30.06.1990, Гродна) – заслужаны ўрач БССР. Герой Сацыялістычнай працы (1969), удзельнік *вайны Вялікай айчыннай* (працаваў хірургам у вайсковых шпіталях). Скончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1939). З 1946 у Гродне, зарганізаваў і ўзначаліў станцыю "Хуткай дапамогі". З 1950 – галоўны ўрач 1-й гарадской клінічнай бальніцы імя З. П. Салаўёва. Значны ўклад М. зрабіў у развіццё матэрыяльнай базы ўстаноў аховы здароўя, ва ўдасканальванне дыягнастычнай і лячэбнай практыкі, у выхаванне маладых урачоў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Леніна, "Знак Гонару", 6 медалямі. У Гродне на новым корпусе першай бальніцы ўсталяваная мемарыяльная дошка ў гонар М. (скульптар *А. Салятыцкі*) з надпісам: "Тут з 1950 па 1990 год працаваў ганаровы грамадзянін г. Гродна, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны ўрач Рэспублікі Беларусь Уладзімір Юсцінавіч Мірончык".

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 218; Книга Героев Гродненской области / сост. Ю.М. Алексей, О.М. Якубович. – Гродно: ГОУПП "Гродн. тип.", 2004. – С. 129.

Міскы Віктар (1889–?) – адзін з арганізатараў у Гродне Саюза стральцоў (1924), прэзідэнт Гродна (19.10.1934 – 1936). У часы яго прызідэнства рэалізоўваўся праект добраўпарадкавання р. Гараднічанкі, пракладвалася гарадская каналізацыя, будаваўся Дом стральца (сённяшні Дом афіцэраў). З заканчэннем тэрміна М. адмовіўся ад пасады прэзідэнта, верагодна з нагоды заканчэння камандзіроўкі – ён быў вайскоўцам у чыне маёра і, магчыма, служыў у Гродне.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 172–173.

Міхальскі – *прэзідэнт Гродна* (1893) да *Лістоўскага Э.* Муж Камілы Гладко, у якой восенню 1857 г. жыла *Ажэшка Э.* з маці. М. – расіянін, ягоны дом знаходзіўся каля званіцы *кляштара брыгітак.*

Міхаэліс Восіп (каля 1801 – не раней 31.01.1853) – губернскі архітэктар (з 20.03.1846), калежскі дарадца (з 31.12.1849), з дваран. Пасля заканчэння гродзенскага павятовага на правах гімназіі вучылішча накіраваны вучнем гродзенскага губернскага архітэктара для навучання тэорыі грамадзянскай архітэктуры. У службе 32 гады (на 1852 г.). Узнагароды: брыльянтавы пярсцёнак (4.07.1833), 600 руб. асігнацыямі (29.04.1838). Быў прэзідэнтам рады *царквы лютэранскай* у Гродне. Меў дачку Юлію, якая пахаваная ў 1873 на *могілках каталіцкіх,* у сектары S 104.

Крыніцы: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 23, с. 653; ф. 2, воп. 37, с. 1037; ф. 8, оп. 1, с. 550, а. 2 адв.–3.

Міхаэліс Зыгмунт Юзаф (05.08.1810, Гродна – пасля 1858, Францыя) – паўстанец 1830–31 гг. Сын Яна, шляхціц. Вучыўся на медыцынскім факультэце Віленскага ўніверсітэта. У паўстанні служыў батальённым лекарам, атрымаў чын падпаручніка літоўскіх апалчэнцаў (18.04.1831). Пасля паражэння паўстання з польскімі часткамі Гелгуда А. 13.07.1831 перайшоў у Прусію. 04.08.1832 прыбыў у Францыю і быў паселены на астравах Экс і Алерон ля французскага ўзбярэжжа, затым у снежні 1832 пераведзены ў Буржэ. 13.02.1833 звярнуўся да французскіх уладаў з просьбай аб пераводзе ў Манпелье дэп. Эроль для працягу медыцынскай адукацыі ў мясцовай акадэміі. 23.09.1834 атрымаў дыплом доктара медыцыны. У сакавіку 1846 далучыўся да акту кракаўскага паўстання. У чэрвені 1854 жыў у дэп. Ардэш (?).

Літ.: Матвейчык Д. Ч. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. – ураджэнцы беларускалітоўскіх губерняў: эміграцыя, гуртаванне, дзейнасць. Дадатак. Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені к.г.н. па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя. – Мінск, 2008. – С. 317.

Могілкі Гродна адлюстроўваюць шматэтнічны і канфесійны склад насельніцтва горада, яго гісторыю.

Могілкі вайсковыя знаходзяцца на вул. Белуша і на вул. Перамогі. Першыя ўзніклі як лютэранскія могілкі ў 1888 г. (так яны пазначаныя і на плане 1792). У 1900 мясцовыя ўлады выдзелілі ўчастак гарадской зямлі на выгане, па правым баку вул. Скідзельскай, каля парахавых склепаў. Падчас *вайны Першай сусветнай* на могілках было пахавана шмат кайзераўскіх жаўнераў і афіцэраў. Іх магілы знішчылі падчас рэканструкцыі могілак у 1970-я гады (валанцёры з Нямеччыны ў 2010 адшукалі падмуркі памятнага знака на былых нямецкіх вайсковых могілках). Самае старое ацалелае пахаванне – расійскага генерал-маёра Русау А. А. (1843–1896), прадвадзіцеля дваранства Гродзенскага ўезда (1885). Яму збудавалі лютэранскую капліцу гатычнага стылю. Яшчэ адно даўняе пахаванне – капітана 26 артылерыйскай брыгады Станкевіча У. П. (1878–1912), помнік з чорнага граніту. Пахаваныя тут абаронцы Гродна падчас *вайны Першай сусветнай*, жаўнеры Войска Польскага, забітыя падчас

С. 878

Нёманскай бітвы ў *вайне савецка-польскай* (1918–1920). Надмагільныя помнікі маюць: кавалеры ордэна Віртуці Мілітары і Мужнага Крыжа паручнік К. Канапацкі (1894–1920) і падпалкоўнік В. Загорскі (1892–1925), а таксама генерал брыгады А. Б. Слепаврон-Яcтшэмбскі (1860–1924). У 1930-х гадах, па словах *Студніцкай Яніны*, у глыбіні могілак былі пахаваныя ў 2 агульных магілах парэшткі з кармелітаў-босых і з могілак каля *Фары Вітаўта*. 21.09.1939 пахавалі на могілках таварышаў Гоя І. Я., Барташэвіча У. М., Сівернюка І. Я., Шведава С. С., Сікорскага М. Я., якія былі "забітыя за вызваленне Заходняй Беларусі ад панскага ярма". У гэты ж дзень узнікла магіла У. М. Катачына, тэхніка-інтэнданта. А 20.09.1939 у брацкай магіле пахавалі 5 чырвонаармейцаў, загінулых у баі. У сярэдзіне могілак стаіць Крыж Катынскі, пастаўлены на 50-годдзе злачынства (інтэрніраванне з месца жыхарства і службы, а затым забойства палякаў з Зах. Беларусі, здзейсненае савецкай ўладай). Насыпаная зямля з Асташкава, Казельска і Катыні. Побач стаіць пліта з імёнамі 168 *катынцаў-гродзенцаў* ці асоб, якія працавалі і жылі ў Гродне.

У найвялікшым сектары пахаваныя савецкія вайскоўцы, палеглыя падчас вызвалення горада ад нямецка-фашысцкіх войск. Паводле звестак на 10.2001 усіх пахаваных савецкіх вайскоўцаў налічвалася 8 266 (з іх вядомых 266). Знаходзяцца таксама 8 брацкіх магіл савецкіх ваеннапалонных (даўжынёй 50 м, глыбінёй і шырынёй да 2 м), у якіх трупы ляжалі ў 3 і 7 шэрагаў (усяго 6 тыс. чал.). У 1960 пастаўлены тут помнік – скульптура жанчыны з падлеткам-суворацам. У цэнтры могілак пахаваныя ў індывідуальных магілах 368 вайскоўцаў, забітых ці памерлых ад ран у ліпені 1944. Тут стаіць з 9.05.1979 скульптура савецкага вайскоўца ў ганаровай варце "Заўсёды напагатове" (вышыня 5 м, скульптар *У. Церабун*, архітэктар А. Каралькоў). Побач знаходзяцца 3 бетонныя блокі з надпісамі-прысвячэннямі. Маецца алея Герояў Савецкага Саюза. У 1973 могілкі былі закрытыя для пахаванняў, але ў 1981 тут знайшоў спакой генерал-маёр А. В. Сакалоў.

На другіх вайсковых могілках (старая назва – Рускае) па вул. Перамогі пахаваныя чырвонаармейцы, забітыя падчас бою пад Гроднам ў 1939 г.: камандзір танкавага батальёна Ф. І. Квітка і палітрук *Г. А. Гарнавых*. Некалькі магіл брацкіх: 8 вайскоўцаў, палеглых у 1941 (перапахаванне 16.07.1987 знойдзеных парэштак падчас будаўніцтва мікрараёна *Румлёва*); плюс 2 вайскоўцы асобна; магіла забітых падчас вызвалення горада ў 1944. У асобных магілах ляжаць: мал. сяржант, Герой Савецкага Саюза *М. Ц. Курбатаў* і С. І. Нечаюк, забіты ў 1941 г.

Могілкі праваслаўныя. Вакол кожнай царквы былі могілкі. Найстарэйшыя, верагодна, бачныя на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта* каля *царквы Барыса і Глеба на Каложы*. Старажытныя могілкі знаходзіліся і на Падоле, каля царквы Св. Крыжа/Чэснахрэсцкай – вядома, што ў 1675 уніяцкі мітрапаліт К. Жахоўскі падараваў кармелітам царкоўны пляц з "могілкамі брацтва гарбарскага". Пра іх згадвае і дамова куплі-продажу 1758. Былі могілкі таксама каля *царквы Прачысценскай, Васкрасенскай* (18 ст.). У 1736 існавалі могілкі каля *царквы*

Св. Мікалая. Праваслаўныя могілкі па вул. Антонава заснаваныя на пачатку XIX ст. Адна са старажытных магіл – пахаванне генерал-лейтэнанта *Сяргея Ланскога*, смяротна параненага ў бітве. У 1848 была пабудаваная *царква Прападобнай Марфы*. На могілках спачываюць *Багдановіч Марыя* (маці паэта Багдановіча Максіма), гісторык *Арлоўскі Яўстафі*, этнограф Дзмітрыеў Міхаіл, архітэктар Небольсін Васіль, паэт *Васілёк Міхась* і інш.

Каталіцкія могілкі. Верагодна, аднымі з першых былі парафіяльныя могілкі каля *Фары Вітаўта*, згаданыя ў прывілеі вялікага князя *Аляксандра Ягайлавіча* ў 1494 г. Яны знаходзіліся побач з домам плябана і межавалі на поўдні з вул. Замкавай, а на поўначы – з вул. Плябанскай. Падчас іх закрыцця (май 1792) налічвалася 2600 надмагілляў. У XVIII ст. на могілках месціліся прытулак для ўбогіх, агароды і крамы. Гродзенскі даследчык Мечыслаў Ян Супрон лічыць, што тут хавалі лаўнікаў, бурмістраў, скарбнікаў, знаходзіліся крыпты рамесных цэхаў. Апошні раз могілкі ўпамінаюцца ў 1804. Пахаванні адбываліся і ў самім касцёле – падлога была выкладзеная надмагільнымі плітамі, пад якімі знаходзіліся склепы прадстаўнікоў духавенства, заможных мяшчан і шляхты.

Могілкі фарныя ў 1792 г. па ініцыятыве ксяндза *Юзафа Мучыньскага* былі закладзеныя на каралеўскіх грунтах на ўскрайку горада (зараз на вул. Антонава). На працягу мая-снежня 1792 было пахавана каля 200 чал. Захавалася адно са старэйшых пахаванняў з надпісам па-руску: "Тут пахаваны пратапоп 4 студзеня 1800 г.". Ёсць і магіла з 1801 – пахаванне мытніка Н. К. Лявіцкага. Гэта 2 прыклады пахаванняў уніятаў. План горада 1823 г. зафіксаваў наяўнасць мураванай агароджы вакол могілак. Яна ўзнікла дзякуючы збору грошай ксяндзом Б. Фютнаўзам. Могілкі сталі месцам спачынку архітэктара *Сака Д.,* пісьменніцы *Ажэшкі Элізы*, яе маці Францішкі Відацкай і малога браціка Яна, яе другога мужа *Станіслава Нагорскага,* ксяндзоў *Мельхіёра Фардона*, Францішка Грынкевіча, Міхала Арамовіча, прэзідэнта горада *Лістоўскага Э. Э., Шышкевіча Б.* і яго сына, *Каханоўскага Я*., генерала брыгады Адама Вінцэнта Макрэцкага (1856–1921). Тут знаходзяцца магілы польскіх вайскоўцаў, якія загінулі ў вайне 1919–1920 гг. Гарадзенскі даследчык С. Пачобут-Адляніцкі налічыў 151 асобу. На могілках спачываюць прадстаўнікі вядомых і заслужаных гродзенскіх родаў Бушаў, Гедройцаў, Касцялкоўскіх, Урублеўскіх, Глябовічаў, Эйсмантаў. У цэнтры некропаля знаходзіцца капліца. Спачатку яна была драўляная, квадратная 6,5 х 6.5 м і вышынёю 3,25 м. У 1822, паводле праекта губернскага архітэктара К. Багеміла, збудавалі мураваную, дзякуючы фундацыі К. Судніцкага. На яе фасадзе ёсць дзве мемарыяльныя дошкі на польскай мове, прысвечаныя польскім абронцам Гродна ў 1939 г. і ахвярам сталінскага тэрору. Паводле рашэння Гродзенскага аблвыканкама ў 1986 могілкі атрымалі статус помніка абласнога значэння.

Могілкі францішканскія знаходзіліся на занёманскай частцы горада, перад галоўным фасадам касцёла кляштара францішканцаў, паміж вуліцамі Лабенскай і Навадворскай. Першыя дакладныя звесткі пра іх паходзяць з 1665,

але ёсць ускосныя ранейшыя згадкі аб "магілах рылаўскіх". У 1848 былі агароджаныя земляным валам, у 1854 *Якаў Румель*, гаспадар маёнтка *Румлёва*, за свае грошы пабудаваў мураваную капліцу, крытую гонтам. Намаганнямі пробашча Юзафа Стацкевіча тэрыторыя могілак была пашыраная, быў пабудаваны домік для ахоўніка. У 1882 з дапамогай парафіян могілкі былі агароджаныя мурам з палявых камянёў, а парафіянін Аляксандр Грыцкевіч пабудаваў каля капліцы званіцу. У гэты час у капліцы з'явіліся алтар са скульптурай Укрыжаванага Хрыста, а на сценах – новыя абразы з выявамі св. Юзафа, св. Міхала і Маці Божай Беззаганнай. Самае старое захаванае пахаванне – Станіслава Паўлоўскага, памерлага ва ўзросце 77 гадоў у 1811 г. З 1867 па 1899 на могілках захавалася больш за 30 помнікаў 34 гарадзенскіх родаў. Сярод іх – Андрушкевічы, Бекішы, Вяжкоўскія, Дабрасельскія, Зязюлі, Курчэўскія, Навумовічы, Стацкевічы, Урублеўскія. У XX ст. тут знайшлі спакой асобы з 53 родаў – Багдановіч, Кашэўнік, Сарасек, Сянкевіч, Трускаляскі, Хлявінскі, Чэкель, Шчука, Янкоўскі і інш. На могілках пахаваны кіраўнік друкарні даваеннага выдання "Rycerz Niepokalanej" А. Альшакоўскі.

Могілкі яўрэйскія

1) Старажытныя займалі тэрыторыю, якая межавала з *рынкам Нямецкім* на поўначы (сёння тут аўтастаянка), рэчышчам *Гараднічанкі* – на захадзе і вул. Могілкавай – на ўсходзе і да *сінагогі Вялікай Харальнай* – на поўначы. Верагодна з'явіліся ў канцы XIV ст. у раёне вул. Вялікай Траецкай. Рэгулярныя пахаванні адбываліся на працягу амаль чатырохсот гадоў і спыніліся ў XVIII ст. Паказаныя на планах Горадні 1780, 1812, 1824, 1832, 1903 і 1923 гг. На могілках знаходзілася камяніца *кагалу*, у якой размеркаваліся канцылярыя і вартоўня. Кіраўніком могілак у міжваенны час быў Гілель Ставіцкі. Падчас *вайны Другой сусветнай* уваходзілі ў тэрыторыю *гета № 1*, і тут, паводле ўспамінаў Р. Н. Хасіда, хавалі памерлых у ім. У гэты час і пасля вайны з могілак вывезлі вялікую колькасць надмагільных пліт, але значная іх частка засталася на месцы, у зямлі. Сёння тут знаходзіцца стаянка аўтатранспарта.
2) Могілкі на Фарштаце Занёманскім, на беразе Нёмана, заснаваныя ў XVIII ст. (у 1789 ужо існавалі) і былі закрытыя ў 1968. Яны захаваліся і вясной 2000 г. Э. Адлер і К. Суворына склалі спіс, які ўключае 1828 магіл, найбольш старая з якіх датуецца 1784 г. Большая частка надпісаў на надмагіллях зробленая на іўрыце, але ёсць і на ідышы. Сярод пахаваных – рабіны А. Зыскінд (1793), Ш. Шкоп. Захавалася камяніца, дзе знаходзіліся морг і вартоўня.
3) Яшчэ адныя могілкі ("Новыя") былі закладзеныя ў 1791 г. на тэрыторыі, дзе з 1963 размеркаваўся стадыён "Чырвоны сцяг"/"Нёман" (вул. Каліноўскага, Горкага, Камунальная). Існавалі да 1949 г. (рашэнне гарвыканкама ад 26.04). Тут пахаваныя рабіны, прадстаўнікі яўрэйскіх сямей Брэгманаў (Грынбергаў), Шарашэўскіх і інш., паэт Найдус Л. (на яго магіле быў помнік у выглядзе анёла ў жалобе). У 1954 на частцы тэрыторыі могілак размясціўся дэкаратыўны гадавальнік трэста зялёнага будаўніцтва, у 1957 – станцыя юных натуралістаў, а 10 га было адведзена для ўзвядзення стадыёна ў раёне вул. Каліноўскага і Камунальнай.

Падчас пабудовы стадыёна і яго рэканструкцыі ў 2003 г. былі ўскрытыя пахаванні і частка іх вывезеная на могілкі на беразе Нёмана. На агароджы стадыёна ў 2007 змешчаная мемарыяльная шыльда ў памяць *яўрэяў* Гродна.

Могілкі, якіх ужо няма: на вул. Дзяржынскага, там, дзе зараз гаспадарчыя пабудовы каля шпіталя вайсковага, былі пахаваныя нямецкія жаўнеры пасля баёў 1915 г.; далей у бок вул. Церашковай – могілкі з пахаваннямі расейскіх жаўнераў часоў *вайны Першай сусветнай*. У гады *вайны Другой сусветнай* на тэрыторыі *саду батанічнага Каханоўскага Я.* было пахавана каля тысячы савецкіх жаўнераў (большасць памерла ў шпіталі вайсковым, размеркаваным у будынку *гімназіі жаночай*). Колішнія могілкі евангеліцка-лютэранскай абшчыны знаходзіліся каля кірхі на Гарадніцы (вул. Акадэмічная і 1 Мая), і былі закрытыя мясцовай уладай 7.09.1951. З 1961 тут знаходзіцца дзіцячы садок. На лютэранскіх могілках было шмат цікавых надмагільных помнікаў з рознымі стылістычнымі элементамі ампіру і класіцызму. Адно са старэйшых пахаванняў – магіла Вільгельміны Даратэі Мелін (1806), мела высокую калону на пастаменце. Сярод пахаваных былі архітэктар *Міхаэліс Восін;* генерал Хрысціян дэ Рот (? – не раней 1816), вайсковы камендант *замка Старога* і яго жонка Караліна фон Сшультэ, дачка французскага генерала часоў Людовіка XV; палкоўнік Ё. В. фон Штайн (1876); маёр М. Віганд; сёстры Луіза і Джэні Хаймдрайк (1839 і 1841) і інш.

18.07.1973 г. мясцовыя ўлады прынялі рашэнне аб закрыцці з 1.08.1973 дзейных могілак на вул. Прыгараднай, на 2-м завулку Белуша, на завулку Перамогі, і адкрыцці для пахавання новых могілак на праспекце Касманаўтаў ва ўрочышчы *Сакрэт*. 19.11.1990 аблвыканкам вырашыў унесці ў спіс помнікаў гісторыі і культуры праваслаўныя і каталіцкія могілкі па вул. Антонава, вайсковыя могілкі па вул. Белуша, яўрэйскія могілкі на вул. Паповіча.

Літ.: Баціс М., Буцько У., Крапівіна Н. і інш. Гародня: сляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні // ARCHE. – 2010. – № 6. – С. 359–367; Гардзееў Ю. Гродзенскі рынак у XVI-XVIII ст. (праблемы сацыятапаграфічнага развіцця) / Ю. Гардзееў // Краязнаўчыя запіскі. – 2000. – № 5. – С. 99, 100, 102; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 101–104; Гардзееў Ю. Габрэйскія могілкі ў Гародні // Горад святога Губерта: зборнік краязнаўчых артыкулаў. Выпуск 6 (2012). – Горадня: б.в., 2012. – С. 4–9; Канчэўская К., Перад абліччам Інскрыпцыі гарадзенскіх французскіх могілак // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 95–103; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 67; Новы Свет ва ўспамінах ягоных жыхароў // Горад Святога Губерта: краязнаўчы альманах. Выпуск IV. – Гродна, Вільня, 2008. – С. 30; Саяпін В. Лёс гродзенскіх могілак пасля Другой сусвтнай вайны // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 32–40; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С. 41, 49, 54; Соркіна. І. Гродзенскія яўрэйскія могілкі // Этнакультурныя і прыродныя турыстычныя рэсурсы Гродзеншчыны і Сувальшчыны: энцыкл. давед. / рэд. В.Р. Карнялюк, І.І. Трацяк. – Гродна-Мінск: Беларускі дом друку, 2014. – С. 82; Супрон М. Новыя

крыніцы па гісторыі гродзенскіх могілак у XIX – пачатку XX стст. // Гарадзенскі гадавік. – 2017. № 5. – С. 24–31; Черепица В.Н. Гродненский православный некрополь (с древнейших времён до начала XX века) / В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 2001. – С. 21–70; Helena z Janczynowskich Roth, Czasy. Miejsca. Ludzie. Wspomnienia z kresów wschodnich, Kraków, 2009, s. 99; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 121–147, 186–187; Rozmus, J. Cmentarz farny w Grodnie 1792–1939 / J. Rozmus, J. Gordziejew. – Kraków: Wyd-wo naukowe WSP, 1999.

Мора Гарадзенскае. Дадзеныя археалогіі і старажытныя крыніцы гавораць пра яго існаванне на месцы сённяшняга размяшчэння Гродна. У ім вяліся вялікія ракі, рыбы з крыламі. Даследчыкі пішуць, што мора некалькі разоў адыходзіла і зноў вярталася. Пра яго існаванне сведчаць *Крэйдавыя горы* пад Гроднам і наяўнасць у крэйдавых слаях марскіх істот; былыя тарфянікі на месцы *Станіславова*; азёры ў Парэччы і Азёрах.

Літ.: Гродназнаўства: дапаможнік па курсе "Краязнаўства" для студэнтаў гуманіт. спецыяльнасцяў / пад агульн. рэд. В.В. Шведа, В.Р. Карнялюка. – Гродна: ГрДУ, 2-е выд., 2010; Jeziora pod Grodnem w pradoline Kotry i Rotniczanki=Les lacs dorigine glasiaire dans une vallee des environs de Grodno/ M. Pruszyński i E. Ruhle. – Warszawa, 1933; Roxolanus., Przedhistoryczne dzieje Grodzieńszczyzny [w.:] Przegląd Wileński. – Wilno. – R. 6. 1923. – № 15. – S. 2–4;

Мсціслаў Данілавіч (? – пасля 1292) – сын князя Галіцка-Валынскага Данілы Раманавіча. У 1289 у спадчыну ад свайго дваюраднага брата Уладзіміра Васількавіча атрымаў Валынскае княства. Магчыма, у 1274 ён валодаў *Горадзенам*.

Мсціслаў Усеваладавіч (? Горадзен – каля 1183) – гарадзенскі князь. Сын Усевалада Гарадзенскага і Агаф'і Уладзіміраўны. З 1151 г. правіў Гарадзенскім княствам разам з братам Глебам, а пасля смерці апошняга ці з 1170 – з ягоным сынам Юрыем. У 1170 дапамог Мсціславу Ізяслававічу трэці раз узысці на кіеўскі прастол. У 1173 удзельнічаў у барацьбе Андрэя Багалюбскага за аб'яднанне земляў Русі. На Мсціслава спадзяваліся ў планаваным паходзе ў 1183 на полаўцаў кіеўскія князі Рурык Расціслававіч і Святаслаў. Гэта апошняя згадка ў летапісах пра Мсціслава.

Літ.: Госцеў А.П., Швед В.В. Шлюб князя-ізгоя, або як пачынаўся Горадзен // Гродзенская праўда. – 1991. – 1 лістапада. – С. 3; Госцеў А. Азбука гарадзенца // Rocznik Grodzieński. – Grodno: Zjednoczenie społeczne Polska macierz szkolna, 2011. – С. 186–187; А. Кібінь. Ад Ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурныя трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – № 5. – С. 138.

"Муза" – гродзенскае таварыства аматараў драматычнага і музычнага мастацтва "Муза", "Літаратурна-артыстычны клуб "Муза", створанае ў 1907 г. групай мясцовай інтэлігенцыі: са шляхты Эйсмант Ю. і Рыдзеўская В.; лекары Тальгейм А. К., Дамброўскі К. К., Шумкоўскі С. А., Якімовіч І. Ю., Жэчкоўскі Г. І.; правізары *Стэмпнеўскі Э. І.*, Сангін А. С.; памочнік прысяжнага паверанага

Янкоўскі В.; ветэрынарны ўрач Леановіч В. і інш. Мэтаю было "даць сваім сябрам магчымасць праводзіць свабодны ад заняткаў час з карысцю і задавальненнем і садзейнічаць развіццю сярод іх драматычнага і музычнага мастацтва і азнаямленню з творамі літаратуры". Першапачаткова М. аб'яднала 61 чал., але хутка выросла да 173 чал. 3.11.1908 г. была занесеная ў рэестр таварыстваў і саюзаў Гродзенскай губ. Сябры М. дзяліліся на дзейных, апекуноў і ганаровых. Справамі таварыства кіравалі Праўленне (выбарнае з 6 чальцоў і 3 кандыдатаў) і Агульны сход. Першым кіраўніком "Музы" быў А. Тальгейм (1907–1915, 1923–1926?), затым – Г. Жэчкоўскі (з 1917). Апошні сфармаваў тры секцыі: музычную, драматычную і літаратурную. М. мела сваю пячатку з надпісам "Муза". Таварыства арандавала частку дома Марголіса на пл. Стэфана Баторыя, № 11 і на пачатку 1920-х адкрыла філіял на вул. Кірхавай (Акадэмічнай) для мерапрыемстваў у летні перыяд. Да 1923 ён ужо займаў паўночна-ўсходнюю частку гарадскога парку, адгароджаную драўляным плотам. На тэрыторыі было 6 аднапавярховых будынкаў, у якіх размясціліся кабінет для адміністрацыі і канцылярыя; памяшканне для масавых мерапрыемстваў і буфета; памяшканне для заняткаў секцыі і гурткоў, рэпетыцый і гульняў таварыства; більярдная і чытальня. Сярод мерапрыемстваў таварыства былі: тэатральныя спектаклі, музычныя канцэрты, танцавальныя вечарыны, раўты, сустрэчы з пісьменнікамі, лекцыі, гульні (карты, більярд), латарэі і інш., якія часта спалучаліся паміж сабой. У 1908 М. дала 11 аматарскіх спектакляў, у 1909 – 25 літаратурна-музычных і танцавальных вечарын, у 1910 – 11 аматарскіх спектакляў, у 1911 – адпаведна 17 вечарын і 8 спектакляў. У асноўным ставіліся камедыі і фарсы. У другой палове 1920-х таварыства ўзначаліў В. І. Нелюбовіч, які перабудаваў яго ў прадпрымальніцкую арганізацыю (па словах А. Тальгейма ў "кулінарна-гульнявы клуб"). Прыхільнікам культурна-асветніцкай дзейнасці таварыства ўдалося перамагчы, і ў 1930 яго ўзначаліў Э. І. Стэмпнеўскі, а абавязкі сакратара стаў выконваць дырэктар музея Ядкоўскі Ю. У формах працы спалучалася асветніцкая і прадпрымальніцкая дзейнасць: папулярныя лекцыі на грамадскія тэмы, літаратурныя вечарыны, гарадскія святы і гулянні, музычна-вакальныя канцэрты, танцавальныя вечары, гульні (карты, більярд), чытальная зала бібліятэкі. У 1939 г. таварыства было закрытае савецкай уладай як "памешчыцка-паляўнічы клуб", а маёмасць была нацыялізаваная.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 103, воп. 1, с. 111, 166; Иващенко Н.А. Александр Тальгейм и его "Муза" // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 464–469; Игнатович Ф., Игнатович Г. Гродненское Общество любителей драматического и музыкального искусства "Муза" (1917–1939 гг.) // Гарадзенскі соцыум. Чалавек у прасторы горада. XV-XX стст.: зборнік навуковых артыкулаў / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука і А. Краўцэвіча. – Мінск: Зміцер Колас, 2015. – С. 318–332.

Музей Ажэшкі Элізы. Быў задуманы пасля смерці пісьменніцы. *Ядкоўскі Ю.* падрыхтаваў спіс рэчаў, пакінутых Ажэшкай. Аднак *вайна Першая сусветная,*

вайна савецка-польская не дазволілі здзейсніць планы адразу. Але дом-музей Ажэшкі быў створаны і існаваў да 1939 г. Новае жыццё музей атрымаў у савецкі час. Рашэнне аб яго стварэнні было прынятае Гродзенскім гаркамам партыі ад 13.12.1940, Беластоцкім абкамам партыі ад 21.01 і 5.02.194 і Бюро ЦК КП Беларусі ад 16.04.1941. У Гродзенскім гістарычным музеі і ў нейкай прыватнай асобы захоўваліся на гэты час некаторыя рэчы пісьменніцы: канапа, пісьмовы стол, 2 шафы, 2 люстэркі, 7 старых парваных крэслаў, буфет, 10 партрэтаў у рамах, вісячая лямпа – паводле аднаго акта. Паводле іншага акта значыліся 4 партрэты Ажэшкі, 2 партрэты яе бацькоў, 2 фотаздымкі яе дома, 2 яе бюсты, 2 крэслы і хустка з вышыўкай Ажэшкі, 4 альбомы гербарыяў, друкаваны зборнік лістоў Ажэшкі, 3 рукапісы рамана "Над Нёманам", медальён з акварэллю яе партрэта, барэльеф *Касцюшкі Т.* Зарганізаваная ў 1940 камісія сцвярджала, што шмат рэчаў польская ўлада вывезла ў Вільню. Праз 2,5 месяцы пачалася *вайна Айчынная* 1941–1945. Паводле рашэння Гродзенскага аблвыканкама 15.06.2001 у доміку Ажэшкі быў адкрыты мемарыяльны пакой. Тут захаваліся: мармуровы камін, драўляны тамбур, упрыгожаны разьбой, балконная агароджа. Ёсць прыжыццёвыя выданні твораў Ажэшкі, карціны, гербарый, стол, крэслы, канапа. Творчыя людзі збіраюцца ў доміку на пасяджанні салона "У пані Элізы". З 2005 адноўленая традыцыя пісьменніцы – дабрачынныя ялінкі для дзяцей-сірот. З 2013 праводзяцца вечарыны "Эліза Ажэшка запрашае", з 2014 – гістарычная вандроўка па вул. Ажэшкі, падчас якой працуюць фотамайстэрня, кавярня "Гарбата ад пані Элізы", рамесны квартал, адбываюцца тэатралізаваныя прадстаўленні.

Літ.: Галоўная кніжніца Прынёмання: да 180-годдзя з дня заснавання ДУК "Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага" / Склад.: Л.В. Мальцава і інш. – Гродна, 2010; Домік Элізы Ажэшкі. – Гродна: ДУК "Гродзенская навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага". – Гродна, 2011; Хацкевич А. Из истории музея Элизы Ожешко // Гродзенская праўда. – 1995. – 29.07. – С. 3; Jodkowski J., Pamiątki po E. Ozeszkowej w Muzeum Grodzieńskim // Nowe Życie. – 1925. – N 39. – S. 2–3; Jodkowski J., Pamiątki po E. Ozeszkowej w Grodnie // Elizie Ozeszkowej w hołdzie. Księga zbiorowa wydana staraniem Komitetu budowy pomnika E. Ozeszkowej w Grodnie / S. Nostitz-Jackowska i J. Jodkowski. Grodno, 1929. – S. 44–48.

Музей-аптэка на пл. Савецкай, 4, створаны навукова-вытворчым кааператывам "Біятэст" і адкрыты 23.07.1996 г. у будынку былой *аптэкі езуітаў*. Арганізатарам і першым супрацоўнікам музея быў гісторык медыцыны і краязнаўца Ф. І. Ігнатовіч. У экспазіцыі прадстаўленыя лекавыя сродкі, аптэчны посуд і абсталяванне, медыцынскія інструменты, а таксама дакументы і кнігі XVIII – першай пал. XX стст. па медыцыне і фарматэўтыцы, рэкламная прадукцыя.



Музей Багдановіча Максіма, знаходзіцца на вул. Багдановіча, 1, створаны ў 1986 г. З 1995 – самастойная установа культуры. З 1.03.2014 – літаратурны аддзел Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. На экспазіцыйнай плошчы ў 150 кв. м захоўваюцца прадметы матэрыяльнай і духоўнай

С. 879

культуры, звязаныя з жыццём і дзейнасцю *Багдановіча М.* Сярод экспанатаў ёсць асабістыя рэчы паэта (чайная лыжка, драўляная рамка для фотаздымкаў), ягонай маці (шкатулка), арыгіналы фотаздымкаў Багдановічаў, 2 арыгіналы зборніка "Вянок". Экспазіцыі размеркаваныя ў 5 залах. У зале "Гродзенскі перыяд жыцця сям'і Багдановічаў" можна азнаёміцца з дзіцячымі гадамі жыцця Багдановіча Максіма, яго бацькі Адама і маці Марыі. У астатніх залах ёсць інфармацыя пра грамадска-літаратурны рух канца 19 – пачатку 20 ст., літаратурнай Гродзеншчыне, сучасных паэтах Гродна і ваколіц. У 1980–1990 у музеі працаваў пад кіраўніцтвам паэткі *Бічэль Д.* літаратурны гурток "Вянок".

Літ.: Гайко Е.В. Багдановіча Максіма музей в Гродно // Рэгіёны Беларусі. Т. 4, кн. 1. – Мінск: БелЭн, 2014, с. 59–60; Музей Максіма Багдановіча ў Гродна. /фота і тэкст падрыхтавалі Л. Даўгела і А. Чобат. – Гродна: ГАУД, б.г.

Музей гісторыі рэлігіі гродзенскі дзяржаўны (да 09.1989 – Рэспубліканскі музей гісторыі і гісторыі рэлігіі, да 2005 – Рэспубліканскі музей атэізму і гісторыі рэлігіі) – адзіны ў Беларусі музей, які займаецца праблемамі гісторыі рэлігіі і царквы ў кантэксце беларускай гісторыі і культуры. Створаны ў Полацку ў 1973, быў пераведзены ў 1977 у Гродна (1817 адзінак захоўвання) у будынак жаночага *манастыра Раства Багародзіцы*. Дырэктарам быў прызначаны *А. М. Карпюк*. З 2005 М. знаходзіцца на вул. Замкавая, 16, у будынках былога комплекса палацаў Храптовіча і Ляхніцкага. С 1979 па 1990 адбываліся рэстаўрацыйныя працы і фармаванне асноўных экспазіцый (30931 адзінка захоўвання). Апошнія былі пабудаваныя паводле храналагічна-канфесійнага прынцыпу. Першыя залы экспазіцый былі адкрытыя для наведвальнікаў у 1985. М. усталяваў сувязі з Рускай праваслаўнай царквой і ініцыяваў далучэнне *царквы Барысаглебскай на Каложы* да *сабора Свята-Пакроўскага* з мэтаю адраджэння унікальнай царквы. М. займаецца экспедыцыйнай і навукова-даследчай дзейнасцю, праводзіць канцэрты духоўнай і класічнай музыкі, Дні народных майстроў. Са студзеня 1980 у музеі працуе рэстаўрацыйная майстэрня. Пасля пераносу музея ў будынкі на вул. Замкавай першая эксазіцыя "Эпоха. Час. Будынак" адкрылася для наведвальнікаў у канцы 2009. У 2011–2012 сталі даступнымі залы "Рэлігія і культура". З 2013 гродзенская *іўдзейская суполка* перадала М. два памяшканні ў Вялікай харальнай *сінагозе*, дзе музей стварыў экспазіцыю "Музей на Траецкай". М. праводзіць выставы пасхальных яек, абразоў XVII – пач. XX ст. Супрацоўнікі музея ўдзельнічаюць у міжнародных праектах, падтрымоўваюць кантакты з калегамі і вучонымі Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны. Дырэктар музея Л. А. Карнілава і рэстаўратар У. М. Кіслы ўзнагароджаныя знакамі "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" .

С. 880

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 132–133.

Музей гісторыі Гарадніцы, з 1994 г. знаходзіцца ў *доме рамесніка.* У фае змешчаная выстава-продаж творчай прадукцыі народных майстроў: вырабы са скуры, саломкі, гліны, тканін (цацкі, сурвэткі, лялькі-абярэгі, вышыўка), карціны самабытных мастакоў. У першай зале (былы жылы пакой) наведвальнікі знаёмяцца з вынікамі дзейнасці рэфарматара *А. Тызенгаўза* і яго паплечнікаў, гісторыяй Гарадніцы, прадукцыяй мануфактур. У былой кухні створаны інтэр'ер кухні гараджаніна канца XVIII ст.: печ, мэбля, посуд. У былых сянях стаіць куфар, экспануюцца прылады працы рамесніка. Зала 3 (другі жылы пакой) – выставачная, яна прысвечаная экспазіцыям, якія рэгулярна змяняюцца: тут выстаўляюцца сучасныя народныя майстры Гродзеншчыны са сваімі вырабамі.

Літ..: Астравецкая Л. Падарожжа ў XVIII ст. чакае наведвальнікаў Доміка рамёстваў, што адкрыўся ў Гродне // Чырвоная змена. – 1994. – 13 жніўня. – С. 5; Хроніка музея за 2001 – 2011 гады // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 8. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2012. – С. 169–221.

Музей гісторыка-археалагічны, пачаў сваю гісторыю з лістапада 1913 г., калі гарадская *дума* выдзеліла яму 300 руб. Па Гродзенскай губ. пачаўся збор экспанатаў. Сярод першых былі каля 70 прадметаў каменнага веку, сабраных у ваколіцах горада *Арлоўскім Я. Ф.* Рэдкім экспанатам быў *прывілей* Аўгуста III *цэху* рыбакоў на права лоўлі рыбы ў *Нёмане*. У сакавіку 1920 пры гродзенскім павятовым управленні была створаная Камісія апекі над помнікамі мастацтва і культуры. Музейную справу працягнуў вучань Арлоўскага, *Ядкоўскі Юзаф,* які меў іншую, супрацьлеглую мэту – падкрэсліць спрадвечнасць існавання польскай культуры на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства. Затым збор матэрыялаў ажыццяўлялі на загад Гродзенскага *камітэта ваенна-рэвалюцыйнага*. 9.12.1920 адбылося ўрачыстае адкрыццё экспазіцыі музея. Тады ён размяркоўваўся ўсяго ў 4 пакоях будынка *старостава*. Тут захоўваліся матэрыялы археалагічныя і геалагічныя, культавыя рэчы, зброя, узоры народнага рамяства і мастацтва, нумізматыка і сфрагістыка, партрэты, абразы, карціны з выявамі Гродна. Была бібліятэка (каля 3 тыс. тамоў, у тым ліку прыватныя кнігі *Станіслава Аўгуста Панятоўскага* і выданні *друкарань гродзенскіх*, беластоцкіх, *тызенгаўзаўскіх* і супрасльскіх). Працавалі архіў, фатаграфічная і інвентарна-кансерватарская майстэрні. На пачатку 1930-х музей пачаў сваё жыццё і дзейнасць у *Старым замку*. Падчас *вайны Вялікай Айчыннай* музей не працаваў і адчыніўся ў 1944, атрымаўшы статус абласнога. З 1945 называецца Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. У сярэдзіне 1950-х сюды перавялі былы яго філіял, *музей прыродазнаўчы*.

40 сваіх апошніх гадоў жыцця аддаў музею Н. Я. Улейчык (1881–1965), умелец сталяр-чырвонадрэўшчык. Яшчэ пры Ядкоўскім паводле яго малюнкаў рабіў вітрыны, стэнды, шафы, мэблю, стылізаваную пад XVI ст. У 2000 г. калекцыя музея налічвала звыш 180 тыс. прадметаў. Экспазіцыі музея прадстаўленыя ў трох будынках: *Старым і Новым замках*, у *доме басняцкім*. Асноўная частка экспазіцыі музея размешчаная ў *замку Старым*. Тут можна пазнаёміцца са

старажытнымі помнікамі Панямоння (крэмнездабыўнымі шахтамі, знаходкамі з могільнікаў, косткамі маманта, матэрыяламі археалагічных раскопак *Замкавай гары*, помнікамі *школы архітэктуры XII ст.* і інш.). У Новым замку перыядычна адбываюцца часовыя выставы (мастацкія, гістарычныя, вырабаў майстроў і рамеснікаў, выратаваных каштоўнасцей і інш.). У доме басняцкім (рамеснікаў) знаходзіцца *Музей гісторыі Гарадніцы*. МДГА мае аддзел старадрукаў і пры ім чытальную залу, дзе можна працаваць з кнігамі і перыёдыкай са старажытнага да новага часу. Навукова-асветніцкі аддзел праводзіць па музеі аглядныя і тэматычныя экскурсіі, абслугоўвае па праграмах "Музей дзецям", "Музей школе", "Музей і сям'я". У 2004 музей атрымаў увесь палац замка Новага, у 2009 – былыя гаражы аблвыканкама (будынак з боку вул. Давыда Гарадзенскага).

З адбудовай *замка Старога* будуць зробленыя новыя экспазіцыі, дзе, напэўна, матэрыялы XVIII – пачатку XX ст. зоймуць больш месца, перагледжаныя будуць пэўныя старонкі *вайны Вялікай Айчыннай* (пераслед яўрэяў і палякаў, барацьба Арміі Краёвай, жыццё гарадзенцаў пад акупацыяй і інш.).

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 371–381, 395; Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння. – Мн., с. 62–63; Каталог выданняў XV-XVI стагоддзяў з фондаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея. – Слонім, 2003; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 23, 87; Хроніка музея за 2001 – 2011 гады // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 8. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2012. – С. 169–221; Царук В.М. Гродзенскі дзяржаўны гісторыка археалагічны музей. – Гродна: ГАУП "Гродзенская друкарня", 2000; Царук В.М., Л. Фёдарава. Хроніка музея за 80 гадоў (1920–2000) // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 6. – Гродна, 2003; Chwalewik E. Zbiory Polskie. Archiwa, biblioteki, gabinety, galerje, muzea i inne zbiory pamiątek przeszłości w Ojczyźnie i na Obczyźnie / E. Chwalewik. T. 1. – Warszawa, Kraków: wyd-wo J. Morkowicza, 1926. – S. 113–114; Jodkowski J. Muzeum w Grodnie (historia) // Nowe Życie. – 1923. – № 28–47, 48; Jodkowski J., Cenny dar dla muzeum Grodzieńskiego // Nowy Dziennik kresowy. – Grodno. – 1924. – 23.04; Jodkowski J., Królewski Zamek Stary i muzeum w Grodnie // Województwo Białostockie. Przeszlość i zabytki. – Białystok, 1929. – S. 22–24; Jodkowski J., Muzeum Państwowe w Grodnie. VII wystawa. – Grodno, 1929. – 9 s; Muzeum w Grodnie. Zarys dziejów powstania i rozwój. 1920–1922. – Grodno, 1923; Muzeum w Grodnie. Sprawozdanie z czynności za rok 1923. – Grodno, 1924; Muzeum w Grodnie. R. II. Sprawozdanie z czynności za rok 1924. – Grodno, 1925; Prace i Sprawozdania Muzeum w Grodnie. Nr 1. – Grodno, 1936.

Музей прыродазнаўчы, музей прыроды. *Станіслаў Жыўна* ахвяраваў гораду сваю багатую калекцыю пры ўмове, што будзе кіраўніком прыродазнаўчага музея. Мясцовая рада 14.06.1930 зацвердзіла Статут і выбрала Камітэт па справах музея (30.04.31 унесеныя праўкі). У апошні ўвайшлі прадстаўнікі Рады гарадской, магістрата, пачатковай і сярэдняй адукацыі, віленскай дырэкцыі дзяржаўных лясоў, павятовай аховы прыроды, таварыства паляўнічых, дэлегата ад супольнасці, выбранага на гарадской радзе, кіраўніка музея прыроды. Скрыні спачатку паставілі ў некалькіх пакоях пажарнай аховы. У канцы 1926

магістрат знайшоў месца для музея (цяпер вул. Валковіча, 1), зрабіў шафы, а ў бюджэце выдзеліў крэдыты на дзейнасць музея. 21.11.1926 адбылося ўрачыстае асвячэнне музея і адкрыццё для публікі. Дадатковыя дары ахвяравалі: інжынер Адам Дзержаноўскі (106 экспанатаў водных птушак з усяго свету), граф Атаназі Мячынскі (збор матылёў). За 3 гады Жыўна і камітэт музея зрабілі многа, каб мець узоры рэгіянальных прадстаўнікоў прыроды Гродзеншчыны. Выдалі справаздачу за 3 гады і разаслалі па бібліятэках, універсітэтах, музеях, вучоным. Наладзілі абмен узорамі з Заалагічным музеем Варшавы. Атрымалі да сваіх 4 пакояў яшчэ 2. У 1929 музей налічваў 76 сысуноў, 417 птушак, 599 матылёў, 1991 жукоў, 22 мушкі, 125 птушак, яшчарыц, 28 рыб, змей, 110 мінералаў, 456 акамянеласцяў. На 1935 г. пабывалі ў музеі 470 школьных экскурсій (12 920 вучняў), 3076 вайскоўцаў Войска Польскага, 1 558 прыватных асоб. Усё сабранае Ж. захоўваецца ў фондах і экспазіцыях аддзела прыроды *Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея*.

Крын. і літ.: ДАГВ, ф. 110, воп.1, с. 3, а. 14, 17–18; с. 6, а. 5; с. 13; Гараднянскі Р., Свет калекцый Ст. Жыўны // Бел. Пушча. – 1996. – № 1 (4) – С.14; Літ.: Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСа-Принт, 2013. – С. 103–104, 109, 120; Chwalewik E. Zbiory Polskie. Archiwa, biblioteki, gabinety, galerje, muzea i inne zbiory pamiątek przeszłości w Ojczyźnie i na Obczyźnie / E. Chwalewik. T. 1. – Warszawa, Kraków: wyd-wo J. Morkowicza, 1926. – S.114; Jakimowicz J. Miejskie muzeum przyrodnicze // Niemen. – Grodno. – 1935. – Z. 1. – S. 13–15.

Мураўёў Міхаіл Мікалаевіч, мянушкі: Мураўёў-Віленскі (з 29.04.1865), Мураўёў Вешальнік (3.10.1796, в. Сырэц Пецярбургскай губ. – 10.09.1866, там жа) – гродзенскі губернатар з 24.08.1831 да 12.01.1835. Атрымаў добрую хатнюю адукацыю, бо яго бацька быў заснавальнікам школы калонаважатых. У 1809 паступіў у Маскоўскі ўніверсітэт на фізіка-матэматычны факультэт, дзе ў 14-гадовым узросце заснаваў "Маскоўскае таварыства матэматыкаў". Чытаў лекцыі па аналітычнай і начартальнай геаметрыі, якія не выкладаліся ва ўніверсітэце. У снежні 1811 паступіў у школу калонаважатых, 27.01.1812 атрымаў чын прапаршчыка світы Яго імператарскай Вялікасці па кватэрмайстарскай частцы. У канцы сакавіка 1812 быў прыкамандзіраваны да начальніка штаба Заходняй арміі графа Л. Л. Бенігсэна. Удзельнічаў у Барадзінскай бітве і быў цяжка паранены. Пасля выздараўлення, на пачатку 1813 быў накіраваны за мяжу, прымаў удзел у бітве пад Дрэздэнам. У жніўні 1814 быў прызначаны ў гвардзейскі Генеральны штаб. Чалец патаемных таварыстваў "Свяшчэнная арцель" (1814), "Саюз выратавання" (1817), "Саюз дабрабыту". Пасля выступлення лейб-гвардыі Сямёнаўскага палка ў 1820 адышоў ад рэвалюцыйнай дзейнасці. 7.11.1820 выйшаў у адстаўку па стане здароў'я і пасяліўся ў маёнтку Лузінцы Смаленскай губ. 23.01.1826 быў арыштаваны па справе дзекабрыстаў і пасаджаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць. 14.06.1826 вызвалены і ў ліпені залічаны на службу з вызначэннем у армію. У студзені 1827 прадставіў Мікалаю I запіску аб паляпшэнні мясцовых адміністратыўных і судовых устаноў і ліквідацыі ў іх хабарніцтва. З 12.06.1827 – віцебскі

віцэ-губернатар, калежскі дарадца, з 15.09.1828 – магілёўскі губернатар, з 17.01.1830 – стацкі дарадца. 22.12.1830 падаў запіску аб неабходнасці распаўсюджвання расійскай сістэмы адукацыі ў Беларусі і Літве. Паводле яго прадстаўлення 1.01.1831 выйшаў указ цара аб ліквідацыі Літоўскага статута, закрыцці Галоўнага трыбунала і падпарадкаванні жыхароў Беларусі і Літвы агульнаімперскаму заканадаўству, увядзенні рускай мовы ў судаводстве. Падчас паўстання 1830–1831 быў генерал-кватэрмайстрам і генерал-паліцмайстрам пры галоўнакамандуючым Разэрвовай арміяй графе П. А. Талстым, прымаў удзел у пагроме паўстанцкага руху ў Віцебскай, Мінскай і Віленскай губ. У сваёй запісцы ад 29.08.1831 прапанаваў зачыніць Віленскі ўніверсітэт як "рассадник вольнодумства и непокорности".

24.08.1831 прызначаны гродзенскім грамадскім губернатарам. Прыклаў максімум сіл для ліквідацыі наступстваў *паўстання 1830–1831* і русіфікацыі губ.: сасланыя ў Сібір князь Р. Е. Сангушка, у "аддаленыя мясцовасці імперыі" ксёндз *Зялёнка*; звольнены дырэктар вучылішч А. Сухадольскі, зліквідаваны кляштар Гродзенскі дамініканскі разам з яго гімназіяй. У ліпені 1833 М. зацвердзіў прыгавор вайсковага суда аб смяротным пакаранні *М. Валовіча*. Пры дапамозе М. у царкве *Барыса і Глеба на Каложы* адрадзіліся праваслаўныя абрады, каб прывучыць уніяцкае насельніцтва да вяртання ў праваслаўную царкву. У 1834 пасля чарговага звароту ў МУС у Гродне была адчыненая *бібліятэка публічная*.

17.04.1857 М. стаў міністрам дзяржаўных маёмасцяў і хутка павялічыў суму аброка дзяржаўным сялянам. З 3.01.1857 з'яўляўся чальцом Галоўнага камітэта па сялянскай справе, у якім зрабіў шмат намаганняў, каб запаволіць ход рэформы па адмене прыгонніцтва. 11.12.1862 звольнены ў адстаўку.

З 1.05.1863 Мураўёў быў прызначаны віленскім, гродзенскім, ковенскім і мінскім генерал-губернатарам, камандуючым войскамі Віленскай вайсковай акругі, галоўным начальнікам Віцебскай і Магілёўскай губ. Мураўёў прымаў рашучыя меры па падаўленні рэвалюцыйных выступленняў: за два гады былі забітыя 128, сасланыя на катаргу 972 і на пасяленне ў Сібір 1 тыс. 427 чалавек, спаленыя вёскі Яваражка пад Беластокам і Шчукі Гродзенскай губ., выселеныя сем'і казённых сялян з в. Крашкле Лідскага ў. і Шумы Гродзенскага ў. М. накіраваў свае сілы на русіфікацыю беларускіх зямель, на аслабленне каталіцкай і ўзмацненне праваслаўнай цэркваў, на паглыбленне расійскай адміністрацыі, дваранская нерухомасць была абкладзеная 10% падаткам з прыбыткаў. 17.04.1865 атрымаў тытул графа з правам пісаць "граф Мураўёў-Віленскі". Пасля смерці пахаваны на Лазараўскіх могілках Аляксандра-Неўскай лаўры ў С.-Пецярбургу. У 1898 у Гродне яго імем названая царкоўна-прыходская школа.

Мучынскі Францішак Адамавіч – гродзенскі мечнік, "шляхціц, жыхар Гродна, дэпутат двух сеймаў". У 1791 набыў будынак, у якім цяпер знаходзіцца Музей рэлігіі, у спадкаемцаў *А. Тызенгаўза* (былы *палац Храптовічаў*). У 1800 М. прадаў яго з усімі гаспадарчымі пабудовамі былому палкоўніку

войск ВКЛ *І. Ляхніцкаму*. Быў удзельнікам *паўстання 1794 г.*, дэлегаваны з Гродна ў Найвышэйшую раду Літоўскага народу. Прыбыў у Вільню 22 мая з акцэсам Гродна аб далучэнні да паўстання. *Прэзідэнт* Гродна падчас *вайны 1812 г.* У 1817 – старшыня 2-га дэпартамента Гродзенскага галоўнага *суда,* выбраны дырэктарам гродзенскага аддзялення Расійскага *таварыства біблейскага.*

Літ.: Iwaszkiewicz J. Litwa w roku 1812. – Kraków, Warszawa, 1914 – S. 150; Żytkowicz. Litwa i Korona w r. 1794 // Ateneum Wileńskie. – Wilno, 1937. R. 12. – S. 546.

Мучынскі Юзаф (каля 1727, Гарадзенскі пав. – 4.02.1793, Гродна) – доктар тэалогіі, з 1783 пробашч фарнай парафіі, рэктар гарадзенскай школы Адукацыйнай камісіі. Быў уладальнікам зямельных пляцаў. Яму належалі землі: 1) у левай частцы вул. Плябанскай, каля канца вул. Цеснай з вул. Замкавай, да вул. Жыдоўскай Школьнай па-над ровам *р. Гарадніца*; 2) каля могілак яўрэйскіх над р. Гарадніца да завулка з *Рынку Нямецкага*; 3) у левай частцы завулка з вул. Петанскай ад Рынку Нямецкага да р. Гарадніцы, што выходзіць на Віленскую дарогу; 4) на рагу тылу *кляштара дамініканскага*; 5) у левай частцы завулка з Рынку Нямецкага да р. Гарадніца, паміж пляцамі Валпенскіх і *Масальскіх*. У 1783 М. турбаваўся аб пераносе *могілак фарных* за горад "па прычыне заразных смуродаў, асабліва падчас летняй спякоты". Намаганнямі ксяндза ў 1780-я гады ўдалося паправіць дах Фары Вітаўта і будынак плябаніі пасля *пажару* 1782. Пахаваны ў *касцёле Св. Францішка Ксаверыя.*

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 82, 102, 227; Obiasnienie interesu Miasta Sejmowego J.K.Mci Grodna. – Grodno, 1789. – S. 37–38.

Мыдляж Стэфан (1890, Люблін – 1944) – быў актыўным сябрам Арганізацыі Нацыянальнай Моладзі Сярэдніх Школ і "Petu", у 1905 г. удзельнічаў у школьнай забастоўцы. Падчас навучання на Гандлёвых курсах імя Зялінскага ў Варшаве быў сябрам Нацыянальных груп, Сяброўскай Групы "Зэт" і яго Братэрскага гуртка. З 1915 служыў у 5 пяхотным палку Брыгады Польскіх Легіёнаў. Пасля прысяжнага крызісу быў інтэрнаваны. У 1918–1920 працаваў інспектарам у Гродзенскай Крэсовай Ахове. Падчас *Другой сусветнай вайны* быў у *АК*, пасля арышту скончыў жыццё самагубствам

Літ.: O niepodległą i granice. T. 7. Raporty Straży Kresowej 1919–1920 ziem północnowschodnich opisane. / Wstęp, wybór i opracowanie J. Gierowska-Kałłaur, Warszawa 2011, s. 22, 46–47.

Мытня гродзенская. У 1498 г. мыта здавалася ў арэнду на 3 гады кракавяніну Г. Карловічу. Пасля далучэння Гродна да Расійскай імперыі, паводле ўказу Кацярыны II ад 14.12.1795 у горадзе на правым беразе *Нёмана* была ўтвораная мытня на мяжы ВКЛ з Прусіяй. У перыяд *вайны 1812 г.* камітэт скарбу ВКЛ 29 жніўня прызначыў інтэндантам гродзенскай каморы Яна Лінкевіча, пісарам – Яна Васілеўскага, кантралёрам – Юзафа Кудрэвіча. У зборах

Аддзела рукапісаў і аддзела старадрукаў Бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта знаходзяцца кнігі гродзенскай мытнай каморы XVI–XVII стст.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1168, воп. 1, с. 3, а. 139; ф. 2002, воп. 1, с. 8, а. 37, 39; Гардзееў Ю. Гісторыка-культурная спадчына Гародні магдэбургскага перыяду // Новае слова ў гісторыі і культуралогіі V Міжнароднага кангрэса беларусістаў "Новае слова ў беларусістыцы". – Мн, 2012. – С. 29; Саяпин В.Ю. Таможенная служба. В двух книгах. Кн. 1. Мыто и мытники; Кн. 2. Борьба с конрабандой. – Гродно: Гродн. тип., 2005; Maroszek J. Dzieje województwa podlaskiego do 1795 roku. – Białystok: Wyd-wo Uniwersytetu w Białymstoku, 2013. – S.363.

Мядзёлка Паўліна Вікенцьеўна (12.09.1893, Будслаў Мядзельскага р-на – 13.02.1974) – беларуская актрыса і грамадска-палітычны дзеяч. У 1909–1912 жыла ў Вільні. Удзельнічала ў Віленскім музычна-драматычным гуртку. Пасля 1912 жыла ў Пецярбургу і вучылася на Вышэйшых камерцыйных курсах. З 1916 была сакратаром Беларускага камітэта дапамогі ахвярам вайны, працавала настаўніцай у Кіеве і Мінску. З пачатку 1919 была ў Вільні, а потым – у Гродне. 16.07.1919 была арыштаваная і да лістапада сядзела ў польскім арышце. Пасля вызвалення жыла ў Мінску, дзе яе зноў арыштавалі і вывезлі ў Варшаву, затым у Вронкі. З 1921 жыла і працавала ў Коўне, а з 1922 – у Латвіі, дзе працавала настаўніцай у беларускай гімназіі ў Дзвінску і стварыла там харавы і драматычны гурткі (1922–25). У 1925 выехала ў савецкую Беларусь. Працавала ў Інстытуце беларускай культуры і ў Горацкай сельска-гаспадарчай акадэміі (1927–1930). У 1930 арыштаваная па сфабрыкаванай справе аб "Саюзе вызвалення Беларусі" і выселеная ў Казань. Пасля вызвалення працавала настаўніцай у Будславе (1947–1958). Заслужаны дзеяч культуры БССР (1966). Аўтар тэатральных успамінаў (Полымя, 1959. – № 5–7) і ўспамінаў "Сцежкамі жыцця" (Полымя, 1993. – № 2–5).

Літ.: Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich= Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– S. 213.

Н

“Набат” – штотыднёвая газета, орган Гродзенскага падпольнага камітэта Камуністычнай партыі Літвы і Заходняй Беларусі. Выходзіла з 16 сакавіка па красавік 1919 г. Рэдактар С. Капланскі.

Навакоўскі Станіслаў Ян Непамуцэн (1798 – 23.11.1862, Гродна) – акцёр, дырэктар тэатраў, спявак. У 1826/27 граў у Вільні, дзе належаў да трупы віленскага тэатра і ўваходзіў у склад дырэкцыі. Выступаў у 1844/45 у Вільні, кіраваў трупай, якая выступала ў *ратушы*. У 1833–1836, 1839, 1853–1859 кіраваў тэатральнымі трупамі ў Гродне.

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 341; Renikowa W., Tradycje teatralne Grodna // Wilno i kresy Północno-Wschodnie. T. II. Kultura i trwanie., Białystok 1906, s.141

Навумавічы, форт №2 – месца расстрэлу гродзенскай польскай інтэлігенцыі. Першы раз гэта адбылося 20.10.1941, калі былі забітыя больш за 20 чалавек (сярод іх суддзя В. Гедройц, настаўнік гімназіі і заснавальнік заапарка *Ян Каханоўскі*). Гэты акт здзейснены фашыстамі за забойства камісарам *Арміі Краёвай* Вітольдам Матушэўскім нямецкага жандара і паліцэйскага-паляка (па інш. дадзеных беларуса). 15.07.1943 – другая масавая расправа немцаў над польскім насельніцтвам Гродна (звыш 70 чал.). Сярод забітых былі настаўнікі, юрысты, лекары, святары і іншыя прадстаўнікі інтэлігенцыі (дырэктар тытунёвай фабрыкі Я. Шыманскі, віцэ-прэзідэнт горада Р. Савіцкі).

Літ.: Мілеўскі Я.Е., Паміж Чырвонай зоркай і свастыкай // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам, Гародня, Вроцлаў, 2014, с. 393–394; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005- 2005). – Гродна: ЮрСапрынт, 2020.

Нагой Георгі Іванавіч – пасол вялікі маскоўскі (1567). Дварэцкі Івана IV. Са старажытнага баярскага роду, які меў сваяцкія сувязі з родам цара. Непасрэдна парадніўся з Іванам Жахлівым тады, калі той ажаніўся (у сёмы раз) з Марыяй Нагой. Быў у Гродне з пасольствам і трапіў на *гравюру Адэльгаўзера-Цюнта.*

Нагорскі Станіслаў Фелікс (1826 – 11.12.1896, Гродна) – прыватны адвакат, сябра *Ажэшкі Э.* з 1860-х гадоў, яе юрыдычны дарадца (з 1867), а з 1894 – муж. Тытулярны радца, працаваў у Гродзенскай палаце грамадзянскага суда.

Удзельнік *паўстання 1863–64*. Быў арыштаваны, але пасля прашэння хворай жонкі вызвалены. Старшыня ў розныя часы такіх сацыяльных ўстаноў, як: сіроцкі суд, мяшчанская апека, мясцовае крэдытнае таварыства, дабрачыннае таварыства, таварыства дапамогі вучнёўскай моладзі, таварыства ўзаемнага крэдыту. Падчас *пажару* 1885 Н. дапамагаў пагарэльцам, як сябра губернскага камітэта, у тым ліку і Ажэшцы Э. У 1895 быў кандыдатам на пост *прэзідэнта Гродна*. Памёр ад паралічу сэрца. Пахаваны на каталіцкіх могілках у сектары D 011. На помніку, пастаўленаму Ажэшкай Э. у 1897, напісаная эпітафія, узятая літаратаркай з Сёмага псалма ў перакладзе на польскую мову Я. Каханоўскага: "На цябе самога Божа я, смутны чалавек, надзею ўскладаю, Ты, калі ласка, паклапаціся пра мяне". Побач з Н. пахаваная Ажэшка Э., а яго першая жонка Леакадзія пахаваная амаль насупраць, у сектары A 014.

Літ.: Jankowski E. Eliza Orzeszkowa. – Warszawa: PIW, 1966. – S. 131–141; 241–246; 276–278, 280–283, 438, 439, 446.

Найдус Лейб (6.10.1890, Гродна – 23.12.1918, Гродна) – яўрэйскі паэт. Дзяцінства правёў на хутары Кусцін (сёння в. Вызгі) каля Кузніцы Сакольскага пав., дзе бацька Ісак Лейбавіч меў скураны завод. Багаты землеўласнік і прадпрымальнік надаваў пільную увагу навучанню сваіх шматлікіх дзяцей. Лейб вучыўся дома і ў пачатковай школе Гродна, з 11 гадоў – у камерцыйным вучылішчы ў Радаме і рэальнай школе ў Беластоку (з апошняй выключаны за ўдзел у *рэвалюцыі 1905–07*), з 1908 – у гімназіі Паўлоўскіх у Вільні. Тут ён пачаў пісаць вершы на польскай, рускай і яўрэйскай мовах (ідыш). На ідышы дэбютаваў вершам "Маладая арфа" у варшаўскім часопісе "Романцайтунг" у 1907, затым друкаваў вершы і пераклады ў шматлікіх перыядычных выданнях, у тым ліку ў Вільні і Гродне. У 1911 вярнуўся ў Кусцін, з пачаткам *вайны Першай сусветнай* сям'я выехала ў Екацярынаслаў. З 1916 Н. жыў у Гродне. Першая кніга вершаў на ідыш "Лірыка" выйшла ў 1915 у Вільні. У 1916–1917 апублікаваў у Гродне літаратурны зборнік "Нёман". У 1918 у Гродне выдаў другую кнігу "Флейта пана" (48 васьмірадковых песень, пераплеценых паміж сабой). Тады ж падрыхтаваў да друку зборнік "Інтымныя песні", але ён быў выдадзены пасля смерці паэта ў 1919. Аўтар паэтычных зборнікаў "Інцімэ нігунім" ("Інтымныя напевы", 1919), паэмы "Дзі эрд дэрвахт" ("Зямля прачынаецца", 1919), а таксама многіх перакладаў з рускай і французскай (А. С. Пушкін, М. Ю. Лермантаў, Ш. Бадлер, Э. Верхарн, Г. Гейнэ, Э. По і інш.). Памёр пасля захворвання дыфтэрыяй, або ад інфаркта. Пахаваны ў Гродне на Новых яўрэйскіх могілках (магіла не захавалася, бо *могілкі* былі зліквідаваныя ў сувязі з будаўніцтвам у 1960-я стадыёна "Чырвоны сцяг"). У 1923 яму паставілі помнік працы варшаўскага скульптара А. Астшэгі – анёл са складзенымі белымі крыламі і апушчанай галавой. Намаганнямі варшаўскага Камітэта і Фонда Найдуса ў Гродне, яго імем назвалі вуліцу (у расійскі час Хлебная), дзе захаваўся дом, у якім жыў Н. Збор твораў Н. выйшаў ў 1926–1928 (5 тт., Варшава). Вершы для дзяцей увайшлі ў зборнік "Лідар" (1938). У 1951 у Буэнас-Айрэсе з'явілася эсэ А. Залускага аб жыцці і творчасці Н. У 1958 тут

апублікавалі выбраныя сачыненні Н. У 1992 на яўрэйскіх могілках у Варшаве паэту паставілі сімвалічны помнік за кошт сабраных грошай гродзенцаў з Ізраіля і Аргенціны, а таксама прыватных асоб-варшавян. У Гродне існуе яўрэйскае таварыства імя паэта Л. Найдуса.

Літ.: Адляніцкі А. Слава і забыццё Найдуса // День. – 2004. – 5–11.02. – С. 13; Карпюк І. Лейб Найдус – сын гарадзенскай зямлі // Биржа информации. – 2000. – 24.02. – № 8. – С. 4; Найдус В., Пясняр гродзенскай зямлі // Беларусіка. – Мінск: Наука і тэхніка, 1995. – С. 176–182; Пивоварчик С., Гродненский поэт Лейба Найдус // Евреи Беларуси. История и культура.: Сб. научных трудов. Вып. 5. – Мн.: "Изд-во "Четыре четверти", 2000. – С. 254- 262; Русская еврейская энциклопедия. Т. 2. – М., 1995, с. 316.

Налкоўская Зоф'я (10.11.1884, Варшава – 17.12.1954, Варшава) – польская пісьменніца, публіцыстка, якая жыла ў Гродне ў 1922–1927 (па вул. Кірхавая, 5). На гродзенскім матэрыяле напісаныя яе раманы "Сцены свету", "Злое каханне" (1928), "Мяжа" (1935), "Вузлы жыцця" (1948), "Вязніцы", літаратурныя мініяцюры "Характары", дзённік "Турма 1924–1926 гг.". Гораду і ваколіцам прысвяціла Н. свае цікавыя нарысы і эсэ, якія друкавала ў польскай перыёдыцы. Напрыклад, яна пісала пра велічны *Нёман*, навакольную прыроду, помнікі гісторыі і культуры (Widzenie bliskie i dalekie. – Warszawa, 1957. – S. 306–315). Муж яе Ян Юр-Гажэхоўскі быў кіраўніком польскай жандармерыі ў Гродне, а яна стварыла "Таварыства апекі над вязнямі" ("Патранат", 1924–26) і дапамагала зняволеным. 20.09.1929 Н. выступіла на адкрыцці ў Гродне *помніка Ажэшцы Э.* і ў прамове сваёй выказалася як феміністка. У 1989 г. па вул. Акадэмічнай на доме № 15, у якім жыла пісьменніца, з'явілася мемарыяльная дошка (скульптар Церабун У.). У Гродзенскім універсітэце знаходзіцца музей Н., створаны кафедрай польскай мовы і літаратуры на чале з яе загадчыцай Мусіенка С.

Літ.: Вашкевіч А. Гарадзенкі. Жаночы след у гісторыі Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 65–69; Мусиенко С. "Когда я думаю о Гродно…" // Гродненская правда. – 1984. – 16.11. – С. 3; С.Ф. Мусиенко. Творчество Зофьи Налковской. – Мн: Наука и техника, 19.; Петрушкевіч А. Старонкі Гарадзеншчыны літаратурнай. Дапаможнік. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 141–145; B.G // Słownik biograficzny historii Polski. T. 1 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – S. 1022–1023.

Нарвойш Францішак Ксаверы Мілікант (герба Касцеша, 15.01.1742, Хадуцішкі, Літва – 25.06.1819, Вільня) – ксёндз-езуіт, матэматык, фізік, астраном. У 1757–1760 вучыўся ў Курляндыі, у Схаембергу, адкуль быў пасланы ў Францыю для ўдасканальвання ў матэматыцы. Хутка быў пераведзены ў Львоў, дзе вучыўся, а потым пэўны час працаваў. Навіцыят і семінарыю скончыў у Вільні (1765–1760). Вывучаў у Віленскай акадэміі: у 1760–61 – філасофію, 1761–63 – матэматыку, у 1765–69 – тэалогію. У 1767–70 быў прафесарам матэматыкі ў Віленскай акадэміі. У 1770–72 па заданні *Тызенгаўза А.* праводзіў працы па расчыстцы рэчышча *Нёмана* ад камянёў на адрэзку ад *Гродна*

да Румшышкаў. У 1772 атрымаў ступень доктара філасофіі і вызвольных навук. З канца 1770-х гадоў жыў і працаваў у *калегіі езуіцкай* у Гродне. Пасля ліквідацыі ордэна езуітаў Н. секулярызаваўся, быў пробашчам гродзенскім і субоцкім. Унёс шэраг прапаноў па механізацыі прац на гродзенскіх каралеўскіх *мануфактурах*. З мэтай вывучэння вопыту арганізацыі прац на фабрыках і пакупкі абсталявання быў адпраўлены *Тызенгаўзам А.* на 5 гадоў за мяжу: у Англію, Галандыю, Германію. Па заданні Тызенгаўза планаваў адкрыццё ў Гродне астранамічнай абсерваторыі ў спецыяльна пабудаваным будынку пры гродзенскай школе/акадэміі медычнай, замовіў у Англіі абсталяванне (1775–77), але не паспеў з-за адстаўкі Тызенгаўза. У 1782–1808 быў прафесарам матэматыкі ў Віленскім універсітэце (Галоўнай школе літоўскай), з 1803 – сябра Варшаўскага таварыства сяброў навукі. *Масон* ложы "Руплівы Ліцвін".

Крын. і літ.: Швед В.В. Масоны і ложы на землях Беларусі (канец XVIII – першая чвэрць XIX ст.). – Гродна: ГрДУ, 2007. – С. 31, 190; Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 334; Podręczna encyklopedya kościelna. T. XXVII-XXVIII. – W-wa, 1912. – S. 307; Kościałkowski S. Antoni Tyzenhauz. Podskarbi nadworny Litewski. – Londyn, 1971. – T. II. – S. 352; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 342, 881–882.

Нарымонт/Нарымант, у праваслаўі Глеб (каля 1294 – 2.02.1348) – найстарэйшы сын *Гедыміна*, магчымы *князь гарадзенскі* пасля смерці *Давыда Гарадзенскага*. Дапускаюць, што быў жанаты на дачцэ Давыда Гарадзенскага. Быў забіты 2.02.1348 г. у бітве з *крыжакамі* ля рэчкі Страва.

Літ.: Tęgowski J. Rola Grodna w składzie Wielkiego Księstwa Litewskiego w XIV i początkach XV wieku // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 63

Насельніцтва перапіс 1897 г., прайшоў па ўсёй Расійскай імперыі 28 студзеня паводле агульнай праграмы і адзінай методыкі. Матэрыялы перапісу па Гродзенскай губ. апублікаваныя ў XI т. Тут мы знойдзем дадзеныя аб размеркаванні насельніцтва Гродна паводле роднай мовы, веравызнання, саслоўя, сямейнага становішча, асноўных відаў заняткаў, пісьменнасці, а таксама аб суадносінах названых дадзеных між сабой (напрыклад, па мове і веравызнанні і д. п.). Усіх *гараднян* у 1897 было 46 919 чал. Створаная гісторыкам Соркінай І. па матэрыялах перапісу табліца па роднай мове паказвае, што яўрэйскую мову падалі роднай 47,7% гараджан, рускую – 22,4 %, польскую – 14,5%, беларускую – 11,6%, татарскую – 1,7%, нямецкую – 0,8%, іншыя – 1,3. Агулам у горадзе размаўлялі на 27 мовах (акрамя названых – армянская, чэшская, грэчаская, эстонская, фінская, балгарская, мардоўская, лапарская і інш.). Трэба пагадзіцца з Соркінай, што мова ў той час не была вырашальным крытэрам вызначэння этнічных супольнасцяў, бо перапіс ахопліваў расійскае войска, якое стаяла ў Гродне, ішоў працэс "распалячвання", не завершыўся працэс

нацыянальнага размежавання насельніцтва. Моўны крытэр ідэнтыфікуе найбольш дакладна толькі *яўрэяў*. А. Дабронскі выключыў з падліку вайскоўцаў і атрымаў наступныя дадзеныя па мове: яўрэяў – 62–63%, польскамоўных – 16–18%, беларускамоўных – 5–7%. Канфесійная структура выглядала наступным чынам: найбольш было іўдзеяў – 48,4%, далей ішлі праваслаўныя – 30%, католікі – 18,5%, мусульмане – 1,99%, *лютэране* – 0, 97%, стараверы – 0,1%, рэфарматы – 0,01%, англікане – 0,01%, армяна-грыгарыяне – 0,004%. Калі не ўлічваць вайскоўцаў, дык сітуацыя выглядае такім чынам: удзельная вага праваслаўных зніжаецца да 18,5, а католікаў узрастае да 20,4%. Гараджане дзяліліся паводле саслоўяў: мяшчане (59,13%), сяляне (29,13%), патомныя дваране (4,91%), дваране асабістыя і чыноўнікі не з дваран (4,06%), купцы (1,12%), *ганаровыя грамадзяне* (0,59%), духавенства хрысціянскае (0,34%), замежныя падданыя (0,31%), вайсковыя казакі (0,002%), ураджэнцы Фінляндыі (0.002%), іншыя не напісалі саслоўе ці не належалі да названых саслоўяў. Паводле сямейнага становішча размеркаванне гараднян было наступным: сярод тых, чыя родная мова руская было 78,1% халастых і незамужніх, 19,2% – у шлюбе, 2,6% – удовыя, 0,03% разведзеныя, 4 чал. не пазначылі свайго сям. становішча; сярод тых, хто назваў роднай беларускую мову – 64,3% халастых і незамужніх, 31,1% – у шлюбе, 4,5% – удовыя, 0,06% – разведзеныя; сярод тых, хто назваў роднай мовай польскую – 61% халастых і незамужніх, 29,7% – у шлюбе, 9,3% – удовыя, 0,03% – разведзеныя, 1 чал. не пазначыў; сярод тых, хто назваў яўрэйскую мову роднай – 60,4% халастых і не замужніх, 34,9% – у шлюбе, 4,3% – удовыя, 0,4% – разведзеныя, 9 чал. не пазначылі. Прафесійная структура цывільных гараднян выглядала паводле Дабронскага А. наступным чынам: прамысловасць і рамяство – 34,4%; служба – 19%; гандаль, фінансы і паслугі – 11,5%; адміністрацыя і вольныя прафесіі – 10,5%; камунікацыя і сувязь – 4,2%; сельская гаспадарка – 1,8%; іншыя – 18,6%. Узровень пісьменнасці (крытэр – уменне чытаць па-руску) сярод мужчын быў 60,7%, сярод жанчын – 44,8%. Скончылі ўніверсітэты 1,1% мужчын і 0,1% жанчын; тэхнічныя вузы – 0,1% м. і 0,1% ж.; спец. сярэднія навуч. установы – 0,7% м. і 0,4% ж.; сяр. навуч. установы – 6,5% м. і 4,8% ж.; вышэйшыя вайсковыя вучылішчы – 0,1% м.; сяр. вайсковыя вучылішчы – 2,3%. У НГАБ у Гродне захавалася частка перапісных лістоў гараднян, і ахвочыя могуць пашукаць сваіх сваякоў паводле адрасу пражывання.

Літ.: Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. Т. XI. – СПб., 1903; Коляга О.В., Рудикова Л.В. Занятость населения Гродно по данным Первой всеобщей переписи населения Российской империи // Гарады Беларусі ў кантэксце палітыкі, эканомікі, культуры: зб. навук. арт. – Гародня, 2007, с. 88–95; Соркіна І. Насельніцтва Гародні паводле апублікованых матэрыялаў Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расейскай імперыі 1897 г. // Гарадзенскі палімпсест. XII – XX стст. – Гародня-Беласток, 2008. – С. 112–135; Dobroński A. Mieszkańcy Grodna w 1897 roku // Grodno w XVIII wieku. Miasto i ludność (na tle trendów rozwojowych od średniowiecza do 1939 roku) / pod red. A. Woltanowskiego i J. Urwanowicza. – Białystok, 1997, s. 173–186.

Насельніцтва перапіс 2020 г. паказаў, што на 1.01.2021 у Гродне жыло 357 510 чал. (у 2020 – 356 686). Працоўныя склалі 169 885, беспрацоўныя – 659 чал. На 1.01.2021 аб'ём прамысловай вытворчасці дасягнуў 922,8 млн. руб., рознічны таваразварот – 97,9% да 2020 г. Намінальна налічаны заробак – 1253,2 руб. Знешні гандаль таварамі: экспарт – 72 039,4, імпарт – 35 643,2 тыс. дол. ЗША; паслугамі: экспарт – 11 836,6, імпарт – 3 691,2 тыс. дол. ЗША.

Літ.: https://www.belstat.gov.by/ofitsialnaya-statistika/publications/izdania/public_bulletin/index_28006/

Насельніцтва спісы 1794 г. былі складзеныя на загад *Цыцыянава П. Д.* падчас знаходжання расійскіх войск у Гродне у перыяд *паўстання 1794*. Спісы былі патрэбныя, каб атрымаць ад маёнткаў і асоб горада падатак, адпаведна 1% з маёнтка і 1 злоты ад гараджаніна. У спісе А былі пералічаныя жыхары адпаведна да месцажыхарства (па вуліцах, камяніцах, дамах, дварах, карчмах, установах), у спісе В змешчаныя жыхары двух гарадзенскіх *замкаў*, у спісе С – жыхары *Гарадніцы* (асобы; працаўнікі з дэпартаментаў фабрычнага, броварнага, агароднага, палацавага; з варштатнага дому; з 20 *басняцкіх дамоў*; з камяніцы пастрыгальнай; з 9 жылых камяніц). Асобна быў спіс *яўрэяў* з *кагалу* ("Спецыфікацыя жыдоў"), хаця ў папярэдніх спісах яны таксама ўказваліся. Усяго хрысціянскае насельніцтва складала 3 651 чал., старазаконныя – 2 780 чал. Сума падатку (кантрыбуцыі) дасягнула 135 020 злотых, 37 грошаў.

Літ.: Urwanowicz J., Woltanowski A. Kontrybucja grodzieńska generała Pawła Cycjanowa a spis ludności miasta z 1794 roku. w.: Grodno w XVIII wieku. Miasto i ludność, red. A. Woltanowski, J. Urwanowicz, Białystok, 1997, s. 43–59; Urwanowicz J / (opr.). Spis mieszkańców Grodna z 1794 r. w.: tamże, s. 61–171.

Небальсін Павел Іванавіч (1817–1893) – этнограф, цэнзар. Праводзіў даследаванне Сібіры і Цэнтральнай Азіі, пісаў артыкулы. З 1863 жыў у Гродне. З 1871 быў цэнзарам кніжак у Вільні і пераследаваў польскую "недобранайдзейнасць".

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 335.

Незабытоўскія/Незабітоўскія – уладальнікі зямельнай маёмасці ў *Гарадні*. У канцы 18 ст. ім належаў пляц на левым баку дзвюх вуліц: Бернардзінскай з *Рынку* на Падол і Дзям'янаўскай, на самім павароце з Бернардзінскай на Дзям'янаўскую. Браты Незабітоўскія, сыны Яна, Крыштаф і Стэфан мелі спадчынны маёнтак і былі запісаныя ў спіс выбаршчыкаў па Гродзенскім пав. 1822–24 гг. Трэці брат Якуб меў маёнтак Забалаць і Глыбокае (40 дымаў і 102 душы ў 1823 г.).

Літ.: С. Токць. Спісы выбаршчыкаў шляхецкіх сходаў Гродзенскага, Ваўкавыскага і Слонімскага паветаў Гродзенскай губерні за 1820–1823 гг. // Rocznik Centrum Studiów

Białoruskich=Гадавік Цэнтра Беларускіх Студыяў, 2020, № 5, с. 216; Obiasnienie interesu Miasta Sejmowego J.K.Mci Grodna. – Grodno, 1789. – S. 32–34.

Неман Чэслаў, сапр. прозв. Выджыцкі (16.02.1939, Старыя Васілішкі, каля Шчучына – 17.01.2004, Варшава) – папулярны польскі музыкант, кампазітар і спявак. Бацька Антоні быў рымарам, настройшчыкам фартэп'яна і арганаў, маці Ганна з Маркевічаў спявала разам з мужам у касцельным хоры. Па бабцы Эльжбеце з Ліпінскіх Н. быў сваяком Караля Юзафа Ліпінскага, скрыпача-віртуоза на мяжы XVIII–XIX стст. Напэўна, такія гены мелі ўплыў на тое, што Н. пачаў граць на музычных інструментах (піяніна, гітары, мандаліне, акардыёне) і спяваць: з 9 год – у касцельным хоры, у 13 год – на школьным бацькоўскім сходзе, дзе выканаў украінскую песню "Чорныя бровы, карыя вочы". Вучыўся ў сярэдняй школе па-руску, а польскую мову пазнаваў у хаце ад бацькоў і з польскіх падручнікаў, пакінутых дзядзькам-настаўнікам Юзафам. У 1954 паступіў у Гродзенскае музычнае вучылішча, але вытрымаў толькі год і вярнуўся дадому – давучвацца ў школе. У 1958 сям'я Н. вырашыла выехаць на месцажыхарства ў Польшчу. У Гданьску вучыўся ў музычнай школе, залічваў за пачатковую і першы клас сярэдняй школы. У 1960 раптоўна памёр бацька на 64 годзе жыцця. Н. пачаў спяваць у гданьскім кабарэ "To Tu", у Клубе студэнтаў Żak. Гэта не спалучалася з вучобай, і яго вясной 1962 выгналі з музычнай школы і з інтэрната. Але ў гэтым ж годзе ён перамог на Фестывалі маладых талентаў у Шчэціне. У 1962–65 супрацоўнічаў з ансамблем Блакітна-Чорныя (Niebesko-Czarni). У 1963 паспяхова выступіў на фестывалі польскай песні ў Аполі. З гэтага часу Н. стаў вядомым і папулярным у Польшчы і за мяжой. Яго пласцінка "Дзіўны гэты свет" упершыню ў гісторыі польскай фанаграфіі атрымала тытул "залатая пласцінка" (1968). На мяжы 1973–74 выйшла пласцінка ў Нью-Ёрку "Mourner's Rapsody", у 1976 – альбом "Катарсіс". Стварыў некалькі музычных гуртоў: Niemen Enigmatic, Grupa Niemen, Aerolit. Шмат гастраляваў у Германіі, Чэхаславакіі, Венгрыі, Фінляндыі, Францыі, Югаславіі, СССР. Самым значным і манументальным яго альбомам лічаць "Энігматык". Апошняя праца ўбачыла святло ў 2001. Н. быў аўтарам музыкі для кінафільмаў на гістарычныя тэмы: "Пах зямлі", "Дзяды", "Пан Тадэвуш". Памёр ад рака. У Васілішках каля Гродна ёсць музей Н. Нацыянальны банк Польшчы выдаў манету ў 2 злотых з выявай Н. Беларускае тэлебачанне зняло дакументальны фільм пра Н. З 2004 імя Н. носіць прагулачны праспект у Чэнстахове, пляцы ў Бельска-Бялай і Сопаце. У маі 2008 публічная гімназія № 2 у Стрэльцах Апольскіх атрымала яго імя, а побач быў пастаўлены помнік Н. З 2019 на фасадзе былога музыкальна-педагагічнага вучылішча (цяпер гуманітарнага каледжа Гродзенскага ўніверсітэта) вісіць мемарыяльная дошка (скульптар У. Панцялеяў), прысвечаная Чэславу Неману.

Літ.: 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. – Мінск: УП "Экоперспектива", 2008. – С. 324–325; Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018. – С. 94–95; Kałuski M., Sprawy kresowe – poza cenzurą. T. 1. – Toruń-Melbourne, 2017. – S. 98; Radoszewski

R. Czesław Niemen: Kiedy się dziwić przestanę. Monografia artystyczna: Iskry, 2004; M. Q. Niemen Czesław // Słownik biograficzny historii Polski. T. 1 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – S. 1022–1023

“Немогардас” (“Горад на Нёмане”) – пад гэтай назвай згадвае Гродна Канстанцін Парфірагенета, рымскі імператар і гісторык. Ён піша, што ў 1009 г. тут, на памежжы Літвы і Русі, адбылося хрышчэнне місіянерамі на чале з Брунам з Кверфурта (Querfurt) прускага князя Нецімера (Nethimer). Бруна і яго сябры былі ў хуткім часе забітыя *яцвягамі*.

Літ.: А. Кібінь. Ад Ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурныя трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – № 5. – С. 90–92, 95, 260; Historia Polski. Kalendarium dziejów. Pradzieje – 1655, Kraków 2010. – S. 78–79.

Немцы жылі ў *Горадні* ў XVI ст., а можа і раней – гродскія кнігі за гэты час не захаваліся, таму сказаць дакладна немагчыма. Вядома, што назіраўся ў гэты час прыток нямецкіх рамеснікаў з Прусіі (магчыма, распаўсюджванне ў будаўніцтве дамоў фахверка звязанае з іх перасяленнем у Горадню). У 1660–1670-х гадах немцы займаюць розныя пасады ў мясцовай уладзе: *бурмістрамі* былі Ганус Паўльсен і Эрхард Вілд, ураднікам па спагнанні падаткаў – Готфрыд Варланд, райцам – Фолтын Шульц. Сярод рамеснікаў упамінаецца цырульнік Лорэнс Блант. З Хэлмінскай зямлі паходзіць род Кальк-штэнаў-*Сталінскіх*. Частка немцаў прыехала ў горад паводле запрашэння *Тызенгаўза А*. (напрыклад, цесляры Шлезінгер, Бронікер, Бон). Гл. таксама *лютэране, прусы*.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 270–271.

“Нёман” – зборнік твораў пісьменнікаў Гродзенскай вобласці, які друкаваўся ў Гродзенскай абласной друкарні. У выдавецтве рэдакцыі *газеты* “Гродзенская праўда” выйшла толькі два нумары. Першы быў падпісаны да друку 25.10.1956. Рэдакцыйную калегію склалі *А. П. Карпюк,* А. В. Каткоў, А. Д. Колас, І. Я. Навіцкі, П. С. Пястрак, А. А. Салаўёў, Л. І. Храмава. Найбольшы аб’ём займалі вершы (*М. Васілька*, П. Макаля, *С. Бандарэнкі,* М. Арачкі і інш.). Былі таксама надрукаваныя: аповесць А. Карпюка “Раманюкі”, драма Л. Марушкі “Зарука шчасця”, апавяданні *В. Быкава* “Страта” і “Тупое пяро”. У раздзеле нарысы ўбачылі святло творы А. Коласа, П. Барэйкі, Я. Шаіркі; у раздзеле сатыра і гумар – творы Г. Цвятніцкага, М. Дуброўкі, І Маркава; у публіцыстыцы – *Я. Мараша* “Кароткі нарыс гісторыі горада Гродна”. Другі зборнік падпісаны да друку 12.12.1958. У складзе рэдакцыі адбыліся змены: выйшлі Навіцкі і Храмава, дадаліся С. С. Дрозд і А. І. Зелянеўскі. Вершаў, як і ў першым, было шмат: з новых прозвішч – *Д. Бічэль*, Я. Пархута, А. Сідаровіч і інш. З нарысаў цікавыя творы А. Сінілава “Па Нёмане”, С. Дразда “З рэвалюцыйнай дзейнасці Кастуся *Каліноўскага* на Гродзеншчыне”, *А. Цыхуна* “Акадэмік Яўфім Фёдаравіч *Карскі*”, *Б. Клейна* “Мужнасць, гераізм, стойкасць (матэрыялы

судовых палітычных працэсаў)". У зборніку былі апублікаваныя апавяданні *В. Быкава* "Трое" і "Страчаныя мары", байкі Г. Цвятніцкага і А. Прусакова, байкі М. Каралёва.



С. 881

Нёман – рака, на берагах якой размясціўся горад Гродна. Ян Длугаш у "Хроніцы Каралеўства Польскага" называе Нёман шостай ракой "зямель польскіх і рускіх". Вытокі мае ў Стаўбцоўскім раёне, на мяжы Міншчыны і Гродзеншчыны. З возера Крона ці Кронэ, якое цяпер называецца Кромань, выцякае рэчка Кроманка, якая ўпадае ў Нёман. На *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта* бачна, што апошні выконвае ролю транспартнай артэрыі для гандлю (у першую чаргу для сувязі з Балтыкай): намаляваныя 3 віціны, *прыстань*, дзе адна з іх разгружаецца. У Нёмане *гарадняне* мылі і выпалосквалі бялізну. Раку выкарыстоўвалі гарбары для апрацоўкі скураў, якія гарадзенскія гандляры вывозілі ў Каралявец/Калінінград. Карысталіся нёманскай вадой таксама мясцовая жывёла і жыхары горада (гл. *водаканал*). Рака забяспечвала рыбай, і пэўны час у горадзе існаваў *цэх* рыбакоў.

Сустракаецца на мапах: Марка Баневентана 1507–1508 гг. (Nyemo), Анджэя Пагрэбкі 1570 г. (Nimen), Мацея Струбіча 1579 г. і яго, з удзелам Тамаша Макоўскага, Радзівілаўскай мапе 1613 г. (Nieman), Фрэдэрыха дэ Віта, Каспра Хенебергера, Нікаласа Сансана, П'ера Ду Валя, Ле Васёра дэ Баплана, Вінчэнца Марыі Каранэлі – усе XVII ст. (Nieman). Ужывалася імя Н. таксама на медзярытах горада: *Адэльгаўзера Г.–Цюнта М. гравюра* 1567–1568 гг. (Nieme); Браўна Г. і Гагенберга Ф. 1575 г. (Nieme), Г. Бодэнера 1720 г. (Niemen). На Жмудзі рака называлася Немнъ, Немонъ. Паводле адной з легенд назва ракі паходзіць ад імя італьянскага кіраўніка маракоў Nemonasa альбо Nemona, які першы ажыццявіў вандроўку па Нёмане і стаў богам гэтай ракі. Даследчык-моваznаўца газеты "Наша Ніва" В. Корбут сцвярджае, што назву ракі Нёман можна знайсці тут у 1919, 1924, 1925, 1927 і 1928 гадах.

Літра: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 37–46; Радзюк А., Горад і гродзенцы ў 30–50-я гады XIX ст.// Гародня X – XX стст. Кралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Вроцлаў, 2014. – С. 224–226; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 101–102; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С. 65–67; Aleksandrowicz St. Kartografia Wielkiego Księstwa Litewskiego od XV do połowy XVIII wieku, Warszawa 2012, s. 285; Czarnowski R. J. Grodno. Zapomniana stolica. – Warszawa: oficyna wydawnicza RYTM, 2015. – C. 209–214; Orzeszkowa E. Znad Niemna // Niwa, 1874, t. 6, nr. 1 , nr. 2; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część I. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 121 – 126; Waszkiewicz F. O rybim królu na Niemnie // Magazyn Polski. – 2017. – n 6 (137). – S. 18–21.

"Новы Горадзен" (Нойгартэн, Newgarten, Neu gartena) – гл. *Замак "Новы Горадзен"*.

Новы Свет – гістарычны і архітэктурны квартал Гродна, які пачаў стварацца пры гарадзенскім *старасце Тызенгаўзе А.* і завершыўся ў канцы 1930-х. У межы горада Гродна увайшоў 24.06.1875. Уключае наступныя сучасныя вуліцы: 1 мая, Акадэмічная, Багдановіча, Валковіча, Дзяржынскага, Астроўскага, Рэйманта, Розы Люксембург, Славацкага, Ватуціна, Горкага, Міцкевіча, Бялінскага. Асаблівы выгляд Н. С. набыў у 1920–1930-я гады – быў забудаваны драўлянымі і, у меншай ступені, цаглянымі дамамі ў стылях канструктывізму (большасць), неабарочным (будынак № 12 па вул. 17 верасня), неакласіцызму (дамы №№ 1, 24 па вул. Рэйманта). У раёне жылі беларусы Янушкевічы, *Федарукі*, *Багдановічы*; палякі Цыпельты, Вайцяхоўскія, *Астроўскія, Іваноўскія*, Грабоўскія; *рускія* Маісеевы, Беклямішавы, Грыбавы і Кірылавы; *яўрэі* Канэлі і Маламеды; *татары* Маслоўскія, Шумскія і Мількамановічы, украінцы Гуменюкі і Шаўчэнкі; *немцы* Кальхэрты, Кляйшміты, Фалендорфы. На тэрыторыі Н. С. знаходзяцца станіславаўскі палац (гл. *Станіславова*) *Станіслава Аўгуста Панятоўскага*; *кірха*; стары *лямус*, *парк імя Жылібера*; *заапарк; музей Багдановіча* А.; будынкі *Народнага дома*, вайсковага *шпіталя* па вул. Дзяржынскага; дом на Валковіча, 1, у якім была ў канцы 1920-х беларуская школа, *музей прыроды Жыўны С.*; дамы, у якіх жылі кампазітар *Шырма Р.*, прэзідэнт Гродна *Лістоўскі Э. Э.*, дырэктар беларускай школы *Федарук У.*

Літ.: Вашкевіч А., Казак Т. Гродзенскі Новы Свет з першай трэці XX ст. // Ян Булгак і культура заходнебеларускага рэгіёну ў канцы XIX ст. і да Другой сусветнай вайны: зб. навук. арт. – Гродна: ГрДУ, 2009. – С. 131–134; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 196–198; Трусов И., Чернякевич А. Новый свет и его окрестности. – Минск: "Лимариус", 2009. – 68 с.; "Горад святога Губерта". Краязнаўчы альманах Вып. IV / Пад рэд. А. Смаленчука і А. Вашкевіча. – Вільня: Інстытут гістарычных даследаванняў Беларусі ЕГУ, 2008. – С. 5–68; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 180–190.

Ноен Ёган Хрысціян (? – студзень 1794, Гродна) – урач, прускі дарадца. Атрымаў дазвол на лячэбную практыку ў Рэчы Паспалітай (1792), паспрабаваў выдаваць медыцынскі часопіс у Гродне на польскай мове. Аб гэтым сведчыць кракаўскі бібліёграф К. Эстрайхер: "Штотыднёвы медыцынскі часопіс у Гродне, 1792 (з красавіка). Медыцынскія дысертацыі, у паўаркуша (Ноен) абвешчана". 18.01.1794 у кнігу рэгістрацыі актаў Гродзенскага магістрата было ўнесенае апісанне маёмасці памерлага доктара медыцыны Ё. Х. Ноена.

Нямцэвіч (Урсын-Нямцэвіч) Караль (1797, Брэсцкі пав. Гродзенскай губ. – 09.02.1867, Парыж) – удзельнік *паўстання 1830–31*. Сын Яна, *маршалка павета* Брэсцкага, і Тэклі Выганоўскай, шляхціц, пляменнік *Юльяна Нямцэвіча*. Падчас *вайны 1812 г.* вывезены ўглыб Расіі разам з бацькам. Пасля заканчэння вайны вярнуўся на радзіму. Скончыў Свіслацкую гімназію, Віленскі ўніверсітэт (факультэт мастацтва), Варшаўскі ўніверсітэт (мастацтва і літаратуры). Пасля вяртання дамоў увайшоў у склад Гродзенскага

дваранскага дэпутацкага сходу, дзе ў 1824 выступіў з прапановай стварэння пры Сенаце ў Пецярбургу асобнага польскага аддзела, што не было прынята. У 1828 стаў брэсцкім павятовым маршалкам, у 1830 – намеснікам губернскага маршалка. З пачаткам паўстання на загад вял. князя Канстанціна быў інтэрнаваны ў Гродне. Тут меў кантакты з афіцэрамі Літоўскага корпуса. У красавіку 1831 быў абраны начальнікам паўстання на Гродзеншчыне і разаслаў па губерні эмісараў з заклікам да паўстання. 18 красавіка ўцёк з Гродна ў Белавежскую пушчу і на чале невялікага атрада меў шэраг сутычак з расійскімі войскамі. Пазней далучыўся да корпуса ген. М. Рыбінскага. 08.08.1831 абраны ў Варшаве дэпутатам на сейм ад Брэсцкага пав., 15.08.1831 увайшоў у склад Камітэта літоўскіх зямель. Быў узнагароджаны залатым крыжам (14.09.1831). Пасля паражэння паўстання эміграваў. Рашэннем гродзенскай губернскай следчай камісіі ад 21.01.1833 быў аднесены ў 1 разрад злачынцаў, а яго маёмасць, у тым ліку і бібліятэка з маёнтка Скокі, была канфіскаваная. Апынуўся ў Гамбургу, пазней пераехаў у Дрэздэн. Адсюль быў вымушаны з'ехаць у Парыж, дзе праз дзядзьку Юльяна атрымаў кантакт з Чартарыйскім А. У 1835 увайшоў у склад Гісторыка-Літаратурнага таварыства. У 1840-х супрацоўнічаў з "Нацыянальным дзённікам" ("Dziennikiem Narodowym"). У 1848 выдаў дзённік Нямцэвіча Юльяна, а ў 1863 – свой "Дзённік 1831 г.". У 1869 выйшлі яго "Успаміны пра паўстанне ў Брэсце".

Літ.: Матвейчык Д. Ч. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. – ураджэнцы беларускалітоўскіх губерняў: эміграцыя, гуртаванне, дзейнасць. Дадатак. Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені к.г.н. па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя. – Мінск, 2008. – С. 317; Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 336.

О

“Обзор Гродненской губернии за ... год” – зборнікі, якія рыхтаваліся паводле рашэння МУС ад 19.06.1870 *камітэтам губернскім статыстычным* па пададзеных туды звестках ад паліцмайстраў, *казённай палаты*, валасных праўленняў і рэлігійных устаноў. Да 1897 з’яўляліся дадаткам да справаздачы *губернатара*. Друкаваліся ў *друкарні губернскай* з 1882 па 1914 (у 1885 і 1886 не выходзілі). Асноўны змест – табліцы і ведамасці пра эканамічнае становішча Гродзенскай губ., але ў некаторых з аглядаў прыводзяцца матэрыялы па Гродне: Промыслы сельскага і гарадскога насельніцтва, Прамысловасць фабрычная і завадская ў Гродзенскай губ., Колькасць выбраных дакументаў на гандаль (пасведчанні купцоў, прамысловыя, білеты на гандаль), Колькасць пасведчанняў, выдадзеных для гандлёвых і прамысловых прадпрыемстваў, Колькасць рамеснікаў у гарадах.

Крын. і літ.: Обзоры Гродненской губернии за 1882–1911 год; Литвак Б.Г. Очерки источниковедения массовой документациии. – М., 1979. – С. 153–155; Шибеко З.В. Обзоры, с. 108–110.

“Ondyna Druskienickich Źródeł” (“Ундзіна Друскеніцкіх крыніц”) – “зборнік для здаровых і хворых у часе чатырохмесячнага побыту ля мінеральных вод”, літаратурна-гістарычны часопіс ліберальна-асветніцкага напрамку. Друкаваўся ў Гродне ў 1844–1846 гг. за ўласны кошт Ксаверыя Вольфганга. Выходзіў на польскай мове адзін раз на месяц, падчас курортнага сезона. У часопісе былі наступныя раздзелы: медыцынскі, гістарычны, літаратурны і “рознае”. Вядомыя 24 нумары часопіса. У апошнім былі апублікаваныя краязнаўчыя артыкулы пра Мінск, Смаленскі і Ялачынскі манастыр, фатаграфічныя здымкі Мінска і Смаленска.

Літ.: Гісторыя беларускай кнігі. У 2 т. Т. 2. Кніжнасць новай Беларусі (XIX – XXI ст.). / М.В. Нікалаеў і інш. – Мінск: БелЭн, 2011. – С. 103–104.

О’Брыен дэ Ласы (Лясы) – ірландскі род, у жылах прадстаўнікоў якога цякла кроў нармандскіх рыцараў ад Карла Вялікага. Як пісала Ёанна Сыпула-Гліва: “У гэтай назве чуваць гук мячоў і сухі трэск дзідаў, тупат коней, якія галапуюць па палях бітваў старой Еўропы, чуецца ў ёй подых цяжкіх крылаў гісторыі”. У канцы XVIII ст. пасяліўся ў *Аўгустоўку* каля Гродна (цяпер тэрыторыя горада) *Маўрыцы-Петэр дэ Лясы*. Частка прадстаўнікоў гэтага роду знайшла спакой у радавой *капліцы ў Аўгустоўку*: *Маўрыцы-Петэр дэ Лясы*,

Патрык О’Брыен дэ Лясы, *Аляксандр О’Брыен дэ Лясы*, *Цярэнці О’Брыен дэ Лясы*. Адным з апошніх уладальнікаў Аўгустоўка быў *Маўрыцы О’Брыен дэ Лясы*.

Літ.: Гардзееў. Матэрыялы да генеалогій рода О’брыен дэ Лясы // Краязн. Запіскі. Вып. 4. – Гродна, 1997 – С. 77; Черепица В.Н. История одной дуэли: к родословной выходцев из Ирландии гродненских дворян О’Бриен дэ Ласи / В.Н. Черепица // Веснік ГрДУ імя Я. Купалы. Сер. 1. – 2006. – № 2. – С.23–28; Sypuła-Gliwa J. Podróż na Wschód. – Łomianki: Wydawnictwo LTW, 2011. – S. 172–176; M. O’Brien de Lacy. Dzikie gęsi z Zielonej Wyspy. – Łomianki: Wydawnictwo LTW, 2011. – S. 5, 10–11, 70; N. Drucka. Trzy czwarte... Wspomnienia. – Łomianki: Wydawnictwo LTW, 2011. – S. 90, 117.

О’Брыен дэ Лясы Аляксандр Патрыкавіч (1842–1908) – сын Патрыка О’Брыена дэ Лясы і Юліі фон Дамме, уладальнік *Аўгустоўка.* Жанаты на Габрыелі Радавіцкай, дачцэ Анэлі з Влодкаў і Аляксандра. Меў 3 дачок і 3 сыноў. Сярод апошніх – два наступных уладальніка Аўгустоўка: Маўрыцы (гл.) і Цярэнці (гл.). У даведніку “Вся Россия 1912 г.” ёсць сведчанне, што ў Аўгустоўку быў вадзяны млын, які належаў Лясы Аляксандру, на ім працавала 15 рабочых, гадавы абарот – 70 тыс. руб. (стб. 503). Гэта быў сын Аляксандра і Габрыэлі-Генавэфы.

О’Брыен дэ Лясы Маўрыцы Аляксандравіч (15.04.1891 – 1978) – *прэзідэнт Гродна* (1929–1932). Сын Аляксандра і Габрыэлі з Радавіцкіх, граф. Скончыў *гімназію* ў Гродне, потым – агранамічны факультэт Палітэхнічнага інстытута ў Рызе, экзамены здаў у Пятроўска-Разумоўскай Акадэміі ў Маскве. Падчас *вайны першай сусветнай* быў камендантам расійскага санітарнага цягніка, які курсаваў у раёне Адэсы. Там пазнаёміўся з будучай жонкай княгіняй Надзеяй Друцкай (1898–1986). Пасля вайны пасяліліся ў *Аўгустоўку,* якім стаў валодаць з 1921 (з капліцай і карчмой, перабудаванай у палацык) сумесна з братам Цярэнціем. Удзельнік *вайны савецка-польскай 1920 г.* У органах самакіравання працаваў з 1918, актыўна дзейнічаў у грамадскіх арганізацыях: стваральнік і старшыня гродзенскага Саюза землеўладальнікаў і *Таварыства сельскагаспадарчага*, дырэктар Школьнай рады. Быўшы старшынёй Гродзенскай павятовай рады, у верасні 1929 быў абраны на пасаду *прэзідэнта Гродна* (быў ім да 1932). Пад яго кіраўніцтвам рабілі бульвар на беразе *Нёмана,* рэстаўравалі *замак Стары*. Яго жонка была пісьменніцай (кнігі “Перамога”, “Зачыненыя дзверы”, “Непатрэбныя дзеці”) і грамадскім дзеячам (віцэ-старшыня Кола землякоў, Чырвонага крыжа, Таварыства дабрачыннасці, старшыня Таварыства сяброў літаратуры і мастацтва імя *Э. Ажэшкі*, Бацькоўскага сходу ў гродзенскай *гімназіі*). У 1931 была чальцом жаночай каманды Гродна па тэнісе. Падчас Варшаўскага паўстання 1944 г. кіравала шпіталем.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. / А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 186–187; Drucka N. Trzy czwarte... Wspomnienia. – Łomianki: Wydawnictwo LTW, 2011. – S. 90, 117; Lorentz S., Album Wileński. – Warszawa, 1986. – s. 80; O’Brien de Lacy M., Dzikie gęsi z Zielonej Wyspy. – Łomianki: Wydawnictwo LTW, 2011. – S. 5,

10–11, 70; Sawoniewski L., Saga o Grodnie. Łódź, Białystok, 1999, s. 27; Słowo – 1931 – № 85 – s. 24.

О'Брыен дэ Лясы Патрык (1790–1870) – сын Мары і Вільяма Цярэнція О'Брыена, граф, уладальнік маёнтка *Аўгустовак* пасля Маўрыцыя-Петэра дэ Лясы. У 1823 маёнтак меў 212 дымаў і 623 душы. Прычым Аўгустовак быў прададзены Маўрыцыем прыяцелю Каралю графу Медэму, а той у 1820 прадаў яго Патрыку. Відаць, гэта было зроблена для юрыдычнага зацвярджэння маёнтка ў руках ўсыноўленага Маўрыцыем Патрыка. У 1822–1824 гг. О. знаходзіўся ў спісе выбаршчыкаў *дваранскага сходу* ў Гродзенскім пав. Граф Медэм уфундаваў у Аўгустоўку *капліцу* ў стылі ратонды. Яна стала маўзалеем родаў дэ Лясы і О'Брыенаў. Патрык меў жонку з прускай шляхты Юлію фон Дамме і з ёю 6 дзяцей: 1 дачку (мажліва, гэта Кацярына, якая ў 1847 скончыла поўны курс Беластоцкага інстытута шляхцянак "з атэстатамі") і 5 сыноў (сярод якіх – наступны гаспадар Аўгустоўка *Аляксандр*.

Літ.: Исторический очерк белостокского института благородных девиц 1841–1891./ Составил Н.П. Авенариус. – Белосток, 1891; С. Токць. Спісы выбаршчыкаў шляхецкіх сходаў Гродзенскага, Ваўкавыскага і Слонімскага паветаў Гродзенскай губерні за 1820–1823 гг.// Rocznik Centrum Studiów Białoruskich=Гадавік Цэнтра Беларускіх Студыяў, 2020, № 5, с. 214.

О'Брыен дэ Лясы Цярэнці (5.08.1888, Аўгустовак пад Гроднам – 1932) – сын Аляксандра і Габрыэлі з Радавіцкіх, граф, уладальнік маёнтка *Аўгустовак* сумесна з Маўрыцыем (гл.). Скончыў Марскую акадэмію і служыў у расійскім войску. Ваяваў пад Цусімай падчас *вайны руска-японскай* (1904–1905) і трапіў у палон. Пасля вяртання ўступіў у Марскую Каўказскую дывізію. Пасля адраджэння Польшчы пакінуў рускую службу, браў удзел у *вайне 1920 г.,* а ў 1921 узначаліў у Беластоку 10 полк уланаў. З жонкай Геленай Паповай меў дачку Гелену (Нэлі), якую падчас *вайны Другой сусветнай* немцы вывезлі на працы ў Германію. Эмігравала ў Аргенціну, дзе з мужам Эвальдам дэ Карэн паклалі пачатак аргенцінскай дынастыі О'Брыен дэ Лясы дэ Карэн.

Літра: Павач А. Гродзенскія гісторыі. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2019. – С. 9–14, 114–116.

Опера – оперная трупа, была часткай тэатра *Тызенгаўза А*. У 1778 г. трупа ўдзельнічала ў пастаноўках камедыі "Севільскі цырульнік" П. Бамаршэ, оперы "Магніфік" ("Беспадобны") А. Грэтры і оперы-буф "Бал" Д. Чымарозы, "Квартэт дудараў" *Пеціньці Г*. Гралі музыкі з капэлы Тызенгаўза. Спявалі жанчыны Бакарэлі, Сгаравіні і інш. Пасля 1780 О. пераязджае ў Паставы, а ў 1785 – у Варшаву, дзе паклала аснову польскай оперы.

Літ.: Гостев А.П. Кронон. Летопись города над Неманом (1116–1990) / А.П. Гостев, В.В. Швед. – Гродно: НВК "Пергамент", 1993. – С. 41, 43; Лябецкі У.С. Невядомыя старонкі гісторыі музычнага мастацтва Гродна: з рэпертуару тэатра Антонія Тызенгаўза // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 225–231; Музыкальный театр Беларуси. Дооктябрьский период. – Мн., 1990,

с. 190; Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 12. – Гродна: ГАІУН, 2010. – С. 22–23

Орда Напалеон (11.02.1807, в. Варацэвічы Пінскага ў. Мінскай губ. – 26.04.1883) – сын інжынера Міхала Орды і дачкі пінскага старасты Мацея Бутрымовіча. Піяніст, кампазітар, мастак, удзельнік паўстання 1830–1831 гг. Вярнуўся з эміграцыі згодна з маніфестам 1856 у гэтым жа годзе. Жыў у Гродне ў 1862–1863 і пакінуў пра яго каля 40 малюнкаў: *касцёлы* (паезуіцкі, дамініканскі, бернардзінцаў, Фара Вітаўта), *кляштары* (бернардзінцаў, базыльянскі), дамы (Макавельскай, *ратуша*), вуліцы, *мост чыгуначны* праз *Нёман*, *Замкавая гара* з *замкамі*, *царква Барыса і Глеба на Каложы*, *палацы* (Чацвярцінскіх, Валіцкага, Сапегаў, Станіславова, Аўгустова, Панямунь), гандлёвая плошча/*Рынак*, *вакзал чыгуначны*. Прыпісаны да Кобрынскага мяшчанскага грамадства, О. арандаваў казённую ферму Варацэвічы ў Кобрынскім у. Вясной 1863 агітаваў сваіх дваровых уступіць у паўстанцкі атрад (тры з іх так і зрабілі 12.05). Быў пад следствам з 3.02.1866, сядзеў у кобрынскім турэмным замку з 12.03.1866. У яго доме быў зроблены вобыск: знайшлі парахаўніцу з порахам, патрыятычныя вершы і падазроныя паперы. 15.05.1866 адпраўлены ў Гродна і пасаджаны тут у *турму* да 11.06.1867. Яшчэ Напалеон і яго жонка Ірына абвінавачваліся ў дазволе свайму сыну Вітольду ўступіць у французскае войска без дазволу расійскага ўрада. Гэтае абвінавачванне пазней было знятае, відаць, пад націскам французскага пасольства. Вайсковым судом прыгавораны да высылкі ў "аддаленыя губерні Расіі", але канфірмацыяй в. а. камандуючага Віленскай вайсковай акругі Манюкіна ад 27.07.1867 вызвалены ад адказнасці. Пэўны час жыў на Валыні. Вынікам яго падарожжаў па Беларусі, Літве, Польшчы і Украіне сталі малюнкі архітэктурных помнікаў і мясцін, звязаных з жыццём вядомых асоб.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 31, с. 108, а. 1, 7, 16 адв., 17, 36–40, 49, 59, 67 адв.; Ткачова В. Гродзенскія краявіды Напалеона Орды / В. Ткачова // Гарадзенскія запісы: старонкі гісторыі і культуры. – Гародня: ГрДУ, 1997. – Вып. 3. – С. 50–57.

П

“Паалей Цыён” (“Judisze Kommunistiszer Arbeiter Faband Poalej Cion”) – сацыялістычная яўрэйская партыя, якая выступала за стварэнне незалежнай яўрэйскай дзяржавы ў Палесціне, за аўтаномію яўрэяў і захаванне сваёй мовы. Было таксама патрабаванне дыктатуры пралетарыята. У 1920–30-я гады мела сваіх прыхільнікаў у Гродне.

Літ.: Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 360.

“Пагоня” – штотыднёвая незалежная газета на беларускай мове, якая выходзіла з 25.03.1992 да 12.11.2001 у Гродне. Нулявы нумар выйшаў 25.03.1992 на Дзень Волі, дзякуючы публіцысту, журналісту, літаратару Сяргею Астраўцову. З 1993 газета пачала выходзіць рэгулярна па пятніцах з пазнакаю: “Рэгіянальны агляд: Беласток-Горадня-Вільня”. З 1995 галоўным рэдактарам быў Мікола Маркевіч, журналіст і дэпутат Вярхоўнага Савета 12 склікання ад партыі БНФ. Наклад газеты ў гэтым годзе дасягнуў 10 тыс., а ў наступным – 14 тыс. асобнікаў. З лета 1997 да лета 1999 выходзіла 2 разы на тыдзень. З лета 1999 П. стала выходзіць раз на тыдзень, а наклад знізіўся да 7 тыс. Сталымі аўтарамі газеты былі Астроўскі Георг, Гумянюк Юры, Дарашкевіч Юлія, Задаля Валер, Карневіч Міхаіл, Кісель Зміцер, Руднік Вітаўт, Сідлярэвіч Алеся, Сіневіч Алёна, Сноп Сяргей, Хільмановіч Уладзімір. Газета спыніла існаванне згодна з рашэннем Вышэйшага Гаспадарчага суда РБ. Галоўны рэдактар М. Маркевіч і журналіст газеты П. Мажэйка былі асуджаныя за “паклёп на прэзідэнта Рэспублікі Беларусь”.

Літ.: https://be-tarask.wikipedia.org/wiki/Пагоня_(1992); https://pl.wikipedia.org/wiki/Pahonia. Доступ 10.01.2022.

Пагромы яўрэйскія. Верагодна, першы адбыўся у ноч з 31 ліпеня на 1 жніўня 1666 г. Некалькі хрысціян напалі на яўрэйскія дамы і крамы, дзе пабілі гаспадароў, сапсавалі тавары, а частку разрабавалі. Суд вынес пагромшчыкам жорсткі прысуд: 1,5 месяца турмы і 200 злотых кары на карысць ахвяр.

Я заўважыў, што пазней П. я. былі звязаныя з вайсковымі падзеямі. У красавіку 1915, у сувязі з набліжэннем фронту, з Гродна былі выселеныя яўрэі. Перад гэтым казачыя часткі рускай арміі здзейснілі пагром. 17–19 ліпеня 1920 г. перад адступленнем пад ціскам Чырвонай арміі польскае войска напала на яўрэяў. Газета “New York Times” (14.09.1920) паведамляла, што ў горадзе было

спалена 800 яўрэйскіх дамоў, забіта 15 яўрэяў, таксама сястра і брат амерыканскага яўрэя, які прывёз вялікія грошы для дапамогі мясцовым яўрэям.

Нагодай для пагрому 7–8 чэрвеня 1935 г. была бойка 4.06 з-за дзяўчыны-хрысціянкі Ніны Маліноўскай (танцоркі ў танцавальнай зале Рэйзнера) паміж палякам-матросам з Балтыкі Уладзіславам Кушчам і двума яўрэямі (Шмулем Штайнерам і Мейлахам Кантароўскім) у ноч з 4 на 5 чэрвеня. Напярэдадні апісанай падзеі радыкальная група маладых сябраў арганізацыі Нацыянальнага аб'яднання вяла антыяўрэйскую прапаганду, біла вокны ў дамах яўрэяў, зарганізавала бойку паміж хрысціянскай і іўдзейскай моладдзю пасля футбольнага матча. У дзень пахавання Кушчы, 7.06.1935, сабралася каля 1,5–2 тыс. чалавек. Пасля пахавання каля 1 тыс. чал. (рабочыя і студэнты) засталося каля могілак. Альфонс Панасюк заклікаў: "Хлопцы, за мной! Біць жыдоў". Натоўп узброіўся ў металічныя пруты, камяні, драўляныя палкі і прайшоўся па вуліцах Ерусалімскай, Брыгіцкай, Дамініканскай, Гувера, Калючынскай, Напалеона, плошчы Баторыя. Былі выбітыя шыбы ў 183 дамах і 85 крамах, якія былі абрабаваныя. Пабітыя больш за 40 чал., 2 з якіх (Ізраэль Беразоўскі і Эліяш Бехер) памерлі ў яўрэйскім шпіталі. Горад панёс страт больш чым на 20 тыс. злотых. Цікава, што пагромшчыкі абмінулі вуліцы, якія шчыльна заселеныя яўрэямі: Траецкую, Пераца, Школьны Двор, даліну Гараднічанкі. Вечарам 7.06 паліцыя затрымала 59 чал., сярод іх 8 яўрэяў. Газетам забаранілі пісаць пра гэты выпадак. "Dziennik Kresowy", які надрукаваў спіс пацярпелых, быў сканфіскаваны. 19–20.09.1935 у акруговым судзе адбыўся суд над забойцамі Кушчы. Штайнер (21 год), які ударыў нажом, атрымаў 12 год, Кантароўскі (23 гады) – 2 гады турмы; абодва павінныя былі выплочваць мацеры забітага па 30 злотых на месяц да яе смерці. 4–13.11.1935 адбыўся суд над пагромшчыкамі (17 чал.): А. Панасюк атрымаў год турмы, але быў адпушчаны за штраф у 100 злотых; 3 чал. прыгавораныя да 9 месяцаў турмы, а яшчэ 3 – да 6 месяцаў (гэтым 6 чал. адтэрмінавалі прысуд на 5 гадоў). У чэрвені 1935 Праўленне яўрэйскай гродзенскай суполкі вылучыла 500 злотых для ўзвядзення маўзалея ў памяць ахвяр. Пасля пагрому ў горадзе ўсталявалася варожасць паміж яўрэямі і хрысціянамі, пачаўся ўзаемны байкот крам.

18–20 верасня 1939 г. перад сыходам польскія вайскоўцы, паліцэйскія і каталіцкае насельніцтва горада пад заклікі віцэ-прэзідэнта горада *Р. Савіцкага* ажыццявілі яўрэйскі пагром. Напрыклад, напалі на д. 9 на пл. Баторыя, д. 4 на вул. Кляштарнай, д. 4 на вул. Мяшчанскай. Былі абстрэлы дамоў яўрэяў па вул. Маставой, Замкавай, інсцэніроўкі расстрэлу. У кватэрах шукалі зброю. Яўрэі абвінавачваліся ў дапамозе Чырвонай арміі (сапраўды 17.09 некаторыя з іх з чырвонымі павязкамі на рукаве з балконаў па вул. Брыгіцкай абстрэльвалі жыхароў). У выніку пагрому было забіта 25 яўрэяў, шмат пабітых.

Верагодна, у канцы чэрвеня ці пачатку ліпеня 1941 г. адбыўся ў горадзе яўрэйскі пагром, пра які згадваецца ў нямецкіх дакументах і сведчаннях відавочцаў.

Крын. і літ.: Вашкевіч А. Габрэйскі пагром у Гродне ў чэрвені 1935 г. па матэрыялах тагачасных газет і ўспамінах сведкаў // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары:

партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: зборнік навуковых артыкулаў / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 234–244; Зусім іншы горад /Уклад. А.Ф. Вашкевіч, Т.У. Касатая. – Гродна: ТАА "ЮрСаПрынт", 2017. – С. 34–35, 123–124; Малишевский Н. Бой за Гродно в сентябре 1939 года глазами участников и очевидцев. – Мн.: Издатель А.Н. Вараксин, 2012. – С. 130–131; Рэйн Л. Каралі і пешкі: калабарацыя ў Беларусі ў час Другой сусветнай вайны. – Смаленск: Інбелкульт, 2015. – С. 98; Сабалеўская В. Гарадзенскі кагал у XVI – XVIII стст. // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 149, 363; Супрон М. Гародня на старонках "The New York Times". 1853–1921. // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: зборнік навуковых артыкулаў / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 104; Gnatowski M., Radziecka administracja wojskowa na północno-wschodnich ziemiach Polski i scenariusze ich aneksji w Radzieckich dokumentach (wrzesień – grudzień 1939) // Studia Podlaskie. – 1999. – T. IX. – S. 164–235; Grzelak Cz. Wilno-Grodno-Kodziowce 1939. – Warszawa: Dom wydawniczy Belona, 2002. – С. 105–106; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005- 2005). – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020.

Пагулянка – раён Гродна, які знаходзіўся на тэрыторыі сённяшніх вуліц Лідскай, Белуша. Узнік на зямлі магістрата ў 1930-х гадах. Каля 40 домікаў (коштам 5 тыс. злотых) для адной сям'і былі пабудаваныя для працоўных з малымі прыбыткамі. Пры дамах быў агарод. Рабочыя атрымоўвалі маёмасць і зямлю ў крэдыт, але *вайна Другая сусветная* спісала ўсе даўгі. Частка дамоў захавалася да нашага часу.

Літ.: Poczobut-Odlanicki St. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok, 2015. – S. 205–206.

Падол, Ніжні горад – раён горада ад *моста* Старога праз *Нёман* і ўздоўж усяго берага ракі да *могілак* фарных. Археалагічныя звесткі ўпэўніваюць, што пасяленні тут былі ўжо ў XI–XII стст. У склад *Гарадні* ўвайшоў пасля надання гораду *права магдэбургскага* ў 1496 г. Тут знаходзіліся вуліцы: Ад Нёмана да *царквы* Чэснага Крыжа, Плутніцкая, вуліца на беразе Нёмана, вуліца за Вераб'ём, вуліца ад Філімона, вуліца каля двара Халецкага да Нёмана, вуліца ад Рову да Перавозу. Згодна з *валочнай памерай* тут мелі свае дамы *Валовічы*, Мялежкі, *Храптовічы* і інш. Амаль на канцы раёна знаходзіліся могілкі з капліцай ад *царквы Прачысценскай*. Выяву раёна сярэдзіны XVI ст. можна пабачыць на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта*. Падчас *пажару* 1885 Падол пацярпеў, і віцэ-старшыня "дамскага камітэта" дапамогі пагарэльцам *Ажэшка Э.* персанальна адказвала за яго (ад касцёла і кляштара бернардзінцаў да Нёмана – каля 200 сямей). У 1920–1930-я гады Падол быў пасяленнем у асноўным гарадской беднаты. Дамы адна- і двухпавярховыя прыціскаліся адзін да аднаго. Па вуліцы людзі хадзілі па драўляных ходніках уздоўж сцен. Панавала антысанітарыя: калодзежы і прыбіральні стаялі побач, жыхары часта бралі ваду з Нёмана. У раёне быў высокі ўзровень злачынства. На сённяшні дзень ужо не існуе цэлы квартал у раёне *бровара Кунца*, забудова вуліцы Падгорнай, квартал каля *чыгункі* – адзінага гісторыка-архітэктурнага комплекса Падола няма.

Захаваліся будынкі бровара Кунца, фабрыкі *Шарашэўскага* (цяпер будынак Беларускага інстытута права), *касцёл і кляштар бернардзінцаў, могілкі* і паўднёвы рэдут крапасных умацаванняў XVII ст. па вул. Антонава.

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 94–95; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 341; Краўцэвіч А.К. Гарады і замкі Беларускага Панямоння XIV–XVIII стст.: Планіроўка, культурны слой / Краўцэвіч А.К. – Мн.: Навука і тэхніка, 1991. – С. 70; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 279–286; Писцовая книга Гродненской экономии с прибавлениями, изданная Виленской комиссией для разбора древних актов. Ч. 1. – Вильна, 1881. – 592 с.; Ч. 2. Вильна, 1882. – С. 46–53; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С. 59–60; Швед В.В.Губернскі горад: аповяды з гісторыі горада (канец XVIII – пачатак XX). – Баранавічы: Баран. Узб. Друкарня, 2003. – С. 89–96.

Пажары. Гродна, доўгі час забудаванае ў большасці драўлянымі дамамі, было пажаранебяспечным горадам. Шчыльная драўляная забудова была добрым асяроддзем для пажараў. Супрацьпажарныя загады *Горадні,* відаць, упершыню дала каралева *Бона* ў *прывілеях* 1540–1541 гг. *Магістрат* быў забавязаны штогод даваць ёй справаздачу аб стане гарадскіх забудоў, мяшчане павінныя былі мець падрыхтаваную ваду для гашэння агню. Сеймавая канстытуцыя 1677 забавязвала будаваць *бровары* з мураванымі комінамі і не пад саламянымі стрэхамі. У 1744 Аўгуст III распарадзіўся аб неабходнасці кожнаму *гарадняніну* мець запас вады і крукі/багры "для разрывання будынкаў". У 1788 гарадскія ўлады скідвалі небяспечныя коміны, зрывалі саламяныя дахі, ліквідавалі пажаранебяспечныя забудовы. Праверка цывільна-вайсковай *камісіі парадкавай* 1791 паказала, што не ўсе жыхары праводзяць супрацьпажарныя мерапрыемствы. А адсюль і тыя вынікі, якія мы ў храналагічным парадку змяшчаем ніжэй. Даследчыца Г. Паўлоўская налічыла, паводле кляштарных хронік кармелітаў босых, езуітаў і бернардзінцаў Горадні, 22 згадкі пра 28 пажараў з 1669 па 1791 гг.

Летам 1183, згодна з Іпацьеўскім летапісам, "Городенъ погоре всь и церкы каменая от блистания молние и шибения грома".

У 1398 адбыўся пажар у *замку Старым*, які ў той час быў драўляным. Падзея адбылася ноччу і, дзякуючы толькі хатняй малпе (адна з версій), *Вітаўту* і жонцы ўдалося выратавацца. Пасля яго было прынятае рашэнне аб пабудове мураванага замка.

Падчас пажару 1606 гетман польны ВКЛ Ян Хадкевіч, толькі што вярнуўшыся пасля слаўнай перамогі пад Кірхгольмам, страціў маёмасці на 5 тыс. злотых. Сярод страт былі трафейныя штандары, з якіх удалося выратаваць каля 30, ды і тыя пагарэлыя. Страцілі шаблі, палашы аздобленыя, плашчы і іншы рыштунак.

У 1613 згарэла *Васкрасенская царква*

У 1617 згарэла *сінагога.*

У жніўні 1665 адбыўся вялікі пажар, калі горад быў "датла разбураны і спустошаны маскоўскім войскам".

У 1669 адбылося як мінімум 7 пажараў. Былі знішчаныя розныя часткі горада, 7 разоў запальваліся стайні, 4 разы *калегія і касцёл езуітаў*, пашкоджаны будынак калегіі.

У маі 1672 горад перажыў наступны моцны пажар: у цэнтры згарэлі 163 дамы *яўрэяў* і хрысціян па вул. Вялікай Жыдоўскай, па вулічцы, якая ішла да царквы Саборнай, а таксама ў заходняй частцы *Рынку*, якія прылягалі да названых вуліц. У спісе стратаў будынкі жылыя, *бровары,* шынкі. У чэрвені гэтага года кароль Міхал Вішнявецкі выдаў лібертацыю, якой вызваляў гарадзенцаў на 4 гады ад аплаты падаткаў і дазволіў карыстацца лесам каралеўскіх пушчаў для адбудовы дамоў.

У 1690 пажар ахапіў дах касцёла езуітаў.

У 1694 значная частка горада была знішчаная пажарам, які пачаўся апоўначы.

У 1698 ноччу гарэў палац падскарбія побач з драўлянымі забудовамі калегіі.

У 1705 расійскія войскі спалілі прадмесце горада.

У 1720 пажар знішчыў горад. Аўгуст II вызваліў Горадню ад вайсковых і некаторых натуральных падаткаў і павіннасцяў.

У 1735 пажар знішчыў пабудовы *замка Старога.*
Вялікая частка горада была ахопленая пажарам 1748 г., перад святам Пяцідзясятніцы.

Два пажары 1753 г. (20.05 альбо 13.06; 11.10) выпалілі усю цэнтральную частку горада. "Досыць, што ледзьве трэцяя частка места засталася". Пажары спустошылі шматлікія мяшчанскія і яўрэйскія дамы, шляхецкія сядзібы і *палацы* магнатаў, будынкі кляштараў базыльянак, дамініканцаў, бернардзінцаў, брыгітак і *шпіталя Св. Духа*. У хроніцы езуітаў выказваецца падзяка войску ВКЛ за дапамогу ў барацьбе з агнём у маі месяцы: яны разбуралі драўляныя дамы вакол касцёла, каб не даць пажару магчымасці перакінуцца на касцёл. У гэты дзень у Горадні знаходзіліся два гетманы ВКЛ Юзаф Масальскі і Міхаіл Казімір Радзівіл "Рыбанька", якія і кіравалі жаўнерамі падчас пажару. У маі згарэлі палац і драўляны двор Храптовіча, пісара земскага гродскага, юрыдыка гетмана Масальскага, кляштар і юрыдыка базыльянак, двор харунжага Красіцкага; *палацы* Бжастоўскага, князя харунжага ВКЛ Радзівіла, Тышкевічаў, Пацаў, падканцлера *Тызенгаўза*, Агінскага, ваяводзіны Мсціслаўскай Сапежыны; карчмы вялікая стражніка польнага Барановіча, Забужскага, стражніка польнага, пісара польнага; касцёл бернардзінскі і кляштар, яго драўляныя пабудовы.

Моцны пажар адбыўся ў 1754 г. Ён закрануў *царкву Васкрасенскую*, *палацы.*

Пажар 11.06.1765 пачаўся ў доме *бурмістра* горада Т. Клава. Хроніка бернардзінцаў адзначыла ролю званоў, якія ноччу абудзілі гараджан, і тыя не далі пажару распаўсюдзіцца па горадзе. Падчас пажару адбыліся крадзяжы.

16.02.1769 гарэла вул. паміж бернардзінкамі і домам Браўна. Спалена некалькі дамоў.

У 1774 пажарам у першы дзень Вялікадня (03.04) былі знішчаныя будынкі старога *касцёла і кляштара кармелітаў*, рэфектарый новага кляштара, будынак кухні. У новым касцёле маскавіты знішчылі алтар і выламалі дзверы, каб схавацца ад небяспекі.

1776. Архіўныя матэрыялы даюць фінансавыя страты за знішчаныя пажарам дамы яўрэяў (29 800 злотых) і тавары (34 950 зл.).

1781. Архіўныя матэрыялы даюць фінансавыя страты за знішчаныя пажарам дамы яўрэяў (1 150 злотых) і тавары (7 320 зл.), даўгі – 19 020.

1 мая 1782. У хроніцы бернардзінцаў пазначана, што пажар пачаўся "аб адзінаццатай гадзіне ночы" у доме яўрэя, дзе выраблялася гарэлка. Згарэла вялікая частка горада, асабліва па Замкавай вуліцы, згарэлі дах *фарнага касцёла*, дах кляштара, драўляны дом, кухня, рэфлекторый, пякарня, кладоўка, стайня і кузня, бібліятэка дамініканцаў; стайня афіцыяла Падляшша (5 коней і карэта князя *Ксаверыя Масальскага* "англійскай работы"). Даследчык Мечыслаў Ян Супрон, на аснове люстрацыі Горадні за 1782 г., сцвярджае, што было знішчана 114 дамоў і пашкоджана 118. Архіўныя матэрыялы даюць фінансавыя страты за знішчаныя дамы (458 890 злотых) і тавары (502 210 зл.).

У чэрвені 1789 на *Гарадніцы* згарэў бровар, які быў збудаваны *А. Тызенгаўзам*. Страты склалі каля 100 тыс. злотых.

Уначы 6 мая 1791 пачаўся вялікі пажар ад дома яўрэя каля яўрэйскай школы. Былі знішчаныя 26 драўляных дамоў яўрэяў, конская стайня. Агонь дайшоў да мураванага палаца падкаморыя гарадзенскага павета Юндзіла "на публічнай вуліцы горада", але жыхары і вайскоўцы абаранілі яго і не далі пажару распаўсюдзіцца далей. 5 чэрвеня за Нёманам адначасова пачалі гарэць дом і *карчма*, некалькі дамоў былі адразу спаленыя. Хроніка бернардзінцаў падазравала наўмысны падпал.

Пажар 1865 здарыўся ў яўрэйскім квартале горада. Згарэлі 82 дамы.

Пажар 22 чэрвеня 1885 г. На Школьным двары (раён цяперашняй МНС па вул. Замкавай) пачаўся пажар, які за некалькі дзён зліквідаваў значную частку горада і архіў *дваранскага дэпутацкага сходу* (на ліквідацыю вынікаў пажару цар ахвяраваў 25 тыс. руб., а яго спадкаемец – 5 тыс. руб.). Вялікую ролю ў дапамозе гродзенцам аказала *Э. Ажэшка* – сябра Дамскага камітэта дапамогі пагарэльцам. Аб гэтым пажары можна прачытаць навэлы Ажэшкі, фельетон А. Чэхава "На Луне".

У 1896 падчас пажару згарэла 511 будынкаў.

У 1899 падчас пажару згарэлі часовы вайсковы *шпіталь*, шмат дзяржаўных і прыватных будынкаў.

22–23 ліпеня 1921 здарыўся вялікі пажар у квартале ад *Рыбнага рынку* да вул. Рынкавай (Св. Тройцы) – пацярпелі каля 300 дамоў, у якіх жылі пераважна яўрэі.

22.06.1941 ад нямецкай бамбардзіроўкі пачаліся пажары ў квартале паміж вуліцамі Мяшчанскай і Маставой. Потым яны перакінуліся на *Рынак сянны*, на *касцёл бернардзінскі*.

Літ.: Анікіевіч М.П. З гісторыі пажарнай справы // ПГіКБ. – 1979, №4, с. 41; Баравік П. Гарадзенскія парафіі // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 85, 92, 93; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 54–55; Маліноўская Т.Р. Тэндэнцыі развіцця архітэктуры Гродна напрыканцы XVIII ст. // Ігнат Анацэвіч: Жыццёвы шлях, педагагічная і навуковая спадчына. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 109; Паўлоўская Г. Гародня ў полымі, або Апісанні горада ў момант катастрофы // // Grodnae et orbi: гарадскія супольнасці і гарадское асяроддзе XIV – XX стст. / пад рэд. А. Радзюка і І. Галубовіча. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2018. – С. 74–91; Саяпин Ю.В. Утраченные католические храмы Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 86, 91; Супрон М. Гародня на старонках "The New York Times". 1853–1921. // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: зборнік навуковых артыкулаў / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 102; Супрон М. Я. Невядомыя старонкі гісторыі Горадні (паводле блога supron-licvin.livejournal.com) // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Вып. 10 (2015) / рэдкал. І. Соркіна [і інш.] – Гродна, 2016. – С. 79; Супрон М.Я. Супрацьпажарная абарона Гародні ў XVI – XVIII стст. [http: //Supron-licvin.livejornal.com/27839.html]; Швед В.В. Гродзенскія пагарэльцы 1885 года і Эліза Ажэшка / В.В. Швед // Пісьменніца. Грамадскі дзеяч. Жанчына: да 170-годдзя з дня нараджэння Э. Ажэшкі. – Гродна, 2013. – С. 120–126; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005- 2005). – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020; Gordziejew J. Socjotopografia Grodna w XVIII wieku. – Toruń, 2009, s. 48; Grodno w XVIII wieku. Miasto ludność (na tle trendów rozwojowych od średniowiecza do 1939 roku), red. A. Woltanowski, J. Urwanowicz, Białystok 1997, s. 23–24; Wiadomość o pożarze zdarzonym 1755 roku w Grodnie // Ondyna Druskienickich źródel. – 1846. – Zesz. 7. – Grodno, s. 35–38.

Пазнякоў Іван Барысавіч (1.07.1902, в. Хутаранка Насовіцкай воласці Магілёўскай губ. – пасля 25.06.1983, Мінск) – партыйны і савецкі дзеяч. З 1917 па 1937 працаваў у Гомелі на чыгунцы: на будаўніцтве, у вагонным дэпо, служыў у надзвычайным атрадзе Гомельскага губернскага камітэта партыі, затым – у Чырвонаармейскім 5-м чыгуначным палку, працаваў на гомельскім паравозабудаўнічым заводзе. З ліпеня 1931 быў на партыйнай працы ў гомельскім гаркаме партыі, пасля – сакратаром Чашніцкага раённага камітэта партыі Міельскай акругі (1937), трэцім сакратаром Віцебскага абласнога камітэта партыі (1938). Пасля заканчэння вучобы ў вышэйшай маскоўскай партыйнай школе стаў партыйным арганізатарам пры ЦК КПСС (1939–1940).

У 1940 накіраваны працаваць першым сакратаром Гродзенскага гаркама партыі. З пачатку *вайны Вялікай Айчыннай* арганізаваў ахову важных дзяржаўных і вайсковых аб'ектаў, эвакуяваў частку каштоўнасцей і дакументаў, пэўную колькасць насельніцтва. Сам трапіў у акружэнне і толькі 30 ліпеня злучыўся з савецкай арміяй у р-не Рагачова. Ваяваў на Цэнтральным, Бранскім і Калінінскім франтах; з восені 1942 па 1944 быў сакратаром Віцебскага падпольнага абкама партыі. Пасля вайны быў на партыйнай працы. З 1971 пайшоў на пенсію. Жыў у Мінску.

Палац Агінскіх – былы палац Сапегі І., будынак старога гродзенскага *бровара*. Пляц ляжаў на скрыжаванні Падольнай вул. з "вул. да перавозу" (цяпер вул. Завадская, 2). На плане Горадні 1706 г. пазначана, што пляцам валодаў троцкі ваявода Юзаф Агінскі, з другой паловы 18 ст. пляцам з палацам і афіцынамі – ягоны сын, польны літоўскі пісар, будучы вялікі літоўскі гетман Міхал Казімір Агінскі, ад якога ў 1779 маёмасць набылі гарадзенскі маршалак Казімір і Ганна з Хлявінскіх Вольмеры. Потым гаспадарамі былі: літоўскі канцлер Аляксандр Сапега (з 1789), граф Міхал Дзяконскі, аўстрыйскі падданы купец *Юзаф Кунц.* Апошні прайшоў курсы піваварaў у чэшскай Празе і ў 1877 заснаваў у Гродне бровар у будынку былога палаца А.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 200; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 39–40; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 273–277.

Палац адміністратара (а таксама: "кватэра паўнамоцнага расійскага пасла", палац Дзяконскага, палац графа *Міхала Валіцкага*, архірэйскі дом). У часы *Вітаўта* на месцы названага будынка паводле яго фундацыі пабудавалі касцёл Св. Мікалая, які выконваў функцыю замкавай капліцы княскага двара *Гарадніцы. А. Тызенгаўз* у 1765–1780 гг. ажыццявіў тут свае эканамічныя і культурныя рэформы, падчас якіх дрэздэнскі архітэктар *Ёган Георг Мёзер* спраектаваў у 1776–1778 (гл. на плане Гарадніцы 1780 г.) палац адміністратара маёмасцяў *Гродзенскай эканоміі*. Будаўніцтва яго было завершанае ў 1793, і знаходзіўся ён насупраць *палаца Тызенгаўза*, замыкаючы гарадніцкі архітэктурны ансамбль. Па спісе насельніцтва 1794 г. бачна, што на Гарадніцы жыў адміністратар, шамбялян Яго Вялікасці караля Станіслава Панятоўскага Марцін Бадэні (1780–1795). Але, відаць, у іншым доме, бо палац быў падараваны Антонію Дзяконскаму, падскарбію надворнаму літоўскаму (1785–1791). Ён заслужыў яго, магчыма, за добрае выкананне абавязкаў сябры камісіі, якай вяла эканамічны працэс супраць Тызенгаўза, а таксама ў Каралеўскай эканамічнай камісіі, якая кіравала эканамічнымі інтарэсамі каралеўскага стала, спадчыннымі маёнткамі караля і ўсімі яго даходамі. З 17 чэрвеня па 23 лістапада 1793 г. у Гродне праходзіў *сейм Рэчы Паспалітай,* які юрыдычна зацвердзіў другі падзел польска-літоўскай канфедэрацыі. 21 сакавіка ў горад прыехаў надзвычайны і паўнамоцны пасол Расійскай імперыі граф *Якаў-Ёган Сіверс*, які

граў першую скрыпку на паседжаннях сейма. "Кватэра паўнамоцнага расійскага пасла" знаходзілася ў палацы Дзяконскага, які быў у гэты час з ім у сціслых стасунках. Тут спраўлялі дзень імянінаў пасла, адзначалі падпісанне дамовы паміж Рэччу Паспалітай і Расіяй (другі падзел Рэчы Паспалітай). З 1795 палац стаў належаць графу М. Валіцкаму. Падчас *вайны 1812 г.* у палацы Валіцкага знаходзіўся галоўны штаб вестфальскага караля, роднага брата французскага імператара, *Жэрома Банапарта*. У 1837 у гарадзенскіх уладаў узнікла ідэя купіць палацавы комплекс Валіцкага для размяшчэння тут казармаў гарнізоннага батальёна. Леапольд Валіцкі, гаспадар дома, быў згодны прадаць яго за 7 тыс. рублёў срэбрам, але той знаходзіўся ў закладзе пад 17 тыс. руб. срэбрам за памешчыкам Юльянам Халявінскім (магчыма, Хлявінскім). Здзелка паміж губернатарам і Валіцкім не была здзейсненая. У 1842 палац купіла праваслаўнае ведамства за тыя ж 17 тыс. руб., і з гэтых часоў ён стаў рэзідэнцыяй другога вікарыя літоўскай епархіі ("Архірэйскі дом"). Першым епіскапам, які тут пасяліўся, быў Ігнаці (Жэлязоўскі), апошнім – Сергій (Ларын). На адной з акварэляў *Напалеона Орды* бачны былы палац Валіцкага, навакольныя вулачкі пад узвышшам, *мост* праз *Гараднічанку*. У галоўным будынку жыў архірэй, тут была да 1974 г. дамавая царква. У паўночным флігелі размяшчалася вазоўня і жыллё для служак, а ў паўднёвым – кухня і службы. Сюды пасля надбудовы галерэі са званіцай перанеслі дамавую царкву і асвяцілі яе ў гонар святых мучанікаў Антонія, Яна і Яўстафія. З 1853 па 1872 у архірэйскім доме дзейнічала перанесеная з Супрасля 3-гадовая павятовая духоўная школа. 26 лістапада 1904 тут адбыўся ўстаноўчы сход Гродзенскага *камітэта царкоўна-археалагічнага*. Пэўны час у архірэйскім доме працавала майстэрня па маляванні абразоў. Вясной 1919 у ім размеркавалася беларуская вайсковая камендатура, а ў паўночным флігелі – эскадрон М. Глінскага з 1-га Гродзенскага беларускага пяхотнага палка. Прыкладна тады ж у архірэйскім доме з'явілася беларуская культурна-асветніцкая арганізацыя "Лучынка", а трохі пазней – першая ў Гродне беларуская *гімназія.* У 1920 у адным з флігеляў пачало працаваць Рускае дабрачыннае таварыства. Яшчэ ў 1923 палацавы комплекс уключаў 5 жылых будынкаў і 7 гаспадарчых пабудоў. У 1952 Гродзенская епархія была ліквідаваная, а архірэйскае падвор'е канфіскаванае. За гады Савецкай улады тут пабывалі самыя розныя ўстановы: гарадскі інтэрнат, гродзенскі памежны атрад, лабараторыя экалагічнага кантролю, адзін з карпусоў медыцынскага універсітэта. У 1992 г. у Гродне была адноўленая епіскапская кафедра, якая аднавіла архірэйскае падвор'е.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 115–119: Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшая школа, 1969. – С. 130; Чарнякевіч А. Гародня: другая сталіца БНР //Шляхамі БНР. Да 100-годдзя абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 29–41; Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 12. – Гродна: ГАІУН, 2010. – С. 55–71.

Палац віцэ-губернатара гл. Дом Максімовіча.

Палац Валіцкага М. гл. палац адміністратара.

Палац культуры і тэхнікі вытворчага аб'яднання "Азот" пабудаваны ў 1974 архітэктарам У. Бажко на вул. Гарнавых, 17. Будынак з цэглы прамавугольны ў плане, ёсць унутраны дворык. У П. маюцца залы для гледачоў. Тут выступаюць самадзейныя і прафесійныя артысты, у розных гуртках, ансамлях, студыях, курсах займаюцца дзеці і дарослыя.

Літ.: Гродно. Энцикл. справ. / Белорус. Сов. Энцикл.; Редкол. И.П. Шамякин (гл. ред.) и др. – Мн.: БелСЭ, 1989. – С. 195–196.

Палац культуры тэкстыльшчыкаў, пабудаваны на месцы *Замкавага двара* XVI ст. згодна з рашэннем гарадскога выканаўчага камітэта ад 6.02.1953, паводле тыпавога праекта з выкарыстаннем элементаў класіцызму (архіт. І. Рожын). Акт прыёмкі будынка падпісаны 22.10.1959. Сярод гродзенцаў ходзіць легенда пра тое, што палац пабудавалі "задам наперад": фасад, які выходзіць на Дом побыту, павінен быць пярэднім і глядзець на плошчу, а фактычны пярэдні фасад – гэта задні выгляд палаца. На сцяне палаца, з боку вул. Замкавай, з 1970 вісіць мемарыяльная дошка, прысвечаная першамайскай дэманстрацыі і мітынгам працоўных у 1921–1939 гг. У канцы 1980-х у палацы дзейнічалі 3 народныя ўніверсітэты (сямейна-побытавых адносін, культуры і атэізму), 43 гурткі і аматарскія аб'яднанні, у якіх займаліся каля 1 500 чал. Званні народных атрымалі ансамбль танца "Раніца", народны тэатр, агітацыйная брыгада "Дзелавыя хлопцы". Перад палацам у савецкі час ставілі трыбуны, з якіх гарадская савецкая і партыйная ўлады прымалі парады і дэманстрацыі жыхароў Гродна, што праходзілі на плошчы Савецкай.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 303; Гродно. Энцикл. справ. / Белорус. Сов. Энцикл.; Редкол. И.П. Шамякин (гл. ред.) и др. – Мн.: БелСЭ, 1989. – С. 196.

Палац культуры "Юнацтва" Гродзенскага вытворчага прадзільна-ніткавага аб'яднання на вул. Урублеўскага, 33, адкрыты ў 1976 г. Меў некалькі залаў: глядацкія – тэатральна-канцэртны, кіна-лекцыйны; танцавальны і спартыўны. Працавалі клубы паводле інтарэсаў для дзяцей і дарослых, займаліся гурткі і калектывы самадзейнасці. Пасля скасавання вытворчага аб'яднання П. быў закрыты і перададзены ў*ніверсітэту Гродзенскаму дзяржаўнаму*.

Літ.: Гродно. Энцикл. справ. / Белорус. Сов. Энцикл.; Редкол. И.П. Шамякин (гл. ред.) и др. – Мн.: БелСЭ, 1989. – С. 196.

Палац Сангушкаў, знаходзіўся на вул. Скаліманаўскай (зараз Гараднічанскай). Сангушкі набылі пляц у 1704 і 1715, а ў 1725–1726 гг. пабудавалі палац. У 1780-х *Тызенгаўз А.* перанёс сюды *кадэцкі корпус*. У 1795 палац перайшоў да новых уласнікаў – Патоцкіх.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 162.

Палац Тызенгаўза А., пазней губернатарскі дом, сустракаецца і назва "замак". Пабудаваны ў 1760–1770-х гадах архітэктарамі *Мёзерам Ю. і Сака Дж.*, пры ўдзеле мастакоў Пятра Гежыдовіча, Лукаша Хібля, Антонія Грушэцкага і Фолвіля. Грушэцкі, напрыклад, намаляваў 8 супрапортаў з вазамі і кветкамі, 6 з фігурамі асоб, 3 з ланшафтамі, а таксама зрабіў дэкаратыўны роспіс столі і малюнкі на біблейскія і міфалагічныя сюжэты. Будынак выкананы ў стылі пераходу ад барока да класіцызму, з выкарыстаннем элементаў ракако (апрацоўка рустам фасадаў, упрыгожванне залы і інтэр'ераў). Будынак быў аднапавярховым і даволі расцягнутым, у цэнтральнай частцы меў анфіладную сістэму плана, а ў бакавых крылах – калідорную. У цэнтры галоўнага фасада, на купале двухпавярховага рэзаліта знаходзілася скульптура багіні Цэрэры (старажытнарымскай багіні жыццёвых сіл зямлі, мацярынства і шлюбу). У крылах палаца знаходзіліся канторы *эканоміі гродзенскай*. Злева ад галоўнага ўвахода была вялікая зала для прыёмаў, справа – жылыя пакоі *Тызенгаўза А*. Перад палацам быў парадны двор, а за ім *парк*. На падворку месціўся сонечны гадзіннік (з 1765 па 1915). У інтэр'еры былі карціны, статуі, прывезеныя з Еўропы, каміны з карарскага мармуру. Тызенгаўз меў звычку на свае імяніны збіраць 11 студзеня ў сваім палацы ваколічную шляхту, частаваў і паіў яе, каб яна падтрымоўвала яго мерпрыемствы і галасавала за яго рашэнні дзеля "дабра краю". Пасля далучэння Гродна да Расійскай імперыі ў палацы Т. жыў *Сіверс Якаў*, тут і ў суседніх *садзе Батанічным* і *Швейцарскай даліне* ў 1793 адзначылі ягоныя імяніны: цэлы тыдзень працягваліся балы, раўты, абеды, вячэры, ілюмінацыі і феерверкі. Рэймант У. апісвае іх ў аповесці "Год 1794". Пазней тут жыў генерал-губернатар *М. Раппін*. Паводле адной з версій у палацы Т. апошні польскі кароль *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* падпісаў сваё адрачэнне ад прастолу. З 1802 П. Т. стаў сядзібай гродзенскіх *губернатараў*. Пакоі ішлі амфіладай, і *губернатар Урусаў* ездзіў па іх на роварах. А дачка *Сталыпіна П. А*. успамінала: "І што за пакоі! Не вельмі высокія, глыбокія, утульныя пакоі вялікага старажытнага памешчыцкага дома, з масай калідорчыкаў, нейкіх вуглоў і закамараў". У 1904 у доме губернатара было 67 пакояў, 67 галандскіх печаў, 3 кухонныя печкі (на ўсе печы траціліся 154 сажані дроў), на ўтрыманне парадку ішло 445 руб. 50 кап., на забеспячэнне вадою з *вадаправода* – 300 руб. Імператары расійскія, якія прыязджалі ў Гродна, бывалі тут абавязкова. Падчас *вайны 1812 г.* некалькі дзён жыў у П. Т. князь *Панятоўскі Юзаф*, камандзір V польскага корпуса. У 1915 у П. Т. трапіла нямецкая бомба, ён быў разбураны і згарэў.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 19, с. 980, а. 15 адв.; Бок М. Воспоминание о моём отце П.А. Столыпине. М., 2014. – С. 114; Канюк Н.Г. Хранитель Жилибертии. – Гродно: ЮрСаПринт, 2017. – С. 72–79; Кулагін А. М. Гродзенскі палац Тызенгаўза // Беларуская энцыклапедыя ў 18-ці т. Т. 5. – Мн., 1997. – С. 437; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшая школа, 1969. – С. 123; Маліноўская Т.Р. Тэндэнцыі развіцця архітэктуры Гродна напрыканцы XVIII ст. // Ігнат Анацэвіч: Жыццёвы шлях, педагагічная і навуковая спадчына. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 116; Павач А. Sursum Corda.– С. 147–152; Jadźwing, Pałac Tyzenhauza w Grodnie // Głos znad Niemna. 1917: jednodniówka grodzieńska – Grodno, 1918. – S. 57–62.

Палац Храптовічаў (1742, 1752), камяніца Мучынскіх, палац *Ляхніцкага* (1790) на вул. Замкавая, 16. Археолаг Краўцэвіч А. праводзіў тут раскопкі і сцвярджае, што частка будынка знаходзіцца на фундаментах больш старажытнага збудавання.

Літ.: Краўцэвіч А.К. Гродзенскі вакольны горад / А.К. Краўцэвіч // Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. – Мінск: БелСЭ, 1993. – С. 189; Краўцэвіч А.К. Археалагічнае даследаванне Гародні / А.К. Краўцэвіч // Arche. – 2010. – № 1–2. – С. 606–624.

Палац Чацвярцінскіх – знаходзіцца на вул. Ажэшкі, 20. Гэта былы будынак *школы медычнай*. Перад *вайной Першай сусветнай* належаў Чацвярцінскім. Сюды з пачаткам вайны пераехалі Канстанцін Ч. (1875–1939), яго жонка Гелена Анна з Пшэздзецкіх (1875–1966) і дзеці.

Літ.: Potocka J. Diennik z lat 1914–1919. Wszystko, co kocham, Wrocław, 2014, s. 77–78.

“**Палац шкляны”** або **“крыштальны”**, пабудаваны ў канцы XVII ст. у кварталe паміж вуліцамі Дзям’янаўскай і Аліскоўскай. Пабудаў яго на касцельных землях ваявода віленскі Міхал *Пац.* Пры будаўніцтве палаца выкарыстаныя “французскія вокны”. Пасля смерці Паца (1682) палац перайшоў бернардзінцам. У 1684 яны прадалі яго ваяводзе віленскаму і гетману вялікаму літоўскаму Казіміру Яну Сапегу. Пасля яго ўласнікамі палаца былі: сын гетмана ваявода мсціслаўскі Юры, староста мерацкі і кашталян троцкі Антоні Казімір Сапега. У 1715 адбываліся тут скарбовыя і земскія суды. Паказаны на дрэздэнскім плане 1753 г. Будынак згарэў падчас *пажару*.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2008. – С. 224–225; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 44.; Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV-XVIII wieku. – Supraśl: Acta collegii Suprasliensis, 2005. – S. 119.

Палацы Масальскіх

1) Адзін з палацаў трохпавярховы, П-падобны, асіметрычны ў плане будынак па вул. Ажэшкі, 1. Верагодна, быў пабудаваны ў 1742 г. У цэнтральнай частцы знаходзіцца арачны праезд, вылучаны трохвугольным франтонам. У *пажары* 1782 быў моцна пашкоджаны. На планах 1830-х гадоў намаляваны як комплекс з некалькіх будынкаў, частка з якіх напэўна драўляная, належала купцу Фрумкіну (з 1831–1843 да 1939). У 1843–1903 будынак арандавала тэлеграфнае ведамства. Летам 1920 у П. М. размеркаваліся розныя бальшавіцкія ўстановы, у некаторых з іх працавалі вядомыя беларускія дзеячы – *Смоліч Аркадзь*, Рак-Міхайлоўскі Сымон. У 1946 палац быў адрамантаваны, і ў ім да 1958 размяшчаўся чыгуначны тэхнікум і трохгадовая школа машыністаў паравозаў. Са жніўня 1958 тут знаходзіўся медычны інстытут. Сёння на цокальным паверсе працуюць крама “Мяса-каўбаса”, кавярні “Карчма”, “Рэтра-піца”, “Каваманія”. Пад часткай будынка знойдзеныя крыжовыя скляпенні 18 ст.

2) Амаль насупраць праз вуліцу стаялі яшчэ два палацы, адзначаныя на плане Гродна 1753 г. Пад часткай будынка знойдзеныя крыжовыя скляпенні 18 ст. У 1795 тут фігуруе драўляная пабудова.
3) Па вул. Замкавай (цяпер дом № 5) у 1643 г. упаміналіся раннебарочныя мураваны палац і камяніца Масальскіх. Гаспадарамі палаца былі ў розныя часы цікавыя і ўплывовыя асобы: вялікі гетман літоўскі Міхал Юзаф Масальскі, каталіцкі біскуп Якуб Ігнацы Масальскі. У 1794 будынкі належалі падкаморыю Францішку Юндзілу. У 1912 палац стаў трохпавярховым. 28.03.1920 тут адбыўся агульны сход Гродзенскага Беларускага *нацыянальнага камітэта*. У 1926 у памяшканнях размеркаваліся яўрэйская рэлігійная школа "Tora Jabne" і Клуб яўрэйскай інтэлігенцыі. Пасля *вайны Другой сусветнай* будынак быў перабудаваны: з'явіўся новы франтон і балконы. З 1970-х гадоў гэта будынак інтэрната № 1 медычнага ўніверсітэта.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 15; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С.27–30; Саяпин В. Пешком по Ожешко и Советской/ Виктор Саяпин. – Гродно: ООО "ЮрСаПринт" 2011. – С. 57–59; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 23–24; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 33–34.

Палацы Радзівілаў. Адзін з іх знаходзіўся на *Рынку*. У 1751 г. літоўскі абозны К. Масальскі і яго жонка прадалі палац, крыты дахоўкай, за 55 тыс. злотых вялікаму літоўскаму ваяводзе М.-К. Радзівілу. Апошні стаў валодаць вялікай часткай рынкавага пляца. Тут у 1738–1744, паводле праекта Фантаны Дамініка (відаць, сына *Юзафа Фантаны II*) і пад наглядам Рашкевіча Аўгусціна, быў пабудаваны новы палац Радзівілаў. Не выключаны ўдзел у будаўніцтве таксама Казіміра Антонія Здановіча і Карла Петэрсана. Копіі кантрактаў з рамеснікамі і прадпрымальнікамі за 1795–97 гавораць пра выкарыстанне партэра (першага паверха) палаца пад яўрэйскую краму, памяшкання для працы сталяра, крамы і склада пры ёй, яшчэ адной крамы і станцыі з каморай. У гэтым палацы ў 1812 ляжаў хворы *Давыдаў Дзяніс*, які вызваліў горад ад напалеонаўскіх войск. У 1922 выступалі гарадзенскія сеймавыя паслы *Баран С. і Якавюк С.* Палац пасля *вайны Другой сусветнай* моцна быў разбураны, таму ў другой палове 1940-х гадоў быў разабраны.

С. 882

Другі, Казіміраўскі палац, стаяў у раёне сённяшніх вуліц Гая і Зярновай. Будаваўся для Міхала Казіміра Радзівіла (адсюль яго назва) архітэктарам А. Рашковічам і "будаўнічым замкаў" Сейфертам. *Планы Гродна* 1655 г. і 1706 г. даюць магчымасць пазнаёміцца з яго выглядам: двухпавярховы мураваны палац з невялікімі вежамі на тарцах. Насупраць галоўнага будынка стаяла яшчэ адна пабудова ў форме літары "П". На кожным паверсе палаца былі па 4 апартаменты, складзеныя з 3–4 пакояў. Самымі вялікімі былі абедзеная зала, распісаная фрэскамі мастака А. Мелана, і вялікая зала з 6 вокнамі, якія выходзілі на *Нёман*. Звонку палац быў упрыгожаны барэльефамі з выявамі

магнацкіх гербаў Радзівілаў і Вішнявецкіх. Каля палаца былі ніжні і верхні сады. Палац быў разбураны расейскімі войскамі падчас *вайны Паўночнай* 1700–1721 гг., і з 1798 яго пачалі разбіраць на цэглы. Тэрыторыя, дзе стаяў палац, перайшла ў гаспадараванне да расійскага войска, якое зрабіла тут летні лагер.

Кр. і літ.: AGAD, zesp. 354, d. 18, syg. 322, Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 120–121; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 325–328; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 87–88, 108; Сліж Н. Уладанні і палацы Міхала Казіміра Радзівіла ў Гародні ў XVIII ст. // Arche. – 2015. – № 6. – С. 236–252; Супрон М. Я. Невядомыя старонкі гісторыі Горадні (паводле блога supron-licvin.livejournal.com) // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Вып. 10 (2015) / рэдкал. І. Соркіна [і інш.] – Гродна, 2016. – С. 74–75; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 38, 44.

Палацы Сапегаў, 1) На "Стакгольмскім плане Гродна" 1665 г. ёсць выява двухпавярховага мураванага палаца з вежачкамі па вуглах князёў *Сапегаў,* на пляцы на беразе *Нёмана*, які ім належаў з 1530 г. У 18 ст. уладальнікамі сталі *Агінскія,* і перабудоўваў яго *Джузэпэ Сака.* З 1877 яшчэ раз перабудаваны палац стаў функцыяваць як *бровар Ю. Кунца.* 2) Другі з іх знаходзіўся на паўднёва-усходнім баку *Рынку*, на пляцы, які ў 1680–1765 гг. належаў Сапегам (цяпер пл. Савецкая, на рагу з вул. К. Маркса). У 1765 уласнікам стаў М. Бжастоўскі, які ў 1779 меў намер прадаць нерухомасць *Тызенгаўзу* А. Помнік XVII ст., які доўгі час лічылі *Батароўкай/Бацараўкай*. У ім праходзілі *сеймы Рэчы Паспалітай* 1718, 1726, 1730 гадоў. У 1718 будынак перабудоўваўся для правядзення сеймаў. Як лічыць Е. Лілейка, аўтарам праекта мог быць адзін з князёў Сапег, але генеральны план усёй сітуацыі быў падпісаны *Д. І. Х. Яўхам*. У гэтым палацы падчас *сейма 1793* жыў расійскі пасол *Сіверс Я.* 3) Трэці палац стаяў на вул. Савецкая, 10 (раней Дамініканская). Двухпавярховы будынак пабудаваны ў 1795 г. Да яго ў 1873 дабудавалі ўздоўж вуліцы двухпавярховы флігель. У 1970 будынак быў непазнавальна перароблены ў трохпавярховы для *гарадскога Савета народных дэпутатаў* у стылі эклектыкі. У расійскі час у будынку размяшчаліся: "Книжная русская торговля" Казлоўскага (1903), натарыяльная кантора Басніна (1911), аптэчная крама Жураўскага (1915), 9 кватэр, 8 крам і пякарня; у польскі час – аптэчны склад Жураўскага, рэстаран Фрухта (1926), крама панчошных вырабаў "B. Cechański i synowie". У савецкі час у будынку размяркоўваліся розныя арганізацыі, майстэрні і крамы. На пачатку 1990-х тут працавала рэдакцыя газеты "Пагоня".

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 292–293; Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 63; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 118–119; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 34–35; Lilejko J. Przebudowa grodzieńskich pałaców Batoriańskiego i Sapieżyńskiego na gmach sejmowy w 1717–1718 r. // Między Padwą a Zamościem. Studia z historii sztuki i kultury ofiarowanie profesorowi J. Kowalczykowi. Warszawa, 1993. – С. 271, 275.

Палацы Станіслава Аўгуста Панятоўскага. У сучасным Гродне ёсць палац/*замак Новы* і тры рэзідэнцыі вялікага князя літоўскага і караля польскага, назвы якіх звязаныя з імёнамі і прозвішчам *Станіслава Аўгуста Панятоўскага*: *Станіславова* ад Станіслава, *Аўгустова* ад Аўгуста, *Панямунь* ад Панятоўскага і *Нёмана*. У іх былі пабудаваныя невялікія палацы, якія выкарыстоўваліся падчас прыезду вялікага князя літоўскага і караля польскага ў Гродна ды ваколіцы. Краязнавец *Госцеў* выказаў здагадку, што рэзідэнцыі САП размеркаваныя ў трохкутніку, які нагадвае сімвалічны знак масонскай ложы.

Палесціна (Палестына) – жылы раён на левабярэжнай частцы горада, які ўзнік напярэдадні *вайны Другой сусветнай*. Пазначаны на *плане горада* 1937 г. і мапе 1943 г.

Літ.: Вашкевіч А., Занёманскі Фарштат Горадні ў XVI – першай палове XX ст.: эвалюцыя гарадской прасторы / А.Вашкевіч, А. Чарнякевіч // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 219.

Паліцыя. Яе органы ствараліся згодна з "Часовымі правіламі аб усталяванні паліцыі ў гарадах і ўездах губерняў" ад 25.12.1862. У гарадах былі арганізаваныя паліцэйскія ўчасткі на чале з участковымі прыставамі. У іх падпарадкаванні былі паліцэйскія назіральнікі, а апошнія мелі ў сваім распараджэнні акалодачных назіральнікаў і гарадавых – шараговых чыноў паліцыі, якія служылі паводле найму. Назіральнікі выконвалі наступныя паліцэйскія функцыі: забеспячэнне бяспекі гараджан, добраўпарадкаванне горада, расквартараванне войск, правядзенне рэкруцкіх набораў, нагляд за санітарным станам, дапамога чынам вышуковай паліцыі. Пасля рэформ 1860–70-х гадоў на першае месца сярод абавязкаў назіральнікаў высунуліся функцыі нагляду і палітычнага вышуку па недапушчэнні выступаў супраць дзяржаўнага ладу і грамадскай бяспекі. На пачатку XX ст. пры паліцэйскіх управленнях стварылі вышуковыя аддзяленні (з 1903 называліся ахоўныя), пры якіх былі ўчастковыя і вакзальныя паліцэйскія назіральнікі. У іх функцыі ўваходзіла сачыць за асобамі, якія былі пад наглядам паліцыі; збіраць звесткі пра ўдзел насельніцтва ў сходах; назіраць за месцамі збору моладзі і за фабрычна-завадскімі рабочымі, утрымальнікамі мэбляваных пакояў. Паліцэйскаму назіральніку былі абавязаныя дапамагаць участковы прыстаў, чыны паліцыі, швейцары, дворнікі, ахоўнікі і т. п. асобы. Пасада паліцэйскага назіральніка была зліквідаваная пастановай Часовага ўрада ад 10.03.1917.

Літ.: Гродненская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917). – Гродно, 2018. – С. 49–51.

Палякі, магчыма, першы кантакт з Гроднам мелі ў 1358 г., калі ў горад прыехаў мазавецкі князь Земавіт III, каб падпісаць з князем літоўскім *Кейстутам* дамову аб размеркаванні межаў паміж Мазоўшам і Літвой. Пачатак пасялення

палякаў у горадзе можна звязаць з будаваннем *Фары Вітаўта* і наданнем гораду *магдэбургскага права*. Як прыклад, можна ўспомніць Шаматулу П., які паходзіць з вялікапольскіх Шаматул і ў 1555 заняў пасаду войта горада. Больш пасяляцца ў Гродне П. (рамеснікі, купцы, упраўленцы, вайскоўцы) пачалі пасля Люблінскай ўніі Кароны з Літвой (1569). З таго часу пачалася паланізацыя мясцовага насельніцтва – у першую чаргу шляхты праз шлюбы і польскую асвету ды культуру, каталіцкае веравызнанне. Некаторыя польскія даследчыкі пішуць, што Гродна стала трэцяй сталіцай Польшчы. Тут будаваліся *касцёлы*, *палацы* магнатаў, збіраліся *сеймікі* павятовыя і *сеймы* Рэчы Паспалітай. Так адбывалася да падзелаў Рэчы Паспалітай, калі Гродна адышло да Расійскай імперыі, на тэрыторыі якой П. перажывалі нацыянальны ўціск і пераслед. Гэта абумовіла іх барацьбу супраць маскоўскай улады, у тым ліку і ў Гродне. У *вайне 1812* П. горада радасна сустракалі войска *Панятоўскага Юзафа*. Актыўна прымалі ўдзел у *паўстаннях 1830–31 і 1863–64*. У адказ расійская улада зруйнавала *Фару Вітаўта*, забараніла польскую адукацыю і асвету, тэатр. Толькі пасля *рэвалюцыі 1905–07* П. удалося адрадзіць сваю культуру, мову, школу. Было створанае *таварыства "Муза"*, хор хлопцаў пры *касцёле францішканцаў*, польскія бібліятэкі (гл. *Ажэшка* і *бібліятэка гарадская публічная*). Пасля *вайны першай сусветнай* Гродна паводле Рыжскай дамовы адышло да другой Рэчы Паспалітай. Тут працавалі *школы польская* і *дамініканская*, *гімназіі*, *тэатр* імя Ажэшкі Э., *Бібліятэка* публічная, музей Ядкоўскага Ю. (гл. *музей гісторыка-археалагічны*), выдаваліся *газеты*. Пасля верасня 1939 Гродна вярнулася да беларускага народу, і за перыяд да пачатку *вайны Другой сусветнай* сталінскія ўлады расстралялі паслоў Сената ад Гродзенскай акругі К. Тэрлікоўскага і К. Біспінг-Галена, дэпартавалі (гл. *дэпартацыя 1940–41*) тысячы польскіх вайскоўцаў, паліцэйскіх, упраўленцаў, дзеячаў адукацыі і культуры. Частка з іх была забітая ў Катыні (гл. *катынцы-гродзенцы)*. 20.10.1942 і ў ліпені 1943 адбыліся два расстрэлы польскай інтэлігенцыі (сярод іх інжынер Мечыслаў Альбрэхт, настаўнікі гімназіі імя Міцкевіча *Каханоўскі Ян,* Францішак Данько, Юзаф Ванатоўскі, дырэктар тытунёвай фабрыкі Ян Шыманскі, суддзя Вінцэнт Гедройц). На тэрыторыі горада дзейнічала *Армія Краёва*. Пасля вайны, у 1945–47 з Гродна і Гродзенскага пав. было пераселена ў Польшчу 50 958 палякаў, у 1958–1959 – яшчэ каля 30–35 тыс. палякаў (сярод іх спявак *Неман Чэслаў*). П., якія засталіся, ажно да гарбачоўскай перабудовы не мелі сваіх школаў, газет, палітычных, культурных, спартовых і іншых арганізацый. У 1961 улады зруйнавалі фару Вітаўта, але заставаліся *помнік* і *дом Ажэшкі* Э. 10.08.1988 пачало існаванне *Таварыства культурна-асветнае імя А. Міцкевіча* ў Беларусі (гл. *Саюз палякаў у Беларусі*), сядзіба якога знаходзілася ў Гродне. У 1989 ва *ўніверсітэце імя Я. Купалы* адкрыўся факультэт польскай філалогіі. У 1991 Ян Павел II стварыў каталіцкую гродзенскую дыяцэзію, першым кіраўніком якой стаў ксёндз *Кашкевіч А*. Паўстанне незалежнай Рэспублікі Беларусь дало гродзенскім П. у пачатковы перыяд шырокія магчымасці да нацыянальнага развіцця. Горад стаў сталіцай П. у Беларусі.

Сёння ў Гродне дзейнічаюць польскія грамадскія арганізацыі пры *Саюзе палякаў у Беларусі* (галоўнае ўпраўленне і мясцовыя аддзелы – гарадскі і абласны).

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і савецізацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 235; Kałuski M., Sprawy kresowe – poza cenzurą. T. 1. – Toruń-Melbourne, 2017. – S. 643–651; Gawin T. O bycie Polakiem. – Grodno, Białystok, 2013.

Памеранскі Якаў Антонавіч – дваранін, стацкі дарадца, гродзенскі гарадскі галава, гаспадар друкарні і літаграфіі ў Гродне на Саборнай вул. Дазвол атрымаў ад гродзенскага праўлення 3.07.1882 і 8.08.1883. На працягу 5 месяцаў выдаваў “Торговый вестник Западного края”. Рэдакцыя яго знаходзілася ў доме П. на *Новым свеце*, у Якаўлеўскім завулку. Вядомае выдадзенае ў друкарні “Прыватнае кіраўніцтва для мяшчанскіх упраў”. У 1885 друкарня згарэла (гл. *пажары*), пазней была прададзеная *Лапіну С.* Мела паравы рухавік з 1885, працавала тады 9 рабочых.

Крын. і літ.: НГАБ, ф. 1, воп. 17, с. 74, а. 303; Болбас. Прамысловыя прадпрыемствы, с. 207; Орловский Е. Гродненская старина. Г. Гродно., с. 314.

“Памятная книжка Гродненской губернии на … год”, друкавалася па-руску ў Гродне паводле пастановы губернскага праўлення ў губернскай *друкарні*. Вядомы рукапісны экзэмпляр на 1858 (захаваўся ў *НГАБ у Гродне*), выходзіла ў 1859–62 (№ за 1859 не знойдзены), 1864–66, на 1868 выйшла ў Віцебску ў “Памятнай кніжцы Віленскага генерал-губернатарства на 1868 г.” і “Адрас-календары Віленскага генерал-губернатарства на 1868 г.”. Далей публікавалася ў 1869, 1890, 1893–95, 1897–1914 гг. Агулам апублікаваныя 58 кніжак. У 1900–1915 П. к. мелі стандартны фармат, выдаваліся ў пераплёце і цвёрдай вокладцы, мелі 5 аддзелаў: каляндарныя звесткі, адрас-каляндар, матэрыялы па статыстыцы Гродзенскай губ. за справаздачны год, звесткі аб стане Гродзенскай губ. за справаздачны год, даведачныя звесткі. Выдавалася П. к. у год напярэдадні свайго распаўсюджвання (напрыклад, у 1899 на 1900 г.) Выдаўцом быў *камітэт Гродзенскі губернскі статыстычны*. Змяшчалі такія матэрыялы, як: каляндарныя звесткі (календары, рэлігійныя звесткі розных веравызнанняў, пералік агульнарасійскіх святочных дзён, астранамічныя звесткі, пералік асоб Расійскага імператарскага дома, важныя губернскія падзеі), *адрас-каляндар* (пералік асабістага складу ўсіх губернскіх і павятовых урадавых і грамадскіх устаноў, з паказаннем біяграфічных і службовых звестак), даведачныя, статыстычныя (з 1879 больш падрабязней у спецыяльным раздзеле) і адміністатыўныя матэрыялы (насельніцтва, эканоміка, крамы, бібліятэкі, аптэкі, друкарні, адукацыйныя ўстановы, рэлігія і інш.), гісторыка-краязнаўчыя матэрыялы (гістарычныя, археалагічныя, этнаграфічныя, краязнаўчыя нарысы, публікацыі крыніц). У асобных зборніках публікаваліся артыкулы. У 1860 і 1861 гг. з’явіліся працы П. В. Баброўскага “Гісторыка-статыстычны нарыс горада Гродна” і “Гістарычныя звесткі аб гарадах Гродзенскай губерні

Беластоку і Слоніме”. У 1869 надрукаваныя нарысы “Гродна ў другой палове былога стагоддзя” і “Чорная Весь” Ф. Стаўровіча. У П. к. на 1881 змешчаныя 2 гравюры Гродна ў 1593 і 1880 гг. з іх апісаннем. У П. к. на 1882 з’явіўся артыкул “Разваліны старажытнай Калажанскай царквы”. П. к. на 1887 парадавала “Матэрыяламі да гісторыі Каложскай царквы” *П. М. Дзікава*. У 1890 *Я. Арлоўскі* апублікаваў “Нарыс гісторыі горада Гродны, складзены на аснове друкаваных крыніц”, а ў 1889 А. Э. Штрытара – “Тапаграфічныя звесткі пра гарадзішчы і курганы ў Гродзенскай губерні”. У 1893 змешчаны “Кароткі фізіка-геаграфічны нарыс Гродзенскай губерні”. У зборніку на 1897 знойдзем “Звесткі аб стане Гродзенскай губерні на 1795 г. Статыстычны агляд”, а на 1899 – артыкул Ф. А. Глінскага “Белавежская пушча і зубры” з 3 ілюстрацыямі па фотаздымках гродзенскага майстра *Карасіка З. Я.* Распаўсюджваліся П. к. звычайна ў межах губерні сярод мясцовых устаноў, ажыццяўляўся абмен кніжкамі паміж статыстычнымі камітэтамі губерняў. Захаваліся П. к. у *архіве* НГАБ у Гродне (на 1870–72, 1876–79, 1881–85, 1887, 1889–92, 1894–1900, 1902–11, 1913–15 гг.), у *бібліятэцы гродзенскай абласной навуковай імя Карскага* (на 1889), у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі ў Мінску (на 1866, 1887 1893–97, 1899, 1900 і 1911), у бібліятэцы Акадэміі наук Беларусі (на 1876 і 1889).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 14, воп. 1, с. 432, 436; Грядовкина И.В., Структура и содержательный аспект Памятных книжек Гродненской губернии // Docplayer.ru/45079196-Struktura-i-soderzatelny-aspekt-Pamiatnych-knizek-Grodnenskoj-gubernii html.; Корсак О.В. Памятные книжки губернских статистических комитетов // Матэрыялы XI міжнародных кнігазнаўчых чытанняў “Кніжная культура Беларусі XI – пачатку XX ст.”. – Мн.: НББ, 2015. – С. 229–233; Саітава В.І., Страмужэўская Т.В. Памятныя кніжкі беларускіх губерняў: агульная характарыстыка / Электронны рэсурс / Электронные текстовые, графические данные и программа (10,5 ГБ). – Мн.: НББ, 2012. – 3 DVD-ROMы.

“Памятная книжка Гродненской дирекции народных училищ на ... учебный год”, выдавалася ў гродзенскай губернскай *друкарні* з 1892 па 1896 гг. Выйшлі 4 кнігі, пачынаючы з 1891/92 навучальнага года. Усе экзэмпляры захоўваюцца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы (Масква), асобныя экзэмпляры – у розных месцах былога СССР.

Крыніца: https://rusneb.ru/catalog/000200_000018_v19_rc_1568428// Доступ 03.12.2021.

Панін Мікіта Пятровіч (17.04.1770, Харкаў – 1.03.1837, Дугіна, Сычаўскі ўезд Смаленскай губ.) – граф, расійскі дыпламат. Быў чальцом пруска-расійскай дэмаркацыйнай камісіі ў Гродне і сябрам *Праўлення Генеральнага Літвы*. Жыў у Гродне з мая 1795 да жніўня 1796. П. быў арганізатарам змовы супраць расійскага імператара Паўла I у сакавіку 1801, у выніку якой той быў забіты. А Панін вярнуўся ў Калегію замежных спраў.

Літ.: Żytkowicz L. Rządy Repnina na Litwie w latach 1794–1797. – Wilno, 1938. – S. 28, 29.

Пануцэвіч Вацлаў. Вучыўся на юрыдычным факультэце Віленскага ўніверсітэта, дзе быў адным з арганізатараў "руху маладых адраджэнцаў". З пачатку *вайны Другой сусветнай* выкладаў у гарадзенскай школе. Сябра *камітэта Беларускага нацыянальнага*, супрацоўнічаў з нямецкімі акупантамі. З'ехаў у эміграцыю і займаўся гісторыяй. Напісаў працы: "Жамойдзь і Літва: розныя краіны і народы", "Пачаткі хрысціянства на нашых землях з часоў Ізяслава", "Гарадзеншчына ў нацыянальным руху ў 1918–1919 гадах" і ішыя.

Літ.: Павач. А. Шпацыр па Гародні. Шляхаводнік. – Вільня: ЕГУ, 2018. – С. 52.

Панцажынскі Людвік К. – калежскі дарадца, павятовы *маршалак* (1798–1809), гродзенскі губернскі маршалак (1809–1815). Падчас *вайны 1812 г.* быў старшынёй Гродзенскай канфедэрацыйнай рады, якая дзейнічала да 17 ліпеня 1812. Меў сына Францішка, які валодаў спадчынным маёнткам Уснаж Драўляны (40 дымаў і 124 душы) і быў запісаны ў спіс выбаршчыкаў *дваранскага сходу Гродзенскага пав.* 1822–24 гг.

Літ.: С. Токць. Спісы выбаршчыкаў шляхецкіх сходаў Гродзенскага, Ваўкавыскага і Слонімскага паветаў Гродзенскай губерні за 1820–1823 гг.// Rocznik Centrum Studiów Białoruskich=Гадавік Цэнтра Беларускіх Студыяў, 2020, № 5, с. 217; Швед В.В., Данскіх С.У., Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. – Гродна: ГрДУ, 2006. – С. 91.

Панямунь, размешчаная на ўсходняй ускраіне Гродна. У сярэднявеччы была сялом, якое належала гораду і плаціла яму падаткі. Паводле валочнага вымярэння 1558–61 гг., рэвізіяў 1650 і 1680, інвентарызацыі 1708 мела 6 валок. У 1771 тут паводле праекта архітэктара Ю. Аляхновіча была пабудаваная сядзіба для вялікага князя літоўскага і караля польскага *Станіслава Аўгуста Панятоўскага.* Аднапавярховы мураваны палац быў размешчаны ў глыбіні пейзажнага парку, над стромкім правым берагам *Нёмана*, умацаваным падпорнымі сценкамі тэрас. Дваровы фасад упрыгожвалі чатырохкалонныя порцікі на высокім цокалі. Палац быў атынкаваны і не меў амаль ніякіх дэкарацыйных упрыгожванняў на знешніх фасадах. Планіроўка дома анфіладная з выхадам у цэнтральную вялікую парадную залу. Было каля 10 пакояў. Палац апісаны ў інвентары 1780/1782 гг. У гэты час тут было 5 будынкаў: палац, гасцёўня, будынак кухні, 2 драўляныя будынкі. Пейзажны парк разбіты перад палацам і на схілах рова. Ён умоўна падзяляўся на высокую, раўнінную і нізінную часткі. Пасярэдзіне яго ішла шырокая цэнтральная пад'язная дарога, абапал якой раслі ліпы, клёны, таполі і іншыя дрэвы. У нізіннай частцы раслі елка, сасна, граб, размяшчалася невялікая аранжарэя. Сядзіба была абмежаваная з паўднёвага боку ракой, з усходняга і паўночнага – глыбокім ярам. У часы рэформы *Тызенгаўза А.* у П. знаходзіліся драўляны гандлёвы склад, пры ім – жылы драўляны будынак і вялікая шопа.

У сярэдзіне XIX ст. была перабудаваная, уезд пазначаны капліцай рэтраспектыўна-агатычнага стылю. На галоўным фасадзе прамавугольнага ў плане

будынка ўзвышалася шатровая васьмігранная званіца. Захаваўся фрагмент вуглавой вежы, якая мае плаўныя абрысы, тонкую і складаную прафіліроўку карнізаў і абрамленняў, здвоеныя пілястры з ажурнымі капітэлямі, гарызантальную рустоўку. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі бываў тут часцей летам. Разам з *Рапніным* і Валконскім ён абмяркоўваў у Панямонскай сядзібе лёсы Рэчы Паспалітай. Пасля дэтранізацыі Панятоўскага сядзібу набыў гродзенскі павятовы маршалак Раман Ляхніцкі. У другой палове XIX ст. яна перайшла праз жонку Вераніку Ляхніцкую да Нямцэвічаў. Напрыканцы XIX ст. тут гаспадарыла Ядвіга з *Друцкіх-Любецкіх*. Пасля яе смерці сядзібай стаў валодаць яе брат, уладальнік *Станіславова*, Уладзіслаў. Пры ім 9 лютага 1892 г. у палацы адзначылі 25-годдзе літаратурнай дзейнасці *Ажэшкі Э.* Сярод гасцей быў беларускі паэт Францішак Багушэвіч. Апошняй гаспадыняй Панямуні была дачка Уладзіслава Яніна – жонка Караля Скажэўскага-Агінскага. Яна не жыла тут пастаянна, а даглядалі сядзібу два эканомы са сваімі жонкамі. Цяпер будынкі сядзібы належаць Гродзенскім райаграпрамтэхніцы і райаграпрамсэрвісу.

Літ.: Сліж Н.І. Падаткі і іх збор у Гародні XVI- XVII стст. // Białoruskie zeszyty historyczne. – 2022. – n. 35. – S. 12–14, 33; Gozdawa, Orzeszkowa w Grodnie // Głos znad Niemna. 1917: jednodniówka grodzieńska – Grodno, 1918. – S.44–50; Sliż N. Horodnica grodzieńska w źródłach wizualnych i dokumentalnych (druga połowa XVIII w.) [рукапіс 2021 г.].

Панятоўскі Станіслаў (1754 – 13.02.1833, Фларэнцыя) – князь, прынц Рэчы Паспалітай (1764). Сын вялікага кароннага падкаморыя Казіміра Панятоўскага, старэйшага брата апошняга польскага караля і дваюрадны брат *Юзафа Панятоўскага*. Вучыўся ў пансіёне, адмыслова створаным для яго каралём, і атрымаў рознабаковую адукацыю. На момант з'яўлення ў Гродне быў генерал-лейтэнантам каронных войск, камандзірам прыдворных палкоў (1776) і чальцом Адукацыйнай камісіі. Прыехаў сустрэцца з *Тызенгаўзам* А. для праверкі высунутых супраць таго абвінавачванняў. У справаздачы *Станіславу Аўгусту Панятоўскаму* пацвердзіў іх. У 1784, вандруючы па нямецкіх дзяржавах, беспаспяхова спрабаваў атрымаць крэдыты і тэхнічную дапамогу для аднаўлення *мануфактур каралеўскіх* на *Гарадніцы*. У гэтым жа годзе стаў вялікім літоўскім падскарбіем і ўдзельнічаў у сесіі Гродзенскага *сейма Рэчы Паспалітай*. У 1786 П. адправіў *балет Тызенгаўза* ў Варшаву. У 1789 узначаліў *камісію Скарбавую*, якая знаходзілася ў Гродне. Хутка падаў у адстаўку і выехаў за мяжу.

Творы: "Несколько замечаний относительно способа, которым пишется история Польши" (1829); воспоминания "Souvenirs" (1891); "Дорожный журнал кн. Станислава Понятовского, веденного в путешествии, мая 11-го дня 1784 года в немецкие земли предпринятого".

Літ.: Брандыс М. Исторические повести. – М.: Пресса, 1993, с. 12–164.

Панятоўскі Юзаф Антоні (7.5.1763, Вена – 19.10.1813, Лейпцыг) – князь, пляменнік польскага караля *Станіслава Аўгуста Панятоўскага*, маршал

Францыі (1813). Падтрымоўваў лагер рэформ і Канстытуцыю 3.05.1791 г. Удзельнік *паўстання 1794 г.* У Гродне атрымаў звесткі аб стварэнні 28.06.1812 у Варшаве Генеральнай канфедэрацыі Каралеўства Польскага і аб сваім прызначэнні камандуючым V корпуса напалеонаўскай "Вялікай арміі". З ёю ён 30.06 уступіў у Гродна. Напэўна, каралеўскаму пляменніку выгляд *Новага замка* напомніў, што тут амаль пад арыштам сядзеў *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі*. З Гродна П. пайшоў на Скідзель, Шчучын, Навагрудак, Мір, Нясвіж. Забіты ў бітве пад Лейпцыгам, прывезены ў Варшаву генералам *Сакальніцкім М.* і пахаваны на Вавелі.

Літ.: Брандыс М. Исторические повести. – М.: Пресса, 1993, с. 167–320; Швед В., Данскіх С. Заходні рэгіён напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гг. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2006. – С. 72–74; Polacy, których poznać warto: praca zbiorowa / pod red. J. Michowicz. – Warszawa: Wyd-wo Szkolne i Pedagogiczne, 1986. – S. 50–53.

Папірны Мардух Шаломавіч – пінскі мешчанін. Да 1884 меў фотамайстэрню ў Слоніме. Дазвол на адкрыццё ў Гродне атрымаў 11.07.1884. Яго майстэрня знаходзілася на вул. Саборнай /Савецкай і была вядомая да 1900. У кастрычніку 1884 г. ён атрымаў дазвол мець фотамайстэрню ў Гродне сумесна з мешчанінам м. Падбярозы Віленскага ўезда Абрамам-Шмуем Аўсеевічам Стамлерам.

Параходы. Адзін з першых быў пабудаваны ў 1887 на верфі *О'Брыена дэ Лясы* "Парахода-будаўнічай фабрыкі" пад назвай "Дэвайціс". Наступным быў параход "Русалка", пабудаваны ў 1895 для купца А. В. Ашкеназы, які ажыццяўляў перавозкі ў Масты 3 разы на тыдзень. Гэты маршрут існаваў і ў 1903–1908, стаў штодзённым. У 1920–30-я гады ў Гродне былі параходы "Ядвіга" (1913 г. пабудовы), "Эмілія Плятэр", "Ягайла", "Міхал Агінскі", цеплаход "Сміглы". У справаздачы *прыстані гродзенскай* за 1945 называліся параходы "Пушкін" (былы "Ягайла"), "8-е сакавіка" (былы "Двярніцкі"), "Летувайце", цеплаходы "Чырвонафлоцец", "Тэхнік" (былы "Эмілія Плятэр), газаход № 1538. 5.04.1966 пасажырскім цеплаходам № ПТ-0170 і № ПТ-0171 былі нададзеныя імёны В. Усава і *В. Соламавай*. Са жніўня 1974 з Гродна ў Масты стаў курсіраваць цеплаход на паветранай падушцы "Зарніца", а з 1976 – у Друскенікі "Зарніца–5".

Літ.: Саяпін В., История общественного транспорта Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 106–160.

Парк гарадскі культуры і адпачынку імя Жылібера – стары парк, на тэрыторыі якога калісьці знаходзіліся *Батанічны сад Ж. Э. Жылібера,* сад *Гарадніцкі*, *сад Батанічны, сад Я. Каханоўскага*. У міжваенны перыяд (1921–1939) гарадскі парк, закладзены прафесарам Таньскім, з боку вул. Ажэшкі і Тэатральнай пл. атрымаў у кастрычніку 1925 г. новую агароджу, зробленую паводле замовы магістрата мясцовым рамесным вучылішчам. За ўзор быў узяты праект француза Ж. Ф. Бландэля (кніга 1738 г. выдання). На бетонным фундаменце ўсталявалі 50 бетонных слупоў, паміж якіх замацавалі

металічныя рашоткі. Уваход з вул. Ажэшкі меў двухстворкавую браму (прастаяла да канца 1950-х) і 2 каліткі. У 1926 у паўночна-ўсходняй частцы парку заклаў сад батанічны *Ян Каханоўскі*. У 1929 у парку быў усталяваны помнік *Э. Ажэшцы*. 1.05.1949 адкрылі помнік *на могілках брацкіх* у парку вайскоўцам і партызанам, забітым у гады *вайны Вялікай Айчыннай*. У гэты час парк дзяліўся на адкрытую (у межах вуліц Ажэшкі і Дзяржынскага) і закрытую часткі (агароджа праходзіла паміж тэатрам і вайсковай камендатурай). У 1950-х гадах пачалі працаваць павільён-рэстаран "Лета", "Зялёны тэатр" (дзе адбываліся канцэрты, дэманстраваліся фільмы), кінатэатр "Летні", танцавальная пляцоўка (гродзенцы называлі яе "Клетка"), адчынілі другі ўваход з вул. Акадэмічнай. Вакол парку была зробленая агароджа з дэмантаваных з каваных бардзюр *моста* праз Нёман. З дзіцячых атракцыёнаў былі: каруселі "Конікі" і "Самалёт", макеты "Слон", "Жыраф", "Глобус". У 1964 парку было прысвоенае імя *Э. Ажэшкі,* а 15.11.1989 – імя *Ж.Э. Жылібера* (без адмены папярэдняга рашэння). Для дарослых былі: більярд, чытальная зала, пакой смеху. У 1950-х – пачатку 1960-х гадоў у парку знаходзілася шмат скульптур: ля галоўнага ўвахода стаяла з 1953 па 1961 "Ленін і Сталін у Горках"; "Мядзведзі", скульптурная група "Гусі" у фантане (цяпер музычны фантан недалёка ад тэатра лялек); скульптурная група "Мацярынства", былі і цэлыя алеі, ўздоўж якіх стаялі скульптуры. Было некалькі фантанаў: каля галоўнага ўвахода з вул. Ажэшкі, на месцы батанічнага саду Я. Каханоўскага. Цікавым месцам з'яўляецца так званая *Швейцарская даліна* каля *Гараднічанкі*. У парку знаходзіліся пункты харчавання: каля ўваходу з пл. Леніна кафэ "Лакомка", каля ўваходу з вул. Акадэмічнай – кафэ "Бярозка", якое захавалася да нашага часу (на месцы павільёна "Лета").

У 1986 г. быў створаны праект рэканструкцыі Старога парку. Меркавалі аднавіць Швейцарскую даліну, пашырыць і расчысціць рэчышча Гараднічанкі, аднавіць сквер паблізу доміка Ажэшкі, якімсці чынам адзначыць месца, дзе стаяў палац *Тызенгаўза А.*. Батанічны сад быў бы засаджаны як мясцовымі, так і замежнымі гатункамі раслін, меў бы калекцыйны ўчастак, аранжарэю, японскі сад, ружоўнік. Савет Міністраў БССР прыняў 21 мая 1991 г. пастанову аб усталяванні ў парку помніка-бюста Жылібера. У 1989–1992 пад кіраўніцтвам архітэктара А. Штэна быў распрацаваны яшчэ адзін праект рэканструкцыі парку. Ён прадугледжваў 4 зоны: Швейцарская даліна, мемарыяльная, Батанічны сад, зона атракцыёнаў. І толькі трэці праект "Гроднаграмадзянпраекта" 2002 г. нарэшце ссунуў справу з месца. Генплан прадугледжваў тры этапы дабраўпарадкавання трох функцыянальных зон (мемарыяльнай, спакойнага адпачынку, атракцыёнаў): 1-ю і 2-ю чаргі будаўніцтва, перспектыўнае планіровачнае рашэнне. У першую чаргу раскрылі і ўпарадкавалі мемарыяльную зону забітым воінам, уваходныя групы з боку вуліц Ажэшкі і Дзяржынскага, ажыццявілі рэканструкцыю і ўладкавалі новыя пешаходныя алеі і пляцоўкі, зрабілі рэканструкцыю басейна з фантанам, упарадкавалі Швейцарскую даліну і Гараднічанку, замянілі агароджу парку з боку вул. Ажэшкі і плошчаў Леніна і Тызенгаўза. Значная ўвага была звернутая на азеляненне.

Прадугледжанае захаванне каштоўных зялёных насаджэнняў, падсадка дрэў і кустоўеў, траўнікаў і кветнікаў, знос дрэў, якія страцілі эстэтычны выгляд. У другую чаргу мяркуецца пабудаваць уваходныя групы з боку вул. Дзяржынскага, 1-га мая, Акадэмічнай; усталяваць тут некалькі аўтастаянак; уладкаваць басейн са светамузычным фантанам; замяніць бетонную агароджу па вул. 1-га мая на металічную, падобна да зробленай ад вул. Ажэшкі; усталяваць знешняе асвятленне з выкарыстаннем накіраванай падсветкі асобных груп дрэў; знесеныя будуць будынкі клуба “Клетка”, ціра, кафэ “Бярозка” і летняя эстрада. У перспектыве межы парку будуць пашыраныя за кошт участка ваеннай камендатуры і тэрыторыі, якую займаюць гаспадарчыя пабудовы Гродзенскага дзяржуніверсітэта; прадугледжваецца пабудова кафэ, рэканструкцыя зоны атракцыёнаў. У 2007 каля ўвахода ў парк з плошчы *Тызенгаўза* пастаўленая скульптурная кампазіцыя ў выглядзе мужчыны ў касцюме XVIII ст. (аўтар А Панцялееў). Грамадскасць лічыць яе помнікам *Ж. Э. Жыліберу*.

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 37; Саяпин В. О парке Жилибера и зоопарке Кохановского. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 7–46; Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 12. – Гродна: ГАІУН, 2010. – С. 49–53

Парк Калажанскі (парк імя 40-годдзя ВЛКСМ), знаходзіцца па вул. *Лермантава Ю. М.*, недалёка ад *царквы Барыса і Глеба на Каложы*. У 1978 у гонар 850-годдзя (якое на самой справе было ў 1977, бо лічыць трэба ад 1127) з дня першага ўспаміна горада ў Іпацьеўскім летапісе пастаўлены *помнік у гонар 850-годдзя Гродна*. У частцы парку ёсць пасаджаныя падчас фестывалю нацыянальнасцяў дрэвы розных этнасаў.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 231.

Парк Румлёва, існаваў ужо ў XVIII ст. на паўднёва-ўсходнім ускрайку сённяшняга жылога мікрараёна Прынёманскі–2. Гаспадарамі яго былі ўладальнікі *Румлёва – Ляхніцкі І., Румель Я., Відацкі К.*, *Відацкая Ф.*, Васількоўскі А., вайсковая адміністрацыя. У цэнтры П. стаяў сядзібны дом, да якога ішла кляновая алея. Захавалася *вежа* і часткова алея. У П. растуць: ліпа, клён востралісты і амерыканскі, вяз, дуб звычайны і чырвоны, івы, каштан, сасна звычайная, бэз, шмат травяністых раслін (пралеска, ветраніца, ахлатка, гусіная цыбуля). У П. Р. можна сустрэць птушак (сініцы, зяблікі, івалгі, салаўі, пеначкі і інш.) і сысуноў (вавёркі, краты, зайцы, лісы і інш). На тэрыторыі парку ў чэрвені 1938 *Каханоўскі Я.* знайшоў ікол *маманта*.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник, Минск, 1988, с. 310–311; Гуменны В., Карнялюк В. Румлёўскі парк у Гродне: вынікі нядзейсненай рэканструкцыі // Гарадзенскі гадавік. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2020. – С. 111–128; Карнялюк В. Румлёўскі парк // Пагоня. – 1998. – 16.04. – С. 6; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў:

гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 68.

Партыя Хрысціянская дэмакратыя (ХД), створаная ў Гродне 13.11.1918. Тады ж была прынятая праграма і абраны арганізацыйны камітэт у складзе Я. Альшанскага і *Саванеўскага Л.* У партыю ўваходзілі землеўладальнікі і амаль усе духоўныя асобы. Ужо на выбарах у Кіроўны аддзел польскага дэмакратычнага Камітэта (улады горада) 15.12.1918 ХД атрымала найбольшую колькасць галасоў. Ксёндз *Жэброўскі* стаў прэзідэнтам, а доктар Калянкевіч – сябрам прэзідыума. 2.02.1919 пры *касцёле францішканцаў* складзены другі гурток ХД, а 11.03.1919 – трэці з польскай моладзі. З 18.12.1918 з № 34 стала выходзіць газета ХД "Nowe Życie" ("Новае жыццё"). Яе рэдактарам і выдаўцом стаў Л. Саванеўскі.

Крын. і літ.: O niepodległą i granice. T. 7. Raporty Straży Kresowej 1919–1920 Ziem Północno-Wschodnich opisane /Wstęp, wybór i opracowanie J. Gierowska-Kałłaur. – Warszawa, Pułtusk, 2001, s. 252–253.

Пасады старажытнага Гродна. Складаліся з наступных тэрыторый: вакольны горад (умацаваны пасад – *замак Новы*) на поўдзень ад *замка Старога*, неўмацаваныя пасады – вул. Замкавая да плошчы Савецкай і ўздоўж *Нёмана* да вул. Падольнай; на правым беразе *Гараднічанкі* каля *царквы Барыса і Глеба на Каложы*. На пасадах была ўтворана сетка вуліц, размешчаных паводле радыкальна-кальцавой схемы.

Літ.: Краўцэвіч А. Гродзенская архітэктурная школа XII ст. // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 25

Пат Ілля Яфімавіч (?–1985) – гродзенскі кравец, дзеяч рэвалюцыйнага руху. У яго доме па вул. Ласасянскай/Савецкіх пагранічнікаў у 1926 была створаная, паводле задання КПЗБ (гл. *Камітэт акруговы КПЗБ*), першая ў Зах. Беларусі падпольная друкарня. Дзейнічала да 1936 г. Краязнавец *Госцеў А.* убачыў на фотаздымку П. шахматную дошку і выказаў здагадку, што на ёй магчыма адлюстраваны пат – становішча ў партыі ў шахматы і іншых гульнях шахматнага тыпу, пры якім бок, які мае права ходу, не можа ім скарыстацца, бо ўсе яго фігуры і пешкі альбо знятыя з дошкі, альбо пазбаўленыя магчымасці зрабіць ход паводле правілаў, пры гэтым кароль не знаходзіцца пад шахам.

Патоцкі Юзаф (05.03.1804, Гродна – не раней 25.06.1841) – удзельнік паўстання 1830–31 гг. Сын Яна і Ганны Марыі Мінскай. Пра дзеянні ў паўстанні невядома. 27.11.1838 у французскім Мецы завербаваўся на 3 гады ў Іншаземны Легіён. Служыў стралком у Афрыцы. З 03.05.1839 знаходзіўся ў шпіталі ў Алжыры і 25.06.1841 быў звольнены з Легіёна, бо доўга адсутнічаў. Прычын магло быць толькі дзве: або памёр, або дэзертыраваў.

Літ.: Матвейчык Д. Ч. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. – ураджэнцы беларускалітоўскіх губерняў: эміграцыя, гуртаванне, дзейнасць. Дадатак. Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені к.г.н. па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя. – Мінск, 2008. – С. 343.

Патоцкі Рышард (19.02.1915, Гродна – 28.09.1975, Лодзь) – польскі мастак, касцюмер і сцэнарыст. Вучань Аляксандра Птушкі, у маладосці быў асыстэнтам Сяргея Эйзенштэйна. У пасляваеннай Лодзі быў адным з арганізатараў студыі фільмаў "Се-ма-фор". З 1949 па 1975 напісаў сцэнары да 38 фільмаў. Сярод іх: "Цягнік" (1959), "Сарваны мост", "Маўчанне" (усе 1963), "Гарачыня" (1964), "Бар'еры гуку" (1968), "Рай на зямлі" (1970), "Шкляная куля" (1972), "Канец бабінага лета" (1974), "Незвычайна спакойны чалавек" (1975), апошні "Заблытанасць пачуццяў" (1975) і іншыя. Актрыса Малгажата Патоцкая – яго дачка.

Крыніца: http://www.lakowa29.pl/

Патоцкія – магнацкі род, які паходзіў з Кароны Польскай і меў зямельныя валоданні ў Горадні. Літоўскаму падчашаму Крыштафу П. у 1665 г. належалі пляцы ў Занямонні, на вул. Лабенскай. Даследчык Ю. Гардзееў дапускае, што ён стаў уласнікам гарадзенскіх земляў недзе ў 1650-х гадах, бо ажаніўся з Гальшкай (Эльжбетай) Трызнай, якой яны належалі. Пасля смерці Крыштафа (1675) пляцы атрымаў ягоны пляменнік, яблоноўскі староста Крыштаф Сэндзівой П. Апошні валодаў яшчэ кварталам паміж усходнім бокам *Рынку*, Азёрскай, Бернардзінскай і Дзям'янаўскай вул. У другой пал. XVIII ст. пляцы на "Падгор'і над ракой Гараднічанкай" і на вул. Лабенскай належалі літоўскаму надворнаму маршалку Ігнацыю П. Уласнасцю П. былі таксама 4 вялізныя пляцы на Занямонні, на вул. Навадворскай. Брат Ігнацыя, тлумацкі староста Юры Міхал П. быў уласнікам пляцаў на Падольнай вул. і за Нёманам. Генерал кароннай артылерыі Станіслаў Шчасны П., дзякуючы сваім шлюбным адносінам, атрымаў сядзібу Ю. Мнішка, якая знаходзілася каля ўсходняй мяжы горада, паміж вул. Рэзніцкай і Азёрскай. Ён валодаў таксама пляцамі за Нёманам, на вул. Горніцкай. Шчырэцкі староста Францішак Пётр П. і бельскі ваявода Антоні Міхал П. у другой палове XVIII ст. былі ўласнікамі пляцаў на Падольнай вул.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2008. – С. 221–222.

Патрык, Патрыкей, Потырг, Пацірг, Patrikyg (верагодны год народзін 1339 – не раней за 1365) – гарадзенскі князь (Rex de Gartena) у 1348–1365 (па іншых звестках 1347–1364). Ёсць дзве версіі, чыім сынам ён быў: паводле першай – Кейстута ды весталкі Біруты, пав. другой – *Нарымонта*, які замяніў князя *Давыда Гарадзенскага* ў Горадзене ў 1326 г. Згадваецца ўпершыю як смаленскі князь. У 1353 разам з Кейстутам і Альгердам удзельнічаў у паходзе супраць *крыжакоў* (ледзь не патануў у рацэ, але выратаваў яго камандор Шындэкопф)

і ў нападзе на іх горад Ольштын 21.01.1356. Згадваецца як князь Гарадзенскі ў дакуменце аб усталяванні мяжы паміж ВКЛ і Мазавецкім княствам ад 14.08.1358. У канцы чэрвеня 1360 г. дапамагаў разам з сынам польскага караля пры будаўніцтве крэпасці Райград супраць крыжакоў і ўдзельнічаў у канфлікце, справакаваным крыжакамі ў канцы гэтага года. Легенда гаворыць, што ў 1363, калі крыжакі на чале з Ульрыхам фон Хатноў сабраліся напасць на Гарадзенскі замак, дык Патрык адчыніў браму горада і выйшаў да братоў па веры з хлебам і соллю. Рыцары з Шатландыі і Англіі, абураныя падманам, павярнулі коней прэч ад горада. У тым жа годзе 25 чэрвеня (дзень Св. Якава) у Кёнігсбергу Патрык хрысціўся. Хутка пасля гэтага Кейстут перавёў Патрыка ў Старадуб на Палессі.

Літ.: Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродно: ТАА "ЮрСаПрынт", 2018. – С. 48; Чарнякевіч А. М. Гарадзенскі князь Патрык-Пацірг // Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў. – Гродна, 2013. – Вып. 2. – С. 15–18; J. Nikodem, Witold. Welki książę litewski (1354 lub 1355 – 27 października 1430). – Kraków: Avalon, 2023. – S. 39; Śliwiński J., Wyodrębnianie się puszczy przynależnej do Grodna // Puszcze wielkoksiążęce na północnym Podlasiu i zachodniej Grodzieńszczyźnie w XV-XVI wieku (podziały, administracja, służby leśne i wodne). – Olsztyn: wyd-wo uniwer. Warmińsko-Mazurskiego, 2007. – S. 106, 109; Tęgowski J. Rola Grodna w składzie Wielkiego Księstwa litewskiego w XIV i początkach XV wieku // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 63–64.

Паўстанне 1794 г. Пад уплывам *Ясінскага Я*. часовы ўрад ВКЛ разаслаў 25 красавіка ўніверсал у ваяводствы, паветы і гарады ВКЛ. На заклік падняліся многія паветы. У тым ліку Гарадзенскі, адкуль у Вільню з акцэсамі (далучэннем да паўстання) 18 мая прыбыў Д. Матакевіч, а 22 мая – Ф. Мучынскі. У Гродне пачатак паўстання замарудзіўся ў сувязі з тым, што тут знаходзіўся расійскі корпус на чале з *П. Д. Цыцыянавым* (8 600 чал. і 28 гармат). Камандуючы паспеў прыняць меры засцярогі: злавіў у нейкім *кляштары* (магчыма, *бернардзінцаў*) змоўшчыкаў, зламаў *мост* на *Нёмане* і вывеў войска з горада ў лагер. Батальён каралеўскай гвардыі, які ішоў на Гродна, каб напасці знянацку на расіян, не мог гэтага зрабіць са зламаным мастом. Калі прыйшоў з Вільні маёр Тучкоў, Цыцыянаў разам з ім пад музыку ўвайшоў у Гродна. Расійскія афіцэры чулі, як польскія дамы на балконах гучна гаварылі: "Вось ідуць расійскія недарэзкі!". Цыцыянаў наклаў на жыхароў Гродна кантрыбуцыю "у прапорцыі свайго маёнтка" (1% з маёнтка і 1 злоты ад асобы). Да 5 мая 1794 гарадняне павінны былі яго заплаціць. У спісе "А" былі сябры "*магістрата* з *ратушай*" (напрыклад, будучы прэзідэнт горада *А. Сталінскі*; пісар Д. Лянкевіч; аптэкары Прайс і Шміт; доктар медыцыны *Л. Бекю*; лекар *К. Вірыён*; дырэктар каралеўскай *друкарні Я. Ясінскі/Ясенскі*). У спісе "В" былі змешчаныя жыхары вуліцы Віленскай (напрыклад, у доме Зараўскага жыў наглядчык дома, шавец Багушэвіч). У спісе "С" знаходзіліся жыхары розных вуліц (напрыклад, на Залатарскай жыў падкаморы *Ю. Клава*), на Скалімоўскай – сакратар В. Сабалеўскі, выдавец *"Газеты Гродзенскай"*,

на Рэзніцкай – кухмайстар Агінскі (гл. *Агінскія*) у сваім доме. У спісе "D" запісаныя жыхары з вуліц Баняцкай (напрыклад, падкаморы Я. Юхноўскі, Корбутава, якая мела маёнтак) і Польнай (тут знаходзіліся маёнткі Каранеўскай, Паўлоўскага, Мілешкі).

Калі расійскія войскі пакінулі Гродна, тут на пэўны час усталявалася рэвалюцыйная ўлада – *парадкавая камісія* Гродзенскага пав., якая была выбраная ў Саколцы 28 красавіка/9 мая (80 чалавек на чале з *Ф. Баўфалам*). На пачатку чэрвеня грамадзяне Гродна пабудавалі на *Рынку* шыбеніцу, прыбілі шыльды з надпісамі "Пакаранне для здраднікаў Айчыны", "Беражыся здраднікаў, выпраўляйся". Яна прастаяла да канца паўстання, але ніхто павешаны не быў. Рэпрэсіўна-карныя функцыі не займалі большую частку часу дзейнасці *камісіі парадкавай*. Значную ўвагу яна звярнула на мабілізацыю войска. Былі сфармаваныя:

1. Полк кавалерыі Адама Казаноўскага, які пачаў вербаваць яшчэ ў Саколцы, а працягваў у Гродне.
2. 1-ы батальён гродзенскіх стральцоў на чале з маёрам Сахацкім (300 пешых, 40 конных). 7 чэрвеня ён прыняў прысягу перад парадкавай камісіяй і пайшоў на злучэнне з Ясінскім Я.
3. 2-гі батальён гродзенскіх стральцоў на чале з палкоўнікам Міхалам Трэмбіцкім, які фармаваўся ў чэрвені-ліпені ў Гродне.
4. Муніцыпальная міліцыя. Гэтым займалася Дэпутацыя Бяспекі, камендант горада М. Эрэнкройм, а потым яе ўзначаліў Е. Кінсгэдл, былы шведскі вайсковец.

Парадкавая камісія займалася таксама забеспячэннем арміі: у горадзе знайшлі некалькі сотняў гарматных куляў. К. Ельскі дастаў з Нёмана 6 гармат з часоў *вайны 1792 г.*; заклікалі жанчын збіраць лекавыя травы і бінт; звярнуліся да гараднян па дапамогу ў абмундзіраванні коннага палка А. Казаноўскага; на патрэбы войска, паводле замовы Найвышэйшай Нацыянальнай Рады (ННР) у Варшаве (на 63 034 зл. 25 гр.) працавала Гродзенская суконная мануфактура (*Тызенгаўза А.*) на *Гарадніцы* (103 чал.); шылі мундзіры, кажухі і сярмягі гродзенскія краўцы. Важнай справаю парадкавай камісіі была ахова парадку ў горадзе і прыняцце мер супраць *пажараў*. Абапіраліся на "Універсал, які наказвае стварэнне спіса жыхароў, аб выдачы пашпартоў, а таксама з гледзішча бяспекі ад агню", які выдала Дэпутацыя Бяспекі. З 23 жніўня па 1 кастрычніка 1794 г. *Цэнтральная Дэпутацыя*, створаная *А.-Т. Касцюшкам* замест Літоўскай Рады, знаходзілася ў Гродне. У гэты час яна поўнасцю падпарадкавалася ННР у Варшаве, сваіх адозваў і універсалаў не выдавала, абмежавалася перадрукам тэкстаў, прысыланых з Варшавы, ды і тыя апазнялася даводзіць да жыхароў Літвы-Беларусі. Так, напрыклад, адозва ННР "Да грамадзян правінцый ВКЛ" ад 11 верасня была выдадзеная ў Гродне толькі 27 верасня, універсал аб дастаўленні жывёлы ў войскі Рэчы Паспалітай – 24 верасня, напярэдадні сыходу Цэнтральнай Дэпутацыі з Гродна. Немагчыма было зрэалізаваць і яе апошняе распараджэнне ад 30 верасня "Загад аб абмалоце збожжа і дастаўцы яго ў лагер" .

Літ.: Гардзееў Ю. Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі ў Вялікім Княстве Літоўскім у часы Чатырохгадовага сойма (1789–1792) / Ю. Гардзееў. – Смаленск, 2014; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997. – 140 с.; Mościcki H. Generał Jasiński i powstanie kościuszkowskie. – Warszawa, 1917 – S. 190.



С. 883

Паўстанне 1830–1831 гг. З 13.12.1830 на землях Беларусі было абвешчанае ваеннае становішча. На тэрыторыі Гродзенскага павета размеркаваўся Літоўскі корпус барона Разэна. У Гродне і павятовых гарадах з'явіліся атрады казакаў для падтрымання парадку. За падазронымі асобамі ўсталявалі паліцэйскі нагляд. Самых уплывовых польскіх памешчыкаў губернатар *М. М. Мураўёў* запрасіў ў Гродна і па сутнасці пасадзіў пад хатні арышт "да пазбаўлення хваробы" ("запаленне мозгу", як ён гаварыў). Адным з такіх арыштаваных быў брэсцкі павятовы маршалак Караль Урсын-Нямцэвіч – сваяк сакратара Сената Каралеўства Польскага. Адначасова ў жыхароў Гродна і памежных ваколіц (*Гожы, Грандзіч, Пышак*, *Пярэселкі*, Чэхаўшчыны і іншых) узялі падпіскі аб спыненні зносін з Каралеўствам Польскім, канфіскавалі значную колькасць зброі. З 10 студзеня па 11 лютага 1831 г. у Гродне знаходзілася галоўная кватэра галоўнакамандуючага расійскай арміі фельдмаршала графа Дзібіча-Забалканскага. Да 27 студзеня паміж Гроднам, Беластокам і Брэстам сканцэнтравалася ўся расійская армія, якая 5–6 лютага перайшла мяжу, каб разбіць паўстанцаў на тэрыторыі Каралеўства Польскага. У Гродне былі зарганізаваныя харчовы магазін (склад), шпіталь на 1200 чал., артылерыйскі парк. Гродзенцы маглі ваяваць у шэрагах партызанскіх атрадаў Яна Жылінскага і Казіміра Гоўвальда, якія дзейнічалі ў Гродзенскім павеце, а таксама ў атрадах Яўгена Ронка і Караля Нямцэвіча, Якава Шрэцера ў Белавежскай пушчы. З 8 снежня 1831 па 11 снежня 1834 у Гродне мела паседжанні губернская следчая камісія "для вызначэння ступені віны мяцежнікаў, секвестру і канфіскацыі іх маёнткаў". Са студзеня 1832 дзейнічала яшчэ адна камісія "для допытаў асоб, якія прымалі ўдзел у паўстанні 1831 г.". Спісы ўдзельнікаў паўстання захаваліся ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне.

Літ.: Радзюк А. Дзейнасць Гродзенскай следчай камісіі ў 1831–1834 г. / А. Радзюк // Гістарычны альманах. – 2008. – Т. 14. – С. 126–129; Швед В.В. Губернскі Гродна: аповяды з гісторыі горада (канец XVIII – пач. XX ст.) / В.В. Швед. – Баранавічы: Баранав. ўзбуйненая друкарня, 2003.

Паўстанне 1863–1864 гг. Атмасферу перад паўстаннем (у маніфестацыйны перыяд) у Гродне апісаў гісторык *Я. Арлоўскі*: "Часта чыноўнікі-палякі, седзячы за перапіскай папер на рускай мове, на пытанне, звернутае да іх па-руску, адказвалі, што не разумеюць гэтай мовы. Афіцэры ў форме, якія праходзяць па вуліцы альбо па бульвары, падвяргаліся аплёўванню; прычым ім услед чулася самая адборная лаянка. У кандытарскіх рускаму чалавеку, які не ведае польскай мовы, немагчыма было дапрасіцца кубачка кавы". Святара *Сафійскага*

сабора айца Ф. Кавалеўскага аплёўвалі, палякі-настаўнікі хто адкрыта, а хто патаемна вялі сярод вучняў агітацыю ў "польскім духу", настаўнікам рускага паходжання пагражалі, "вучні ў класе тачылі вялікія паляўнічыя нажы, намякаючы даволі адкрыта, "для каго" яны рыхтуюць гэтую зброю". У касцёлах адбываліся жалобныя імшы па ахвярах варшаўскай (27.01.1861) і віленскай крывавых дэманстрацый (18.09.1861), жанчыны сталі насіць жалобную вопратку і капелюшы-"гарыбальдзінкі", а мужчыны – канфедэраткі; з'явіліся сімвалічныя знакі (пярсцёнкі, завушніцы, партрэты і г. д.). Гродзенцы збіралі грошы на помнік пяці забітым у Варшаве, на лекі і зброю.

Віцэ-губернатар Ражноў адзначаў, што спевы забароненых польскіх песень адбываюцца "і ў касцёлах, і ў дамах рознага саслоўя людзей, і нават падчас палявых працаў. Гэта ўзята простымі людзьмі, вядома, у касцёлах і перайшло ўжо ў іх ледзь не ў звычку". Спявалі забароненыя польскія песні/гімны "Boże, coś Polskę" і "Serdeczna Matko". Улады адзначалі вялікую ролю ў гэтым *Валіцкай Леакадзіі* і яе дачкі; *Леакадзіі дэ Ромер, В.-Л. С. Лебеля*), моладзь выбівала шкло ў вокнах кватэр расійскіх чыноўнікаў.

26.08.1861 пасля вячэрняй службы з *касцёла Фарнага* адбылася працэсія на чале з дэканам *Ю. Маеўскім* і 4 святарамі. Дайшлі да моста праз Нёман, а затым расійскае войска прымусіла ўдзельнікаў вярнуцца ў касцёл. З сяр. ліпеня 1861 па чэрвень 1863 выходзіла газета *"Мужыцкая праўда"*. Мажліва, да яе друку меў дачыненне рэдактар "Гродзенскіх губернскіх ведамасцей" *Штарк Я. А.* Для распаўсюджвання газеты прыцягвалі чыноўнікаў Гродзенскай палаты дзяржаўных маёмасцяў, якія былі звязаныя з казённымі сялянамі, мелі ў вёсках знаёмых валасных старшынь, пісараў, настаўнікаў вясковых вучылішчаў. У Гродне распаўсюджваліся ўлёткі: 30.10.1861 знойдзеная пракламацыя "Российским воинам", у якой тлумачылася, што без свабоды Польшчы не будзе свабоднай Расія. 18.03.1862 цырульнік з 3-й пяхотнай дывізіі, якая размяшчалася ў Гродне, Кірыл Емяльянаў пасля наведвання Фарнага касцёла знайшоў у бакавой кішэні шынэлі пракламацыю "Что надо делать войску?". 24.06.1862 на адной з вуліц Гродна мытны даглядчык знайшоў лісток пад назвай "Русская правда".

21.10.1861 вучні 5-га і 6-га класаў *гімназіі гродзенскай* выступілі супраць інспектара гімназіі, старэйшага выкладчыка Рахманіна за данос на аднаго з вучняў, які спяваў забаронены гімн у касцёле, а таксама супраць настаўніка гісторыі. 25.11.1862 выступленне ў гімназіі паўтарылася. А 14.03.1863 гімназісты спрабавалі выехаць цягніком з гродзенскага вакзала ў Парэчча, дзе чакаў Баляслаў Нарбут, брат камандзіра партызанскага атрада Людвіка Нарбута. Праект выезда гродзенскіх паўстанцаў узнік сярод гімназістаў, якія пражывалі ў інтэрнаце Прушынскага, у так званых "агульных кватэрах" (цяпер на вул. Кірава). Паводле паказанняў гімназіста А. Кашубы і шляхціца Ю. Гамулецкага, ініцыятарам праекта быў служачы прыказа грамадскай апекі Г. Зуброўскі. Праект быў узгоднены з кіраўніцтвам *ваяводскай гродзенскай дэмакратычнай арганізацыі:* ваяводам *Эразмам Заблоцкім,* вайсковым начальнікам Гродна *Цэлесцінам Цеханоўскім* і В. Грабоўскім, магчымым сувязным ад

атрада Людвіка Нарбута. Забяспечваў выезд начальнік чыгуначнай станцыі Гродна *Л. Ф. Кульчыцкі*. Было тры месцы збору: на чыгуначнай станцыі каля вагонаў, ля Брыгіцкага моста, у арцельным доме вёскі Капліца. Дабрацца да партызан удалося нямногім, бо вагоны былі адчэпленыя ад лакаматыва, і кіраўнік выправы Л. Кульчыцкі застаўся без сваіх паўстанцаў. Разам з ім было 7 ці 8 чалавек. Яму ўдалося завалодаць грашыма з касы станцыі. Усіх жа ўдзельнікаў няўдалай выправы з Гродзенскай станцыі налічваецца прыкладна каля 100 чалавек (гл. *Ражбіцкі С. Н., Мазуркевіч І. К.*). Мне ўдалося ў розных крыніцах знайсці прозвішчы 72 чал., якіх прыцягнулі да следства. Сярод іх былі: 25 гімназістаў з губернскай (былой Дамініканскай) *гімназіі* і 1 са Свянцянскай гімназіі; 13 чыноўнікаў – з *губернскага праўлення* (2 чал.), канцылярыі *гродзенскага губернатара* (1 чал.), *палаты дзяржаўных маёмасцяў (3 чал.)*, грамадзянскай і крымінальнай судовых палат, прыказа грамадскай апекі, канцылярый *дваранскага дэпутацкага сходу* і дваранскай апекі, *казённай палаты* і камітэта Друскеніцкіх мінеральных вод (ва ўсіх пералічаных па 1 чал.); 1 рабочы і 7 служачых чыгункі (шляхціцы); 1 аптэкар і 6 аптэкарскіх вучняў з *аптэк* Кандратовіча, Несцяровіча і *Адамовіча*; 2 працаўнікі друкарні Гродзенскага *губернскага праўлення*; студэнт Пецярбургскага ўніверсітэта Г. Даланскі; 3 шляхціцы, 2 памешчыкі, 1 селянін, 1 мешчанін, 1 шавец, 2 настаўнікі, 1 адстаўны вайсковец і 1 салдацкі сын.

16-гадовы былы вучань гродзенскай гімназіі Актавіян Лапінскі таксама ўдзельнічаў у сакавіцкай выправе, але ў паўстанцкі аддзел патрапіў толькі ў канцы красавіка. Праз Нёман дабраўся, дзякуючы сустрэчы са знаёмым, да атрада Андрушковіча, пасля бою пад Кадышом тры месяцы партызаніў у атрадзе Ваўра (Канстанціна Раматоўскага).

У Гродне дзейнічала *ваяводская гродзенская дэмакратычная арганізацыя*, створаная *Каліноўскім В.-К.* Ваяводамі/камісарамі былі Каліноўскі, *Заблоцкі Э.; Сільвестровіч; Гафмайстар А. П.; Заблоцкі Б.* Начальнікі горада (*Цеханоўскі Ц. М.; Руткоўскі Ю.; Жалкоўскі У.*) займаліся зборам сродкаў на паўстанне, шукалі годных людзей і адпраўлялі іх у партызанскія атрады, сачылі за паводзінамі насельніцтва, уладаў і ўрадавых войск. Ім былі падпарадкаваныя жаночыя гарадскія камітэты апекі паўстанцаў, якія мелі мэтай далучыць да паўстання жанчын. Другі бок паўстання (“белых”) прадстаўляў Стажынскі (Стажэнскі) Віктар, *губернскі прадвадзіцель дваранства*.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1241, а. 244. НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 158.; Герасімчык В. Гродна і гарадзенцы ў паўстанні 1863–1864 гг. ва ўспамінах Івана Мітрапольскага // Гарадзенскі гадавік. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2020. – С. 30–44; Маевский И. Гродненская процессия 14 августа 1861 г. // Русская старина – 1891. Вып. V. – С. 489–497; Орловский Е. Граф М.Н. Муравьёв как деятель над укреплением прав русской народности в Гродненской губернии. 1831–1835 и 1863–1865 гг. – Гродна, 1898. – С. 14–15; Революционный подъём в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг. – М., 1964. – С. 467–468; Швед В.В., Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня), Мн.: ТАА “Альфа-кніга”, 2017.

“Паходня” – гісторыка-культурны клуб, створаны пры гродзенскім ГДК 12.03.1986, дзякуючы намаганням *М. Таранды* з Інстытута біяхіміі АН БССР і М. Ткачова. На першае паседжанне прыйшло 19 чал. Сярод іх былі: удзельнікі народнага ансамбля “Нёман” В. Зубкоў і В. Ятулевіч, супрацоўнікі Інстытута біяхіміі А. Пацэнка, В. Лучко, Т. Казак, выкладчыкі *Гродзенскага ўніверсітэта* М. Даніловіч, Н. Тарэлкіна, П. Маляўка, мастак У. Кіслы, карэспандэнт “Гродзенскай праўды” С. Астраўцоў і іншыя. У склад П. уваходзілі выкладчыкі і студэнты вышэйшых навучальных устаноў, настаўнікі школ, супрацоўнікі Інстытута біяхіміі АН БССР, тэхнічная і творчая інтэлігенцыя, працоўныя прадпрыемстваў (усіх у 1988 – каля 200 чал.). Удзельнікі клуба вывучалі гісторыю і культуру Гродзеншчыны, дзейнасць выдатных ураджэнцаў Беларусі, папулярызавалі беларускую мову і літаратуру, фальклор, звычаі і традыцыі. Праводзіліся суботнікі па добраўпарадкаванні горада, на паседжаннях выступалі запрошаныя гісторыкі, пісьменнікі, паэты, мастакі, артысты і д. п. Чальцы клуба ўдзельнічалі ў археалагічных раскопках *замка Старога*, збіралі грошы на помнікі *В.-К. Каліноўскаму, Максіму і Марыі Багдановічам*. П. падрыхтаваў шэраг навукова-практычных канферэнцый: 400-годдзе аптэкі фарнай, 150-годдзе Каліноўскага, 100-годдзе мастака Я. Драздовіча і інш.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник, Минск, 1988, с. 311; Таранда М. Дзейнасць клуба “Паходня” // Гісторыя ХХ ст. ва ўспамінах гарадзенцаў/ В. Руднік, Л. Руднік, В. Корсун. – Гродна-Мінск, 2010. – С.47–56; http://dvv-international.by/wp-ontent/uploads/2011/10/History_of_the_XX_century_in_memories_of_Hrodna_inhabitants.pdf

Пац Крыштаф Зыгмунт (1621 – 10.01.1684) – сын Стэфана, канцлер вялікі літоўскі (з 1658), адміністратар *эканоміі Гродзенскай*. Адзін з высокаадукаваных чыноўнікаў Рэчы Паспалітай: вучыўся ў Кракаве, Падуі, Лейдэне, дзе вывучаў вайсковую інжынерную справу. Служыў у французскай, іспанскай і галандскай арміях. На радзіму вярнуўся ў 1643. Ваяваў супраць казакаў ва Украіне (1651), узначальваў групоўку Пацаў на баку караля супраць Радзівілаў падчас шведскага наезда. Не без яго ўдзелу былі заключаныя Аліўскі (1660) і Андрусаўскі (1667) трактаты. Удзельнічаў у кампаніях супраць Масквы ў 1661–1664. Пазней быў за саюз з ёю супраць Турцыі. Падтрымаў абранне каралём Міхала Карыбута Вішнявецкага (1669), быў супраць абрання Яна Сабескага (1674). На *сейме Рэчы Паспалітай* 1673 г. дабіўся прыняцця рашэння аб правядзенні кожнага трэцяга сейма ў Горадні. У сувязі з гэтым адраманаваў *Стары замак* і збудаваў *мост* праз Нёман. Падчас адкрыцця першага гарадзенскага *сейма РП* на сцяне замка з’явілася мемарыяльная дошка, прысвечаная гэтай падзеі і ролі П. у ёй (гл. *Стары замак)*.

Літ.: Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя. Т. 2. Мінск: Бел.Эн., 2006. – С. 422–423; F.L. Pac Krzysztof // Słownik biograficzny historii Polski. T. 1 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 147; Sejmy

i sejmiki pierwszej Rzeczypospolitej: Dokumenty w zbiorach Biblioteki Narodowej / Oprac. M. Wrede i M. Wrede. – Warszawa: Wyd-wo Sejmowe, 1999. – S. 95.

Пацей/Пацэй Людвік Канстанцін (пам. 1730) – стражнік літоўскі (1698), падскарбі вялікі літоўскі (1703). Падчас *вайны Паўночнай* узначальваў шляхецкую групоўку ў ВКЛ за саюз з Расіяй. У 1705–1706 падчас аблогі шведамі Гродна П. узначаліў працу гродзенскага манетнага двара, які чаканіў так званыя "трохграшовікі" і "шасціграшовікі" Людвіка Пацэя. Народ называў іх "Ludu płacz" ("Плач народа") паводле ініцыялаў П. ("L. P."), якія друкаваліся на манетах.

Пацёмкін Аляксандр Мікалаевіч – гродзенскі *губернатар* (1883–1890). Скончыў курс Рышельеўскага ліцэя ў Адэсе. Сапраўдны стацкі дарадца. Пасля *пажару 29.05.1885* у Гродне аказваў дапамогу пагарэльцам, ўзначаліў губернскі камітэт дапамогі. Добра адносіўся да пісьменніцы *Э. Ажэшкі* – хадайнічаў у С.-Пецярбургу аб зняцці з яе паліцэйскага нагляду. Звольнены з пасады губернатара ўказам ад 19.04.1890 згодна з прашэннем па стане здароўя. Кавалер сямі ордэнаў; меў падарунак Яго Вялікасці за працы па падрыхтоўцы да свяшчэннага каранавання; меў медалі: залаты на Аляксандраўскай ленце ў памяць заканчэння і асвячэння храма Хрыста Выратавальніка і бронзавы ў памяць Крымскай вайны 1853–1856.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф.2, воп. 24, с. 1509, а.4; ф. 1, воп. 8, с. 2516, а. 7; Orzeszkowa E. Dnie. – Warszawa: IBL, 2001. – S.122.

Пачобут-Адляніцкі Марцін (30.09.1728, в. Саломенка Гродзенскага ў., маёнтак Пачобудзе, цяпер Капцёўскі сельсавет Гродзенскага р-на – 20.02.1810, Даўгаўпілс; па словах П. у 1808 яму было 84 гады) – выдатны беларускі мысліцель эпохі асветніцтва. Вядомы астраном. Нарадзіўся ў збяднелай дробнапамеснай шляхецкай сям'і, першапачатковую адукацыю атрымаў дома. З 1738 сем год вучыўся ў калегіуме езуітаў у Гродне. Вучобу працягнуў у Вільні і Празе. Удасканальваў свае веды ў Германіі, Італіі, Францыі. Некаторы час выкладаў старажытнагрэцкую мову ў Полацкім калегіуме, а затым – у Віленскім ўніверсітэце, у якім стварыў астранамічную абсерваторыю (першапачаткова меркаваў зрабіць яе ў Гродне пры *Тызенгаўзе А.*). З 1765 па 1780 – першы рэктар Віленскай езуіцкай акадэміі, якую ў 1790 рэарганізаваў у Галоўную школу ВКЛ. Тут напісаў кнігі "Пачатак геаметрыі...", "Астранамічныя назіранні". 39 год праводзіў назіранні за зоркамі і планетамі, асабліва за Юпіцерам і Меркурыем. Вызначыў геаграфічныя каардынаты Вільні і Гродна. Усё гэта фіксавалася ў "Журнале назіранняў", якія зараз захоўваюцца ў архіве АН СССР у Пецярбургу. Запісы з 1769 па 1808 вяліся П. і яго вучнямі па-французску. Захаваліся таксама дзённікі яго назіранняў з 1772 па 1806 (34 тамы). П. даследаваў сонечныя зацьменні ў Вільні, Варшаве, Кракаве, Гродне (разам са Снядэцкім Я.) і інш. Вынікам прац са Снядэцкім стаў дзённік "Разлік гродзенскіх назіранняў зацьмення Сонца, праведзеных Пачобутам і Снядэцкім 3 верасня 1793 года".

П. актыўна удзельнічаў у дзейнасці Адукацыйнай камісіі. Падчас *паўстання 1794* П. быў чальцом Часовага ўрада літоўскай правінцыі. Жыў у Гродне ў 1795–1797 па запрашэнні *Станіслава Аўгуста Панятоўскага*. Пра П. як вядомага астранома ўспамінае А. Міцкевіч у паэме "Пан Тадэвуш". Яго жыццё і творчасць апісаў Ян Снядэцкі. У 1930-х гадах у Гродне была вуліца яго імя.

Літ.: Левицкий Г. Почобут-Одляницкий Мартын Кузьмич // Русский биографический словарь. – СПб., 1905. – С. 732–733; Цыхун А. П. Ураджэнец Гродзеншчыны Марцін Пачобут-Адляніцкі – адзін з заснавальнікаў медычнага факультэта ў Вільні // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII – XIX стагоддзяў. матэр. навук.- практыч. канферэнцыі 11–12 траўня1992 г. – Гродна-Белавічы: Б.в., 1992 – С. 55–58.

Пачынчук Пётр Іванавіч (26.07.1954, в. Ляхаўцы Маларыцкага р-на Брэсцкай вобл. – 1.12.1991, Гродна) – гродзенскі алімпіец. Скончыў гродзенскі тэхнікум фізічнай культуры (1972), гістарычны факультэт гродзенскага педінстытута імя Я. Купалы (1977), вышэйшую школу трэнераў у Маскве (1989). Працаваў з 1989 старэйшым выкладчыкам кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры і спорту *ўніверсітэта* ў Гродне. Срэбны прызёр у спартыўнай хадзьбе на дыстанцыі 20 км на XXII алімпійскіх гульнях (1980), срэбны прызёр Кубка свету (1979), пераможца гульняў юнацкіх зборных СССР–ЗША (1973) і СССР–Польшча (1973), пераможца Кубка СССР (1980), шматразовы прызёр чэмпіянатаў СССР і першынстваў Узброеных Сіл СССР. Узнагароджаны медалём "За працоўны гонар", граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Літ.: Попко И.Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 94–98.

Паясы гродзенскія пачалі вырабляць на гродзенскай каралеўскай мануфактуры, пабудаванай на Гарадніцы *Тызенгаўзам А.* У 1770 г. прыехалі ліёнскія майстры Вінсэнт дзю Пінэй і Інард, якія рабілі паясы паводле французскіх, а не турэцкіх узораў. У 1774 да іх пад'ехаў французскі ткач Франца Сэліман. Паясы іх вытворчасці былі адрозныя ад "слуцкіх" паводле дэкаратыўнай кампазіцыі і каларыту. Сэліман па-новаму распрацаваў арнамент поля і шлячка, размясціўшы на яго канцах букеты з сіне-чырвоных гваздзікоў і цюльпанаў, перавітых сіняй стужкай з бантам. Сярэднік пояса Сэліман разбіў сіне-чырвонай рамбічнай сеткай, у кожнай ячэйцы якой размясціў выяву чырвонай кветкі граната. Шлячок быў падобны на хваліста ўкладзеную галінку з дробных чырвоных гваздзікоў, стылізаваных сініх незабудак і белых рамонак (звярніце ўвагу, што гэта колеры французскага сцяга). П. г. пазначаныя літарамі імя і прозвішча майстра (SF), укладзенымі гарызантальна.

С. 884

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадніца і пераўтварэнні Антонія Тызенгаўза // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 131; Яніцкая М.М. Да пытання аб атрыбуцыі гродзенскіх шаўковых паясоў 18 стагоддзя // Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства. – Гродна: б.в., 1990. – С. 29–30.

Пепельман (Poppelman) **Карл Фрыдрых** (1690–1750) – архітэктар, сын Матэвуша П., парадамі якога, верагодна, карыстаўся Яўх пры падрыхтоўцы плана разбудовы *замка Новага*, прынятага Аўгустам III у 1739 г. У 1738–42 г. менавіта ён быў найбольш задзейнічаны ў будаўніцтве палаца, і яно ішло найбольш эфектыўна.

Лит.: Szymański S, Pałac królewski w Grodnie // Rocznik Białostocki. T. VI. – 1966. – s. 325, 329.

Пепельман Матэвуш/Матэус Даніэль (3.05.1662, Херфард, Вестфалія – 17.01.1736, Дрэздэн) – нямецкі архітэктар, прадстаўнік позняга барока і часткова ракако. У 1710 г. наведаў Рым і Неапаль, у 1715 – Парыж. Яго працы: палацавы ансамбль Цвінгер (1711–22), паркавы фасад Японскага палаца ў Дрэздэне, царква Дрэйкёнігскірхе (1732–39), вадзяны палац у Пільніцы (1790), замак у Морыцбургу пад Дрэздэнам (1722–30, перабудаваў). Удзельнічаў пры пабудове ці перабудове такіх варшаўскіх будынкаў, як: Каралеўскі палац, Саксонскі палац, Казіміраўскі, Блакітны, Чартарыйскіх, Сангушкаў і інш. З*амак Новы* ў Гродне было задумана будаваць у 1726 г., калі яго ўжо не было ў Гродне. Ён мог толькі сваімі парадамі дапамагаць каралю з Саксоніі, і тое толькі наконт галоўнага корпуса і асноўных сегментаў крылаў.

Літ.: Szymański S, Pałac królewski w Grodnie // Rocznik Białostocki. T. VI. – 1966. – s. 323, 534, 539.

Персіцкі Тамаш – цэхмайстар будаўнікоў у Гродне ў 1704 г. Рабіў скляпенні ў *касцёле езуіцкім* і скардзіўся на канкурэнтаў-італьянцаў.

Літ.: Szymański S, Pałac królewski w Grodnie // Rocznik Białostocki. T. VI. – 1966. – s. 324.

Першы гарадзенскі губернскі беларускі з'езд адбыўся ў будынку Барысаглебскага *манастыра* 1–2 снежня 1918 г. У ім прымалі ўдзел 192 дэлегаты з мандатамі і 35 без іх з Гарадзенскага, Сакольскага, Беластоцкага і Ковенскага паветаў. Агулам прысутных было каля 600 чал. З'езд сцвердзіў, што "гэты край ніколі польскім не быў, а яго спрадвечна насяляў беларускі народ, і што толькі беларускі народ можа прэтэндаваць на валоданне ім!". Праўда, у абарону беларускасці выступілі толькі два прадстаўнікі Гродзенскага *камітэту беларускага нацыянальнага* Я. Натусевіч і А. Якубецкі. За выкладанне ў школах выключна па-беларуску прагаласавала толькі 8 чалавек. Востра абмяркоўвалася пытанне аб палітычнай будучыні краю. Прагучала некалькі поглядаў: уваходжанне Гарадзеншчыны ў склад Літоўскай краіны ("найменшае зло"), у незалежную беларускую дзяржаву. Большасць прагаласавала за аб'яднанне Гарадзеншчыны з Літвой на правах аўтаноміі. Заключная рэзалюцыя сходу ўхваліла "свабоду, роўнасць, братэрства, Беларускую Управу" і заклікала беларусаў-католікаў і беларусаў-праваслаўных да еднасці.

Літ.: Чарнякевіч А. З гісторыі Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту. Канец 1918 – пачатак 1921 г. // Гарадзенскі палімпсест. XII-XX стст. Матэрыялы

міжн. канф. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Горадня-Беласток: ІГДБ (ЕГУ). – 2008. – С. 151–172.

Петрашэвіч Яўген Канстанцінавіч (18.06.1930, в. Падбараны Мастоўскага р-на – 12.03.2017) – беларускі музычны педагог, кампазітар. Скончыў гродзенскую школу № 8 і музычную школу, музычную вучэльню ў Мінску. Выкладаў у музычнай школе № 1 у Гродне (1956–70); кіраваў аркестравымі групамі народных ансамбляў песні і танца *"Нёман"* і "Вянок". Кіраваў хорам Абласнога савета профсаюзаў у Гродне (1972–74), аркестрам народных інструментаў абласнога палаца піянераў і школьнікаў (з 1975), які перарос у 1980 ва ўзорны дзіцячы фальклорны гурт "Дударыкі", вядомы ў краінах Еўропы. Аўтар вакальна-інструментальных і вакальна-харэаграфічных кампазіцый, песень, рамансаў, апрацоўшчык народных песень. У аўтарскім багажы ёсць кантаты пра гарады Гродна, Наваградак, Нясвіж, пра Мірскі замак, пра вядомыя постаці: *В.-К. Каліноўскага, А.-Т. Касцюшку, Давыда Гарадзенскага, М. Васілька, А. Карпюка, А. Шыдлоўскага.* Як аматар займаецца скульптурай з каменя і дрэва, лоза- і саломапляценнем, чаканкай. Аўтар зборнікаў песень "Беларускі вясёлкавы край" (2010) і "Купалле-Русалле" (ГрДУ), рэдактар зборніка песень "Нежность" (Мінск). Узнагароджаны знакам "Настаўнік-выдатнік", шэрагам грамат СССР і БССР, Міністэрствам культуры і Саюза кампазітараў Беларусі.

Крын. і літ.: Аўтабіяграфія Я.К. Петрашэвіча; Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: давед. / А.М. Пяткевіч. – Гродна: ГрДУ, 2000. – С. 237.

Петыпа Лідзія Пятроўна, з Астаф'евых (? – 1914/15) – драматычная актрыса. Другая жонка *Петыпы Марыуса*. На працягу 27 гадоў працавала ў буйных правінцыйных тэатрах.

Петыпа (Суроўшчыкава-Петыпа) Марыя Сяргееўна (27.02.1836 – 16.03.1882, Новачаркаск) – танцоўшчыца-мімістка, жонка Марыуса Петыпы. Скончыла Пецярбургскае тэатральнае вучылішча (1854). Танцавала ў Пецярбургскай балетнай трупе (да 1869); выступала з мужам. Гастролі ў Берліне, Парыжы, Рызе (1861–1862). Для яе М. Петыпа паставіў кароткія балеты: "Шлюб у часы рэгентства" (1858, графіня Матыльда), "Блакітная геаргіна" (1860) і інш. Выконвала стылізаваныя народныя танцы, "псеўдарускія" танцы "Мужычок", якія крытыкаваў М. А. Някрасаў у вершы "Балет".

Петыпа Марыус Іванавіч (11.03.1818, Марсэль – 14.07.1910, Гурзуф) – вядомы балетмайстар, педагог, танцоўшчык. Француз па нацыянальнасці. Сын Жана Петыпы, які быў запрошаны ў 1847 галоўным салістам і выступаў у 1850-х на Пецярбургскай балетнай сцэне. З 1869 па 1903 П. паставіў на рускай сцэне звыш 60 балетаў ("Сіняя барада" (1896), "Раймонда" (1898) і інш.). Меў званне саліста двара Яго Вялікасці. Некаторыя балеты П. захоўваюцца ў сучасным рэпертуары, як выдатныя ўзоры харэаграфічнага мастацтва ("Лебядзінае

возера", "Прыгажуня ў спячцы"). Сач.: Мемуары Мариуса Петипа.- Спб., 1906; Мариус Петипа. Материалы. Воспоминания. Статьи. – Л., 1971.

Пеціпаці/Пеціпэці Гаэтан/Каэтан – настаўнік у *школе балетнай Тызенгаўза А*. Працаваў у Неапалі, а ў 1774–1779 разам з братам Людвікам – у прыдворным *тэатры і школе тэатральнай* А. Тызенгаўза ў Нясвіжы (1784, "Агатка, або прыезд пана") і затым аналагічна ў Варшаве (1785). Магчыма, меў не больш за 22 гады. Згодна з кантрактам П. павінен быў сам танцаваць і вучыць дзяцей танцу (як балетмайстар). За працу прызначылі 7 чырвоных злотых на месяц, што было значна менш абяцанага яму ў Італіі. Быў у Гродне ў 1778 пастаноўшчыкам балетаў і галоўным танцорам у "Квартэце дудараў", "Другім балеце пекараў", "Сялянскім балеце" (у ім выступілі яго вучні). З 1779 па запрашэнні К. С. Радзівіла працаваў танцорам і балетмайстрам Нясвіжскага тэатра. Удзельнічаў у падрыхтоўцы балетаў "Арфей у пекле" і, верагодна, "Пігмаліён". З'ехаў з Нясвіжа ў 1786. Ёсць звесткі, што перад *паўстаннем 1830–31* ён яшчэ працаваў настаўнікам танцаў у Варшаве.

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. – Lwów. T. II, 1925. – S. 196, 325; Барышев Г.І. Театральная культура Белоруссии XVIII века, – Мн., 1992, с. 201–204; Mamontowicz-Łojek B. Tancerze króla Stanisława Augusta. 1774–1798. Początki polskiego baletu. – Warszawa: Rytm, 2005. – S. 38–39.

Пешка Марцін Фрыдэрык Юзаф (1767–1831) – мастак. Вучыўся ў Кракаве, потым у майстэрні Ф. Смуглевіча ў Варшаве. З 1787 працаваў у Вільні: пры дэкарацыі віленскай катэдры, маляваў пейзажы, рэлігійныя і гістарычныя карціны, партрэты (Х. Страйноўскага, Ю. Франка і інш.). У 1803–1804 быў у Гродне, маляваў віды горада і ваколіц: *касцёлы кармелітаў і бернардзінцаў*. У 1809 атрымаў у Віленскім універсітэце ступень магістра мастацтва. У 1807–09 быў надворным мастаком князя Радзівіла Дамініка ў Нясвіжы. У 1813 вярнуўся ў Кракаў, дзе ў 1817 стаў прафесарам Ягелонскага ўніверсітэта.

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 375.

Пётр-Міланег (Нежык) – архітэктар, прадстаўнік *гарадзенскай архітэктурнай школы*, традыцыі якой распаўсюджваў усюды, дзе яму прыйшлося працаваць. У *Горадзене* дзейнічаў на працягу 12–15 год (з 1180-х да не пазней за 1194 г.) і збудаваў *цэрквы Ніжнюю, Прачысценскую і Барыса і Глеба на Каложы, церам княжацкі*, сцены *крэпасці*. Зрабіў гэта так цудоўна, што аўтар Іпацьеўскага летапісу параўнаваў яго з біблейскім архітэктарам Веселіілам. Даследчыкі доўгі час пісалі Пётр Міланег, маючы на ўвазе імя і прозвішча. Аднак высветлілася, што архітэктар меў падвойнае імя, згодна з хрысціянскай традыцыяй, а вось прозвішча нам невядомае. Даследчык Р. Раманаў лічыць, што "міланегамі" называлі ў Кіеве выраблялынікаў каменя, а ў Белай Русі мурнікаў, гэта значыць тых, хто ўмеў абпальваць вапну, расціраць бітую цэглу-плінфу ў цымянку і ствараць моцны раствор "міланіт" (ад грэцкага – млын).

В. Р. Слюнчанка піша, што П.-М. прыехаў з Валыні або з Балгарыі праз Валынь, але "указать на какие-либо прямые связи и влияния извне не представляется возможным". Аўтару гэтых радкоў удалося з'ездзіць у Балгарыю (у XII ст. яна належала Візантыйскай імперыі) і ўбачыць у Нясебры царкву канца XI ст. з элементамі гродзенскай архітэктурнай школы. Верагодна, будаўнік прыбыў з Балгарыі ў Гродна са сваёй брыгадай, у якую ўвайшлі полацкія і мясцовыя будаўнікі і майстры. П.-М. з'яўляецца таксама будаўніком цэркваў: Пятніцкай у Чарнігаве, Васіля ў г. Оўручы, Апосталаў у Белгарадзе. З 1194 быў асабістым архітэктарам вял. кіеўскага князя Рурыка Расціслававіча. "Тады ж славіўся ў Кіеве дойлід Міланег-Пётр, будаўнік мураванай сцяны на беразе Дняпра пад манастыром Выдубецкім, настолькі дзівоснай для сучаснікаў, што яны гаварылі пра яе, як пра вялікі цуд" (М. М. Карамзін).

Літ.: 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. – Мінск: УП "Экоперспектива", 2008. – С. 291; Романов Р., Памятники Белой Руси (правда и вымысел), Гродно 2000, ч. 1; Рапапорт П.А. Пётр Міланег – гарадзенскі дойлід XII стагоддзя // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1987. – № 4. – С. 21–22; Слюнчанка В.Р. Барысаглебская (Каложская) царква ў Гродне: гіст.-архітэктур. нарыс. – Мінск: Полымя, 1992. – 63 с.; Shved V. Cerkiew Świętych Borysa i Gleba na Kołoży w Grodnie w: Europa Środkowo-Wschodnia. Doświadczenia i tradycje, Warszawa 2016, s. 119–132.

Пётр I Раманаў (9.06.1672, Масква – 8.02.1725, Пецярбург) – расійскі цар (з 1682, правіў з 1689). Першы расійскі імператар (1721–25). Малодшы сын цара Аляксея Міхайлавіча (1629–1676). Дзяржаўны, вайсковы і культурны дзеяч Расійскай імперыі. Падчас вайны Паўночнай (1700–1721) П. I вялікае значэнне надаваў Гродну, разлічваючы менавіта ў раёне яго крэпасці заманіць шведаў у пастку. 27.09.1705 прыехаў у Гродна, верагодна, з васьмігадовым *Абрамам Ганібалам*, прадзедам А. С. Пушкіна, бо перад гэтым ён быў з ім у Вільні, дзе ахрысціў Абрама ў Пятніцкай царкве. 6 снежня Пётр I разам з вял. кн. літоўскім і каралём польскім *Аўгустам II* прысутнічаў на асвячэнні *касцёла езуіцкага кляштара* ў гонар Св. Францішка Ксаверыя. Вял. князь і кароль у гонар Пятра I даў абед, а езуіцкі калегіум – тэатральнае прадстаўленне. 18.12.1705 Пётр I пакінуў Гродна.

Літ.: Донских С.В. Гродненская военная кампания 1705–1706 гг. / С.В. Донских – Мир: Музей "Замковый комплекс "Мир", 2017; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005). – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020. – 325 с.

Пілсудскі Юзаф Клеменс (5.12.1867, Зулава – 12.05.1935, Варшава) – польскі палітычны дзеяч, маршалак Польшчы. Нарадзіўся на Віленшчыне. Вучыўся ў Харкаўскім універсітэце (1885), за ўдзел ў студэнцкіх хваляваннях быў з яго выключаны. З 1888 па 1892 знаходзіўся ў сібірскай ссылцы ў сувязі з замахам на Аляксандра III. У 1892 далучыўся да Польскай партыі сацыялістычнай (ППС), стаў рэдактарам партыйнага выдання "Працаўнік". У 1905–1907 стварaў тэрарыстычныя групы, выступаў супраць сумеснай барацьбы

расійскага і польскага пралетарыята. Адзін з заснавальнікаў нацыянальнай рэвалюцыйнай фракцыі ППС (1906). Марыў аднавіць незалежнасць Польшчы, разлічваючы на разгром Расіі ў *вайне першай сусветнай*. Стварыў у Галіцыі арганізацыю "Стралец", камандаваў польскім легіёнам на баку Аўстра-Венгрыі. У 1917 стаў Начальнікам вайсковага дэпартамента ва ўрадзе незалежнай польскай дзяржавы, створанай аўстра-германскімі ўладамі на акупаванай тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай. Пасля канфлікта з імі ў ліпені 1917 аказаўся ў турме, але ў лістападзе быў дастаўлены ў Варшаву для ўдзелу ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам. У 1918–1922 быў Начальнікам Польскай Рэспублікі. У гэты час бываў у Гродне: 1–6.04.1919 пасля таго, як яго занялі польскія войскі, і 4–6.10.1921 падчас адкрыцця помніка абаронцам Гродна ў 1920 г. Кіраваў абаронай Польшчы падчас *вайны савецка-польскай 1920*, з сакавіка камандаваў узброенымі сіламі. 11.02.1923 П. быў у Гродне і ўручыў 76 пяхотнаму палку харугву. У маі 1926 ажыццявіў вайсковы пераварот і ўсталяваў так званы "санацыйны" рэжым. Жорстка праследаваў левую і дэмакратычную апазіцыю. Генеральны інспектар узбраенняў (1926), прэм'ер-міністр і фактычна дыктатар Польшчы (1926–1928, 1930). У 1930 Рада Гродна прасіла маршалка Пілсудскага прыняць званне ганаровага жыхара Гродна. У 1930-х гадах у горадзе была вуліца (былая Сафійская, цяпер Леніна) і *мост* (Стары) яго імя. Апошні раз гараджане сустракалі Пілсудскага ў канцы мая 1935, калі праз горад праязджаў жалобны цягнік, які вёз урну з сэрцам маршалка на знакамітыя віленскія могілкі Роса.

Літ.: Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 87; Grodno. – Grodno, 1936. – S. 64–69; Kałuski M. Sprawy kresowe – bez cenzury. T. 3. – Toruń, Melbourne, 2018. – s. 637; Nałkowska Z. Dzienniki. T. III. 1918–1929. – Warszawa, 1980. – S. 174–175; Plebanowicz J., Prezydenci II Rzeczy Pospolitej w Grodnie [w.] Magazyn Polski, 2018, n 4 (147), s. 16–17.

Піскун Уладзімір Сяргеевіч (1926–?) – заслужаны шафёр БССР (1968), Герой Сацыялістычнай Працы (1971). З 1955 працаваў кіроўцам аўтобуса, брыгадзірам кіроўцаў аўтакалоны № 2408 г. Гродна. Званне Героя дадзенае за паспяховае выкананне планаў па перавозцы пасажыраў. У 1980–85 быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР (1968).

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 218; Книга Героев Гродненской области / сост. Ю.М. Алексей, О.М. Якубович. – Гродно: ГОУПП "Гродн. тип.", 2004. – С. 136.

"Писцовая книга гродненской экономии" с прибавлениями, изданная Виленской Комиссией для разбора древних актов. Часть первая", выдадзеная ў 1881 г. у Вільні, у друкарні Л. Р. Сыркіна. Мае 592 старонкі. На адвароце тытульнай вокладкі напісаны склад віленскай камісіі для разбору старажытных актаў: старшыня Д. Ф. Галавацкі, сябры – К. І. Снытко, С. В. Шалковіч, І. А. Спрогіс. На стар. III – XXIII змешчаная прадмова С. Шалковіча. Частка I

уключае рэестр вымярэння валок, местаў і валасцей гродзенскіх (Бержнікаў, Квасоўкі, Котры, Красніка, Крынак, Лабна, Мастоў, Мількаўшчыны, Новага Двара, Перстуня, Прускі, Скідзеля, Шэмбелеўшчыны, Янаўкі ды інш. двароў і валасцей), налічаных у 1558 г. слугамі яго каралеўскай вялікасці Себасцьянам Дыбоўскім і *Лаўрынам Войнам*.

Планы генеральныя Гродна. Пачалі складацца ў пасляваенны час. Першы план распрацоўваўся з 1946 і быў падпісаны ў 1949 г. Ён прадугледжваў тэрытарыяльные развіццё горада ва ўсходнім, паўночна-заходнім і паўднёвым напрамках. У 1957 у межы горада ўключылі вёску *Пярэселка*, пасёлак *Пышкі* і правабярэжную частку вёскі *Ласосна*. За 1950–60 змяніўся *цэнтр гістарычны* Гродна. Другі П. г. быў зацверджаны ў 1963, трэці – у 1973, чацвёрты – у 1987 (пасля карэкціроўкі зацверджаны 11.04.1988). У 1960-я будаваліся прадпрыемствы горада, якія ўплывалі на яго развіццё: азотнатукавы, гандлёвага машынабудавання, аўтаагрэгатаў, аўтамагнітол, буйнапанэльнага домабудавання, прадзільна-ніткавае аб'яднанне, радыёзавод, новы будынак абутковай фабрыкі "Нёман". Пабудавалі ТЭЦ–2, тралейбусны комплекс, стадыён "Чырвоны сцяг". Усе П. г. базаваліся на тэндэнцыі развіцця мікрараёнаў горада: Прынёманскі, *Фарты, Пярэселка, Вішнявец, Дзевятоўка*, Малахавічы. Ва ўсіх павінны былі быць адміністрацыйныя і грамадска-абслуговыя ўстановы, гандлёвыя комплексы, стаянкі для аўтамашын, спартыўныя пляцоўкі, раённыя паркі.

Літ.: Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада / Пад. Рэд. В. Карнялюка і В. Шведа. – Гародня, Вроцлаў, 2012. – С. 275–277; Саяпин В. Архитектура Гродно: неосуществлённые проекты советского периода / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 5–58.

Планы горада. У XVIII–XIX стст. складаннем і зацвярджэннем планаў, мапаў і чарцяжоў займалася Будаўнічая экспедыцыя *казённай палаты* (з 1832 – Будаўнічая камісія губернскага праўлення, з 1850 – Губернская будаўнічая і дарожная камісія, з 1865 – Будаўнічае аддзяленне губернскага праўлення). Вядомыя наступныя планы:

1. Стакгольмскі план 1655 г.
2. Стакгольмскі план 1706 г.
3. Дрэздэнскі план 1753 г.
4. План 1758 г.
5. План *Гарадніцы* 1780 г., захоўваецца ў аддзеле рукапісаў Бібліятэкі Варшаўскага ўніверсітэта і ў Цэнтральным вайскова-гістарычным архіве (ЦВГА) у Маскве. На ім пазначаныя ўсе асноўныя зоны Гарадніцы: рэпрэзентатыўная (палацы, будынкі для абслугі гасцей, аб'екты культуры), гаспадарчая (на поўначы – склады, вазоўні, стайні, будынак лясной адміністрацыі, кузня, ліцейня, ганчарня і д. п.; на паўночным усходзе – вайсковыя казармы з дапаможнымі будынкамі); вытворчая (на захадзе, уздоўж ракі *Гараднічанкі,* знаходзіліся *бровары*, пральня, бойня, *млын*).

6. План *Юзафа Маркевіча* 1780–83 гг. У легендзе прыводзяцца ўсе вуліцы і плошчы горада, уладальнікі ці карыстальнікі сядзіб. Складальнік карыстаўся вынікамі *валочнай памеры* 1560–1561.
7. План 1793 г. памерам 22х35,5 см. Складзены падчас працы апошняга *сейма Рэчы Паспалітай* у Гродне. Прадстаўленая частка *Гарадніцы* з драўлянымі домам і лядоўняй.
8. Расійскі "План города Гродни 1795 г." (захоўваецца ў ЦВГА). Занатавана звыш 20 назваў вуліц.
9. План 1797 г. "Мапа адмежавання горада Гродна з выганамі ад маёнткаў *Станіславова* і *Аўгустова*, таксама ад грунтоў юрыздычных скарбовых і іншых на аснове указа літоўскай Скарбовай палаты ад 22.08.1797 г…". Аўтар – каморнік Гродзенскага павета Адам Тот. Паказаныя будынкі горада і бліжэйшыя ваколіцы: Аўгустовак, *Панямунь*, *Пышкі*, *Пярэселка*, Станіславова.
10. План 1811–1812 гг.
11. План 1823 г.
12. План 1830 г. Памер аркуша 96,3х50,5. Прадстаўлены пляцы ў Гродне, якія належалі *кляштару брыгітак*. У легендзе падаецца спіс пляцаў, іх плошча і прозвішчы арандатараў.
13. План 1830 г. Прадстаўленая частка Гродна ў раёне вуліцы Траецкай (пляц з яўрэйскай бальніцай): вул. Замкавая, Дамініканская, Могілкаўская, завулак Дамініканскі, старыя яўрэйскія *могілкі*, Казіны рынак, *касцёлы*, сады і агароды.
14. План 1838 г. часткі Гарадніцы ў раёне вул. Раскоша. Паказаны пляц, названы "*дравяны рынак*", які належаў гродзенскім баніфратрам.
15. План 1841 г.
16. План 1851 г. Памеры аркуша 99,1х132 см. Пазначаныя Гродна, дарогі, рака *Нёман* і населеныя пункты, якія ўваходзяць у двухвярстовую мяжу чарачнага водкупу.
17. План 1865 г. Паказаная акружная мяжа Гродна.
18. План 1867 г. горада і бліжэйшага навакольля. Складаецца з 24 частак памерам 13,3х16,8 см, наклееных на тканіну. Знаходзіцца ў цвёрдай вокладцы.
19. План 1882 г. прафіляванага размеркавання Гродна, надрукаваны ў Санкт-Пецярбургу. Памеры аркуша 88,5х71 см. Пералічаныя каменныя дамы, якія існуюць і якія плануецца пабудаваць.
20. План 1892 г. Гродна з назвамі вуліц. Прыводзіцца спіс будынкаў грамадскага прызначэння і ўказаныя некаторыя прыватныя будынкі.
21. План 1895 г., выкананы ў сувязі з будаўніцтвам драўлянага дома жандармскага ўнцер-афіцэра Фамы Кісялёва на *Фарштаце занёманскім* каля крыніцы "Каралеўская студня". Паказаныя планы часткі горада, участка будаўніцтва і дома, фасад дома і разрэз па лініі а-б.
22. План горада 1903 г. Аднакаляровая літаграфія памерам 60,8х80,3 см.
23. План горада, выдадзены ў прамежку 1915–1918 гг. Літаграфія двухкаляровая. Паказаныя вуліцы з назвамі, у паказальніку пазначаныя грамад-

скія і гарадскія будынкі, а таксама нямецкія адміністрацыйныя будынкі на нямецкай мове.

24. Копія мапы Гродна 1797 г., зробленая *Ядкоўскім Ю.* у 1920–30-х гадах.
25. План Гродна 1920–30-х гадоў, выдадзены магчыма ў Варшаве. Памер аркуша 79,7х63 см. Прадстаўлены горад з пазначэннем вуліц, будынкаў, *мастоў*, могілак, а таксама ваколіцы Гродна.
26. План 1924 г. *гары Замкавай* у Гродне. Надрукаваны ў літаграфіі *Мейлаховіча Зундэля*. Памер аркуша 97,5х120,5. Указаныя вуліцы вакол *Замкавай гары* і прозвішчы ўладальнікаў дамоў уздоўж набярэжнай *Нёмана*.
27. План 1925 г. Гродна. Каляровы рукапіс, калька з плана 1895 г. На адваротным баку ёсць надпіс пра продаж дадзенага гарадскога пляца на вечнае ўладанне Гэлене Рэй.
28. План 1928 г. Надрукаваны ў літаграфіі Мейлаховіча Зундэля. Памер аркуша 57,2х43,1 см. Прадстаўлены план горада з назвамі вуліц.
29. План 1929 г. зроблены Ядкоўскім Ю. памерам 40х41 см. Паказаная тэрыторыя *парку гарадскога* паміж *садам батанічным*, гарадскім *тэатрам*, плошчай Незалежнасці, Гарнізоннай царквой, *Швейцарскай далінай* і вул. *Ажэшкі Элізы*.
30. План 1937 г. Чатырохкаляровая літаграфія Э. Ібэрскага, выдадзеная ў гродзенскай друкарні Мейлаховіча З. памерам 61,8х46 см. Чырвоным колерам паказаныя кварталы, забудаваныя мураванымі дамамі, жоўтым – драўляныя дамы ў прыгарадзе, зялёным – Верхняя і Ніжняя *Палесціны*, паркі (напрыклад, *Пышкі*), сады (напрыклад, *Станіславова*) і *могілкі* (хрысціянскія, іўдэяў, лютэран). Храмы горада выдзеленыя адпаведнымі формамі крыжа. Адлюстраваныя *спартовыя таварыствы* (“Крэсовія”), “Лехія”, “Макабі”, “W.K.S.”), самакіраванне яўрэйскага *кагалу*. Прадстаўлены план горада і ваколіц, асобна вынесены план Рыбнага *рынку*, план пасёлка і чыгуначнай станцыі *Ласосна*. З адваротнага боку плана падаецца пералік вуліц, алей і плошчаў, грамадскіх устаноў, фотаздымкі некаторых помнікаў горада (Стары замак, касцёл гарнізонны = Фара Вітаўта, былы касцёл езуіцкі, помнік Э. Ажэшцы ў парку).
31. План 1940 г. выдадзены для вайсковага карыстання ў Берліне. Напэўна за аснову ўзяты план 1937. Друк каляровы, памер 51,4х46,2 см. Прадстаўлены план горада і ваколіц, асобна вынесены план Рыбнага рынку, план пасёлка і чыгуначнай станцыі Ласосна. З адваротнага боку плана падаецца пералік вуліц паводле алфавіта.
32. План Гродна, верагодна 1941 г., скапіяваны з польскай мапы 1920–30-х гадоў. Паказаны горад і ваколіцы.
33. План 1993 г., першы пасля вайны дэталізаваны план для цывільнага карыстання. Зроблены ў 1991 Беларускім картографа-геадэзічным прыдпрыемствам у маштабе 1:18000 пад назваю “Гродна і ваколіцы” (арыгінал на рускай мове). Паказаныя мікрараёны забудоў шматпавярховікаў з пачатку 1970-х, зона адпачынку ад даліны Гараднічанкі уздоўж берагу Нёмана

і праз лесапарк Пышкі. Асобнымі сімваламі паказаныя *могілкі*, турыстычныя помнікі, запраўкі.

У *музеі Гродзенскім гісторыка-археалагічным* захоўваецца найбольш значная і каштоўная картаграфічная калекцыя. Планы і карты ёсць у справах 8 і 11 фондаў Нацыянальнага *гістарычнага архіва* Беларусі ў Гродне.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 68–69, 319–320; Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 55–57; Квитницкая Е.Д. Планировка Гродно в XVI-XVIII вв. // Архитектурное наследство. – М., 1964. – С. 105, 109; Маліноўская Т.Р. Тэндэнцыі развіцця архітэктуры Гродна напрыканцы XVIII ст. // Ігнат Анацэвіч: Жыццёвы шлях, педагагічная і навуковая спадчына. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 114; Мась В. Карты і планы Гродна XVII-XX ст // Гарадзенскі палімпсест. XII-XX стст. Матэрыялы міжн. канф. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Горадня-Беласток: ІГДБ (ЕГУ). – 2008. – С. 191–203; Трусов И., Пышинская Е. Гродненские мосты. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 15.

Платаў Мацвей Іванавіч (17.08.1751, станіца Навачаркаская, цяпер Аксайскі р-н Растоўскай вобл. – 15.01.1818, Навачаркаск) – генерал ад кавалерыі (1809), граф (12.12.1812). З пачаткам *вайны 1812 года* камандаваў Лятучым казачым корпусам, а з 14.06.1812 – усімі казацкімі палкамі 1-й і 2-й Заходняй арміі Расійскай імперыі. З 25.06 П. знаходзіўся ў Гродне, уважліва сачыў за мяжой і займаўся эвакуацыяй харчовых запасаў, медыкаментаў, фінансаў, зброі і амуніцыі, хворых салдат – звыш 1 тыс. фурманак. 27.06 казакі Платава ўдзельнічалі ў перастрэлцы з польскай кавалерыяй і пяхотай на р. *Ласосна*. На высокім правым беразе *Нёмана* П. разгарнуў свае войскі і пачаў абстрэл праціўніка з 12 гармат роты Данской артылерыі. Знішчыўшы мост, пакінуўшы 2 атрады казакаў для кантролю за непрыяцелем, П. увечары 28.06 пакінуў Гродна і пайшоў у Ліду, дзе сабраў усе падначаленыя сабе войскі. Далей вырушыў на злучэнне з 1-й Заходняй арміяй. Удзельнік кампаній 1813–1814 гг. Быў у свіце Аляксандра I падчас паездкі ў Вялікабрытанію, атрымаў дыплом ганаровага доктара Оксфардскага ўніверсітэта.

Літ.: Швед В.В., Данскіх С.У. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады, – Гродна, 2006, с. 64–65, 72–73; Швед В.В. По следам гродненской старины. – Гродно, 1993.

фон Плетц – гродзенскі павятовы камісар у часы нямецка-фашысцкай акупацыі Гродна/*Гартэна* (15.10.1941 – 16.07.1944).

фон Плёцке Генрых – вялікі комтур Тэўтонскага ордэна (1309–1312), кіраўнік войска, якое напала на *Горадню* ў 1311 г. З 22.03.1286 быў у Альтэнбург Хале, з 01.02.1287 – манах, з 28.09.1304 – комтур Бальгі, з 19.05.1307 па 01.05.1309 – ландмайстар у Прусіі. У перыяд 21.09.1309 – 10.09.1312 выконваў абавязкі гроскомтура, а з 26.03.1313 па 27.07.1320 – вялікага маршала. У 1311 сабраў апалчэнне з мэтаю захапіць Гродна. Дапамагчы яму ў гэтым

павінен быў нейкі літоўскі шляхціц у падзяку за вызваленне з палону. Распараджэнні літоўскага князя Вітэнэса сарвалі планы П. і ён быў вымушаны адступіць. У 1314 г. *Давыд Даўмонтавіч* цалкам разбіў Плёцке, які спрабаваў авалодаць Навагрудкам.

Літ.: Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерня / М. Бобровский. Ч. 2 – СПб., 1863. – С. 762.

Плінфа – шырокая, тонкая і плоская абпаленая цэгла, якая трапіла на Беларусь з Візантыі ў X–XI стст. Пазней выраблялася на месцы будаўніцтва і была распаўсюджаная ў XI–XII стст. Гродзенская П. выраблялася ў драўляных формах, таму адзін бок цэглы быў шурпаты ці меў адбітак дошкі. Менавіта на гэты бок клаўся раствор, што забяспечвала лепшае счапленне П. у кладцы. Непатрэбная гліна выдалялася з формы гладкай дошчачкай, таму верхняя пасцель П. часам бывае трохі увагнутай. Сушылі П. перад абпалам пад адкрытым небам, часам на траве. Абпальвалі ў спецыяльных печах, якія будаваліся з сырца ці абпаленай П. напольнымі або ў схіле нейкага ўзвышша (звычайна на беразе ракі). П. шырока прадстаўленая ў пабудовах *гродзенскай школы дойлідства* XII ст.: *цэрквах Барыса і Глеба на Каложы*, у захаваных фрагментах *Прачысценскай* і *Ніжняй* (паводле версіі І. Трусава, Сімяонаўскай), рэштках *княжацкага хорама* (палаца) на *дядзінцы*. Склад плінфы на тэрыторыі вакольнага горада Ваўкавыска ў 1925 г. адкапаў *Ю. Ядкоўскі*. Адна са сцен *замка Старога* XII ст. у Горадне была зробленая з П. Сцены царквы Барыса і Глеба на Каложы складзеныя з П. памерам 3,5–4х16–16,5х26–28 см. Выкарыстаная лякальная цэгла са скругленым вуглом, з паўкруглым шырокім бокам, падобная да трапецыі. На цаглінах выяўленыя рэльефныя, літарныя знакі, арнаментальныя графіці. І. Трусаў лічыць, што частка знакаў – гэта піктаграмы і малюнкі, частка – літары кірыліцы, а большая палова – руны і іх спалучэнні. Гэтымі знакамі вытворцы П., сяляне *Гродзенскага княства*, мецілі сваю прадукцыю – група сваякоў, або ўся вёска. Падобнага погляду прытрымліваюцца В. Галубовіч, Л. Бяляеў, П. Рапапорт – знакі належаць плінфатворцам: залежным (на П. княжацкія знакі), вольным (асабістыя знакі), манастырскім (роўнаканцовы крыж). Кожны знак вызначанага малюнка належаў аднаму фармоўшчыку, які ставіў сваю метку на ўсёй партыі цэглы. П. ваўкавыскага храма (пабудаваны толькі фундамент) была некалькіх тыпаў: прамавугольная памерам 3,5–4,5х14,7–16,5х26–28,5 см, трапецападобная, з круглаватым вуглом, з паўкруглым кароткім канцом, на тарцах П. ёсць рэльефныя знакі.

Літ..: Архітэктура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. / Рэдкал.: А.А. Воінаў і інш.. – Мн.: БелЭн.,1993. – С. 166–168, 170, 179, 549; Трусов О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI – XVII вв.: Архитект.-археологический анализ. – Мн.: Наука и техника, 1988. – С. 28–30, 80–82, 98–99, 109, 113–115; Трусаў А.А. Ваўкавыскі храм // Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл./ Беларус. Энцыкл.: Рэдкал: В.В. Гетаў і інш. – Мн.: БелЭн, 1993. – С. 120; Трусов И.Г. Православные храмы Гродно. Краткий очерк истории / И.Г. Трусов. – Мн.: Мэджик Бук, 2008. – С. 10, 48.

Плошча Савецкая, у часы ВКЛ – *Рынак* (фармуецца з XV ст.), Ратушная (пасля пабудовы ратушы на мяжы XV–XVI ст.); у Рэчы Паспалітай – Гандлёвая; у Расійскай імперыі – Парадная (паводле дакументаў 1848, 1885, 1913, 1915), Бульварная (у крыніцах 1869, 1872), Саборная (згадваецца ў 1871, 1886), Біржавая (1910), Paradeplatz (у перыяд нямецкай акупацыі 1915–1919); у 2-й Рэчы Паспалітай – Пляц Фарны, Стэфана Баторыя (1921–1939), у гады БССР/СССР – Савецкая (15.01.1940 – 1941, 1944–1991), Kirchplatz (у часы нямецка-фашысцкай акупацыі 06.1941 – 07.1944); у Рэспубліцы Беларусь – Савецкая (з 1991). Ад плошчы разыходзяцца галоўныя гарадскія артэрыі: вул. Маставая, якая вядзе ў заходнім кірунку (на мяжу з Польшчай), вул. Савецкая – у паўночным напрамку з выхадам на мяжу з Літвой праз вул. Дзяржынскага і Горкага; вул. К. Маркса – ва ўсходнім напрамку (вядзе да Мінска); вул. Замкавая злучала з *замкамі*. На плошчы знаходзіліся ці знаходзяцца наступныя будынкі і збудаванні: *ратуша*, побач з ёй слуп ганьбы, гарадская *студня*, гандлёвыя рады, насупраць ратушы стаіць *касцёл Францішка Ксаверыя* і былы езуіцкі кляштар, *палацы* Радзівіла і Сангушкі, Палац культуры тэкстыльшчыкаў, *дом купца Мураўёва, аптэка фарная,* Дом настаўніка, "Гандлёвы дом Баторыя", жылы дом з аптэкай, жылы дом з кнігарняй, жылы дом з гастраномам. На плошчы ёсць тры скверы: з паўднёвага боку (з 1950-х гадоў тут штогод праводзіліся выставы кветак, вырашчаных жыхарамі, прадпрыемствамі і арганізацыямі горада; быў фантан), з паўночнага знаходзіцца грамадская прыбіральня. З канца 1950-х гадоў на плошчы вакол ялінкі залівалі каток, на якім днём коўзаліся дзеці, а вечарам – моладзь і дарослыя.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 302–312; Саяпин В. История Гродненских площадей. – Гродна: ЮрСаПринт, 2011.—С. 4–38;

Плямш Адольф О. (1866–1938) – пастар у *кірсе лютэранскай*. Родам з польскіх Інфлянтаў, пераехаў у Гродна ў 1905. Перад *вайной першай сусветнай* большасць лютэран нямецкага паходжання была з Гродна дэпартаваная ў глыб Расіі. Пастар Плямш быў сасланы ў Казань, а пазней – у Вятку і Перм. У канцы вайны, верагодна, вярнуўся ў Гродна і праславіўся як гандляр і "выдавец" паштовых марак. *Яджоўскі Ю.* высветліў, што П. падрабляў рэдкія маркі, надрукоўваючы на іх VP Grodno (Verbindungs Post Grodno). Некаторыя пішуць, што П. мог быць агентам нямецкай выведкі. У міжваенны перыяд П. вярнуўся да абавязкаў пастара.

Літ.: Гринь З.В. Церковная община города Гродно // ДерБоте (СПб.). –1999. – No 1. – С. 39; Швед В.В., Ігнатовіч Ф.І. Гісторыя нямецкай супольнасці і евангелісцка-лютэранскай парафіі ў Гродне (1770 – 2002 г.) // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчнасці, перспектывы развіцця. Ч. 2. – Гродна, 2002, с. 3–8; Parafia ewangelicko-ausburgska w Grodnie i jej duszpasterze. – Б.г. Б.в. – 2 s.

Полк Першы беларускі пяхотны – згодна з успамінамі *А. Успенскага* яго пачалі ствараць у Вільні ў кастрычніку 1918, калі *Лаўрэнцьева М.* прызначылі

камандзірам палка, а самога Успенскага ў лістападзе – камандзірам 1 батальёна беларускага палка. У снежні 1918 *Кандратовіч К.* перавёў фармаванне палка ў Горадню ў сувязі з пачаткам *вайны савецка-польскай*. Пасля афіцыйнага дазволу нямецкіх уладаў (1.02.1919) камендант Гродна *Дзямідаў М.* загадам № 1 распачаў набор добраахвотнікаў. Спецыяльныя вярбовачныя афіцэры раз'ехаліся па розных месцах: Беласток, Брэст, Васілішкі, Ваўкавыск, Друскенікі, Кобрын, Ліда, Пружаны, Радунь, Саколка, Слонім, Шчучын і інш. Паводле Дзямідава полк налічваў у красавіку 1919 г. 1057 чал., з іх 70 афіцэраў. Гісторык Латышонак А. лічыць, што жаўнераў было 800, з якіх 350 уваходзілі ў спецыяльны батальён пры камендатуры. Палкоўнік А. Успенскі ўспамінаў, што П. меў на ўзбраенні 150 стрэльбаў, 20 рэвальвераў і 3 кулямёты. Паводле польскага камісара Іваноўскага С. афіцэры палка амаль усе былі расейцамі (выключэнне складаў 1 паляк). Шмат было расейцаў і ў асяроддзі жаўнераў. Польскамоўныя сяляне былі з ваколіц Горадні, Аўгустава, Сувалак, Ковеншчыны. Была ў палку і яўрэйская рота. Камандзірамі палка былі Лаўрэнцьеў М., Езавітаў К. (з 22.03.1919), палкоўнік Антонаў. Начальнікам штаба быў палкоўнік Шчэрба-Равіч, начальнікам вайсковай падрыхтоўкі – палкоўнік Успенскі А., інтэндатуры – палкоўнік Юшкевіч. Полк удзельнічаў у двух акцыях: супраць захопу бальшавікамі ўлады ў Горадні (у ноч з 11 на 12.03.1919) і арышце К. Цвіркі-Гадыцкага, які ў Варшаве склаў на імя прэм'ер-міністра І. Падарэўскага адозву, у якой ад імя нібыта праведзенага Беларускага краёвага з'езда гаварылася пра неабходнасць уваходжання Беларусі ў Польскую Рэч Паспалітую: кавалерыйскі эскадрон беларускага палка не дазволіў атраду Польскай вайсковай арганізацыі вызваліць арыштаванага (канец сакавіка). Палякі адыграліся пазней – ноччу з 27 на 28.04, напярэдадні адыходу немцаў з горада, штурмавы атрад *Польскай вайсковай арганізацыі* раззброіў эскадрон (на пачатку мая звольненыя вайскоўцы перайшлі да літоўцаў у Друскенікі). 28.04, з прыходам у Горадню польскага рэгулярнага войска, П. перайшоў у падпарадкаванне польскаму камандаванню *крэпасці Гарадзенскай* (у той час ён складаўся з 4 страявых рот, кулямётнай каманды, літоўскай роты з Коўна). 1.06.19 была знятая ахова з палкавой касы, палякі загадалі скласці зброю і паставілі каля яе сваю варту, афіцэры здалі сваю зброю каменданту крэпасці пад распіску, з будынку беларускай камендатуры знялі беларускія і літоўскія штандары (полк быў часткай літоўскай арміі) і шыльду з "Пагоняй". 11.06 П. выстраілі каля казармаў і зрабілі пераклічку, пасля якой жаўнераў-каталікоў адвялі ў польскія казармы, а астатнім выдалі пасведчанне аб дэмабілізацыі.

Літ.: Міхалік Д. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920: Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці. – Смаленск: Інбелькульт, 2015, с. 334; Латышонак А. Жаўнеры БНР. – Менск, 2009, с. 75–83; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў / А. Чарнякевіч. – Мінск: Янушкевіч, 2015, с. 41–58; Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich=Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– S. 189–220.

Польская вайсковая арганізацыя (Polska Organizacja Wojskowa) – адна з частак польскага падполля на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая склалася на загад камандуючага III акругі Войска Польскага, генерала брыгады *Ю. Альшыны-Вільчынскага* адразу пасля яе далучэння да БССР і СССР у 1939 г. і існавала да нямецка-фашысцкай акупацыі ў 1941. Першымі удзельнікамі падполля сталі афіцэры памежнай аховы, сябры так званай "пазафронтавай дыверсіі", гарцэры і чальцы стралецкай арганізацыі. Арганізоўваць падполле ў Гродне быў прызначаны капітан Станіслаў Сядлецкі ("Ганча") з 41 пяхотнага палка, якому дапамагаў падпаручнік рэзерва Аляксандр Палянка ("Олек"). Актыўную ролю адыгрываў ксёндз, пробашч парафіі ў Адамавічах пад Гроднам Станіслаў Бароўчык.

Польская сацыялістычная партыя (Polska Partia Socjalistyczna) у Літве, арганізатарам і лідэрам якой быў *П. І. Шумаў*. Гродзенскі гурток склаўся ў часы Расійскай імперыі (1902). Праграма партыі заклікала да звяржэння царскага самаўладдзя і ўсталявання рэспубліканска-дэмакратычнага ладу, самастойнасці Літвы-Беларусі, якая будзе мець агульны для абодвух народаў сход у Вільні і федэратыўныя адносіны з Расіяй. ПСП у Літве падтрымлівала сувязі з іншымі мясцовымі сацыялістычнымі групамі і праводзіла з імі сумесныя акцыі. Напрыклад, у 1903 зарганізавалі падчас пахавання вядомага ў Гродне ўрача Ю. Банецкага антыўрадавую дэманстрацыю, у сакавіку 1905 – маніфестацыю салідарнасці з палітвязнямі каля гродзенскай турмы, у перыяд *рэвалюцыі 1905–07* кіравалі мітынгамі, дэманстрацыямі, забастоўкамі, маніфестацыямі. Да 1905 у Гродне знаходзіўся Акруговы камітэт (пазней Літоўскі рабочы камітэт) ПСП у Літве. У чэрвені 1906 партыя разарвала сувязі з ПСП, стала называцца Сацыял-дэмакратычнай партыяй у Літве і вяла перамовы ў канцы 1906–1907 з РСДРП аб аб'яднанні. Да ПСП у Літве, напрыклад, належаў *Ядкоўскі Ю.* На пачатку міжваеннага часу кіравалі ёй выкладчык Савіцкі Р., адвакат Гарбачэўскі, сакратар *магістрата* Мазуркевіч Л. Інспектар-інструктар Стражы Крэсовай *Стэфан Мыдляж* у рапарце ад 3.10.1919 ахарактарызаваў сябраў ПСП як людзей, якія не маюць "краёвых" поглядаў.

Літ.: Біч М. Гродзенская арганізацыя Польскай сацыялістычнай партыі ў Літве // ЭГБ. Т. 3, Мн., 1996, с. 123–124; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005), Гродна, 2020; O niepodległą i granice. T.7. Raporty Straży Kresowej 1919–1920 Ziem Północno-Wschodnich opisane /Wstęp, wybór i opracowanie J. Gierowska-Kałłaur. – Warszawa, Pułtusk, 2001, s. 252.

"Помера волокъ городенскихъ", зробленая ў 1560–61 г. С. *Дыбоўскім і Л. Войнам*. Вымярэнні паказалі правабярэжнае і левабярэжнае Гродна. Тут былі замак і каралеўскі дом, 3 рынкі ("старадаўні", Нямецкі і занёманскі), 32 вуліцы, 5 дарог у межах горада, названых вуліцамі. Плошча *Рынку* складала 2,19 моргаў (каля 1,5 га). Кожная частка плошчы была падзеленая на 6 пляцаў. З Рынку выходзілі 4 галоўныя гарадскія камунікацыйныя вуліцы: з паўднёвага боку "вуліца з Рынку на *Падол*" і "вуліца вялікая да

моста на Падоле"; з паўночнага ішлі вуліцы Віленская і Калюцінская; з усходняга выходзіла вул. Язерская/Азёрская; з заходняга – вул. Замкавая, якая звязвала Рынак з замкам Старым. *Рынак Занёманскі* меў 2 моргі і быў запраектаваны свядома. У горадзе былі 9 праваслаўных *цэркваў*, 2 *касцёлы, сінагога*, *ратуша*, *звярынец*, 716 пляцаў. Згадваюцца рэкі *Нёман* (Niemen) і *Гарадніца* (Horodnica). Іншаземцы тады лічылі Гродна другім пасля Вільні горадам у Літве.

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 50–52; Писцовая книга Гродненской экономии. Т. 2, Вильно, 1882; Gordziejew J. Socjotopografia Grodna w XVIII wieku. – Toruń, 2009; Kutrzeba S. Historia ustroju Polski w zarysie. Cz 2, t. 2. Litwa. – Lwów, 1914. – S. 88–95.

Помнік Ажэшцы Э. У 1823 г. быў створаны камітэт будаўніцтва помніка *Ажэшцы Э.* у Гродне. Аб'яўлены конкурс на скульптуру пісьменніцы выйграў Рамуальд Зерых. У сакавіку 1827 г. з ім заключылі дамову на выкананне бюста. Другім скульптарам быў В. Куявінскі. Праект помніка ажыццяўляўся на сродкі касы мясцовага кіравання Гродна (15 тыс. злотых), павятовага сейміка (2 тыс.), камунальнай касы (2 тыс.), збору варшавян (6,2 тыс.) і іншых збораў (9,8 тыс.). Урачыстае адкрыццё помніка адбылося 20.10.1929 у межах святкавання 10-й гадавіны вяртання незалежнасці Польшчы. Спачатку помнік стаяў у гарадскім парку, недалёка ад будынка *школы медычнай*. У гады *вайны Вялікай Айчынай* яго хавалі на *могілках каталіцкіх*. У 1949 П. А. перанеслі на бераг *Гараднічанкі,* на вул. Ажэшкі, дзе ён знаходзіцца і сёння.

С. 885

Літ.: Саяпин В. Пешком по Ожешко и Советской/ Виктор Саяпин. – Гродно: ООО "ЮрСаПринт" 2011. – С. 40–41; Musijenko S., historia pewnego pomnika [w:] Magazyn Polski, 2010, n 1–2 (41–42), s. 43–44; St. Poczobut-Odlanicki, Szlakiem Elizy Orzeszkowej i jej bohaterów wiek późnej z historycznym opisaniem świątyń i osad po drodze objazdu, Białystok 2007, s. 32–33.

Помнік вайскоўцам-афганцам, знаходзіцца ў парку на рагу вул. Горкага і Курчатава. Адкрыты ў памяць пра жаўнераў-гродзенцаў, забітых падчас ваенных дзеянняў на тэрыторыі Афганістана ў 1980-х гг. Помнік ствараюць два бронзавыя жаўнеры, якія стаяць на гранітным пастаменце перад вялікім расколатым каменем. У правым баку ад дадзенай кампазіцыі знаходзяцца бронзавыя пліты, на якіх выгравіраваныя імёны забітых жаўнераў.

Крыніцы: https://www.komandirovka.ru/sights/grodno/pamyatnik-voinam-afgantsam/. Доступ 04.01.2021; https://present5.com/memorialnye-pamyatniki-grodnenskoj-oblasti-pogranzastava-lejtenanta-v/ Доступ 04.01.2021

Помнік Давыду Гарадзенскаму, размешчаны на скрыжаванні вуліц Замкавай і Давыда Гарадзенскага, паблізу *замкаў Новага і Старога*. Фундатарам помніка стаў заснавальнік мінскай фірмы "Хорс-Мотарс" А. А. Карабач. Яго падтрымала Гродзенская праваслаўная епархія. Праект скульптара Сяргея

Аганава выйграў сярод 13 іншых. Конная скульптура была зробленая са светлашэрага башкірскага граніту за 3,5 месяцы. Помнік складаецца з дзвюх частак: пастамента і самой скульптуры (вага 16 тон, вышыня 3,7 м). *Давыд Гарадзенскі* сядзіць на кані, целам і тварам павернуты ў правы бок. У левай руцэ ён трымае крыж Еўфрасінні Полацкай, які прыціскае да сэрца, а ў правай – меч. Унізе адлюстраваны *замак Стары*, на адваротным баку бачым шчыт наверсе і *царкву Барыса і Глеба на Каложы*. На пастаменце ёсць надпіс: "Славутаму продку, сыну Св. Цімафея (Даўмонта) і Прп. Марфы, мужнаму абаронцу Айчыны са шчырай удзячнасцю ад нашчадкаў і мецэната Карабача Анатоля Анатольевіча". Помнік быў урачыста адкрыты 1.06.2018 у прысутнасці ўладаў горада і міністра культуры Беларусі Ю. Бондара.

Крыніцы: https://www.svaboda.org/a/28901311.html. Доступ 04.01.2021; https://nn.by/?c=ar&i=210554. Доступ 04.01.2021; https://www.svaboda.org/a/29247590.html. Доступ 04.01.2021.

Помнік Янку Купалу, стаіць з 1965 на вул. *Ажэшкі*, перад *універсітэтам дзяржаўным Гродзенскім,* з нагоды прысваення былому тады інстытуту імя беларускага класіка. Аўтар помніка, скульптар Заір Азгур зрабіў бронзавы скульптурны партрэт (1,2 м), які быў пастаўлены на кансоль, прымацаваную на бетоннай стэле (агульная вышыня помніка больш за 5 м). На апошняй змешчаная металічная пласціна, на якой выбітыя радкі з купалаўскага верша "Наша моладзь".

Літ.: Саяпин В. Гродненские памятники и скульптуры / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014; Ярмоленка Г.М. Помнік Купалу Янку // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэд. кал.: С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1986.

Помнікі Леніну У. І. 1) Першы паўстаў паводле рашэння выканкама ад 12.02.1948. У маі 1949 серыйную гіпсавую скульптуру ўсталявалі на краі плошчы яго імя. Гэта месца насупраць сённяшняга вечнага агня ў кірунку плошчы *Тызенгаўза А*. У той час пачала існаванне традыцыя ўскладання кветак маладажонамі каля помніка. 2) 21.01.1950 *"Гродненская правда"* апублікавала фотаздымак новага помніка, таксама серыйнай гіпсавай штампоўкі. На высокім пастаменце, абліцаваным чорным мармурам, стаяла скульптура Леніна. Ад *гарадскога парку* яе аддзяліла бетонная балюстрада, вакол паклалі тратуарную плітку, пасадзілі блакітныя елкі і туі. 3) Невялікая гіпсавая скульптура Леніна знаходзілася на вул. Гарнавых, каля школы № 9 (рашэнне гарвыканкама ад 18.11.1950). Пасля пераносу школы помнік некуды знік. 4) Гіпсавая скульптура Леніна, зробленая самадзейным майстрам А. Ліпенем, стаяла перад будынкам першай у Гродне *электрастанцыі*. Нядаўна яе знеслі, а безгаспадарскі помнік праз нейкі час знік. 5) З 1987 перад будынкам Гродзенскага гарадскога *камітэта* і Ленінскага райкама КПБ пастаўлены існы сёння помнік (скульптар З. Азгур, архіт. В. Асадаў). Бронзавая фігура (5 м) пастаўленая на гранітны пастамент (5,5 м).

Літ.: Саяпін В. Гродненские памятники и скульптуры. – Гродно: ЮрСаПрынт, 2014, с. 9–11.

Помнік савецкім жаўнерам, партызанам і падпольшчыкам, адкрыты 1.05.1945 у гарадскім парку (цяпер імя *Жылібера Ж.-Э.*) на месцы *брацкай магілы.* Пад помнікам, у мурах былога *палаца Тызенгаўза А.*, пахаваныя 2 героі Савецкага Саюза – *Іўліеў Ю.* і *Санфірава В.*, а таксама партызанка *Соламава В.* Помнік складаецца з гранітнага пастамента, на якім выбітыя залатымі літарамі прозвішчы пахаваных. На ім стаіць скульптура маладога вайскоўца ў жалобным выглядзе і са схіленым баявым Чырвоным Сцягам. Пастамент завершаны высокім чатырохгранным абеліскам. П. двойчы пражыў рэканструкцыю – у 1984, калі побач запалілі Вечны агонь, і ў 2005, калі скульптуру вайскоўца (гіпс пакрылі меддзю) паставілі на абеліск, які атрымаў залатую зорку. Помнік апранулі ў мармур і граніт.

Крыніцы: http://tourgrodno.by/information/monuments/monuments/bratskaja-mogila.html. Доступ 05.01.2021; https://marshryt.by/object/bratskaya-mogila-sovetskih-voinov-i-partizan-v-grodno/. Доступ 05.01.2021.

Помнік "Танк Т–34" у гонар вайскоўцаў-вызваліцеляў, усталяваны ў 1968 г. (архітэктар Г. Федасеенка). На франтальнай частцы пастамента знаходзіцца надпіс па-беларуску: "Доблесным савецкім воінам другога і трэцяга Беларускіх франтоў, вызваліўшых Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 16.VII.1944 года". Указаная дата не зусім дакладная, бо горад канчаткова быў вызвалены 24 ліпеня, пасля баёў у занёманскай частцы горада. У 2019 рабілі ўпарадкаванне помніка і ўнутры танка знайшлі запіску з наступным тэкстам: "Этот танк восстановил сын узбекского народа Эшбоев Чори. в/ч 12324. 4.11.1967 года". У канцы стаяў подпіс, што дазволіла знайсці гэтую асобу – Чары Эшбоеў нарадзіўся 1.09.1946 у Сарыясінскім раёне Сурхандар'інскай вобл. Узбекістана. У 1967–68 гг. служыў у рамонтнай роце.

Літ.: Госцеў А.П., Швед В.В. Кронан. Летапіс города на Нёмане (1116–1990 гг.). – Гродна: НВК "Пергамент", 1993. – С. 94; Гродно. Энцикл. справ. / Белорус. Сов. Энцикл.; Редкол. И.П. Шамякин (гл. ред.) и др. – Мн.: БелСЭ, 1989. – С. 308.

Помнік Тызенгаўзу А., пастаўлены ў *касцёле святога Францішка Ксаверыя* чалавеку, дзякуючы якому тэрыторыя Гродна выйшла за межы *ракі Гарадніцы* (Гараднічанкі) і паглынула аднайменную *вёску Гарадніцу*. Дзякуючы знойдзенаму ў Нацыянальным гістарычным архіве Гродна прашэнню графа Канстанціна Аляксандравіча Пшэздзецкага ад 18.03.1893, вядома, што задума паставіць помнік належала камер-юнкеру двара яго імператарскай высокасці, графу Канстанціну Тызенгаўзу. Выканаць яе ён не паспеў, бо ў 1852 г. памёр. Духоўным тастаментам абавязак пабудовы помніка быў ускладзены на ўнука *А. Тызенгаўза,* Райнольда. Але і гэты нашчадак, відаць, нічога не зрабіў. За справу ўзялася ягоная сястра Марыя Пшэздзецкая, народжаная Тызенгаўз. Яна замовіла помнік у львоўскага скульптара Тамаша Дукаса, але ў 1886

памерла. Яе сын Канстанцін паслаў прашэнне да *губернатара гродзенскага* аб дазволе паставіць зроблены свайму прадзеду помнік у касцёле святога Францішка Ксаверыя. Губернатар, даведаўшыся ад паліцмайстра, што "няма падставаў лічыць, што гэты помнік будуецца ў памяць падзей 1863 і 1864 гадоў", адказаў варшаўскаму паліцмайстру: "З майго боку перашкодаў не сустракаецца". Адказ губернатара быў даведзены да К. Тызенгаўза, аб чым сведчыць ягоная распіска ад 27 красавіка 1893 г. Але спатрэбілася паменшыць алтар часоўні св. Міхаіла, дзе вырашылі паставіць помнік. Граф піша наступнае прашэнне ад 13.10.1894. Віленская духоўная кансісторыя дае згоду. Здаецца, што ўжо нічога не стрымлівае, тым не менш у 1896 гродзенскі паліцмайстар даносіў губернатару, што помнік яшчэ не пастаўлены. Гродзенскі гісторык Ю. Гардзееў лічыць, што ён быў усталяваны недзе ў 1896–1900 гг.

Літ.: Гардзееў Ю. Да гісторыі помніка Антонію Тызенгаўзу ў Гродзенскім Фарным (паезуіцкім) касцёле / Ю. Гардзееў // Гарадзенскія запісы: старонкі гісторыі і культуры. – Гародня: ГрДУ, 1993. – Вып. 1. – С. 21–23; Гардзееў, Ю. Рамантык эпохі Асветніцтва: Антоні Тызенгаўз / Ю. Гардзееў. – Мінск, 2008; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна, 1997; Швед В.В. Антоні Тызенгаўз і сучасны Гродна // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 211–217.

Помнік у гонар 850-годдзя Гродна, усталяваны ў 1978 г. на тэрыторыі *парку Калажанскага* (інш. назва: імя 40-годдзя ЛКСМБ). Аб'ектыўна помнік трэба было бы паставіць на год раней, бо першы ўспамін пра *Горадню/Горадзен* быў у летапісах пад 1127. Аўтарамі помніка былі скульптар Г. Буралкін, архітэктары *А. Каралькоў* і Р. Пешкаў, інжынер А. Навумовіч. Помнік складаецца з 2 бетонных стэл вышынёй 31 м, якія ў верхняй частцы злучаныя сімвалічным шкляным гербам з літарамі "850" на чырвона-зялёным фоне. Ля асновы стэл стаяць 2 алегарычныя фігуры: вайсковец у латах ("Мужнасць") і жанчына з вышытым ручніком у руках ("Гасціннасць"). Да помніка ідзе алея, на пачатку якой ляжыць камень з надпісам "Аллея 850-летия".


Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 308.

Порт рачны, узнік на базе *прыстані* на левым беразе Нёмана ў 1975 г. Асноўная дзейнасць П. р. у канцы 1980-х – перавозка мінеральна-будаўнічых грузаў (пяску і пясчана-гравійнага матэрыяла) прадпрыемствам, якія знаходзяцца ў прырэчных раёнах, будаўніцтва і рамонт суднаў, перасовачнай пагрузачна-разгрузачнай тэхнікі. Перавозка грузаў ажыццяўлялася баржамі, якія буксіравалі цеплаходы ў перыяд прыкладна з 1.04 па 15.11. Пасажырскія перавозкі звычайна насілі прагулачны ці экскурсійны характар.

Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 345.

С. 886

Пошта гродзенская мае свае карані ў Вялікім Княстве Літоўскім. У 1764 г. *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* правёў паштовую рэформу, якая ўпарадкавала і ўдасканаліла каралеўскую пошту: цэнтрам літоўскай пошты стала Вільня,



С. 887

якая паштовымі трактамі была звязаная з гарадамі і мястэчкамі краіны. Галоўнай паштовай дырэкцыі ў Вільні былі падпарадкаваныя паштмайстры, якія узначальвалі паштовыя установы ў асобных мясцовасцях і кіравалі наступнымі паштовымі супрацоўнікамі: афіцыяламі (прыказчыкамі), атэндэнтамі (мытнікамі), карэспандэнтамі і ўпаўнаважанымі. На ніжэйшай ступені знаходзіліся паштовыя служачыя, паштальёны, кур'еры (пасыльныя), табелярыюсы, фурманы і інш. Як правіла, паштальёны былі з былых адстаўных салдат, якія праслужылі 25 гадоў, а іх дзеці па сутнасці былі прыгоннымі паштовага ведамства і з 17 гадоў пачыналі службу на працягу 25 гадоў. Урадавая карэспандэнцыя перасылалася бясплатна, прыватная – згодна з тарыфам у залежнасці ад вагі і месца прызначэння. Напрыклад, за перасылку закрытага ліста ўнутры краіны бралі 12 грошаў, а за адпраўку пяціфунтавай пасылкі ў Францыю трэба было заплаціць 237 злотых. Лісты звычайна перасылаліся поштай адзін раз на тыдзень, рэдка па некаторых трактах – 2 разы. Таямніца карэспандэнцыі магла быць парушаная толькі па прычыне захавання грамадскай бяспекі.

У Гродне быў свой паштмайстар. Вядома, што сакратар гродзенскай пошты *Сабалеўскі В.* стаў у 1776 г. ініцыятарам друкавання на польскай мове *"Газеты Гродзенскай"*. Пасля другога падзелу Рэчы Паспалітай паштовую сувязь у незахопленай яшчэ частцы ВКЛ 1794–95 гг. наладжваў *М. Рапнін*. Раней Літва была падзеленая на тры акругі, адміністрацыя якіх знаходзілася ў Вільні, Гродне і Коўне. Рапнін загадаў аднавіць ранейшыя і працягнуць новыя паштовыя дарогі, указаў, дзе зрабіць станцыі і колькі коней яны павінныя мець, якія пабудаваць паштовыя дамы (вялікія, малыя і паштовыя корчмы), вылічыў патрэбны бюджэт. Смерць Кацярыны II затрымала змены, але яны адбыліся: дарогі былі пракладзеныя, на станцыях з'явіліся коні абываценяў, у Гродне адкрытая памежная паштовая кантора. Паводле ўказу ад 29.10.1796 засноўваліся пошты Слонімскай губ., куды ўваходзіла Гродна. Указам ад 27.01.1800 Літоўская губ. увайшла ў тэрыторыю Літоўскага паштамта (Вільня). З утварэннем Гродзенскай губ. паштовая сувязь усё болей уніфікавалася з агульнарасійскай. У сказцы пачатку XIX ст. можна знайсці прозвішчы гродзенскіх паштальёнаў каталікоў Яна Чыгірына, Вінцэнта Серпутоўскага. У 1820 у губерні выслалі ўзорныя планы станцыйных дамоў трох разрадаў адпаведна падзелу дарог на галоўныя, сярэднія і малыя. Ад гэтага залежала колькасць коней на паштовых станцыях: 1 разраду – звыш 50, 2 разраду – звыш 25, 3 разраду – не менш за 15.

1.04.1866 была створаная Гродзенская паштова-тэлеграфная акруга (адзін з першых кіраўнікоў – Я. Памеранскі, 1868–77). З гарадской пошты ў 1877 г. можна было адправіць наступную карэспандэнцыю: закрытыя лісты вагою не больш за 1 фунт – простыя і заказныя; простыя закрытыя лісты і простыя бандэрольныя адпраўленні з друкаванымі матэрыяламі. З гэтага году да 1885 кіраўніком губернскай паштовай канторы быў стацкі дарадца Аляксандр Яфімавіч Андрыеўскі. Паводле палажэння Дзяржаўнага савета ад 28.05.1885

была створаная паштова-тэлеграфная кантора, якая дзейнічала да 1918 (падчас *вайны Першай сусветнай* была эвакуяваная). У штаце былі начальнік (першым з 1886 лічыцца фон Зэнібут), яго памочнік і служачыя (сартавальнікі карэспандэнцыі, паштальёны, тэлеграфісты). Падпарадкоўваліся упраўленням паштова-тэлеграфных акруг, а самі з'яўляліся кіраўніцтвам для паштова-тэлеграфных і паштовых аддзяленняў уездаў. Ажыццяўлялі прыём, перасылку і дастаўку адрасатам паштовай і тэлеграфнай карэспандэнцыі. Статыстычныя дадзеныя за 1905 гавораць, што Гродзенская паштова-тэлеграфная кантора мела наступныя паштовыя тракты: Азёрскі, Гродзенскі вайсковы лагер (з 1.05 па 1.10), Аранскі, Віленскі, Варшаўскі, Індурскі, Луненскі, Скідзельскі, Сувалкаўскі. У 1910 не было Луненскага і Скідзельскага, але дадаўся Мастоўскі тракт. Будынак канторы з 1868 знаходзіўся ў арандаваным будынку, які належаў *Фрумкіну*. Новы будынак быў пабудаваны да *вайны першай сусветнай*, але пераехалі туды толькі пасля яе заканчэння. Вуліца, на якой ён стаяў, стала называцца Тэлеграфнай.

У канцы 1980-х сетка прадпрыемстваў паштовай сувязі Гродна складалася з паштамта, у якім было 26 гарадскіх і 47 сельскіх (Гродзенскі р-н) аддзяленняў сувязі, участкі лінейны, сарціроўкі пісьмовай карэспандэнцыі і перыядычнага друку, па апрацоўцы і абмене страхавой пошты. 4 аўтамашыны ў горадзе два разы на дзень дастаўлялі пошту на 121 даставачны ўчастак, дзе працавала 150 паштальёнаў. Пошта ў Гродне ажыццяўляла прыём, выдачу і перасылку паштовых адпраўленняў: пісьмовай карэспандэнцыі, тэлеграмаў, бандэроляў, пасылак, грашовых пераводаў, абанементнай аплаты за перамовы. На пошце можна было пакарыстацца міжнароднай тэлефоннай і тэлеграфнай сувяззю, паслугай упакоўкі паштовых адпраўленняў, набыць канверты і паштоўкі. Паштальёны дастаўлялі на дом перыядычныя выданні, карэспандэнцыю, пенсіі, грашовыя пераводы.

Крын. і літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 330; НГАБ в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 207; Памятная кніжка Гродзенскай губ. на 1885 год. – Гродна, 1884. – С. 19, 20; Де Пуле. М. Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794–1797 годах. Изд. 2-е. – СпБ., 1871. – С. 154–154–157; Рутковский Я. Экономическая история Польши, М., 1953, с. 349.

"Праведнік народаў свету" – ганаровае званне і ўзнагарода, што надаваліся арганізацыяй "Яд-Вашэм" тым асобам, якія падчас *вайны Другой сусветнай* выратоўвалі яўрэяў. На лецішчы ў *Ласосне* сям'я Яна і Ганны Пухальскіх хавала да вызвалення пяцёх чалавек на працягу 17 месяцаў. У гэтай жа вёсцы хавалі яўрэяў Ян і Кацярына Карэйвы, у Гродне – сям'я Аляксандры, Надзеі Навумюкоў і Алега Фралова. Т. Сарока дапамог 9 яўрэям з'ехаць цягніком у Вільню. Лекар Доха схаваў сям'ю свайго калегі Х. Блюмштайна (больш за 10 чал.). Звычайна хавалі яўрэяў іх сябры, знаёмыя, пацыенты, кліенты з даваеннага часу, якія ішлі на вялікую рызыку для свайго жыцця.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт,

2021. – С. 244, 245; Сабалеўская В., Жыццё і смерць гарадзенскага гета // Гародня X-XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2014, с. 407–408.

Прадвадзіцель дваранства павятовы – былы *маршалак павятовы*. У спісе расійскага перыяду знаходзім: калежскага дарадцу Людвіка Панцажынскага (1798–1809), князя, сапраўднага стацкага дарадцу Ксаверыя Друцкага-Любецкага (1809–1815), Станіслава Гоўвальда (1815–1818), князя Канстанціна Святаполка-Чацвярцінскага (1821–1825), Караля Бажэнцкага (1825–1837), графа Францішка Пуслоўскага (1837–1848), паручніка гвардыі *Рамана А. Ляхніцкага* (1848–1862), Аляксандра *Друцкага-Любецкага* (1862–1864), генерал-маёра Антона Левандоўскага (1866–1874), стацкага дарадцу і камер-юнкера Аляксандра Жаўтухіна (1874–1877), надворнага дарадцу *Уладзіміра Вірыёна* (1878–1883), сапраўднага стацкага дарадцу Густава-Эміля Вестберга (1883–1885), генерал-маёра Аляксандра Русаў (1885–1897), генерал-лейтэнанта Юрыя Елчанінава (1897–1898), калежскага сакратара Мікалая Кошалева (1898–1901), калежскага дарадцу і камер-юнкера Аляксея Азнабішына (1901–1905), надворнага дарадцу і шамбяляна Мікалая Невяровіча (1905–1906), калежскага сакратара Аляксандра Ушакова (1906–1915). У гады 1818–1821, 1864–1866, 1877–1878 была вакансія.

Літ.: L. Szczuka, Marszałkowie szlachty gubernji grodzieńskiej // Ateneum Wileńskie. – 1924. – R. II. – Z. 7–8. – S. 424–425; тое ж у Герольд. – 2001. – № 3–4. – С. 110.

Прайсіг Ёган Якуб – цясляр швейцарскага паходжання. У крыніцах называюць яго "обермайстрам цяслярскага мастацтва", "гарадзенскім баўмайстрам". На Гарадзеншчыне з'явіўся ў 1770-х гадах. На загад адміністрацыі *эканоміі Гродзенскай* будаваў млыны і тартакі. Напрыклад, у 1777 будаваў на *Гарадніцы млыны* і займаўся вынаходніцтвам машын для адбельвання тканінаў. У 1780-х на вул. Маставой пабудаваў "камяніцу з прускага муру", у 1789 побач з *ратушай* на *Рынку* збудаваў *калодзеж*.

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 362–363.

Праўленне Вярхоўнае Літоўскае, утворанае паводле ўказа Кацярыны II ад 10.11.1794. Урачыста адкрытае ў Гродне 10.07.1795, у гадавіну ўваходжання на прастол Кацярыны II., а закрытае 23.11.1796 (эканамічны дэпартамент існаваў да 1.12.1796). Фактычна Гродна стала сталіцай ВКЛ у перыяд паміж другім і трэцім *падзелам ВКЛ*. У *палацы Тызенгаўза А*. знаходзілася рэзідэнцыя галавы В. Л. П. і Эстляндскага, Курляндскага і Віленскага генерал-губернатара *М. Рапніна* (прызначаны 12.11.1794). В. Л. П. складалася з 4 аддзяленняў/дэпартаментаў: Казённага/Скарбавага (начальнік – палкоўнік Іван Фрызель), Эканамічнага ці дамаводства (прэм'ер-маёр П. Літке), Крымінальнага (брыгадзір Іван Русанаў), Грамадзянскага (надворны дарадца Мікалай Волкаў). Скарбовы займаўся даходамі, якія збіраліся ў часы Рэчы Паспалітай

у скарб дзяржавы і караля: з маёмасці гэтых аб'ектаў падаткаў і з маёнткаў прыватных уладальнікаў, асоб духоўных, кляштараў, паўстанцаў і іншых, хто плаціў скарбу і каралю. Эканамічны дэпартамент апекаваўся падаткамі, якія паступалі ў скарб дзяржавы з зямель паўстанцаў-эмігрантаў, з прадпрыемстваў, асоб, якія не прынеслі прысягу імператару Расійскай імперыі. Паседжанні дэпартамента адбываліся ў памяшканні *кляштара езуіцкага*. Крымінальны і Грамадзянскі дэпартаменты займаліся справаводствам на аснове Статута ВКЛ 1588 г.: былі пакінутыя ўсе раней існыя суды: войтаўска-лаўнічы, бурмістраўскі, гродскі, земскі, падкаморскі. Праз дэпартаменты апеляцыі падаваліся ў расійскі Сенат у Пецярбургу. Улада В. Л. П. распаўсюджвалася на тэрыторыю ВКЛ, якая яшчэ не была занятая расейцамі: Гродзенская, Віленская і Ковенская часткі. У іх адпаведна кіравалі: генерал *П. Цыцыянаў*, затым *М. Панін*; генерал-маёр В. Кнорынг; князь С. Галіцын, затым *Тармасаў* і генерал-маёр А. Абрэзкаў.

Літ.: Куль-Сяльверстава С. Ад каралеўскага горада да губернскага цэнтра : Гродна на мяжы XVIII – XIX стст. / С.Я. Куль-Сяльверстава // Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў. – Гродна, 2011. – С. 81–82; Милютин Д. М. Гродна в 1794, 1795, 1796 годах / Д.М. Милютин. – Гродна, 1905. – С. 6–8; Рубинштейн С.Ф. Хронологический указатель указов и правительственных распоряжений по губерниям Западной России, Белоруссии и Малороссии. Вильно, 1894. – С. 159–164; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997. – С. 104–105, 107; Żytkowicz L. Rządy Repnina na Litwie w latach 1794–1797. – Wilno, 1938. – S. 85–114.

Праўленне губернскае гродзенскае, створанае 1.01.1802 з усталяваннем Літоўска-Гродзенскай губерні. Падпарадкоўвалася Сенату, знаходзілася ў ведамстве Міністэрства ўнутраных спраў. На чале праўлення быў *губернатар*, якому дапамагалі два дарадцы. У склад канцылярыі ўваходзілі экзекутар, пратакаліст, ягоны памочнік, 2 перакладчыкі, архіварыус і пісар. У функцыі праўлення ўваходзіла адміністратыўнае кіраванне губерняй: пытанні гаспадарчыя, фінансавыя, землеўпарадкаванне, адукацыя, ахова здароўя, канфесійныя і д. п. Гродна, як губернскі цэнтр, таксама трапляў пад кіраванне праўлення. Таму ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў Гродне захавалася шмат спраў па горадзе ў межах вышэй названых пытанняў: у фондзе 2 – аб будаўніцтве і ўтрыманні розных будынкаў, стварэнні *таварыстваў*, дзейнасці *кірмашоў*, *планы горада*, аб развіцці прамысловасці і д. п.; у ф. 8 – справы будаўнічага аддзялення Гродзенскага губернскага праўлення: каштарысы, планы, праекты будынкаў, дакументы аб кантролі за будаўніцтвам, аб таргах на падрады будаўнічых спраў, аб рамонце помнікаў старажытнасці і д. п.; у ф. 9 знаходзяцца справы ўрачэбнага аддзялення П. – аб адкрыцці *аптэк,* гарадского *шпіталя*, аб стане медыцынскіх устаноў і апецы здароўя, статыстычныя звесткі і д. п.

Літ.: Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 27–29, 212–214, 238–239.

Прусы, у Гродне пасяліліся дзякуючы вялікаму князю літоўскаму Тройдзеню ў 1276 г., які прыняў іх пад сваю абарону ад *крыжакоў*: "Посемъ же придоша пруси к Тройденеви из своей земле неволею предъ немьцами. Он же прими къ собе и посади часть их в Городне, а часть ихъ посади оу Слоним". Прусы абаранялі Гродна ад нападаў Галіцка-Валынскага княства. З прусаў паходзіў вядомы гродзенскі ўрач *Тальгейм А. К.*

Літ-ра: Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym. Wyd. Drugie. T. IV. – Warszawa, 1886. – S. 292; Кибинь А.С. От Ятвязи до Литвы. Русское пограничье с ятвягами и литвой в X-XIII веках. – М.: Квадрига, 2014.

Прывілеі гарадскія – заканадаўчыя акты, нададзеныя вялікім князем літоўскім або вялікім князем літоўскім і каралём польскім, якія давалі ці пацвярджалі асаблівыя правы гараджан. Аўтэнтычныя гарадзенскія прывілеі захоўваюцца ў фондах архіва Інстытута гісторыі Акадэміі навук Расіі ў Санкт-Пецярбургу і рукапіснага аддзела Бібліятэкі імя Урублеўскіх Акадэміі навук Літвы (вывезеныя туды пасля далучэння Гродна да Расійскай імперыі). Там знаходзіцца 26 прывілеяў:

1. Даравальная грамата караля Аляксандра жыхарам Гродна на магдэбургскае права 1496 г.
2. Прывілей караля Аляксандра гродзенскім мяшчанам на купленыя землі пры жыцці яго бацькі Казіміра 16.07.1502
3. Прывілей караля Аляксандра гродзенскаму старосце Забярэзінскаму 11.05.1506 г.
4. Прывілей караля Жыгімонта I жыхарам Гродна, які пацвярджае прывілей в. к. л. і польскага караля Аляксандра 4.12.1506.
5. Прывілей каралевы Боны гарадзенскім мяшчанам, які пацвярджае былыя прывілеі і пазбаўляе іх ад кірмашовай пошліны 21.07.1540.
6. Пацвярджальны прывілей караля Жыгімонта I на прывілеі караля Аляксандра і каралевы Боны 07.1540.
7. Рашэнне караля Жыгімонта I па спрэчнай справе гарадзенскіх мяшчан 25.02.1516 г.
8. Прывілей караля Жыгімонта I мяшчанам Гродна 26.02.1531.
9. Прывілей караля Жыгімонта I мяшчанам Гродна 13.01.1541.
10. Пацвярджальны прывілей караля Жыгімонта Аўгуста мяшчанам Гродна 28.03.1561.
11. Пацвярджальны прывілей караля Жыгімонта Аўгуста мяшчанам Гродна 3.03.1562.
12. Прывілей караля Жыгімонта Аўгуста жыхарам Гродна 12.06.1564.
13. Прывілей караля Стэфана Баторыя, які пацвярджае прывілеі, дадзеныя яго двума папярэднікамі мяшчанам Гродна, 1576.
14. Прывілей караля Стэфана Баторыя аб вызваленні гарадзенскіх мяшчан ад пошлін за саладоўню і бровары 1576.

15. Прывілей караля Стэфана Баторыя, які дазваляе гарадзенскім жыхарам адкрыць склад солі ў Горадні 1576.
16. Ліст Рады Вялікага Княства Літоўскага, які вызваляе гарадзенскіх мяшчан і яўрэяў ад дачы мерак 15.06.1587.
17. Пацвярджальны прывілей караля Жыгімонта III мяшчанам і яўрэям Гродна 22.03.1588.
18. Прывілей караля Жыгімонта III, які пацвярджае правы і прывілеі жыхароў Гродна 2.02.1589.
19. Прывілей караля Жыгімонта III мяшчанам Гродна 14.02.1589.
20. Пацвярджальны прывілей караля Жыгімонта III мяшчанам Гродна 5.02.1596.
21. Прывілей караля Жыгімонта III Гродну і гродзенскаму магістрату на права весці аптовы гандаль хлебам, соллю і селядцамі, з выключэннем з гэтага права яўрэяў 14.08.1601.
22. Прывілей караля Уладзіслава IV жыхарам Гродна.
23. Прывілей караля Яна Казіміра, які пацвярджае Прывілей караля Уладзіслава IV 20.03.1650.
24. Прывілей караля Яна III, які пацвярджае Прывілей караля Аляксандра 2.02.1679.
25. Прывілей караля Аўгуста III, які пацвярджае 24 артыкулы Статута гарадзенскага скуранога цэха 2.01.1699.
26. Прывілей караля Станіслава I жыхарам Гродна, які пацвярджае іх 40 каралеўскіх прывілеяў 24.04.1709.

У 7 томе "Актов издаваемых Виленскою Комиссией для разбора древних актов" апублікаваныя наступныя прывілеі в. к. л. і каралёў польскіх (папярэдне ўказаныя нумары 1, 2, 4, 5, 10, 13, 15, 20, 21 паўтараюцца, таму ніжэй не напісаныя):

1. Прывілей Аляксандра гарадзенскім мяшчанам на ўваход у каралеўскую пушчу пад Прудцамі 1516.
2. Прывілей Жыгімонта I 1506, які пацвярджае прывілей 1496 на права магдэбургскае.
3. Прывілей Жыгімонта I які пацвярджае незбіранне пошліны з гарадзенскіх мяшчан, якія вядуць гандаль па рэках *Нёмане* і Неце 1540.
4. Прывілей Жыгімонта I гарадзенскаму *магістрату* на права продажу водкі з уплатай капшчыны – 50 коп. 1541.
5. Прывілей каралевы *Боны* Горадні адносна гарадскога ўпарадкавання 1541.
6. Прывілей караля Жыгімонта II Аўгуста Горадні на атрыманне зямель за Нёманам і 2,5 валок сенажаці 1562.
7. Прывілей Жыгімонта III, які вызваляе мяшчан ад меркі ў каралеўскім млыне, з платаю 12 пенязей з бочкі 1588.
8. Прывілей Жыгімонта III гарадзенскай *ратушы* на збор капшчыны ад продажу водкі, які таксама забараняе яе продаж іншым асобам, апроч мяшчан 1589.

9. Прывілей Жыгімонта III, які пацвярджае прывілей на права мець склад солі ў Горадні 1596.
10. Прывілей Жыгімонта III на збор мыта з маставой у Горадні 1627.
11. Прывілей Жыгімонта III на вызваленне гарадзенскіх гараджан ад вайсковых пастояў 1627.
12. Прывілей Жыгімонта III аб зборах мыта і гандлёвага ад прыезджых купцоў на карысць горада 1629.
13. Прывілей Аўгуста II гарадзенскаму *цэху* рыбакоў 1698.
14. Прывілей Аўгуста II на зямлю ў *Ласосне* і Дзямідкава Восіпу Кубліцкаму 1716.
15. Прывілей Аўгуста II, які пацвярджае прывілеі і дараванні сваіх папярэднікаў 1718.
16. Прывілей Аўгуста II, які пацвярджае прывілеі і рэскрыпты 1744.

Літ.: Акты издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. Т. VII. – Вильна; Гардзееў Ю. Некаторыя аспекты даследавання комплексу прывілеяў Гародні // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 25–26.

Прыстань – апошні порт на *Нёмане*. Рака з прытокамі і Агінскім каналам злучала Гродна з Гродзенскай, Мінскай, Валынскай губернямі, Каралеўствам Польскім і Прусіяй. У 1837 г. з прыстані было адпраўлена 113 суднаў і 20 плытоў з грузам на суму 955 630 руб., у 1859 г. – 261 судна, 133 плыты і 12 паўплытоў з грузам на суму 367 000 руб. Груз складаўся з хлеба (зярно, крупа, мука), хлебнай гарэлкі, дрэва (бярвенні, брусы, дубовая клёпка), паташ, льняное і канаплянае масла і семя, тытунь, воўна, сала і д. п. У 1837 г. прыбыло на прыстань 55 суднаў і 285 плытоў з грузам на суму 406 205 руб., у 1859 – 303 судны і 80 плытоў з грузам на суму 375 000 руб. У сакавіку 1866 даход склаў 384 руб 63 ¼ кап. Прывозілі ў Гродна машыны, чыгун, метал і вырабы з іх, аптэчныя матэрыялы, соль, селядцы, віно, сыравіну для прамысловасці і інш. Гродзенская прыстань не страціла сваю ролю і ў канцы XIX ст. Напрыклад, у 1889 адпраўлена было 37 тыс. пудоў хлеба, лясных і будаўнічых матэрыялаў, а прыбыло 561 тыс. пуд. груза. У канцы XIX ст. пачалася і перавозка пасажыраў. У межах горада былі 2 прыстані: на левым беразе, каля *моста імя Пілсудскага* – адсюль адыходзілі *параходы* да Лунны і Мастоў, і на правым беразе, каля армейскага вяслярнага клуба “Гродна”, адкуль у выходныя дні адпраўляліся прагулачныя судны ў *Пышкі* і *Крэйдавыя горы*. Пасля *вайны Другой сусветнай* суднаходства па Нёмане адрадзілася: былі падняты затопленыя баржы, судны, фрагменты ўзарваных мастоў, падрыхтаваныя да эксплуатацыі 6 барж, адрамантаваныя 3 параходы, адноўлены склад на прыстані. Загадам № 9 ад 31.03.1945 начальніка Нёманскага параходства ў Гродне была зарганізаваная Гродзенская прыстань, межы дзейнасці якой ахоплівалі Нёман ад вытокаў да Меркіне, раку Шчару, Агінскую шлюзавую сістэму, Аўгустоўскі канал да дзяржаўнай мяжы з усімі прытокамі (усяго 269 км). У падпарадкаванні прыстані былі механічныя майстэрні. Вядомыя начальнікі прыстані: М. А. Равінскі (з 1945), П. Рудакоў (1946), Д. А. Пеліх

(1951). З навігацыі ў 1946 адкрыліся 2 пасажырскія лініі ў Свентаянск і Лунну. У 1948 прыстань мела 5 самаходных адзінак флота і 8 несамаходных сухагрузаў, на левым беразе ракі – грузавую пляцоўку 700 кв. м з драўляным навесам 200 кв. м, на правым – драўляны пасажырскі павільён і грузавы цагляны склад. Да прыстані былі прыпісаныя сударамонтныя майстэрні. З пачатку 1960-х пасажырскія перавозкі сталі скарачацца, не вытрымаўшы канкурэнцыі з боку аўтатранспарта і ў сувязі з атсутнасцю турыстычнай інфраструктуры. Грузавыя перавозкі зменшыліся ў сувязі са скарачэннем аб'ёмаў перавозкі ляснога матэрыялу для Мастоўскага прадпрыемства.

Крын. і літ.: НГАБ, ф. 23, воп. 1, с. 7, а 53; Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерня / М. Бобровский. – СПб., 1863. Ч. 1; Ч. 2.; Приложения. Ч. 1, Ч. 2; Саяпин В., История общественного транспорта Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 106–160; Швед В.В. Торговля в Беларуси в период кризиса феодализма (1830–1850-е годы). – Гродно: ПКФ "Орбикс", 1995. – С. 65–69.

Прыстаў гарадскі – пасада створаная на аснове "Палажэння аб земскай паліцыі" ад 3.06.1837, існавала да сакавіка 1917 г. Горад падзяляўся на часткі, тыя – на кварталы, кварталы – на акалодкі. На чале іх стаялі прыватныя прыставы, прызначаныя *губернатарамі* з кандыдатаў, якіх падало мясцовае дваранства. Прыставы назіралі за выкананнем распараджэнняў урада, пастаноў губернатара і *губернскага праўлення*, прыгавораў судовых устаноў, выкананнем павіннасцяў. У іх абавязкі ўваходзіў дагляд за станам дарог, мастоў, рачных перапраў, забеспячэнне бяспекі ў горадзе (праводзілі даследаванні дробных спраў у сваёй частцы горада). Падпарадкоўваліся павятовым земскім судам, а з 1862 – павятовым паліцэйскім упраўленням. Мелі ў сваім падпарадкаванні соцкіх і дзесяцкіх, а з 1878 ім дапамагалі паліцэйскія ўраднікі. У 1866 пасада прыватнага прыстава была зліквідаваная, а яго функцыі перададзеныя ва ўчасткі, якія ўзначалілі участковыя прыставы.

Літ.: Гродненская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1802–1917). – Гродно, 2018. – С. 43; Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 61–62.

Прытыцкі Сяргей Восіпавіч (1.02.1913, с. Гаркавічы Беластоцкага ваяводства – 13.06.1971, Мінск) – беларускі савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч. У 1931 стаў чальцом Камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі. З 1932 быў сакратаром Гродзенскага акруговага камітэта камсамола Заходняй Беларусі і чальцом Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. З мая па кастрычнік 1933 сядзеў у Гродзенскай *турме*. Другі раз П. апынуўся там пасля свайго выстралу ў правакатара ў сценах віленскага акруговага суда (27.01.1936). Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР выйшаў з чарговай турмы і быў выбраны дэпутатам Народнага сходу ў Беластоку, дзе выступіў з дакладам аб усталяванні Савецкай улады. На V пазачарговай сесіі Вярхоўнага Савета СССР выступіў з заявай аб ўключэнні Заходняй Беларусі ў СССР і аб'яднанні

яе з БССР. З кастрычніка 1939 па 22 чэрвеня 1941 – нам. старшыні Беластоцкага абласнога выканаўчага камітэта. У ліпені–жніўні 1941 прымаў удзел у будаванні абарончых збудаванняў вакол Магілёва, у фармаванні народнага апалчэння ў Гомелі. Са жніўня 1941 па студзень 1942 быў старшым інструктарам 4 аддзела палітупраўлення Цэнтральнага фронту. З сакавіка 1942 па сакавік 1944 – 2 сакратар ЦК ЛКСМБ. Затым да заканчэння вайны быў намеснікам і начальнікам польскага штаба партызанскага руху (Роўна, Люблін, Варшава). У кастрычніку 1945 накіраваны ў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК ВКП(б), якую скончыў у 1948. Другі сакратар (1948), а са студзеня 1949 па снежань 1951 – першы сакратар Гродзенскага абкама партыі. У 1950–60-х гадах працаваў у партыйных, прафсаюзных, савецкіх і камсамольскіх органах. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР усіх прыхыццёвых пасляваенных скліканняў, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, дэлегатам XX–XXIV з'ездаў КПСС. Выбіраўся чальцом ЦК КПСС. Узнагароджаны 4-ма ордэнамі Леніна, 2-ма ордэнамі Чырвонага Сцяга, 10 медалямі, 7 польскімі і 1 чэхаславацкай урадавымі ўзнагародамі.

Крын. і літ.: Борисенок Ю. Железный человек Притыцкий // Родина. – 2019. – № 10; Жизнь, отданная народу: Статьи и речи С. О. Притыцкого, документы и воспоминания о нем. Мн., 1978; Чагіна Л. Жыццё, аддадзенае народу. Мн., 1987.

Прытулак Беларускі дзіцячы, пераведзены ў 1915 г. з Краснастока (цяпер Польшча) у гродзенскі Барысаглебскі *кляштар* (былы *бернардзінак)* па вул. Маставая, 9. З 1917 апекаваўся прытулкам гродзенскі філіял дабрачыннага Віленскага беларускага таварыства "Золак". Знаходзіўся ў вельмі цяжкіх умовах. Загадчыца *Буйло С.* пісала да старшыні Варшаўскага Беларускага нацыянальнага камітэта Л. Дубейкаўскага ў красавіку 1921: "Ад урада не атрымліваем грошай зусім. Нават у магістраце нам не далі… А тут, як на большае нашае гора, цэны страшэнна пайшлі ўгару. (…) На дзяцей я проста глядзець не магу… Вокан няма, дзверы не зачыняюцца. Дзеці лёгка адзеты, галодныя, гэта штосьці страшэннае… Я з гэтага ўсяго расхварэлася і ляжу ўжо другі тыдзень, але добра, што хоць цяпер нічога не бачу і не ведаю… Дык хутка, мусіць, трэба будзе перастаць есці – прадуктаў жа амерыканскіх толькі яшчэ на дзён сем хопіць. Становішча страшэннае… Калі можаце, Дзядзечка, памагчы чым-небудзь, дык памажыце…". Дубейкаўскі дапамог своечасова: дзеці не галадалі, вокны ўставілі, грошы дасылалі. Апекаваўся прытулкам і *Дзекуць-Малей Л.* Дапамагалі таксама: Мінскі БНК, прыватныя асобы – Міна Цытэр, Г. Сідарэвіч. Падчас кароткага панавання ў Гродне бальшавікоў летам 1920 настаўнікі П. школы не атрымоўвалі зароблена аплаты і пісалі лісты да *камітэта Гродзенскага вайскова-рэвалюцыйнага.* На пачатак 1924 налічвалася 50 дзяцей-хрысціян, у 1925–34, у 1926–33. У гэты перыяд дзяцей маглі вывезці на лета ў лагер Дружыны скаутаў пры Расійскім дабрачынным таварыстве. Польская мясцовая ўлада нічым не дапамагала і рабіла ўсё, каб адарваць П. ад уплыву беларускіх арганізацый. Пасля смерці Буйло

С. больш сталыя дзеці былі пераведзеныя ў Вільню, а самыя малыя аддадзеныя ў апеку праваслаўнай кансісторыі і беларускаму прытулку. Кіраўніцтва апошнім староства даручыла Беларускаму апякунскаму камітэту (рэарганізаванаму хутка ў *таварыства Гарадзенскае беларускае дабрачыннае*), створанаму з асоб лаяльных да польскай улады. 15.02.1927 *магістрат* прыняў рашэнне аб закрыцці П.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 46, воп. 1, с. 15, а. 75; Павач Андрэй. Шпацыр па Гародні. Шляхаводнік. – Вільня: ЕГУ, 2018. – С. 10, 13; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў, Мінск, 2015, с. 92, 94–97, 101–102; Przegląd statystyczny m. Grodna w latach 1924, 1925 i 1926 /Pod. red. R. Sawickiego. – Grodno: Nakładem Magistratu m. Grodno, 1925. – C. 48.

Прэзідэнт горада. Спачатку называўся войтам ў гарадах ВКЛ і Кароны Польскай, заснаваных на магдэбургскім праве. У XV – XVIII стст. – службовая асоба, абіраная звычайна з багатых жыхароў. У функцыі войта, а пазней і прэзідэнта ўваходзілі агульная адміністрацыя, кіраванне гарадской маёмасцю і судовыя функцыі, рэалізаваныя з дапамогаю галавы прысяжных. Першы вядомы прэзідэнт з 1753 г. Гэтую пасаду займалі: *Бадаракі Юзаф* (1743–1745 войт, 1753–1754 прэзідэнт, 1755–1760, 1763–1766), Сталінскі Андрэй Францішак (1753–63, 1765, 1766), Жылінскі Вінцэнт Тадэвуш (1753, 1757–59 1761–63), Клява Тадэвуш (1759,1760, 1763–66), Абрамовіч Казімір (1795), Урублеўскі Ігнацы (1804–1809), Бярвінскі (1810), *Мучынскі Францішак* (1812, 1817), *Крэйбіх Казімір* (1818–23), Памеранскі Юзаф (1877), Міхальскі і М. А. Кузьмін (1893), *Э. Э. Лістоўскі* (1893, 1907, 1912, 03.05.1919 – 11.05.1922); Нелюбовіч Віктар (выконваў абавязкі 12.05–17.07.1922), *Э. І. Стэмпнеўскі* (17.07.1922 – верасень 1927); *Казімір Рагалевіч* (верасень 1927–1929); *А. Ранчашак/Рачашак* (11.1929–1930); *М. О'Брыен дэ Лясы* (1930–1933); К. Сілістровіч/Сулістроўскі (1933–1934); В. Міскы (1934–1936); В. Ценскі (1936 – верасень 1939).

Крын. і літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў: Wrocławska Drukarnia Naukowa PAN, 2008. – С. 356; Павач. А. Под крылом Коложы. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 184–188; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у 1743–1767 гг.// Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – с. 63–64; Sypuła-Gliwa J. Podróż na Wschód. – Łomianki, 2011. – S.17; Jodkowski J. Spis wójtów, burmistrzów i prezydentów m. Grodna // Przegląd statystyczny za lata 1922 i 1923. – Grodno, 1925. – S. 11–12.

Прэмія імя Юзафа Ядкоўскага – узнагарода, заснаваная гродзенскім Гістарычным таварыствам і Таварыствам беларускай школы. З 2012 г. ёю ўзнагароджваюцца гісторыкі і краязнаўцы, якія зрабілі значны ўнёсак у даследаванне гісторыі горада, ахову яго архітэктуры і культуры, паспрыялі папулярызацыі прыроднай і гістарычна-культурнай самабытнасці Гродна і яго ваколіц. Першым узнагароджаным мог стаць гісторык, адзін з аўтараў *"Гроднаznaўства"* Андрэй Чарнякевіч, але ён адмовіўся прыняць яе, бо лічыў, што прэмію трэба даць усім аўтарам кнігі. Таму ў 2012 узнагародзілі вядомага

педагога і краязнаўца, стваральніка музея гісторыі педагогікі Гродзеншчыны Алеся Госцева і арганізатара маладзёвай ініцыятывы "Варштат ідэй" Таццяну Касатую. Потым узнагароду атрымлівалі: у 2013 – *Віктар Саяпін*, аўтар кніг па гісторыі савецкага Гродна і цыкла дакументальных фільмаў пра культурную спадчыну Гродна; у 2014 – канд. мед. навук Фёдар Ігнатовіч, стваральнік музея-аптэкі ў Гродне; у 2015 – гісторык, супрацоўнік *музея гісторыка-археалагічнага* Андрэй Вашкевіч, папулярызатар і ахоўнік археалагічнай спадчыны Гродна; у 2016 – педагог Таццяна Еўдакімава, за правядзенне гульні "Я гэтым горадам апекаваны"; у 2018 – краязнавец Ігар Лапеха, за стварэнне макета Гродна; у 2019 – гісторык Мечыслаў Ян Супрон, за ахову архітэтурнай спадчыны Гродна. Уручаюцца фінансавая прэмія (са складак сябраў таварыстваў – заснавальнікаў прэміі), дыплом і памятны медаль (мастак У. Алехна), на аверсе якога – выява гісторыка з надпісам "Юзаф Ядкоўскі", на рэверсе – абрыс будынка замка з надпісам "Для горада. Для людзей", лаўровая галінка і год ушанавання.

Путкамеры. 1) Марыянна Эва з Верашчакаў (званая яшчэ Марыляй і Перы) – жонка графа Путкамера; каханка і муза паэта Адама Міцкевіча. 2) Ваўжынец/Лаўрэнці – удзельнік напалеонаўскіх войск, уладальнік маёнткаў у Гродзенскай губ. Вясной 1833 г. на тэрыторыі Беларусі з'явіўся эмісар Юзафа Заліўскага з Парыжа, *Марцэлі Шыманскі,* які хацеў падрыхтаваць наступнае ўзброеннае паўстанне. Ён 15.04.1833 звязаўся ў Больцініках з сям'ёй Путкамераў (меў рэкамендацыйны ліст да іх ад доктара Юзафа Шчапінскага, які жыў у эміграцыі). Шыманскі папрасіў Марыю Путкамер, каб была пасярэднікам у перасылцы пошты з Гродна ў Вільню – такім чынам яна ўвайшла ў канспірацыйную арганізацыю, створаную Шыманскім. Сама яна перадала эмісару напісаныя ёю рэкамендацыйныя лісты да ўладальнікаў суседніх маёнткаў (у тым ліку да брата Міхала Верашчакі, да пробашча, ксяндза Ф. Венгроўскага). З'язджаючы ад Путкамераў, Шыманскі перадаў Марылі пошту для Рэўкоўскага ў Вільні і ксяндза Маціёўскага ў Гродне. Разам з мужам Марыля была прыцягнутая да следства. Спачатку пасля арышту яны сядзелі ў віленскім кляштары базыльянаў (у тым, дзе сядзеў Міцкевіч падчас следства над філарэтамі), а затым у жніўні 1833 былі перавезеныя ў *турму* Гродна (дзе сядзеў Шыманскі). Путкамеры ні ў чым не прызналіся, гаварылі, што дапамаглі Шыманскаму як падарожніку і асобе, якая планавала набыць сабе фальварак, а пра яго палітычныя мэты нічога не ведалі. З дапамогай сяброўак, з якімі Марыля дапамагала калісьці арыштаваным філарэтам і філаматам, Шыманскі за грошы былі вызвалены. Раней Марылі ўдалося сустрэцца ў Гродне са сваімі дзецьмі. Вярнуліся дадому ў Больцінікі Лідскага ў. на Вігілію Божага Нараджэння (лістапад 1833).

Літ.: Wawrzykowska-Wierciochowska D., Adam i Maryla. Dzieje romantycznej miłości Adama Mieckiewicza i Maryli Wereszczakówny. – Warszawa: Instytut Wydawniczy ZZ, 1990, s. 163, 175–181; Śalna R., Piotrovićus V. Adomas Mickievićius ir moterys. Adam Mickiewicz a kobiety. – Vilnius, 2009. – S. 76; Sidorowicz-Czerniewska K. Sprawa

emisariusza Michała Wołłowicza w r. 1833. – Grodno, 1934. – C. 86–87; Rymkiewicz J. M. Żmut. – Warszawa, 1991. – S. 334.

Пушкін Аляксандр Сяргеевіч (6.06.1799 – 10.02.1837) – заснавальнік новай рускай літаратуры, паэт і празаік. Частка твораў П. прысвечаная падзеям расійскай гісторыі. У "Истории Петра. Подготовительные тексты. Годы 1705–1706" (1832–1836) ёсць шмат згадак пра Гродна ў сувязі з *вайной Паўночнай* і знаходжаннем Пятра I ў гэтым горадзе. У расійскі час у Гродне было вучылішча імя Пушкіна. Цяпер яго імя носіць абласная дзіцячая бібліятэка і адна з вуліц. У савецкі час існаваў кінатэатр А. Пушкіна па вул. Савецкіх памежнікаў.

Пышкі – раён горада. У археалагічным музеі Кракава, у калекцыі З. Глогера, знаходзіцца 91 выраб з крэменю каменнага і бронзавага часу (скрабкі, нуклеусы, ножападобныя пласціны) і два фрагменты посуду, зробленага на ганчарным коле эпохі ранняга сярэднявечча, знойдзеныя ў 1872 г. на правым беразе *Нёмана*, на паўднёвым канцы П. У XVI ст. – вёска, у якой жылі замкавыя рыбакі (у 1560 сярод іх былі асобы з прозвішчам Пыскі). З часоў *памеры валочнай* вёска П. належала замкавай юрыздыкцыі. У 1650 складалася з 2 засценкаў: Дзецкава (21 морг) і Пыскі (30 моргаў). Наступныя інвентары называюць ужо адзін, памерам 52 моргі. У 1680 жылі ў вёсцы толькі 3 рыбакі, а ў 1708 і 1712 не было жыхароў – яны былі альбо знішчаныя, альбо збеглі падчас вайны Паўночнай. У 1784 вёска належала гораду Гродна і адносілася да Гродзенскай парафіі. У гэты ж час на левым беразе Нёмана занатаваная другая вёска пад той жа назвай. У 1795–1797 гг. апошні польскі кароль і вялікі князь літоўскі *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі*, які жыў у Гродне, любіў прыязджаць сюды для адпачынку з *замка Новага*. У 1795–1807 частка вёскі апынулася ў складзе Новай Усходняй Прусіі, але ўлады апошняй дазволілі гродзенскаму кіраванню атрымоўваць з яе падаткі. З 1798 знаходзілася ў Станіславоўскім ключы гродзенскай *эканоміі*. Падчас *паўстання 1830–1831 гг.* земскі спраўнік узяў ад жыхароў падпіску аб тым, што яны не будуць падтрымоўваць зносіны з жыхарамі Каралеўства Польскага. З рапарта начальніка Юрбургскай мытні вядома, што ў П. мелі жыхарства стражнікі. У канцы XIX – пачатку XX ст. П. знаходзіліся ў маёнтку *Станіславова* і належалі князю Аляксандру Ксавер'евічу Друцкаму-Любецкаму. Да 1917 г. вёска была ў Расійскай імперыі, а ў 1921–1939 – у складзе Польшчы. У гэты час тут былі гаспадары (напрыклад, кн. Ян Друцкі-Любецкі, сяляне Юзаф Кічук і Юзаф Юхневіч), якія здавалі турыстам свае дамы, абяцаючы смачнае харчаванне, добрую рыбалку, прагулкі на лодцы па Нёмане, грыбы і ягады ў бліжэйшым лесе. Летам 1941 на беразе Нёмана знаходзіўся летні вучэбны лагер Гродзенскай паграншколы, дзе рыхтавалі малодшы камандны склад для пагранзастаў. На момант пачатку вайны тут было да тысячы курсантаў, якімі камандаваў начальнік школы маёр Зіноўеў. 22 чэрвеня яны занялі бераг ракі пад абстрэлам нямецкіх бамбардзіроўшчыкаў і да позняга вечара зрывалі спробы немцаў пераправіцца праз Нёман. Ноччу курсанты адышлі ад П. у напрамку

Грандзіч і затым – на Скідзель. У савецкі час у сасновым бары размясцілася абласная клінічная бальніца і паліклініка, на базе якіх працавалі некалькі кафедр *Гродзенскага медуніверсітэта*. Побач знаходзіліся стацыянар туберкулёзнага дыспансера і інфекцыйная бальніца. Пышкі – месца адпачынку гарадзенцаў і гасцей у XX ст. У савецкі час у П. знаходзіліся шматлікія піянерскія лагеры, вядомы рэстаран "Сосны", на месцы якога цяпер ўладкаваўся Парк-Гатэль. На пач. 2007 г.: 81 гаспадарка, 199 жыхароў, з іх да 15 гадоў – 26, працоўнага ўзросту – 135, пенсіянераў – 38. Каля П. захаваліся пабудовы *форта* № 5 фортавай лініі 1887–92, які планаваўся да выкарыстання ў 1912–15 як цэнтральная станцыя сувязі.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф.19, воп. 1, спр. 525, а. 134; Гардзееў Ю. Гарадская прастора ў XVI – XVIII стст. // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 110; Глогер З. Далінамі рэк. Нёман (фрагменты) // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Вып. 10 (2015) / рэдкал. І. Соркіна [і інш.] – Гродна, 2016. – С. 50; Граблевский И.С. Гродно и окрестности: справочник-путеводитель. – Мінск, 1987, с. 187; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 72; Орловский Е.Ф. Гродненская старина. – Гродна, 1910. – Ч. 1: Гродна, с. 210; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013, с. 303–306; Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гродна: ГрГУ, 2001, с. 313; Borowik P. J. Jurydyki miasta Grodna w XV – XVIII wieku. Stanowy podział nieruchomości. – Supraśl, 2005, s. 214, 235–237, 265, 288; Grodno. Informacje turystyczno-letniskowe uwzgledniajace miasto, okolice i powiat. – Grodno, 1920, s. 16.

Пушкоў Іван Васільевіч (16.02.1918, в. Трэскіна Інжавінскага р-на Тамбоўскай вобл. – 31.07.1986, Гродна) – беларускі мастак, арганізатар і першы кіраўнік (1971–1979) Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза мастакоў БССР. Скончыў Пензенскае мастацкае вучылішча (1938), удзельнік *вайны Вялікай Айчыннай*. У мастацкіх выставах удзельнічаў з 1946. Для яго пейзажаў характэрная глыбокая лірычнасць, спакойная і стрыманая прыгажосць ("На берагах сядога Нёмана", "Каля млына", "Сімфонія палёў", "Азёрны край", "Возера Свіцязь", "Летняя раніца на Нёмане", "Край прынёманскі" і інш.). У сюжэтна-тэматычных карцінах адлюстраваны подзвіг народа ў *вайне Вялікай Айчыннай* ("Кавалерыйская атака", "Пераслед ворага", "Фарсіраванне *Нёмана* ў ліпені 1944" і інш.). Ёсць карціны, прысвечаныя выдатным ураджэнцам Гродзеншчыны ("Адам Міцкевіч і *Тамаш Зан* на Свіцязі", "А. Пашкевіч (Цётка) у *Э. Ажэшкі*", "Э. Ажэшка і А. Пашкевіч (Цётка)" і інш.).

Пшэздецкі Вацлаў – арганізатар вайсковай абароны Гродна ў верасні 1939 г. Генерал, у 1931 – камандуючы 27 пях. Горнай дывізіі ў Бельска-Бялай.

Літ.: Wojna polsko-sowiecka 1939 r. t. 2. – Londyn. Polska Fundacja Kulturalna. 1986.

Пэлюс Даўмонтавіч – князь, сын Даўмонта Пскоўскага, брат *Давыда Гарадзенскага* (?). У 1284 збег у Гродна ад пераследу князёў Лютавора і Віценя. Спрабаваў набраць харугву з добраахвотнікаў, каб адпомсціць сваім супернікам, але набраў невялікі атрад і таму быў вымушаны збегчы да лівонскіх рыцараў.

Пякарская Дарота гл. Сітанскія.

Пярэселка – раён горада, які знаходзіцца паміж сённяшнімі вуліцамі Лермантава, Горкага, БЛК, Болдзіна. Летапісы гавораць аб перамозе Вітаўтам пскавічоў у 1406 г. і захопе ў палон 11 тыс. чал., але прамых дадзеных аб перасяленні іх пад Гродна няма. У сярэднявеччы землі належалі вялікаму князю літоўскаму, каралю польскаму, адносіліся да Станіславоўскага ключа *эканоміі Гродзенскай*.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 252–253; Трусов И.Г. Православные храмы Гродно. – Минск: Мэджик Бук, 2008. – С. 49; Орловский Е. Очерк истории города Гродны. – Гродна, 1889. – С. 15.

Пясецкі Геранім, герба Яніна (? – каля 1690) – маршалак слонімскі, пасол на сеймы. Падпісаў з Навагрудскім ваяводствам элекцыі Яна Казіміра (1648), Міхала Карыбута (1668). З 1670, як намеснік Кшыштафа Паца, займаўся адміністрацыяй гродзенскай каралеўскай *эканоміі* і адбудовай замка ў Гродне (напэўна Гарадніцкага), у 1678 перадаў яго ўрачыста Яну III.

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 377.

Пястрак Піліп Сямёнавіч (14.11.1903, в. Сакоўцы, цяпер Брэсцкай вобл. – 22.11.1972, Мінск) – беларускі савецкі пісьменнік, паэт, удзельнік рэвалюцыйнага руху, чалец КПЗБ (з 1926). З Гродна звязаныя цяжкія турэмныя гады: 1927, 1929–1934, 1936–1939. У *турме* П. шмат працаваў, займаўся самадукацыяй, напісаў новыя творы (пісаў нават на сценах турэмнай камеры). У 1937–1939 узначальваў турэмны камітэт Гродзенскай турмы, пад кіраўніцтвам якога ў верасні 1939 палітычныя вязні вырваліся ў горад, ваявалі з войскамі і паліцыяй. П. стаў старшынёй Гродзенскага *рэвалюцыйнага камітэта*, быў дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі, дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР. Працаваў у Гродне старшынёй гарадскога камітэта МАПРа. Жыў у Гродне да пачатку *вайны Вялікай Айчыннай.* Пасля яе жыў і працаваў у Мінску. У Гродне ёсць вуліца яго імя.

Пяткевіч Аляксей Міхайлавіч (30.03.1931 г., м. Новы Свержань Стаўбцоўскага р-на Мінскай вобл. – 11.03.2022) – літаратуразнаўца, культуролаг, прафесар (1994). Ганаровы сябра Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў (2006), сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў (1971). У 1938 пайшоў вучыцца ў польскую школу (адразу ў 2 кл.), затым працягваў адукацыю ў беларускай школе пры "першых

Саветах", немцах, зноў пры Саветах і скончыў Навасвержанскую сямігодку. Пасля заканчэння СШ № 1 у Стоўбцах паступіў у 1949 на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1954–57 вучыўся ў аспірантуры, у 1963 абараніў кандыдацкую дысертацыю. З 1957 жыў і працаваў ў Гродне. У 1968–1974 быў загадчыкам кафедры беларускай літаратуры. Усё жыццё прысвяціў даследаванню літаратурнай Гродзеншчыны. Так ён і назваў адну з кніг – "Літаратурная Гродзеншчына" (1996), а другую – "Людзі культуры з Гродзеншчыны" (2000). Навуковая спадчына вучонага складаецца з 500 найменняў: манаграфіі, кнігі, падручнікі, артыкулы. Ён быў адным з ініцыятараў надання ўніверсітэту ў Гродне імя Янкі Купалы, арганізатарам тут кафедры беларускай культуры (быў яе загадчыкам у 1991–2001). Узнагароджаны медалём, граматамі ГрДУ, Гродзенскага аблвыканкама, Міністэрства адукацыі РБ.

Літ.: Аляксей Пяткевіч: жыццё для Беларусі // Пагоня. – 2001. – 29.03. – С. 5; Прафесары Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. 1940–2010. – С. 89–90. Пяткевіч А. Бібліяграфічны агляд навукова-педагагічнай дзейнасці да 70-годдзя. – Гродна: ГрДУ, 2001.

Пяткевіч Г. В. – старшыня Гродзенскага *гарадскога выканаўчага камітэта* ў 1950–1952 гг. Біяграфічнага матэрыялу пра яго знайсці не ўдалося.

Пятраеў Валеры Барысавіч (5.05.1947, Ціхвін Ленінградскай вобл. – ?, Гродна) – скульптар. Пасля вучобы ў мінскім мастацка-тэатральным вучылішчы (1963–1968) працаваў у Гродзенскіх мастацкіх майстэрнях "Мастацтва". Аўтар скульптурных твораў: "Я. Купала" (у ГрДУ), бюст Даватара (у СШ № 11), бюст *М. Багдановіча* (у музеі Багдановіча ў Гродне) і інш.

Пячатка гарадская гербавая, упершыню з'явілася паводле ўказу Боны Сфорцы ў 1540 г. На пячатцы 1565 ёсць надпіс на лацінскай мове "SIGILLUM CONSULUM CIVITATES GRODNENSIS", што ў перакладзе значыць "Пячатка гарадская *рады Гродзенскай*". На пячатцы ёсць выява герба на шчыце, форма шчыта і яго ўпрыгожванні, дата. Цітоў А. выявіў 8 розных адбітак гродзенскай пячаткі: "пячатка рады горада Гродна" з датай 1540 г. на дакуменце 18.11.1633; пячатка *лавы* з датай 1565 на дакуменце 1575; пячаткі рады на дакуменце 1635 і з датай 1640; на дакуменце 24.05.1652; на дакументах за 1772–1791 пячатка рады з датай 1540; "пячатка *магістрата* горада акруговага вольнага Рэчы Паспалітай Гродна" на дакуменце 1792; "пячатка магістрата рэгіёна Гродна" на дакуменце 1801.

Літ.: Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 16; Цітоў А. Пячаткі горада Гродна // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1984. – № 4. – С. 35–36.

Р

Рагалевіч Казімір (9.04.1878, м. Асмолава Навагрудскага пав. – 15.12.1934, Ваўкавыск) – гродзенскі павятовы *староста* ў 1919–1926, *прэзідэнт* Гродна (4.01.1927 – 1.03.1929). Атрымаў юрыдычную адукацыю ў Пецярбургскім універсітэце. Працаваў на розных пасадах: у 1904–1909 памочнікам прысяжнага адваката ў Мінскім акруговым судзе; прысяжным адвакатам у Віленскім акруговым судзе; у 1909–1918 юрыдычным дарадцам ва ўпраўленні Лібава-Роменскай чыгункі. У 1918 быў камісарам польскага аддзела рэпатрыцый ў Мінску. З лютага 1919 працаваў у галоўнай земскай камісіі пры польскім Міністэрстве сельскай гаспадаркі і дзяржаўнай маёмасці. Быў пераведзены на пасаду кіраўніка аддзела ў ваяводскае ўпраўленне ў Беластоку. Па словах інспектара Стражы Крэсовай *С. Мыдляжа* "чалавек вельмі шляхетны, прыстойны, які разумее сваё заданне, толькі думкі яго не трымаюцца ані гадзіны, дае абяцанні, не выконваючы іх потым. Чалавек пры гэтым мяккі (…). Пры добрых памочніках вельмі добры". На пасадзе прэзідэнта Гродна заслужыў прызнанне і пашану яго жыхароў сваёй адданай працай на карысць насельнікаў горада. Быў сябрам вяслярнага клуба "Гродна" (1927), Камітэта адбудовы *замка Старога* (1928), старшынёй праўлення Гродзенскага павятовага камітэта Лігі паветранай абароны дзяржавы. У 1929 здаў экзамен на натарыуса і працаваў на гэтай пасадзе ў Скідзелі (1929–1933) і Ваўкавыску (з 1933).

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 207–208; O niepodległą i granice. T. 7. Raporty Straży Kresowej…, s. 277.

Рагачэўскі Майсей (1823 – 1933, Гродна) – сын паўстанца 1831, удзельнік *паўстання 1863* на Гродзеншчыне ў чыне падпаручніка ў атрадзе Вайчынскага. У 1931 падаў праз ДОК Гродна прашэнне ў Міністэрства вайсковых спраў.

Літ.: B. Kuliberda. Mojzesz Rogaczewski // Goniec Wielkopolski. – 1931. – Nr 286. – 11.12.

Рада Беларуская сялянская павятовая, створаная замест рады губернскай на паседжанні Першага *гарадзенскага губернскага беларускага з'езда* ў 1919. У склад яе ўвайшлі А. Якубецкі (старшыня), Я. Натусевіч, У. Курбскі, З. Качан, А. Грыкоўскі, *Л. Дзекуць-Малей*, А. *Аляксючанка*, Я. Міхайлоўскі, П. Міськевіч, М. Сарока, Р. Злоцкі, А. Сініма, А. Ламашэвіч.

Літ.: Чарнякевіч А. З гісторыі Гарадзенскага Беларускага нацыянальнага камітэту. Канец 1918 – пачатак 1921 г. // Гарадзенскі палімпсест. XII-XX стст. Матэрыялы

міжн. канф. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Горадня-Беласток: ІГДБ (ЕГУ). – 2008. – С. 160.

Рада польская галоўная Гродзенскай зямлі (Polska Rada naczelna Ziemi Grodzieńskiej). У ёй чальцамі былі: ксёндз *Леан Жаброўскі* (з *партыі Хрысц. дэмакратаў*, старшыня), *Жабакліцкі Антоні* (сацыяліст, віцэ-старшыня і сакратар Рады), Ю. Цытажынскі (рэферэнт), *Іваноўскі Станіслаў* (камісар Польшчы ў Гродне) і іншыя.

Літ.: Gierowska-Kałłaur J. Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (19.02.1919 – 9.09.1920). – Warszawa, 2003. – S. 269.

Рада Гарадзенская беларуская школьная/вучыцельская – паўстала ў канцы сакавіка 1919 г. падчас Першага беларускага вучыцельскага з'езда Гарадзеншчыны. Працавала на момант прыходу бальшавікоў у Гродна ў ліпені 1920, а потым працягнула працу пасля вяртання ў горад у верасні 1920 польскага войска. З ліпеня 1919 старшынёй рады быў *Лукаш Дзекуць-Малей*.

Літ.: Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 69, 90, 92.

Рада гарадская (міжваенны час) – адміністрацыйны орган, які пачаў дзейнічаць пасля скасавання ў Гродне Часовага гарадскога камітэта. Першыя выбары адбыліся 27–28 лютага 1919 г. Спрэчкі сярод беларускіх дзеячаў прывялі да таго, што ў склад радных былі абраныя толькі 2 беларусы (Боеў У., *Аляксюк П.*), у той час як ад яўрэйскіх арганізацый – 25, ад польскіх – 11. Пятага сакавіка на першым паседжанні рады прэзідэнтам быў абраны паляк Э. *Лістоўскі*. (23 за, 10 стрымалася), сакратаром – Тарлоўскі. Адзначым, што справаводства вялося на польскай і яўрэйскай мовах. 6.03 беларусы ўнеслі у Раду прапанову аб месцы ў праўленні рады для беларуса. Пасля дыскусій і спрэчак у чальцы рады давыбралі Ю. Цытажынскага, Нелюбовіча, а сакратаром – Гарбачэўскага. У рэвізійную камісію з 5 чал. патрапілі: А. Ліпнік, Сабалеўскі, Аляксюк П., Я. Якімовіч, Главінскі. 8.03 была створана камісія па барацьбе з беспрацоўем: Бадаш, Бас, Савіцкі, Кавальскі, Шыфрэс. У камісію харчавання ўвайшлі: кс. *Курыловіч*, Пальніцкі, Цыдзік, Эпштэйн, *Стэмпнеўскі*. Прававая камісія складалася з наступных асоб: Ліпнік, К. Якімовіч, Цыдзік. Вырашылі паседжанні праводзіць 2 разы на месяц, а важныя справы абмяркоўваць пры наяўнасці не менш за 7 чал. праўлення. Назва *магістрат* была зменена на *Гарадское ўпраўленне*.

У склад Р., выбары ў якую адбыліся 9.10.1927, увайшлі вядомыя ў горадзе асобы: лаўнік А. Сухаўлянскі, лекары А. Валянскі і А. Ліпнік, адвакат Гарбачэўскі, купец Гітлер і інш. *Прэзідэнтам* рады выбралі *К. Рагалевіча*. На выбарах 7.04.1929 у раду патрапілі: павятовы лекар Я. Якімовіч, дырэктар семінарыі і сябра сейма Р. Пульян, інжынер Ю. Цытажынскі, адвакат І. Рутэн, аптэкары С. Разенталь і А. Троп-Крынскі, прадпрымальнік *Марголіс*, настаўнік Ш. Бадылькес, стаматолаг А. Любіч і інш.

Крын. і літ.: Nowe Życie. – 1919. – n. 9, s. 68–69; 16.03. – № 13, с. 103; 7 września. – n. 37, s. 272; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гродна-Вроцлаў: Гродзенская бібліятэка, 2014. – С. 297; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 116.

Рада гарадская народных дэпутатаў – орган дзяржаўнай улады ў горадзе. Першая была створаная ў колькасці 15 чал. у снежні 1939 г. пасля ліквідацыі *Упраўлення Часовага 1939*. Падчас выбараў 1940 на аснове ўсеагульнага, роўнага і прамога галасавання выбралі 180 дэпутатаў на тэрмін 2,5 гады. Р. г. вырашае ўсе пытанні мясцовага значэння, кіруе дзейнасцю рад гарадскіх раённых (Кастрычніцкага і Ленінскага), удзельнічае ў абмеркаванні пытанняў абласнога і рэспубліканскага значэння. Р. г. плануе гаспадарчае, культурнае, адукацыйнае, сацыяльнае жыццё горада і кантралюе выкананне планаў развіцця, забяспечвае захаванне законаў, ахову ўнутранага парадку, праў грамадзян, кантралюе дзейнасць прадпрыемстваў у галіне землекарыстання, аховы прыроды, будаўніцтва, выкарыстоўвання працоўных рэсурсаў. Праца Р. г. павінна праходзіць на аснове калектыўнасці кіраўніцтва, галоснасці і справаздачнасці дэпутатаў перад выбаршчыкамі, калектывамі і грамадскімі арганізацыямі. Сесіі Р. г. праходзяць не менш як 4 разы на год. Пры Р. г. ствараюцца аддзелы і ўпраўленні, пастаянныя камісіі (планава-бюджэтная, па прамысловасці, транспарце і сувязі, па гандлі, па народнай адукацыі, па культуры, па ахове здароўя, па фізічнай культуры і спорту і інш.).

Літ.: Літ.: Гродно. Энциклопедический справочник, Минск, 1989, с. 139–140.

Рада гарадская рабочых дэпутатаў. Выбары ў першую праходзілі ў другой палове снежня 1918 – пач. студзеня 1919 ва ўмовах нямецкай акупацыі, па ініцыятыве гродзенскай падпольнай партыі *камуністаў*. Былі выбраныя 103 дэлегаты, большасць з якіх былі бальшавікамі ці іх прыхільнікамі. 26.01.1919 адбылося першае паседжанне ў будынку гарадскога *тэатра,* акружанага нямецкім войскам, якое не перашкаджала сходу. Быў выбраны пастаянны прэзідыум Рады з 9 чал. на чале са Шпакам (*В. Багуцкім*). Былі дасланыя тэлеграмы У. І. Леніну (Ульянаву), Усерасійскаму Цэнтральнаму Выканаўчаму Камітэту, Савету Народных Камісараў, Чырвонай Арміі, ураду Літвы і Беларусі, пралетарыяту Германіі. Рада зацвердзіла тэкст пратэсту супраць рэпрэсій акупацыйных улад. 2.02.1919 у памяшканні рабочага клуба (будынак на пл. Савецкай, 2) адбылося другое пасяджэнне гродзенскай Рады рабочых дэпутатаў (у колькасці 60 чал.). Абмяркоўваліся пытанні аб уладзе і рабочай фракцыі. Прынятая дэкларацыя "Ко всему населению города Гродно и окрестностей", у якой было напісана: "Рада, як прадстаўнічы орган усяго гродзенскага пралетарыята, абвяшчае лозунг барацьбы за ўладу і ўсталяванне дыктатуры пралетарыята". Рада пастанавіла ўвесці 8-гадзінны рабочы дзень на прадпрыемствах. 27.04.1919 горад пакінулі апошнія нямецкія часткі, і ў Гродна ўвайшлі легіянеры *Пілсудскага.* Першая Рада рабочых дэпутатаў перастала існаваць.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др., Мн., 1988, с. 81–82, 84–86; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3, Мн., 1996, с. 140.

Рада муніцыпальная, 1812 г. Складалася з аддзяленняў: паліцэйскага, фінансавага, правіянцкага, кватэрмайстарскага і "богаўгодных спраў". На чале Рады быў мэр, былы гродзенскі дэлегат у Найвышэйшай радзе Літоўскага народа ў 1794 г., *Францішак Мучынскі*. У паліцэйскіх адносінах Гродна было падзеленае на тры кварталы. На чале іх стаялі назіральнікі: 1-га – Антон Жымкевіч, 2-га – Стэфан Забіцень, 3-га – Станіслаў Макарэвіч. Самастойнасць мясцовай улады была ўмоўная, бо паралельна ў Гродне былі ваенны губернатар дэпартамента генерал барон Гійом-Мары-Анн *ле Брун*, камендант горада Лебрэн, інтэндант Шасенон.

Літ.: Швед В. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. / В. Швед, С. Данскіх. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2006.

Рада Цэнтральная беларуская Гарадзеншчыны – створаная была 19.03.1919 на сходзе прадстаўнікоў "беларускіх сацыялістычных партый і сацыялістычных арганізацый". Яе ўзначаліў *Аляксюк П*, віцэ-старшынямі сталі А. Якубоўскі і Б. Квяцінскі. У склад прэзідыума Рады былі кааптаваныя прадстаўнікі сялянскай рады М. Маркевіч і Т. Вернікоўскі. Месцілася ў *доме Ромера* (зараз вул. Савецкая, 23). Мэтай арганізацыі было скліканне беларускага з'езда Гарадзенскай і Віленскай губерняў.

Літ.: Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гродна-Вроцлаў: Гродзенская бібліятэка, 2014. – С. 298; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 36–37, 57–61.

Радаліцкі Пантэлеймон Аляксандравіч (26.06.1916, с. Чыстапаль – 23.09.1961) – кіраўнік гродзенскага народнага ансамбля песні і танца пры гарадскім доме культуры (1957), заслужаны дзеяч культуры БССР. Скончыў Кіеўскі музычны тэатральны інстытут ім. Лысенкі (1933). Заслужаны дзеяч культуры БССР (1958) – першы ў Гродне. Працаваў чорнарабочым (1931), выкладчыкам музычнай школы ў Сухумі (1934–38), скрыпачом Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра (1934–38), выкладчыкам музыкі ў педвучылішчы ў Армавіры, (1938–44), выкладчыкам музыкі ў дзіцячым доме (Махары, Каберда-Карачаеўскага раёну, 1941–42), кіраўніком ваеннага ансамблю (1943), мастацкім кіраўніком раённага дома культуры ў горадзе Зелянгук (1944–45), кіраўніком ваеннага ансамбля (сакавік – верасень 1945). У Гродне з верасня 1945. Выкладаў музыку ў педагагічным вучылішчы (1945–55), кіраваў раённым домам культуры ў Любчы (1955–56), хормайстрам Дзелячыцкай харавой капэлы, з 1956 – у Гродзенскім педагагічным інстытуце. Аўтар апрацовак народных песень. Узнагароджаны ганаровай граматай ВС БССР.

Радзівіл Міхал – князь, палкоўнік, начальнік жандармерыі Гродзенскага дэпартамента падчас вайны 1812 г. Удзельнік паўстання 1830–1831, галоўнакамандуючы войск (20.01–26.02.1831).

Літ.: Матвейчык Д. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. – ураджэнцы беларуска-літоўскіх губерняў: эміграцыя, гуртаванне, дзейнасць. Дадатак. Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені кандыдата гіст. навук. – Мінск: БДУ; Швед В. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. / В. Швед, С. Данскіх. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2006.

Радзівіл/Радзівіловіч Юры/Ежы, мянушкі: Віктар, Пераможац, Літоўскі Геркулес (нар. каля 1480 – пам. 04.1541) – дзяржаўны і вайсковы дзеяч ВКЛ, заснавальнік біржанска-дубінкаўскай галіны роду Радзівілаў. У 1509–17 быў падчашым літоўскім, у 1511–14 – кіеўскім ваяводам, у 1514–1516, 1518–1523, 1526, 1533–34, 1541 – *старастам* гарадзенскім, у 1520–23 – гетманам польным літоўскім, у 1522–27 – каштaлянам троцкім, з 1527 і віленскім, у 1528 – маршалкам надворным, у 1531 – гетманам вялікім літоўскім. Быў прыхільнікам Жыгімонта Аўгуста, удзельнічаў у вайне з татарамі ў 1512, узначальваў войска ў вайне з Масквой 1534–36. Праславіўся перамогамі ў 30 бітвах.

Літ.: Літоўскія метрыкі; Регионы Беларуси. Гродненская область. Т. 4, кн. 2, С. 280–281; Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 417.

Радзівіл (з Сангушкаў) **Ганна Кацярына** (1676–1746) – князёўна, жонка Караля Станіслава, канцлера вялікага літоўскага. Пасля смерці мужа вяла актыўную гаспадарчую дзейнасць – адчыніла прадпрыемства па вытворчасці дываноў у Нясвіжы, гуту і шкляную мануфактуру ў Налібаках, прадпрыемства па шліфаванні шляхетных камянёў у Белай і Янкавічах. У Гродне збудавала *палац*.

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 422.

Радзівілы – магнацкі род герба Трубы, які меў найбольшыя зямельныя ўладанні ў *Горадні*. Першыя пляцы яны атрымалі пасля выгнання з Горадні *яўрэяў* (1495). Віленскі ваявода і вялікі літоўскі канцлер Мікалай Радзівіловіч паклаў пачатак гарадзенскіх земляў Р., а працягнуў віленскі каштaлян Радзівіл Юры Мікалаевіч які меў валоданні на беразе *Нёмана*. Троцкі ваявода Крыштаф "Пярун" Р. у 1582 г. атрымаў пляц на вул. Садоўніцкай, а ягоны ўнук, ваявода навагрудскі Мікалай Р. у 1588 набыў пасэсію на вул. Віленскай. Пачынаючы з другой паловы XVII ст., Р. сістэматычна павялічвалі свой зямельны комплекс на паўднёвым баку *Рынку*. Першым быў напэўна вялікі літоўскі маршалак Аляксандр Людвік Р., пасля жонкі якога часткай сядзібы стаў валодаць з 1645 вялікі літоўскі канцлер Альбрэхт Станіслаў Р. Затым у 1683–91 гг. да Р. перайшлі пляцы літоўскай падскарбіхі Барбары Валовіч, некалькі ўчасткаў жонкі каралеўскага паручніка Зоф'і Гамельтан і мастака

Юзафа Пралейкі. У 1705 полацкі ваявода Дамінік Міхал Слушка падараваў свой *палац* літоўскаму канцлеру Каралю Станіславу Р. На мяжы XVII–XVIII стст. Р. купілі некалькі пляцаў на заходнім баку вул. Маставой, побач з *Рынкам*, і злучылі іх у адзіны зямельны комплекс. Да яго Р. далучылі ў 1735 камяніцу Міхала і яго жонкі Францішкі з *Масальскіх*, а ў 1751 – палац Казіміра і яго жонкі Крыстыны з Масальскіх. Уласнікам усяго комплекса ў паўднёвай частцы Рынку ў сяр. XVIII ст. быў харужы вялікі літоўскі Геранім Фларыян Р., а ў канцы гэтага стагоддзя – віленскі ваявода Караль Станіслаў Р. і яго пляменнік падкаморы Дамінік Геранім. Зямельныя валоданні Р. знаходзіліся і ў іншых кварталах Горадні: пляцы на Падольскай (Падольнай) вул. (у 1660-х і пач. XVIII ст.), на паўночным баку вул. Замкавай на пачатку XVIII ст. стаяў двор навагрудскага ваяводы Р.; пляцы на вул. Маставой, па правым баку, ідучы з горада; пляцы паміж вуліц Калюцінскай і Златарскай; пляц на вул. Садоўніцкай каля *замка Новага*. Некалькі дзясяткаў пляцаў Р. мелі на *Занёманскім фарштаце:* на вул. Горніцкай і Рабіёўскай, фальварак Гнойніца з палацам.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2008. – С. 216–218; Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 39–40; Obiasnienie interesu Miasta Sejmowego J.K.Mci Grodna. – Grodno, 1789. – S. 14–19.

Радзішэўскі Е. І. – гродзенскі краязнавец. Аўтар кнігі "Историческое описание г. Гродно" (Гродна, 1860). У "Памятной книжке Гродненской губернии за 1891 год" змешчаны яго артыкул "Открытие Александровского ремесленного училища в г. Гродно".

Радыё. Яго презентацыя ў Гродне адбылася 2.04.1925 г. у памяшканні гродзенскага тэатра. А. Гельдэрбрант і У. Тапор зрабілі выступленне "Што гэта такое радыё?" і прадэманстравалі па ім канцэрт. На 1.12.1933, паводле звестак А. Чарнякевіча, абанентаў было звыш 30 чал. Яны жылі на вуліцах Агароднай, *Ажэшкі,* Грандзіцкай, *Гувера, Напалеона,* Падольнай, Рабіноўскай, Францішканскай і інш.

Раёны Гродна. 7.04.1978 г. рашэннем Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР горад быў падзелены на Ленінскі і Кастрычніцкі раёны, як адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі горада. Ленінскі раён знаходзіцца ў паўночнай і паўночна-заходняй частцы Гродна на правым беразе *Нёмана.* Мяжа з Кастрычніцкім раёнам праходзіць па Нёмане і паўночным участку *чыгункі* Вільнюс–Гродна–Беласток. На тэрыторыі Ленінскага р-на знаходзіцца *гістарычны цэнтр горада* і асноўныя помнікі гісторыі і культуры. Колькасць насельніцтва на 01.07.2020 – 147,5 тыс. чал. Кастрычніцкі раён знаходзіцца ў паўднёвай, паўднёва-заходняй і ўсходняй частках Гродна. У 1978 тэрыторыя складала 3,4 тыс. га, на якой пражывала 86 тыс. чал. У 2008 і 2011 да раёна далучылі вёскі Аульс, Баранавічы, Вішнявец, Галавічы, Дзмітрыеўка,

Калбасіна, *Ласосна,* Малахавічы, Новікі, *Панямунь*, Скамарошкі, Солы, Вялікая Альшанка, пасёлкі Фабрычны і Паўднёвы. На 01.01.2020 на тэрыторыі раёна жыло 226 701 чал.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник, Минск, 1988, с. 252–253, 301–302; https://aor.gov.by/region/. Доступ 06.01.2021; https://grodnolen.gov.by

Ражанскі Фелікс (? – пасля 1903) – паўстанец 1863 г. У дзяцінстве знаходзіўся пад апякунствам графа Касакоўскага. Каморнік з Вялікай Бераставіцы. Чалец Гродзенскай *рэвалюцыйнай арганізацыі* з 1861, паплечнік і блізкі сябар *В.-К. Каліноўскага.* У 1863 быў кіраўніком у маёнтку Геранімаўка Беластоцкага ў. Пісаў вершы на беларускай мове. Адзін з выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў *"Мужыцкай праўды"*. У сваіх успамінах "З Гродзенскага ваяводства" Ражанскі пісаў: "Каліноўскі і Ражанскі ў пэўныя перыяды часу з поспехам рабілі пешыя падарожжы па шырокім краі пад розным абліччам, выкарыстоўваючы асабістыя сувязі, пашыралі свае выданні і вучылі, як і дзе трэба шукаць вызвалення ад прыгнёту". У 1863 – паўстанец атрада *В. Урублеўскага*, для партызан якога ствараў патрыятычныя песні. Пасля паражэння паўстання жыў у эміграцыі (Кракаў). Пакінуў успаміны "Z województwa grodzieńskiego" (W czterdziestą rocznicę Powstania styczniowego. 1863–1864. – Lwów, 1903. – s. 396–400). Аўтар паўстанцкіх песень на беларускай мове "Гэй-га разам хлопцы…", "Ах ты, мая чарнаброва…". Магчыма яго аўтарству належаць "Пісьмо ад Яська-гаспадара да мужыкоў зямлі польскай" і "Песні на Божы час".

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 450, 563 адв.; Кісялёў Г. Радаводнае дрэва..., с. 35; Кісялёў Г. Здарэнне з Яськам-гаспадаром // Ён жа. Смак беларушчыны. – Мінск: Лімарыус, 2013. – С. 408; Rożański F. Z województwa grodzieńskiego // W czterdziestą rocznicę Powstania styczniowego. 1863–1864. – Lwów, 1903. – S. 396–397.

Ражбіцкі Станіслаў Нарбертавіч – дваранін Гродзенскай губ., 18 гадоў, вучань 6-га класа *гродзенскай гімназіі*. Жыў у мацеры ў Гродне. Педагагічны савет гімназіі 21–22.10.1861 вырашаў пытанне аб яго выключэнні з гімназіі за спяванне забароненага польскага гімна ў гімназічным касцёле. Быў высланы ў Пружаны, дзе служыў засядацелем земскага суда ягоны бацька. Над ім усталявалі паліцэйскі нагляд. 28.04.1862 *губернатар* дазволіў пераехаць на жыхарства да мацеры, дзе над Р. працягвалі сакрэтна наглядаць. У верасні 1862 г. прынялі зноў у гімназію.

Крыніца: ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 52, 76; НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1135, а. 3, 4 адв., 28.

Ражнецкі Аляксандр (1771 ці 1774 – 1849) – гродзенскі *губернатар,* генерал дывізіі, інспектар польскай кавалерыі. Быў прызначаны *Жэромам Банапартам* губернатарам з прыходам французскіх войск у Гродна 30 чэрвеня. Перастаў быць ім магчыма 3–4 ліпеня, калі кавалерыйскі корпус М. Латур-Мабура,

у які ўваходзіла яго 4 дывізія лёгкай кавалерыі, выступіла ў пераслед Заходняй рускай арміі П. І. Багратыёна. Галоўнай справай губернатара Ражнецкага стала арганізацыя польскай улады на Гродзеншчыне (Канфедэрацыйнай рады з 12 чалавек) і ўрачыстым далучэннем войска да Генеральнай канфедэрацыі Княства Варшаўскага. Каб зразумець добра Ражнецкага як грамадскага дзеяча, успомнім такія факты з яго далейшай біяграфіі, як: шэфства над тайнай паліцыяй і арганізацыя жандармерыі (1816) у Каралеўстве Польскім, адначасова быў актыўным масонам з 1807 г. і, нават, намеснікам (1810) і Вялікім майстрам Вялікага Усходу Польскага (1821), з'яўляўся прэзідэнтам Таварыства сяброў музыкі ў Варшаве, а з 1821 – урадавай дырэкцыі варшаўскіх тэатраў.

Літ.: Швед В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гродна: ГрДУ, 2001. – С. 278; Encyklopedja wojskowa / Pod red. O. Laskowskiego. – W-wa, 1937. – T. 7. – S. 276–277; Polski Słownik Biograficzny. T. 32. – Wrocław; W-wa; Kraków: PAN, 1990. – С. 460–461.

Разанаў Васіль Данілавіч (1901, в. Красная Горка Калінінскай вобл. – 10.07.1944) – кіраўнік гродзенскай падпольнай антыфашысцкай групы. Перад *вайной Вялікай Айчыннай* і падчас акупацыі працаваў на мясакамбінаце горада, да канца 1942 стварыў групу з 12 чалавек. Быў ініцыятарам стварэння антыфашысцкіх груп у чыгуначным дэпо і на рамонтным заводзе. Група дзейнічала з верасня 1941 па ліпень 1944: перадавала медыкаменты і вопратку параненым савецкім вайскоўцам, якія хаваліся ў в. Абухава; падтрымоўвалі сувязь з партызанамі А. І. Іванова; з мая 1942 разам з падпольнай групай С. М. Лямава адпраўлялі людзей у партызанскі атрад "Кузнецкія металургі". Пасля выканання адной з такіх аперацый Р. трапіў у засаду ў р-не в. Верцялішкі. У баі Р. быў забіты. Пахаваны ў Гродне. На яго магіле ўсталяваны абеліск (1949). Яго імем у Гродне названая вуліца, на перасячэнні якой з вул. Лялевеля стаіць мемарыяльны знак.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. – Минск, 1989, с. 318–319.

Разумовіч Вячаслаў, псеўд. "Хмара" (?, Гродна – ?) – арганізатар партызанскага руху супраць палякаў у 1920-я гады. Калі пачалася *вайна Першая сусветная,* пайшоў працаваць добраахвотнікам, а затым уступіў у расійскае войска і ваяваў на турэцкім фронце на Каўказе, затым – у Галіцыі, дзе быў паранены. З вяртаннем у Горадню ўладкаваўся на працу ў кааператыў "Беларусь". Падчас савецкай улады ў Горадні, магчыма, быў камендантам горада. Затым у канцы 1920 збег у Літву. У Коўне служыў афіцэрам у фармаваным беларускім батальёне. Саюз літоўскіх стральцоў даручыў яму фармаванне партызанскіх атрадаў. У падпольную структуру ў Горадні ўваходзілі М. Карповіч, В. Юрэчка, *С. Якавюк*. У 1922 Р. быў арыштаваны літоўскай уладай і пасаджаны ў VI форт у Коўне за супрацьдзеянне развіццю літоўскай дзяржавы і гвалт над мірнымі грамадзянамі.

Літ.: Латышонак А. Жаўнеры БНР. – Менск, 2009, с. 87, 95; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў, Мінск, 2015, с. 110, 115.

Райберг Зігфрыд – *крыжак*, камендант г. Бальгі – замка ва Усходняй Прусіі, камандор Тэўтонскага ордэна. Зімой 1296 г. асадзіў гродзенскі замак, які не змог захапіць, але спаліў жылыя кварталы і ўсе ваколіцы горада. 200 чал. узяў у палон. Ёсць меркаванне, што сам Р. быў забіты пад сценамі замка.

Рак-Міхайлоўскі Сымон (14.4.1885, в. Максімаўка Вілейскага пав. Віленскай губ., цяпер Маладзечанскі р-н Мінскай вобл. – 27.11.1938, Мінск) – грамадска-паліт. дзеяч, публіцыст, перакладчык, паэт, педагог, беларускі дзеяч, пасол у польскім сейме. Скончыў Маладзечанскую гімназію (1904) і педінстытут у Феадосіі (1912). Затым вярнуўся на Радзіму, арганізоўваў бел. школы, стаў чальцом БСГ. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. узначаліў у Мінску Цэнтральную вайсковую раду. З 1918 – член Рады БНР. У 1919–20 жыў у Гродне са сваёй сям'ёй (разам з імі жылі *Смолічы*). У *гімназіі беларускай* выкладаў гісторыю (ці матэматыку, па словах *З. Верас*). Апошняя сябравала з Р.-М., разам з маці яны часта бывалі ў яго сям'і, а тыя – у іх. Падчас знаходжання бальшавікоў у Гродне ў перыяд *вайны савецка-польскай 1919–1920* Р.-М. працаваў школьным інструктарам аддзела народнай адукацыі і арганізоўваў школы ў Гродзенскім пав. Пасля адбытых арыштаў ён у кастр. 1930 перабраўся ў Мінск. 9.1.1934 рашэннем судовай калегіі АДПУ СССР быў прыгавораны да расстрэлу, але гэтым разам прысуд замянілі на 10 гадоў лагераў (на Салаўках). 14.11.1938 "адмысловай тройкай" НКУС БССР яго прыгаварылі да расстрэлу. Рэабілітаваны 16.8.1956.

Літ.: Верас З. Я помню ўсё: успаміны, лісты. – Гародня-Wrocław: Гарадз. б-ка, 2013, с. 111, 178, 258, 273–274; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў / А. Чарнякевіч. – Мінск: Янушкевіч, 2015, с. 67–68.

Раманаў Еўдакім Раманавіч (1855–1922) – беларускі этнограф, фалькларыст, археолаг. Аўтар вядомай 9-ці томнай працы "Беларускі зборнік", у якой змешчаныя матэрыялы па фальклоры і мове Гродзеншчыны – казкі, песні, прымаўкі, загаворы і д. п. У 1895 у Гродне была выдадзеная яго праца "Краткая этимология церковнославянского языка. С приложением краткого словаря".

Раманаў Мікалай Бенедыктавіч (6.04.1863 – 1927, Гродна) – губернскі архітэктар (1893–1900). Пасля заканчэння у 1887 г. Інстытута грамадзянскіх інжынераў у Пецярбургу, са званнем "грамадзянскі інжынер" і правам на чын 10 кл., прыехаў працаваць малодшым інжынерам будаўнічага аддзялення Гродзенскага *губернскага праўлення*. У 1895 ажыццяўляў нагляд за рамонтам турмы, у 1899 – рамонт будынку будаўнічай камісіі. У 1886–1889 гг. зацверджаны ў чыне калежскага сакратара, і за выслугу гадоў атрымаў чын

тытулярнага дарадцы. З 10.1890 – малодшы архітэктар будаўнічага аддзялення, з 23.03.1893 – губернскі архітэктар. У Гродне перабудаваў гродзенскую *турму* (1895), каменную пабудову пры губернаторскім палацы з гаспадарчымі памяшканнямі (1896). З мая 1900 г. прызначаны на пасаду ст. інжынера па дарожнай частцы Гродзенскага губернскага распарадчага камітэта. Пад яго кіраўніцтвам пабудаваны *мост Губернатарскі* праз *Гараднічанку* (1901). У 1904 разам з інжынерам Лангардам Л. склаў праект будынка *дома Народнага*. З 1905 на службе ў палаце дзяржаўнай маёмасці, ў 1910 атрымаў узнагароду як грамадзянскі інжынер за выдатны вынік па пабудове *моста Пятроўска-Нікольскага* праз *Нёман*. Падчас *вайны Першай сусветнай* будаваў, аднаўляў разбураныя баявымі дзеяннямі дарогі. У сувязі з хранічнай хваробай адкамандзіраваны ў Гродна, потым быў эвакуяваны. Сябра дабрачыннага таварыства і *брацтва Сафійскага*. У 1925 распрацаваў праект агароджы для *моста* праз *Гараднічанку*, будаваў школу № 8 на *Фарштаце*. У 1927 памёр, пахаваны за кошт магістрата на *могілках праваслаўных* у Гродне. Гарадская рада выплачвала яго ўдаве па 100 злотых штомесячнай дапамогі. Жыў на Паліцэйскай вул. За сваю працоўную дзейнасць атрымаў шэраг узнагарод: залатая шпілька з ізумрудам ад Аляксандра III (1894); ордэн св. Станіслава 3-й ст. (1895); залаты гадзіннік з ланцужком ад Мікалая II (1897); срэбны медаль у памяць аб праўленні Аляксандра III на Аляксандраўскай стужцы (1897); ордэн св. Ганны 3-й ст. (1900); ордэн св. Станіслава 2-й ст. (1911); медаль у гонар 200-годдзя Дома Раманавых.

Літ.: Памятная кніжка Гродзенскай губерні за 1889 – 1898 гг.; Чарапіца В.М., Гродзенскі праваслаўны некропаль (с древнейших времён до начала XX века). – Гродна, 2001, с. 178 – 180; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 209–210.

Раманаў Юры Іванавіч (21.03.1949, г. Сцепанаван, Арменія) – гродзенскі архітэктар. З 1977 па 1982 працаваў у "Грамадзянпраекце" кіраўніком архітэктурнай групы. У 1978 прыняты ў сябры Саюза архітэктараў. У 1982–84 – архітэктар у Гродзенскіх вытворчых мастацкіх майстэрнях. У 1984–86 быў у Венгерскай народнай рэспубліцы і працаваў архітэктарам у г. Будапешце. З 1986 па 1987 займаўся вытворчасцю рэкламы на камбінаце. З 1987 будаваў у Гродне: гасцініца "Гродна" (комплекс), мікрараён *Румлёва*.

Літ.: Романов Юрий Иванович // Кто есть Кто в Республике Беларусь. Архитекторы Беларуси. – Минск: Энциклопедикс, 2014; Романов Юрий Иванович // Архитекторы Советской Белоруссии: Биогр. справочник / Сост. В. И. Аникин и др. — Мн.: Беларусь, 1991.

Ранчашак Антоні (14.12.1898, Чэлядзь – 11.3.1957, Варшава) – прэзідэнт Гродна (1929–1930). Скончыў гандлёвую школу ў Бэндзіне (1916), юрыдычны факультэт Кракаўскага ўніверсітэта (1919), факультэт сельскай і лясной гаспадаркі Пазнаньскага ўніверсітэта (1923). У апошнім узначальваў Хрысціянскі

студэнцкі саюз. У 1920 удзельнічаў у *вайне польска-савецкай*. У 1924–1927 быў бурмістрам г. Чэлядзь, затым – кіраўніком аддзела працы і грамадскай апекі Палескага ваяводства (1927–1929). Прэзідэнтам Гродна да 31.08.1930 стаў паводле пастановы беластоцкага ваяводы ад 26.08.1929. Відаць, не вельмі добра праявіў сябе на гэтай пасадзе, бо пасля сыходу Рада большасцю галасоў зменшыла яму выплаты. Далей працаваў інспектарам Беластоцкай ваяводскай управы (1930–1935), прэзідэнтам Тамашава Мазавецкага (1935–1939). Падчас *вайны Другой сусветнай* быў арыштаваны гестапа ў Пёткраве Трыбунальскім. Пасля вызвалення займаўся ўласнай гаспадаркай у Чэлядзі. Пасля вайны кіраваў фірмай "Celofan W. Rączaszek i S-ka" (1945–1949) і быў старшынём кола Саюза сялянскай самадапамогі. У 1956–1957 працаваў у Варшаўскім бюро праектаў і з'яўляўся старшынём Камітэта па адбудове польскай сталіцы.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 210–212; R. Kotewicz. Rączaszek Antoni // Tomaszowski słownik biograficzny. T. 2, s. 17–19; L. Sawoniewski. Saga o Grodnie. Łódź, Białystok, 1999, s. 66.

Рапапорт Павел Аляксандравіч (29.06.1913, Пецярбург – 11.09.1988, Ленінград) – доктар гістарычных навук, архітэктар, даследчык у галіне старажытнарускага будаўніцтва, кіраўнік навуковага напрамку архітэктурнай археалогіі. Даследаваў болей за 800 старажытнарускіх крэпасцей і іх рэшткаў. Разам з А. А. Трусавым даследаваў *царкву Ніжнюю* і *церам княскі* XII ст. на *Замковай гары* ў Гродне (1981), сцяну з цэглы 2-й паловы XII ст. тамсама (1985). Аўтар рэканструкцыі выгляду Гродна ў XII–XIII стст. (*музей Гродзенскі гісторыка-археалагічны*). Аўтар кніг: "Русская архитектура XII–XIII веков" (1982); "Зодчество древней Руси" (1986) і інш. (звыш 180 навуковых твораў).

Раннін Мікалай Васільевіч (1734–1801) – літоўскі генерал-губернатар і галава *Вярхоўнага літоўскага праўлення*. Князь. Сын рускага генерала В. А. Рапніна і ўнук генерал-фельдмаршала Анікіты Рапніна (любімца *Пятра I*), пляменнік ўсемагутнага расійскага канцлера М. Паніна. Меў добрую адукацыю, ведаў дасканала французскую, італьянскую і нямецкую мовы. Дырэктар сухапутнага даследчыцкага корпуса (1763). Паўнамоцны міністр у Польшчы, дзе дамогся (сумесна з К. Радзівілам) дамовы аб свабодзе веравызнання і грамадзянскіх праў усіх дысідэнтаў (1767). Пастаянна баяўся прывіду рэвалюцыі, спаць яму не давала дзейнасць патаемных таварыстваў, хаця сам належаў да масонаў і ілюмінатаў, а таксама да філасофска-рэлігійнай школы марцініstаў. Удзельнік руска-турэцкіх войнаў (1770–1774, 1787–1791). Паўнамоцны пасланнік у Турцыі, генерал-губернатар у Смаленску і Оршы, пскоўскі генерал-губернатар (1781). У *1794* пасланы на падаўленне *паўстання* ў Літве і Беларусі. Генерал-аншэф. Эстляндскі, Курляндскі і Віленскі генерал-губернатар (да 10.11.1794). Гродна стала яго рэзідэнцыяй і цэнтральным урадавым пунктам для кіравання, мірнага уладкавання "літоўскіх" губерняў. Яго палітычным ідэалам была Расія, створаная Кацярынай II, "і маральна прасветленая,

і больш дабрабытная". І пад гэтую мерку ён падганяў край, якім стаў кіраваць. А яшчэ Р. дастаўся абавязак запяспечваць жыццё *Станіслава Аўгуста Панятоўскага*, калі ён жыў у Гродне пасля 2 *падзелу Рэчы Паспалітай*. Выконваў сцісла волю і загады Кацярыны ІІ, якія тычыліся вялікага князя літоўскага і караля польскага, але стараўся іх злагодзіць і рабіць менш цяжкімі. Польскі даследчык П. Быкоўскі піша: "(…) палітыканстваваў стары дыпламат, каб выйсці цэлым з гэтай двухсэнсоўнай пазіцыі, сваю манархіню задаволіць і ў вачах Еўропы не выглядаць "прыхільнікам парадка, які падае". Фельдмаршал, камандзір літоўскай дывізіі і вайсковы губернатар Рыгі (8.12.1796). Пасля няўдалага пасольства ў Берліне і Вене (1798) быў звольнены са службы і пасяліўся ў Маскве.

Літ.: : Де Пуле. М. Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794–1797 годах. Изд. 2-е. – СпБ., 1871. – С. 25–27; P.J. Bykowski. Dwór królewski w Grodnie. Epizod biograficzny (1795–1797)/ – Warszawa, 1884. – 152 s.

Расійская сацыял-дэмакратычная рабочая партыя (РСДРП), гродзенская арганізацыя. Аформілася пасля ІІ з'езда РСДРП у 1903 г. (бальшавікі і меншавікі). Распаўсюджванне марксізму ў Гродне пачалося з *гуртка рэвалюцыйнага* (1887–94), *гуртка П. І. Шумава* (1895–96), Гродзенскай рабочай арганізацыі (1897), *Польскай сацыялістычнай партыі ў Літве* і Сацыял-дэмакратычнага *камітэта Бунда*. Уваходзіла ў Паўночна-Заходні камітэт РСДРП. Некаторыя чальцы названых арганізацый і партый распаўсюджвалі газету "Іскра". У ёй можна знайсці і артыкулы пра Гродна. Летам 1905 гродзенскія бальшавікі (іскраўцы) усталявалі цесную сувязь з Віленскім акруговым камітэтам РСДРП і ў канцы года падрыхтавалі базу для стварэння ў студзені 1906 Гродзенскай групы РСДРП. Летам 1906 была створаная гродзенская акруговая арганізацыя, у якую гарадская група ўвайшла на правах камітэта. У сяр. снежня 1907 ён быў разгромлены паліцыяй, а адноўлены ў снежні 1908. Гродзенцы ўдзельнічалі ў студзені 1909 у працы з'езда сацыял-дэмакратычнай партыі Каралеўства Польскага і Літвы (СДКПіЛ). У Гродне група мела ў 1909–1912 перасылачны пункт сацыялістычнай літаратуры (газеты "Социал-демократ", "Рабочая газета", "Звезда", "Правда" і інш), а ў *Ласосне* – прыёмны пункт. З 1909 экспедытарамі былі Лебіт П. і яго жонка Лебіт К. Група падтрымоўвала сувязі з ЦК РСДРП, з рэдакцыямі газет "Звезда" (Пецярбург) і "Рабочая газета" (Парыж), збірала грошы ў фонд газеты "Правда".

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 70, 72–75; Гродно: Энцикл. справочник, Мн., 1989, с. 155–156; Савіцкі Э.М. Месца стварэння і дзейнасці гродзенскай арганізацыі РСДРП // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі:. Гродзенская вобл. – Мн.: БелСэ, 1986. – С. 70; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005). – Гродна, 2020, с. 184, 185, 195.

Расіяне. Пазней за іншыя этнасы з'явіліся ў Горадні для пасялення і працы. Відаць, першымі аселымі сталі 37 палонных падчас бітвы пад Воршай 1514 г. Сярод іх была і група купцоў. "Маскоўскім вязням" Жыгімонт Стары дазволіў

“поспол з местом права […] майборского вживати”. У актавых кнігах 1540 ёсць прозвішчы расійскіх купцоў (“маскавіцінаў”), якія запісаліся ў шэрагі мяшчан. Сярод іх: Іван Чудзін, Баразна з Лук, Іван Сабельнік, Лука Іванавіч. У часы рэформ *А. Тызенгаўза* Р. былі запрошаныя на працу ў мануфактурах. Большасць Р. наехала пасля падзелаў Рэчы Паспалітай і адыходу Гродна да Расійскай імперыі: чыноўнікі ўстаноў, выкладчыкі, вайскоўцы і паліцэйскія, дзеячы культуры.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 271–272.

Ратайка Пётр Іванавіч (13.01.1898, в. Пескі Кобрынскага ў. Гродзенскай губ. – 1972, Мінск) – дзяржаўны дзеяч БССР, *ганаровы жыхар* Гродна (1967). Скончыў мясцовую трохкласную школу (1912), з 14 год пачаў працаваць. У верасні 1915 сям’я эвакуявалася ў Арэнбург, дзе працаваў на чыгунцы. У 18 год патрапіў на фронт у Расійскую армію (1916). Падзеі кастрычніка 1917 сустрэў у складзе 18-га стралковага палка (радавым, затым палітруком). Удзельнічаў у баях з войскамі генерала Дутава і арміяй Калчака. Чалец Камуністычнай партыі з ліпеня 1920.

Пасля дэмабілізацыі пасяліўся ў Беларусі, дзе ў Мінску скончыў Камуністычны ўніверсітэт. Да 1939 працаваў старшынёй выканаўчых камітэтаў (валасных, раённых і абласных) у Мінскай і Магілёўскай абласцях. Са снежня 1939 да 1941 быў старшынёй Гродзенскага *гарадскога савета*. З першых дзён *вайны Вялікай Айчыннай* быў на фронце (Бранскім, 3-я армія). Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Восенню 1943 Р. накіраваліў СНК БССР (у Гомель). Стаў намеснікам старшыні СНК БССР (1943–1944). З 1.07.1944 – старшыня Беластоцкага, а затым Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта Саветаў дэпутатаў працоўных (20.08.1944 – 1.01.1948). Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга (1944). Начальнік Галоўнага ўпраўлення рыбнай прамысловасці пры Савеце міністраў БССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1938–1955).

Літ.: Ермоленко В. А., Черепица В.Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 315.



С. 888

Ратуша – рэзідэнцыя гарадской адміністрацыі – *магістрата*, знаходзілася на *Рынку* Гродна. Пабудаваная паводле *прывілея Аляксандра Ягелончыка* 1496 г. Упершыню згадваецца ў 1526. У горадзе змянілася некалькі будынкаў ратуш, пра што гавораць гравюры XVI–XVII стст. Верагодна, першая бачная на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта* 1568. Пабудавалі ратушу на рагу вул. Замкавай і *Рынку* мясцовыя будаўнікі. Яна была двухпавярховая і драўляная да канца 1580-х гадоў, але не выключана, што сутарэнні і першы паверх былі мураваныя. На вежы ратушы знаходзіўся гарадскі *гадзіннік*, мелася супрацьпажарная пляцоўка. Паседжанні магістрата праходзілі ў памяшканнях 2 паверха. А на першым размяркоўваліся крамы, памяшканне, дзе захоўваліся меры збожжа (бочка ратушная), мёду (мёдніца), “камора для пастрыгання сукна”. Пад Р. была вязніца/ “турма меская”.

І. Трусаў лічыць, што на *гравюры Т. Макоўскага 1600 г.* знаходзіцца выява гродзенскай мураванай ратушы, пабудаванай у прамежку 1586–1600 гадоў падчас разбору драўлянай *Фары Вітаўта* і перапланіроўкі Рынку. Падчас *вайны руска-польскай 1654–1667* гэтая ратуша была зруйнаваная маскоўскімі войскамі, і паседжанні *магістрата* адбываліся ў камяніцах бурмістраў і райцаў, размешчаных на Рынку. Прыняцце станоўчага рашэння ў 1673 аб прызначэнні Горадні месцам правядзення *сеймаў* паскорыла і вырашэнне пытання аб Р. Рашэнні аб аднаўленні Р. стаялі на паседжаннях 1678, 1685, 1690. Потым перашкодзіла *вайна Паўночная*. На плане 1705 відаць, што старая ратуша (з надпісам “базар”) закінутая, і тут размеркаваліся гандляры, а на Рынку ёсць прыватная камяніца з надпісам “ратуша”. У 1713 улады выдалі распараджэнне, каб *яўрэі* спынілі гандаль у крамах ратушы і далі для яе адбудовы 50 тыс. цаглін ды іншыя матэрыялы. У 1730 нават дайшло да бойкі з яўрэямі, якія закідалі камянямі бурмістра В. Цяхлевіча і мулыраў.

Наступная ратуша была пабудаваная з цэглы ў комплексе з гандлёвымі радамі ў 1784 г. Зафіксаваная на *планах Гродна* 1793, 1795, 1798. Р. складалася з двух невялікіх аб’ёмаў, якія былі ўкампанаваныя ў паўночны і паўднёвы карпусы радоў. Ратуша была двухпавярховай і мела шасцікалонныя порцікі класічнага тыпу на паўднёвым і паўночным фасадах і васьмікалонны порцік паўночна-усходняга фасада, якія трымалі трохвугольны франтон. У падзямеллі Р. знаходзілася гарадская вязніца. У двор будынка вялі арачныя праезды. Акрамя магістрата і гандлёвых радоў тут знаходзіліся ў розныя часы розныя дзяржаўныя ўстановы: паліцыя, гаўптвахта, *дума гарадская*, сіроцкі суд. У другой палове XIX ст. будынак сталі называць “гостинный двор”. Мураваная ратуша прастаяла да 1949 г., калі была знесеная.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 35–40; Квитницкая Е.Д. Планировка Гродно в XVI-XVIII вв. – Архитектурное наследство. – № 17. – 1964. – С. 25; Квитницкая Е.Д. Центры городов Белоруссии в XVI – первой половине XIX в. // Архитектурное наследство. № 31. – М., 1983. – с. 30; Саяпин В. История Гродненских площадей. – Гродна: ЮрСаПринт, 2011. – С. 11; Супрон М. Гарадзенская ратуша (гасцінны двор) у XIX – пачатку XX ст.: функцыі і знешні выгляд // Гарадзенскі гадавік, Кракаў. – 2014. – №. III. – С. 95–105; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVII веков. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 14–18; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшая школа, 1969. – С. 111.

“Ратуша” – гродзенскае абласное грамадскае аб’яднанне, было зарэгістраванае ўпраўленнем юстыцыі Гродзенскага аблвыканкама 24.04.1996 і перарэгістраванае 30.09.1999. Паводле статута Р. павінная садзейнічаць развіццю гуманітарнай адукацыі, культуры, навукі, аховы здароўя, СМІ, права, рынкавай эканомікі, міжнародным кантактам і супрацоўніцтву, аказваць арганізацыйную і іншую падтрымку фальклорных і музычных калектываў, садзейнічаць правядзенню сустрэч гродзенцаў з вядомымі гісторыкамі і дзеячамі культуры, распрацоўваць і праводзіць адукацыйныя праграмы па актуальных пытаннях

С. 889

прававога, эканамічнага і палітычнага жыцця Рэспублікі Беларусь. Р. з'яўлялася асноўным выканаўцам міжнароднага праекта "Інтэрнэт" для НДА, які рэалізоўваўся Праграмай развіцця ААН у Беларусі. Партнёрамі Р. былі больш за 100 зарэгістраваных грамадскіх аб'яднанняў, а таксама незарэгістраваных грамадзянскіх ініцыятыў. На дасягненне статутных мэтаў і задач Р. прыцягвала фінансавыя сродкі і іншыя віды дапамогі. Грамадзянская справа аб ліквідацыі аб'яднання паступіла 24.04.2003. Пазоўнікам было абласное ўпраўленне юстыцыі. 22.05.2003 і 21.08.2003 суд разбіраў справу аб закрыцці Р. на падставе 2 парушэнняў (наяўнасць рызографа і выкарыстанне яго без паліграфічнай ліцэнзіі), за якія яе кіраўнік *Мілінкевіч А. В.* быў аштрафаваны, а Р. зачыненая. Пазней на яе аснове была створаная грамадская арганізацыя Таварыства беларускай школы.

Літ.: Лабовіч А. Грамадскае аб'яднанне "Ратуша". – Гродна, 2006; http://niva.bialystok.pl/issue/2002/50/art_04.htm Доступ 07.01.2021; http://www2.polskieradio.pl/eo/dokument.aspx?iid=2277. Доступ 07.01.2021; http://spring96.org/be/news/417. Доступ 07.01.2021.

Рашкевіч Аўгустын – архітэктар, з 1746 г. быў звязаны з Радзівіламі ў Гродне. У 1748–51 будаваў ім тут палац, размеркаваў дзядзінец і закладваў сад.

Літ.: Szymański S., Pałac królewski w Grodnie // Rocznik Białostocki. T. VI. – 1966. – S. 323.

Ржэўскі Браніслаў (?–1980) – кандыдат філалагічных навук, з 1955 – выкладчык беларускай літаратуры ў Гродзенскім педагагічным інстытуце. За акцыі ў абарону беларускай мовы і культуры (шляхам адкрытых лістоў і зваротаў) быў у лютым 1957 г. арыштаваны падчас лекцыі. У яго асабістай бібліятэцы знайшлі і сканфіскавалі беларускія і польскія газеты, выдадзеныя ў міжваенны час, рукапісы яго вершаў, дзе ён называў Сталіна забойцам. Ржэўскі быў асуджаны на сем год зняволення ў лагеры ў Мардовіі "за паклёп на савецкі грамадскі лад, савецкую рэчаіснасць і на нацыянальную палітыку камуністычнай партыі і савецкага ўраду". Праз 4 гады вярнуўся ў Гродна пад нагляд КДБ. Да выкладчыцкай працы ў інстытуце не дапускалі, артыкулы не друкавалі. З цяжкасцю ўладкаваўся ў сярэдняй школе.

Літ.: Валодзін У. Браніслаў Ржэўскі і яго пратэст супраць русіфікацыі // Гарадзенскі гадавік. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2020. – С. 63–79; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гродна-Вроцлаў: Гарадзен. б-ка, 2014. – С. 453–454.

Ровар. Спачатку ў Гродне з'явіўся імпартны ("Badenia", "Rower"), а ў 1920–30-я гады ровары пачынае прадукаваць прадпрыемства Старавольскага, заснаванае ў 1894 (Kresowa Wytwórnia Rowerów i Motocykli "Niemen"). У ліпені 1925 гродзенская павятовая паліцыя атрымала прапанову ад Таварыства з абмежаванай адказнасцю "Mercato" (Варшава, генеральнае прадстаўніцтва фабрык роваряў – англійскай "Bury" і бельгійскай "Janus"). Прапаноўвалася набыць ровары маркі "Żylet" па аптовым кошце за 210 злотых (аплата наяўнымі 40 злотых, астатнія ў крэдыт на 9 месяцаў). Камендант павятовай паліцыі

Ю. Макарэвіч выказаў падтрымку і звярнуўся да кіроўных органаў мясцовай паліцыі. У 1936 прадпрыемства Старавольскага зрабіла 10 тыс. роварaў. Па сутнасці гродзенскія ровары былі сімбіёзам найлепшых нямецкіх і англійскіх машын. Распаўсюджваліся не толькі па Беларусі, але і ў прыбалтыйскім рэгіёне і Польшчы. Выкарыстоўваліся не толькі ў прыватных мэтах, але і для пошты, у вайсковых аддзелах сувязі. Вытворчасць была спыненая *вайной Другой сусветнай* у 1939 і больш ніколі не адноўленая. У часы Расійскай імперыі ў Гродне на месцы, дзе цяпер *заапарк,* знаходзіўся роварны трэк. Яго ўспамінае Г. Рот, якая піша, што летам там былі спартовыя спаборніцтвы, а зімой – ледзяная дарожка. Для язды на ровары гарадская дума 5.06.1900 выдала спецыяльную пастанову, адпаведна з якой ехаць можна было толькі па правым баку дарогі, забаронена па тратуарах і ў месцах масавага збору жыхароў (напрыклад, у парках); трэба было мець нумар на ровары ў адпаведным месцы – ззаду, а не спераду ці на коле.

Крын. і літ.: ДАГВ, ф. 26, воп. 1, с. 12, а. 85; ф. 92, воп. 1, с. 8, а. 7; Вайцэховіч З. Транспарт. Ч. 1. Конка, трамваі, аўтобусы, ровары, матацыклы. – Мінск: УП "Камет", 2008. – С. 74–76; Черепица В. …Не потерять связующую нить: История Гродненщины XIX – XX столетий в событиях и лицах (исследования, документы, комментарии): Монография. – Гродно: ГрГУ, 2003. – С. 184–185; Helena z Janczynowskich Roth, Czasy. Miejsca. Ludzie. Wspomnienia z kresów wschodnich, Kraków, 2009, s. 101.

Ромер Севярын Аляксандравіч, меў 44 гады ў 1864 г., нарадзіўся ў Губінцы Гродзенскага ў., з дваран Курляндскай губ., скончыў Віленскую гімназію. З 1846 г. служыў у конназаводстве Віленскай губ., меў ордэн Св. Ганны 3-й ступені, калежскі асэсар. Жанаты, дзяцей не меў. Прадвадзіцель дваранства Гродзенскага ў., рэвалюцыйны касір і рэферэнт казны падчас паўстання 1863–64 гг. У яго *гатэлі* ў Гродне па вул. Дамініканскай (цяпер Савецкая) у красавіку ці маі 1862 адбыўся сход чальцоў *гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі* па раскладцы падаткаў на памешчыкаў пад кіраўніцтвам *С. Солтана*. 13 красавіка 1864 у кватэры Ромера (у гатэлі) быў зроблены вобыск, падчас якога знайшлі лісты на польскай мове, рэвальвер з прыладамі да яго, штуцар і шпагу. У гэты ж дзень вобыск адбыўся ў маёнтку Ромера Губінка, знайшлі рэвальвер амерыканскай сістэмы з 20 зарадамі. У ноч з 13 на 14.04 былі арыштаваныя Ромер ды яго жонка і адвезеныя ў гродзенскую *турму*. Прыгавораны да крапасных катаржных прац на 10 гадоў. Пазней Ромер быў высланы разам з жонкаю ў Табольскую губ., дзе яны знаходзіліся прыкладна да 1867–1869, калі выехалі ў Цвярскую губ. Маёнтак і гродзенскі дом па вул. Дамініканскай секвестравалі, але вярнулі па аплаце 10% збору. Цікава, што ў 1870 г. МУС даслала просьбу да гродзенскага губернатара аб атрыманні ад Р. 30 руб. за дадзены яму 19.08 ордэн Св. Станіслава 2-й ступені. Віленскі генерал-губернатар пісаў гродзенскаму губернатару, што выдачу ордэна стрымаў М. М. Мураўёў, але Р. не пазбаўлены права на атрыманне ордэна, а таму канцылярыя высылае знакі для "выдачи по принадлежности". У той час Р. жыў у Пскове.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 2025, а. 239, 339–340, 354 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 12, 42, 124–135 адв.; с. 1, а. 265 адв., 553 адв.; ф. 23, воп. 1, с. 373, а. 2; 372, а. 117 адв.; Электронны рэсурс: narod.ru|1864|Ssilka-ZapSib.html. Дата доступу: 15.01.2013.

Ромер Тэадора Тадэвушаўна – жонка Ромера Севярына, 43 гады ў 1864 г., нарадзілася ў маёнтку Аўсянішкі Троцкага ў. Віленскай губ. (дзявочае прозвішча Матушэвіч). Старшыня гродзенскага павятовага жаночага камітэта (або камітэта апекі) з абавязкамі збіраць ад памешчыц, якія жывуць у горадзе, узносы (было сабрана каля 400–500 руб.), сачыць за шыццём бялізны паўстанцам, дапамагаць бедным сем'ям, з якіх дзеці пайшлі ў паўстанцкі атрад, падаваць справаздачы аб прыходзе і расходзе збіраных сум грошай. У сваіх паказаннях адмовілася ад таго, што выконвала функцыі старшыні. Сасланая ў Казанскую губ., але ўпрасіла суд, каб выслалі разам з мужам у Табольскую губ.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 39 – 40 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 12, 55, 123 адв., 159–159 адв.; с. 1, а. 132; Jodkowski. Rok 1863… // Echo Grodzieńskie. – 1921. – № 173. – S. 3.

Ром Барух бар Рабі Юзаф (1750–1803) – выхадзец з Галіцыі, які адкрыў яўрэйскую друкарню ў м. Азёры каля Гродна, потым перавёў яе ў Гродна (*друкарня Рома*), дзе яна працавала з 1799 па 1803. З 1788 па 1792 Р. кіраваў ці арандаваў друкарню каралеўскую ў Гродне. Магчыма, Р. быў першым з яўрэяў, хто атрымаў дазвол на кіраванне дзяржаўнай друкарняй. У 1792, магчыма, набыў ва ўласнасць яўрэйскую частку друкарні і ў 1799 пераехаў у Вільню, дзе паклаў пачатак вядомай друкарні Ромаў, якая існавала да 1925 г. У 1803 пасля смерці Баруха Р. гродзенскую і віленскую друкарні ў спадчыну атрымаў яго сын *Ром Менахем Ман Манес*.

Літ.: Łojek J. "Gazeta Grodzieńska" 1776 – 1783. // Rocznik Historii Czasopiśmiennictwa Polskiego. – 1966. – T. 5, z. 2. – S. 16; Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku. Zeszyt 5. Wielkie Księstwo Litewskie. / Oprac. A. Kawecka-Gryczowa, K. Korotajowa, W. Krajewski. – Wrocław, Kraków, 1959, S. 6, 94, 102; Encyklopedia wiedzy o książce. – Wrocław, Warszawa, Kraków, 1971. – s. 586.

Ром Менахем Ман, Манес (?–1841) – друкар. Пасля смерці свайго бацькі Рома Баруха атрымаў ягоныя яўрэйскія друкарні ў Гродне і Вільні ў спадчыну. У 1823 разам з *Жымелем Нахімовічам* адкрыў польскую друкарню пад назвай "Манес і Жымель". Выдалі ў ёй "Gramatyka języka żmudskiego" ("Граматыка жмудскай мовы") К. Касакоўскага. З 1835 па 1854 друкавалі Талмуд Вавілонскі. Нашчадак Менахема Мана Р. – яго сын Іосіф Рэувен (Рубін) Р. (?–1858) і ўнукі – Давід (?–1860), Манкель і Манес Р. паспяхова працягнулі сямейную справу. Да 1863 валодалі манапольным правам яўрэйскага друку на тэрыторыі Літвы і Беларусі. Пасля смерці Давіда фірму "Друкарня ўдавы і братоў Ром" узначаліла ягоная жонка Двойра/Дэбора (у дзявоцтве Гаркаві, ?–1903).

Акрамя Талмуда выпускаліся творы равіністычнай літаратуры, літургічныя кнігі, малітоўнікі, Літ. Гаскалы, свецкія літ. творы. Друкаваўся часопіс на іўрыце "Та-Кармел".

Літ.: Российская еврейская энциклопедия. Т. 2. М., 1995, С 495; Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 437; Venclova T., Wilno. Przewodnik biograficzny. – Warszawa: PIW, 2013. – С. 186.

Рубінштэйн Антон Рыгоравіч (28.11.1829, в. Выхваценец Падольскай губ. – 20.11.1894, Пецяргоф) – адзін з вялікіх піяністаў, кампазітар, дырыжор, педагог і музычны грамадскі дзеяч. 26.07.1885 г. у зале Англійскага палаца (Пецяргоф) зрабіў дабрачынны канцэрт на карысць гараднян, якія пацярпелі ад *пажару 1885*. Сабраныя 2,5 тысячы руб. былі пасланыя ў Гродна (у той час карова каштавала 3 руб.).

Рубінштэйн Меір Абрамавіч – адзін з вядомых гродзенскіх фотамайстроў. Яго атэлье знаходзілася на вул. Дамініканскай, 21, а пазней у доме Чартка па той жа вуліцы, дом 20. Існавала з 1905 да сяр. 1920-х (у 1927 яшчэ працавала). Адныя аўтары гавораць пра тое, што Р. загінуў падчас нямецкай акупацыі. Іншыя пішуць, што ён выехаў у Мексіку, а атэлье перайшло Нахману Рубінштэйну. Апошні, на думку Ф. Варашыльскага, мог быць ягоным братам і меў дачку Сару, якая дапамагала яму ў атэлье.

Літ.: Sawicka E. Kochane Grodno i kochana miłość // granica.pl.; Woroszylski F. "Kochane Grodno i kochana miłość" czyli Sara córka Nachmana // MyGrodnocards.

Рубінштэйн Мойшэ (1906, Гродна – 1980, Мехіка) – публіцыст. Вучыўся ў ешыве, затым у тэхнікуме ў Вільні. З 1936 – у Мексіцы. Літаратурную дзейнасць пачаў у 1925 у гродзенскай штотыднёвай газеце "Гроднер момент", у 1926 выдаваў штотыднёвік "Унзер лебн", рэдагаваў шэраг яўрэйскіх перыядычных выданняў.

Рукапісы філасофскія гродзенскія – каля 50 трактатаў аб'ектыўна-ідэалістычнага напрамку, напісаныя на лацінскай мове у канцы XVII – пач. XIX ст. выкладчыкамі філасофіі мясцовых навучальных устаноў, пераважна сябрамі бернардзінскага, некаторыя – дамініканскага, езуіцкага, кармеліцкага і інш. каталіцкіх ордэнаў. Сярод аўтараў А. Бандалевіч, М. Дамашэвіч, Л. Дулевіч, Б. Мажэйка, Ю. Мышкоўскі, Ф. Пшыленскі, Б. Станкевіч, І. Стырпейка і інш. Яны прапаведавалі тэалагічны пункт гледжання на стварэнне свету Богам, аднак у тлумачэнні асобных філасофскіх праблем дапускалі адхіленне ад ідэалізму і набліжаліся да матэрыялізму, прызнавалі геліяцэнтрычную сістэму Каперніка. У рукапісах XVIII ст. абмяркоўваліся пытанні існавання жыцця на іншых нябесных целах. Р. захоўваюцца ў рукапісным аддзеле навуковай бібліятэкі Вільнюскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя В. Капсукаса.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. – Минск: БелСэ, 1989. – С. 168–169; Пяткевіч А.М. Слова і кніга Прынёмання. Зборнік навуковых артыкулаў. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 13.

Рукевіч Міхал Янавіч (у 1823 г. меў 28 год) – філамат, сябра таварыства прамяністых, філарэт. Родам з маёнтка Гозьная Нараўскай парафіі Беластоцкага пав. Скончыўшы Беластоцкую гімназію, паступіў у 1817 у Віленскі ўніверсітэт і вучыўся там на факультэце права да 1.07.1820. Меў ступень кандыдата права (1817). Бацькі прадалі свой маёнтак, пакінулі сыну капітал, на які ён, відаць, і вёў гаспадарку пасля ўніверсітэта (у жніўні 1821 тут гасціў А. Міцкевіч). Быў прыцягнуты да следства па справе філарэтаў, аднак, з-за адсутнасці доказаў пра яго ўдзел у філарэцкім таварыстве, быў 24.01.1824 вызвалены. З яго была ўзятая падпіска і прысяга, што ён не будзе належаць да патаемнага таварыства. Аднак сваё абяцанне ён не выканаў. Наадварот, стаў арганізатарам філарэцкага таварыства ў Гродне, беластоцкага Таварыства згодных братоў (пазней Заране) і ініцыяваў стварэнне ў ліпені 1825 Таварыства ваенных сяброў у Літоўскім асобным корпусе, размешчаным у Гродз. губ. Яно падняло паўстанне Літоўскага піянернага батальёна ў м. Браньск пад Беластокам 24.12.1825. Пасля следства быў сасланы ў Сібір.

Крын. і літ.: ЛДГА, ф. 567, воп. 2, спр. 1317, ч. 14, а. 1–1 адв., 7–11; спр. 2089, а. 43–44, 107–10; спр. 2091, а. 129 адв.; ВУ, аддзел рукапісаў, ф. 24, спр. 88, а. 3–6; Швед В.В. Губернскі Гродна: аповяды з гісторыі горада (канец XVIII – пач. XX ст.) – Баранавічы, 2003, с. 60–61.

Рукевічы – дзекабрысткі, сёстры *М. Рукевіча* Карнэлія і Ксаверыя. За неданясенне аб патаемным Таварыстве ваенных сяброў у Літоўскім асобным корпусе на тэрыторыі Гродзенскай губ. (гэта ён 5.01.1826 адмовіўся прысягнуць расійскаму імператару Мікалаю I) і спаленне зялёнага куфэрка з дакументамі таварыства былі прыгавораныя да арышту ў сценах гродзенскага *кляштара брыгітак*: Карнэлія з 22.05 да пачатку снежня (не раней за 6) 1827 і Ксаверыя з 22.05.1827 да 3.06.1828. Пасля вызвалення Карнэлія жыла ў маёнтку бацькі свайго жаніха К. Г. Ігельстрома, а з вызваленнем сястры пасялілася разам з ёю ў сваяка – гродзенскага *павятовага маршалка/прадвадзіцеля дваранства* К. Бажэнцкага. Сёстры падтрымлівалі брата Рукевіча М., сасланага ў Сібір, перапісваліся з жонкамі расійскіх дзекабрыстаў. Карнэлія збіралася паехаць да жаніха ў Сібір і атрымала ў гэтай сувязі ліст ад М. М. Валконскай (ён не дайшоў да адрасата і захаваўся ў НГАБ у Гродне).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 2, с. 1892, а. 5–6, 10–13; Букчин С.К. К мечам рванулись наши руки… – Минск, 1978; Декабристы: Библиографический справочник. – М, 1988. – С. 361, 364–366; Швед В. "Трымаць пад арыштам у кляштары…" / В. Швед // Гарадзенскія запісы: старонкі гісторыі і культуры. – Гародня: ГрДУ, 1993. – Вып. 1. – С. 75–79; Швед В.В. Губернскі Гродна: аповяды з гісторыі горада (канец XVIII – пач. XX ст.) – Баранавічы, 2003, с. 61–65.

Румель Аўгуст Мацвеевіч (у 1834 меў 52 гады) – тытулярны дарадца і кавалер ордэна Станіслава 4-й ступені. Жонка Канстанцыя 35 год, сыны Ян 11 гадоў і Фелікс 1 год, дачка Паўліна 4 гадоў. Меў Р. маёнтак Навасёлкі і быў зацверджаны Герольдыяй ў дваранстве 26.03.1841.

Крыніца: НГАБ, ф. 98, воп. 1, с. 1533, а. 20 адв.–21.

Румель Віктар – гродзенскі паэт, настаўнік купецкай семінарыі. Малодшы брат генерала *Румеля.* Верагодна, вучыўся ў кадэцкім корпусе ў Пецярбургу, бо, згодна з дакументам Галоўнага кіравання ваенна-вучэбнымі установамі, атрымоўваў ад граданачальніка Пецярбурга дапамогу ў суме 200 руб. на год. Жыў у Гродне ў міжваенны час у 1921–1939 гг. Публікаваўся ў перыядычным друку Гродна (напрыклад, у газеце "Nowe Życie"), Вільні, Беластока і Варшавы. Пісаў пра помнікі гісторыі і культуры Гродна: *Замак, Каложа, Фара, кляштар францішканцаў, Сабачая горка* і інш. Умеў граць на піяніна і быў кампазітарам. У 1940 яго саслалі, і ён загінуў у савецкіх лагерах.

Крын. і літ.: E.S. [Eugeniusz Skrobocki]. Wiersze o Grodnie. Wiktor Rumel // Magazyn Polski, s. 26–27; Чарнякевіч А. Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада 1919–1939 гг. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015. – С. 215; Renik W. Grodno w dwudziestoleciu międzywojennym // Informator wystawy "Grodno i Wołkowysk w II Rzeczypospolitej". – Pelplin-Gdańsk, 2001; Biblioteka Narodowa, Rps., sygn.. akc. 8884.

Румель Іван/Ян – магчыма, сын *Румеля Аўгуста Мацвеевіча*, павятовы спраўнік, удзельнік *паўстання 1863–64*. Сядзеў у *турме* гродзенскай і быў пад следствам.

Крыніцы: НГАБ, ф. 98, воп. 1, с. 1533, а. 20 адв.–21; ф. 1, воп. 13, с. 1399, а. 27.

Румель Караль Юліюш Альфонсавіч (23.05.1888, Гродна – 7.03.1967, Эльблёнг у Польшчы) – брат генерала *Юліюша Караля Р.,* вайсковец, спартовец, алімпіец. Скончыў гродзенскую *гімназію*, Адэскі кадэцкі корпус, Пецярбургскае пяхотнае вучылішча, пасля якога служыў у л.-гв. Ізмайлаўскім пяхотным палку. Пасля служыў у царскай гвардыі (палкоўнік у 1917). Браў урокі мастацтва і скончыў Пецярбургскую мастацкую школу (маляваў коней і батальныя сцэны), з дзяцінства любіў коней і таму вучыўся ў школе верхавой ездзы. У 1912 г. прадстаўляў Расію на V Алімпійскіх гульнях у Стакгольме. На апошнім бар'еры конь зачапіў бэльку і прыціснуў Р., але той, губляючы прытомнасць, узлез на каня і даехаў да фінішу. Спецыяльна адліты залаты медаль уручаў Р. у шпіталі шведскі кароль Густаў V. З 1919 служыў у Войску Польскім. У 1920–1939 рыхтаваў польскіх кавалерыстаў. Удзельнічаў у VIII Алімпійскіх гульнях у Парыжы (1924) ад Польшчы, дзе ў канкуры заняў 11 месца ў індывідуальным заліку і 6 – у камандным; у трохбор'і заняў 10 месца ў індывідуальным заліку і 7 – у камандным. На алімпіядзе ў Амстэрдаме (1928) заваяваў бронзу ў складзе каманды па трохбор'і, а ў індывідуальным заліку – 26 месца.

У 1930-я гады быў чатырохразовым медалістам чэмпіянатаў Польшчы па канкуры: залатыя медалі 1935 і 1937; срэбны ў 1938, бронзавы ў 1934. У *вайне Другой сусветнай* прайшоў два канцлагеры (Дахаў, Маўтхаўзен). У камуністычнай Польшчы працаваў у спартовых клубах, быў заслужаным трэнерам, арганізатарам коннага спорту, палкоўнікам Войска Польскага. Быў кансультантам фільмаў "Крыжакі", "Тарпаны".

Літ.: Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 118; Саяпин В. Гродненский спорт: история и достижения. 1919–1939 годы. Гродна: ЮрСаПринт, 2015. – С. 192–193; Rómmel J.K. // Encyklopedyczny słownik Historii Polski/ J. Maciszewski. Polska oficyna wydawnicza, 1996, s. 247; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. I. – Białystok: Prymat, 2014. – C. 135.

Румель Уладзіслаў-Антон Юльянавіч-Якаўлевіч і яго сын Юльян-Яўген былі ўказам Герольдыі ад 31.01.1894 далучаныя да роду Румеляў, унесеных у 6 частку радаслоўнай кнігі Герольдыі ад 14.12.1832. Верагодна, Р. – сын уладальніка Румлёва Якава Багданавіча, народжаны каля 1816 г.

Крыніца: НГАБ, ф. 98, воп. 1, с. 1533, а. 20 адв.–21; ф. 92, воп.1, с. 258, а. 4 адв–5.

фон Румель Юліюш Караль Вільгельм Юзаф Альфонсавіч (2.06.1881, Гродна – 8.09.1967, Варшава) – генерал. Род Rómmel згадваецца з 1332 г., і ў курляндскіх радаводах запісаны пад № 67. Пачатак яго паклалі крыжак Матэвуш Rómmel з замка Надрэніі і графіня Moers. Бацька Румель Альфонс Караль Вікенці Дзітрыхавіч даслужыўся ў расійскай арміі да палкоўніка (ён з мая 1905 камандаваў 26-й арт. брыгадай, якая знаходзілася ў Гродне). Маці Марыя Восіпаўна/Іосіфаўна з Марцінкевічаў вучылася ў *гімназіі жаночай* Гродзенскай. Р. дзяцінства правёў у Гродне (у фармулярным спісе бацькоў за 1885 месцажыхарства падаецца як "26 артылерыйскі парк") і ў Аранах. У Гродне дом бацькоў знаходзіўся на Манастырскім завулку, за *фабрыкай Шарашэўскага,* першы дом на правым баку дзядзінца. Побач былі дамы цётак: Наталлі і Сталеўскай з Нелюбовічаў (удавы па палкоўніку). Дзед Р. Дзітрых Караль удзельнічаў у *паўстанні 1863–1864 гг.* Дзядзькам Р. быў *архітэктар Міхаэліс*. У іх доме пэўны час жыў мастак *Орда Н.* Румель Юліюш скончыў пскоўскі кадэцкі корпус (1899) і Канстанцінаўскую Школу артылерыі ў Пецярбургу (1902). Служыў афіцэрам у лейб-гвардыі 1 артыл. брыгады ў Пецярбургу. Удзельнічаў у *вайне Першай сусветнай* на тэрыторыі Польшчы, пад Вільняй, Смаргонню. Падчас інтэрнавання аўстрыякамі 3-га Корпуса быў камандуючым арт. брыгады (06.1918). З 11.1918 служыў у Войску Польскім. Быў у фармаваннях ген. Ю. Доўбар-Мусніцкага ў Магілёве. У 1920 ваяваў на Кіеўскім фронце супраць 1 Коннай арміі С. Будзённага (у бітве пад Камаровам 28–31.08 Р. прымусіў яе адысці за Буг). Быў камандуючым 1 Дывізіі пяхоты Легіёнаў і камандуючым 1 Дывізіі кавалерыі ў Замасці. Падчас *вайны польска-нямецкай 1939* да 6.09 кіраваў арміяй "Лодзь", а затым – арміяй "Варшава", якая абараняла сталіцу Польшчы. 27.09.1939 Р. даў даручэнне М. Карашэвічу-Такажэўскаму зарганізаваць вайсковую канспіратыўную сетку (была створаная

Служба Перамогі Польшчы, SZP). Пасля капітуляцыі Варшавы патрапіў у нямецкі лагер у Мурнау, а пасля вызвалення пэўны час знаходзіўся ў Францыі. У чэрвені 1947 вярнуўся ў Польшчу, а 9.06.1947 выйшла спецыяльная ўлётка са зваротам генерала брыгады Р. да сыноў Польшчы, у якой ён пісаў, што вярнуўся на радзіму і заклікае іх вяртацца да адбудовы Айчыны. Праз 2 гады выйшаў у адстаўку. Напісаў "Успаміны" (рукапіс знаходзіцца ў Асалінеум, Вроцлаў), "Moje walki z Budiennym. Dziennik wojenny b. Dowódcy 1 Dywizji Kawalerii Generała dywizji Juliusza Rómmla". – Lwów, 1932 ("Мае баі з Будзённым. Ваенныя дзённікі былога камандуючага 1 дывізіі кавалерыі генерала дывізіі Юліюша Румеля"), "Kawaleria polska w pościgu za Budiennym. – Lwów, 1935 ("Польская кавалерыя ў пагоні за Будзённым"), "Za honor i ojczyznę. Wspomnienia dowódcy armii "Łódź" i "Warszawa". – Warszawa, 1958 ("За гонар і Айчыну. Успаміны камандуючага арміяй "Лодзь" і "Варшава"). Меў узнагароды: Віртуці Мілітары 5, 4 і 2 класа; пяць Крыжоў Мужнасці; Polonia Restituta 5–2 класа; Крыж Грунвальда.

Літ. і крыніцы: Czarnowski R. J. Grodno. Zapomniana stolica. – Warszawa: oficyna wydawnicza RYTM, 2015. – C.140; Historia Polski. Kalendarium dziejów. T. III,1887–1943, Kraków, 2010, s. 197, 384, 388, 391; G.M., Rómmel Juliusz Karol // Słownik biograficzny historii Polski. T. 2 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C. 1309; Pamiętnik Juliusza Rómmla z lat 1881–1939. T. 1. – S. 1–7 (rękopis w Ossolineum, Wrocław, ф. 4808–4816); Biblioteka Narodowa, Rps sygn. akc. 8884.

Румель Якаў Багданавіч (1785 – 30.06.1855) – аптэкар і правізар. Зацверджаны ў дваранстве рашэннем у 1821 г. за № 75 *сходам дваранскім* у Гродне. Гаспадар маёнткаў *Панямунь* і *Румлёўка/Румлёва* паводле рашэння суда ад 26.05.1828 і да 1857. Р. і да яго *Ляхніцкі І.* закладвалі асновы парку ў *Румлёва*. Як аптэкар, Р. выкарыстоўваў яго для збору лекавых раслін. Можа і інтарэс *Ажэшкі* да збору раслін і ўкладання гербарыяў пачаўся з гэтага парку Румеля Я.? Пэўны час Р. выконваў пасаду апекуна сельскіх запасных магазінаў (складоў на выпадак неўраджаяў і інш. праблем), з якой прасіў яго звольніць у маі 1843. Р. удзельнічаў у грамадскім жыцці горада – у 1828 губернатар уключыў яго ў "камітэт па ўладкаванні горада". У 1854 на сродкі Р. на францішканскіх *могілках*, дзе ў сакавіку 1850 была пахаваная яго жонка Вікторыя з Стэцкевічаў, пабудавалі капліцу. Самога Р. пахавалі на публічных могілках у Пінску. У 1828 Р. меў 4 сыноў: Багдана 19 гадоў, Адольфа 17 гадоў, *Уладзіслава* 12 гадоў, Юльяна 8 гадоў. Жылі з бацькамі ў асабістым мураваным доме з аптэкай.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 11, с. 1334, а. 355–356; ф. 92, воп. 1, с. 258, а. 4 адв.–5; Гардзееў Ю. З гісторыі помнікаў францішканскай парафіі г. Гродна// Краязнаўчыя запіскі. Вып. 4 – Гродна, 1997, с. 71; Садова-паркавае мастацтва Гродзеншчыны: гісторыя і сучаснасць. – Гродна / склад. В. Р. Карнялюк. – Гродна, 2001; E. Orzeszkowa, Listy zebrane, t. III, Wrocław 1955, s. 433; Orzeszkowa, O Sobie… –

Warszawa: Czytelnik, 1974. – S. 37; https://geocaching.su/?pn=101&cid=13932. Доступ 08.01.2021; https://7dney.by/ru/issues?art_id=7235. Доступ 08.01.2021.

Румлёва – частка сённяшняга Гродна, былое месца на беразе *Нёмана*, куды звозілі дрэва. Тут яго скідвалі ў ваду і вязалі ў плыты (rum – вязаць). Далей па рацэ дрэва сплаўлялі да Балтыйскага мора. Даследчык Баброўскі ў сваёй кнізе прыводзіць дадзеныя па плытах, якія прайшлі па Румлёўскай прыстані ў 1837. Згодна з планам занёманскай часткі за 1797 землі Р. належалі Радзівілам. На пач. XIX ст. у Р. гаспадарыў уладальнік *Панямуні Ляхніцкі Ігнацы.* З 1828 Р. атрымаў *Румель Якаў Багданавіч*, які прадаў маёнтак у 1857 *Відацкай Ф.*, маці *Ажэшкі Э.* Як яна піша, быў гэта "маёнтак у трох вярстах ад Гродна, які падчас майго побыту ў пансіянаце маці купіла за грошы свайго пасагу". Ажэшка ў 1857 правяла ў Румлёва лета пасля вяртання з Варшавы. Бывала тут і пасля замужжа, калі прыязджала ў Гродна. У 1877 Румлёўкай зацікавіліся суседзі-вайскоўцы. І таму ў гродзенскім гістарычным архіве захавалася справа пад назваю "Аб высылцы начальніку 26 пяхотнай дывізіі плана маёнтка Румлёўка Гродзенскага ўезда памешчыцы Відацкай…". Штаб дывізіі 25.06.1877 звярнуўся ў гродзенскую губернскую чарцёжную з пытаннем, ці ёсць у іх план маёнтка памешчыцы Відацкай, "які прылягае да лагера 26 дывізіі і на частцы якога размешчаны ў дадзены час лагер 104-га Усцюжскага палка". Калі такі план ёсць, штаб прасіў яго прыслаць для вызначэння дакладных межаў маёнтка. Плана не знайшлі, а Відацкую выселілі, даўшы ёй фінансавую кампенсацыю. Вайсковы лагер быў у Р. і ў міжваенны час. У 1927 г. ён складаўся з пляца для маршыроўкі, пляца для стральбы і стрэльбішча, месца для кідання гранат і драўляных будынкаў для пасялення жаўнераў. Кіравалі лагерам камендант (падпарадкоўваўся камандуючаму 29 дывізіі пяхоты), афіцэр пляца, намеснік каменданта стрэльбішча; таксама быў дапаможны персанал.

Літ.: Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерня. Ч. 1. – 2; Приложения. Ч. 1. – 2, СПб., 1863; Dobroński A. Cz. Stan sanitarny Grodna w latach dwudziestych XX w. // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: зборнік навуковых артыкулаў / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 282; E. Orzeszkowa, Listy zebrane, t. III, Wrocław 1955, s. 433; Orzeszkowa, O Sobie… – Warszawa: Czytelnik, 1974. – S. 37; Śliwiński J. Grodzieńszczyzna i Podlasie w XV – XVI wieku w Wielkim Księstwe Litewskim (wielkoksiążęce puszcze i włości, eksploatacja, pożary). – Olsztyn: Uniwersytet Warmińsko-Mazurski w Olsztynie, 2010. – S. 159.

Румянцаў Р. А. – архітэктар, з 1945 г. першы архітэктар Гродзенскага філіяла Белграмадзянпраекта. Аўтар першага *генеральнага плана* Гродна. У 1951 апошні быў скарэктаваны архітэктарам Кліменкам А. Н. і інжынерам-эканамістам Ясковічам Д. І.

Руны. Пісьмо старажытных германцаў ці балгар нагадваюць знакі на плінфе *царквы Барыса і Глеба на Каложы.* У "Тэрміналагічным слоўніку мастацтваў" (выдадзены ў Варшаве ў 1969 г.) яны названыя "гмерк", і растлумачана, што

азначаюць сігнатуру (подпіс) вытворцы, якая дапамагала заказчыку разлічыцца за выкананую працу, з'явілася ў сярэдзіне XII ст. у сувязі са стварэннем будаўнічых арцелей. Гэты факт дае нам магчымасць скарэктаваць дату пабудовы царквы – не раней за названую храналагічную мяжу. М. Валіцкі ў сваім артыкуле пра знакі на царкве Барыса і Глеба напісаў, што было заінвентарызавана каля 20 знакаў, якія нагадваюць розныя геаметрычныя фігуры, фрагменты славянскай азбукі, асабістыя знакі. Ён лічыў, што прататыпам, які паслужыў узорам цэглы са знакамі, была цэгла з храма ў Абоба-Пліску ў Балгарыі пач. IX ст. Падобныя знакі ёсць на цэгле цэркваў Дзесяціннай ў Кіеве, Барыса і Глеба ў Полацку і на Смядыні пад Смаленскам.

Літ.: Трусаў І.Г. Спробы класіфікацыі і расшыфроўкі знакаў на гродзенскай плінфе / І.Г. Трусаў // Археалагічныя помнікі Гродзеншчыны. – Гродна, 1992. – С. 61–62; Słownik terminologiczny sztuk pięknych / pod red. S. Kozakiewicza. – Warszawa: PWN, 1969. – S. 126; Walicki M. Cerkiew Św. Św. Borysa i Gleba na Kołoży pod Grodnem // Studia do dziejów sztuki w Polsce. T.1 – Warszawa: W-wo Zakładu architektury polskiej Politechniki Warszawskiej, 1929. – 42 s.

фон Русдорф Пауль – брат хохмайстар Тэўтонскага ордэна (10.03.1422 – 2.01.1441), комтур Тухеля (1413), фогт Лейпе (1414), Меве (1416), затым Крыстбурга (1418–1422).

Літ.: Neitmann K. Der Hochmeister des Deutschen Ordens in Preu Ben – ein Residenzhrrs unterwegs. Untersuchungen zu den Hochmeisteritineraren im 14 und15 Jarhrhunder. – Koln, Wien: Bohlau Verlag, 1990. – S. 105**;** Ziesemer W. Die Literatur des Deutschen Ordens in Preussen. – Breslau, 1928. – S. 812.

Рускі нацыянальны саюз Гродзенскай губ. – прарасійская арганізацыя, створаная ў 1910 г.

Русь Чорная – гістарычная вобласць у басейне верхняга і сярэдняга *Нёмана*, у старажытнасці заселеная *яцвягамі*. Тэрмін гэты побач з "Белай Руссю" ёсць у Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай (XIII ст.). Баварскі гісторык Рыхенталь пісаў, што падчас Канстанцкага сабору (1414–1418) у пасольстве *Вітаўта* былі "князі з Белай і Чорнай Русі". На пачатку XVII ст. у Хроніцы еўрапейскай Сарматыі піша пра Белую, Чорную і Чырвоную Русь польскі гісторык А. Гваньіні. Сучасны даследчык Ю. Весялкоўскі адзначыў, што Чорная Русь ахоплівала шырокую тэрыторыю з такімі гарадамі, як: Ваўкавыск, Горадня, Драгічын, Клецк, Ліда, Мір, Навагрудак, Нясвіж, Рэчыца, Слонім, Слуцк. Значыць, Чорнай Руссю азначалі заходнюю частку Беларусі з цэнтрам у Навагрудку.

Літ.: Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990 гг.) – Гродна, 1993, с. 292; Белы А. Чорная Русь // Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя. Т.2. – Мн., 2006; Ширяев Е. Е. Беларусь: Русь Белая, Русь Черная и Литва в картах. – Мн., 1991;

Руткоўскі Андрэй – акцёр варшаўскага тэатра, у якім падчас *паўстання 1794* г. адбыўся бенефіс у яго гонар за мужнасць у перыяд аблогі Варшавы.

Руткоўскі Юзаф Юзафавіч (Іосіф Іосіфавіч) – паўстанец 1863 г., дваранін 33 гадоў, нарадзіўся ў м. Ражанка Лідскага ў. Скончыў гродзенскую *гімназію* ў 1849. Дзяржаўную службу пачаў у Гродзенскай палаце грамадзянскага суда, атрымаў бронзавы медаль у памяць Крымскай вайны 1853–1856. З 1862 г. працаваў пакаёвым наглядальнікам Гродзенскага шляхетнага пансіёна, калежскі сакратар. Рэвалюцыйны начальнік Гродна пасля арышту *Цеханоўскага* (30.07.1863). Да гэтага ён быў ягоным памочнікам, захоўваў паўстанцкія грошы і выдаваў ваяводскаму, дапамагаў яму рыхтаваць паперы. Жыў у пабернардзінскім *кляштары*. Арыштаваны 15 верасня 1863 і 19 кастрычніка высланы ў Пермскую губ., дзе знаходзіўся пад паліцэйскім наглядам у г. Ахінску. Па патрабаванні гродзенскага *губернатара* вернуты ў губерню летам 1864. На следстве праявіў сябе "в упорном запирательстве". Прыгавораны да расстрэлу, але па канфірмацыі – да 15 гадоў катаржных прац у Табольску. Рашэннем гродзенскага *губернскага праўлення* ад 13.12.1864 ягоная маёмасць падлягала канфіскацыі.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11, 47 адв., 167 адв., 190 адв., 203 адв.; с. 1, а. 84, 547, 552; воп. 1, с. 40, а. 147, 151; Jodkowski. Rok 1863… // Echo Grodzieńskie. – 1923. – № 173. – S. 3.

Рыбацкая слабада, згадваецца ў дакументах з пачатку XVI. Пра яе напамінае вул. Рыбацкая каля палаца Сапегі/былога піўзавода. Паглядзіце на рэканструкцыю планіроўкі на 1561 г., зробленую А. Д. Квітніцкай. Яна даволі ўдала паказала тэрыторыю засялення, напрамкі вулічнай сеткі, месцазнаходжанне грамадскіх будынкаў і храмаў.

Літ.: Квитницкая Е.Д. Планировка Гродно в XVI-XVIII вв. / Е.Д. Квитницкая // Архитектурное наследство. – М., 1964. – № 17. – С. 11–38.

Рымінскі Міхал – танцор *балета Тызенгаўза,* першы танцор Яго Каралеўскай Вялікасці ў Варшаве. Праславіўся ўдзелам у балеце "Клеапатра" (7.09.1791) разам з *Бжэзінскім* і *Сітанскай*. У 1785–88, 1788, 1790–93 гг. у Варшаве танцаваў у балетах "Мірза і Ліндэр", "Ванда, польская каралева", "Шлюб самнітаў", "Капітан Сандэр на востраве Караліна".

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. – Lwów. T. I, c. 305, 317, 462, T. II, 1925. – S. 330, 331, 334, 338.



С. 889

Рынак – галоўная плошча горада (назва выкарыстоўвалася да 1 пал. XIX ст.), Парадная плошча (паралельная назва, уведзеная расійскай адміністрацыяй), Бульвар і Саборная плошча (назвы ў афіцыйных дакументах 2 пал. XIX ст.). На Р. былі размешчаныя *ратуша* і гандлёвыя рады, куды гандляваць прыязджалі расійскія, польскія, нямецкія, венгерскія і іншыя еўрапейскія купцы. Даследчык горадабудаўнічай культуры Гродна Ю. Н. Кішык піша, што менавіта Р. надаваў пасяленню гарадзенцаў гарадскі характар. Як правіла, ён з'яўляецца як новая частка гарадскога арганізма ва ўжо складзеным пасяленні.

Першы ўспамін пра Р. ёсць у прывілеі Жыгімонта Старога 1507 г., дзе загадваецца вярнуць жыдам іх маёмасць "на рынку в месте Городенском". Але фармаванне Р., лічыць гісторык Ю. Гардзееў, пачалося на мяжы XIV–XV стст. Ад Рынку адыходзілі важныя дарогі: на ўсход – Брыгіцкая/Купецкая; на поўдзень – Бернардзінская і Маставая, на захад – Замкавая, на поўнач – Калажанская і Дамініканская. Да канца XVI ст. рынак стаў сацыяльным, функцыянальным і планіровачным вузлом гарадской структуры, тэрытарыяльным фокусам горада. На ўсходнім баку плошчы знаходзіліся *касцёл імя Св. Францішка Ксаверыя*, *аптэка езуіцкая*/фарная, рэшткі былога *палаца Сапегі*. На паўднёвым баку калісьці стаяў *палац Радзівілаў* (пазней Любецкіх), а цяпер знаходзіцца сквер. На захадзе была *Фара Вітаўта*, у расійскі час перароблена ў Сафійскі сабор. На поўначы пабудаваная *карчма гарадская* (зараз крама "Ратушная"). На *Фарштаце Занёманскім* быў свой Рынак (прыкладна каля касцёла францішканцаў), ад якога адыходзілі вуліцы Навадворская, Горніцкая, Лабенская, Рабяёўская.

Літ.: Гардзееў Ю. Гродзенскі рынак у XVI-XVIII ст. (праблемы сацыятапаграфічнага развіцця) / Ю. Гардзееў // Краязнаўчыя запіскі. – 2000. – № 5. – С. 80–105; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 111–125; Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 115; Гардзееў Ю. Гарадская прастора ў XVI – XVIII стст. // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 101; Кишик Ю.Н. Градостроительная культура Гродно / Ю.Н. Кишик. – Мн.: Белорус. Наука, 2007. – С. 45, 49, 55; Саяпин В. История гродненских площадей / Виктор Саяпин. – Гродно: ООО "ЮрСаПринт", 2011. – С. Hjl ; Wielka Encyklopedja powszechna ilustrowana. T. XXV. – Warszawa: Drukarnia A. T. Jezierańskiego, 1900. – S. 875.

Рынкі гарадскія размяркоўваліся ў розных частках Гродна. На рынку Грандзіцкім у 1938 *рада гарадская* запланавала "урэгуляванне". Знаходзіўся ў міжваенны час на пачатку вул. Грандзіцкай/Горкага на плошчы, якая была на месцы, дзе цяпер дзевяціпавярховік Аграпрома і скверык перад ім, а злева – пачатак вул. Базыльянскай/Лермантава. З бліжэйшых вёсак прывозілі на вазах дровы і, паводле дамовы з пакупніком, завозілі яму дадому і складвалі ў адрыну, а вясковыя жанчыны гандлявалі маслам, яйкамі, смятанай. У раёне перакрыжавання вуліц Грандзіцкай/Горкага і Міцкевіча, на месцы, дзе цяпер справа стаіць адміністрацыйны будынак, знаходзіўся дравяны рынак. Сюды восенню вакольныя сяляне прывозілі на продаж дровы, на Новы год – ялінкі.

Занёманскі рынак утвораны свядома ў часы да правядзення *валочнай памеры* 1560–1561, знаходзіўся на левым беразе Нёмана ў абшары ад *касцёла францішканскага* да месца сённяшняй фабрыкі тытунёвай па вул. Гарнавых. У актавых дакументах 1672 гэтае месца называецца вёскай Рылаўцы (пазней вул. Горніцкая), якая мела 45 валок грунту і належала замку Старому. Мясны рынак у міжваенны час знаходзіўся на вул. Вызвалення/Вялікая Траецкая. Нямецкі вядзе пачатак з сярэднявечча і з'яўляецца дамінантай раёна горада, што знаходзіцца над тэрасай ракі *Гарадніцы*. Па словах даследчыцы Квітніцкай

А. назву яму далі *крыжакі*. Гісторык Ю. Гардзееў лічыць, што назва і ўзнікненне яго звязаныя з дамовай 1379 г. паміж Ордэнам і ВКЛ, згодна з якой мяжа прайшла паблізу *Горадзена* ў раёне вёскі Пералом. Знаходзіўся Нямецкі рынак прыкладна ў месцы, дзе сёння стаіць крама алкаголя "Крышталь". У канцы XV ст. тут быў пабудаваны кляштар аўгусцінцаў з касцёлам Св. Тройцы. Згадваецца ў апісанні Гродна "Regester pomiary wlok", складзеным Дыбоўскім у 1561. У той час тут было 11 пляцаў, якія належалі Пятру Міцуце, Яўлашу Тарашовічу, Мацею Сейтку, Яну Янкоўскаму, Пацам, Пракопу Дзямітравічу, Ількам, Ганне Марціновіч, Мікалаю Кузніцкаму, Марціну Аляхновічу, Грыску Чарыковічу. Гандлю ўжо тут ніякага не было.

Рыбны рынак у міжваенны час знаходзіўся на месцы Нямецкага, на вул. Вызвалення, побач з мясным (яшчэ называлі "яткі"). Калі ў 1938 г. збіраліся яго перанесці, дык 136 гандляроў падпісалі мемарыял супраць гэтага. Было прынятае рашэнне гарадской рады пра будоўлю навесаў на старым месцы. Рыбу дастаўлялі з Нёмана (ласось, сом, судак, асётр, харыус і д. п.) і з Ласасянкі (фарэль). Цяпер на месцы рынку знаходзіцца аўтастаянка побач з крамай "Абухаўскі". Стаіць яшчэ тут адзін цікавы будынак – яўрэйскі грамадскі прытулак. Да 1880-х гадоў у будынку знаходзілася яўрэйская бальніца. Сянны рынак знаходзіўся за сённяшнім гатэлем "Нёман", у раёне паміж плошчай Рынку і касцёлам брыгітак. Назва ўтварылася ад раскіданага на рынкавым пляцы сена, якім кармілі коней (гандаль адбываўся з вазоў).

Скідзельскі р. у міжваенны час знаходзіўся ў раёне сучаснага аўтавакзала. Сяляне прадавалі тут мяса, якое папярэдне прайшло аналіз у санітарна-мікрабіялагічнай станцыі. Па словах даследчыка Госцева А., рынак тут быў да 1972 г. Цэнтральны р. пабудаваны ў 1976 з жалеза, бетона і шкла. Будынак пастаўлены на плане квадрата 57х57 м. У крытым павільёне, дзе гандлююць харчовымі таварамі, было каля 600 гандлёвых месц. Вакол будынка знаходзіліся крамы і гандлёвыя рады, дзе гандлявалі прамысловымі таварамі, гароднінай і садавіной. У 2002 быў зроблены праект зараз існага Цэнтральнага рынку (архітэктар Барыс Шульга). На генеральным плане адлюстраваныя наступныя аб'екты: 1) крыты рынак, 2) закрытыя гандлёвыя павільёны, 3) гандлёвы комплекс, 4) разборны шматфункцыянальны дах, 5) гандлёвыя навесы Ніжняй пляцоўкі, 6) уваходныя вузлы, 7) існыя будынкі. 8) перспектыўныя будынкі, 9) аўтастаянкі, 10) балкон Верхняй пляцоўкі.

Літ.: Гардзееў Ю. Да пытання аб планіроўцы Гародні ў другой палове 13 – пачатку 15 ст. // Гістарычны альманах. – Гародня. – 1998. – № 1 – С. 18, 22; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 94, 96, 336–337; Журавлёв В. Верхняя площадка Центрального рынка: проект реконструкции и деньги // Биржа информации. – 2002. – 11.04 № 15 (217). – С. 7; Канюк Н.Г. Хранитель Жилибертии. – Гродно: ЮрСаПринт, 2017. – С. 45; Квитницкая Е. Планировка Гродно в XVI-XVIII вв. // Архитектурное наследство. – 1964. – № 17. – С. 11–38; Павач А. Sursum corda: Красная кніга / Павач Андрей Андреевич. – Гродно: ЮрСаПрынт, 2013. – С. 63–64, 79–81, 83, 85- 86, 245–246 (ілюстрацыя); Писцовая книга Гродненской экономии с прибавлениями изданная виленскою комиссиею для

разбора древних актов. Т. 2. – Вильна, 1882. – С. 44; Чарнякевіч А. "Гвалтоўная эстэтызацыя": архітэкурна-планіровачныя змены ў міжваенным Гродна. 1919–1939 гг. // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Выпуск 9 (2014) / рэд. І. Соркіна [і інш.]. – Гродна, 2014. – С. 10–11; Новы Свет ва ўспамінах ягоных жыхароў // Горад Святога Губерта: краязнаўчы альманах. Выпуск IV. – Гродна, Вільня, 2008. – С. 25, 27, 45; Gordziejew J. Socjotopografia Grodna w XVIII wieku. – Toruń, 2009. – С. 158–159.

"Rycerz Niepokalanej" ("Рыцар Бязгрэшнай") – штомесячны каталіцкі часопіс, заснаваны *Кольбэ Максіміліянам*. Са студзеня да кастрычніка 1922 г. выдаваўся ў Варшаве, затым – у Гродне, а з 1927 – у друкарні францішканскага касцёла ў Непакалянаве пад Варшавай, дзе быў паломніцкі цэнтр, прысвечаны Дзеве Марыі. З 1952 па 1981 часопіс не выдаваўся. Тыраж пастаянна павышаўся: пачаўся з 5 тыс. экземпляраў, з 1927 было 70 тыс., у 1938–1939 – 800 тыс. Акрамя Польшчы часопіс выдаваўся ў Японіі (з 1930), Італіі (з 1911). Кольбэ быў і аўтарам, і рэцензентам, і арганізатарам усяго працэсу друку: купляў друкарскія машыны (у 1925 з'явіліся машыны з рухавіком), паперу, турбаваўся пра працаўнікоў-манахаў. У Гродне дапамагаў яму і брат, айцец Альфонс Кольбэ. На думку М. Кольбэ, часопіс патрэбны быў для распаўсюджвання каталіцкай веры, барацьбы за душы з пратэстантамі, левалібералъным рухам, масонамі.

Літ.: Maxence P., Maksymilian Kolbe. Kapłan, dziennikarz, męczennik, tłum. J. M. Kłoczowski. – Warszawa, 2013; Sotowski P., Opowieść o św. Maksymilianie. – Niepokalanów, 2011.

Рэвалюцыйная арганізацыя навучэнцаў, пачала складвацца ў 1904 г. у *гімназіі* мужчынскай пад уплывам дзейнасці Гродзенскай арганізацыі *Польскай сацыялістычнай партыі ў Літве,* а аформілася ў 1905. У лютым гэтага года аб'ядноўвала прадстаўнікоў усіх навучальных устаноў Гродна. Кіраўнікамі Р. а. н. былі С. Нелюбовіч, Б. Шушкевіч, У. Матушэўскі, А. Дзяканаў, М. Панкевіч, браты Трускоўскія. Выдавалі ў 1905–06 палітычна-сатырычны *часопіс "Школа"* і лістоўкі. Чальцы арганізацыі вялі палітычную прапаганду сярод навучэнцаў і рабочых, праводзілі агульнаадукацыйныя заняткі з падлеткамі-рабочымі *друкарні губернскай.* Пад кіраўніцтвам Р. а. н. адбыліся выступленні гімназістаў у 1904 і забастоўка іх у 1905. У паслярэвалюцыйны рэакцыйны перыяд дзейнасць арганізацыі была спыненая.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Мн., 1989, с. 158; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3., Мн., 1996, с. 131.

Рэвалюцыя 1905–1907 гг. У Гродне пачалася ў той самы дзень, 22 студзеня 1905 г., калі на вуліцы Пецярбурга выйшлі рабочыя ("крывавая нядзеля"). Гэтая падзея доўгі час была асноўным фактам агітацыйнай дзейнасці партый у Гродне. 22 студзеня мясцовая арганізацыя РСДРП заклікала рабочых выйсці на вуліцы пад лозунгам "Далоў самадзяржаўе!", выпусціла лістоўкі, у якіх

растлумачвалася значэнне пецярбургскіх падзей, распаўсюдзіла праклама-цыю "Да ўсіх грамадзянаў", у якой гаварылася аб пачатку рэвалюцыі ў Расіі. 26 і 27 студзеня на кватэрах Р. Рэзнікоўскай і Міхнеўскай паліцыяй былі зной-дзеныя друкарскія станкі і гектограф, шрыфты і праклама цыі на польскай і яўрэйскай мовах з заклікам да ўдзелу ў рэвалюцыі.

У першы год рэвалюцыі ў Гродне, паводле няпоўных дадзеных, адбы-лося 76 выступленняў. У іх прынялі ўдзел рабочыя такіх прадпрыемстваў, як: пераплётныя фабрыкі (30.01, 8.02, 4.05, 4–5.07, 25.08, 9.12), *тытунёвая фабрыка Шарашэўскага* (30.01, 14.03, 9.05, 4–5.07, 9.12), губернская (23.05, 4–5.07, 9.12) і прыватныя *друкарні* (4–5, 24.07, 9.12), цагельні (4.07), гарбарні (9.12), чыгунка (25.10), вінны склад (17.08). Забастоўкі рабочых насілі як эканамічны, так і палітычны характар. Асноўнымі эканамічнымі патрабаван-нямі былі: скарачэнне працоўнага дня, павелічэнне заработнай платы, паляп-шэнне ўмоў працы, аплата за час забастоўкі, вяртанне на працу звольненых рабочых. Сярод палітычных патрабаванняў гучалі: свабода стачак, вызва-ленне палітычных вязняў з мясцовай турмы, салідарнасць з рабочымі і салда-тамі Расіі, Польшчы, ліквідацыя самадзяржаўя, адраджэнне незалежнасці. Працоўныя горада адзначылі 1 мая: гандлёва-прамысловае жыццё ў горадзе было спыненае, вечарам у трох раёнах горада адбыліся маніфестацыі, былі запушчаныя ракеты, па вул. Дамініканскай і Мураўёўскай *Польская партыя сацыялістычная* і *Бунд* зладзілі дэманстрацыю. У рэвалюцыйных падзеях удзельнічала вучнёўская моладзь: вучні яўрэйскага рамесніцкага вучылішча (9.05), рэальнага вучылішча (11.05), *гімназіі* (канец лістапада, 5.12 – сярэдзіна снежня, 25–29.12) і гарадской школы імя А. С. Пушкіна (канец лістапада). Служачыя дзяржаўных устаноў таксама не ўстаялі перад рэвалюцыйнымі падзеямі. Актыўнасць праявілі служачыя акруговага суда (07, 1.08), *казённай палаты* (07), пажарнай каманды (15.05), гарадавыя (28.11). На барацьбу паўста-лі нават вязні гродзенскай *турмы* (19.03, 8.04, 1.05). На бок рэвалюцыі пад кіраўніцтвам ваенна-рэвалюцыйнай арганізацыі сталі салдаты Гродзенскага гарнізона: 26-й артылерыйскай брыгады (18–19.11), 103-га пяхотнага Петра-заводскага палка (2, 4–5, 12.12), сапёры (канец снежня). 4 і 7.12 адбыліся салдацкія мітынгі. Падчас мітынгаў і дэманстрацый, маніфестацый і сходак на вул. Мураўёўскай, Саборнай, Дамініканскай, Траецкай, пл. Параднай, у *Ласосне* (12.03, 19.03, 25.03, 2–3.07, 08, 17.11, 17.12, 22–29.12) распаўсюдж-валіся лістоўкі, праклама цыі, адозвы, заклікі, часам раздаваліся стрэлы ў бок паліцыі і войска (8.04, 26.04, 1.05), кідалі бомбы (30.09).

Дасягненнем барацьбы першага года рэвалюцыі было падпісанне Мікалаем II Маніфеста 17 кастрычніка, паводле якога Дзяржаўная дума, ство-раная яшчэ паводле жнівеньскагп маніфеста цара, надзялялася заканадаў-чымі паўнамоцтвамі. Разам з тым пашыраўся кантынгент выбаршчыкаў. Абвяшчаліся свабоды слова, друку, сходаў, саюзаў. Булыгінскую думу абедзве сацыялістычныя партыі прынялі рашэнне байкатаваць на сходзе каля старога *форта* за Нёманам (каля 1 тыс. чал.). Маніфест 17 кастрычніка быў сустрэты з радасцю, 31.10–4.11 ў горадзе была спыненая праца, у кафедральным саборы

адбыўся падзячны малебен, *губернатар* зачытаў Маніфест, рабочыя спрабавалі выпусціць палітвязняў з турмы (іх вызвалілі 4.11).

У 1906 г. адбылося, паводле няпоўных дадзеных, каля 33 выступленняў. Характэрнымі з'явамі гэтага году былі байкот выбараў у I Дзяржаўную думу, уцягванне ў барацьбу новых слаёў працоўнага класа, якія не ўдзельнічалі ў рэвалюцыйным руху 1905: рабочыя-землякопы (30.04), рабочыя *прыстані* (12.07), краўцы (24.10), рабочыя літаграфій (лета). Працягвалі барацьбу былыя яе ўдзельнікі: рабочыя тытунёвай *фабрыкі Шарашэўскага* (лета), цагельні (лета), *пераплётнай фабрыкі* "Нёманская" (4.07), прыватных *друкарань* (7.11, 4.12), губернскай друкарні (4.12). Агульная палітычная забастоўка адбылася 1 мая. Шмат людзей было на цэнтральных вуліцах горада. Маніфестацыю зладзілі палітвязні турмы. Быў вывешаны чырвоны сцяг. Узмацніўся рэвалюцыйны тэрор: напады баевікоў на крамы (на пачатку лютага ў Капліцы, праз 2 тыдні ў в. Капцёўка), друкарні (у красавіку *Мейлаховіча*, 9.08 Крамкоўскага), касы (Акруговага суда ў канцы жніўня). Стралялі ў паліцэйскіх і жандараў (23.05, 4.09, 10.09 забілі жандармскага падпалкоўніка Грыбаедава за ўдзел у Беластоцкім яўрэйскім пагроме). Кідалі бомбы ў фабрыканта *Харына*, які 22.02 абвясціў лакаўт на сваёй пераплётнай фабрыцы (23.05), у саўладальніка пераплётнай фабрыкі "Нёманская" *Хазана* (14.08), у прыстава Сачка (1.09). Пераважалі эканамічныя стачкі. Гэтаму спрыяла адмена крымінальнага пераследу за ўдзел у іх, калі яны працякаюць "мірна". Вынікі барацьбы часцей за ўсё былі паспяховымі для рабочых – гаспадары прадпрыемстваў задавальнялі патрабаванні цалкам або часткова. Бачная была большая зарганізаванасць рабочых. У снежні адбылася першая канферэнцыя прадстаўнікоў рабочых усіх прадпрыемстаў горада.

Ва ўмовах пераходу ўрада да адкрытага ваеннага тэрору, распаўсюджвання на Гродна Палажэння аб узмоцненай ахове колькасць выступленняў рэзка скарацілася да аднаго дзясятка (за пяць месяцаў 1907 г.). Ад забастовак і мітынгаў працоўныя перайшлі да іншых формаў барацьбы – прафсаюзнай і выбарчай. 13–17 сакавіка адбыўся ўстаноўчы з'езд "Усеагульнага саюза гарбароў", на якім было прынятае рашэнне аб стварэнні сацыял-дэмакратычных прафсаюзаў. 21 сакавіка гродзенскі прафсаюз рабочых-металістаў заклікаў байкатаваць фабрычную лаўку Левітана на фабрыцы Шарашэўскага, бо там прадаюцца тавары па завышаным кошце. Адбываліся і тэрарыстычныя акцыі: стралялі ў турэмнага наглядальніка Каханскага (24.01). Указам Мікалая II ад 3 чэрвеня 1907 г. II Дзяржаўная дума была распушчаная, насуперак Маніфесту 17 кастрычніка. Па сутнасці гэта быў дзяржаўны пераварот, які паклаў канец першай расійскай рэвалюцыі.

Літ.: Швед В.В. Губернскі Гродна: аповяды з гісторыі горада (канец XVIII – пач. XX ст.) / В.В. Швед. – Баранавічы: Баранав. ўзбуйненая друкарня, 2003; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005). – Гродна: ЮрСапрынт, 2020.

Рэймант Уладзіслаў Станіслаў (1867, с. Кабеле Вельке, сёння Лодзкае в-ва, Польшча – 1925) – польскі пісьменнік, нобелеўскі лаўрэат у галіне літаратуры

(1924), аўтар кнігі пра *сейм* Рэчы Паспалітай, які адбыўся ў Гродне ў 1793 г. Прыязджаў у Гродна да *Ажэшкі Э.* У горадзе ёсць вуліца яго імя.

Літ.: Гродно. Энциклопедический справочник. – Минск: БелСэ, 1989. – С. 343.

Рэрых Мікалай Канстанцінавіч (9.10.1874, Ізвара – 15.12.1947, Кулу, Індыя) – рускі філосаф і мастак. У 1903 г., падчас вандроўкі з жонкай А. І Рэрых, быў у Гродне, дзе напісаў два эцюды царквы Барыса і Глеба на Каложы.

Рэхберг Зігфрыд – *крыжак*, камендант г. Бальгі. На чале атрада тэўтонаў асадзіў Гарадзенскі *замак* зімой 1296 г. Замак захапіць не змог, але спаліў жылыя кварталы і ўсе ваколіцы горада, 200 чалавек былі ўзятыя ў палон. Рэхберг, відаць, памёр пад сценамі замка.

С

Сабалеўскі Ваўжынец – райца гарадзенскага *магістрата* (1764, 1774), выдавец *"Газеты Гродзенскай"*. У 1763 і 1769 займаў пасаду пісара рады, а ў 1772 – райцы і пісара. Сакратар гарадзенскай *пошты* (1775). Муж Тэрэзы з *Бадаракаў*. У 1793 сеймавай пастановай быў набілітаваны ў шляхецкі стан.

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 356, 362; Kościałkowski S., Antoni Tyzenhauz podskarbi nadworny litewski, t. 1–2. – Londyn, 1970–71.

Сабалеўскія – уладальнікі пляцаў у Горадні. Камісар скарбовы Рэчы Паспалітай і ВКЛ С. валодаў зямлёй па вул. Язерскай, з правага боку паміж пляцам канцлера вялікага ВКЛ і пляцам брыгітак. Другі яго пляц знаходзіўся ў левай частцы вул. Дзям'янаўскай, тылам да пляцаў юрыдыкі брыгітак. Гл. таксама *Сабалеўскі Ваўжынец.*

Літ.: Obiasnienie interesu Miasta Sejmowego J.K.Mci Grodna. – Grodno, 1789. – S. 19–22.

"Сабачая горка" (польск. "Psia górka", "Myśliwska górka") – узвышша, якое знаходзілася паміж *"Сакрэтам"* і фальваркам *Станіславова*, недалёка ад перасячэння Азёрскай шашы і вуліцы Пралетарскай. Назвы, магчыма, ідуць ад палявання з удзелам сабак (існуе паданне аб паляванні тут *Станіслава Аўгуста Панятоўскага)*. Паводле другой версіі на гэтым месцы закопвалі бадзяжных гарадскіх сабак. У часы Расійскай імперыі ў раёне С. г. праходзілі вайсковыя вучэнні, *Верас 3.* успамінала, што тут было месца сустрэчы моладзі (маёўкі): было шмат лавак, столікаў, часам іграў аркестр. За "польскім часам" польскія вайскоўцы выкарыстоўвалі горку для лыжнага спорту. Пэўны час меркавалася размясціць тут стадыён яўрэйскага спартыўнага клуба *"Макабі"*. На тэрыторыі С. г. супрацоўнікі НКУС, пры актыўным удзеле мясцовых камуністаў, расстралялі 20 вучняў, якія абаранялі ў 1939 г. *"Дом стральца"*. Пасля *вайны Другой сусветнай* тут часова знаходзіўся лагер нямецкіх ваеннапалонных. Сёння праз С. г. праходзіць шаша, падчас будаўніцтва якой яе зраўнялі.

Літ.: Верас З. Я помню ўсё. Успаміны, лісты/уклад. М. Скобла. – Гародня, Вроцлаў, 2013, с. 403–404; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 270–272; Філіповіч М., Савіцкая Э. Савецкія рэпрэсіі супраць абаронцаў Горадні ў 1939 г. // Горад святога Губерта: зборнік краязнаўчых артыкулаў. Выпуск 6 (2012). – Горадня: б.в., 2012. – С. 87; Вашкевіч А., Чарнякевіч А. Польскі Гродна: Эвалюцыя гораду ў міжваенны час // ARCHE. – 2010. – № 1–2. – С. 382–383.

Сабор Свята-Пакроўскі – храм-помнік, стаіць на рагу вуліц *У. Леніна* і *Э. Ажэшкі*. Пабудаваны архітэктарам М. М. Прозаравым, вайсковым інжынерам-будаўніком І. Е. Савельевым (паходзіць з Магілёўскай губ.) у 1904–1907 гг. для войск гродзенскага гарнізона (пра гэта гаворыць асобая памятная дошка). Узорам паслужыла вайсковая царква Новага Пецяргофа (1901). Асвечаны 30.09.1907 у гонар Пакрова Прасвятой Багародзіцы. Гэта помнік архітэктуры рэтраспектыўна-рускага/псеўдарускага стылю. Гонарам царквы была званіца з 9 званоў агульнай вагой 485 пудоў. Пабудова вайсковай царквы ў стылі рымскай базілікі абыйшлася гораду ў 157 972 руб., у тым ліку зямельны ўчастак пад будаўніцтва (35 413 руб), у выдзяленні якога вялікую дапамогу аказаў былы гродзенскі *губернатар П. А. Сталыпін*. Статус сабора атрымала ў 1961 г. У царкве захоўваюцца: цудоўны абраз Маці Божай Казанскай, перанесены з былога Сафійскага сабора ў 1920-х гадах; абразы XIX ст. “Аляксандр Неўскі і святая пакутніца”, “Маці Божая Адзігітрыя”, “Бог Саваоф”, “Бог Саваоф і анёлы”, “Сашэсце Святога Духа”, “Святая прамудрасць стварыла сабе дом”, “Уваскрасенне”. Унутры царквы вісяць зробленыя *Б. Шышкевічам* дзве мармуровыя дошкі, прысвечаныя афіцэрам і ніжнім чынам 26-й артылерыйскай брыгады (12 чал.) і Гродзенскага гарнізона (101 Пермскага пях. п. – 3 чал.; 102 Вяцкага пях. п. – 3 чал.; 103 Петразаводскага пях. п. – 1 чал.; 171 Кобрынскага пях. п. – 2 чал.), забітых і памерлых ад ран у *вайну руска-японскую*, а таксама мемарыяльная дошка гродзенскім воінам-*афганцам*. У верасні 1939 у саборы схавалася частка збеглых з *турмы* гродзенскай палітвязняў, якія забарыкадаваліся і далі бой атрадам польскай паліцыі і войска. 24.07.1995 С. наведаў Святейшы патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II. 14.10.2010 каля сабора была ўрачыста адкрытая бронзавая скульптура Божай Маці (аўтар *У. Панцялееў*).

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 17; Черепица В.. Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней). Ч. 1. – Гродно: ГрГУ, 1999. – С. 59–67; В.Н.Черепица, Гродненский православный некрополь, Гродно: ГрГУ, 2001. – С. 180; Черепица В.Н. 400 имён: жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гроднен. тип., 2014. – С. 397.

Сабор Сафійскі, адлічвае свой час з указа рас. імператара ад 29.02.1804 аб перадачы *Фары Вітаўта* праваслаўным вернікам. Будынак адрамантавалі, пераабсталявалі і 7.08.1807 асвяцілі ў гонар Сафіі, Прамудрасці Божай. Неаднаразова С. С. рамантавалі (1847, 1850, 1859, 1865, 1870 гады). Па сведчаннях гісторыка *Арлоўскага Я. Ф.*, на прыватныя ахвяраванні былі заказаныя ў Пецярбургу 2 пазалочаныя крыжы. У 1877 у галоўным будынку храма з’явілася “пнеўматычнае ацяпленне”. 9.05.1892 С. С. пацярпеў ад *пажару*, у 1895 на аднаўленне было выдзелена 150 099 руб. Праект быў падрыхтаваны акадэмікам *Чагіным,* і другі варыянт яго з праўкамі быў прыняты. 28.03.1899 адрамантаваны і дабудаваны храм быў асвечаны Брэсцкім епіскапам Іаакімам

і ўступіў у шэраг дзейных. У снежні 1891 у ім быў ахрышчаны *Багдановіч М.* 6.09.1911 тут адслужылі паніхіду па забітым *Сталыпіне П. А.,* а 4.12.1913 адпявалі Арлоўскага Я. Ф. Напярэдадні *вайны Першай сусветнай* у Маскву вывезлі званы, каштоўныя літургічныя прадметы, абразы, іншую царкоўную маёмасць. 18.12.1918 протаіерэй І. Карчынскі правёў першую паслявоенную літургію, а ў ліпені 1920 быў высланы ў Літву. Храм жа польскія мясцовыя ўлады перадалі каталіцкай царкве, і хутка тут размясціўся гарнізонны касцёл. Апошні ў 1962 быў савецкай уладай узарваны і разабраны.

Крын. і літ.: Летопись. Софийский собор в гор. Гродно (захоўваецца ў епархіі); Орловский Е.Ф. Гродно. Гродненская старина, Гродно, 1910; Орловский Е. Судьбы православия в связи с историей латинства и унии в Гродненской губернии в XIX столетии, Гродно, 1903; Трусов Православные храмы Гродно. Краткий очерк истории – Минск, 2008, с. 39–44.

Сава, Саветаў Георгі Яўгенавіч (6.04.1898, Санкт-Пецярбург – 21.05.1951, Лондан) – епіскап, архірэй Гродзенска-Навагрудскай епархіі ў 1937–1939 гг., паланізатар праваслаўнай царквы. Скончыў С.-Пецярбургскую гімназію (1915) і, у сувязі з *вайной Першай сусветнай* – паскораныя курсы кадэцкага корпуса (1.10.1916). Паручнікам 1-га Лейб-гвардыі Грэнадзёрскага палка прымаў удзел у вайне на Галіцкім фронце, двойчы быў паранены. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне ў шэрагах Добраахвотнай арміі Дзянікіна. Вайну скончыў у чыне штабс-капітана і эміграваў у Сербію. Тут стаў манахам у манастыры Петкавіца (1922), пасля заканчэння багаслоўскага факультэта Белградскага ўніверсітэта (1925) стаў настаяцелем Св.-Мікалаеўскай царквы ў Бары (да 18.11.1926). Затым вучыўся ў аспірантуры на праваслаўным аддзяленні багаслоўскага факультэта Варшаўскага ўніверсітэта (1926–1928). Пасля яго заканчэння быў настаяцелем рускай царквы ў Мюнхене (1928–29). Перасяліўся ў Варшаву і быў прыняты ў склад Польскай праваслаўнай царквы (1929). Быў архімандрытам (5.05.1929), біскупам Люблінскім, вікарыем Варшаўска-Холмскай епархіі (3.04.1932 – 1937), біскупам Гродзенскім (27.02.1937 – 2.09.1939). У 1936 стварыў у Гродне Таварыства праваслаўных палякаў (праўленне яго знаходзілася па вул. Рыдза-Сміглага, 11), галоўнай задачай якога была "актывізацыя грамадскага і культурнага жыцця і дапамога ўплыву на тых вернікаў, якія яшчэ сёння атаясамліваюць праваслаўе з рускасцю і схільныя да Усходу". У гэтым жа годзе ў горадзе ў асяроддзі камандавання Гродзенскай абарончай акругі быў створаны "Камітэт барацьбы супраць камунізму", і Сава актыўна яго падтрымаў ды зладзіў публічныя курсы для праваслаўнага духавенства, з мэтаю арганізаваць іх для барацьбы супраць камунізму. 26.02.1937 урачыста быў адкрыты Дом праваслаўных палякаў імя *Стэфана Баторыя* па вул. Брыгіцкай, 11. С. быў ганаровым сябрам шэрагу іншых арганізацый праваслаўных палякаў на Гродзеншчыне. Па ініцыятыве С. у Гродне была разабраная *царква Аляксандра Неўскага,* і 3.05.1938 асвечаная закладка царквы, якую меркавалася пабудаваць з яе цэглы для "праваслаўных палякаў" на месцы, дзе сёння знаходзіцца стадыён фізкультурнага факультэта *ГрДУ*

па вул. Захарава. Сава асвяціў месца будаўніцтва і па-польску прамовіў патрыятычную пропаведзь, заклікаў праваслаўных аказваць матэрыяльную дапамогу будаўніцтву новай царквы. С. быў актыўным сябрам Праваслаўнага навукова-выдавецкага інстытута, інаўгурацыя якога адбылася ў Гродне 6.10–7.12.1938. У сваёй прамове выказаў надзею, што Інстытут "стане цэнтрам сапраўднай польскай хрысціянскай культуры, якая, базуючыся на былых традыцыях, будзе выхоўваць праваслаўных палякаў у духу вернасці Праваслаўнай Царкве і сваёй Айчыне – Рэчы Паспалітай". З пачаткам *вайны Другой сусветнай* эмігравaў праз Літву і Румынію ў ЗША (тут актыўна супрацоўнічаў з польскім эміграцыйным урадам), а затым у 1943 перасяліўся ў Вялікабрытанію. У чыне брыгаднага генерала быў на Заходнім фронце вайсковым епіскапам у польскай арміі Андэрса (29.11.1943). Пасля вайны служыў настаяцелем польскага праваслаўнага прыхода ў Лондане і быў кіраўніком Польскай Праваслаўнай Царквы за мяжой (1947–1951). Архіепіскап (4.04.1947). Да апошніх дзён сваіх меў тытул Гродзенскага і Навагрудскага архіепіскапа.

Літ.: Гродненские епархиальные ведомости. – 2000. – № 3; Нивьер А. Православные священнослужители. Богословы и церковные деятели русской эмиграции в Западной и Центральной Европе. 1920–1995. Биографический справочник. – Москва, Париж: Русский путь, 2007; Свитич А. Православная церковь в Польше и её автокефалия. – Москва, 1997; Черепица В. Н. "Православные поляки" на Гродненщине (1934–1939) // 60-летие образования Гродненской области. – Гродно: ГрГУ, 2004. – С. 123–133; Черепица В. Н. Очерки истории православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней). Монография: часть II. – Гродно: ГрГУ, 2005. – С. 28–31, 44–67; Grzybowski J. Arcybiskup Generał brygady Sawa (Sowietow) 1898–1951: duszpasterz, żołnierz, obywatel. – Warszawa: WUW, 2021; Przegląd Prawosławny. – 1939. – № 1. – S. 13–17; № 4. – S. 29; № 5. – S. 28; № 6. – S. 27.

Саванеўскі Людвік (25.08.1891, в. Ігнатовічы, Гродзенскі ў. – 24.05.1966, Лодзь) – ксёндз, выкладчык, рэдактар *газеты* "Nowe Życie" ("Новае жыццё"), аўтар вершаванай "Сагі пра Гродна". Вучыўся ў сакольскай школе (скончыў у 1910), віленскай семінарыі, пецярбургскай духоўнай акадэміі. У 1915 у пецярбургскім касцёле *св. Казіміра* быў асвечаны ў капланы і працягваў вучыцца тэалогіі. Дзейнічаў у Польскім таварыстве дапамогі ахвярам вайны, рэдагаваў студэнцкі часопіс "Gaudentia". Восенню 1918 прыехаў у Гродна, дзе атрымаў пасаду вікарыя ў *касцёле св. Францішка Ксаверыя*. Пасля года службы стаў прэфектам школ і рэктарам касцёла брыгітак. У газеце "Nowe Życie" друкаваўся пад псеўданімам "Ян Стаська". З 1926 зноў працаваў у касцёле Францішка Ксаверыя. У 1930-х гадах выкладаў катэхізіс у гродзенскіх школах: агульнай імя *Стэфана Баторыя*, агульнай імя Адама Міцкевіча, на 5 курсе мясцовай настаўніцкай семінарыі, у дзяржаўнай *гімназіі* імя Эміліі Плятар, у кравецкай гімназіі, прамысловай школе, школе хатняй гаспадаркі. Падчас *вайны Другой сусветнай* далучыўся да абаронцаў Гродна ад савецкіх войск 20–21.09.1939. Ад арышту збег у Варшаву, дзе служыў у касцёле св. Пятра і Паўла і выкладаў у школах. Прыняў удзел у Варшаўскім паўстанні супраць нямецкіх

акупантаў (выконваў службу святара). Сядзеў у канцлагеры Прушкаў, адтуль быў пасланы ў Кракаў, а затым у Бохню, адкуль быў восенню 1946 звольнены за "занадта рэлігійнае выхаванне моладзі". Выехаў у Лодзь, дзе працаваў вікарыем пры парафіі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса і Святой Марыі Маргарыты Алакок і выкладаў у школах рэлігію. У 1957–1963 пісаў "Сагу пра Гродна", дзе ў першай частцы апісаў асобы (каля 200 чал.) і эпізоды міжваеннага жыцця, а ў другой – старажытныя часы гісторыі горада (Беласток, 1994 і 1999).

Літ.: Павач А. Гродзенскія гісторыі. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2019. – С. 104–106; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 219; Sawoniewscy Leonard i Ludwik. Ksiądz Ludwik Sawoniewski wychowawca młodzieży grodzieńskiej // Magazyn Polski. – 1999. – N 1(15). – S. 24–26; Potępa G., Ciche łezki ronię, gdy wspominam Bochnię // Kronika Bochneńska. – 2016, wrzesień, s. 33–36.

Савашкевіч Канстанцін, 40 гадоў у 1864 г., нарадзіўся ў в. Жыдомля Гродзенскага ў. у сям'і святара. Выхоўваўся ў Супрасльскім вучылішчы, пасля яго заканчэння ў 1840 паступіў у Літоўскую духоўную семінарыю. З прычыны хваробы звольнены адтуль у 1846 і вызвалены ад духоўнага звання. Пачаў працаваць у Гродзенскім *губернскім праўленні*, дзе даслужыўся да пасады начальніка рэвізійнага стала і памочніка старэйшага сакратара, атрымаў чын тытулярнага дарадцы. Абвінавачваўся паводле паказанняў *Э. Заблоцкага* ў тым, што быў агентам рэвалюцыйнага начальніка Гродна падчас *паўстання 1863–1864 гг*. Падчас арышту ў яго знайшлі спіс *яўрэяў* горада, з пазначэннем 10% збору (падазравалі, што на карысць паўстання). С. не прызнаў віну і сказаў, што З. яго агаварыў, выкарыстаўшы размовы падчас сумеснага знаходжання пад арыштам.

Літ.: Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017. – С. 39–40.

Савет гродзенскі гарадскі рабочых дэпутатаў. Першае яго паседжанне адбылося 26.01.1919 г. у памяшканні гарадскога *тэатра*. На чале Савета стаў старшыня падпольнага камітэта РКП(б) *Багуцкі Вацлаў*. Была прынятая дэкларацыя "Да ўсяго насельніцтва Гродна і ваколіц", якая абвяшчала барацьбу за ўсталяванне дыктатуры пралетарыята.

Літ.: Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада. – Гродна, Вроцлаў, 2012, с. 213.

Савіцкі Раман (10.02.1888, Гродна – 20.10.1942, в. Навумавічы пад Гроднам) – настаўнік, віцэ-прэзідэнт Гродна (з 19.10.1934). Сын Францішка і Міхаліны з Лубатынскіх. Скончыў *гродзенскую гімназію* (1906), фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта (1911). Працаваў настаўнікам матэматыкі сярэдніх школ у Пецярбургу і Гродне (1911–1916). Служыў у расійскім войску ў 1916–1918. У 1918 быў сябрам польскай *Самаабароны Гродзенскай зямлі*, настаўнік ў *польскай гімназіі* (8.1918 – 4.1919). Сябра гродзенскай

гарадской Рады (1919–1927, 1934–1939), лаўнік *магістрата,* кіраўнік аддзела камунальнай гаспадаркі (1925), сябра рэвізійнай рады ашчаднай камунальнай касы. У 1922 беспаспяхова балатаваўся на выбарах у сейм ад спіса партыі *ППС.* Быў сябрам праўлення польскай *Мацежы школьнай* (1925), рэдакцыйнага камітэта *гістарычнай бібліятэкі Гродна* (1929). У 1935 належаў да праўлення Гродзенскага аддзела *таварыства Польскага гістарычнага,* быў рэдактарам *"Kroniki miasta Grodno"*. У верасні 1939 г. быў душой абароны Гродна (20–22.09) ад Савецкай арміі: заклікаў гродзенцаў уступаць у добраахвотныя аддзелы, капаць ірвы, будаваць барыкады супраць танкаў. Эвакуяваўся ў Літву, абвінавачваўся ў арганізацыі *пагромаў яўрэйскіх* у Гродне. З пачаткам *Другой сусветнай вайны* вярнуўся ў горад і працаваў у гарадской управе кіраўніком гаспадарчага аддзела. Быў сябрам *АК і* адным з арганізатараў камітэта дапамогі ахвярам вайны ў Гродне. У кастрычніку 1942 быў расстраляны немцамі на *форце* № 2 Гродзенскай крэпасці. Пахаваны пад Аўгуставам (Польшча).

Літ.: Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 143; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 221–222; J. Jadeszko. Obrona Grodna we wrześniu 1939 roku // Agresja sowiecka 17 września 1939 roku na kresach Wschodnich i Lubelszczyźnie. – Lublin: Tow-wo Przyjaciół Grodna i Wilna, 2011. – S. 57–76; Sawoniewski L. Saga o Grodnie. – Białystok, 1994, s. 87; Sawoniewski L. Saga o Grodnie. – Łódź, Białystok, 1999, s. 17, 78–79.

Сад Батанічны каралеўскі, пачынае сваю гісторыю вясной 1776 г., калі французскі прафесар батанік *Жылібер Жан Эмануэль* зрабіў планіроўку ўчастка паблізу будынка будучай *школы медычнай* (зараз паміж рэстаранам "Стары лямус" і летняй сцэнай гарадскога парку). Паводле дамовы з *Тызенгаўзам А.*, падпісанай 9 мая 1776, ён павінен быў "закласці сад, неабходны для школы медычнай". У разважаннях, пададзеных Тызенгаўзу, Жылібер пісаў аб тым, што ён збіраецца вырошчваць у гэтым садзе: мясцовыя лекавыя расліны, якія "могуць падыходзіць да камяніц і хвароб, каб выхоўваць здаровых людзей"; розныя гатункі збожжа, якія "прыдатныя для мясцовай глебы, надвор'я, ліцвінскага спосабу вырошчвання"; розныя расліны, прыдатныя для фабрык, тытунь, шафран, 30 гатункаў раслін для фарбавання; розныя гатункі дрэў і кустоў пад адкрытым небам; усе лекавыя расліны, якія завозяцца з-за мяжы, для каралеўскіх аптэк.

Жылібер прыехаў у Гродна добра падрыхтаваным. Ён пазнаёміўся з арганізацыяй і дзейнасцю французскіх батанічных садоў у Манпелье і Парыжы, венскага саду. У Гродна захапіў свой багаты гербарый з 300 раслін, бібліятэку, атрыманыя ад венскага батаніка Жакэна насенні экзатычных раслін. Каралеўскі батанічны сад складаўся з асобных участкаў, на якіх расліны былі пасаджаныя адпаведна з сістэмай К. Лінея. Наглядаў за імі вопытны садоўнік, для якога ў цэнтры саду быў збудаваны дом з дзвюма аранжарэямі. Насенні выкарыстоўваліся як мясцовыя (з ваколіц Гродна, Навагрудка, Нясвіжа, Шчорсаў, Беластока), так і прысланыя з Варшавы, Пецярбурга (сібірскія расліны даслаў

прафесар П. С. Палас), Вены, Страсбурга, Эдзінбурга, Англіі і іншых месцаў. Ужо ў 1777 г., калі сад наведаў Станіслаў Аўгуст Панятоўскі, калекцыя налічвала 1200 відаў экзатычных раслін (траў, імхоў, кустоў, дрэў). У наступным годзе іх было, па словах швейцарскага вучонага Ё. Бернулі, каля 2 тысяч відаў (з іх 1,5 тыс. – іншаземныя расліны). Каралеўскі батанічны сад у Гродне быў прызнаны адным з найлепшых у Еўропе (разам з Лонданскім і Пецярбургскім). Знакамітыя вандроўнікі англічанін В. Кокс, ксёндз і батанік-самавучка К. Клюк наведалі сад у 1778 і 1780 гг. і ўбачылі яго вялікім і квітучым. Такога саду не было ні ў Варшаве, ні ў Кракаве, ні ў Вільні. Пасля адстаўкі Тызенгаўза ў 1780 Жылібер перавозіць на 76 вазах у Вільню сваю бібліятэку, гербарыі, большасць каштоўных раслін батанічнага саду. У Вільні ён заснаваў новы сад для медыцынскага факультэта Галоўнай школы ВКЛ. Яшчэ ў 30-я гады XIX ст. у яе аранжарэі расла гродзенская лаўравішня. Сад можна ўбачыць на расійскім плане 1795 г.

Крын. і літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 157–162; Саяпин В. О парке Жилибера и зоопарке Кохановского. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 4–5; Швед В.В. "Квітнеючая Галандыя" на Нёмане // Швед В.В., Госцеў А.П. Горадня. Аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 сст.). – Гродна: Пергамент, 1997. – С. 77; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 335, 685.

Сад Батанічны Я. Каханоўскага, быў закладзены ў паўночна-усходняй частцы старога парку ў 1926 г. як школьны: яго мэтай было садзейнічанне навучанню дзяцей. На плошчы 3,07 га былі зробленыя градкі і клумбы, падзеленыя шырокімі сцежкамі такім чынам, каб вакол мог размясціцца цэлы клас для агляду і апісання раслін. Апошнія падбіраліся ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай пачатковай і сярэдняй школы. Сад меў аддзелы: біялагічны; марфалогіі ліста; біялогіі кветак; харчовых, прамысловых, лекарскіх раслін; дрэў і кустоў. У 1928 колькасць пасаджаных дрэў і кустоў дасягала 104, раслін – 726 гатункаў. У гэты год адбылося 109 школьных экскурсій. У 1928/29 школьным годзе адкрыўся заалагічны аддзел, які стаў асновай для арганізацыі ў 1929 гарадскога *заапарку*. У гады *вайны Вялікай Айчыннай* тэрыторыя саду выкарыстоўвалася ваенна-палявым шпіталем для пахавання памерлых. Пасля вайны парэшткі былі перапахаваныя ў брацкіх *могілках*.

Літ.: Саяпин В. О парке Жилибера и зоопарке Кохановского. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 7; Państwowe gimnazjum męskie im. Adama Mickiewicza w Grodnie. Drugie sprawozdanie szkolne. Za rok szkolny 1928/29. – Grodno: Nakład własny, 1929.

Сад Гарадніцкі, лазарэтны – частка вялікага губернатарскага саду ў XIX – пачатку XX ст. Рэшткі саду *батанічнага каралеўскага* належалі вайсковаму шпіталю, які размяшчаўся побач. Таму да пачатку XIX ст. звалі яго "лазарэтны". Са стварэннем губернскай улады ён стаў часткай Гарадніцкага саду. У 1818 г. гродзенская памешчыца княгіня Калета *Чацвярцінская* даслала міністру фінансаў прашэнне, у якім выказала жаданне купіць суседні з яе домам

запушчаны Гарадніцкі сад для адкрыцця публічнага саду. Аказалася, што ён знаходзіцца пры доме, дзе жыве гродзенскі *губернатар* (былым палацы *А. Тызенгаўза*), і часам тут спыняецца расійскі імператар. Мясцовыя ўлады вырашылі не прадаваць зямлю пад садам, а здаваць у арэнду. А для таго, каб прывесці яго ў "першабытны стан" яны папрасілі казну даць ім грошы. Першае, што трэба было зрабіць – гэта пасадзіць новыя фруктовыя дрэвы замест тых, якія замерзлі. Арандатара абавязвалі зрабіць новую агароджу, адрамантаваць дом садоўніка і будынак аранжарэі. На таргах у лютым 1818 Чацвярцінская, відаць, атрымала сад у арэнду на 12 год. Разам з тым ён застаўся ў распараджэнні губернатара. А таму сад называлі яшчэ Губернатарскім. У архіве захаваўся каштарыс на рамонт у ім аранжарэі і парнікоў у 1859 г. У другой палове XIX ст. Гарадніцкі сад стаў публічным (гарадскім). Яго межы ў паўночным і ўсходнім напрамках пашырыліся, і тэрыторыя дасягнула 3 дзесяцін (3,27 га). Для падтрымання саду быў садоўнік. Найбольш ўпарадкаваным быў участак, які прылягаў да Гараднічанкі і губернатарскага дома. Тут зрабілі рамантычную "швейцарскую даліну" з абрывамі, воднымі люстэркамі, якія размяркоўваліся тэрасамі, лёгкімі ажурнымі масточкамі. Гродзенцы любілі тут прагуляцца. На пачатку XX ст. была цяпліца, аранжарэя для вырошчвання вясновых раслін, ружаў і цыбулін кветак. Апекавалася гэтым гарадское таварыства садаводаў. Менавіта яно звярнулася па дазвол на будаўніцтва ў садзе кіёска для продажу газет і часопісаў.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 159–162.

Сад заалагічны Жылібера Ж. Э. Згадваецца ў дзённіках вандроўнікаў і вучоных Ёгана Бернулі і Вільяма Кокса. Яны пішуць толькі пра бачаную там у 1778 зубрыху. Ёй было каля 16 месяцаў, але на выгляд яна была як дарослы бык або англійская карова, мела высокую і тоўстую шыю, якая разам з горлам і грудзьмі была пакрытая кучаравай поўсцю, што мае спецыфічны пах. На галаве былі закручаныя назад рогі, а язык быў блакітнага колеру. Гэта пакуль адзіная інфармацыя пра С. з.

Літ.: Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 337, 686.

Садоўскі Ян/Іван Іванавіч – мешчанін (у некаторых дакументах напісана, што дваранін), адзін з вядомых гродзенскіх фотамайстроў. Заснаваў па вул. Купецкай, у доме Штакельбергавай, фатаграфічную ўстанову пасля дазволу гродзенскага *губерскага праўлення* ад 27.02.1865 (па інш. дадзеных 17.02.1865). Існавала ў 1871–1907 гг. (з перапынкамі). Пэўны час працаваў разам з Л. Казлоўскім. Вядомыя яго фотаздымкі сям'і *А. Е. Багдановіча* і *Верас З.* Прымаў удзел у падрыхтоўцы выдання "Альбома строяў Расіі" (1870-я) – з 532 змешчаных там фотаздымкаў 31 адносіцца да беларускага строя.

Літ.: Верас З. Я помню ўсё. Успаміны, лісты/уклад. М. Скобла. – Гародня, Вроцлаў, 2013, с. 386.

Сады каралеўскія, знаходзіліся ў XVI–XVIII стст. пад заходнім адхонам *замка Старога*, над р. Гараднічанкай. Каралеўскія садоўнікі жылі на Падгор'і і на падэшве былога *вакольнага горада* (вул. Садоўніцкая/цяпер Завадская).

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадская прастора ў XVI – XVIII стст. // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 100.

Сака Юзаф/Джузэпэ (1721, Верона – 1798, Вільня) – маёр кавалерыі, гараднічы Гарадні, каралеўскі архітэктар. У Польшчы з 1767 г. Належаў да кола архітэктараў, якое ўтварылася вакол *Станіслава Аўгуста Панятоўскага* ў Варшаве (так званая "станіславаўская архітэктурная майстэрня"). Разам з Я. Фантанам як рысавальшчык прымаў удзел у праектаванні сталовай і бібліятэкі каралеўскага замка ў Варшаве (1767), Замка (1768–69), калегіі варшаўскай. У 1771 атрымаў чын капітана кавалерыі літоўскага войска і стаў архітэктарам Скарбовай *камісіі* ВКЛ. На Гродзеншчыну перанёс дасягненні варшаўскай архітэктуры (палацы ў Свяцку і *Аўгустоўку,* сядзіба *Тызенгаўза А.* ў в. Караліно каля 1776, палац Храптовічаў у Шчорсах). У 1773 рэкамендаваны Тызенгаўзу ксяндзом прымасам М. Панятоўскім для будаўніцтва касцёлаў у Горадні, з 1774 перайшоў на пастаянную службу да яго. Заняў месца *Яўха*, адкліканага ў Варшаву. Магчыма, быў спачатку яго супрацоўнікам і жыў у *палацы Сапег*. З часам стаў кіраўніком *школы будаўнічай* на *Гарадніцы.* Хутчэй за ўсё ён аўтар плана будаўніцтва *Кунстава* (горада майстроў) у *Ласосне*, *палацаў адміністратара і віцэ-адміністратара* на Гарадніцы. У *палацы Тызенгаўза* праектаваў "супер порты" (роспіс над дзвярыма ў інтэр'ерах). Займаўся падрыхтоўкай апартаментаў для раскватэравання балетмайстра *Марэлі* з жонкай. Ставіць будынкі ў фальварках можна было толькі пасля подпісу С. на плане. У 1775 г. атрымаў дваранства. Галоўны архітэктар ВКЛ (1775–1795). 15.04.1780 у Варшаве ажаніўся з Францішкай Малкоўскай (?–1850, Гродна, пахаваная на каталіцкіх могілках, сектар А 28). Адзін з аўтараў праекта *палаца Радзівілаў* у Гродне, рэстаўраваў *Новы Замак* і адаптаваў яго да паседжанняў сейма 1784 г. У Бібліятэцы Варшаўскага ўніверсітэта захаваліся апісанні замка і патрэбных для рамонту і пераробак прац, каштарыс з подпісам Сака за 1783 і 1784 (ці 1781 г.?). Пахаваны ў Гродне.

Крын. і літ.: Квитницкая Е.Д. Строительство Тизенгауза в Гродно / Е.Д. Квитницкая // Архитектурное наследство. – М., 1958. – № 11. – С. 27; Чернякевич А.Н. Знакомьтесь, Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Навукова-метадычны дапаможнік для настаўнікаў гісторыі і геаграфіі. Вып. 12. – Гродна: ДУА Гродзенскі АІРА, 2010. – С. 6–7, 44; Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 457; Dąbrowski S., Artyści na dworze Antoniego Tyzenhauza (przyczynki archiwalne)// Biuletyn historii i kultury. – 1933. – № 3. – S. 134–139; Katalog rysunków z gabinetu rycin Biblioteki Uniwersytetu Warszawskiego. Cz. 2. – Warszawa, 1969. – S. 64–65; Kwiatkowski M. Stanisław August: Król-Architekt. – Wrocław, Warszawa i inni. – wyd-wo Narodowe im. Ossolinskich, 1983. – S. 47, 62, 64, 90, 250, 259. St. Łoza. Architekci i budowniczowie w Polsce, Warszawa, 1954. – s. 266; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 341, 881; Szymański S., Pałac królewski w Grodnie // Rocznik Białostocki. T. VI. – 1966. – S. 318, 326.

Сакальніцкі Міхал (29.09.1760, в. Вежэя, сёння Велікапольскае в-ва – 26.09.1816, Варшава) – падпалкоўнік інжынернага літоўскага корпуса, будаўнік умацаванняў і *моста* праз *Нёман* у Гродне ў 1792 г. Скончыў рыцарскую школу (1777–1780) і ў 1781–87 вучыўся гідраграфіі, тапаграфіі і абароннаму будаўніцтву ў Германіі і Францыі. У 1789 арганізаваў інжынерны корпус у Вільні. Падчас вайны польска-расійскай 1792 быў генеральным кватэрмайстрам арміі ВКЛ. Рыхтаваў Гродна да абароны: на правым беразе Нёмана будаваліся ўмацаванні для галоўных сілаў, а на левым – для рэзерваў і харчовых магазінаў. Сапраўдным шэдэўрам стаў пабудаваны С. *мост* праз Нёман. Удзельнічаў у *паўстанні 1794 г*., арганізаваў корпус конных стральцоў, будаваў абарончыя збудаванні пад Варшавай. На загад А. Суворава С. 24.12.1794 быў вывезены ў Пецярбург. Толькі ў канцы 1796 быў вызвалены і выехаў у Парыж. Апублікаваў тут у 1802 у "Dzienniku Akademii wojskowej" ("Дзённіку Вайсковай акадэміі") апісанне свайго гродзенскага моста. Пазней С. увашоў у французскія легіёны, у 1812 быў у штабе Вялікай арміі Напалеона і яго ад'ютантам. Узнагароджаны Крыжам Ганаровай Лігі. Пасля смерці князя *Панятоўскага Юзафа* кароткі час быў камандуючым польскай арміі (1813), ахоўваў Парыж. Прывёз у Польшчу труп Ю. Панятоўскага і застаўся ў Варшаве.

Літ.: Павач. А. Под крылом Коложы. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С.117; Сокольницкий М. "Исполнено по высочайшему повелению…". – Мн.: БГУ, 2003; Jankowski J., Mosty w Polsce i mostowcy polscy (od czasów najdawniejszych do końca I wojny światowej). Wrocław, Warszawa: Wydawnictwo PAN, 1973. – S. 97–98, 104; Kuczman K. Sokolnicki Michał // Słownik biograficzny historii Polski. T. 2 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C. 1418.

"Сакрэт" – гарадзенскае ўрочышча, на якім цяпер знаходзяцца дзейныя камунальныя могілкі каля "Азота". У канцы 1790-х гадоў тут быў "лясок кашталяна Вальмара", куды любіў прыязджаць у любую пару года *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі*, які жыў у гэты час у Гродне пад наглядам расіян. Ён, па словах Міхаіла дэ Пуле, у С. "батанізаваўся, любіў заводзіць размовы пра раслінае царства". Гэты аўтар выдаў кнігу ў 1871 і пісаў, што ў раёне Сакрэта "цяпер гродзенскае пазагарадское месца для прагулак" (па-руску "гульбище"). У перыяд Расійскай імперыі у С. было месца вайсковага навучання. Даследчык В. М. Чарапіца пісаў, што тут было месца дуэляў. У сваім дзённіку Налкоўская З. напісала 20.05.1924: "Гай, званы Сакрэтам, авеяны дымамі зелені, збіранне фіялак". У 1939 г. праз Сакрэт праходзіла лінія абароны польскіх войск. А пазней супрацоўнікі НКУС, пры актыўным удзеле мясцовых камуністаў, расстрэльвалі тут абаронцаў Гродна. Гродзенец Л. С. Махнач успамінаў, што пасля вайны 1941–44 дзеці хадзілі ў С. па ягады і грыбы, што туды вяла Напалеонаўская дарога, ляжаў вялікі валун, на які яны любілі залазіць.

Літ.: Де Пуле. М. Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794–1797 годах. Изд. 2-е. – СпБ., 1871. – С. 94, 185; Зусім іншы горад /Уклад. А.Ф. Вашкевіч,

Т.У. Касатая. – Гродна: ТАА "ЮрСаПрынт", 2017. – С. 57; Філіповіч М., Савіцка Э. (Беласток). Савецкія рэпрэсіі супраць абаронцаў Горадні ў 1939 г. // Горад святога Губерта: зборнік краязнаўчых артыкулаў. Выпуск 6 (2012). – Горадня: б.в., 2012. – С. 87; Черепица В.Н. История одной дуэли: к родословной выходцев из Ирландии гродненских дворян О'Бриен дэ Ласи / В.Н. Черепица // Веснік ГрДУ імя Я. Купалы. Сер. 1. – 2006. – № 2. – С. 23–28; Nałkowska Z. Dzienniki III 1918–1929/ Opracowanie, wstęp i komentarz H. Kirchner, Warszawa, 1980, s. 111; Poczobut-Odlanicki St. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok, 2015. – S. 203.

Салавейчык Восіп Якаўлевіч – нясвіжкі мешчанін, 21.07.1884 г. атрымаў дазвол на адкрыццё фотамайстэрні ў Гродне пасля памерлага бацькі *С. Якава Ісакавіча.*

Салавейчык Рафаіл (?, Гродна – ?) – удзельнік рэвалюцыйнага руху. У 1884 г. паступіў у Берлінскі тэхналагічны ін-т, у 1885 перайшоў у Цюрыхскі палітэхнічны ін-т. У Швейцарыі ўвайшоў у кола рускіх рэвалюцыйных эмігрантаў, пазнаёміўся з Г. В. Пляханавым, П. Б. Аксельдорам і інш. З 1887 – член "Саюза сацыялістычнага літаратурнага фронту", звязанага з марксісцкай групай "Вызваленне працы". З кастрычніка 1888 па сакавік 1889 жыў у Гродне, дзе займаўся дастаўкай рэвалюцыйнай літаратуры ў Расію. Адзін з ініцыятараў стварэння "Замежнага рускага саюза сацыял-дэмакратаў" (1888). На пач. 1889 арыштаваны. У яго кватэры знайшлі марксісцкую літаратуру: "Манифест коммунистической партии", "Наемный труд и капитал", "Нищета философии", "Развитие социализма от утопии к науке", працы Г. В. Пляханава і інш. У турме захварэў псіхічна. Скончыў жыццё самагубствам.

Літ.: Российская Еврейская Энциклопедия. Т. 3. Биографии: С-Я., М., 1997. – С. 93.

Салавейчык Якаў Ісакавіч (?–1884) – гродзенскі ўладальнік фотамайстэрні паводле дазволу ад 30.07.1881. Да гэтага трымаў фотамайстэрню ў Слоніме, але пасля пажару пераехаў у Гродна. Пасля яго смерці майстэрня перайшла да сына *Салавейчыка Восіпа Якаўлевіча*. Знаходзілася ў будынку побач з Домам купцоў Мураўёвых на пл. Савецкай (цяпер там пляцоўка перад гатэлем "Сямашка").

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 78; Попов А.П. Российские фотографы (1839–1930). Словарь – справочник. Т. 2 // html5 / flash

Саламоні Г. – балерына трупы *Тызенгаўза*. У 1779 у Гродне танцавала ў балеце "Жэліма". Выступала ў Варшаве ў 1785–88 у балеце "Гілас і Сільвія", у 1790–93 – у балеце "Капітан Сандэр на востраве Караліны".

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. – Lwów. T. II, 1925. – S. 329, 330, 339.

Саланевіч Лук'ян Міхайлавіч (1866–1938) – прапагандыст "заходнерусізму", рэдактар газеты "Северо-Западная жизнь" ("Белорусская жизнь"), якая ў 1911–1913 гг. выходзіла ў Гродне, пераехаўшы з Вільні. Як пісала "Наша Ніва", ён павінен быў на загад сваіх гаспадароў "там загубіць нарадзіўшыйся беларускі рух" (НН, 1911, № 10, с. 1). Скончыў Свіслацкую настаўніцкую семінарыю (1886), працаваў у народных вучылішчах і *губернскам праўленні* Гродзенскай губ. У 1901 апублікаваў "Краткий исторический очерк Гродненской губернии за сто лет её существования. 1802–1902", дзе даказваў, што беларусы – частка рускай нацыі, якая доўгі час апалячвалася і акаталічвалася, і толькі падзелы Рэчы Паспалітай паспрыялі доўгачаканаму "ўз'яднанню". Быў адным са стваральнікаў "Беларускага таварыства", якое прытрымлівалася канцэпцыяў заходнерусізму і палітычнай платформы Сталыпіна П. А. У 1912 заснаваў пры рэдакцыі газеты "Северо-Западная жизнь" "Белорусскую историческую библиотеку". Пасля 1917 г. адышоў ад публіцыстычнай і грамадскай дзейнасці. У 1934 быў рэпрэсаваны і памёр у лагеры каля г. Севера-Енісейска. Рэабілітаваны ў 1989 г. Яго сын Іван (1891–1953) быў барацьбітом з бальшавікамі і прыхільнікам манархічнага ладу для Расіі, аўтарам вядомай аўтабіяграфічнай кнігі "Россия в концлагере". Другі сын Барыс таксама эміграваў з савецкай Расіі, займаўся літаратурнай творчасцю, выдаваў часопіс "Родина".

Літ.: Ермоленко В. А., Черепица В.Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 262; Ціхаміраў А. Саланевічы і Гародня // Arche. – 2010. – № 1–2. – С. 185–193. Саланевіч І., Россия в концлагере.

Салаўёў Зіновій Пятровіч (22.11.1876, Гродна – 6.11.1928) – адзін з арганізатараў аховы здароўя ў СССР, ініцыятар стварэння піянерскага лагера "Артэк" у Крыме. Дзяцінства прайшло ў Гродне, дзе выхоўваўся пад наглядам мацеры Тэклі Міцкевіч, сваячкі Адама Міцкевіча. Скончыў Сімбірскую гімназію, медыцынскі факультэт Казанскага ўніверсітэта (1904). Ваяваў у вайне руска-японскай. Вярнуўся ў Сімбірск і працаваў земскім урачом, пасябраваў з урачом-бальшавіком Дзмітрыем Ульянавым, малодшым братам У. І. Леніна. Быў сябрам РСДРП. За рэвалюцыйную дзейнасць неаднаразова арыштоўваўся. У 1909–1912 быў у ссылцы ў Валагодскай губ. Пасля яе ў 1912 пасяліўся ў Маскве, быў кіраўніком Пірагоўскага таварыства, рэдактарам часопіса "Общественный врач". Удзельнік узброенага паўстання ў Маскве (1917). Загадчык медыцынскай часткі НКУС (1917), загадчык часопіса "Известия советской медицины" (1918). Нам. наркама аховы здароўя РСФСР (1918), начальнік Галоўнага ваенна-санітарнага ўпраўлення Чырвонай арміі і старшыня Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца (1920), адначасова выкладаў курс сацыяльнай гігіены ў 2-м Маскоўскім медінстытуце (з 1923). Аўтар шэрагу прац па тэорыі і гісторыі медыцыны і медыцынскай адукацыі, па ахове здароўя. 16.06.1925 Салаўёў прымаў першую лінейку ва ўсерасійскім піянерскім лагеры-санаторыі "Артэк", створаным паводле яго

ідэі ў Мядзведзь-гары ў Гурзуфе. Там захаваўся домік, у якім жыў С. У Гродне яго імя носіць Першая гарадская бальніца.

Літ.: Ермоленко В. А., Черепица В.Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 245–247.

Салей Іван Сямёнавіч (5.09.1931, в. Раўкі Мастоўскага р-на) – герой Сацыялістычнай Працы (1971), заслужаны будаўнік БССР (1974). З 1956 узначальваў комплексную брыгаду будаўнікоў СУ–151 абласнога будтрэста № 11, з 1979 па 1992 – будаўніча-мантажнага трэста № 30. Быў дэпутатам Гродзенскага *гарадскога Савета дэпутатаў*. Узнагароджаны ордэнам Леніна і медалямі.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 218–219; Книга Героев Гродненской области / сост. Ю.М. Алексей, О.М. Якубович. – Гродно: ГОУПП “Гродн. тип.”, 2004. – С. 141.

Салятыцкі Анатоль Іосіфавіч (24.08.1940, в. Слабодка Пружанскага р-на Брэсцкай вобл.) – скульптар, чалец Саюза мастакоў СССР (1978). Пасля заканчэння Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1972) працаваў у Гродзенскіх мастацка-вытворчых майстэрнях. Аўтар скульптур: “Сцяганосец” (1974, Слонімскі музей), “Няскораныя” (1976, музей ва Ушачах); станковых прац: “За зямлю”, “Партрэт В. Соламавай” (Белдзяржмузей); помнікаў І. Філідовічу (1976, Дзятлава), ахвярам фашызму (Скідзель, в. Гліняны Гродзенскага р-на), А. Міцкевічу (2007, в. Завоссе Баранавіцкага р-на), рэльефнага пано “Дзеці народаў свету” для Гродзенскага палаца піянераў і школьнікаў (1975, у суаўтарстве з У. Церабуном), дэкаратыўнай жырандолі ў інтэр’еры Гродзенскага абласнога *драматычнага тэатра* (1983, у суаўтарстве); бюстаў: С. В. Прытыцкага (1975, В. Бераставіца), Яна Фогеля (1986, Дзятлава); мемарыяльных знакаў: настаўнікам і вучням СШ N1 г. Гродна, Пятру Камышаву (в. Заполле Навагрудскага р-на) і інш. На пачатку 1990-х С. паводле замовы Гродзенскага *гарадскога выканаўчага камітэта* выканаў бюст паэта *Лейбы Найдуса* (1890–1918), але помнік не быў усталяваны. Аўтар мемарыяльнай дошкі з барэльефным партрэтам *П. А. Сталыпіна* (2011), якая ўсталяваная на будынку Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта.

Літ.: Ивановский В. Уходят годы — остаются памятники // Перспективы. Гродно, 2004. – 2 июля, С. 7; Салятыцкі Анатоль Іосіфавіч // Беларускі саюз мастакоў, 1938–1998: энцыклапедычны даведнік. Мінск, 1998. С. 484; Салятыцкі Анатоль Іосіфавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. Мінск, 1987. Т. 4, с. 622–623.

“Самаабарона зямлі Гродзенскай” – польская арганізацыя, створаная ў Гродне з былой царскай арміі і ўсходніх карпусоў, якая існавала з лістапада 1918 г. да 1 сакавіка 1919. На з’ездзе нацыянальных рад павятовых была выбраная Галоўная рада, якая і занялася ўтварэннем “Самаабароны”: разброіла некалькі камендатур у павеце (Сапоцкін, Індура, Талочкі, Масты), збірала ці купляла ў немцаў зброю і харчаванне. Значную ролю адыгрываў

у гэтым *Станіслаў Іваноўскі* (брат Вацлава), віцэ-старшыня рады. Ён, напрыклад, падтрымоўваў сувязь са штабам нямецкай X арміі, якая сышла з Украіны. 12 снежня 1918 на чале вайсковых фармаванняў "Самаабароны" з чынам генерал-маёра быў прызначаны дэкрэтам Галоўнага польскага кіравання ў Варшаве Мікалай Сулеўскі, уладальнік мёнтка *Грандзічы*. 18 снежня ў *Фарным касцёле* адбылася прысяга на вернасць службе Рэчы Паспалітай. "Самаабарона" мела сваё вярбовачнае бюро, на чале якога стаяў палкоўнік Маліноўскі (Казімір Сковыш) і падпалк. Отан Багінскі. З важных асоб трэба ўспомніць падпалк. *Багатырэвіча Б.,* паручнікаў *Чучаловіча* і Рыбека. Пазней "Самаабарона зямлі Гродзенскай" існавала ў выглядзе 78 гродзенскага палка стралкоў і 23 палка гродзенскіх уланаў у складзе літоўска-беларускай дывізіі, зарганізаванай генералам В. Івашкевічам у Лапах і Камарове. За баі за незалежнасць Ю. Пілсудскі ўзнагародзіў гродзенскі полк стралкоў крыжам Віртуці Мілітары, а ў 1933 г. ён атрымае назву палка імя *Стэфана Баторыя*.

Літ.: A. Czerniakiewicz, Przejmowanie władzy przez Polaków w Grodnie (koniec 1918 – kwiecień 1919) // Początki niepodległości. Lomża-Białystok-Grodno-Suwałki 1918–1919. – Białystok 1998, s. 43–44; Iwanowski K. Stanisław Iwanowski. Organizator Grodzieńskiej Obrony Obywatelskiej. 1918–1919. – Gdynia, Gdańsk: Oficyna wydawnicza I . Iwanowski, 2002. – S. 35–39.

Самуйлін Валеры Навумавіч (12.05.1946, Гродна – ?) – кіраўнік ансамбля "Музыкі" (з 1984), дырыжор аркестра ансамбля танца "Белыя росы" (з 14.08.1990). У 1960–1964 вучыўся ў Гродзенскім музвучылішчы, затым у 1964–1965 працаваў у Слонімскай дзіцячай музычнай школе. У 1965–1968 служыў у Савецкай арміі. Без адрыву ад вытворчасці скончыў Беларускую дзяржаўную кансерваторыю (1969–1971). У 1968–1988 працаваў у Гродзенскім музычным педагагічным вучылішчы, а затым, з 1988 па 1990 – у дзіцячай музычнай школе № 1.

Самуэль бэн Мойзеш – літаратурназнавец. Жыў у канцы XVII ст. у Літве, галоўным чынам у Гродне. Напісаў каментары да некалькіх раздзелаў Пяцікніжжа 1669 года выдання. У рукапісах вядомы яго каментар да псалмоў. Гэта ўсё, што пра С. вядома.

Літ.: Bersohn M. Słownik biograficzny uczonych żydów polskich XV, XVII, XVIII wieku. – Warszawa, 1906.

Сангін Станіслаў Юзафатавіч/Восіпавіч (каля 1818, магчыма, на Беласточчыне – 15.02.1863, с. Рэчыца Пружанск. у.) – паўстанец 1863 г., псеўданім Маланка. Працаваў столаначальнікам у Гродзенскім *губернскім праўленні*, пратэндаваў на пасаду рэдактара "Гродненских губернских ведомостей". Затым працаваў піцейна-акцызным наглядальнікам у Бельскім у., быў тады калежскім асэсарам. Пасля выхаду ў адстаўку працаваў кіраўніком маёнтка каля Сямятыч у Бельскім у. Супрацоўнічаў з Віленскай археалагічнай камісіяй. Публікаваўся ў віленскім друку на эканамічныя тэмы, збіраў экспанаты для

віленскага музея старажытнасцей. Прысутнічаў у 1861 г. на сходзе ў Саколцы, дзе быў пакладзены пачатак стварэння Гродзенскай *рэвалюцыйна-дэмакратычнай арганізацыі*. Прызначыў *Геніюша* начальнікам гродзенскага паўстанцкага бюро. Дапамагаў выдаваць і распаўсюджваць *"Мужыцкую праўду"*. Удзельнік паўстанцкага руху Ю. Такарэвіч гаварыў, што Сангін разам з *В. Урублеўскім* стаялі на чале "літоўскай партыі" і былі выразнікамі памкненняў беларускага народа. Высока ацэньваў ролю Сангіна ў выданні "Мужыцкай праўды" ўдзельнік руху і яго гісторык Б. Ліманоўскі. Сангін фармаваў партызанскія атрады на сумежжы Беларусі і Польшчы, відаць, быў падваяводскім (намеснікам Урублеўскага). Удзельнічаў у баях пад Сямятычамі (6–7.02.1863), партызанскім рэйдзе Рагінскага на Пружаншчыну, дзе і загінуў каля фермы Рэчыца (зараз Камянецкі раён). Магчыма, пахаваны там у брацкай магіле паўстанцаў. Аддадзены ваеннаму суду завочна і прыгавораны да расстрэлу.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 384, 414, 563 адв.; Электронны рэсурс: narod.ru/1864/Spis-kalinovski.htm. Дата доступу: 16.01.2013; Памятная книжка Гродненской губернии на 1860 г. – Гродна, 1869. – С. 32; Кісялёў Г. Разам з вялікім… – С. 48; Яго ж. Радаводнае дрэва…, с. 35–36; Яго ж. Смак Беларушчыны… – С. 411, 412, 415, 417, 424, 425.

Сангушкі – княжацкі род герба Пагоня ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай. У Горадні валодалі дзвюма сядзібамі: камяніцай з *карчмой* на *Рынку* і пляцамі паабапал Скаліманаўскай вул. Паводле крыніц 1780 г. ім часова належалі пляцы на заходнім баку вул. Віленскай, насупраць рынкавай сядзібы. З уладальнікаў XVIII ст. можна ўспомніць вялікага літоўскага маршалка Паўла Караля С., ягоных сыноў надворнага літоўскага маршалка Януша Аляксандра С. і літоўскага маршалка Юзафа Паўліна С.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2008. – С. 225.

Санфірава Вольга Аляксандраўна (2.05.1917, Самара – 13.12.1944, Пултуск, Польшча) – камандзір эскадрыллі 46-га гвардзейскага начнога бамбардзіровачнага авіяцыйнага палка 325-й начной бамбардзіровачнай авіяцыённай дывізіі 4-й паветранай арміі 2-га Беларускага фронту. Гвардыі капітан. Герой Савецкага Саюза (23.02.1945). Узнагароджаная ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны 1-й ступені, медалём "За оборону Кавказа". Пахаваная ў Гродне ў брацкай магіле ў *парку гарадскім* імя *Жылібера Ж.-Э.*, пад *помнікам савецкім вайскоўцам, партызанам і падпольшчыкам*.

Крын. і літ.: https://ru.wikipedia.org/wiki/Санфирова,_Ольга_Александрова. Доступ 06.01.2021; Ракобольская И., Кравцова Н. "Нас называли ночными ведьмами. Так воевал женский 46-й гвардейский полк ночных бомбардировщиков". 2-е изд., доп. – М., 2005.

Сапега Грызельда (?–1636) – дачка Яна Вадынскага и Аляксандры Марыянны Сабескай. Прыёмная дачка *Весялоўскага Крыштафа*. Другая жонка

(1632) Яна Станіслава Сапегі (1589–1635), маршалка вялікага літоўскага (1620). У гонар С. быў заснаваны *кляштар брыгіцкі* ў Гродне.

Сапега Фрыдэрык – падкаморы Віцебскі. Разам з апошняй жонкай Крысцінай з Пацаў быў фундатарам *касцёла дамініканскага*, які быў асвечаны ў імя Прасвятой Дзевы Марыі Ружанцовай у 1635 г. у прысутнасці караля *Уладзіслава IV*. Ф. Сапега і яго брат Крыштаф падаравалі касцёлу маёнтак Калбасіна і пляцы пры *рынку Нямецкім* у Гродне.

Літ.: Гузевіч А.С. Сапегі ў Гродна // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 4. – Гродна: ГДГАМ, 1997. – С. 79–82.

Сапега Юры Мікалаевіч (1.01.1965, Гродна) – гродзенскі алімпіец-валейбаліст. Срэбны прызёр XXIV Алімпійскіх гульняў (1988), срэбны (1986) і бронзавы (1990) прызёр чэмпіянату свету, пераможац Кубка свету (1991), чэмпіён Еўропы (1987, 1991), чэмпіён свету сярод юніёраў (1984). Пераможац Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў (ЦСКА, 1987–91), Кубка ЕКВ (“Петрарка”, Італія, 1994), Суперкубка (ЦСКА, 1991). Семіразовы чэмпіён СССР (ЦСКА, 1985–1991), заслужаны трэнер Расіі (2000).

Літ.: Попко И.Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 103–107.

Сапега Яўстахі, паходзіў са старажытнага шляхецкага роду, вучыўся ў нямецкай гімназіі, потым доўга жыў у Францыі і Англіі. Гродзенцы выбралі яго кіраўніком гарадскога камітэта (пазней рада), і ён добра спраўляўся са сваімі задачамі, набыўшы неблагі досвед, кіруючы сваёй вялікай маёмасцю. Ён падзяліў камітэт на аддзелы, наладзіў бухгалтэрыю, пазычыў гарадской казне з умовай даўгавога абавязацельства немалую суму са сваёй маёмасці. У 1918 г. С. быў у складзе Літоўскай камісіі пры Рэгенацыйнай радзе ў Варшаве і адначасова сябрам Камісіі выканаўчай Часовай рады. Міністр замежных спраў II Рэчы Паспалітай. 27.08.1920 г. на паседжанні Рады аховы дзяржавы прапанаваў, “каб мяжа паміж Расіяй і Польшчай прайшла ўздоўж былых нямецкіх акопаў: ад Дзвінска на паўднёвы ўсход ад Вільні, далей каля Баранавіч да Пінска і Луцка, далей па лініі Гарыні і Збруча”. Быў у Варшаве на чале так званай Літоўскай камісіі, якая падтрымоўвала Аб’яднанае Польскае Таварыства ў Літве.

Літ.: K. Gomółka, Między Polską a Rosją. Białoruś w koncepcjach polskich ugrupowań politycznych 1918–1922, Warszawa 1994, s. 126; Łosowski P., Stosunki polsko-litewskie…, s. 31; J. Gierowska-Kałłaur, Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich, s. 260.

Сапегі – магнацкі род герба Ліс у ВКЛ, які лічыўся другім паводле значэння пасля Радзівілаў. Зямельнай маёмасцю ў Горадні сталі валодаць з пачатку XVII ст., калі Жыгімонт Ваза надаў двор (магчыма на вул. Бернардзінскай) літоўскаму надворнаму маршалку Івашку (Яну Станіславу) С. У 1634 г. на грошы Фрыдэрыка і Крысціны Сапегаў былі пабудаваныя *кляштар дамініканскі* і касцёл імя Прасвятой Дзевы Марыі Ружанцовай. Віленскі ваявода

Казімір Ян С. у 1680–90 купіў пляцы на ўсходнім баку *Рынку*, паміж вул. Бернардзінскай і Азёрскай. На апошняй вуліцы шэраг пляцаў у канцы XVII ст. набыў брат Казіміра Яна, вялікі літоўскі падскарбі Бенедыкт Павел С. З 1684 С. належаў *"шкляны палац"*, куплены ў бернардзінцаў. У 1730–60-х гадах ўласнікамі зямельных нерухомасцяў сталі падляскі ваявода Міхал Юзаф С. і літоўскі падканцлер Міхал Антоні С. Сапегам да 1765 належаў размешчаны побач з касцёлам езуцкім *палац Сапег,* у якім адбываліся *сеймы Рэчы Паспалітай*. Вялікі літоўскі канцлер Аляксандр Міхал С. у 1789 набыў наднёманскі палац гарадзенскага маршалка Казіміра Вольмера на вул. Садоўніцкай. У першай палове XVIII ст. надворны падскарбі Юзаф Францішак С. валодаў 2 пляцамі на вул. Падольнай, а літоўскі маршалак Аляксандр Павел С. і генерал літоўскай артылерыі Казімір Лявон С. часова валодалі сядзібай на рагу Рынку і вул. Маставой.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2008. – С. 224–225, Borowik P. Jurydyki miasta Grodna w XV-XVIII wieku. – Supraśl: Acta collegii Suprasliensis, 2005. – S. 119.

Саўкоў В.М. – старшыня Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта ў 1944–1945 гг.

Саюз палякаў у Беларусі – рэспубліканская грамадская арганізацыя, якая паўстала ў чэрвені 1990 г. на І з'ездзе палякаў у Беларусі. У Саюз злучыліся грамадскія арганізацыі палякаў Гродна, Брэста, Мінска, Ліды, Баранавічаў. У Гродне з 1988 існавала Таварыства польскае культурна-асветніцкае імя А. Міцкевіча. Сядзіба Саюза знаходзілася ў Гродне, у прыгожым будынку на рагу вуліц Ф. Дзяржынскага і А. Міцкевіча. Цяпер Галоўнае ўпраўленне Саюза, гарадскі і абласны імя А. Міцкевіча аддзелы знаходзяцца ў будынку па вул. Будзёнага. На пачатку 2000-х гадоў Саюз меў свае структуры больш чым у 40 мясцовасцях і налічваў больш за 25 тыс. сябраў. Першым старшынёй Саюза быў *Тадэвуш Гавін*. Галоўныя напрамкі дзейнасці Саюза – адраджэнне польскай мовы і культуры. Адкрытыя польскія школы ў Гродне і Лідзе, "Польскія дамы" у Гродне, Баранавічах, Шчучыне, Лідзе. Выходзіць штотыднёвая газета "Głos znad Niemna na uchodźstwie" ("Голас з-над Нёмана ў эміграцыі", рэд. Інэс Тодрык-Пісальнік) і часопіс "Magazyn Polski na uchodźstwie" ("Польскі Журнал у эміграцыі", рэд. Ірэна Валюсь), штомесячнік "Słowo Ojczyste" (орган польскай суполкі). Ёсць партал у Інтэрнэце Znadniemna.pl (рэд. А. Пісальнік).

Пасля VI з'езда СПБ (сакавік 2005) улады РБ не прызналі вынікі галасавання і правамоцнасць самога з'езду. Газету "Głos znad Niemna" пачаў выдаваць ідэалагічны аддзел абласнога выканаўчага камітэта ў Гродне. Чальцы СПБ сабралі 3 тыс. подпісаў пад лістом да прэзідэнта. Адпаведна атрымалі новы ўдар: былі арыштаваныя дзеячы СПБ, Дом Польскі ў Гродне быў заняты прадстаўнікамі ўлад з дапамогай міліцыі. За пратэстныя акцыі шмат польскіх актывістаў было арыштавана і асуджана, але 80% структуры арганізацыі ўдалося захаваць.

Сёння ў Гродне дзейнічаюць грамадскія арганізацыі: Саюз палякаў у Беларусі (СПБ, галоўнае ўпраўленне і мясцовыя аддзелы – гарадскі і абласны), Таварыства польскіх ветэранаў, Таварыства палякаў-ахвяр палітычных рэпрэсій, Таварыства вайскоўцаў Арміі Краёвай у Беларусі, Гурток жанчын пры *Мацежы польскай школьнай* (да яе ліквідацыі). Існуюць моладзевыя арганізацыі: Таварыства моладзі польскай пры Саюзе палякаў у Беларусі, Клуб маладой Палоніі "Гродзенскія салаўі", Саюз польскіх Гарцэраў у Беларусі, Першая гродзенская Гарцэрская дружына "Вікторыя" імя *Стэфана Баторыя*, трэцяя гродзенская Гарцэрская дружына "Сусвет", сёмая гродзенская Гарцэрская дружына "Зялёны прамень", восьмая гродзенская Гарцэрская дружына "Вольныя птушкі", першая Гродзенская зухавая грамада "Зялёныя праменьчыкі". Сярод культурна-асветніцкіх устаноў: польскі тэатр пры СПБ, Камітэт памяці А. Міцкевіча ў Беларусі, Камітэт памяці *Э. Ажэшкі* ў Беларусі, Бібліятэка польская ў Гродне, хоры "Рэха Гродна" і "Голас з Нёмана" пры СПБ, дзіцячы ансамблі "Званочкі" і "Гродзенскія салаўі" пры СПБ у Гродне, моладзевы ансамбль спеваў і танца "Храбры" пры польскай школе, польскі народны ансамбль танца і спеваў "Ляхі", ансамбль "Трыа".

Асвету прадстаўляюць: *школа польская* (сярэдняя школа № 36), Польская *Мацеж школьная* (ліквідаваная некалькі гадоў таму), *семінарыя вышэйшая духоўная*, філія варшаўскага Універсітэта трэцяга веку, Інстытут катэхізічны. Існуюць польскія прафесійныя аб'яднанні: Таварыства польскіх лекараў у Беларусі, гродзенскі абласны аддзел; Таварыства польскіх скульптараў у Беларусі; Таварыства настаўнікаў, Таварыства народных умельцаў, Суполка санітарак і акушэрак. Працуе гаспадарчая ўстанова – Прамыслова-гандлёвая палата СПБ. Дзейнічаюць спартовыя клубы: "Баторы" і вяслярскі клуб пры польскай школе. Сістэматычна праводзіцца ў Гродне шэраг мерапрыемстваў: Фестываль польскай культуры, Свята незалежнасці Польшчы, аплаткавыя сустрэчы, навуковыя канферэнцыі.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і савецізацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – 413–414; Kałuski M., Sprawy kresowe – poza cenzurą. T. 1. – Toruń-Melbourne, 2017. – S. 643–651; Gawin T. O bycie Polakiem. – Grodno, Białystok, 2013.

Саюз пісьменнікаў БССР. Гродзенскае абласное аддзяленне было створанае ў 1964 г. Сакратарамі яго былі: *А. Н. Карпюк* (1964–70, 1978), *В. Быкаў* (1970–78). У 1988 у складзе саюза знаходзіліся: *Д. І. Бічэль-Загнетава*, *Ю. У. Голуб, М. Васілёк,* А. Іверс, А. Н. Карпюк, *А. М. Пяткевіч*, М. С. Шаўчонак і інш. С. п. праводзіў семінары творчай моладзі, літаратурныя вячоркі, сустрэчы з беларускімі і замежнымі аўтарамі, кіраваў працай літаратурных аб'яднанняў. На тэлебачанні вёў праграмы "Кніжная крама аўтара" і "Гродзеншчына літаратурная", на радыё – часопіс "Заранка", у *газеце "Гродзенская праўда"* выходзіла літаратурная старонка. У 1986 г. 54 літаратары змаглі надрукавацца ў літаратурным альманаху С. п. "Край мой – Нёман".

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 366.

Саюз савецкіх пісьменнікаў. Гродзенскае абласное адддзяленне было створанае ў 1946 г., дзякуючы намаганням паэта А. Астрэйкі, які прыехаў з Мінска і стаў працаваць у "*Гродзенскай праўдзе*". 25.05.1946 газета абвясціла аб першым арганізацыйным сходзе чальцоў Саюза савецкіх пісьменнікаў і аўтараў-пачаткоўцаў. Удзел прынялі С. Астрэйка, Міхась Васілёк, Аляксандр Міронаў, якія мелі пасведчанні чальцоў С. Такім чынам Саюз змог аб'явіць аб сваім існаванні, бо быў створаны кулуарна з-за недахопу пісьменніцкіх кадраў пасля вайны. Пазней да Саюза далучыліся *А. Карпюк, В. Быкаў.* Да 1948 кіраўніком (сакратаром) быў Астрэйка.

Літ.: Пяткевіч А. Спроба стварыць арганізацыю. З мінулага гродзенскай пісьменніцкай суполкі // Новы замак. – 2017. – Вып. 5. – С. 211–214.

Саяпін Віктар Юр'евіч (17.01.1950, Кыргызстан – 2.02.2017) – саветнік мытнай службы 1 рангу, гісторык, краязнавец, журналіст. У Гродне з 1961 г. Скончыў СШ № 2 і Гродзенскі педагагічны інстытут (1975). Працаваў тут тэхнікам у электрарадыёлабараторыі (1968–75), затым на заводзе "Радыёпрыбор" ад рэгуліроўшчыка радыёапаратуры да начальніка цэха (1976–1984). З 1985 г. 25 гадоў служыў у мытных органах СССР і РБ і выйшаў у адстаўку намеснікам начальніка Гродзенскай рэгіянальнай мытні.

Меў рознабаковыя таленты: пісаў артыкулы, кнігі, сцэнары дакументальных фільмаў з цыкла тэлеперадач "Гісторыі Віктара Саяпіна" на канале "Гродна плюс": "Баториевка и её обитатели", "Главный храм города – Фара Витовта", "Гродненский театр кукол", "Дворец Радзивиллов", "Зоопарк Кохановского". На канале "Гарант +" вёў у 2006 тэлеперадачу "Гродзенскі каляндар". Праводзіў экскурсіі, вандраваў з фотаапаратам.

С. мае дзяржаўныя ўзнагароды: "За працоўныя заслугі" (2006), "70 лет Победы в Великой Отечественной войне. 1941–1945" (2015) і медаль Сусветнай Мытнай арганізацыі (2002). Гродзенскія ўлады ўганаравалі С. прэміяй Дубко "За творческие достижения в отрасли культуры и искусства" (у намінацыі "журналіст года") і занеслі ў Кнігу Славы Гродна (2016), а апазіцыйныя гісторыкі – *прэміяй Ядкоўскага* (2013). У 2019 адна з новых вуліц Гродна ў мікрараёне Грандзічы названая ў яго гонар. Мае больш за 400 матэрыялаў па краязнаўчай тэматыцы ў рэспубліканскіх і абласных газетах і часопісах.

Літ.: паводле матэрыялаў з Інтэрнэту.

Свідрыгайла (каля 1370 – 10.02.1452, Луцк, сёння Валынская вобл.) – вялікі князь літоўскі (1430–1432). Сын Альгерда, супернічаў з дваюрадным братам *Вітаўтам* у барацьбе за кіраванне ВКЛ. Шмат разоў утрымліваўся пад арыштам (апошні раз у 1409–1418). З 1420 перайшоў на бок *Вітаўта*. Удзельнічаў у вайне Польшчы і Літвы з Тэўтонскім ордэнам (1422). Пасля смерці Вітаўта стаў вялікім князем літоўскім. С. з дапамогаю Тэўтонскага ордэна, імператара свяшчэннай Рымскай імперыі Жыгімонта, князёў Русі не даў магчымасці Польшчы забраць Валынь і зліквідаваць самастойнасць ВКЛ. У перыяд

праўлення С. у ВКЛ узмацніўся ўплыў князёў і баяр Русі. Польскія магнаты абвінавіцілі С. у распаўсюджванні праваслаўя ў ВКЛ і зарганізавалі супраць яго змову. С. збег у Полацк. У вырашальнай Пабайскай бітве (1435) войска С. пацярпела паражэнне ад войска яго дваюраднага брата – вялікага князя літоўскага з 1432 Жыгімонта Кейстутавіча. У Гродне бываў неаднойчы, пра што сведчаць яго лісты (напрыклад, з мая да ліпеня 1432) і заключаныя ў горадзе дамовы (у 1432 з Ягайлам).

Літ.: Гостев А.П. Кронон. Летопись города над Неманом (1116–1990) / А.П. Гостев, В.В. Швед. – Гродно: НВК "Пергамент", 1993. – С.208.

Свірыдзёнак Анатоль Іванавіч (нар. 7.07.1936, г. Орша Віцебскай вобл.) – доктар тэхнічных навук (1975), прафесар (1980), акадэмік АН Беларусі (1986). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі ў галіне навукі (1972). Вядомы вучоны ў галіне фізікі і механікі паверхні, матэрыялазнаўства і трыбалогіі. У 1990 С. пераехаў у Гродна, дзе арганізаваў і ўзначаліў Аддзел (на правах Інстытута) праблем рэсурсазберажэння АН Беларусі. Асноўныя напрамкі даследаванняў Аддзела: навуковае абгрунтаванне аптымізацыі эканомнага расходавання ўсіх відаў рэсурсаў на базе экатэхналагічнага маніторынгу і сучасных навукаёмкіх тэхналогій; распрацоўка тэхналогій выкарыстання адкідаў вытворчасці, зніжэнне і ўтылізацыя прамысловых выкідаў; распрацоўка новых матэрыялаў; даследаванне з'яў паверхні ў нанатэхналогіях датычна мікраэлектронікі, оптыкі, малекулярнай трыбалогіі. С. быў галоўным рэдактарам міжрэспубліканскага навукова-тэхнічнага часопіса "Трение и износ", чальцом Прэзідыума АН Беларусі, чальцом рэспубліканскага Савета па навукова-даследчай працы ў галіне рэсурсазберажэння і зніжэння матэрыялаёмістасці ў прамысловасці. Аддзелам, супольна з Гродзенскім адзяленнем Беларускага фонда культуры, арганізаваны "Цэнтр па экалогіі нацыянальных культур", адной з функцый якога з'яўляўся сацыялагічны маніторынг працоўных рэсурсаў, вывучэнне этнадыфузіі. Узнагароджаны ордэнам "Знак пашаны" (1981).

С. – аўтар 6 манаграфій (2 з іх пераклалі ў Англіі і ЗША), 160 навуковых артыкулаў, 130 вынаходніцтваў.

Літ.: С.А. Габрусевіч, Я.А. Роўба // Прафесары Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. 1940 – 2012: бібліяграфічны слоўнік. – Мінск: Друкарня Макарава і К, 2013. – С. 28–29; Свірыдзёнак Анатоль Іванавіч // Беларуская энцыклапедыя: Т. 14. – Мн.: БелЭн, 2002. – С. 263.

Сейм 1678 г. – першы гродзенскі сейм Рэчы Паспалітай, праходзіў з 15.12.1678 па 4.04.1679 паводле рашэння сейма 1673 (гл. *сеймы РП*). Падчас паседжанняў адбылася вострая дыскусія паміж каралём Янам III Сабескім і апазіцыяй па пытанні польскай антыгабсбургскай палітыкі. У выніку кароль пайшоў на саюз з Габсбургамі і супраць Турцыі, а яго былая апора пры двары стала апазіцыяй (у ВКЛ гэта гетман вял. літоўскі Казімір Ян Сапега і вял. падскарбі Бенедыкт Сапега).

Літ.: Historia Polski. Kalendarium dziejów. T. II. 1655–1887, Kraków, 2010, s. 51–52.

Сейм 1793 г. – апошні надзвычайны сейм Рэчы Паспалітай у Гродне, на якім быў зацверджаны другі падзел РП. У маі 1793 г. у Гродна пачала з'язджацца, вобразна кажучы, уся Рэч Паспалітая: каля 12 сенатараў, каля 140 сеймавых паслоў, міністры, ваяводы, кашталяны, біскупы, іншыя высокія чыны, кароль са сваім невялікім дваром. Прыехалі замежныя паслы: Расіі – надзвычайны і паўнамоцны пасол *Я. Ё. Сіверс*, Прусіі – паўнамоцны пасол Л.-Г. Бухгольц, Аўстрыі – Б. дэ Кашэ, Швецыі – Е.-Х. Толь, Англіі – В. Гардынер, Галандыі – Крыгінгейм, папскі нунцый – Ф.-М. Салуцца. Сейм праходзіў у *замку Новым* з 17 чэрвеня па 23 лістапада 1793 г. Умоўна паседжанні сейма можна падзяліць на тры перыяды, адпаведна з галоўным пытаннем, якое вырашалася ў гэты час. Першы перыяд працягваўся з 17 чэрвеня па 22 ліпеня, калі стаяла пытанне аб заключэнні трактата з Расіяй. Як заўсёды, перад пачаткам сейма ў замкавай капліцы адбылася імша. Першае паседжанне пачаў найстарэйшы ў іерархіі кракаўскі пасол граф Юзаф Анквіч. Потым выбралі маршалкам Станіслава Бялінскага, які толькі на трэцім паседжанні прыняў прысягу. Ужо з першага дня Сіверс спрабаваў не дапусціць на паседжанні арбітраў і ўплываць на ход справы вайсковай сілай: пяць паслоў-патрыётаў былі затрыманыя ў дамах расійскімі афіцэрамі, пад Гроднам стаяў конны полк, а каля замка – батальён стральцоў. 21 чэрвеня Бялінскі зачытаў ноты расійскага і прускага паслоў аб ратыфікацыі іх захопаў. Ноты былі аднолькавыя па змесце і форме, што сведчыла аб згодзе двух манархаў. Кароль адазваўся на гэта тым, што нагадаў аб сваім далучэнні да Таргавіцкай канфедэрацыі з умоваю захавання цэласці Рэчы Паспалітай. Сіверс пагражаў, што не выпусціць нікога з залы, пакуль не будзе вызначаная дэлегацыя з паўнамоцтвамі на падпісанне трактата з Расіяй. Быў аддадзены загад аб арышце Юзафа Панінскага і Плужэўскага, але тыя здолелі выехаць з Гродна. 5 ліпеня 74 галасамі супраць 59 прымаецца інструкцыя дэлегацыі. У склад дэлегацыі ўвайшлі: сенатары – тры біскупы (В. Скаршэўскі, Ю. Касакоўскі, І. Масальскі), два кашталяны (П. Ажароўскі, Аборскі), ваявода віленскі Міхаіл-Геранім Радзівіл, паслы С. Касакоўскі, Ю. Анквіч, К. Янкоўскі, А. Валеўскі і іншыя, літоўскія міністры (Л. Тышкевіч, Л. П. Плятар, М.-К. Агінскі, *Дзяконскі*), каронныя міністры князь А. Сулкоўскі, гетман польны Ю. Забела. Адзінаццатага ліпеня склад дэлегацыі папоўніўся яшчэ 6 пасламі па жаданні Сіверса. Кароль вызначыў іх сам, не раіўшыся з сеймам, што выклікала яго абурэнне. 13 ліпеня дэлегацыя атрымала трактат з Расіяй, галоўныя пункты яго наступныя: 1. Вечны мір паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай; 2. Акрэсленыя будучыя межы; 3. Уступка занятых тэрыторыяў і гарантыі цэласці рэшткаў Рэчы Паспалітай; 4. Адмова ад усялякіх захопаў і прэтэнзіяў; 5. Гарантыі з боку Расіі свабоды пераменаў і рэформ у форме кіраўніцтва Рэчы Паспалітай; 6. Гарантыя свабоды веравызнання католікам, маёмасці касцёлаў і духавенства; 7. Абумоўленыя дадатковыя артыкулы; 8. Гарантыі ратыфікацыі на працягу шасці тыдняў. 22 ліпеня, у дзень нараджэння ўнучкі імператрыцы, як таго жадаў Сіверс, трактат з Расіяй быў падпісаны. Барон Хіндэльхоф адразу павёз яго ў Пецярбург, а ў Гродне адбыўся абед з ілюмінацыямі і феерверкамі.

17 жніўня пасля бурлівага паседжання, калі патрыёты спрабавалі перашкодзіць чытанню трактата, ён быў ратыфікаваны 66 галасамі супраць 21.

Другі перыяд працы Гродзенскага сейма пачаўся ўмоўна з 22 ліпеня і працягваўся да 25 верасня. Галоўным пытаннем быў трактат з Прусіяй. Бухгольц меў сярод паслоў невялікую падтрымку з пяці чалавек, бо ўсе лічылі Прусію ініцыятарам І падзелу Рэчы Паспалітай і прычынаю ўсіх няшчасцяў краіны. Толькі 31 ліпеня прайшоў праект трактата, але наступнае абмеркаванне спынілася на дэталях і форме паўнамоцтваў. 3 жніўня дэлегацыя, якая падпісала трактат з Расіяй, была ўпаўнаважаная зрабіць тое самае з Прусіяй. 23–24 верасня адбылося знакамітае "нямое" паседжанне, на якім дэлегацыя падпісала трактат з Прусіяй, якая атрымала тэрыторыю ў 1062 кв. мілі з насельніцтвам 1 136 389 чалавек і прыбыткам каля 6 870 486 злотых. У другі перыяд працы сейма акрамя галоўнага пытання вырашаліся і іншыя, такія як: ваеннае, фінансавае (заняпад банкірскіх дамоў), адабранне грошай у сенатараў і дзяржаўных службоўцаў, якія не выконваюць свае абавязкі, праект М. Агінскага аб рэформе кіравання. На становішча войска звярталі ўвагу тройчы: 24 ліпеня, 19 жніўня, 6 верасня. У гэты самы перыяд, відаць, адбылася большая частка баляў, якія суправаждалі працу сейма. Днём гаварылі пра любоў да Айчыны і веліч цара, які бярэ ў добрую апеку Польшчу і Літву, а вечарам за грошы з расійскай і прускай казны ладзілі застолле, абеды і вячэры, асамблеі і раўты, адзначалі імяніны Сіверса і караля.

Пасля 25 верасня пачаўся апошні перыяд працы Гродзенскага сейма, калі галоўнымі пытаннямі былі заключэнне саюзнага трактата з Расіяй і прыняцце новай *канстытуцыі (Гродзенскай*). Праект дамовы Рэчы Паспалітай з Расіяй аб саюзе і сяброўстве паступіў на паседжанне сейма 14 кастрычніка. Умовы яго былі выкладзеныя ў 17 артыкулах, сярод іх: узаемныя гарантыі валоданняў, вырашэнне пытанняў аб вайне і міры са згодай абодвух бакоў, апека Польшчы пры падпісанні трактатаў, імператрыца гарантавала канстытуцыю і дазваляла зрабіць у ёй змены, расійская і польская шляхта атрымлівалі роўныя правы ў Расіі і Польшчы. Дадаткова да гэтага трактата далучаўся гандлёвы. Пераважнай большынёю галасоў праект быў прыняты.

За заключэнне саюзнага трактата *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* ўзнагародзіў Сіверса і графа В. Зубава стужкай ордэна Белага Арла. 27 кастрычніка Кацярына II выдала рэскрыпт, дзе быў спіс узнагароджаных. Сіверс атрымаў ордэн св. Уладзіміра 2 ступені і вёскі без вызначэння колькасці прыгонных душаў. Гетман С. Касакоўскі быў узнагароджаны пярсцёнкам з алмазамі, Бялінскі, Л. Плятар, П. Ажароўскі – пярсцёнкамі з брыльянтамі, падскарбі М.-К. Агінскі – табакеркаю з выявaю Кацярыны II, упрыгожанаю брыльянтамі, епіскап Ю. Касакоўскі, М.-Г. Радзівіл, Л. Тышкевіч – табакеркамі з партрэтам імператрыцы, упрыгожанымі алмазамі і г. д. Трынаццаць пярсцёнкаў і табакерка не мелі выбітых імёнаў, яны былі дадзеныя Сіверсу для раздачы паводле ягонага рашэння, відаць, тым, хто прадаў сваю Айчыну, дапамагаючы здзейсніць чарговы падзел Рэчы Паспалітай.

23 і ўначы 24 лістапада было прынята 112 праектаў. Чытаць такую колькасць дакументаў было немагчыма, таму іх аб'ядналі паводле трох класаў: 1 – змяненні формы кіравання (40 артыкулаў), 2 – 32 артыкулы, 3 – прыватныя справы. Галасавалі паводле назвы праекта і прымалі блокамі. На гэтым апошнім паседжанні была скасаваная *Гродзенская канфедэрацыя* і складзеная Пастаянная Рада. Каля 9 гадзін раніцы паслы пайшлі ў замкавую капліцу і адспявалі "Te Deum". Гарадзенскі сейм скончыўся, усе разыходзіліся панурыя, сумныя, з сорамам і дакорам. Кароль пастарэў і збляднеў. Зграя авантурыстаў, шулераў, інтрыганаў, якая напала на Гродна як на прынаду, паволі пакідала горад і раз'язджалася па цэлым свеце. Кароль і Сіверс выехалі ў Варшаву.

Літ..: Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997.

Сеймікі павятовыя – з'езды шляхты Гродзенскага павета, якія адбываліся ў Гродне рэгулярна і значна часцей за сеймы, хаця людзей збіралі ў горад значна менш: у канцы XVI і ў XVII ст. ад каля 20 да менш чым 50 чал., у XVIII ст. – у некаторых выпадках больш. Звычайным месцам паседжання быў *Стары замак* (да 1730-х гадоў – у 1699, 1712, 1733), *Новы замак* (у 1764, 1766, 1767, 1770), *кляштар* і *касцёл бернардзінскі* (у 1669, 1716, 1765, 1766, два разы ў 1767, 1768, 1782–1784, 1789, два разы ў 1790). Некаторыя сеймікі адбываліся адначасова ў некалькіх месцах: кляштар бернардзінцаў і Стары замак (1764, 1765). У 1791 сеймік праходзіў у *палацы Сангушкаў*, *палацы Агінскіх* і *кляштары бернардзінцаў*. З 1792 сеймікі сталі праходзіць у *касцёле Св. Францішка Ксаверыя*. Да паседжанняў сейміка ў *Фары Вітаўта*, а пасля пабудовы касцёла езуітаў і ў ім адбывалася святочная імша або іншае набажэнства. На папярэдніх сеймініках выбіралі дэпутатаў на вальны (агульны) сейм, ім складалі інструкцыі, паводле якіх трэба было дзейнічаць у вырашэнні пастаўленых каралём пытанняў. На генеральных (правінцыяльных) сеймініках узгаднялася пазіцыя гродзенцаў на вальным сейме. На справаздачных сеймініках абмяркоўваліся пастановы, прынятыя на вальным сейме, а дэпутаты давалі справаздачы аб сваёй дзейнасці. На элекцыйных сеймініках выбіраліся кандыдаты на земскія пасады падкаморыя, суддзі, падсудка, пісара. Іх зацвярджаў манарх. Пасля ўзнікнення *Літоўскага трыбунала* пачалі склікацца дэпутацкія сеймікі. Сеймікавыя пастановы (lauda, ухвалы) запісваліся ў гарадскія (гродскія) кнігі.

Літ.: Галубовіч В., Соймы, соймікі і палітычнае жыццё Гродзенскага павета ў XVI-XVIII ст. // Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё XVI-XX ст. – Гародня, 2009. – С. 156–183; Галубовіч В. Пастулаты Гродзенскага соймікa на Сойм 1646 г. // Гарадзенскі палімпсест. XII-XX стст., с. 48–53; Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа. X-XXI стст. – Варшава: Demart, 2015. – С. 101–102; Паўлоўская Г. Апісанне гарадзенскіх соймікаў у хроніках бернардзінскага кляштара // Гарадзенскі палімпсест. 2009. Дзяржаўныя ўстановы і палітычнае жыццё. XV – XX ст – Гародня, 2009. – С. 223–226; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005).

– Гродна, 2020; Smoliński M., Kościoły w życiu politycznym Grodna w XVIII wieku: funkcje i treści w: Barok. Historia-Literatura-Sztuka. Półrocznik XVIII/1 (35). 2011. – S. 95–113.

Сеймы ВКЛ у Гродне. Звычайна адбываліся ў Вільні, але па розных прычынах (ваенных, экалагічных і д. п.) часам склікаліся ў Гродне. Вядомыя наступныя: 10.02 – канец 03.1522; 1.12.1566 – 6.01.1567; 25.04 – 07.1568; 1618.

Літ.: Сеймы Литовско-русского государства до Люблинской унии 1569 г. / Н.А. Максимейко. Харьков, 1902. – С. 153, 157, 174–176, прил. с. 48–49, 59, 62–63; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005–2005). – Гродна: ЮрСапрынт, 2020.

Сеймы Рэчы Паспалітай. У Гродне праходзілі паводле пастановы варшаўскага сейма 1673 г. – кожны трэці звычайны сейм. Дамагліся гэтага прадстаўнікі ВКЛ, асабліва *Крыштаф Пац*. Аб гэтым сведчыла мемарыяльная дошка, якая калісьці вісела на сцяне *замка Старога*: "Пры сходзе ў Гродне найсвятлейшых асоб польскіх і літоўскіх сенатаў, уступаем на цудоўны Капітул. Калі вайна, вораг міру, страшэнным спусташэннем ператварыла ў руіны і брыдкім зрабіла, дык у памяць міру і роўнасці людзей, а таксама для асвячэння сеймавых пасяджэнняў пры найсвятлейшых каралях Міхале і Яне III, Крыштаф Пац, маршалак брэсцкі і 20-ы раз пасол на сейм, з любоўю да Айчыны змайстраваў. Няхай для бога, караля, Айчыны і права, ганаровая пліта, каралём забяспечаная, гербам Пацаў "Лілеяй" упрыгожаная, расходамі казны ВКЛ адноўленая, доўга існаваць будзе. Вы ж, якія з'яўляецеся аздобаю польскага пурпуру, вашая слушная думка-рада і вялікасць, падтрымка права. Грамадзянскага года 1678, месяца снежня, перад адкрыццём сейма 14 дня".

У Гродне збіраліся 8 звычайных (1678/79, 1688, 1693, 1718, 1726, 1744, 1752, 1784) і 3 надзвычайныя (1729, 1730, 1793) сеймы. Месцы паседжанняў: Стары *замак* (1678/79, 1688, 1693), у *палацах Стэфана Баторыя* і Сапегаў на *Рынку* (1718, 1726, 1729, 1730), Новы *замак* (1744, 1752, 1784, 1793). Перад пачаткам паседжанняў сейма ў *Фары Вітаўта* альбо ў *касцёле езуітаў* адбывалася імша ў прысутнасці паслоў, сенатараў і караля, а пасля закрыцця сейма – урачыстае спяванне "Te Deum". Даследчыца Г. Паўлоўская сцвярджае, што хроніка езуіцкага кляштара згадвае амаль пра ўсе сеймы (акрамя 1688 і 1693), называе тых, хто пасяляўся на час сейма ў будынках калегіума, ёсць сведчанне пра спецыяльную пабудову над вуліцай ад палаца Сапег, дзе жыў кароль, да касцёла ў 1718 г., указваецца, што пачатак сейма ў 1729 быў у касцёле езуітаў, а ў 1744 тут адбываліся некаторыя паседжанні сейма. Рукапісны акт апошняга гродзенскага сейма 1793 г. знаходзіўся ў 1920 у Гродне і напярэдадні уваходжання сюды Чырвонай арміі, 19 ліпеня, быў вывезены гісторыкам Ю. Ядкоўскім у г. Улацлавак, а потым у Быдгашч.

Крын. і літ.: Страйноўскі А. Сойм у Горадні ў 1784 г. Аб'яднаныя пасяджэнні палат 6–23 кастрычніка 1784 г. // Arche. – 2017. – № 2. – С. 199–224; Страйноўскі А. Склікання першага пры Станіславу Аўгусту Панятоўскім сойма ў Горадні ў 1784 годзе //

Arche. – 2014. – № 11. – С. 251–274; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997. – Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005- 2005). – Гродна: ЮрСапрынт, 2020; Diariusz sejmu walnego ordynacyjnego grodzieńskiego w r. 1752 // Diariusze./ wydał W. Konopczyński. T. III. – S. VII, 44–140; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 146–149, 196–198; T. 2 – S. 396–7; Skibiński M. Europa a Polska w dobie wojny o sukcesję austriacką w latach 1740–1745. T. II. – Kraków, 1912. – S. 295–350 (Diariusz sejmu sześcioniedzielnego w Grodnie 1744 r.); Szwed W., Grodzieńskie sejmy Rzeczypospolitej // Białostocczyzna. – 1998. – nr. 1(49).

Семінарыя міждыяцэзіяльная вышэйшая духоўная – вышэйшая каталіцкая навучальная ўстанова, якая навучае святароў для Гродзенскай і Віцебскай дыяцэзій, Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі. Знаходзіцца ў Гродне ў будынку былога *кляштара Бернардзінцаў*. Заснаваная 1.09.1990 біскупам *Т. Кандрусевічам*. На першы курс было залічана 15 чал. з Гродзенскай вобласці, 9 чал. з іншых абласцей Беларусі, 12 чал. з Украіны і 1 асоба з Грузіі – усяго 37 чал. У 1997 пачала працаваць семінарыйная бібліятэка (кнігазбор налічвае амаль 20 тыс. тамоў і 80 найменняў часопісаў). У 2000 адкрылася актавая зала. Рэктарамі С. былі: Станіслаў Кучынскі (з 1990), Люцыян Радомскі (з 1996), Антоні Дзям'янка (з 2000), Юзаф Станеўскі (з 2005), Раман Рачко (з 2014), Віталь Вайцяхоўскі (з 2018).

14.12.2021 Нацыянальны Банк Рэспублікі Беларусь выпусціў у грашовы зварот калекцыйныя срэбныя манеты (1 і 10 руб.) з серыі "Рэлігійныя вераванні Беларусі – каталіцызм". На рэверсе манет пададзеная выява С. з яе поўнай назвай і надпісам "Каталіцызм".

Крыніца: https://be.wikipedia.org/wiki; https://news.notafilia.pl/2021/12/14/białorus-monety-kolekcjonerskie–12/. Доступ 09.01.2022.

Сержпутоўская Валерыя Вінцэнтаўна – удзельнік *паўстання 1863* г., мела 47 гадоў, дваранка з Гарлеўскіх Сакольскага ў. Жыла ў сына Сержпутоўскага Адама і ёй належала пятая частка маёнтка *Ласосна*. Як паказаў селянін Юргель, яна загадала яму адкапаць схаваныя у садзе порах, свінец, корпію, 4 ружжы і схаваць у свіране. Усё гэта вечарам забраў невядомы яму чалавек. Арыштаваная не прызнала віны нават на вочнай стаўцы. Прыгавораная да вытрымкі ў турме паўгода і высылцы на жыхарства ва ўнутраныя губерні Расіі. Сядзела ў гродзенскім астрозе з 3 ліпеня 1864 г.

Крыніца: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 82, с. 1, а. 540 адв., 550, 559 адв.; ф. 1., оп.13, с. 1399, а. 151 адв.; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 269–270, 273–274.

Сержпутоўскі Адам Эмільевіч – удзельнік *паўстання 1863* г., сын Сержпутоўскай Валерыі. Меў 27 гадоў, быў уладальнікам чацвёртай часткі маёнтка *Ласосна* Сакольскага ў. Прызнаўся ў забеспячэнні паўстанцаў ваеннымі і харчовымі прыпасамі, вопраткай, спаслаўшыся на страх перад імі, а паляўнічыя ружжы, з ягоных словаў, належалі юнкеру Ф. Вяльгорскаму.

Сасланы ў лютым 1864 г. на пасяленне ў Сібір, у Табольскую губ. Маёнтак быў канфіскаваны.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 81 адв. – 82; с. 1, а. 517; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917 б., а. 262–267; Буднік І., с. 82.

Сержпутоўскі Іван/Ян – былы асэсар Слуцкага ў. (1820). Адвакат Гродзенскага галоўнага суда. Удзельнік філамацкага таварыства "Ваенныя сябры" (1825). Але, хутчэй за ўсё, ён проста праходзіў па справе гэтага патаемнага таварыства на Гродзеншчыне, бо меў з ім нейкія сувязі. Масон, сябра польскага Патрыятычнага таварыства.

Літ.: Швед В.В. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў. – Мн.: Бел.НДІДАС, 1998.

Сіверс Якаў Ёган Яфімавіч (1731–1808) – надзвычайны і паўнамоцны пасланнік у Рэчы Паспалітай (24.11.1792 – 13.12.1793), выканаўца расійскага плана зацвярджэння другога падзелу РП на гродзенскім *сейме* 1793 г. Са старажытнага дацкага дваранскага роду. Службовую кар'еру пачаў пісарам у Калегіі замежных спраў (1744). Працягнуў пры расійскім пасольстве ў Капенгагене (1747) і Лондане (1748). У 1756 С. уступіў у вайсковую службу ў чыне прэм'ермаёра і, дзякуючы прыдворным сувязям дзядзькі Карла Сіверса, стаў дывізійным кватэрмайстрам у кіраўніка артылерыі П. І. Шувалава. Удзельнічаў як падпалкоўнік Неўскага палка ў Сямігадовай вайне (1756–1763). Сакратар пруска-расійскай камісіі для абмену палоннымі (1759–1760). 17 год быў Наўгародскім губернатарам (04.1764 – 14.06.1781). У гэты час склаў шэраг запісак, праектаў, прапаноў на імя Кацярыны: стварэнне таварыства сельскай гаспадаркі, арганізацыя ўзорных маёнткаў па ліфляндскіх правілах, паляпшэнне стану сялян (змякчэнне ўплыву рэкруцкіх набораў, змяншэнне аброку праз павелічэнне працы на панскай зямлі), уладкавнне паштовай службы, паляпшэнне становішча сельскага духавенства, планы абласнога падзелу. С. садзейнічаў адкрыццю ў канцы 1768 асігнацыйнага банка, актыўна займаўся воднымі зносінамі (Сіверсаў канал паміж Волхавам і вусцем р. Мсты ў 1798–1803; даўжыня 8 вёрст), дапамагаў Кацярыне II распрацаваць абласны падзел імперыі ("Учреждения о губерниях" 1775), падаў праект адкрыцця ў кожнай губерні школ для дваранства. У 1775 С. атрымаў ордэн Аляксандра Неўскага і 20 тыс. руб. Меў дачыненне да яшчэ двух важных дакументаў, якія выдала Кацярына II: Даравальная грамата дваранству і Гарадавое палажэнне. З адкрыццём Цвярской і Пскоўскай губ. С. прызначылі генерал-губернатарам Наўгародскім, Цвярскім і Пскоўскім. У 1792 С. прызначаны надзвычайным і паўнамоцным паслом у Рэч Паспалітую. На гэтай пасадзе кантраляваў дзейнасць *Станіслава Аўгуста Панятоўскага* праз сваіх агентаў у яго кабінеце: К. Баскампа-Ласапольскага і Х. Фрысе. У Гродне усталяваў над ім строгі нагляд і скараціў каралеўскую канцылярыю. Каб задушыць апазіцыю, С. загадаў арыштаваць патрыятычную частку паслоў, секвестраваць іх маёнткі, акружыць войскамі горад і *замак Новы*, увесці ў залу паседжанняў сейма салдат. Нягледзячы

на тое, што С. актыўна садзейнічаў 2-му падзелу РП, яго з-за прыдворных інтрыг і "мяккасці да палякаў" адклікалі з РП (1794). Жыў у апошнія гады царавання Кацярыны II часам у Санкт-Пецярбургу, часам у сваім маёнтку Баўенхофе на беразе Бурценекскага возера (Ліфляндыя). Павел I прызначыў яго сенатарам (1796), а праз год даручыў кіраванне воднымі камунікацыямі. У 1798 С. атрымаў графскі тытул і праз два гады канчаткова пакінуў службу.

Літ.: Иловайский. Граф Яков Сиверс // Гродненский сейм 1793 года. Последний сейм Речи Посполитой. Историко-биографические очерки. – СПб., 2013. – С. 436–537; 62–238 (Сіверс на сейме); Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997.

Сільвестровіч Станіслаў Янавіч (31.01.1833, Гродзенская губ., па іншых дадзеных Віленская – 1910, Стрэльчае, Валынь) – удзельнік *паўстання 1863–64* гг. Вучыўся ў прыватным вучылішчы Мітавы і Дэрпцкім універсітэце (1850–1855), які скончыў са ступенню "сапраўднага студэнта". Памешчык, гаспадар маёнтка Гожа-Пералом. У дапаўстанцкі час вызначыўся тым, што збіраў складкі на помнік пяці забітым у Варшаве дэманстрантам. Спачатку быў акруговым у раёне Друскенік і Азёр да Скідзеля, а ў сакавіку 1863 стаў цывільным начальнікам Гродзенскага пав. Збіраў грошы і шукаў людзей у будучыя паўстанцкія атрады. Калі рыхтаваўся выезд гродзенскіх гімназістаў у партызанскі атрад (14.03.1863), прапанаваў свой маёнтак як месца збору. Падтрымліваў сувязі з начальнікам суседняга Аўгустоўскага пав. А. Гансеўскім. Займаўся ўладкаваннем патаемных паштовых шляхоў па трактах ад Гродна ў Ваўкавыскі пав., у Аўгустоўскі да м. Сапацкін і праз *Нёман* да памешчыка Шамборскага. У чэрвені 1863 стаў ваяводскім на 4 паветы – Гродзенскі, Сакольскі, Ваўкавыскі і Слонімскі. Арыштаваны 11.08.1863, восем месяцаў правёў у Гродзенскай *турме,* пасля быў пераведзены ў Вільню ў Дамініканскую турму. Прыгавораны ваенным судом да расстрэлу, пазней на 8 гадоў высланы на катаргу ў Сібір. Маёнтак Гожа канфіскаваны. 15.01.1866 прыбыў у Іркуцк. Згодна з царскім маніфестам ад красавіка гэтага года, С. скарацілі тэрмін напалову і ў маі выслалі на будову дарогі вакол возера Байкал. Падазраваны ва ўдзеле ў забайкальскім паўстанні, закаваны ў кайданы сядзеў у асобным аддзеле. У 1870 перанесены на пасяленне ў Мінусінскі ў. Енісейскай губ. Знаходзіўся пад наглядам з 10.10.1875 у Казанскай губ. (Ядрынск, цяпер Чувашыя). У лістападзе 1878 выехаў у Гродзенскую губ. на 4 месяцы па справах маёнтка. 15.01.1883 вызвалены ад паліцэйскага нагляду. 20.03.1883 выехаў у Валынскую губ. на 6 месяцаў.

Крыніцы: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10, 16, 38–44, 46; с. 1, а. 108–116 адв., 237, 244–247, 360 адв.; с. 4, а. 17, 18, 20; Швед В.В., Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня), Мн.: ТАА "Альфа-кніга", 2017.

Сіліневіч Ігнацы Фабіянавіч – гаспадар майстэрні, у якой каваліся агароджы, краты. Узоры іх можна ўбачыць каля помніка *Тызенгаўза А.* у *касцёле*

Фарным, а таксама каля громаадвода на доме *Тальгейма А.*, на балконах дома купцоў *Мураўёвых*.

Сімані Сіман/Шыман (? – 1602, Польшча) – італьянскі лекар пры двары *Стэфана Баторыя*, адзін з удзельнікаў *анатаміравання* вялікага князя літоўскага і караля польскага ў Гродне. Доктарам медыцыны стаў у Падуі. Працаваў у Жэневе, Парыжы, Лейпцыгу. Быў прыдворным лекарам імператара Рудольфа II, з 1583 – Стэфана Баторыя. Канфліктаваў з другім яго лекарам Бучэлам М., якога абвінавацiў у атручанні Стэфана Баторыя. Пасля смерці апошняга з'ехаў у Маравію, а пазней – у Прагу.

Літ.: Pawłowska-Kubik A., Śmierć Stefana Jegomości króla polskiego w Grodnie 12 Decembra Anno Domini 1586 (Prawdziwa sprawa o chorobie i śmierci nieboszczyka Stefana Batorego króla polskiego) – źródło do losów Stefana Batorego i historii medycyny // Studia Źródłoznawcze=Commentationes. T. 56 (2018). – Warszawa: Ih PAN. – S. 144–145.

Сімановіч Уладзімір Георгіевіч – супрацоўнік Асобага аддзела 4-й арміі, першы старшыня Гродзенскага вайскова-рэвалюцыйнага трыбунала ў 1920 г., падчас *вайны савецка-польскай*. Удзельнічаў у сходзе ў будынку гродзенскага *тэатра* 30 ліпеня з нагоды ўсталявання Савецкай улады ў Гродне і на Гродзеншчыне. Ваяваў з Врангелем, штурмаваў Перакоп, быў цяжка паранены. Доўгі час жыў у Адэсе, працаваў начальнікам гарадской міліцыі. З вясны 1932 служыў начальнікам міліцыі горада Самарканда. Летам 1942 добраахвотнікам пайшоў на фронт, абараняў Сталінград. З 1947 стаў загадчыкам адміністрацыйнага аддзела Калінінградскага абласнога выканаўчага камітэта. Узнагарджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 2 ст., Чырвонай Зоркі і медалямі.

Сінагогі. У Гродне былі пабудаваныя ў некалькіх месцах. На рагу вул. Найдуса і Вялікай Траецкай, 13 знаходзілася малітоўная школа Хаей Адом (Haem Adam), збудаваная ў 1875. Сюды прыходзіў памаліцца *Найдус Л.* У 1930-х гадах адміністратарам у сінагозе быў Гірш Фарбер. Захаваўся будынак канца XIX ст., у якім з 1951 знаходзіцца спартыўная зала таварыства "Спартак", дзе трэніруюцца барцы. На вул. Сацыялістычнай, 35 захаваўся будынак сінагогі Орах Хаім (Бенахім), пабудаванай ў 1856 на месцы драўлянай малітоўнай школы. Прашэнне падаў Арон Сокал, а падпісалі яго 32 чал., якія жылі на вакольных вуліцах. На вул. Урыцкага, 9 знаходзілася школа Кадзіш 1885 г. пабудовы, цяпер прыватны жылы дом. У 1930-х адміністратарам сінагогі быў Файвел Готкін. На пр. Касманаўтаў, 1, С. пабудаваная на пач. XX ст. У міжваенны час ёю кіраваў Вольф Рыбак. У 2008–09 перабудаваная пад банкаўскае бюро.

Літ.: Баціс М., Буцько У., Крапівіна Н. і інш. Гародня: сляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні // ARCHE. – 2010. – № 6. – С. 362–363.

Сінагога вялікая харальная – галоўная сінагога Хаем Адам, знаходзілася на вуліцы Школьнай (цяпер Вялікая Траецкая, 59 а). Пабудаваная рабінам

Мардахай бен Абрагам Яфэ ў стылі маньерызму (позняга рэнесансу) паводле праекта *Гучы Санці* ў 1576–1578 гг. Пасля *пажару 1617 г.* была перабудаваная ў стылі барока. Першыя выявы сінагогі на планах горада адносяцца да 1706 і 1753. Да пажару 1899 г. у галоўнай зале сінагогі вісела мемарыяльная дошка, на якой было напісана, што гродзенскі рабін Іосіф Бен-Іофэ (другі варыянт напісання прозвішча) пазнаёміўся ў Італіі з Санці Гучы і запрасіў яго для будаўніцтва мураванай сінагогі ў Гродне. У 1902–1905 адбудаваная пасля чарговага пажару, бакавыя флігелі пры гэтым значна змянілі яе аблічча. Галоўны фасад і флігелі вытрыманыя ў стылі рускага мадэрну, інтэр'ер – рэнесансу. Даследчыкі архітэктуры Гродна пішуць, што архітэктарам сінагогі быў напэўна той, хто будаваў *дом купца Мураўёва.* У 1940 Савецкая ўлада зачыніла С. в. х. У часы нямецкай акупацыі ў 1941–44 у сінагозе расстрэльвалі яўрэяў з *гета № 1*. Тут было і месца збору для адпраўкі ў канцлагеры. У савецкі час С. была зачыненая і ператвораная ў склад харчовых тавараў і медычных сродкаў. У 1991 вернутая яўрэйскай суполцы (гл. *кагал*). У 1990-х адрэстаўраваная. У маі 2012 г. тут адбылося адкрыццё Музея гісторыі яўрэяў Гродзеншчыны.

Літ.: Баціс М., Буцько У., Крапівіна Н. і інш. Гародня: сляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні // ARCHE. – 2010. – № 6. – С. 359, 362; Вашкевіч А. Харальная сінагога ў Гродне ў XIX ст. // Горад святога Губерта: зборнік краязнаўчых артыкулаў. Выпуск 6 (2012). – Горадня: б.в., 2012. – С. 15–19; Соркіна І. Гродзенскія сінагогі // Этнакультурныя і прыродныя турыстычныя рэсурсы Гродзеншчыны і Сувальшчыны: энцыкл. давед. / рэд. В.Р. Карнялюк, І.І. Трацяк. – Гродна-Мінск: Беларускі дом друку, 2014. – С. 80; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 22–23;

Сінагога драўляная на Фарштаце – бесстаўповы ў плане, амаль квадратны храм, пабудаваны ў 1760 г. Бэйсам Хохесасам у стылі барока. Знаходзіўся на ўзвышшы паміж сучаснымі вуліцамі Леванабярэжнай і Дарвіна. С. складалася з трох аб'ёмаў: галоўная зала і па баках прыбудоўкі (вежачкі падобныя на скірду з чатырохскатнымі купаламі). Дах кроквенны, складаўся з трох ярусаў, кожны з якіх ламаны і пакрыты гонтам. Разам дахі ўсіх аб'ёмаў утваралі складанае спалучэнне форм, якія прыдавалі будынку сваеасаблівы аб'ёмна-прасторавы абрыс. Інтэр'ер быў упрыгожаны розным арнаментам па дрэве – асабліва балюстрада пад купалам, карнізы і гранёны амбон-бяседка з калонамі і лучковымі аркамі. У 1928 абмеры С. зрабілі супрацоўнікі варшаўскай Палітэхнікі. Згарэла 22.06.1941 г.

С. 890

Літ.: Баціс М., Буцько У., Крапівіна Н. і інш. Гародня: сляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні // ARCHE. – 2010. – № 6. – С. 362; Вашкевіч А., Занёманскі Фарштат Горадні ў XVI – першай палове XX ст.: эвалюцыя гарадской прасторы / А.Вашкевіч, А. Чарнякевіч // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 211, 220; Соркіна І. Гродзенскія сінагогі // Этнакультурныя і прыродныя турыстычныя рэсурсы Гродзеншчыны і Сувальшчыны: энцыкл. давед. / рэд. В.Р. Карнялюк, І.І. Трацяк. – Гродна-Мінск: Беларускі дом друку, 2014. – С. 82; Чантурия В.А. История

архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшаяя школа, 1969. – С. 163.

Сінкевіч Рамуальд – удзельнік *паўстання 1863–64 гг.*, калежскі сакратар Гродзенскай палаты дзяржаўных маёмасцяў. У яго шафе, у гаспадарчым аддзяленні, знайшлі 37 экз. "*Мужыцкай праўды*" № 3 і 5. Сасланы ў Томскую губ. у Сібіры.

Літ.: Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017.

Сітанскія – сям'я гродзенскіх музыкантаў і педагогаў, прадстаўнікі гродзенскай культурнай эліты XVIII ст.

Барталамей (? – пасля 1785) – клавікардыст, педагог. Музыкант Гродзенскай *капэлы Тызенгаўза* ў 1776 (?) – 1781 (?). Выкладаў ігру на клавікордзе, фагоце і скрыпцы ў Гродзенскай *школе тэатральнай* Тызенгаўза (працаваў у Гродне і Паставах).

Дарота (каля 1767 – ?) – прыгонная Тызенгаўза і выхаванка яго *школы балетнай*, танцоўшчыца, жонка *Леана.* У Гродне ў 1795–97. Выступіла танцоўшчыцай у балеце Ле Ду "Мірза і Ліндэр" (1786–88), "Клеапатра" (1790–93), "Шлюб самнітаў" і "Ванда, польская каралева" (абодва ў 1788).

Леан (каля 1745 – 1800) – скрыпач, дырыжор, канцэртмайстар, педагог. Першы скрыпач і капельмайстар Гродзенскай капэлы А. Тызенгаўза (з 1765?; захаваўся кантракт ад 24.06.1769), кіраўнік Гродзенскай школы балетнай і *тэатра*. У замежных вандроўках (1772–74, Германія, Італія) закупляў ноты, інструменты, запрашаў у гродзенскі тэатр італьянскіх артыстаў (між іншых *Пеціпэці Каэтана і Людвіка*, італьянскага кампазітара Абатэ). Агулам Л. Сітанскі завербаваў 12 чал. У 1781, даведаўшыся аб змове супраць Тызенгаўза А., вырашыў застацца за мяжой. Выступаў з канцэртамі ў Расіі, Італіі. На думку сучаснікаў, быў выдатным музыкантам. Пад яго кіраўніцтвам Гродзенская *капэла* стала адной з найлепшых у Еўропе. У 1785 Тызенгаўз паслаў Сітанскага з групай музыкаў у Пецярбург і завяшчаў 8 тыс. злотых пасля сваёй смерці.

Малгажата – дачка Леана, спявачка, выступала пераважна ў камічных операх. Вучылася ў гродзенскай *школе музычнай,* пазней у пецярбургскага спевака Допраша. Спявала ў варшаўскіх Лазенках, як чалец "Нацыянальнага тэатра".

Сымон/Шыман (? – люты 1785) – музыкант. З 1771 працаваў у Гродзенскай капэле Тызенгаўза, выкладаў ігру на габоі і скрыпцы ў Гродзенскай тэатральнай школе Тызенгаўза. З 1781 у Нясвіжскай капэле Радзівілаў.

Літ.: Збор помнікаў у гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць. – Мінск: БелСЭ, 1986. – С. 50; Капилов А. Гродненский скрипач // Неман. – 1980. – № 1. – С. 185–187; Регионы Беларуси. Гродненская область. Т. 4, кн. 2, С. 342; Bernacki L.,

Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. – Lwów. T. I, s. 285, T. II, 1925. – s. 331, 333 338 ; Jędrychowski Z. Teatra grodzieńskie 1784–1864. – Warszawa: WUW, 2012. – S. 18, 59.

Сіяністы. Сябры партыі сваю актыўнасць праявілі ў 1920–1930-х гадах, агітуючы да выезду ў Палесціну гродзенцаў-яўрэяў: чыталі лекцыі пра гісторыю і сучаснасць Палесціны, дзяліліся ўражаннямі ад яе наведвання, афармлялі дакументы на рэпатрыяцыю праз свае бюро, праводзілі дабрачынныя мерапрыемствы, прыбытак ад якіх перадаваўся жыхарам паселішча "Эрэц Ісраэль". Падтрымоўвалі "Таварыства аховы здароўя", якое прапагандавала здаровы лад жыцця, фізічную падрыхтоўку, гігіену і прафілактыку захворванняў. Артадаксальныя сіяністы "Мізрахі" імкнуліся стварыць у Палесціне дзяржаву рабочых, заснаваную на сацыяльнай справядлівасці і этыцы Торы. У Гродне займаліся адукацыяй. У 1930-х гадах актыўным быў моладзевы сіянісцкі саюз "Аківа", мэтай якога была інтэлектуальная, прафесійная і фізічная падрыхтоўка хлопцаў і дзяўчат перад адпраўкай у Палесціну. У 1926–27 друкаваўся сіянісцкі штотыднёвік "Unser Leben" ("Нашае жыццё"), рэдактары І. Салавейчык, Ц. Бялко.

Літ.: Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 360–361, 367, 369.

Скарына Францішак (паводле В. Агіевіча 23.04.1476, Полацк – 21.06.1551, Прага) – беларускі мысліцель-гуманіст, асветнік, першавыдавец. Даследчык Я. Л. Неміроўскі піша аб дарозе Скарыны з Прагі ў Вільню ў 1520 г., пасля закрыцця друкарні: "Найкарацейшая дарога да Айчыны ішла праз Баляслаў, Вроцлаў, Варшаву, Гродна". На жаль, матэрыялаў пра побыт Скарыны ў Гродне ў 1520 не знойдзена. У лютым ці сакавіку 1522 Скарына пэўна прыязджаў у Горадню, калі там адбываўся вальны (агульны) сейм ВКЛ. На ім Жыгімонт даў панам-радзе права скласці Статут ВКЛ і паабяцаў апублікаваць яго "вялікай колькасцю кніг бітых літарамі". Даследчыкі-скарыназнаўцы пішуць, што С., які жыў у Вільні, мог удзельнічаць па запрашэнні віленскага кашталяна князя Канстанціна Астрожскага ў падрыхтоўцы Статута як друкар (адсюль народзіны віленскага шрыфта С.: дробны, сціслы, зроблены на віленскім манетным двары). Гэты аспект яшчэ слаба даследаваны. У гэты ж час Скарына сустракаўся пад Горадняй з нейкім гарадзенскім панам на прадмет стварэння школы – спачатку ў яго маёнтку, а пасля і ў іншых.

Літоўскі даследчык Уладзімір Уладзіміравас напісаў пра знаходжанне кнігі С. у Гродне, якая як трафей трапіла ў Расію: "На адным з экзэмпляраў Біблії Скарыны, які захоўваецца цяпер у Маскоўскім Цэнтральным дзяржаўным архіве старажытных актаў, ёсць надпіс: "Книга сия Алексея Петровича Гладкова, а взята книга сия на Литовской земле в граде Гродно 26 августа 7163 (1655) г.". Больш правільны тэкст знаходзім у "Зводным каталозе і апісанні" Яўгена Неміроўскага. У Гродне была знойдзеная "Кніга Царстваў", выдадзеная

Скарынам 10.08.1518. Названы экзэмпляр уваходзіў у канвалют, сфармаваны ў Пецярбургскай публічнай бібліятэцы ў сярэдзіне XIX ст. А пра тое, каму належаў да гэтага, гаворыць надпіс на старонках 15–32: "Сиа книга Алексеева дому Петровича Гладкова, а взята сиа книга в литовской земле в городе Гродне лета 7163 [= 1655] году м [е] с [я] ца августа в 27 день".

Літ.: В.В. Агіевіч, Імя і справа Скарыны: У чыіх руках спадчына, Мінск 2002, с. 136–137, 138, 140, 153, 154; Гостев А.П., Швед В.В. Кронон. Летопись города на Немане (1116–1990 гг.). – Гродно: "Пергамент", 1993. – С. 20–21; Лабынцаў Ю., Скарынаўскі каляндар. Мінск, 1988. С. 61; Любавский М. Литовско-русский Сейм. Опыт по истории учреждения в связи с внутренним строем и внешней жизнью государства. – М.: Университетская тип., 1900. – С. 59, 62, 65 прилож.; с. 157; Немировский Е.Л., Франциск Скорина. Жизнь и деятельность белорусского просветителя. – Минск: Мастац. Літ., 1990. – с. 239, 412, 414–415; Францыск Скарына. Зборнік дакументаў і матэрыялаў. Мінск, 1988. С. 218, 245.

Скварцоў Іван Мікалаевіч (1817 – не пазней за 1899) – гродзенскі *губернатар* з 21.07.1863 па 13.01.1868. З дваран С.-Пецярбургскай губ., праваслаўны. Выхоўваўся ў Пажскім корпусе. У 1835 паступіў на службу ў званні прапаршчыка ў лейб-гвардыі Сямёнаўскі полк. Да прызначэння ў Гродна служыў у войску, затым у Корпусе жандараў у Херсонскай, Падольскай, Ковенскай і Віленскай губ. Даслужыўся да генерал-маёра (8.06.1863). Указам Аляксандра II ад 21.07.1863 быў прызначаны вайсковым губернатарам г. Гродна і гродзенскім грамадзянскім губернатарам. У перыяд падаўлення паўстання 1863–1864 дзейнічаў згодна з ідэйнымі установамі М. М. Мураўёва. 7.09.1863 былі разбітыя рэшткі атрада *В. Урублеўскага*. С. звольніў усіх міравых пасярэднікаў польскага паходжання, якія падтрымалі губернскага маршалка графа Старжынскага (Стажэнскага), які падаў у чэрвені 1863 запіску па сялянскім пытанні. На працягу двух гадоў таксама звольненыя былі тыя пасярэднікі першага склікання, якія складалі надта выгодныя ўстаўныя граматы для памешчыкаў. Падчас канфіскацыі маёнтка Азёры ў Лепольда Валіцкага скраў, разам з гродзенскім спраўнікам Магнусам, каштоўныя рэчы (напрыклад, табакерку з брыльянтамі часоў Марыі Антуанэты). У 1864 С. садзейнічаў будаўніцтву мураванай агароджы вакол *могілак праваслаўных* у Гродне. У 1864–1868 С. займаўся праблемай жыхароў Рыбацкай вуліцы і Шпітальнага завулка, якія цярпелі ад разліву *Нёмана* і *Гараднічанкі*. Былі пабудаваныя два абводныя каналы, на *Замкавай гары* пасадзілі івы і акацыі для ўмацавання паверхні, завулак вымасцілі каменем. На загад літоўскага генерал-губернатара фон Каўфмана зачыніў *касцёл дамініканскі* (22.10.1865), а яго маёмасць перадаў гродзенскаму дэкану і арцыбіскупу *Гінтаўту*. Звярнуў увагу на разбураную *царкву Барыса і Глеба на Каложы* і далучыў да яе аднаўлення інжынераў 9-й інжынернай акругі. У кабінеце губернатара вісела *гравюра Адэльгаўзера-Цюнта*. Царскім указам ад 13.01.1868 па асабістым прашэнні звольнены з пасады, з залічэннем у запасныя войскі. У 1874 у званні генерал-лейтэнанта быў пры Галоўным штабе. Меў наступныя ўзнагароды: 5

ордэнаў, медалі – бронзавы ў памяць Крымскай вайны 1853–1856, у памяць падаўлення *паўстання 1863–1864*; брыльянтавы пярсцёнак з вензелем імператара 14.04.1863; знакі адзначэння за XV год (1853) і XX год (1857) бездакорнай службы. З'ўляўся *ганаровым грамадзянінам* Гродна (з 1865).

Літ.: Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 78–81; Радзюк А. Гродзенскія губернатары-злачынцы // Гарадзенскі гадавік. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2020. – С. 52–55; Moje wspomnienia w Masalanach spisane. Pamiętniki Jana Ordynata Bispinga. 1842–1892. – Kielce: Uniwersytet J. Kochanowskiego, 2017. – s. 139–140.

Скібінскі Казімір (1786, Вільня – 17.02.1858, Камянец Падольскі) – акцёр. З дзяцінства яго цікавіў тэатр, часта ўцякаў на яго відовішча з дому. Пад канец 1802 супраць волі бацькоў паступіў у балетную трупу Бонча-Тамашэўскага. У 1803 выступаў у Гродне і тут застаўся ў трупе *Я. Шыманскага* (граў у операх і аперэтках, быў суфлёрам). Гадоў праз 10 стварыў сваю трупу і выступаў у Беларусі, Украіне, Польшчы. У Гродне яе выступы былі ў 1816, 1819, вясной 1928, летам 1929, 1830. Працаваў над "Слоўнікам драматычных артыстаў, музыкаў, пісьменнікаў і мастакоў", пісаў мемуары.

Літ.: Pieryłowa O. Aktor o niezwykłym talencie // Magazyn Polski. – 2003. – № 3(28). – S. 23–24.

Скіндэр Леслаў (18.04.1932, Гродна – 23.06.2020, Варшава) – легендарны спартыўны карэспандэнт Польскага радыё, старшыня ўпраўлення Варшаўскага таварыства сяброў Вільні і Гродна. Кар'еру спартыўнага каментатара распачаў у "Kurierze Szczecińskim" ("Кур'еры Шчэцінскім") у 1950 г. Пазней працаваў у Польскім радыё і Тэлевізійным цэнтры ў Шчэціне. У 1973–1976 быў рэдактарам Рэдакцыі спартыўных праграм Польскага Тэлебачання, дзе каментаваў алімпійскія гульні (з 1968) і чэмпіянаты Свету і Еўропы па лёгкай атлетыцы. Цікавіўся ўсходнімі Крэсамі, асабліва Гродзеншчынай, садзейнічаў адкрыццю ў Гродне першай у Беларусі *школы польскай*, на якую сабраў у ЗША 200 тыс. долараў. Дапамагаў школе кампутарамі, кнігамі для бібліятэкі. У 2009 атрымаў Ганаровы Залаты Мікрафон "за незвычайныя эмоцыі, за выдатнае ўменне вымалёўваць словам спартыўныя падзеі, а таксама за стварэнне з самага падмурку польскай школы ў Беларусі і за нястомны клопат, каб дзеці, якія там вучацца, ніколі не адчувалі ніякай нястачы".

За сваю дзейнасць С. атрымаў шмат узнагарод: медаль камісіі Нацыянальнай адукацыі; званні Заслужаны дзеяч культуры і Заслужаны дзеяч фізічнай культуры; Залатое пяро Клуба публіцыстаў (1969); "Ганаровы лаўр" да 75-годдзя Польскага алімпійскага камітэта; Крыж ордэна Адраджэння Польшчы; залаты і срэбны Крыж заслугі.

Крыніца: Wikipedia; Znadniemna.pl: Zmarł słynny sprawozdawca radiowy, grodnianin Lesław Skinder.

Скота з Пармы (Scotto) – італьянскі архітэктар 2-й паловы XVI ст. Паводле яго праекта, магчыма, перабудаваны *замак Стары* ў Гродне (каля 1586).

Скрабоцкі Эўгеніюш (1950, Эйшышкі – 4.02.2010, Гродна) – польскі грамадскі дзеяч, гал. рэд. газеты "Głos znad Niemna" (1989–96) і часопіса *"Magazyn Polski"*, віцэ-прэзідэнт Саюза палякаў у Беларусі (2005). Пасля школы працаваў слесарам. Вучыўся на факультэце журналістыкі Белдзяржуніверсітэта. Пасля службы ў арміі быў журналістам у "Астравецкай праўдзе", затым гал. рэдактарам газеты мінскага медыцынскага інстытута, карэспандэнтам "Чырвонай змены", намеснікам рэдактара "Гродзенскай праўды". У канцы 1980-х стаў адным с заснавальнікаў Саюза палякаў. У 1990–95 быў дэпутатам у Гродзенскім абласным савеце, сакратаром Камісіі па праблемах нацыянальнасцяў. Удзельнічаў кандыдатам на выбарах у Вярхоўны савет Беларусі ў маі 1995.

Крын.: Wikipedia, Skrobocki E.

Скрыннік Іван Несцеравіч (кастрычнік 1920, с. Аляксандраўка Сямёнаўскага р-на Чарнігаўскай вобл. – 25.07.1944, Беласток) – адзін з арганізатараў і кіраўнікоў падпольнага руху ў Віцебскай і Беластоцкай абласцях у гады *вайны Вялікай Айчыннай*. Скончыў Ноўгарад-Северскае педагагічнае вучылішча (1938), вайскова-палітычнае вучылішча (1942). На фронце з сакавіка 1942, палітрук роты. Затым быў памочнікам па камсамольскай працы камісара партызанскай брыгады "Аляксей" у Віцебскай вобласці (чэрвень 1942). Чалец Ліёзненскага падпольнага раённага камітэта ЛКСМБ (1.08.1942 – 1.01.1943). Помочнік упаўнаважанага ЦК ЛКСМБ па Беластоцкай вобл. (люты 1943). Чалец Беластоцкага падпольнага абкама ЛКСМБ (1.08.1943 – 1.07.1944). Сакратар Беластоцкага падпольнага гарадскога камітэта (студзень-ліпень 1944). Пад яго кіраўніцтвам створана каля 50 моладзевых антыфашысцкіх груп і 21 падпольная камсамольская арганізацыя. З ліпеня 1944 С. служыў у Чырвонай Арміі. Забіты ў баі за Беласток. Пахаваны ў Гродне ў *брацкай магіле савецкіх вайскоўцаў і партызан у гарадскім парку* імя *Ж. Э. Жылібера*. У Гродне яго імем названая вуліца, на адным з дамоў якой усталяваная мемарыяльная дошка.

Скульчык Ф. – адзін з кіраўнікоў гродзенскай камсамольскай арганізацыі ў 1931 г.

Славінскі Адам Сямёнавіч, сапр. Качароўскі (11.09.1885, г. п. Панінка Палонскага р-на Хмяльніцкай вобл. – 1937) – дзеяч польскага і міжнароднага працоўнага руху, сябра СДКПіЛ, РСДРП(б), удзельнік кастрычніцкіх падзей 1917 года. Старшыня *камітэта павятовага Гродзенскага вайскова-рэвалюцыйнага* (ліпень-жнівень 1920), сябра Цэнтральнага Бюро ЦК КП(б)Б, сябра Палітбюро ЦК КПП (1930–1936), сябра палітычнага сакратарыята ІККІ (1930–1936). Арыштаваны ў 1937 г. і 3 лістапада прыгавораны ВК Вярхоўнага суда СССР да смяротнага пакарання. Рэабілітаваны 29.04.1955.

Літ.: Досин М.И., Селиванов П.А. А.С. Славинский. Страницы биографии. – Минск: Беларусь , 1980; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 68.

“Слімак” – раён гарадской забудовы на землях князя Яна Друцкага-Любецкага, дзе мясцовая ўлада з 1934 пачала будаваць жыллё для гродзенскіх беднякоў (41 дом). Знаходзіцца каля сучаснага Скідзельскага *рынку,* вуліцы Брацкай і аднайменнай шашы. Увесну 1936 ужо існаваў рабочы квартал пасялення: адно і двухкватэрныя аднолькавыя домікі (пакой, кухня, пярэдні пакой) і невялікі агарод. Жыллё выдавалася за крэдыт – больш за 5 тыс. злотых – на доўгі тэрмін (да 1971 г.). Да *вайны Другой сусветнай* паспелі збудаваць трохі больш за палову запланаванага.

Лі-ра: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 25; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 287–291.

“Слово о полку Игореве” – твор старажытнарускай культуры, напісаны ў 1185 г., у якім чытаем: “Загородите Полю Ворота своими острыми стрелами (...) – (…) трубы трубятъ городенскіи”. Расійскі гісторык А. В. Салаўёў лічыў, што *гарадзенскі князь* мог удзельнічаць сваімі сіламі, або ў саюзе з Раманам Валынскім у барацьбе з Літвой і яцвягамі. А. Кібінь сцвярджае, што трубяць трубы нёманскага Горадзена і заклікаюць Яраслава або яго нашчадкаў і полацкіх князёў спыніць спрэчкі. У 1184 здарыўся *пажар,* які спаліў горад. Усё гэта прывяло да аслаблення Горадзена, і ён ужо не мог бараніць *Чорную Русь* ад Літвы.

Літ.: Кібінь А. Ад Ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурныя трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – № 5. – С. 165–167; Марозава С. “Слова аб палку Ігаравым”: Новае прачытанне // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка горада Гродна. – Мн.: БелЭн, 1999. – С. 52–55; Соловьёв А., Новые раскопки в Гродно и их значение для русской истории / А. Соловьёв // Записки Русского Научного Института в Белграде. – Белград, 1936. – Вып. 13. – С. 69–96.

Слуп ганьбы, прэнгер (pranger) з эшафотам, стаяў на *Рынку*, паміж *ратушай* і *Фарай Вітаўта*. Згадваецца ў дакументах першай паловы XVII ст. і ў 1690. Вядома аб яго пабудове ў 1840 г. Злачынцу прывязвалі (ці прыкоўвалі) да слупа на некалькі дзён, а на эшафоце выконвалася пакаранне. Эшафот са слупам захоўваўся ў паліцыі (пэўны час яна месцілася ў ратушы) і пры неабходнасці ўсталёўваўся на *Рынку*.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: “Гарадзенская бібліятэка”, 2012. – С. 303; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 51; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гродна-Вроцлаў: Гродзенская бібліятэка, 2014. – С. 236; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 1.

Смоліч Аркадзь Антонавіч (29.09.1891, в. Бацэвічы, Клічаўскі р-н – 17.06.1938, Омск) – аграном, віцэ-прэм'ер Рады БНР (намеснік А. Луцкевіча), міністр адукацыі, затым земляробства. Як сын псаломшчыка, атрымаў спачатку духоўную адукацыю (Менская духоўная семінарыя), а пазней аграномічную (сельскагаспадарчы інстытут у Новааляксандраўску/Зарасай, Летува) і эканамічную (інстытут лесаводства ў Пулавах, Польшча). Удзельнічаў у абвяшчэнні БНР: менавіта ён ад імя фракцыі БСГ 24.03.1918 выступіў на пасяджанні II сесіі Рады БНР, унёс і абгрунтаваў ідэю аб неабходнасці абвяшчэння незалежнасці Беларусі. Вясной 1918 С. увайшоў у склад камісіі па арганізацыі першага беларускага ўніверсітэта. С. быў лідарам *грамады Беларускай сацыялістычнай*, выдаваў газету "Грамада". У 1919 быў у складзе дэлегацыі на Украіне, якая атрымала ад урада УНР грошы, і частку іх С. прывёз у Горадню. Калі Вярхоўнае камандаванне Войска Польскага рыхтавалася да заняцця Горадні, С. звярнуўся з лістом да польскага ўрада аб прызнанні незалежнасці БНР. 20.05.1919 С. быў у Варшаве і падаў прэм'еру І. Падарэўскаму праект польска-беларускага пагаднення: стварэнне Літоўска-Беларускай рэспублікі, мажлівасць арганізацыі адміністрацыі і войска пад кантролем Польшчы і пры яе фінансавай дапамозе. У жніўні 1920 прыехаў у Горадню разам з жонкай Аляксандрай і маленькай дачкой. Працаваў кіраўніком аграномічнага пададдзела ў *камітэце гродзенскім рэвалюцыйным* (знаходзіўся ў *доме Максімовіча*): пачаў набор інструктараў па сельскагаспадарчых машынах і іншых спецыялістаў; ажыццявіў улік і мабілізацыю коней і валоў ў Гарадзенскім у..; выступаў як лектар на тэму "Камуны і арцелі", выкладаў эканамічную геаграфію на рабочых курсах. У 1920-я гады займаў пасаду загадчыка аддзела прыроды і народнай гаспадаркі Інстытута Беларускай культуры, стаў акадэмікам АН БССР. Выкладаў у БДУ, загадваў кафедрай геаграфіі, заснаваў ланшафтазнаўства. Быў узнагароджаны Малым залатым медалём Геаграфічнага таварыства СССР. У 1930 арыштаваны і высланы ў Цюменскую вобл., дзе ў Ішыме працаваў настаўнікам у тэхнікуме. У 1937 арыштаваны другі раз і прыгавораны да расстрэлу ў Омску (1938). Рэабілітаваны двойчы – у 1957 і 1988. Аўтар вядомага падручніка "Геаграфія Беларусі", які вытрымаў шмат выданняў (першае ў 1919, апошняе ў 1994).

Літ.: Міхалік Д. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920: Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці. – Смаленск: Інбелькульт, 2015, с. 146–149, 201, 242, 247, 352, 360, 366, 450; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 68.

Соламава (Салома) Вольга Іосіфаўна (25.05.1920, в. Лаша Гродзенскай вобл. – 2.02.1944, в. Жорнаўка Бераставіцкага раёна) – адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёвага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Гродзеншчыны. Закончыла курсы пры Гродзенскім педвучылішчы і працавала настаўніцай у в. Іванаўцы Гродзенскага р-на., дзе стварыла камсамольскую арганізацыю. У 1940 была дэпутатам абласнога савета ў Беластоку і аднойчы на пасяджанні паставіла небяспечнае ў той час

пытанне: чаму на вёсцы адкрываюць пераважна расейскія, а не беларускія школы, якія вяскоўцам бліжэй. На пачатку вайны эвакуявалася ў Мардовію, адкуль пісала ў ЦК камсамола і Беларускі штаб партызанскага руху – прасіла накіраваць яе ў акупаваную Беларусь. Яе выклікалі ў Цэнтральны партызанскі штаб у Маскву, яна скончыла спецшколу (у Мураме і станцыі Сходня пад Масквой), і пасля гэтага з групай беларускіх партызан была закінутая самалётам у Ліпічанскую пушчу ў брыгаду імя Аляксандра Неўскага. Сябра КПСС з 1943. Сябра Беластоцкага падпольнага абкама ЛКСМБ (чэрвень 1943 – 2 лютага 1944). Стала сакратаром Гродзенскага падпольнага гаркама камсамолу (з 1.11.1943). Агітацыйную працу праводзіла ў Гродне, Капцёўцы, Навасёлках, Індуры, Луцкаўлянах, Агароднікаў. Летам 1944 г. у в. Жорнаўка Бераставіцкага р-на Соламава разам з Васілём Бібічам знаходзілася па справах з сувязнымі. Вёску акружылі карнікі, калі Васіля забілі, Вольга адстрэлівалася з двух аўтаматаў, а потым застрэлілася апошнім патронам (верагодна, каб не патрапіць у палон і не разлучацца з каханым, з якім хутка мелася быць вяселле). Пахаваная ў брацкай магіле ў гродзенскім *парку гарадскім*. Перад СШ № 19 усталяваны бюст-помнік (1977, скульптар В. Галубкіна, арх. К. Асадаў). Адна з вуліц Гродна носіць яе прозвішча, тут ёсць мемарыяльная дошка. Яе імя носіць цеплаход Гродзенскага *рачнога порта*. С. – *ганаровая грамадзянка* Гродна (1964). У красавіку 1975 г. у в. Лаша быў адкрыты ёй помнік.

Літ.: Вашкевіч А. Гарадзенкі. Жаночы след у гісторыі Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 93–96; Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 215; Плешавеня А.М. Партызанка Вольга // Памяць: Гіст.-дакум. хроніка горада Гродна. – Мн.: БелЭн, 1999. – С. 412–414.

Солтан Станіслаў Станіслававіч – удзельнік падзей 1863 г., меў 42 гады. Граф, сын паўстанца *1794 г.* і ўдзельніка *вайны 1812 г.* на баку Напалеона, брат напалеонаўскага вайскоўца 1812 і ўдзельніка *паўстання 1831*, сваяк паўстанцаў 1863 Францa Юндзіла і Севярына Ромера. Вучыўся ў Мітаўскай гімназіі і Дэрпцкім універсітэце. Служыў у канцылярыі гродзенскага *сходу дваранскага*. Да чэрвеня 1862 быў міравым пасярэднікам Гродзенскага ў. Ёсць сведчанні, што ў гэты час сяляне выганялі яго з вёскі, ён выклікаў войскі для "уціхамірання мужыкоў". Паводле паказанняў *Э. Заблоцкага, Сільверстовіча, Геніюша І.,* садзейнічаў ім у выкананні іх абавязкаў на рэвалюцыйных пасадах: парадамі, выбарам асоб для рэвалюцыйнай арганізацыі, складаннем складак 10% збору з памешчыцкіх маёнткаў на закупку зброі за мяжой. *Каліноўскі К.-В.* у канцы мая 1863 выслаў яму намінацыю на пасаду памочніка камісара гродзенскага ваяводства і пячатку, але С. адмовіўся (па прычыне хваробы жонкі) і аддаў іх назад. Солтан прызнаў гэты факт, але адмаўляў свой удзел у паўстанні і садзейнічанне рэвалюцыйнай арганізацыі. Абвінавачваўся таксама ў забеспячэнні паўстанцаў зброяй (атраду Духінскага перадаў 50 двухстваловых ружжаў, 4 бутэлькі пораху, скрынку куляў), вопраткай, харчаваннем, прыняццем іх у сваім маёнтку. Ведаў К. Каліноўскага, *Гофмайстра,* Заблоцкага, Сільвестровіча – кіраўнікоў рэвалюцыйнай арганізацыі, якія бывалі ў яго. Э. Заблоцкі

паказаў, што С. пісаў рэвалюцыйныя адозвы. Падчас арышту сядзеў у мурах *касцёла паезуіцкага*. Распараджэннем гродзенскага губернатара ад 13.05.1864 яго маёнтак падлягаў канфіскацыі. Прыгавораны да катаржных прац у капальнях на 15 гадоў (было "меркаванне" расстраляць).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 65–66 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 2, а.12, 15 адв., с. 426–436; с. 1, а. 38, 500–505, 556 адв., 566; ф. 3, воп. 1, с. 40, а. 11; Jodkowski. Sylwety z roku 1863 // Echo Grodzieńskie. – 1926. – № 8. – S. 3.

Солы – частка горада, раней маёнтак Дамініка *Радзівіла,* які ў 1806 г. прадаў большую частку зямлі палкоўніку *Ляхніцкаму*, пакінуўшы сабе 1,5 морга над *Нёманам* (раён *фарштата Занёманскага*). Суд Радзівілаўскай Камісіі прызначыў гэты кавалак зямлі Радзівілам (яго атрымала Стэфанія Радзівіл рашэннем эксдывізарскага суда ад 26.11.1828) і, калі князь Л. П. Вітгенштэйн ажаніўся з ёй, дык зямля ў 1 дзесяціну перайшла яму рашэннем Гродзенскай палаты грамадзянскага суда ад 7.09.1839. Яе знайшлі паміж маёнткамі Ляхніцкага і *Румеля*.

Крыніца: AGAD, zesp. 353, d. 18, syg. 316, k. 1–31.

Сольная Баля (Салёная Баля) – частка горада, раней вёска каля Гродна. Назва балцкая, ад асновы "bala" – верхавое балота. Назву "Баля" на мапах XIX ст. насіла рэчка, якую цяпер называюць "Зарачанская рэчка". Польскі археолаг Глогер знаходзіў каля вёскі каменныя прылады працы. У 1975 г. у вёсцы і на паўночна-усходняй ускраіне выяўленыя тры стаянкі каменнага і бронзавага веку. Былі знойдзеныя крамянёвыя вырабы (скоблі, разцы, праколкі), каменная сякера, фрагменты керамічнага посуду. Упершыню ўпамінаецца ў дакументах у 1506, калі Грынка Хадкевіч з Балі атрымаў ад вялікага князя зямлю ў лясах Пераломскай пушчы. У 1558 С. Б. – каралеўскі двор, аддадзены ў арэнду *Валовічу.* Падчас рэвізіі *эканоміі гродзенскай* ў 1679–1680 у вёсцы мелі свае фальваркі шляхціцы Павел Міклашэвіч, Рыгор, Іван, Астафі Валовічы. У часы ВКЛ і Рэчы Паспалітай тут існавалі дзяржаўныя склады солі з Вялічкі пад Кракавам. У 1880 Баля Сольная – вёска і фальварак Лабенскай воласці Аўгустоўскага ў. Сувальскай губ. Падчас *вайны Першай сусветнай*, у жніўні 1915, каля вёскі знаходзіліся пазіцыі 3-й і 57-й расійскіх дывізій. На пачатку XX ст. тут здабывалася соль, якая ўтварылася ў мезазойскі перыяд гісторыі зямной кары. На 2007 г. – дамоў 16, агульная колькасць жыхароў – 32, няпоўнагадовых да 15 год – 1, працаздольнага ўзросту – 17, пенсіянераў – 14.

Літ.: Глогер З. Далінамі рэк. Нёман (фрагменты) // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Вып. 10 (2015) / рэдкал. І. Соркіна [і інш.] – Гродна, 2016. – С. 50; Гродно: энцикл. справ / редкол.: И.П. Шамякин [и др.]. – Минск: БелСэ, 1989, с. 87–88; Карнялюк В. Гродзенскі эпізод Першай сусветнай вайны // Беларусіка=Albaruthenica. Кн. 7. – Мн., 1996. – С. 37; Орловский Е.Ф. Гродненская старина. / Е.Ф. Орловский. – Гродна, 1910. – Ч. 1: Гродна, с. 3, 8; Borowik P. J. Jurydyki miasta Grodna w XV – XVIII wieku. Stanowy podział nieruchomości. – Supraśl, 2005, s. 77, 85, 89, 91.

Спіра, Натан бэн Самсон (? – 1577, Гродна) – адзін з першых рабінаў Гродзенскай гміны, вядомы сваёй надзвычайнай рэлігійнасцю. Быў нашчадкам сям'і, якая пераехала з Германіі ў Польшчу, і сваяком вядомага гісторыка і астранома Давіда Ганса з Прагі. С. напісаў творы ў галіне кабалістыкі і гамілетыкі: каментары да Machzoru (Кракаў, 1604), каментары да Raszi і Mizrachi "Imre Szefer" ("Мовы прыгожай"), каментары да Zocharu (Люблін, 1623). С. пісаў мовай даступнай для простых чытачоў і карыстаўся папулярнасцю.

Літ.: Bersohn M. Słownik biograficzny uczonych żydów polskich XV, XVII, XVIII wieku. – Warszawa, 1906.

Сталінскі Андрэй Францішак – шляхетны пан, радца і пісар каралеўскай мытні ў 1747 г., гарадзенскі ўраднік: лаўнік у 1746–1747, *бурмістр* у 1748–1756, 1763, 1738, 1774, 1779, *прэзідэнт* у 1753–1755, 1757–1763, 1765–1766, 1768, 1774, 1779. Валодаў камяніцай з аптэкай на заходнім баку *Рынку*, камяніцай на вул. Траецкая, трыма пляцамі над Нёманам, валокай зямлі ў Грандзічах (Касцёлаўшчынай), ворнай зямлёй ў Сухім сяле (сёння раён *парку гарадскога*, прывакзальнай плошчы). Прэзідэнта згадвае ў сваім дзённіку вандроўкі швейцарскі вучоны Ёган Бернулі, які ў 1778 быў у Гродне: напісаў, што, дзякуючы С., пазнаёміўся з *Жыліберам Ж.-Э.*, які запрасіў яго ў сваю кватэру.

Літ. і крыніцы: Гардзееў Ю. Гродзенскі рынак у XVI-XVIII ст. (праблемы сацыятапаграфічнага развіцця) / Ю. Гардзееў // Краязнаўчыя запіскі. – 2000. – № 5. – С. 96; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 258–259; Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 358, 360; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 334.

Сталыпін Пётр Аркадзевіч (2.04.1862, Дрэздэн, Германія – 5.09.1911, Кіеў) – гродзенскі *губернатар* з 30.05.1902 да 15.02.1903. Паходзіў са старажытнага расійскага дваранскага роду, вядомага з XVI ст., праваслаўны. Другі сын обер-камергера, генерала ад артылерыі, генерал-ад'ютанта (дваюраднага дзяцькі паэта *М. Ю. Лермантава*) і Н. М. Гарчаковай. Дзяцінства і юнацтва С. звязаныя з Літвой: летам сям'я жыла ў маёнтку Калнаберж пад Коўнам; у Вільні быў куплены дом. Вучыўся ў Віленскай гімназіі, у 1881–1885 – на фізіка-матэматычным факультэце С.-Пецярбургскага ўніверсітэта. Да прызначэння гродзенскім губернатарам працаваў у МУС (з 20.10.1884), у дэпартаменце земляробства і сельскай прамысловасці Міністэрства дзяржаўных маёмасцяў (з 5.02.1885). З 1889 С. быў звязаны з Ковенскай губ.: 18.03.1889 прызначаны ковенскім павятовым прадвадзіцелем дваранства і старшынёй Ковенскага з'езда міравых пасярэднікаў; 28.05.1890 прызначаны ганаровым міравым суддзёй Ковенскай акругі на тры гады. У 1898 лёс закінуў С. у Пензенскую губ., дзе ён (ужо надворны дарадца) стаў міравым суддзёй Інсарскага ў. Але хутка вярнуўся на Ковеншчыну, бо 24.04.1899 быў прызначаны ковенскім губернскім прадвадзіцелем дваранства з захаваннем прыдворнага звання (камергера імператарскага двара) і ганаровым міравым суддзёй

Ковенскага ў. на тры гады (1899–1902). У 1901 і 1902 быў чальцом Сельскагаспадарчага савета пры Міністэрстве земляробства і дзяржаўнай маёмасці.

Указам Мікалая II ад 30.05.1902 С. быў прызначаны выканаўцам абавязкаў гродзенскага губернатара з захаваннем прыдворнага звання. На пасаду ўступіў 21.06.1902, калі прыехаў у Гродна. Адразу зайшоў у кафедральны Сафійскі *сабор*, сустрэўся з Гродзенскім і Брэсцкім епіскапам Іаакімам. На наступны дзень С. сустрэўся з праваслаўным гарадскім духавенствам, затым са служачымі грамадзянскіх устаноў горада. 16.07.1902 С. выступіў на паседжанні Гродзенскага губернскага камітэта аб патрэбах сельскагаспадарчай прамысловасці. Ён сказаў пра неабходнасць рассялення сялян на хутары і пераходу да хутарнай гаспадаркі, ліквідацыі зямельнай цераспалосіцы, развёрстванні сервітутаў і меліяратыўных працах, адукацыі насельніцтва. Ужо тады ён быў перакананы, што багаты, адукаваны і сельскагаспадарча асвечаны селянін-прыватнік будзе апорай манархіі.

Восенню 1902 у Гродне, па ініцыятыве Сталыпіна, былі адкрытыя вучылішчы: яўрэйскае двухкласнае, народнае рамеснае, жаночае прыходскае з трэцім прафесійным класам. 27–28.01.1903 С. сустракаўся ў Гродне з міністрам народнай асветы і папячыцелем Віленскай вучэбнай акругі па пытаннях узаемаадносін царкоўнага і міністэрскага вучэбных ведамстваў. Займаўся С. і нацыянальным пытаннем: лічыў апорай расійскага ўрада сялян-беларусаў і не давяраў дваранам-палякам; у сваім плане кіравання Расіяй прадугледжваў поўнае аддзяленне Польшчы (без беларускіх і ўкраінскіх зямель) ад Расіі; лічыў неабходным паступовае ураўнаванне *яўрэяў* у правах з іншымі падданымі Расійскай імперыі. С. быў старшынёй Гродзенскага аддзялення Расійскага таварыства Чырвонага Крыжа.

Царскім указам ад 15.02.1903 С. быў прызначаны на пасаду саратаўскага губернатара з захаваннем прыдворнага звання. 21 сакавіка ў будынку *дваранскага сходу* адбылося развітанне са Сталыпіным прадстаўнікоў усіх дзяржаўных устаноў і духавенства. Епіскап Іаакім правёў малебен, а Уладыка звярнуўся да былога губернатара і яго жонкі з кароткай прамовай, у якой адзначыў яго адданасць асноўным пачаткам дзяржаўнага ладу: праваслаўю, самадзяржаўю, народнасці. На пасадзе саратаўскага губернатара С. люта падаўляў сялянскі рух. А ў Гродне ў 1903–1904 праходзіла кампанія па зацверджанні стыпендыі імя Сталыпіна і яго жонкі ў адной з арганізаваных імі вучэбных устаноў. Падпіска і збор грошай праходзілі пры падтрымцы новага губернатара *Асаргіна* і гродзенскага губернскага прадвадзіцеля дваранства. 5.10.1907 С. і яго жонка былі выбраныя ганаровымі чальцамі *брацтва Сафійскага праваслаўнага.* С. быў адным з першых, хто падтрымаў гродзенцаў у іх жаданні ўвекавечыць памяць аб сваіх земляках, забітых на *вайне руска-японскай*, будаўніцтвам *царквы Свята-Пакроўскай.*

У красавіку 1906 С. стаў міністрам унутраных спраў, а з ліпеня – старшынёй Савета міністраў. На гэтых пасадах праводзіў тую аграрную палітыку, якая аформілася ў сваіх элементах у часы, калі ён быў гродзенскім губернатарам (рэформа адбывалася паводле ўказаў 9.11 і 15.11.1906, Палажэнні аб земле-

ўладкаванні 1911). Адначасова ўжываў паліцэйскія рэпрэсіі супраць рэвалюцыйнага руху праз сістэму ваенна-палявых судоў (шыбеніцы называлі "сталыпінскімі гальштукамі").

На жыццё С. некалькі разоў ажыццяўлялі замах: 12.08.1906 былі параненыя 3-гадовы сын і 14-гадовая дачка; у 1907 сярод тэрарыстаў была гродзенская мяшчанка Адэль Качан; у 1911 быў забіты ў кіеўскім тэатры правакатарам з былых рэвалюцыянераў, агентам ахранкі Д. Багровым. Пахаваны на могілках Кіева-Пячорскай лаўры ў Кіеве.

6.09.1911 у гродзенскім Сафійскім саборы адбылася паніхіда па забітым. Камітэт пад старшынствам губернатара В. М. Барзенка для увекавечвання памяці Сталыпіна ажыццявіў збор сродкаў на пабудову насупраць губернатарскага дома, дзе жыў Сталыпін, і каля царквы Аляксандра-Неўскай помнік-бюста. 15.06.1914 адбылося яго ганаровае адкрыццё.

Творы: Указатель книг, журнальных и газетных статей по сельскому хозяйству за 1886 г. //1886 год в сельскохозяйственном отношении по ответам полученным от хозяев. – Вып. 3. Прил. СПб, 1887.

Узнагароды: 10 ордэнаў, 3 медалі – срэбны ў памяць царавання Аляксандра III (1896), срэбны ў памяць каранацыі Мікалая II (1896), цёмна-бронзавы за працы па Першым ўсеагульным перапісе насельніцтва Расійскай імперыі 1897 г. (1897); знак адрознення за пазямельнае ўладкаванне дзяржаўных сялян (1905).

Крын. і літ.: ф. 2, воп. 25, с. 500, а. 5; ф. 2, воп. 25, с. 500, а. 25; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007; Бок М.П. Воспоминания о моем отце П.А. Столыпине. – Ленинград: Ингрия, 1990. – с. 112–113; Рожков Н. Столыпин // Энциклопедический словарь русского библиографического института Гранат. 8-е изд. Т. 41, ч. 4. – М., б.и., б.г. – Стб. 647–651; Россия на рубеже веков: Исторические портреты. – М.: Политиздат, 1991. – с. 51–52; Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. Т. XI. Гродненская губерния. – СПб., 1903. – 544 с.; Черепица В. …Не потерять связующую нить: История Гродненщины XIX – XX столетий в событиях и лицах (исследования, документы, комментарии): Монография. – Гродно: ГрГУ, 2003. – С. 6–47.

Станіславова – каралеўская рэзідэнцыя, размешчаная на ўсходняй ускраіне Гродна (сёння вул. Ціміразева). У 1760–70 гг. паводле праекта *Дж. Сака* ўзнік сядзібны ансамбль, які ўключаў сядзібны дом, два флігелі, гаспадарчыя пабудовы і парк. Першапачатковы выгляд сядзібы можна паглядзець на малюнку *Н. Орды* 2-й пал. XIX ст. Мураваны дом-палац быў аднапавярховым прамавугольным у плане будынкам з 2-павярховай цэнтральнай часткай, вылучанай на дваровым фасадзе эркерам з манаграмай *Станіслава Аўгуста Панятоўскага* на атыку, а на галоўным – рэзалітам з атыкавым завяршэннем і шырокай тэрасай. У дэкоры фасада выкарыстаныя пілястры, раскрапаваныя карнізы, філёнгі, лепка. Вокны прамавугольныя і арачныя. Унутраная планіроўка калідорная з цэнтральнай групай парадных памяшканняў: вестыбюль, ніжняя і верхняя (тэатральная) залы. Да пачатку *вайны Другой*

сусветнай на сценах апошняй залы можна было ўбачыць фрагменты малюнкаў на міфалагічныя сюжэты. Ад канца XIX ст. у вестыбюлі захаваліся дзве печы ў стылі неаготыкі, якія абліцаваныя паліванымі керамічнымі пліткамі цёмна-карычневага колеру. Аднапавярховыя прамавугольныя ў плане флігелі размешчаныя на рэльефе ніжэй дома і сіметрычныя адзін да аднаго. Створаны флігелямі парадны курданёр абнесены з боку ўезда невысокай цаглянай агароджай з брамай. Перад цэнтральным уваходам быў круглы газон, абсаджаны кустамі бэзу. За заходнім флігелем размешчаныя гаспадарчыя пабудовы. За домам знаходзіўся парк рэгулярнага тыпу з радыкальна-прамянёвай планіроўкай. Ад парку, які займаў 3 га, захавалася некалькі старых ліп недалёка ад палаца. *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* бавіў тут час у зімовы перыяд. Асабліва часта наведваў рэзідэнцыю ў час вымушанага знаходжання ў Гродне. Пасля ад'езда вялікага князя літоўскага і караля польскага ў Санкт-Пецярбург сядзіба была канфіскаваная ў расійскую казну. У сярэдзіне XIX ст. яна патрапіла ў маёмасць да сям'і *Друцкіх-Любецкіх*, якім належала да 1939 г. Адным з першых ўладальнікаў быў Францішак-Ксаверы – *гродзенскі губернатар* у 1816 г., міністр скарбу Каралеўства Польскага. На мяжы XIX–XX стст. гаспадарыў у Станіславове Уладзіслаў, які заснаваў цагельню. У міжваенны перыяд (1919–1939) спадчыннікам быў ягоны сын Ян, які значна перабудаваў палац, хаця сам не часта тут бываў. Пасля *вайны Другой сусветнай* будынак палаца быў перабудаваны пад размяшчэнне сельскагаспадарчага інстытута: надбудавалі другі паверх над бакавымі крыламі, замуравалі франтальны аркадавы порцік. Акрамя палаца захаваўся комплекс гаспадарчых пабудоў (карэтная, стайня, фабрыка "коламазі" (змазкі), воданапорная вежа) і фрагменты рэгулярнага парку каля палаца ды сённяшняга будынка Аграрнага ўніверсітэта.

Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 191–195; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997; Швед В. Гарадзенскія памятныя месцы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Элізы Ажэшкі // Albaruthenica. – 2018. – № 18. – S. 333–343.

Станіслаў Аўгуст Панятоўскі (1732–1798) – вялікі князь літоўскі, кароль польскі. Часта і нядоўга жыў у Гродне, у *замку Новым*. Таксама меў пад Гроднам тры рэзідэнцыі: *Станіславова*, *Аўгустова* і *Панямунь*. Пасля заняцця А. Суворавым Варшавы павінен быў, паводле прадпісання Кацярыны II, перададзенага 10.02.1793 г. новым расійскім паслом у Варшаве *Я. Сіверсам* (узгодненага з прускім і аўстрыйскім дварамі), пераехаць у Гродна, дзе і жыў у *замку Новым* з 1(12).01.1795 (даты 5, 8, 9.01 з'яўляюцца памылковымі) па 15.02.1797. Разам з САП прыехалі 153 асобы: пажы, камергеры, камердынеры, кватэрмайстар, шталмайстар, наглядальнік каралеўскага палаца, лекар, кухмайстар, буфетчык, камер-лакеі і лакеі, прачка, кур'еры і д. п. Разам з ім знаходзілася ў Гродне каралеўская сям'я: князь Казімір, экс-падкаморы каронны; ст. сястра Людвіка Замойская, удава падольскага ваяводы; малодшая сястра

Ізабэла, удава гетмана кароннага Я. К. Браніцкага; пляменнік, падскарбі літоўскі Станіслаў Панятоўскі. На ўтрыманне двара расійскі ўрад выдаваў 7 705 чырвонцаў і на "кішэнныя выдаткі" САП 3 295 чырвонцаў. М. дэ Пуле піша, што САП мог у Гродне жыць "з царскай пышнасцю".

Яшчэ па дарозе САП у Гродна генерал-губернатар Літвы *Рапнін Мікалай* даў сакрэтнае прадпісанне князю *Цыцыянаву П. Д.* як яго там утрымліваць: абмежаваць у перапісцы і сачыць за карэспандэнцыяй; не дапускаць кантактаў з мясцовымі жыхарамі і гандлярамі; весці штодзённыя запісы каралеўскіх гасцей у палацы; сачыць за кантактамі світы караля з духоўнымі асобамі і ў корчмах; трымаць вайсковыя каравулы заўсёды гатовымі да дзеяння; па вуліцах наладзіць конныя раз'езды, якія будуць рабіць гэта кожны дзень у розных месцах і часе, каб злачынцы не маглі прыстасавацца да графіка вайскоўцаў. У Гродне САП узялі пад апеку і кантроль знаёмы былога караля генерал-губернатар Літвы Рапнін Мікалай, камісар (прыстаў) граф генерал-маёр Ілля Безбародка, які даносіў Рапніну пра жыццё караля, а таксама яго сакратар Фрысе. На ахову была вызначаная рота і 30 канвойных драгунаў, з якіх 24 з афіцэрам былі змешчаныя ў перадпакоях і павінныя былі заўсёды ездзіць з каралём (12 перад, 12 пасля карэты караля), а 6 заставацца пры двары. Безбародка пісаў, што на гродзенскім замку "ад раніцы да поўначы раіліся" мясцовыя і прыезжыя асобы: кароль раздаваў ордэны "Белага Арла" і "Станіслава" (а дакладней яго стараста Рыкс гандляваў імі па 10 і 5 чырвоных злотых), нехта прасіў караля аб пратэкцыі перад Рапніным. Прыязджалі былыя сябры: рэктар *Пачобут-Адляніцкі*, літаратар Нарушэвіч, знакамітыя расіяне і замежныя госці (напрыклад, лорд Дуглас). З расіян часта прыязджалі ў Гродна: генерал граф *Панін Мікіта*, былы расійскі пасол у Варшаве барон д'Арсш і ягоная жонка, палкоўнікі графы Штакельберг і Сакен, контр-адмірал Літ, Рапніна і яе дачка графіня Валконская, Лабанова-Растоўская, графіня Паніна.

САП не мог нікуды выехаць з Гродна – гэта было адзіным абмежаваннем, а жыццё яго двара адбывалася як у Варшаве: аўдыенцыі, прэзентацыі, цырыманіяльныя і прыватныя прыёмы, дворскія і прыяцельскія абеды і вячэры. Парадак жыцця пры двары быў амаль рэгулярны: пад'ём караля ў 8 гадзін, абед каля 13, найпазней каля 14, адпачынак – між 11 і 12 гадзінамі. У святочныя дні хадзіў у замкавую капліцу, у дамініканскі ці паезуіцкі *касцёлы*. САП любіў і добра гуляў у більярд, Рапнін падараваў яму два сваіх сталы і прыязджаў да яго пагуляць. Былы кароль напісаў у Гродне большую частку сваіх "Успамінаў", упарадкаваў сваю калекцыю нумізматыкі, медалёў і старажытных рэчаў. Доўга вывучаў нейкі старажытны камень, які быў знойдзены ў *Ласосне* над Нёманам. Калі дазваляла надвор'е, любіў пагуляць на замкавым дзядзінцы, а з 15.03.1795 стаў выязджаць за горад (*Грандзічы*, Панямунь, *Пышкі*, Каханова, *Ласосна,* Аўгустова/Аўгустовак, Караліно, Адамавічы, Гнойніца, *Сакрэт,* раён *царквы Барыса і Глеба на Каложы*). У палове красавіка 1795 г. прыехала жонка Рапніна, і пачаліся асамблеі (забавы), на якіх бываў і САП. Аднойчы выступіў у Гродне перад каралём і гродзенскай арыстакратыяй штукар і чорнакніжнік Пінэці.

25.11.1795 САП на загад Кацярыны II падпісаў адрачэнне ад прастола. Гэта адбылося альбо ў замку Новым, альбо ў *палацы Тызенгаўза*, дзе жыў Рапнін (столік, на якім было падпісанае адрачэнне, мажліва знаходзіцца ў Літоўскім нацыянальным музеі). Яму паабяцалі выплаціць ягоныя даўгі і заапекавацца сёстрамі. 1.08.1896 (ст. ст.) САП прысутнічаў у раёне ракі *Ласасянкі* на манеўрах батальёна стральцоў на чале з падпалкоўнікам Барклаем дэ Толі, з якім пасля размаўляў. 16.11.1796 кароль даведаўся пра смерць Кацярыны II 6.11.1796. Новы імператар Павел I запрасіў караля ў Пецярбург (і той паехаў туды замест жаданай Італіі). 13(25).01.1797 быў адпраўлены першы багаж, затым на 120 канях – кухня, цукерня і шафа, 15.02.1797 (пав. новага ст.) пры суправаджэнні Безбародкі выехаў кароль і ягоны двор (80 чал.) на 150 конях. У Пецярбургу САП памёр і быў пахаваны ў касцёле Св. Кацярыны на Неўскім праспекце. У красавіку 1938 г. парэшткі САП былі перанесеныя з Ленінграда ў Воўчын (цяпер у Брэсцкай вобл.).

У 1981 у Польшчы была створаная спецыяльная камісія па вяртанні праху САП. У кастрычніку 1987 група гродзенцаў у складзе Ткачова М. А., Мілінкевіча А. У., Мілінкевіча А. А., Кіслага У. знайшлі ў Воўчыне артэфакты, звязаныя з САП (усе названыя асобы былі ўзнагароджаныя польскім урадам знакам "Заслужаны для польскай культуры"). Знойдзенае было перададзенае ў Музей культуры Беларусі, а ў 1988 група польскіх даследчыкаў была ў Воўчынскім касцёле Св. Тройцы і музеі, дзе ім передалі некаторыя рэліквіі. У 1989 г. польская група з удзелам беларускіх даследчыкаў правяла раскопкі ў Воўчынскім касцёле і ўсе знаходкі (а таксама частку зямлі з касцявымі фрагментамі) перадала ў замкавае сховішча ў Варшаве (13.06.1989).

Крын. і літ.: Безбородко И.А. Журнал пребывания его величества, короля польского, Станислава Августа в Гродне 1795–1796 годов, ведённый приставом при нём генерал-поручиком И.А. Безбородком. – М., 1870. – 158 с.; Де Пуле. М. Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794–1797 годах. Изд. 2-е. – СпБ., 1871. – С. 12–27, 78–79, 85, 98–99, 180–181; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997; P. J. Bykowski. Dwór królewski w Grodnie. Epizod biograficzny (1795–1797)/ – Warszawa, 1884. – 152 s; Czarnowski R. J. Grodno. Zapomniana stolica. – Warszawa: oficyna wydawnicza RYTM, 2015. – C. 49–62.

Станішэўская Тэкля (1898, Вільня – 21.05.1919, Вільня) – настаўніца ў першай *школе беларускай* у Гродне. Да беларускага руху далучылася яшчэ ў 1914 г. у Вільні – была чальцом беларускай музычна-драматычнай дружыны, выступала ў беларускім тэатры, добра дэкламавала вершы. У 1916 скончыла вучыцельскія курсы, паехала ў Гродна працаваць настаўніцай і змагла здабыць агульную сімпатыю. У газеце "Беларуская думка" пісалася: "Праца Тэклі Станішэўскай у Горадні была безупыннай барацьбой за беларускае адраджэнне і за беларускую школу (…). Маладым беларускім адраджэнцам-вучыцялём прыходзілася кожны крок здабываць упорнай, доўгай і сістэматычнай працаю". Гэтая барацьба на працягу 2 гадоў, голад і холад, цяжкае становішча

з падручнікамі і ўсялякай навучальнай літаратурай падарвалі здароўе С. Яна захварэла на сухоты і летам 1918 выехала дадому, дзе лячылася і працавала ў беларускім прытулку "Золак" і ў беларускай кнігарні. У сакавіку злягла ў клініку і хутка памерла. Пахаваная побач з бацькам на могілках Росы ў Вільні.

Літ.: Вашкевіч А. Гарадзенкі. Жаночы след у гісторыі Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 79–82; Мяцельскі А. ў https://hrodna.life/articles/teklya-stanisheuskaya/; Чарнякевіч А. Першыя беларускія настаўнікі: Тэкля Станішэўская і Аляксандр Грыкоўскі // Биржа информации. – 2003. – №. 293. – 18.09. – С. 1.

Станцыя юных натуралістаў, створаная М. І. Жаваронкам у 1951 г. у закрытай частцы гарадскога *парку культуры і адпачынку*, на месцы, дзе быў батанічны сад Я. Каханоўскага і аранжарэя, у захаваных гаспадарчых памяшканнях і аранжарэі. Тут працавала каля 10 гурткоў батанічнага напрамку. У 1953 станцыя пераехала на вул. Камунальную, але аранжарэя яшчэ да канца 50-х гадоў заставалася яе філіялам.

Літ.: Саяпин В. О парке Жилибера и зоопарке Кохановского. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 16.

Староста гарадзенскі – дзяржаўца, чыноўнік, які на тэрыторыі Гарадзенскага пав. Троцкага ваяводства на працягу XV–XVIII стст. ад імя вялікага князя літоўскага/караля польскага ажыццяўляў адміністратыўна-гаспадарчую і судовую ўладу (гэтыя функцыі замацаваў Літоўскі Статут 1529 г.). У сярэднявеччы рэзідэнцыя старасты знаходзілася ў вялікакняскім і каралеўскім двары *Гарадніца*. У XVIII ст. староства размяшчалася ў будынку былой школы дамініканскай (вул. Савецкая, 8). Староста павінен быў яго утрымоўваць падчас побыту гаспадара двара ў *Гарадні*, дастаўляць харчаванне ў Вільню, збіраць прыбыткі з арандаваных зямель, *корчмаў*, саляных збораў і інш. Вядомыя наступныя старосты: Судымонтавіч Алехна (1458–59), Судывоевіч Станка (1463–1476); Кучук Ян (1478); Насутовіч Ян (1479–84); Гальшанскі Аляксандр Юр'евіч (1485–1504); *Забярэзінскі Ян Юр'евіч* (1504–1507); Кішка Станіслаў Пятровіч (1508–1512); *Радзівіл/Радзівіловіч Юры Мікалаевіч* (1514–1516, 1518–1523, 1526, 1533–34, 1541); Трэбскі Войцех (1540); Грышковіч (Грынковіч) Войцех Кімбар (1540–51); Глябовіч Станіслаў (1542–?); Міхайловіч Леў (1552–55); *Дыбоўскі Себасцьян* (з 23.11.1555); Багавіцінавіч Леў М. (1561); Хадкевіч Рыгор Аляксандравіч (1563/64 – 1572, 1578); Хадкевіч Аляксандр Рыгоравіч (зацверджаны паміж 7.07.1572 і 2.04.1573); Клюкоўскі Ян (1594); Збражскі Я. (1598–1608); Скумін-Тышкевіч Тэадор/Фёдар (1608–1619); Касабудскі Станіслаў (1621); Хадкевіч К. (1632–1649), гл. *Хадкевічы*; Сапега К. (1649–1656); *Катовіч Андрэй* (1652); *Пац Кшыштаф Зыгмунт* (1690); Масальскі Міхал Юзаф (з 29.04.1727); Храптовіч К. (1752–?); князь Масальскі Юзаф (1754–?), гл. *Масальскія*; *Тызенгаўз Антоні* (1765–1780); Жэвускі Францішак (1780–1781); *Панятоўскі Станіслаў* (1781–1786); Храптовіч Караль (1786–1800); *Рагалевіч К.* (1920–1922); Рабакевіч Зыгмунт (1923–?); Дражанскі І. (1934–?); Валіцкі Тадэвуш (да верасня 1939). Дакументы

і матэрыялы Гродзенскага староства знаходзяцца ў Літоўскім дзяржаўным гістарычным архіве.

Крын. і літ.: Літоўскія метрыкі; А.С. Церковные торжества в гор. Гродне 13–15 октября 1934 года. – Варшава: Синодальная тип., 1934. – С. 13; Галубовіч В. Канфірмацыйны прывілей Гародні на магдэбургскае права 1633 г. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 269; Ластоўскі В. Кароткая энцыклапедыя старасвеччыны / Уклад. Я. Янушкевіч. – Мінск: Выдавец В. Хурсік, 2003. – С. 139–142; Малишевский Н. Бой за Гродно в сентябре 1939 года глазами участников и очевидцев. – Мн.: Издатель А.Н. Вараксин, 2012. – С. 116; Сліж Н. Магдэбургскае права ў Гародні ў канцы XV – першай палове XVI ст.: увядзенне і развіццё // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – с. 18, 39; Сліж Н. Статус Гародні ў XVI – першай палове XVII стст. / Rocznik Grodzieński. – 2012. – 4. – С. 37; Якубаў В. Удзел мяшчан і жыхароў Гарадзенскага павета ва ўзброеных канфліктах пачатку XVII ст. // Гарадзенскі соцыум. 2013. – Горадня, 2014. – С. 67; Цітоў А.К. Пячаткі старажытнай Беларусі: Нарысы сфрагістыкі / А.К. Цітоў. – Мн.: Полымя, 1993. – С.99; Jodkowski J. Cechy grodzieńskie w wiekach dawnych. – Grodno, 1926. – S. 35; Lietuvos Metrika. 6 (T. 225/6), 8 (T. 227/8), 11 (T. 230/11) книги судных дел; 7 книга публичных дел (T. 564/7); 11 книга записей (T. 11/11); Śliwiński J. Grodzieńszczyzna i Podlasie w XV – XVI wieku w Wielkim Księstwe Litewskim (wielkoksiążęce puszcze i włości, eksploatacja, pożary). – Olsztyn: Uniwersytet Warmińsko-Mazurski w Olsztynie, 2010. – S. 67, 150, 181, 194, 205; Sypuła-Gliwa J. Podróż na Wschód. – Łomianki, 2011. – S. 182; Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. II. Województwo Trockie XIV-XVIII wiek /Pod red A. Rachuby. – Warszawa: DiG, 2009. – S. 12–14.

Статут ВКЛ. На гродзенскім сейме Рэчы Паспалітай у 1522 г. "станы" (саслоўі) звярнуліся да гаспадара ВКЛ з просьбаю аб выданні пісьмовых законаў, і тады вялікі князь літоўскі з панамі-радай "права им прирекли дати и тыи вси члонки, как ея падданыя наши мають справовати и радити, казали есмо…выписати". Я. Л. Неміроўскі лічыць, што ў падрыхтоўцы Статута, як аўтар і друкар, мог удзельнічаць *Скарына Ф.* Верагодна, нешта не атрымалася, і падрыхтаваны да 1529 першы Статут так і застаўся да 1841 у рукапісах. Паводле прац І. Даніловіча ў Гродне захоўваўся рукапіс трэцяга Статута ВКЛ на польскай мове. Ён называў яго "калажанскім" паводле месца знаходжання. Гэты экзэмпляр патрапіў у бібліятэку Віленскага ўніверсітэта. Паводле сцверджанняў Даніловіча ў 1820-х гадах у *дамініканскім кляштары* захоўваліся тры экзэмпляры Статута. Два з іх былі надрукаваныя на польскай мове: адзін быў 1819 г. выдання, другі – 1623, з дадаткам матэрыялаў Трыбунала літоўскага. Трэці экзэмпляр быў на рускай мове. Ён не меў тытульнага ліста, але меў прывілей караля Жыгімонта III аб канфірмацыі Статута, герб Сапегі і эпіграму Рымшы, адозву канцлера да літоўскіх станаў, прывілей на друк па-латыні, рэестр раздзелаў і артыкулаў. За статутам з асобным тытулам знаходзіўся Трыбунал грамадзянам Вялікага Княства Літоўскага, дадзены на варшаўскім сейме, далей – карона, а пад ёю з левага боку – польскі арол, з правага – Пагоня, пад імі далей ішоў працяг тытула. Надрукаваны быў

у Вільні ў друкарні Мамонічаў у 1586 г. Жыхары Гродна, як і іншых беларускіх зямель, пасля далучэння да Расійскай імперыі жылі паводле Статута ВКЛ. На загад *Аляксандра I* ён быў у 1811 надрукаваны ў Вільні з друкаванага экзэмпляра 1786, а ў 1821 была зробленая праўка згодна з арыгіналам 1558. У 1828 Мікалай I зацвердзіў палажэнне Камітэта міністраў аб перакладзе на беларускую, польскую і рускую мовы, а ўказам ад 7.07.1840 дзейнасць Статута было скасаваная. Жыхары беларускіх зямель сталі кіравацца, як і расіяне, Поўным зборам законаў Расійскай імперыі.

Летам 1836 Дэпартамент дзяржаўных маёмасцяў даслаў у Гродзенскую *казённую палату* паведамленне, што атрымаў Статут, выдадзены ў 1619 г. Верагодна, яго даслалі з Гродна або з Гродзеншыны, бо пасля *паўстання 1830–31* было канфіскавана шмат хатніх і кляштарных бібліятэк.

Літ.: Данилович И. О литовском статуте // Журнал министерства народного просвещения. – 1838. – Ч. XVII. – № 2. – С. 375; Немировский Е.Л., Франциск Скорина. Жизнь и деятельность белорусского просветителя. – Минск: Мастац. Літ., 1990. – с. 414–415; Пичета В.И., Белоруссия и Литва XV – XVI вв. – М.: АН СССР, 1961. – С. 508; Швед. В.В. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гродна: ГрГУ, 2001. – С. 129–131; Daniłowicz I., Opisanie bibliograficzne dotąd wiadomych rękopisów i drukowanych egzemplarzy Statutu Litewskiego // Dziennik Wileński/ – 1823. – T. I. – S. 283–284; Kowkiel L. "Ratować zabytki przeszłości…": prywatne księgozbiory szlacheckie na Litwe i Białorusi w XIX wieku na straży tradycji // Szlachta i ziemiaństwo na pograniczach dawnej Rzeczypospolitej od XVI do początku XX wieku. – Warszawa: DiG, 2016. – S. 157.

Стачкі гродзенскіх рабочых, якія адбываліся ў расійскі перыяд гісторыі Гродна (гл. таксама "Рэвалюцыя 1905–07").

26.06–10.07.1898 адбылася, пад уплывам *Гродзенскага рабочага камітэта* і беластоцкай "Групы рабочых рэвалюцыянераў", стачка каля 250 рабочых-сталяроў. Яны патрабавалі 12-гадзіннага працоўнага дня з 2-гадзінным перапынкам, павелічэння зарплаты, нармальных кантактаў з боку гаспадароў. Удалося перамагчы.

28.09–10.10.1899 пад кіраўніцтвам *камітэтаў Бунда і Гродзенскага рабочага* стачкавалі каля 800 працаўніц папяроснага аддзялення тытунёвай фабрыкі *Шарашэўскага*. Яны патрабавалі ад гаспадара павышэння зарплаты, адмены штрафаў і "сістэмы плюсаў" (дадатковай бясплатнай працы). Дзякуючы падтрымцы гараджан (дэманстрацыя каля 1 тыс. чал.), фінансавай дапамозе "Саюза барацьбы за вызваленне рабочага класа" (300 руб.) спроба *губернатара* прымусіць працаўніц выйсці на працу аказалася марнай. Улады былі вымушаныя вызваліць каля 100 арыштаваных дэманстрантаў. Гаспадар часткова задаволіў патрабаванні папяросніц.

1 мая 1903 адбылася першая ў Гродне і адна з першых у Беларусі агульнагарадскіх палітычных стачак рабочых пад кіраўніцтвам *камітэтаў Бунда і Гродзенскага рабочага і ПСП у Літве*. Каля 300 рабочых сабраліся ў прыгарадным лесе (*Пышкі*) на сходы. Прагучалі прамовы пра неабходнасць рэвалюцыйнай барацьбы і салідарнасць пралетарыята, спявалі песні "Варшавянка",

“Працоўная Марсэльеза”. Адзін са сходаў перарос у 2-тысячную дэманстрацыю, якая прайшла каля сцен *турмы,* з патрабаваннем спыніць здзекі над палітычнымі вязнямі.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 372–374.

Струнін Аляксандр Пятровіч (1909, Чыта – 1993, Санкт-Пецярбург) – акцёр, театральный дзеяч. Заслужаны дзеяч мастацтва РСФСР (2.08.1960), драматург, галоўны рэжысёр Гродзенскага драматычнага тэатра.

Крыница: https://www.kino-teatr.ru/kino/acter/m/sov/29971/bio/

Студніцкая (Казлоўская-Гізберт-Студніцкая) Яніна (18.10.1890, Люблін – 1972, г. Шрэм) – архівіст, дырэктар гродзенскага *архіва* ў міжваенны час. Вучылася ў Пецярбургу, дапамагала кракаўскай акадэміі мастацтва ў пошуках у мясцовых архівах польскіх матэрыялаў па гісторыі і культуры. З 1914 г. жыла ў Вільні і працавала ў мясцовым архіве. У 1917 арыштоўвалася нямецкай уладай і сядзела некалькі месяцаў у *турме*. Са жніўня 1919 пачала працаваць у гродзенскім архіве (з 1.07.1924 па 20.12.1939 – дырэктар), якому аддала 20 гадоў жыцця. Упарадкавала архіўнае сховішча і ператварыла архіў у навуковы і культурны цэнтр (у 1923 тут захоўвалася 450 тыс. архіўных адзінак, у 1935 – 750 тыс.). Стварыла пры архіве навуковую бібліятэку, куды збіраліся кнігі па гісторыі Гродзеншчыны XIX – пач. XX ст. У 1935 г. зарганізавала мясцовы філіял *таварыства Польскага гістарычнага*, праз год – гродзенскую *бібліятэку гістарычную*. У 1936 С. выступіла экспертам Камісіі па ўдакладненні *герба горада*. У красавіку 1940 была арыштаваная савецкай уладай і сасланая на 6 гадоў у Сібір. Пасля *вайны Другой сусветнай* у 1946 вярнулася ў Люблін і працавала ў Курніцкай бібліятэцы. Апошнія 20 гадоў жыцця хварэла і была прыкаваная да ложка. Пахаваная на могілках г. Курніка Пазнаньскага ваяводства. Л. Саванеўскі назваў С. “другой *Элізай Ажэшкай”*, а створаны ёю архіў – “крэпасцю польскіх справаў, польскіх дакументаў, польскай прэсы і кніжак”.

Творы: Kozłowska-Studnicka J. Likwidacja Uniwersytetu Wileńskiego w świetle korespondencji urzędowej // Księga pamiątkowa Uniwersytetu Wileńskiego. – Wilno: Uniwersytet, 1929. – s. 405–419.

Літ.: Павач А. Гродзенскія гісторыі. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2019. – С. 101–103; Черепица В. Эпистолярное наследие Янины Козловской-Студницкой как исторический источник // Magazyn Polski. – 2010. – N 1–2. – S. 92–97; Milewski J. J. Janina Kozłowska-Studnicka – kierownik Archiwum Państwowego w Grodnie w okresie międzywojennym // Białostoccyzna. – 1998. – N1. – S. 41–42; Naumowicz-Panasiuk W. Dyrektor Archiwum Państwowego w Grodnie w latach 1922–1939 // Magazyn Polski. – 2010. – N 1–2. – S. 91; Sawoniewski L. Saga o Grodnie. – Łódź, Białystok, 1999. – S. 41–42.

Стэмпнеўскі Эдуард Гіпалітавіч (13.10.1879, маёнтак Санцыгнаў, побач з Пінчавам Люблінскага ваяводства – 05.06.1944, канцлагер Штутгаф) – аптэкар, прэзідэнт Гродна. У 1895 г., пасля заканчэння прагімназіі ў Пінчаве,

стаў вучнем аптэкара, у 1899 здаў экзамены пры ўн-це Варшаўскім і атрымаў ступень памочніка аптэкара. На гэтай пасадзе працаваў у аптэках Любліна, Згежа і Варшавы. Скончыў Варшаўскі ўніверсітэт, фармацэўтычны факультэт (1902–1904). У чэрвені 1905 прыехаў у Гродна. З 27.09.1905 па 1914 г. трымаў у арэндзе былую езуіцкую (Фарную*) аптэку*. За 10 гадоў яна павялічыла колькасць выдадзеных паводле рэцэпту лекаў. Атрымаў прызнанне за філантрапічную дзейнасць. Адзін з ініцыятараў і заснавальнікаў *таварыства аматараў драматычнага і музычнага мастацтва "Муза"* (1907). Пасля смерці Э. *Ажэшкі* кіраваў працай яе драматычнай секцыі, сам часам выступаў як артыст-аматар. Удзельнік *вайны Першай сусветнай*, ваяваў на Каўказе (малодшы сяржант 7-га самастойнага арт. дывізіёна). Вярнуўся у Гродна ў 1919 г. і актыўна ўключыўся ў палітычнае жыццё горада: удзельнічаў 11–12.06.1919 у Гродзенскім *сеймiку* (зрабіў ваенную прапанову), быў кандыдытам у паслы ў Варшаўскі сейм ад Гродна, старшынёю Федэрацыі Польскіх Саюзаў абаронцаў Айчыны. Па словах Мыдляжа, "дзейны", "адзін з нямногіх актыўных людзей, палітычна і грамадска (…). Палітычна блізкі да левых (…). Чалавек права і сумленны (…). У кожным разе адзін з найвыбітнейшых і актыўных людзей у Гродне". З 1921 – намеснік старасты Гродзенскага павета. Рэдактар газеты "Echo Grodzieńskie" ("Гродзенскае рэха"). З 17.07.1922 па 1927 г. быў *прэзідэнтам Гродна*. На гэтай пасадзе шмат увагі прысвячаў адбудове горада, яго гаспадарцы, пад'ёму здароўя і асветы, аднавіў дзейнасць таварыства "Муза", падтрымаў стварэнне *музея гістарычнага* і *музея прыроды*, працягваў займацца фармакалогіяй, адкрыў пры аптэцы вытворчасць газаванай вады. У 1934–1939 быў сябрам фракцыі грамадскага клуба Гродзенскай *гарадской рады* і некалькі разоў абіраўся намеснікам старшыні Рады. Сябра Гродзенскай акруговай арганізацыі "Лагера нацыянальнага аб'яднання" (на 1937), старшыня павятовага праўлення Лігі паветранай абароны дзяржавы. У 1939 прызваны ў польскую армію, затым быў інтэрнаваны на тэрыторыі Літвы савецкімі войскамі. С. удалося збегчы і схавацца ад савецкіх і нямецкіх уладаў у Літве. На пачатку 1944 г. вярнуўся ў Гродна і працаваў у аптэцы, дапамагаў Арміі Краёвай. 21.03.1944 быў за гэта арыштаваны і 1,5 месяца сядзеў у *турме*. 9.05 быў вывезены ў канцлагер Штутгаф (нумар вязня 34519), дзе пасля 10 дзён памёр.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 239–240; Ignatowicz F., Aptekarz i prezydent Grodna. Do 130-lecia Edwarda Stępniewskiego // "Głos znad Niemna", 30.10.2009, s. 14; L. Sawoniewski, Saga o Grodnie. Łódź, Białystok, 1999, s. 49; Słownik biograficzny lekarzy i farmaceutów – ofiar drugiej wojny światowej. T. 3. – Wrocław 2003, s. 341; O niepodległą i granice. T. 7. Raporty Straży Kresowej 1919–1920 Ziem Północno-Wschodnich opisane / Wstęp, wybór i opracowanie J. Gierowska-Kałłaur. – Warszawa, Pułtusk, 2001, s. 262–263.

Стэфан Баторы, венг. Istvan Bathory, польск. Stefan Batory (27.11.1533, Шомліё, Румынія – 12.12.1586, Гродна) – кароль польскі (1576–1586), вялікі С. 891

князь літоўскі (1579–1586): “Rex Polonae, Magnus dux Lituaniae”. Паходзіў са старажытнага венгерскага роду Баторыяў Шомле. З 15 гадоў знаходзіўся на вайсковай службе ў венгерскага і чэшскага караля Фердынанда, разам з ім быў у Італіі, дзе наведваў Падуанскі ўніверсітэт. Пазней, калі быў на службе ў князя Трансільваніі Яна Жыгімонта Заполі, трапіў у палон да немцаў на тры гады (у гэты час займаўся навукамі, чытаннем кніг, асабліва рымскіх гісторыкаў). У 1551, пасля таго, як Генрых Валуа збег з Польшчы, з дапамогай магнатаў Збароўскіх С. Б. выставіў сваю кандыдатуру на польскі прастол. 12.01.1575 быў абраны і ў сакавіку 1576 каранаваўся ў Кракаве. Вялікім князем Літоўскім стаў толькі тады, калі спецыяльнай граматай ад 29.07.1579 прызнаў, што Польшча і ВКЛ з’яўляюцца дзвюма раўнапраўнымі дзяржавамі ў складзе канфедэрацыі Рэчы Паспалітай, абавязаўся захаваць самастойнасць ВКЛ, пашыраць яе межы, агульныя сеймы склікаць па чарзе, як у Кароне (Польшчы), так і ў Літве (ВКЛ), вайсковымі кіраўнікамі ў ВКЛ не прызначаць палякаў.

З моманту вырашэння праблем Інфлянт і вяртаннем С. Б. у Гродна 1.06.1582 горад стаў месцам яго пражывання і прыватнай сталіцай, а не часовых прыпынкаў (першы раз у 1579). Пра гэта гавораць карты перамяшчэнняў С. Б., складзеныя польскім даследчыкам М. Врэдэ. С. Б. пачаў перабудоўваць *Стары замак*. Яму падабалася Гродна, ён быў тут не менеў за 11 разоў. На тое былі наступныя прычыны: геапалітычнае знаходжанне горада (бліжэй да маскоўскай тэрыторыі і Інфлянт, Вільні і Варшавы); складаныя адносіны з жонкай Ганнай (нашмат гадоў старэйшай за мужа), якая хацела кіраваць Баторыем, а ён – краінай; спробы сейма кантраляваць караля і пакінуць яго без фінансавых паступленняў (а ў Гродне знаходзіўся цэнтр каралеўскай эканоміі); вакол Гродна былі каралеўскія пушчы, дзе С. Б. мог паляваць і такім чынам забяспечваць двор мясам; па чутках ён меў каханку ў Непаламіцах (жонку ці дачку старасты каралеўскага замка). Некаторыя даследчыкі пішуць, што самазванец Ілжэдзмітры I быў сынам С. Б. і дачкі ляснічага. Пішуць таксама пра няшлюбнага сына па прозвішчы Князёўскі ці Князёўскі, які меў у Гродне сваю аселую маёмасць.

С. Б. прымаў у Гродне паслоў расійскага цара Івана IV Жахлівага (1581), пасла англійскай каралевы Елізаветы I Герберта (1584), праводзіў дзяржаўную нараду ў *доме Каралеўскім* (1582), вырашаў справу жыхароў Рыгі, якія не прынялі грыгарыянскі каляндар і справу Гданьска. У 1576 С. Б. пацвердзіў усе ранейшыя прывілеі, падараваныя Гродну вялікімі князямі літоўскімі. Мяшчанам горада былі дадзеныя выключныя правы на продаж солі, якая прывозілася з Гданьска і Караляўца (цяпер Калінінград). С. Б. выказаў ідэю стварэння *калегіі езуіцкай* у Гродне. У 1581 *царкве Прачысценскай* даў прывілей на атрыманне штогод 10 коп. (адзінка меры ў ВКЛ, роўная 60 асобнікам аднародных аб’ектаў) грошаў літоўскіх з гарадскіх даходаў. Падтрымоўваў, як бачым, не толькі касцёлы, але і цэрквы, дазволіў свайму архітэктару збудаваць *сінагогу*.

З ліста Л. Сапегі да Караля Радзівіла можна даведацца пра апошнія дні С. Б. 7.12.1586 з нядзелі на панядзелак каля 23.00 ён, вяртаючыся з каморкі

ў пакой, упаў, моцна пабіў лоб, правае вока і нос, на правым калене была рана як ад шаблі. У панядзелак (07.12) – сераду (09.12) да яго нікога не пускалі, акрамя біскупа В. Бараноўскага. У чацвер (10.12) вечарам вял. князя літ. і польскага караля пабачыў Сапега, вечарам у пятніцу (11.12) яго бачылі ў вялікім вуглавым пакоі. Лекары сказалі, што надзеі на выздараўленне няма, але шатны караля Ф. Вяселін не дазволіў біскупу яго паспавядаць, а перанёс гэта на заўтра (12.12). Тады ж перад 5 гадзінай дня С. Б. памёр.

Каб даведацца пра прычыну смерці, у *Замкавым двары* (“*Бацараўка*”) зрабілі *анатаміраванне*. С. Б. завяшчаў пахаваць сябе ў Гродне і пра гэта казаў правінцыялу езуітаў, айцу Кампана, бо “гэтае месца яму і для часовага жылля і для вечнага адпачынку наймільшае”. Паводле тастаменту горад атрымаў ад караля 30 тыс. фларынаў (=30 тыс. злотых), што ў пераліку на сучасную валюту складае 6 мільёнаў долараў.

У 1930 г. у Гродне ў серыі “*Историческая библиотека г. Гродно”* выйшла кніга Т. Янкоўскага “Śmierć Stefana Batorego w Grodnie” (“Смерць Стэфана Баторыя ў Гродне”). У 1933 на сцяне школы № 2 па вул. Пілсудскага/Леніна, 4 (корпус гуманітарнага каледжа), адчынілі мемарыяльную дошку памяці С. Б. Тады ж з’явілася дошка і на сцяне *замка Новага* ў прысутнасці кіраўніцтва краіны, ваяводства і горада. Цэнтральная плошча Гродна (цяпер Савецкая) атрымала назву С. Б. 12.12.1938 у ганаровых абставінах з *Замкавай гары* была ўзятая зямля пад фундамент помніка С. Б., які будаваўся ў Будапешце. У 1991 г. імем С. Б. была названая адна з вуліц Гродна.

Літ.: Грыцкевіч А. Старонкі нашай мінуўшчыны. – Мінск: Кнігазбор, 2009. – С. 144–151; Марозава С. Стэфан Баторы і Гродна // Rocznik Grodzieński. – 2008. – № 2. – S. 183–190; Марозава С. Стэфан Баторы і Гродна // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: “Гродзенская друкарня”, 2011. – С. 110–124; Павач А. Гродзенскія гісторыі. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2019. – С. 9–14; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 177; Archiwum domu Radziwiłłów. – Kraków, 1895. – S. 184–185 (ліст Л. Сапегі); Jasienica P. Ostatnia z rodu. – Warszawa: Prószyński Media Sp. Z o.o., 2009. – s. 232–233, 247; Niemcewicz J. U., Podróże historyczne po ziemiach polskich od 1811 do 1828 roku. Wyd. 2. – Petersburg, 1859. – S. 262–265 (ліст пра смерць караля і в.к.л.); E. Bojtar. Gaspar Bekiesz i jego “nagrobek”. Zagadki i nieporozumienia // Akcent. – 1992. – N 2–3(48–49). – C.174; Plebanowicz J. Król Stefan Batory i Grodno // Magazyn Polski. – 2017. – N 1 (133). – S. 12–15; Wrede, M. Ku nowemu centrum Rzeczypospolitej. Stolice króla Stefana Batorego / M. Wrede // Rocznik warszawski. – XXXIV. – 2006. – S. 24–33.

Суд акруговы, існаваў у расійскі і міжваенны час. У Гродне знаходзіўся ў спецыяльным будынку, пабудаваным архітэктарам Небальсіным у 1884 г., часткова на месцы, дзе стаяў *палац* Масальскага (зараз вул. Савецкая, 31). Двухпавярховы будынак у 1910 стаў часткова трохпавярховым. У 1989 быў рэстаўраваны паводле праекта С. Штэйна. Пад значнай часткай будынка знаходзяцца крыжовыя скляпенні 18 ст. Там, дзе цяпер крама – сутарэнні палаца Масальскіх, а дзе кавярні – былыя склады і гаспадарчыя пакоі акруговага суда. У С. а. адбываліся палітычныя суды: над беларускімі партызанамі

“працэс 72-х” (04.1925); над чальцамі КПЗБ Косаўскага пав. Палескага ваяводства “працэс 75-ці” (9–21.06.1929).

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: “Гарадзенская бібліятэка”, 2012. – С. 301; Госцеў А.П., Швед В.В. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990). – Гродна: НВК “Пергамент”, 1993. – С. 84, 86; Клейн Б.С. Взгляд из прошлого: ист.-докум. очерки / Б.С. Клейн. – Минск,1989.

Суд бурмістраўска-радзецкі – мясцовы суд для гараджан часоў ВКЛ. У склад суда ўваходзілі гарадскія бурмістры і радцы, колькасць якіх залежала ад колькасці гараджан. Разглядаліся цяжбы рамеснікаў і купцоў, розныя правапарушэнні мяшчан.

Літ.: Т. Доўнар. Бурмістраўска-радзецкі суд // Вялікае княства Літоўскае. Энцыклапедыя. Т. 1. – Мн.: БелЭн, с. 356.

Суд гродскі – замкавы суд, або павятовы суд для простых людзей і шляхты ў ВКЛ.

Сулеўскі Мікалай (?, маёнтак Грандзічы – 1943, Гродна) – выпускнік 1 кадэцкага корпуса ў Пецярбургу, удзельнік *вайны руска-японскай* і *вайны Першай сусветнай* (камандзір артылерыйскага дывізіёна). Прыняты ў Войска Польскае 08.09.1917. Дэкрэтам польскага вышэйшага камандавання ў Варшаве ад 12.12.1918 прызначаны камандзірам *Самаабароны Гродзенскай зямлі* і ўсіх іншых польскіх вайсковых атрадаў і міліцыі на Гродзеншчыне. Яму было дадзенае права прадстаўніцтва польскіх вайсковых інтарэсаў на Гродзеншчыне з правам прызначэння на сваёй тэрыторыі афіцэраў і падафіцэраў. 18.12.1918 у *касцёле Св. Францішка Ксаверыя*/Фарным С. прынёс урачыстую прысягу на вернасць Рэчы Паспалітай.

Літ.: Чарнякевіч А. Памяць пра Гродна…, с. 241; Dobroński A. Cz. Stan sanitarny Grodna w latach dwudziestych XX w. // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары: партрэт на фоне эпохі. X-XX стст.: зборнік навуковых артыкулаў / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 291; A. Czerniakiewicz, Przejmowanie władzy przez Polaków w Grodnie (koniec 1918 – kwiecień 1919) // Początki niepodległości. Lomża-Białystok-Grodno-Suwałki 1918–1919. – Białystok 1998, s. 44.

Сулістроўскі Казімір (1885–1955) – часовы кіраўнік гміны Гродна пасля *О’Брыена дэ Лясы* ў 1933–1934 (фактычна выконваў абавязкі прэзідэнта). Паходзіў з сям’і варшаўскага прамыслоўца Казіміра Сулістроўскага і Тэклі з Порай-Жэзніцкіх. З 1934 быў прэзідэнтам Каліша.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 241–242.

Сухадольскі Януар Янавіч (19.09.1797, Гродна – 20.03.1875, Бойме каля Седлеца) – жывапісец-баталіст. Вучыўся архітэктуры ў корпусе кадэтаў Школы

элементарнай артылерыі і інжынерыі Княства Варшаўскага. Ужо ў 1825 атрымаў залаты медаль за карціны "Узяцце штандара Магамета пад Венай" і "Смерць Уладзіслава пад Варнай". Удзельнік *паўстання 1830–1831*. Пасля яго паражэння эміграваў. У Рыме браў урокі жывапісу ў баталіста Шарля Вернэ (1832–1837). Напісаў некалькі карцін аб напалеонаўскіх паходах. Вярнуўшыся на радзіму, прыехаў у Гродна, дзе жылі яго жонка і дзеці. У 1839 атрымаў запрашэнне ад Мікалая I прыехаць у Пецярбург для напісання некалькіх карцін пра *вайну 1812 г.* Атрымаў тытул сябра расійскай Акадэміі Мастацтва.

Аўтар карцін: "Узяцце Ачакава" (1853). "Бітва пад Самасьера" (1860), "Пераход арміі Напалеона праз Бярэзіну" (1866). Напісаў шэраг карцін на тэмы руска-іранскай (1826–1828) і руска-турэцкай войн. "Узяцце рускімі войскамі крэпасці Карс", "Перамога пад Ялдавай", "Штурм крэпасці Ахалцых". У Гомельскім музеі знаходзіцца шэраг карцін, якія адлюстроўваюць удзел І. Ф. Паскевіча ў гэтых войнах. У творчай спадчыне С. ёсць таксама жанравыя палотны і пейзажы.

Літ.: Kuczman K., Suchodolski January // Słownik biograficzny historii Polski. T. 2 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C. 1481.

Сухамбаеў Агадзіл (1923, аул Карасу Свярдлоўскага р-на Джамбульскай вобл. – 31.07.1944) – удзельнік вызвалення Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У Чырвонай Арміі з кастрычніка 1941. Удзельнічаў у абароне Масквы, вызваленні Смаленска. Загінуў у баі ў в. Стральцоўшчына на тэрыторыі Летувы. Пахаваны ў Друскеніках. У Гродне яго імем названая вуліца і ўсталяваная мемарыяльная дошка на будынку каледжа (былое СПТУ-74).

Сцыпіён дэль Кампа – шляхецкі род уласнага герба, які паходзіў ад неапалітанца Пятра Сцыпіёна, двараніна каралевы *Боны*. Назавем тых, хто звязаны з Гродна. Каля 1578 тут нарадзіўся Крыштаф, сын Францішка. У 1596 ён уступіў у ордэн бернардзінцаў. Пасля вучобы ў Віленскай акадэміі, Рыме і Саламанцы выкладаў у школе бернардзінскага кляштара ў Кракаве. Уваходзіў у склад кіраўніцтва ордэна ў Рэчы Паспалітай. У 1611–14, 1620–23, 1640–45 кіраваў польскай правінцыяй бернардзінцаў (ахоплівала ўсю Рэч Паспалітую). На гродзенскіх *каталіцкіх могілках*, сектар Н 092, пахаваныя браты Ян і Адам С. д. К., якія пабудавалі ў 1621 *касцёл і кляштар бернардзінак*. Жонкай гродзенскага *губернатара* Друцкага-Любецкага К. Ф. з 1807 была графіня Марыя С. д. К. Яна пахаваная на тых жа могілках побач з Адамам і Янам. Там жа пахаваны Міхал С. д. К. (магчыма брат Марыі) і Вікторыя.

Літ.: Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя. Т. 2. – Мінск: БелЭн, 2006. – С. 647; Nowe życie. – 1919. – 13.04. – №17. – S. 130.

Сцяг Гродна. У старажытнасці Гродна, як і іншыя гарады, не меў сцяга (харугвы). Яны былі ў рамесных *цэхах* – аб'яднаннях рамеснікаў адной ці некалькіх сумежных прафесій. Існавалі ваяводскія і павятовыя харугвы. *Горадня* уваходзіла ў Троцкае ваяводства, харугва якога была "масці лазуровай" і мела

С. 892

Пагоню, размешчаную ў чырвоным полі. Тыя ж колеры і Пагоню мела харугва Гродзенскага павета.

У савецкі час упершыню сцяг горада быў зацверджаны ў 1940 г. Другі ўзор сцяга быў прыняты ў 1944, а трэці – ў 1977. Апошні выглядаў наступным чынам: двухбаковае аксамітнае палотнішча памерам 160х130 см, абшытае па баках макрамой і прымацаваным да дрэўца навершам, ў аснове якога залацісты кутас. На правым баку палотнішча залацістым шоўкам вышыты партрэт Леніна і лозунг – "Под знаменем марксизма-ленинизма, под руководством Коммунистической партии – вперёд к победе коммунизма!". На другім баку палотнішча вышыты герб СССР, над якім подпіс: "Пролетарии всех стран, соединяйтесь!". Менавіта на гэты сцяг прымацавалі ў 1978 узнагароду Гродна – ордэн Чырвонага Працоўнага Сцяга.

У маі 1997 г. сесія гарадскога Савета дэпутатаў прыняла рашэнне аб распрацоўцы праекта чацвёртага ўзору сцяга горада. Гарадскі выканаўчы камітэт даручыў выкананне праекта ўзору кандыдату гістарычных навук, дацэнту Гродзенскага ўніверсітэта *Шведу В. В.* Распрацоўваючы ўзор сцяга Гродна, ён сыходзіў з правілаў сцягаўтварэння: колер харугвы супадае афарбоўкай з полем герба, на ёй малюецца толькі выява галоўнай эмблемы без шчыта, а яго ролю выконвае сама харугва. А таму быў прапанаваны сцяг Гродна лазурковага (блакітнага) колеру і на ім вышыты залаты алень Святога Губерта, які пераскоквае праз агароджу. 25 верасня 1997 г. сесія гарадскога савета адзінагалосна зацвердзіла дадзены праект сцяга Гродна. Пазней ён быў зроблены на тэатральнай фабрыцы ў Мінску.

Літ.: Гродна: гісторыя, сімвалы, знакі, асобы / склад. Я.М. Жабрун. – Гродна: "RISE", 1996; Гродназнаўства: дапаможнік па курсе "Краязнаўства" для студэнтаў гуманіт. спецыяльнасцяў / пад агульн. рэд. В.В. Шведа, В.Р. Карнялюка. – Гродна: ГрДУ, 2009; Гродно: ист. очерк / под ред. З.Ю. Копысского, Б.М. Фиха. – изд. 2-е – Минск: Беларусь, 1964.

Сяменаў Уладзімір Міхайлавіч (1936–2008) – першы сакратар Гродзенскага абкама КПБ (1990). Працоўную дзейнасць пачаў у 1959 г. пасля заканчэння Беларускага палітэхнічнага інстытута. Працаваў інжынерам-канструктарам аддзела галоўнага канструктара Мінскага трактарнага завода, затым – намеснікам сакратара камітэта камсамола. Скончыў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС і з 1964 знаходзіўся на партыйнай працы: загадчык прамыслова-транспартнага аддзела, другі, затым першы сакратар Завадскога раённага камітэта КПБ г. Мінска. Першы сакратар Гродзенскага гарадскога камітэта КПБ (1972–1989). Народны дэпутат СССР (1989). На ўстаноўчым з'ездзе Партыі камуністаў Беларусі (снежань 1991) С. быў выбраны сустаршынёй Палітычнага выканаўчага камітэта.

Крыніцы і літаратура: https://src-h.slav.hokudai.ac.jp/belregions/data/16.html. Доступ 08.01.2022.

Т

Таварыства аматараў Гродна, заснаванае ў горадзе ў 1923–24 гг. У НГАБ у Гродне захаваўся яго Статут, дзе мэтай дзейнасці пазначанае пашырэнне звестак аб Гродне і дапамога яго культурнаму развіццю. Прадметам працы ТАГ былі: апека над помнікамі гісторыі і культуры; культурнае развіццё Гродна і ваколіц; кантакты ў гэтых напрамках з мясцовай уладай; арганізацыя лекцыяў на сходах ТАГ і публічных пра гісторыю і сучасны стан Гродна, ваколіц і іх жыхароў; падтрымка выдавецтваў і стварэнне асабістага для публікацыі даведнікаў ды інш. літаратуры пра Гродна. Сябрамі праўлення ТАГ у 1924 сталі: кіраўнік жаночай гімназіі (1922), рэдактар газеты "Dziennik Kresowy" Ян Гжэндзельскі, лекар Самуэль Хазан, інжынер Вітольд Выганоўскі, Юзаф Ліберацкі, падпалкоўнік Маўрыцы Дарашкевіч. Адным з першых праектаў ТАГ было стварэнне сквера на плошчы *Стэфана Баторыя*. ТАГ цяпер існуюць у Вільні, Варшаве. Складаюцца з былых жыхароў Гродна і ваколіц, а таксама аматараў гісторыі "усходніх Крэсаў".

Крын. і літ.: ДАГВ, ф. 46, воп. 1, с. 188, а. 20–32; А Чарнякевіч. Памяць пра Гродна. Матэрыялы для біяграфічнага слоўніка постацей міжвеннага горада. 1919–1939 гг. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015. – С. 83, 74, 260.

Таварыства беларускай школы, створанае ў 1921 г. як легальная культурна-асветніцкая арганізацыя працоўных Зах. Беларусі. У Гродне з'явілася ў 1926 (сядзіба знаходзілася ў будынку *гатэля "Швейцарыя*"). Першым старшынёй Гродзенскага часовага акруговага камітэта ТБШ стаў настаўнік, старшыня павятовага камітэта *Грамады Беларускай сацыял-дэмакратычнай Іосіф Баліцкі*. У сярэдзіне 1927 камітэт меў ужо сталую пасаду інструктара, бібліятэку, драматычны гурток. Да лютага 1928 у Гродне і Гродзенскім пав. дзейнічала 58 гурткоў, у якіх было каля 2 тыс. чальцоў. ТБШ вяло барацьбу за адкрыццё беларускіх школ, дэмакратызацыю адукацыйнага працэсу, выдавала беларускія кнігі і падручнікі, арганізоўвала чытальні, бібліятэкі, музычна-драматычныя і харавыя калектывы. Адбылася вечарына памяці *Максіма Багдановіча*. Пасля выдання аднадзёнкі "Пералом" (2 тыс. асобнікаў) у 1929 гарадзенская акруговая управа ТБШ была зліквідаваная польскаю ўладаю: стараста загадаў паліцыі канфіскаваць наклад і арыштаваць аўтараў выдання – Н. Ламашэвіча, І. Баліцкага і інш.

С. 893

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник, Минск, 1988, с. 390; Чарнякевіч А. Постаці беларускага нацыянальнага руху ў Гродне 1909–1939: біграфічны даведнік.

– Мінск, 2003. – С. 26–27; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 99–100, 104.



С. 894

Таварыства біблейскае расійскае. Складалася з цэнтральнага камітэта ў Пецярбургу, мясцовых аддзяленняў (звычайна ў губернскіх гарадах), камітэтаў і сутаварыстваў. Восенню 1816 г. у Гродзенскую губ. з мэтаю "падтрымаць планы і намеры таварыства" прыязджаў агент Брытанскага біблейскага таварыства П. Пінкертон. Яго намаганні падхапіў *Ляхніцкі Ігнацы Эмануэль*. Ёсць сведчанне, што ў лістападзе 1816 Гродзенскае аддзяленне біблейскага таварыства ўжо існавала, і *губернатар* аддаў загад аб распаўсюджванні па паветах Кнігі для спісаў сябраў таварыства. Аднак , калі ў студзені 1828 Гродзенскае *губернскае праўленне* даручыла свайму дарадцу Марціну Явароўскаму і пісару гродзенскага гарадавога *магістрата* Антонію Жышкевічу сабраць матэрыялы аб Гродзенскім біблейскім таварыстве, дык яны ўказалі іншую дату яго заснавання – 1817 г. Мелася на ўвазе арганізацыя камітэта – кіроўнага органа Гродзенскага таварыства. Дакладна вядома, што 16.04.1817 гродзенскі губернатар С. Ф. Урсын-Нямцэвіч лістом далажыў А. М. Галіцыну аб стварэнні Гродзенскага камітэта Расійскага біблейскага таварыства, за што атрымаў ад таго падзяку. У гэты час сябрамі яго былі: губернатар С. Ф. Урсын-Нямцэвіч, віцэ-губернатар *М. Т. Бутаўт-Андрайковіч*, *прэзідэнт* Гродна Ф. Мучынскі, былы прэзідэнт горада *К. Крэйбіх*, старшыня першага дэпартамента Л. Сухадольскі, паліцмайстар Высочын, дарадца М. Нечвалодаў, К. Марачэўскі, А. Сульвестровіч, С. Гоўвальд, І. Храптовіч, *І. Э. Ляхніцкі*, *Я. Румель* і іншыя (у асноўным пералічаныя толькі тыя, хто ўнёс самыя значныя ўступныя ўзносы). 12 сакавіка 1820 адбыліся апошнія выбары ў Гродзенскі камітэт. Яго сябрамі сталі: гродзенскі губернатар М. Андрайковіч (віцэ-прэзідэнт), Сухадольскі (дырэктар), дарадцы Нечвалодаў, Маліноўскі, Крыдзель, паліцмайстар Высочын, губернскі казначэй Фамінскі, тытулярны дарадца М. Вітаноўскі (сакратар), калежскі сакратар Ю. Нелюбовіч (касір). Агульная колькасць сябраў Гродзенскага біблейскага таварыства: 61 чал. па Гродзенскім у., 16 – па Пружанскім, 4 – па Ваўкавыскім і ніводнага па Навагрудскім. У архіўных справах захаваўся праект Статута аддзялення Расійскага біблейскага таварыства, адпаведна з якім дзейнічала і Гродзенскае аддзяленне. Яно павіннае было "дапамагаць Расійскаму біблейскаму таварыству ў яго справе, гэта значыць у імкненні прыводзіць у большае карыстанне Біблію або кнігі Святога пісання (Старога і Новага запавета), без якіх-небудзь тлумачэнняў і каментароў". З Пецярбурга для камітэта Гродзенскага біблейскага таварыства была дастаўленая пячатка для пакетаў, лістоў, пасылак. У цэнтры яе была выява Бібліі, вакол – сонечныя прамені, па коле – надпіс "пячатка ... расійскага біблейскага таварыства". Карэспандэнцыя, завераная такой пячаткаю лічылася казённай і прымалася на пошце бясплатна.

Сувязь з Пецярбургам Гродзенскае аддзяленне біблейскага таварыства падтрымлівала пастаянна. Адтуль прысылалася патрэбная колькасць Бібліяў і розная рэлігійная літаратура. Так ужо пры стварэнні бібліятэка Гродзенскага

таварыства атрымала Біблію на 9 мовах, Новы запавет на 18 мовах, нават Евангелле на калмыцкай мове. З 1817 па 1824 з Пецярбурга прыслалі ў Гродна 253 кнігі на розных мовах (славянскай, нямецкай, французскай, польскай і іншых). Толькі не было сярод іх літаратуры на беларускай мове, хаця ў мэтах біблейскага таварыства было распаўсюджванне Бібліі на "родных мовах" насельніцтва. Дзейнасць гродзенцаў курыраваў сябра Пецярбургскага камітэта А. Тургенеў. Для сваёй дзейнасці сябры таварыства збіралі ўзносы. За 1817–1820 гг. у касу гродзенскага камітэта паступіла грашовых ахвяраванняў на суму 1 чырвонец 4 рублі 50 капеек серабром і 1244 рублі асігнацый. Акрамя таго было атрымана ад продажу кніг 226 руб. 50 кап. асігнацый. З гэтых сум 1000 руб. выслалі ў Пецярбург, а 74 руб. 92 3/4 кап. патрацілі на свае патрэбы.

У дзейнасці Гродзенскага аддзялення біблейскага таварыства адчуваўся значны польскі ўплыў: большасць сябраў былі палякамі, дакументацыя (спісы, ведамасці аб прыходзе і расходзе рэлігійных кніг, кніга аб паступленні і выдатках грошай і іншыя) вялася на польскай мове; большасць прысыланых Біблій была на польскай мове. Распаўсюджванне яе суправаджалася адкрыццём народных школ, у якіх вучылі чытаць Біблію і малітоўнікі на польскай мове. Створанае Варшаўскае (Польскае) біблейскае таварыства падтрымлівала шчыльныя кантакты з Гродзенскім камітэтам.

Гісторыя Расійскага біблейскага таварыства аказалася даволі кароткай. 27 ліпеня 1826 г. выйшаў імянны ўказ на імя мітрапаліта Серафіма аб яго закрыцці. Працы ж таварыства спыніліся яшчэ раней – да канца 1824. У рэскрыпце імператара Мікалая I аб спыненні дзейнасці Расійскага біблейскага таварыства ад 24.04.1826 загадвалася правесці інвентарызацыю рухомай і нерухомай маёмасці таварыства, а таксама яго наяўных капіталаў. Кнігі Святога пісання дазвалялася "працягваць прадаваць ахвотным па вызначаных коштах". Гродзенскае таварыства атрымала копію вышэйназванага рэскрыпта і таксама спыніла сваю дзейнасць. Наяўныя грошы ў суме 1 чырвонца 8 рублёў 40 капеек серабром і 664 рублёў 67 капеек былі здадзеныя архіепіскапу Мінскаму і Літоўскаму Анатолію, кнігі – у гродзенскі *Сафійскі сабор* В. Папову, справы – у губернскае праўленне.

Крын. і літ.: Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 251–252; НГА РБ у Гродне, ф. 1193, воп. 1, с. 1–4, 6, 7; Орловский Е.Ф. Судьбы православия в связи с историей латинства и унии в Гродненской губернии в XIX в. (1794 – 1900). // Гродненские епархиальные ведомости. – 1901. – №7. – С. 55; Швед В.В. Гродзенскія масонскія ложы (канец XVIII – пачатак XIX ст.). // Гарадзенскія запісы. Старонкі гісторыі і культуры. Вып. 3. – Гародня, 1997. – С. 71–72.

Таварыства "Веды" – гродзенская абласная арганізацыйная структура рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання "Беларускае таварыства "Веды". Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі некамерцыйнай арганізацыі было выдадзенае Гродзенскім абласным выканаўчым камітэтам 28.03.2014 г. УНП 500043726. З 1947 грамадская асветная арганізацыя існавала ў складзе

С. 894

Усесаюзнага таварыства "Веды" і займалася распаўсюджваннем палітычных і навукова-асветных ведаў сярод насельніцтва. З 26.01.2018 старшынёй абласной арганізацыйнай структуры была выбраная рэктар Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта І. Кітурка.

Крын. і літ.: https://www.region.grodno.by/ru/znanije-ru/; https://volkovysk.grodno-region.by/by/region-news-by/view/rektar-grdu-imja-janki-kupaly-iryna-kiturka-uznachalila-ablasnuju-strukturu-belaruskaga-tavarystva-vedy–10254–2018/. Доступ 11.01.2022.

Таварыства дабрачыннае Расійскае, гродзенскае аддзяленне. Створанае восенню 1925 г. Сярод арганізатараў былі: былы памешчык і домаўладальнік А. В. Малашка, былы палкоўнік царскай арміі Б. К. фон Гагман, адвакат А. А. Байрашэўскі, М. М. Седлярэвіч. Налічвала ў першы год каля 180 сябраў. Бюро таварыства размяшчалася ў памяшканні архіерэйскага дома (цяпер вул. Горкага, д. 2; гл. *Палац адміністратара*). Узначаліў доктар медыцыны Васіль Васільевіч Кошалеў (21.12.1856 – восень 1925, Гродна). Статут прадугледжваў культурна-асветніцкія, камерцыйныя і дабрачынныя мэты: адкрыццё кааператываў, школ, дзіцячых дамоў, збор сродкаў на гэтыя мэты сярод рускага насельніцтва Польшчы. Пры аддзяленні адкрыўся сірацінец для дзяцей ва ўзросце ад 3 да 16 гадоў (у год заснавання было 30 дзяцей). Навучанне адбывалася ў польскіх гарадскіх школах, але ў сірацінцы гаварылі толькі на рускай мове. Пры аддзяленні была бібліятэка (загадчык М. А. Чарвякоўскі), тут праводзіліся лекцыі, адбываліся дыскусіі (напрыклад, пра месца "Слова пра полк Ігаравы", аб развіцці рускай літ. мовы, аб жыцці і дзейнасці выдатных дзеячаў расійскай культуры і навукі). Да дня народзінаў А. С. Пушкіна адзначаўся "День русской культуры", да якога выдаваліся газеты аднадзёнкі "Зарница", "Наш день", "Русский день" і іншыя. Ставіліся спектаклі па творах Пушкіна, М. Астроўскага, А. Чэхава, праходзілі канцэрты мастацкай самадзейнасці, экскурсіі па гістарычных месцах Гродзеншчыны, навагоднія ялінкі для дзяцей.

Літ.: Черепица В.. Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней). Ч. 1. – Гродно: ГрГУ, 1999. – С. 177–181, 186; Черепица В.Н., Гродненский православный некрополь, Гродно: ГрГУ, 2001. – С. 173.

Таварыства дапамогі ахвярам вайны (Towarzystwo Pomocy Ofiarom Wojny). У 1917 г. у складзе кіраўніцтва былі: ксяндзы *Жаброўскі Л.* і *Курыловіч А.*, князь Сапега, Гедройц, Красінскі, лекар *Тальгейм А.,* Цытажынскі, Класоўскі, Маліноўскі, Лінька, Свідэрскі. Пры Таварыстве існавалі: 2 кухні (для простага народу і інтэлігенцыі), хрысціянская суполка "Społem" ("Разам"), дом працы, дзіцячы прытулак Св. Антонія, дабрачынная секцыя.

Літ.: A. Czerniakiewicz, Przejmowanie władzy przez Polaków w Grodnie (koniec 1918 – kwiecień 1919) // Początki niepodległości. Lomża-Białystok-Grodno-Suwałki 1918–1919. – Białystok 1998, s. 42.

Таварыства педагагічнае, дзейнічала з 16.11.1907 па 1915 г. Статут быў зацверджаны 3.11.1907. Старшыня – К. У. Кемарскі. У складзе было 45 сапраўдных

і 12 сябраў-кандыдатаў. Сярод ініцыятараў і актыўных сяброў – *Я. Ф. Арлоўскі*, А. У. Караткоў, І. І. Астравумаў, *Д. Кропатаў*. Таварыства ставіла мэтай "узаемадапамогу ў распрацоўцы навуковых і педагагічных пытанняў" і "пытанняў эстэтычнага развіцця". Складалася з секцый: гістарычна-філалагічнай, прыродазнаўча-матэматычнай, псіхалагічнай, выяўленчага мастацтва і музыкі. На паседжаннях заслухоўваліся даклады пра стан народнай адукацыі, дасягненні ў навуцы, методыцы выкладання ў школе, гістарычнае мінулае краю. Таварыства дапамагала арганізацыі ў горадзе музея, правядзенню археалагічных раскопак у горадзе і наваколлі. З 1911 па 1914 выдаваўся часопіс "Педагогическое дело", які ставіў сваёй мэтаю арганізацыю абмену педагагічным вопытам.

Літ.: Беларусь. Энцыклапедычны даведнік. – Мінск: Бел.Эн, 1995. – С. 243; Соркіна І. Навучальныя ўстановы, настаўнікі і вучні Гродна ў 60-я гады XIX – пачатку XX ст. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 368–369.

Таварыства польскае гістарычнае. Гродзенскае аддзяленне было створанае ў 1935 г. пасля VI з'езда польскіх гісторыкаў у Вільні. У Гродне аддзяленне было заснаванае па ініцыятыве старшыні таварыства прафесара Станіслава Закрэўскага і генеральнага сакратара Польскай акадэміі здольнасцяў праф. Станіслава Кутшэбы 24.06.1935. У гэтым годзе ў таварыства ўваходзілі 37 чалавек, сярод якіх былі: палкоўнік Фургальскі Тэадор (старшыня), старшыня акруговага суда Гедройц Казімір, дырэктар дзяржаўнага архіва *Студніцкая Я.* (віцэ-старшыня), генерал брыгады, камандуючы III Акруговага корпуса Літвіновіч А., дырэктар дзяржаўнай *гімназіі жаночай* Нядзведзкая Я., ксёндз *касцёла Фарнага* Маліноўскі Ю., віцэ-прэзідэнт Гродна *Савіцкі Раман*, уладальнік маёнтка Адэлькаўшчына Адляніцкі-Пачобут Г., капітан Равіч-Шчэрба А. (сакратар). Верагодна, пазней далучыліся да сяброў таварыства: Клеберг Ф. (ён змяніў на пасадзе Літвіновіча), *Жыўна Станіслаў, Каханоўскі Ян, Тальгейм Аляксандр, Ядкоўскі Юзаф, Янкоўскі Тадэвуш, Касцялкоўскі Станіслаў, кс. Курыловіч А., прэзідэнт горада Міскы* і інш. Сябрамі таварыства былі таксама наступныя установы: гімназіі польскай *Мацежы школьнай* – агульная, мужчынская і "Тарбут"; *бібліятэка публічная*; *Таварыства Польскае краязнаўчае*; Бібліятэка дзяржаўная педагагічная. У 1936 дадаліся: гімназіі дзяржаўная жаночая і агульная; *школы* гандлёвая польскай Мацежы школьнай і прамыслова-гандлёвая жаночая, жаночая семінарыя (дырэктарка В. Чапаў была скарбнікам ТПГ). Памяшканне таварыства знаходзілася ў Архіве дзяржаўным. У справаздачным перыядзе (17.09.1935 – 31.03.1936) чальцы Секцыі навучання гісторыі (створаная 27.01.1936) збіралі матэрыялы для выдання зборніка лекцый па мясцовай і рэгіянальнай гісторыі для пачатковых і сярэдніх школ; Дудкова і Аляхновіч выступілі з рэфератамі пра гістарычныя лекцыі ў 5 і 6 класах усеагульных школ. Навуковая дзейнасць была ў выглядзе рэфератаў, напісаных Я. Студніцкай (тэмы: "Палітычная і рэлігійная дзейнасць Супрасля" і "Праблемы, патрэбы і сродкі даследаванняў гісторыі

Гродна") і Т. Янкоўскім "Ход дыскусій аб уніі польска-літоўскай на VI з'ездзе польскіх гісторыкаў". У гэты час паўстала камісія "Бібліятэкі гістарычнай", Студніцкая наглядала за працэсам кансервацыі царквы Барысаглебскай на Каложы, дапамагаючы архіўнымі матэрыяламі. У справаздачным перыядзе (31.03.1936 – 21.04.1937) былі прачытаныя 2 рэфераты: Студніцкая "У Гродне сто гадоў таму"; кс. Ц. Патшэскі "Год 1793 у Гродне", на якіх прысутнічала больш за 40 чал. на кожным паседжанні. Польская Мацеж школьная зарганізавала ў *доме Ажэшкі Э.* цыкл лекцый у Народным ўніверсітэце. Секцыя навучання гісторыі зрабіла канферэнцыю для настаўнікаў гісторыі, дзе між іншага агаворвалася анкета аб выніках навучання гісторыі ў 3 класе. Чальцы ТПГ прынялі ўдзел у працах *Бібліятэкі гістарычнай*. У гэты перыяд чальцоў таварыства было 23 чал.

Літ.: ДАГО, ф. 109, воп.1, с. 1., а. 15–16, 20–21, 26 адв.; с. 5, а. 11, 20, 22, 25, 28; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część I. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 152.

Таварыства польскае краязнаўчае. Гродзенскі аддзел быў створаны ў 1906 г. 1.06.1906 быў прыняты Статут і выбранае кіраўніцтва арганізацыі. Мэта таварыства: збор краязнаўчай інфармацыі аб польскіх землях і тых, якія гістарычна або геаграфічна з імі звязаныя; распаўсюджванне і прапаганда польскага краязнаўства сярод насельніцтва, асабліва моладзі. Для гэтага вырашаліся наступныя задачы: праводзіліся экскурсіі, паездкі ў культурна-турыстычныя мясціны, навуковыя экспедыцыі; ствараліся бібліятэкі; у 1939 быў выдадзены адзін нумар рэгіянальнага часопіса-квартальніка "Niemen" (рэдактар і выдавец Генрых Адляніцкі-Пачобут); арганізоўваліся канферэнцыі, выставы; утвараліся музеі. Вядомае выданне кнігі: Hirszel St. Zygmunt. Przyczynki do monografji powiatu Grodzieńskiego. – Grodno, 1923. – 30 s.

Літ.: Лупинович Ю., Роль польского краеведческого общества в сохранении культурного наследия Западной Беларуси // Польска-беларускія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі / Пад рэд. М. Кандрацюка, Б. Сегеня. Т. XI. Матэрыялы XVI Міжнароднай навук. канферэнцыі "Шлях да ўзаемнасці". – Беласток, 2009. – С. 375–379.

Таварыства праваслаўных палякаў. Створанае Міністэрствам асветы і веравызнанняў Польшчы з мэтай апалячвання беларусаў і рускіх. Існавала ў Гродне ў 1936–1939 гг. пад кіраўніцтвам епіскапа Гродзенскага *Савы (Саветава)*. Памяшканне таварыства знаходзілася па вул. К. Маркса, 11. Пры таварыстве з 1938 дзейнічаў Навуковы інстытут на чале з дырэктарам святаром Л. Касперскім. Адказным сакратаром быў вайсковы святар В. Аляхновіч, а сакратаром – дзякан У. Амбражэйчык. Акрамя названых сябрамі таварыства былі: святар Ф. Валікоўскі (намеснік Савы), святары Б. Барысевіч, Б. Буракоў, Р. Скрыннік, Баранаў, П. Радкевіч; рэгент хору Д. Арлоў, справаводца епархіяльнага ўпраўлення Б. Гагман, чыноўнікі Краскоўскі, А. А. Арцішэвіч,

Б. У. Смольскі. 17–18.09.1939 архіў таварыства быў зліквідаваны ў сувязі з прыходам Чырвонай арміі.

Літ.: Черепица В.. Очерки истории Православной Церкви на Гродненщине (с древнейших времён до наших дней). Ч. 1. – Гродно: ГрГУ, 1999. – с. 190–193.

Таварыства роварнае. Упершыню праект яго ўтварэння быў пададзены *губернатару* 18.12.1893, але віленскі генерал-губернатар адхіліў рашэнне. Другі раз заява была пададзеная ў студзені 1898, у лютым яе пераправілі ў Вільню. Затым папера пайшла ў МУС. 20.11 статут таварыства быў зарэгістраваны. Рух раварыстаў па вуліцах горада рэгуляваўся Правіламі, зацверджанымі гродзенскім паліцмайстрам 21.05.1899. Кіраваць *роварам* дазвалялася з 17 год, трэба было атрымаць на гэта дазвол, мець рэгістрацыйны нумар, званок, ліхтар для язды ў цёмны час, трымацца правага боку вуліцы, прапускаць калоны вайскоўцаў і пахаванні. З 1900 Т. р. мела свой значок круглай формы з фонам колеру бірузы, па коле было напісана: "Гродзенскае таварыства раварыстаў" і пазначаная дата 1899 г. У сярэдзіне змяшчаўся эмаляваны шчыт чырвонага колеру, на ім была залацістая выява зубра. З 1908 Т. р. стала называцца "Таварыства па спрыянні фізічнаму развіццю". Адкрыліся тры пракатныя пункты роваraў: пры краме "Праваднік", на складзе Ганіёнзкага, у будынку Гродзенскага *губернскага праўлення*. Т. р. мела свой трэк (цяпер там тэрыторыя заапарка), дзе праводзіла спаборніцтвы; арганізоўвала турыстычныя экскурсіі на роварах у напрамку Скідзеля, Друскенік, Індуры, Азёраў.

Літ.: Вайцэховіч З. Транспарт. Ч. 1. Конка, трамваі, аўтобусы, ровары, матацыклы. – Мінск: УП "Камет", 2008. – С. 68–71.

Таварыства сельскай гаспадаркі. 20.03.1900 Міністэрства земляробства і дзяржаўнай маёмасці Расійскай імперыі зацвердзіла статут ТСГ. 30.11.1900 адбыўся ўстаноўчы сход сябраў. Дазвол на яго арганізацыю атрымаў губернскі *маршалак* шляхты Ян Янавіч Урсын-Нямцэвіч, але смерць (4.04.1900) перашкодзіла яму закончыць справу. Першае ўрачыстае паседжанне адбылося 23.02.1901 ужо пад старшынствам новага губернскага маршалка Пятра Уладзіміравіча Вяроўкіна. Прысутнічала 78 чал. Ахвочыя запісваліся ў сябры таварыства і аплочвалі 10 рублёў узносу. Сябрам таварыства мог быць любы расійскі грамадзянін, нягледзячы на саслоўе, які "займаецца або цікавіцца сельскай гаспадаркай". Чальцы таварыства падзяляліся на звычайных, пажыццёвых, ганаровых, карэспандэнтаў і супрацоўнікаў.

Віцэ-старшынёю быў абраны князь С. Святаполк-Чацвярцінскі (ён згадзіўся толькі на шэсць месяцаў, спаслаўшыся на вялікую занятасць). Сябрамі Рады (выканаўчага органа таварыства) сталі: Я. Я. Урсын-Нямцэвіч, Дзмітры Карыбут-Дашкевіч, *Скірмунт К.*, князь Станіслаў Юзафавіч Пузыня, Барташ Людвікавіч Рашкоўскі, Юзаф Феліксавіч Банькоўскі, Ян Канстанцінавіч Рот, Казімір Эдуардавіч Вольмер, Аляксандр Аляксандравіч Азнабішын. У рэвізійную камісію (кантрольны орган) увайшлі С. С. Ячыноўскі, К. Б. Шэмет,

М. Урсын-Нямцэвіч, купец Баснін і Бельскі. Сакратаром таварыства прызначылі Гродзенскага адваката Л. Бяляўскага, а скарбнікам – К. А. Коцела. Вырашылі, што агульныя сходы сябраў будуць адбывацца тры разы на год, а Рады – не менш за адзін раз на месяц. На агульным сходзе 4.04.1901 было прынятае рашэнне аб стварэнні сельскагаспадарчай школы. Для гэтай мэты доктар Чэслаў Мікалаевіч Бітнер ахвяраваў 16 дзесяцін зямлі ў сваім маёнтку Масевічы Ваўкавыскага ў. Грунт (5 дзес.) пад будынак школы ахвяраваў палкоўнік М. Жарабцоў у сваім маёнтку Крэмяніца Ваўкавыскага ў. Але справа стварэння школы зацягнулася, і ў Запісцы рады ТСГ (апублікаваная ў 1903, а напісаная, верагодна, у канцы 1902) адзначалася, што арганізацыя яе "затрымліваецца недастатковасцю грашовых сродкаў, неабходных для яе ўсталявання". У 1912–1913 ужо існавала сельскагаспадарчае вучылішча, а з 1913–1914 у Гродне пачала дзейнічаць і доўгачаканая *школа.*

На зямлі (1 дзесяціна), якую падараваў князь У. Друцкі-Любецкі ў маёнтку *Станіславова,* меркавалася адкрыць станцыю кантролю насенняў і гною. Двойчы (23.06 і 30.11.1901 г.) уздымалася пытанне аб стварэнні для сельскіх гаспадароў дзвюх касаў: пенсіённай і на выпадак хваробы. Пасля бурных дыскусій гэтыя праекты былі адкладзеныя. Затое быў створаны Камітэт вінакурэння пры ТСГ (статут яго зацверджаны 10.04.1901), які дамогся павышэння ўрадавых коштаў на спірт з 55 кап. да 60 кап. за вядро, што павысіла даходы вытворцаў на 70 тыс. руб. У канцы 1902 зацвердзілі статуты камітэтаў конегадоўлі, жывёлагадоўлі і малочнай вытворчасці. Практычная дзейнасць таварыства абмяжоўвалася даследаваннем уплыву на ўраджай угнаенняў і новых насенняў, якія праводзіліся на грунтах маёнтка Станіславова. У студзені 1903 г. таварыства прадставіла Надзвычайнай радзе па справах патрэб сельскай гаспадаркі мемарыял, у якім адзначыла галоўныя праблемы землеўладальнікаў Гродзенскай губ.:

* Стварэнне вышэйшай сельскагаспадарчай навучальнай установы ў Вільні.
* Арганізацыя ніжэйшых сельскагаспадарчых школаў у правінцыі.
* Утрыманне за кошт дзяржавы або пры яе дапамозе інструктараў па жывёлагадоўлі і малакавытворчасці.
* Арганізацыя добраахвотнага перасялення сялян.
* Паляпшэнне побыту сялян праз развіццё дробнага крэдыту і ліквідацыю сервітутаў і цераспалосіцы.
* Права вольнага продажу і абмену зямлі.
* Увядзенне іпатэкі.
* Ліквідацыя абмежаванняў для палякаў у Дваранскім банку.
* Будаўніцтва мясцовых дарог, супрацьпажарная ахова.
* Увядзенне новых мытных тарыфаў.

Гарачую дыскусію падчас абмеркавання мемарыяла выклікала прапанова К. Г. Скірмунта аб абавязковым навучанні дзяцей сялян. С. Святаполк-Чацвярцінскі заявіў, што асвета і абавязковае навучанне з'яўляюцца "крыніцай рэвалюцыі і практычна аслабляюць вытворчыя сілы краю". Супраць гэтага выступіў П. Вяроўкін, а група польскіх уладальнікаў нават закранула праблему

аб характары школьных устаноў у *губерні*. На іх погляд, не царкоўна-прыходскія школы, якія галоўным чынам распаўсюджваюць праваслаўе, а міністэрскія школы адпавядалі мэтам пачатковай школы. Галасаванне дало наступны вынік: 35 сябраў "супраць", 11 "за" увядзенне пачатковай асветы. З мэтаю прыцягнуць новых сябраў і ажывіць дзейнасць таварыства было запланавана правесці ў маі-чэрвені 1904 г. вялікую прамыслова-сельскагаспадарчую і прамыслова-гандлёвую выставу ў лясочку "Звярынец" пад Беластокам. Па прычыне "няўдалага ўраджаю" яна была перанесеная на вясну 1905, а затым *вайна 1904–1905* і *рэвалюцыя 1905–1907* не далі магчымасці ажыццявіць гэты праект.

З канца 1901 па 1905 віцэ-старшынёю таварыства быў Скірмунт. Адной з ягоных турбот стала павелічэнне яго колькаснага складу. У спісе за 31.03.1902 таварыства налічвала 174 сябры (135 палякаў, 39 расіян). Праз два гады было 244 сябры (197 палякаў, 47 расіян). Найбольшая колькасць сябраў таварыства паходзіла з Сакольскага, Беластоцкага, Бельскага, Брэсцкага, Пружанскага ў., меней было з Гродзенскага, Кобрынскага, Слонімскага і Ваўкавыскага. Этнічны склад таварыства яшчэ раз падкрэслівае спробу палякаў Беларусі зрабіць сельскагаспадарчую арганізацыю апорай польскага нацыянальнага руху. У апошнім з канца 1880-х гадоў адбывалася пераарыентацыя, з'явіўся, як пісаў беларускі гісторык А. Цвікевіч у кнізе "Западно-руссизм", "капіталістычны нацыяналізм", на чале якога стаў польскі магнат-землеўласнік. Буйное польскае шляхецтва рабілася сапраўдным кіраўніком польскай грамадскай думкі ў канцы XIX ст. – пачатку XX ст. На пятым паседжанні ТСГ 13.06.1902 маршалак П. Вяроўкін прачытаў ліст *Э. Ажэшкі*, у якім тая пісала, што хоча падараваць ім свой радавы маёнтак Гнойніца (каля 3 км ад Гродна) з умоваю атрымання пажыццёва штогадовай рэнты ў суме 600 руб. Ні падарыць, ні прадаць яго не ўдалося з-за нязгоды расійскіх улад. У запісцы рады ТСГ, надрукаванай у "Трудах местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности" (1903), пералічаныя вышэй праблемы землеўладальнікаў дапоўненыя яшчэ наступнымі прапановамі:

* Развіццё сельскагаспадарчай вопытнай справы і азнаямленне з яе вынікамі гаспадароў зямлі;
* Барацьба з ворагамі сельскай гаспадаркі (яры, пяскі, балоты, эпізаотыі, шкоднікі);
* Ахова зробленых у гаспадарках паляпшэнняў (у першую чаргу меліярацыйных пабудоў, водных сховішч і водазапеспячэння);
* Ахова сельскагаспадарчай маёмасці (супраць захопаў зямлі, вырубкі лясоў, крадзяжу коней, а таксама з палёў, агародаў і садоў);
* Арганізацыя дзейнасці гаспадарчых саюзаў (кааперацыі);
* Паляпшэнне малочнай гаспадаркі і дапамога збыту тавараў яе вытворчасці;
* Садзейнічанне развіццю ўнутранага і знешняга гандлю сельскагаспадарчымі прадуктамі, абмену таварамі паміж рознымі рэгіёнамі Расіі;
* Развіццё вытворчасці звязанай з сельскай гаспадаркай (у прыватнасці ў вінакурэнні паскорыць працэс дэнатуралізацыі спірту для тэхнічных патрэб – асвятлення, аціплення, паліва для рухавікоў);

* Упарадкаванне сельскагаспадарчых адыходных промыслаў.

Пасля рэвалюцыі 1905–1907 змена грамадска-палітычнага становішча прывяла да скарачэння дзейнасці таварыства. Пасля "двухгадовага поўнага застою" у 1909 г. таварыства было адноўленае. Яго адраджэнцамі сталі вядомыя на Гродзеншчыне памешчыкі і землеўладальнікі: князь С. К. Святаполк-Чацвярцінскі, О. О. Баер, С. Г. Сегень, К. А. Коцел, барон М. Р. Мантэйфель, К. Г. Скірмунт, Я. Я. Урсын-Нямцэвіч, Я. Ю. Біспінг, С. С. Ячыноўскі, С. І. Клімашэўскі, К. А. Вольмер, І. У. Імбіровіч. У склад Рады ўвайшлі 12 чалавек: старшыня – Станіслаў Канстанцінавіч Незабітоўскі, таварыш (намеснік) старшыні – Аляксандр Аляксандравіч Азнабішын (віцэ-губернатар Гродзенскай губ.), сябры – барон Станіслаў Сямёнавіч Брунаў, князь Канстанцін Станіслававіч Святаполк-Чацвярцінскі, Марцін Францішкавіч Адляніцкі-Пачобут, Ян Юзафавіч Біспінг (казначэй), Мар'ян Адольфавіч Блаўдзевіч (сакратар), Ігнацы Іванавіч Калянкевіч, Аркадзь Якаўлевіч Лапін, Азнабішын, Конрад Станіслававіч Прушынскі, Іван Станіслававіч Стравінскі. Кантрольным органам была рэвізійная камісія з чатырох чалавек: С. А. Лямпіцкі, Я. Я. Урсын-Нямцэвіч, князь С. І. Пузыня, І. А. Скірмут. Паводле "Нормального устава для местных сельскохозяйственных обществ" ад 1910 г. мэтай таварыства было "садзейнічаць у Гродзенскай губерні злучанымі сіламі сваіх сябраў развіццю і ўдасканальванню сельскай гаспадаркі і сельскай прамысловасці". У 1909-м справаздаўчым годзе "сапраўдных" членаў таварыства налічвалася 68 чал., у 1910 – 75 чал., у 1912 – 73 чал. Сярод іх — К. Незабітоўскі (старшыня ў 1912), князь Я. Сапега (старшыня ў 1913–1914). У таварыстве былі чатыры "ганаровыя" сябры: старшыня Савета міністраў *Сталыпін П. А.,* князь Святаполк-Чацвярцінскі, *Дабравольскі М. А.*, А. Е. Ярмолаў.

Бюджэт таварыства складаўся з гадавых сяброўскіх складак, даходаў ад сваіх мерапрыемстваў, ахвяраванняў грамадскіх устаноў, субсідый дэпартамента земляробства Упраўлення земляробства і дзяржаўных маёмасцяў, урадавага агранома Гродзенскай губ. і дзяржаўнай казны. Напрыклад, у снежні 1913 г. Упраўленне дало 4 тыс. руб. на мерапрыемствы па паляпшэнні жывёлагадоўлі. Дапамога ад казны ў 1911 – 4 500 руб., у 1912 – 5 700 руб., у 1913 – 8 000 руб. У 1911 быў створаны "Саюз жывёлаводаў і жывёлазаводчыкаў". На пачатку 1914 г. ён налічваў 75 землеўладальнікаў з 88 кароўнікамі (785 кароў). Вясной 1914 у саюз увайшлі землеўладальнікі Сувалкаўскай і некаторых уездаў Віленскай губ. ТСГ мела сваё памяшканне і пазначала свой адрас такім чынам: чыгуначная станцыя, пошта, тэлеграф, тэлефон – г. Гродна. Нам вядома пра *палац Станіславова*, дзе было паседжанне таварыства 14.02.1902, на якім прысутнічала *Ажэшка Э.* Раён дзейнасці ТСГ ў 1900 г. ахоплівaў дзевяць уездаў. Гэта значыць, што амаль на ўсю Гродзенскую губ., акрамя Брэсцкага, Кобрынскага, Пружанскага, Бельскага ўездаў, дзе дзейнічала Брэсцкае таварыства. Існавалі аддзяленні ТСГ у м. Лунна, Заблудава, Кузніца, г. Ваўкавыск, Слонім, м. Скідзель, Масты, Індура, Крынкі. Уся дзейнасць таварыства была накіраваная на перабудову сельскай гаспадаркі і прамысловасці. Успомнім, што ў гэты час у Беларусі праходзіць сталыпінская аграрная рэформа.

Паводле ўказу ад 29 мая 1911 г. землеўпарадкавальныя камісіі атрымалі права прымусова выдзяляць сялянам зямлю ў адным участку і перасяляць іх на хутары. Таварыства дапамагала рэалізоўваць гэты ўказ. Перш за ўсё таварыства даследавала становішча гаспадарак сваіх членаў. Для гэтага былі складзеныя "вопросные листки", збіраліся статыстычныя звесткі, ажыццяўляліся экскурсіі па ўзорных гаспадарках (каля 1905 іх было 15). Дармова або за меншы кошт сябры таварыства забяспечваліся насеннем хлябоў, траў, тэхнічных раслін і агародніны (такім чынам укараняўся шматпольны севазварот), пасадачным матэрыялам пладовых дрэў, племянной жывёлай, угнаеннямі, тэхнікай (жняяркі, маслабойкі, сепаратары, пралькі, лядоўні). Сябры таварыства ўрэгулёўвалі лясную і водную гаспадаркі, арганізоўвалі кааператывы, наладжвалі народны дробны крэдыт, садзейнічалі развіццю саматужнай прамысловасці, змяншэнню пажараў і лепшаму захоўванню мясцовых дарог. У функцыі таварыства ўваходзіла і распаўсюджванне сельскагаспадарчых ведаў. З гэтай мэтай на агульных сходах чыталіся рэфераты. Напрыклад, у 1911 г. сябра Магілёўскага таварыства сельскай гаспадаркі К. Свяцкі выступіў на тэму "Дацкі спосаб кармлення малочнай жывёлы і выкарыстанне яго ў нашых гаспадарках", а С. К. Вільпішэўскі – на тэму "Аб нітрабактэрыі з насенняў і глебы для павелічэння ўраджаю бабовых раслін". Арганізоўваліся выставы, фармаваліся бібліятэкі, друкаваліся плакаты, праводзіліся курсы. У Гродне існавала сярэдняе сельскагаспадарчае вучылішча, а ў 1913 было дазволена стварыць падобную школу. Апошняя не была, відаць, адкрытая па прычыне пачатку *вайны Першай сусветнай* (пазней у 1919 доктар Уладзімір Адольф Здзіслававіч Бітнер прапануе зарганізаваць сельскагаспадарчую школу ў сваім маёнтку Кватары і выдзеліць для яе 18 дзесяцін зямлі).

У справаздачы таварыства за 1911 г. адзначалася "здавальняльная з'ява, якая заключаецца ў тым, што дзейнасць таварыства ў бягучым годзе не абмяжоўвалася кабінетнымі заняткамі, а прыняла жывы, практычны кірунак, ахопліваючы шырокія грамадскія і сельскагаспадарчыя інтарэсы". З галоўных мерапрыемстваў называліся: сельскагаспадарчыя курсы (70 слухачоў), курсы для абслугі сельскагаспадарчых машын (30–50 чал.), выставы ў Гродне і ўтварэнне даследчага поля "Цагельня". Яго зарганізавалі ў маёнтку Будоўля (цяпер вёска ў Абухаўскім сельсавеце Гродзенскага р-на), дзе быў ахвяраваны ў 25-гадовае бясплатнае карыстанне ўчастак зямлі памерам у 21 дзес. 1920 кв. сажаняў. На датацыі міністэрства сельскай гаспадаркі ў суме 5800 руб. пабудавалі дом для працаўнікоў, стайні, кароўнікі, падрыхтавалі даследчае поле. Загадчыкам быў Казімір Генрыхавіч Урублеўскі. Ён меў двух асістэнтаў, тэхнічнага памочніка, трох батракоў, служачага лабараторыі і "кароўніцу". Першыя пробныя пасевы аўса, ячменю, гароху, 20 сартоў бульбы былі зробленыя на даследчым полі вясною 1911 г. Праз чатыры гады доследы вяліся ужо па ячмені (10 сартоў), аўсе (15 сартоў), капусце (20), кармавых (13) і цукровых (29) бураках, бульбе (50), жыце і г. д. У 1915 у "Цагельні" існавалі дзве лабараторыі – хімічная і батанічная, метэаралагічная станцыя, батанічны сад, дзе высявалі некалькі дзясяткаў сартоў траў, лекавых і прамысловых раслін.

Вяліся вегетацыйныя доследы з калійнымі, фосфарнымі, азотнымі ўгнаеннямі, дзеяннем вапны на глебу. "Цагельня" мела свіран, хлеў для жывёлы, ляднік, калодзеж з помпаю, сховішча для гною, сельскагаспадарчыя машыны і інвентар. У 1915 ТСГ перастала існаваць, бо да Гродзеншчыны набліжалася *вайна Першая сусветная*. На жнівень была запланаваная эвакуацыя даследчага поля "Цагельня". З рапарта Стражы Крэсовай ад 21.07.1919 даведваемся, што ТСГ у гэты час мела 112 сябраў і 2 філіялы ў Заблудаве і Лунне. Старшынёй быў князь Яўстахі Сапега, віцэ-старшынёй – граф М. Красінскі, які прапагандаваў стварэнне Саюза землеўласнікаў. Павятовы інспектар Р. Мартыноўскі лічыў, што ТСГ будзе зліквідаванае, калі ўзмацніцца дзейнасць сельскагаспадарчых гурткоў і будзе створаны акруговы Саюз сельскагаспадарчых гурткоў.

Крын. і літ.: Записка Совета Гродненского общества сельского хозяйства // Труды местных комитетов о нуждах сельскохозяйственной промышленности. Т. XI. Гродненская губерния. – СПб., 1903. – С. 221–239; Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне, ф. 1, воп. 27, с. 2946, а. 28; ф. 366, воп.1, с. 130, а. 136; Памятная книжка Гродненской губернии на 1903 год. – Гродна, 1903. – С. 158–159; Цвікевіч. А. "Западноруссизм". Нарысы гісторыі грамадскай мыслі ў XIX і пачатку XX в. – Менск, 1993. – С. 256; Orzeszkowa E. Listy zebrane/ red. E. Jankowski. T. VII. – Wrocław, 1971. – S. 618; Skirmunt K. Moje wspomnienia. 1866–1945, Wydawnictwo Wyższej Szkoły Pedagogicznej, 1998. – S. 26–27, 38.

Таварыства ўрачоў Гродзенскай губ., створанае ў 1869, калі сябраў было толькі 13 урачоў і фармацэўтаў. Сваімі мэтамі лічылі: санітарнае вывучэнне губерні (між іншым складанне медыка-тапарафічнай і санітарнай карт), барацьбу з эпідэміямі, медычную дапамогу сельскаму насельніцтву, санітарную асвету. У 1871–1872, у сувязі з эпідэміяй халеры на Гродзеншчыне, Т. спыніла свае працы і зноў ажывіла іх у 1873. З студзеня адбыўся арганізацыйны сход, на якім прысутнічалі 11 урачоў і 4 фармацэўты. Актыўна праявілі сябе сябры Т. падчас *пажару* 1885 г. у Гродне: аказвалі медыцынскую дапамогу, удзельнічалі ў зборы і размеркаванні ахвяраванняў пагарэльцам. У 1890–91 колькасць сябраў Т. дасягнула 25 чал., а ў 1896 – 42 чал. (з вайскоўцамі). У 1890–1902 прэзідэнтам быў А. Ф. Райпольскі, пазней – М. Д. Беклямішаў. У 1896 віцэ-прэзідэнтам быў І. А. Нікіфараў, сакратаром – Беклямішаў. У Т. уваходзілі вядомыя на Гродзеншчыне медыкі: Ю. Ф. Бянецкі, І. І. Касцялкоўскі, Д. Л. Глінскі, В. К. Шэнберг, П. І. Яхантаў і іншыя. Таварыства выдала 2 зборнікі сваіх пратаколаў 1891–97 гг.

Літ.: Молчанов А. П. Новые материалы из истории возникновения медицинских обществ Белоруссии // Здравоохранение Белоруссии. – 1969. – № 5; Черепица В.Н. Гродненский православный некрополь: (с древнейших времён до начала XX века) / В.Н. Черепица. – Гродно: ГрГУ, 2001.

Таварыства Чырвонага Крыжа. Гродзенскае ўпраўленне Расійскага таварыства пачало дзейнічаць у 1880 г. Паводле Статута мясцовыя ўпраўленні ствараліся пры наяўнасці не менш 50 сябраў-заснавальнікаў. Мэтаю ТЧК

з'яўлялася аказанне лекарскай і іншай дапамогі хворым і параненым вайскоўцам ў ваенны час. Пазней дадалася апека пацярпелым ад "грамадскіх бед" у мірны час. У перыяд спакою таварыства займалася нарыхтоўкай медычных матэрыялаў, абсталявання, інструментаў, лекаў, падрыхтоўкай лекарскага і санітарнага персанала, стварэннем суполак сясцёр міласэрнасці. У фонде 101 Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў Гродне захоўваецца 64 справы гродзенскага праўлення за 1884–1905, 1914, 1916 гг.

Літ.: Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 245–246.

Таксі ў Гродне з'явілася ў 1912 г. Два пасажырскія аўтамабілі належалі Сувальскаму таварыству аўтамабільных зносін. У кожным аўто быў кандуктар, шафёрам аўто № 1 з'яўляўся Уладзіслаў Мураўскі. 29.06.1913 браты Бароўскія падалі ў гарадскую думу заяву на дазвол перавозіць па горадзе пасажыраў на 4-месным аўтамабілі "La Buire" у 14. к. с. Але атрымаў падобны дазвол іншы ўладальнік аўтамабіля – шафёр-механік Браніслаў Браніслававіч Гародка, які меў пасведчанне аб заканчэнні поўнага курса навучання ў "Школе шофераў у Пецярбургу". Спачатку кошты праезду былі паводле дамовы, а потым былі распрацаваныя тарыфы, і ў таксі сталі ўжываць таксометр, які паказваў км, таксу і кошт праезду. Пасля *вайны Другой сусветнай* рух таксі аднавіўся ў 1950 г., калі па горадзе вазілі 4 аўтамабілі "Победа". Колькасць таксаматораў пастаянна павялічвалася: у 1955 іх было 35, у 1960 – 80. У 1959 былі вызначаныя наступныя месцы стаянак таксі: вакзал, пл. Леніна, пл. Савецкая, бібліятэка № 1, вул. Гарнавых, рэстаран "Гродна", рынак Скідзельскі (аўтавакзал), пл. Калгасная (аўтастанцыя). З гэтага года таксі пачало хадзіць па маршруце Гродна – Рыга. З 1960 парк таксі размясціўся ў зав. Дзяржынскага.

Літ.: Саяпін В., История общественного транспорта Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 11–15, 34, 38–41; Черепица В. …Не потерять связующую нить: История Гродненщины XIX – XX столетий в событиях и лицах (исследования, документы, комментарии): Монография. – Гродно: ГрГУ, 2003. – С. 182–183.

Талочка Адольф Іванавіч – паўстанец 1863 г. Меў 30 гадоў у 1864, нарадзіўся ў Сакольскім у., урочышча Курылы, з дваран, вучыўся ў Сакольскім прыходскім вучылішчы. Працу пачаў у Сакольскім павятовым казначэйстве ў 1851, а з 1854 служыў у Гродзенскай *казённай палаце*, калежскі сакратар. Жыў на кватэры ў *доме купца Фукса* на Саборнай вуліцы ў Гродне. У рэвалюцыйную арганізацыю быў прыняты ў красавіку-маі 1863 г. на кватэры *Э. Заблоцкага,* дзе атрымаў пасаду памочніка ваяводскага (выконваў яе 7–8 месяцаў). Падчас арышту 29 сакавіка 1864 г. у яго знайшлі розныя рэвалюцыйныя паперы, дзённыя загады вайсковага начальніка Гродзенскага павета, забароненыя вершы, карту Польшчы, паштоўкі Гарыбальдзі, *Лялевеля*, *Касцюшк*і, Дамброўскага, *Ягайлы.* Гэта ўказвала на ягоныя погляды і даказвала ягоны ўдзел у Гродзенскім ваяводскім кіраванні. Ён захоўваў у сябе ваяводскую пячатку (у вазоне для кветак) і прыкладваў яе да інструкцыяў, якія адсылаліся па

паветах, перапісваў паперы. Быў жанаты і меў дачку 6 і сына 4 гадоў. Прыгавораны да катаржных прац у крэпасці на 8 гадоў, але суд прасіў аб змякчэнні пакарання за "чистосердечное признание", маёнтак падлягаў канфіскацыі.

Крыніца: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 34, с. 768 а, а. 15 адв.; ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 24 – 25 адв., 75–76, 81–81 адв.; с. 1, а. 51; с. 1, а. 59, 92–97.

Тальгейм Аляксандр Карлавіч (1873, Варшава – 28.06.1937, Гродна). Продкі Т. – прускія шляхціцы, перасяліліся ў Расійскую імперыю ў 1830-х гг. Бацька Карл Тальгейм – уладальнік фальварка Путрышкі-Разалін. Т. вучыўся ў *гімназіі* гродзенскай, на медычным факультэце Кіеўскага універсітэта. У 1900 працаваў у м. Поразава, а з 1905 – у Гродне, у абшчыне сёстраў міласэрнасці "Чырвоны Крыж". Займаўся прыватнай медычнай практыкай і стаў вядомым урачом у галінах унутраных, гінекалагічных і неўралагічных хвароб. Старшыня створанага ў 1907 музычна-драматычна-літаратурнага *таварыства "Муза"*, а з 1910 – яшчэ і бібліятэкі таварыства. У 1911 Т. пабудаваў на скрыжаванні вуліц Сафійскай і Польнай дом у стылі мадэрн, дзе часам праходзілі паседжанні "Музы". У ліпені 1917 выбраны ў кіраўніцтва т-ва дапамогі ахвярам *вайны Першай сусветнай*. У 1920 савецкая ўлада прызначыла яго галоўным урачом гарадскога *шпіталя*, а польская ўлада пасля свайго вяртання пакінула яго на пасадзе і прызначыла шэфам дэпартамента здароўя і міласэрнасці ў *магістраце*. Т. актыўна займаўся грамадскай працай. Быў ініцыятарам стварэння мясцовага таварыства ўрачоў (1923), сябрам Рэвізійнай камісіі Варшаўска-Беластоцкай урачэбнай палаты, сябрам Рэвізійнай камісіі мясцовага камітэта Чырвонага Крыжа, старшынёй камітэта магістрата па справах дапамогі беспрацоўным. У 1924 стаў сябрам праўлення Гродз. *музея прыроды*. Але і на сонцы ёсць плямы: вядомы як філантроп і грамадскі дзеяч, Т. апісваецца ў газеце "Дзеннік Гродзенскі" (№ 128 за 25.07.1922) як доктар, які не спяшаецца на дапамогу хворым, не ідзе да тых, якія не могуць яму заплаціць ганарар і, нават, ідзе на падман: Г. Калантай лячылася ў шпіталі за кошт дзяржаўнай казны, і *магістрат* заплаціў Т., але і ёй прышлося заплаціць яшчэ 7 тыс. марак. Пахаваны на гродзенскіх *фарных могілках*, сектар К 157.

Літ.: Иващенко Н.А. Александр Тальгейм и его "Муза" / Н.А. Иващенко // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 464–469; "Echo Grodzieńskie". – 1921. – № 28; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. I. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2014. – C. 104.

Таранда Мікалай Іванавіч (нар. 1.05.1957) – біёлаг, кандыдат навук, дацэнт кафедры мікрабіялогіі і эпізааталогіі Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта. З 1997 г. выкладаў мікрабіялогію на зааінжынерным, аграномічным і тэхналагічным факультэтах у ГДАУ і медыцынскім універсітэце. Т. быў арганізатарам і адным з кіраўнікоў гродзенскага клуба *"Паходня"*. Гродзенцы памятаюць Т. і як сузаснавальніка кафэ "Батлейка", якое знаходзілася ў *тэатры лялечным* (другім гаспадаром быў мастак Сураў А.). Яго

кліентамі былі беларускія барды, пісьменнікі, акцёры, беларусы з Еўропы і ЗША. Напрыклад, Лявон Вольскі, Зянон Пазняк, Данчык. Таранда і сам таленавіты чалавек: 10 год танчыў у вядомым *ансамблі песні і танца Нёман* і 3 разы быў узнагароджаны медалём лаўрэата Усесаюзнага фестывалю самадзейнай народнай творчасці працоўных. Шмат фатаграфуе горад і стварае тым самым фоталетапіс Гродна.

Літ.: https://news.tut.by/society/383749.html; http://www.nastaunik.info/national-edu/persons/8948; https://www.ggau.by/publication/fwm/4319-taranda-nikolaj-ivanovich Дата доступу 26.02.2021.

Тарашкевіч Браніслаў Адамавіч (20.01.1892, Мацюлішкі Віленскага ў. – 29.11.1938, Мінск) – беларускі грамадскі і палітычны дзеяч, філолаг, літаратуразнавец, публіцыст, перакладчык, акадэмік АН БССР (1925). Стваральнік і кіраўнік Беларускай сацыялістычнай *грамады* (БСГ, 1911). Скончыў Пецярбургскі ўніверсітэт (1916). Чалец Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (1918). Тады ж узначаліў культурна-асветны аддзел Петраградскага аддзялення Беларускага нацыянальнага камітэта. Выкладчык беларускай і грэчаскай моў у Мінскім педагагічным інстытуце (1919), загадчык беларускага сектара дэпартамента адукацыі Сярэдняй Літвы (1920). Дырэктар Віленскай беларускай гімназіі (з 1921), адзін з кіраўнікоў *Таварыства беларускай школы* (1921–1922). Пасол сейма Польшчы (1922), дзе да 1923 узначальваў беларускі пасольскі клуб. У 1925 выйшаў з яго і з групай левых дэпутатаў стварыў аснову Беларускай рабоча-сялянскай грамады, стаў старшынёй яе ЦК. Са снежня 1925 стаў чальцом Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі.

Часта бываў у Гродне. 20.02.1926 выступаў у *кінатэатры* "Палас", мітынг ішоў пад лозунгам "Патрабуем вызвалення палітзняволеных!". У студзені 1927 арыштаваны і прысуджаны да 12 год турмы. Утрымоўваўся ў гродзенскай *турме*, дзе пераклаў на беларускую мову паэму А. Міцкевіча "Pan Tadeusz" ("Пан Тадэвуш"). У 1930 Т. быў вызвалены і падпольна кіраваў дзейнасцю арганізацыі "Змаганне". У лютым 1931 Т. зноў арыштавалі і асудзілі да 8 год катаржных прац. З верасня 1933 у выніку абмену палітычнымі вязнямі жыў у СССР, працаваў у міжнародным аграрным інстытуце ў Маскве. Рэпрэсаваны ў гады сталінскага рэжыму.

У друку выступаў з 1914 г. Выдаў "Беларускую граматыку для школ" (1918). Пераклаў на беларускую мову "Іліяду" Гамера.

Таргавіцкая канфедэрацыя, створаная на загад расійскай імператрыцы Кацярыны II у Пецярбургу 27.04.1792 і абвешчаная 14.05 ва ўкраінскім мястэчку Таргавіца. Аб'яднала непрыхільнікаў Канстытуцыі 3 мая 1791 і тых, хто жадае вяртання былога ладу Рэчы Паспалітай пад гарантыяй Расіі (галоўнае было вярнуць кардынальныя правы – liberum veto, выбарнасць караля). Кіраўнікі Т. к. (маршалак Шчэнсны Патоцкі і гетманы Севярын Жэвускі, Францішак Ксаверы Браніцкі) звярнуліся па вайсковую дапамогу да Кацярыны II. Адбылася *вайна* (май-ліпень 1792), якая скончылася паражэннем кароннага

і літоўскага войскаў. 24.07 *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* далучыўся да Т. к. З канца 1792 па 15.09.1793 канфедэрацыя знаходзілася ў Гродне, а на паседжанні *сейма Рэчы Паспалітай* была зліквідаваная і замененая Гродзенскай.


Літ.: Historia Polski. Kalendarium dziejów. T. II. 1655–1887. – Kraków, 2010, s. 239–243.

Татары. Першае з'яўленне іх у горадзе звязанае з 1241 г. Польскія вайсковыя гісторыкі В. Заторскі і Ю. Пузыня упэўнена сцвярджаюць, што ў гэтым годзе мангола-татарскія войскі разрабавалі Гродна пасля выйгранай бітвы з гарадзенскім войскам на тэрыторыі *замка Старога*. Далей *Вітаўт,* пасля пераможнага крымскага паходу ў канцы XIV ст., некалькі дзясяткаў тысяч татараў пасяліў ў Заходняй Беларусі і Летуве на памежжы ВКЛ. Частка іх апынулася каля 1396 у Гродне (з'явілася вул. Татарская /Баніфратарская, Свярдлова) і ваколіцах (Аульс, *Ласосна,* Кадыш, Караліно, Тарусічы, Чэхаўшчына, Каробчыцы, Каменка, Капанікі, Нямейшы, Падліпкі, Саламянка). Асядалі тут таксама беглыя татары. Усіх іх у гістарычных крыніцах называюць "ласасянскія" (гл. *Ласосна*) ці "гарадзенскія". У 1503 яны падалі каралю польскаму *Аляксандру* прашэнне аб вызваленні іх ад выканання службы вартаўнікамі ў Гродне (ахоўвалі масты на *Нёмане* і вязняў у замку), да чаго змушае *староста гарадзенскі* Аляксандр Юр'евіч, князь Гальшанскі. Кароль задаволіў просьбу татараў. Паводле звестак І. Трусава "ласасянская" мячэць, першы дакументальны ўспамін пра якую сустракаецца ў 1539 г., знаходзілася ў сучаснай вёсцы Каробчыцы, непадалёк ад *могілак татарскіх*. На літоўскім сейме ў Горадні 1568 польскі кароль і вял. кн. літоўскі Жыгімонт Аўгуст пацвердзіў прывілеі літоўскіх татараў. У расійскі час жыў на вул. Татарскай, у доме "пад філярамі", чыноўнік-татарын Мурзіч.

Літ.: Краўцэвіч А. Вялікі князь Вітаўт. – Мінск, 1998. – С. 30–33; Трусаў І. 460 год татарскай мячэці на Ласосне, ці кароткая гісторыя татарскіх паселішчаў у ваколіцах Гродна // Биржа информации. – 01.04.1999. – № 13 (58). – С. 4; Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym. Wyd. Drugie. T. IV. – Warszawa, 1886; Nowe życie. – 1919. – 5 października. № 41 – s. 310; 25 maja. – № 23. – s. 176; Przegląd historyczno-wojskowy. T. IX. –Warszawa, 1937. – S. 209–213, 369–377, 394–395.

Таўлай Валянцін Паўлавіч (8.02.1914, Баранавічы – 27.04.1947, Мінск) – беларускі паэт, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Дзяцінства прайшло ў Лідзе (вучыўся ў польскай школе, 1924), Вільні, Зэльве (тут памерла яго маці). Вярнуўся да бабулі ў в. Рудаўку Слонімскага р-на і вучыўся ў школе в. Вялікая Кракотка. У 1925 г. паступіў на падрыхтоўчыя курсы пры польскай педагагічнай семінарыі ў Слоніме, адкуль, за нежаданне адмовіцца ад сваёй нацыянальнасці, быў выключаны. У 1927 паступіў у Віленскую беларускую гімназію, з якой быў выключаны за рэвалюцыйную дзейнасць. Затым турма, выезд у БССР, вучоба і літаратурная праца ў Мінску. Вярнуўся ў Вільню. З 1934 па 1939 сядзеў у гродзенскай *турме,* адкуль быў вызвалены Чырвонай арміяй. Працаваў у Лідскай газеце "Уперад". У гады *вайны Вялікай Айчынай*

быў сувязным партызанскага атрада на Навагрудчыне. У 1944 працаваў у навагрудскай газеце “Звезда”. На пачатку 1945 г. выкліканы на працу ў Мінск. Пад вершамі Т. ёсць пометкі: Рудаўка, Слонім, Гродна, Ліда, Навагрудак і інш. У гродзенскай турме створаная паэма “Таварыш” – гімн моцнага духу і непахіснасці рэвалюцыянера-барацьбіта.



С. 895

Ткачоў Міхаіл Аляксандравіч (10.03.1942, Мсціслаў Магілёўскай вобл. – 31.10.1992, Мінск) – беларускі гісторык і археолаг. Доктар гістарычных навук, прафесар (1989). Нарадзіўся ў сям’і настаўніцы, бацька загінуў у 1942. Для паступлення ва ўніверсітэт патрабавалася 2 гады стажу, таму пасля заканчэння школы працаваў у калгасе, на цагляным заводзе. З 1959 вучыўся завочна, а затым на стацыянары ў БДУ імя Леніна (гістарычны факультэт). Накіраванне ў 1964 атрымаў у г. Жодзіна, дзе працаваў спачатку настаўнікам гісторыі, потым завучам СШ № 3 (1964–1968). Закончыў аспірантуру пры інстытуце гісторыі АН БССР, пасля абароны працаваў тут навуковым супрацоўнікам (1968–1971). У Гродзенскім *універсітэце* працаваў з 1978 па 1989 ад пасады старшага выкладчыка да прафесара кафедры гісторыі СССР. У 1987 абараніў доктарскую дысертацыю па дзвюх спецыяльнасцях – археалогія і гісторыя, а ў 1989 атрымаў званне прафесара. Чалец прэзідыума БФК і рады Беларускага краязнаўчага таварыства, старшыня Гродзенскага гісторыка-культурнага клуба “*Паходня*” (1986–1989). На тэрыторыі Гродна ў 1980 Т. адкрыў разам з І. М. Чарняўскім *царкву Прачысценскую*, а разам з А. А. Трусавым у 1977, 1981, 1985–88 Т. даследаваў *дзядзінец*. Т. дабіўся магчымасці правесці раскопкі на двары *замка Новага*, дзе знаходзіўся Гродзенскі абласны камітэт КПБ, і знайшоў царкву XII ст. *гродзенскай архітэктурнай школы*. Ткачоў бараніў помнікі гісторыі і культуры Гродна (стары чыгуначны вакзал, Швейцарскую даліну і інш.), называў горад “сапраўдным музеем пад адкрытым небам”. Яшчэ ў 1988 напісаў зварот-прапанову гісторыка-культурнай праграмы “Гродна – горад-музей. Гродна – горад музеяў”, у якой прапаноўвалася стварыць у горадзе 18 музеяў і мемарыяльных цэнтраў. У выніку Гродна стала бы нацыянальным і міжнародным цэнтрам турызму. За абарону помнікаў старажытнасці пераследаваўся мясцовай уладай, абкамам КПБ, універсітэцкім кіраўніцтвам. Пасля Гродзенскага ўніверсітэта Т. з 1989 працаваў загадчыкам рэдакцыі гісторыі Беларусі выдавецтва “Беларуская энцыклапедыя” імя П. Броўкі (1989 – 6.04.1992), галоўным рэдактарам БелЭн (з 6.04.1992). Пад яго кіраўніцтвам пачалося выданне “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” у 6 тамах, тома “Археалогія і нумізматыка”. Пасля XXXI з’езда КПБ выйшаў з камуністычнай партыі. На устаноўчым з’ездзе Беларускага народнага фронту Т. быў выбраны намеснікам старшыні сейма. У сакавіку 1991 стаў старшынёй Цэнтральнай рады Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады. У інтэрв’ю А. Уліцёнку сказаў: “Мы павінны быць у народзе як баявыя патроны. І ўсё зрабіць дзеля адстрэлу зла і захавання дабра”. На доме № 27 на праспекце Будаўнікоў, дзе Т. жыў у 1978–89, усталяваная ў яго гонар мемарыяльная дошка.

Аўтар кніг: “Замки Белоруссии” (1-е изд.: Мн., 1977 /на бел.яз./, 2-е изд. значительно расширенное и дополненное: Мн., 1987), “Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII-XVIII ст.” (Мн., 1978); “Замкі і людзі” (Мн., 1991). У 1992 г. Т. у суаўтарстве выдаў кнігі “Большое искусство артиллерии” і “Древний Мстиславль”. Адзін з аўтараў шматтомнай “Гісторыі Беларускага мастацтва” (т. 1–4, Мн., 1987–1990). Суаўтар “Очерков по археологии Белоруссии”, ч. 1, 2. – Мн., 1970–1971; “Просвещение и педагогическая мысль в Беларуси”, “Белорусские изразцы”. Усяго яго пяру належыць болей за 400 навуковых публікацый. Узнагароджаны медалём Ф. Скарыны.

Літ.: Ганецкая І., Мяцельскі А. Міхаіл Ткачоў – даследчык археалагічнай і гістарычнай спадчыны Беларусі (1942–1992) // Гарадзенскі гадавік. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2020. – С. 91–99; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гродна-Вроцлаў: Гарадзен. б-ка, 2014. – С. 459–460; Семянчук Г., А. Мяцельскі, Л. Калядзінскі. Прафесар Міхась Ткачоў (10.03.1942 – 31.10.1992). Навуковец. Грамадскі дзеяч. Настаўнік // Białoruskie zeszyty historyczne. – Białystok. – 2010. – № 37. – S. 140–152; Уліцёнак А., Іншадумцы=Мыслящие иначе. – Мінск: Беларусь, 1991. – С. 264–287.

Тот Адам – губернскі архітэктар. З 1783 працаваў землямерам у каралеўскіх эканоміях. Згадваўся ў спісе *П. Цыцыянава* ў 1794 г. У 1795 атрымаў каралеўскі прывілей на драўляны дом на беразе *Гараднічанкі/Гарадніцы* пры Віленскім гасцінцы. Са станаўленнем *Гродзенскай губерні* Т. стаў *губернскім архітэктарам.*

Літ.: Рэвізская сказка Гродна пачатку XIX ст.// Гарадзенскі гадавік – 2024. – № 8. – С. 91.

Томін Мікалай Дзмітрыевіч (16.10.1886, пас. Качэрдык Усць-Уйскай станіцы Арэнбургскай губ., сёння Курганскай вобл. – 12.08.1924) – камандзір 10 кавал. дывізіі, якая захапіла Гродна ў ліпені 1920 г. падчас *вайны савецка-польскай*. Малодшы ўраднік 1-й Арэнбургскай казацкай дывізіі, якая перайшла на бок бальшавікоў. У 1918–1919 ваяваў з белачэхамі, Дутавым і Калчаком. Пасля Гродна Т. быў у населеных пунктах: Асавец, Ломжа, Млава, Цяханаў, Улацлавак, Ліпна, Плоцк. За баі Т. быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. У жніўні 1920 корпус Г. Гая, у складзе якога дзейнічала дывізія Т., быў інтэрнаваны на тэрыторыі Германіі. У верасні яму ўдалося збегчы з палону, дабрацца да Мінска і ўзначаліць Кубанскую конную дывізію. Удзельнічаў у ліквідацыі Булак-Балаховіча ў раёне Мазыра, а пазней – у падаўленні паўстання на Кубані і Антонава ў Тамбоўскай губ. Восенню 1923 быў камандзіраваны на Вышэйшыя акадэмічныя курсы ў Маскве, пасля якіх у 1924 атрымаў прызначэнне ва Усходнюю Бухару, дзе ў баі з басмачамі быў забіты.

Трактаты філасофскія – каля 50 напісаных у Гродне на лацінскай мове рукапісаў на філасофскія і прыродазнаўчыя тэмы канца XVII – пачатку XIX стст. Аўтарамі іх былі галоўным чынам выкладчыкі філасофіі – манахі мясцовых

кляштараў (найбольш бернардзінцаў, а таксама дамініканскага, езуіцкага, кармеліцкага і інш.): А. Бандзевіч, М. Дамашэвіч, Л. Дулевіч, Б. Мажэйка, Ю. Мышкоўскі, Ф. Пшылэнскі, Б. Станкевіч, І. Сцірпейка і інш. Усе яны знаходзіліся пад уплывам Асветніцтва – еўрапейскага ідэйнага руху, у якім логіка і тэалогія адсоўваліся на задні план. Аўтары разглядалі погляды *Каперніка,* Дэкарта, Ньютона, Р. Бошкавіча – адныя пагаджаліся з імі, іншыя крытыкавалі. Рукапісы знаходзяцца ў Навуковай бібліятэцы Вільнюскага ўніверсітэта.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 168–169; Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 55–56; Дорошевич Э.К. Философия эпохи просвещения в Белоруссии, Мн., 1971; Дорошевич Э.К. Новая философия в рукописных трактатах // Очерки истории философской и социологической мысли в Белоруссии (до 1917 г.). Мн., 1973.

Тралейбус – грамадскі транспарт, першая лінія якога пачала праектавацца паводле рашэння *гарадскога выканаўчага камітэта* ад 25.09.1965. Яна павінная была прайсці па пр. Касманаўтаў, вул. *Леніна, Ажэшкі*, Дзяржынскага, 17 верасня, Горкага ў прамым напрамку і па вул. Горкага, пл. Леніна, вул. Сацыялістычнай, К. Маркса, пр. Касманаўтаў у адваротным напрамку. 16.01.1972 абласны выканаўчы камітэт прыняў рашэнне "Аб зацвярджэнні задання і зводнага каштарысна-фінансавага разліку на будаўніцтва тралейбуса ў г. Гродна". Згодна з ім працягласць маршрута павінная была быць 7 км, а колькасць машын у дэпо – 100. З 1.06.1974 пачало працаваць Гродзенскае тралейбуснае ўпраўленне, а 5 лістапада быў адчынены першы тралейбусны маршрут працягласцю 8,5 км ад *хімкамбіната* імя *Прытыцкага*. 29.12.1975 здадзеная ў эксплуатацыю другая чарга тралейбусных ліній: па вул. Кастрычніцкай, Вялікай Траецкай, Віленскай, Горкага, Астроўскага, пл. Леніна, Сацыялістычнай і далей па існай лініі № 1. Пазней адкрываліся новыя маршруты: 1.11.1976 – №3 хімкамбінат – *Фарты* (16,2 км), № 4 Дом сувязі – Фарты (17 км); 1978 – № 5 і № 6.

С. 896

Літ.: Саяпін В., История общественного транспорта Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 49–54.

Трацяк/Тшэцяк Юльян Віктаравіч – удзельнік падзей 1863 г.. нарадзіўся ў в. Шымакі Сакольскага ў., меў 29 гадоў у 1864 г. Ягоны бацька служыў у 1-ым гвардзейскім уланскім палку на баку Напалеона Банапарта ў 1807–1815, меў Крыж Ганаровага Легіёна 3-й ступені. Юльян вучыўся ў Гродзенскай *гімназіі*, даслужыўся ў войску да чына падпаручніка (1854–1859) і быў узнагароджаны срэбным медалём у памяць Крымскай вайны. У Гродна прыбыў з Нежына Чарнігаўскай губ. у снежні 1862 і заняўся пераплётным рамяством. Дапамагаў Сільвестровічу перадаваць рэвалюцыйныя паперы павятовым і акруговым начальнікам ваяводства. Верагодна, Т. спрабаваў угаварыць І. Ф. Лапінскага, аканома маёнтка Калбасін, выконваць ролю развозчыка карэспандэнцыі ў Ваўкавыскі і Слонімскі паветы. Арыштаваны ў маі 1864. На допытах расказаў следчым шмат таямніц паўстанцкай арганізацыі. Падчас

вобыску ў маёнтку бацькі Шымакі Сакольскага ўезда ў пакоі Юльяна знайшлі "мешочек со свинцовыми литерами". Прыгавораны да крапасных катаржных прац на 8 гадоў. Рашэннем гродзенскага губернскага праўлення ад 13.12.1864 маёмасць падлягала канфіскацыі.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, 127; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 52, 280–280 адв., 290, 311–319; с. 1, а. 555 адв.; воп. 1, с. 40, а. 180; ф. 320, воп. 2, с. 160, а. 27 адв.–28; Jodkowski J. Rok 1863... N 176, 34.

Тройдзень (? – 1282?) – вялікі князь літоўскі (1270–1282), валадар *Горадзена*. Малодшы сын вялікага князя Нарымонта, брат князя Гойшы – легендарнага продка князёў Гальшанскіх. Пасля Вайшэлка быў Навагародскім князем. З 1270 "нача княжити в Литве", ваяваў з Валынскім князем Уладзімірам Васількавічам. У 1274 авалодаў з дапамогаю гарадзенскай дружыны г. Драгічынам на Бугу і "избиша все от мала и до велика". Т. далучыў да тэрыторыі фармаванай ВКЛ Нальшанскую зямлю (у тым ліку Крэва, Гальшаны, Ашмяны). У Горадзене збудаваў *"столп бо без камен"*. У 1276 пасяліў пад горадам і пад Слонімам прусаў і барцян, якія збеглі ад пераследу *крыжакоў*. У 1278 Т. адбіў напад на Горадзен галіцка-валынскіх князёў. Выкарыстаўшы адсутнасць аховы іх войска, гарадзенская дружына разам з прусамі і барцянамі напала на рабаўнікоў "и избиша я все и дроугим изомаша и в город ведоша"; Мсціслаў, сын Раціслаўка "наги и босы" ледзь уцяклі да бацькі, князя Луцкага. Раніцай да Горадзена падыйшлі асноўныя галіцка-валынскія войскі, але гараджане і дружына "аки мертва стояша на забралах города" і мужна адбіла штурм. Князі падпісалі мір і вярнуліся дадому. Да канца жыцця Т. яны больш не прыходзілі пад Горадзен.

Трыбунал Літоўскі/Галоўны (літоўскі) трыбунал – вышэйшы апеляцыйны суд ВКЛ, усталяваны 1.03.1581 *Стэфанам Баторыем*. Складаўся з суддзяў, якіх выбірала штогод шляхта на *сеймiках*. На паседжанях разглядаліся апеляцыйныя скаргі на прыгаворы і дэкрэты (пастановы) судоў земскіх, замкавых, падкаморскіх і панскіх. Справы разбіраліся адкрыта, з удзелам двух бакоў і іх адвакатаў. Рашэнні трыбунала мелі моц сеймавых пастаноў, і адмяніць іх не меў права вялікі князь літоўскі і кароль польскі. Трыбунал выконваў таксама натарыяльныя абавязкі. Па просьбе гродзенскага сеймiка 20.08.1766 і *Тызенгаўза А.* варшаўскі *сейм Рэчы Паспалітай* 1775 г. перанёс рускую кадэнцыю (сесію) трыбунала з Менска і Наваградка ў Гродна. У 1775–1791 у горадзе адбылося 17 кадэнцый, кожная на працягу пяці месяцаў. Распачыналіся яны 1 мая, а заканчваліся 29 альбо 30 верасня. Месцам працы Трыбунала і жыхарства некаторых яго дэпутатаў быў *замак Новы*.

Літ.: Дзярновіч А. Трыбунальскія сталіцы Вялікага Княства Літоўскага: праблемы лакалізацыі месцаў пасяджэння // Гарадзенскі соцыум 2013: Гісторыя і памяць XV – XX стст. – Гародня, 2014. – С. 76–90; Орловский Е. Очерк истории города Гродны. // Гродненщина. Часть 1. История, краеведение, этнография. По материалам "Памятных книжек Гродненской губернии". Т. 2. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 115;

Stankiewicz A. Działalność Trybunalu Litewskiego w Grodnie (w latach 1775 – 1791) // Grodnae et orbi: гарадскія супольнасці і гарадское асяроддзе XV – XX стст. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2018. – С. 92–101.

Трусаў Алег Анатольевіч (7.08.1954 г., Мсціслаўль) – беларускі гісторык, публіцыст, грамадскі дзеяч. У 1976 скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1976 па 1992 працаваў у Беларускім рэстаўрацыйным праектным інстытуце загадчыкам аддзела комплексных навуковых даследаванняў. У гэты час праводзіў раскопкі на *Замкавай гары* ў Гродне ў 1981, 1985–1988 гг., у выніку якіх была выяўленая гістарычная забудова Гродна 12–17 стст. (гл. *Ткачоў М. А.*). З 1996 працуе ў Беларускім ўніверсітэце культуры: да сакавіка 1998 быў дэканам факультэту бібліятэчна-інфармацыйных сістэмаў, затым – дацэнтам кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства. У 1990 Т. быў адным з заснавальнікаў Беларускага гуманітарнага ліцэя імя Якуба Коласа. У 1990–1996 быў дэпутатам Вярхоўнага Савета XII склікання. З 1990 па 1995 гады – намеснік старшыні камісіі ВС Рэспублікі Беларусь па адукацыі, культуры і ахове гістарычнай спадчыны. Арганізатар і рэктар Беларускага ўніверсітэта (2018–2020).

Кнігі: Памятники монументального зодчества Белоруссии 11–17 вв. – Мн., 1988; Беларуская кафля. – Мн., 1989 (у суаўтарстве); Старонкі мураванай кнігі: Манументальная архітэктура эпохі феадалізму і капіталізму. – Мн., 1990; Манументальнае дойлідства Беларусі 11–18 стст: Гісторыя будаўнічай тэхнікі. – Мн., 2001 і інш.; Невядомая нам краіна: Беларусь у яе этнаграфічных межах. – Мінск: Кнігазбор, 2009.

Літ.: Корзенко Г. В. Историки Беларуси в начале XXI столетия. Библиографический справочник. Минск, 2007. – С. 393; Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада/ Пад рэд.В. Карнялюк, В. Швед. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2012, с. 32–33; Трусов Олег // Кто есть кто в Беларуси. – М.: Книжный дом "Университет", 1999; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т. 6. Кн. 1. – Мн.: БелЭн, 2001.

Трускулаўскія/Трускаласкія – гродзенскія жыхары, удзельнікі антыўрадавых выступленняў у Гродне ў 1861 г., перад *паўстаннем 1863 г.* Патомкі вядомых польскіх акцёраў і тэатральных дзеячаў Трускалаўскіх Дамініка Тамаша (20.12.1750 – 1797) і Агнешкі Марыянны з Мураноўскіх (1755–1831).

Дамінік Тамаш выступаў у Гродне ў 1780-х гадах, граў у Варшаўскім нацыянальным тэатры, быў дырэктарам тэатраў у Варшаве, Львове, Любліне. Яму прыпісваюць аўтарства перакладаў камедый "Кароль у краіне раскошы" і "Разумны з кахання" (1787). Трупа яго выступала ў Познані, Гданьску, Ловічы.

Агнешка Марыянна з Мураноўскіх (1755–1831) – знакамітая актрыса і спявачка, пасля смерці мужа кіравала яго антрэпрызай у варшаўскім палацы Радзівілаў. У *тэатры Тызенгаўза* грала разам з мужам у розных пастаноўках (1774); у трагедыі "Баверлей, або англійскі гулец" (1777–78, 1784), спявала ў оперы "Для любові выдуманае шаленства" (1779–81); у 1781–83 выступала ў Львове; затым у Варшаве, дзе спявала ў 1783 ролю Яўгеніі ў аднай-

меннай оперы, у оперы “Суліман II” ролю Раксаланы (1786), “Слуга пані” (1787), “Баверлей” паўтарыла ў Варшаве (1792, 1793) і г. д.

Іх дачка Юзэфа Вікторыя Францішка (мажліва, нарадзілася ў Гродне ў 1780 ці 1781) вядомая пад прозвішчам свайго мужа *Леду*(хоўская) таксама стала вядомай польскай актрысай. Першы раз на сцэну выйшла ў Варшаве ў чэрвені 1792 г. З 1801 па 1805 не выступала.

Літ.: Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017; Bator Z., Truskolaski Dominik Tomasz // Słownik biograficzny historii Polski. T. 2 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków; Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. – Lwów. T. I, c. 265, 288, 304, 360, 388, 400, 401,406; T. II, 1925. – S. 133, 208, 239, 297; Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – C. 1562–63; Szenic S. Cmentarz Powązkowski. 1790–1850. Zmarli i ich rodziny. – Warszawa: PIW, 1979, s. 63–64, 401–405.

Трэмбіцкі Міхал – палкоўнік, камандзір Гродзенскага батальёну стральцоў, сфармаванага ў чэрвені-ліпені 1794 г. у Гродне. Брат аўтара ўспамінаў (мемуарыста Трэмбіцкага). Яго вельмі любілі гродзенцы. Яму ўдалося добра абмундзіраваць і ўзброіць свой батальён за кошт ахвяраванняў жыхароў Гродзенскага пав.

Літ.: Woltanowski A. Grodno w powstaniu kościuszkowskim // Grodno w XVIII wieku. Miasto i ludność, Białystok, 1997, s. 33.

Тубянскі Меер Ізраэлевіч – гродзенскі фотамайстар. З мяшчан Цельшаўскага ў. Яго фотамайстэрня па вул. Брыгіцкай (цяпер вул. К. Маркса) вядомая з 1863 г. Дазвол на яе адкрыццё Т. атрымаў 21.05.1864 пав. ст. ст.

Турма гродзенская – турэмны замак, пабудаваны ў 1820 г. побач з былым кляштарам *касцёла Св. Францішка Ксаверыя*, на месцы саду *калегіума езуіцкага*. На будаўніцтва МУС выдаткавала звыш 25 тыс. руб. асігнацыямі. Працамі кіраваў губернскі архітэктар Багаміл, падрад на будаўніцтва ўзяў гродзенскі купец Грыдзель. Будынак зрабілі з цэглы, двухпавярховы, з вежамі па вуглах. Меліся 12 арыштанцкіх пакояў, памяшканні для 80 перасыльных арыштантаў, “сакрэтныя камеры”, пакоі для кіраўніка турмы, каравульнага афіцэра і жаўнераў. У правай пярэдняй вежы на першым паверсе знаходзіўся шпіталь для мужчын, на другім – для жанчын, у левай вежы – кладоўкі для арыштанцкіх рэчаў. У вежах з тылу знаходзіліся баня і агульная кухня. На тэрыторыі турмы пабудавалі казарму для злачынцаў першага і другога разрадаў, агульную прыбіральню, калодзеж, кузню. У кастрычніку 1821 пабудавалі капліцу Св. Пятра ў кайданах, якую асвяціў прыёр *дамініканскага кляштара*, ксёндз Машкоўскі.

Падчас *паўстання 1830–1831 гг.* у падвальных памяшканнях турмы і прыстасаваным да яе першым паверсе будынку паезуіцкага кляштара сядзелі камандзір паўстанцкага атрада Казімір Багдановіч, а ў 1833 – эмісар Ш. Канарскага *Валовіч Міхал*. У 1839 губернскі архітэктар Міхайлаў склаў план рамонту

і рэканструкцыі турэмнага замка, а ў наступным годзе на гэта было выдаткавана болей зп 28 тыс. руб. Працы адбываліся з чэрвеня 1841 па жнівень 1842 г. Апякаў іх начальнік турмы Шыгрын. Да сярэдзіны XIX ст. турма выконвала функцыі папярэдняга зняволення падчас вядзення следства, затым – месца адбыцця пакарання. Для гэтага ў 1853 да будынка турмы дабудавалі два флігелі, у якіх былі 10 камер для адзіночных падследчых арыштантаў. У наступным годзе пяць камер для вязняў з'явіліся на першым паверсе кляштара. Агульная умяшчальнасць камер дасягнула 90 чал., але фактычная напаўняльнасць арыштантаў магла значна яе перавышаць.

Падчас *паўстання 1863–64 гг.* арыштанцкія камеры былі зробленыя ў паезуіцкім будынку (тут размясціліся і камісіі – следчая і ваенна-судовая) і на другім ды трэцім паверсе калегіума. Апошні ў 1882 перайшоў цалкам у валоданне турэмнага ведамства. Сярод паўтанцаў, якія сядзелі тут у гэтыя гады быў *Напалеон Орда*, які пакінуў шэраг малюнкаў пра Гродна. Умовы ўтрымання былі вельмі цяжкія: адсутнічалі ацяпленне, вадаправод і каналізацыя (адсюль смурод), драўляная падлога была пашкоджаная, муры неатынкаваныя (адсюль холад і вільгаць), недахоп святла. Да канца 1830-х гадоў ежай займаліся самі арыштанты – ім выдавалася пэўная сума грошай (асобы вышэйшага саслоўя атрымоўвалі ў 1,5–2 разы больш сродкаў, чым ніжэйшага стану). Пасля рэформы сістэмы харчавання прадукты закупаліся і выдаваліся арыштантам цэнтралізавана: 2,5 фунты хлеба, каша ці баланда з розных круп, гародніна (буракі, гарох, шчаўе), запраўлялі суп салам або алеем (у посныя дні). Пітная вада прывозілася з Нёмана, таму санітарны стан яе быў нялепшы. Вадаправод прыйшоў у горад у 1874, а ў турму – у жніўні 1876.

У 1885 г. тэрыторыя турэмнага замка складала ў даўжыню 32 сажані, шырыню – 31,5 (1 сажань=2,1 м). Мураваная агароджа была з трох бакоў, а з чацвёртага стаяў трохпавярховы будынак былога езуіцкага калегіума. У турме ўтрымлівалася каля 300 арыштантаў. У 1891 быў пабудаваны новы трохпавярховы будынак, у якім было 72 пакоі (66 для размеркавання арыштантаў). Падлогі ў камерах былі драўляныя, а ў калідорах – каменныя пліты. У кожнай камеры былі: пад'ёмны жалезны ложак, каналізацыя, керасінавае (пазней электрычнае) асвятленне, званок, зімой падаграванае паветра, вентыляцыя. У 1893 турма была абсталяваная ўнутранай і гарадской тэлефоннай сувяззю. У наступным годзе была пабудаваная турэмная царква, і пачалося будаўніцтва новага шпіталя на 28 чал.

У 1912 г. комплекс гродзенскай турмы складаўся з наступных будынкаў: галоўнага корпуса (трохпавярховы будынак былога паезуіцкага калегіума); трохпавярховага будынка адзіночнага ўтрымання; двухпавярховага будынка новага флігеля; двухпавярховы адміністрацыйны будынак з жылымі памяшканнямі (былы дом Гінзбурга); турэмнай канторы; шпіталя; бані з пральняй; царквы са званіцай; хлява; кузні; качагаркі; цейхгаўза. Меліся два гаспадарчыя двары, два двары для прагулак арыштантаў (асобна мужчынскі і жаночы), шпітальны двор, прыватны адміністратыўны двор, гарод, кветнікі. Усё гэта было размеркаванае на тэрыторыі каля 16 гектараў. Увесь комплекс пабудоў

быў абнесены мураваным плотам і захаваўся да нашых дзён. У міжваенны час у Т. пабывала шмат дзеячаў беларускага руху: Грыб Т., *Мядзёлка П.*, Натусеіч Я., *Баран С.*, Таўлай В., *Тарашкевіч Б., Прытыцкі С.* Тут сядзелі беларускія партызаны 1919–20 гг. У 1924 колькасць зняволеных дасягала 497 чал., у 1927 – 554 чал., у 1931 – 650 чал., у 1935 – 1 005 чал. (з іх 344 палітвязні). У лукашэнкаўскі час у Т. г. патрапілі Шарамет П., Пачобут А., Леванеўскі В., Дашкевіч Д.

Літ.: Андэрсан Ф. У гродзенскай турме. Верасень 1863. // Горад святога Губерта. Альманах лакальнай гісторыі. Вып. VII. – Гродна, 2013. – С. 42–81; Вашкевіч А. Гродзенская турма. Дзвесце гадоў на адным месцы // Наша гісторыя. – 2020. – № 1 (18). – С. 74–79; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гродна-Вроцлаў: Гродзенская бібліятэка, 2014. – с. 233–235, 245–246; Лисицин В. За тюремной стеной. История гродненской тюрьмы. XIX – 1939 г. – Гродно, 2003; Радзюк А. Чалавек за кратамі: гарадзенскія турмы і вязні ў XIX ст. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. / пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мінск: Зміцер Колас, 2011. – С. 295–328; Libicz H. Spod Wilna na Syberię. – Warszawa: Tor, 1990. – С. 20–27; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў / А. Чарнякевіч. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 123–124.

Тухачэўскі Міхаіл Мікалаевіч (15.02.1893, Масква – 11.06.1937) – камандуючы шэрагу армій у грамадзянскую вайну ў Расіі (Паволжа, Поўдзень, Урал, Сібір), маршал СССР (1935). 28.07.1920 прыехаў у Гродна разам са штабам 4-й арміі, 30 ліпеня удзельнічаў у ганаровым сходзе, прысвечаным усталяванню Савецкай улады на Гродзеншчыне. Восенню 1920 Т. ліквідаваў атрады Булак-Балаховіча, у сакавіку 1921 – кранштацкі мяцеж, у маі – антонаўскі (выкарыстоўваў хімічную зброю супраць мірнага насельніцтва). Восенню 1921 Т. быў прызначаны начальнікам Вайсковай акадэміі Рабоча-сялянскай Чырвонай арміі. У 1925 – камандуючы войскамі Заходняй вайсковай акругі, чалец Рэвалюцыйна-вайсковага Савета СССР. У 1925–1928 быў начальнікам штаба Чырвонай арміі. З 1934 – намеснік, а з 1936 – першы намеснік наркама абароны. У 1934–1937 – кандыдат у чальцы ВКП(б), чалец Цэнтральнага выканаўчага камітэта СССР усіх скліканняў. Неабгрунтавана рэпрэсаваны, рэабілітаваны пасля смерці. Быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і Ганароваю зброяй. Працы Т. зрабілі пэўны ўнёсак у развіццё вайсковай навукі і практыку вайсковага будаўніцтва.

С. 897

Тызенгаўз Антоні (1733, м. Жалудок Гродзенскага пав. – 31.03.1785, Варшава) – дзяржаўны дзеяч ВКЛ, рэфарматар, які апярэдзіў свой час і стаў ахвяраю ментальнасці ліцвінскай грамадскасці, унутраных і знешніх абставін развіцця дзяржавы, палітычных інтрыг. Паходзіў з малодшай ветэльскай лініі роду Тызенгаўзаў (XIV пакаленне). Нарадзіўся як дзясятае дзіця ў сям'і Бенедыкта і Ганны Апалоніі Ружы з Бяганскіх. Пачатковую адукацыю атрымаў у хаце пад наглядам маці, а затым вучыўся ў езуіцкай калегіі пры Віленскай акадэміі. Паваротным момантам у жыцці Т. стала ягоная сустрэча са *Станіславам Аўгустам Панятоўскім* у Воўчыне пры рэзідэнцыі канцлера ВКЛ

М. Чартарыйскага. Як піша польскі пісьменнік М. Брандыс, яны "(…) разам уваходзілі ў першыя таямніцы палітыкі. Разам засвойвалі праграму прагрэсіўных рэформ Чартарыйскіх, разам марылі аб цывілізацыі Польшчы і вызваленні яе ад саксонскай анархіі".

Сяброўства Тызенгаўза з Панятоўскім паспрыяла пачатку яго бліскучай кар'еры. У 1757 стаў гродзенскім маршалкам. У 1761 Т. абралі паслом на сейм у Варшаве, у 1763 – прызначылі вялікім пісарам літоўскім, у 1764 – вялікім канюшым літоўскім. На каранацыйным сейме кароль узнагародзіў яго ордэнам св. Станіслава (8.05.1765), прызначыў арандатарам брэсцкай, шавельскай і *гродзенскай каралеўскіх эканоміяў* і кіраўніком каралеўскіх *мануфактураў*. Т. валодаў шэрагам маёнткаў: Жалудок, Ігумен, Каменка, Каралін, Паджыжа, Паставы, Ракішкі, Рэпіхаў. У 1765 г. Т. стаў надворным падскарбіем літоўскім і *старастаю гродзенскім*. Як палітычны дзеяч Т. у ВКЛ умацоўваў прыхільнікаў караля і накіроўваў працу сеймікаў (абед дадзены Т. для шляхты перад сеймікам у Гродне апісвае англічанін Кокс В.). Т. задумаў у кароткі тэрмін стварыць у адсталай земляробчай краіне ўсе галіны прамысловасці, якія існуюць у іншых развітых дзяржавах Еўропы. Для гэтага ў яго былі ўлада, фінансы, неабмежаваны давер караля, а таксама паплечнікі. Ды і сам быў вельмі працавіты, больш за 3 гадзіны ўначы не спаў. У 1777 пабываў у замежжы (Германія, Бельгія, Галандыя, Англія, Францыя).

Прадмесце Гродна, *Гарадніца,* стала цэнтрам гаспадарчых і культурных рэформаў. За 15 гадоў Т. пабудаваў тут 50 будынкаў. Прагрэсіўны польскі публіцыст Ю. Выбіцкі пісаў, што "Гарадніца магла бы знаходзіцца і ў Галандыі". Сёння мы бачым толькі рэшткі. Ужо на плане Гродна 1849 г. няма 30 пабудоў. У 1958 захоўвалася 20 будынкаў ансамбля XVIII ст., а ў 1988 – 7. Т. адчыніў больш за 20 мануфактур, 17 з якіх знаходзіліся ў межах сучаснага *Гродна*. Інтэнсіўна эксплуатаваліся ліцвінскія лясы і пушчы. Т. будаваў новыя дарогі, рамантаваў старыя гасцінцы, узводзіў масты і плацiны, расчысціў рэчышча *Нёмана* ад Гродна да Вілii, пабудаваў Каралеўскі канал, па якім можна было адпраўляць прадукцыю ў парты Каспійскага і Чорнага мораў.

Пільную ўвагу звярнуў Т. на адукацыю. У Гродне ўзніклі *школы* будаўнічая, бухгалтарская, землямераў, каморнікаў, медыцынская (са шпіталем), музычная, *корпус кадэцкі*. Французскі прафесар *Жылібер Жан Эмануэль* стварыў у Гродне каралеўскі *батанічны сад*. Планавалася адкрыццё астранамічнай абсерваторыі, для якой *Нарвойш* закупляў у Галандыі, Германіі, Англіі абсталяванне. З-за адстаўкі Т. не адкрылася ў Гродне Акадэмія навук. Нямала зрабіў Т. у галіне культуры. У 1765–80 у Гродне грала *капэла Тызенгаўза*, створаны *тэатр* меў вакальную групу і балетную трупу. У будынку *калегіума езуіцкага* была заснаваная *друкарня каралеўская*. Т. быў калекцыянерам і ў сваім палацы на Гарадніцы зрабіў галерэю. Інвентары 1785 і 1790 зафіксавалі "Каралеўскі партрэт", 8 ландшафтаў, тысячы копій выяваў духоўных асоб і розных гарадоў.

У 1780 г. Т. быў адхілены ад кіраўніцтва каралеўскімі *эканоміямі*. Гэтаму паспрыялі расійская царыца Кацярына II і яе пасол у Польшчы Штакельберг, якія былі супраць усяго, што добра для Рэчы Паспалітай. Іх падтрымоўвала

антытызенгаўзаўская кааліцыя (біскуп Ю. Касакоўскі, маршалак надворны каронны Ф. Жэвускі і падканцлер Я. Храптовіч) і каралеўская сям'я, у казне якой Т. меў доўг у 1 802 572 злотых. Эканамічнымі прычынамі падзення Т. былі: прыгонная праца большасці працаўнікоў прадпрыемстваў, арыентаванасць прадукцыі на багатую шляхту, прывоз сыравіны з замежжа, звышнапружанасць фінансавага стану.

Пасля адстаўкі некаторы час Т. жыў у віленскім прадмесці Сніпішкі, а потым – у Варшаве, дзе і памёр пасля хваробы. Два тыдні цела Т. знаходзілася ў Варшаве, і ў мясцовых касцёлах адбываліся набажэнства – у гісторыі Польшчы толькі пахаванне *Пілсудскага Ю.* было большым па тэрміне. 20.04.1785 Т. вывезлі з Варшавы і павезлі ў м. Жалудок, дзе пахавалі ў фамільным склепе кармеліцкага кляштара. Сёння яго парэшткі знаходзяцца ў склепе касцёла Ушэсця ў Жалудку. У *касцёле езуіцкім* Гродна стаіць *помнік Тызенгаўзу*. Імя Т. носяць плошча ў Гродне, мясцовыя капэла і мастацкая галерэя.

Літ.: Гардзееў, Ю. Рамантык эпохі Асветніцтва: Антоні Тызенгаўз / Юры Гардзееў. – Мінск: Тэхналогія, 2008. – 65 с.; Гродно во второй половине прошлого столетия // Памятная книжка Гродненской губ. на 1869 г. – Гродна, 1868. – С. 13–27; Швед В.В. Антоні Тызенгаўз // 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. – Мінск 2008, с. 50–51; Швед В.В. Антоні Тызенгаўз і сучасны Гродна // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 211–217; Швед В.В. Антоний Тизенгауз и Гродно XVIII и XXI веков // Наследие родни графов Тизенгаузов, Rokiskis, 2013. – С. 49–63; Kościałkowski S., Antoni Tyzenhauz podskarbi nadworny litewski, t. 1–2, Londyn, 1970—1971; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 341, 691–692; 881; Ziemczonok J., Trzej Tyzenhauzowie. Szice biograficzne. – Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW, 2007. – C. 29–51.

Тызенгаўзы – шляхецкі род, які стаў валодаць зямельнымі пляцамі ў *Гарадні* на пач. XVIII ст. Магчыма, першым уладальнікам пляцаў на скрыжаванні вул. Златарскай, Скаліманаўскай і Рэзніцкай стаў навагрудскі ваявода Стэфан Т. У 1709 ён запісаў свае землі сыну Міхалу. Валоданні Т. значна павялічыліся пры гарадзенскім *старосце* і надворным літоўскім падскарбіі *Тызенгаўзе А.* У 1775 ён набыў пляц з камяніцай і карчмой на паўночным баку *Рынку* (ад віленскага біскупа *Масальскага*); камяніцу на рагу Рынку і Замкавай вул., дзве камяніцы на вул. Замкавай; юрыдыку на вул. Падольнай (9 пляцаў). Адным з трох спадкаемцаў Антонія Т. быў Ігнацы Т. У Латвіі (былой Курляндыі, дзе пасяліўся род Т.) ёсць мясцовасць пад назвай Тызенгаўз (суч. латышская назва: Laši). У 1920-х гадах належала графу Райнольду Пшэздзецкаму.

Літ.: Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2008. – С. 222–223; Hardziejeu J. Źródła do dziejów Grodna w zbiorach krakowskich. Wstęp do badań // Pogranicze polsko-litewsko-białoruskie. Źródła historyczne – stan badań. – Białystok: wyd-wo "Prymat", 2003. – S. 27; Obiasnienie interesu Miasta Sejmowego J.K.Mci Grodna. – Grodno, 1789. – S. 38; Urbański A. Memento kresowe. – Warszawa, 1929. – S. 131, 135; Ziemczonok Józef, Trzej Tyzenhauzowie. Szkice biograficzne. – Warszawa: Katedra Białorutenistyki UW, 2007. – 151 s.

Тэатр гродзенскі, пачынаўся з тэатра школьнага *езуіцкага калегіума* (17 – першая пал. 18 ст.), потым быў *тэатр Тызенгаўза А.* Была пабудаваная музычная і тэатральная прыбудова, часам прадстаўленні ішлі ў зале *палаца Тызенгаўза*, спецыяльна прыстасаваннай для спектакляў (мела памост для сцэны). Будынак прызначаны для тэатра пабудаваў *староста гродзенскі Станіслаў Панятоўскі* ў 1784 г. На мяжы 18–19 стст. сталай трупы не было, прыязджалі ў Гродна камерцыйныя трупы (французскія, італьянскія) на адзін сезон. Восенню 1784 прыехаў з варшаўскай трупай *Багуслаўскі Войцех* (разам з ім былі *Трускаляская*, *Дэшнер С.*). У 1786 гралі акцёры з былога дваровага тэатра Радзівіла з Нясвіжа. У 1791–93, 1795–96 выступала трупа *Мараўскага Дамініка* (у складзе былі яго жонка, Мацей Кажынскі, Ян Руткоўскі, Туроўскі). У 1793 кіраўніцтва тэатрам і відовішчамі ў Гродне трымаў маршалак вялікі каронны Міхал Ежы Мнішак. Ён упарадкаваў тэатральную адміністрацыю, усталяваў кошты білетаў і тэатральны рэгламент, увёў цэнзуру мастацкіх твораў. Мараўскі павінен быў прытрымлівацца названых працэдур. 12.10.1793 тэатральную канцэсію атрымаў Кажынскі Мацей і даваў спектаклі да вясны 1794, а потым у 1801–1802. *Шыманскі Ян* выступаў у Гродне ў 1795, 1802–1806, 1808, 1820–?. У 1802 цар *Аляксандр I* падчас побыту ў Гродне пабачыў стан тэатра і даў распараджэнне аб яго рамонце за кошт казны (выдзелілі 1538 руб. 67 кап.). У 1802–1809 на гродзенскай сцэне выступала трупа Дэшнер Саламеі, якая канкуравала і супрацоўнічала з трупай Шыманскага. У студзені 1815, ліпені 1817, студзені 1818 прадстаўленні давала трупа Камінскага Каспера. У 1832 у Гродне выступала трупа Вікенція Вярбіцкага., які за п'есу "Марыя, каралева шведская і Кацярына, каралева польская" адсядзеў на гаўптвахце 3 дні. У 1834–1839 у горад прыязджала трупа Станіслава Навакоўскага, якому належыць гонар арганізацыі першага дырэкцыйнага тэатра ў Гродне. З лістапада 1839 па чэрвень 1840 у горадзе была трупа вядомай віленскай спявачкі і актрысы Ізабэлы Гурскай. Яны адныя з першых ставілі п'есы маладой украінскай пісьменніцы-драматурга Квіткі-Аснаўяненкі "Наталка-Палтаўка", "Маскаль-чараўнік". У 1841 у Гродна прыехала трупа Карла Вільгельма фон Шмідкафа, у рэпертуары якой было каля 250 п'ес (сярод іх 48 опер). Віленскі генерал-губернатар Ф. Я. Мірковіч з мэтай русіфікацыі тэатра правёў у ім рэформу: утваралася губернская дырэкцыя, якая мела права наймаць трупу і заключаць кантракты з антрэпрынёрамі, павінная была сачыць за рэпертуарам, займацца рамонтам тэатральнных будынкаў. Усё гэта ўплывала і на гродзенскі тэатр, дзе сталі выступаць рускамоўныя трупы з рускім рэпертуарам. Стварыць польска-рускі тэатр прапанавалі С. Навакоўскаму. Ён адкрыўся 13.10.1846. Да *паўстання 1863–64 гг.* польскую мову і репертуар выцесніць з тэатра не ўдалося. У 1850-я гады гродзенская сцэна не мела сталай трупы. Часцей прыязджалі віленскія акцёры, выступала мінская трупа Даната Грунвальда, трупа Яна Хэлмікоўскага (1858–61), трупа Мікалая Гана. Жонка губернатара *О'Брыен дэ Лясы* М. успамінала, што яны мелі спецыяльную ложу з невялікім салонам і пісала, што "Тэатр у Гродне меў знакамітыя традыцыі, праз яго сцэну прайшло шмат у будучыні знакамітых варшаўскіх артыстаў".

С. 898

У часы II Рэчы Паспалітай Т. носіць назву імя *Ажэшкі Элізы*. На сцэне выступаюць Дымша (Багінскі) Адольф, Скомпскі Браніслаў, Алексы Аляксандр, Самасарская Ядвіга і інш. У 1921 Скомпскі атрымаў субсідыю (500 тыс. марак) ад Міністэрства па справах рэлігіёзных канфесій і грамадскай адукацыі для дзейнасці тэатра ў Гродне і Беластоку.

Літ.: Куль-Сяльверстава С. Я. Жынчыны ў тэатральным жыцці Гродна ў другой палове XVIII – XIX стст. // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 160–170; Куль-Сяльверстава С., Польскі тэатр у Гродне ў першай палове XIX стагоддзя // Шлях да ўзаемнасці=Droga ku wzajemności: / Пад рэд. М. Кандрацюка, Б. Сегеня – Беласток: Універсітэт у Беластоку, 2004. – С. 581–603; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 62, 146; Drucka N. Try czwarte… Wspomnienie, 2011, s. 115, 117; Nowy Korbut. T. 4. – S. 183; Jędrychowski Zbigniew, Teatra grodzieńskie 1784–1864, Warszawa 2012; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – С. 39–43.



С. 899

Тэатр абласны драматычны, створаны ў верасні 1947 г. на аснове трупы Бабруйскага абласнога тэатра, якая ў той час працавала ў Гродне. Знаходзіўся спачатку ў будынку старога *тэатра гродзенскага* (цяпер тут *тэатр лялек*). Адкрыўся 20.10.1947 спектаклем А. М. Астроўскага "Праўда добра, а шчасце лепш". Паводле рашэння гродзенскага выканкама ад 24.05.1967 быў пабудаваны ў 1976–1984 гг. новы будынак (арх. Р. Мачульскі, А. Пархута) на месцы *кляштара бернардзінскага жаночага*. Ён мае галоўную залу з амфітэатрам і балконам для гледачоў на 700 месц, вестыбюль і фае, адміністратыўны корпус з малой залай на 216 месц. На цокальным паверсе размеркаваныя репетыцыйная зала, акцёрскія пакоі, апаратная, склад дэкарацый. Перад уваходам у тэатр стаіць 8-метровая трохфігурная скульптурная кампазіцыя "Пегас" скульптара Л. Зільбера. Рэжысёрамі тэатра былі: М. Кавязін (1947–50), І. Парамонаў (1951–52), А. Міронскі (1953–55), І. Папоў (1952–53, 1955–63), А. Струнін (1963–75), У. Караткевіч (1975–81), А. Шалыгін (1982–84), І. Пятроўскі (1985–90), М. Разцоў (1991–94), Г. Мушперт (1994–98, 2019), С. Палешчанкаў (2000–01), А. Жугжда (2002-03), У. Мацулевіч (з 2008). З тэатрам звязаныыя імёны народных артыстаў БССР Я. Кімберга і Ю. Сідарава, заслужаных артыстаў БССР С. Аляксандрава, Р. Дубава, С. Іванова, М. Астанкавай, Ю. Нікіціна, Л. Дзяменцьевай, Н. Караткевіч, А. Марцінюк, А. Гайдуліс. У 2011 тэатру нададзенае званне "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь".

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 380–382; Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 133,135; Пятроўская С.Г. Гродзенскі абласны дрматычны тэатр: гісторыя і сучаснасць // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 254–264.; Саяпин В. История Гродненских площадей. – Гродна: ЮрСаПринт, 2011.—С. 4–38.

Тэатр Дзяржаўны польскі БССР, створаны *Вянгеркам А. М.* у лістападзе 1939 г. у Беластоку тэатр 3 катэгорыі. Дырэктарам была Ламакіна, рэжысёрам – Вянгерка, асыстэнтам яго – А. М. Ябланхоўна, загадчыкам пастановачнай часткі – С. Е. Габай, мастаком сцэны – Я. Г. Рыбкоўскі, яго асістэнтам – В. С. Крыськавяк. Трупа складалася з 19 акцёраў. Сярод іх: Я. Вашчаровіч, І. Баброўская, Т. Манкевіч, В. Міхальская, М. Даўмунт, А. Палонская, Б. Герсан, Л. Ратоўскі і інш. Сезон 1940 тэатр пачаў з п'есы Ф. Шылера "Падступнасць і каханне". З 38 спектакляў, пастаўленых у Т. Д. П., толькі адзін быў прысвечаны савецкай тэматыцы. Каб перавыхаваць акцёраў, пры тэатры ўлада стварыла тры гурткі: гісторыі Усерасійскай камуністычнай партыі (бальшавікоў), расійскай мовы (які ніхто не наведваў), вайсковы (сюды хадзілі ўсе). Вянгерка і Баброўская гурток гісторыі УКП(б) не наведвалі. У 1939–40 Т. Д. П. дзейнічаў у Гродне, а ў канцы 1940 яго перавялі ў Беласток.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 149; Батура Н.В. Тэатр і музыкальнае жыццё г. Гродна ў 1939–1940 гадах // Сайт Гродненский район, доступ 22.07.2020.

Тэатр лялек гродзенскі абласны – пачаў сваю гісторыю 2.02.1940, калі трупа Уладзіслава Ярэмы пры падтрымцы заслужанага артыста РСФСР С. Абразцова, які гастраляваў у Гродне, стварыла Гродзенскі дзяржаўны тэатр лялек. Адкрыўся тэатр спектаклем "Цырк Тарабумба" У. Ляха, а закрыўся спектаклем "Чароўная лямпа Аладзіна". Пасля вайны летам 1946 г. у Доме народнай творчасці тэатр аднавіў сваю дзейнасць як самадзейны калектыў, а 11.11 атрымаў афіцыйны статус, затым у 1947 стаў абласным тэатрам лялек. Наступны раз тэатр быў адкрыты рашэннем Гродзенскага аблвыканкама 1.11.1980. Рэжысёрам стаў Сяргей Юркевіч, мастацкім кіраўніком – Леанід Быкаў. Трупа склалася з выпуснікоў Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, Ленінградскага інстытута тэатра, музыкі і кіно імя М. Чаркасава, Гродзенскага вучылішча культуры. Першы спектакль адбыўся 25.05.1981 – "Людвіг і Тута" У. Богача і С. Хрыстоўскага, паводле кнігі Я. Экхальма, у пастаноўцы С. Юркевіча і сцэнаграфіі Л. Быкава. У 1984 Т. л. размясціўся ў будынку старога *тэатра гродзенскага*. У 2011–2012 адбыліся рэканструкцыя і тэхнічнае пераабсталяванне тэатра (гукавое і светлавое). У тэатры з'явіліся камерная зала на 70 месц, кафэ "Шэкспір", музей. Спектаклі адбываюцца для дзяцей і дарослых (у рэпертуары больш за 35 спектакляў). Гастролі тэатра праходзяць у Беларусі і замежжы (Польшча, Літва, Расія, Украіна, Чэхія, Францыя, Германія і інш.). Сучаснай зоркай тэатра несумненна з'яўляецца *Шалкевіч Віктар*. У 2003 і 2014 тэатр атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За ўклад у развіццё міжнародных культурных сувязяў". У 2012 калектыў тэатра з пастаноўкай "Пікавая дама" перамог на II Нацыянальнай тэатральнай прэміі ў 4 намінацыях: найлепшы спектакль, найлепшы спектакль тэатра лялек, найлепшая рэжысура, найлепшая жаночая роля. Т. л. – актыўны ўдзельнік міжнародных тэатральных фестываляў.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 382–383; Данильчик М.Е. Волшебный мир театра кукол: история и современность // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 265–270; Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 135–137; Трусов И.Г. К истории здания театра кукол в Гродно / И.Г. Трусов // Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў / ДУК "Гродзен. абл. навук. б-ка імя Я.Ф. Карскага", аддз. краязнаўства; склад. Л.І. Турмасава; навук. рэд. С.В. Марозава. – Гродна: Гродз. друкарня, 2011. – С. 232–239.

Тэатр Тызенгаўза Антонія, узнік на *Гарадніцы* ў 1770 г. Складаўся з *балета, оперы, капэлы* (гл. асобныя артыкулы). Будынак тэатра быў закладзены ў 1772 архітэктарамі *Мёзерам Ё.-Г.* і *Сака Дж.* (?). Задуманы як працяг палаца *Тызенгаўза А.* і злучаўся з ім крытым пераходам. Зала мела паўкруглае памяшканне з амфітэатрам і яруснымі галерэямі па яго перыметры. На двух ярусах размеркаваліся 22 ложы. Сцэна мела 5 планаў кулісных машын для перасоўвання дэкарацый. Будынак не адразу выкарыстоўваўся як тэатральны, бо каралю прывезлі коней і ў памяшканні ўладкавалі манеж для іх выгулу. Тэатрам будынак стаў пасля адстаўкі Тызенгаўза А., пры гарадзенскім *старасце Станіславе Панятоўскім*. А ў тызенгаўзаўскія часы тэатральныя пастаноўкі адбываліся ў "крывой афіцыне". У тэатры працавалі наступныя акцёры: *Трускуляўскія*, *Дэшнер Саламея*, *Багуслаўскі Войцех*, *Мараўскі Дамінік, Марэлі Казімір* і яго жонка, *Гурская Ізабэла*, *Кажынскі Мацей*, *Саламоні Г., Пецінэці Каетан*. Тызенгаўз глядзеў на тэатр, як на інструмент для выпраўлення маральнасці грамадства і ўкаранення польскай мовы. Ён турбаваўся пра "цывілізацыю для мясцовага края" і пісаў *Станіславу Аўгусту Панятоўскаму*, што тэатр трэба падтрымоўваць "толькі ў імя асветніцтва, а не ў імя прыбыткаў". Праўда, Т. Т. не стаў агульнадаступным і выхаваўчую ролю граў толькі ў прывілеяванай частцы грамадства.

Крын. і літ.: AGAD, Archiwum Tyzenhauza, sygn. D, k. 7–8; Гродно: энцикл. справ / редкол.: И.П. Шамякин [и др.]. – Минск: БелСэ, 1989, с. 383; Музыкальный театр Беларусии. Дооктябрьский период. – Мн., 1990, с. 190–191; Bernacki L. Teatr, dramat i vuzyka za Stanisława Augusta. T. I, II. – Lwów, 1925.

Тэатр школьны езуіцкі, адкрыты ў 1650 г. разам з адкрыццём *калегіума езуітаў*. Праграма навучання ў ім прадугледжвала звязаныя з дыдактычным працэсам школьныя спектаклі, а таксама пазашкольныя відовішчы. Прадстаўленні былі на лацінскай мове, а з сяр. XVII ст. і па-польску. Спектаклі звычайна ставіліся на каталіцкія святы, візіты важных гасцей, прысвячаліся ордэну і дабрачынцам школы. Напрыклад, 16.06.1650 была пастаноўка на свята Божага Цела – "Jozeph prius a fratribus venditus, postea Fegypti dominus". Падчас Вялікага тыдня ў 1865 настаўнік паэзіі Міхал Сіповіч паставіў спектакль "Crux Diva salutis nostrae tropheum". У 1687, для сустрэчы Стэфана Мікалая Браніцкага, Кацярыны і Казіміра Сапегаў, М. Сіповіч напісаў Iason in prawda Colchica. У лістападзе 1705 школьны тэатр вітаў спектаклем расійскага цара *Пятра I.* У XVIII ст. ставілі такія спектаклі, як Юзафа Рудаміны

“Calix memoriae e Cranio Sventoslai, Kijoviensium ducis”, Фрэдэрыка Ідвела “Clementina nobie ultionis genus, sive Octavius Augustus”. Тэатр выконваў не толькі навучальную, але і культурную, сацыяльную і палітычную ролю. Аўтарамі, як правіла, былі настаўнікі калегіі. Акрамя названых можна ўспомніць: К. Гаршвіла, С. Макоўскага, У. Нарэвіча, У. Нармунта. На сённяшні дзень вядомыя 26 пастановак. Існаваў Т. ш. да 1754 г.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 417; Kałuski M., Sprawy kresowe – poza cenzurą. T. 1. – Toruń-Melbourne, 2017. – S. 91; Renikowa W., Tradycje teatralne Grodna // Wilno i kresy Północno-Wschodnie. T. II. Kultura i trwanie., Białystok 1996, s. 126–128

Тэлебачанне (абласная студыя), пачало працу па вул. Горкага, 85, з 26.12.1968. У канцы 1980-х сутачны аб’ём вяшчання дасягаў 1 гадзіны, а падрыхтоўка перадач для рэспубліканскага тэлебачання – 30 гадзін у год. Прымаліся праграмы 1 і 2 агульнасаюзныя, рэспубліканская і часткова літоўская і польская. У складзе студыі было 6 творчых рэдакцый: інфармацыйная; прапаганды; народнай гаспадаркі; дзіцячага і моладзевага вяшчання; літаратурна-мастацкіх і музычных перадач; выпуска праграм пра сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё вобласці. Шмат выпускалася цыклавых перадач пра дзейнасць піянерскіх, камсамольскіх, партыйных арганізацый; аб праблемах эканамічнага развіцця; літаратурнага і мастацкага жыцця, аб самадзейнай мастацкай творчасці працоўных і вопыце культурна-асветніцкай дзейнасці. На Т. рэжысёрамі А. Дзіргінчус, В. Куцам, Г. Пархамчук, В. Ткачэнка і інш., сцэнарыстамі Н. Сакаловай, Я. Карабок, П. Шаўчук, М. Шаўчонак, Э. Драбышэўскай, В. Шоцік і інш. былі створаныя тэлевізійныя нарысы.

Літ.: Гродно: Энциклопедический справочник. Минск, 1989, с. 386.

Тэлеграфная сувязь. Упершыню ў Гродне тэлеграф пачаў працаваць у 1843 г., і праз чатыры гады тэлеграфная лінія Гродзенскай губ. складала 153,5 вярсты, на якіх было размеркавана 18 пастоў (тэлеграфічных сігналаў). Не магу не ўспомніць цікавы факт. У 1989 г. аўтар гэтых радкоў разам з групай асоб з краязнаўчага *клуба “Гарадніца”* (*Л. і А. Госцевы*, А. Анісімава, Л. Грышуціна, Г. Юневіч) знайшлі на правым беразе *Нёмана,* недалёка ад Новага *моста* (калісьці “роў за Каложай”), надмагільную пліту дырэктара 5 тэлеграфічнай лініі Платона Аляксеевіча Зуева. Аказалася, што яго пахавалі на месцы, дзе ён застрэліўся ў 1847 па прычыне растраты казённых грошай. 11.09.1861 у горадзе была адкрытая электрамагнітная тэлеграфная станцыя, якая злучыла Гродна з Каралеўствам Польскім. Яна размясцілася ў былым *палацы Масальскіх* (цяпер па вул. Ажэшкі, 1). П. Баброўскі пісаў, што яна мела толькі адзін апарат. З 1875 у ёй працавалі першыя 4 жанчыны: Вольга Клышынская, Эма Гайдановіч, Паўліна Сальтус, Аўрэлія Рэймер. З пабудовай чыгункі ў Гродне можна было карыстацца і яе асабістым тэлеграфам. У 1877 праз тэлеграф на чыгуначнай станцыі можна было перадаць тэлеграмы простыя, з аплочаным адказам, з паведамленнем аб дастаўцы, дэпешы

з некалькімі адрасамі. З 1782 начальнікам тэлеграфнай станцыі быў капітан Уладзімір Васільевіч Муселіус, мужчыны тэлеграфісты былі з лютэран і евангелістаў – А. К. Муселіус, І. А. Шрэдэр, Ф. С. Гейзлер, К. П. Швоб, К. О. Яворскі, А. А. Патрэк; жанчыны тэлеграфісткі – П. В. Сальпіус (працавала з 1870), Б. Ф. Муселіус (з 1875). У 1885 г. было створанае ўпраўленне Гродзенскай паштова-тэлеграфнай акругі.

Крын. і літ.: НГАБ, ф. 23, воп. 1. С. 7, а 53; Бобровскій П.О. Материалы для географии и статистики России. Часть 1., прил. С. 41; Ч. II, прил. С. 33; Болбас М.Ф. Развитие промышленности в Белоруссии (1795–1861). – Мн., 1966. – С. 17; Павач А. Гродзенскія гісторыі. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2019. – С. 83–85; Памятная книжка на 1885. – Гродна, 1884. – С. 20–21.

Тэлефонная сувязь. Сетка была заснаваная ў Гродне 14.11.1907. Яна звязала ў першую чаргу ўрадавыя ўстановы. У "Штогадовіку Расіі на 1911 г." у Гродзенскай губ. згадваліся толькі 2 карыстальнікі тэлефона. Невядома, ці ў іх лік уваходзіла *Ажэшка Э.*, бо з яе лістоў вынікае, што ў 1909 ёй правялі тэлефон. 24.06.1930 гродзенская газета "Крэсовы агляд" паведаміла аб намеры мясцовай улады паставіць у грамадскіх будынках тэлефоны-аўтаматы. Першы, магчыма, быў пастаўлены ў кандытарскай Катоўскага. Усяго тэлефонаў у гэтым годзе адпаведна тэлефоннаму даведніку было 599. У 1956 г. здадзеная ў эксплуатацыю аўтаматычная тэлефонная станцыя на 2 тыс. нумароў.

Літ.: Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 144, 145; Хрестоматия по истории Белоруссии. – Минск, 1977. – С. 431.

Тэрлікоўскі Канстанты (1895 – пасля 1939). У 1918 г. дзейнічаў у Гродне у польскім Дэмакратычным камітэце і ў Галоўнай радзе зямлі Гродзенскай. Суддзя, адвакат, сябра Федэрацыі польскіх саюзаў абаронцаў Айчыны. Пасол (1928–30), сенатар (1935–38) ад беластоцкага ваяводства. Пасля пачатку *вайны Другой сусветнай* збег на ўсход. У верасні 1939 арыштаваны ў Гродне НКВД і забіты.

Літ.: Zach. Białoruś. 17.IX.1939 – 22.VI.1941. Wydarzenia i losy ludzkie. – Warszawa, 1998. – s. 178.

фон Тэцінген (ці Цэцінген) Вернер – маршалак крыжацкага Ордэна, які разбіў ліцвінскае войска ў студзені 1393 г. і разбурыў Горадню. У лютым 1401 тры дні рабаваў ваколіцы Горадні.

Літ.: J. Nikodem, Witold. Welki książę litewski (1354 lub 1355 – 27 października 1430). – Kraków: Avalon, 2023. – S. 172, 255.

У

Уладзімір Давыдавіч (? – 5.05.1151) – Чарнігаўскі, Берасцейскі і Дарагічынскі князь. Ажаніўся з адной з дочак *Усевалада Давыдавіча Гарадзенскага* ў 1144 г. Меў сына Святаслава (пам. у 1166), які ў 1159 ажаніўся з дачкою Андрэя Багалюбскага (каля 1111–1174).

Уладзімір Святаслававіч Святы (?–1015) – князь Кіеўскі (1113–1125). Падчас яго княжання назіраўся пад'ём Кіеўскай Русі. Першы кіеўскі князь, які прыняў хрысціянства і распаўсюдзіў яго на землях Русі (988). У. С., паводле адной з версій – прадзед *Усевалада Гарадзенскага* і яго жонкі *Агаф'і.*

Уладзімір Усеваладавіч Манамах (1053–1125) – вялікі князь кіеўскі (1113–1125), дзяржаўны дзеяч, ваяр і літаратар. Сын кн. Усевалада Яраслававіча. Названы Манамахам па прозвішчы маці, якая была дачкой візантыйскага імператара Канстанціна Манамаха. Княжанне У. У. стала часам узмацнення Кіеўскай Русі. Ён змог аб'яднаць 3/4 яе тэрыторыі. Пасля смерці У. У. падзелы дзяржавы ўзмацніліся зноў. У. У. – бацька Агаф'і, жонкі *Усевалада Гарадзенскага*. Быў жанаты на Гіце – дачцэ англійскага караля Гаральда.

Уладзіслаў IV Ваза (19.04.1595, Лобзаў каля Кракава – 20.05.1648, Мерач) – вялікі князь літоўскі і кароль польскі (з 1632). 25.05.1633 праездам у Вільню спыняецца ў Горадні, жыве тут месяц. Прысутнічаў у Горадні на ганаровым уваходзе манахаў у *кляштар касцёла дамініканскага*. 6 чэрвеня прымаў венецыянскае пасольства на чале з Цьепалі. Пацвердзіў прывілей *Стэфана Баторыя,* дадзены шавецкаму цэху. 11 чэрвеня падпісаў канфірмацыйны прывілей для Горадні, які адрозніваецца ад іншых тым, што ў ім прыводзіцца кароткі змест 40 папярэдніх *прывілеяў* яго папярэднікаў. У 1635 быў на асвячэнні касцёла дамініканскага. У студзені 1639 Уладзіслаў IV тры дні прымае ("великолепно угощал") у Горадні курфюрста Брандэнбургскага Георга-Вільгельма – аднаго з дзеячаў Трыццацігадовай вайны. У 1647 Уладзіслаў IV прыехаў у Горадню, дзе суцяшаў свой боль з-за смерці адзінага сына, васьмігадовага Жыгімонта Казіміра.

Уласавец Мікалай – дырэктар Гродзенскага педагагічнага інстытута ў 1944–49 гг. Выпускнік Маскоўскага гісторыка-філасофскага інстытута. У 1947 яму ўказалі на недахопы ў "педагагічнай, ідэалагічнай і палітыка-выхаваўчай дзейнасці" калектыва інстытута, а ў 1949 звольнілі з пасады за тое, што "не

забяспечыў неабходнага кіраўніцтва вучэбна-выхаваўчай працай інстытута". Калегі Уласаўца казалі, што ён быў настаўнікам не толькі паводле спецыяльнасці, але і паводле прызвання, а ў людзях цаніў у першую чаргу прафесіяналізм.

Літ.: Праўдзіна А. Рэпрэсіі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце гісторыя і сучаснасць // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Вып. 10 (2015) / рэдкал. І. Соркіна [і інш.] – Гродна, 2016. – С. 124–125.

Універмаг, гандлёвы дом "Нёман" на вул. Савецкай, 18. Пабудаваны на месцы, дзе стаялі мураваныя будынкі крам М. Левінсона і Мусоўскага, пазней Пялецкага. Затым тут размяшчаўся *гатэль* "Еўропа", у якім, здаецца, спыняўся 28.07.1920 чырвонаармейскі камандуючы М. М. Тухачэўскі, калі ішоў на Варшаву падчас *вайны польска-савецкай 1919–20*. Пасля гатэля ў 1950-х гадах збудавалі стары будынак У. у стылі "сталінскага ампіру". У 1970-х гадах побач узнік новы будынак, падчас будаўніцтва якога зруйнавалі камяніцы гістарычнай часткі горада.

Літ.: Гостев А.П. Кронон. Летопись города над Неманом (1116–1990) / А.П. Гостев, В.В. Швед. – Гродно, 1993, с. 265; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 77.

Універмаг "Дзіцячы свет", знаходзіцца на вул. Савецкая, 29. Пабудаваны ў 1982 г. на месцы камяніцы Фрумкіна (пач. XX ст.). Грунтоўна перабудаваны ў 1920-х. З 1909 у будынку працавала кнігарня І. Іберскага, пры якой ў 1922 адкрылася бібліятэка. Пазней тут знаходзілася крама "Філармонія", вяндлярня Л. Хіселі (Хісдо), "Bank narodowy w Grodnie" (1937). У ліпені 1947 г. у будынку запрацаваў гродзенскі ўніверсітэт.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 300–301.



С. 900

Універсітэт імя Янкі Купалы. Пачынаў сваё жыццё як настаўніцкі інстытут. Ён быў адкрыты паводле пастановы Савета Народных Камісараў БССР ад 22 лютага 1940 г. Заняткі ў студэнтаў пачаліся 7.03.1940, а спынілася дзейнасць інстытута ў сувязі з *вайной Вялікай Айчыннай*. Месціўся настаўніцкі інстытут у будынку былой *гімназіі Марыінскай жаночай*. Тут знаходзіліся 6 вялікіх аўдыторыяў, 4 кабінеты (літаратуры, марксізму-ленінізму, замежных моў і ваенны), актавая і фізкультурная залы, бібліятэка і студэнцкая чытальная зала, а таксама кватэры 4 выкладчыкаў. Першыя студэнты (іх было каля 100 чал. – пераважна дзеці рабочых і сялян) вучыліся на двух аддзяленнях – беларускай, рускай мовы і літаратуры і фізіка-матэматычным. Рыхтавалі настаўнікаў 5–7 класаў няпоўнай сярэдняй школы. Тэрмін навучання складаў два гады. Вучылі студэнтаў усяго 20 выкладчыкаў.

Паводле пастановы Савета Народных Камісараў ад 20.10.1944 быў створаны дзяржаўны педагагічны інстытут з мэтай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных выкладчыкаў для сярэдніх школ. У 1944/45 навучальным годзе замест 240 чал.

паводле плану былі прынятыя толькі 125. Правядзенне прафарыентацыйнай працы, усталяванне пэўных ільготаў для ўдзельнікаў *вайны Вялікай Айчыннай*, адкрыццё падрыхтоўчых курсаў дазволілі павялічыць набор студэнтаў амаль у 4 разы да 1950/51 навучальнага года (494 чал.). У 1944/45 навучальным годзе працавалі 24 штатных выкладчыкі, з якіх толькі адзін меў вучоную ступень кандыдата навук (ім быў намеснік дырэктара інстытута, загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі М. Я. Лявіцкі). У адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР "Аб паляпшэнні падрыхтоўкі, размеркавання і выкарыстання спецыялістаў з вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыяй" ад 30.08.1954 у інстытуце пачалася рэарганізацыя. Былі створаныя новыя факультэты: гістарычны (1954), хутка заменены на гісторыка-філалагічны з аддзяленнямі гісторыі, рускай мовы і літаратуры (1956), фізіка-матэматычны (1956), методыкі пачатковага навучання (1958). З 1956/57 навучальнага года працягласць навучання на дзённым аддзяленні павялічылася з 4 да 5 гадоў (для студэнтаў завочнага аддзялення, якія скончылі настаўніцкія педінстытуты – 3 гады). З 1957 інстытут стаў насіць імя класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы. Згодна са школьнай рэформай 1958 г. сярэднія школы пераўтвараліся ў працоўныя палітэхнічныя школы з вытворчай падрыхтоўкай. Адпаведна з гэтым у інстытуце пачалася падрыхтоўка студэнтаў да арганізацыі працоўнай дзейнасці ў школах. Адкрыліся вытворчая майстэрня, кабінеты машынабудавання, радыёэлектронікі, аўтатрактарнай справы, тэхнічнага і праекцыйнага чарчэння, фота- і кінакабінет, створаныя сталярны, слясарны і такарны цэхі. Пасля заканчэння навучання пэўнай спецыяльнасці студэнты атрымлівалі пасведчанне. На пачатку 1960-х гадоў пачаў працу факультэт грамадскіх прафесій. Тут на працягу 2–3 гадоў студэнты маглі вучыцца на аддзяленнях лектараў, экскурсаводаў, спартыўных суддзяў, інструктараў па турызме, артыстаў тэатра, танцораў і д. п. У ліпені 1954 *гарадскі выканаўчы камітэт* прыняў рашэнне аб пашырэнні плошчаў педагагічнага інстытута, а ў чэрвені 1957 перадаў яму вызваленыя тры будынкі (аб'ёмам 3898 куб. м) і зямельны ўчастак (плошчай 4472 кв. м) школы сляпых па вул. Ажэшка, 24 (былы дом адваката С. Нагорскага, мужа *Ажэшкі Э.*). У сакавіку 1958 з'явілася рашэнне гарвыканкама аб дазволе рэканструкцыі корпуса інстытута з прыбудовай да вольнага тарца дадатковага будынка для размеркавання ў ім актавай залы і вучэбных аўдыторый. Новы корпус злучыў стары будынак жаночай гімназіі з галоўным корпусам. У 1964 перад новым будынкам паставілі бюст Я. Купалу. У гэтым годзе ў інстытуце быў створаны біялагічна-хімічны факультэт (у 1970 на ім быў апошні набор студэнтаў). У 1967 на базе гісторыка-філалагічнага факультэта былі створаныя самастойныя факультэты: філалагічны і гісторыка-педагагічны, які даваў настаўнікам дадатковую спецыяльнасць метадыстаў па выхаваўчай працы. З 1969 пачало сваю працу падрыхтоўчае аддзяленне. У 1972 у інстытуце быў адкрыты музычна-педагагічны факультэт.

Да свайго 20-годдзя інстытут меў на 12 кафедрах 65 выкладчыкаў, з якіх 17 былі кандыдатамі навук. 20.11.1969 у інстытуце была адкрытая аспірантура

па спецыяльнасцях: матэматычны аналіз, дыферэнцыяльныя і інтэгральныя ўраўненні, гісторыя СССР, методыка выкладання матэматыкі, беларуская мова. Да пачатку 1973/74 навучальнага года ў складзе выкладчыкаў (207 чал.) было ўжо 3 доктары навук і 62 кандыдаты навук. У 1978/79 навучальным годзе было 3 навучальных і 1 лабараторны карпусы, 58 спецыялізаваных лабараторыяў, кабінетаў, майстэрняў, вылічальны і тэлевізійны навучальныя цэнтры.

XIV Пленум ЦК Кампартыі Беларусі ў 1974 г. прыняў рашэнне аб адкрыцці на базе Гродзенскага педінстытута дзяржаўнага універсітэта. Пастановай Савета Міністраў СССР ад 24.06.1977 пад № 564 была прынятая прапанова ЦК Кампартыі Беларусі і Савета Міністраў Беларускай ССР аб арганізацыі ў 1978 г. Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Ён стаў трэцім у Беларусі і 65-м у СССР універсітэтам. У гэтай якасці ён пачаў функцыянаваць з 1 мая, а першы ўніверсітэцкі набор быў здзейснены ў верасні 1978 г. У 1978/79 навучальным годзе ва ўніверсітэце працавала 236 выкладчыкаў, з іх 3 доктары навук, у т. л. 1 прафесар, 101 кандыдат навук, у т. л. 60 дацэнтаў і старшых навуковых супрацоўнікаў. Працэнт выкладчыкаў з вучонымі ступенямі і званнямі складаў 44,4%. Напярэдадні 50-годдзя (1990) на 10 яго факультэтах па 33 спецыяльнасцях вучыліся каля 7 тыс. студэнтаў, з іх каля 4 тыс. на стацыянары. Завяршылася стварэнне сістэмы мэтавых праграм падрыхтоўкі настаўніка – светапогляднай, агульнанавуковай, псіхалагічна-педагагічнай. Упершыню ўводзілася комплексная праграма кампутарнай падрыхтоўкі студэнтаў. Значная ўвага прысвячалася вучэбна-метадычным комплексам, за кошт скарачэння лекцыйных заняткаў былі павялічаныя практычныя і лабараторныя. У другой палове 1980-х – першай палове 1990-х гадоў ва ўніверсітэце праходзіў працэс беларусізацыі: быў уведзены экзамен па беларускай мове для абітурыентаў, на ўсіх факультэтах уводзіліся абавязковыя курсы па гісторыі БССР, спецкурсы "Асновы культуры беларускай мовы" і "Гісторыя беларускай літаратуры і мастацтва", чытанне курса методык выкладання на беларускай мове, выкладчыкі маглі прайсці моўную падрыхтоўку на занятках гурткоў, навучальна-метадычная дакументацыя пераходзіла на беларускую мову, планавалася ажыццявіць поўны пераход вучэбна-выхаваўчага працэсу на беларускую мову да 1998 г. Пасля рэферэндумаў 1995 і 1996 гадоў названыя працэсы былі спыненыя, і задача пераўтварэння Гродзенскага ўніверсітэта ў нацыянальны канчаткова не была вырашаная.

Структура ўніверсітэта увесь час гнутка прыстасоўвалася да навучальна-выхаваўчага працэсу і даследчай працы, узмацняючы акадэмічную накіраванасць і рэгіянальны характар навучальнай установы. Адкрываліся новыя факультэты: правазнаўства (1981, з 1994 – права і эканомікі, з 1997 перапрафіляваны на юрыдычны і факультэт эканомікі і кіравання), фізічнага выхавання (1989), інжынерны (1990), беларускай філалогіі і культуры (1991). Аднаўляліся былыя факультэты: біялогіі і хіміі (1984, з 1994 – біялогіі і экалогіі), педагогікі і методыкі пачатковага навучання (1985, з 1994 – псіхалогіі і педагогікі). Рэарганізоўваліся старыя: на гістфаку (з 1994 гісторыі і культуры) уведзеныя новыя спецыяльнасці – гісторыя з дадатковым кірункам падрыхтоўкі – англійская

мова, нямецкая мова, французская мова (1991), пры факультэце правазнаўства ўпершыню быў здзейснены набор на аддзяленне міжнародных эканамічных адносін (1993), на філалагічным факультэце адкрыліся аддзяленні польскай мовы і літаратуры (1989), замежных моваў – англійскай, нямецкай і французскай (1993).

У 1994 г. замест падрыхтоўчага аддзялення ўзнікла аддзяленне дауніверсітэцкай падрыхтоўкі. У 1995 адкрыўся гродзенскі філіял Спецыяльнага факультэта бізнесу і інфармацыйных тэхналогій пры БДУ. У 1998 на базе ўніверсітэта быў створаны інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў. У студзені 1999 адкрыўся інстытут сацыяльна-гуманітарных навук. У 1999 на 60 кафедрах працавалі 585 штатных супрацоўнікаў, з іх 33 дактары навук, 241 кандыдат навук, 1 акадэмік, 36 прафесараў, 167 дацэнтаў. У 1998 быў зроблены першы выпуск магістратуры – 17 чал. па 9 спецыяльнасцях. На 1.09.2020 агульная колькасць студэнтаў – 11 331 чал. з іх: на I ступені – 10 763 чал.; на II (магістранты) – 568 чал.; аспірантаў і дактарантаў было 126 чал. Былі прынятыя на наступны навучальны год – 2572 студэнты; на I ступень 2298 чал.; на II ст. – 274 чал.

За гады існавання колькасць выпускнікоў дасягнула 35 тыс. чал. (1999). Яны працуюць у навучальных і навуковых установах, у органах мясцовай адміністрацыі, грамадскіх арганізацыях. Многія з іх дасягнулі пэўных працоўных ці творчых вышынь. Сярод вельмі вядомых выпускнікоў: першы намеснік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь У. В. Русакевіч, намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама М. М. Бірукова, старшыня Ваўкавыскага райвыканкама У. В. Лукашэвіч, акадэмік НАН Рэспублікі Беларусь М. П. Касцюк, акадэмік АПН Л. М. Ціханава, прафесары В. М. Міхнюк, Ф. М. Янкоўскі, пісьменнікі *Карпюк Аляксей*, *Бічэль-Загнетава Данута*, *Макаль Пятрусь*, заслужаны настаўнік Рэспублікі Беларусь Алесь Белакоз, міністр адукацыі РБ С. А. Маскевіч, рэктар ГрДУ І. Ф. Кітурка, дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі В. Л. Лакіза. Праславілі Беларусь выпускнікі ГрДУ, алімпійскія чэмпіёны па гімнастыцы – *Валчэцкая Алена* і *Корбут Вольга*, па цяжкай атлетыцы – *Курловіч Аляксандр*, неаднаразовы чэмпіён Еўропы і прызёр чэмпіянатаў свету па барацьбе Аляксандр Федарэнка, срэбны алімпійскі прызёр *Пачынчук Пётр*, чэмпіён універсіяды па плаванні *Ларычава Ірына*, футбаліст Сяргей Саладоўнікаў і інш. 12 сакавіка 1999 была створаная Асацыяцыя выпускнікоў Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы.

На канец 1990-х У. меў кантакты з 43 універсітэтамі свету (навучальнымі і навуковымі цэнтрамі Масквы, Санкт-Пецярбурга, Польшчы, Венгрыі, Балгарыі, Чэхіі, Славакіі, ЗША, Францыі, Швецыі). Ён уваходзіць ў Еўрапейскую асацыяцыю ўніверсітэтаў. У 2001 у склад У. уключаны Інстытут паслядыпломнай адукацыі, а ў перыяд з 2001 па 2006 – 4 каледжы: Тэхналагічны, Ваўкавыскі, Лідскі, Гуманітарны. З 2003 У. з'яўляецца членам Міжнароднай камісіі па дыстанцыйным навучанні, якая мае кансультацыйны статус пры Эканамічнай і сацыяльнай радзе ААН. З 2005 У. з'яўляецца членам Партнёр-

ства Універсітэтаў Рэгіёна Балтыйскага мора. У. мае ўрадавыя ўзнагароды. У 1972 інстытут быў узнагароджаны юбілейнай Ганаровай Граматай ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсавпрафа ў сувязі з 50-годдзем утварэння СССР. За дасягнутыя поспехі ў выкананні заданняў 11-й пяцігодкі ўніверсітэт быў узнагароджаны Ганаровай граматай Мінвуза БССР і Беларускага рэспубліканскага камітэта працаўнікоў адукацыі, вышэйшай школы і навуковых устаноў. Паводле звестак міжнароднага рэйтынга Webometrics у студзені 2017 У. знаходзіўся на 3-м месцы сярод беларускіх вузаў і на 3122-м месцы ў сусветным рэйтынгу.

Літ.: Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы: Біябібліяграфічны даведнік /Пад рэд. В.М. Чарапіцы. – Гродна: ГрДУ, 1999; Габрусевіч С.А. Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы: Гістарычны нарыс /С. Габрусевіч, І.П. Крэнь. – Гродна: ГрДУ, 2001; Постаці ў гісторыі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы: гіст. нарыс/ Аўт.-склад. В.П. Таранцей. – Гродна, 2005; Университет и его педагоги /под ред. Ю.П. Золотухина. – Гродно: ГрДУ, 2006; Саяпин В. Пешком по Ожешко и Советской/ Виктор Саяпин. – Гродно: ООО "ЮрСаПринт" 2011. – С. 27–32; https://www.wikiwand.com/ru/. Доступ 11.01.2022.

Універсітэт аграрны, узнік на базе сельскагаспадарчага інстытута, заснаванага рашэннем Савета Міністраў СССР 7.01.1951. На двух факультэтах (аграномічным і заатэхнічным) пачалі вучыцца 175 студэнтаў на першым курсе і 25 – на другім. У 2000 г. заснаваны Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018.

Унія Гарадзенска-Троцкая 1432–1433 гг., утвораная дзякуючы здрадзе Свідрыгайлы, *Жыгімонтам Кейстутавічам* паміж ВКЛ і Каронай Польскай. Згодна з ёй улада Кейстутавіча на Літве ўсталёўвалася пажыццёва, а пасля яго смерці Літва далучалася да Польшчы. Была скасаваная ў 1440 г., калі без згоды Уладзіслава III Варненчыка і польскіх паноў вялікім князем літоўскім быў выбраны дванаццацігадовы *Казімір Ягелончык*.

Літ.: Пазнякоў В. Гарадзенска-Троцкая ўнія 1423–33 // Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 1. – Мінск, 2007, – С. 496–497; Szkolny Słownik Historii Polski / P. Grejner, E. Gronkowska, R. Kaczmarek, K. Miroszewski. – Katowice: Videograf II, 2000. – S. 408.

Управа гарадская, створаная як пастаянна дзейны выканаўчы орган *думы гарадской* на аснове рашэння расійскай Дзяржаўнай рады ад 29.04.1875 "Аб распаўсюджванні Гарадавога палажэння ад 16 чэрвеня 1870 г. на гарады Заходніх губерняў". На чале яе стаяў гарадскі галава (старшыня), зацверджаны *губернатарам.* У склад упраўлення ўваходзілі сябры ўправы і сакратар. Падпарадкоўваліся *губернатару* і МУС. У функцыі ўваходзіла кіраванне адукацыяй, аховай здароўя, збор падаткаў і збораў, упарадкаванне горада. Зліквідаваная ў 1917. Знаходзілася ў будынку флігеля *кляштара дамініканскага*

па вул. Савецкая, 8. Разам з управай там размяшчалася гарадское *ўпраўленне паліцыі.* У 1911 г. у доме жыў гарадскі паліцмайстар І. Фрымерман.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 289; Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 88–89.

Упраўленне паліцэйскае гарадское, створанае "Часовымі правіламі аб усталяванні паліцыі ў гарадах і паветах губерняў, па агульным усталяванні кіруемых" ад 25.12.1862, як орган адміністрацыйна-паліцэйскага ўпраўлення ў гарадах. Апошнія дзяліліся на часткі, участкі і акалодкі. На чале іх былі прыватныя прыставы, паліцэйскія і акалодачныя назіральнікі. Яны падпарадкоўваліся Упраўленню, якім кіравалі паліцмайстар і агульная ўстанова (присутствие). Упраўленне кантралявала выкананне законаў у мэтах унутранай бяспекі, рашэнні і прыгаворы судоў, назірала за паступленнем збораў і падаткаў, выплатай нядоімак, за забудовай горада, выкананнем рэкруцкіх набораў, збіралі матэрыялы аб працы прамысловых прадпрыемстваў, ураджаях сельскагаспадарчых культур і інш. Зліквідаванае ў 1917 г.

Літ.: Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 65–66.

Упраўленне рамеснае – орган кіравання рамеснай вытворчасцю, створаны замест *цэхаў* згодна з рапараджэннем літоўскага генерал-губернатара ад 20.03.1893. Маёмасць цэхаў перадавалася рамесным упраўленням у Гродне і Беластоку паводле рашэння ад 27.03.1893.

Літ.: Швед В. Гісторыя развіцця рамяства ў Гродне. – Ліда: Лідская друкарня, 2014. – С. 22.

Упраўленне часовае г. Гродна, створанае 22.09.1939 г. камандуючым Беларускага фронту Кавалёвым (стаўка ў Ваўкавыску) і ваеннай радай для кіравання палітычным, адміністрацыйным, гаспадарчым і культурным жыццём горада пасля ўваходу ў яго Чырвонай арміі. Органам У. ч. была газета "Свабодная Беларусь", першы нумар якой з'явіўся 25.09.1939. Дзейнічала да выбараў гарадскога Савета ў снежні 1939 – першая сесія адбылася 25 снежня. Старшынёй У. ч. быў Бугроў, сакратаром Бальшуноў. За кароткі час існавання ўпраўленне зрабіла наступнае: нацыяналізавала прадпрыемствы, якія знаходзіліся ў горадзе (заводы шкляны, піваварны, фанерны, скураныя, лесапільныя, галантарэйную фабрыку, друкарні і тыпалітаграфіі); заапекавалася вытворчасцю хлеба для гараджан (пякарні забралі ў прыватных асоб і зарганізавалі трэст хлебапячэння); абвясціла барацьбу са спекуляцыяй (напрыклад, гаспадара рэстарана "Раяль" *Левандоўскага* аштрафавалі на 2 тыс. руб.); адкрыла хіміка-бактэрыялагічную лабараторыю; зарганізавала двухмесячныя курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў пачатковых школ (там знаёмілі з савецкай педагогікай, Канстытуцыяй, гісторыяй, беларускай і рускай мовамі);

арганізоўвала вольны час гараджан (савецкія спектаклі, музыка, кіно, *тэатр лялек*, працы ў клубах, дэманстрацыі).

Літ.: Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 235–246; Sudoł A. Antypolskie decyzje Biura Politycznego Wszechzwiązkowej Komunistycznej Partii (bolszewików) z 1.X.1939 roku oraz ich urzeczywistnianie na kresach wschodnich II Rzeczypospolitej// Sowietyzacja Kresów Wschodnich II Rzeczypospolitej / pod. red. A. Sudoła. – Bydgoszcz, 1998. – S. 58.

Урсын-Нямцэвіч Станіслаў Францішкавіч (? – 1817) – гродзенскі губернатар з 20.07.1816 да 22.11.1817. З дваран Гродзенскай губ., католік. Валодаў маёнткам Адамкава ў Брэсцкім пав. У 1790–1791 – суддзя Брэсцкага і Гродзенскага пав. На пачатку і ў канцы *вайны 1812 г.* займаўся забеспячэннем расійскай арміі харчаваннем і фуражом. Падчас вайны выехаў з Гродна з арміяй П. Багратіёна ў Магілёў, затым у Кіеў. У лютым 1813 вярнуўся ў свой маёнтак, а праз 3,5 гады быў прызначаны гродзенскім *губернатарам* у чыне сапраўднага стацкага дарадцы. Зарганізаваў Гродзенскае аддзяленне *таварыства Расійскага біблейскага*. З 16.04.1817 з'яўляўся яго віцэ-старшынёй. 23.08.1817 *дваранскі сход* пастанавіў падарыць У.-Н. 24 тыс. руб. (па 10 кап. за кожную тону сена, пастаўленага расійскай арміі) у падзяку за зацверджанне Камітэтам міністраў добрай аплаты за пастаўкі. У рашэнні сходу гаварылася, што У.-Н. "руководит вверенной ему губернией в каждом случае справедливостью, общественным добром", што "его расходы не отвечают доходам его имений". Губернатар адмовіўся ад падарунка. У маі-ліпені 1817 ён, відаць, хварэў і ў выніку памёр.

Меў наступныя ўзнагароды: ордэны Св. Ганны 2 ст., Св. Станіслава, бронзавы медаль "В память Отечественной войны 1812 г."

Крын. і літ.: НИАБ в г. Гродно, ф.1, воп.1, с. 1055, а. 3; ф. 1, воп. 1, с. 551, а. 251–252; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007; Швед В.В. Губернскі Гродна. Аповяды з гісторыі (канец XVIII – пачатак XIX ст.). – Гродна, 2002, с. 8, 15; Historia Polski. Kalendarium dziejów. 1655–1887, Kraków, 2010, s. 277.

Урсын-Нямцэвіч Ян (1758–1841) – чалец *камісіі Гродзенскай адміністрацыйнай*, верагодна, старшыня (прэзідэнт) аддзела фінансавых спраў і асветы (28.08.1812). Скончыў Рыцарскую акадэмію ў Варшаве і стаў ад'ютантам А. Чартарыйскага (1777). Як пасол Чатырохгадовага сейму ўдзельнічаў у распрацоўцы Канстытуцыі 3 мая 1791 г. З гэтага часу быў сябрам Адукацыйнай камісіі. З 1792 па 1794 жыў у эміграцыі, затым быў ад'ютантам *А. Т. Касцюшкі* падчас *паўстання 1794 г.* Пад Мацяёвіцамі трапіў у палон, сядзеў у Петрапаўлаўскай крэпасці, адкуль быў вызвалены ў 1796 Паўлам I. Выехаў разам з Касцюшкам у ЗША. У 1807 вярнуўся і займаў пасаду сакратара Сената Княства Варшаўскага, з 1815 – сакратар Сената Каралеўства Польскага. Удзельнічаў у *паўстанні 1830–1831 гг.*, а пасля яго паражэння эмігравaў.

Урублеўскі Валеры Антоні (27.12.1836, Жалудок Лідскага ў. Віленскай губ. – 05.08.1908) – дзеяч беларускага, польскага і міжнароднага рэвалюцыйнага руху, паплечнік *В.-К. Каліноўскага*. Уплыў на палітычнае выхаванне Валерыя аказаў ягоны дзядзька Яўстахі Урублеўскі, які, калі быў студэнтам Кіеўскага ўніверсітэта, з'яўляўся сябрам патаемнага дэмакратычнага таварыства "Брацтва Кірыла і Мяфодзія". Пасля вяртання з Сібіры Я. Урублеўскі жыў у Вільні, на кватэры яго Валеры зблізіўся з Л. Сыракомляй і З. Серакоўскім. Жонкай апошняга была Апалонія Далеўская, сястра ўдзельнікаў Саюза літоўскай моладзі. Скончыў Віленскі шляхецкі інстытут (1853), Пецярбургскі лясны інстытут. Падчас вучобы пазнаёміўся з братамі Каліноўскімі. З 1857 г. працаваў памочнікам загадчыка, а з 26.01.1862 – начальнікам пісарска-егерскага вучылішча ў Саколцы ў чыне паручніка. Жыў пры вучылішчы разам са сваякамі *А. Гафмайстра* Гутакоўскімі. Спачатку быў паплечнікам Шварцэ ў Беластоцкай арганізацыі і ажыццяўляў яе сувязь з гродзенскім падполлем. Рэвалюцыйны начальнік Сакольскага пав., а потым, да сакавіцкага пераваротy "белых" у 1863 – вайсковы начальнік Гродзенскага *ваяводства рэвалюцыйна-дэмакратычнага*. Удзельнічаў у выданні і распаўсюджванні *"Мужыцкай праўды"*, "Гутарак". Фармаваў паўстанцкі атрад Сакольскага пав. Пасля прыбыцця ў Гродна Каліноўскага быў прызначаны начальнікам штаба паўстанцкіх сіл Гродзенскай губ. Прыгавораны завочна да расстрэлу. Рашэннем *праўлення Гродзенскага губернскага* ад 13.12.1864 маёмасць падлягала канфіскацыі. У 1865 г. на страсе дома былога сакольскага егерскага вучылішча знайшлі паперы рэвалюцыйнага зместу. Пасля паражэння паўстання эміграваў у Францыю. Быў генералам Парыжскай Камуны. Атрымаў ад французскага ўрада пенсію. Парэшткі У. захоўваюцца на знакамітых могілках Пэр-Лашэз. У Гродне яго імем названая вуліца, на адным з дамоў якой знаходзіцца барэльеф У.

Крын.і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 11 адв., 39, 47 адв.; с. 1, а. 563 адв.; воп. 1, с. 40 а, а. 62; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, спр. 1240, а. 3–5; Революционная Россия и революционная Польша (вторая половина XIX в.). – М.: Наука, 1967. – С. 50.

Урублеўскі Вітаўт/Вітольд Адольф (1839, Гродна – 1927, Варшава) – брат Зыгмунта, Станіслава і Эдварда. У *касцёле езуіцкім/Фарным* ахрышчаны 29.06.1839, там ёсць мемарыяльная дошка. Скончыў *гімназію гродзенскую,* працягваў адукацыю ў Кіеве. Працаваў выкладчыкам у варшаўскай гімназіі, выкладаў геаграфію ў гандлёвай школе імя Кроненберга. Пісаў артыкулы ў "Wielka Encyklopedja Ilustrowana" і часопіс "Wszechświat", рэдактарам якога стаў у 1897 г. З 1900 – дырэктар прыватнай рэальнай школы.

Літ.: Афанасьева Т. Семья Врублевских // Проблемы национального сознания польского населения Беларуси. Материалы междунар. науч. конфер.– Барановичи: Баранов. укрупн. тип., 2004. – С. 250–251.

Урублеўскі Зыгмунт Фларэнты Казіміравіч (28.10.1845, Гродна – 19.04.1888, Кракаў) – фізік, хімік. Дом, у якім ён нарадзіўся, знаходзіўся на вул. *Ажэшкі,*

насупраць *дома віцэ-губернатара Максімовіча*. Вучыўся ў Гродзенскай *гімназіі* і Кіеўскім універсітэце (з верасня 1862 па першую палову лютага 1863 на фізіка-матэматычным факультэце). З-за адсутнасці фінансавых сродкаў вымушаны быў вярнуцца дадому, дзе вучыў матэматыцы сваіх малодшых братоў і сясцёр. Быў дваюрадным братам *Сільвестровіча Станіслава*. Арыштаваны 10.08.1863, у гродзенскай следчай камісіі не прызнаўся ва ўдзеле ў паўстанні. 29.04.1864 паказаў у віленскай следчай камісіі, што прыехаў з Кіева з намерам ваяваць са зброяй ў руках у паўстанцкім атрадзе, але кузін угаварыў застацца пры ім. У паказаннях Сільверстовіча часта згадваецца як перапісчык розных дакументаў набела і як пасярэднік у перадачы папер у Вільню і акруговым, павятовым начальнікам. З 5.07.1863 сядзеў у гродзенскай *турме*. Прыгавораны ваенным судом да пазбаўлення дваранскіх прывілеяў і праў, ссылкі на катаржную працу на заводах на 8 гадоў. 3.06.1867 прыбыў у Цывільск Казанскай губ. У 1869 вярнуўся ў Варшаву. У 1874 у Мюнхене абараніў дысертацыю на ступень доктара філасофіі. З 1882 быў прафесарам Ягелонскага універсітэта ў Кракаве. Праславіўся як фізік, які ўпершыню вызначыў крытычныя тэмпературы вокісу вугляроду, кісларoду і азоту. Разам з фізікам і хімікам К. Альшэўскім 5.04.1883 здабыў кісларод з паветра, а 13.04.1883 – азот. Сябра-карэспандэнт АН у Кракаве і ў Вене, ганаровы сябра Таварыства імя Каперніка ў Львове. Загінуў падчас выбуху эксперыментальнай установкі для атрымання вадкага вадароду (загарэўся ад запаленай нафты і праз некалькі дзён памёр). На магільнай пліце ў Кракаве напісана: "Служыў Айчыне. Загінуў дзеля навукі". У гродзенскім касцёле езуітаў знаходзіцца мемарыяльная дошка. Міжнародны астранамічны саюз у 1976 назваў імем У. кратар "Урублеўскі" на Месяцы. У міжваенны час у Гродне была вуліца яго імя (цяпер Калючынская).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 25 адв. – 26 адв.; с. 2, а. 44, 48 адв.; с. 1, а. 229, 248–250, 265–267 адв., 361; воп. 1, с. 40, а. 236–239; Афанасьева Т. Семья Врублевских // Проблемы национального сознания польского населения Беларуси. Материалы междунар. науч. конфер.– Барановичи: Баранов. укрупн. тип., 2004. – С. 251–252; Паўлаў В. Удзельнікі паўстання 1863 г. у ссылцы ў Казанскай губерні // ARCHE. – 2010. -№ 12. – С. 255; Мысліцелі і асветнікі Беларусі X – XIX стагоддзяў. Энцыкл. Даведнік. – Мн.: БелЭн, 1995. – С. 582; Rudnicka H. Zygmunt Wróblewski // Magazyn Polski. – 1992. – № 2. – S. 44–45.

Урублеўскі Ігнацы – войт (1804–1809), друкар. Паводле рапарта Віленскага універсітэта ўтрымліваў у Гродне друкарню, якую зарганізаваў у 1793 г. *Ясінскі/Ясенскі.*

Літ.: Швед В.В. Гродзенскія друкары (канец XVIII – першая палова XIX ст.) // Grodnae et orbi: гарадскія супольнасці і гарадское асяроддзе XIV – XX стст. / пад рэд. А. Радзюка і І. Галубовіча. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2018. – С. 136–142; Kościałkowski S., Antoni Tyzenhauz podskarbi nadworny litewski, t. 1. – Londyn, 1970. – 686 s.; T. 2. – Londyn, 1971. – S. 493.

Урублеўскі Карл (1855, Гродна – 1936) – хімік. Адукацыю атрымаў у Віленскім універсітэце (1884). У 1855 паехаў у Аўстралію як эксперт па хімічным аналізе. Працаваў у камісіі кансервацыі вод у Сіднеі. З 1888 перайшоў у прыватнае горнае прадрыемства "Monte Cristo Pyes Creek Silver Mining Company". Вызначыў наяўнасць жылаў срэбра, волава, золата ў рачных басейнах на тэрыторыі горнай кампаніі. З 1892 па 1897 выдаваў штогадовік "Le Courrier Australien", які выдаецца дагэтуль.

Літ.: Ермоленко В. А., Черепица В.Н., 400 имён: Жизнеописания видных деятелей истории и культуры Гродненщины (с древнейших времён до начала XX века). – Гродно: Гродненская типография, 2014. – С. 352–353.

Урублеўскі Станіслаў – брат Зыгмунта, Эдварда і Вітаўта, вучань *гімназіі гродзенскай*. У *касцёле фарным* ёсць мемарыяльная дошка.

Урублеўскі Эдвард/Эдуард Вікенці (1848, Гродна – 1892, Пецярбург) – брат *Зыгмунта, Станіслава і Вітаўта Урублеўскіх*. Ахрышчаны ў *касцёле езуіцкім/Фарным* 3.02.1848, там ёсць прысвечаная яму мемарыяльная дошка. Вучань гродзенскай *гімназіі*, скончыў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут. У 1871 абараніў доктарскую дысертацыю па філасофіі ў Гётынгенскім універсітэце. З 1875 працаваў прафесарам хіміі Пецярбургскага тэхналагічнага інстытута. Займаўся праблемай будавання араматычных злучэнняў. Перад смерцю некалькі год хварэў, страціў зрок.

Літ.: Афанасьева Т. Семья Врублевских // Проблемы национального сознания польского населения Беларуси. Материалы междунар. науч. конфер. – Барановичи: Баранов. укрупн. тип., 2004. – С. 252.

Урусаў Мікалай Пятровіч (1864 – 21.10.1918, Пяцігорск) – гродзенскі *губернатар* з 29.01.1901 да 28.04.1902. З княскага роду, праваслаўны. Пасля заканчэння Імператарскага Аляксандроўскага ліцэя ў чыне тытулярнага дарадцы пачаў працаваць у МУС, затым быў адкамандзіраваны ў Дэпартамент духоўных спраў замежных веравызнанняў. У 1888 прымаў удзел у перамовах з патрыярхам усіх армян. У 1889–90 працаваў у Камісіі па рэвізіі справаводства касы і рахункаводства рымска-каталіцкай Духоўнай калегіі. У 1891–94 быў чыноўнікам асаблівых даручэнняў МУС пры Дэпартаменце духоўных спраў замежных веравызнанняў. 3.02.1894 прызначаны старшынёй Томскага губернскага праўлення, 31.03.1894 – уладзімірскім віцэ-губернатарам.

Царскім указам ад 22.12.1901 прызначаны гродзенскім губернатарам з захаваннем прыдворнага звання і ў чыне сапраўднага стацкага дарадцы (6.12.1901). 1.01.1901 адсвяткаваў 100-гадовы юбілей Гродзенскай губ. Царскім указам ад 28.04.1902 быў прызначаны палтаўскім губернатарам, пасля ў 1906 – кацярынаслаўскім губернскім прадвадзіцелем дваранства. У 1907 стаў сенатарам, у 1912 – шталмайстрам імператарскага двара. У 1915 – чалец Дзяржаўнага савета па выбарах, з 1.07.1915 – упаўнаважаны па справах бежанцаў Паўднёва-Заходняга фронту.

Узнагароды: 5 ордэнаў расійскіх і 3 замежныя, 3 медалі, 4 знакі (сярод іх – за духоўную асвету Сібіры (1902).

Крын. і літ.: ф. 2, воп.25, с. 234, а. 3; ф. 2, воп. 25, с. 234, а.43; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 107–111.

Усаў Віктар Міхайлавіч (21.12.1916, Нікапаль Днепрапятроўскай вобл.-23.06.1941) – начальнік заставы 86 Аўгустоўскага памежнага атрада, лейтэнант, Герой Савецкага Саюза (6.05.1965). 22.06.1941 памежнікі заставы пад яго камандаваннем на працягу 10 гадзін адбівалі атакі нямецка-фашысцкіх войск. У гэтым баі У. быў забіты. Ягоным прозвішчам назвалі памежную заставу на заходняй мяжы, вёску Вулька Даргунская Гродзенскага р-на, вуліцу ў Гродне, на якой усталяваны мемарыяльны знак. На тэрыторыі школы № 3 стаіць бюст-помнік (1980). З 1968 у Гродне праводзіўся штогадовы ўсесаюзны мемарыял па боксе на прыз У.

Усевалад Давыдавіч/Усевалад Гарадзенскі/Усеваладка, верагоднае хроснае імя Сымон/Сімяон (пасля 1097, Дарагабуж ці Перамышль – 1.02.1142, Горадзен) – першы *князь Гарадзенскі*. Сын Давыда Ігаравіча Валынскага. Унук смаленскага князя Ігара Яраславіча, праўнук вялікіх князёў кіеўскіх Яраслава Мудрага і Уладзіміра Манамаха і Рагнеды Полацкай. Паводле адной з версій, быўшы князем-ізгоем пасля смерці бацькі, не меў права на бацькоўскую зямлю (Валынь). Атрымаў Горадзен у якасці пасагу за жонкай сваёй *Агаф'яй Уладзіміраўнай* у 1116 г. Удзельнічаў у паходзе кіеўскага князя Мсціслава на Полацак (1127) і на Літву (1132). Меў трох сыноў – *Барыса, Глеба і Мсціслава* і двух дочак, выдадзеных замуж за Уладзіміра Давыдавіча (Чарнігаўскага) і Юрыя Яраслававіча (Тураўскага). Гэтую агульнапрынятую версію аб паходжанні Усеваладкі ад Давыда Ігаравіча, князя тмутараканскага (1082–1083), валынскага (1086–1098), дарагабужскага (1084–85, 1100–1112) падвяргае сумневу расійскі даследчык А. У. Назаранка, Ён лічыць, што прадзедам Усеваладкі Гарадзенскага быў Ізяслаў Яраслававіч, які займаў тураўскі, наўгародскі і кіеўскі стол; дзедам – Яраполк, які быў тураўскім і валынскім князем; бацькам – Яраслаў Яраполкавіч, берасцейскі князь, захоплены ў 1102 г. (памёр у зняволенні). З гэтым поглядам згодны даследчык палітычных і сацыякультурных трансфармацыяў ў басейне Верхняга Нёмана ў X–XIII стст. А. Кібінь і беларускі гісторык з Беластока А. Латышонак.

Літ.: Гостев А.П. О возникновении удельного Городенского княжества и князьях городенских / А.П. Гостев // Наш радавод. – Гродна, 1993. – Кн. 5, ч. 1. – С. 107–109; Госцеў А.П., Швед В.В. Шлюб князя-ізгоя, або як пачынаўся Горадзен // Гродзенская праўда. – 1991. – 1 лістапада. – С. 3; Госцеў А. Азбука гарадзенца // Rocznik Grodzieński. – Grodno: Zjednoczenie społeczne Polska macierz szkolna, 2011. – С. 181–184; Кібінь А. Ад Ятвязі да Літвы. Палітычныя і сацыякультурныя трансфармацыі ў басейне Верхняга Нёмана ў X – XIII стагоддзях // Arche. – 2016. – № 5. – С. 127–133; Латышонак А. Ранньнесярэднявечнае Гарадзенскае княства ў гістарыяграфіі апошняга

дваццацігодзя // Ён жа. Нацыянальнасць – Беларус. – Б.м., 2012, с. 357–367; Назаренко А.В. Городенское княжество и городенские князья в XII в. // Древнейшие государства на территории Восточной Европы. – М., 2000. – С. 169–188; Семянчук Г. Пачаткі Городна / Гродна ў археалагічных і гістарычных даследаваннях канца XIX – XXI ст.: спроба канкрэтызацыі // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні.XV – XX стст. – Мн.: Зміцер Колас, 2013. – С. 278–279.

Успенскі Аляксандр Арэф'евіч (23.08.1872, Вільня ці Галіч Кастрамской губ. – 1951) – арганізатар *палка Першага Беларускага пяхоты* ў Гродне, аўтар успамінаў пра *вайну Першую сусветную*. Тата паходзіў з Вільні, а мама Елізавета – з Гродзенскай губ. Вучыўся У. ў віленскай духоўнай семінарыі, але пасля 5 класа змяніў кар'еру духоўніка на кар'еру вайскоўца – 6.08.1891 уступіў добраахвотнікам у 108 Саратаўскі пяхотны полк, скончыў віленскую вайсковую школу ў чыне падхарунжага (6.08.1894). Службу пачаў у 106 Уфімскім пяхотным палку, 13.08.1899 атрымаў чын паручніка і 2.02.1900 быў пераведзены ў Новатроцкі пяхотны полк. Чарговыя чыны прысвоілі 18.10.1903 (штабс-капітан) і 3.10.1907 (капітан), а 12.02.1908 вярнулі ва Уфімскі полк, дзе служыў да пачатку вайны *Першай сусветнай* (з 26.08.1914 у чыне падпалкоўніка). Ваяваў ва Усходняй Прусіі, 8.02.1915 у пушчы Аўгустоўскай патрапіў у палон і быў пасаджаны ў лагер ваеннапалонных Гладэнфрэй (цяпер у межах г. Гурна Пілава ў Дзержанёўскім пав. Ніжнесілезскага ваяводства). 6.11.1918 быў вызвалены з палону, паехаў у Вільню, дзе добраахвотна ўступіў у Літоўскую армію. Падчас службы ў расійскай арміі атрымаў шэраг ордэнаў: Св. Ганны 3 ст., Св. Станіслава 2 ст. з мячамі, Св. Уладзіміра 4 ст. з мячамі, Георгіеўскі Крыж 4 ст. У Вільні 1.12.1918 атрымаў загад на часовае кіраванне фармаваным Першым беларускім пяхотным палком, эвакуяваным у Гродна. Адначасова літоўскім вайсковым міністрам быў прызначаны начальнікам гродзенскага гарнізона. Тут знаходзіўся да канца верасня 1919, калі збег з-пад польскага арышту (знаходзіўся ў ім тыдзень з 22.08.) у Коўна. Стаў інструктарам 2 батальёна пяхотнага рэзерву (1.09.1919). 14.02.1920 У. пацвердзілі чын палкоўніка, а з 2.03 прызначылі начальнікам Вышэйшых афіцэрскіх курсаў. З 15.06 кіраваў двухмесячнымі афіцэрскімі курсамі пры Ковенскай вайсковай школе. З 27.09.1920 па 12.10.1921 кіраваў сфармаваным у Вільні Самастойным беларускім батальёнам пяхоты. Ад 4.01.1923 да 1.01.1924 быў начальнікам партызанскага штаба Усходняй Літвы. 6.03.1926 звольніўся з літоўскай вайсковай службы. Быў узнагароджаны медалём "Арганізатараў Літоўскага войска". Займаўся гаспадаркай, пісаў успаміны, удзельнічаў у грамадскім жыцці расійкай суполкі.

Творы: На войне. Восточная Пруссия – Литва. 1914–1915. – Каунас, 1932; В плену. Воспоминания офицера. Ч. 1. 1915–1916, Kaunas, 1933; В плену. Воспоминания офицера. Ч. 2. 1917 – 1918, Kaunas, 1933; 1-ы беларускі полк у Гародні і як палякі яго раззброілі // Rocznik Centrum studiów białoruskich=Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– с. 193–220.

Літ.: Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich=Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– с. 189–220; Surgailis G. Lietuvos Kariuoenes. Gudu Kariniai Daliniai 1918–1923 m. – Vilnius, 2020. – s. 255–257.

Ушацкі Іван Іванавіч (7.01.1922, с. Быткі Дрысенскага р-на Віцебскай вобл.) – старшыня Лідскага гарадскога выканаўчага камітэта, старшыня Гродзенскага гарвыканкама (1961–1965). Скончыў Мінскі юрыдычны інстытут.

Ф

Фабрыка кафлі Друцкіх-Любецкіх – прамысловы комплекс, які з'явіўся ў 1895 г. і складаўся з некалькіх вялікіх аднопавярховых будынкаў. Знаходзілася на рагу сучасных вуліц Чырвонаармейскай і Пралетарскай, адразу за чыгункай. На фасадзе аднаго з будынкаў захавалася ўмураваная вялікая кафля з выглядам амураў, якія весяляцца вакол вогнішча. Працэс вырабу кафлі быў ручным, а таму ўмовы працы былі даволі цяжкімі. На пачатку XX ст. на прадпрыемстве працавала больш за 100 чал. Працаўнікі жылі на сучаснай вул. Каханоўскага, у добрых аднапавярховых доміках.

Літ.: Вашкевіч А. На гродзенскім бруку. Вандроўка па фабрыках і прадпрыемствах старога Гродна: ЮрСаПрынт, 2012. – С. 53–55; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 252, 261–264.

Фабрыка Лапіных – "першая краёвая фабрыка па вытворчасці ігральных карт", заснаваная братамі Аляксандрам і Абрамам Лапінымі ў Гродне (канцэсія ад пачатку 1922). Размяшчалася на вул. Ягелонскай (зараз Будзёнага, 56). Займала сем пакояў і некалькі памяшканняў, пабудаваных у двары будынка. Не пазней за зіму 1923 пачалася вытворчасць ігральных карт. У міжваенны перыяд на фабрыцы працавала да 50 чал. пад кіраўніцтвам друкара з Нямеччыны Макса Леапольда Коля. Друкавалі карты народныя, ракайлевыя, венскія, рэйнскія. Па стане на 1938 г. у акцыянернае таварыства літаграфіі ўваходзіла цэлае сямейства Лапіных (Абрам, Барыс, Генрык, Самуіл). Працавала ад 35 да 44 чал. Меліся тры плоскадрукавальныя машыны. За друкаванне карт у 1930 уласнікі заплацілі дзяржаве 230 тыс. злотых падатку з больш чым 320 тыс. калод карт. Восенню 1939 фабрыка была нацыялізаваная Савецкай уладай. Уладальнікі фабрыкі былі забітыя ў гета падчас *вайны Другой сусветнай*. Цяпер будынак фабрыкі займае гродзенская рэгіянальная мытня. Падчас рэканструкцыі на пачатку 2000-х гадоў былі знойдзеныя ўзоры карт Лапіных, і адбыўся сучасны выпуск ігральных карт.

Літ.: Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 76–79; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С.181–184.

"Фабрыка" македонскай халвы – вялікая цукерня арыентальных (усходніх) слодычаў, якая існавала на вул. Дамініканскай/Савецкай з 1927 і ў 1930-х гадах (будынак старога загса) і была папулярным месцам адпачынку гарадзенцаў.

Заснаваная беластоцкім прадпрымальнікам – македонцам Біса Пейкавым, які збег з Балкан падчас *Першай сусветнай вайны*. Летам 1927 ён адкрыў цукерню (бузярню) у Гродне, а ў 1930 яе купіў гродзенскі прадпрымальнік Мікалай Васілевіч і адкрыў цукерню "Арыент". У лютым 1930 яна атрымала залаты медаль на суветнай выставе ў Ніцы. Васілевіч мог пахваліцца такімі слодычамі, як халва (арэхавая, ванільная, шакаладная, з апельсінавай скуркай, Мікада), нугат (шакаладны і фруктовы), рахат-лукум (з арэхамі, лімонны, апельсінавы), пасціла, грыльяж, "сезамкі", чурчхела, карыёка азіяцкая (падсмажаныя шарыкі з рысавай мукі і какоса), скуркі апельсіна або яго долькі ў цукры, пірожныя з макам і з яблычнай начынкай (югаслаўскія), турэцкі (султанскі) хлеб, буза (энергетычны напітак, які выраблялі з грэчневай або аўсянай кашы з дадаткам дражджэй і сметанковага масла).

Літаратура: A. Вашкевіч, Jak orientalne słodycze z Grodna wygrywały na wystawach we Francji// Harodnia.com 27.11.2020.

Фабрыка Нёманская пераплётных вырабаў, заснаваная ў 1899 г. прадпрымальнікамі Уладзімірам Вайсбрэмам і Майсеем Лангбордам. Знаходзілася на сённяшняй вул. Леніна, 3–5. Пачыналі з вырабаў картонна-папяровых (папак, рэгістратараў, кніжных пераплётаў), а затым перайшлі на вырабы са скуры (папкі, пісьмовыя прыборы, гаманцы). У 1913 г. фабрыка мела трохпавярховы будынак, у якім працавала больш за 200 чал. Вырабы фабрыкі вывозілі за мяжу (у Францыю, Вялікабрытанію). У 1928 скураныя вырабы фабрыкі атрымалі залаты медаль на выставе ў Фларэнцыі. У маі 1939 фабрыка, якая належала ў гэты час прамыслоўцу Рэзнікаву, згарэла. Аднавіцца яна не паспела, бо пачалася *вайна Другая сусветная*. Пасля яе ў будынку фабрыкі зрабілі абутковую фабрыку "Чырвоны Кастрычнік", ад якой вядзе адлік свайго існавання сучасная абуткова фабрыка.


Літ.: Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 176–180.

Фабрыка пальчаткавая, знаходзіцца ў будынку былога тонкасуконнага камбіната па вул. Маставой, паводле рашэння *камітэта гарадскога выканаўчага* ад 14.07.1967 г. У сваю чаргу камбінат заняў пасля *вайны Вялікай Айчыннай* захаваны будынак *тытунёвай фабрыкі Шарашэўскага*. Ф. п. дабудавала яшчэ адзін паверх і стала трохпавярховай. Былі знесеныя частка дваровага жылога крыла і кацельная.

Літ.: Саяпин В. История Гродненских площадей. – Гродна: ЮрСаПринт, 2011.—С. 12, 28–29;

С. 901

Фабрыка тытунёвая Шарашэўскага – прадпрыемства, заснаванае ў 1859 г. *Л. Шарашэўскім* і гродзенскім купцом А. Гардонам. Пачало працаваць з 1862 (заява на дазвол была пададзеная ў 1861 пецярбургскім купцом Іосіфам Лейбавічам Шарашэўскім). У 1873 на фабрыцы дзейнічалі конны млын



С. 902

і 6 станкоў для рэзкі тытуню, у 1880–1896 – 3 паравыя машыны (34 к. с.), 2 паравыя катлы, 3 прэсы, 3 сталы, 14 станкоў для рэзкі паперы і 18 крышыльных. У 1895 дадаліся яшчэ дзве паравыя машыны (20 к. с.) і паравы кацёл, а ў 1913 дзейнічалі 2 паравыя катлы (500 к. с.). Колькасць рабочых, занятых на фабрыцы, пастаянна расла: у 1885 – 823 чал., у 1914 – 1400 чал. Сыравіну (махорку, тытунь) прывозілі з расійскіх губерняў, Украіны, Крыма, а тытунь вышэйшых гатункаў – з Амерыкі. У 1873 было выраблена 2,6 тыс. пуд. тытуню, цыгар і папяросаў на суму 40 тыс. руб.; у 1884 – 4,9 тыс. пуд. тытуню, 22,4 тыс. пуд. курыльнай і нюхальнай махоркі, 93 млн. шт. цыгар і 48 млн. шт. папярос – усяго на суму 344 тыс. руб.; у 1913 – 300 тыс. пачкаў курыльнай і нюхальнай махоркі, 6 млн. шт. цыгар, 1500 тыс. шт. папярос – усяго на 3,5 млн. руб. З 1873 г. фабрыка размяшчалася ў трохпавярховым будынку па вул. Маставой (зараз тут *фабрыка пальчаткавая*). Склады прадукцыі знаходзіліся ў Польшчы (Варшаве, Любліне, Лодзі, Радаме, Ломжы), Вільні, Сімферопалі. Вырабы фабрыкі былі ўзнагароджаныя медалямі: срэбным на выставе ў Маскве (1882), у Парыжы (1888, 1889), Бруселі (1888), залатым медалём у Ніжнім Ноўгарадзе (1896). Пры фабрыцы існавалі ашчадная (з 1884) і пазыковая (з 1885) касы. З 1892 дзейнічалі: вучылішча для дзяўчат-падлетка ў, медыцынскі пост (урач і фельчар), дзе можна было набыць лекі з аплатай у сярэднім 10 кап.; з 1912 існаваў прытулак для яўрэйскіх дзяцей-сірот (зараз на праспекце Касманаўтаў). 31.12.1906 (ст. стыль) на базе фабрыкі было зарганізаванае акцыянернае таварыства тытунёвай фабрыкі “І. Л. Шарашэўскі” з мэтаю “працягвання і развіцця дзеянняў (...) тытунёвай фабрыкі, якая дзейнічае пад фірмаю “І. Л. Шарашэўскі” і знаходзіцца ў Гродне, па вуліцы Маставой, у дамах І. Л. і Д. Г. Шарашэўскіх і Ф. Ш. Русоты, а таксама для ўсталявання і эксплуатацыі тытунёвых фабрык у іншых мясцовасцях Расіі і для гандлю вырабамі як сваіх, так і іншых фабрык, і навогул прадуктамі тытунёвай прамысловасці ў сырым і апрацаваным выглядзе” (1 артыкул статута). Заснавальнікамі былі І. Л. Шарашэўскі (1170 акцый, 60% маёмасці) з правам 20 галасоў і Ф. Русота (780 акцый, 40% маёмасці) з правам 20 галасоў. Акцыянерамі сталі: гродзенскі купец Г. В. Гелер (5 акцый), купецкія сыны Ш. І. і Г. І. Шарашэўскія (адпаведна 5 і 4 акцыі), жонка купца Д. Г. Шарашэўская (5 акцый), жонка купца (дачка Шарашэўскага) Г. І. Гелер (4 акцыі), жонка купецкага сына Ш. М. Шарашэўская (4 акцыі), інжынер Я. В. Фрумкін (1 акцыя), жонка інжынера І. Г. Фрумкіна (1 акцыя), прысяжны павераны Г. Я. Яноўскі (1 акцыя), купецкі сын Г. Х. Ліўшын (5 акцый), купецкія сыны Ш. Ф. Русота (5 акцый), Г. Ф. Русота (4 акцыі), С. Ф. Русота (2 акцыі), жонка купца С. Л. Русота (3 акцыі), жонка купецкага сына Н. Ф. Ліўшын (1 акцыя). Дырэктарамі праўлення выбраныя І. Л. Шарашэўскі (старшыня), Г. В. Гелер, Ф. Ш. Русота, Г. Х. Ліўшын (усе тры сябры), а кандыдатамі С. І. і Г. І. Шарашэўскія, С. Ф. і Г. Ф. Русоты. Сябрамі рэвізіённай камісіі сталі Д. Г. і Ш. М. Шарашэўскія, Г. І. Гелер, С. Л. і С. Ф. Русоты, бухгалтарам – Л. Г. Язерскі. Асноўны капітал таварыства ў 1907 г. складаў 2 млн. руб.

(1 акцыя = 1000 руб.). Нерухомая маёмасць (будынак фабрыкі) ацэньвалася ў суму каля 220 тыс. руб., машыны і рознае абсталяванне – каля 300 тыс. руб. Заснаванне таварыства прывяло да павелічэння вытворчасці прадукцыі, як неаднаразова адзначаў Дзяржаўны банк, што выдаваў яму з кожным годам усё большыя крэдыты: "Адна з самых буйных і грунтоўных тытунёвых фабрык у Расіі. Рэпутацыя цудоўная, справа пастаўленая правільна, адміністрацыя выклікае поўны давер". У 1913 акцыянернае таварыства набыло гродзенскую тытунёвую фабрыку "Нёман". Падчас *вайны Першай сусветнай* фабрыка працавала на патрэбы германскай арміі. Адрэзаная ад рынкаў сыравіны ў Расіі і Польшчы, адміністрацыя звярнула ўвагу на развіццё айчыннага тытуню. У 1922 г. было выраблена 1 мільярд 44 мільёны цыгарэт ("Elite", "Polonia", "Eva", "Sokol", "Splendid"). На аснове закона польскага ўрада "Аб тытунёвай манаполіі" ад 1.06.1922, распараджэннем міністра фінансаў ад 31.03.1924 тытунёвая фабрыка таварыства была нацыяналізаваная і да 1939 г. знаходзілася ў кіраванні Варшаўскай дырэкцыі польскай тытунёвай манаполіі. У 1940 быў пабудаваны новы будынак фабрыкі (цяпер на вул. Гарнавых). Архітэктарам, па словах гісторыка А. Вашкевіча, быў варшавянін Стэфан Шылер.

Працоўныя фабрыкі прымалі ўдзел у рэвалюцыйнай барацьбе ў канцы XIX – пачатку XX стст.: стачка работніц у 1899, *забастоўкі* ў снежні 1900, снежні 1903, студзені, красавіку, чэрвені і кастрычніку 1905, лістападзе 1907, кастрычніку 1908. Масавыя выступленні адбыліся ў 1920–1930-я гады: лістапад 1921, восень 1930, 1931, сакавік 1936.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 9, с. 1429, а. 50 об.–54; Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 44–53; гл. таксама да артыкула "Шарашэўскі".

Фалевіч Войцех (1863, Вільня – 1935, Варшава) – вайсковы інжынер, польскі камендант крэпасці Гродна ў 1919. Скончыў Мікалаеўскае інжынернае вучылішча (1884) і Мікалаеўскую інжынерную акадэмію (1889). Удзельнічаў у перабудове крэпасцей у Дэмбліне і Модліне, на будоўлі Дубноўскай крэпасці. З 1906 – генерал-маёр, начальнік будаўніцтва ў Пецярбургскай вайсковай акрузе. У Войску Польскім са снежня 1918. У 1919 у Гродне камендант Ф. аглядзеў 4 страявыя роты і кулямётную каманду палка першага беларускага; размаўляў з афіцэрамі, цікавіўся рэлігійным складам службоўцаў. 31.05.1919 аддаў загад аб пераездзе палка ў Слонім. Калі камандзір палка Антонаў І. адмовіўся яго выканаць, 1.06 полк быў польскімі вайскоўцамі раззброены. Пасля Гродна Ф. быў камендантам крэпасці ў Грудзёндзы (1920). У 1921 выйшаў у адстаўку.

Літ.: Pułkownik Aleksander Uspienski i jego wspomnienia o Pierwszym Białoruskim Pułku Piechoty w Grodnie / T. Błaszczak // Rocznik Centrum studiów białoruskich=Гадавік Цэнтра беларускіх студыяў. – 2021. – № 7.– S. 210–211.

Фалькоўскі Якуб – літаратар, аўтар твораў: Oda na imieniny M. Andrzejkowicza, wice-gubernatora grodzieńskiego. – Grodno, 1816 (Ода на імяніны *М. Андрайковіча*, віцэ-губернатара гродзенскага); Kazanie na uroczyste objęcie władzy przez S. Niemcewicza (…) przed wykonaniem przysięgi na urząd gubernatora cywilnego guberni Litewsko-Grodzieńskiej. – Grodno, 1816 (Казанне на ўрачыстае атрыманне ўлады *С. Нямцэвічам* (…) перад выкананнем прысягі на пасаду цывільнага губернатара Літоўска-Гродзенскай губерні). Магчыма, гэта той Ф., які быў ініцыятарам стварэння Варшаўскага інстытута глуханямых і сляпых. Ён памёр у 1848 ці 1849, калі была выдадзеная брашура з вершам на ягоную смерць. Пахаваны ў касцёле Св. Аляксандра ў Варшаве. Творы Ф. знайсці пакуль не ўдалося.

Фандэнберкі/Франдэбергі – сям'я, якая прыехала ў Гродна з нямецкамоўнага рэгіёну Еўропы (магчыма, з Усходняй Прусіі). Прадстаўнікі ўладнай эліты горада.

Ганус, *бурмістр* Гродна (1627–1629), райца (1633). У 1629 за асабістыя сродкі пабудаваў *Рынак,* і Жыгімонт III дазволіў яму карыстацца гандлёвым мытам з тавараў, якія прывозілі ў Гродна на Рынак. Пасля смерці Ф. дадзенае яму права збіраць падатак было перададзенае гарадскому *магістрату*. Зроблена гэта было з мэтаю вярнуць расходы, панесеныя бурмістрам на добраўпарадкаванне горада. Ф. быў арганізатарам будаўніцтва першага ў Гродне *вадаправода*. На Рынку (цяпер пл. Савецкая) знаходзіўся *калодзеж*. Жонкай Гануса была Марына з *Цвіклічаў*.

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 350–352; Volumina legum. T. V. – Petersburg, 1860. – S. 400.

Фантана Юзаф Дамінікавіч (каля 1700 – пасля 1755) – каралеўскі архітэктар. Сын Дамініка Фантаны, капітана войск Вялікага Княства Літоўскага і Тэклі Перасвет з Салтанаў. Пабудаваў у Гродне *царкву Раства Багародзіцы* 1726 г., прымаў удзел у шляхецкіх *сеймiках,* бо меў у ваколіцах земскі маёнтак, пачаў будаваць касцёл у Сталавічах каля Баранавіч цяпер Брэсцкай вобл. (каля 1740). У 1755 іх сям'я прадала *Масальскім* Свяцк, Каўняны і Васілевічы. Магчыма з удзелам бацькі, будаваў у 1738 гродзенскі *палац Радзівілаў*.

Літ.: Трусаў І. Архітэктары і дойліды Гародні XVIII ст. / І. Трусаў // Arche. – 2010. – № 1–2 – С. 9; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков / И.Г. Трусов. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012; Szymański S, Pałac królewski w Grodnie // Rocznik Białostocki. T. VI. – 1966. – S. 297–333.

Фара Вітаўта, упершыню згадваецца як прыхадскі касцёл Узнясення Найсвяцейшай Маці Божай у грамаце *Вітаўта*, дадзенай *яўрэям* Гродна ў 1389 г. Магчыма першым, хто назваў храм Фарай Вітаўта, быў гісторык Гродна *Ядкоўскі Юзаф*. У 1392 Вітаўт даў касцёлу фундацыю. Вядома, што апошні быў да 1570–1580-х гадоў драўляным. Яго галоўны фасад звернуты быў на захад, у бок замка і існай на той час гарадской забудовы, а апсідай прымыкаў да лініі абарончых умацаванняў. У 15 ст. гарадская планіроўка змянілася, і Фара

С. 903



С. 904

апынулася да Рынку апсідай, а не галоўным фасадам. У плане Ф. В. – прамавугольны будынак, крыты двухсхільным дахам. Побач была шмат'ярусная вежа-званіца. Выгляд храма пасля перабудовы ў 1480-х гадах можна пабачыць на гравюры М. Цюнта. Менавіта ў гэты касцёл прыходзіў на малітву каралевіч *Казімір*, сын караля *Казіміра Ягелончыка*, кананізаваны ў 1521 г. У 1494 в. к. л. і кароль польскі *Аляксандр* абнавіў касцёл. На загад каралевы *Боны* ў 1551 Фара Вітаўта была перабудаваная, але зноў засталася драўлянай. *Стэфан Баторы* у 1584 у лісце да правінцыяла ордэна езуітаў Кампаны ацэньваў касцёл ля Рынку, як "самы вялікі і самы прыгожы ў Вялікім Княстве Літоўскім, але драўляны". Гродзенскія гісторыкі І. Трусаў і А. Краўцэвіч лічаць, што ў 1587 драўляны касцёл быў разабраны, бо да гэтага часу з 1584 побач быў пабудаваны мураваны. Архітэктарам быў *Санці Гучы*, а не Джавані/Ян Марыя Бернардоні, як лічыла даследчыца архітэктуры Т. Габрусь. За паслугі падчас будаўніцтва (даваў вапну і цэглы) каралём быў узнагароджаны зямлёй італьянскі будаўнік *Антоні Дзікрэп/Дэгрып* (Dikgrep/Dekgrip). Магчыма, прыклаў руку да будаўніцтва і нямецкі архітэктар Ёзаф Ройтэн, таму ў храме спалучаліся італьянскае барока і нямецкая готыка. У касцёле гарадзенскія *цэхі* мелі свае алтары. Храм быў моцна разбураны падчас *вайны 1654–1667*, але ў 1673 быў адрамантаваны. Пазней ні адзін раз цярпеў ад *пажараў* (1720, 1753, 1782 і інш.). Згодна з інвентаром Ф. В. 1793 яна знаходзілася "у вялікім разбурэнні". Пра гэта сведчыць і тагачасны малюнак Ганны Тышкевіч. У часы Расійскай імперыі будынак быў перароблены ў *сабор Сафійскі*. У 1920 Ф. В. вярнулася да католікаў, і была перабудаваная ў гарнізонны касцёл. Пасля *вайны Вялікай Айчыннай* ў будынку знаходзіліся розныя арганізацыі і ўстановы. У лютым 1949 у Ф. В. размяшчаўся "Загатлен" і пакой з падвалам займала аргбюро добраахвотнага Таварыства садзейнічання арміі Гродз. вобл. Званіцу ў гэтым годзе перадалі Таварыству садзейнічання авіяцыі для арганізацыі парашутнай вышкі. У 1951 аблвыканкам перадаў касцёл Гродзенскаму міжраённаму аддзяленню "Аўтатрактарсбыта" пад склад запчастак. У 1958 Ф. В. ледзь не стала аб'ектам перабудовы пад шырокафарматны кінатэатр, а ў 1959 – пад гарадскі Дом фізічнай культуры. Але лёсам было наканавана іншае: 8.03.1961 выканаўчы *камітэт гарадской Рады* дэпутатаў працоўных вырашыў знесці Ф. В., як неадпаведную новаму *генеральнаму плану* Гродна (усе пастановы, якія тычацца зносу Фары ёсць у кнізе *Саяпіна В.)*. Быў зацверджаны каштарыс у суме 19,5 тыс. руб., у тым ліку вяртанне матэрыялаў – 11,93 тыс. руб. Начальнікам выбуху быў прараб Ленвыбухпрама тав. Піна М. В. А ўсю падрыхтоўчую працу па выбуху (праект, разлікі) зрабіў маёр Зубкоў, якога ўзнагародзілі пазней залатым гадзіннікам, а не нейкае ленінградскае "дзяўчо невысокага росту". Выбух быў прызначаны на 2.00 29.11.1961. З бліжніх дамоў, з кватэр, якія выходзілі на касцёл, выселілі жыхароў. Міліцыя і ДАІ забяспечылі ахову тэрыторыі. Каля аб'екта дзяжурылі экскаватар, бульдозер, брыгада шкляроў, цесляроў і дахаўшчыкоў з патрэбнымі матэрыяламі для аварыйных прац. Цэгла вывозілася на балота ў раёне сённяшняй вул. Суворава (арыентыр – крама

“Суворaўская”), дзе пазней пабудавалі жылы раён. А на месцы Ф. В. разбілі сквер, дарожкі якога былі пасыпаныя молатай цэглай. Пасля апошняй рэканструкцыі пл. Савецкай дарожкі выклалі бетоннай пліткай. Цяпер там стаіць помнік у выглядзе аркі, якая выглядам і крыжамі напамінае, што на гэтым месцы стаяў храм, які ў розныя часы быў ці касцёлам, ці царквой.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 12; Кишик, Ю.Н. Градостроительное наследие Беларуси. Гродно, Минск, 2012. – С. 78 –97; Мілінкевіч А., Пашэнда Е. Фара Вітаўта ў Гродне // Наш радавод. Кн. II. – Гродна, 1990. – С. 182; Саяпин Ю.В. Утраченные католические храмы Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 3–21; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С. 51–54; Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 22–23; Lawszuk W. Stefan Batory i Jezuici w Grodnie: Pierwsza próba założenia kolegium // Rocznik Grodzieński. – 2008. – № 2. – S. 74; Wilczewski W. Fara Witoldowa w Grodnie – następny etap // Goniec Kresowy. – 1993. – n. 3 (15). – S. 18.

Фардон Юзаф Якуб, манах Мельхіёр (2.08.1862, Гродна – 27.02.1927, Гродна) – святар, гродзенскі святы. Сын *Якуба Ф.* і Феліцыі з Луковічаў. Скончыў сярэднюю школу і марыў стаць святаром. Колькасць семінарыстаў абмяжоўвалася расійскай уладай, а таму прыйшлося чакаць і працаваць у аптэцы. З 1883 г. пачаў вучобу ў віленскай семінарыі і пасля яе заканчэння 2.08.1887 быў у Коўне пасвечаны ў святары. Служыў у парафіях: Струбніца пад Ваўкавыскам (1887–1893), у Дамброве пад Саколкай (цяпер Польшча, 1893–1902); у *касцёле Францішканскім* Гродна (1902–1905). Прысвячаў шмат часу катэхізацыі дзяцей. У Гродне служыў 2 гады і 4 месяцы (парафія мела *прадмесце Занёманскае* і 18 вёсак). Апекаваўся сасланымі ў кляштар пакаранымі святарамі, хворымі парафіянамі, дзяцьмі-падкідышамі. У 1905 служыў у Вільні ў парафіі Усіх святых. Царская ўлада пазбавіла яго магчымасці служыць ксяндзом, забараніла яму працаваць святаром на тэрыторыі імперыі, а затым прыгаварыла Ф. да прымусовага знаходжання ў францішканскім касцёле. Ф. вырашыў пайсці манахам у кляштар і 20.09.1910 прыняў навіцыят у львоўскіх францішканцаў пад імем Мельхіёр. У 1911 вярнуўся ў Гродна, дзе апекаваўся сёстрамі назарэтанкамі. У верасні 1915 выратаваў 13 гродзенскіх пажарных ад смерці, бо немцы падазравалі іх у падаванні сігналаў рускай артылерыі на *вежы пажарнай*. Фардон прапанаваў нямецкаму афіцэру забіць яго замест пажарных, якія ні ў чым не вінаватыя. Уражаны ўчынкам Ф. афіцэр вызваліў арыштаваных. Пажарныя Гродна на сваім агульным сходзе надалі Ф. тытул “вечна ганаровага сябра і капелана гродзенскай пажарнай аховы”. Пасля атрымання Польшчай незалежнасці Ф. быў выбраны пробашчам, у 1919 – гвардыянам (старшынёй кляштара). Быў спавядальнікам *Кольбэ Максіміліяна* і яго дарадцам у выданні часопіса “Rycerz Niepokalanej”. У 1925 Ф. стаў хварэць на сухоты і хутка памёр. Пахаваны 2.03.1927 на *могілках каталіцкіх* пры вялікай колькасці сабранага народу, духавенства, манахінь. У міжваенны час 1919–1939 у Гродне была вуліца імя Ф. на прадмесці Занёманскім.

Літ.: Гостев А.П., Известные личности Гродно. – Гродно, 2016. – С. 180–188; Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 97; Stępień K. Grodzieński święty // Głos znad Niemna. – 1996. – 23–31.12. – S. 5.

Фардон Якаў/Якуб Марцінавіч (1808 – 1888, Гродна) – архітэктурны памочнік (з 04.02.1850), калежскі рэгістратар (з 5.08.1841). Пасля заканчэння гродзенскага павятовага на правах гімназіі вучылішча 9 гадоў вучыўся ў гродзенскага губернскага архітэктара. Вывучаў тэорыю і практычныя навыкі грамадзянскай архітэктуры. Затым пры друкарні Літоўскага асобнага корпуса навучаўся чарчэнню планаў, літаграфіі і геаметрыі. У 1823 г. збудаваў паром і мост, што плавае на *Нёмане*. З 1831 працаваў памочнікам гродзенскага губернскага архітэктара. У 1835 быў памочнікам архітэктара ў будаўнічай камісіі Беластоцкага праўлення. Склаў планы знішчэння беластоцкіх кляштараў. У канцы 1844 быў прыкамандзіраваны ў адмысловую камісію для ацэнкі каменных дамоў унутры Брэст-Літоўскай крэпасці. Пахаваны на *каталіцкіх могілках* у сектары L 165.

Літ. і крыніцы: НГАБ у Гродне, ф. 8, оп. 1, с. 550, а. 6 адв.- 7), ф. 98, воп. 1, с. 932, а. 8 адв.; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 142.

Фарты – умацаванні пабудаваныя ў Гродне І. Н. Кайгародавым паводле рашэння Генштаба расейскай арміі 1897 г. Усяго збудавалі 7 фартоў, якія знаходзяцца ў наступных месцах: № 1 на правым беразе Нёмана ў раёне лесапарку "Пышкі"; № 2 – стадыён каля СШ № 12; № 3 – раён прадпрыемства "Хімвалакно"; № 4 – раён гарадской клінічнай бальніцы № 4; № 5 – могілкі францішканскія; № 6 – мікрараён Дзевятоўка, у раёне канцавога прыпынку тралейбусаў на вул. Дзяржынскага; № 7 – запраўка "Лукойл" на вул. Багуцкага. Кожны форт займаў плошчу 400х200 м, а перыметр умацаванняў, якія павінны былі ахопліваць горад, складаў 12–14 км. Фарты будаваліся з зямлі і невялікай колькасці дрэва і бетона. Па сваёй канфігурацыі напаміналі шматвугольнік няправільнай формы. Былі абнесеныя вялікім ірвом і брустверам, уваход ва ўнутраны дворык ахоўваўся папярэчным земляным насыпам. Часткова захаваліся фарты № 1, 4, праглядаюцца валы на форце № 2.

Літ.: Лютик Д., Семенчук А. Сто лет одиночества. Неизвестная крепость Российской империи: путеводитель по фортам крепости. – Гродно: б. и., 2012. – 48 с.; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 113–114; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 282–290.

Фарштат Занёманскі (гродзенскі фарштат**,** занёманскае прадмесце Горадні) – назва левабярэжнай часткі горада прыкладна з канца XVIII ст., падчас старосцва *Тызенгаўза А.*, які прыцягваў у горад еўрапейскіх рамеснікаў. А засяленне левага берага *Нёмана* пачалося ў сярэднявеччы. У 1390 *Вітаўт* пабудаваў тут *замак "Новы Горадзен"*. У прывілеі на магдэбургскае права 1496 г. гаворыцца,

што гарадское ўпраўленне распаўсюджваецца і на гараджан, якія жывуць за Нёманам. Тут знаходзілася вёска Занямонне/Панямонне ці Рылоўцы. Землямі валодалі *Агінскія, Патоцкія, Радзівілы*, горад і *эканомія Гарадзенская*. З Фарштата ад рэзідэнцыі *Яна Забярэзінскага* ў лютым 1508 пачаўся мяцеж М. Глінскага, які перайшоў на маскоўскі бок. У красавіку 1706 расійская армія пакідае Гродна і праз Нёман пераходзіць на левы бераг, уратоўваючыся ад шведскіх войск. У 1796 Прусія ў дэмаркацыйнай камісіі настойвала на перадачы ёй ўсяго левага берага Нёмана да р. Свіслач. Пасля далучэння Гродна да Расійскай імперыі ў структуры Фарштата адбываюцца значныя змены, а яго тэрыторыя паступова ссоўваецца на поўдзень ад занёманскага рынку (зараз пляцоўка паміж кляштарам францішканскім і Інстытутам развіцця адукацыі) у раён прыстані Хлебнай. Спалучала два рынкі вул. Варшаўская (бачна на мапе 1793) ад кляштара да скарбавай *карчмы*. Калі ў 1860 г. на Фарштаце было толькі 5 вуліц (Беластоцкая, Луненская, Рэзніцкая (Мясніцкая), Францішканская і Лабенская), дык у 1915–17 (Ласасянская, Аўгустоўская, Індурская, Леванабярэжная і інш.). У сяр. 1890-х была пабудаваная *царква Свята-Уладзімірская*; на ўзвышшы, на сучаснай вул. Дарвіна, стаяла да 22.06.1941 драўляная *сінагога* (збудаваная каля 1760). З прамысловых прадпрыемстваў на Фарштаце дзейнічалі тытунёвая фабрыка "Нёман" з 1911 (якую выкупіў у 1912/1913 *Шарашэўскі*, а ў 1924 – дзяржава), бровары, медаварны завод Б. Лабенскага ў 1869, млыны, тартакі, фотамайстэрня Краўзэля з 1912 г. У міжваенны час пачалі працу малаказавод, гарбарня, шкляная гута, у 1938 на вул. Індурскай пачалі будаўніцтва элеватара на тысячу тон збожжа. На скрыжаванні сучасных вуліц Савецкіх пагранічнікаў і Гарнавых знаходзіўся *гатэль* "Надзея". Існавала школа імя С. Жэромскага (зараз № 6). На плане 1937 г. відаць, што новымі вуліцамі злучыліся Эканамічная і Ласасянская, утварыўшы раён "Агароды" (вул. Лялевеля, Райгарадская, Глогера, Падляская), з'явілася калонія *Палесціна*. Адзін з жыхароў Фарштата Б. Грабінскі ўспамінаў: "Фарштат розніўся ад горада, быў падобны да малых мястэчкаў на Беларусі. Тады як у Горадні каталіцкая інтэлігенцыя гаварыла па-польску, праваслаўная – па-расейску, жыды – ламанаю расейскаю моваю, Фарштат гаварыў па-беларуску. Было там пару жыдоўскіх хатаў, дзе гаварылі па-жыдоўску і па-беларуску тож".

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 96; Вашкевіч А., Занёманскі Фарштат Горадні ў XVI – першай палове XX ст.: эвалюцыя гарадской прасторы / А.Вашкевіч, А. Чарнякевіч // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С.210–221; Гостев А.П. Кронон. Летопись города над Неманом (1116–1990) / А.П. Гостев, В.В. Швед. – Гродно: НВК "Пергамент", 1993. – С. 17, 20, 37, 149, 191; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 311–313.

Фатаграфія з'явілася ў Гродне падчас будаўніцтва першай чыгункі. У лістападзе 1861 г. горад наведаў грамадзянін Аўстра-Венгрыі Антон Рорбах і зрабіў панарамныя здымкі Гродна. Цікавыя здымкі (панарама правабярэжнай часткі С. 905



С. 906

горада; Фарны касцёл) з 1860 рабіў гродзенскі фатограф, шарашэўскі мешчанін Ілля Штуман. Яго фотамайстэрня знаходзілася на вул. Замкавай. На ёй была з 1863 і фотамайстэрня пруская падданага Эміля Менцэля. 24.02.1865 заснаваў сваю фірму адзін з самых вядомых фотамайстроў Іван Садоўскі (на вул. Купецкай). У 1871–1907 яго кампаньёнам быў Люцыян Казлоўскі. У будынку *кляштара дамініканскага* працавала з 1881 фотамайстэрня М. Г. Кушнера, а ў доме Абрамскага па вул. Купецкай – фотамайстэрня *Якава Ісакавіча Салавейчыка* (з 1884 – яго сына Восіпа/Іосіфа). З'язджаючы ў эміграцыю ў Амерыку, апошні прадаў майстэрню сям'і свайго зяця, Ліпу Эліёвічу і Сары Якаўлеўне Блох. У доме Баркоўскага, які стаяў на месцы сённяшняй новай часткі ўнівермага, былі тры фотамайстэрні: *Мардуха Шаломавіча Папірнага* (1884–85, 1896–1900 гг.), *Зельмана Карасіка* (1895) і *Хаіма-Арона Файвелевіча Язерскага* (1897–1901). У 1890 г. атрымала атэстат і званне "жанчына-фатограф" Ента (Яўгенія) Аўсееўна Райхштэйн, якая адкрыла сваю фотамайстэрню праз 4 гады. У доме Чартка, па вул. Саборнай, 21, размяшчалася ў 1894–1896 фотамайстэрня *Хаіма Бініковіча*, а з 1903 – "спецыяльнае атэлье мастацкіх партрэтаў" Мікалая Рубінштэйна (з 1915 у доме Левандоўскага, 15, а ў міжваенны час – на вул. Дамініканскай). У 1898 па вул. Мураўёўскай, у доме Арловай, адкрылася майстэрня фатографа-аматара штабс-капітана *К. Мараўскага.* З 1901 на вул. Саборнай, у доме Яфэ, працавала фотамайстэрня пляменніка З. Карасіка Зеліка Карасіка. У доме Левандоўскага знаходзіліся фотамайстэрні *Ф.-Д. Д. Адляніцкага-Пачобута* (1902–1911), Г. А. Шульнер-Дамбравіцкага (да пачатку *вайны Першай сусветнай*). У доме Левінсонаў па сённяшняй вул. Савецкай, 1, на пач. XX ст. знаходзілася фотамайстэрня *Лейбы Гельгара*, які працягваў справу свайго бацькі Меера. У 1912 пасведчанне на фатаграфаванне атрымаў Браніслаў Барэвіч, які працаваў і ў гады Першай сусветнай вайны. У міжваенны час дзейнічалі фотамайстэрні "Мадэрн" Станіслава Рамашкевіча (Ажэшкі, 14); "Venus" П. Меламеда (Дамініканская, 19), Дамініка Анэрыка (Скарбовая, 10/Урыцкага), М. Палніцага (Агародная/Завадская). Каб зарабіць, некаторыя фатографы прапаноўвалі свае паслугі на вуліцы, асабліва на рагу Дамініканскай і Ажэшкі: бясплатна рабілі маленькі здымак і на канцы вуліцы ўручалі кліенту. Калі яму спадабалася, ён заказваў за грошы адбітак большага фармату. У 1941–1944 гг. на вул. Брыгіцкай (зараз К. Маркса) працавала фотамайстэрня Ю. Бахмінскага "Арыён".

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 283, 285, 295, 297, 298; Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 243; Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня, Вроцлаў, 2014, – С. 338; Иващенко Н.А., Повседневная жизнь губернского города Гродно (XIX – начало XX века). – Гродно: ЮрСаПринт, 2019. – С. 181, 183, 224–226; Казак Т., Вашкевіч А. Гродзенскія фотамайстры 1860–1930-х гг. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. // Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 463–473; Соболевская О.А. Гродненские евреи в экономической жизни города конца XIX века // Rocznik Grodzieński. – 2011. – S. 91–92.

Федарук Леанід Уладзіміравіч (17.07.1914, Янава – 8.08.1944, Ларэта, Італія) – сын педагога *У. Т. Федарука*, гродзенскі лёгкаатлет, выступаў за спартовыя клубы "КС Крэсовія" (1931–33), затым у Вільні і Варшаве. Трохразовы рэкардсмен Польшчы і двухразовы чэмпіён краіны ў кіданні дыска, трохразовы віцэ-чэмпіён і бронзавы медаліст чэмпіянату Польшчы па штурханні ядра. Удзельнік міжнародных спаборніцтваў у складзе каманды Польшчы. Уключаны ў алімпійскую каманду 1940 г., але спаборніцтвам перашкодзіла *вайна Другая сусветная*. Падпаручнік легендарнага палка "Скарпіёны". Ваяваў з фашыстамі ў Афрыцы і Італіі, пад Монтэ-Касіна ў складзе арміі Андэрса. Забіты ў баі пад Анконай і пахаваны на могілках італьянскага Ларэта. Узнагароджаны крыжам "Virtuti Militari" і "Крыжам Храбрасці".

Літ.: Павач А. Легенды не старой Гародні. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2018. – С. 117; Саяпин В. Гродненский спорт: история и достижения. 1919–1939 годы. Гродна: ЮрСаПринт, 2015. – С. 13–14, 195.

Федарук Уладзімір Трафімавіч (1885–?), з 1919 настаўнік, а прыкладна з 1921 па 1926 – дырэктар агульнагарадской *школы беларускай*. Меў яшчэ даваенны педагагічны стаж, папоўніў яго курсамі беларусазнаўства ў Вільні. Карыстаўся даверам грамадскасці і здолеў падняць на добры ўзровень вучэбна-выхаваўчы працэс. Польскі школьны інспектар *Вазнякоўскі* быў вымушаны прызнаць яго школу. У 1939 быў рэпрэсаваны савецкімі органамі НКУС. Меў жонку Алену, дачку Ганну 1910 г. н. і сына *Леаніда,* вядомага спартсмена.

Літ.: Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 91.

Філаматы і іх таварыства ў Гродне. Польская даследчыца Марыя Дунаюўна назвала яго "Stowarzyszenie" (па-беларуску – "Асацыяцыя"). 25.03.1821 філамацкі Саюз сяброў абмеркаваў праект арганізацыі малых саюзаў. Паводле яго кожны філарэт павінен быў стварыць такі саюз з мэтаю "напрыклад, хадзіць на прагулкі і там чытаць перыядычны друк, альбо якой-небудзь карыснай забавай бавіць час". Чальцы Саюза сяброў меліся іх апякаць. Тамаш Зан казаў, што "кожны адпаведна характару знойдзе сабе падобных і з імі адпаведны час будзе праводзіць". Таварыства магло б дапамагаць праз складкі на стыпендыю беднаму студэнту Віленскага ўніверсітэта; уплываць на выбары добрых чыноўнікаў у мясцовых органах самакіравання; садзейнічаць паляпшэнню побыту сялян.

М. Дунаюўна лічыць, што таварыства сфармаваў М. Рукевіч. У знойдзеным намі лісце Францішка Малеўскага да Адама Міцкевіча ад 22.02.1821 ёсць згадка пра тое, што "Рукевіч арганізоўвае саюз у Гродне". У лісце да Яна Чачота ад 16.03.1822 Рукевіч піша, што па справах білетаў на паэтычны зборнік А. Міцкевіча: "Спадзяюся быць у Гродне і Беластоку". Магчыма, прыклаў свае намаганні і Ануфры Петрашкевіч, які паходзіў з блізкага Шчучына і падчас стварэння таварыства прыязджаў некалькі разоў у Гродна. Тут жыла Эля (Анэля) Лучко, вучаніца Тамаша Зана, якая прыязджала ў Гродна да Петрашкевіча ў 1820. На вербную нядзелю ў 1841 прыязджаў ў Гродна *Т. Зан.*

Пра дзейнасць таварыства мала сведчанняў. Вядома, што збіралі складкі на стыпендыю для студэнта Віл. У., а таксама на ўзнагароду за працу, напісаную пра тое, як палепшыць быт сялян. Дзейнасць Рукевіча атрымала прызнанне ў філаматаў і погляд на яго як на "выдатнага чальца ў правінцыі".

Літ. і крыніцы: Dunajówna M. Filomaci na prowincji. – Wilno, 1935. – C. 30; Kronika życia i twórczości Mickiewicza. Lata 1798–1824 / M. Dernałowicz, K. Kostenicz, Z. Makowiecka. Warszawa:PIW, 1957. – C. 276, 282, 326, 342; Mościcki H. Pod znakiem Orła i Pogoni. Szkice historyczne. Wyd. 2. – Lwów, Warszawa, 1920, s. 134–136, 231–234; Materiały do historii Towarzystwa Filomatów. T. III, wyd. S. Pietraszkiewicz. – Kraków: Polska Akademja Umiejętności, 1934, s. 76–77.

Філармонія, цяпер знаходзіцца ў будынку на вул. Савецкая, 9, які быў пабудаваны ў 1961 г. для размяшчэння тут кінатэатра "Гродна". Пры гэтым знеслі камяніцы Залуцкай і Фрумкінай, дзе у розныя часы былі: аптэчная крама, агенцтва 1-га расійскага страхавога таварыства ад агню, аптэка Атовіча і ювелірная майстэрня.

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 292

Фіх Барыс Маркавіч (9.06.1923, с. Грушка Каменскага р-на Малдаўскай ССР – 5.07.1977, Гродна) – прарэктар па вучэбнай і навукавой працы Гродзенскага педагагічнага інстытута (гл. *Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт*), гісторык, доктар гістарычных навук (1968), прафесар. Вучыўся ў Ціраспальскім педагагічным інстытуце (1939–1941). Падчас *вайны Вялікай Айчыннай* вучыўся ў Ціхарэцкай авіяшколе (кастрычнік 1941 – сакавік 1942) і ў II Бакінскім пяхотным вучылішчы (красавік і жнівень 1942). Са жніўня 1942 па май 1945 быў на фронце, большую частку перакладчыкам разведаддзела. Вучыўся на гістарычным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута (скончыў у 1948, а аспірантуру – у 1951). Загадчык кафедры, затым – нам. дырэктара па вучэбнай і навуковай працы настаўніцкага інстытута ў Пінску (1951–1954). З кастрычніка 1954 па красавік 1976 – у Гродзенскім педагагічным инстытуце: старшы выкладчык кафедры гісторыі, загадчык кафедры гісторыі СССР, прарэктар па вучэбнай і навуковай працы, прарэктар па навуковай працы.

На 10.03.1975 – 71 навуковая праца, у тым ліку манаграфіі: "Гродно" (у суаўтарстве з З. Ю. Капыскім) – Мн., 1960, 1964; "Аграрная революция Белоруссии (1917–1920)" – Мн., 1965; "Гродненская область" – Мн., 1968 (аўтар дзвюх глаў і кіраўнік аўтарскага калектыва). Асноўныя творы Ф. прысвечаныя гісторыі сельскай гаспадаркі, сялянству Беларусі ў 1917–1920, рэвалюцыйнаму руху ў Гродзенскай губ. у 1905–1907, методыцы выкладання гісторыі, выкарыстанню краязнаўчага матэрыялу.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны II ступені, медалямі, знакамі "Отличник высшей школы" і "Отличник просвещения БССР".

Літ.: Прафесары Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. 1940–2010. – С. 110–112.

Фольксдойчэ – прывілеяванае насельніцтва падчас нямецка-фашысцкай акупацыі Гродна, прызнанае нямецкай цывільнай адміністрацыяй. Дадзеныя асобы павінныя былі адпавядаць наступным патрабаванням: паводле крыві належаць да нямецкай нацыі, добра ведаць нямецкую мову, ведаць культурныя традыцыі і мець гістарычны досвед, прызнаваліся і рэлігійныя прыкметы (напрыклад, прыналежнасць да евангелісцкай канфесіі). Дарослыя мелі магчымасць працаваць у нямецкай адміністрацыі, мелі лепшыя жыццёвыя ўмовы. Іх дзеці вучыліся ў спецыяльных *школах фольксдойчэ*.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 210–211.

Фолюш – мікрараён Гродна. Пачаў фармавацца ў часы рэформ *Тызенгаўза А.* (1765–1780). Тут былі пабудаваныя дзве суконныя мануфактуры, на якіх "фалявалі" (выпрамлялі) сукно (гл. *Кунстава).* Тэрыторыя ўваходзіла ў маёнтак *Аўгустова.* У часы *вайны Вялікай Айчыннай* тут знаходзіўся лагер для савецкіх ваеннапалонных і мірных грамадзян, які пачалі арганізоўваць 25.07.1941 у в. Калбасіна (раён Фолюша на плошчы ў 50 га, 96 зямлянак памерам 6х25 м, вышынёй 3 м). Прайшлі праз лагер 36 тысяч чал., 18 тысяч пахаваныя ў ямах, колькасць усіх пахаваных у магілах застаецца невядомай.

Літ.: Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 29; Швед В.В. Летапіс горада Гродна (1005- 2005). – Гродна: ЮрСапрынт, 2020.

Фрумкін Іосіф – патомны *ганаровы грамадзянін* Гродна, валодаў у 1886 г. двухпавярховай камяніцай з флігелем і драўляным домам на вул. Саборнай. У мураваным доме размяшчалася крама з малочным аддзелам, бакалеяй і кафетэрыем. Імя Фрумкіных згадвалася з *лазняй*, якая знаходзілася на Віленскай вул.

Фрэйліх (Фройліх) Францыск Ксаверы – палкоўнік, дырэктар Гродзенскай *школы кадэтаў*. Магчыма, ураджэнец Саксоніі. 20.10.1767 г. Караль Радзівіл адправіў обер-лейтэнанта Фрэйліха са Слуцка ў Нясвіж для кіравання дырэкцыяй Рыцарскай школы (Корпуса інжынернага і артылерыі). На пачатку 1774, калі яна была закрытая, бо засталася без сродкаў для існавання, а кадэты разбегліся, Ф. пераехаў у Гродна, дзе ўзначаліў школу кадэтаў А. *Тызенгаўза* (1773–1782). Швейцарскі вучоны Ё. Бернулі ў 1778 не змог пабачыць Ф. і пагаварыць з ім (бо той зламаў нагу), але напісаў у сваім дзённіку, што ён прыхільнік прыродазнаўства і мае калекцыю мінералаў.

Літ.: Родионов, А. Гродненский кадетский корпус / А. Н. Родионов // Весн. Гродз. дзярж. ун-та ім. Я. Купалы. Сер. 1: Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. – Гродно, 2006. – № 4. – С. 51–57; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 343, 882.

Фукс Лейба – гродзенскі купец 2-й гільдыі (1871). Домаўладальнік па вул. Дамініканскай (Саборнай) у Гродне (дом пабудаваны на пачатку 1860-х, пашкоджаны *пажарам* 1885 г.). У яго доме (цяпер вул. Савецкая, 5 і 7) у 1861–1863 была явачная кватэра гродзенскай *рэвалюцыйнай арганізацыі*, дзе часам бываў *В.-К. Каліноўскі* (напрыклад, у чэрвені 1863 сустракаўся с *Заблоцкім Э.*). Менавіта ў доме Ф. адбыўся сход гродзенскіх чальцоў арганізацыі напярэдадні ад'езда Каліноўскага ў Вільню ў маі 1863. Тут жылі: да мая 1862 *Ільдэфонс Мілевіч* – паплечнік Каліноўскага і затым яго памочнік у Вільні; *Сільвестровіч* – начальнік Гродзенскага пав., а пазней ваяводскі; *Геніюш*, начальнік рэвалюцыйнага бюро; *Талочка А. І.* – памочнік ваяводскага Э. Заблоцкага.

Літ.: Швед В.В. Гродзенскія адрасы паўстанцаў 1863–1864 гг. / В.В. Швед // Горад Святога Губерта: альм. лакал. гісторыі. – Гродна, 2013. – Вып. 7. – С. 142–150; Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017. – С. 22, 26, 28–30, 34–35, 41–42, 246.

Фурманскі транспарт. У 1878 гарадская дума ў Гродне прыняла "Правілы для легкавых вазніц". Згодна з імі апошнія павінныя былі плаціць падатак у гарадскую касу. Гаспадары, якія самі асабіста не займаліся перавозкамі, а наймалі працаўнікоў, павінны былі ўказваць званні, імёны, прозвішчы працаўнікоў, прадстаўляць ад паліцыі пасведчанне аб іх паводзінах і добранадзейнасці. Вазніцаю маглі быць асобы не маладзейшыя за 18 гадоў, цвярозыя, ветлівыя, якія не патрабуюць ад пасажыраў аплаты звыш таксы. Экіпажы (дарожка, пралётка) маглі быць адкрытыя і крытыя скураным верхам ды скураным фартухам, мець 2 ліхтары для цёмнага часу дня. Вазніца мусіў быць апрануты ў чыстую, цэлую і спраўную вопратку кшталту рускага армяка. Коні муселі быць здаровыя (не кульгавыя, не касыя і не сляпыя). За невыкананне вызначаных Правіл гарадская управа магла пазбавіць права займацца перавозкамі. У верасні 1926 з'явілася распараджэнне Беластоцкага ваяводы "Аб вулічным руху ў гарадах Беластоцкага ваяводства". Згодна з ім з 1927 г. павозкі павінны былі мець белыя авальныя таблічкі з парадкавым нумарам з чырвоным надпісам "Магістрат Гродна – конныя або ручныя павозкі". 16.03.1927 былі ўсталяваныя тарыфы і прызначаныя месцы стаянак. 14.04.1927 *магістрат* прыняў "Правілы для вазніц г. Гродна" паводле ўзору Правіл 1878 г. Вазніцам патрэбна было мець пасведчанне, жэтон і копію Правіл. Згодна з імі экіпаж павінен быў быць чыстым, зручным, моцным, з 2 ліхтарамі, нумарам, мець скураныя пакрыццё і сядзенні, быць на рэсорах. Вазніца таксама мусіў быць чысты, у вопратцы цёмна-сіняга колеру, фуражка – са скураным паяском (зімой – шапка з клапанамі). Забаранялася быць нецвярозым, жартаваць з пасажырамі, курыць падчас руху і адыходзіць ад каня падчас стаянкі.

Літ.: Саяпін В., История общественного транспорта Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 4–10, 16–19; Швед В.В. Губернскі Гродна: аповяды з гісторыі горада (канец XVIII – пач. XX ст.) / В.В. Швед. – Баранавічы: Баранав. ўзбуйненая друкарня, 2003.

Х

Хадкевічы – магнацкі род герба "Касцеша" у ВКЛ. З Гродна звязаныя дзве асобы. Рыгор Аляксандравіч Х. (? – 12.11.1572 ці 19.11.1573) – таленавіты ваяр у Лівонскай вайне 1558–1583 гг. (бітва на р. Ула), староста гарадзенскі, праціўнік Люблінскай уніі 1569, стваральнік у Заблудаве друкарні, у якую запрасіў І. Федаровіча/Хведаровіча і П. Мсціслаўца. Крыштаф Х. (? – 03.10.1652) быў старастам гарадзенскім.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 43.

Хаецкі Гіляры – мастак 17 ст., манах. Магчыма, ён быў аўтарам трох партрэтаў членаў сям'і заснавальніка кляштара Брыгіцкага (*гл. касцёл Дабравешчання Найсвяцейшай дзевы Марыі* і *кляштар брыгітак*) *Кшыштафа Весялоўскага*, яго жонкі Аляксандры Весялоўскай-Сабескай і іх дачкі Грызельды. Знайдзеныя ў 1966 г. у падвале манастыра "парсуны" былі ў стане "клінічнай смерці", але таленавітыя рукі ленінградскага мастака-рэстаўратара Брындарава вярнулі іх да жыцця. Зараз яны знаходзяцца ў Мастацкім музеі Беларусі. Праца Х. "Святое сямейства" захоўваецца ў фондах Беларускага *музея гісторыі рэлігіі ў Гродне*.

Літ.: Граблевский И.С. Гродно и окрестности: справочник-путеводитель / И.С. Граблевский. Мінск: Полымя, 1987. – С. 32; Гродно: ист.-экон. очерк / И.П. Крень [и др.]. – Минск: Полымя, 1988.

Хайноўскі Пётр, прыбыў у Гродна ў 1921 г., быў намеснікам старшыні акруговага суда, потым натарыусам. Сябра аддзялення таварыства апекі над зняволенымі "Патранат". У ягонай кватэры праходзілі вечарыны Кола сяброў літаратуры і мастацтва. Падчас нямецкай акупацыі быў кіраўніком групы Арміі Краёвай. Загінуў як закладнік у ліпені 1943 разам са сваёй сям'ёй.

фон Ханаў – нямецкі граф, *крыжак* з Лівонскага ордэна. У лютым – сакавіку 1364 г. узначаліў войска, дзе было каля 40 еўрапейскіх князёў. Павёў яго з Лівоніі на гродзенскі *замак Стары*. Але апошні выстаяў, і тады войска Ханаў, як напісаў нават рыцарскі храніст, "бязлітасна спустошыла ваколіцы Горадні, павёўшы многіх людзей у няволю".

Літ.: Ткачоў М.А. Замкі Беларусі (XIII-XVII ст.) / М.А. Ткачоў. – Мінск: Полымя, 1977.– С. 29–30.

Харын Вольф – бацька *Ісака і Міхеля*, уладальнік пераплётнай майстэрні ў 1870-х гадах па вул. Паліцэйскай/Кірава. Працаваў паводле кантрактаў з гродзенскім губернскім праўленнем, будаўнічым і ўрачэбным аддзяленнямі, думамі і судамі. З 29.02.1895 саўладальнікам фабрыкі стаў яго сын *Харын Міхель*, а ў 1897 гаспадарамі ўжо лічыліся два браты (дадаўся Ісак) і Л. М. Эфраім. У 1897 на прадпрыемстве працавала 89 чал., а ў 1900 – больш за 100 чал.

Літ.: Соболевская О.А. Гродненские евреи в экономической жизни города конца XIX века // Rocznik Grodzieński. – 2011. – S. 91.

Харын Ісак Вольфавіч – купец 2-й гільдыі. У 1897 г. меў 38 гадоў, нарадзіўся ў Гродне, вучыўся ў гродзенскім прыходскім вучылішчы. Жыў у Гродне з жонкай Басяй на вул. Паліцэйскай, д. Шварца. Меў 3 сыноў і 3 дачок. Брат Міхеля і саўладальнік пераплётнай фабрыкі ў Гродне. У 1899 на ёй працавалі 105 чал., з іх 70 пераплётчыкаў. Яны выраблялі канторскія кнігі, нататнікі, альбомы, календары, скураныя вырабы на 66 721 руб.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 9, с. 199, а. 1.

Харын Міхель Вольфавіч – уладальнік пераплётнай фабрыкі ў Гродне, якая існавала з 1885 г. Падобная паравая фабрыка канторскіх кніг і выдавецтва існавалі з 1885 у Варшаве: "бр. Н. і М. Харын і К°". У 1900 яна была ўзнагароджаная вялікім залатым медалём. У музеі г. п. Мёры Віцебскай вобл. ёсць канторская кніга з выявай фабрыкі ў Варшаве, на ёй шмат медалёў.

Хасід Рыгор/Гірш Ніселевіч (24.12.1924, Гродна – 04.01.2013, Гродна) – вязень гродзенскага *гета*, адзін з актыўных дзеячаў яўрэйскага таварыства ў Гродне. Вучыўся ў школе "Тарбут", якая знаходзілася ў доме па вул. Кірава, дзе вісіць памятная дошка *Заменгофу Л.*, а таксама на цяперашняй вул. Сацыялістычнай, дзе пазменная школа. Падчас *вайны вялікай Айчыннай* яму ўдалося збегчы з цягніка, які вёз яго з гета (дзе ён жыў з бацькамі і сястрой) у канцлагер Трэблінка, і дабрацца да партызанскага атрада братоў Бельскіх. З ліпеня 1944 да верасня 1945 працаваў сакратаром канцылярыі у *турме* гродзенскай. Вучыўся на фізіка-матэматычным факультэце Гродзенскага педінстытута. Выкладаў матэматыку і фізіку ў Доме піянераў і Культасветвучылішчы. Ведаў добра сем моваў. Быў ініцыятарам стварэння таварыства культурна-асветніцкага імя *Найдуса Л.* Пахаваны на старых *могілках яўрэйскіх*. Успаміны Рыгора Хасіда надрукаваныя ў часопісе "Arche" (2015. – 07-08).

Літ.: Зусім іншы горад /Уклад. А.Ф. Вашкевіч, Т.У. Касатая. – Гродна: ТАА "ЮрСаПрынт", 2017. – С. 119–130 (Успаміны Хасіда); Ерузалім Б.Е. Боль памяти. Холокост на Гродненщине. Гродно: ЮрСаПринт, 2020. – С. 58–62.

Хацкелевіч Бенцэль (Барыс Максімавіч) – гродзенскі фатограф. З мяшчан. Атрымаў дазвол адкрыць фатаграфічную майстэрню разам з Кайранскім 23.02.1880 (стст.). Пазней – віленскі фатограф, упаўнаважаны парыжскіх фатографаў братоў Юнг.

Хіпі – моладзь, якая у Гродне з'явіліся ў канцы 1960-х гадоў. Называла сябе "дзеці Элізы" або "дзеці матулі", бо любімым месцам сустрэч быў скверык каля помніка *Ажэшкі Элізы* ("матулі"). Насілі доўгія валасы, любілі джаз і рок-н-рол, паводзілі сябе незалежна. У жніўні 1971 Х. выйшлі на Савецкую плошчу з транспарантамі "Свабода рок-н-рола", "Прэч тэрор", "Рукі прэч ад нашых валасоў", "Beatles Forever", "All you need is love". Удзельнік выступу М. Гуленін успамінаў, што на Савецкай плошчы моладзь сталі біць міліцыя, вайскоўцы-дэсантнікі. Арыштаваных садзілі ў машыны і вывозілі за горад, дзе выпускалі на волю. Гэтаму садзейнічаў генерал Судзілоўскі, сын якога таксама прымаў удзел у дэманстрацыі.

Літ.: Саяпин В. Молодёжная субкультура Гродно 1960–1970-х годов // Гарадзенскі соцыум. Горад і яго жыхары. Партрэт на фоне эпохі. X – XX стст. зборнік навуковых артыкулаў. – Мінск: Зміцер Колас, 2016. – С. 306–307.

Хмара гл. Разумовіч Вячаслаў.

Ховен фон дэр Хрыстафор Хрыстафоравіч (1795 – 20.04.1890) – генерал-лейтэнант ад інфантэрыі, вайсковы губернатар Гродна і гродзенскі грамадзянскі *губернатар* з 29.03.1849 да 15.05.1856. Барон, з дваран Курляндскай губ., лютэранін. У службу ўступіў унцер-афіцэрам першага кадэцкага корпуса 22.02.1814. Пазней займаўся вайсковай геадэзіяй і тапаграфіяй на тэрыторыі Расійскай імперыі і за мяжой (у Бесарабіі, Турцыі, Балгарыі, Румеліі, на Балканах). Падчас *паўстання 1830–31* быў начальнікам штаба ў астзейскага генерал-губернатара, генерал-лейтэнанта П. А. Палена і ўдзельнічаў супраць "літоўскіх мяцежнікаў". Напрыклад, праследаваў польскае войска генерала Антонія Гелгуда ад Шаўляў (Шауляй) да прускай мяжы. Са жніўня па лістапад 1831 быў начальнікам кардоннай лініі па ўсёй прускай мяжы ад Юрбурга да Палангена (Паланга) і паляваў на паўстанцаў, якія хацелі перайсці мяжу. У лістападзе 1831 быў у Кёнігсбергу (Калінінград) і інш. гарадах Усходняй Прусіі "для отыскания расхищенных мятежниками топографических карт Варшавского депокарта и для разъяснения бежавшим в Пруссию полякам точного смысла всемилостивейшего манифеста". У сакавіку-кастрычніку 1833 кіраваў вайскова-тапаграфічным дэпо карт, пасля – обер-кватэрмайстар асобнага Каўказскага корпуса. З мая 1838 па красавік 1841 быў начальнікам штаба асобнага Сібірскага корпуса. У красавіку-ліпені 1841 быў пры вайсковым міністэрстве. З ліпеня 1841 па снежань 1946 служыў вайсковым губернатарам Варонежа і Варонежскім грамадзянскім губернатарам. Затым стаў наўгародскім губернатарам (снежань 1846 – 29.03.1848).

Указам імператара ад 17.03.1848 прызначаны Гродзенскім губернатарам. У пасаду ўступіў 18.04.1848, атрымаўшы аднаразовую дапамогу ў 5 тыс. руб. срэбрам. *Э. Ажэшка* пісала, што "курляндчык гэты быў стары, грубы, сівы, з чырвоным тварам, з крыклівым і басовым голасам. Паспешлівасць і непрыстойнасць яго не мелі межаў". Дзейнасць Ховена была накіраваная на ўмацаванне праваслаўя ў Гродзенскай губ. Прапанаваў перадаць *касцёл Бернардзінскі*

з манастырскімі будынкамі ў ведамства праваслаўнага веравызнання і размясціць тут *Царкву Барыса і Глеба на Каложы* (якую немагчыма адрэстаўраваць, бо патрэбных 6 тыс. руб. няма), а касцельную маёмасць перанесці ў *касцёл кармеліцкі*. У 1849 Х. дазволіў чальцам лютэранскай абшчыны зрабіць збор сродкаў на аднаўленне спаленых 25.03.1849 школы і жылля настаўнікаў. Х. быў звольнены з пасады губернатара з дазволам прысутнічаць у кіроўным Сенаце. Адзін з сыноў Х., Мікалай, служыў у *Гродзенскім лейб-гвардыі гусарскім* палку.

Узнагароджаны 10 ордэнамі, залатой шпагай з надпісам "За храбрость", медалём за Турэцкую вайну, знакам адрознення бездакорнай службы за ХХХ і ХХХV гадоў.

Сач.: Аўтабіяграфія (не апублікаваная), якая дае ўяўленне аб дзяржаўным ладзе Расійскай імперыі 1830–1870 і яе кіраванні.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 27, с. 948, а. 1; Орловский Е.Ф. Судьбы православия в связи с историей латинства и унии в Гродненской губернии в Х1Х ст. (1794–1900). Гродно. // Гродненские епархиальные ведомости. Гродно, 1901. – № 2. – с.176; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 61–65.

Хогенберг Франс (1533–1590) – гравёр фламандскага паходжання. Удзельнічаў у падрыхтоўцы выдання атласа мап "Theatrum Orbis Terrarum" Абрахама Артэліуса ў 1570 г. у Антверпене. Разам з канонікам кёльнскай катэдры Георгам Браўнам выдаў у 1575 у Кёльне атлас мап, планаў і выяваў гарадоў "Civitates Orbis Terrarum". У другім томе на планшэце 48 змешчаная выява Горадні (Гродна).

Храптовіч Іахім Літавор (4.01.1729 – 4.03.1812) – грамадскі і дзяржаўны дзеяч. З беларускага магнацкага роду, вядомага з XV ст. Дэпутат сеймаў, маршалак галоўнага трыбунала ВКЛ (1765), падканцлер літоўскі (1773). Адзін з кіраўнікоў, стваральнік і член Адукацыйнай камісіі (1773–94), кіраўнік каралеўскай групоўкі ВКЛ (з 1780), міністр замежных спраў (з 1791), канцлер вялікі літоўскі (з 1793). У сваіх маёнтках Шчорсы, Вішнёва замяніў паншчыну чыншам. У Шчорсах пабудаваў палац, школу, уніяцкую царкву, зарганізаваў бібліятэку і архіў. Быў адным са стваральнікаў Канстытуцыі 3 мая – самай прагрэсіўнай у Еўропе. Былы таргавічанін, але камісар *парадкавай камісіі* Гродзенскага пав. Аддаў усю душу *паўстанню 1794*. Менавіта ён схіліў гродзенцаў да напісання акцэсу ("уступу", далучэння) да паўстання.

Літ.: Гардзееў Ю. Цывільна-вайсковыя парадкавыя камісіі ў Вялікім Княстве Літоўскім у часы Чатырохгадовага сойма (1789–1792) / Ю. Гардзееў. – Смаленск, 2014; Швед В.В. Горадня: аповяды з гісторыі горада (сярэдзіна 16 – канец 18 ст.) / В.В. Швед, А.П. Госцеў. – Гродна: Пергамент, 1997.

Храптовічы – уладальнікі маёнтка *Гожа,* які цяпер у складзе Гродна.

Хронан (Chronon, Chronus, Chrono) – антычная назва Нёмана, пра этымалогію якой адзінага погляду няма. Гл. *Кронан.*

Літ.: Гардзееў Ю. Тапанамія старажытнай Гародні (XII–XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 32–35.

Хронікі кляштарныя, у Гродне ствараліся ў мужчынскіх кляштарах трох буйных ордэнаў: бернардзінцаў, кармелітаў босых і езуітаў, з мэтаю адлюстравання жыцця кляштараў. У першую чаргу пазначаліся этапы будаўніцтва храмаў і кляштараў, гаспадарчая і царкоўна-службовая дзейнасць: фундацыі, дакументацыя надання і зацвярджэння *прывілеяў,* атрымання зямельных надзелаў, супрацоўніцта з кляштарамі іншых ордэнаў і грэка-каталіцкай царквой, пастырская і місіянерская дзейнасць кляштараў, біяграфічныя звесткі пра манахаў (юбілеі, хваробы, смерць). Хронікі не змяшчаюць звестак аб прыватным жыцці ў кляштары і штодзённых побытавых справах. У тэкстах хронік адлюстраваныя маёмасна-прававыя аспекты: апісанне наданняў, лібертацый, іх пацвярджэнняў, дарэнняў, куплі-продажу; апісваюцца канфліктныя сітуацыі. Асвечаныя ў хроніках сацыяльна-палітычныя праблемы, звязаныя з кляштарамі: у памяшканнях бернардзінцаў адбываліся паседжанні *сеймікаў* Гродзенскага пав. (адзначаліся падзеі са знаходжаннем шляхты ў Гродне) і сесіі каптуровых судоў, скарбавай камісіі; у *касцёле езуітаў* і ў *Фары Вітаўта* праводзіліся ўрачыстыя набажэнствы з нагоды праходжання ў Гродне *сеймаў Рэчы Паспалітай*, сесій *Галоўнага трыбунала* ВКЛ; апісваліся вайсковыя падзеі ў горадзе і жыццё гараджан у моманты палітычных крызісаў. Ёсць сведчанні аб дзейнасці *брацтваў* і гарадскіх *пажарах,* звесткі аб выкананні судовых прысудаў (экзекуцыях, на якіх манахі выконвалі ролю духоўнікаў). Не забыліся складальнікі хронік і пра адлюстраванне рэлігійнай і свецкай культуры горада: вялікія царкоўныя святы, тытулярныя святы кляштараў і касцёлаў, патронаў ордэна, пачатак і заканчэнне будаўніцтва, асвячэнне храмаў і іх гадавіны, каранацыя караля, яе гадавіна, прыняцце Канстытуцыі, пачаткі сеймаў, сеймікаў, *трыбунала літоўскага* і г. д.

Літ.: Pawłowska H., Grodzieńskie kroniki klasztorne XVII i XVIII w. Formy gatunkowe i aspekty komunikacyjne. – Warszawa, 2013 (praca doktorska, “Artes Liberalis” UW).

Хрысціянская дэмакратыя (ХД) – партыя, створаная ў Гродне 13.11.1918. Тады ж была прынятая праграма і абраны арганізацыйны камітэт у складзе Я. Альшанскага і *Саванеўскага Л.* У партыю ўваходзілі землеўладальнікі і амаль усе духоўныя асобы. Ужо на выбарах у Кіроўны аддзел польскага дэмакратычнага Камітэта (улады горада) 15.12.1918 ХД атрымала найбольшую колькасць галасоў. Ксёндз *Жэброўскі* стаў прэзідэнтам, а доктар Каленкевіч – сябрам прэзідыума. 2.02.1919 пры касцёле францішканцаў складзены другі гурток ХД, а 11.03.1919 – трэці з польскай моладзі. З 18.12.1918 з № 34 стала выходзіць газета ХД “Nowe Życie” (“Новае жыццё”). Яе рэдактарам і выдаўцом стаў Саванеўскі.

Крын. і літ.: O niepodległą i granice. T. 7. Raporty Straży Kresowej 1919–1920 Ziem Północno-Wschodnich opisane /Wstęp, wybór i opracowanie J. Gierowska-Kałłaur. – Warszawa, Pułtusk, 2001, s. 252–253.

Ц

Цагельні Друцкіх-Любецкіх. Знаходзіліся не пазней як з 1820 г. у *Станіславова,* “пры Лапенскай дарозе” (у раёне сучаснай вул. Дубко); у 1900 – “насупраць вакзала” (зараз вул. Мендзялеева) і “пры вёсцы Пярэселка” (раён сучасных Чкалава і Камунальнай). Станіславаўская цагельня карысталася залежамі жоўтай гліны ў трохкутніку вуліц Дубко, Дзяржынскага, Пушкіна і вырабляла жоўтую цэглу. У 1886 мела свой уласны мураваны будынак, паравы рухавік у 8 конскіх сіл. Цагельня выпускала каля 100 тыс. цаглін штогод, а з пачатку XX ст. – таксама гліняную плітку, трубы, бетонныя прыступкі, аздобленыя мазаікай і інш. будматэрыялы. Разам усе тры цагельні на пачатку XX ст. выраблялі штогод да 5,5 млн цаглін. У канцы 1930-х гадоў прадпрыемствы Друцкіх-Любецкіх былі манапалістамі па выпуску будаўнічых матэрыялаў для Гродна і ваколіц.

Літ.: Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 10–11.

Царква Аляксандра Неўскага, будавалася ў 1866–69 гг. у памяць выратавання імператара Аляксандра II падчас замаху на яго жыццё. Фінансавалася будаўніцтва за кошт грошай, атрыманых за продаж маёнткаў паўстанцаў 1863–64 гг. і за добраахвотныя складкі (1 тыс. руб. далі фрэйліны *Ланскія*). Праектаваў архітэктар Гур’еў, а за ход працы адказваў губернскі архітэктар У. Джанееў. 4 красавіка 1870 г. царква была асвечаная епіскапам ковенскім Іосіфам, а 24.06 у ёй пабываў Аляксандр II. З 1900 царква атрымала свой прыход, у межы якога патрапілі *Новы Свет*, вул. Грандзіцкая, раён загараднай слабады, прыгарадныя вёскі ад Пярэселкі да Малышчына. У 1906–07 да заходняга боку царквы прыбудавалі вялікі прытвор і ўзвялі некалькі новых купалаў. 02.05–06.08.1938 храм быў разабраны польскімі ўладамі, як сімвал расійскіх рэпрэсій супраць паўстанцаў XIX ст. Просьба 2023-х праваслаўных гараджан да прэзідэнта Рэчы Паспалітай І. Масціцкага захаваць царкву была праігнараваная. Будаўнічы матэрыял з царквы перанеслі на іншую тэрыторыю. Паводле адной версіі на месца, дзе сёння знаходзіцца стадыён ГрДУ. Паводле другой (Р. Кулевіча і А. Семянчука) – на месца сённяшняга сквера каля будынка ГрДУ па вул. Захарава (тады Сабескага). Паводле версіі Я. Супрона – на пустцы паміж дамамі 37/1 і 37 А на вул. Захарава. Меркавалі тут пабудаваць царкву так званых “праваслаўных палякаў” (праект епіскапа *Савы*). На месцы будучай царквы 3.05.1938 замуравалі “Акт закладкі храма”

і рэліквіі св. Рыгора Цудатворцы. Зверху паставілі крыж. Абвешчаны конкурс праектаў будаўніцтва выйграў архітэктар Румянцаў – царква напамінала ўсечаную піраміду з празрыстым завостраным купалам, з высокай званіцай над уваходам. Вітражы павінен быў зрабіць З. Глогер. Аднак праект не быў ажыццёўлены (набліжалася *вайна Другая сусветная*), і з цэглы царквы пабудавалі некалькі будынкаў у заапарку, якія прастаялі да 2011 г. Тады падчас рэканструкцыі на іх месцы збудавалі новы ўваходны комплекс.

Літ.: Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 12. – Гродна: ГАІУН, 2010. – С. 17–20; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 219; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 105–106.

Царква Барыса і Глеба на Каложы – шасцістоўпны, трохапсідны, трохкрыжавы храм крыжакупальнай сістэмы XII ст. Архімандрыт І. Кастравіцкі лічыў, што царкву залажылі рускія (кіеўскія) князі ў 1200 г. перад закладкай Горадзена, калі ў балтаў існавала паганства. Даследчык П. Дзікаў пісаў, што царкву, мажліва, збудавалі *князі гарадзенскія* (гл. таксама артыкулы пра *Барыса* і *Глеба)* у XII ст., а горад ужо існаваў у XI ст.

С. 907

Царква – прыклад *гарадзенскай школы архітэктуры*. Першая яе выява і забудовы вакольнай тэрыторыі (званіца з капліцай, манастыр, гаспадарчая пабудова, брама, могілкі, агароджа), магчыма, змешчаная на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта*. Бачна, што алтарная частка храма накрытая двухсхільным дахам, а царква – чатырохгранным купалам. З правага боку стаяла круглая вежа з купалам і крыжам на ім. Побач з царквой (цяпер тут знаходзіцца памятны *знак "Пагоня на Грунвальд"*) размяшчаўся двухпавярховы манастырскі будынак з паддашкам і двухсхільным дахам з дымаходам. Другі будынак таксама быў двухпавярховы з двухсхільным дахам (магчыма, гаспадарчага прызначэння). Паміж названымі пабудовамі знаходзіліся *могілкі*.

Царква мае шмат загадак. Першая з іх – месца пабудовы: паводле легенды гэта было месца паганскага капішча, камяні якога былі выкарыстаныя для будаўніцтва. Царква будавалася як манастырскі храм, а таму здаля ад горада і ад Нёмана яе аддзялялі "сад на Калажэнях" і праезны шлях. Маскоўскі даследчык інжынер Р. Раманаў сцвярджае, што такое месца для будаўніцтва абарончага храма выбралі *крыжакі*. Шырокая лапатка з правага боку заходняга фасада, на яго думку, пацвярджае гэта, бо тут знаходзілася да абрушэння 1853 г. вуглавая вежа. Ядкоўскі пісаў пра крапасны роў, які знаходзіўся з паўночнага боку царквы. Загадкавай з'яўляецца падвойная назва храма. Першапачаткова ён меў толькі назву ў гонар славянскіх святых Барыса і Глеба, у імя якіх быў асвечаны. Магчыма так гарадзенскі князь Мсціслаў Усеваладавіч хацеў уганараваць памяць аб сваіх памерлых братах, *князях гарадзенскіх* Барысе і Глебе. Загадкавая асоба будаўніка царквы. Ва ўсёй літаратуры пра храм называецца *Пётр Міланег* – і ўсе лічаць, што гэта імя і прозвішча. А на самой справе дакладна невядома. Р. Раманаў піша, што "міланегамі"

называлі ў Кіеве тых, хто вырабляў камяні, а ў Белай Русі – мурнікаў, тых хто ўмеў выпальваць вапну, расціраць бітую плінфу ў цамянку і ствараць моцны раствор "міланіт" (з грэцкага – млын). Атрымоўваецца, што мы ведаем толькі адно імя – Пётр. Гісторык Слюнчанка піша, што ён прыехаў з Валыні, або з Балгарыі праз Валынь, але "указать на какие-либо прямые связи и влияния извне не представляется возможным". Аўтар гэтай кнігі быў у Балгарыі (у XII ст. знаходзілася ў Візантыйскай імперыі) і бачыў у Нясебры царкву з элементамі гарадзенскай архітэктурнай школы. Адным з іх з'яўляюцца *галаснікі*. Роспісы ў царкве Барыса і Глеба былі толькі ў алтарнай частцы і насілі вельмі арыгінальны характар.

Паводле звестак другой паловы XIX ст. у цэнтры кампазіцыі апсіды быў размешчаны вялікі крыж карсунскай формы, над ім – выявы сонца і месяца, у правай частцы – сюжэт "Святая Тройца". У галоўным алтары знаходзіўся абраз Прасвятой Дзевы, які быў напісаны на палатне, наклееным на драўляную дошку, абрамлены ў разную пазалочаную раму. Абраз меў 12 чэшскіх каштоўных камянёў. Па баках алтара ўверсе віселі іконы: справа – Пакрова Св. Багародзіцы, злева – Успення Прасвятой Дзевы. Абодва абразы былі ў чорных рамах. У двух бакавых алтарах знаходзіліся іншыя абразы: справа – Святога Іасафата на палатне ў зялёнай раме, злева – Антонія Падуанскага на палатне ў чорнай раме.

Манастыру належала зямля Тураўшчына маёнтка Чашчыцы/Чашчаўляны. Судовая справа аб ёй паміж манастыром і братамі Некрашэвічамі ў 1540 скончылася на карысць манастыра. Надаваў землю прывілей караля польскага Жыгімонта I ад 1506. Згадваецца царква ў інвентары Горадні, складзеным у 1558 *Войнай* і Дыбоўскім (гл. *валочнае вымярэнне Гарадзенскай эканоміі*), а таксама ў інвентарах горада 1590 і 1680.

Архімандрыт І. Кульчынскі ў сваім інвентары піша, што царква стаяла на пясчанай гары, якая сістэматычна асыпаецца. У 1842 настаяцель манастыра даносіў епархіяльнаму начальству, што гара абвальваецца з-за дажджу і крыніц, а ў сцяне царквы з'явіліся шчыліны. Было загадана закрыць царкву (што не было зроблена), а ў 1844 Св. Сінод выдзеліў 1 тыс. руб. Але ў той час на рамонт ужо патрабавалася 8 тыс. руб. У 1845 абвал дайшоў да паўднёвай сцяны, і служба ў царкве спынілася. 1.04.1853 былі страчаныя паўднёвая і палова заходняй сцен, дзве круглыя і дзве чатырохвугольныя калоны, уся верхняя частка будынка. У 1864 пачаліся працы па рамонце царквы. Грошы ў памеры 10 тыс. даў Сінод з сумы ахвяраванай купцом І. Сараковым. Кантроль ажыццяўляў *губернатар* І. М. *Скварцоў* і генерал-губернатар К. П. Каўфман. Складзены быў новы праект, але асноўныя грошы былі патрачаныя, і рабіць рамонт далей не было за што. Аж толькі ў 1873 пры губернатары *А. Е. Зураве* ў былым алтары была збудаваная часоўня імя Барыса і Глеба і зробленыя падпоры для падтрымання сцен ды іншых частак царквы.

У 2008 адбыўся рамонт царквы: замянілі згнілыя драўляныя канструкцыі, зрабілі новыя дрэнажы і ліўневую каналізацыю, дубовую падлогу і балкон для хору, аднавілі стол. У храм вярнуліся дзве іконы, якія захоўваліся

ў запасніках *сабора Свята-Пакроўскага*. На аўкцыёне ў Германіі выкупілі копію XIX ст. іконы Каложскай Божай Маці, страчанай у 1915 г.

У царкве знаходзілася найвялікшая бібліятэка з часоў XII ст. Паводле інвентару 1704 было 6 рукапісных кніг.

Настаяцелі манастыра базыльянаў на Каложы: ігумен Калікст (1480–1492), архімандрыт Арсені (1492–1500), ігумен Лукаш (да 1506), ігумен Феактыст (1506–1520), архімандрыт Іон (1520–46), архімандрыт Сергій (да 1550), архімандрыт Місаіл (да 1560), свецкі радца Сямён Валовіч (1560–68), свецкі радца Павел Катовіч (1568–82), свецкі Дзімітр Халецкі (1582–91), архімандрыт Ходкінскі/Годкінскі ці інакш архімандрыт Клеменс (да 1619), сын яго арх. Макары (1619–1630), арх. Леан Крэўза-Жэвускі (да 1636), абат Яўстахі Пяшкоўскі (да 1650), арх. Марцін (Бялазор) (да 1660), арх. Рыгор (Бянькоўскі, да 1667), арх. Метрафан (Друцкі-Сакалінскі, 1667–1688), арх. Юзафат (Агурцэвіч, да 1692), арх. Сімеон (Агурцэвіч, да 1698), арх. Мялеці (Дарашкоўскі, да 1700), арх. Фларыян (Волк-Ланеўскі, да 1709), арх. Лаўрэнці (Друцкі-Сакалінскі, да 1718), абат Юзафат (Яхімовіч, да 1728), затым перапынак цягам 8 год; протаархімандрыт Антоні (Таміловіч (?), арх. *Ігнаці Кульчынскі* (1735–40), Самуэль Яноўскі (1741), Юзафат Кастравіцкі (1779–1793?), Мацей Корн (?1798–?1815/16), Базылі Палонскі (1816 – да 1830), Віктар Бучынскі (каля 1832–1838), адміністратар манастыра Лангін Шавурскі (1838–39).

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 92; Диков П. Материалы для истории Колож-ской церкви в г. Гродно // Памятная книжка Гродненской губернии – Гродна, 1886; И. Костровицкий. Краткие сведения о Греко-российских церквях, существующих в Гродно; Орловский Е. Очерк истории города Гродны. – Гродна, 1889. – С. 25, 32–33, 38–39; Скобла М. Протаіерэй Аляксандр Балоннікаў "Колькі сябе помню, цягнула на пошукі Бога"; Сліж Н. Невядомае пра вядомае: уладанні царквы і манастыра Св. Барыса і Глеба ў канцы 15 – пачатку 17 ст. // Гістарычны альманах.Т. 18. – Гародня, 2012. – С. 2–26; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С. 39–41; Трусов И.Г. Православные храмы Гродно. – Минск: Мэджик Бук, 2008; Трусов И. Борисо-Глебская Коложская Церковь. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – 52 с.; Чантурия В. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшая школа, 1969. – С. 25; Швед В.В.Рэстаўрацыя Барысаглебскай царквы на Каложы ў Гродне: гістарычны вопыт канца XIX ст. – пачатку XX ст. в: Белорусская политология: многообразие в единстве. Политическое знание в современном социальном и образовательном пространстве. Часть 1, Гродно 2012, с. 241–244; Kultura Wielkiego Księstwa Litwskiego. Analiza i obrazy. – Kraków, 2006, s. 52–53; Shved V. Cerkiew Świętych Borysa i Gleba na Kołoży w Grodnie // Europa Środkowo-Wschodnia. Doświadczenia i tradycje, Warszawa 2016, s. 119–132; Walicki M. Cerkiew Św. Św. Borysa i Gleba na Kołoży pod Grodnem // Studia do dziejów sztuki w Polsce. T. 1 – Warszawa: W-wo Zakładu architektury polskiej Politechniki Warszawskiej, 1929. – 42 s.

Царква Васкрасенская, знаходзілася, як доўгі час лічылі, на тэрыторыі Каралеўскага двара. Найноўшыя даследаванні Н. Сліж паказалі, што царква

была пабудаваная на гары насупраць замка, па суседстве з жыдоўскай юрыдыкай (на месцы, дзе цяпер стаіць пажарнае дэпо па вул. Замкавай). Гэта пацвярджаюць археалагічныя раскопкі 2006 г., падчас якіх знайшлі рэшткі мураванай сцяны і пахаванні 16–17 стст. Царква была пабудаваная з двухсхільным дахам, з невялікім купалам наверсе. Аляксандр Ягелончык надаў ёй у вёсцы Альшанка 2 валокі зямлі, якія падчас валочнай памеры былі зафіксаваныя як уласнасць царквы. *Стэфан Баторы* даў прывілей на 2 валокі ў Канюхах. Дакументы за 1555–1560 згадваюць святара Аваркея Паўловіча, а таксама Максіма Юркевіча, які набыў для царквы пляцы на вул. Рэзніцкай у Б. С. Кульбацкага і ў жонкі А. Казароды. У 1613 царква згарэла разам з царкоўнымі прыбудовамі і была перанесеная на вул. Рэзніцкую (ужо як уніяцкая). Падчас *вайны 1654–67* маскоўскія войскі вывезлі з царквы дакументы, літургічныя начынні, званы і забілі трох святароў. У 1754 Ц. трапіла ў спіс 9 "занядбаных" храмаў, магчыма яна была ўжо нядзейнай. У 1768 на яе пляцах засталіся могілкі, агарод і дом плябана. Адзінай візуальнай крыніцай па Ц. з'яўляецца *гравюра Адэльгаўзера-Цюнта*. Ю. Гардзееў лічыць, што царква была ўзведзеная ў XII ст. на *вакольным горадзе.* Тады, магчыма, гэта яе фундаменты побач з плотам *Новага замка* знайшлі ў 2018 г. падчас капання траншэі ў бок замка Старога. А. Краўцэвіч пісаў, што ў 1989 натрапіў на сляды царквы Уваскрэсення Гасподняга на *замку Новым*.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 78–79; Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 91; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 18–19; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С.47–50; Borowik P. Unici w Grodnie w II połowie XVIII w. (1749–1786) // Acta Collegii Suprasliensis, t. 10. – Lublin-Supraśl, 2008. – S. 233–235.



С. 908

Царква Верхняя – помнік старажытнага дойлідства, пабудаваны на месцы *царквы Ніжняй* на тэрыторыі гарадзенскага *дзядзінца.* Выяўленая ў 1933 г. падчас археалагічных раскопак *Ю. Ядкоўскім*. Ён лічыў, што яна магла быць пабудаваная ў сярэдзіне XIII ст. для Марты, жонкі-хрысціянкі *Міндоўга* ці для Віта, дамініканіна, біскупа Літвы, які хрысціў Міндоўга, і пасля вяртання яго сына Вайшэлка з вандроўкі на гару Афон храм быў прыстасаваны для праваслаўя. Польскі даследчык Ю. Пузыня не пагаджаецца з гэтым сцвярджэннем, бо ў гэты час *Горадзен* яшчэ не належаў Літве, не быў валоданнем ні Міндоўга, ні Вайшэлка. Магчыма, будаўнік быў з Захаду і пабудаваў каталіцкую капліцу, а потым прыстасаваў да праваслаўя. Час узнікнення царквы – да нападу мангола-татараў на Горадзен у лютым 1241, паводле рашэння кіеўскіх князёў, якія ў той час кіравалі горадам. Зруйнаваная царква была падчас нападу *татараў,* і пацвярджэннем гэтага з'яўляюцца знойдзеныя Ядкоўскім на узроўні пласта, на якім стаіць царква, раскіданыя вакол яе ў розных позах каля 30 шкілетаў. М. М. Варонін лічыў часам пабудовы царквы

XIV – пач. XV ст., калі уладарыў *Вітаўт*. Літоўскі даследчык В. Левандаўскас называе датай пабудовы другую палову XIII ст. Беларускі археолаг А. Трусаў піша, што царква пабудаваная на мяжы XIII–XIV стст. Захаваліся ўсходняя частка сцен (выш. 1–1,5 м), частка паўночнай сцяны з паўн.-зах. вуглом, унутраны слуп (з 1939 захоўваюцца ў асобным павільёне). Храм квадратны ў плане (8,9х8,9 м), з паўкруглай вытырклай апсідай. Падмурак складзены з 2–3 шэрагаў камянёў, у муроўцы выкарыстаная тонкая і тоўстая брусковая цэгла. У якасці рошчыны выкарыстаная белая вапна з дамешкам пяску і жвіру. Падлога была цагляная, дах – гатычны, з *дахоўкі*. Існавала царква да часу будаўніцтва замка *Стэфана Баторыя*, калі была разабраная. І. Трусаў выказаў гіпотэзы аб пабудове царквы *Давыдам Гарадзенскім,* калі ён быў гарадзенскім каштэлянам, і што царква можа называцца ў гонар св. Сімяона.

Літ.: Вашкевіч А. Падарожжа гродзенскай Верхняй царквы // Наша гісторыя. – 2020. – № 1 (18). – С. 80–81; Павач А. Sursum Corda. Красная книга Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 23–25; А.Трусаў. Гродзенская Верхняя царква // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. – Мінск: БелЭн, 1996. – С. 124–125; Трусаў. І. Православные храмы Гродно. – Мінск, Гродно: "Мэджік Бук", 2008. – С. 13–14; Jodkowski J. Grodno wczesnośredniowieczne w świetle prac wykopaliskowych dokonanych na Królewskim Zamku Starym w Grodnie w latach 1932 i 1933 // Przegląd historyczno-wojskowy. T. VII, zesz. I. – Warszawa, 1934. – S. 14; Puzyna J. W sprawie pierwszych walk Litwinow z Tatarami o Ruś w latach 1238–1243 // Przegląd historyczno-wojskowy. T. IX. – Warszawa, 1937. – S. 374–375.

Царква лютэранская гл. кірха лютэранская Святога Яна.

Царква Малая, "малы папоўскі манастырык" пад *замкам Старым*. Назва такая, бо невядома, які святы быў яе апекуном. Археолаг і гісторык А. Краўцэвіч сцвярджае, што яна заснаваная ў канцы XII ст. Згадваецца ўпершыню ў крыніцах пачатку XVI ст. Каля яе знаходзіўся праваслаўны манастыр (з XVII ст. уніяцкі). Юрыдыка яго была на беразе *Гараднічанкі* па-суседску з замкам да 1783. Тады на пляцах Ц. пачалі будаваць каралеўскую канцылярыю і стайні.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 75–76; Walczyna F. Grodno // Miasta wielu religii. Topografia sakralna ziem wschodnich dawnej Rzeczypospolitej / pod red. M. Jakubowskiego, M. Sasa, F. Walczyny. – Warszawa Muzeum Historii Polski, 2016. – s. 209–231.

Царква Ніжняя – храм 30-х гадоў XII ст., адзін з першых гарадзенскіх храмаў, сямейная царква *Усеваладкавічаў*. Адносіцца да *гродзенскай архітэктурнай школы.* Знайшоў яе ў 1932 г. падчас раскопак і даследаваў *Ядкоўскі Юзаф*. Назва царквы не захавалася ў крыніцах, археолагі назвалі яе Ніжняй таму, што над ёй была яшчэ адна *царква*, якой далі імя *Верхняя*. Гродзенскі гісторык архітэктуры І. Трусаў выказаў здагадку, што абедзве царквы называліся Сямёнаўскімі (археолагі знайшлі пласціну з алтара з выявай апостала Сімяона). Адзінага погляду на час узнікнення храма няма. Аўтары артыкула

С. 909



С. 910

“Стары замак” у “Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць” пішуць, што царква пабудаваная ў 1116 ці 1128–1241 гг. М. М. Варонін лічыў, што храм узведзены ў 2-й чвэрці – сярэдзіне XII ст., У. А. Чантурыя – у сярэдзіне XII ст., П. А. Рапапорт датуе яго 2-й паловай XII ст., А. А. Трусаў і Л. Аляксееў адносяць царкву да XII ст. Царква была невялікай (18,4х11,7 м), 6-стоўпнай, 3-нефнай, аднакупальнай. У цагляную муроўку знешніх сцен устаўленыя шліфаваныя камяні розных памераў і колераў, з маёлікавых плітак выкладзеныя арнаменты ў выглядзе крыжоў,



С. 911

разетак, ромбаў. З унутранага боку ў сцены ўмураваныя *галаснікі.* У паўднёва-заходнім чляненні была вінтавая лесвіца, што вяла на хоры. Падлога зробленая з рознакаляровай маёлікавай пліткі. Дах быў свінцовы. Царква мела званіцу (знойдзены кавалак звона вагой 27 кг, на якім захавалася частка надпісу – слова “рабу”). Летам 1183 г. царква згарэла. У Іпацьеўскім летапісе напісана: “6691... Городенъ погоре всь и церкы каменая от блистания молние и шибения грома”. Захаваліся сцены на вышыню 2–3,5 м.

Літ.: Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння. – Мн.: Беларуская нвука, 1996. – С. 20–22; Гостев А.П. Кронон. Летопись города над Неманом (1116–1990) / А.П. Гостев, В.В. Швед. – Гродно: НВК “Пергамент”, 1993. – С. 12; Иушина О. В. Гродненская архитектурная школа XII века // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада). – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 138–139; Краўцэвіч А. Гродзенская архітэктурная школа XII ст. // Гародня X – XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2014. – С. 36; Трусов И. Православные храмы Гродно. Краткий очерк истории. – Минск, Гродно: “Мэджик Бук”, – С. 9–12.

Царква Прападобнай Марфы, знаходзіцца на старых *праваслаўных могілках*. Пабудаваная ў 1848 г. нараджэнцам Гродзенскай губ. архіепіскапам Іркуцкім, а пазней і Якуцкім Нілам (Ісаковічам) у гонар памерлай у Гродне сваёй маці Марфы Насковіч.

Крын. і літ.: В.Н. Черепица, Гродненский православный некрополь, Гродно: ГрГУ, 2001; Przegląd statystyczny m. Grodna w latach 1924, 1925 i 1926 / Pod. red. R. Sawickiego. – Grodno: Nakładem Magistratu m. Grodno, 1925. – C. 220.

Царква Прачысценская (Прачыстай Багародзіцы) – праваслаўны храм *гарадзенскай архітэктурнай школы*, які ўзнік у XII ст. у гонар Багародзіцы. У першай палове XVI ст. саборны (у крыніцы: “Пречистенской соборной церкви Городенской”, 1540). Археалагічныя даследаванні 1980 г. далі магчымасць высветліць планіроўку царквы і выкарыстаныя будаўнічыя матэрыялы. Гэта быў шасціслупавы трохнефавы храм з трыма прамавугольнымі ў плане апсідамі. Памеры царквы 12,5х19,1 м. Падлога была выкладзеная рознакаляровай *пліткай маёлікавай*, у сценах былі устаўкі са шліфавыных камянёў, *галаснікі* і паліваная плітка. Знешні выгляд царквы бачны на *гравюрах Адэльгаўзера-Цюнта* 1568 г. *і Тамаша Макоўскага* 1600 г. Царква мела двухскатны дах са скатам у форме казырка, а частка храма, якая абапіралася на квадрат

унутраных апораў, мела дах у выглядзе высокага шатра. Па краях галоўнага фасада былі круглыя вежы, з боку апсіды – уязная брама. Царква была абнесеная парканам, уваход быў праз браму з вежай. На тэрыторыі знаходзіліся званіца, розныя пабудовы і могілкі. Вядомыя наступныя фундатары царквы: кіеўскі ваявода Д. Пуцяціч, 7 братоў Валовічаў, сын гетмана Канстанціна Астрожскага Ілля, Я. Валовіч, М. Гнайніцкі. Фундушы царквы канцэнтраваліся ў раёне вуліцы Падольнай: каля Бернардзінскай гары, на беразе *Нёмана* і вул. Дубатоўская. Магчыма на пачатку XVII ст. царква стала ўніяцкай. Пры царкве знаходзіўся шпіталь для жабракоў, за царквой – могілкі, дзе першыя пахаванні адбыліся ў XII ст. (у сярэдзіне XIX ст. ужо забудаваныя). У 1633 ці 1635 пры царкве пасяліліся манашкі – так быў створаны базыльянскі манастыр, які ўзначаліла ігумення Васіліса Сапяжанка. Храм пацярпеў падчас *вайны з Масковіяй* 1654–1667 гг. Знішчэнне царквы адбылося ў перыяд са жніўня 1655 па 9 сакавіка 1659 г. У 1720, калі адна са сцен абвалілася, мітрапаліт Л. Кішка загадаў разабраць старую і пабудаваць новую *царкву Раства Багародзіцы*.

Літ.: Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 88–89; Сліж Н. З гісторыі Прачысцінскай царквы ў Гародні. XVI-XVIII ст. // Гарадзенскі палімпсест. XII-XX стст. Матэрыялы міжн. канф. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Горадня-Беласток: ІГДБ (ЕГУ). – 2008. – С. 64–95; Трусов И.Г. Православные храмы Гродно. – Минск: Мэджик Бук, 2008; Чарняўскі І.М., Жаровіна Г.П. Нечаканае адкрыццё // Помнікі культуры і гісторыі Беларусі. – 1982. – № 4. – С. 34–36; Чарняўскі І. Гродзенская Прачысцінская царква // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 3. – Мн.: БелЭн., 1996. – С. 130; Чернявский И.М. Пречистенская церковь XII в Гродно // Древнерусское государство и славяне. Материалы симпозиума, посвящённого 1500-летию Киева. – Мн.: Наука и техника, 1983. – С. 119–121.

Царква Раства Багародзіцы базыльянскага манастыра – мураваны храм, пабудаваны ў 1726 г. паводле праекта архітэктара Юзафа Фантаны III у стылі барока з рысамі класіцызму. Ён жа будаваў у 1726–1751 манастырскі корпус. Царква цагляная, крыжа-купальная, двухвежавая. Дамінуе цэнтральны купал падобны да цыбуліны, які мае васьмігранную аснову, размеркаваную на светлавым барабане. Жылы корпус – двухпавярховы Г-падобны ў плане будынак з галерэйнай планіроўкай. Унутры паўадкрыты дворык.

С. 912

Літ.: Трусов И. Гродненские архитекторы и строители XII-XVIII веков, Гродно 2012. – С. 41–42.

Царква Св. Іллі Прарока, упамінаецца ва ўніверсале Уладзіслава IV 1663 г., дзе гаварылася пра неабходнасць яе вяртання праваслаўным.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 73.

Царква Св. Мікалая, знаходзілася на ўзвышшы, каля зліцця ручая *Юрыдыкі* з ракой *Гарадніцай* і каля крыніцы "Каралеўскай". Узнікла, магчыма, у XII ст. і была прыходскай для *сяла Гарадніца* і вакольных вёсак. Пабудова храмаў

каля крыніц традыцыйная ў хрысціянстве. Іх называлі цэрквамі "Мікалая Мокрага". У адной з гарадзенскіх кніг замкавага суда згадваецца "каплан Светого Миколая Городенский князь Янъ" (1540). У дакументах зафіксаваная як "cerkiew ś Mikuły" (1560–1561), "cerkiew pod tytułem Ś. Mikołaja nad rzeczką Horodnicą" (1768). Верагодна разбураная падчас *вайны з Масковіяй 1654–67*. У 1680 каралеўскія камісары, якія праводзілі рэвізію горада, адзначылі прысутнасць на юрыдыцы мітрапаліта "царквы мураванай пустой". Да 1681 г. разам з зямельным надзелам адышла да замкавай юрыдыкі. У 1793 *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* на месцы Ц. пабудаваў палац, які падараваў надворнаму літоўскаму падскарбію Дзяконскаму А. (гл. *палац Дзяконскага*).

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 74; Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 92–93; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 13; Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 12. – Гродна: ГАІУН, 2010. – С. 54.

Царква Св. Сімяона, згадваецца ў "*померы волок городенских*" 1560–1561 гг. Гродзенскі даследчык гісторыі архітэктуры І. Трусаў лічыць, што з такой назвай было некалькі храмаў. Цэрквы *Ніжняя і Верхняя*, на яго погляд, былі Сімяонаўскімі. Пацвярджэннем гэтага з'яўляецца знаходка каля царквы пласціны з выявай гэтага святога. Пасля разбурэння царквы Верхняй храм Св. Сімяона пабудавалі на *Рынку*. У валочнай памеры адзначалася, што царква мае 2 валокі ў вёсцы Альшанка. Арлоўскі Я. лакалізоўваў Ц. у паўночна-ўсходняй частцы Рынку. А вось расійская даследчыца Квітніцкая А. указвала на яе паўднёва-ўсходнюю частку.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 73; Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 93; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С. 56–57; Трусов И. Архитектура Гродно. Невосполнимые утраты. XIX-XX вв. / И. Трусов. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011.

Царква Св. Спаса, магчыма ўзнікла ў часы *Вітаўта*. Згадваецца ў *прывілеі* 1514 г., дзе духавенству дазвалялася мець млын на р. Котра. Апошняя згадка паходзіць з 1560-х гадоў. Месцазнаходжанне невядомае.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 73; Walczyna F. Grodno // Miasta wielu religii. Topografia sakralna ziem wschodnich dawnej Rzeczypospolitej / pod red. M. Jakubowskiego, M. Sasa, F. Walczyny. – Warszawa Muzeum Historii Polski, 2016. – s. 218.

Царква Св. Тройцы (Траецкая), згадваецца з 1511 да 1765 г.: ад прывілея Жыгімонта Старога на наданне Ц. грунту Суслаўшчына ў Азёрах да канфірмацыі, выдадзенай Станіславам Аўгустам. Лакалізацыя Ц. невядомая. З 1

паловы XIX ст., як лічыць Гардзееў Ю., яе беспадстаўна размяшчаюць на *Рынку нямецкім*.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 73–74; Walczyna F. Grodno // Miasta wielu religii. Topografia sakralna ziem wschodnich dawnej Rzeczypospolitej / pod red. M. Jakubowskiego, M. Sasa, F. Walczyny. – Warszawa: Muzeum Historii Polski, 2016, c. 218.

Царква Свята-Уладзімірская – храм-школа, пабудаваная архітэктарам І. К. Плотнікавым. Адным з ініцыятараў будаўніцтва Ц. на *занёманскім фарштаце* быў айцец А. Някрасаў, а прычынай – немажлівасць жыхароў гэтай часткі горада дабрацца да царквы на правым беразе *Нёмана* падчас крыгалому, а вучняў – да школы. Гарадское самакіраванне выдзеліла пляц у 900 кв. сажняў, вучылішчная рада дала 5 тыс. руб., Св. Сінод – 6 тыс. руб., маскоўскі купец М. Бірукоў – да 3 тыс. руб., астатнія грошы назбіралі ад вернікаў. На пачатку будаўніцтва здарыўся *пажар*, які пашкодзіў значную колькасць будаўнічага матэрыялу. Апякаў будаўніцтва спецыяльны камітэт, у які ўвайшлі А. М. Някрасаў, святар М. Давідовіч, павятовы спраўнік У. М. Кабылецкі, міравы пасярэднік І. С. Мачугоўскі. Асвечаная Ц. была 11.01.1897 епіскапам Брэсцкім Іосіфам (Сакалоў) у гонар Роўнаапостальнага князя Уладзіміра. Пры акце прысутнічаў губернатар *Д. М. Бацюшкаў*, кіраўнікі *палат* казённай і кантрольнай Рыхлеўскі і Стаяноўскі, інспектары дырэкцыі народных вучылішч і інш. *Камітэт гродзенскі выканаўчы* сваім рашэннем ад 09.12.1964 пад № 649 прасіў камітэт абласны выканаўчы аб закрыцці царквы і ператварэнні яе ў клуб. У жніўні 1965 гарвыканкам ужо прасіў аблвыканкам зняць царкву з уліку з далейшым зносам. Пад рашэннямі стаяць подпісы старшыні Сташкевіча Л. і сакратара Архіпава Е. Царква ў цяперашні час дзейнічае.

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 70; Православное Гродно. Сборник очерков, фотографий, воспоминаний, духовного наследия, архивных документов об истории Гродненской епархии. Гродно, 2000. – С. 23–27.

Царква Чэснага Крыжа (Чэснахрэсцкая), пабудаваная на *Падоле*, недалёка ад берага *Нёмана* у канцы XV ст. у выглядзе нехарактэрнай для ВКЛ ратонды. Над асноўным будынкам знаходзіліся яшчэ два ярусы, і над апошнім стаяў крыж, які нагадвае салярны (падобны да лацінскага, але ад сярэдзіны ішлі 4 промні ў розныя бакі). Гісторык Ю. Гардзееў дапускае існаванне Ц. у XII ст., бо пасад на Падоле ўзнік у XI–XII ст., і яго насельніцтву неабходная была царква, як было гэта ў іншых *пасадах гарадскіх*. У 1560–1561 гг. царкве належалі 2 валокі зямлі. Пры царкве існавала брацтва гарбароў і яго могілкі. У часы *вайны з Масковіяй 1654–67* царква была зруйнаваная маскоўскімі войскамі і разрабаваная (зніклі кадзільніца, срэбны келіх з каштоўнымі камянямі, харугва, срэбная зорка і інш. царкоўныя начынні). На царкоўным

пляцы ў другой палове XVIII ст. стаяў першы *касцёл кармеліцкі*, у савецкі час – корпус тонкасуконнага камбіната, цяпер – Гродзенскі філіял Беларускага інстытута правазнаўства. Выяву царквы можна пабачыць на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта*. Этымалогія назвы царквы звязаная з хрысціянскім сімвалам Святога крыжа. У XII–XIII стст. у праваслаўным календары замацаваліся свята Вынясення Пачэсных Дрэў Жыватворнага Крыжа Гасподняга, свята Узвіжання Крыжа Гасподняга.

Літ.: Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня-Вроцлаў, 2008. – С. 74–75; Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 91; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С. 57–59.

Цвіклічы – сяло, якое ў сярэднявеччы належала Гарадні і плаціла гораду падаткі. Паводле валочнай памеры 1558–61 гг., рэвізіі 1680, інвентарызацыі 1708 мела 17 валок.

Літ.: Сліж Н.І. Падаткі і іх збор у Гародні XVI- XVII стст. // Białoruskie zeszyty historyczne. – 2022. – n. 35. – S. 12–14, 33.

Цвіклічы/Цвіклы/Свіклычы – заможны мяшчанскі род, з ліку гродзенскай эліты. Першыя звесткі пра яго сустракаюцца ў кнізе замкавага суда Гарадзенскага павета 1539–41 і валочнай памеры 1560–61.

Міска, "Миско Свиклич", у 1540 быў гарадзенскім райцам і ўладальнікам сядзібы на *Рынку*.

Марцін і Павел паводле звестак *памеры валочнай* 1560–61 валодалі нерухомай маёмасцю на Рынку.

Станіслаў, "Стась Свиклич", засядаў у радзе (1639–40), быў *бурмістрам* Гродна (1641, 1642, 1646, 1650, 1653, 1654) і ландвойтам (1634, 1638, 1645). Меў нерухомую маёмасць на Рынку і на цэнтральных вуліцах горада (Віленскай, Калюцінскай, Мірсніцкай).

Ян, засядаў у радзе (1639–42, 169, 1661–64, 1666–68, 1670, 1672) і займаў пасаду бурмістра ў 1662.

Адам, у 1641–44 – лаўнік, у 1659, 1661, 1666–69, 1673 – райца, у 1659, 1662, 1664, 1670, 1672 – бурмістр Гродна. У яго камяніцы на Рынку адбываліся пасяджанні лавы, бо *ратуша* была зруйнаваная маскоўскім войскам.

Казімір – бурмістр у 1665. Меў дачку Ганну, якая была жонкай Ю. К. Яўшэвіча і прадала свой дом на Рынку лідскаму падкаморыю Э. М. Рымвіду.

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 350–352; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у 1743–1767 гг.// Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – с. 65–66; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у XVIII с. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. // Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 107–110.

Ценскі Вітольд (28.6.1896, в. Сачэўка, Гастынінскі пав., Польшча – ?) – прэзідэнт Гродна (26.11.1936 – 1939). Сын Станіслава і Браніславы з Гаеўскіх. Вучыўся ў Лэнчыцкай настаўніцкай семінарыі, у Варшаўскім гуманітарным калегіуме, Вышэйшай лясной школе, Пазнанскай падафіцэрскай школе. Кіраўнік стралецкай дружыны (1912), Сябра Польскай вайсковай арганізацыі ў Варшаве (1915). Служыў у польскім войску (1918–1921). Пасля дэмабілізацыі ў 1924–1930 быў у Бразіліі прадстаўніком Міністэрства рэлігійных веравызнанняў і публічнай асветы і адказваў за польскія школы. Затым на радзіме служыў у галіне сацыяльнага забеспячэння ў Золачаве, Цярнопалі, Гродне (1934). Быў сябрам *магістрата,* дарадчай фракцыі грамадскага клуба (1934–1939), прэзідыума Гродзенскай гістарычнай бібліятэкі (1937), праўлення Польскага *Чырвонага Крыжа,* Саюза легіянераў, рэвізійнага камітэта фундацыі працы, камітэта па святкаванні дваццацігоддзя Незалежнасці (1938). Жыў на Алеі 3 Мая, 10.

Літ.: Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 266–267.

Церабун Уладзімір Васільевіч (11.04.1946, в. Несценяты Смаргонскага р-на – 8.10.2024) – беларускі скульптар, лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1976), заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь. Скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1973). Працаваў пераважна ў станковай і манументальнай скульптуры. З 1974 – удзельнік мастацкіх выстаў. Персанальныя выставы адбыліся ў наступных гарадах: Гродна (1986), Дубна Маскоўскай вобл. (1987), Мінск (1989), Смаргонь (1993) і інш. – усяго да красавіка 2021 г. адбылося больш за 20 персанальных выстаў. Працы захоўваюцца ў музеях: Нацыянальным мастацкім, *Гродзенскім гісторыка-археалагічным*. Чалец Саюза мастакоў Беларусі. Старшыня Фонда вольнага сучаснага мастацтва (1992). Жыў у Гродне ў 1973–2001. Быў старшынёй Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага саюза мастакоў. У 1986 атрымаў медаль "За доблестный труд". Стварыў і ўзначаліў творчае аб'яднанне "Рунь" пры Гродзенскім абласным аддзяленні Беларускага фонду культуры (з 15.11.1988 па 1992). У 1997–99 выкладаў скульптуру, малюнак, кераміку ў Гродзенскім вучылішчы мастацтваў імя Цёткі. Для творчасці Т. характэрныя розныя пластычныя рашэнні, унутраная экспрэсія вобразаў, выкарыстанне выразных магчымасцяў фактуры матэрыялу. Паводле яго і архітэктара А. П. Карлькова праекта ў цэнтральнай частцы *могілак вайсковых* па вул. Белуша збудаваны ў 1979 помнік "Заўсёды напагатове!" – вайсковец, які стаіць у ганаровым каравуле. Іншыя памятныя знакі і скульптурныя кампазіцыі ў Гродне: "Крылатая" – супрацоўнікам міліцыі, якія загінулі пры выкананні службовага і вайсковага абавязку (вул. Акадэмічная, суаўтар А. Крахалёў); "Ветразь" каля гатэля "Турыст" (1992); "Гімн Сонцу" (1977, дэкаратыўная кампазіцыя на фасадзе Гродзенскага абласнога цэнтра творчасці дзяцей і моладзі). Зрабіў серыю мемарыяльных дошак: пісьменніцы З. *Налкоўскай,* генералу *Антонаву*

А. Жыў пасля Гродна ў Мінску (2001–2015), затым у Смаргоні з 2015 (*ганаровы грамадзянін* горада з 2013).

Ц. таксама быў добрым музыкантам. Граў на розных музычных інструментах: скрыпцы, акардэоне, фартэпіяна, балалайцы, гітары, цымбалах. Меў мілагучны голас і прыгожа спяваў. Як мастак намаляваў серыю пейзажаў у тэхніцы алей і акварэль; серыю малюнкаў пад назваю "Ракурс" (рэльефна-выразныя і дынамічныя аголеныя фігуры мужчын і жанчын). Праяўляў сябе як фотамастак. У 2020 выдаў кнігу пра кіраўніка і арганізатара цымбальнага аркестра ў Смаргоні А. Дзяругу (у суаўтарстве).

Літ.: Госцеў А. Натхненне само не прыходзіць// фэйсбук. 11.04.2021.

Церам (хорам) княжацкі другой пал. XII ст., знойдзены *Ядкоўскім Ю.* ў паўднёвым баку *дзядзінца* падчас археалагічных раскопак 1932–33 гг. Пабудаваны з плінфы ў роўнаслаёвай тэхніцы муроўкі на вапнавай рошчыне з цамянкай (вапна з тоўчанай цэглай). Даўжыня будынка – 9,72 м. На плінфе археолагамі было знойдзена звыш 30 тыпаў знакаў: літары Т, Н, М, А, N, крыжы, стрэлы, геаметрычныя фігуры, пляцёнкі. У. Галубовіч выказаў думку, што на частцы цэглаў адціснутыя знакі князёў Рурыкавічаў, да якіх належаў князь *Усевалад Гарадзенскі.* Звонку ў сцены былі ўмураваныя рады амаль неапрацаваных камянёў. Падлога была выкладзеная паліванай пліткай. Дах пакрыты алавянымі лістамі. Адносіцца да *школы гарадзенскай архітэктурнай.* Будынак, верагодна, быў двухпавярховым, меў драўляныя перакрыцці на бэльках. На першым паверсе былі два памяшканні: у большым (даўжыня 6,5 м, магчыма квадратнае ў плане) была маёлікавая падлога, а ў меншым – з плінфы. Вялікае памяшканне мела ўваход з паўночнага боку, з плошчы дзяцінца. У сценах калісьці былі нішы, перакрытыя аркамі. Меншае памяшканне было вузкім і знаходзілася ва ўсходняй частцы, было падзеленае на дзве часткі. Паміж двума памяшканнямі была сцяна таўшчынёй 0,74 м. Сцены ўсяго будынка былі рознай таўшчыні: заходняя і паўночная 1,12–1,17 м, а ўсходняя – усяго 0,6 м. У некаторых месцах сцены захаваліся на вышыню 2,5 м. Агульная глыбіня фундамента – каля 35 см. Пасля невялікіх раскопак 1981 г. было вызначана, што пад фундаментам ляжыць зямля з вуглямі (6–7 см), затым – культурны слой XII ст. (23–24 см), ніжэй – гарэлая праслойка шэрага ад залы колеру (12–13 см), далей пачынаецца жоўты пясок мацерыка. Ядкоўскі лічыў, што Ц. к. – гэта парадная частка княскага палаца. Варонін сцвярджаў, што гэта крапасная вежа, якая спалучае баявыя і жылыя функцыі. Археолагі Рапапорт П. А. і Трусаў А. А. выказалі думку, што ў канцы XIV – XVI ст. Ц. к. мог выконваць і абарончую функцыю, як частка замка *Вітаўта.*

Літ.: Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння. – Мн.: Беларуская нвука, 1996. – С. 22–23; Иушина О. В. Гродненская архитектурная школа XII века // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада). – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 139–140; Рапопорт П.А. Новые данные об архитектуре древнего Гродно / П.А. Рапапорт // Древнерусское искусство: худ. культура X – первой

половины XIII в. – М., 1988. – С. 65–66; Трусаў А.А. Стары замак у Гродне XI – XIII стст.: гіст.-археал. нарыс / А.А. Трусаў, В.Е. Собаль, Н.І. Здановіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993; Трусаў А.А. Гродзенскі княжацкі церам // Беларуская энцыклапедыя ў 18-ці т. Т. 5. – Мн., 1997. – С. 435. Hołubowicz W. Znaki rodowe i inne na przedmiotach z wykopalisk w Grodnie. – Poznań: Drukarnia Uniwersytetu Poznańskiego, 1948.

Цеханоўскі Цэлесцін Міхайлавіч (1835, мястэчка Горлава Чавускага ў. Магілёўскай губ. – 28.12.1906, Іркуцк) – паўстанец 1863 г. Скончыў Магілёўскую гімназію і медыцынскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта ў 1857 г. Падчас вучобы з'яўляўся чальцом патаемнай студэнцкай арганізацыі "Агул" (польск. "Ogół"), якая аб'ядноўвала моладзь Літвы, Беларусі і Польшчы. Пазнаёміўся з *В.-К. Каліноўскім* і яго братам *Віктарам*. Пасля ўніверсітэта зарабляў вольнай лекарскай практыкай ў Гродне (побач, у сваім маёнтку Жыдомля жыла яго маці). Стаў чальцом рэвалюцыйнай арганізацыі, быў заўважаны ў перадпаўстанчы час удзельнікам спеваў гімнаў у *Дамініканскім касцёле*, у зборах грошай, удзеле ў дэманстрацыях і "провадах" былога гродзенскага губернатара *Шпеера*. Напісаў верш "Падзяка полькам", у якім падзякаваў жанчынам, якія не носяць квяцістыя спадніцы і зразумелі, што цяпер не час танцаваць з маскалямі, а больш прыгожа з малітваю і слязьмі аплакваць забітых у Варшаве. У сакавіку (ці студзені) – ліпені 1863 г. быў паўстанцкім начальнікам Гродна: збіраў і адпраўляў у партызанскія атрады людзей, перадаваў туды рэвалюцыйныя газеты "Час" і "Звесткі з поля бітвы", выдаваў распараджэнні па Гродне (напрыклад, заклікаў жанчын не насіць квяцістыя спадніцы). Адзін з кіраўнікоў паўстання Я. Гейштар ахарактарызаваў Ц. як "душу арганізацыі ў Гродне, каханым моладдзю, і на самой справе незвычайнай асобай". Удзельнік паўстання гісторык Т. Корзун пісаў, што Ц. быў "ідэалістам без матэрыяльных інтарэсаў, чалавекам вялікай працаздольнасці і сумленнасці". Арыштаваны 29.07.1863 падчас аказання медыцынскай дапамогі паўстанцу, сядзеў у мурах Дамініканскага кляштара. На следстве праявіў сябе "в упорном запирательстве": сваёй віны ва ўдзеле ў рэвалюцыйнай арганізацыі не прызнаў і ад усяго адмаўляўся. Следчай Віленскай камісіяй асуджаны да расстрэлу, заменены, дзякуючы намаганням брата Яна, на 15 год катаржных прац, якія адбываў у Іркуцку (прыбыў 28.05.1865). Рашэннем гродзенскага губернскага праўлення ад 13.12.1864 маёмасць падлягала канфіскацыі. Адпраўлены 22.08.1865 у пасёлак Ліственічны для працы на будаўніцтве акруговага байкальскага паштовага тракту. 3.11.1866 пераведзены на Аляксандраўскі вінакураны завод, дзе стаў добраахвотна выконваць абавязкі турэмнага ўрача. 25.05.1868 царскім указам яго вызвалілі ад катаржных прац. У 1872 прызначаны штатным урачом Аляксандраўскай турмы, і з яго былі знятыя кайданы. З 1883 дазволена вольнае пасяленне ў Іркуцку, дзе заняўся прыватнай практыкай, працаваў у амбулаторыі Чырвонага Крыжа. Стаў актыўным чальцом таварыства ўрачоў Заходняй Сібіры. Меў жонку з мясцовых казачак і 10 дзяцей. Памёр у Іркуцку. У 1930-х гадах у Гродне была вуліца Ц. (цяпер вул. Л. Талстога).

Крын. і літ.: Ігнатовіч Ф. Вядомы ў Беларусі і ў Сібіры //"Гродненская правда". – 1990 – 6 января; Игнатович Ф. Врач Целестин Михайлович Цехановский: повстанческий начальник Гродно и общественно-медицинский деятель Сибири // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Вып. 8 (2014). – Гродна, 2014. – С. 106–115; НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 38, с. 611, а. 127; ф. 3, воп. 3, с. 2, а. 10, 184–186; с. 1, а. 49, 238–243 адв.; с. 4, а. 29–31; Грицкевич В. С факелом Гиппократа… – С. 193; Jodkowski J. Rok 1863... Notatki...; Komar… – S. 119.

Ціханчук М. П. – старшыня Гродзенскага *гарадскога выканаўчага камітэта* (1948–1950).

Цольнер Конрад фон Ротэнштэйн – магістр Тэўтонскага ордэна ў 1382–1390 гг., комтур Крысбурга.

Цыгельніцкая Фаня А. – маці Інны Анатольеўны Карпюк, жонкі пісьменніка *Карпюка Аляксея*. У 1923 г. – член кампартыі Польшчы. Прыбыла ў Гродна з Беластока, дзе была ў саюзе швейнікаў. Раней перадавала сюды нелегальную літаратуру. У Гродне ўладкавалася ў швейную майстэрню і жыла нелегальна, кіравала камсамолам, удзельнічала ў забастовачным руху (друкавала нелегальныя заклікі, магчыма, на шапірографе па вуліцы Рыбацкай). З 1923 працавала ў цэнтральнай сувязі ЦК КПЗБ.

Публікацыі: Под знаменем Октября // Сельская новь, 1979, 7 ноября; За светлое будущее // Там же, 1982, 6 марта; Незабываемое // Там же, 1982, 28 октября; Годы борьбы и испытаний // Там же, 1983, 22 октября; За счастливое сегодня: о женщинах Гродненщины бывших членах КПЗБ // Там же, 1985, 8 марта.

Крын. і літ.: Успаміны Цыгельніцкай, папка ў Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеі. – 23 с.; Кіркевіч А. Заходнебеларуская адысея. Аляксей Карпюк // Наша гісторыя. – 2020. – № 3 (20). – С. 18–23.

Цыдзік Стэфан (каля 1882 – 12.01.1941) – віцэ-прэзідэнт Гродна (1922). У 1919 выконваў абавязкі суддзі 1-га раёна. У 1919–1927, 1934–1939 быў радным *гарадской рады*. Сябра *Таварыства аматараў горада Гродна* (1924), праўлення польскага дабрачыннага таварыства ў Гродне (1921, 1930). Акруговы апякун 3-й акругі Гродна (1935). Жыў па вул. Ерусалімская, 14 (1922). Магіла яго з помнікам знаходзіцца ў Бержніках пад Сейнамі на Сувальшчыне (Польшча). З верасня 1939 ён там хаваўся 1,5 года ад Савецкай улады, захварэў на запаленне лёгкіх і памёр. Разам з ім была жонка, якая паходзіла з Бержнікаў. Карпюк А. у сваім рамане "Карані" пісаў, што Ц. знішчыў каштаны, якія раслі на вуліцах і пасадзіў "італьянскія ліпы". Супраць гэтага паўсталі гродзенцы, паадбіралі ў рабочых сякеры, паламалі пілы і далі ім па карку. "Каштанавы бунт" хацелі падавіць войскам, якое стаяла ў баявой гатоўнасці, але парадак утрымалі паліцыя і "стральцы".

Літ.: Карпюк А. Выбр. Творы. Т. 1, с. 65; Чарнякевіч А. М., Памяць пра Гродна. Матэрыялы да біяграфічнага слоўніка постацей міжваеннага горада. 1919–1939 гг. /

А. М. Чарнякевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2015, с. 267–268; L. Sawoniewski. Saga o Grodnie. – Łódź-Białystok, 1999. – S. 24; H. Orzechowska. 80 rocznica bitwy Niemeńskiej // Magazyn Polski – 2001. – №4 (21). – s. 48.

Цыленць Валеры (22.09.1969, Ліда) – прызёр спаборніцтваў па грэка-рымскай барацьбе на Алімпійскіх гульнях 1996 у Атланце (бронза), заняў 4 месца на АГ у Сіднеі (2000). У Гродне жыве з 1986, скончыў факультэт фізічнай культуры ГрДУ (1996). Чэмпіён Беларусі (1993, 1994, 1996). На чэмпіянатах Еўропы: у 1994 – 6 месца, у 1996 – 9 месца. На чэмпіянатах Свету: 4 месца ў 1993, 3 месца ў 1994.

Літ.: Попко И. Валерий Циленьть: Моя цель – Олимпиада в Сиднее // Гродзенская праўда. – 1996. – 27.08. – С. 3; Попко И.Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 47; 130–134.

Цырк. Існаваў у Гродне на пачатку XX ст. Мажліва, знаходзіўся ў тэатры *Тызенгаўза А.* Належаў Ш. Гурвічу, кіраўніком быў селянін Канстанцін Сцяпанавіч Алендскі (21.03.1915). У ліпені 1914 маёмасць цырка склалі ў адзін з пакояў і зачынілі. Пасля знаходжання ў будынку цырка ў 1914–1915 гг. расійскага войска, коней, тэлеграфічнай часткі, ветэрынарнага шпіталя было шмат пашкоджана і страчана: паласы, дываны, канаты, драпіроўка, сцэна, крэслы, печы, ложа губернатара. Створаная ў красавіку 1915 камісія, на чале з гродзенскім павятовым прадвадзіцелям дваранства А. І. Ушаковым, адмовіла ў вяртанні страчанага, бо скаргу падаў не гаспадар, а ахоўнік цырка.

Крыніцы: НГАБ у Гродне, ф. 13, воп. 1, с. 1771.

Цыффенбах Карл Фрыдрыхавіч (1771, Гданьск – 1822) – урач і арганізатар аховы здароўя, доктар медыцыны (1794). З 1799 г. працаваў Гродзенскім павятовым урачом. Сябра Віленскага медыцынскага таварыства (з 1808). Аўтар прац па клініцы, эпідэміялогіі і прафілактыцы інфекцыйных хвароб. Найбольш вядомая з іх прысвечаная вакцынацыі супраць воспы (Гродна, 1803). Апошнія гады працаваў хірургам і кіраўніком вайсковага шпіталя ў Вільні.

Літ.: Игнатович Ф. И. К. Тиффенбах – один из первых организаторов и пропагандистов оспопрививания по методу Э. Д. Дженнера в Белоруссии // Здравоохранение Белоруссии – 1992. – №3 – С. 73–75.

Цыхун Апанас Пятровіч (5.05.1910, в. Кунцаўшчына Гродз. р-на – 10.03.2005) – філолаг, стваральнік музея акадэміка Я. Ф. Карскага ў в. Лаша (1964), паэт. Вучыўся ў настаўніцкай семінарыі ў Гродне, на літаратурным ф-це Гродзенскага педінстытута. Ваяваў супраць немцаў у 1939 г., патрапіў у лагер ваеннапалонных. Вайну 1941–45 сустрэў на вайсковых зборах у Беластоку, але пазбег палону і вярнуўся ў родныя мясціны. Пасля вайны працаваў настаўнікам у Лашанскай сямігодцы, дырэктарам Капцёўскай няпоўнай СШ, настаўнікам польскай СШ № 2 у Гродне (1946–48), інспектарам Гродз. раённага аддзела Народнай асветы (1949–68). Атрымаў званне "Заслужаны

настаўнік БССР". У 1968–70 быў дырэктарам васьмігодкі ў в. Батароўка Брэсцкага р-на. 20 гадоў узначальваў літаб'яднанне пры Гродз. раённай газеце "Сельская новь". Галоўнай справай свайго жыцця лічыў вывучэнне і папулярызацыю дзейнасці акадэміка Я. Ф. Карскага. Выдаў "Скарбы народнай мовы" (з лексічнай спадчыны насельнікаў Гродз. раёну)"; "Пройдзеныя шляхі – пуцявіны", "Песні з народных глыбінь".

Літ.: Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: давед. / А.М. Пяткевіч. – Гродна: ГрДУ, 2000. – С. 317–318.

Цыцыянаў Павел Дзмітрыевіч (1754–1806) – грузінскі князь, які пераехаў у канцы XVIII ст. у Расію і стаў расійскім генералам ад інфантэрыі, камандзір корпуса, які знаходзіўся падчас *паўстання 1794 г.* у Гродне. 6.05.1794 вывеў войска (8 646 чал. і 30 гармат) з горада ў ваколіцы, захапіў касы *эканоміі Гродненской* і казначэйскай камісіі, запасы сукна са складоў (277 паставаў), прымусіў жыхароў пад пагрозай абстрэла да выплаты кантрыбуцыі (10 1552 руб. 55 кап. срэбрам), пасля гэтага адышоў пад Нясвіж. Спіс гродзенцаў, складзены Цыцыянавым – добрая крыніца па гісторыі Гродна (яго знайшлі і апублікавалі гісторыкі з Беластока). Пасля паўстання Ц. быў прызначаны на кіраўніцтва Гродзенскай адміністратыўнай часткай *Вярхоўнага літоўскага праўлення*. На пасадзе працаваў да 1 мая 1795. З пасяленнем у Гродне *Станіслава Аўгуста Панятоўскага* забяспечваў яго і гродзенцаў бяспеку, кантроль за паводзінамі і кантактамі караля. У 1802–1806 быў кіраўніком адміністрацыі на Каўказе. Памёр там (магчыма ў Баку) у 1806 г.

Літ.: Де Пуле. М. Станислав-Август Понятовский в Гродне и Литва в 1794–1797 годах. Изд. 2-е. – СпБ., 1871. – С. 13–15; Grodno w XVIII wieku. Miasto i ludność (na tle trendów rozwojowych od średniowiecza do 1936 roku) / Red. A. Wolanowski i J. Urbanowicz. – Białystok, 1997; Żytkowicz L. Rządy Repnina na Litwie w latach 1794–1797. – Wilno, 1938. – S. 87.

"Civitates Orbis Terrarum" – атлас мап, планаў і выяваў гарадоў, выдадзены ў 1575 г. у Кёльне канонікам мясцовай катэдры Георгам Браўнам і гравёрам Францам Хогенбергам. У другім томе на планшэце 48 змешчаная выява Горадні (Гродна), якая паўтарае кампазіцыю гравюры Маціяса Цюнта 1568. Выдаваўся шмат разоў, апошні раз у 1612 г.

Літ.: Rocznik biblioteki Naukowej PAU I PAN w Krakowe. Rok LIII. – Kraków, 2008. – S. 501–503.

Цэймерн Мікалай Максімавіч (24.04.1839 – ?) – гродзенскі *губернатар* з 3.05.1879 па 16.10.1883. З дваран Ліфляндскай губ., праваслаўны. На выдатна скончыў Пажскі корпус. Пачаў служыць прапаршчыкам лейб-гвардыі Гатчынскага палка. У 1861 скончыў Мікалаеўскую акадэмію Генеральнага штаба. Да прызначэння гродзенскім губернатарам служыў у розных вайсковых частках і Генеральным штабе. Удзельнічаў у падаўленні *паўстання 1863–64.*

З 26.03.1867 – афіцэр асаблівых даручэнняў пры галоўнакамандуючым Варшаўскай вайсковай акругі. Удзельнік руска-турэцкай вайны 1877–1878. Распараджэннем цара ад 28.03.1879 вызвалены ад пасады камандзіра палка з прызначэннем у МУС і атрыманнем звання флігель-ад'ютанта.

Указам Аляксандра II ад 3.05.1879 палкоўнік Ц. прызначаны выканаўцам абавязкаў на пасаду гродзенскага грамадзянскага губернатара. Ахвяраваў для Азёрскага народнага вучылішча ўчастак зямлі ў Слонімскім у. (2,54 дзесяціны) коштам у 300 руб., за што атрымаў падзяку міністра народнай адукацыі. У 1878 у Гродне адкрыў школу ўраднікаў. З 29.06.1879 выконваў абавязкі старшыні Гродзенскага таварыства апекі хворых і параненых вайскоўцаў. 30.08.1879 атрымаў чын генерал-маёра з зацверджаннем на пасадзе гродзенскага губернатара і з прызначэннем у світу імператара. За паспяховую арганізацыю збору казённых мытаў і выкупных аплат атрымаў "монаршее благоволение". Жонка Вольга Аляксандраўна, у 1893 з'яўлялася ганаровым чальцом *таварыства Гродзенскага дабрачыннага.*

16.10.1883 царскім указам звольнены па асабістым прашэнні з пераводам у МУС. Даведаўшыся пра *пажар* 29.05.1885 у Гродне, ахвяраваў пагарэльцам 75 руб. З 1.02.1884 па 17.05.1888 – астраханскі губернатар і наказны атаман Астраханскага казацкага войска. З 1888 з'яўляўся чальцом Савета МУС. 30.08.1889 атрымаў чын генерал-лейтэнанта. У 1894 лічыўся ў штаце Генеральнага штаба. У 1912 быў ганаровым апекуном Апякунскага савета Устаноў імператрыцы Марыі.

Узнагароджаны 10 ордэнамі, 2 медалямі (адзін з іх быў за пагром паўстання 1863–64), залатой шабляй "За храбрасць"; знакамі адрознення – за пазямельнае уладкаванне былых дзяржаўных сялян (1880) і срэбным за працы па ўладкаванні сялян у Каралеўстве Польскім.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф.1, воп. 8, с. 168, а.1–1адв.; ф. 2, воп. 8, с. 934, а. 3; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 92–94.

Цэнтральная дэпутацыя ВКЛ – выканаўчы орган паўстанцаў 1794 г. на тэрыторыі Літвы і Заходняй Беларусі. Створаны ў Вільні 23 красавіка, дзейнічаў да 1 кастрычніка ў Гродне, што ператварыла горад на пэўны час у сталіцу ВКЛ.

Цэнтр гістарычны – старая частка Гродна, абмежаваная з поўначы вул. 17 верасня, з захаду – раёнам індывідуальнай забудовы і гарадскім паркам, з поўдня – левым берагам *Нёмана,* з усходу – *чыгункай.* Ц. г. трэба разглядаць як цэласнае горадабудаўнічае асяроддзе, каштоўнае ў гісторыка-культурным і архітэктурным планах, якому патрабуецца спецыяльны горадабудаўнічы рэжым далейшай забудовы, рэканструкцыі і аднаўлення. На жаль, так не сталася. Адпаведна *планам генеральным горада* Савецкая пл. вызвалялася ад ролі грамадскага цэнтра і ператваралася ў гістарычны. Пры гэтым яна была пазбаўленая ў 1950–1960-я гады *Дома рыбака, Фары Вітаўта,* у гістарычным ядры былі пабудаваныя *Палац тэкстыльшчыкаў*, шматкватэрныя

С. 913

дамы з аптэкай і крамамі, гатэль Нёман – усе названыя пабудовы не мелі агульных рысаў і не стваралі цэласную ансамблевую структуру. Грамадскім цэнтрам у 1970-я сталі рабіць пл. Леніна, забудаваўшы яе будынкамі гарадскога камітэта кампартыі і абласнога выканаўчага камітэта. Гэта змяніла выгляд старажытнай *Гарадніцы*. Ц. г. страціў такія помнікі гісторыі і архітэктуры, як: *карчма "Раскоша", дамы майстроў* на вул. Ажэшкі Э., рэшткі былых каралеўскіх стайняў.

Літ.: Гродназнаўства. Гісторыя еўрапейскага горада / Пад. Рэд. В. Карнялюка і В. Шведа. – Гародня, Вроцлаў, 2012. – С. 278–281; Міхед А. Адказнасць архітэктара // Літаратура і мастацтва. – 1963. – 1.02. – С. 1.

Цэх рамесны – карпаратыўная арганізацыя рамеснікаў адной або некалькіх спецыяльнасцяў. Цэх быў іерархічнай арганізацыяй і складаўся з вучняў, падмайстраў (чаляднікаў), майстроў, адносіны паміж якімі рэгуляваліся статутам. На чале цэхаў стаялі старшыя майстры або цэхмайстры. Першы ўспамін аб арганізацыі цэха ў Гродне адносіцца да 13.02.1570 г., калі гродзенскі магістрат зацвердзіў статут аб'яднанага цэха кавалёў, кацельшчыкаў, мечнікаў, слесараў (цэх металаапрацоўчых спецыяльнасцяў).

Пазней да яго далучыліся: латнікі, нажоўшчыкі, карэтнікі, шорнікі, сядзельнікі. У 1612 цэх атрымаў прывілей ад караля Жыгімонта III. 17.06.1639 гарадзенскі *магістрат* прыняў рашэнне аб захаванні аб'яднанага металаапрацоўчага цэха, але майстрам кожнага рамяства дазвалялася мець асобную скрыню і ўласны статут. 12.03.1674 па ініцыятыве чатырох цэхмайстраў – Марціна Макоўскага (мечніка), Яна Мархеля Пятровіча (катляра), Даніэля Юргелевіча (каваля), Станіслава Кавальскага (слесара) на паседжанні магістрата былі зацверджаныя "Пункты (…) аб тым, як маюць паводзіць сябе таварышы". Другі аб'яднаны цэх муляраў, ганчароў, цесляроў, бандароў атрымаў прывілеі аж ад чатырох каралёў: Стэфана Баторыя (у Вільні 2.04.1579), Жыгімонта III (у Вільні 22.02.1620), Уладзіслава IV (у Гродне 30.05.1633), Яна II Казіміра (у Гродне 15.01.1653).

Цэхмайстрамі ў 1659 былі: у цэху мечнікаў – Марцін Казакевіч, у слесараў – Якуб Нуймека, у кавалёў – Крыштаф Бараноўскі, у катляроў Мальхер Пятровіч, у цесляроў – Францішак Бялькоўскі, у муляраў – Фёдар Хацкевіч, у бандароў – Эліяш Стэфановіч, у шаўцоў – Ваўжынец Казярацкі, у мяснікоў – Андрэй Іванавіч, у гарбарскім – Якуб Адамовіч. У часы Аўгуста II (1697–1704) цэхмайстрамі былі Рыгор Раманоўскі, Мікалай Тарасевіч, Крыштаф Кішкевіч, Ян Саваневіч. У 1679 Ян III Сабескі даў прывілей мулярам і стрыхарам, у якім ёсць згадка аб правах, дадзеных Жыгімонтам III. У 1699 Аўгуст II дараваў грамату цэхам брукароў, ганчароў, бандароў, цесляроў. Паводле прывілея Стэфана Баторыя ад 2.02.1579 быў заснаваны кравецкі цэх. Яго канфірмавалі Жыгімонт III 22.02.1620 і Уладзіслаў IV 30.05.1633. Дамовай ад 10.05.1667 цэх аб'яднаўся з кушнерскім цэхам, але паводле магістрацкага дэкрэта 1673 г. аддзяліўся ад яго. 10 студзеня 1630 Жыгімонт III дае прывілей на арганізацыю цэха злотнікаў. Паводле прашэння старшых майстроў цэха Яна і Станіслава

Цвіклаў, Тамаша Ланеўскага, Уладзіслаў IV таксама выдае ім прывілей 10 снежня 1637 г. Ён даслоўна быў канфірмаваны Янам Казімірам 20.03.1650. Статут шавецкага цэха быў зацверджаны магістратам і меў прывілей ад *Стэфана Баторыя*, пацверджаны 6.06.1633 Жыгімонтам III і 4.01.1653 Янам Казімірам. Гандляваць абуткам без дазволу цэха забаранялася пад караю канфіскацыі тавараў. У 1633 цэхмайстрамі былі Каспер Часновіч і Ваўжынец Казароўскі. У 1645 упершыню згадваецца цэх брукароў. У 1649 арганізаваныя былі цэхі гарбароў і цырульнікаў (і тых, хто рабіў парыкі). Першая пісьмовая згадка пра гарбарскі цэх адносіцца да 25.01.1675. Прывілей гарбарам даў 2.01.1699 Аўгуст II Моцны. Статут цэха цырульнікаў быў унесены ў гарадскую кнігу 10 снежня 1649, а 9 студзеня 1650 Ян II Казімір даў яму прывілей. Цэх цырульнікаў меў у Фары Вітаўта свой алтар. У 1666 згадваецца цэх жывапісцаў. У канцы XVII ст. быў арганізаваны мясніцкі цэх. Згодна са статутам часоў Яна III ён павінен быў дапамагаць шпіталю Фарнага касцёла. Часова да цэха мяснікоў (5 артыкул статута) належалі "каралеўскія рыбакі" (і лаўцы ракаў). 30.01.1698 Аўгуст II даў ім прывілей на арганізацыю свайго цэха. Дазвалялася мець на рынку сваё месца, а іншыя гандляры рыбаю розных відаў і гатункаў маглі гандляваць толькі з дазволу цэха, яўрэям забаранялася гандляваць селядцамі. Аўгуст III канфірмаваў прывілей свайго бацькі і дадаў, што гродзенскія рыбакі абавязваюцца "кожную сераду і пятніцу даваць па вядры рыб на замак". У 1777 у Гродне налічвалася 15 цэхаў: шавецкі, рыбацкі, гарбарны, кавальскі, мясніцкі, кравецкі, будаўнічы, цяслярскі, ганчарны, бандарскі, ткацкі, стрыхарскі, злотніцкі, сталярны, фурманскі. У *музеі Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным* захоўваюцца некаторыя цэхавыя артэфакты: харугва млынарскага цэха; каваная скрыня (ляда 1797), у якой захоўваліся грошы цэха, сімвалы ўлады цэхмайстра і каралеўскія прывілеі; рыба, якая вісела на сцяне дома цэха рыбакоў.

У першай палове XIX ст. цэхі паступова страчвалі свой уплыў на развіццё рамяства. У 1829 г. гродзенскі губернатар пісаў у Міністэрства ўнутраных спраў (МУС), што "цэхавыя, гэта мяшчане, хрысціяне і яўрэі, па родах іх рамяства хаця падзяляюцца на цэхі, але суполкі іх ніякіх капіталаў не маюць". У 1850 МУС распрацавала пастанову, адпаведна якой быў складзены спіс рамесных цэхаў у гарадах і мястэчках заходніх губерняў. У 1852 Сенат выдаў указ аб ліквідацыі цэхавай арганізацыі ў гарадах і мястэчках, дзе колькасць рамеснікаў была нязначнай. 20 сакавіка 1893 г. літоўскі генерал-губернатар выдаў распараджэнне гродзенскаму губернатару аб ліквідацыі цэхаў. 27 красавіка апошні загадаў маёмасць цэхаў перадаваць ствараемым рамесным упраўленням у Гродне і Беластоку.

Літ.: Швед В.В., Гісторыя развіцця рамяства ў Гродне. – Ліда: Лідская друкарня, 2014. – С. 16–19; Цітоў А. Краіна майстроў. Рамесныя цэхі Беларусі: 16 – канец 18 ст./ А. Цітоў. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. – С. 52–59.

Цюнт (Zundt, Zunten) **Мацей/Маціяс/Матэвуш** (1498–1586) – выбітны нюрнбергскі мастак, ювелір, гравёр. Гравюру "VERA DESIGNATIO URBIS IN

LITTAVIA GRODNAE" ("Праўдзівае адлюстраванне Горадні ў Літве") паводле малюнка Адэльгаўзера выканаў у Нюрнбергу ў 1568 г. Вядомыя таксама яго гравюры "Гарадзенскі замак", "Аблога Готы", 5 гравюр з вайсковымі тэмамі змешчаныя ў калекцыі Каралеўскага музея Грынвіч, партрэты вялікага магістра Мальтыйскага ордэна Ёгана дэ Ралета (1566), Луі III Бурбона-Кандэ (1568), Вільгельма I (1569) і інш.

Літ.: Салей С. Гравюра Адэльгаўзера/Цюнта "Vera designation urbis in Littavia Grodna" як крыніца па гісторыі Гародні: сучасны стан і перспектывы вывучэння // Гістарыяграфія і крыніцы гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі. Зб. навуковых артыкулаў. – Гродна, 2009. – С. 227–234; Сліж Н. Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2. – С.10–11.

Цялегін М. І. – гродзенскі архітэктар. Старшыня праўлення Гродзенскага абласнога адзялення Саюза архітэктараў БССР (з 1959 г.).

Цяцерскі Міхал Янавіч (? – 12.09.1797) – дамініканін, педагог, літаратар. Брат *Себасцьяна, Фаўстына і Фелікса Цяцерскіх*. Паходзіў з Варміі, Альштынскага ваяводства Каралеўства Польскага. Працаваў у Забельскай калегіі, дзе выкладаў рыторыку і паэтыку. Разам з К. Марашэўскім адныя з першых пачалі пісаць па-беларуску. Зрабіў лацінкаю ў 1787 г. польска-беларускую моўную пераапрацоўку камедыі Ж.- Б. Мальера "Доктар па прымусу" ("Le Médecin malgré lui"), якую можна было паглядзець у *тэатры гродзенскім*. Напісаны ім у Забелах у 1784 лацінскі падручнік рыторыкі знаходзіцца ў рукапісным фондзе Навуковай бібліятэкі Віленскага універсітэта. Аўтар наступных твораў: "Вольнасць і няцнота", трагедыі "Сапар", арацыі "Пчолы", "Аб ашчасліўленні чалавека", трагедыі "Фемістокл", празаічных тэкстаў у аперэце "Апалон-заканадаўца", камедыі "Шлюб, разбаўлены штучкамі Арлекіна", "Камедыя" з пяці актаў (усё на польскай мове). У сваіх творах асуджаў дэспатызм, сцвярджаў роўнае права ўсіх людзей на валоданне багаццямі прыроды, выхоўваў грамадзянскі патрыятызм і высокую мараль.

Крын. і літ.: Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X-XIX стагоддзі. Энцыкл. даведнік. – Мінск, 1995. – С. 328; Навуковая бібліятэка Віленскага універсітэта, рукапісны аддзел, ф. 3, №1612; ф. 18, сп. 201, л. 50–74; Мальдзіс А. Ажываюць спадчыны старонкі: Выбранае. – Мн., 1994. – С. 394, 399, 405–415.

Цяцерскі Себасцьян (2 пал. XVIII – пасля 1802) – касцюшкавец, сябра "Віленскай асацыяцыі". Вучыўся ў віленскіх школах, служыў падхарунжым у 8 палку літоўскай пяхоты, падчас *паўстання 1794 г.* перайшоў у стральцы падпалкоўніка Грабінскага і даслужыўся да падпаручніка. Прымаў удзел у абароне Варшавы, потым вярнуўся ў Вільню. Увайшоў у Віленскую асацыяцыю, дзякуючы пасярэдніцтву *Фаўстына Цяцерскага*. Быў выбраны на патаемны польскі сейм у Мілане. Па дарозе на яго быў арыштаваны ў Гродне (1797). Падчас вобыску ў яго зашытым каўнеры фрака знайшлі наступныя

паперы: Акт віленскага паўстання 27.08.1797, "Артыкулы прынятыя да асацыяцыі" (Адгалінаванне Львоўскай "Цэнтралізацыі") і лічбавы алфавіт. Спрабаваў падчас вобыску здзейсніць самагубства, але перашкодзіў генерал Мерлен. Выдаў брата, ксяндза Зюлкоўскага, адваката Грабоўскага і Юдыцкага.

Літ.: Miller A. Pierwsza Porozbiorowa Konspiracja Litewska. Spisek ks. Ciecierskiego preora dominikanów Wileńskich (1796–1797). Studium historyczne. – Kraków, 1936. – S. 149–150; Polski Słownik biograficzny. T. IV. Kraków, 1938. – S. 37.

Цяцерскі Фаўстын Янавіч (1760, Альштынскае ваяводства РП – 1832 ці 1833, Прапарцы на Жмудзі) – сакратар Віленскага Канвента літоўскай правінцыі з 29.01.1793. Меў кантакты з гродзенскімі паўстанцамі ў 1794 г. Быў кіраўніком першай пасля падзелаў Рэчы Паспалітай ліцвінскай канспірацыі – Віленскай асацыяцыі (Адгалінаванне Львоўскай "Цэнтралізацыі"). 1.12.1797 прыгавораны да ссылкі ў Сібір, з якой вярнуўся ў 1802. Да 1810 знаходзіўся ў Забельскім кляштары (з 1804 быў прыёрам). Напісаў там свае "Успаміны" (выдадзеныя ў Львове ў 1865). Пераехаў у Вільню. Быў правінцыялам Літоўскай правінцыі ордэна дамініканцаў (16.12.1817–4.11.1824). Апекаваўся гродзенскай *школай дамініканскай*: для кабінета прывёз з замежжа розныя машыны і механізмы, падараваў для бібліятэкі кнігі, а для нумізматычнай калекцыі – некалькі манет, падараваў 150 польскіх злотых. З 1824 г. жыў і працаваў візітатарам на Жмудзі. Напісаў "Літоўскую Хроніку", "Успаміны візітатара" (на польскай мове).

Літ.: Miller A. Pierwsza Porozbiorowa Konspiracja Litewska. Spisek ks. Ciecierskiego preora dominikanów Wileńskich (1796–1797). Studium historyczne. – Kraków, 1936. – S. 149–150; Polski Słownik biograficzny. T. IV. Kraków, 1938. – S. 37.

Цяцерскі Фелікс Янавіч (1774 – 2.11.1826, Вільня) – славуты навуковец-дамініканін, выдаў у Гродне сваю дысертацыю па эксперыментальнай фізіцы, доктар філасофіі і тэалогіі. З 1792 г. вучыўся ў Віленскай галоўнай школе. Працаваў у дамініканскіх школах у Гродне, Навагрудку, Забеллі. Напісаў трактат аб рыторыцы і паэзіі, падручнік па эксперыментальнай фізіцы (Elementorum physicae experimentalis – Grodno, 1806 і 1807). У 1812 г. быў у складзе Часовага Літоўскага ўрада (ВКЛ), ажыццяўляў нагляд над шпіталямі і харчовымі складамі (магазінамі). У 1824 на капітуле ў Папорцях пасля брата *Фаустына* быў выбраны на правінцыяла. Вёў канфідэнцыяльныя размовы з Аляксеем I аб справах ордэна, стане каталіцкага касцёла ў Расійскай дзяржаве, аб пераходзе Аляксея ў каталіцтва. Памёр у кляштары св. Духа ў Вільні.

Літ.: Polski Słownik biograficzny. T. IV. Kraków, 1938. – S. 37.

Ч

Чагін Мікалай Міхайлавіч (20.11.1823, Арол – 06.06.1909, Санкт-Пецярбург) – акадэмік архітэктуры Імператарскай Акадэміі мастацтва (1853), сапраўдны стацкі дарадца. У 1848 г. Чагін атрымаў дыплом архітэктара і хутка быў прызначаны на пасаду грамадзянскага інжынера пры Гродзенскай *палаце дзяржаўных маёмасцяў* (да 1850). Паводле яго праектаў будаваліся і рэканструяваліся цэрквы ў Гродне (*сабор Сафійскі*), Шчучыне, Ашмянах, Слоніме, Дзярэчыне (цяпер Зэльвенскага раёна) і інш. Ч. рабіў абмеры і замалёўкі падчас задумы праекта аднаўлення *царквы Барыса і Глеба на Каложы*. Яны захоўваюцца ў рукапісных аддзелах Віленскага дзяржаўнага ўніверсітэта і бібліятэкі Урублеўскіх АН Літвы. Пазней Ч. пагадзіўся з меркаваннем вядомага інжынера А. Штукенберга пра тое, каб не адбудоўваць царкву, а зрабіць кансервацыю руінаў. Сучасны даследчык архітэктуры С. Харэўскі лічыць, што гэта ўратавала царкву ад чарговага абвалу ў 1889. У 1896–98 Ч. перабудаваў на маскоўскі стыль *Фару Вітаўта*: над дахам паставіў пяць цыбулепадобных купалаў (драўляных, абабітых ліставым жалезам і пафарбаваных у фіялетавы колер з залатымі зоркамі); вежу пераўтварыў у званіцу, завершаную высокім шатром; на фасадах змясціў шмат дэкаратыўных элементаў – какошнікі, броўкі, парэбрыкі. Ч., як галоўны архітэктар Віленскай губ., напэўна карэктаваў і зацвярджаў праект архітэктара Гур'ева пабудовы *царквы Аляксандра Неўскага*.

Літ.: Харэўскі С. Дзейнасць архітэктара Мікалая Чагіна ў Вільні і Горадні: досвед і ўрокі // Гарадзенскі палімпсест. 2010, Мінск, 2011, с. 474–481; Venclova T., Wilno. Przewodnik biograficzny. – Warszawa: PIW, 2013. – С. 162; https://ru.wikipedia.org/wiki/Чагин_Николай_Михайлович Доступ 26.02.

Чаркаскі Якаў Кудзенетавіч/Кудзенекавіч (? – 8.07.1666), да хрышчэння ў Расіі меў імя Урусхан-Мурза. 29.09.1645 атрымаў сан баярына. У 1649–1650 кіраваў стралецкім і іншаземным прыказам і Новай Чэццю. Падчас рускапольскай *вайны* (1654–1667) прызначаны першым ваяводам вялікага палка, пры якім знаходзіўся сам цар Аляксей Міхайлавіч. Ч. прайграў бітву пад Оршай з Янам Радзівілам і Канстанцінам Астрожскім. З падыходам падмацаванняў працягнуў наступ у ВКЛ: узяў Копысь, Шклоў, Вільню, Коўна. 29.08.1655 яго войска заняло Гродна. Ч. правёў у *замку Старым* аднаўленчыя працы і пакінуў тут невялікі гарнізон. У сакавіку 1659 ён здаў горад шляхце Гродзенскага пав.

Літ.: Русский биографический словарь. Т. 22. – СПб., 1905. – С. 220–224.

Чарняўскі Ігар Мяфодзьевіч (нар. 12.03.1955, Чачэрск Гомельскай вобл.) – археолаг архітэктуры. Скончыў у 1978 г. Белдзяржуніверсітэт і з 1979 пачаў працаваць у Спецыяльных навукова-рэстаўрацыйных вытворчых майстэрнях Міністэрства культуры Беларусі. Пасля іх рэарганізацыі ў Беларускі рэстаўрацыйна-праектны інстытут быў прызначаны начальнікам аддзела архітэктурна-археалагічных даследаванняў, начальнікам сектара археалогіі. У 1980 разам з Ткачовым М. А. знайшоў у Гродне *царкву Прачысценскую*. З 1990 г. быў старшынёй пастаяннай камісіі па культуры, ахове і адраджэнні гісторыка-культурнай спадчыны Мінскага гарадскога савета. З 1991 працаваў намеснікам начальніка Галоўнага ўпраўлення па рэстаўрацыі і кансервацыі помнікаў гісторыі і культуры пры СМ РБ. З 2008 стаў начальнікам упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Працы Ч. пра Гродна: Архитектурно-археологические исследования в Гродно и Могилеве // АО 1980 года. — М., 1981. — С. 346–347; Пречистенская церковь XII в. в Гродно // Древнерусское государство и славяне: Матер. симпозиума, посв. 1500-летию Киева. — Мн., 1983. — С. 119–121; Новый памятник гродненской архитектурной школы XII в. // Древнерусское искусство: Художественная культура X — первой половины XIII в. — М., 1988; Новый памятник гродненской архитектурной школы XII в. // Древнерусское искусство: Художественная культура X — первой половины XIII в. — М., 1988.

Літ.: Археалогія і нумізматыка Беларусі. Энцыклапедыя. – Мінск: БелЭн, 1993. – 642–643.

Чацвярцінскі Георгі (Юры) Канстанцінавіч – удзельнік паўстання 1863 г., князь, 31 год. Нарадзіўся ў Гродне, атрымаў хатняе выхаванне, служыў у Сумскім гусарскім палку з 1853 па 1862, выйшаў у адстаўку штаб-ротмістрам. Арыштаваны па падазрэнні ў прысутнасці падчас раскладкі 10% збору з памешчыкаў на карысць *гродзенскай рэвалюцыйнай арганізацыі*. Гэтае абвінавачванне было ў ходзе следства знятае, але Ч. прызнаўся, што даў *Багатку* 120 руб. срэбрам. Падчас вобыску знайшлі спісаную ім пастанову варшаўскіх цэхаў "возмутительного содержания": "Да шаноўнай дэлегацыі горада прадстаўленне цэха бронзавага, сталярскага, катлярскага і іншых майстроў і чаляднікаў". У пастанове быў заклік любіць Айчыну, бо без яе будзе дрэнна. Загадам гродзенскага *губернатара* ад 13.05.1863 у яго быў канфіскаваны маёнтак. Прыгавораны да высылкі на пасяленне ў аддаленых месцах Сібіры і штрафу ў суме 360 руб.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 74; с. 2, 415, 418 адв., 422–425;с. 1, а. 556; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 126; Jodkowski. Sylwety z roku 1863 // Echo Grodzieńskie. – 1926. – № 8. – S. 3.

Чачэнскі Аляксандр Мікалаевіч (?, Чачня – 1834, сяло Саўкіна Апоцкага ўезда Пскоўскай губ.) – маёр, галава авангарда партызанскага атрада *Давыдава Дзяніса*, які вызваліў Гродна ад аўстрыйскай арміі ў 1812 г. Хлопчыкам

быў падабраны ў горным ауле Алды, выхоўваўся ў сям'і Мікалая Раеўскага (будучага героя *вайны 1812 г.*) у в. Каменка ва Украіне. Тут ён пазнаёміўся са сваім кузінам-аднагодкам Давыдавым. Вучыўся ў шляхетным пансіёне Маскоўскага ўніверсітэта. Вайсковую службу пачаў у Кізляры ў Ніжагародскім драгунскім палку Раеўскага. Два гады ўдзельнічаў у барацьбе супраць персаў і туркаў і ў 24 гады стаў падпаручнікам. З 1805 служыў у *Гродзенскім гусарскім палку*, дзе камандаваў паўэскадронам і ў 1805–1807 ваяваў з напалеонаўскімі войскамі пад Прэйсіш-Эйлау (атрымаў ордэн Св. Георгія 4-й ступені), Мышаніцамі, Гутштатам (узнагароджаны залатой шабляй "За храбрость"), Акендорфам. У 1808 удзельнічаў у вайне са шведамі ў Фінляндыі. У 1812 Ч. прымаў удзел у бітвах пад Віцебскам, Смаленскам, Таруціна. Разам з *Платавым М.* і прыёмным бацькам Раеўскім абараняў батарэю ў Барадзінскай бітве. Далей разам з Давыдавым вёў партызанскую вайну супраць напалеонаўскіх войск. За заваяванне Гродна атрымаў пазачарговае званне ротмістра. У замежным паходзе 1813 на чале Бужскага казачага палка ўдзельнічаў у бітвах пад Дрэздэнам, Бауцэнам, Люцэнам, Лейпцыгам, Ліёнам (атрымаў ордэн Св. Ганны з брыльянтамі). У Парыжы палкоўнік Ч. знаходзіўся ў свіце Аляксандра I і прымаў удзел у парадзе пераможцаў на Елісейскіх палях. Узнагароджаны срэбнымі медалямі "За вступление в Париж", "В память 1812 года". Са студзеня 1814 па студзень 1816 служыў палкоўнікам у гродзенскім гусарскім палку, а затым камандаваў Літоўскім уланскім палком. З 1822 – генерал-маёр, меў сувязь з *дзекабрыстамі.* Пасля іх паўстання быў звольнены з захаваннем зарплаты. У храме Хрыста Выратавальніка на сцяне № 16 было імя Ч., як асобы, узнагароджанай ордэнам Св. Георгія IV ступені.

Літ.: Гусары Российской империи / сост. Минск: Букмастер, 2012. – С. 141–148; Давыдов Д.В. Военные записки / Предисл. О. Михайлова. – М.: Воениздат, 1982. – С. 239–241; Кочетков. Партизанская война // 1812 год: К 150-летию Отечественной войны. – М., 1962. – С. 178.

Чопчыц Адам Сідаравіч (02.08.1921, в. Ленін Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. – 26.06.2005, Гродна) – арганізатар і мастацкі кіраўнік народнага *ансамбля песні і танца "Нёман"* (з 1960), заслужаны дзеяч культуры БССР. Выкладчык Гродзенскага педагагічнага вучылішча, рэжысёр, дырыжор, складальнік песень, аўтар праграм і падручнікаў па спевах. Скончыў гімназію ў Варшаве (1939). У часы *вайны Другой сусветнай* сядзеў у нямецкім канцлагеры г. Бруге за сувязь з партызанамі. Пасля вайны скончыў педагагічны інстытут у Пінску (1954), беларускую кансерваторыю (1960). У 1945–49 працаваў дырэктарам у Ганцавіцкай сямігадовай школе, у 1954–59 – у Пінскім педвучылішчы. З 1959 працаваў у гродзенскім музычна-педагагічным вучылішчы (выкладчык харавога дырыжыравання, метадыст па педагагічнай практыцы). Па даручэнні Міністэрства адукацыі Беларусі склаў першую праграму спеваў і музыкі для агульнасярэдняй школы. Напісаў метадычны дапаможнік для настаўнікаў спеваў. З 1960 кіраваў народным танцавальным ансамблем "Нёман" пры гродзенскім Доме культуры. Удзельнічаў у розных конкурсах,

сам арганізоўваў святочныя выступы і фестывалі. *Ганаровы жыхар* Гродна (1997). На будынку *Дома народнага* ў 2009 была ўсталяваная мемарыяльная дошка. Узнагароджаны ордэнам "Дружбы народов". Сын яго Аляксандр – кампазітар і песеннік, працуе ў гродзенскім вучылішчы мастацтваў.

Літ.: Карев Д.В. Гродно: город в контексте истории и культуры Европы (XI – нач. XXI в.) / Карев Д. – Мінск: Нац. Біб-ка Беларусі, 2018, – С. 107–108; Ключнік Г. Талент шчодрай душы // Гродзенская праўда. – 1997. – 14.01. – С. 3; Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 255–256; Родионов В. Песни Чопчица // Гродзенская праўда. – 1997. – 30.06. – С. 2.

Чорная Русь – тэрмін гэты, побач з "Белай Руссю", ёсць у Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай (XIII ст.). Баварскі гісторык Рыхенталь пісаў, што падчас Канстанцкага сабору (1414–1418) у пасольстве Вітаўта былі "князі з Белай і Чорнай Русі". На пачатку XVII ст. у "Хроніцы еўрапейскай Сарматыі" піша пра Белую, Чорную і Чырвоную Русь польскі гісторык А. Гваньіні. Сучасны даследчык Ю. Весялкоўскі адзначыў, што Чорная Русь ахоплівала вялікую тэрыторыю з такімі гарадамі, як: Ваўкавыск, Горадня, Драгічын, Клецк, Ліда, Мір, Навагрудак, Нясвіж, Рэчыца, Слонім, Слуцк. Археолаг *Гурэвіч Ф.* дадае яшчэ Вевярэск (гарадзішча ў в. Касцянева на р. Ваверка). Значыць, Чорнай Руссю азначалі заходнюю частку Беларусі. Горадня была адным з прамысловых, гандлёвых і культурных цэнтраў Ч. Р.

Літ.: Весялкоўскі Ю. Нарысы па гісторыі Беларусі. – Беласток, Лондан, 2002; Гурэвіч Ф. М. О формировании городов Черной Руси по данным археологии //Советская археология. – 1983 – № 3. – С. 61–71; Е. Н. Краткая история Гродненского края // Епархиальные ведомости. – 1906. – № 1–2, с. 12–18; № 3, с. 70.

Чыгунка. Першай прайшла 27.12.1862 праз Гродна Пецярбургска-Варшаўская чыгунка**.** Беларускі ўчастак Гродна – Парэчча склаў 50 вёрстаў. Менавіта тады была пабудаваная 2-га класа чыгуначная вузлавая станцыя ў Парэччы і 3-га класа ў Гродне. Ідэя гэтая прыпісваецца Браніславу Шварцу, інжынеру і аднаму з кіраўнікоў *паўстання 1863–64 гг.* Будынак станцыі ў Гродне быў зруйнаваны ў 1986, хаця лічыўся ахоўным помнікам гісторыі і культуры. Ад Гродна да Пецярбурга было 810 вёрст, і квіток каштаваў у 1877 г. адпаведна класу: 1-га – 24 руб. 30 кап., 2-га – 18 руб. 23 кап., 3-га – 10 руб. 13 кап. Гэтая першая ў Беларусі чыгунка злучыла Гродна з важнымі гандлёвымі і прамысловымі цэнтрамі: Беластокам, Пецярбургам, Варшавай. Дзякуючы міжнародным дамовам, Гродна было звязанае з многімі краінамі і выконвала ролю транзітнага цэнтра. Для патрэб чыгункі ў Гродне ў 1859 быў спраектаваны *мост чыгуначны* праз Нёман. З 1958 па 1861 ішло будаўніцтва часткі чыгункі ад Гродна да Дынабурга/Даўгаўпілса. У 1864 былі зацверджаныя правілы і тарыфы таварных зносін паміж асобнымі станцыямі Пецярбургска-Варшаўскай і прускай чыгунак. Гродна разам з Дынабургам і Беластокам знаходзіліся ў прамых таварных зносінах з Гамбургам, Берлінам, Штэцінам,

Вальдэнбургам, Брэслаўлем, Данцыгам, Кёнігсбергам, Інстэрбургам. У жніўні 1866 былі адкрытыя руска-нямецка-нідэрландскія зносіны паміж станцыямі Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі (у тым ліку і Гродна) і станцыямі Амстэрдам, Ротэрдам, Кёльн, Рурорт, Дортмунд і інш. Згодна з руска-прускай канвенцыяй аб прамых таварных зносінах 1866 г. да станцыі Гродна прымацоўваліся Лунна, Брэст, Бераставіца, Белавежа, Масты, Зэльвяны, Навагрудак. У красавіку 1867 адкрыліся прамыя зносіны паміж станцыямі Пецярбургска-Варшаўскай чыгункі і станцыямі Рэйнскіх чыгунак: Дзюрэн, Эшвеймер, Штольберг, Кобленц, Бінгербрук і інш. Амаль адначасова Гродна займела прамыя таварныя зносіны са станцыямі Паўночнай французскай чыгункі: Парыж, Гаўр, Ліль, Дзюнкірхен, Кале, Булонь і інш. У 1881 шлях з Пецярбурга да Варшавы займаў 35–36 гадзін. У складзе яго былі вагоны 1–3 класа. У вагоне 1 класа былі купэ па 8 чал. з мяккімі сядзеннямі, зашклёнымі вокнамі; у 2 класе ў купэ сядзела 10 чал., а ў 3 кл. былі звычайныя лавы і незашклёныя вокны. У 1886 была пабудаваная чыгунка Баранавічы – Слонім – Ваўкавыск – Гродна – Беласток. 1.05.1899 пачаў хадзіць цягнік Гродна – Сувалкі – Аліта, а калі апошнюю злучылі мастом з м. Пацяранцы (Пацяроніс), дык адкрылася магчымасць руху па вялікім паўколе Гродна – Аўгустаў – Сувалкі – Аліта – Артылерыя – Араны (Варэна). Абодва канцы паўкола далучаліся да чыгункі Пецярбург – Варшава. У 1907 адкрыўся рух па лініі Масты – Гродна, а з Пецярбурга ў Варшаву сталі хадзіць 2 пары хуткіх цягнікоў (22 гадз. 40 хв. і 23 гадз. 25 хв.), 1 пара пасажырскіх і 1 пара таварна-пасажырскіх цягнікоў. У часы *вайны Першай сусветнай мост чыгуначны* праз Нёман быў узарваны, і немцам прыйшлося пабудаваць часовы драўляны. З адыходам Гродна да Польшчы польская ўлада ў 1921 наладзіла рух па лініі *Ласосна* – Беласток, а затым – да Варшавы, прычым каляіна стала еўрапейская (шырыня 1435 мм). З аднаўленнем моста праз Нёман праз Гродна сталі хадзіць цягнікі на Вільню, Сувалкі, Земгале (Латвія). Прыгарадныя цягнікі ў 1929 адпраўляліся з Гродна ў Масты, Азёры, Друскенікі, Скідзель, Ваўкавыск. З 1934 адкрылася лінія Парэчча – Друскенікі. Напярэдадні *вайны Другой сусветнай* з Гродна цягнікі адпраўляліся на Варшаву, Вільню, Беласток, Сувалкі, Ваўкавыск, Баранавічы, Ліду, Азёры. Да вайны ўсе лініі перарабіць на каляіну 1435 не паспелі.

Падчас нямецкай акупацыі дзейнічала Кёнігсбергская чыгуначная дырэкцыя, якая наладзіла рух пасажырскіх і таварных цягнікоў у Гродна праз Алецка і Сувалкі. Пасля вайны на працягу 1944–45 былі адноўленыя чыгуначны вакзал, паравознае дэпо, будынак упраўлення чыгункі. У 1946 скончылася першая чарга будаўнічых прац на чыгуначным мосце, і ён адкрыўся для руху. У 1947 пачаў дзейнічаць гродзенскі чыгуначны тэхнікум і 3-гадовая школа машыністаў паравозаў. 1.04.1949 з Гродна ў свой першы рэйс адправіліся пасажырскія цягнікі на Мінск і Ленінград. У абодвух складах быў прамы вагон да Масквы. А 2.06.1947 станцыя Гродна стала міжнароднай – тут прайшоў першы цягнік Ленінград – Варшава. У 1965 цягнікі адпраўляліся ў Ваўкавыск, Друскінінкай, Парэчча, Баранавічы, Калугу, Маскву, Ленінград, Кузніцу. Чыгуначны *вакзал* звязаны з расійскімі імператарамі *Аляксандрам I і Мікалаем II*,

польскім кіраўніком *Ю. Пілсудскім,* падзеямі *паўстання 1863 г.* Ён таксама стаў адным з месцаў здымак мастацкага фільма "Міколка-паравоз".

Крын. і літ.: Бейлькин Х.Ю. Сельскохозяйственный рынок Белоруссии 1861–1914 гг. – Мн., 1989, с. 34–35; Всеобщий календарь на 1877 год. – СПб., 1876, с. 193–194; Саяпин В., История общественного транспорта Гродно. – Гродно: ЮрСаПринт, 2012. – С. 56–104; Klejn Z. O początkach linii kolejowej Warszawa-Białystok-Petersburg // "Rocznik Białostocki", № 7, 1967, s. 207–220; P. Jasienica. Dwie drogi. – Warszawa: Prószyński Media Sp. Z o.o., 2009. – S. 180.

Чучаловіч Станіслаў (31.07.1881 – ?) – маёр кавалерыі, удзельнік вайны савецка-польскай 1919–20, камандзір эскадрона гродзенскіх уланаў (пазней 23 уланскага палка). Удзельнічў у бітвах пад Крынкамі (22.09.1919), Слонімам (03.1919), у паходзе Войска Польскага з–пад Баранавіч да Бярэзіны. У міжваенны час служыў у Корпусе аховы памежжа. Узнагароджаны Крыжам Віртуці Мілітары 5 кл., 4 разы Крыжам Мужнасці, Крыжам Заслугі (срэбным і залатым).

Літ.: Bielski M. Relacja generałowej Alfredy Olszyny-Wilczyńskiej z wydarzeń wojennych z września 1939 R. na terenie dowództwa okręgu korpusu № III Grodno // Dzeje najnowsze. R. 23. – Wrocław. – 1991, №1. – S. 98.

Чэхаўскі Якуб Абрамовіч (30.12.1879, Гродна – 31.07.1941, Ленінград/Пецярбург) – вядомы барэц і атлет. Скончыў Гродзенскую мужчынскую *гімназію* (1889), служыў у *Гродзенскім гусарскім палку*. Віцэ-старшыня Усерасійскага з'езда барцоў-атлетаў (люты 1918). На пачатку 1920 кіраваў фізічнай падрыхтоўкай вайскоўцаў Петраградскай вайсковай акругі. Сурэдактар журнала "Барэц-атлет". Выступаў у барцоўскіх паядынках у цырках Расіі, Персіі, Германіі, Італіі, Аўстра-Венгрыі, на чэмпіянатах па французскай барацьбе. У 1913 атрымаў міжнародны ганаровы залаты пояс за рэкордны нумар: перанёс на адной руцэ 6 чал. Ягоны дэвіз: "Кожны чалавек можа і павінен быць моцным". Пры росце 180 см і вазе 125 кг кідаў 6 двухпудовых гір і лавіў іх сабе на грудзі, трымаў на "мосце" 10 чал., гнуў домабудаўнічую бэльку, прапускаў праз сябе грузавы аўтамабіль з 20 пасажырамі. Летам 1937 выступаў на Мінскім стадыёне "Дынама".

Літ.: Гусары Российской империи / сост. Н.Н. Малишевский. – Минск: Букмастер, 2012. – С. 155–156; Мядзведзеў М.Н. Чахаўскі Д.Я. "Асілак Якуба". – Мн., 1991; Попко И. Богатырь Якуба: Из циркача в силача // Вечерний Гродна. – 2005. – 5.01. – С. 8.

Ш

Шабека Вадзім Мікалаевіч (11.07.1864 – ?) – гродзенскі *губернатар* з 18.10.1913 да 17.02.1916. Сын сенатара і таварыша (намесніка) міністра ўнутраных спраў, камандзіра Асобнага корпуса жандараў, генерал-лейтэнанта М. І. Шабекі. Праваслаўны. Скончыў Пажскі корпус (1879–84) і Мікалаеўскую акадэмію Генеральнага штаба (1891–94). Вайсковую службу пачаў карнэтам Кавалергардскага Яе Вялікасці палка (14.08.1884). Пасля заканчэння акадэміі накіраваны ў Генеральны штаб і на службу ў Кіеўскую вайсковую акругу ў чыне штабс-ротмістра, з прыкамандзіраваннем на час лагерных збораў да С.-Пецярбургскай акругі. Тут і застаўся для далейшага праходжання службы. З 1896 па 1899 знаходзіўся ў распараджэнні расійскага ваеннага агента ў Канстанцінопалі. 28.10.1899 прызначаны ваенным агентам у Вашынгтоне, а 24.11.1901 – у Берліне. 14.10.1904 прызначаны на службу пры двары імператара германскага і караля прускага Вільгельма II. Указам Мікалая II ад 25.02.1913 прызначаны на пасаду саратаўскага віцэ-губернатара. 14.04.1913 стаў генерал-маёрам з залічэннем у світу імператара і армейскую кавалерыю.

Указам Мікалая II ад 15.10.1913 прызначаны на пасаду гродзенскага губернатара. Займаўся землеўладкаваннем адпаведна рэформе *П. Сталыпіна*. У першай палове 1914 прымаў удзел у падрыхтоўцы спісаў населёных пунктаў губерні, неабходных для правядзення Другога ўсеагульнага перапісу насельніцтва Расійскай імперыі ў 1915. Было ўнесена ў спіс 10 534 населеныя пункты. Праявіў сябе ў справе мабілізацыі войск перед *вайной Першай сусветнай:* ажыццявіў 5 збораў у 1914 і 3 – у 1915 (болей за 45 тыс. чал.), а таксама ў забеспячэнні арміі вопраткай і абуткам. Кантраляваў будаўніцтва *крэпасці гродзенскай*, пад'язных дарог да *фартоў*, мабілізоўваў насельніцтва на крапасныя працы. Прымаў бежанцаў Прывісленскага краю, а падчас набліжэння фронту займаўся эвакуацыяй насельніцтва, прадпрыемстваў, установ. Быў ганаровым чальцом Ваўкавыскага праваслаўнага Петрапаўлаўскага брацтва. Царскім указам ад 17.02.1916 прызначаны на пасаду маскоўскага граданачальніка.

Узнагароджаны 12 расійскімі і замежнымі ордэнамі, 4 замежнымі крыжамі, 4 медалямі і Знакам адрознення за працы па землеўладкаванні 6 мая 1913 г. (1915).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 25, с. 2952, а. 3; ф. 2, воп. 37, с. 1673, а. 9об.–10; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 138–141.

Шайкоўскі Лазар Рыгоравіч (1901, Гродна – ?) – удзельнік забастоўкі ў Гродне 8.01.1919 супраць нямецкіх уладаў. Выратаваў сцяг, пад якім адбывалася дэманстрацыя, і перадаў яго Чырвонай арміі падчас *вайны 1919–1920*. Сябра КПЗБ (1922–1928). Сакратар Гродзенскага, затым Брэсцкага гаркама КПЗБ. Кіраваў вайсковым аддзелам ЦК КПЗБ, дзе між іншым займаліся працай сярод салдатаў польскай арміі. У красавіку 1929 г. прайшоў працэс "35-ці", у выніку якога Ш. быў асуджаны да 15 год турэмнага зняволення строгага рэжыму. Восенню 1932 трапіў у СССР пасля абмену палітвязнямі паміж СССР і Польшчай. Вучыўся ў аспірантуры Камуністычнага ўніверсітэта нацыянальных меншасцяў Захаду ім. Мархлеўскага ў Маскве. У канцы лета 1935, яшчэ да заканчэння аспірантуры Ш. быў накіраваны на падпольную партыйную працу ў Заходнюю Беларусь. Але ў канцы 1935 у Вільні быў арыштаваны і прыгавораны да 8 год зняволення. На свабоду выйшаў у верасні 1939 г. У гады *вайны Вялікай Айчыннай* ваяваў на фронце, дзе быў паранены. Пасля вайны быў на кіроўнай савецкай працы. Узнагароджаны ордэнам "Знак почета" і медалямі.

Літ.: Тюремные университеты // Годы испытаний и мужества / Сост. Орехво Н. С., Сташкевич Н. С. – Мн.: Беларусь, 1973. – 416 с.

Шалкевіч Віктар Антонавіч (9.02.1959, м. Поразава Свіслацкага р-на) – беларускі артыст тэатра і кіно, бард. Пасля заканчэння тэатральнага факультэта Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1980) стаў працаваць акцёрам Гродзенскага абласнога драмтэатра (1980–81, 1983–87). У 1987–90 выкладаў у Гродзенскім культасветвучылішчы. З 1991 – акцёр Гродзенскага тэатра лялек. З 1987 выступае як бард у Беларусі, Польшчы, Расіі, Украіне, Літве і краінах далёкага замежжа. З 1994 – вядучы аукцыёнаў па продажы аб'ектаў камунальнай маёмасці ў розных беларускіх гарадах. Здымаўся ў фільмах Беларускай кінастудыі "Плач перапёлкі", "Мёд асы", "Слёзы блуднага сына", "Салодкае пекла кахання". Аўтар апавяданняў.

Літ.: Он такой один // Твой город Гродно. – 2019. – № 1 (47). – С. 4–7; Пяткевіч А.М. Людзі культуры з Гродзеншчыны: давед. / А.М. Пяткевіч. – Гродна: ГрДУ, 2000. – С. 326.

Шаматулы – прадстаўнікі гродзенскай эліты з роду мяшчан з вялікапольскага мястэчка Шаматулы. Першыя згадкі пра іх знаходзяцца ў дакументах 1540-х гадоў.

Пётр – гарадзенскі пісар (1541), войт (1555–56).

Якуб Шаматула-Сапінскі – райца (1659–66, 1669–70), бурмістр (1654, 1659).

Марцін Шаматула-Сапінскі – лаўнік (1661–70), райца (1672–73, 1682, 1689, 1691). Разам з Шыманам быў уладальнікам нерухомай маёмасці на ўсходнім баку вул. Віленскай.

Шыман Шаматула-Сапінскі – лаўнік (1664–65, 1667–68, 1671, 1674).

Літ.: Гардзееў Ю. Гарадскія эліты Гародні ў новы час / Ю. Гардзееў // Arche. – 2011. – № 6. – С. 353–354; Яцкевіч З., Урублеўскі В. Гарадзенскі магістрат у 1743–1767 гг.//

Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV – XX стст. / Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2012. – с. 65–66; Яцкевіч З., Уруб-леўскі В. Гарадзенскі магістрат у XVIII с. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаў-ныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. // Пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мн.: Зміцер Колас, 2011. – С. 107–110.

Шапавалаў Анатоль Дзмітрыевіч (12.07.1937, с. Пятроўскае Башмакаў-скага р-на Пензенскай вобл.) – беларускі архітэктар. Скончыў Пензенскі будаўнічы тэхнікум (1957) і інжынерны факультэт Сібірскага інжынерна-будаўнічага інстытута (1968). Удзельнік выставы Усесаюзных дасягненняў народнай гаспадаркі (1968). Дыпломны праект Ш. – універсальная спартыўная зала на 18 тыс. гледачоў, у 1969 была прадстаўленая на Усесаюзным конкурсе дыпломных праектаў, дзе атрымала дыплом 3 ступені. З 3.07.1969 стаў кіраў-ніком групы архітэктурна-канструктарскага аддзела Гродзенскіх праектных майстэрань Беларускага дзяржаўнага праекта. Ш. – аўтар прывязкі тыпавога праекта "ДК "Юнацтва", архітэктурнай часткі індывідуальнага праекта палі-тэхнічнага тэхнікума/каледжа, архітэктурнай часткі праектаў прывязкі школ, жылых дамоў, клубаў, праекта планіроўкі жылога раёна ў г. Лідзе, мікра-раёна "Прынёманскі" у Гродне (разам з І. М. Мазнічка). У 1973–74 Ш. быў галоўным архітэктарам "Белкамунпраекта". Затым пераехаў у Варонеж, дзе ў 1974 кіраваў групай у інстытуце "Варонежгрmaмадзянпраект", быў галоўным архітэктарам Варонежскай вобл. (1975–83, 1985–99), Варонежа (1983–85). З 1993 стаў кіраўніком творчай майстэрні і дацэнтам кафедры архітэктурнага праектавання і горадабудаўніцтва Варонежскага дзяржаўнага архітэктурна-будаўнічага ўніверсітэта (1993–2002).

Крыніца: https://vrnguide.ru/bio-dic/sh/shapovalov-anatolij-dmitrievich.html. Доступ 12.01.2022.

Шапіра Мойшэ Хаім (1902, Гродна – 1970, Ерусалім) – палітычны дзеяч. Атрымаў традыцыйную яўрэйскую адукацыю. У 1917 зарганізаваў у Гродне сіянісцкую маладзежную арганізацыю "Бнэй Цыён", у 1920 у Каўнасе – мала-дзёжную гр. "Цэірэй Мізрахі". У 1922–24 – у Польшчы, выкладчык і дырэктар рэлігійнай школы "Ахіэзер" у Вільні. У 1924–25 – у Германіі, вучыўся ў Вышэй-шай равінскай школе ў Берліне. З 1925 – член Цэнтр. Савета руху "Тора вэ Авода". З 1928 – чалец Савета партыі "Га-Поэль га-Мізрахі". У 1935–48 – нача-льнік аддзела рэпатрыяцыі Яўрэйскага агенства (Сохнут). У 1938 у Вене вёў перамовы з А. Эйхманам аб выездзе яўрэяў з далучанай да Германіі Аўстрыі. У 1948 – міністр па пытаннях рэпатрыяцыі і аховы здароўя часовага ўрада Ізраіля. У 1948–70 – міністр па справах рэпатрыяцыі, унутраных спраў, аховы здароўя, рэлігій, сацыяльнага забеспячэння. У 1956–70 – старшыня Сусвет-нага руху рэліг. *сіянізму*. У 1948–70 – дэпутат Кнесета. Дэлегат 14, 19, 22 сія-нісцкіх кангрэсаў.

Літ.: Российская Еврейская Энциклопедия. Т. 3. Биографии: С-Я., М., 1997. – С. 360.

Шарашэўскі Ёсель (Іосіф) Лейбавіч (каля 1839 – 1.12.1925, Варшава) – пецярбургскі 1-й гільдыі купец. У 1861 г. разам з Ф. Ш. Русотам стварыў *тытунёвую фабрыку* па вул. Маставой. У 1901 разам з Ландау меў мукамольны завод (працавала 18 м, даход 7 352 руб.) і тартак (15 м, 6 300 руб.). У 1910, 1923 жыў на вул. Замкавая, 12 (цяпер дом № 4) у асабістым доме. З 1884 тут знаходзілася гільзавая фабрыка Ісака Ёселевіча Ш., а ў 1924 – упраўленне акцыянернага таварыства Шарашэўскага і стайня на 10 коней. Шарашэўскі з'яўляўся сябрам праўлення таварыства дапамогі бедным *яўрэям,* у 1914–15 быў сябрам праўлення гродзенскай акругі імператарскага расійскага таварыства выратавання на водах. Калі немцы ў 1915 г. абклалі прадпрыемствы горада падаткам, фірма Ш. выплаціла палову сабраных грошай (100 тыс. марак). Памёр Ш. пасля доўгай і цяжкай хваробы. Пахаваны ў гродзенскай *сінагозе Вялікай* 3.12.1925. Магчыма, ягоным сынам быў Рыгор Ёселевіч Ш., які жыў на вул. Пясочнай у доме Буша і быў членам савета гродзенскай яўрэйскай бальніцы. Невядома, ці ягонымі сынамі былі ўладальнікі фабрыкі галантарэйных тавараў Саламон і Аўсей Шарашэўскія, якія пражывалі па вул. Купецкай/К. Маркса (мажліва, што на гэты дом ён купіў частку цэглы з разбуранага палаца Радзівілаў). Дачка Ганна з Шарашэўскіх Гелер у 1927 пабывала ў Гродне, пазнаёмілася са справамі Таварыства апекі здароўя і 15.05.1928 падпісала ў Варшаве даравальны акт, згодна з якім дом яе і сям'і ў Гродне па вул. Вітаўта, 12 пераходзіў Таварыству. Дом назвалі "Дом здароўя імя Ганны з Шарашэўскіх і Гірша, сужэнцаў Гелер".

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, оп. 25, д. 393, а. 120, 192, 193; ф. 1, оп. 9, д. 1429, л. 50 об.–54; AGAD, zesp. 354, d.18, syg. 318, k. 40; Памятная книжка Гродненской губернии на 1910 год. – Гродна, 1910. – С. 151; Адрес-Календарь и Справочная Книжка Гродненской губернии на 1914 год. – Гродна, 1913. – С. 76; Адрес-Календарь и Справочная Книжка Гродненской губернии на 1915 год. – Гродна, 1915. – С. 15; Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 49; Abramowicz Boris. In dinst der ideye fun gezunt-shuts un kinder-farzorgung: (10 yor "Toz" in Grodne) / B. Abramovitsh; hakdome A. Lipnik. – Grodno: Ł. Mejłachowicz, 1935. – S. V-VI, XXII-XXIII; Nałęcz-Dobrowolski M. Okrucieństwa Niemców na Kresach Wschodnich Polski. – Warszawa, 1918. – S. 31.

Шафранскі Мацвей (16.02.1909, Гродна – ?) – півавар. У 1930 г. прыехаў ва ўніверсітэт у Генце (Бельгія), каб навучыцца варыць піва. У 1933, з'яўляючыся інжынерам, пачаў працаваць піваварам у абацтве Святога Сікста. Тут ён прыдумаў свой сорт піва Westvleteren XII (1940). Пасля *вайны Другой сусветнай* да 1992 Ш. варыў яго ў камерцыйных аб'ёмах паводле ліцэнзіі пад гандлёвай маркай St. Sixtus Abdij Westvleteren у прыватным бровары St. Bernardus (у 10 км ад абацтва).

Лит.: Л. Михальчук. Пиво к рождеству // Сайт Белрынок, 25.12.2015.

Шахматы – гульня, у якую гуляла гродзенская эліта XII ст. Падчас археалагічных раскопак на Замкавай гары ў 1931 г. *Ядкоўскі Ю.* знайшоў шахматную

фігуру ў выглядзе ладдзі. М. Н. Варонін лічыў скульптурку ладдзі "фігурай багатага і высокамастацкага набора шахматнай гульні". 5-сантыметровая лодка-насада (даўжыня 55 мм, шырыня ў бартах 15 мм) вырабленая з светла-жоўтага каменя з серавата-зялёнымі пражылкамі на падстаўцы, у якой ёсць круглая адтуліна. Ладдзя мае круглыя адтуліны пад вёслы ў бартах і 4 фігуркі вайскоўцаў (2 каля бартоў, па 1 – на носе і карме). Барты ўпрыгожаныя трыма шчытамі "рускай формы" (міндалепадобныя). Даследчыкі высветлілі, што яна зробленая па прыкладзе рэальных ваенных рачных суднаў сярэдзіны XII ст., якія мелі 2 аднолькавыя насы, каб была магчымасць двухбаковага ходу і палубу, якая абараняла веславоў. Аднойчы была скрадзеная з Гродзенскага *гісторыка-археалагічнага музея*, дзе яна дэманстравалася. Праз пэўны час ладдзю знайшлі, і цяпер яна знаходзіцца ў музейных фондах. А жыхары горада і турысты могуць палюбавацца на помнік гэтай ладдзі. У 2016 г. гродзенскі скульптар У. Панцялееў з дарожных блокаў вырабіў ладдзю і паставіў яе на валун, знойдзены ў ваколіцах Гродна. Падчас рэстаўрацыі Старога замка ў 2018 была знойдзеная другая фігурка ладдзі.

Літ.: Воронин Н.Н. Древнее Гродно (по материалам археологических раскопок 1932–1949 гг.) // Материалы и исследования по археологии древнерусских городов. – М.: Изд-во АН СССР, 1954. – С. 75–76; Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыклапедыя. – Мн.: БелЭн, 1993. – С. 652; Павач А. Под крылом Коложи. Карманная история Гродно / А.А. Павач. – Гродно: ЮрСаПринт, 2014. – С. 14–15.



С. 914

Швейцарская даліна, знаходзіцца ў *парку гарадскім культуры і адпачынку* ўздоўж плыні ракі *Гараднічанкі.* У XIX ст. ахоплівала тэрыторыю ад моста на вул. Раскоша/Ажэшкі да моста Губернатарскага на плошчы Дварцовай/Леніна, а пасля рэканструкцыі 2005 г. – ад моста на вул. Леніна да моста на вул. Віленскай. Назва "швейцарская" увайшла ва ўжытак, верагодна, пасля таго, як *Орда Напалеон* у 1867 зрабіў замалёўку парку і рачной даліны і назваў яе швейцарскай. Рамантычная даліна са стромкімі тэрасамі і драўлянымі масткамі менавіта ў другой палове XIX ст. стала любімым месцам адпачынку моладзі і дарослых. У 1866 Ш. д. адгарадзілі ад вул. Раскошы і гарадской бальніцы плотам, збудавалі масткі праз Гараднічанку і яр у *садзе гарадскім.* У 1903 даліна з боку суч. вул. Ажэшкі атрымала каваную агароджу, зробленую кавалямі гродзенскага механічнага завода А. Васілеўскага, былі зробленыя новыя пешыя масткі праз Гараднічанку. У 1903 *Дума гарадская* перадала Ш. д. у арэнду гарадскому таварыству садаводаў. З 1894 па 1910 у доміку каля Ш. д. жыла пісьменніца *Ажэшка Э.*, якая бачыла яе праз вакно і з балкона мансарды свайго дома, любіла прагульвацца па пешых дарожках даліны і парку. У 1960-я гады на паплаўцы Ш. д. было месца для піянерскага вогнішча ў дзень народзінаў піянерыі (19.11), а трохі пазней збудавалі валейбольную пляцоўку з трыбунамі. Тут гулялі і дзіцячыя каманды, і зборная горада, былі сустрэчы зборнай Гродна са зборнай Беластока. Зімой дзеці любілі з'язджаць на санках з горак. Уздоўж даліны ішла алея ад пл. Леніна да вул. Ажэшкі, дзе стаялі стэнды з газетамі ("Правда", "Известия", "Труд", "Комсомольская правда", "Литературная

правда", "Советский спорт", "Советская Белоруссия", "Гродненская правда" ды інш.). На алеі знаходзілася кавярня "Лакомка". У 1970-я гады каля 250 м даліны ракі былі заключаныя ў бетонныя трубы ад моста Губернатарскага да вул. Віленскай. У 2005 была здзейсненая рэканструкцыя Ш. д. ад моста на вул. Леніна да моста на вул. Віленскай: зробленая агароджа ў межах гарадскога парку; збудаваныя бетонныя лесвіцы-спускі на тэрасы і да ракі з вул. Ажэшкі і з парку; перакінуты масток праз Гараднічанку з пешай дарожкай у верхнюю частку даліны; па беразе ракі пракладзеныя дарожкі; ля моста зроблены грот і на агляднай пляцоўцы – ніша. У верхняй частцы Ш. д. ад Ажэшкі да Леніна таксама адбыліся змены: зробленыя пешыя дарожкі ўздоўж ракі; праз яе зрабілі аблегчаны бетонны мост; абсталяваныя лесвіцы-спускі; левы бок даліны адмежаваны ад завулка Тэлеграфнага фігурнай агароджай. На вул. Віленскай пабудаваныя каскадныя вадаспады, пешыя дарожкі ўздоўж ракі. Ш. д. вечарам асвячаецца святлом 65 арыгінальных ліхтароў, ёсць падсветка дрэў, помнікаў, ракі.

Літ.: Иващенко Н.А. "Швейцарская долина": история и современность // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 158–164; Саяпин В. О парке Жилибера и зоопарке Кохановского. – Гродно: ЮрСаПринт, 2011. – С. 30, 37, 39.

Швед Вячаслаў Вітальевіч (7.10.1956, Гродна) – аўтар дадзенай кнігі. Пасля заканчэння гродзенскай школы № 6 у 1979 г. скончыў гістарычны факультэт БДУ, гістарычнае аддзяленне. У 1979–1983 гг. вучыўся ў завочнай аспірантуры БДУ, у 1995–1998 быў у дактарантуры БДУ. Уплыў на фармаванне навуковых поглядаў аказалі кандыдат гістарычных навук П. І. Краўчанка, доктар гістарычных навук, прафесар І. В. Аржэхоўскі, д. г. н., прафесар П. І. Брыгадзін, д. г. н., прафесар А.П. Грыцкевіч. У 1984 абараніў кандыдацкую дысертацыю "Гандаль у Беларусі ў перыяд крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін (30–50-я гады XIX ст.)" (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт М. П. Баранава), а ў 2001 абараніў доктарскую дысертацыю "Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.)". У 1979–1982 працаваў настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства ў Гарадзішчанскай СШ Баранавіцкага р-на Брэсцкай вобл. У 1982–1995, 1998–2001 і з 2005 па 2013 г. выкладаў на кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў Гродзенскага ўніверсітэта, з 2001 па 2005 г. – прарэктар па навуковай працы УА "Гродзенскі дзяржаўны абласны інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіроўных работнікаў і спецыялістаў адукацыі". З 1 верасня 2005 – прафесар кафедры гісторыі славянскіх дзяржаў ГрДУ, з сакавіка 2007 – прафесар кафедры беларускай культуры і рэгіянальнага турызму, выканаўца абавязкаў загадчыка кафедры, з сакавіка 2008 па 1 красавіка 2013 – загадчык гэтай кафедры. У 2013 быў звольнены з універсітэта за выданне кнігі *"Гроднаznаўства"* у Вроцлаве (Польшча). З 1.01.2016 працуе прафесарам Варшаўскага ўніверсітэта. Вобласць навуковых інтарэсаў: сацыяльна-эканамічнае развіццё Беларусі ў 1 пал. XIX ст., грамадска-палітычнае развіццё зямель Беларусі ў 1772–1863 гг., гісторыя Гродна

С. 915

і Гродзеншчыны (X–XX стст.), развіццё турызму ў Панямонні. Агульная колькасць публікацый на 1.01.2022 – 267 навуковых прац (з іх 23 брашуры, кнігі і манаграфіі), 9 навукова-метадычных і 8 аўтарскіх, творчых. Публікацыі, якія маюць гродзенскія матэрыялы паказваем ніжэй:

1. Кронон. Летопись города на Немане (1116–1990) – Гродно: НВК "Пергамент", 1993. – 320 с. (соавтор А. П. Гостев)
2. Торговля в Беларуси в период кризиса феодализма (1830–1850-е годы). – Гродно: ПКФ "Орбикс", 1995. – 195 с.
3. Беларускія старонкі гісторыі дзекабрыстаў. – Мн.: Бел. НДІДАС, 1998. – 132 с.
4. Kanał Augustowski. Szlak wodny Euroregionu Nieman. Praca zbiorowa / Pod. red. J. Kopciala. – Augustów-Suwałki, 2000. – 127 s. (у суаўтарстве)
5. Паміж Польшчай і Расіяй: Грамадска-палітычнае жыццё на землях Беларусі (1772–1863 гг.). – Гродна: ГрГУ, 2001. – 416 с.
6. Вольныя муляры ў беларускай гісторыі. Канец XVIII – пачатак XX ст./ Укл. і навук. рэд. А. Ф. Смалянчук. – Вільня: "Gudas", 2005 – 280 с. (у суаўтарстве).
7. Прынёманне. Гродзенская вобласць = Принеманье. Гродненская область. = Niemanland. Grodno region. Фотаальбом. – Мінск: Беларусь, 2005. – 247 с. (аўтар тэкстаў).
8. Заходні рэгіён Беларусі ў часы напалеонаўскіх войнаў. 1805–1815 гады. / В. Швед, С. Данскіх. – Гродна: ГрДУ імя Янкі Купалы, 2006. – 252 с.
9. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня), Мн.: ТАА "Альфакніга", 2017, 312 с.
10. Летапіс Гродна. 1005–1995. – Гродна: Юрсапрынт, 2020. – 324 с.
11. Historia Białorusi: od czasów najdawniejszych do roku 1991, UW, Warszawa 2020 (суаўтар Ю. Грыбоўскі). – 269 s.
12. Кірмашовы гандаль // Гісторыя рознічнага гандлю ў Беларусі. Т. 1. – Прага: Вясна, 2023. – С. 309–336.

Літ.: Выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы: біябібліягр. давед. / рэд. В.М. Чарапіца. – Гродна: ГрДУ, 1999; Прафесары Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. 1940–2010. – С. 119–121; Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Т. 6, кн. 2. – Мінск, 2003; Беларуская энцыклапедыя. Т. 17. – Мінск, 2003.



С. 916

"Школа" – рукапісны часопіс гродзенскіх гімназістаў сацыял-дэмакратаў, які выдаваўся па-руску ў 1905–1906 гг. У захаваным у Гродзенскім аддзеле Нацыянальнага гістарычнага архіва часопісе № 3 (8) за сакавік 1906 маецца 4 старонкі. На першай змешчаны намаляваны партрэт выкладчыка нямецкай мовы Юлія Іванавіча Марці, які памёр 2.03.1906 пасля хваробы. Пра гэта напісана на с. 2. На наступных старонках гаварылася пра тое, што выкладчык не быў чалавекам у футляры, не цураўся моладзі, разумеў яе. У канцы 4 с. пад тэкстам подпіс "Ред", ніжэй змешчаны малюнак лаўровага вянка, справа і злева ад якога – гімназічная фуражка, пад вянком – стужка з надпісам "педагогу-чалавеку". У самым нізе старонкі 4, у правым рагу ў коле напісана "Ц:ИК".

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 73.

Школа акушэрская мае пачатковую гісторыю з часоў *Тызенгаўза А.*, калі ў 1775–1781 гадах існавала *школа медычная*. У 1877 з дазволу *губернатара гродзенскага Зурава А. Е.* была адкрытая Ш. а. па просьбе губернскага ўрачэбнага інспектара А. Ф. Рэйпольскага. 9.04.1877 дырэктарам школы і загадчыкам створанага пры ёй радзільнага адзялення прызначаны *Кемарскі К. С.* Школа была разлічаная на 20 казённакоштных вучаніц, якія пасля заканчэння вучобы павінныя былі адпрацаваць тры гады на вёсцы і на неабмежаваную колькасць месц для тых, хто мог аплаціць за сваё навучанне. Вучаніцы ў асноўным набіраліся з сельскай мясцовасці ва ўзросце ад 18 да 30 год, яны павінныя былі умець чытаць і пісаць. У 1878 адбыўся першы выпуск акушэрак. У 1908, у сувязі з чарговай пагрозай распаўсюджання ў Гродзенскай губ. эпідэміі халеры, Кемарскі на базе Ш. а. зарганізаваў курсы па падрыхтоўцы санітараў. 15.09.1910 школа была ператвораная ў Цэнтральную акушэрска-фельчарскую, у якой рыхтавалі медыцынскія кадры сярэдняга звяна для Гродзенскай, Віленскай і Ковенскай губ. за кошт збораў гэтых губерняў. У сувязі з гэтым прыём у школу быў павялічаны да 60 месц, а тэрмін навучання – да 4 год. За перыяд з 1901 па 1914 з яе сцен выйшла каля 350 спецыялістаў. У сувязі з вайной Першай сусветнай Ш. а. была эвакуяваная 14.08.1915 у Калугу, дзе працягнула дзейнасць са студзеня 1916 і закончыла сваю працу 1.03.1919.

С. 917

Літ.: Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 237–238; Черепица В.Н, Гродненский православный некрополь, Гродно: ГрГУ, 2001. – С. 82

Школа балетная Тызенгаўза А., існавала ў Гродне ў 1774–1780 гг. у будынку на сённяшняй плошчы Тызенгаўза. Былі тут пакоі для рэпетыцый, апартамент для балетмайстра, пакоі гувернёраў, спальні і зал для “Collegium musicum”. Дзень пачынаўся ў пяць раніцы і заканчваўся каля дзевяці вечара. Вучоба працягвалася тры гады. Вучыліся ў школе хлопчыкі і дзяўчаты – дзеці “прыгожыя тварам” з маёнткаў Тызенгаўза (Ігумена, Пастаў, Літвян, Жэпіхава, Хатыніч, Быценя і вакольных вёсак).

Літ.: Музыкальный театр Беларусии. Дооктябрьский период. – Мн., 1990, с. 224–227; Bartnicka K., Początki szkolnictwa artystyczniego w Polsce w czasach panowania Stanisława Augusta Poniatowskiego. Rozprawy z dziejów oświaty, Wrocław 1966, t. IX, s. 57–58; Renikowa W., Tradycje teatralne Grodna // Wilno i kresy Północno-Wschodnie. T. II. Kultura i trwanie., Białystok 1906, s. 130

Школа беларуская. Першая ўзнікла дзякуючы *Луцкевічу А. і Ластоўскаму В.*, сябрам Беларускай школьнай камісіі ў Вільні (з 10.1915). Яны прыязджалі ў Гродна, сустракаліся з мясцовай інтэлігенцыяй. І вось у мурах былога праваслаўнага мужчынскага манастыра Барысаглебскага (раней жаночага кляштара бернардзінскага), дзе цяпер стаіць тэатр абласны

драматычны, пачала сваю дзейнасць у сакавіку 1916 Ш. Спачатку як пачатковая, але пазней рэарганізаваная ў пачатковую навучальную ўстанову павышанага тыпу з 4-гадовым тэрмінам навучання. Настаўнікамі сталі *Станішэўская Т.* і *Грыкоўскі А.*, Качынскі С., Краўцэвічанка В. На канец нямецкай акупацыі дзейнічала тры класы. Дзяцей было шмат у сувязі з вайной і бежанствам. Не хапала падручнікаў, пераследаваў холад і голад. Ш. дзейнічала прыкладна да 1921.

Другая беларуская школа існавала ў будынку былога Пушкінскага вучылішча (на сённяшняй вул. Леніна). Праз паўгода, восенню 1919 пераехала на вул. Палявую/Карбышава, 10, а затым – у былую Марыінскую *гімназію* (вул. Ажэшкі, 22). У 1922 Ш. была ўжо ў памяшканні па вул. Сапёрная, 6 (стары корпус гімназіі №10 па вул. Дзяржынскага). Апошні прытулак да закрыцця ў 1927 Ш. знайшла ў будынку па вул. Паўночнай/Валковіча, 1 (цяпер корпус сельскагаспадарчага універсітэта). Можа гэта была агульнагарадская беларуская школа, дырэктарам якой быў *Федарук У.*?

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск, 2008, с. 29; Мяцельскі А. у https://hrodna.life/articles/teklya-stanisheuskaya/ ; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні. З гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск, 2015, с. 18–19, 91, 97.

Школа будаўнічая, узнікла ў горадзе падчас правядзення рэформ *Тызенгаўза А.* Узначальваў яе архітэктар *Сака Ю.* У школе навучалі матэматыцы, архітэктурнай графіцы, каліграфіі, практычныя заняткі праходзілі ў сталярных майстэрнях (у зімовы час). У летнія гадзіны ў панядзелак, сераду і пятніцу вучні тры гадзіны аглядалі фабрычныя працы і працавалі на мурах, 1 гадзіну займаліся матэматыкай, 2 гадзіны – малюнкам; пасля абеду і адпачынку (1 гадзіна) – 1 гадзіна арыфметыкі, 1 гадзіна лекцыі па фармаванні характару, 2 гадзіны – архітэктурны малюнак, 1 гадзіна – матэматыка, 2 гадзіны – практычная праца на мурах; пасля вячэры – 1 гадзіна на агляд фабрычных працаў. У аўторак, чацвер і суботу адводзілася па 1 гадзіне на маляванне геаметрычных сітуацый, лекцыю па фармаванні характару, рэгістратуру (канцылярскую справу), 3 гадзіны – на архітэктурны малюнак. У зімовы час у сталярні 3 гадз. прысвячалі мадэляванню цяслярскіх будынкаў, днём былі заняткі па прадметах, якія былі і летам, а вечарам цягам 1 гадзіны аглядалі фабрычныя працы. Вучняў было 10–12, а выкладчыкаў – 4. У 1777 сярод вучняў былі: М. Арцімовіч, Ю. Баркоўскі, А. Барамоўскі, П. Вайтажэўскі, М. Габрыцкі, С. Герчынскі, Г. Занеўскі, Я. Мацкевіч, М. Стасюлевіч, С. Хазэйла, А. Ядусевіч. Заняткі праводзілі: па матэматыцы – паручнік Крэйц, па архітэктурным малюнку – харунжы Шайсердэкер, па ручным малюнку – кадэцкі унцер-афіцэр Людвіцкі, лекцыі па выхаванні характару і канцылярскай справе – аплікант канцылярыі Тартыла. Навучэнцы вучыліся будаваць жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Па нядзелях яны мелі абавязак выкладаць у нядзельнай школе для моладзі з мануфактураў і фабрык.

Крын. і літ.: AGAD, Arch. Tyzenhauza, sygn. D–3, k. 347, 350; Кітурка І. Антоній Тызенгаўз і развіццё адукацыі ў Гародні ў другой палове XVIII ст. – Arche. – 2010. – № 1–2; Маліноўская Т.Р. Тэндэнцыі развіцця архітэктуры Гродна напрыканцы XVIII ст. // Ігнат Анацэвіч: Жыццёвы шлях, педагагічная і навуковая спадчына. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 113.

Школа бухгалтарская, гандлёвая працавала ў 1775–85 падчас правядзення рэформ *Тызенгаўза А.* для падрыхтоўкі добрых афіцыялістаў.

Літ.: Кітурка І. Антоній Тызенгаўз і развіццё адукацыі ў Гародні ў другой палове XVIII ст. – Arche. – 2010. – № 1–2; Historia Polski. Kalendarium dziejów. 1655–1887, Kraków, 2010, s. 201.

Школа дамініканская, спачатку знаходзілася ў памяшканнях *кляштара дамініканцаў,* зараз на вул. Савецкай, 8. Будынак новай дамініканскай школы быў збудаваны пасля *пажару* 1782 г., падчас рэканструкцыі кляштара. Праект "афіцыны мураванай двухпавярховай, у якой размесціцца школа" склаў айцец Людвік Грынцэвіч у 1783. Упершыню будынак зафіксаваны на плане горада 1795, але ёсць звесткі пра заканчэнне будоўлі ў 1789 г. У 1793 *Станіслаў Аўгуст Панятоўскі* наведаў кабінет фізікі, дзе яму прадэманстравалі розныя прылады (прызмы, люнеты, мікраскопы, апарат для электрастатыкі) і паказалі фізічныя ды хімічныя вопыты. З 1797 школа стала называцца павятовай шляхецкай школай. У 1801 тут працавала шэсць настаўнікаў-шляхціцаў і выкладчык нямецкай мовы Д. Браўн, усе мелі духоўнае званне. Прэфектам школы быў Я. Стырпейка (1797–1803). У 1803 штат настаўнікаў складаўся з 9 чал., якія навучалі 160 вучняў, прэфектам быў настаўнік права М. Ждановіч. У 1804 школа мела бібліятэку (каля 10 500 тамоў), хімічную лабараторыю, некалькі вялікіх глобусаў, тэлескопы, калекцыі мінералаў, гербарыі, чучалы звяроў. У 1817 у школе навучаўся 301 вучань. У 1825 школа стала 4-класнай *гімназіяй дамініканскай.* Напрыканцы XVIII ст. у школе навучаўся будучы гісторык Анацэвіч І. З 1803 некалькі гадоў у школе выкладаў фізіку і матэматыку дамініканін *Фелікс Цяцерскі.*

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 286, 289; Маліноўская Т.Р. Тэндэнцыі развіцця архітэктуры Гродна напрыканцы XVIII ст. // Ігнат Анацэвіч: Жыццёвы шлях, педагагічная і навуковая спадчына. – Гродна: ГрДУ імя Я. Купалы, 2008. – С. 118, 119; Wyka E. Szkoła dominikanów w Grodnie, rok 1793 // Grodnae et orbi: гарадскія супольнасці ш гарадское асяроддзе XV – XX стст. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2018. – С. 110–121.

Школа евангеліцка-лютэранскай суполкі. 15 чэрвеня 1846 г. пры кірсе, дзякуючы старанням стацкага саветніка губернскага архітэктара *І. І. Міхаэліса,* які дабіўся ад куратара Беларускай навучальнай акругі дазволу, і на сродкі, завешчаныя сябрам савета сталяром Людвікам Шмікам, была адкрытая школа. 32 гады ўзначальваў яе настаўнік і арганіст Фрыдрых Берлін.

Пасля яго дырэктарам школы быў у 1878–1879 запрошаны з Варшавы арганіст Адам Часка. Калі ён з'ехаў на працу ў Маскву, яго замясціў Райнгольд Воле з Ліфляндыі. 25 сакавіка 1849 *пажар* знішчыў будынак школы і кватэры настаўнікаў. Для адраджэння школы Мітаўская кансісторыя дазволіла правесці збор сродкаў па ўсёй Расійскай імперыі сярод лютэранскіх суполак, а ваенны *губернатар* Гродна *Х. Ховен* – у гродзенскай суполцы. Школа была платная: кожны вучань уносіў паўтара рубля на год (па 15 кап. на месяц). З 1870 г. 5 бедных вучняў-лютэран змаглі атрымоўваць фінансавую дапамогу са сродкаў, завешчаных членам савета аптэкарам І. В. Адамовічам (75 руб. на год на ўсіх). Жудасны *пажар* 29–30 мая 1885 зліквідаваў будынак школы. 4 600 руб. са страхавога таварыства "Расія" і 1 500 руб., сабраных суполкай, дазволілі 20 жніўня 1886 аднавіць школу і заняткі. У сярэднім яе штогод наведвала каля 70 дзяцей, сярод якіх 20% складалі лютэране, 30% – каталікі, 50% – праваслаўныя. У школе працавалі настаўнікі рускай і нямецкай мовы, арыфметыкі, геаграфіі, спеваў, фізкультуры; службу вялі праваслаўны і каталіцкі святары, пастар. У канцы XIX – пачатку XX ст. у школе вучыліся 20 лютэран, 50 праваслаўных і 30 католікаў.

Крын. і літ.: Бягучы архіў Гродзенскага абласнога статупраўлення. – Вынікі раённай распрацоўкі матэрыялаў усесаюзнага перапісу насельніцтва 1989 г. Табл. с. 7–8, 9–10, 10–11; Миллер А.В. Не иссякнуть источнику // Гродзенская праўда. – 1993. – 28 кастрычніка. – С. 2.

Школа жаночая прафесійная, адкрытая ў 1921/1922 навучальным годзе пад кіраўніцтвам *Мацежы польскай школьнай*. Дырэктар С. Масціцка была накіраваная Міністэрствам рэлігійных вызнанняў і публічнай асветы. У 1930-х гадах школа атрымала статус вышэйшай прафесійнай жаночай школы. Заняткі праходзілі ў будынку па вул. Пілсудскага, 28. У школе арганізоўваліся таксама курсы кравецтва і майстэрства вытворчасці бялізны.

Літ.: Historia Polskiej Macierzy Szkolniej w Grodnie // Słowo Ojczyste. – 2011. – Nr 4 (128). – S. 10.

Школа землямераў/каморнікаў узнікла, верагодна, ужо ў 1765 г. падчас правядзення рэформ *Тызенгаўза А*. Узначальваў яе *Маркевіч Ю*. Мернікі і геадэзісты патрэбныя былі для адмежавання каралеўскіх зямель ад грамадзянскіх для вызначэння апошнім правільнага памеру чыншу; для будаўніцтва дарог і будынкаў. Працавала на ніжэйшым узроўні, чым кафедра практычнай геаметрыі ў Кракаўскай акадэміі, і рыхтавала спецыялістаў пераважна для эканамічных маёнткаў. Колькі існавала, невядома. Магчыма, скончыла існаванне, калі патрэба ў ёй адпала.

Літ.: Кітурка І. Антоні Тызенгаўз і Гарадзенская школа мернікаў: другая палова XVIII ст. / І. Кітурка // Гарадзенскі палімпсест. XII-XX стст.: матэрыялы міжнар. канф. – Горадня-Беласток: ІГДБ (ЕГУ). – 2008. – С. 105–110; Moroz M., Działalność Józefa Markiewicza w ekonomii grodzieńskiej za rządów Antoniego Tyzenhauza // Białostocczyzna. – 1998. – nr 1. – S. 15–35.

Школа кадэцкая (рыцарская школа, кадэцкі корпус). Упершыню згадваецца вясной 1773 г., калі віцэ-адміністратар гарадзенскай *эканоміі* А. Дзяржынскі пачынае шукаць з дзяцей шляхты ў навакольных вёсках (Вялікія Эйсыманты, *Ласосна*, Саламянка) "дзецюкоў для кадэтаў" ва ўзросце 12–15 гадоў. Адкрытая ў 1774. Агульная колькасць вучняў дасягала 20–30 чал. з беднай шляхты, якую ўтрымлівалі затым за кошт караля. Спачатку школа знаходзілася ў камяніцы Сангушкаў на *Рынку* (будынак на рагу сучаснай вул. Савецкай і пл. Савецкай). Напрыканцы 1770-х *Тызенгаўз* А. дамовіўся з Сангушкамі пра перанос корпуса ў іх палац па вул. Скаліманаўскай (зараз Гараднічанскай). Начальнікам школы быў увесь час інжынер-маёр Францішак Фройліх/Фрэйліх. У школе выкладалі геаграфію, алгебру, геаметрыю, малюнак, нямецкую і, пазней, французскую мовы, каліграфію, вучылі валодаць шабляй, палашом, мушкетам са штыком. Не забываліся пра муштру: парадак пастраення ў калоны і карэ, стральба і штыкавы бой. Пры навучанні магчыма выкарыстоўвалі ланкастарскі метад – старэйшыя вучні вучылі малодшых. Асобную групу складалі кадэты-стралкі, якіх мажліва набіралі з дзяцей вольных сялян Тызенгаўза (асочнікаў, баяр і стралкоў лясной службы). У 1792 школу перавялі ў Полацк (па інш. дадзеных – у Вільню). У 1799–1806 у Гродне працаваў Шклоўскі кадэцкі корпус (былое шляхецкае вучылішча, будучы 1-й маскоўскі кадэцкі корпус). Рэвізская сказка Гродна пачатку XIX ст. згадвае двух сыноў будаўніка Яна Макоўскага – Іосіфа і Антонія, якія там вучыліся.

Крын. і літ.: Рэвізская сказка Гродна пачатку XIX ст.// Гарадзенскі гадавік – 2024. – № 8. – С. 86; Галушко Ю., Колесников А. Школа Российского офицерства. Исторический справочник. – М.: Русский мир, 1993. – С. 52–54; Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 12. – Гродна, 2010. – С. 33–34; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 343; Historia Polski. Kalendarium dziejów. 1655–1887, Kraków, 2010, s. 196.

Школа медычная (Каралеўская медычная акадэмія), адкрытая ў 1777 г. *Тызенгаўзам А.* падчас рэформ. У 1775 у Гродна быў запрошаны прафесар *Жылібер Жан Эмануэль*, вядомы спецыяліст па ветэрынарыі і медыцыне, для адкрыцця ветэрынарнай школы (дзе вучні пазнавалі бы коней і іх хваробы, вучыліся бы правільнаму абыходжанню, кармленню і лячэнню коней). Пазней яна была пераквалiфікаваная ў лекарскую і хірургічную. Вучняў для Ш. м. збіралі у Шавельскай, Брэсцкай і *Гродзенскай эканоміі*. У 1778 г. 15 асобаў вывучалі хірургію, акушэрства, ветэрынарыю, прыродазнаўства і замежныя мовы. Вучні былі падзеленыя на два класы: шляхту вучылі на дыпламаваных гарадскіх лекараў, а астатніх так, каб яны маглі працаваць лекарамі і хірургамі на правінцыі (у тым жа 1778 другі вандроўнік праз Гродна падае дзве лічбы: 10 вучняў вучаць агульную медыцыну, а 20 – хірургію – магчыма, гэта якраз пра 2 класы). У сваіх заўвагах, пададзеных Тызенгаўзу ў 1777, прафесар Жылібер Ж. Э. піша, што трэба павялічыць сумы на вопратку і ежу для вучняў, бо 400–500 зл. не хапае на вопратку і абутак, дзеці палову года ходзяць амаль голымі, просіць, каб повар быў падпарадкаваны асабіста яму,

што такі кантроль палепшыць якасць ежы вучняў. У школе была добрая бібліятэка, якая налічвала каля 3 тыс. кніг. Швейцарскі вучоны *Бернулі Ё.* ў 1778 знайшоў сярод іх шмат каштоўных. Калекцыя кабінета натуральнай гісторыі мела каля 10 тыс. мінералаў, анатамічных, заалагічных і батанічных экспанатаў, фізічных і астранамічных інструментаў. Значная колькасць калекцыі раней належала князю М. Радзівілу, вял. гетману літоўскаму (або яго бібліятэкару палкоўніку Магніцкаму), ад якога набыў яе кароль. У фізічным кабінеце былі цікавыя машыны і канструкцыі, прыдатныя для школьных лекцыяў (назіраў за ім механік Бергер). Пры школе быў заснаваны *шпіталь* для лячэння працаўнікоў і адміністрацыі *мануфактур*. Адным з выкладчыкаў у школе быў Менард, які вучыў дзяцей латыні, французскай, добра рэдагаваў рукапісы перад іх друкам. Жылібер даваў яму добрую характарыстыку і прасіў Тызенгаўза пацвердзіць падпісаную з ім трохгадовую дамову.

Будынак школы, які спраектаваў архітэктар *Сака Дж.* у 1775–77, быў пабудаваны ў 1783 на *Гарадніцы,* у *садзе батанічным*. Унутры будынка быў доўгі калідор, па баках якога размяшчаліся класы, кабінеты, пакоі выкладчыкаў і дапаможныя памяшканні. Дзве бакавыя шасцівугольныя аўдыторыі выступаюць наперад, утвараючы па фасадзе гранёныя вежы. Будынак скончылі будаваць, калі сама школа ўжо была перанесеная ў Вільню. Пазней у будынку размясціўся *палац князёў Чацвярцінскіх*.

Крын. і літ.: AGAD, Arch. Tyzenhauza, sygn. D–3, k. 44–47; Игнатович Ф.И. Вклад учёных и воспитанников Гродненской медицинской академии в развитии медико-биологических наук в Белоруссии и Литве // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII –XIX стагоддзяў. матэр. навук.-практыч. канферэнцыі 11–12 траўня 1992 г. – Гродна-Белавічы: Б.в., 1992 – С. 27–31; Игнатович Ф.И. Гродненская медицинская академия: к 220-летию со дня основания / Ф.И. Игнатович // История медицины и здравоохранения Гродненщины: материалы науч. конф. – Гродно, 1995. – Ч. 2. – С. 33–34; Игнатович Ф.И. Ж.Э. Жилибер и Гродненская медицинская академия / Ф.И. Игнатович // Журнал Гродненского государственного медицинского университета. – 2011. – № 2. – С. 85–90; Мілінкевіч А. Гродзенская каралеўская медычная акадэмія / А. Мілінкевіч // Гарадзенскія запісы: старонкі гісторыі і культуры. – Гародня: ГрДУ, 1993. – Вып. 1. – С. 15–20; Трусов И. История строительства здания медицинской академии в Гродно на Городнице // Дзеячы аховы здароўя і медыцынскай навукі Беларусі і Літвы на пераломе XVIII – XIX стагоддзяў. матэр. навук.-практыч. канферэнцыі 11–12 траўня 1992 г. – Гродна-Белавічы: Б.в., 1992 – С. 23–26; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 334–335, 68, 878.

Школа музычная/музычна-тэатральная (1765–1780), адкрытая *Тызенгаўзам А.* падчас рэформ. Барочны будынак яе называецца “музычным флігелем”, “крывой афіцынай” і адносіцца да 2 паловы XVIII ст. На 1 і 2 паверхах былі невялікія залы для заняткаў; на мансардзе размяшчаўся інтэрнат для вучняў і жыллё для настаўнікаў. Архітэктура будынка складаная: аркі, пілястры, міжпаверхавыя пасы, фігурны ламаны дах. Школай кіраваў *Сітанскі Л.* Дзяцей з мяшчан і прыгонных сялян (ва ўзросце 8–10 гадоў) набіралі з маёнткаў

Тызенгаўза (Быхава, Жэпіхава, Ігумена/Чэрвеня, Літвян, Пастаў, Хатыніч) і вучылі граць на скрыпцы, фагоце, альце, квартвіёле, габоі, кларнеце, флейце, валторне, пузане, флатраверсе, клавікордзе. Настаўнікамі былі Баркоўскі Е., Бірон Ф., Пташынскі Д., Сітанскі Л., Тумін А., Швед С. Адпраўлялі вучняў таксама на навучанне ў магнацкія аркестры (Слонім, Нясвіж і інш.). Спяваць вучылі кампазітар Абатэ К., тэнар Кучбаіні і іншыя ўдзельнікі *капэлы* Тызенгаўза. Расклад заняткаў выглядаў наступным чынам: між 5 і 6 раніцы – пад'ём, упарадкаванне, малітва, сняданак; ад 6 да 12 і ад 13 да 19 – заняткі па арыфметыцы, пісьме, французскай мове, малюнку, танцам, нотнай грамаце, тэорыі музыкі, кампазіцыі, спевах, рукадзеллю; ад 12 да 13 – абед і кароткі адпачынак; 19–20 – вячэра, летам прагулка, а зімой кароткі адпачынак; 20–21 – малітва, адыход да сну. У канцы 1774 г. Тызенгаўз ужо планаваў выступленне капэлы і спевакоў. Будынак Ш. м. быў не толькі для заняткаў, але і для адкрытых выступленняў артыстаў. У 2 палове XIX ст. – 1 палове XX ст. будынак перабудавалі: мансардавы паверх стаў звычайным, арачная галерэя 1 паверха замураваная, зроблены балконы, зменена калідорная планіроўка. Цяпер тут жылы дом.

Крын. і літ.: AGAD, Arch. Tyzenhauza, sygn. D–4, k. 1–2, 4; Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Гродзенская вобласць. – Мінск, 1986. – С. 49–50, 70–71; Музыкальный театр Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн., 1990, с. 188–189; Чернякевич А. Н. Городница // Мінулае Гродзеншчыны. Вып. 12. – Гродна: ГАІУН, 2010. – С. 23–25; Чантурия В. А. История архитектуры Белоруссии. Дооктябрьский период. – Мн.: Вышэйшая школа, 1969. – С. 117–118; Mamontowicz-Łojek B. Tancerze króla Stanisława Augusta. 1774–1798. Początki polskiego baletu. – Warszawa: Rytm, 2005. – S. 42–43; Prośniak J. Grodzieńska Szkoła w czasach Tyzenhauza // Muzyka. – 1969. – nr. 2. – S. 93–100.

Школа польская. Пачыналася з патаемнага навучання па-польску ў расійскі час: *Ажэшка Э.* на паддашы свайго дома вучыла дзяцей польскай мове, літаратуры, геаграфіі і гісторыі. *Рэвалюцыя 1905–1907* гг. паспрыяла адкрыццю першай польскай школы. У доме Ажэшкі ў сакавіку 1905 адбылося веча польскай інтэлігенцыі, на якім быў складзены праект петыцыі аб арганізацыі польскай школы. 20.10.1908 г. Ажэшка ўдзельнічала ў адкрыцці польскай школы-інтэрната, дазволенага і зацверджанага ўладаю. Магчыма, яна паўстала пры ўдзеле ксяндза М. Руткоўскага, пробашча *касцёла францішканскага*. Т. Бохвіцу яна пісала: "Прашу цябе, ўяві, абшырны будынак, відны, чысты, акружаны навокал садам, а ў ім каля 150 дзяцей з найбяднейшых слаёў, малых ад 6 да 12 гадоў; і амаль усё польскае Гродна, панамі, панямі, ксяндзамі, прэзідэнтам горада – усім, што па-польскі жыве і гаворыць. (…) Вярнулася дамоў трохі змучаная тлумам, размовамі, уражаннямі, але з нейкай дзіўнай у глыбіні сэрца радасцю".

У перыяд 1919–39 у Гродне было 8 публічных дзяржаўных польскіх школ: № 1 імя А. Міцкевіча, мужчынская № 2 імя *Стэфана Баторыя*, жаночая № 3 бернардзінская пры *кляштары бернардзінак* пад апекай кс. *Курыловіча*, № 4, № 5 (некаторы час была беларускай), № 6 імя каралевы Ядвігі, № 7, якая знаходзілася за

Нёманам (тут выкладаў Глябовіч), № 8 імя *Пілсудскага* на вул. Базыльянскай. Тайнае навучанне па-польску адбывалася падчас *вайны Другой сусветнай*: пачалося ў 1942/43 навучальным годзе і было звязанае з польскім падполлем. Паводле звестак на 1.04.1945 у Гродне былі тры польскія школы: 1 сярэдняя, 2 сямігодкі (усяго 2 422 вучні). Але хутка 2 школы былі ператвораныя ў рускія. Звязана гэта было не толькі з адукацыйнай палітыкай, а і з перасяленнем палякаў у ПНР. У канцы 1945/46 навучальнага года ў польскай школе вучылася 1129 чал. Польская мова засталася толькі як прадмет выкладання, а ў 1948 польскае навучанне пачалі ліквідаваць. У 1997 г. на базе беларускай школы № 36 з польскай мовай навучання паўстала ў Гродне польская школа, дзякуючы намаганням мясцовай польскай грамадскасці, Саюза палякаў Беларусі і ўладаў Польшчы. Значную ролю ў яе стварэнні адыграў *Л. Скіндэр*. Знаходзіцца Ш. п. у раёне *Дзевятоўка*, на вул. Курчатава, 43. На адкрыцці школы прысутнічалі тагачасныя прэм'еры Беларусі і Польшчы – М. Чыгір і У. Цімашэвіч. Штогод у школе вучыцца каля 500 вучняў і працуе каля 70 выкладчыкаў. У 2021/2022 навуч. годзе у школе большасць прадметаў у першым класе выкладалася на беларускай і рускай мовах, а польская засталася для "паглыбленага навучання". "Сохраняя изучение языка, литературы, истории и культуры польского народа, в будущем мы будем планомерно переходить к изучению других предметов в средней школе № 36 на государственных языках", – паведамілі ў Гродзенскім гарвыканкаме.

Літ.: Ванда Р. // Зусім іншы горад/ Уклад. А.Вашкевіч, Т. Касатая. – Гродна, 2017. – С. 29; Швед В. Гарадзенскія памятныя месцы, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Элізы Ажэшкі // Albaruthenica. – 2018. – N 18. – S. 333–343; Poczobut-Odlanicki St. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok, 2015. – S. 194–196; Szumski J., Szkoła Polska w Grodnie 1939–1948: sowietyzacja, rusyfikacja, likwidacja // Шлях да ўзаемнасці=Droga ku wzajemności: матэрыялы X міжнар. наук. канф. / Пад рэд. І. Крэня – Гродна: ГАУПТ ""Градз. друк. 2004. – С. 281–287; Szumski J., Szkoła Polska w Grodnie 1939–1948 // Шлях да ўзаемнасці=Droga ku wzajemności: матэрыялы XII міжнар. наук. канф. / Пад рэд. С. Мусіенка, П. Скрабко – Гродна: ГрДУ, 2006. – С. 303–306; https://www.autoparus.by/publication/38323. Доступ 14.01.2022.

Школа райхсдойчэ, існавала з 1943 г. як прыватная ў будынку *кляштара дамініканцаў*. Аднакласная народная школа знаходзілася ў тым жа будынку, што і двухкласная народная *школа* для дзяцей *фольксдойчэ*. Вясной 1943 налічвала каля 25 вучняў. Агульнае кіраўніцтва школай ажыццяўляла фройляйн Сук, якая вяла таксама заняткі па чытанні і пісьме.

Крыніца і літ.: Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці, ф.1, воп. 1, спр. 58, а. 26; Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 288.

Школа рамесная імя Эліяша Брэхмана была пабудаваная з цэглы ў 1936 г. архітэктарам Н. Харціце ў стылі канструктывізма. Цяпер будынак знаходзіцца

па вул. Вялікая Траецкая, 4. У школе вучылі кавальству, слясарнай справе, механіцы. Дзяўчат навучалі кравецтву. Была магчымасць вучыцца і дарослым. Пасля *вайны Айчыннай* тут таксама была школа, а пазней уладкавалася лабараторыя *ўніверсітэта медычнага*.

Літ.: Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 182.

Школа фольксдойчэ, адкрытая 8.06.1942 у будынку, дзе раней размяшчалася *"Польская Мацеж Школьная"* на Таненбергштрасэ/Савецкая, 6, з мэтаю "трымаць дзяцей у полі зроку і імкнуцца выхоўваць іх у духу Германіі". Першапачаткова ў школу запісаліся 62 вучні бацькоў-фольксдойчэ (такіх налічвалася 72), якія па-нямецку размаўлялі дрэнна, і таму былі патрэбныя настаўнікі, якія ведалі б польскую і нямецкую мовы. З 62 дзяцей 39 раней навучаліся ў польскай школе (з іх склалі 1 і 2 класы), а 13 пайшлі ў школу ўпершыню (для іх быў арганізаваны пачатковы клас). Было 26 хлопчыкаў і 36 дзяўчат ва ўзросце ад 6 да 14 год. З іх 52 католікі, 6 грэка-праваслаўных і 4 евангельскай веры. Полькі Дамброўская і Нямчынава выкладалі адпаведна матэматыку і прыродазнаўства, руская Польнер – геаграфію, Азімінская – спевы, Заваліш – арыфметыку ў пачатковай школе, фольксдойчэ Алтынгер – права. Школьны дарадца Рыман лічыў: "школа фольксдойчэ павінная накіроўваць усю моц, каб павялічыць веды вучняў па нямецкай мове і тым самым садзейнічаць развіццю і выхаванню нямецкай нацыі (…). Звяртаць увагу на дзіцячую песню, маючы на ўвазе нямецкую нацыянал-сацыялістычную моладзевую песню. (…) Нямецкімі гульнямі запаўняць перапынкі. У школе фольксдойчэ не дазваляць выкарыстанне не нямецкай мовы. Класы абсталяваць партрэтамі фюрэра і яго паплечнікаў".

Крыніца і літ.: Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці, ф. 1, воп. 1, с. 58; с. 188; с. 572; Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў, 2012, с. 287–288.

Шміт Адольф Іванавіч – удзельнік *паўстання 1863 г.*, меў 28 гадоў, арандатар *аптэкі Адамовіча* ў Гродне, шляхціц з Аўгустоўскага ў. Прымаў удзел у антыўрадавых маніфестацыях у 1861 у Плоцку і таму знаходзіўся пад паліцэйскім наглядам да 5.04.1862. Магчыма таму пераехаў у Гродна разам з жонкаю і пасяліўся ў пакоі пры аптэцы. Арыштаваны 20 сакавіка 1863 за дапамогу паўстанцам медыцынскімі прэпаратамі (гімназістам, якія паспрабавалі выехаць у атрад Л. Нарбута). На следстве казаў, што кораб з лекамі быў прададзены незнаёмай асобе для лячэння сялян у сваім маёнтку некалькі тыдняў таму. 28.04.1863 быў вызвалены з-пад арышту пад паручальніцтва 2 добранадзейных асоб і пад нагляд паліцыі. А 9.06.1863 быў зноў затрыманы і дапытваўся гродзенскай ваенна-следчай камісіяй. 10.10.1863, паводле канфірмацыі камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі, быў пазбаўлены ўсіх правоў і маёмасці. Прыгавораны да ссылкі ў Сібір, 8.11.1863 г. адпраўлены ў Томскую губ. За ім паехала жонка.

Крын. і літ.: ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 933, а. 195, 243); Jodkowski. Rok 1863… // Echo Grodzieńskie. – 1921. – № 175. – S. 3; Игнатович Ф. Аптека провизора Адамовича и восстание 1863 г. // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. Вып. VII. – Гродна: Гродзенская бібліятэка, 2013. – С. 129–131.



С. 918

Шміт Ян/Ёган Хрысціян (1701, Каралявец/Кёнігсберг – 1759, Рэвель) – нямецкі скульптар-рэзчык, з сям'і скульптараў. З 1724 г. быў суддзёй у магістраце Рэвеля. Ажаніўся з дачкою майстра-сталяра К. Пеўкера. З вядомых яго прац можна назваць каменную скульптуру ў Святой Ліпце (1732), галоўны алтар касцёла Св. Крыжа ў Браневе (1738), скульптуру ў Фрэйдэнбургу (1745), мажліва, галоўны алтар у Шчучыне. Прыпісваюць яму алтары ў Арнэце, Блізаў, Асэтніку (Вусен), Мансдорфе. У Гродна прыехаў з Рэвеля (Усходняя Прусія). Разам з нямецкімі майстрамі зрабіў у 1736–1737 гг. разны драўляны алтар для *касцёла езуіцкага* ў Гродне. Гэта самы выдатны яго твор у стылі барока. У зноўдзеным кантракце касцёла са скульптарам (14.12.1736) былі агавораныя: час працы (ад 29.09.1736 да 31.07.1737), працаўнікі (6 памочнікаў і хлопец), дэталёвая ікаграфічная праграма. Скульптуры Св. Францішка Ксаверыя і Хрыста былі дастаўленыя разам з інструментамі з Рэвеля, астатнія скульптуры выразаліся ў Гродне. Трэба было так змантаваць скульптуры, каб можна было іх здымаць для пазалочвання ці іншых патрэб.

Літ.: Gorszkowoż O., Jaroszewicz A. Ołtarz kościoła farnego w Grodnie // Kultura artystyczna Wielkiego Księstwa Litewskiego w epoce baroku. – Warszawa: Instytut kultury, 1995. – S.84; Smoliński M., Rzeźbiarz Jan Chrystian Schmidt: rola Warmii jako prowincji artystycznej w XVIII wieku, Olsztyn 2006, s. 45–48, 122–126.

Шпеер Іван Абрамавіч (1805–1869) – гродзенскі грамадзянскі губернатар з 16.05.1856 да 13.09.1861. З дваран, яўрэй, праваслаўны. Вучыўся ў Нарвскім кадэцскім корпусе (з 26.03.1814) і пасля яго заканчэння служыў на флоце (да звальнення ў 12.12.1832). Затым быў паліцмайстрам марскога кадэцкага корпуса (16.02.1833 – 16.12.1840); інспектарам над выхаванцамі Маскоўскай медычна-хірургічнай Акадэміі (13.12.1840 – 14.10.1842). У 1842–1845 працаваў тут старэйшым дарадцам па будаўніцтве. Далей меў пасады дырэктара Маскоўскай 2-й гімназіі (27.01.1846), інспектара над студэнтамі Маскоўскага ўніверсітэта (8.04.1848) і дырэктара вучылішч Маскоўскай губ. (1853).

Указам Аляксандра II ад 4.05.1856 быў прызначаны на пасаду гродзенскага губернатара, на якую ўступіў 1.07.1856 у чыне сапраўднага стацкага дарадцы. У 1857 безвынікова хадайнічаў у МУС аб пераносе Ганненскага кірмашу з Зэльвы ў Гродна. У 1858 хадайнічаў перад літоўскім і віленскім мітрапалітам Сямашкам аб дапамозе для аднаўлення ў губерні праваслаўных храмаў (выдаць кожнай са 142 цэркваў па 500 руб.). У 1860 атрымаў "монаршее благоволение" за паспяховы збор падаткаў у 1859. Аб дзеяннях Ш. напярэдадні і падчас *паўстання 1863–1864 гг.* гісторык *Я. Ф. Арлоўскі* пісаў "(…) дело доходило до того, что уличные манифестанты, образовавшие значительную толпу, подходили к губернаторскому дому, пели там патриотические гимны и разражались

потоком брани по адресу правительства". Гісторык *Ю. Ю. Ядкоўскі* адзначаў, што Ш. быў "чалавекам баязлівым і слабавольным, відаць, неяк спачуваючы польскай справе". Верагодна, за недастаткова рашучыя дзеянні ён і быў зняты з пасады. 2.10.1861 вакольным шляхам Ш. патаемна пакідаў Гродна ў карэце земскага спраўніка Магнуса, а яго экіпаж, з паліцэйскім служачым унутры, патрыятычныя асобы ля *карчмы* Пагулянка закідалі пяском і камянямі. У С.-Пецябургскім гістарычным архіве захоўваецца рапарт, складзены ў 1859 чыноўнікам С. С. Калошыным аб службовых злоўжываннях Ш. і віцэ-губернатара Ражнова.

Узнагароджаны 7 ордэнамі, 3 медалямі, знакамі за XX (1839) і XXX гадоў (1848) беззаганнай службы.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 645, а. 1–1 адв.; Орловский Е.Ф. Судьбы православия в связи с историей латинства и унии в Гродненской губернии в Х1Х ст. (1794–1900). – Гродненские епархиальные ведомости. – 1901. – № 22. – с. 176; Орловский Е.Ф. Гродненская старина. – Ч. 1. – Гродно, 1910; Славутинский С.Т. Город Гродно и Гродненская губерния во время последнего польского мятежа (Отрывок из воспоминаний) // Исторический вестник. – Т. 37. – СПб., 1889. – с. 65; Jodkowski J. Rok 1863 w powiecie Grodzieńskim // Echo Grodzieńskie. – Grodno, 1921. – № 28.

Шпіталь вайсковы па вул. Дзяржынскага, 17, пабудаваны ў 1895 г. паводле праекта вайсковага інжынера, генерал-маёра Штальмана. На цэглах сцяны з боку Дзяржынскага гродзенскія краязнаўцы знайшлі надпісы салдат-вартаўнікоў з розных часоў і эпох (расійскай, польскай і савецкай): "Рядовой Іван Ніть, 1893", "jefrejtor Bolek z Gdyni, 1931", "Józef Szafranski, 1934", "1942. Содыков А. П.".

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 37–38.

Шпіталь гарадскі. Створаны 11.10.1829, перайменаваны ў акруговую бальніцу 16.04.1837. Першапачаткова знаходзіўся ў двухпавярховым цагляным будынку бровара (на сённяшняй вул. Ажэшкі, 9), падараваным баніфратрам у 1808 г. расійскім царом *Аляксандрам I*. Пасля ліквідацыі ордэна будынак быў перададзены прыказу грамадскай апекі. У 1857, пад наглядам губернскага архітэктара *Міхаэліса У.*, купец *Фрумкін Я.* адрэмантаваў і перабудаваў будынак і здаў яго ў арэнду на 30 гадоў пад акруговую бальніцу. Калі яе ўзначаліў Беклямішаў М. Д., пачалося будаўніцтва шпітальнага гарадка на сённяшняй вул. Дзяржынскага (тут нядаўна яшчэ знаходзіўся гродзенскі памежны атрад). Асобныя карпусы мелі тэрапеўтычнае, хірургічнае, інфекцыйнае, венерычнае аддзяленні. Была свая аптэка, бактэрыялагічны кабінет. Будаўнічымі, гаспадарчымі і фінансавымі пытаннямі займалася спецыяльная Рада. Бальніца была ў сістэме МУС і падпарадкоўвалася Гродзенскаму прыказу грамадскай апекі. Фінансавыя справаздачы дасылаліся ў Кантрольную палату. З пачаткам *вайны Першай сусветнай* персанал установы быў эвакуяваны ў Калужскую губ., а ў будынках размясціўся 221 палявы запасны шпіталь.

Літ.: Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 14; Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно. Путеводитель. – Гродно: Гродненская типография, 2016. – С. 243; Ситкевич С.А., Гончарук В.В. История Гродно в вопросах и ответах. – Гродно: ГрГМУ, 2013. – С. 37–38; Чернякевич А. "Новый Свет" и его окрестности / А. Чернякевич при участии И. Трусова. – Минск: Лимариус, 2009. – С. 64–65.

Шпіталь пры касцёле Святога Духа. Шпіталь/прытулак для 24 убогіх існаваў з часоў каралевы *Боны*. У 1553 г. яна падаравала яму тры возеры, а віленскі біскуп у 1786 – каменныя двухпавярховыя будынкі. У 1800 рашэннем Шпітальнай камісіі Віленскага губернскага праўлення валоданне шпіталем Св. Духа было перададзенае гродзенскім уладам. Домам грамадскай апекі, размеркаваным там, апекавалася гродзенскае *таварыства дабрачыннасці*. У 1816 расійскі імператар *Аляксандр I* аглядзеў шпіталь (у той час у ім было каля 100 чал.) і ахвяраваў яму 10 тыс. руб. Дапамагала яму і віленскае дабрачыннае таварыства. У канцы 1820-х жыхарам Ш. аб'явілі, што больш карміць іх не будуць, бо няма грошай. Значная частка іх разыйшлася, але ў 1854 заставалася 56 чал. Пасля паўстання 1863–1864 гг. будынак быў канфіскаваны і прададзены купцу А. Тарлоўскаму. Пасля *пажару* 1885 ён перапрадаў будынкі купцу І. Хозэ. Сыны апошняга ў 1890-х гадах адкрылі гатэль "Славянскі" на 25 нумароў. А яшчэ тут размясціліся: шэраг крамаў, кравецкая майстэрня, цырульня, пякарня, "скоропечатня" С. Ган. У міжваенны час уладальнікамі будынкаў былі С. Хозэ, Ф. Назарка, Х. Фрухт. Тут знаходзіліся сталоўка "Cynke", гатэль, Польскі крэсовы банк, крама слодычаў. Немцы падчас *вайны Другой сусветнай* зарганізавалі ў будынку вайсковы пансіянат "Стары сябра".

Літ.: Вашкевіч А. і інш. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы. – Гародня, Вроцлаў: "Гарадзенская бібліятэка", 2012. – С. 294–295; Квитницкая К.Д. Малоизвестные зальные сооружения Белоруссии конца XV – XVI в. – Архитектурное наследство. – № 16, Москва 1967. – С. 5.

Шпіталь пры касцёле Фарным. Невядома, з якога часу дзейнічаў, але ў другой палове XVIII ст. знаходзіўся на прыкасцельных могілках. Будынак меў адзін пакой з каморай і сянямі. Існаваў яшчэ ў 1793, і там жылі ўбогія касцельныя служкі.

Літ.: Гардзееў Ю. Гродзенскі рынак у XVI-XVIII ст. (праблемы сацыятапаграфічнага развіцця) / Ю. Гардзееў // Краязнаўчыя запіскі. – 2000. – № 5. – С. 103–104.

Шпіталі яўрэйскія. Адзін з іх быў пабудаваны ў 1908 г. на вул. Баніфратарскай/Свярдлова, 3. Будынак захаваўся да сённяшніх дзён, яшчэ нядаўна быў узорам эклектыкі з элементамі мадэрна і ўнікальнымі для нашага горада гіпсавымі аконнымі ліштвамі па цаглянай неатынкаванай паверхні фасада. У будынку таксама знаходзіўся прытулак для старых, пазней – медычнае вучылішча, жаночая кансультацыя, зубапратэзная майстэрня.

Яўрэйская грамадская бальніца першапачаткова месцілася ў раёне *рынку Нямецкага*, але ў 1866 было прынятае рашэнне аб будаўніцтве новага будынка на сённяшняй вул. Будзёнага, 2 (чыгуначны шпіталь). Ш. паўстаў у 1868–71 і быў разлічаны на 60 ложкаў. Меў у Друскеніках прытулак і аддзяленне для лячэння мінеральнымі водамі хранічных хворых. З 1857 па 1882 старшынёй праўлення Ш. быў купец Б. Ашкеназі, які дапамагаў яму значнымі ўласнымі сродкамі. У 1890-х гадах мелася тры аддзяленні: хірургічнае, унутраных хвароб і інфекцыйнае. У штаце было 2 урачы і некалькі фельчараў, да амбулаторных хворых, 2 разы на тыдзень прыходзіў урач з вайсковай бальніцы. З 1914 фінансаваў Ш. купец Г. Ліўшыц, старшыня праўлення. У 1915–18 пасля эвакуацыі Ш. у яго памяшканнях дзейнічала агульнагарадская бальніца. З 1919 Ш. зноў стаў яўрэйскім. Тут працавалі ўрачы А. і Ю. Ліпнікі, Н. Нэйман, М. Фінкель. Вясной 1920 Ш. ператварыўся ў вайсковы, і з прыходам Польскага войска ўся маёмасць яго была рэквізаваная. Дапамогу Ш. аказала амерыканская місія Чырвонага Крыжа: грашыма, лекамі, бялізнай, перавязачнымі матэрыяламі. З восені 1939 Ш. стаў 3 гарадской бальніцай.

Літ.: Баціс М., Буцько У., Крапівіна Н. і інш. Гародня: сляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні // ARCHE. – 2010. – № 6. – С. 372–374; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 25–26; Вашкевіч А. Біяграфія гарадзенскіх вуліц: ад Фартоў да Каложы / аўт.: А. Вашкевіч [і інш.]. – Гародня–Wrocław: Гарадз. б-ка, 2012. – С. 330.

Шрэтэр Ян/Іаган (? – 20.02.1685) – мастак нямецкага паходжання, жыў у Гданьску, аўтар абразоў у *касцёле Брыгіцкім*. У Гродне быў у 1646 г. Яго абразы Дабравешчанне, Св. Брыгіта, Св. Ганна, Беззаганнае зачацце Дзевы Марыі і інш. знаходзяцца ў галоўным алтары.

Літ.: Jodkowski J. Nieznane prace J. Szrettera i O. F. Lekszyckiego // Buletyn historii i sztuki. – 1948. – nr 1, s. 56–64.

Штарк Ян Антонавіч (1822, Каменец Літоўскі – ?) – паўстанец 1863, дваранін, вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, чыноўнік губернскага праўлення, калежскі асэсар, 12 год быў рэдактарам "Гродненских губернских ведомостей" і кіраваў губернскай друкарняй. У 1862 г. быў звольнены са службы "заўважаны ў нядобранадзейнасці і падазронасці ў друкаванні ўзбуджальных брашур". Сярод апошніх была, паводле паказанняў Адама Баяроўскага, *"Мужыцкая праўда"*. Ш. казаў, што "калі быў я наглядальнікам друкарні, знайшлося меркаванне, што друкую бунтоўныя брашуры. Усё можа быць, але для гэтага рэдактара газеты патрэбны прэсар і наборшчык, а я не майстар да гэтага механізма". У 1863 зноў западозраны ва ўдзеле ў паўстанцкай арганізацыі. На следстве супраць яго даў паказанні А. Талочка: "ён іграў нейкую ролю ў арганізацыі", а Геніюш удакладніў, што той выкарыстоўваўся для "раз'ездаў і перадачы даручэнняў". На думку *Э. Заблоцкага* Ш. быў звязаны з першым камісарам па Літве Дзюларанам і потым у Брэсце знаходзіўся пры ваяводзе *Гафмайстры*. Штарк

быў у кантактах з цывільным паўстанцкім урадам Гродзенскага ваяводства і паводле яго распараджэння раз'язджаў па Гродзенскай губ. Першы раз быў арыштываны ў жніўні ці пачатку верасня 1863 за пражыванне без пашпарта ваенным начальнікам Бельска Барэйшам. Адпушчаны, пражываў у Нараве Бельскага ў., але 8.08.1864 г. зноў быў арыштаваны і пасаджаны ў гродзенскую *турму*. Прыгавораны на жыхарства ў Томскую губ. пад строгі нагляд паліцыі.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1., воп. 34, с. 2887, а. 65; ф. 3, воп. 3, с. 1, а. 414, 564 адв.; с. 2, а. 85; с. 1, а. 103 адв.; воп. 1, с. 40, а. 38 адв., 46; ф. 1., воп. 13, с. 1399, а. 158 адв.; ЛДГА, ф. 1248, с. 1240, а. 2, 7, 30 а–36, 89 адв.; с. 917, т.1, а. 34; с.1240, а. 72; Кіселеў. З думаю с. 34; Jodkowski J. Rok 1863 w powiecie Grodzieńskim // Echo Grodzieńskie. – 1921. – № 175.

Штрытэр Аляксандр Э. – сакратар Гродзенскага *камітэта статыстычнага* (1891–93). Выдаў у 1889 г. "Топографические известия о городищах и курганах в Гродненской губернии". Быў рэдактарам "Памятных книг Гродненской губернии" на 1891, 1892, 1893 гг.

Літ.: Грядовкина И.В. Структура и содержатеьный аспект Памятных книжек Гродненской губернии// http://infobelarus.nlb.by/7n_4150cd/data/menu/5.pdf. Доступ 10.01.2021.

Штуман Ілля Арыямавіч – адзін з першых гродзенскіх фотамайстроў. Дазвол на адкрыццё майстэрні атрымаў 17 лютага 1864 г. (ст. ст.), аднак яго працы вядомыя з 1860, калі, відаць, і пачынаецца гісторыя гродзенскай фатаграфіі.

Шульнер-Дамбравіцкі Гірш Абрамавіч – мешчанін, гродзенскі фотамайстар. Дазвол на адкрыццё майстэрні атрымаў 28 лютага 1892 г. (ст. ст). Вядомы да 1915 г. Фотамайстэрня знаходзілася спачатку на вул. Купецкай ў доме Вільнера, а затым – па вул. Саборнай (Савецкай).

Шумаў Пётр (25.03.1872, Гродна – пасля 1933, Лодзь?) – расійскі рэвалюцыянер, арганізатар сацыялістычнага руху ў Гродне (1885). Скончыў тут *гімназію*, у 1892 паступіў у пецярбургскі Тэхналагічны інстытут. Падчас вучобы звязаўся з рускім рэвалюцыйным рухам, пазнаёміўся з польскімі рэвалюцыянерамі (братамі Яркоўскімі). З 1893 у ППС, да 1906 кіраваў гродзенскай арганізацыяй, дапамагаў рабочым гурткам. Быў за незалежнасць Літвы і Польшчы. Чатыры разы сядзеў у *турме гродзенскай*. У лістападзе 1907 разам з жонкай выехаў у эміграцыю, пасяліўся ў Парыжы. Адкрыў на Манпарнасе свой фатаграфічны салон. *Л. Бакст* увёў Ш. у артыстычнае асяроддзе Парыжа. У 1920-я ён фатаграфаваў выдатных мастакоў, кампазітараў, пісьменнікаў, паэтаў, балерын, палітыкаў, навукоўцаў: М. Шагала, Л. Бакста, У. Маякоўскага, А. Дункан, М. Цвятаеву, А. Эйнштэйна, К. Манэ, А. Керанскага, Ф. Шаляпіна і інш. Ш. стаў асабістым фатографам Агюста Радэна. У фондах гродзенскага *Музея гісторыка-археалагічнага* ёсць фатаграфіі Радэна, захавальніка Люксембургскага музея Л. Бенедзіт, брытанскага паітычнага дзеяча

Д. Г. Макдональда. У 1933 г. Ш. прыехаў у Польшчу, пасяліўся ў Лодзі. Быў адзначаны Крыжам Незалежнасці.

Літ. і крыніцы: Гостев А.П., Известные личности Гродно. – Гродно, 2016. – С. 147–156; Szuszkiewicz B. Organizacja Grodzieńska P.P.S. 1898–1910. – Warszawa, 1937. – C. 9–11; Pankiewicz M. Biebrza-Amazonka-Wisła. Wspomnienia z lat 1877–1945// rękopis w Ossolineum, Wrocław, z. 15612, k. 10109–10112.

Шчасны Іван Андрэевіч (1925, в. Чарлёна Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл. – 13.09.1942) – адзін з арганізатараў і кіраўнік камсамольска-моладзевага падполля ў гады *вайны Вялікай Айчыннай* на тэрыторыі Гродзеншчыны. Вучыўся ў Гродзенскім рамесным вучылішчы № 8. Адзін з кіраўнікоў Скідзельскага камсамольскага подполля (з верасня 1941). Быў партызанскім сувязным. Удзельнічаў у пагроме варожага гарнізона ў в. Азёры Гродзенскага р-на. 4.09.1942 Ш. быў захоплены фашыстамі і пасля катаванняў 13.09.1942 забіты. Пахаваны пад Скідзелем. У Гродне ёсць вуліца яго імя, дзве мемарыяльныя дошкі: вул. Шчаснага, 38 і вул. Вялікая Траецкая, 4. Імя Ш. запісанае ў "Кнігу Народнай Славы" Гродзенскага р-на.

Шыбеніца, упершыню згадваецца ў прывілеі на магдэбургскае права 1496 г. Стаяла на краі горада за каралеўскімі стайнямі (Н. Сліж: "прыкладна сёння гэта месца, дзе стаіць касцёл і кляштар бернардзінцаў"; А. Павач: "недзе ў раёне дарогі на Скідзель, каля сучаснага галоўнага выезда з Гродна"). Уяўляла сабой канструкцыю шасцівугольнай формы, што дазваляла пры неабходнасці караць адначасова 6 злачынцаў. Выяву можна паглядзець на *гравюры Адэльгаўзера-Цюнта.*

Літ.: Павач А. Гродзенскія гісторыі. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2019. – С. 34–35; Сліж Н., Гравюра Гародні Адэльгаўзера-Цюнта 1567–1568 гг. як адлюстраванне міжнародных падзей на фоне гарадскога жыцця // Arche. – 2017. – № 2 (152). – С. 62–63.

Шыдлоўскі Аляксандр Канстанцінавіч (18.06.1911, в. Мінкі Смаргонскага р-на – 26.09.2002) – дзеяч самадзейнага мастацтва, кампазітар, педагог. Удзельнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі: чалец Грамады беларускай сялянска-работніцкай, камуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі, галоўнай управы Таварыства беларускай школы. Неаднойчы быў арыштаваны (1931–1936, 1937). Чалец Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (з 1932). Артыст Беларускага ансамбля песні і танца (з 1940). Закончыў БДУ (1950). Настаўнік сярэдняй школы № 10 г. Гродна (1951). Дырэктар Гродзенскага абласнога дома народнай творчасці (1960–1971). Заслужаны дзеяч культуры БССР (1960). Аўтар песень "Беларусь Савецкая", "Колькі ў небе зор" і інш. Асобным зборнікам выдадзеныя 35 песень (1964).

Літ.: Островцов С. Яркая судьба // Гродненская правда. – 1988. – 1.05. – С. 4.

Шылава Ірына Алегаўна (нарадз. 22.02.1960, Гродна) – чэмпіёнка Сеульскай алімпіяды па кулявой стральбе з вінтоўкі (18.09.1988) і 45-га чэмпіянату свету

ў Маскве (жнівень 1990). Двухразовая чэмпіёнка СССР (трэнер В. П. Авілаў). Удзельніца алімпійскіх гульняў у Барселоне (1992) – 19 месца, у Атланце – 9 і 17 месцы, у Сіднеі – 20–21 месца. Бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы (Брно, 1993). 5-разовая чэмпіёнка СССР. Шматразовая чэмпіёнка і рэкардсменка Беларусі.

Літ.: Попко И.Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Мн., 2003. – С. 41, 52, 80–84.

Шыманскі Марцэлі Тамашавіч (каля 1810, Гродна – ?) – паўстанец 1830–31 гг., эмісар польскай эміграцыі ў Парыжы. З пачаткам *паўстання 1830* выехаў у Каралеўства Польскае. Пасланы ў сакавіку 1833 на радзіму для ажыццяўлення патаемнай працы ў акрузе Гродна-Ліда (у Гродне Ш. скончыў *гімназію* ў 1829 і тут жыла яго маці Тэкля). Прабыў на Гродзеншчыне 310 дзён, прыводзячы да прысягі на вернасць польскаму ўраду гродзенскіх гімназістаў, вучняў у касцёлах, збіраючы ксяндзоў, адвакатаў складаў новыя палітычныя колы. Нават планаваў напад аб'яднанымі сіламі на Гродна з мэтаю захопу арсенала. У Гродне прабыў болей за 10 дзён. Некалькі разоў спрабаваў забіць *Мураўёва М. М.,* гродзенскага *губернатара.* Быў схоплены пад гродзенскім *мастом* (з кінжалам і пісталетам) – чакаў праезду губернатара. Следства па справе Ш. вялося ў Вільні і Гродне. Шыманскі супрацоўнічаў са следствам, даваў падрабязныя паказанні, і яму не выносілі прысуд, а вырашылі выкарыстаць яго ў якасці шпіёна для збору інфармацыі пра дзейнасць эміграцыі ў Зах. Еўропе, асабліва назіраць за І. Лялевелем, кн. А. Чартарыйскім, генералам Ю. Двярніцкім. Пра шпіёнскую дзейнасць Ш. нічога не вядома. Прыбыўшы ў Парыж у 1834 г., ён прызнаўся генералу ў сваёй "місіі", абяцаў раскрыць іншых расійскіх шпіёнаў, але не даў абяцанай інфармацыі і хутка знік у невядомым напрамку. Далейшы лёс яго невядомы.

Літ.: Матвейчык Д.Ч., Выгнаныя з роднага краю. – Мінск: Лімарыус, 2011. – С. 88–92; Орловский Е. Очерк истории города Гродны. – Гродна, 1889. – С. 54; Sidorowicz-Czerniewska K. Sprawa emisariusza Michała Wołłowicza w r. 1833. – Grodno, 1934. – С. 86–87; E. Gulczyński, Sprawa Marcelego Szymańskiego emisariusza wyprawy Zaliwskiego, Wilno 1933.

Шыманскі Ян (каля 1765 – 18.05.1845) – польскі тэатральны дзеяч. У 1792–93 гг. выступаў у Вільні. У 1795 яго трупа была ў Гродне да канца года, пасля чаго Ш. быў прымушаны дырэктарам тэатра *Мараўскім* пакінуць горад, дзе засталіся яго акцёры. Кіраўнік гродзенскага тэатра пасля смерці *Дэшнер Саламеі* ў 1806. На пасадзе дырэктара тэатра Ш. быў да 1808. Выступленні адбываліся не толькі ў Гродне, але і ў Зэльве, Свіслачы, Слоніме, Навагрудку. У 1808 Ш. выступаў у Віленскім тэатры. У 1814–15, 1820–23, 1826–30, 1835, 1839–40 ён зноў быў у Гродне. Яго маленькую трупу бачыў у 1827 *Скібінскі Казімір*. Памёр Ш. у гродзенскім Таварыстве дабрачыннасці ў 80-гадовым узросце.

Літ.: Bernacki L., Teatr, dramat i muzyka za Stanisława Augusta. – Lwów. T. I, c. 403; T. II, 1925. – S. 322 Nowy Korbut. T. 4. Oświecenie: hasła ogólne, rzeczowe i osobowe A-H, Warszawa, 1966. – S. 183; PSB t. 21. Warszawa, 1935. – S. 708; Renik W. Tradycje teatralne

Grodna. Cz. 1: Życie teatralne w Grodnie od XVII do przełomu XX wieku // Wilno i kresy północno-wschodnie. T. II. Kultura i trwanie. – Białystok, 1996. – S. 140.

Шырма Рыгор Раманавіч (20.01.1892, в. Шакуны Пружанскага ў. Гродзенскай губ. – 23.03.1978, Мінск) – майстар харавога мастацтва, заснавальнік *капэлы Дзяржаўнай акадэмічнай харавой БССР*, фальклярыст, этнограф, крытык і музычна-грамадскі дзеяч. Скончыў Пружанскае гарадское вучылішча, педагагічныя курсы ў Свянцянах Віленскай губ. Два гады выкладаў, у 1914 паступіў у настаўніцкі інстытут у г. Седлец (цяпер Польшча). У студэнцкія гады пакляўся "нашу простую сяляначку, беларускую народную песню, вывезці ў людзі і зрабіць дамай высокага культурнага свету". У гады вайны першай сусветнай эвакуяваўся ў Маскву, Яраслаўль. На пачатку 1917 быў мабілізаваны ў армію. З 1918 настаўнічаў у Варонежскай губ. У 1922 вярнуўся ў Шакуны, працаваў на лесараспрацоўках, з 1926 – настаўнікам спеваў і беларускай літаратуры ў Віленскай беларускай гімназіі. У гэты час стаў адным з арганізатараў *Таварыства беларускай школы* (з 1928 па 1937 – сакратаром), арганізоўваў спектаклі і канцэрты, чытаў лекцыі, пісаў артыкулы і вершы, рабіў музычныя запісы. Для гэтага абыйшоў пехатою амаль усю Заходнюю Беларусь (з 1910 запісаў больш за 2 тыс. народных песень). Кіраваў хорам Беларускага саюза студэнтаў у Вільні. У верасні 1939 прыступіў да арганізацыі Беларускага дзяржаўнага ансамбля песні і танца (пачатак дзейнасці – 15.01.1940). У гады *вайны Вялікай Айчыннай* выступаў на Урале, у Кузбасе, а ў ліпені 1944 вярнуўся ў Мінск. З восені 1944 да 1952 ансамбль знаходзіўся ў Гродне, дзе ішла рэарганізацыя. У. Кісель успамінаў, што Ш. дапамагаў стварыць студэнцкі хор у Гродзенскім педінстытуце і, калі студэнты стварылі падпольную арганізацыю беларускіх патрыётаў у 1946, дык Ш. папярэдзіў іх, што добра ведае Савецкую ўладу і яе карныя ворганы, але благаслаўляе іх на ажыццяўленне адвечнай мары беларускага народа. З 1957 ансамбль Ш. стаў называцца "Дзяржаўная акадэмічная капэла БССР", кіраўніком якой Ш. быў да 1970. "Капэла Шырмы" паказала ўсяму свету харaство і веліч роднай беларускай песні, але выконвала і творы сусветных кампазітараў: Бетховена, Моцарта, Мурадэлі, Рахманінава, Свірыдава, Танеева, Чайкоўскага, Шабаліна і інш. З 1966 Ш. з'яўляўся старшынёй праўлення Саюза кампазітараў БССР. У 1966 і 1974 атрымоўваў Дзяржаўную Прэмію БССР. Ш. – народны артыст СССР, Герой Сацыялістычнай працы. Імя Ш. нададзенае харавой капэле Беларусі, музычнай школе ў г. Пружаны.

Літ.: И. Г. Нискевич Г. Р. Ширма: Очерк жизни и творчества. – Л., 1971; В. Сізко-Габрыелян, "Дзядзька Рыгор"// Мы-беларусы / Уклад. Т. Бондар. – Мн.: Літаратура і Мастацтва, 2003. – С. 42; Шырма Рыгор Раманавіч // Беларускія пісьменнікі: біблія-графічны слоўнік. Т. 6. – Мінск, 1995; Venclova T., Wilno. Przewodnik biograficzny. – Warszawa: PIW, 2013. – C. 295.

Шышкевіч Баляслаў (1865 – 13.09.1893) – скульптар, ганаровы грамадзянін Гродна. Паходзіў са збяднелай польскай шляхты. Вучыўся ў Ваўкавыскім

павятовым вучылішчы (1874–76), потым пераехаў у Гродна. Ва ўзросце 24 гадоў ажаніўся з Ромай-Марыяй Пратасовіч. Памёр на сухоты, пакінуўшы трохгадовую дачку і жонку, якая працягвала дзейнасць яго фірмы да 1907 г. (памерла ў 1912, пахаваная на гродзенскіх могілках фарных). У 1896 у фірме працавала 7 чал., абарот склаў 2050 руб. На гродзенскіх могілках ёсць скульптуры рукі Шышкевіча: па вул. Антонава на праваслаўных – 14 твораў, на каталіцкіх – 13. Працы фірмы пасля смерці Баляслава: на праваслаўных – 27, на каталіцкіх – 16.

Літ.: Зорына Л. Гродзенскія скульптары XIX – пачатку XX ст. // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 86–94; Poczobut-Odlanicki S. Grodno znane i nieznane. T. II, część II. Przewodnik do podróży na kanapie i do wyjazdu w teren. – Białystok: Prymat, 2015. – C. 143.

Э

Эйсымонт Віктар Уладзіслававіч (20.12.1904, Гродна – 31.01.1964, Масква) – савецкі кінарэжысёр (1957), лаўрэат трох Сталінскіх прэмій другой ступені (1942, 1947, 1951). Скончыў Ленінградскі інстытут сцэнічнага мастацтва (1930). Працаваў памочнікам рэжысёра на чатырох карцінах (1931–38), 14 зняў самастойна. Сярод іх: першы фільм "Чацвёрты перыскоп" (1939, вайсковая драма), затым – "Жила-была дзяўчынка" (1944, пра блакадны Ленінград), "Агні на рацэ" (1953, камедыя, прыгодніцкі), "Лёс барабаншчыка" (1955, паводле Гайдара), "Канец Старой Бярозаўкі" (1960) і інш. Апошняя карціна "Прыгоды Толі Клюквіна" (1964, камедыя паводле твораў Носава).

Крыніца: Википедия. Свободная энциклопедия.

Эканомія гродзенская, створаная прывілеем караля польскага і вялікага князя літоўскага Жыгімонта III Вазы 28 снежня 1588 г. згодна з рашэннем каранацыйнага сейма ў Кракаве ад 28.12.1576. Гродзенскае староства было аб'яўленае прыналежным да каралеўскага трона са згоды станаў Рэчы Паспалітай. Гродзенская эканомія разам з Аліцкім уладаннем уключала наступныя фальваркі і мястэчкі: Адэльск, Азёры, Верцялішкі, *Гарадніцу*, Квасоўку, Котру, Краснік, Крынкі, Кузніцу, Лабна, Масты, Мількаўшчыну, Новы Двор, Салаты (Салацце), Скідзель. Вельмі пацярпела падчас *вайны Паўночнай* – ад заразы згінула 1\3 насельніцтва, не хапала жытла. Цікава звярнуць увагу на тое, што ў Э. г. з часоў праўлення Яна III не было паншчыны – сяляне плацілі чынш. Пры старасце *Тызенгаўзе А.* Э. г. складалася з 181 населеных пунктаў і 5 пушч, а тэрыторыя ахоплівала 75,5 тыс. дзесяцін. Яна стала месцам правядзення рэформ у галіне прамысловасці ВКЛ.

Крын. і літ.: Гродно: энцикл. справ / редкол.: И.П. Шамякин [и др.]. – Минск, 1989; Кітурка І.Ф. Антоні Тызенгаўз у справе мадэрнізацыі Гарадзенскай сталовай эканоміі (другая палова XVIII ст.) // Гарадзенскія чытанні. Зб. матэрыялаў. – Гродна: "Гродзенская друкарня", 2011. – С. 110–124; Писцовая книга Гродненской экономии с прибавлениями, изданная Виленской комиссией для разбора древних актов. – Вильна, 1881. Ч. 1, Ч. 2; Encyklopedja powszechna. T. X. – Warszawa: S. Orgelbrand, 1862 – S. 747; Bejnar L. Ziemie północno-wschodnie Rzeczypospolitej za Sasów. – Wilno, 1939. – S. 29; Polska Stanisławowska w oczach cudzoziemców. T. 1 – Warszawa, 1963. – S. 880.

Электрычнасць. Першая электрастанцыя дзейнічала ў 1912–14 і знаходзілася на вул. Аляксандраўскай/Будзёнага. Першы ток быў пададзены 25 снежня

1912 г. Два дызельных рухавіка (600 к. с.) маглі даваць ток для 120 вулічных электрычных ліхтароў горада (ул. Мураўёўская/Ажэшкі, Саборная/Савецкая, Замкавая, галоўныя плошчы) і 8 тыс. лямпачак абанентаў. У 1913 г. 12 рабочых і 3 служачых выраблялі 256 тыс. квт/гадзін электраэнергіі. На станцыі былі 2 дызель-маторы фірмы "Нобель" (80 і 120 к. с.), 2 генератары пастаяннага току напружаннем 500 вольт і агульнай магутнасцю 130 квт. Станцыя абслугоўвала 541 дом з 12 562 лямпачкамі напальвання магутнасцю 440 квт, 4 дугавыя ліхтары і 57 лямпачак напальвання магутнасцю 13 квт. 8.08.1913 на пасяджанні *думы Гарадской* было прынятае рашэнне аб выдзяленні 1 000 руб. на пашырэнне гарадскіх электрычных сетак (пакуль яны ахоплівалі тэрыторыю, абмежаваную *Нёманам, Гараднічанкаю* і вул. Міцкевіча, алеяй 3 Мая і *чыгункай*) і 1 500 на набыццё электрычных лічыльнікаў. У гады *вайны першай сусветнай* немцы экспрапрыявалі медны дрот і, не маючы змазкі, зламалі дызельныя рухавікі. У 1920–1923 электрастанцыя нармальна працаваць не магла з-за частых няспраўнасцяў рухавікоў. 1.12.1923 запрацаваў новы рухавік на 275 квт, але электрычны голад гэтым не быў пераадолены. Сетка заставалася амаль у даваенных межах, працягнулася толькі ў напрамку вул. Ерусалімскай, Грандзіцкай, Нарутовіча і Станіславоўскай. У 1928 электрастанцыю перабудавалі на пераменны ток, ўвялі 2 паравыя катлы (273 кв. м) і 2 турбарухавікі магутнасцю па 700 квт кожны. Пабудавалі 4 трансфарматарныя падстанцыі (на пл. Баторыя, вул. Ерусалімскай і 2 на фарштаце Занёманскім). Пуск новага абсталявання адбыўся 7.11.1928. Новыя падстанцыі ўзніклі пры гарадскім упраўленні (1933), на вул. Нарутовіча (1936), вул. Рыдза-Сміглага (1937). У гэтыя гады пракладзена каля 11 000 м наземнага кабелю, паветраныя сеткі працягнуліся на *Фолюш* (1929, 3 км), *Панямунь* (1929, 1,5 км), Чэхаўшчыну (1935, 5 км). Да электрычнай сеткі далучыліся *вадаправод* (1928), *тытунёвая фабрыка* (1929), *млын* Касоўскага (1936). *Вайна Другая сусветная* перашкодзіла выкананню перспектыўных планаў распаўсюджвання электраэнергіі на наваколле Гродна, суседнія паветы Навагрудскага ваяводства, выкарыстання для гэтага не толькі новых падстанцый, але і водных рэсурсаў Віліі і Дзвіны.

Літ.: Болбас Ф. Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. – Мн., 1988, с. 73; Вашкевіч А., Саяпін В. На гродзенскім бруку. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – С. 100–107; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 12; Nieman. – 1939. – S. 21–26.

Эрдзівіл Мантвілавіч – літоўскі князь, быў у ліку паслоў да галіцка-валынскага князя Данілы Раманавіча ў канцы 1219 – пач. 1220 з прапановай заключэння міру. Пасля 1241 г. (смерці гарадзенскага князя *Юрыя Глебавіча* і разбурэння горада *татарамі*) адбудаваў *Горадзен* ("zarąbił zamek Grodno", "зарубіл город Городно") і атрымаў яго ў сваё валоданне ад дзядзькі, вял. князя літоўскага *Міндоўга*. Э. пабудаваў круглую *стоўп/вежу* пры ўваходзе ў *Стары замак*. Паводле Альшэўскага, Рачынскага і Румянцаўскага летапісаў Э. быў князем

Навагрудскім пасля свайго бацькі князя Мантвіла і над замкамі Брэст, Драгічын, Мельнік, якія адбудаваў пасля разбурэння татарамі.

Літ.: П Бобровский. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губ. Ч. 2. СПб., 1863; Летапісы і хронікі Беларусі. Сярэднявечча і раньнемадэрны час, Мінск, 2010, с. 204, 234, 283, 682; H. Lowmiański. Prusy-Litwa-Krzyżacy. – Warszawa, 1989. – S. 237, 466, 472.

Эрэнкройц Міхал – былы харунжы кароннай артылерыі, камендант Гродна, як ён падпісваў свае дакументы. Яшчэ з Саколкі фармаваў гродзенскую муніцыпальную міліцыю. Пазней яе ўзначаліў і на мяжы чэрвеня-ліпеня 1794 г. увайшоў у новы склад *Парадкавай камісіі* Гродзенскага пав.

Ю

Юдэнрат – яўрэйская рада, орган, які займаўся абшчыннымі справамі і выконваў у Гродне загады акупацыйнай нямецкай адміністрацыі. Ён наладжваў побыт яўрэяў, арганізоўваў сацыяльную дапамогу, забяспечваў правапарадак. Першае пасяджэнне адбылося 28.06.1941 г. Са стварэннем у горадзе *гета* ў кожным былі створаныя свае юдэнраты: у гета № 1 яго ўзначаліў Ісак Гажанскі, у гета № 2 – Аўрам Задай (абодва былі юрыстамі). Яны падпарадкоўваліся Давіду Браверу, былому дырэктару гімназіі "Тарбут". У верасні 1941 налічвалася да 24 супрацоўнікаў юдэнрата. Іх не пасылалі на прымусовыя фізічныя працы і не дэпартавалі. Таму з цягам часу колькасць супрацоўнікаў павялічылася і дасягнула 850 чал. Яны займаліся ўсімі сферамі жыццядзейнасці жыхароў гета (фінансы, забеспячэнне, праца, канфіскацыя і д. п. – усяго 13 аддзелаў). Кіраўнік аддзела па камерцыі і прамысловасці А. Ліўшыц падрыхтаваў спіс майстроў і кваліфікаваных рабочых (600 прафесій). Кіраўнік аддзела забеспячэння Я. Эфрон з дапамогай Бравера, які меў асабістыя кантакты ў гарадскім кіраванні і жандармерыі, дабіўся павелічэння дастаўкі ежы ў гета, а таксама зарганізаваў кантрабандную пастаўку прадуктаў, запалак і мыла. Адвакат Фюрстэнберг кіраваў кватэрным аддзелам. Рамонтам і прыстасаваннем нежылых памяшканняў (у гета № 1 жылля не хапала) займаўся будаўнічы аддзел. Было аддзяленне, якое займалася рэлігійнымі пытаннямі: забяспечвала кашэрным харчаваннем, пахаваннем памерлых, наладзіла вывучэнне дзецьмі Святога пісання (Танах). Паколькі яўрэі-"спецыялісты" (рабочыя, рамеснікі) жылі ў гета № 1, юдэнрат стараўся з гета № 2 перавесці сюды як мага больш людзей. Спадзяваліся, што яны выжывуць, бо патрэбныя немцам. Арамя таго тут было вялікае поле, на якім высаджвалі гародніну, больш жылля, хаця і горшага па ўмовах жыцця. Юдэнрат утрымліваў пякарню, забяспечваў яе мукой, дровамі. Кожнаму выдавалася па картках 200 грам хлеба, часам мяса, мелася грамадская кухня (штодзённа гатавалася каля 3 тыс. абедаў) – ні адзін чалавек не памёр з голаду. У гета працавалі паліклінікі і аптэкі (туды часам звярталіся і немцы), на другім паверсе *сінагогі Вялікай* быў часовы шпіталь.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 220–221; Гародня X-XX стст. Каралеўскі горад з правінцыйным лёсам. – Вроцлаў: Гарадзенская бібліятэка, 2014, с. 397–402; Баціс М., Буцько У., Крапівіна Н. і інш. Гародня: сляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні // ARCHE. – 2010. – № 6. – С. 402–410, 412.

Юзаф з Літвы/Юзаф бен Ісак ха-Леві (паміж 1580–1590, Літва – ?, Гродна) – рэлігійны філосаф. Вучыўся ў Празе (Чэхія), выдаў тут у 1612 г. сваю першую працу "Gibeat ha-More", у якой крытыкаваў вельмі папулярную тады філасофскую працу Майманіда. У другой працы "Ketonech Pasim" ("Рознакаляровы матэрыял") адказаў на прэтэнзіі прыхільнікаў гэтага аўтара. Перад смерцю доўгі час жыў у Гродне.

Літ.: Bersohn M. Słownik biograficzny uczonych żydów polskich XV, XVII, XVIII wieku. – Warszawa, 1906.

Юзафовіч-Бароўская Тэафіля Багуміла (1828, Гродна – ?) – скрыпачка, з дваран татарскага паходжання, каталічка. Бацькі памерлі рана, і яе выхаваннем займаўся старэйшы брат. З 5-гадовага ўзросту Багуміла вучылася іграць на скрыпцы (першы педагог – гродзенскі скрыпач-аматар П. Звіровіч). У сакавіку 1835 г. прыняла ўдзел у канцэрце віленскага скрыпача Ігнацыя Рэўта. У студзені 1837 з поспехам выступіла ў Гродне, выканаўшы канцэрт і варыяцыі французскага кампазітара П'ера Радэ. Выехала ў сяр. 1838 у Пецярбург, дзе вучылася ў пансіёне і брала ўрокі скрыпічнай ігры ў славутых еўрапейскіх музыкантаў: бельгійцаў Анры В'ётана і Франсуа Прума, нарвежца Уле Буля. Пасля выступлення 13.04.1841 у пецярбурскім салоне В. М. Энгельгард яе сталі называць "Паганіні ў жаночым адзенні" (інш. варыянт "Паганіні ў сукенцы"). У 1843 выступала ў Варшаве. Недзе ў сяр. 1840-х гадоў вярнулася ў Гродна, дзе выступала з мясцовым аматарскім аркестрам Івана Дабравольскага. Канцэрты былі таксама ў Вільні, Мінску. Больш за 30 гадоў Юзафовіч-Бароўская прысвяціла служэнню мастацтву.

Літ.: Вашкевіч А. Гарадзенкі. Жаночы след у гісторыі Гродна. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2020, с. 23–26; Капілаў А. Скрыпачка з Гродна // Беларусь – 1978 – № 3. – С. 28; Марціновіч А. Гісторыя праз лёсы. Т. 3./ Алесь Марціновіч. – Мінск: Беларуская навука, 2017. – С. 247–254.

фон Юнгінген Конрад – вялікі магістр Тэўтонскага (Нямецкага) ордэна (30.11.1393 – 30.03.1407). Яго вайсковыя і дыпламатыныя здольнасці дазволілі закончыць жмудскія войны. Паводле Салінскага трактата 1398 г. наступіў мір Ордэна з Польшчай і Літвой, Жмудзь адышла пад кантроль Ордэна, што забяспечыла яму сухапутныя зносіны з Інфлянтамі.

Юндзіл Францішак Уладзіслававіч (1825 – 14.02.1865) – вайсковец, адзін з кіраўнікоў *паўстання 1863–64 гг*. Нар. у фальварку Югалін (Івацэвіцкі р-н). Пасля адстаўкі ў 1858 з расійскай вайсковай службы жыў у Горадні і служыў засядацелем ад дваранства ў Гродзенскай палаце грамадзянскага суда. Яго кватэра часта была прытулкам для *Каліноўскага В-К*. і яго паплечнікаў. У 1863 быў паўстанцкім начальнікам Слонімскага пав. (на карысць паўстання даў 3 тыс. срэбных рублёў), камандзір паўстанцкага атрада (каля 300 чал.), які фармаваўся ва ўрочышчы Старынка паблізу Югаліна. Злучыў свой атрад з атрадам Ісідора Лукашэвіча і браў удзел у бітве пад Мілавідамі 22 траўня,

а 28 траўня 1863 – пад Літвінавам. На пачатку чэрвеня злучыўся з атрадамі А. Лянкевіча і В. Міладоўскага. У жніўні перадаў камандаванне атрадам Я. Калупайлу і ў сакавіку 1864 эмігравaў у Францыю. Хварэў, лячыўся ў парыжскім шпіталі і тут памёр. Меў расійскі медаль у памяць аб Крымскай вайне 1853–56 гг.

Літ.: Акудовіч Ц., Юрчык Д. Паўстанне 1863 года на Слонімшчыне // Горад Святога Губерта: альманах лакальнай гісторыі. – 2014 – Вып. 8. – С. 121; Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня). – Мінск: Альфа-кніга, 2017. – С. 52.

Юркевіч Сяргей Фёдаравіч (нар. 21.01.1954, с. Ілава Мядзельскага р-на Мінскай вобл.) – галоўны рэжысёр Гродзенскага *лялечнага тэатра* (1980–1987). Скончыў Ленінградскі інстытут тэатра, музыкі і кінематаграфіі (1980). Быў акцёрам тэатра лялек у Мінску (1971–1972), затым служыў у Савецкай арміі (1972–1974). У ліпені-жніўні 1980 працаваў педагогам у Брэсцкім абласным тэатры лялек, у верасні-лістападзе 1980 – мастацтвазнаўцам-кантралёрам упраўлення культуры пры Гродзенскім абласным выканаўчым камітэце. Са снежня 1980 па студзень 1987 быў галоўным рэжысёрам Гродзенскага тэатра лялек, са студзеня 1987 па май 1989 на падобнай пасадзе у Брэсцкім тэатры лялек. Дырэктар Мінскага абласнога тэатра лялек у г. Маладэчна (з 1990).

Юры Глебавіч (1184? – 1241) – гарадзенскі князь, сын *Глеба Усеваладавіча*. Верагодна, загінуў у бітве, якая адбылася ў другой палове 1241 г. паміж Астрыной і Васілішкамі (на месцы Шайбакполя), дзе літоўскае войска было разбітае татарамі. Паводле другой версіі ён мог быць забіты ў гарадзенскай бітве з татарамі ў 1241. Пішуць, што ён мужна абараняў драўляны замак на высокім беразе *Нёмана*. З ягонай смерцю дынастыя Усеваладкавічаў згасла.

Літ.: Кукольник П.В. Исторические заметки о Литве. – Вильна: Тип. А.К. Киркора, 1864 или др. издания (в рос. книгах Ю.Г. называют Георгием); Przegląd historyczno-wojskowy. T. IX. –Warszawa, 1937. – S. 209–213. 209–213, 369–377, 394–395.

Юрыдыка – ручай, які атрымаў назву ад тэрміна "*юрыдыка*". Упадае ў *Гараднічанку* пад мастом каля пл. *Тызенгаўза А*., а разам з ёй – у *Нёман*. У "Памятной книге Гродненской губернии на 1893 г." ручай называюць ракой "Малая-Городничанка". Пры ёй стаяў уласны дом архіварыуса Гродзенскага губернскага праўлення К. А. Мілабенцкага. У 2016 планавалі Ю. упарадкаваць таксама, як рэчышча Гараднічанкі каля будынка *гарадскога выканаўчага камітэта*.

Літ.: Гродзенская праўда. – 2016. – 14.04. – С. 1.

Юрыдыкі – паводле характарыстыкі З. Капыскага "у ВКЛ адміністрацыйна адасобленыя часткі гарадоў ці прадмесцяў, якія былі пад уладай феадала, царквы або манастыра і на жыхароў якіх не пашыралася судовая і адміністрацыйная ўлада гарадскога самакіравання". У Горадні Ю. вядомыя з XVI ст. Належалі магнатам *Агінскім, Масальскім, Патоцкім, Радзівілам, Сапегам, Тызенгаўзам; кляштарам аўгусцінцаў* (сядзіба на Нямецкім *рынку*, каля

Гараднічанкі і 16 пляцаў, якія ў XVII ст. сталі юрыдыкай Св. Тройцы *Фары Вітаўта*), *базыльян каложскіх* (на правым баку Гараднічанкі, з поўдня межавалі з берагам Нёмана, з поўначы – з грунтамі *вёскі Гарадніца*; у 1775 уздоўж рэчышча Гараднічанкі было 25 базыльянскіх пляцаў) *і базыльянак* (1 юрыдыка ў раёне *замка Новага* = 23,5 пляца; 2 на пляцы былой *царквы Васкрасенскай*; 3 юрыдыка падараваная манастыру ў XVII ст. Я. і Б. Кунцэвічамі), *бернардзінак* (24–39 пляцаў вакол кляштарных муроў) *і бернардзінцаў* (участкі на ўсходнім баку вул. Маставой, Бернардзінскім узгор'і ды з поўначы Бернардзінскай гары), *баніфратраў* (у 1780 – 8 вялікіх пляцаў, у 1812 – 5 моргаў 24 прэнты 31 прэнцік зямлі), *брыгітак* (квартал у межах вуліц Азёрскай, Навікоўскай, Дзям'янаўскай, Ерусалімскай), *дамініканцаў* (абшар, абмежаваны вул. Віленскай, Плябанскай, Траецкім завулкам і *Нямецкім рынкам*), *кармелітаў босых* (пляцы паміж Нёманам і вул. Маставой, у *Занёманскім прадмесці* з XVII ст. пляцы на вул. Лабенскай, з XVIII ст. землі былога *звярынца* з млыном), *францішканцаў* (усяго ў 1650 г. – 198 пляцаў, у 1790 – 144); касцёлам: Фары Вітаўта ("вялікая жыдоўская юрыдыка", "малая жыдоўская юрыдыка", "падзамкавая юрыдыка", "каталіцкая юрыдыка Св. Тройцы", "юрыдыка шпіталя Св. Духа"), фарнаму/езуіцкаму (пляцы ў рынкавым квартале, на задворках заходняга боку вул. Маставой, сядзіба на беразе Нёмана і ўчастак з цагельняй на вул. Падольнай); замку *Старому* і *эканоміі гродзенскай* (у канцы XVIII ст. 110–130 пляцаў). Дакументы і матэрыялы па Ю. знаходзяцца ў кракаўскіх рукапісных зборах (у бібліятэцы ПАУ і ПАН, Бібліятэцы Чартарыйскіх, Дзяржаўным архіве на Вавелі – фонды Хадкевічаў і Сангушкаў), у варшаўскім Галоўным архіве старажытных актаў (фонды Радзівілаў і Тызенгаўзаў).

Літ.: Гардзееў Ю. Гісторыка-культурная спадчына Гародні магдэбургскага перыяду // Новае слова ў гісторыі і культуралогіі V Міжнароднага кангрэса беларусістаў "Новае слова ў беларусістыцы". – Мн, 2012. – С. 30; Гардзееў Ю., Тапанамія старажытнай Гародні (XII-XVIII стст.). – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2013. – С. 98–102; Капыскі З. Юрыдыкі // Вялікае Княства Літоўскае: Энцыклапедыя. Т. 2. – Мінск: БелЭн, 2006. – С. 772; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 226–231.

Я

Ягайла, у праваслаўі Якаў, у каталіцтве Уладзіслаў, Уладзіслаў II (каля 1350 – 1434) – сын Альгерда, родапачынальнік каралеўскай дынастыі Ягелонаў, якія правілі ў Польшчы, Венгрыі, Чэхіі з 1385 па 1572 г. Вялікі князь літоўскі (1377–1392), з 1401 – вярхоўны вялікі князь Літоўскі, з 1386 – кароль польскі Уладзіслаў II. Вёў барацьбу са сваім дзядзькам Кейстутам за ўладу ў ВКЛ. Быў у Горадне 16 разоў – пераважна ў снежні (9 разоў) і студзені (4 разы): аблога гарадзенскага замка (люты – красавік 1390), святкаванне Божага нараджэння (1411, 1412, 1414, 1416, 1424. 1426, 1428), праездам у Вільню на сустрэчу з крыжакамі ў Велёне (1415, 1416, 1418), на адпачынак з жонкай (25.11.1417, 17.11.1418 – вяселле Вітаўта і Юльяны, 01.1419) ці для сустрэч без яе (люты 1421, студзень 1422, 8 і 13–17.1425, 29.12.1429).

Літ.: Бутэвіч А. Паміж Княствам і Каронай. – Мінск: Выдавецкі дом "Звязда", 2013. – С. 273–274, 277–278 281–282; Госцеў А.П., Швед В.В. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116–1990 гг.). – Гродна: ГАА БФК, 1993. – С. 16–18, 277; Нарыс гісторыі Польскай Дзяржавы і Народа. X-XXI стст. – Варшава: Demart, 2015. – С. 37–39; Семянчук А. Каралеўскі і велікакняжацкі побыт у Гародні ў канцы XIV – XVI ст. // Grodnae et orbi: гарадскія супольнасці і гарадское асяроддзе XIV – XX стст. / пад рэд. А. Радзюка і І. Галубовіча. – Мінск: А.М. Янушкевіч, 2018. – С. 6–21; Baliński M., Lipiński T. Starożytna Polska pod względem historycznym, jeograficznym i statystycznym. Wyd. Drugie. T. IV. – Warszawa, 1886. – S. 293, 295.

Ягалкоўскі Захар Купрыянавіч (1835, Гродна – ?) – удзельнік *паўстання 1863–64 гг*. Вучыўся ў Слонімскім пяцікласным вучылішчы, па заканчэнні якога працаваў у Слонімскім павятовым судзе, а потым у Гродзенскай *казённай палаце*. Утрымліваў казённую ферму Ярнева ў Слонімскім у. З 1859 г. пакінуў службу і займаўся гаспадаркай у маёнтку Луконіца сваёй мацеры ў Слонімскім у. Яго дом быў знаёмы з дамамі Стравінскіх, Радавіцкіх, Эйсьманаў, Ліпскіх (удзельнікаў паўстання). Паводле паказанняў Э. *Заблоцкага* быў акруговым начальнікам Слонімскага пав., у яго ён начаваў з *Каліноўскім* падчас паездкі па аднаўленні арганізацыі пасля арыштаў, у маі 1863. Сядзеў з 4 ліпеня 1864 у гродзенскай *турме*, адкуль быў перавезены ў Вільню. Віленскім ваенным судом прыгавораны да ссылкі ў Пермскую губ.

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 3, воп. 3, с. 4, а. 62 адв.–63; с. 2, а. 34, 359–361; с. 1, а. 317–319,376; ф. 3, оп. 1, с. 40, а. 6 адв.; ф. 1., воп. 13, с. 1399, а. 158 адв.; ЛДГА, ф. 1248, воп. 2, с. 917, ч. 1, а. 123; Швед В.В. Рэквіем паўстанцам 1863–1864 гг.: (Гродзенская губерня), Мн.: ТАА "Альфа-кніга", 2017, с. 52.

Ядкоўскі Юзаф (20.12.1890, Гродна – 2.04.1950, Варшава) – гісторык, археолаг, стваральнік і першы дырэктар *музея Гродзенскага гісторыка-археалагічнага*. Нарадзіўся ў небагатай сям'і гродзенцаў Юзафа Феліцыянавіча (тэхніка паштова-тэлеграфнага ведамства) і Зоф'і з Занеўскіх. Вучыўся ў *гімназіі мужчынскай*, дзе гісторыю ў той час выкладаў *Арлоўскі Я. Ф.* Менавіта ён прышчапіў Ядкоўскаму любоў да гісторыі малой радзімы. Паралельна з гімназіяй Юзаф наведваў тайныя курсы *Ажэшкі Э.* па польскай гісторыі і літаратуры – яны мелі несумненны ўплыў на патрыятычнае выхаванне Я. Ён быў сябрам гуртка ППС у Гродне і дапамагаў атрымліваць нелегальную літаратуру на чыгуначнай станцыі (пад выглядам галантарэі і металічных вырабаў) і распаўсюджваць яе ў вучнёўскіх колах. Прымаў удзел у патрыятычным руху падчас *рэвалюцыі 1905–1907 гг.:* рэдагаваў нелегальную газету і ўлёткі, удзельнічаў у лістападаўскім выступленні гімназістаў 1905 г. У 1908 Я. вучыўся каля года на 1-х маскоўскіх будаўнічых курсах інжынера Прыорава. З 1909/10 нав. года пачаў вучыцца ў маскоўскім Археалагічным інстытуце. Грошай на жыццё і аплату вучобы (80 руб. на год) не хапала, таму 29.12.1909 ён падаў прашэнне на стыпендыю ў Маскоўскую апеку над славянамі пры Славянскім дабрачынным таварыстве (у ім Я. прадставіўся беларусам, ураджэнцам Гродна). Стыпендыю не атрымаў, але ў 1912 скончыў вучыцца з адзнакай "выдатна" і тытулам "вучоны археолаг". У Археалагічным інстытуце Я. абараніў магістарскую працу аб літоўскай грыўне і працаваў лабарантам. Потым у Румянцаўскім музеі займаўся каталагізацыяй архіваў і матэрыялаў, вывезеных пасля *падзелаў Рэчы Паспалітай*. Сабраў каля тысячы фотаздымкаў і малюнкаў для кнігі "Польскія рэліквіі ў Расіі", але з-за фінансавых праблем не змог яе выдаць. Як член-карэспандэнт Маскоўскага археалагічнага таварыства (28.02.1914), з'яўляўся захавальнікам помнікаў даўніны па Гродзенскай, Мінскай і Віленскай губернях. У 1913–1914 Я. пабываў ў Гродне, Лідзе, Крэве, Гарадзішчы пад Баранавічамі, у Сынкавічах, Супраслі, Міры і іншых населеных пунктах, дзе даследаваў касцёлы, замкі, палацы. Разам з В. Шукевічам правёў археалагічныя раскопкі ў Начы, на палях Ланкішак. Дзякуючы Я., захаваліся такія помнікі культуры, як іканастас XVII ст. у Супраслі (сёння Польшча, знішчаны падчас Другой сусветнай вайны), фрэскі О. Губля ў Гарадзішчы, каля Пінска. У 1914 г. Я. атрымаў узнагароду імя графа Уварава за рэферат "Умацаваныя храмы на Літве". Падчас *вайны Першай сусветнай* хацеў запісацца ў польскі легіён, які збіраў В. Тарчынскі, але з нейкіх прычынаў адмовіўся ад гэтага і пайшоў на службу санітарам Чырвонага Крыжа ў расійскім вайсковым шпіталі. Разам з ім выязджаў на вайсковыя пазіцыі, быў сведкам баёў пад Элкам, затым – начальнікам эвакуацыйнага пункту ў Арысе. Пасля кароткага адпачынку ў Гродне выязджаў у Маскву і Вільню. У ліпені 1915 працаваў ва ўпраўленні інтэнданта *крэпасці* Гродна. Дэмабілізаваўся з расійскага войска ў 1919 і пачаў працаваць (не раней за 27 красавіка, калі горад быў перададзены немцамі польскім войскам) у Грамадзянскім упраўленні Усходніх зямель у Гродне. Быў таксама кіраўніком бюро Камісіі дзяржаўнай апекі над помнікамі мастацтва і культуры па г. Гродна і Гродзенскім павеце. Публікацыі Я., сабраныя ў Расіі

С. 919

матэрыялы, дапамаглі пасля вайны Рэвіндыкацыйнай польскай камісіі дамагацца на перамовах вяртання Польшчы помнікаў гісторыі, вывезеных пасля падзелаў Рэчы Паспалітай. У 1920 Я. добраахвотна ўступіў у Войска Польскае і ўдзельнічаў у *вайне савецка-польскай 1920 г.*, быў адзначаны Залатым Крыжам Заслугі. Па заканчэнні ваенных дзеянняў вярнуўся ў Гродна. У 1922 быў прызначаны ваяводскім захавальнікам помнікаў у Беластоку, але хутка вярнуўся ў Гродна, дзе прысвяціў сябе стварэнню музея (дырэктарам якога быў да 1936). З 1928 актыўна ўдзельнічаў у дзейнасці Замкавай апекі, створанай з мэтаю каардынацыі прац па вывучэнні і захаванні *Замкавай гары* і *замка Старога.* Быў зроблены 550-метровы ахоўны бульвар ля падножжа гары, пачалося яе ўмацаванне з боку Нёмана і перанос адсюль пабудоў. У выніку археалагічных прац на Старым замку ў 1932–1933 Я. знашоў рэшткі старажытных збудаванняў: *церам княскі, царква Ніжняя*, часткі драўляных пабудоў і маставых, а таксама позняга часу – абарончай вежы XIII ст., *царквы Верхняй,* сцяны замка *Вітаўта*, фундамента замка *Стэфана Баторыя*, абарончых сцен XVI–XVII стст. і інш. Я. выказаў меркаванне аб тым, што Гродна было заснаванае варагамі ў IX ст. і належала пазней рускім князям (для польскага патрыёта гэта было нечакана). У 1935 Я. правёў раскопкі каля *царквы Барыса і Глеба на Каложы* і ўнутры храма. Па выніках напісаў працу "Помнік абарончага тыпу на Каложы ў Гродне ў святле архіўных даследаванняў" (Гродна, 1936), якая таксама выклікала канфлікт паміж Ядкоўскім і археолагамі.

Малавядомы нам Ядкоўскі як рысавальшчык і фатограф, хаця аловак і фатаграфічны апарат былі такімі ж сродкамі працы гісторыка, як і яго пяро. У фондах *музея Гродзенскага гісторыка-археалагічнага* захоўваюцца 24 малюнкі і чарцяжы Я., выкананыя на паперы і кальцы: *Старога замка*, *касцёла і кляштара бернардзінак*, Гродзенскай фары перад *пажарам* 1892 г., якія прыведзеныя ў кнізе "Grodno", чарцяжы Мірскага замка, помнікаў гісторыі і культуры ў Сынкавічах, Малым Мажэйкаве, Цяханаве, Чарніцы, Гродне. Дапаўненнем малюнкаў Я. з'яўляюцца ягоныя фотаздымкі. У фондах Гродзенскага музея захаваліся два фотаздымкі з маскоўскай калекцыі Я. (1910): тканіна з балдахіна польскага караля Уладзіслава IV і праект помніка Барбары Радзівіл, а таксама вялікая колькасць фотанегатываў на шкле: выява воўпянскага касцёла Яна Хрысціцеля XVII ст. (1922), фотаматэрыялы раскопак Шведскай гары ў Ваўкавыску (1924), 4 негатывы аб паводцы на *Нёмане* 1926 г., 33 негатывы выявы *царквы Барыса і Глеба на Каложы* 1930–1935 гг.; фотаматэрыялы даследаванняў па ўмацаванні гродзенскай Замкавай гары ў 1928 і 1931–1933 гадах (68 негатываў), фотафіксацыя 1929–1931 гг. гістарычных помнікаў Гродзеншчыны (у тым ліку на памежнай тэрыторыі сённяшняй Польшчы). З апошніх назавем Супрасльскі манастыр, фотаальбом якога паводле здымкаў Я. быў апублікаваны ў Варшаве ў 2016.

Пры музеі Я. сабраў вельмі багатую бібліятэку. Аднымі з першых патрапілі сюды 905 тамоў з былой бібліятэкі *гімназіі дамініканскай* і рукапісы, знойдзеныя ў падвале *бібліятэкі Публічнай Гродна.* Затым былі кнігі, якія захаваліся ад бібліятэкі педагагічнага музея ў Гродне. Я. перавёз каштоўныя кнігі

з Рудкаўскай бібліятэкі, бібліятэкі Красінскіх-Пуслоўскіх з маёнтка Свіслач. Прысылалі кнігі музеі Львова, Варшавы, Кракава, бібліятэкі Польшчы. Даравалі кнігі прыватныя асобы. Сам Я. прынёс рукапісы, сярод якіх былі пастановы (канстытуцыі) *сейма 1793* г. Усяго назбіралася ў музеі каля 15 тысяч тамоў. Былі тут і старадрукі XV–XVII стст. Частка гэтых кніг захоўваецца ў аддзеле рэдкай кнігі *музея Гродзенскага гісторыка-археалагічнага*. У Гродне вядомае месца, дзе стаяў дом Я. – цяпер тут аўтамабільная стаянка на скрыжаванні вул. Сацыялістычнай і *Карбышава*.

У 1936 г. Я. пакінуў Гродна і пераехаў у Варшаву, дзе яго і застала *вайна Другая сусветная*. Падчас Варшаўскага паўстання хварэў, але ў кастрычніку 1944 апынуўся ў канцлагеры ў Прушкаве (пад Варшавай). Пасля вызвалення перабраўся ў Кракаў, дзе доўгі час хварэў. У красавіку 1945 вярнуўся ў Варшаву. З 1.07.1947 да канца свайго жыцця працаваў кусташам і кіраўніком аддзела нумізматыкі ў Нацыянальным музеі: здолеў за 4 гады цяжкай працы сабраць калекцыю манет і медалёў, якая ў некаторых раздзелах перавышала даваенную, разрабаваную нямецкімі акупантамі. У 1946 пачаў аднаўляць Варшаўскае нумізматычнае таварыства, стаў яго старшынёй і выдаўцом штомесячніка (выйшла 9 нумароў). З 2012 г., па ініцыятыве прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый Гродна, была ўведзеная Узнагарода імя Ю. Ядкоўскага за вялікі ўнёсак у вывучэнне і папулярызацыю гісторыі горада, дзейнасць па захаванні яго гісторыка-культурнай спадчыны.

Літ..: Краязнаўчыя запіскі. Зборнік артыкулаў памяці Ю. Ядкоўскага. – Гродна, 1990. – 48 с.; Лялевіч Я. Ад Каложы да фартоў: гістарычная спадчына Гродна: гіст.-архітэктур. энцыкл. давед. / Я. Лялевіч, І. Трусаў, А. Чарнякевіч. – Мінск: Лімарыус, 2008, с. 79; Саяпин В. Hrono Гродно: история Гродно на страницах газет. 1913–1941. / В.Ю. Саяпин. – Гродно: ЮрСаПринт, 2013. – С. 77–78, 179, 181; Blombergowa M.M. Wojenne losy Józefa Jodkowskiego w świetle listów do Wandalina Szukiewicza z lat 1914–1915 // Archeologia Polski. T. 37. Z. 1–2. – 1992. – Warszawa. – S. 41–55; Szwed W., Jamski P.J., Bibliografia prac Józefa Jodkowskiego, Supraśl 1913.// Dokumentacja fotograficzna Józefa Jodkowskiego cerkwi Zwiastowania Najświętszej Maryi Pannie. – Warszawa, 2016, s. 57–67; Ігар Барынаў з групы "Запіскі беларусаведа" на ФБ. Доступ 27.04.2021.

Ядэшка Іван Іванавіч (нарадз. 25.03.1945, в. Сцяцкі Гродзенскага р-на) – баскетбаліст, заслужаны трэнер Расіі, заслужаны трэнер СССР, заслужаны майстар спорту СССР. У якасці спартсмена: чэмпіён Універсіяды 1970, уладальнік Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў 1971, чэмпіён Еўропы 1971 і 1979, алімпійскі чэмпіён 1972, срэбны прызёр Універсіяды 1973, бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы 1973, срэбны прызёр чэмпіянату Еўропы 1975, бронзавы прызёр Алімпійскіх гульняў 1976, срэбны прызёр чэмпіянату свету 1978, васьміразовы чэмпіён СССР у складзе ЦСКА (1971–74, 1976–77, 1979–80), срэбны прызёр чэмпіянату СССР 1975. У якасці трэнера: 1984–86 – другі трэнер зборнай СССР, 1987 – трэнер нацыянальнай зборнай Гвінеі-Бісау, 1988–89 – другі трэнер ЦСКА, 1990–91 – першы трэнер ЦСКА, 1993–95, 1997–98 – на

трэнерскай працы ў Ліване (бейруцкі клуб “Спортынг”), 1998–2000 – галоўны трэнер юніёрскай зборнай Расіі, 1999–2000 – другі трэнер ЦСКА, з лета 2000 узначаліў клуб расійскай суперлігі “Шахцёр”. Кавалер ордэна “Знак Гонару” (1972), ордэна Гонару (2006), мае медаль “За працоўную доблесць” (1982). Аўтар кнігі “Тры секунды і не толькі…”. Унесены ў *Кнігу славы* Гродна.

Літ.: Попко И. Ю. Олимпийцы Гродненщины. – Минск: Харвест, 2003. – С. 70–75.

Язерскі Хаім-Арон Файвелевіч – гродзенскі фотамайстар. Яго майстэрня працавала з 1897 па 1911 на вул. Саборнай (цяпер Савецкая). Дазвол на адкрыццё атрымаў 13.12.1897.

Якавюк Сымон/Сямён – пасол на сейм, беларус, належаў да першага *камітэта беларускага* (1921). Нарадзіўся ў в. Дубіны Бельскага пав., да *вайны Першай сусветнай* працаваў тэлеграфістам чыгуначнай станцыі Беласток. Падчас вайны служыў ваенным інжынерам на Каўказе. Адтуль вярнуўся ў Гродна і пэўны час займаўся гандлем. 14–25.05.1923 быў працэс над беларусамі ў Беластоцкім акруговым судзе. Іх абвінавачвалі ў здрадзе дзяржаве. Якавюку ставілі ў віну, што, з’яўляючыся польскім паслом, аб’язджаў Гродзеншчыну і агітаваў за паўстанне супраць Польшчы. У студзені 1924 вызвалены. Я. быў з *Баранам С.* на чале ковенскага ўрада (па таемным спісе). Меў сувязі з расійскай Надзвычайнай камісіяй (па-руску ЧК) з 1918 г.

Літ.: Вашкевіч А., Нарэль Д. Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант // Arche-Пачатак. – 2005. – № 5, с. 178–225; Чарнякевіч А. Нараджэнне беларускай Гародні: з гісторыі нацыянальнага руху 1909–1939 гадоў. – Мінск: Янушкевіч, 2015. – С. 76–77, 142.

Якаўлеў (Эпштэйн) Якаў Аркадзевіч (21.06.1896, Гродна ці Беласток – 29.07.1938) – савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, гісторык і публіцыст. Вучыўся ў Пецярбургскім палітэхнічным інстытуце, але не скончыў яго, бо не было фінансавых сродкаў. У 1913 уступіў у камуністычную партыю і з восені 1914 г. пачаў актыўна ўдзельнічаць у рэвалюцыйным руху (разам з сябрам напісаў лістоўку супраць вайны). Пасля дэманстрацыі 14.02.1917 ля Казанскага сабора ў Пецярбургу быў арыштаваны. У першыя дні Лютаўскай рэвалюцыі арганізоўваў палкавыя камітэты і рабочую міліцыю, быў агітатарам у вайсковых частках і на заводах. Выязджаў для вядзення партыйнай працы на Украіну. З вясны 1918 быў у Екацярынаславе – сакратаром партыйнага камітэта, рэдактарам газет, чальцом прэзідыума гарадскога савета ад бальшавіцкай фракцыі, чальцом бюро Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Украіны, старшынёй Харкаўскага рэвалюцыйнага камітэта, кіраўніком Екацярынаслаўскага і Кіеўскага губернскіх камітэтаў партыі (1918–1920). У 1924–1934 быў наркамам земляробства СССР. З 1926 рэдагаваў “Красную газету” і “Беднату”. Чалец Цэнтральнага камітэта ВКП(б) з 1930. Выбіраўся старшынёй усесаюзнага Савета калгасаў, дэлегатам VIII–XVII з’ездаў партыі. У 1937 быў прызначаны першым сакратаром ЦК КП(б) Беларусі,

раскрыў змову "ворагаў народа", але ў 1938 у Маскве сам быў рэпрэсаваны і 29 ліпеня расстраляны. Рэабілітаваны 5.01.1957.

Аўтар кніг: "Анархизм в русской революции", "Деревня как она есть", "Наша деревня", "Жизнь Ленина и ленинизм" (у суаўтарстве з Паповым), "Об историческом смысле "Октября", "Индустриализация и сельское хозяйство" і інш.

Літ.: Гродно: Ист.-экон. очерк /Крень И.П., Мараш Я.Н., Ковкель И.И. и др. – Мн.: Полымя, 1988. – С. 208–209; Деятели СССР и революционного движения России. Энциклопедический словарь Гранат. – М., 1989, стр. 276–278.

Ян з Куразвенк (магчыма, на Малашаве Мяхоўскага пав. Кялецкага ваяводства Кароны Польскай), разам з сынам атрымаў дазвол чаканіць у Гродне залатую і срэбную манеты, так званыя "перуны" (1503–1545).

Яневіч-Янеўскі Феадосі Сямёнавіч (1789–?) – гродзенскі віцэ-губернатар, выканаўца абавязкаў *губернатара* са снежня 1842 па 27.07.1844. З дваран Беластоцкай вобласці, католік. Пасля заканчэння вучобы ў Валынскім вучылішчы (4.11.1809) пачаў працаваць у Беластоцкім абласным праўленні: памочнікам перакладчыка, з 4.03.1810 – перакладчыкам, сакратаром Агульнага сходу праўлення, з 28.08.1814 – сакратаром Прыказа грамадскай апекі, з 22.09.1821 – дарадцам 2-й экспедыцыі. Даслужыўся да чына калежскага дарадцы (29.01.1837). За выдатную службу неаднойчы быў узнагароджаны: 7.10.1811 – брыльянтавым пярсцёнкам, 18.01.1830 – гадавым заробкам у 1 тыс. руб. срэбрам, 3.09.1835 – царскім "благоволением".

Указам Мікалая I ад 27.03.1838 Я.-Я. быў прызначаны на пасаду гродзенскага віцэ-губернатара. У рэзалюцыі Гродзенскага губернскага праўлення ад 8.12.1842 запісана аб передачы ўлады губернатарам *Допельмаерам* віцэ-губернатару Яневічу. Апошні выконваў пасаду губернатара 1 год і 7 месяцаў. Атрымаў чын стацкага дарадцы (верагодна, у 1843). Узнагароджаны 5 ордэнамі, знакам за XV год беззаганнай службы (1829).

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 2, воп. 3, с. 2284, а. 47; ф. 1, воп. 11, с. 1621, а. 1–1 адв.; Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – С. 57–58.

Янкоўскі Ігнаці Мікалаевіч – удзельнік паўстання грэкаў у 1820 г. Капітан Асобнага літоўскага корпуса самавольна пакінуў службу і адправіўся дапамагаць грэчаскім войскам у барацьбе супраць туркаў. У 1824 быў арыштаваны ў Гродне і ў 1826 знаходзіўся пад паліцэйскім наглядам. У 1827 меў 45 год і прасіўся ў вайсковую службу ў Асобным літоўскім корпусе. Атрымаў адмову.

Яроцкі Анатоль Іванавіч (10.07.1915, в. Вакарына, Казанскі р-н, Цюменская вобл., Расія – 01.09.2008, Гродна) – доктар медыцынскіх навук, спецыяліст па касмічнай фізіялогіі. Працаваў у Гродзенскім дзяржаўным *універсітэце* прафесарам на кафедры фізічнага выхавання. Займаўся праблемамі

рухомай адаптацыі касманаўтаў з мэтаю дабіцца праз фізічныя практыкаванні устойлівасці арганізма да ўмоў новага асяроддзя. Для гэтага выпрацаваў 35 правіл біялагічнай сістэмы выжывання ў космасе. На працягу 30 гадоў удзельнічаў у розных эксперыментах. Шмат чаго выпрабоўваў на сваім арганізме. Аўтар манаграфій: Эмоции человека и современность. – Ташкент, 1991 (у суаўтарстве); Подготовка гандболистов. – Ташкент, 1992 (у суаўтарстве); Теннис. – Ташкент, 1993 (у суаўтарстве); Проблема пространственно-временной ориентации борца. – Кинезиология. – Загреб, 1993 (у суаўтарстве); Проблемы "Жизнеустойчивость современного человека и развитие её".

Літ.: Попко И. Анатолий Яроцкий: Человек способен переносить сверхнагрузки // Гродзенская праўда. – 1992. – 1.12. – С. 3; Постаці ў гісторыі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы: гіст. нарыс / аўтар-складальнік праф. В.П. Таранцей. – Гродна: ГрДУ, 2005. – С. 26–31; Прафесары Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы. 1940–2010. – С. 123–124; Прафесары Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. 1940 – 2012: бібліяграфічны слоўнік / С. А. Габрусевіч, Я. А. Роўба. – Мінск : Друкарня Макарава і К, 2013. – С. 203–205.

Яроцкі Антон – гаспадар Гродзіч. Меў у 1863 г. 62 гады. Засядацель Гродзенскага зямельнага суда Лясота данёс у паліцыю, што ў в. Гродзічы ён знайшоў у мешчаніна г. Гродна Яроцкага *"Мужыцкую праўду"* № 2. Газету знайшоў у жніўні 1862 пры ўездзе ў веску з боку Гродна Мікалай Таўрэль. Памешчык Філарэтаў у сваім данясенні звярнуў увагу на тое, што Яроцкі апошнім часам шмат раз'язджаў па наваколлі: "назад тому месяца два делал какие-то выборы с жителей этой деревни, как денег, так и картофель. Под предлогом будто бы для собрания каких-то бумаг, потом разъезжал по деревням Царства Польского, а потому и не наводится сомнения в том, что легко могло быть и то, что письмо это разъезжало вместе с ним; причём ещё не лишним считаю упомянуть и то, что характер Яроцкого вообще: злой, беспокойный, предприимчивый, возмутительный или подстрекательный, дерзкий и неблагонадежный".

Крын. і літ.: НГАБ у Гродне, ф. 1, воп. 22, с. 1121, а. 279, 283–285; Каліноўскі К. За нашую вольнасць Тв., дак. — Мн., 1999; Кісялёў Г. З думай пра Беларусь. Мн., 1966, с. 31; Смирнов А.Ф. "Мужицкая правда"//Восстание 1963 г. и русско-польские революционные связи 60-х г. М., 1960, с. 50; Станкевіч А. Кастусь Каліноўскі: "Мужыцкая праўда" і ідэя незалежнасці Беларусі. Вільня, 1933.

Ясенскі/Ясінскі Ян – дырэктар каралеўскай друкарні (1784–1788 гг.), хаця яшчэ 9.05.1792 атрымаў ад віленскага магістрата разам з Ігнацыем Урублеўскім прывілей на адкрыццё друкарні ў Вільні. Зрабіў гэта ў Гродне (1794–1797). Я. валодаў у горадзе пляцам з камяніцай. Адпаведна *перапісу насельніцтва Гродна ў 1794* вартасць маёмасці Я. дасягала 30 тыс. злотых. Я. падпісаў акт далучэння да *паўстання 1794* як "абывацель Гродзенскага павета". Быў сябрам крымінальнага суда ў *парадкавай камісіі* Гродзенскага пав. Сябра кантрыбуцыйнай дэпутацыі. Жыў на вуліцы Маставой. Каля 1797 перанёс друкарню

ў Вільню, дзе працягваў друкаваць “Кур’ер Літоўскі” (з 1.04.1797), друкаваў матэрыялы *Літоўскага Трыбунала*. У 1802 друкарня спыніла сваё існаванне, абсталяванне было прададзенае Віленскаму ўніверсітэту за 1037 руб.

Літ.: Drukarze dawnej Polski od XV do XVIII wieku T. 5. Wielkie Księstwo Litewskie / Oprac. A. Kawecka-Gryczowa, K. Korotajowa, W. Krajewski. – Wrocław, Kraków, PAN, 1959, s. 100–101; Encyklopedia wiedzy o książce. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Zakład narodowy im. Ossolinskich,, 1971. – s. 1066; Grodno w XVIII wieku. Miasto i ludność (na tle trendów rozwojowych od średniowiecza do 1936 roku) / Red. A. Woltanowskiego i J. Urwanowicza. – Białystok, 1997. – S. 73, 102.

Ясінскі/Ясенскі Людвік Барталамей (1800–1842) – ксёндз. Скончыў *гімназію* ў Гродне, у 1818 уступіў у дамініканскі ордэн. Удзельнічаў у *паўстанні 1830–1831* гг. – капелан 12 палка ўланаў. Быў сасланы ў Сібір, але змог збегчы ў эміграцыю. Жыў у Францыі, дзе выказваў ідэі сацыяльнай роўнасці.

Літ.: Encyklopedia Ziemi Wileńskiej. T. 1. Wileński słownik biograficzny. – Bydgoszcz: Zakład poligraficzny SPRINT, 2008. – S. 174.

Ясінскі Тадэвуш, паводле ўспамінаў настаўніцы гродзенскай *гімназіі* Г. Ліпінскай, быў 21.09.1939 г. укрыжаваны на савецкім танку падчас атакі Чырвонай арміі на Гродна. Яму было 13 гадоў – адзіны сын Зоф’і Ясінскай, бацькі не меў, выхоўваўся ў Прытулку міласэрнасці. Удзельнічаў у баі: кінуў бутэльку з бензінам у танк, але не падпаліў яго. Чырвонаармейцы збілі Ясінскага, застрэлілі і затым прывязалі да танка. Даследчыкі сцвярджаюць, што ўкрыжаваць чалавека на танках Т–26, БТ ці Т–37 немагчыма, каб не закрыць агляд механіку-вадзіцелю. Пахаваны на каталіцкіх могілках Гродна, дзе на сцяне капліцы ў яго гонар усталяваная памятная дошка. У 2009 г. узнагароджаны прэзідэнтам Лехам Качынскім Крыжам Камандорскім ордэна Адраджэння Польшчы.

Крын. і літ.: Малишевский Н. Бой за Гродно в сентябре 1939 года глазами участников и очевидцев. – Мн.: Издатель А.Н. Вараксин, 2012. – С. 120; Lipińska G. Jeśli zapomnę o nich. – Warszawa, 1990. – S. 20–21;

Ясінскі Юзаф (2 пал. XVIII ст., Беларусь – 22.09.1833) – аўтар першай польскай “Антрапалогіі”. Вучыўся ў Гродне у *школе медыцынскай Жылібера*, тут выкладаў і Е. Форстэр (?) – удзельнік 2 выпраў вядомага вандроўніка Кука. Меў тытулы доктара філасофіі, медыцыны і хірургіі, займаўся ўрачэбнай практыкай. Быў сябрам Віленскага медыцынскага таварыства. Яго “Antropologia o własnościach człowieka fizycznych i moralnych” складзеная ў 1810 г., надрукавана ў 1818 у друкарні Ю. Завадскага ў Вільні. Я. быў прыхільнікам эвалюцыйнай тэорыі, лічыў, што няма змястоўнай розніцы паміж чалавекам і жывёлай, якія абое маюць душу, выдзяляў этапы генетычнага развіцця чалавека.

Літ.: Materiały do dziejów literatury i oświaty… T. 1. – Wilno, 1935 – s. 159–160.

Ясяніца Павел Мікалаевіч, сапраўднае Бейнар Леан Лех (10.11.1909, Сімбірск – 19.08.1970, Варшава) – гісторык, пісьменнік, публіцыст. Пасля заканчэння гімназіі ў Варшаве, Апатаве і Гродне (дзе здаў іспыт на атэстат сталасці) вучыўся на гістарычным факультэце Віленскага ўніверсітэта (1828–32). Выкладаў гісторыю ў гродзенскай *гімназіі* імя Г. Сянкевіча (1934–37). Быў сакратаром праўлення філіяла *таварыства Польскага гістарычнага* ў Гродне (1935), сябрам арганізацыі нацыянальнага аб'яднання гродзенскай акругі (1937). У канцы 1937 пераехаў у Вільню і пачаў працаваць вядучым на радыё (1937–39), у рэдакцыі газеты "Słowo Wileńskie". Быў удзельнікам вайны 1939 г. і руху супраціву на Віленшчыне, афіцэрам Арміі Краёвай падчас *вайны Другой сусветнай*, у 1944 быў рэдактарам канспіратыўнай газеты "Pobudka", удзельнічаў у баях за Вільню. Пад Гроднам быў арыштаваны органамі НКУС. Пасля мабілізацыі ў польскую Армію Народную збег у *Армію Краёвую*. Быў паранены і хаваўся ў в. Ясяніца – адсюль і прозвішча. Пасля вайны жыў у Кракаве, працаваў публіцыстам у мясцовых газетах. У 1948 арыштаваны органамі бяспекі. Пасля вызвалення ў 1950 перасяліўся ў Варшаву, працаваў старшынёй таварыства "Caritas". У 1966 падпісаў пратэст польскіх інтэлектуалаў супраць узмацнення цэнзуры ("Спіс 34"), стаў віцэ-старшынёй польскага ПЭН-клуба. За адкрытую падтрымку пратэстаў моладзі ў сакавіку 1968 творы Ясяніцы апынуліся пад забаронай. Творы: "Polska Piastów", "Polska Jagielonów", "Rzeczpospolita Obojga narodów", "Zygmunt August na ziemiach dawnego Wielkiego Księstwa" і інш.

Літ.: Skolny Słownik Historii Polski / P. Grejner, E. Gronkowska, R. Kaczmarek, K. Miroszewski. – Katowice: Videograf II, 2000. – S. 135–136; Ossowski J. S., Komolka J. Jasienica Paweł // Słownik biograficzny historii Polski. T. 1 / pod red. J. Chodery i F. Kiryka. – Wrocław, Warszawa, Kraków: Wyd-wo Zakład Narodowy im. Ossolińskich, 2005. – s. 130; Venclova T., Wilno. Przewodnik biograficzny. – Warszawa: PIW, 2013. – s. 322–323.



С. 920

Яўрэі, з'явіліся ў Гродне ў XII ст., калі сыходзілі выгнаныя з Кіеўскай Русі і пакідалі Заходнюю Еўропу пад націскам *крыжакоў*. 18.06.1389 гарадзенскія яўрэі паводле прыкладу брэсцкіх атрымалі ад *Вітаўта* прывілей, які даваў ім правы ды вольнасці і вызначаў адносіны яўрэяў да вялікага князя і астатняга насельніцтва. Арыгінал не захаваўся, а ўспамінаецца ў прывілеі Жыгімонта II Аўгуста ад 19.08.1547 і пацверджаны ў прывілеях Яна II Казіміра ад 20.06.1655 і Станіслава Аўгуста ад 19.12.1785. Некаторыя гісторыкі лічаць названы прывілей Вітаўта фальсіфікатам. Напрыклад, Ежы Ахмянскі звяртае ўвагу на такія памылкі: згаданы ў дакуменце гараднічы Іван Федаровіч жыў у 1 палове XVI ст.; індыкт 3 не згодны з 1389 г., павінен быць 12; спасылкі на брэсцкі прывілей, які таксама з'яўляецца фальсіфікатам. У XV ст. гданьскія і пазнаньскія крыніцы зафіксавалі гарадзенскіх яўрэйскіх купцоў, якія вялі ў гэтых гарадах гандаль, напрыклад, Слома гандляваў сукном, футрамі, срэбнымі паясамі і карэннем у Гданьску, а Мошка заключыў кантракт з групай пазнаньскіх купцоў. У маі 1495 яўрэі былі выселеныя з ВКЛ, у тым ліку і з *Горадні*, а іх нерухомасць перайшла ва ўласнасць віленскага біскупа В. Табара,

канцлера і віленскага ваяводы М. Радзівіла. Частку пляцаў атрымала гарадская абшчына. У 1503 яўрэі вярнуліся, вялікі кн. *Аляксандр* “казал им вернути домы их, и клети на *Рынку* в месте Городенском”. У сярэдзіне XVI ст. у яўрэяў быў 61 пляц на прызамкавым абшары, недалёка ад *замка Старога* ў 1575–78 пабудавалі *сінагогу Вялікую*, а насупраць яе – “школу жыдоўскую”. Уздоўж *Гараднічанкі,* у паўночным напрамку ад сінагогі, знаходзіліся самыя старыя *могілкі яўрэйскія*. Былі таксама свае *лазня, калодзеж, шпіталь* і кагальны дом. Ліст Яна Казіміра да яўрэяў Горадні 2.01.1688 абвінавачваў іх у выцясненні з вул. Замкавай хрысціян, у прыцясненнях манахаў, пабудовах *корчмаў* на *могілках* хрысціянскіх, пахаванні памерлых на вул. Замкавай, каля каралеўскай рэзідэнцыі замест прызначанага месца за горадам, у прыёме на працу чэлядзі з хрысціян, выездах за мяжу без дазволу ўраднікаў, у няпродажы алкаголя ў суботу і адкрыцці корчмаў у хрысціянскія святы, правядзенні з’ездаў у сінагозе без дазволу *магістрата.*

Акрамя кампактнага пражывання ў абшары ад *замка Старога* да *Рынку* Я. валодалі сядзібамі на вул. Плябанскай, Садоўніцкай, Аліскоўскай. У першай палове XVIII ст. сталі пасяляцца на *занёманскім прадмесці.* Там яны мелі свае *сінагогу драўляную* і могілкі. Паміж яўрэямі занёманскімі і гродзенскім *кагалам* былі канфлікты з-за невыканання першымі “кагальных павіннасцяў”. Паводле звестак 1764–65 у горадзе жыло 2 555 яўрэяў, а ў 1794 – 2 780 (больш за 43% гараджан).

У 1 томе “Актов, издаваемых Виленскою археаграфическою комиссией” апублікаваныя прывілеі, дадзеныя гродзенскай яўрэйскай суполцы вялікімі князямі літоўскімі і каралямі польскімі *Стэфанам Баторыем* (пацвярджэнне былых *прывілеяў*), *Уладзіславам IV* (адбудаваць дамы і сінагогу на вул. папярэчнай Жыдоўскай; права гандлю купленым у мяшчан і землеўладальнікаў хлебам на рынках, лаўках і ў асабістых дамах, а таксама соллю, селядцамі з аплатай пошліны і без вывазу на суднах па Нёмане); *Янам II Казімірам* (пацвярджэнне былых прывілеяў на дазвол пабудаваць дамы і сінагогі з умовай, каб яны не былі вышэйшыя за звычайныя дамы); Міхаілам Карыбутам Вішнявецкім (на правы гандлю); Янам III Сабескім (падвярджэнне папярэдняга прывілея). Я. пераследаваліся каталіцкім духавенствам у XVII ст., пацярпелі падчас *войнаў Паўночнай* у 1705, *Першай і Другой сусветных*, эпідэміі 1740, *яўрэйскіх пагромаў.* Я. займаліся гандлем (асабліва любілі гандляваць алкагольнымі напоямі; кнігамі), рамяством (вытворчасць адзення – краўцы, кушняры, шапачнікі; пераплётчыкі, друкары, злотнікі, ліцейшчыкі, шкляры і інш.). У канцы XIX ст. Я. складалі больш за 50% гараджан, а ў 1939, перад *вайной другой сусветнай* яўрэем быў кожны другі жыхар (да 20 000 чал.). У Гродна ўцякалі яўрэі з тэрыторыі акупаванай Польшчы. У 1939–1941 савецкая ўлада дапускала яўрэяў да іх традыцыйнага занятка – гандлю: закупка, продаж, перапродаж, лагістыка, складская праца. Пры гэтым Я. не забываліся рабіць і свае прыватныя гешэфты, выкарыстоўваючы свае старыя сувязі і новае становішча пры новай уладзе. На пачатку XXI ст. у горадзе прызнаюць свае яўрэйскія карані каля 2 тыс. чал.

Можна ўспомніць па прозвішчах некаторых асобаў, якія пакінулі свой след у гісторыі Гродна: прамыслоўцаў *Л. і Ё. Шарашэўскіх*, Файнгольда, *М. Харына*; гандляроў *У. Вейсбрэма*, *Л. Фукса*; друкароў *Д. Мейлаховіча, Зімеля, Лапіна*; вучоных *Л. Заменгофа*, *Б. Клейна, Б. Фіха*; паэта *Л. Найдуса*; мастака *Л. Бакста*; фатографаў *Х.-А. Язерскага, Х. Біньковіча, Л. Блоха, Л. Гельгара, М. Папірнага, М. Рубінштэйна* і інш.; дзеячаў рэвалюцыйнага руху Е. Гальдштэйна, К і П. Лебіт, *І. Пата*, Ф. Цэгельніцкую, *Я. Якаўлева/Эпштэйна*; равіна Нохіма. Пра некаторых з іх ёсць асобныя артыкулы ў дадзенай энцыклапедыі.

Пра цікавую гарадзенскую яўрэйку Хайку (канец 19 – пач. 20 ст.) расказвае ў сваіх успамінах Г. Рот. Яна сядзела каля гатэля "Славянскі" на вул. Саборнай/Савецкай і гандлявала папяросамі. Але славутай была з-за таго, што "была крыніцай навін пра ўладныя і асабістыя падзеі, пра плёткі усёй губерні". Яна ведала пра маёнткі на продаж, пасагі нявест, месцы працаўладкавання, магла зрабіць у канцылярыі губернатара пашпарт на выезд за мяжу, знайсці скрадзеныя рэчы, добрага повара ці лакея, мела звычай прыходзіць да гасцей гатэля, каб даведацца пра навіны і прапанаваць сваю дапамогу.

Палітычныя погляды яўрэяў прадстаўлялі партыі *сіяністаў, Бунд, "Паалей Цыён" ("Рабочыя Сіёну")*. Я. Гродна на працягу стагоддзяў перанеслі рознага кшалту пераслед: высяленне з дамоў з-за фінансавай запазычанасці; забарона набываць пэўную маёмасць; эканамічны байкот; жыццё на тэрыторыі яўрэйскай аселасці; яўрэйскія пагромы; у 1939–41 зведалі дэпартацыі; у вайну *Другую сусветную* з чэрвеня 1941 павінныя былі насіць жоўтую зорку Давіда, амаль адразу трапілі пад расстрэлы, затым сядзелі ў *гета*.

Я. Гродна размаўлялі на ідыш, маліліся на іўрыце, ведалі беларускую, польскую, рускую мовы. Раней мелі свае адукацыйныя ўстановы *школу* (хедэр) і ешыву на вул. Калючынская, 23; гімназію "Тарбут" на вул. Кірава, 40; рамеснае вучылішча імя Э. Брэгмана на вул. Вялікай Траецкай, 2 Яўрэйскія бібліятэкі знаходзіліся ў *сінагозе Вялікай харальнай*, управе яўрэйскага кагалу, пры кніжных крамах. Яўрэі мелі аркестр, *спартыўныя аб'яднанні* і тэатральнае таварыства. У 1990-х адкрылі свой музей у Вялікай харальнай сінагозе, сустракаюцца ў ёй на рэлігійных святах і падчас розных культурных мерапрыемстваў.

Літ.: Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сяроднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – С. 82–84, 142, 165, 216–231; Баціс М., Буцько У., Крапівіна Н., Паняеў А., Сабалеўская В., Фядосава Ю., Ханф Э., Шлёгель Г., Гародня: сьляды яўрэйскага жыцця. Праваднік па яўрэйскай Гародні // Arche. – 2010. – № 6 (93). – С. 378–386; Гардзееў Ю., Заўвагі да пытання часу заснавання яўрэйскіх могілак Гародні // Гарадзенскі гадавік. – 2017. – № 5. – С. 116; Гардзееў Ю. Магдэбургская Гародня. – Гародня, Вроцлаў, 2008. – С. 274–279; Сліж Н. Праца гарадзенскага магістрата ў другой палове XVII ст.// Przegląd Środkowo-Wschodni. – 2021 – № 6. – S. 50–51; Czarnowski R. J. Grodno. Zapomniana stolica. – Warszawa: oficyna wydawnicza RYTM, 2015. – C. 157–164; Grodno w polskim okresie jego dziejów // Głos znad Niemna. 1917: jednodniówka grodzieńska – Grodno, 1918. – S. 27–31; Helena z Janczynowskich Roth, Czasy. Miejsca. Ludzie. Wspomnienia z kresów wschodnich, Kraków, 2009,

s. 112–113; Pilarczyk K. Leksykon drukarzy ksiąg hebrajskich w Polsce (XVI – XVIII wiek). – Kraków: Antykwa, 2004. – S. 66; Vitoldiana. Codex privilegiorum Vitoldi Madni Ducis Lithuaniae. 1386–1430 /Zebrał i wydał J. Ochmański. – Warszawa, Poznań, 1986. – S. 180–181.

Яўрэйскія пагромы гл. **Пагромы яўрэйскія.**

Яўстафі – гарадзенскі дзяк. У 1466 г. напісаў "Триодъ" – праваслаўную богаслужэбную кнігу на старабеларускай, дзяржаўнай мове ВКЛ (хутчэй за ўсё "Триодъ постную", дзе знаходзіліся спевы і малітвы да Вялікага паста).

Яўх Даніэль Ян Іахім Хрысціян (1684 – 3.05.1754, Вернава). У Польшчы з 1713 г.: палкоўнік (1736), генерал войск каронных (1748) і саксонскіх (1751), інспектар будаўніцтва. У 1722 набыў двор у Кракаўскім прадмесці Варшавы. У 1727 быў прадстаўніком караля падчас набыцця Сандамірскага палаца. У 1734 пабудаваў у Гродне *замак Новы* (асноўны будынак, сенацкую і пасольскую залы). Менавіта ён выбраў для яго месца і быў аўтарам першага праекта (да 1726). У гэты час жыў у гродзенскім *палацы Сапегаў* (у пакоі каля Канферэнцыйнага зала), меў супрацоўнікаў. Дапамагаў адбудоўваць *касцёл бернардзінскі* пасля яго *пажару*. Аб яго высокай кваліфікацыі гаворыць той факт, што ён быў запрошаны для нагляду будаўніцтва саксонскага палаца ў Варшаве ў 1735 г. У 1752 яго зноў запрасілі ў Гродна для падрыхтоўкі замка для патрэб сеймавых паседжанняў.

Літ.: Szymański S, Pałac królewski w Grodnie // Rocznik Białostocki. T. VI. – 1966. – S. 324–325.

Яўх Юзаф (? Верона – 21.12.1798, Вільня) – архітэктар польскага караля. У Рэчы Паспалітай працу пачаў у 1735 г. – маёрам кавалерыі, гарадзенскім гараднічым (з 1774 на пастаяннай службе ў *Тызенгаўза А.*). Рэстаўраваў *палац на Гарадніцы*, з 1784 разбудоўваў *палац Радзівілаў*.

Літ.: Szymański S, Pałac królewski w Grodnie // Rocznik Białostocki. T. VI. – 1966. – s. 316.

Яцвягі – заходне-балцкае племя, першы ўспамін пра якое захоўваецца ў летапісах пад 983 г. На тэрыторыі Я. узнік *Горадзен/Городна* спачатку як гарадзішча, а ў канцы X ст. як горад на *Замкавай гары*. У X–XIII стст. Я. жылі на Падляшшы, Берасцейскай зямлі, часткова ў Верхнім Панямонні, і іх заходняй крэпасцю лічыўся Драгічын. Вядомы паход на яцвягаў войскаў кіеўскіх князёў з удзелам гарадзенскага князя *Усевалада Давыдавіча* (1132). Гісторык А. Латышонак сцвярджае, што "ёсць падставы сур'ёзна паставіцца да гіпотэзы, што існавала протадзяржаўная сіла, якая арганізоўвала ўсю тэрыторыю паміж Нёманам, Бугам і Прыпяццю і магчыма, што ёю з'яўлялася карпарацыя яцвягаў". Да канца XIII ст. *крыжакі* захапілі тэрыторыі Я. Згодна з Іпацьеўскім летапісам *Тройдзень* у 1276 пасяліў яцвягаў у ваколіцах Горадзена, і яны ў гэтым і наступным годзе баранілі горад ад крыжакоў.

Літ.: Госцеў А.П., Швед В.В. Кронан. Летапіс горада на Нёмане (1116 – 1990) – Гродна: НВК "Пергамент", 1993. – С. 11; Латышонак А. Раньнесярэднявечнае Гарадзенскае княства ў гістарыяграфіі апошняга дваццацігодзя // Ён жа. Нацыянальнасць – Беларус. – Б.м., 2012, с. 357–368; Энцыклапедыя Гісторыі Беларусі. Т. 3. – Мінск: БелЭн. 1996. – С. 147; Т. 6. – Мінск: БелЭн., 2003. – С. 312; Grodno w polskim okresie jego dziejów // Głos znad Niemna. 1917: jednodniówka grodzieńska – Grodno, 1918. – S. 17.

Ячыноўскі Станіслаў С. (?–1920) – гродзенскі адвакат, уладальнік маёнтка Янцэвічы ў Брэсцкім у. Пасля смерці С. Нагорскага, мужа *Э. Ажэшкі*, замаўся яе справамі. Напрыклад, продажам маёнтка Гнойніца *таварыству Гродзенскаму сельскагаспадарчаму.*

Літ.: Orzeszkowa E. Listy zebrane / red. E. Jankowski. T. I. – Wrocław: Wydawnictwo PAN, 1961. – S. 373; E. Orzeszkowa. Dnie, s. 218, 270.

Бібліяграфія гісторыі Гродна

Дадзены спіс складзены на базе:

- Афіцыйных бібліяграфічных прац, падрыхтаваных супрацоўнікамі НББ:
  1. Белоруссия в печати XIX – начала XX столетия: Библиография на иностранных языках. Ч. 2 / Сост. М.А. Василевская. – Минск: Гос. б-ка БССР им. В.И. Ленина, 1983. – 418 с.
  2. Белоруссия в печати начала XX столетия. Ч. 1. /Сост. М.А. Василевская. – Минск: Гос. б-ка БССР им. В.И. Ленина, 1980. – 408 с.
  3. Бібліяграфія па гісторыі Беларусі. Феадалізм і капіталізм / склад. М.Г. Краканэ, А.А. Сакольчык; пад рэд. Е.І. Карнейчыка, С.А. Шчарбакова. – Мінск: Фундамент. б-ка імя Я. Коласа АН БССР, 1969. – 437 с.
  4. Кніга Беларусі. 1517 – 1917: зводны каталог / склад. Г.Я. Галенчанка [і інш.]. – Мінск: БелСэ, 1986. – 615 с.
  5. Русская дореволюционная книга о Белоруссии (1802–1916 гг.): библиография / сост. А.А. Сакольчик. – Минск: Гос. б-ка БССР им. В.И. Ленина, 1964. – 311, V с.; 2-е изд. – Минск, 1974.
  6. Сакольчик А.А. Дооктябрьская книга на русском языке о Белоруссии (1768–1917 гг.): библиогр. указ / под ред. Ю.И. Драгуна. – Минск: Гос. б-ка БССР им. В.И. Ленина, 1976. – 425 с.
- Выкарыстаны бібліяграфічныя публікацыі і каталогі бібліятэк:
  1. Bibliografia Polska XIX stulecia. T. IX. / Pod red. K. K. Estreihera, profesora U.J. – Kraków: PWN, 1970.
  2. Гродзенская губерня. 1801–1921: бібліягр. паказ.: [рукапіс] / Гродзен. абл. навук. б-ка імя Я.Ф. Карскага; Л.У. Здрадоўская, Л.І. Турмасава. – Гродна, 2011. – 282 с.
  3. Каталогі бібліятэк: Бібліятэка Універсітэта Варшаўскага (Biblioteka Uniwersytetu Warszawskiego), Нацыянальная бібліятэка ў Варшаве (Biblioteka Narodowa), Нацыянальная бібліятэка Беларусі ў Мінску (НББ), Гродзенская навуковая бібліятэка імя Я. Карскага.
  4. Borowik P. J. Jurydyki miasta Grodna w XV–XVIII wieku. Stanowy podział nieruchomości. – Supraśl, 2005. – S. 339–364.
- Праведзены асабістыя бібліяграфічныя пошукі па публікацыях зборнікаў матэрыялаў канферэнцый, зборнікаў навуковых артыкулаў, у часопісах, манаграфіях і калектыўных працах.

- Сабраны аўтарскія спісы прац, прысвечаных Горадні, падрыхтаваных па просьбе аўтара дадзенай кнігі
- Прагледжаны рэсурсы Інтэрнэта (Hrodna life; Harodnia.com; s.13.ru і іншыя).

Авдей Ю.А. Благотворительная деятельность Католического общества «Каритас» в Гродно / Ю.А. Авдей // Хрысціянства ў гістарычным лёсе беларускага народа: зб. навук. арт.: у 2 ч. – Гродна: ГрДУ, 2009. – Ч. 2. – С. 344–348.

Ад Каложы да фартоў праз дзесяць стагоддзяў гісторыі Гродна (і адну «рэканструкцыю…): матэрыялы «круглага стала» 28 кастрычніка 2006 года / склад. А. Чарнякевіч. – Гродна, 2006.

Ad majorem Dei gloriam: Аднаўленне і рэстаўрацыя галоўнага алтара ў гродзенскім касцёле Св. Францішка Ксаверыя / над тэкстамі працавалі І. Бурак, Г. Серэган, С. Шаўчэнка / рэд. І. Бурак. – Мн.: Pro Hrysto, 2011. – 38 s.+ 4.

Адольф К. О состоянии бечевника в пределах гор. Гродно с санитарной точки зрения. (Виленский судоходный съезд 1904 г.). – Вильна, 1904. – 10 с.

Адрес-календарь и справочная книжка Гродненской губернии. – Гродно,1860–1915. [У 1867 г. пад назвай «Адрес-календарь служащих в Гродненской губернии лиц гражданского, военного и духовного ведомств»; в 1879–1889 гг. – «Памятная книжка Гродненской губернии. Адрес-календарь и статистическо-справочные сведения»; в 1890–1910 гг. – "Памятная книжка Гродненской губернии"].

А.С. Церковные торжества в гор. Гродне 13 – 15 октября 1934 года. – Варшава: Синодальн. тип., 1934. – 18 с.

Акерман Ф. Ідэнтычнасць на пашпарце: увядзенне афіцыйных пасведчанняў // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі. – Мінск, 2009. – С 3–7.

Акерман Ф. З вёскі ў Гародню: саветызацыя Заходняй Беларусі як працэс акультурацыі / культурнай асіміляцыі мігрантаў з вёскі / Ф. Акерман // Arche. – 2010. – № 1–2. – С. 493–516.

Акерман Ф. Нямецкая акупацыя Горадні ў чэрвені 1941 – ліпені 1944 // Arche. – 2010. – № 7–8. – С. 204–269.

Акерман Ф. Дэмаграфічнае разбурэнне Гародні ў 1939–1949 гг. / Ф. Акерман // Гістарычны альманах. – 2011. – Т. 17. – С. 29–63.

Акерман Ф. Дзяржаўны антысемітызм у Савецкай Беларусі канца 1940-х – пачатку 1950-х гг.: гродзенскі водгук "справы лекараў" / Ф. Акерман // Горад Святога Губерта: альм. лакал. гісторыі / рэд. І. Соркіна [і інш.]. – Гродна, 2014. – Вып. 9. – С. 134–141.

Акерман Ф. Гісторыя Гародні (1919–1991). Нацыяналізацыя, вынішчэньне і саветызацыя сярэднеэўрапейскага места/ нав. Рэд. В. Булгакаў. – Смаленск: Інбелкульт, 2021. – 488 с.

Акінчыц Р.М. Гліняныя формы – матрыцы гродзенскага рамесніка другой паловы XVII ст. / Р.М. Акінчыц // Краязнаўчыя запіскі. – Гродна, 1993. – Вып. 2. – С. 55–61.

Акінчыц Р.М. Ганчарства старажытнага Гродна XI-пач.XV стст. / Р.М. Акінчыц // Краязнаўчыя запіскі. – Гродна: Выд-ва Гродз. абл. аддзела БФК, 1997. – Вып. 4. – С. 51 – 57.

Акінчыц Р.М. Некаторыя тыпы вырабаў гродзенскіх ганчароў у XVI-XVII ст. / Р.М. Акінчыц // Краязнаўчыя запіскі. – Гродна, 2000. – Вып. 5. – С. 74–76.

Акты издаваемые Виленской археографическою комиссиею. Т. 1. Акты Гродненского земского суда (1540–1795 гг.). – Вильна, 1865. – 377 с.

Акты издаваемые Виленской археографическою комиссиею. Т. 5: Акты Брестского и Гродненского гродских судов с присовокуплением привилегий на землевладение в Брестской и Кобринской экономиях (1577–1769 гг.). – Вильна, 1871. – 42+432 с.

Акты издаваемые Виленской археографическою комиссиею. Т. 7: Акты Городненскаго гродскаго суда (1510–1784 гг.). – Вильна. 1874. – 16+614 с.

Акты издаваемые Виленской археографическою комиссиею. Т. 17: Гродненского земского суда (1539–1565 гг.). – Вильна, 1890. – 73+559 с.

Акты издаваемые Виленской археографическою комиссиею. Т. 21: Гродненского земского суда (1555–1558 гг.). – Вильна, 1894. – 41+418 с.

Александров Ф. Гродненский архив / Ф. Александров // Архивное дело. – 1940. – № 4. – С. 60–64.

Алексеева Т. Как создавалась знаменитость / Т. Алексеева. – Слоним: ГОУПП «Слоним. тип.», 2001. – 95 с.

Алфавитный указатель к Запретительной книге по Гродно. – СПб., 1898. – 4 + 16 с.

Аляксееў Л.В. Гродна і помнікі Панямоння / Л.В. Аляксееў. – Мінск.: Беларус. навука, 1996. – 191 с.

Амелька С. Геральдычныя, генеалагічныя і эпіграфічныя крыніцы Беларусі Горадня (працяг) // Герольд. Litherland. – 2001. № 2. – С. 78.

Амелька С. Геральдычныя, генеалагічныя і эпіграфічныя крыніцы Беларусі: Горадня // Герольд. Litherland. – 2001. – № 3–4. – С. 120–121.

Амелька С. Геральдычныя, генеалагічныя і эпіграфічныя крыніцы Беларусі: Горадня // Герольд. Litherland. – 2002. – № 1–4. Год II. – С. 36–37.

Амелька С. Станаўленне і развіццё перыядычнага друку на Гродзеншчыне ў пасляваенны час // 60-летие образования Гродненской области. – Гродно: ГрГУ, 2004. – С. 235–238.

Андруковіч В. Страчаная спадчына Гародні / В. Андруковіч. – Вільня, 2015. – 72 с.

Андэрсан Ф. У гродзенскай турме. Верасень 1863 / Ф. Андэрсэн // Горад святога Губерта: альм. лакал. гісторыі. – Гродна, 2013. – Вып. 7. – С. 42–81.

Антановіч З. Гарадзенскі каптуровы суд у XVII–XVIII стст. / З. Антановіч // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI – XX ст. / пад рэд. А.Ф. Смалянчука, Н.У. Сліж. – Мінск: Зміцер Колас, 2011. – С. 57–83.

Антонаў І. Успаміны аб польскай акупацыі Горадзеншчыны у 1919–1921 гг.: малюнкі гвалту і зьдзеку фацетных польскіх паноў на Беларусі: (Мае перажываньні). – Б.м., 1921.

Арашэвіч А.А., Бажэнава В.Д. Гродзенскі кафедральны касцёл Св. Францішка Ксаверыя. – Мн., 2005.

Арлукевич А. Памятные книжки гродненской губернии как источник по изучению гродненского военного гарнизона / А.Б. Арлукевич // Этих дней не смолкнет слава: сб. науч. ст. / ГрГУ им. Янки Купалы. – Гродно, 2008. – С. 73–79.

Арлукевич А. Гродненский военный гарнизон в 80-е – 90-е гг. XIX века / А.Б. Арлукевич // Наука 2010: сб. науч. ст.: в 2 ч.: / ГрГУ им. Янки Купалы. – Гродно, 2010. – Ч. 1. – С. 91–96.

Арлукевич А. Офицерское собрание гродненского гарнизона по материалам его устава / А.Б. Арлукевич // Наука 2010: сб. науч. ст. в 2 ч.: / ГрГУ им. Янки Купалы. – Гродно, 2010. – Ч. 2. – С. 103–108.

Арлукевич А.Б. Постойная повинность и расквартирование войск Гродненского гарнизона во второй половине XIX – начала XX в. // Гродненщина в историческом, экономическом и культурном развитии 1801–1921 (к 200-летию образования Гродненской губернии). – Гродно:ГрГУ, 2012. – С. 140–142.

Археалагічныя даследаванні ў Гродна ў 2012 г. / Г. Семянчук [і інш.] // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мінск, 2003. – № 18.

Археалогія Беларусі: у 4 т. / НАН Беларусі, Ін-т гісторыі. Т. 3: Сярэднявяковы перыд (IX-XIII ст.) / Я.Г. Звяруга [і інш.]; навук. рэд. П.Ф. Лысенка. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – 554 с.

Археалогія і нумізматыка Беларусі: энцыкл. / рэдкал.: В.В. Гетаў [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 1993. – 702 с.

Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси. Т. 9. Хроника первоначально православных, а потом униятских монастырей – Супрасльского и Коложского. – Вильна, 1870. – 10+486 с.

Архітэктура Беларусі: энцыкл. / рэд.-склад. М.М. Клімковіч. – Мінск: БелЭН, 1982. – 228 с.

Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: А.А. Воінаў [і інш.]. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1993. – 620 с.

Афанасьева Т.Ю. История гродненской фарной аптеки в документах ЦГИА БССР в Гродно / Т.Ю. Афанасьева // Историко-медицинские памятники и здравоохранение Гродненщины. – Гродно, 1990. – С. 116–117.

Афанасьева Т. Герой 1812 года / Т. Афанасьева // Памяць: гіст.-дакум. хроніка горада Гродна. – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 172–174.

Афанасьева Т.Ю. Благотворительное общество при Гродненском фарном костёле / Т.Ю. Афанасьева // Misericordia. – 2000. – № 2. – С. 25–26.

Афанасьева Т.Ю. Развитие торговли в Гродненской губ. в первой половине XIX в. / Т.Ю. Афанасьева // 60-летие образования Гродненской области: материалы междунар. науч. конф. – Гродно, 2004. – С. 63–65.

Афанасьева Т.Ю. и др. Гродненская губерния в законодательных актах Российской империи (1801 – 1913) / Т.Ю. Афанасьева. – Слоним: Слним. тип., 2004. – 360 с.

Афанасьева Т.Ю. Гродненские губернаторы (1801 – 1917): докум.-биограф. очерки / Т.Ю. Афанасьева, Р.Ф. Горячева, В.В. Швед. – Гродно: Гродн. тип., 2007. – 168 с.

Афанасьева Т.Ю. "Гродненские губернские ведомости" в фондах Национального исторического архива Беларуси в Гродно // Гарадзенскія чытанні: зб. матэрыялаў. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2011. – С. 28–30.

Бажэнава В. Роспісы гродзенскай катэдры Святога Францішка Ксаверыя / В. Бажэнава // Наша вера. – 2002. – № 1. – С. 60–63.

Балансы и отчёты Гродненского общества взаимного кредита // Вестник финансов, промышленности и торговли. – 1885. – № 20; 1886. – №№ 41, 44, 48, 50; 1889. – №№ 27, 28, 32, 36, 44, 49; 1891. – №№ 14, 20; 1895. – № 38; 1900. – №№ 2, 34.

Баскаков В. Северная война 1700–1721 гг. Кампания от Гродно до Полтавы. 1700–1709 гг.: критико-ист. исследование. Вып. 1: Краткий очерк событий до кампании. Краткий очерк театра войны / В. Баскаков. – СПб., 1890. – 200 с.

Батракова К.П. Галоўныя напрамкі краязнаўчай работы ЦДГА БССР у г. Гродне / К.П. Батракова // Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства. – Гродна, 1990. – С. 54–56.

Батракова К.П. Тытунёвая фабрыка ў Гродне / К.П. Батракова // Гарадзенскія запісы: старонкі гісторыі і культуры. – Гародня: ГрДУ, 1993. – Вып. 1. – С. 110–113.

Батура Н.В. Тэатральнае і музычнае жыццё г. Гродна ў 1939–1941 гадах / Н.В. Батура // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 334–339.

Баціс М. Ober Ost і нямецкая акупацыя Гародні ў Першую сусветную вайну паводле Дзённіка Курта Кламрота / М. Баціс // Гістарычны альманах. – 2012. – Т. 18. – С. 42–73.

Бачкоў У., Баравы Р., Трусаў А. Гродзенскі Стары замак // Мастацтва Беларусі. 1989. – № 6. – С. 47–48.

Бачкоў У.В. Стратыграфія помніка архітэктуры 11–19 стагоддзяў – комплекса Старога замку ў Гродне / У.В. Бачкоў // Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства. – Гродна, 1990. – С. 72–73.

Бачкоў У. Невядомая нам Гародня / У. Бачкоў // Мастацтва. – 2007. – № 1. – С. 54–55.

Бачкоў В.В. Алебастровый зал в Старом замке // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 10. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2016. – С. 23–28.

Баюра А.Н. Развитие кредитно-банковских учреждений губернского города Гродно в конце XIX – начале XX вв. / А.Н. Баюра // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 193–198.

Безбородко И.А. Журнал пребывания его величества, короля польского, Станислава Августа в Гродне 1795–1796 годов, ведённый приставом при нём генерал-поручиком И.А. Безбородком. – М., 1870. – 158 с.

Беседа Д. Праздник парка / Д. Беседа // Гродненская правда. – 1981. – 2 сент.

Белазаровіч В.А. Гародня на шляхах замежных падарожнікаў і дыпламатаў XVI ст. / В.А. Белазаровіч // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 101–105.

Белакоз А. Каб жыла Беларусь. Успаміны, артыкулы, інтэрв'ю / А. Белакоз. – Мінск: Бел. кнігазбор, 2003. – 103 с.

Беркоўскі В. Гродна ў 1812 годзе / В. Беркоўскі // Беларусь. – 1946. – № 4. – С. 56–58.

Беркоўскі В. Пётр I у Гродні / В. Беркоўскі // Беларусь. – 1947. – № 1. – С. 62.

Бершадский С.А. Документы и регесты к истории литовских евреев: В 2-х т. / С.А. Бершадский – СПб., 1882. Т. 1. – 337+XXс.; Т. 2. – 259+XIII с.

Беспамятных М.Н. Гродзенскія старыя каталіцкія могілкі / М.Н. Беспамятных // Этнакультурныя і прыродныя турыстычныя рэсурсы Гродзеншчыны і Сувальшчыны: энцыкл. давед. / рэд. В.Р. Карнялюк, І.І. Трацяк. – Гродна-Мінск: Беларускі дом друку, 2014. – С. 88.

Беценко С.Б. Музыкальные наследие Старинного города: век 18-й / С.Б. Беценко. – Гродно: б. и., 2012. – 127 с.

Бируля К.В. Краткое описание Гродненской губернии / К.В. Бируля. – Гродно, 1897. – 22 с.

Бічэль-Загнетава Д.І. Пошукі Максіма Багдановіча / Д.І. Бічэль-Загнетава // Музей і развіццё гістарычнага краязнаўства. – Гродна, 1990. – С. 12–14.

Бічэль Д. Хадзі на мой голас. – Гродна-Вроцлаў, 2008. – 331 с.

Блинова Т.Б. Иезуиты в Белоруссии / Т.Б. Блинова. – Минск: Беларусь, 1990. – 110 с.

Блінова Т.Б. Дынаміка колькасці езуітаў Гродзенскай калегіі за 1623/24 – 1733/74 гг. / Т.Б. Блінова // Гарадзенскія запісы. – Гародня. – 1993.– Вып. 1. – С. 103–104.

Блінова Т. Гродзенскі езуіцкі калегіум / Т. Блінова // Энцыкл. гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1996. – Т. 3 – С. 134.

Блинова Т.Б. Иезуиты в Белоруссии. Роль иезуитов в организации образования и просвещения / Т.Б. Блинова. – Гродно: ГрГУ, 2002. – 427 с.

Бобровский П.О. Историко-статистический очерк города Гродна / П.О. Бобровский // Памятная книжка Гродненской губернии на 1860 год. – Гродно, 1860. – С. 69–132.

Бобровский П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния / М. Бобровский. – СПб., 1863. Ч. 1. – 866 с.; Ч. 2. – 1074 с.; Приложения. Ч. 1. – 247 с.; Ч. 2. – 6+391+72 с.

Бобровский П. Историческая монография г. Гродно / П. Бобровский // Вестник России 1862. – № 12.- июнь. – С. 170–178; 1865 – ноябрь – С. 170–178; 1865 т.II, кн 5,отд 2. – С. 57–64; 1865. – Т.III, отд.2. – С. 170–178; 1866. – Т. III., кн.7, отд 2. – С. 28–43.

Богданович А.В. Города Белоруссии: краткий эконом. очерк / А.В. Богданович, П.А. Сидоров. – Минск: Наука и техника, 1967. – 185 с.

Богородский Н. Церковь во имя святаго равноапостольнаго великаго князя Владимира в городе Гродне, на Занеманском форштате: очерк истории ея возникновения / Н. Богородский. – Гродна, 1897. – 36 с.

Богородский Н.М. Курсы пения и музыки для подготовки регентов народных хоров в г. Гродне: краткий очерк / Н.М. Богородский. – Гродна, 1905. – 17 с.

Бой за Гродно в сентябре 1939 года: глазами участников и очевидцев/ Н. Малышевский. – Минск: издатель А.Н. Вараксин, 2012. – 134 с.

Борко А.И. и др. Страницы конфессиональной истории Гродно. – Минск: Экоперспектива, 2012. – 119 с.

Бородин А.П. Гродненский губернатор / А.П. Бородин // Пётр Аркадьевич Столыпин: энцикл. / отв. ред. В.В. Шелохаев. – Москва, 2011, С. 147.

Бочков В.В. Средневековый детинец на Замковой горе в Гродно в XII веке // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 8. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2012. – С. 12–16.

Брылеўскі Ул. Гістарычная мінуўшчына Горадні і Гарадзеншчыны // Полацак. – 1993. – № 7.

Брэгер Г. Дакументы сведчаць: Інвентар каралеўскага горада Гродна паводле камісарскай рэвізіі, 1680 г. / Г. Брэгер // Памяць: гіст.-дакум. хроніка горада Гродна. – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 84–95.

Быкаў В. Доўгая дарога дадому: кніга ўспамінаў / В. Быкаў. – Мінск: ГА БТ "Кніга", 2002. – 539 с.

Быкаў В. Гарадзенскі архіў: невядомыя творы (1957–1972). Незавершанае. Нататнікі. – Гродна-Вроцлаў: Гарадз. б-ка, 2012. – 445 с.

В июне 1941: воспоминания участников боёв на Гродненщине / сост. И. Борисов [и др.]. – Гродно, 1999. – 208 с.

Вайцешчык Г.С. Арганізацыя гандлю ў Гродне (першая палова XIX ст.) / Г.С. Вайцешчык // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 185–188.

Валодзін У. Браніслаў Ржэўскі і яго пратэст супраць русіфікацыі // Гарадзенскі гадавік. – Гародня: Гарадзенская бібліятэка, 2020. – С. 63–79.

Вароніч Т. Афіцыйная хроніка здарэнняў у Гародні напрыканцы XIX – пачатку XX ст. / Т. Вароніч // Гарадзенскі соцыум. Чалавек у прасторы горада. XV-XX стст.: зб. навук. арт. / пад рэд. А.Ф. Смаленчука, А.К. Краўцэвіча. – Мінск: Зміцер Колас, 2015. – С. 150–164.

Васілевіч І. Каложская царква ў Гродні / І. Васілевіч // Беларусь. – 1945. – № 7–8. – С. 73–75.

Василькевич В.А. Буржуазные реформы 60–70-х г. XIX в. (по материалам "Гродненских губернских ведомостей") // Актуальныя праблемы гісторыі Беларусі: стан, здабыткі і супярэчасці, перспектывы развіцця. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С. 79- 83.

Васілючак М.В. Трывожная гродзенская восень 1939 г. / М.В. Васілючак // Гродна і гродзенцы: дзевяць стагоддзяў гісторыі (да 880-годдзя горада): матэрыялы Міжнар. навук. канф. – Гродна: ГрДУ, 2008. – С. 301–307.

Вацкель О.Г. Борисоглебская (Коложская) церковь – выдающийся памятник русского зодчества XII века / О.Г. Вацкель. – Гродно, 1958. – 17 с.

Вацкель О.Г. Нижняя церковь – памятник русского зодчества XII века. – Гродно, 1958. – 7 с.

Вашкевич А.Ф., Трусов И. Кунштат Антония Тизенгауза: история и место в пространстве современного Гродно // Краязнаўчыя запіскі: зборнік артыкулаў / Упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, Установа культуры "Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей". — Гродна. — 2018. — Вып. 11. — С. 48–63.

Вашкевіч А., Нарэль Д. Сымон Якавюк: адраджэнец, спекулянт, манархіст і савецкі дыверсант // Arche. – 2005. – № 5. – С. 178–229.

Вашкевіч А. Паміж Ласоснай і Чорнай Ганчай: гісторыя каталіцкіх парафій у паўднёва-усходняй частцы Аўгустоўскай пушчы / А. Вашкевіч, Д. Нарэль. – Мінск: Зміцер Колас, 2006. – 127 с.

Вашкевіч А. Праект развіцця транспартнай сістэмы Горадні /А. Вашкевіч [і др.] // Горад Святога Губерта: краязн. альм. – Warszawa: Białorusko-Polskie Towarzystwo im. Tadeusza Kościuszki, 2007. – Wyd. 3. – С. 40–48.

Вашкевіч А. Гродна, якога не было: заходнебеларускі горад, як аб'ект гісторыяпісання / А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч // Гістарыяграфія і крыніцы па гісторыі гарадоў і працэсаў урбанізацыі ў Беларусі. – Гродна: ГрДУ, 2009. – С. 397–404.

Вашкевіч А., Казак Т. Гродзенскі Новы Свет з першай трэці XX ст. // Ян Булгак і культура заходнебеларускага рэгіёну ў канцы XIX ст. і да Другой сусветнай вайны: зб. навук. арт. – Гродна: ГрДУ, 2009. – 135 с.

Вашкевіч А. На крок ад заўтра. Нарыс нацыянальна-культурнай трансфармацыі Гродна паміж дзвюма Сусветнымі войнамі (1919–1939 гг.) // Arche. – 2010. – № 1.

Вашкевіч А. Польскі Гродна: эвалюцыя горада ў міжваенны час (1919–1939) / А. Вашкевіч, А. Чарнякевіч // Arche. – 2010. – № 1–2. – С. 306–384.

Вашкевіч А. На гродзенскім бруку: вандроўка па фабрыках і прадпрыемствах старога Гродна / А. Вашкевіч. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2012. – 100 с.

Вашкевіч А. Харальная сінагога ў Гродне ў XIX ст. / А. Вашкевіч // Горад Святога Губерта: зб. краязн. арт. – Горадня, 2012. – Вып. 6. – С. 15–19.

Вашкевіч А.Ф. Комплекс старых гродзенскіх могілак. Гісторыя, мастацкая каштоўнасць, перспектывы выкарыстання як аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны // Краязнаўчыя запіскі. Вып. 10. – Гродна: Гродзенская друкарня, 2016. – С. 40–51.

Вашкевіч А. Біяграфія гарадзенскіх вуліц: ад Фартоў да Каложы / аўт.: А. Вашкевіч [і інш.]. – Гародня–Wrocław: Гарадз. б-ка, 2012. – 369 с.

Вашкевіч А. Занёманскі Фарштат Горадні ў XVI – першай палове XX ст.: эвалюцыя гарадской прасторы / А.Вашкевіч, А. Чарнякевіч // Гарадзенскі палімпсест. 2012. Людзі даўняй Гародні: XV–XX стст. / пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Гродна, 2013. – С. 210–221.

Вашкевіч А. Лісты з горада, якога няма / А. Вашкевіч, Т. Казак // Arche. – 2014. – № 11. – С. 328–353.

Вашкевіч А. Гародня падчас нямецкай акупацыі перыяду Другой сусветнай вайны ў вусных успамінах / А. Вашкевіч, Т. Касатая // Гарадзенскі соцыум. Чалавек у прасторы горада. XV–XX стст.: зб. навук. арт. / пад рэд. А.Ф. Смаленчука, А. Краўцэвіча. – Мінск: Зміцер Колас, 2015. – С. 333–344.

Вашкевіч А., Саяпін В. Смакі старой Гародні: грамадскае харчаванне і прадуктовыя крамы міжваеннага часу / А. Вашкевіч, В. Саяпін // Гарадзенскі соцыум. Чалавек у прасторы горада. XV–XX стст.: зб. навук. арт. / пад рэд. А.Ф. Смаленчука, А. Краўцэвіча. – Мінск: Зміцер Колас, 2015. – С. 271–281.

Вашкевіч А. На гродзенскім бруку / А. Вашкевіч, В. Саяпін. – 2-е выд. – Гродна: ЮрСаПрынт, 2016. – 273 с.

